Мікалай Півавар

# Краязнаўцы Віцебшчыны

другой паловы XX – пачатку XXI ст.

Біябібліяграфічны даведнік

Мінск, «Кнігазбор», 2010

УДК 94(476.5)
ББК 63.3 (4Беи)
П32

Рэцэнзент
*кандыдат гістарычных навук*
В. У. Скалабан

**Півавар, М. В.**
П32 Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст. : біябібліяграфічны даведнік / М. В. Півавар. — Мінск: Кнігазбор, 2010. — 372 с.
ISBN 978-985-6976-46-2.

Кніга з'яўляецца працягам выдадзенага у 2006 г. даведніка «Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г.». Змяшчаецца інфармацыя пра больш за 570 асоб: краязнаўцаў-аматараў, музейных работнікаў, архівістаў, бібліятэкараў, журналістаў, настаўнікаў, выкладчыкаў ВНУ, навукоўцаў і супрацоўнікаў дзяржаўных устаноў, арганізацый, якія даследуюць гісторыю і культуру Віцебшчыны ў адміністрацыйных межах сучаснай Віцебскай вобласці. Прыводзіцца бібліяграфія краязнаўцаў. У якасці ілюстрацый змяшчаюцца фотаздымкі даследчыкаў, іх прац.

Кніга будзе карыснай для краязнаўцаў, супрацоўнікаў архіваў, музеяў, бібліятэк, студэнтаў, навучэнцаў сярэдніх навучальных устаноў, настаўнікаў, турыстаў, усіх тых, хто цікавіцца гісторыяй Віцебшчыны.

**УДК 94(476.5)**
**ББК 63.3 (4Беи)**

**ISBN 978-985-6976-46-2**

© Півавар М.В., 2010
© Вокладка. Волкаў А. А., 2010
© Афармленне. ПУП «Кнігазбор», 2010

## ПРАДМОВА

Ідэя стварэння даведніка «Краязнаўцы Віцебшчыны» ўзнікла прыблізна ў 2001 г. пры падрыхтоўцы дысертацыйнага даследавання «Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 1961–1991 гг.». У ходзе працы былі вызначаны асноўныя тэндэнцыі, характэрныя рысы, асаблівасці дзяржаўнага, школьнага і грамадскага кірункаў краязнаўства ў той час, зроблены пэўныя вывады. Аднак дакументы не дазвалялі «ўбачыць за лесам дрэваў». Хто былі тыя людзі, якія вывучалі наш край? Якімі яны былі? Чаго хацелі? Што падштурхнула іх да цяжкай, часта няўдзячнай працы на ніве краязнаўства?

На жаль, ні задачы даследавання, ні яго памеры не дазвалялі сур'ёзна заняцца гэтымі тэмамі. Узнікла ідэя падрыхтоўкі асобных прац, прысвечаных гісторыі краязнаўства рэгіёна, ролі асобы ў краязнаўстве. У 2006 г. была выдадзена першая частка — «Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г.». У ёй змяшчалася інфармацыя пра больш чым 360 асоб, якія прычыніліся да вывучэння Віцебшчыны ў XVI – першай палове XX ст. Праца над другой часткай, прысвечанай даследчыкам другой паловы XX ст. і нашым сучаснікам, заняла больш часу. Прычынамі былі нераспрацаванасць тэмы, адсутнасць друкаваных крыніц, значны аб'ём інфармацыі, якую прыйшлося сабраць і належным чынам апрацаваць.

Былі вывучаны асобныя фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, ведамасных архіваў розных дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый. Карпатліва аналізавалася літаратура, асабліва мясцовыя перыядычныя выданні ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, Віцебскай абласной бібліятэцы і раённых кнігасховішчах рэгіёна, праведзены сотні інтэрв'ю, анкетаванняў. У выніку праведзенай працы былі сабраны матэрыялы пра краязнаўцаў-аматараў, музейных работнікаў, архівістаў, бібліятэкараў, журналістаў, настаўнікаў, выкладчыкаў ВНУ, навукоўцаў і супрацоўнікаў дзяржаўных устаноў, арганізацый, якія даследуюць гісторыю і культуру Віцебскай вобласці ў сучасных адміністрацыйных межах. Асноўнымі крытэрыямі ў адборы персаналій у даведнік з'яўляліся: публікацыйная дзейнасць (выданне кніг, публікацыя артыкулаў у навуковым і перыядычным друку, інтэрнэт-выданнях); грамадска-асветніцкая праца (удзел у мерапрыемствах, навуковых праграмах, канферэнцыях, семінарах; у мас-мэдыя: выступленні на радыё, тэлебачанні, інтэрв'ю ў газетах і часопісах); удзел у стварэнні музеяў і экспазіцый; дабрачынная дзейнасць (па добраўпарадкаванні помнікаў і памятных мясцін, мецэнацтва).

Разам з жыццяпісамі мясцовых краязнаўцаў, як правіла, аматараў, асветлены рэгіянальны аспект у даследаваннях сталічных і рэгіянальных навукоўцаў. Змешчаныя біяграмы даследчыкаў уключаюць у сябе інфармацыю пра месца нараджэння, звесткі пра адукацыю, працоўную дзейнасць, удзел у грамадскім жыцці, краязнаўчыя зацікаўленні даследчыкаў, іх галоўныя дасягненні. У дужках курсівам прыводзяцца псеўданімы краязнаўцаў, пры магчымасці ў жанчын падаюцца дзявочыя прозвішчы. Прыводзіцца бібліяграфія краязнаўцаў па катэгорыях: кнігі, артыкулы ў навуковым, рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку, гісторыка-дакументальных хроніках гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць». У межах раздзелаў назвы твораў і артыкулаў змяшчаюцца ў храналагічнай паслядоўнасці. Назвы большасці перыядычных выданняў скарочаны. Іх тлумачэнні пададзены ў спісе

скарачэнняў. Нягледзячы на пошукі, многія нумары саматужных перыядычных выданняў не выяўлены ў Беларусі. Артыкулы ў зборніках навуковых канферэнцый, пачынаючы з 1991 г. прааналізаваны слаба, з прычыны іх маладаступнасці (малы наклад друку, ігнараванне абавязковай рассылкі ў бібліятэкі краіны). У асобным раздзеле прыводзіцца літаратура, прысвечаная даследчыку. У якасці ілюстрацый падаюцца фотаздымкі даследчыкаў, іх прац (больш за 400 здымкаў).

Геаграфічныя межы працы — Віцебская вобласць у яе сучасных адміністрацыйных межах. Сабраны звесткі таксама пра асоб, якія пражываюць у іншых рэгіёнах Беларусі і Еўропы, аднак вывучаюць Віцебшчыну. Храналагічныя рамкі — другая палова ХХ – пач. ХХІ ст. (па 2009 г. уключна). У пэўных выпадках уключаюцца найбольш важныя выданні пазнейшага часу.

У кнізе змешчаны артыкулы пра 570 персаналій. Інфармацыя пра яшчэ больш як сотню асоб па розных прычынах не ўвайшла ў кнігу. Даследаванні краю некаторымі з іх мелі эпізадычны характар, звесткі пра дзейнасць іншых пакуль не ўдалося адшукаць. Некаторыя запоўнілі анкеты фармальна ці нават адмовіліся гэта рабіць. Звязацца з іншымі было проста немагчыма. Інфармацыя пра іх недастатковая. У некаторых выпадках не удалося адшукаць нават імя і імя па бацьку. З іншымі ўдалося мець размову прыватна, часта працяглую, не абмежаваную адной сустрэчай, таму некаторыя артыкулы больш нагадваюць нарысы, у якіх бачна асоба з шматлікімі гранямі таленту. З гэтай мэтай у кнізе сустракаюцца адступленні ад навукова-даведачнага стылю.

У кнізе па прычынах канфідэнцыяльнасці не змешчаны адрасы і тэлефоны краязнаўцаў. Возьмем на сябе адказнасць стаць кантактнай асобай. Пры пільнай патрэбе звязацца з краязнаўцам і атрымаць неабходную інфармацыю можна даслаўшы электронны ліст на электронную пошту аўтара pivavar@gmail.com ці на адрас: 211311, г. Віцебск, п. а. Лужасна, 9/11.

Звяртаемся да чытачоў з просьбай дасылаць свае заўвагі і прапановы, каб зрабіць адпаведныя дапаўненні і ўдакладненні ў новым выданні, якое плануем зрабіць у электроннай форме.

**Літаратура і крыніцы**. Працы, прысвечанай сучасным краязнаўцам Віцебшчыны, як і Беларусі, няма. Аднак ідэя выдання зборніка персаналій краязнаўцаў не новая. У 1995 г. на Магілёўшчыне была падрыхтавана кніга «Даследчыкі роднага краю (краязнаўцы і гісторыкі — ураджэнцы Магілёўшчыны)»[1]. У Оршы ў 2002 г. пабачыў свет даведнік, прысвечаны аршанскім краязнаўцам[2]. На старонках «Краязнаўчай газеты» на працягу некаторага часу друкаваліся матэрыялы, сабраныя В. Скалабанам[3]. З метадалагічнага пункту гледжання выклікаюць цікавасць даследаванні расійскіх навукоўцаў прысвечаныя персаналіям краязнаўцаў розных рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі[4]. Найлепшым прыкладам даведніка, на нашу думку, з'яўляецца кніга І. Бяляева «Подвижники земли Смоленской»[5].

Асноўнымі крыніцамі пры падрыхтоўцы даведніка сталі падшыўкі абласных («Віцебскі рабочы», «Народнае слова»), раённых, гарадскіх газет Віцебскай вобласці, некаторыя ведамасныя выданні («Строитель», «Витебский лотерейный вестник», «Старожил» і інш.),

[1] Даследчыкі роднага краю: Краязнаўцы і гісторыкі — ураджэнцы Магілёўшчыны: біяграфічна-бібліяграфічны паказальнік. — Магілёў, 1995. — 67 с.

[2] Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — 32 с.

[3] Скалабан В. Ствараецца даведнік «Беларускія краязнаўцы» // Кантакты і дыялогі. — 2001. — № 1. — С. 28–30; Скалабан В. Сучасныя беларускія краязнаўцы // Краязнаўчая газета. — 2005. — Сакавік–кастрычнік.

[4] Историки и краеведы Москвы: Некрополь: библиографический справочник / Институт российской истории РАН; Моск. гор. объед. архивов; сост. Л.В. Иванова [и др.]. — М.: Мосгорархив, 1996. — 220 с.

[5] Беляев И.Н. Подвижники земли Смоленской: биобиблиографический справочник об исследователях родного края. — Смоленск: СОКИ «Смядынь», 2003. — 454 с.

незалежныя, прыватныя і канфесійныя выданні («Витебский курьер», «Вольнае Глыбокае», «Выбар», «Витебский проспект», «Информ плюс», «Телеком-Экспресс», «Минские епархиальные ведомости», «Полоцкие Епархиальные ведомости» і інш.).

Асобую цікавасць выклікаюць рэгіянальныя бюлетэні, якія выдаваліся краязнаўцамі: «Краязнаўцы Паазер'я», «Нашы карані. Ілюстраваны часопіс краязнаўцаў Паазер'я» (Пастаўшчына), «Полацкі край», «Рабочее слово», «Рабочы Дзвінскага памежжа» (Верхнядзвіншчына), «Спадчына» (Лёзна), «Каплічка» (Сянно), «Павет» (Браслаў) і інш.

Выбарачна аналізаваліся рэспубліканскія перыядычныя выданні: «Краязнаўчая газета», «Звязда», «Літаратура і мастацтва», «Культура», «Настаўніцкая газета», «Наша слова», «Пора отдыхать», «Туризм и отдых», «Советская Белоруссия», «Чырвоная змена», «Głos znad Niemna» і інш.

Асобнай крыніцай інфармацыі сталі матэрыялы гісторыка-дакументальных кніг «Памяць», энцыклапедычныя выданні «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», «Беларускія пісьменнікі», «Археалогія і нумізматыка Беларусі», «Архітэктура Беларусі», «Прырода Беларусі» і інш.

Аналізаваліся часопісы, у першую чаргу бюлетэнь «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі» («Спадчына»), «Архівы і справаводства», «Беларускі гістарычны часопіс», «Беларуская мінуўшчына», «Витебские епархиальные ведомости», «Кантакты і дыялогі», «Краткие сообщения института археологии», «Роднае слова», «Родная прырода», «Беларуская мова і літаратура ў школе», «Советская археология», «Гісторыя. Праблемы выкладання», «Мастацтва», штогоднікі «Мишпоха», «Шагаловский международнай ежегодник» і інш.

Вывучаліся зборнікі матэрыялаў канферэнцый, бібліяграфічныя спісы ў даследаваннях айчынных і замежных навукоўцаў, дакументы і матэрыялы беларускіх і замежных архіўных сховішчаў (Р. Афтаназі, А. Глагоўскай, Р. Раманава і інш.).

Асобную катэгорыю ўяўляюць сабой манаграфіі віцебскіх краязнаўцаў.

Пэўную інфармацыю пра віцебскіх краязнаўцаў можна адшукаць у электронных выданнях (CD і DVD-дыскі) і ў інтэрнэце. Дзякуючы апошняму, між іншым, вельмі спрашчаліся стасункі з краязнаўцамі, запаўненне і перадача анкет, бібліяграфічных спісаў, фотаздымкаў.

У час працы над выданнем былі выкарыстаны архіўныя матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (фонды Беларускага аддзялення Савецкага фонда культуры, Беларускага фонда культуры, Беларускага краязнаўчага таварыства, БДТАПГіК), Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці (фонды Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, Віцебскага аддзялення Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Віцебскага абласнога аддзела народнай адукацыі, абласнога камітэта КПБ, ЛКСМБ, асабістыя фонды некаторых краязнаўцаў), архівы Віцебскага аддзялення БКТ, гісторыка-культурнага таварыства «Узгор'е».

Пад час падрыхтоўкі выдання былі праведзены кансультацыі з работнікамі асноўных асяродкаў краязнаўства ў вобласці: цэнтраў пазашкольнай працы, краязнаўчых музеяў, краязнаўчых аддзелаў бібліятэк, архіваў, ВНУ. Было праведзена анкетаванне і апытанне краязнаўцаў. З гэтай мэтай была распрацавана анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны» (сумесна з В.У. Скалабанам) [гл. дадатак]. У архіве аўтара захоўваецца больш за 450 анкет у папяровай і электроннай формах. Паколькі анкеты ўтрымліваюць важную інфармацыю пра даследчыкаў, яны будуць перададзены ў асабісты фонд М. В. Півавара для надання ім статусу крыніц.

У канцы кнігі прыводзіцца геаграфічны паказальнік тапонімаў, якія сустракаюцца ў тэксце, рэзюме на беларускай, рускай, ангельскай і польскай мовах, спісы скарачэнняў. У асобным радзеле падаюцца меркаванні аўтара пра тое, што такое краязнаўства, тыпалогія

даследчыкаў роднага краю, а таксама аглядаюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця краязнаўства Віцебшчыны ў вывучаемы перыяд.

Выданне не прэтэндуе на ўсеахопнасць.

Хачу выказаць словы ўдзячнасці ўсім тым, хто розным чынам далучыўся да падрыхтоўкі і выдання гэтай кнігі: навукоўцам, архівістам, супрацоўнікам музеяў, бібліятэк, педагогам, краязнаўцам-аматарам, калегам, сябрам, сваякам і проста неабыякавым асобам. Асаблівую падзяку хачу выказаць: І.А. Абрамавай, Т. Алексій, Ф.А. Анапрыенка, А.У. Аніськовічу, В.М. Арлову, Н.А. Бабровіч, М.М. Баўтовічу, В.В. Бандарэвічу, А.Ф. Бубала, А.А. Букінай, І.У. Бунто, С.С. Буткевічу, В. Броўку, Т.М. Варонінай, А.А. Волкаву, Р. Воранаву, Д.М. Газіну, В.У. Галубовічу, І.В. Ганчарову, С.М. Глушкову, А.І. Грачышнікавай, В.В. Грыбко, Я.А. Грэбеню, Л.Ф. Данько, А.М. Дарафееву, Л.І. Дзевяковіч, А.М. Дулаву, Г. Жаголкінай, Ю.Л. Зайцу, І. Зямчонку, В.А. Ермалёнку, П.І. Кавальчуку, І.І. Каліноўскаму, Т.М. Кастэнцы, У.П. Каханка, А.М. Кісялёву, К.А. Кожану, А.В. Крачкоўскаму, М.Ф. Крывёнку, А. Куксо, А.В. Куржалаву, Н.Л. Ларковай, А.Г. Лісаву, В.П. Лютынскаму, У.К. Ляскоўскаму, А.Г. Майсяёнку, М.Д. Макараву, Г.М. Мезенцы, А.І. Мемусу, Э.Э. Навагонскаму, І.Х. Навагродскай, Л.К. Нікіцінай, П.М. Падгурскаму, С.С. Панізьніку, М.У. Паўлаву, М.К. Паўловічу, М.Х. Плавінскаму, І. Пракаповічу, А. Радаману, А.Э. Райчонак, А.У. Русецкаму, С.І. Садоўскай, С. Серабро, В.У. Скалабану, У.К. Слабіну, А.І. Судніку, А.М. Супрановічу, А. Сцепанішчаву, Н.А. Сяргеенцы, В.У. Тухта, М.Г. Хмялюк, Т.А. Шагалеевай, Р.Л. Шарыпкіну, З. Шлімакову, А.А. Шнэйдару, Г.І. Шпакоўскай, А.Л. Шульману, Ф.Л. Шымуковічу, А.М. Шынкевічу, В. Шырме, К. Шыталю, В.А. Шышанаву, Д. Юрчаку, М.Д. Юшкевіч, А.В. Якаўлеву, І.Ю. Янушу.

Асоба хацеў бы падзякаваць С.М. Глушкову, які адкаментаваў і адкарэктаваў матэрыялы, прысвечаныя краязнаўцам Полацка, К. Шыдлоўскаму за дапамогу у падрыхтоўцы матэрыялаў, прысвечаных Браслаўшчыне і краязнаўцам замежжа, К.Р. Карпекіну за дапамогу ў зборы матэрыялаў па Лёзненшчыне, супрацоўнікам краязнаўчага аддзела ВАБ — Т.М. Адамян, А.В. Ганчаровай, Н. Кастуновай, Н.В. Курсо.

# КРАЯЗНАЎЦЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ 2-Й ПАЛОВЫ XX — ПАЧАТКУ XXI СТ.



**АБРАМАВА** ІНА АЛЯКСАНДРАЎНА (19.09.1959, г. Каменка-Бугская Львоўскай вобл., УССР), краязнаўца, гісторык, музейны работнік. Скончыла гіст. факультэт Львоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя І. Франко (1986). Працавала настаўніцай гісторыі ў СШ № 31 г. Віцебска (1986–1989), вядучым навуковым супрацоўнікам ВАКМ (1989–2003), загадчыцай аддзела ў ДАВВ, мастацтвазнаўцам у КУНПП «Віцебскпраектрэстаўрацыя» (з 2003), ст. захавальнікам фондаў культурна-выхаваўчай працы ва Упраўленні ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама (з 2005).

Краязнаўчую дзейнасць распачала ў 1986 г. Комплексна даследуе Віцебскі рэгіён, аддаючы перавагу вывучэнню архітэктурнай спадчыны, сацыяльнай гісторыі, археаграфіі Віцебшчыны, гісторыі Віцебска, вуліц, установ і прадпрыемстваў горада.

Брала ўдзел у стварэнні некаторых экспазіцый ВАКМ, сярод якіх «1812 г. на Віцебшчыне», «Масонская калекцыя В. Федаровіча», «Спадчына А.П. Сапунова» і шэрагу іншых. Рыхтавала гістарычныя даведкі па розных пытаннях гісторыі горада, напрыклад: «Першыя фотаатэлье ў г. Віцебску», «З гісторыі Полацкага жаночага вучылішча духоўнага ведамства», па храмах г. Віцебска. Зрабіла важны ўклад у стварэнне экспазіцыі музея міліцыі Віцебскай вобл. (2007).

Аўтар кнігі «Витебская губернская милиция (1917–1924 гг.)». Апублікавала ў «Віцебскіх сшытках» пераклад граматы аб пераносе ўніяцкай друкарні з Вільні ў Віцебск, перапіску Е.Р. Раманава з А.П. Сапуновым, «Запіскі старога» М. Маркса. З мэтай іх падрыхтоўкі працавала ў гістарычным архіве РФ, ваенна-гістарычным архіве РФ, Нацыянальнай бібліятэцы РФ імя Салтыкова-Шчадрына, архівах Украіны (Львоў) і Беларусі. Аўтар двух артыкулаў у бюлетэні Цэнтра напалеонаўскіх даследаванняў пра знаходжанне імператара Напалеона Банапарта ў Віцебску ў 1812 г.

Аўтар соцень артыкулаў па гісторыі і культуры Віцебска ў рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку. У газеце «Віцебскі кур’ер» з 1991 г. надрукавана больш за 200 артыкулаў па гісторыі і культуры Віцебшчыны, сярод якіх шэраг матэрыялаў з рукапіснай спадчыны А. Сапунова.

На працягу двух гадоў штотыдзень вяла перадачу «Стары горад» на абласным тэлебачанні, большасць з выпускаў якой былі прысвечаны гораду і наваколлю.

Актыўны ўдзельнік краязнаўчых канферэнцый (з 1989).


Тв.: Музейны збор В.П. Федаровіча ў Віцебску // Беларуска-рускае культурнае ўзаемадзеянне канца XIX – пачатку XX ст.: матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 150-годдзю з дня нараджэння І.Я. Рэпіна і 100-годдзю знаходжання мастака на Беларусі. — Віцебск: Друкарня імя Камінтэрна, 1995. — С. 64–65; Фундуш Тадулінскаму кляштару Тадэвуша і Ізабэлы Агінскіх // Віцебскі сшытак. — 1995. — № 1. — С. 52–57; Грамата Станіслава Аўгуста базыльянам Літоўскай правінцыі 1768 // Віцебскі сшытак. — 1996. — № 2. — С. 70–71; Спіс жыхароў Віцебска 1812 года: [падрыхтоўка рукапісу да друку] // Віцебскі сшытак. — 1997. — № 3. — С. 122–136; «Чарцёж» Віцебска 17 ст. // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 101–103; Вайна 1812 года ў Віцебску // Тамсама. — С. 131–135; Па старонках віцебскіх газет // Тамсама. — С. 201–202.

Артыкулы ў перыядычным друку: Забытые имена (ВУАК) // ВК. — 1991. — № 15. — С. 5; Каждый хотел войти в историю: [губернатары Віцебскай губ.] // ВК. — 1991. — № 47. — С. 6; Смерть Великого князя: [Канстанцін Паўлавіч] // ВК. — 1992. — № 3. — С. 10; Шорох времени: [Юр’ева горка] // ВК. — 1992. — № 4. — С. 6; Наполеон поступает по-своему: [Напалеон у Віцебску] // ВК. — 1992. — № 18. — С. 3; Юбилей монумента: [у гонар 1812 г.] // ВК. — 1992. — № 38. — С. 3; Ох, уж эти гусары! // ВК. — 1992. — 24 сент. — С. 3; На войне, как на войне: [палонныя французы ў Віцебску] // ВК. — 1992. — № 39. — С. 5; «…А в это время Бонапарт переходил границу» // ВК. — 1992. — № 42. — С. 5; Не моргайте, господа, выдержка всего две минуты // ВК. — 1993. — № 11. — С. 8; Масоны // ВК. — 1993. — № 18, 19; Магдебургское право // ВК. — 1993. — № 21. — С. 8; Отец Варсонофий // ВК. — 1993. — 5 нояб.; Покойся душою, а Русь дорогая с любовью тебя помянёт: [І Сусветная вайна на Віцебшчыне] // ВК. — 1993. — № 45. — С. 8; Разбойники Витебской губернии // ВК. — 1994. — № 2. — С. 4; Магазины… Базары… Конец XIX века // ВК. — 1994. — № 3. — С. 8; Епархиальное Братство // ВК. — 1994. — № 14. — С. 4; Царь Пётр был не совсем трезв // ВК. — 1994. — № 19. — С. 4; Возвращение Евфросинии // ВК. — 1994. — № 24. — С. 4; История г. Витебска: [Сапунов] // ВК. — 1994. — № 31–37; В начале века развлекались, как могли // ВК. — 1994. — № 48. — С. 8; Неизвестная Первая мировая война // ВК. — 1994. — № 46. — С. 8; Нашим предкам ЭТО было не чуждо: [прастытуцыя ў Віцебску] // ВК. — 1994. — № 47. — С. 8; На любовь, на дальнюю дорогу // ВК. — 1994. — 2 дек.; Веселись, народ! // ВК. — 1994. — 30 дек.; Из летописи: [стыхійныя навалы ў Віцебску] // ВК. — 1995. —




№ 8. — С. 8; Про воду, пожарных и трубочистов // ВК. — 1995. — № 19. — С. 4; Имущий, помоги неимущему: [дабрачыннасць у Віцебску] // ВК. — 1995. — № 29. — С. 8; Жизнь генерала // ВК. — 1995. — 11 авг.; Два выстрела в антракте // ВК. — 1995. — 8 сент.; Наши предки любили покататься на велосипедах // ВК. — 1995. — 24 окт.; Из дневника императрицы // ВК. — 1996. — № 4. — С. 4; Записки депутата: [Ф. Нікановіч — дэпутат Дзяржаўнай Думы Расійскай імперыі] // ВК. — 1996. — № 7. — С. 2; Тадулинский монастырь // ВК. — 1996. — № 13. — С. 4; Свято-Троицкий Марков монастырь // ВК. — 1996. — № 15. — С. 4; Витебский женский Свято-Духовской монастырь // ВК. — 1996. — № 17. — С. 8; Забытые храмы // ВК. — 1996. — № 25, 26; Витебские немцы // ВК. — 1996. — № 29. — С. 8; Благородное собрание // ВК. — 1996. — № 35. — С. 4; Пройдусь по Замковой // ВК. — 1996. — № 41. — С. 3; Первые аптеки Витебска // Тамсама. — С. 5; Витебская губерния. 100 лет назад. Декабрь // ВК. — 1996. — № 49. — С. 3; Витебская губерния. 100 лет назад. Январь // ВК. — 1997. — № 1. — С. 5; Винт. Вист. Безик // ВК. — 1997. — № 5. — С. 3; Витебская губерния. 100 лет назад. Февраль // ВК. — 1997. — № 6. — С. 3; Первая перепись // ВК. — 1997. — № 9. — С. 3; Поздравляя, вспомним // ВК. — 1997. — № 10. — С. 3; Витебская губерния. 100 лет назад. Апрель // ВК. — 1997. — № 14. — С. 3; Городской ратуше — 400 лет // ВК. — 1997. — 21 марта; Праздник ратуши // ВК. — 1997. — № 15. — С. 3; Витебская губерния. 100 лет назад. Май // ВК. — 1997. — № 18. — С. 3; Единственный смысл жизни // ВК. — 1997. — № 20. — С. 3; Витебская губерния. Июнь. 100 лет назад // ВК. — 1997. — № 23. — С. 3; Витебская губерния. Июль. 100 лет назад // ВК. — 1997. — № 28. — С. 3; Ольга. В крещении Елена // ВК. — 1997. — № 29. — С. 3; Город грустный, город сонный // ВК. — 1997. — 25 июля; Великий князь Ольгерд // ВК. — 1997. — № 41. — С. 3; Сонька Золотая Ручка // ВК. — 1997. — 9 сент.; Витебская губерния. Сентябрь. 100 лет назад // ВК. — 1997. — № 44. — С. 2; Замки Витебска // ВК. — 1997. — № 47. — С. 3; Предместья Витебска // ВК. — 1997. — № 51; Витебская губерния. Октябрь. 100 лет назад // ВК. — 1997. — № 53. — С. 3; Ловилась рыбка в Двине // ВК. — 1997. — № 56. — С. 2; Витебская губерния. Ноябрь. 100 лет назад // ВК. — 1997. — № 62. — С. 3; Великий князь Ягайло // ВК. — 1997. — № 65. — С. 3; Имение Цехановецких: [Бачэйкава] // ВК. — 1997. — № 66. — С. 3; Витебская губерния. Декабрь. 100 лет назад // ВК. — 1997. — № 69. — С. 3; Свадьба — дело серьёзное // ВК. — 1997. — 24 дек.; Витебск. Новый год. 100 лет назад // ВК. — 1997. — С. 75. — С. 3; Занимайте свои места не позже второго звонка // ВК. — 1998. — № 1. — С. 6; Детектив // ВК. — № 7. — С. 3; В Витебске всегда любили книги // ВК. — 1998. — № 9. — С. 3; Дуэль на Чёрной речке // ВК. — 1998. — 20 лют.; Витебские мещане // ВК. — 1998. — № 15. — С. 5; Женщины всегда были кокетками // ВК. — 1998. — 6 сак.; Витебская губерния. Апрель. 100 лет назад // ВК. — 1998. — № 25. — С. 3; Историк Витебской земли // ВК. — 1998. — № 27. — С. 3; Коллекционер: [В. Федаровіч] // ВК. — 1998. — № 28. — С. 3; Чертёж Витебска 1664 г. // ВК. — 1998. — № 29. — С. 3; Когда же всё-таки был основан Витебск // ВК. — 1998. — 15 мая; Витебская губерния. Май. 100 лет назад // ВК. — 1998. — № 34. — С. 3; Новость. В Витебске новый вид транспорта // ВК. — 1998. — № 37. — С. 3; Пресмушки // ВК. — 1998. — № 38. — С. 2; История Витебских музеев // ВК. — 1998. — № 39. — С. 3; Преподобная Евфросиния Полоцкая // ВК. — 1998. — № 42. — С. 3; Витебская губерния. Июнь. 100 лет назад // ВК. — 1998. — № 44. — С. 3; Витебская губерния. Июль. 100 лет назад // ВК. — 1998. — № 50. — С. 3; Витебская губерния. Август. 100 лет назад // ВК. — 1998. — № 60. — С. 3; История городской бойни // ВК. — 1998. — 14 авг.; Спасовка у белорусов // ВК. — 1998. — 18 авг.; Царское благословение // ВК. — 1998. — 21 авг.; Первый дантист России был из Витебска // ВК. — 1998. — 28 авг.; Как спасать людей и животных от встречи с паровозом // ВК. — 1998. — № 70. — С. 3; Мёртвый в гробе тихо спи, жизни радуйся живущий // ВК. — 1998. — 18 сент.; Витебский кожвен // ВК. — 1998. — № 75. — С. 3; Витебская губерния. Октябрь. 100 лет назад // ВК. — 1998. — № 76. — С. 3; Легенда о Замковой горе // ВК. — 1998. — № 80. — С. 3; Юность предана ученью // ВК. — 1998. — 23 окт.; Благие намерения // ВК. — 1998. — № 85. — С. 3; Свечной завод // ВК. — 1998. — № 88. — С. 3; Как лечились в старину // ВК. — 1998. — № 89. — С. 3; Церковно-археологическое древлехранилище // ВК. — 1998. — 13 дек.; Витебская губерния. Декабрь. 100 лет назад // ВК. — 1998. — № 96. — С. 3; Витебск. Январь. 100 лет назад // ВК. — 1999. — № 2. — С. 3; Умчалось время золотое: [Полацкае жаночае духоўнае вучылішча] // ВК. — 1999. — № 5. — С. 3; Витебск. Февраль. 100 лет назад // ВК. — 1999. — № 11. — С. 3; Музей открыт: [Віцебскі дзяржаўны гістарычны музей] // ВК. — 1999. — № 12. — С. 3; Зимние праздники витебчан // ВК. — 1999. — № 13. — С. 3; Хутор с ветряной мельницей // ВК. — 1999. — № 14. — С. 3; Витебск. Март. 100 лет назад // ВК. — 1999. — № 18. — С. 3; Благовещенская церковь // ВК. — 1999. — 21 марта; Витебск. Апрель. 100 лет назад // ВК. — 1999. — № 25. — С. 3; Из истории Витебского окружного суда // ВК. — 1999. — № 27. — С. 3; Кустарные промыслы. Кожевенное производство // ВК. — 1999. — № 31. — С. 3; Мосты в Витебске // ВК. — 1999. — № 37. — С. 3; Время для забав // ВК. — 1999. — 4 июня; [Сінагога на вул. Рэвалюцыйнай] // ВК. — 1999. — № 44. — С. 3; Шорох времён: [Віцебск у фотаздымках] // ВК. — 1999. — № 48. — С. 3; Витебская грамота // ВК. — 1999. — № 49. — С. 3; Витебск. Июль. 100 лет назад // ВК. — 1999. — № 52. — С. 3; Витебск. Август. 100 лет назад // ВК. — 1999. — № 66. — С. 3; Витебск. Сентябрь. 100 лет назад // ВК. — 1999. — № 68. — С. 3; Ночные сторожа // ВК. — 1999. — № 72. — С. 5; Чудотворные иконы Божьей Матери // ВК. — 1999. — 24 сент.; Витебск. Октябрь. 100 лет назад // ВК. — 1999. — № 78. — С. 3; Витебск. Ноябрь. 100 лет назад // ВК. — 1999. — № 86. — С. 3; Витебские юродивые // ВК. — 1999. — 6 нояб.; Витебск. Январь. 100 лет назад // ВК. — 1999. — № 94. — С. 3; Колокола // ВК. — 1999. — № 102. — С. 3; Витебск. Январь. Сто лет назад // ВК. — 2000. — № 3. — С. 3; 100 грамм в «разувайке» // ВК. — 2000. — № 4. — С. 3; Начало // ВК. — 2000. — № 5, 6; Витебск. Февраль. Сто лет назад // ВК. — 2000. — № 13. — С. 3; Гуторовщина // ВК. — 2000. — № 14. — С. 3; Благовещенская

единоверческая церковь // ВК. — 2000. — № 22. — С. 3; Аэропланы над Витебском // ВК. — 2000. — 7 апр.; Прихватчики // ВК. — 2000. — 18 апр.; Богоявленская церковь // ВК. — 2000. — № 34. — С. 4; Жил-был великан // ВК. — 2000. — № 35. — С. 4; Витебск. Май. Сто лет назад // ВК. — 2000. — № 37. — С. 3; Витебск. Июнь. Сто лет назад // ВК. — 2000. — № 45. — С. 3; Витебские богадельни // ВК. — 2000. — № 47. — С. 3; Витебские храмы: [Барысаглебскі, Уваскрасенскі] // ВК. — 2000. — № 49. — С. 5; Витебск. Июль. Сто лет назад // ВК. — 2000. — № 50. — С. 3; Витебск. Август. Сто лет назад // ВК. — 2000. — № 62. — С. 3; Минеральные источники Витебской губернии // ВК. — 2000. — 28 авг.; Долгожители Витебской губернии // ВК. — 2000. — № 69. — С. 3; Жертвоприношение // ВК. — 2000. — 3 окт.; Бани Витебска // ВК. — 2000. — 20 окт.; Витебск. Декабрь. Сто лет назад // ВК. — 2000. — № 95. — С. 3; Храм Иоанна Богослова // ВК. — 2001. — № 1. — С. 4; Как в Витебске учились // ВК. — 2001. — № 3. — С. 3; Белорусская батлейка // ВК. — 2001. — № 6. — С. 3; Витебск. Январь. Сто лет назад // ВК. — 2001. — № 7. — С. 3; Записки мента // ВК. — 2001. — № 8. — С. 3; Историк Алексей Сапунов // ВК. — 2001. — 23 марта; Николай Лосский // ВК. — 2001. — № 9. — С. 4; Витебск. Февраль. Сто лет назад // ВК. — 2001. — № 13. — С. 3; Витебск. Март. Сто лет назад // ВК. — 2001. — № 22. — С. 3; Витебск. Апрель. Сто лет назад // ВК. — 2001. — № 31. — С. 4; Кража у Маковского // ВК. — 2001. — 3 апр.; Необычный вердикт // ВК. — 2001. — 8 сент.; Карты // ВК. — 2001. — № 35. — С. 4; Воскресенская (рынковая) церковь // ВК. — 2001. — № 36. — С. 4; Витебск. Июнь. Сто лет назад // ВК. — 2001. — № 46. — С. 3; Рулетка // ВК. — 2001. — 1 июня; Бильярд // ВК. — 2001. — № 51. — С. 5; Витебск. Июль. Сто лет назад // ВК. — 2001. — № 53. — С. 3; История одной пушки // ВК. — 2001. — № 56. — С. 3; Витебск. Октябрь. Сто лет назад // ВК. — 2001. — № 79. — С. 4; Воскресенская церковь // ВК. — 2001. — № 83. — С. 4; Грустная звезда // ВК. — 2001. — 10 авг.; Дуэль // ВК. — 2001. — 14 авг.; Витебск. Декабрь. Сто лет назад // ВК. — 2001. — № 98. — С. 3; Витебск. Январь. Сто лет назад // ВК. — 2002. — № 6. — С. 3; Витебск. Февраль. Сто лет назад // ВК. — 2002. — № 12. — С. 3; Витебск. Март. Сто лет назад // ВК. — 2002. — № 22. — С. 3; Уважаемый милиционер // ВК. — 2002. — 1 марта; Собачья служба // Тамсама; Домино // ВК. — 2002. — № 27. — С. 4; Витебск. Июнь. Сто лет назад // ВК. — 2002. — № 48. — С. 3; Уездный город Дрисса // ВК. — 2002. — № 52. — С. 3; Витебск. Лето. Сто лет назад // ВК. — 2002. — № 58. — С. 3; Шахматы // ВК. — 2002. — № 60. — С. 4; Уездный город Лепель // ВК. — 2002. — № 61. — С. 3; Фанат: [В. Шышанаў] // ВК. — 2002. — № 62. — С. 3; Письма к Софии Сонцовой // ВК. — 2002. — № 73. — С. 3; [Д.А. Якерсон] // ВК. — 2002. — № 76. — С. 3; Витебск. Октябрь. Сто лет назад // ВК. — 2002. — № 78. — С. 3; Орёл над Витебском: [помнік 1812 г.] // ВК. — 2002. — № 83. — С. 3; Витебск. Ноябрь. Сто лет назад // ВК. — 2002. — № 90. — С. 3; Первомай 1933 года // ВК. — 2003. — 3 мая; Лагерь в монастыре // ВК. — 2003. — 13 мая; «Шестёрки» СССР // ВК. — 2003. — 27 июня; «Плохое» воспитание Евгении Марковны // ВК. — 2003. — 26 сент.; Витебские нищие // Тамсама; От консерватории до народного училища // ВК. — 2003. — 30 сент.; Ильинская церковь // ВК. — 2003. — 10 окт.; Про то, как витебчане письма писали // ВК. — 2003. — 21 нояб.; Военный оркестр: и марши, и джаз // ВК. — 2003. — 16 дек.; Сюжет для «Фитиля» // ВК. — 2003; Почти Хлестаков // ВК. — 2003; Реконструкция Привокзальной площади // ВК. — 2004. — 13 янв.; «Запретить!» Умами Шариковых руководили Швондеры // ВК. — 2004. — 23 янв.; Фильм. Фильм. Фильм… // ВК. — 2004. — 27 янв.; Троицкая (чёрная) церковь // ВК. — 2004. — 6 фев.; Эсперанто — язык пролетариев // ВК. — 2004. — 2 апр.; Костёл Святого Антония // ВК. — 2004. — 25 мая; Лагерь уничтожения // ВК. — 2004. — 22 июня; Процесс // ВК. — 2004. — 6 июля; Крестообразность времени и судеб // ВК. — 2004. — 13 июля; Июль. Сто лет назад // ВК. — 2004. — № 53. — С. 3; Витебский цирк // ВК. — 2004. — № 59. — С. 4; Витебск. Сентябрь. Сто лет назад // ВК. — 2004. — № 71. — С. 3; Вид с открытки: [капліца ў гонар 50-годдзя ліквідацыі Берасцейскай царкоўнай уніі] // ВК. — 2004. — № 77. — С. 4; Старые дома. Улица Советской Армии, 8, 10 // ВК. — 2004. — № 86. — С. 3; Старые дома. Ленина, 74 // ВК. — 2004. — № 91. — С. 3; Витебские китайцы // ВК. — 2004. — № 92. — С. 3; Всё равно тебя не брошу // ВК. — 2004. — 12 нояб.; Старые дома. Окружной суд // ВК. — 2005. — № 10. — С. 3; Мост // ВК. — 2005. — № 15. — С. 4; Победители и побеждённые // ВК. — 2005. — 11 март.; Старшина — значит старший: [А.М. Голуб] // ВК. — 2005. — № 32. — С. 3; Вид с открытки № 107: [вул. Савецкая] // ВК. — 2005. — № 37. — С. 3; Вокзал // ВК. — 2005. — № 43. — С. 3; Криминальный Витебск: [1920–1930-я] // ВК. — 2005. — № 50. — С. 3; Старые дома: [ул. Чехова, 11] // ВК. — 2005. — № 53. — С. 4; Памятник Ленину // ВК. — 2005. — № 56. — С. 3; «Віцебскі сшытак» // ВК. — 2005. — № 60. — С. 3; Была в Витебске Красная площадь, но без Мавзолея… // ВК. — 2005. — № 63. — С. 3; Улица Кирова // ВК. — 2005. — № 78. — С. 3; Крестьянский поземельный банк // ВК. — 2005. — № 85. — С. 4; Юрьева горка // ВК. — 2005. — № 94. — С. 4.

Літ.: НА ВАКМ. Ф. 931, 1064, 1084, 1098 (1–23); Павлова Е. Собирательница историй: [І. Абрамава] // ВК. — 2001. — № 49. — С. 3; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Абрамава І.А. (27.06.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**АБРАМОВІЧ** ВАЛЕР, гісторык. Цікавіцца гісторыяй і культурай роднага краю. Даследуе падзеі Вялікай Айчыннай вайны на Аршаншчыне, вывучае ўмацаванні часоў Другой сусветнай вайны ў ваколіцах Оршы. На старонках мясцовага перыядычнага друку дыскутаваў з Э.Э. Навагонскім адносна існавання адгалінавання шляху «з вараг у грэкі» па Аршаншчыне.

Тв.: Гіпотэзы і факты: [меркаванне адносна шляху з «варагаў у грэкі»] // ЛП. — 1990. — № 92. — С. 3; Тайна аршанскіх бункераў // ЛП. — 1990. — № 111. — С. 3; А ці можам людзьмі звацца // ЛП. — 1991. — № 28. — С. 3; Сведкі цяжкіх дзён 41-га // ЛП. — 1991. — № 82. — С. 3; А ці быў хлопчык, або Яшчэ раз да пытання аб падземных хадах старажытнай Оршы // АГ. — 1992. — № 121. — С. 3; Орша падземная: [працяг дыскусіі] // АГ. — 1994. — № 2. — С. 3; Каментар спецыяліста: [прадмова да артыкула пра 1812 г.] // АГ. — 1994. — № 11. — С. 3.

**АГНІШЧАНКА** ГЕНАДЗЬ ЦІМАФЕЕВІЧ (5.01.1942, в. Бор Лёзненскага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыў Арджанікідзаўскае ваеннае вучылішча. Служыў ва УС СССР (1960–1985), працаваў інжынерам сувязі (1985–1992), настаўнікам вайсковай падрыхтоўкі ў школах Лёзненскага раёна (1992–1996), намеснікам дырэктара саўгаса (1996–1997).

Даследуе гісторыю падзеяў Вялікай Айчыннай вайны на Лёзненшчыне, гісторыю населеных пунктаў Выдрэйскага с/с Лёзненскага раёна. Вывучаць гісторыю родных мясцін пачаў, калі стаў працаваць у школе. Збіраў успаміны мясцовых жыхароў пра падзеі мінуўшчыны, працаваў у ДАВВ, падтрымліваў адносіны з ВАКМ. Мае ненадрукаваныя працы: «Гісторыя Выдрэі», «Апавяданні аб земляках і мясцінах». Сабраў фотакартатэку славутых землякоў (23 фотаздымкі).

Тв.: Лиозненщина — родина моя // СП (Л). — 1999. — № 31. — С. 2; Старший брат // СП (Л); Командир Красной Армии: [А.П. Жаўненак] // СП (Л). — 2000. — 22 крас. — С. 4; Прошел всю войну: [М.П. Дуброўскі] // СП (Л). — 2000. — 20 чэрв. — С. 3; Партизанский разведчик: [І.І. Міхайлаў] // СП (Л). — 2000. — 1 ліп. — С. 2; Прошедший всю войну: [Г.М. Пагуляеў] // СП (Л). — 2001. — 8 мая. — С. 2; Хранительница памяти: [Ф.В. Вінаградава] // СП (Л). — 2001. — 5 чэрв. — С. 2; Верность: [лёс жанчын, якія страцілі мужэй ў гады вайны] // СП (Л). — 2001. — 22 чэрв. — С. 2; Депутат народа: [М.М. Навуменка] // СП (Л). — 2001. — 7 ліп. — С. 2; Солдат и труженик: [В.Я. Фядосаў] // СП (Л). — 2002. — 23 лют. — С. 2; Тайны Панасекиного леса // СП (Л). — 2002. — 13, 16, 23 ліп.; Жизненные дороги Ивановых // СП (Л). — 2003. — № 49. — С. 2; Край ты мой заброшенный…: [населеныя пункты раёна, якія зніклі] // СП (Л). — 2004. — 17, 21 жніўня; Связал судьбу с геологией. Дмитрий Ефимович Агейченко (1902–1950 гг.) // СП (Л). — 2006. — 28 лют. — С. 2; Нелегкая женская судьба: [В.Ф. Радзевіч] // СП (Л). — 2006. — 8 крас. — С. 2.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Агнішчанка Г.Ц. (3.09.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**АДАМКОВІЧ** АЛЕСЬ (19.08.1977, в. Зорка Шаркоўшчынскага раёна Віцебскай вобл., да 1964 г. в. Сініцы), гісторык, краязнаўца. Скончыў СШ у в. Зорка (1994), геадэзічны факультэт ПДУ (1999), факультэт славістыкі Віленскага педагагічнага ўніверсітэта (2006), магістратуру гэтай жа ВНУ (2008), вучыцца ў дактарантуры на філалагічны факультэце Віленскага ўніверсітэта. Працаваў гал. захавальнікам фондаў, навуковым супрацоўнікам у Культурна-асветным цэнтры імя Я. Драздовіча і ў Музеі мастацтва і этнаграфіі імя Я. Драздовіча ў в. Германавічы (1999–2002). Зараз працуе намеснікам гал. рэдактара літоўскай гіст. газеты «Voruta», а таксама ў газеце «Trakų žemė».

Значны ўплыў на фарміраванне зацікаўленасці родным краем аказалі К. Кожан і А. Райчонак. Працуючы ў КАЦ імя Я. Драздовіча, даследаваў гісторыю і культуру Шаркоўшчыны. Матэрыялы публікаваў у мясцовым перыядычным друку. Разам з А. Райчонак і У. Ляскоўскім падрыхтаваў да друку кнігу «Германавічы», якая прысвечана гісторыі і сучаснасці мястэчка. Распрацаваў пытанні для віктарыны «Ці ведаеш ты свой край?».

Вынікам навучання на факультэце Славістыкі Віленскага педагагічнага ўніверсітэта стала абарона магістарскай дысертацыі на тэму «Стараверы Шаркоўшчыны: сацыялінгвістычны аспект» (2008). Акрамя сацыялінгвістычнай характарыстыкі рэгіёна праца ўключае ў сябе апісанне каляндарных і сямейна-бытавых абрадаў гэтай групы насельніцтва. Трэці раздзел прысвечаны побытавай магіі і народнай міфалогіі стараввераў. Сабраны значны аўдыяматэрыял.

Аўтар некалькіх артыкулаў у гісторыка-культурнай хроніцы «Памяць» Шаркоўшчынскага раёна. Падрыхтаваў да друку дзве кнігі: «Стараверы Шаркоўшчыны», «Германавіцкая і Сцяпанпольская гміны (гісторыя, падзеі, дакументы)» (не выданы). У вольны час працуе ў архівах Вільні, дзе збірае шмат матэрыялаў па гісторыі Дзісненшчыны.

Актыўна супрацоўнічае з Таварыствам беларускай культуры ў Літве. Непрацяглы час супрацоўнічаў з польскай газетай (4 нумары) «Nasz czas», дзе быў адказны за беларускую старонку. Жыве ў Вільні (з 2002).

Тв.: Кніга (разам з У. Ляскоўскім, А. Райчонак): Германавічы. — Паставы: Сумежжа, 2006. — 95 с.

Артыкулы ў навуковым друку і кнізе «Памяць»: Божае слова па-беларуску: [бел. каталіцкія святары, якія спраўлялі набажэнствы па-беларуску за польскім часам на тэрыторыі сучаснага Шаркоўшчынскага раёна] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Шаркоўшчынскага раёна. — Мінск: БелТА, 2004. — С. 122–124; Маліўся за мір і шчасце людское: [І. Бобіч] // Тамсама. — С. 124–125; Ксёндз Браніслаў Хаданёнак: [пераклад з польскай мовы] // Тамсама. — С. 125–126; Падзеі савецка-польскай вайны 1920 г. // Тамсама. — С. 132–133;

Русский фольклор в Шарковщинском районе Витебской области // Fjodorovs F., red. in Memoriam: Эдуард Брониславович Мекш. — Daugavpils: Saule, 2007. — С. 35–38; Долман всё знал…: Мифологизация образа сельского целителя на материале записей из Беларуси и Литвы // Tapatybė kultūrų sankirtoje. — Vilnius:Vilniaus pedagoginis universitetas, 2008. — С. 125–130.

Артыкулы ў перыядычным друку: «Я ўкланіўся Яму…»: [разважанні Я. Драздовіча аб праблемах веры і бязвер'я на матэрыяле дзённікаў] // Наша вера. — 1997. — № 1. — С. 21–24; Святар і пісьменнік: [жыццёвы і творчы шлях беларускага каталіцкага святара Ільдэфонса Бобіча (Пётра Просты)] // Наша вера. — 1999. — № 2. — С. 21–24; Многія прыйдуць пад імем маім // Ave Maria. — 1998. — № 8–9. — С. 24–25; Святар і пісьменнік: [І. Бобіч (Пётра Просты)] // Рунь. — 1999. — № 52. — С. 4; вяртанне // Наша вера. — 2001. — № 2. — С. 21–24; Колькі год Гарадцу?: [вёска ў Шаркоўшчынскім раёне] // НС. — 2001. — № 94. — С. 5; Памяці рыцараў Аршанскае бітвы // Ніва. — 2007. — № 38. — С. 8; Беларусь — вечная ты!!!: [святкаванні 90-годдзя БНР у Вільні] // Ніва. — 2008. — № 14. — С. III; Хведару Нюньку — 80! // Ніва. — 2008. — № 16. — С. 10; Яны захоўваюць беларускі дух. Таварыству беларускай культуры ў Літве — 20! // Ніва. — 2008. — № 16. — С. 5; Стан гаспадаркі ў Ігуменскай воласці ў XIX ст. // КР. — 2000. — № 91. — С. 2; Так гаспадарылі ў мінулым // КР. — 2000. — № 96. — С. 2; Ці ведаеш ты свой край // КР. — 2001. — № 1, 3, 14; А ў той касцёл дарогі няма // КР. — 2001. — № 51. — С. 4.

Выданні на літоўскай мове: Garšva K. Dysnos apskrities lietuviškos kilmės tikriniai vardai: [тапонімы, гідронімы, уласныя імёны літоўскага паходжання ў Дзісенскім павеце] // Acta Baltico-Slavica 30 SOW. — Warszawa, 2006 . — С. 301–310; Vitebsko apskrities lietuviai: [старонкі гісторыі літоўцаў у Віцебскай вобл.] // Voruta. — 2006. — № 21; Vyskupas Jurgis Matulaitis ir baltarusių katalikų bažničia: [віленскі біскуп Юры Матулевіч і яго дзейнасці на карысць беларускага каталіцкага касцёла] // Voruta. — 2007. — № 4; Baltarusijos sostinėje — pamaldos lietuvių kalba: [набажэнствы на літоўскай мове ў Менску] // Voruta. — 2007. — № 8; Lietuviai apleidžia šią žemę palikdami miškus: [гісторыя і сучаснасць літоўцаў вёскі Малькава ў Магілёўскай вобл.] // Voruta. — 2007. — № 12; Armanavičių Romos katalikų parapijai lietuviai: [гісторыя літоўцаў Германавіцкай рыма-каталіцкай парафіі] // Voruta. — 2007. — № 8, 9, 11; Pastave, Baltarusijos globeja: [Маці Боская Будслаўская] // Voruta. — 2007. — № 14; Užmirštuosius Baltarusijos ežerų krašto istorijos puslapius pasklaidžius…: [падарожжа Таварыства беларускай культуры ў Літве на Мядзельшчыну] // Voruta. — 2007. — № 16; Vingiuotais Dysnos keliais: [падарожжы Таварыства беларускай культуры ў Літве на гістарычную Дзісеншчыну] // Voruta. — 2007. — № 20; Kunigas salezietis Bronislavas Chodanionkas: [жыццёвы шлях ксяндза салезіяніна Браніслава Хаданёнка] // Voruta. — 2008. — № 2; Ganytojas ir rašytojas kunigas daktaras Ildefonsas Bobičius: [І. Бобіч] // Voruta. — 2008. — № 3; Gudų kultūros draugijai — 20: [Таварыству беларускай культуры ў Літве — 20 год] // Voruta. — 2008. — № 16.

Творы на польскай мове: Ku czci ks. Adama Stankiewicza: [святкаванні гадавіны з дня нараджэння ксяндза Адама Станкевіча ў Вільні Таварыствам беларускай культуры] // Nasz czas. — 2005. — № 2 (652), 27 stycznia – 9 lutego; Pamięci poety: [Угодкі смерці Масея Сяднёва] // Nasz czas. — 2005. — № 3; 115 rocznica urodzin ks. Ildefonsa Bobicza // Nasz czas. — 2005. — № 3; Kulturna-aśvietnickamu centru imia Jazepa Drazdovicza — 10! // Nasz czas. — 2005. — № 5.

Літ.: Сідарэвіч А. Выдадзена ў Паставах // НН. — 2005. — № 29. — С. 8; Аўтабіяграфія А. Адамковіча (1.09.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**АДАМЯН** ТАЦЦЯНА МІКАЛАЕЎНА (20.10.1962, в. Маляўка Талачынскага раёна Віцебскай вобл.), бібліёграф. Скончыла МДІК (1986). Працавала бібліятэкарам на заводзе «Эвістар» (1986–2000), у рэабілітацыйным цэнтры «Элект» (2000–2002), Віцебскай абласной бібліятэцы (з 2002). Краязнаўчую дзейнасць распачала з прыходам на працу ў сектар краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ВАБ. Значны ўплыў на станаўленне як краязнаўцы аказала Н.В. Курсо. Займаецца складаннем бібліяграфічных выданняў, прысвечаных розным тэмам жыцця Віцебшчыны, персаналіям, якія маюць дачыненне да гісторыі і культуры Віцебшчыны. Складальнік (разам з А.В. Ганчаровай) бібліяграфічных паказальнікаў, якія выдадзены краязнаўчым аддзелам ВАБ: «Жанчыны Віцебшчыны на скрыжаваннях гісторыі», «Гісторыя славутых родаў Віцебшчыны», «П.М. Машэраў», «І.Ф. Хруцкі», «Освобождение Витебщины: путь мужества и славы» і інш. Складальнік «Каляндара знамянальных і памятных дат» на 2003, 2004, 2005 гг. Брала ўдзел у падрыхтоўцы паказальнікаў: «А.М. Падліпскі», «Выданні Віцебскай абласной бібліятэцы».

Тв.: Каляндар знамянальных і памятных дат на 2003, 2004, 2005 гг.; Віцебская вобласць: бібліяграфічны паказальнік 2002, 2003 г.; П.М. Машэраў: бібліяграфічны паказальнік. — Віцебск: ВАБ, 2004. — 14 с.; (разам з А.В. Ганчаровай) Жанчыны Віцебшчыны на скрыжаваннях гісторыі: бібліяграфічны паказальнік. — Віцебск: ВАБ, 2004. — 54 с.; (разам з А.В. Ганчаровай) Гісторыя славутых родаў Віцебшчыны: бібліяграфічны паказальнік. — Віцебск: ВАБ, 2004. — 54 с.; (разам з А.В. Ганчаровай) Іван Фаміч Хруцкі (1810–1885): бібліяграфічны паказальнік. — Віцебск: ВАБ, 2005. — 14 с.; (разам з А.В. Ганчаровай) Освобождение Витебщины: Путь мужества и славы: библиографический указатель. — Витебск: ВОТ, 2005. — 320 с.

Літ.: Інтэрв'ю Т.М. Адамян (24.06.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**АКУНЕВІЧ** ВІКТАР УЛАДЗІМІРАВІЧ (28.09.1956, г. Віцебск), гісторык. Скончыў СШ № 29 г. Віцебска, гіст. факультэт БДУ (1980), аспірантуру пры БДУ (1988). Кандыдат гіст. навук (1989), дацэнт (1993). Працаваў асістэнтам, ст. выкладчыкам, дацэнтам, загадчыкам кафедры гісторыі Беларусі ВДУ (з 1982). Старшыня камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Віцебскім гарвыканкаме ў першай палове 1990-х гг. Член тапанімічнай камісіі пры Віцебскім аблвыканкаме. Член Віцебскага аддзялення Археаграфічнай камісіі Белкамархіва.

Даследуе гісторыю і культуру Віцебшчыны, аддаючы перавагу пытанням грамадска-палітычнага жыцця краю ў першай чвэрці ХХ ст. Аўтар шэрагу артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў навуковым і перыядычным друку.

Тв.: (разам з В.І. Акуневіч) Палітычныя біяграфіі як крыніца вывучэння гісторыі г.Віцебска 1917 г. // Человек, общество, личность: Исторические, философские и экономические аспекты проблемы: тезисы докладов. — Витебск: ВГМИ, 1993. — С. 22–24; (разам з В.І. Акуневіч) Палітычнае становішча ў Віцебску ў час выбараў ва Устаноўчы сход // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: Новыя канцепцыі і падыходы: тэзісы дакладаў і паведамленняў. Ч. 1. Гісторыя Беларусі. — Мн., 1993; Гуманітарная інтэлігенцыя Віцебшчыны ў станаўленні дзяржаўнасці Беларусі на пачатку ХХ ст. // Навука, культура і адукацыя ў развіцці грамадства і станаўленні дзяржаўнасці Беларусі: тэзісы дакладаў. — Мн., 1995; Перыядычны друк Віцебска на пераломе часу: 1917 год // Пісьменства і друк на Віцебшчыне: Гісторыя і сучаснасць: матэрыялы рэгіянальнай навуковай канферэнцыі, 15–16 кастрычніка 1996 г. — Віцебск: Віцебскі дзяржаўны універсітэт, 1996. — С. 12–16; Першы ўсеагульны перапіс насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. як крыніца вывучэння этнічных працэсаў на Віцебшчыне // Беларуска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства. — Віцебск: ВДУ, 1997. — Ч. 1. — С. 9–13; Фарміраванне этнічнай структуры насельніцтва Беларускага Падзвіння // Беларуска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія. — Віцебск: ВДУ, 2000. — С. 130–131; (разам з А.Л. Дзядзінкіным) Этнакультурныя кантакты ў асяроддзі сумеснага пражывання беларускага і польскага этнасу на Віцебшчыне ў канцы ХІХ – ХХ ст. // Беларусь и Европа: Взаимодействие культур. — Витебск: ИЦ ВГУ, 2000. — С. 73–75; (разам з Е.В. Довлатовым) Профсоюзы Витебской губернии в 1921–1924 гг. // Профсоюзное движение на Витебщине: История, опыт, уроки. Витебск, 2000; Профсоюзы Витебщины в середине 20-х – 30-е годы // Тамсама; Гарадское самакіраванне ва ўмовах рэвалюцыйных падзей 1917 г. // История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур: Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности: материалы международной научно-теоретической конференции. — Витебск: ВГУ, 2003. — С. 372–374; (разам з А.Л. Дзядзінкіным, А.М. Дулавым) З гісторыі Віцебскага універсітэта // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. — 2003. — № 4. — С. 3–9; Прафсаюзы Віцебска ў 1917 г.: Паміж дзвюма рэвалюцыямі // Профсоюзы Витебщины: История, теория, практика. Витебск, 2004. — Витебск: МИТСО, 2004; Баі за вызваленне Віцебска // Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, 24 чэрвеня 2004 г. — Віцебск: ВДУ, 2004. — С. 76–80; Оборона Витебска летом 1941-го // Тамсама. — С. 12–17; (разам з Ю. Петуховым) Дакументы віцебскай гарадской управы як гістарычная крыніца // Европа во второй мировой войне: история, уроки, современность. — Витебск: ВГУ, 2005; Віцебскае аддзяленне Белнацкома // Актуальные проблемы новой и новейшей истории Европы и США. — Мн.: БДПІ, 2005; (разам з А.М. Дулавым) Віцебскі пав. у пачатку ХХ ст. // Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І.А. Абрамава [і інш.]; уклад. М.В. Півавар. — Мінск: Паркус плюс, 2008. — С. 101–104; Віцебскі пав. у 1917–1921 гг. // Тамсама. — С. 107–111.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Грунвальд–580. Аднаўленне гістарычнай памяці // ВР. — 1990; (разам з Л. Гудзелевай) Скарбонкі культуры павінны заняць належнае месца ў нацыянальным адраджэнні // ВР. — 1991. — № 193. — С. 2; (разам з М. Пішчулёнкам) Тапанімічная рэвалюцыя на фоне Віцебска // НС. — 1992. — № 16. — С. 4.

Літ.: Акуневіч В.У. // Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава: Падзеі. Людзі. Лёсы / пад рэд. А.У. Русецкага, А.М. Дарафеева. — Віцебск: ВДУ, 1998. — С. 156.

**АКУНЕВІЧ** ВОЛЬГА ІВАНАЎНА (1957), краязнаўца, музейны работнік. Працавала на розных пасадах у ВАКМ, дырэктарам Мастацкага музея ВАКМ.

Даследуе гісторыю і культуру г. Віцебска, аддаючы перавагу вывучэнню пытанняў сацыяльнай адносінаў. Адыграла пэўную ролю ў музейным будаўніцтве Віцебшчыны. Працуючы ў ВАКМ, падрыхтавала экскурсы, падборкі дакументаў на розныя тэмы, усталяванне савецкай улады ў Дзвінску і Дзвінскім уездзе (1983), гісторыя герба г. Віцебска, віцебскі тэатр рэвалюцыйнай сатыры «Теревсат»; усталяванне савецкай улады ў Лепельскім уездзе (1985) і інш. Даследуе тэмы: «Палітычныя партыі на Віцебшчыне кан. ХІХ – пач. ХХ ст.», «Сялянскія і іншыя паўстанні на Віцебшчыне ў 1918 г.», «Ураджэнцы Віцебшчыны — удзельнікі баёў на Халхін-Голе», «Прамысловыя прадпрыемствы г. Віцебска 1917–1941 гг.», «Калгасы Віцебскай вобл. 1926–1941 гг.», «Ажыццяўленне беларусізацыі на Віцебшчыне», «Гісторыя развіцця краязнаўства на Віцебшчыне 1917–1941 гг.», «Віцебская народная кансерваторыя», «Стварэнне першых частак Чырвонай Арміі на Віцебшчыне», «7-ы губернскі з’езд Саветаў», «Паводка ў 1929 г. у г. Віцебск», «Вуліцы Віцебска», «Прадстаўнікі ад

Віцебска на І Усебеларускім з'ездзе» і шэраг інш. Запісала ўспаміны герояў першай пяцігодкі Е.Р. Буланава, В.Г. Латышава.

Арганізатар і ўдзельнік шэрагу міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных канферэнцый краязнаўчай тэматыкі. Аўтар (разам з Т.Н. Касцянюк) камплекта плакатаў «Призванные Октябрем», прысвечанага асобам, якія мелі дачыненне да ўсталявання савецкай улады на Віцебшчыне. Аўтар артыкулаў у навуковым, рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку на краязнаўчую тэматыку.

Тв.: (разам з Т.Н. Касцянюк) Призванные Октябрем. — Витебск: Типография им. Коминтерна, 1987. — 28 л.; У.К. Стукаліч як прадстаўнік «заходне-рускай» плыні ў грамадскай думцы Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. // Беларуска-рускае культурнае ўзаемадзеянне канца XIX – пачатку XX ст.: матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 150-годдзю з дня нараджэння І.Я. Рэпіна і 100-годдзю знаходжання мастака на Беларусі. — Віцебск: Друкарня імя Камінтэрна, 1995. — С. 45–50; Калабарацыя ў Віцебску: Яе асобныя прадстаўнікі // Война известная и неизвестная. — Витебск: Облтипогр., 1995. — С. 88–93; Віцебскі тэатр рэвалюцыйнай сатыры // Зборнік выступленняў на навуковай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю Віцебскай мастацкай школы. — Наваполацк: Наваполацкая друкарня, 1997. — С. 126–128; Из истории Витебского «Теревсата» // Малевич. Классический авангард. Витебск: сборник материалов Международной научной конференции, 12–13 мая 1998 г., г. Витебск. — Мн., 1998. — Вып. 2. — С. 58–66; 1930-е годы — новый, своеобразный период в истории ВОКМ // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею: матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 30–31 кастрычніка 2008 г. / рэдкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. — Мінск: Медысонт, 2009. — С. 214–220.

Артыкулы ў перыядычным друку: Адзін з першых: [М. Зіновіч] // ВР. — 1985. — № 160. — С. 3; Яе звалі Аля: [стаханаўка Г.К. Семянідава] // ВР. — 1985. — № 162. — С. 2; Кімаўка: [Я.М. Дабравольская] // ВР. — 1985. — № 166. — С. 2; Дынастыя: [Сазонавы] // ВР. — 1987. — № 217. — С. 3; Чалюскінцы: [якія жывуць на Віцебшчыне] // ВР. — 1987. — № 236. — С. 4; Іх імёнамі названы вуліцы Віцебска: [І. Каралёў, Ю. Гайдук, В. Чунчын] // ВР. — 1988. — № 40. — С. 3; Ладзілі ў Віцебску вадаправод… // ВР. — 1991. — № 237. — С. 4; Вёрнутыя імёны: [1917 г., г. Віцебск] // Віцьбічы. — 1993. — № 38. — С. 2.

Літ.: НА ВАКМ. Ф. 635, 1064/4, 1112, 1243; Пастернак Т. У хозяйки ратушы забот невпроворот // НС. — 1996. — № 32. — С. 5; Пастернак Т. Хозяйка витебской ратуши // НС. — 2002. — № 144. — С. 5.

**АЛЕНІНА** ТАМАРА АЛЯКСАНДРАЎНА, педагог, краязнаўца. Працуе настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Дзёрнавіцкай СШ. Кіраўнік этнаграфічнага музея пры Дзёрнавіцкай СШ Верхнядзвінскага раёна (1992). Вывучае гісторыю і культуру Верхнядзвіншчыны. Жыве ў в. Дзёрнавічы,

Літ.: Бубала А.Ф. Этнаграфічны музей пры Дзёрнавіцкай СШ // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна. — Мн.: Паліграфафармленне, 2000. — Кн. 2. — С. 323.



**АЛІЕВА** (Біруліна) ВЕРА ІБРАГІМАЎНА (25.05.1957, г. Віцебск), бібліёграф. Скончыла МДІК (1983). Працуе ў ВАБ на розных пасадах (з 1975). Краязнаўчую дзейнасць распачала ў 1991 г. у аддзеле беларускай і краязнаўчай літаратуры. Значную ролю ў фарміраванні напрамкаў краязнаўчых даследаванняў аказала Н.С. Кітовіч. Даследуе гісторыю і культуру Віцебшчыны, займаецца вывучэннем персаналій мастакоў Віцебшчыны.

Тв.: Золотые звезды Витебщины: рек. список литературы. Вып. 5. — Витебск: ВОБ, 1982. — 5 с.; Памятники славы и бессмертия Витебщины. — Витебск: ВОБ, 1985. — 30 с.; Мастак-акварэліст: Творчасць І.М. Сталярова. — Віцебск: ВАБ, 1986. — 4 с.; Сучасныя мастакі Віцебшчыны: бібліяграфічны слоўнік. — Віцебск: ВАБ, 1994. — 133 с.



**АЛЯКСЕЕЎ** ЛЕАНІД ВАСІЛЬЕВІЧ (15.01.1921, г. Растоў-на-Доне – 22.03.2008), савецкі і расійскі гісторык, археолаг. Доктар гіст. навук (1982). Скончыў гіст. факультэт МДУ (1948). Вучыўся ў аспірантуры Інстытута гісторыі АН БССР (1950–1952). Працаваў гал. захавальнікам фондаў у Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі (1948–1950), Інстытуце археалогіі АН СССР (з 1953). Выкладаў археалогію ў МгДПІ (1962–1966).

Практычна ўсе археалагічныя зацікаўленасці тычыліся Полаччыны і Смаленшчыны. Кандыдацкае даследаванне «Полоцкая земля в IX–XIII вв.» прысвечана гісторыі Полаччыны ў старажытнасці. На аснове матэрыялаў дысертацыі была выдадзена праца «Полацкая зямля (Нарысы гісторыі Паўночнай Беларусі IX–XIII стст.)» (1966). Працягам яе стала даследаванне




«Полацкая зямля» (1975). Краязнаўчую накіраванасць мае кніга «По Западной Двине и Днепру в Белоруссии» (1974).

На працягу шэрагу гадоў праводзіў раскопкі на Віцебшчыне: два гады на Браслаўшчыне, дзевяць гадоў — у Друцку, шаснаццаць — у Мсціслаўлі, Віцебску. Меў добрыя стасункі з кіраўніцтвам ВАКМ, адміністрацыяй горада, віцебскімі краязнаўцамі, асабліва М. Рыўкіным.

Даследаваў гісторыю беларускай археалогіі і гістарычнага краязнаўства. Праводзячы раскопкі, вывучаў таксама гісторыю археалогіі, архітэктуры, мастацтва і краязнаўства даследуемых рэгіёнаў. На аснове атрыманых матэрыялаў выдаў кнігу «Археология и краеведение Беларуси, XVI в. – 30-е годы XX в.» (1996). Выданне ажыццяўлялася пры фінансавай падтрымцы ВАКМ. Кніга дапрацавана і перавыдадзена ў сааўтарстве з В.П. Багданавым у 2009 г.

Аўтар дзясяткаў артыкулаў у мясцовым і рэспубліканскім перыядычным друку, у якіх закранаюцца пытанні гісторыі і культуры Віцебшчыны. Часта друкаваўся на старонках бюлетэня «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі».

У 1950-х гадах адшукаў 19 негатываў на шкле, якія зрабіў штатны фатограф імператарскай археалагічнай камісіі І. Чысцякоў. На іх, напрыклад, былі зафіксаваны здымкі некаторых Барысавых камянёў, крыж Еўфрасінні Полацкай і інш. Усе негатывы маюць надзвычайную каштоўнасць, бо ў 1930-я гады здымкі былі знішчаны. Адыграў пэўную ролю ў прызнанні 974 г. як года легендарнага заснавання Віцебска княгіняй Вольгай.

Падтрымаў даследчыка Міколу Ермаловіча ў час афармлення ім беларускай нацыянальнай гістарычнай канцэпцыі.

Тв.: Кнігі: Полоцкая земля IX–XIII вв.: Очерки истории Северной Белоруссии. — М.: Наука, 1966. — 295 с.; По Западной Двине и Днепру в Белоруссии: Дороги к прекрасному. — М.: Искусство, 1974. — 143 с.; Смоленская земля в IX–XIII вв.: Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии. — М.: Наука, 1980. — 261 с.; Смоленская земля в IX–XIII вв. — М., 1986; Археология и краеведение Беларуси, XVI в. – 30-е годы XX в. — Мн.: Бел. наука, 1996. — 206 с.; Западные земли домонгольской Руси. — М.: Наука, 2006. — Кн. 1. — 289 с. —Кн. 2. — 165 с.; Полоцкая земля. — Полоцк: А.И. Судник, 2007. — 50 с.; (разам з В.П. Багданавым) Западные земли домонгольской Руси в историко-археологическом осмыслении / Л.В. Алексеев, В.П. Богданов; Ин-т археологии РАН; МГУ им. М.В. Ломоносова. — М.: Наука, 2009. — 336.

Артыкулы ў навуковым друку: Лазарь Богша — мастер-ювелир XII в. // Сов. археология. — 1957. — № 3. — С. 224–244; Археологические памятники эпохи железа в среднем течении Западной Двины // Труды ПОКЭ. — Т. 1. — М., 1959. — С. 273–315; Раскопки древнего Браслава // КСИА. — 1962. — Вып. 81. — С. 95–106; На Замкавай гары // Маладосць. — 1962. — № 1; Друцк // СИЭ. — Т. 5. — М., 1964. — С. 388–389; Некоторые вопросы исторической географии Северной Белоруссии. — Мн., 1966. — С. 257–258; Раскопки в Друцке // АО-1965. — 1966. — С. 168–169; Очерк истории белорусской дореволюционной археологии и исторического краеведения до 60-х гг. XIX в. // Сов. археология. — 1967. — № 4; Белорусская археология и историческое краеведение в XIX — начале XX в. // Сов. археология. — 1968. — № 3. — С. 85–100; О распространении топонимов «Межа» и «Рубеж» в Восточной Европе // Славяне и Русь. К 60-летию Б.А. Рыбакова. — М., 1968. — С. 245–250; О работах в древнем Друцке и его округе // АО-1967. — 1968. — С. 236; Вяртаючы народу мінулыя стагоддзі… // Полымя. — 1969. — № 12. — С. 189–200; Крыж Ефрасінні Полацкай // Маладосць. — 1969. — № 7. — С. 143–148; Гогалеўская Беларусь // Полымя. — 1971. — № 12. — С. 203–214; (разам з Б.А. Рыбаковым) Калі быў заснаваны Віцебск // ПГіКБ. — 1972. — № 2. — С. 79; Віцебская даўніна // Маладосць. — 1972. — № 12. — С. 143–149; Старажытны Друцк // ПГіКБ. — 1973. — № 3. — С. 16–23; Полоцкая земля // Древнерусские княжества X–XIII вв. — М., 1975. — С. 202–239; Старажытны Браслаў // ПГіКБ. — 1978. — № 4. — С. 37–40; Таленавіты даследчык Беларусі // ПГіКБ. — 1980. — № 1. — С. 12–14; Пачатак вывучэння помнікаў // ПГіКБ. — 1984. — № 4. — С. 32–33; Из истории формирования южных феодальных центров Полоцкой земли: Минск и Друцк // История и археология Полоцка и Полоцкой земли. К 1125-летию Полоцка. — Полоцк, 1987. — С. 3–5; Горад на Друці // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна. — Мн.: БелСЭ, 1988. — С. 34–40; (разам з Н. Шыраевай) Першы беларускі антраполаг: [К. Ікаў] // ПГіКБ. — 1988. — № 1; Игнатий Кульчинский — первоисследователь белорусских древностей // Древности славян и Руси. К 80-летию Б.А. Рыбакова. — М., 1988. — С. 100–105; Судьбы археологии и исторического краеведения Белоруссии и Смоленщины в 20-е – 30-е гг. XX в. // Сов. археология. — 1990. — № 4. — С. 241–262; Е.Ф. Канкрин и история открытия «Борисовых камней» // Сов. археология. — 1991. — № 2. — С. 256–265; Преподобная Евфросинья Полоцкая: Жизнь, деятельность, судьба // Вестник Белорусского Экзархата. — 1995. — № 1. — С. 33–48; Домонгольская архитектура Полоцкой земли в историческом осмыслении // РА. — 1996. — № 2. — С. 96–110; (разам з Т. Макаравай, Н. Кузьмічом) Крест — хранитель всея вселенныя: История создания и воссоздания Креста преподобной Евфросинии, игумении Полоцкой // Спецвыпуск. — № 15. — Мн., 1996; «Менскія дрыгавічы» і полацкія князі // БГЧ. — 1996. — № 4. — С. 80–87; Минск и Друцк // Славяне и их соседи: К 70-летию Э.М. Загорульского. — Мн., 1998. — С. 10–19; Княжеское строительство полоцких князей XI–XII вв. // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкая зямлі: матэрыялы III Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 21–23 красавіка 1997 г., Полацк. — Полацк, 1997. — С. 8–20; Древний Друцк. Письменные источники, топография, время возникновения: К празднованию тысячелетия Друцка // РА. — 2002. — № 1.; Друцк в XII–XVI вв.: Общие вопросы истории памятника // РА. — 2002. — № 2.

Літ.: Ткачоў М.А. Аляксееў Л.В. // ЭГБ. Т. 1. — Мн., 1993. — С. 111; Штыхаў Г. Аляксееў Леанід // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Полацка. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 805–806; Карлюкевіч А. У скарбонку полацказнаўства // КГ. — 2007. — № 27 (188). — С. 1; Богданов В.П. Леонид Васильевич Алексеев // Полоцкая земля / Л.В. Алексеев; вступ. ст. Л.Ф. Данько, А.И. Судник. — Полоцк: А.И. Судник, 2007. — С. 46–58; Перечень опубликованных работ Л.В. Алексеева // Тамсама. — С. 49–51.

**АМБРАЗЕВІЧ** ЛЮДМІЛА МІКАЛАЕЎНА (30.07.1958, в. Іскра Віцебскага раёна), педагог, краязнаўца. Скончыла філал. факультэт ВДПІ (1981). Працуе настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў СШ № 7 г. Віцебска (з 1981). Краязнаўствам пачала займацца ў 1990 г. пад уплывам і кіраўніцтвам А.В. Куржалава з мэтай далучэння дзяцей да вывучэння і захавання спадчыны роднага краю. Збірае матэрыялы, якія маюць дачыненне да гісторыі, этнаграфіі, літаратуры, музыкі г. Віцебска і яго наваколля. Даследуе жыццё і дзейнасць Б.І. Эпімаха-Шыпілы. Перадала шэраг сабраных матэрыялаў (у тым ліку з архіваў г. Мінска) у школьны музей Ветрынскай СШ (Полацкі раён). Разам з вучнямі бярэ ўдзел у Рэспубліканскай экспедыцыі «Наш край», у конкурсах, якія ладзяцца ВАААППДіП. Укладальніца кнігі «Квітней, мой горад над Дзвіною», у якой сабрала літаратурныя творы, у якіх згадваецца Віцебск (2000, 2003). Кніга падрыхтавана і выдадзена намаганнямі аўтара пры падтрымцы ВАААППДіП.

Тв.: Квітней, мой горад над Дзвіною: зборнік твораў пра Віцебск / уклад. Л.М. Амбразевіч. — Віцебск, 2000. — 192 с.
Літ.: Патроліна Н. Літаратурны вянок малой радзіме // ВК. — 2002. — № 96. — С. 4.

**АМОСАЎ** УЛАДЗІМІР ВАСІЛЬЕВІЧ (18.01.1955, г. Полацк), педагог. Скончыў Наваполацкае музычнае вучылішча па класе баяна (1975), факультэт журналістыкі Варонежскага дзяржаўнага ўніверсітэта (1984). Працуе дырэктарам дзіцячай школы мастацтваў у в. Ветрына Полацкага раёна (з 1978).

Даследуе архітэктуру правінцыйных гарадоў Віцебшчыны, гісторыю і архітэктуру дваранскіх сядзіб, генеалогію шляхецкіх родаў Полаччыны, гісторыю адукацыі Полацкага краю, музычную, мастацкую культуру Беларусі XIX–XX ст. Сабраў значную колькасць матэрыялаў самай рознай тэматыкі, сярод якіх каштоўная інфармацыя, якую атрымаў ад відавочцаў-старажылаў (збіраць звесткі пачаў яшчэ з 1978 г.). Штогод выязджае на месцы, дзе знаходзіліся дваранскія сядзібы, дзе праводзіць візуальную разведку, апытанне мясцовых старажылаў, добраўпарадкаванне. Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку, якія друкаваліся ў газетах «НН», «Наша слова».

Ініцыятар і арганізатар правядзення музычных конкурсаў «Шляхецкая сядзіба». Арганізаваў выставу «Ветрынская кераміка», выставы вучняў школы мастацтваў у Віцебску, Полацку.

Цікавіцца артыстычнай культурай Беларусі. Знаўца сусветнай класічнай музыкі, тэатра, выяўленчага мастацтва. Займаецца жывапісам. Асабістыя выставы экспанаваліся ў Віцебску, Полацку, Варонежы, Маскве. Жыве ў Наваполацку.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Амосаў У.В. (16.01.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**АНАПРЫЕНКА** ФРЫДРЫХ АЛЯКСАНДРАВІЧ (*Радзімір Міхайлаў, Елена Светломирова*) (2.08.1939, ст. Ілавайск Данецкай вобл.), краязнаўца. Скончыў Мішневіцкую СШ Сіроцінскага раёна, Ульскае вучылішча механізацыі с/г (1957), Гарадоцкі тэхнікум (1976), вячэрні ўніверсітэт марксізму-ленінізму (1967, г. Замакееўскі Данецкай вобл.). Працаваў ва ўстановах культуры, на шахтах Данбаса (1960–1971). Вярнуўся на Шуміліншчыну. Працаваў у будаўнічай арганізацыі, быў арганізатарам ПМК № 101, сакратаром партарганізацыі, старшынёй райкама ДТСААФ (1975–1988).

Вывучае гісторыю, культуру, прыроду Шумілінскага раёна. Цікавіцца пачаў з дзяцінства, але асэнсавана збіраць легенды, паданні роднага краю пачаў, калі вярнуўся з Данбаса на пастаяннае месца жыхарства ў Шуміліна. На новы ўзровень збіральніцкай працы перайшоў, калі пачаў працаваць старшынёй Шумілінскага раённага аддзялення ДТСААФ. Разам з выкананнем прафесійных абавязкаў праводзіў вялікую грамадскую, пошукавую і краязнаўчую працу. Так, пэўны час з'яўляўся

кіраўніком пошукавага аддзела «Памяць» пры Шумілінскім раённым аддзеле ДТСААФ. Сабраў шмат звестак сярод мясцовага насельніцтва пра месцы знаходжання савецкай і нямецкай ваеннай тэхнікі (самалётаў, танкаў), падбітай у часы вайны, і склаў карту. Разам са спартыўна-тэхнічным клубам «Чайка» (Мінск) удзельнічаў у пад'ёме самалёта Як-1, збітага каля в. Стрэшава Шумілінскага раёна ў 1943 г. (1983). Стаў адным з ініцыятараў усталявання у памяць падзей Вялікай Айчыннай вайны самаходна-артылерыйскай установкі (САУ-2) у в. Мішневічы Шумілінскага раёна, гарматы ў г.п. Шуміліна, будаўніцтва некаторых помнікаў савецкім салдатам і добраўпарадкавання воінскіх могілак часоў Вялікай Айчыннай вайны (Алеі Герояў у г.п. Шуміліна, помніка двум невядомым савецкім салдатам каля шашы Віцебск–Полацк). Выяўляў імёны асоб, якія атрымалі званне Герояў Савецкага Саюза пры вызваленні Шуміліншчыны (106 асоб), стаў адным з ініцыятараў і арганізатараў сустрэчы гэтых людзей у Шуміліна ў 1980-я гг.




Сабраў значную колькасць прадметаў матэрыяльнай культуры па гісторыі Шуміліншчыны, сярод якіх каменныя сякеры, ядры, ночвы, жорны і інш. Сабраў і захоўвае ў прыватным архіве значную колькасць фотаздымкаў, аўтабіяграфій, успамінаў мясцовых жыхароў пра падзеі Вялікай Айчыннай, лісты з фронту, перапіску з ветэранамі, якія ваявалі на Шумілiншчыне. Браў удзел у падрыхтоўцы кнігі «Памяць» Шумілінскага раёна. Вялікая колькасць матэрыялаў была выкарыстана і апублікавана пад прозвішчамі іншых аўтараў. Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку, у якіх адлюстроўваліся падзеі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі раёна, лёсы землякоў, ветэранаў войнаў, хроніка абаронча-масавай работы і добраўпарадкаванне помнікаў, прысвечаных падзеям 1941–1944 гг. на Шумілiншчыне. Выклікаюць цікавасць сабраныя ім матэрыялы пра асілкаў, людзей незвычайнай фізічнай сілы, якія жылі ў родным краі ў мінулым.

Перадаў значную частку калекцыі ў Мінскі краязнаўчы рэспубліканскі музей, матэрыялы пра шумілінцаў – удзельнікаў італьянскага руху Супраціўлення — у музей Вялікай Айчыннай вайны.

Сваёй актыўнай папулярызатарскай і асветніцкай дзейнасцю паўплываў на фарміраванне цікавасці да гісторыі і культуры роднага краю некаторых сучасных краязнаўцаў Шумілiншчыны і аматараў даўніны (А.Л. Бычкова, В.В. Улюценка).

Склаў карту валуноў Шумілiншчыны. Валодае інфармацыяй пра размяшчэнне найбольш шануемых камянёў на тэрыторыі раёна, напрыклад, пра камень-следавік каля в. Мішневічы Шумілінскага раёна з выявамі слядоў Багародзіцы і чорта.

У прыватнай сядзібе ў в. Мішневічы Шумілінскага раёна стварыў парк камянёў «Каменны сад». На плошчы 0,5 га змяшчаюцца некалькі соцень камянёў. З іх выкладзены кампазіцыі, у асноўным на рэлігійныя тэмы, сюжэты легендаў і паданняў Шумілiншчыны. Апрацоўвае камяні і робіць з іх скульптурныя кампазіцыі, напрыклад, камень-сэрца, камень-мядзведзь, камень-качка і інш.

Цікавіцца філасофіяй касмізму, вучэннем М. Рэрыха. Стварыў музей «Воінства Хрыстова» («Сэрца Данка»), у якім адлюстраваў свае погляды на жыццё, сваю сістэму светаўспрымання. Паслядоўнік вучэння Парфірыя Іванова. Займаецца папулярызацыяй агратурызму. Па матэрыялах Ф. Анапрыенкі створаны DVD-дыск (захоўваецца ў прыватным архіве).

Паэт. Аўтар вершаў, у якіх творча перапрацоўвае легенды і паданні роднага краю, падзеі гісторыі, прыродную спадчыну. Сярод іх адзначым прысвечаныя обальскаму падполлю, Вялікаму каменю, Маланкінай гары. Разам з А.В. Міхеевым напісаў «Песню пра Шуміліна».

Узнагароджаны граматамі ЦК ДТСААФ БССР, СССР.

Тв.: Баявое хрышчэнне: [М.С. Зайцаў] // ГС. — 1980. — 12 жніўня; Удзельнік парада Перамогі: [В.І. Усціна ў] // ГП. — 1982. — 23 лют.; Бой на світанні: [Ф.Я. Мішчанка] // ГП. — 1982. — 22 крас.; Народны заступнік: [А.Н. Афанасьеў] // ГП. — 1982. — 20 ліст.; Бяроза Фядота Сяргушкіна // ГП. — 1983. — 27 студз.; Удзельнікі парада Перамогі // ГП. — 1983. — 22 лют.; Вахта Памяці не скончыцца ніколі // ГП. — 1983. — 31 мая; Памятная запіска С.М. Будзённага: [падарунак Сіроцінскай СШ] // ГП. — 1983. — 14 ліп.; (разам з У. Нарушэвічам) На мяжы партызанскай зоны // ГП. — 1983. — 17 ліст.; Цаной жыцця свайго: [С. Дзянісава] // ГП. — 1983. — 21 снеж.; Партыі радавы: [П.В. Сцяпанаў] // ГП. — 1984. — 1 студз.; Нязлоўная Ася: [С.Я. Арцем'еў] // ГП. — 1984. — 3 студз.; Узнагароды ветэрана: [Іван з. в. Шчарбакі Шумілінскага раёна пасадзіў бярозавы гай у памяць усіх Іванаў, якія загінулі на вайне] // ГП. — 1984. — 23 лют. — С. 3; Паходня мужнасці вялікай // ГП. — 1984. — 22 сак.; «І мёртвыя мы будзем жыць…»: [У. Батакоў] // ГП. — 1984. — 12 крас.; Салдацкая памяць: [Р.Д. Белы] // ГП. — 1984. — 12 мая; Іванаў чай: [І.К. Іваноў] // ГП. — 1984. — 7 чэрв.; Загад адзін — уперад! // ГП. — 1984. — 23 чэрв.; Создаем летопись славы // Советский патриот. — 1984. — 24 чэрв.; Пайшоў

хлопчык на вайну: [В.В. Дзямідаў] // ГП. — 1984. — 21 ліп.; Два байцы // ГП. — 1984. — 28, 31 ліп.; Слова аб мужнасці: [В. Улюценка] // ГП. — 1984. — 25 жніўня; Тайна дзвюх бяроз // ГП. — 1984. — 2 кастр.; Ля сцен Ленінграда: [С. Маслюкоў, С. Хмыльнікаў] // ГП. — 1985. — 19 студз.; Па загаду сэрца: [Ю.А. Цярэня] // ГП. — 1985. — № 7. — С. 3; Паданні аб Шумілішчыне // ГП. — 20, 24 жніўня; Вайна і хлеб: [М. Глушакоў] // ГП. — 1985. — № 9, 11; Памяць сэрца: [С.Г. Сокалава] // ГП. — 1985. — № 30. — С. 3; Ля сцен Ленінграда // ГП. — 1985. — № 39. — С. 3; З баявога задання не вярнуліся // ГП. — 1985. — № 55; Шумилино чтит героев // Знамя Победы: газета северной группы войск. — 1985. — 13 чэрв.; Трое у парадного расчёта // Знамя победы. — 1985. — 16 ліп.; Героі не паміраюць // ГП. — 1989. — № 74–76; Парад Перамогі // ГП. — 1990. — 9 мая; «З легендаў і казак былых пакаленняў»: [паданне пра назву в. Валатоўкі Шумілінскага раёна] // ГП. — 1994. — № 16. — С. 3; Пра пана Заблоцкага і яго мыла // ГП. — 1994. — № 18–19. — С. 3.

Літ.: Уладзіміраў В. Доўгая дарога праз вайну // ГП. — 1988. — 8 сак.; Кавалеўскі С. Мішневічы // НС. — 2001. — 28 снеж. — С. 5; Мароз М. «Што ёсць ісціна» // ГП. — 2005. — № 71. — С. 7; Улюценка У. Даведка на Ф.А. Анапрыенка (2.02.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**АНІСОВІЧ** ЛАРЫСА ЭДУАРДАЎНА (21.03.1964, г. Орша Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыла СШ № 6 г. Оршы (1981), гіст. факультэт МДПІ (1987). Працавала настаўнікам гісторыі ў СШ № 11 г. Оршы (1986–1999), метадыстам аддзела краязнаўства, кіраўніком краязнаўчага гуртка ў аршанскім цэнтры дзіцяча-юнацкага турызму і экскурсій (1999–2008). У СШ № 11 кіравала Музеем славы выпускнікоў школы. Да вывучэння гісторыі роднага краю далучылася працуючы ў школе. Значны ўплыў аказала Т.М. Вароніна.

У межах выканання працоўных абавязкаў ажыццяўляла метадычную дапамогу школьным музеям Оршы. З'яўлялася адным з арганізатараў дзіцячых «Аршанскіх чытанняў», на якіх абараняліся навуковыя працы. Ажыццяўляла метадычнае кіраўніцтва падрыхтоўкай школьнікаў да ўдзелу ў I Рэспубліканскім праваслаўным фестывалі. Разам з Ю. Копцікам уклала зборнік «Легенды і паданні Аршаншчыны», а з Т.М. Воронінай выданне «Орша — город интересный».

Тв.: Легенды і паданні Аршаншчыны / уклад. Л. Анісовіч. — Орша: Цэнтр імя Філона Кміты, 2004. — 61 с.; (разам з Т.М. Воронінай) Орша — город интересный: путеводитель по древней Орше. — Мн., 2008. — 12 с.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Анісовіч Л.Э. (19.04.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.




**АНІСЬКОВІЧ** АЛЯКСАНДР УЛАДЗІМІРАВІЧ (5.04.1972, г. Калінінград, РФ), мастак, краязнаўца. Скончыў мастацка-графічны факультэт ВДУ (1994). Працуе дызайнерам вонкавай рэкламы, дырэктар фірмы «Сангор».

Даследуе архітэктурную спадчыну Віцебшчыны. Удзельнічае ў грамадскім жыцці вобласці, аддаючы перавагу ахове помнікаў гісторыі і культуры. Цікавіцца гісторыяй сваёй малой радзімы (в. Лявонпаль Міёрскага раёна) пачаў з дзяцінства, пад уплывам бацькоў. Пад час навучання ва ўніверсітэце пад уплывам мастака і настаўніка А. Мемуса пачаў рабіць жывапісную і графічную рэканструкцыю архітэктурных аб'ектаў. Значны ўплыў на фарміраванне зацікаўленасці да гісторыі архітэктуры малой радзімы аказаў пісьменнік, краязнаўца, старшыня таварыства «Беларусь–Латвія», ураджэнец Лявонпаля С. Панізьнік. З 1998 г. пачаў даследаваць гісторыю і культуру Міёршчыны і Дрысеншчыны (Верхнядзвіншчыны).

Актыўны прапагандыст сваёй малой радзімы ў друку і мастацтве. Браў удзел у мастацкім культурна-гістарычным праекце маладых мастакоў Полаччыны, пленэры «У пошуках Атлантыды», які ладзіўся ў былым м. Лявонпаль (2005), а таксама ў выставах, якія ладзіліся па выніках праекта ў Полацку (Дзіцячая мастацкая школа, 2005, ВАКМ, 2006). Па матэрыялах гэтага пленэра выдаў сваім коштам буклет «Лявонпаль: маладыя мастакі». Перадаў шэраг матэрыялаў ў «Музей Радзімазнаўства» («Хата бабкі Параскі») у в. Лявонпаль. Зрабіў выкшталцоныя шыльды для гэтага музея і яго філіяла «Хата бабкі Ядзвінні».

Аўтар некалькіх культурных праектаў, сярод якіх «Помнікі гісторыі нашай Радзімы», у якім асэнсоўвае ролю, якую адыгрывала наваколле ў шляху «з варагаў у грэкі», помнікі Лявонпальшчыны: палац, будынкі касцёла, калона ў гонар Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Падрыхтаваў буклет «Лявонпаль — былое і сучаснае».

Аўтар і выканаўца праекта «Рака расказвае гісторыю» (частка інтэрнацыянальнага праекта «Дзвіна–Даўгава»), які прысвечаны культурна-гістарычнай спадчыне роду Лапацінскіх у Прыдзвінскім краі (маёнткі ў Лявонпалі, Росіцы і Сар'і). На аснове друкаваных крыніц і матэрыялаў, атрыманых у экспедыцыях, аналізуецца і прапагандуецца матэрыяльная і духоўная спадчына Прыдзвіння, звязаная з дзейнасцю славутага роду. Цікавасць выклікае

графічны рад праекта: у ім прадстаўлены шэраг малюнкаў, фотаздымкаў, зробленых у розныя часы, рознымі аўтарамі, расцярушаных па розных выданнях, калекцыях, музейных зборах, інтэрнэт-сайтах, якія складана знайсці недасведчанаму чалавеку. Асаблівую каштоўнасць прадстаўляюць выкананыя аўтарам графічныя рэканструкцыі Лявонпальскай сядзібы, палацу і яго частак, храмаў (касцёла ў Росіцы, Троіцкай царквы і сінагогі ў Лявонпалі). Па матэрыялах праекта стварыў кампакт дыск, на якім пісьмовыя і графічныя дакументы прадстаўлены ў электронным выглядзе. У межах праекта «Дзвіна–Даўгава» распрацаваў турыстычную карту-схему «Скрытые драгоценности».



Аўтар цыклу карцін, прысвечаных помнікам гісторыі і культуры родных мясцін: «Свята-Троіцкая царква ў Лявонпалі», «Лявонпальскі палац Лапацінскіх», «За Дзвіною іншая дзяржава» (прысвечана мемарыяльнай калоне ў гонар Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г.). Напісанню кожнага твора папярэднічае грунтоўная праца ў бібліятэках, архівах, з матэрыяламі краязнаўцаў. Кожная выява суправаджаецца вялікім артыкулам, у якім аналізуецца гістарычная сітуацыя, на фоне якой паўстаў той ці іншы помнік, мастацкая каштоўнасць, вызначаюцца асаблівасці і адметныя рысы прадстаўляемага аб’екта, прэзентуецца аўтарскае разуменне гісторыка-культурнай каштоўнасці ў агульнагістарычным, беларускім і мясцовым аспекце.

Некалькі разоў на год арганізуе экспедыцыі па Прыдзвінні, у якіх вывучае гісторыка-культурную спадчыну краю, праводзіць яе фотафіксацыю.

Мае нявыдадзеныя працы: «Невядомыя Дзёрнавічы» (2005); «Лявонпаль — былое і сучаснае: альбом архітэктурных рэканструкцый, замалёвак, фотадакументаў» (2007); «Спіс цікавых месцаў Верхнядзвіншчыны»; «Спіс цікавых месцаў Міёршчыны»; «Страчаныя плады райскага месца»; «Гісторыя Росіцкага касцёла»; «Лявонпаль. Ілюстраваная гісторыя мястэчка»; «Кароткі нарыс архітэктурнай спадчыны Лапацінскіх Прыдзвінскага краю: Росіца, Сар’я, Барадзінічы».

Перадаў некаторыя матэрыялы ў Музей радзімазнаўства ў в. Лявонпаль Міёрскага раёна, краязнаўчы музей СШ № 3 г. Міёр, раённыя бібліятэкі г. Верхнядзвінска і Міёр, Віцебскую абласную бібліятэку. Падтрымлівае кантакты з мясцовымі краязнаўцамі і мастакамі: С. Панізьнікам, Ф. Сіўко, А. Бубалай, Г. Загурскай, В. Ермалёнкам, Л. Хмяльніцкай, В. Шчасным і інш.

Тв.: Лявонпаль і маладыя мастакі. — Віцебск: Копіцэнтр, 2006. — 40 с.; Нечаканае адкрыццё // МН. — 2007. — № 66. — С. 3; Помнік гісторыі НАШАЙ радзімы // МН. — 2008. — № 15. — С. 4; Скрытые драгоценности. Схема Лявонпаля. — 2008; Ілюстраваная гісторыя мястэчка: [электронны рэсурс]. — 2008 // Асабісты архіў М.В. Півавара.

Літ.: Казакевіч З. У пошуках Атлантыды // ВП. — 2006. — № 9. — С. 2; Скарбы музея радзімазнаўства // НС. — 2006. — № 141. — С. 3; Перыферыя? Не, глыбінка // ЛіМ. — 2008. — № 5. — С. 14; Танін П. Рэха пленэру // МН. — 2007. — № 68. — С. 5; Панізнік С. У чароўным люстэрку Памяці // МН. — 2008. — № 15. — С. 4; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Аніськовіч А.У. (красавік 2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**АНУФРЫЕЎ** ВІКТАР АНТОНАВІЧ (2.01.1932, в. Будзянка – 18.05.2006), педагог, краязнаўца. Жыў у в. Заполле Віцебскага раёна. Скончыў гіст. факультэт МгДПІ (1956) (па інш. звестках — гіст. факультэт БДУ, 1959). Працаваў настаўнікам, нам. дырэктара, дырэктарам Задуброўскай СШ і Запольскай школы Віцебскага раёна.

Даследаваў гісторыю партыз. руху ў Віцебскім, Лёзненскім і Суражскім раёнах. Сабраў багаты матэрыял па гісторыі роднага краю: шэраг важных дакументаў, фотаздымкаў, лістоў, узнагарод, уласных рэчаў партызан. Асабіста вёў перапіску з кіраўнікамі партыз. руху ў гады вайны ў Віцебскім і Суражскім раёнах: М.П. Шмыровым, Р.У. Шкрэда, М.М. Бальшаковым, М.Ф. Біруліным і інш. Вынікам збіральніцкай працы стала стварэнне Музея Першай Беларускай партызанскай брыгады, які быў адчынены ў былым доме выканкама Запольскага с/с Віцебскага раёна (1968). Пры адкрыцці новай школы ў в. Заполле экспазіцыя была пэўным чынам перапрацавана і працягвала сваё існаванне ў выглядзе музея пры Запольскай СШ (1976). У 1985 г. быў адкрыты аддзел «Працоўная слава». Цяпер мае назву «Музей народнай славы».

Даследаваў гісторыю народнай гаспадаркі роднага краю, станаўленне савецкай улады, правядзенне калектывізацыі, аднаўленне і развіццё эканомікі пасля вайны. Аўтар шэрагу

артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку. Кіраваў працай краязнаўчага гуртка, праводзіў паходы па месцах баявой славы. Аказаў значную дапамогу пры ўзвядзенні памятнага знака «Віцебскія/Суражскія вароты».

Выдатнік народнай асветы (1979).

Тв.: Шлях доўгі і гераічны: [334-я Віцебская дывізія] // ЛПр. — 1985. — № 38. — С. 2; Камісар: [Р.У. Шкрэда] // ЛПр. — 1986. — № 140. — С. 3; Камбрыг: [М.П. Шмыроў] // ЛПр. — 1986. — № 152. — С. 3; Камбрыгмінаевец: [Я.З. Захараў] // ЛПр. — 1987. — № 35. — С. 3; Мінулае і сучаснае калгаса «Расія» // ЛПр. — 1987. — № 128. — С. 2; 100-гадовы юбіляр: [В.Ф. Фёдараў] // ЛПр. — 1988. — № 1. — С. 3; Партызанскі аэрадром // ЛПр. — 1989. — № 10. — С. 3; Аўтарытэт настаўніка // ЛПр. — 1989. — № 37. — С. 2; Гісторыя без «белых плямаў» // ЛПр. — 1989. — № 79. — С. 2; Байцы Вялікай Айчыннай // ЛПр. — 1991. — № 17. — С. 2; Чалавек з легенды: [М.П. Шмыроў] // ЛПр. — 1991. — № 99. — С. 2; У цяжкі час: [М.П. Шмыроў] // ЛПр. — 1991. — № 106. — С. 2; Навечна ў памяці народнай // ЛПр. — 1991. — № 108. — С. 2; Першая вёска: [в. Цімахі Суражскага раёна — першы населены пункт БССР, вызвалены савецкімі войскамі ў 1942 г.] // ЛПр. — 1992. — № 9. — С. 2; Партызаны Еўдакімавы: [в. Заполле] // ЛПр. — 1992. — № 18. — С. 2; Супраць мірнага насельніцтва: [карныя экспедыцыі] // ЛПр. — 1992. — № 24. — С. 2; Землякі: [удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны] // ЛПр. — 1992. — № 37. — С. 2; Раней за Сураж // ЛПр. — 1993. — № 80. — С. 2; З варожага тылу — на фронт // ЖП. — 1994. — № 89. — С. 2; З кагорты смельчакоў // ЖП. — 1994. — № 96. — С. 2; Мои земляки // ЖП. — 1997. — № 15. — С. 3; Евдокия // ЖП. — 1997. — № 18. — С. 2; Суражские ворота «Батьки Миная» // ЖП. — 1997. — № 45. — С. 2; Стефан // ЖП. — 1997. — № 46. — С. 2; Поп Иван: [гісторыі пра свяшчэнніка] // ЖП. — 1997. — № 56. — С. 2; Заполье: От князей до батьки Миная // ЖП. — 1997. — № 67. — С. 2; Кісель: [быль] // ЖП. — 1997. — № 68. — С. 2; Колхозные маяки. Греет ли свет былой славы // ЖП. — 1997. — № 94. — С. 2; Ануфриев: [Бацька Мінай] // ЖП. — 1998. — № 28. — С. 2; Местный Кулибин // ЖП. — 1998. — № 99. — С. 2; Жил в Папоротно Куприянович: [Ганчароў] // ЖП. — 1999. — № 24. — С. 2; Освобождение // ЖП. — 1999. — № 50. — С. 2; А первыми были Тимохи // ВР. — 1999. — № 73. — С. 2; Батька Минай. Страницы «мирной» биографии: [гісторыя пасля вайны. Сустрэча са Сталіным, абкурак і Сталін] // ЖП. — 1999. — № 93. — С. 3, 4; Встреча с волчицей: [аўтабіяграфічныя падзеі] // ЖП. — 1999. — № 93. — С. 2; Старший матрос Галеев // ЖП. — 2000. — № 15. — С. 2; Наш земляк — генерал Асташенко: [суражанін] // ЖП. — 2000. — № 27. — С. 2; Таццяна: [выпадак у 1942 г.] // ВР. — 2000. — № 30. — С. 3; Судьба человека: [В.М. Шлыкаў] // ЖП. — 2000. — № 30. — С. 2; У могилы патриотов: [І. Клімянкоў, В. Странчанка, загінулі ў 1942 г.] // ЖП. — 2000. — № 39. — С. 2; Мастер: [В. Дзмітрачэнка] // ЖП. — 2001. — № 2. — С. 3; Хозяин полей: [аграном М. Дзмітрачэнка] // ЖП. — 2001. — № 7. — С. 2; В тылу врага: [Н.І. Дарафеенка] // ЖП. — 2001. — № 35. — С. 2; Так родилась бригада: [1-я Беларуская партыз. брыгада] // ЖП. — 2001. — № 39. — С. 3; В боях за «Суражские ворота» // ЖП. — 2001. — № 57. — С. 2; У истоков отряда Батьки Миная // ЖП. — 2001. — № 54. — С. 2; Легендарный Батька // ЖП. — 2001. — № 99. — С. 4; Сураж: 60 лет назад // ЖП. — 2002. — № 11. — С. 2; Как генерал Власов стал предателем // ЖП. — 2002. — № 25. — С. 2; Встречали красноармейцев: [вызваленне Суража] // ЖП. — 2003. — № 17. — С. 2; Партизанский край воспитывал патриотов // ЖП. — 2003. — № 26. — С. 2; Тот памятный день: [вызваленне Суража] // ЖП. — 2003. — № 47. — С. 2; Подвиг рядового: [Герой Савецкага Саюза А.І. Кароткаў] // ЖП. — 2003. — № 50. — С. 2; Весной 44-го: [аднаўленне гаспадаркі раёна] // ЖП. — 2004. — № 33. — С. 3; Поединок // ЖП. — 2004. — № 34. — С. 2; Смекалка выручила в бою // Тамсама.

Літ.: Краязнаўцы Віцебскага раёна // Памяць: Віцебскі раён: Гісторыка-дакументальная хроніка / уклад. У.І. Мезенцаў. — Мн.: Маст. літ., 2004. — С. 723; Гаравая А. В.А. Ануфрыеў — настаўнік гісторыі і краязнаўца // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 18–19 чэрвеня 2009 г. / ВДУ; рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. — Віцебск: ВДУ, 2009. — С. 305–308.



**АНЦІПАЎ** КАНСТАНЦІН МІКАЛАЕВІЧ (10.10.1937, г. Вольск Саратаўскай вобл.), краязнаўца. Скончыў ваеннае авіяцыйнае вучылішча (1959), гіст. факультэт БДУ. Служыў ва УС СССР (1956–1986, з іх 1959–1974 у ЧБВА). Пражывае ў Варонежы.

Даследуе жыццё і дзейнасць славутых асоб, лёс якіх звязаны з Полаччынай. На фарміраванне цікавасці да гісторыі Полаччыны аказаў уплыў С.М. Глушкоў. Вывучае жыццёвы шлях генерала Я.П. Кульнева. Правёў значную працу па папулярызацыі імя рускага адмірала XVIII ст. І.А. Паваліпшына, пахаванага ў сваім былым маёнтку ў в. Янкавічы Расонскага раёна. Удзельнік краязнаўчых экспедыцый на Полаччыне (2003–2007): браў удзел у вывучэнні могілак у в. Янкавічы; у экспедыцыі, прысвечанай даследаванню радавога склепу Паваліпшыных у в. Янкавічы Расонскага раёна (2004); па месцах баёў 1915 г. каля в. Круляўшчызна (2005); у в. Быкаўшчына (2005), гісторыка-археалагічнай экспедыцыі «Туржэц-1». У сваёй дзейнасці актыўна супрацоўнічае з гіст. факультэтам ПДУ, Міжнароднай асацыяцыяй грамадскіх пошукавых аб’яднанняў «Народная память о защитниках Отечества».

Аўтар кнігі, прысвечанай дынастыі Кульнёвых, а таксама артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў перыядычным друку. Актыўна займаецца пошукавай дзейнасцю. З’яўляўся

начальнікам штаба грамадскага пошукавага клуба «Брыг» у г. Варонежы, які займаецца пошукам зніклых без звестак воінаў у гады Вялікай Айчыннай вайны (1987–1995, 1998–2003). Адзін з арганізатараў правядзення Вахт Памяці і пошукавых экспедыцый на тэрыторыі былога СССР. Браў удзел у стварэнні экспазіцый, прысвечаных адміралу Павалішыну ў СШ в. Янкавічы, сельскім савеце в. Янкавічы, Расонскім музеі, краязнаўчым музеі і школах Варонежа. Некаторыя матэрыялы перадаў у розныя музеі РФ, Музей беларускага кнігадрукавання ў Полацку.

Узнагароджаны 13 медалямі СССР, РФ, Мангольскай народнай рэспублікі.

Тв.: Кнігі: Кульневы — славная династия. — Воронеж, 2008. — 69 с.

Артыкулы ў перыядычным друку: Старажытныя храмы Полацка // ПВ. — 1998. — № 97. — С. 3; (разам з С.М. Глушковым) Илларион Афанасьевич Повалишин // ГлРс. — 2004. — 20 крас. — С. 2; (разам з В. Скоп) Семья Повалишиных // ГлРс. — 2005. — № 76. — С. 2; (разам з С.М. Глушковым) Семья Повалишиных // ГлРс. — 2006. — 27 верас. — С. 2; (разам з С.М. Глушковым) Новое о Повалишиных // ГлРс. — 2006. — 4 жніўня. — С. 2; (разам з С.М. Глушковым) Новое о Повалишиных // ГлРс. — 2006. — № 62. — С. 2.

Літ.: Інтэрв'ю з С.М. Глушковым (31.07.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Анціпаў К.М. (9.08.2008) // Тамсама.



**АРКУШ** АЛЕСЬ (*Васіль Кроква, А.К.*, сапр. Аляксандр Барысавіч Козік) (28.05.1960, г. Жодзіна), пісьменнік, журналіст. Скончыў аддзяленне аўтатрактарнага электраабсталявання Жодзінскага палітэхнікума (1979), планава-эканамічны факультэт БДІНГ (1987). Працаваў канструктарам на Беларускім аўтамабільным заводзе (1981), інжынерам на Наваполацкім заводзе «Вымяральнік» (1987–1988); карэспандэнтам у газеце «Знамя новостройки» Наваполацкага будтрэста № 16 (1988–1996), карэспандэнтам газеты «Витебский курьер М» (1996–2006). Стваральнік Таварыства вольных літаратараў (1993). Уваходзіў у літаратурную суполку «Тутэйшыя». З 1987 г. жыве ў Полацку.

З дзяцінства любіў краязнаўчыя кнігі. У малодшыя школьныя гады хадзіў у краязнаўчы гурток ў Жодзіне, пры Палацы культуры Смалявіцкай ДРЭС. Значны ўплыў на фарміраванне краязнаўчых зацікаўленняў аказаў Г. Каханоўскі.

Займаецца даследаваннямі гісторыі Жодзіна, Полацка, а таксама гісторыяй беларускай літаратуры. Аказаў дапамогу ў стварэнні гарадскога музея ў Жодзіне. Браў удзел у шэрагу краязнаўчых канферэнцый, якія праводзіў Полацкі дзяржаўны музей-запаведнік. Удзельнічаў у літаратуразнаўчых канферэнцыях, якія праводзіліся ПДУ, дзе выступаў з дакладамі па гісторыі літаратурнага руху Полаччыны. Удзельнічаў у шэрагу канферэнцый у Познані, дзе чытаў даклады пра гісторыю замежных (скандынаўскіх і польскіх) уплываў на Полаччыну і пра пазацэнзурны друк Полаччыны ў 80–90 гг. XX ст. Аказаў дапамогу ў зборы матэрыялаў па беларускім пазацэнзурным друку канца XX ст. і па гісторыі літаратурнага таварыства «Тутэйшыя». Падтрымліваў адносіны з ГА «Дыярыюш».




Асвятляе ў СМІ гісторыю Полацка. Аўтар шэрагу артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку: у часопісах «Дзеяслоў», «Arche», «Калосьсе», «Правінцыя», газетах «НН», «Витебский Курьер М». Напісаў шэраг эсэ, у якіх рознабакова асвятляецца гісторыя і культура Полаччыны. Некаторыя з іх надрукаваны ў кнізе «Аскепкі вялікага малюнку». У часопісе беларусаў Беласточчыны «Правінцыя» (выйшла толькі 2 нумары) надрукаваў матэрыял пра гісторыю непадцэнзурнага друку Віцебшчыны. Атрымаў прэмію за матэрыялы па гісторыі Полацкага аэрадрома. Аўтар тэксту гімна горада Полацка і песень для шэрагу рок-гуртоў: «Мясцовы час», «RIMA».

Аўтар успамінаў пра дзіцячыя гады ў Жодзіне, якія павінны выйсці у кніжнай серыі «Кнігарня “Нашай нівы”». Аўтар дзесяці зборнікаў паэзіі і двух зборнікаў эсэістыкі. Выдаваў літаратурны альманах «Ксэракс беларускі». Заснавальнік, выдавец і гал. рэдактар літаратурнага альманаху «Калосьсе» (часопіс Таварыства вольных літаратараў, заснаваны ў 1993 г., выйшла 11 нумароў). Захоўвае архіў Таварыства. Старшыня арганізацыйнага камітэта літаратурнай прэміі «Гліняны Вялес».

Тв.: Кнігі: Аскепкі вялікага малюнку. — Мн.: І.П. Логвінаў, 2007. — 136 с.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Пад покрывам натоўпу // Выбар. — 1993. — № 27. — С. 3; Праца яго ўяўлення: [А. Аблажэй] // ВК. — 1997. — № 2. — С. 8; Яго абяцалі вярнуць ў Наваполацк у «варанку»: [У. Арлоў] // ВК. — 1997. — № 22. — С. 3; Вучань Віленскай гімназіі: [П.М. Лаўрычонак] // ВК. — 1997. — № 31. — С. 3; Полоцк. Каким ты был, таким ты будешь? // ВК. — 1997. — № 60. — С. 3; У сённяшніх вандалаў былі добрыя настаўнікі: [могілкі Полацка] // ВК. — 1997. — № 61. — С. 2; Працяг традыцый «Полацкага штомесячніка»: [«Веснік ПДУ»] // ВК. — 1997. — № 63. — С. 2; Двина — река трех стран // Тамсама. — С. 3; Западня: [апошнія гады Я. Купалы] // ВК. — 1998. — № 22. — С. 3; Скандал, спрятаный в архивную папку // ВК. — 1998. — № 25. — С. 3; Полоцкие староверы — поморская ветвь // ВК. — 1998. — № 36. — С. 3; Хворы на беларускую літаратуру: [Л. Вашко] // ВК. — 1998. — № 49. — С. 2; Фотокор: [А. Васечка] // ВК. — 1998. — № 83. — С. 3; Сысці з мёртвага дому: [С. Дубавец] // ВК. — 1999. — № 4. — С. 3; Сімптомы полацкага неакансерватызму: [выстава] // ВК. — 1999. — № 6. — С. 4; Полацк і скульптура // ВК. — 1999. — № 10. — С. 4; Крыж Еўфрасінні Полацкай і КДБ // ВК. — 1999. — № 15. — С. 3; История из первых уст // ВК. — 1999. — № 63. — С. 3; Конец «кухонной демократии»: [С. Сокалаў-Воюш] // ВК. — 1999. — № 65. — С. 3; Жыла ў Полацку паэтка — Ганна Брэсцкая // ПВ. — 2000. — № 9. — С. 4; Студентка педтехникума: [В.В. Няміра] // ВК. — 2000. — № 13. — С. 3; Из глубины веков: [музычны фестываль] // ВК. — 2000. — № 28. — С. 3; Дзень музеяў // ВК. — 2000. — № 38. — С. 3; Пацярпелі за веру: [рэц. на кнігу «Полацкія пакутнікі»] // ВК. — 2000. — № 59. — С. 3; Памятник установили, но страсти не улеглись: [Еўфрасінні Полацкай] // ВК. — 2000. — № 75. — С. 3; Полоцк развивается по азиатскому типу: [С. Палякоў] // ВК. — 2000. — № 82. — С. 4; На пошукі Палатыды: [Лучайскі манастыр каля Полацка] // ВК. — 2001. — № 46. — С. 3; У Полацк вяртаюцца крывічы: [помнік крывічам] // ВК. — 2001. — № 80. — С. 3; Віртуальны сабор: [Св. Стэфана ў Полацку] // ВК. — 2002. — № 11. — С. 3; Асуджаны без суда: [Бр. Пяткевіч, што выратаваў С. Новікава-Пяюна] // ВК. — 2002. — № 33. — С. 3; Тайны полоцких подземелий // ВК. — 2002. — № 37. — С. 3; Археолог обращается к президенту: [С. Тарасаў, у сувязі з падрыхтоўкай «Дажынак»] // ВК. — 2002. — № 42. — С. 3; Полоцкие клады // ВК. — 2002. — № 62. — С. 2; Археологи на глубине XI века: [Полацк] // Тамсама. — С. 3; Деревня городского типа: [Бігосава] // ВК. — 2002. — № 80. — С. 4; Магістар віртуальнай справы: [А. Храпавіцкі] // ВК. — 2002. — № 81. — С. 3; Трудолюбивая Двина // ИП. — 2003. — № 40. — С. 6; На Полотчине появились свои медиа-магнаты // ВК. — 2003. — № 8. — С. 4; Старажытны малюнак вярнуўся ў Полацк: [малюнак на берасце, знойдзены археолагам Г.В. Штыхавым] // ВК. — 2003. — № 14. — С. 4; Забота — нуждающимся: [яўрэйскі культурны цэнтр у Полацку] // ВК. — 2003. — № 29. — С. 3; У Полацку з'явіўся помнік ТВЛ: [Таварыству вольных літаратараў] // ВК. — 2003. — № 39. — С. 4; Курс — классический университет: [ПДУ, рэктар Д. Лазоўскі] // ВК. — 2003. — № 43. — С. 4; Легенда Полацкай зямлі: [В. Ластоўскі] // ИП. — 2003. — № 46. — С. 6; «Родина» в трещинах: [кінатэатр у Полацку] // ВК. — 2003. — № 55. — С. 3; Холмики памяти: [пахаванні] // ВК. — 2003. — № 73. — С. 4; Беги, вода моей Двины, куда велят мальчишек сны // ВК. — 2003. — № 78. — С. 3; Вяртанне забытага імя: [Г. Брэская, паэтка 1920-х гг.] // ВК. — 2003. — № 83. — С. 3; Лявон Баршчэўскі застаецца педагогам // ВК. — 2003. — № 100. — С. 3; Сорак гадоў таму памёр Янка Журба // ВК. — 2004. — № 1. — С. 3; Аналогов в мире нет: [вынаходнік М. Міхайлаў] // ВК. — 2004. — № 22. — С. 3; Свято-Покровский храм возродился: [Полацк] // ВК. — 2004. — № 80. — С. 3; Полоцкий колледж потерял независимость // ВК. — 2004. — № 94. — С. 3; 100 лет полоцкому футболу // ВК. — 2005. — № 31. — С. 4; Сагановіч знайшоў кнігу XVI стагоддзя пра Полацк // ВК. — 2005. — № 52. — С. 3; Всеслав Чародей пока останется в макете: [варыянт помніка ў Полацку] // ВК. — 2005. — № 56. — С. 3; Вернулся ли Груббер в Полоцк? // ВК. — 2005. — № 65. — С. 3; Заполотье // ВК. — 2005. — № 70. — С. 3; Аўтар гімна — з Бабынічаў: [Б. Пяткевіч і С. Новікаў-Пяюн] // ВК. — 2005. — № 82. — С. 3; Парк на высечку?: [п. Ветрына, У.В. Амосаў] // ВК. — 2005. — № 86. — С. 4; Строительство Полоцкой ГЭС откладывается // ВК. — 2005. — № 91. — С. 3; Сьпіс полацкіх невядомасцяў // ARCHE. — 2009. — № 4. — С. 356–364.

Літ.: Аркуш Алесь: [электронны рэсурс] // Wikipedia: электронная энцыклапедыя. — 2005. — Рэжым доступу: http://be-x-old.wikipedia.org/wiki/; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Аркуш Алесь (15.08.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**АРЛОЎ** ВАЛЯНЦІН МІКАЛАЕВІЧ (14.05.1928 (па пашпарце 1929), в. Калышкі Лёзненскага раёна Віцебскай акругі), краязнаўца, педагог. Скончыў Чыгуначную СШ г. Віцебска (1948), маторабудаўнічы факультэт Казанскага авіяцыйнага інстытута (1955). Пасля размеркавання працаваў на Рыбінскім авіяматорным заводзе (1955–1959), у выпрабавальным канструктарскім бюро генеральнага канструктара У.А. Дабрыніна (1958–1966) у тым жа горадзе. У 1966 г. пераехаў у Віцебск, дзе працаваў выкладчыкам супрамату, прыкладной механікі, дэталяў машын у Віцебскім тэхналагічным інстытуце лёгкай прамысловасці (1966–1996), метадыстам у аддзеле беларусазнаўства і краязнаўства ВАААППДіП. Мае актыўную грамадскую пазіцыю. Удзельнік руху ў абарону беларускай мовы (доўгі час займаў пасаду старшыні Віцебскай гарадской рады ТБМ), член БДТАПГіК. Адзін з актыўных членаў клуба ў абарону помнікаў архітэктуры «Узгор'е» (1986–1991).

У дзяцінстве сям'я часта пераязджала з месца на месца, бо бацька працаваў у наркамаце земляробства. З маленства цікавіўся мінулым месцаў, дзе прыходзілася жыць. Пад час пражывання ў Рыбінску вандраваў па наваколлях, даследаваў гісторыю і культуру рэгіёну

(гарады Яраслаўль, Кастрама, Растоў Вялікі, Угліч). Калі навучаўся і працаваў у РСФСР, наведваў бацькоў, якія пражывалі ў Віцебску, і звярнуў увагу на тое, што ў Расіі стаўленне да помнікаў гісторыі і культуры інакшае, чым у БССР. У РФ цэрквы, старасвецкія будынкі збольшага не нішчыліся, а выкарыстоўваліся пад музеі, жылыя ці складскія памяшканні. У БССР жа помнікі мінуўшчыны знішчаліся. Воблік Полацка, Віцебска на працягу 1950–1960-х гг. мяняўся не ў лепшы бок. Амаль адсутнічала літаратура па гісторыі беларускіх гарадоў і мястэчак, хаця шмат якія з іх з'яўляліся больш старажытнымі за населеныя месцы паўночна-ўсходняга рэгіёну Расіі. З пераездам на радзіму працягваў вандроўкі, толькі цяпер рабіў падарожжы Беларусі. Звярнуў увагу на занядбанне беларускай мовы. Стаў цікавіцца гісторыяй мясцовасці, збіраць любую інфармацыю, якой, аднак, было вельмі мала.

З пачаткам палітыкі перабудовы ўзніклі новыя магчымасці. Ушчыльную заняўся гісторыяй мовы, гісторыяй Беларусі. Асноўнымі кірункамі дзейнасці сталі беларуская мова, ахова архітэктурнай спадчыны, экалагічны стан горада і навакольляў.

З дазволу адміністрацыі тэхналагічнага інстытута арганізаваў гурткі, дзе абмяркоўваліся пытанні гісторыка-культурнай праблематыкі. На аматарскіх пачатках вёў факультатыў, на якім чытаў лекцыі па гісторыі, культуры, экалогіі Віцебска і ваколіц, ладзіў экскурсіі па горадзе і яго наваколлях. У тэхналагічным інстытуце зрабіў стэнд «Знішчаныя і захаваныя помнікі гісторыі і культуры Віцебска». На ім экспанавалася карта г. Віцебска з адзначанымі на ёй помнікамі даўніны, іх здымкамі, каментарамі да іх.

Даведаўшыся пра стварэнне клуба падтрымкі рэстаўрацыі «Узгор'е», стаў яго актыўным удзельнікам, членам праўлення. Браў удзел у раскопках, якія ладзілі археолагі В.М. Ляўко, Л. Калядзінскі, М. Ткачоў і інш. Выступаў з паведамленнямі на пасяджэннях клуба. У канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. цесна супрацоўнічаў з віцебскім абласным камітэтам ЛКСМБ. Сумесна выпрацоўваліся планы аднаўлення гісторыка-культурнай спадчыны горада і вобласці (у межах дзейнасці камсамола). Дзякуючы падтрымцы арганізацыі, ажыццявіў шэраг турыстычна-краязнаўчых вандровак па Віцебшчыне, Беларусі.

Актыўная дзейнасць, якую праводзіў В.М. Арлоў, супала з аднаўленнем цікавасці шырокіх слаёў насельніцтва горада да беларускай мовы, гістарычнай спадчыны. Па запрашэнні Д. Сімановіча, які працаваў рэдактарам на абласным тэлебачанні, зрабіў шэраг перадач, прысвечаных абароне беларускай мовы, гісторыка-культурнай спадчыне горада. Былі падрыхтаваны і некалькі цыклаў перадач і на абласным і гарадскім радыё. Па шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын выступленні ў мас-медыя спыніліся да 1996 г.




На пачатку 1990-х гг. стаў актыўна ўдзельнічаць у палітычным жыцці Віцебска. Узначальваў суполку Народнага фронту «Адраджэнне» ў ВДТІ. Уваходзіў у грамадзянскую камісію па экалогіі пры гарвыканкаме. Браў удзел у грамадскіх форумах і палеміцы па пытаннях беларускай мовы і гістарычнага лёсу беларускай нацыі з грамадскай арганізацыяй «Славянскі сабор», культурна-асветніцкай арганізацыяй «Русь».

У канцы 1990-х гг. працаваў метадыстам у краязнаўчым аддзеле ВАААППДіП. Распрацаваў шэраг метадычных парад па складанні радаводу і правядзенні турыстычна-краязнаўчых вандровак.

Удзельнік рэспубліканскіх і рэгіянальных канферэнцый, дзе выступаў з паведамленнямі на краязнаўчую тэматыку. Аўтар кнігі «Каляды ў народнай міфалогіі», шэрагу артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку на тэму абароны мовы, помнікаў гісторыі і культуры, экалогіі Віцебшчыны. Мае прыватны архіў. Частка матэрыялаў аформлена і падрыхтавана да друку.

Тв.: Кніга: Каляды ў народнай міфалогіі. — Віцебск, 2004. — 16 с.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Ратуша на Духавой гары // ВР. — 1990. — № 226. — С. 4; Аб этнагенезе беларусаў // Выбар. — 1991. — № 6. — С. 7; Роздум пасля з'езда ТБМ // ВР. — 1991. — № 134. — С. 4; У памяці Грунвальд // ВР. — 1991. — № 137. — С. 4; За бацькам Мураўёвым?: [статус бел. мовы] // НС. — 1992. — № 22. — С. 5; Аб мове і іншым // ВК. — 1992. — № 33. — С. 6; Ці ведае чытач? // Віцьбічы. — 1993. — № 62. — С. 2; Чаму ў беларусаў мова беларуская // Віцьбічы. — 1993. — № 120, 124, 145; У вытокаў: [славянства] // Выбар. — 1993. — № 7. — С. 7; Народ, гісторыя, культура // Выбар. — 1993. — № 8. — С. 3; «Княжанні», гарады, Полацкая зямля // Выбар. — 1993. — № 15. — С. 7; Бітва пад Іванскам // Выбар. — 1994. — № 1, 2; Ганебна адчуваць сябе падпольным беларусам // ВК. — 1998. — № 47. — С. 3.

Літ.: Кадушка В. Валянцін Арлоў: «Беларуская мова перанесла шмат выпрабаванняў» // НС. — 1996. — № 10. — С. 4; Інтэрв'ю В.М. Арлова (вясна 2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**АРЛОЎ** УЛАДЗІМІР АЛЯКСЕЕВІЧ (25.08.1953, г. Полацк), краязнаўца, пісьменнік. Скончыў гіст. факультэт БДУ (1975). Працаваў настаўнікам гісторыі ў СШ № 3 г. Наваполацка (1975), супрацоўнікам (карэспандэнтам, заг. аддзела, намеснікам рэдактара) Наваполацкай гарадской газеты «Химик» (1976–1986), рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» ў Мінску (1988–1997), потым на самастойнай творчай працы.

Краязнаўчую дзейнасць распачаў у студэнцкія гады. Займаецца даследаваннем гісторыі г. Полацка і Полаччыны. Аўтар шэрагу артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку. Найлепшым краязнаўчым даследаваннем, прысвечаным роднаму краю, можна лічыць кнігу «Таямніцы полацкай гісторыі» (1994, 2001). На высокім навуковым і мастацкім узроўні апісваюцца розныя старонкі гісторыі і культуры Полаччыны. Аўтар сцэнарыяў дакументальных фільмаў «Ефрасіння Полацкая» (1989), «Беларускія матывы» (1990). Пераклаў на беларускую мову кнігу М. Улашчыка «Была такая вёска» (1989).




Актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця краіны і Полаччыны ў прыватнасці. Адзін з арганізатараў гісторыка-культурнага аб'яднання ў дапамогу рэстаўрацыі і археалагічным раскопкам «Маладзік» у Полацку, полацкай філіі БНФ «Адраджэнне», якія паўсталі ў канцы 1980-х гг. Удзельнік навуковых канферэнцый, літаратурных чытанняў і сустрэч. Перадаў некаторыя дакументы, кнігі і частку рэчаў у Музей беларускага кнігадрукавання, Полацкі краязнаўчы музей, Музей Я. Драздовіча ў в. Германавічы Шаркоўшчынскага раёна, гісторыка-этнаграфічны музей ў в. Гудзевічы Мастоўскага раёна Гродзенскай вобл. і інш. Некаторыя рукапісы перадаў у Полацкі занальны архіў. Падтрымлівае кантакт з шэрагам дзяржаўных і грамадскіх арганізацый у Беларусі і за мяжой.

Член Саюза беларусіх пісьменнікаў (1986). Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (1991), выдавецкай прэміяй імя У. Караткевіча (1993), літаратурнай прэміяй імя Ф. Багушэвіча ПЭН-цэнтру (1996), прэміяй імя Барыса Кіта (2004).

Тв.: Кніга: Таямніцы Полацкай гісторыі. — 2-е выд. — Мн.: Полымя, 2002. — 464 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Полацкія кадэты // Спадчына. — 1993. — № 1. — С. 28–40; Alma mater Polocensis // БМ. — 1996. — № 3. — С. 66–70.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Выток нашай памяці // ВР. — 1987. — № 171. — С. 4; Alma mater Polocensis // Спадчына. 1999. — № 2. — С. 30–73; Перліна Полацкага дойлідства: [Спаская царква] // СК. — 1989. — № 129. — С. 3; Вяртаецца гістарычная памяць. Да выхаду першага нумару часопіса «Спадчына» // СК. — 1989. — № 161. — С. 3; Хто выкраў крыж Еўфрасінні? // НС. — 1991. — № 12, 13; Вяртанне святыні: [Еўфрасіння Полацкая] // НС. — 1991. — № 39. — С. 4–5; Хто выкраў крыж Еўфрасінні // ПВ. — 1991. — № 58, 59, 65; Пад уладаю Перуна і Сварога // ПВ. — 1992. — № 59–64; Таямніцы полацкай гісторыі // НС. — 1992. — № 89, 92, 95, 101; Тайна крыжа Еўфрасінні // ВР. — 1993. — № 11, 17; Якім ён быў, Леў Сапега? // НС. — 1997. — № 85. — С. 6; Полацкія лабірынты // Навіны. — 1999. — 12 сак. — С. 6; Забытая alma-mater // Навіны. — 1999. — 26 сак. — С. 6.

Літ.: Сціплы полацкі архіварыус: [У. Арлоў] // БМ. — 1996. — № 3. — С. 63; Патролина А. У чаканні залатога веку: [У. Арлоў] // ВК. — 2001. — № 9. — С. 3; Конышева Н. Владимир Орлов: «XXI столетие должно стать золотым веком для Беларуси» // ВК. — 2001. — № 56. — С. 3; Філімонава Т. На полацкай зямлі яшчэ шмат таямніц // ПВ. — 2002. — № 33. — С. 2; Арлоў Уладзімір // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Полацка. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 784; Каленік А. Радзіма маёй душы // ПВ. — 2003. — № 95–96. — С. 8; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Арлоў У.А. (9.02.2007) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**АРЦІМОВІЧ** СТАНІСЛАЎ ІОСІФАВІЧ (13.03.1897, в. Орцы Дзісненскага пав., цяпер Міёрскі раён – 14.01.1974), мастак, краязнаўца. Скончыў двухкласнае народнае вучылішча. Разам з бацькамі жыў у Санкт-Пецярбургу (1910–1920), вучыўся на курсах малявання пры Акадэміі мастацтваў. Пасля грамадзянскай вайны вярнуўся на Міёршчыну, працаваў у гміне, дзе складаў планы, схемы, карты.

Вывучаў родны край. Запісваў мясцовыя легенды, паданні, склаў нарыс па гісторыі Міёршчыны (неапублікаваны). З 1944 г. жыў у Польшчы.

Літ.: Арцімовіч С.І. // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Міёрскага раёна. — Мн.: Бел. навука, 1998. — С. 525.



**АРЭХ** МІКАЛАЙ УЛАДЗІМІРАВІЧ (9.09.1971, в. Жоўніца Шаркоўшчынскага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца, педагог. Скончыў гіст. факультэт МгДПІ. Працуе настаўнікам гісторыі ў Гуцкай СШ Пастаўскага раёна. Збірае і апрацоўвае матэрыял па гісторыі месца пражывання: вёскі Гута, Галбейшчына. Стварыў краязнаўчы музей у Гуцкай СШ. Аўтар гісторыка-геаграфічнага нарыса «Гута-Голбія» падрыхтаванага разам з І. Пракаповічам.

Тв.: (разам з І. Пракаповічам) Гута-Голбія: Гісторыка-геаграфічны нарыс Галбейскага краю. — Мн.: Кнігазбор, 2007. — 88 с.



**АСВЯЦІНСКІ** ГЕРАЛЬД БАЛЯСЛАВАВІЧ (23.01.1932, п. Ялізава Магілёўскай вобл. – 12.05.2006), краязнаўца. Скончыў юрыдычны факультэт БДУ (1955), Дзяржаўны інстытут тэатральнага мастацтва ў Маскве. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1967). Працаваў на камсамольскай і савецкай рабоце на Гродзеншчыне, начальнікам упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, дырэктарам Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа ў Віцебску (1965–1992), дырэктарам Беларускага тэатра «Лялька» (1993–2002).

Удзельнічаў у краязнаўчым руху Віцебшчыны. Браў актыўны ўдзел у працы Віцебскага абласнога аддзялення БДТАПГіК. Выконваў абавязкі старшыні праўлення Віцебскага абласнога краязнаўчага аб'яднання (1990–1994). Аказваў значную падтрымку краязнаўчым суполкам і краязнаўцам-аматарам праз арганізацыю аўтобусных паездак на канферэнцыі, экскурсіі, у вандроўкі. Аўтар артыкулаў і брашур, у якіх асвятляў свае меркаванні адносна абарончых збудаванняў Віцебшчыны ў раннім сярэднявеччы.

Тв.: Абарончыя сістэмы старажытнай Полаччыны: [саматуж. выд.]. — Віцебск, 2002; Некаторыя версіі са старажытнай гісторыі Полацкай зямлі. Абарончыя сістэмы старажытнай Полаччыны: [саматуж. выд.]. — Віцебск, 2003. — 19 с.; Непаўторны мой край, або Хто абароніць Рубаўскую сістэму? // ВР. — 1989. — № 42. — С. 4.

Літ.: Валодзька Г. Краязнаўцы Паазер'я — яднайцеся // ВР. — 1991. — № 65. — С. 3; Ганчароў У. Гэтае імя трэба было б занесці ў кнігу рэкордаў Гінэса // ВР. — 1992. — № 11. — С. 4; Памяці Геральда Асвяцінскага // НС. — 2006. — № 56. — С. 8.

**АСІНОЎСКІ** СВЯТАСЛАЎ МАРКАВІЧ (*Алесь Соніч*, *Алесь Смаляніч*, *Васіль Заранок*) (21.09. 1951, м. Смаляны Коханаўскага раёна Віцебскай вобл., цяпер Аршанскі раён), краязнаўца, журналіст. Скончыў СШ № 4 г. Оршы, факультэт журналістыкі БДУ (1973), рэдактарскае аддзяленне Ваенна-гуманітарнай акадэміі ў Маскве (1990). Служыў ва УС СССР (1973–1994), працаваў у газеце ЧБВА «Во славу Родины» карэспандэнтам аддзела баявой падрыхтоўкі і жыцця войск, адказным сакратаром (1984–1994), нам. галоўнага рэдактара гісторыка-публіцыстычнага часопіса «Беларуская мінуўшчына» (1994–1998). Арганізатар і гал. рэдактар навукова-практычнага часопіса «Архівы і справаводства» (з 1999). Член Саюза журналістаў Беларусі (1986), Археаграфічнай камісіі Дэпартамента па архівах і справаводству (2000).

Гісторыяй і культурай роднага краю зацікавіўся пад час навучання ў школе. Друкаваў некаторыя матэрыялы ў рэспубліканскім («Піянер Беларусі») і мясцовым перыядычным друку. Браў удзел у стварэнні школьнага музею.

Разам з сябрамі шмат зрабіў для аднаўлення гісторыі дзейнасці асінторфскага камсамольскага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Як вынік, у гонар 20-годдзя Перамогі многія падпольшчыкі, і тыя, што загінулі, і тыя, што засталіся жывымі, былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, а ў гонар іх подзвігу быў узведзены помнік.

Сістэмна краязнаўствам пачаў займацца пад час работы ў ваеннай газеце. У час працы карэспандэнтам у газеце ЧБВА «Во славу Родины» рыхтаваў матэрыялы на краязнаўчую тэматыку, у тым ліку і па гісторыі Віцебшчыны. З'яўляўся ўкладальнікам краязнаўчай старонкі «Паходня», быў стваральнікам і актыўным аўтарам рубрыкі «Белая Русь: архівы часу», для якой напісаў каля 200 артыкулаў па гісторыі роднага краю. Тэматыка краязнаўчых даследаванняў вельмі шырокая, найбольш цікавіцца падзеямі перыяду росквіту ВКЛ, легендарнымі асобамі гісторыі Беларусі, а таксама ўсім, што тычыцца аршанскай даўніны.

Браў удзел у шэрагу канферэнцый, сярод якіх Рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя «Гістарычнае краязнаўства — дзейсны фактар інтэнсіфікацыі навучальнага

працэсу ў школе і ВНУ» (Гродна, 1994), V Аршанская навукова-краязнаўчая канферэнцыя (Орша, 1996), навукова-краязнаўчая канферэнцыя, прысвечаная 930-годдзю Оршы (Орша, 1997), навуковая канферэнцыя «Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: стан і перспектывы развіцця» (Мінск, 1999), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Архівы Беларусі на рубяжы XX–XXI стагоддзяў: гісторыя, стан, перспектывы» (Мінск, 2000) і інш. У краязнаўчых росшуках падтрымлівае стасункі з НА РБ, НГАБ, БДАКД, Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, гіст. факультэтам БДУ, Дзяржкамархівам, аршанскімі музеямі.




Аўтар кніг «Там, дзе была Неўрыда» (1996), «Поле памяці: падзеі і постаці беларускай мінуўшчыны» (1999), у аснову якіх былі пакладзены артыкулы, якія раней друкаваліся ў газеце «Во славу Родины» і часопісе «Беларуская мінуўшчына». Выдаў першы ў Беларусі ілюстраваны храналагічны даведнік «Орша: залатыя стрэлы на блакітным полі» (1997), даведнік для замежных турыстаў «Мінск» (1999). Аўтар больш 300 публікацый гісторыка-краязнаўчага характару ў рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку: газетах «Наша слова», «Чырвоная змена», «Звязда», «Настаўніцкая газета», «Свободные новости», часопісах «Архівы і справаводства», «Беларуская мінуўшчына», «Эпоха». Друкаваўся ў расійскіх і польскіх выданнях.

Працуючы на пасадзе рэдактара часопіса «Архівы і справаводства», актыўна прапагандуе гістарычную спадчыну краю, спрыяе актывізацыі вывучэння гісторыі Беларусі, развіццю архівазнаўства, дакументазнаўства, археаграфіі, папулярызацыі архіўных дакументаў па гісторыі краю.

Тв.: Кнігі: Орша: Залатыя стрэлы на блакітным полі: храналагічны даведнік. — Мн.: Полымя, 1997. — 428 с.
Артыкулы ў навуковым друку: «З варагаў у грэкі»… Праз Старую Перавалоку? // БМ. — 1994. — № 3. — С. 45–47; Тапанімічны генацыд, або Як Амерыка стала савецкай // БМ. — 1994. — № 4. — С. 7–10; Смаляны // БМ. — 1995. — № 1. — С. 44–47; Горад зруйнаваных храмаў і светлых надзей: [Орша] // БМ. — 1996. — № 1. — С. 35–36; «Вялікі галоўны гасцінец»: [шляхі зносін на Беларусі і Віцебшчыны ў часы Екацярыны II, паштовыя станцыі] // БМ. — 1996. — № 2. — С. 41–44; Грымяць мячы булатныя на полі Аршанскім: [Аршанская бітва] // БМ. — 1997. — № 2. — С. 32–34; Справа вялікай смеласці і розуму вышэйшага: [узаемаадносіны з татарамі] // БМ. — 1997. — № 4. — С. 2–8; Пра Альжбету Астрожскую, кульны двор і Спаса-Праабражэнскую царкву: [Барань] // БМ. — 1997. — № 5. — С. 75–79; Заснаванне Оршы: як спалучыць легенды і рэаліі // Аршанскі краязнаўчы зборнік № 2. — Орша: Аршанская друкарня, 1997. — С. 39–46; Потомки хана Тохтамыша // Эхо веков (Казань). — 1997. — № 12; Чорная смерць // БМ. — 1998. — № 1; «Адведаў пан Бог горад агнём…» // АіС. — 1999. — № 2; Вакханалія рабавання // АіС. — 1999. — № 4, 5; Археаграфічныя і архівазнаўчыя публікацыі ў часопісе «Архівы і справаводства» // БАШ. — Вып. 2. — Мн., 2001. — С. 64–72; Смаляны: Легенды і таямніцы Белага Ковелю // АіС. — 2004. — № 1. — С. 104–117; Места на Барані // АіС. — 2004. — № 6. — С. 105–114; Таямніцы легендарнай Арэсы // АіС. — 2005. — № 1. — С. 103–114; Чыгуначнае раздарожжа Еўропы: [беларуская чыгунка] // АіС. — 2007. — № 2. — С. 116–126; «У Літоўскай зямлі град Арш камен…» // АіС. — 2007. — № 5. — С. 114–121; «Бярэзінская Неўрыда»: [р. Бярэзіна] // АіС. — 2007. — № 3. — С. 109–117; «Калі я буду адыходзіць…»: [І. Чэрскі] // АіС. — 2008. — № 2. — С. 146–154; Z Honorem przyjawszy swoj los // Inna Białorus. — Warszawa, 1999.
Літ.: Скалабан В. Ствараецца даведнік «Беларускія краязнаўцы» // КіД. — 2001. — № 1. — С. 28–30; Шумейко М. Юбилей главного редактора «Архіваў і справаводства» // АіС. — 2001. — № 5. — С. 112–116; З сумленнем у добрай згодзе // Яршоў І.А., Сіднякова В.М. Вёрсты пройдзеных дарог. — Магілёў: Магілёўская друкарня, 2003. — 156–165; Шумейка М.Ф. Асіноўскі С.М. // Архівісты Беларусі: біябібліяграфічны даведнік / склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. — Мн.: БелНДІДАС, 2006. — С. 57–58; Корзенко Г.В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник. — Мн.: Бел. наука, 2007. — С. 16–17.

**АСТАПЕНКА** А.П., **АСТАПЕНКА** ВІКТАР ІВАНАВІЧ (1928–?), педагогі. Працавалі настаўнікамі ў Ноўкінскай, Пальмінкаўскай, Мяжанскай школах Гарадоцкага раёна. На працягу педагагічнай дзейнасці сабралі шмат успамінаў, калекцыю фотаздымкаў, альбомаў, якія адлюстроўваюць іх турыстычна-краязнаўчую дзейнасць. Напрыклад, у ГРКМ перадалі збор песень і частушак, сабраных на тэрыторыі Мяжанскага с/с.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Шагалеева Т.А. (3.07.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**АСТРОЎСКІ** УЛАДЗІСЛАЎ (Władysław Ostrowski), аўтар кнігі ўспамінаў «Застаўся пусты дом» (Зялёна Гура, 1992), у якой змяшчаецца цікавая інфармацыя па гісторыі Браслаўшчыны ў міжваенны перыяд у складзе II Рэчы Паспалітай, у час Другой сусветнай вайны. У кнізе апавядаецца пра лёс сям'і ў лагеры ў Калузе, вяртанне на радзіму і выезд у Польшчу.

Тв.: Pozostał pusty dom: Wspomnienia żołnierza Armii Krajowej. — Zielona Gora, 1992. — 130 s.

**АЎКШТОЛЬ** УЛАДЗІМІР ІВАНАВІЧ (1913, в. Барадзінічы – кан. 1990-х), краязнаўца. Аўтар успамінаў, у якіх апісана жыццё вёскі ў міжваенны час. Частка друкавалася ў газеце «Браслаўская звязда», уключаны ў кнігу «Памяць» Браслаўскага раёна. Дапамагаў збіраць матэрыялы пра М. Пецюкевіча Браслаўскаму музейнаму аб'яднанню. Валодаў выдатнай памяццю. Успаміны пра жыццё запісаны і падрыхтаваны да друку К. Шыдлоўскім. Вырабляў народныя музычныя інструменты і забаўкі.

Тв.: Успаміны старога чалавека // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Браслаўскага раёна. — Мн., 1998. — С. 275–278; Барадзінічы // БЗ. — 1994. — № 64. — С. 2.
Літ.: Шыдлоўскі К. Даведка пра У.І. Аўкштоля (15.01.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**АЎЧЫННІКАЎ** АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ (1922, в. Казейкіна Бешанковіцкага раёна), краязнаўца. Вучыўся ў Бераснёўскай, Селішчанскай, Чаўнышанскай, Бешанковіцкай школах, на курсах у ВДПІ. Выкладаў у Бачэйкаўскай і Пажарышчанскай СШ. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля яе заканчэння скончыў ВПІ. Працаваў у Ульскім райкаме КПБ, дырэктарам Ульскай СШ, ВДМІ на кафедры гісторыі КПСС, лектарам Віцебскага гаркама КПБ, выкладчыкам Віцебскага ветэрынарнага інстытута. З 1982 г. на пенсіі. Пасля выхаду на пенсію вывучаў гісторыю роднай вёскі і навакольных мясцін. Стварыў для гэтага картатэку. Збіраў рэчы, кнігі, карты з мэтай арганізацыі асабістага музея.

Літ.: Крачкоўскі А. Франтавік, краязнавец // Зара. — 1997. — 30 верас. — С. 2, 3.

**АФАНАСЬЕЎ** ВІКТАР, краязнаўца. Працаваў лектарам Расонскага райкама КПБ. Браў актыўны ўдзел у працы камісіі па падрыхтоўцы кнігі «Памяць» Расонскага раёна. Актывіст раённага аддзялення БДТАПГіК. Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку.

Тв.: (разам з Р. Прудоўскім) Аб назве Клясціцы, Баі пад Клясціцамі ў 1812 г., Рагнедзін курган, Сакалінскі замак, Вопіс царкоўных і манастырскіх маёнткаў // КШ. — 1990. — № 90. — С. 2–3; Жыў Ф. Скарына ў Тродавічах // КШ. — 1990. — № 114. — С. 2–3; Партызанскія ўзнагароды: [1941–1944] // ГлРс. — 1991. — № 8. — С. 2; (разам з Р. Прудоўскім) Адраджэнне: [гісторыя раёна ў другой пал. 1940-х – 1960-я гг.] // ГлРс. — 1991. — № 13. — С. 2; Глыбока перапляліся карані нашы: [Расоншчына] // ГлРс. — 1991. — № 22. — С. 2; Эдуард Дэрву: [зямляк-расонец] // ГлРс. — 1994. — № 85. — С. 2; Такімі былі вызваліцелі: [лісты сав. салдат] // ГлРС. — 1995. — № 13. — С. 1, 4; Кавалер ордэна Аляксандра Неўскага // ГлРС. — 1998. — № 34. — С. 2.
Літ.: Байдзін Л. Падзея гістарычнай важнасці: [кніга «Памяць»] // ГлРС. — 1995.



**АФТАНАЗІ** РАМАН (1914–2004), польскі бібліятэкар, дакументазнаўца, гісторык. Вучыўся ў Львоўскім універсітэце, даследаваў гісторыю культуры Польшчы. Скончыў факультэт філасофіі Вроцлаўскага ўніверсітэта. Працаваў у аддзеле імя Асалінскіх у Львове (1944–1945), у Вроцлаве (1946–1981). Аўтар працы «Materiały do dziejyw rezydencji» (тамы 1–11, 1986–1994), выдадзеных у другім выданні пад назвай «Сядзібы на былых крэсах Рэчы Паспалітай» — «Dzieje rezydencji na dawnych Kresach Rzeczypospolitej» (1991–1997).

Матэрыялы, прысвечаныя Віцебшчыне, змяшчаюцца ў 1-м т. (ваяводствы Полацкае і Віцебскае) і 4-м т. (ваяводства Віленскае). Комплексна апісаны сядзібы (архітэктура будынкаў, забудова, унутранае ўбранства, паркавая архітэктура), пералічаны маёмаснікі. Часта адзіная крыніца для краязнаўцы для вывучэння гісторыі маёнткаў і сядзіб у краі. Найбольш грунтоўна разгледжана Заходняя Віцебшчына, галоўным чынам даследаваліся сядзібы спаланізаванай шляхты, маёмаснікі якіх адносіліся да сферы польскай культуры і каталіцкай рэлігіі. (У наваколлях Віцебска, напрыклад, не разглядаецца сядзіба «Мілае» вядомага асветніка Ігната Манькоўскага, пабудаваная ў 1806 г., якая захавалася да нашых часоў, сядзіба ў в. Вялікія Лётцы батаніка Уладзіміра Адамава і іншых вядомых прадстаўнікоў праваслаўнага дваранства.)

Лаўрэат шэрагу ўзнагарод, у тым ліку Галоўнай узнагароды міністра культуры і мастацтва (Nagrody Głównej Ministra Kultury i Sztuki (1990)), Навуковай узнагароды ПАН (Nagrody Naukowej PAN (1990)) і інш.

Тв.: Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. — Wyd. 2. — Cz. 1. Wielkie Ksiestwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. — T. 1. Województwa minskie, mścislawskie, połockie, witebskie. — Wrocław: Ossolineum, 1996. — 335 s; Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. — Wyd. 2. — Cz. 1. Wielkie Ksiestwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. — T. 4. Województwo wilenskie. — Wrocław: Ossolineum, 1993. — 547 s.



**БАБРОВІЧ** НІНА АЛЯКСАНДРАЎНА (10.01.1969, в. Стары Лепель Лепельскага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыла мастацка-графічны факультэт ВДПІ (1991). Працавала ў Лепельскім доме рамёстваў (1992–1997), ВАКМ (1997–2005), Віцебскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі (2005–2008), выставачным цэнтры «Задзвінне» (з 2008).

Займацца краязнаўчымі даследаваннямі пачала, працуючы ў Лепельскім доме рамёстваў. Асноўныя кірункі краязнаўчых росшукаў: народны касцюм і тэкстыль Віцебшчыны. Удзельнік шматлікіх навуковых канферэнцый. Аўтар шэрагу артыкулаў у навуковым друку на тэму ткацтва і традыцыйнай матэрыяльнай культуры Віцебскага Паазер'я. Прыняла ўдзел у стварэнні некаторых экспазіцый па профілю дзейнасці Лепельскага дома рамёстваў, ВАКМ, ВРГКМ. Брала ўдзел у этнаграфічных экспедыцыях па Аршанскім, Віцебскім, Гарадоцкім, Дубровенскім, Лепельскім раёнах Віцебскай вобл. і некаторых раёнах Магілёўскай вобл. Падтрымлівае адносіны з інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, БелДІПК, Музеем старажытнай беларускай культуры, ВАКМ, шэрагам раённых музеяў і Дамамі рамёстваў Віцебскай вобл., ГА «Экалагічны агратурызм». Мае ненадрукаваную работу «Сялянская мода ад мінулага да сучаснага», заснаваную на матэрыялах дзённікаў экспедыцый, якія ладзіліся па Віцебшчыне.

Тв.: Артыкулы ў навуковым друку: Народны касцюм // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзвінне / Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка [і інш.]; склад. Т.Б. Варфаламеева. — Мн.: Бел. навука, 2004. — С. 797–827; Захоўванне мясцовых традыцый у ручным ткацтве (з вопыту працы гуртка «Ткацтва» Лепельскага дома рамёстваў) // Матэрыялы абласной навукова-практычнай канферэнцыі «Ручнік як увасабленне традыцыйнай культуры беларусаў», Віцебск, 29–31 кастрычніка 1996 г.; Каталог выставы «Віцебскі ручнік». — Віцебск, 1998. — С. 29–32, 39–90; Застаўся ў хаце «багавік»…: па матэрыялах экспедыцыі ВАКМ у Гарадоцкі раён // Ручнік у прасторы і часе: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., 19–20 ліст. 1998 г. / агул. рэд. В.А. Лабачэўскай. — Мн.: БелІПК, 2000. — С. 156–160; Народный костюм: Сохранение и изучение традиций // Итоги НИР – 2001: тезисы докладов VI (51) научной конференции студентов, магистрантов и аспирантов. — Витебск: ВГУ, 2002. — С. 5–6; Вклад старообрядцев в историю культуры: по материалам собраний ВАКМ // Старообрядчество как историко-культурный феномен // Материалы Международной научно-практической конференции «Старообрядчество как историко-культурный феномен», г. Гомель, 27–28 февраля 2003 г. — Гомель: ГГУ, 2003. — С. 28–31; Існаванне традыцый і жыццёвыя змены: да пытання нівеліравання адзення сялянак на Віцебшчыне ў канцы XIX – пач. XX ст. // История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур: Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности: материалы международной научно-теоретической конференции, 30–31 октября 2003 г. — Витебск: ВГУ, 2003. — С. 140–141; Экамузей як экасістэма традыцыйнага складу жыцця селяніна: Да праблемы захавання асяроддзя ў кантэксце экалагічнай культуры // Міжнародны экалагічны досвед і яго выкарыстанне на Беларусі: зборнік навуковых артыкулаў. Віцебск: ВФ УА ІСВ, 2003. — С. 17–21; XX стагоддзе — ад асобы вясковай равесніцы: Да пытання нівеліравання традыцыйнага адзення сялянак на Паазер'е // Женщина. Образование. Демократия: материалы 5-й международной междисциплинарной научно-практической конференции, 6–7 декабря 2002 г. — Мн.: ЖИ «ЭНВИЛА», 2003. — С. 394–397; (разам з П. Падгурскім) Версія фрагментарна-храналагічнай рэканструкцыі гендэрназнакава-этнічнай сістэмы язычніцкай духоўнай і матэрыяльнай культуры Паазер'я // Женщина. Образование. Демократия: материалы 6-й международной междисциплинарной научно-практической конференции, 19–20 декабря 2003 г. — Мн.: ЖИ «ЭНВИЛА», 2004. — С. 228–232; Рэканструкцыя адзення сялянак на аснове Дубровенскага строя Віцебшчыны XIX ст. для камедыі «Несцерка» НАДТ імя Я. Коласа // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею: матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 30–31 кастрычніка 2008 г. / рэдкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. — Мн.: Медысонт, 2009. — С. 97–105.

Артыкул у перыядычным друку: Тканіна… мара і надзея // ЛК — 1997. — № 24–25. — С. 5.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Бабровіч Н.А. (15.06.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**БАГАМАЗАЎ** УЛАДЗІМІР СЯМЁНАВІЧ (26.10.1948, г. Акмалінск), музейны работнік. Скончыў СШ № 5 г. Оршы (1967), Маскоўскае вышэйшае пагранічнае каманднае Чырванасцяжнае вучылішча КДБ СССР, Маскоўскую ваенна-палітычную акадэмію імя У.І. Леніна. Служыў на Далёкім Усходзе, у Забайкальскай пагранічнай акрузе, Афганістане. У 1983 г. выйшаў у адстаўку. Працуе дырэктарам Мемарыяльнага музея Героя Савецкага Саюза К. Заслонава ў Оршы.

Цікавіцца гісторыяй і геаграфіяй роднага краю пачаў са школьных гадоў. Аднак больш сур'ёзна краязнаўствам стаў займацца пад час працы ў музеі. Вывучае гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар некалькіх артыкулаў па гэтай тэме ў БГЭ, кнізе «Памяць» г. Оршы і Аршанскага раёна, даведачных выданнях, мясцовым перыядычным друку. Аўтар біяграфічнага нарыса пра К.С. Заслонава, даведніка па музеі К.С. Заслонава. Аўтар

гісторыка-дакументальнага нарыса «Орша в Великой Отечественной войне 1941–1945», выдадзенага аршанскім аддзяленнем БДТАПГіК, у якім апісаны подзвігі землякоў, змяшчаюцца дакументы і матэрыялы па тэме даследавання, спісы памятных мясцін Оршы, звязаных з падзеямі вайны, спіс помнікаў савецкім воінам, падпольшчыкам і партызанам.

Тв.: Кнігі: Мемориальный музей К.С. Заслонова: путеводитель. — Мн.: Полымя, 1989. — 75 с.; Орша в Великой Отечественной войне 1941–1945: краткий документально-исторический очерк. — Орша: Оршанская типография, 1994. — 115 с.; Константин Заслонов: краткий биографический очерк. — Орша: Оршанская типография, 1996. — 88 с.

Артыкулы ў энцыклапедыях і кнізе «Памяць»: Заслонава К.С. музей // ЭГБ. Т. 3. — Мн.: БелЭн, 1996. — С. 413; Акупацыйны рэжым // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 307–308; Падпольны і партыз. рух // Тамсама. — С. 311–334; Вызваленне Аршанскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў // Тамсама. — С. 358–362.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Легендарны герой: [К. Заслонаў] // ВР. — 1985. — № 4. — С. 3; Памятная кніга чалавецтва // ЛП. — 1985. — № 77. — С. 4; Праўда пра адзін бой: [К. Залонаў] // ЛП. — 1990. — № 4. — С. — С. 2; Лёс ветэрана: [К.В. Грышчанкаў] // АГ. — 2000. — № 132. — С. 2.

Літ.: Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 7.

**БАГДАНОВІЧ** ГАЛІНА ВАСІЛЬЕЎНА (26.11.1948, в. Ізабеліна Лепельскага раёна), музейны работнік. Скончыла Полацкае педагагічнае вучылішча (1968). Працавала настаўніцай Плінскай СШ Ушацкага раёна (1968–1972), навуковым супрацоўнікам, ст. навуковым супрацоўнікам, гал. захавальнікам фондаў Ушацкага музея народнай славы імя У.Е. Лабанка (з 1972). Даследуе жыццё і дзейнасць знакамітых землякоў.



**БАГАМОЛАЎ** МІХАІЛ МАЙСЕЕВІЧ (11.06.1922, в. Капусціна Дабрамысленскага с/с Лёзненскага раёна Віцебскай вобл. — 2001), педагог, краязнаўца. Скончыў СДПІ (1967). Працаваў настаўнікам гісторыі ў Дабрамысленскай СШ Лёзненскага раёна.

Вывучаў падзеі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі раёна, гісторыю вёскі і наваколляў у савецкі час. Працаваў з дакументамі ў архіве, праводзіў апытанні мясцовых жыхароў, перапісваўся з ветэранамі, рэканструяваў падзеі Вялікай Айчыннай вайны на Лёзненшчыне. На аснове сабраных матэрыялаў стварыў школьны музей баявой славы. З’яўляўся кіраўніком гуртка «Чырвоных следапытаў» Дабрамысленскай СШ, які актыўна дзейнічаў амаль палову стагоддзя (1947 – пач. 1990-х гг.). За гэты час праз школу патрыятычнага выхавання прайшло больш за 500 вучняў. Адшукаў аднаго з нешматлікіх, які застаўся жывы, чырвонагвардзейцаў першага Дабрамысленскага атрада П.І. Сарокіна, першага старшыню арганізаванага ў 1930 г. калгаса «Чырвоны Кастрычнік» М.М. Кухарэнку і іншых цікавых людзей, якія пакінулі след у гісторыі Дабрамысляў. Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Ганаровы грамадзянін Дабрамысляў: [М.Д. Барынаў] // СП (Л). — 1990. — 13 сак. — С. 3; Снайпер Маша Шварц // СП (Л). — 1995. — 1 ліп. — С. 3; Участвовал в штурме Зимнего: [К.В. Казакоў] // СП (Л). — 2000. — 4 ліст. — С. 1, 2; Стала девушка снайпером // СП (Л). — 2000; Тут пачынаўся яе баявы шлях: [Н.С. Новікава] // СП (Л). — 2005; В прицеле снайперской винтовки: [К.П. Пятрова] // СП (Л).



**БАЙНОВА** (Хайкіна) МАРЫЯ ЛЬВОЎНА (15.09.1909, х. Зацішша Магілёўскага пав. Магілёўскай губ. (цяпер Грабянёўскага с/с Магілёўскага раёна)), гісторык, архівіст. З сям’і сялян. Скончыла гіст. факультэт Маскоўскага педагагічнага інстытута імя К. Лібкнехта (1935). Працавала на макароннай фабрыцы, інструментальна-механічным заводзе, гарбарным заводзе ў Таганрогу (1926), настаўніцай у СШ Хабараўска, а потым Масквы (1935–1938), навуковым супрацоўнікам Цэнтральнага архіва Чырвонай Арміі (1938–1941). У час Вялікай Айчыннай вайны і першыя пасляваенныя гады пражывала ў Краснаярскім краі, працавала на розных работах у Салікамску і Канску. Пераехала ў Віцебск (1948), працавала ў ДАВВ начальнікам аддзела дарэвалюцыйных фондаў, загадчыкам чытальнай залы, нам. начальніка архіва, ст. навук. супрацоўнікам-археографам аддзела выкарыстання і публікацыі дакументаў (1948–1965).

Зрабіла значны ўнёсак у адраджэнне ДАВВ у пасляваенны перыяд. Маючы вялікі практычны вопыт, праводзіла работу па выяўленні і археаграфічнай апрацоўцы дакументаў для зборнікаў «Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии» (1957), «Комитеты бедноты Белоруссии» (1958), «Революционные комитеты БССР» (1975), выконвала вялікую работу па папулярызацыі архіўных дакументаў. Падрыхтавала каля 20 артыкулаў для публікацыі ў газетах, а таксама радыёперадачы на тэмы «Першы акруговы з'езд ударнікаў», «Першыя здраўніцы», «Новыя дакументы пра Фабрыцыуса», «Дружба народаў-братоў» і інш.

Тв.: (разам з З. Жураўлёвай) От рабочего контроля к государственному управлению промышленностью // ВР. — 1957. — 2 чэрв.; Першы з'езд ударных брыгад Віцебскай акругі // ВР. — 1959. — 29 крас.; Работницы и крестьянки Витебщины в первые годы советской власти // ВР. — 1960. — 29 лют. — С. 3; Першыя здраўніцы // ВР. — 1961. — 9 ліп. — С. 4; (разам з А.В. Сырцовай) Яны былі першымі: [першыя піянерскія арганізацыі] // ВР. — 1962. — 25 ліп. — С. 3; Нядзельны рабочы універсітэт // ВР. — 1962. — 16 верас. — С. 4; Дружба народаў // ВР. — 1962. — 22 ліп. — С. 3.

Літ.: ДАВВ. Ф. 289, воп. 1-к, спр. 53 (асабовая справа М. Л. Байновай); Долгова А.В. Байнова А.М. // Витебщина архивная: История, фонды, персоналии, сер. XIX–XX вв. — Мн.: БелНДІДАС, 2002. — С. 183; Байнова М.Н. Архівісты Беларусі: біябібліяграфічны даведнік / склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. — Мн.: БелНДІДАС, 2006. — С. 63.

**БЛЮМ** УЛАДЗІМІР ІВАНАВІЧ (11.09.1927, г. Орша), краязнаўца. Ганаровы чыгуначнік Беларусі. Вучыўся ў СШ № 14 г. Оршы, скончыў 9 класаў у СШ г. Набережныя Чаўны. Служыў у СА (1948–1953). Пасля службы працаваў на чыгунцы машыністам. З выхадам на пенсію (1983) пачаў працу над стварэннем музея Аршанскага лакаматыўнага дэпо (1986). Арганізаваў збор матэрыялаў, афармленне экспазіцыі. Выконваў абавязкі экскурсавода, дызайнера, мастака, захавальніка фондаў. Ініцыяваў распрацоўку і афармленне новай экспазіцыі музея (1996). Аўтар брашуры, прысвечанай жыццю дэпо на працягу гісторыі яго існавання.

Тв.: Локомотивное депо Орша — вехи истории. — Мн.: ДЦНТИ, 1994.
Літ.: Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 6.



**БАНДАРЭВІЧ** ВАСІЛЬ ВІКТАРАВІЧ (24.06.1955, в. Новая Беліца Сенненскага раёна Віцебскай вобл.), педагог, краязнаўца, мастак. Скончыў Сенненскую СШ № 2 (1972), мастацка-графічны факультэт ВДПІ (1978). Працуе выкладчыкам выяўленчага мастацтва СШ № 2 г. Сянно (з 1978). Працаваў навуковым супрацоўнікам Сенненскага краязнаўчага музея (1992–2005).

Гісторыяй роднага краю захапляўся з дзяцінства, аднак сур'ёзна займацца даследаваннямі Сенненшчыны пачаў пасля заканчэння інстытута, працуючы настаўнікам. Значны ўплыў на яго станаўленне як краязнаўцы аказаў удзел у краязнаўчых экспедыцыях і конкурсах, якія з канца 1980-х гг. стаў ладзіць аддзел беларусазнаўства і краязнаўства ВАААППДіП, якім кіраваў А.В. Куржалаў. Браў удзел у абласным конкурсе «Мой родны кут» у 1990–1992 гг. Як адзін з пераможцаў удзельнічаў у краязнаўчых экспедыцыях па гістарычных месцах Беларусі, Літвы і Польшчы. Вынікам вандровак стаў збор біяграфічных звестак пра асоб, якія жылі і працавалі на Сенненшчыне: А. Зязюлю, К.Ц. Анікіевіча, К.А. Жэру, Т. Агінскага, Я.В. Фрэзэра і інш., тапаграфічнае апісанне г. Сянно і Сенненскага пав. 1784 г. На аснове назапашаных матэрыялаў пачаў пісаць артыкулы і публікаваць у мясцовым перыядычным друку. Пазаштатны карэспандэнт раённай газеты «Голас Сенненшчыны», дзе на працягу 1992–2006 гг. вёў рубрыку «Аб зямлі Сенненскай старажытнай і заўсёды юнай».




Аўтар гісторыка-краязнаўчага курса, прысвечанага гісторыі, культуры і прыродзе Сенненскага раёна (сяннознаўства) і першай выдадзенай у Віцебскай вобл. кнігі, якая выкарыстоўвалася як падручнік: «Экскурсія да вытокаў г. Сянно» (2000, 2-е выд., перапрац., 2008). Аўтар некалькіх артыкулаў у энцыклапедычных выданнях Беларусі. Распрацаваў курс і вучэбны дапаможнік

«Спадчына, або Краязнаўчыя нарысы па вывучэнні культурнай і гістарычнай спадчыны Сенненскага раёна» (2000) для вучняў 6–7 класаў (не выдадзены). Да курса распрацаваны альбом «Краявіды Сенненшчыны: мінулае і сучаснае», які складаецца з 200 карцін і малюнкаў (не выдадзены).

Сабраў вялізны архіў і калекцыю матэрыялаў (больш за 250 тэчак), звязаных з гісторыя і культурай Сянно і Сенненскага краю. Стварыў серыю малюнкаў помнікаў гісторыі і культуры Сенненшчыны, як тых, якія захаваліся, так і тых, якія не дайшлі да нашага часу. Арганізаваў 3 мастацкія галерэі малюнкаў (кожная па 60 прадметаў) у тэхніках акварэлі і алею на тэму «Культурныя, гістарычныя і архітэктурныя помнікі Сенненшчыны ад старажытнасці да нашых дзён». Карціны ўпрыгожваюць бібліятэкі г. Сянно і раёна. Разам з В.М. Лісоўскай падрыхтаваў выставу «Помнікі дойлідства Сенненшчыны», у якой прадстаўлены работы вучняў і настаўнікаў СШ № 2 г. Сянно. У Віцебскім абласным навукова-метадычным цэнтры народнай творчасці і культасветработы прайшла выстава «Васіль Бандарэвіч і яго вучні. Жывапіс, разьба» (чэрвень 1995). Выявіў і зрабіў каляровую копію акварэлі Н. Орды «Сянно, губерня Магілёўская. 1877 г.» (прывёз з вандроўкі ў Польшчу ў 1992 г.).

Некаторыя матэрыялы былі выкарыстаны пры падрыхтоўцы тэлефільма «Сянно з блакітнымі вачыма» з цыкла «Зямля Беларуская», які рыхтаваўся Агенствам тэленавінаў Белтэлерадыёкампаніі (БТ, 24.10.2009).

Узнагароджаны юбілейным медалём «60 лет Победы в Великой Отечественной войне 1941–1945». Лаўрэат Рэспубліканскай выставы народнай творчасці «Вечназялёнае дрэва рамёстваў» (1996). Лаўрэат абласной выставы народнага выяўленчага мастацтва «Жывая легенда» II Усебеларускага фестывалю народнага мастацтва «Беларусь — мая песня» (2005).

Тв.: Кнігі і артыкулы ў энцыклапедычных і навуковых выданнях: Экскурсія да вытокаў г. Сянно: Краязнаўчы маршрут па раённым цэнтры Віцебскай вобл. — Віцебск: ВАД, 2000. — 216 с.; Экскурсія да вытокаў горада Сянно: краязнаўчыя нарысы. — Мн.: Літаратура і мастацтва, 2008. — 168 с.; Сенненскае патрыятычнае падполле ў Вялікую Айчынную вайну // ЭГБ. Т. 6. Кн. 1. — Мн., 2001. — С. 289; Сенненскі краязнаўчы музей // ЭГБ. Т. 6. Кн. 1. — Мн., 2001. — С. 289; Сенненскае патрыятычнае падполле ў Вялікую Айчынную вайну // ЭБ. Т. 14. — Мн., 2002. — С. 329; Сенненскі краязнаўчы музей // ЭБ. Т. 14. — Мн., 2002. — С. 330; Сапегі на Сенненшчыне // Вялікі канцлер Вялікага княства. Да 450-годдзя з дня нараджэння Льва Сапегі: зб. матэрыялаў I Міжнародных Сапежанскіх чытанняў, 3–4 снежня, Брэст, II і III Рэспубліканскіх Сапежанскіх чытанняў у Віцебску, 28–29 чэрвеня 2003 г., Астроўна, 28–29 кастрычніка 2006 г. / склад., рэд. Г.М. Праневіч. — Мн.: І.П. Логвінаў, 2007. — С.149–153.

Артыкулы ў перыядычным друку: (разам з М. Ермашкевічам) Аб зямлі Сенненскай, старажытнай і заўсёды маладой // ГС. — 1992. — № 64, 72, 81, 100. — 1993. — № 3, 9, 11, 13; Дойлідства мінуўшчыны // ГС. — 1993. — № 5. — С. 3; Апісанне Сенненскага павету: [пераклад з польск. мовы артыкула, змешчанага ў «Польскім слоўніку геаграфічным»] // ГС. — 1993. — № 48. — С. 2, 3; [пан Рахальскі] // ГС. — 1993. — № 99. — С. 2; (разам з А. Лазюком) У Сянно працаваў штаб Чарняхоўскага. Легенда або быль // ГС. — 1996. — № 78. — С. 2; Беліца. Гісторыя ў асобах // ГС. — 1996. — № 81. — С. 2; Беліца. З пачатку XIX ст. і да нашых дзён: [пераклад з польск. мовы артыкула Р. Афтаназі] // ГС. — 1996. — № 89. — С. 2–3; Некалькі знакамітых, але забытых дат: [XVI ст.] // ГС. — 1997. — № 75. — С. 1, 4; Экскурсія да вытокаў Сянно // ГС. — 1999. — № 18–23, 28, 35, 38, 40, 42, 44, 47, 48, 52, 54, 61, 64, 66, 70, 72, 73, 76, 80, 84, 85; Князі Сенненскія і інш. // ГС. — 2000. — № 28. — С. 2; Выстава вучыць і выхоўвае // ГС. — 2000. — № 49. — С. 2; Дарогі і людзі: [мастак В.А. Грамыка] // ГС. — 2000. — № 75. — С. 3; (разам з А.Я. Лазюком) Незвычайнае ў звычайным (Сянно – Вароніна – Ст. Беліца – Чарэя – Лукомль – Чашнікі) // ГС. — 2000. — № 89, 90, 95, 97, 99, 101. — 2001. — № 1, 4, 7, 9, 15, 22, 56; Званы Друцка — званы памяці // ГС. — 2002. — № 22, 30, 33, 38, 42, 47, 56.

Літ.: Астапчык М. Прысвечана роднаму краю: [«Спадчына»] // ЛІ. — 1991. — № 145. — С. 2; Шпакоўская Г. Прадаўжальнік справы Наполеона Орды // НС. — 1995. — 6 ліп.; Куржалаў А. Настаўнік, мастак, краязнавец // НГ. — 1995. — 9 жніўня; Нікіціна Л. Педагогі-вандроўнікі // ВР. — 1997. — 14 мая; Хітроў А. Улюбёны ў свой горад // ЛіМ. — 1997. — 19 верас.; Конан М. На зямлі Сенненскай старажытнай і заўсёды маладой // Віцьбічы. — 1997. — 25 верас.; Кудраўцаў В. Люблю наш край, старонку гэту // Алеся. — 1998. — № 11. — С. 16–17; Сидорович О. Сенненские родники // Беларуская думка. — 2000. — № 2. — С. 45–48; Кармазін Д.З. Сенненшчына ў малюнках // ВК. — 2002. — № 71. — С. 3; Іванова Л. Настаўнік і яго вучні // ГС. — 2002. — № 44. — С. 3; Шайко С.М. Нястомны краязнаўца // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна. — Мн.: Паліграфафармленне, 2003. — С. 583–584; Урадава Н. Загадкі Васіля Бандарэвіча // ЗЮ. — 2005. — 25 лют. — С. 2; Даты і падзеі ў гісторыі раёна // ГС. — 2005. — № 42. — С. 1; Шнэйдэр А. З павагай да мінулага // ГС. — 2005. — 26 ліп. — С. 2; Шпакоўская Г. Каб дзеці навучыліся цаніць радзіму // НС. — 2006. — № 64. — С. 2; Бандарэвіч В.В. // КГ. — 2006. — № 45, снежань. — С. 2; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Бандарэвіч В.В. (1.11.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Грыбко И. Падарожжа з Чашнікаў у Сянно // ГС. — 2008. — № 8. — С. 3.

**БАНДАРЭВІЧ** ВОЛЬГА, журналіст. Да вывучэння роднага краю далучылася пад уплывам дзейнасці бацькі — В.В. Бандарэвіча. Скончыла СШ № 2 г. Сянно (2000), факультэт беларускай філалогіі і культуры ВДУ (2006). У час вучобы падрыхтавала дыпломную працу «Літаратурная Сенненшчына: традыцыі і наватарства» (2006), якая захоўваецца ў ВДУ. Працуе ў рэдакцыі газеты «Голас Сенненшчыны». Аўтар шэрагу артыкулаў на краязнаўчую тэматыку.

Тв.: Юбілей забытай кнігі – 2007: [К.Ц. Анікіевіч] // ГС. — № 89. — С. 2–3; Юбілей забытай кнігі // Культура. — 2007. — № 51; У цэнтры адно, на ўскрайне…: [помнікі гісторыі і культуры Сенненшчыны] // ГС. — 2008. — № 66. — С. 10; Край мой мілы! Горад з назваю Сянно! // ГС. — 2009. — 30 снеж. — С. 2; З гусарскім размахам! // ГС. — 2010. — 16 студз. — С. 4; «Майстры Сенненшчыны — віцябчанам!» // ГС. — 2010. — 6 лют. — С. 1.



**БАНДАРЭНКА** УЛАДЗІМІР КАРПАВІЧ (15.06.1939, в. Крынкі Лёзненскага раёна – 27.01.2001), педагог, краязнаўца. Скончыў гіст. факультэт МДПІ па спецыяльнасці «Гісторыя, руская мова і літаратура» (1961). Член Саюза журналістаў СССР (1973). Жыў у п. Дружны каля Мінска, у г. Рагачоў, з 1995 г. у г. п. Лёзна.

Шмат вандраваў па Лёзненшчыне. Уражанні і меркаванні афармляў у выглядзе нарысаў і вершаў на краязнаўчыя матывы, сярод якіх: «Лёзна», «Крынкі», «Адаменкі», «Пагосцішча», «Курганы», «Аршанскі рэквіем» і інш. Даследаваў паданні роднага краю. Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку. Цікавіўся тэмай «Яўрэі на Лёзненшчыне».

Тв.: О дореформенной школе: [аналіз кнігі М. Нікіфароўскага «Сельско-школьное обучение в юго-восточной окраине Витебской Белоруссии, каким застает его реформа 19 февраля 1861 г.»] // СП (Л). — 1996. — 14 жніўня; Паўстанцы на лёзненшчыне: [1863] // СП (Л). — 1998. — 2 чэрв. — С. 2–3; У пошуках каранёў сваіх. З гісторыі жыцця угра-фінаў на Лёзненшчыне // СП (Л). — 1996. — 20 жніўня. — С. 4; Станіславоўскія муры: землеўласнікі XIX ст. на тэрыторыі Лёзненскага раёна // СП (Л). — 1998. — 20, 24, 27 кастр.; «Лісты пра Беларусь» (У пошуках каранёў сваіх) // ЛК. — 1998. — № 82. — С. 4; Знаходкі з-пад Альховіка ці ўрок гісторыі, які запомніцца надоўга // СП (Л). — 1999. — 26 студз. — С. 3; Станіславоўскія муры: [Лёзненшчына] // НС. — 1999. — № 62. — С. 5; Краявед з Высачан // СП (Л). — 1999. — 11 мая. — С. 2; Станіславоўскія муры // НС. — 1999. — 1 чэрв. — С. 5; Тут жыў славуты філосаф: [З. Шнеерзон] // СП (Л). — 1999. — 14 верас. — С. 4; Агінскія і Лёзненшчына // СП (Л). — 1999. — 26 кастр. — С. 3, 4.

Літ.:Федасеенка Вікторыя. Пакінулі след у гісторыі раёна. У.К. Бандарэнка (1939–2001) // СП (Л). — 2006. — 4 крас. — С. 2.



**БАРАВІК** МАРЫЯ ЯКАЎЛЕЎНА (22.02.1946, в. Праабражэнка Пліскага раёна Маладзечанскай вобл., цяпер Глыбоцкі раён), пісьменніца. Скончыла Перадольскую сямігодку, СШ у г.п. Падсвілле Глыбоцкага раёна, факультэт журналістыкі БДУ (1978). Працавала у Падсвільскім доме культуры, у рэдакцыі раённай газеты «Шлях Перамогі» (цяпер «Веснік Глыбоччыны»), бібліятэкарам у Падсвільскай дзіцячай бібліятэцы. У розныя часы з’яўлялася кіраўніком шэрагу гурткоў Глыбоцкага РЦДТ, Падсвільскага ЦДЮТЭ: юных карэспандэнтаў, літаратурнага, фатографаў, лялечнага клуба, клуба «Сябры прыроды», «Чароўная школа» і г.д. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1992).

Даследуе гісторыю г.п. Падсвілле і ваколіц, жыццёвы шлях Я. Драздовіча, І. Буйніцкага. Пэўны ўплыў на фарміраванне зацікаўленасці ў вывучэнні гісторыі роднага краю зрабіла дырэктар Падсвільскага ЦДЮТЭ Людміла Васільеўна Марговіч. Кіруе гуртком «Юны экскурсавод». У экскурсіях выкарыстоўвае свае вершы. Распрацавала даведнік «Падсвілле. Штрыхі мінулага і сучаснага». Адшукала фрагмент карціны Я. Драздовіча «Зачараваны замак» у в. Азёркі Пліскага с/с Глыбоцкага раёна. Жыве ў г.п. Падсвілле.

Тв.: Падсвілле: на мяжы смеху і слёз // ВР. — 1990. — № 197. — С. 4; Пад зоркай Буйніцкага // КГ. — 2005. — № 33; Памяць выгнання з волі // НСл. — 2007. — № 15; Да ты — асілак // ВГ. — 2007. — № 9; Да Перадол бяжыць шаша // ВГ. — 2007. — № 19; Бяры стагоддзі ў рукі // ВГ. — 2007. — № 21; Ад роднага да вышыні мары // ВГ. — 2007. — № 27; Я помню цудоўнае імгненне // НГ. — 2007. — № 25.

Літ.: Пісьменнікі Віцебшчыны: даведнік. — Віцебск: ВАД, 2001. — С. 16; Жыгуноў А. З пяшчотай і журбой, або Вырас у глыбінцы паэт: [М. Баравік] // ВР. — 1991. — № 57. — С. 3; Руплівец Марыя Баравік // КГ. — 2006. — № 9 (122), сакавік. — С. 1; Сіўко Ф. Раб на рабе і рабом паганяе // НН. — 2006. — № 9, сакавік. — С. 42; Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 417; Пісьменніца Марыя Баравік // НСл. — 2006. — № 13. — С. 3; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Баравік М.Я. (21.08.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**БАСТАВА** АЛІНА ВАСІЛЬЕЎНА (5.10.1935), педагог, краязнаўца. Скончыла Віцебскае мастацка-графічнае педагагічнае вучылішча, філал. факультэт СДПІ. Працавала ў СШ № 1 г. Гарадка выкладчыцай малявання, чарчэння, рускай мовы і літаратуры, навуковым супрацоўнікам Гарадоцкага краязнаўчага музея.

Пасля выхаду на пенсію зацікавілася гісторыяй роднага краю, лёсамі землякоў, пачала займацца даследчыцкай справай. Атрыманыя матэрыялы публікуе ў мясцовым і рэспубліканскім перыядычным друку. Да актыўнага краязнаўчага пошуку падштурхнула знаёмства з Л.К. Нікіцінай.

Вывучае гісторыю г. Гарадка, яго вуліц, будынкаў, жыхароў. Так, адшукала дом, у якім жыў кампазітар Дзяржынскі. Вывучае тапаніміку населеных месцаў раёна. Напрыклад, прасачыла тэндэнцыю зменаў назваў вуліц горада на працягу пасляваеннага перыяду: з'яўленне раёна з назвай «Шанхай», у якім адразу пасля вайны жылі кітайцы, раёна «Порт-Артур», рабочага пасёлка «БАМ», вуліцы «В'етнам», якая выцягнулася ўздоўж рэчкі і сваімі формамі нагадвае гэтую краіну. Аўтар артыкулаў пра месцы, дзе пражывала (вёскі Віцебскага і Шумілінскага раёнаў). На працягу працы ў школе арганізоўвала і ўдзельнічала ў шэрагу паходаў па Гарадоччыне. Супрацоўнічае з раённым краязнаўчым музеем, СШ № 1, раённым архівам, райвыканкамам, бюро тэхнічнай дакументацыі, раённай бібліятэкай.

Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў часопісе «Нёман», газетах «Культура», «Настаўніцкая газета», «Герой працы» (Шуміліна), «Жыццё Прыдзвіння», «Гарадоцкі веснік». Актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці г. Гарадка, выступае з ініцыятывамі па добраўпарадкаванні горада, арганізацыі і паляпшэнні турыстычнай інфраструктуры горада. Прапанавала правесці конкурс «Сем цудаў Гарадка». Мае невялікі прыватны архіў. Шэраг матэрыялаў перадала ў СШ № 1 г. Гарадка. Шмат ненадрукаваных матэрыялаў у рукапіснай форме захоўваюцца ў асабістым архіве.

Тв.: Аб настаўніку Г.Ф. Клікушыну — графіку // Нёман. — 2007. — № 5; Памяць // ПК (Г). — 1985. — № 45. — С. 2; Аўтограф пісьменніка // ПК (Г). — 1988. — № 63. — С. 2; Капитаны наших первых путешествий // НГ. — 2006. — 26 жніўня; Кликушин Г.Ф. // НГ. — 2006, верасень; Свидетели прошлого // ГВ. — 2007. — № 27–31; Працавала наша Гаражанка // КГ. — 2007. — № 18, май. — С. 4; Была в Заронове церковь // ЖП. — 2008. — № 19. — С. 3; Зароново: Землянка-школа // ЖП. — 2008. — № 28. — С. 3; Яны тут гнёзды вілі: [гісторыя дома Дзяржынскага ў г. Гарадок] // Культура. — 2008. — 12 сак.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Бастава А.В. (3.06.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Інтэрв'ю з А.В. Баставай (3.06.2008.) / запісала Г. Жаголкіна // Тамсама.



**БАЎТОВІЧ** МІХАСЬ МІКАЛАЕВІЧ (*С. Нарушэвіч, М. Равіч, Х. Ясная, І. Янкоўскі*) (21.11.1957, г. Полацк), краязнаўца. Скончыў СШ № 5 г. Полацка (1975), факультэт аўтаматыкі і вылічальнай тэхнікі Рыжскага політэхнічнага інстытута (1980). Працаваў інжынерам, начальнікам канструктарскага бюро Наваполацкага завода «Вымяральнік» (1980–1992), дыспетчарам, начальнікам дыспетчарскай службы полацкага гарадскога раёна электрасетак прадпрыемства Полацкія электрычныя сеткі (з 1992).

Займаецца даследаваннямі Полацка і ваколіц, аддаючы перавагу канфесійнай гісторыі горада і Полаччыны. Гісторыяй роднага краю зацікавіўся з дзяцінства. Краязнаўчую дзейнасць распачаў у 1988 г. у складзе полацкага гістарычнага клуба «Вытокі». З'уляўся яго старшынёй (1989–2003), ініцыятарам, арганізатарам і правадніком грамадскіх гісторыка-культурных ініцыятыў нацыянальна-арыентаванай часткі інтэлігенцыі г. Полацка. Сярод іншых — ініцыятывы вяртання полацкага гістарычнага герба, вяртання гістарычных назваў вуліцам горада, даследавання і грамадскай аховы полацкіх могілак (Чырвоных, Ксавэраўскіх, Грамоўскіх, Фатынаўскіх, Экіманскіх), замены помніка на магіле нашаніўца Я. Журбы на Ксавэраўскіх могілках, кансервацыі рэштак бернардынскага касцёлу Св. Ганны, стварэння камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны (з супрацоўнікаў выканкама, дэпутатаў гарсавета, прадстаўнікоў грамадскасці). Разам з С. Глушковым, В. Падасетнікавым уваходзіў у склад тапанімічнай камісіі пры Полацкім гарсавеце (1991).

Удзельнік шэрагу краязнаўчых і рэгіянальных канферэнцый, сярод якіх «Беларусь у сістэме трансеўрапейскіх сувязяў у 1-м тысячагоддзі н.э.» (Мінск, 1996), «Ut sint unum (Brestas vienoaanas 400 gadi)»: [400 гадоў Берасцейскай царкоўнай уніі] (Рыга, 1996), «Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі» (Полацк 1997, 2002, 2007), 2-я міжнародныя чытанні, прысвечаныя творчасці Яна Баршчэўскага (Полацк, 1998), «Сімяон Полацкі: Светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць» (Полацк,




1999), III Міжнародны кангрэс беларусістаў (Мінск, 2000), «Abp Jozafat Kuncewicz hierarcha Rzeczypospolitej wielu narodyw»: [Архібіскуп Язафат Кунцэвіч, іерарх Рэчы Паспалітай многіх народаў] (Люблін, 2003), Гісторыка-краязнаўчая канфэрэнцыя да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музею (Полацк, 2006), «Леў Сапега (1557–1633) і яго час» (Гродна, 2007). Выступаў адным з арганізатараў і ўдзельнікаў круглага стала краязнаўчых арганізацый Віцебскай вобл. «Краязнаўчыя арганізацыі: дзейнасць, праблемы развіцьця, вопыт узаемадзеяння з староннімі структурамі» (Шаркоўшчына, 22.06. 2003).




Аўтар кніг «Полацкія пакутнікі» (1999), «Вянок акафістаў» (2000), «Эпісталяцыя Сьвятога Язафата» (2006), створаных на аснове значнай колькасці літаратурных і архіўных крыніц. Кніга «Полацкія пакутнікі» змяшчае шэраг дакументаў, датычных забойства царом Пятром I манахаў у полацкай Святой Сафіі ў 1705 годзе. У кнігу «Вянок акафістаў» увайшлі творы, тым ці іншым чынам звязаныя з Полацкай зямлёй: восем акафістаў з «Малой падарожнай кніжкі» Ф. Скарыны, два акафісты з рукапісу Сімяона Полацкага, акафісты да Св. Еўфрасінні і Св. Язафата. Зроблены пераклады з стараславянскай і польскай моваў на беларускую. У кнізе «Эпісталяцыя Сьвятога Язафата» змешчаны дакументы і праведзены параўнальны аналіз лістоў архіепіскапа полацкага Язафата Кунцэвіча да розных духоўных і свецкіх асобаў.

Узначальвае полацкае грэка-каталіцкае выдавецтва «Сафія» (з 1996). Навуковы рэдактар выдання «Архіў уніяцкіх мітрапалітаў» (Т. 1, 1999; Т. 2, 2001; Т. 3, 2005), укладальнік тлумачальных слоўнікаў для іх. Аўтар уступу, каментарыяў, рэдактар і выдавец кнігі В. Пануцэвіча «Сьвяты Язафат, архіяпіскап полацкі» (2000). Падрыхтаваў да друку і выдаў кнігу «Полацкая даўніна» (2007) паводле рукапісу І.П. Дэйніса з аўтарскімі замалёўкамі розных аб’ектаў Полацка, аўтар прадмовы і нарыса пра І.П. Дэйніса.

Арганізатар гісторыка-культурных вандровак для членаў клуба «Вытокі» па гістарычных месцах Беларусі і зямель, якія раней уваходзілі ў склад ВКЛ. Сярод іншых: «Беларускія святыні» па маршруце Полацк – Прошкава – Глыбокае – Дунілавічы – Лучай – Паставы – Камаі – Лынтупы – Свянцяны – Гадуцішкі – Відзы – Відзы Лаўчынскія (1990); Полацк – Друя – Дрысвяты, Полацк – Свір – Гальшаны (1990), «Абарончыя збудаванні Беларусі» па маршруце Полацк – Нарач – Свір – Міхалішкі – Варняны – Ашмяны – Крэва – Баруны – Гальшаны – Трабы – Іўе – Навагрудак – Шчорсы – Карэлічы – Мір – Нясвіж (1990); маршрута Полацк – Дзісна – Забалоцце – Ідолта – Друя – Слабодка – Браслаў – Мінкавічы – Дрысвяты – Пеліканы – Опса – Далёкія – Богіна – Відзы – Казьяны – Германавічы (1991), Полацк – Себеж – Невель (1999) і інш.

Адзін з ініцыятараў, арганізатараў і ўдзельнікаў экспедыцый па Полаччыне. Сярод іншых адзначым экспедыцыю, якая праводзілася з мэтай пошуку месца нараджэння беларускага паэта, удзельніка паўстання 1863 г. Ф. Тапчэўскага па маршруце Туржэц – Прудок – Багародзіцкае – Антунава – Будзішча – Астраўляны – Вусвіца – Глыбачка – Павулле (1992); экспедыцыю па тэрыторыях Себежскага і Невельскага пав. былой Віцебскай губерні па маршруце Дзёрнавічы – Анінск – Себеж – Ідрыца – Вярбілава – Пачаноўская гара – Гультаі – Невель – Стайкі (1999); экспедыцыю Полацк – Стайкі, якая рабілася з мэтай фіксацыі стану драўлянай царквы XVIII ст. на могілках, рэштак алтарнага роспісу, агляду могілак (2001); экспедыцыю з мэтай адшукаць фальварак Янатруда, дзе напачатку XX ст. жыў беларускі святар, полацкі вікарый Францішак Будзька, па маршруце Полацк – Глушаніна – Обаль –

Мікалаёва – Залессе (2001). Разам з С. Глушковым браў удзел у экспедыцыі, арганізаванай сябрамі таварыства «Артавіта» пад кіраўніцтвам супрацоўніка ННАЦ С.П. Віцязя для вывучэння каменнага комплексу на Яновым возеры і даследавання рытуальных камянёў вакол азёраў Чарсвяты, Атолава, Пола, Крывое, Павулле, Гомель, па маршруце Полацк – Заскаркі – Усомля – Гомель – Бікульнічы – Сарочына – Чарсвяты – Казьяны – Загор'е – Турасполле – Горы – Пола – Усая – Дубраўка – Краснае – Цётча – Гарбаціца – Адворня (20–22.06.1996).

Арганізаваў выставу ў парафіі Св. Язафата ў Полацку «Гісторыя грэка-каталіцкага друку» (3.06.2001), якая была спалучаная з прэзентацыяй выданняў выдавецтва «Сафія».

Мае ненадрукаваныя матэрыялы: «Ян Чачот і Падзвінне», «Да аўтарства гравюры "Выгляд калегіі айцоў езуітаў у Полацку"», «Полацак Беларускі (культурнае жыццё пач. XX ст.)».

Тв.: Кнігі: Вянок акафістаў / уклад. і прадм. М. Баўтовіч. — Полацк: Полац. грэка-катал. грамада, 1999. — 264 с.; Полацк: грэка-катал. рэлігійн. грамада, 1999. — 385 с.; Пануцэвіч В. Сьвяты Язафат, архіяпіскап полацкі / уклад. і прад. М. Баўтовіч. — Полацк: Сафія, 2000. — 274 с.; Полацкія пакутнікі: збор дакумэнтаў / уклад. і прадм. М. Баўтовіч. — Полацк: Сафія, 2000. — 92 с.; Архіў уніяцкіх мітрапалітаў: дакументы да гісторыі царквы ў Беларусі XVI–XX стст. у фондах гістарычных архіваў Украіны: даведнік / БелНДІДАС. Полац. грэка-катал. грамада; склад. С. І. Паўловіч, Т. М. Мальцава; навук. рэд. М. Ф. Шумейка, М. М. Баўтовіч. — Мн.: БелНДІДАС; Полацк: Грэка-катал. рэлігійн. грамада, 2001. — 162 с.; Архіў уніяцкіх мітрапалітаў: дакументы да гісторыі царквы ў Беларусі XVI–XX стст. у фондах гістарычных архіваў Літвы і Расіі: даведнік / БелНДІДАС. Полац. грэка-катал. грамада; склад. С. І. Паўловіч, Т. М. Мальцава; навук. рэд. М. Ф. Шумейка, М. М. Баўтовіч. — Мн.: БелНДІДАС; Полацк: Грэка-катал. парафія сьвятапакутніка Язафата, 2005. — 166 с.; Эпісталяцыя Сьвятога Язафата: збор дакумэнтаў / уклад. і прадм. М. Баўтовіч. — Полацк: Грэка-каталіцкая парафія Сьвятапакутніка Язафата, 2006. — 144 с.; Дэйніс І.П. Полацкая даўніна / уклад., прадм. і камент. М. Баўтовіч. — Мн.: Медысонт, 2007. — 330 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Праблематыка этнагенэзу палачанаў // Беларусь у сістэме трансеўрапейскіх сувязяў у 1 тысячагоддзі н.э.: тэзісы дакладаў і паведамленняў. — Мн., 1996. — С. 17–21; Балтызмы ў беларускіх гаворках як адзнака этнічных працэсаў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі, матэрыялы канферэнцыі. — Полацк, 1998. — С. 31–39; Гімнаграфічная спадчына Ф. Скарыны й С. Полацкага // Симеон Полоцкий: Мировоззрение, общественно-политическая и литературная деятельность: материалы. — Полоцк, 1999. — С. 14–26; Гімнаграфія Францыска Скарыны і Сімяона Полацкага: Рознасць падыходаў да апрацоўкі // Albaruthenica № 20, а таксама на сайце http://www.lingvo.minsk.by/mab/@book/BOOKS/ Albaruthenica/AB_ 20/AB_20.pdf; Эпісталяцыя архібіскупа полацкага Язафата Кунцэвіча // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы. — Полацк, 2002. — С. 7–13; З досьледаў эпісталяцыі архібіскупа Язафата Кунцэвіча // Sztuka sakralna i duchownośc pogranicza polsko-ukrainskiego na Lubelszczyzżnie. — Lublin, 2005. — S. 52–61; Асоба канцлера Льва Сапегі (паводле ліста ад 12.03.1622 да полацкага архібіскупа Іасафата Кунцэвіча) // Леў Сапега (1557–1633) і яго час: збор артыкулаў. — Гродна, 2007. — С. 382–391; Гэральдычная гісторыя Полацку // Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі. Да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея / уклад. В.Д. Краско. — Полацк: НПГКМЗ, 2008. — С. 15–31; Дарогі Торвалада Кодрансана // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі, матэрыялы. — Полацк, 2009. — С. 15–29.

Артыкулы ў часопісах, бюлетэнях: Ліст мітрапаліта А. Шаптыцкага кардыналу Э. Цісэрану пра стан беларускае царквы (1943): [пераклад, падрыхтоўка, каментары] // Абвесьнік полацкае парафіі Сьв. Язафата «ΣΟΦΙΑ». — 1995. — № 3. — С. 1–8; Грэка-каталіцкая царква ў Беларусі 1596–1996: Гісторыя і сучасны стан // Царква. — 1996. — № 3–4. — С. 25; Забраны край: [Себежскі і Невельскі пав.] // Спадчына. — 2000. — № 1. — С. 200–207; «Парашутысты» невядомага цэнтру: [аналіз мемуараў П. Ільінскага «Тры гады пад нямецкай акупацыяй у Беларусі»] // ARCHE. — 2004. — № 3. — С. 247–248; Горад сэрца // ARCHE. — 2006. — № 6. — С. 422–432; Цуд Святога Казіміра пад Полацкам: [падзеі вайны 1518 г.] // Наша Вера. — 2008. — № 1. — С. 44–46; 20 гадоў дэмакратычнага руху ў Полацку // ARCHE. — 2009. — № 4. — С. 356–364.

Артыкулы ў перыядычным друку: Некалькі заўвагаў і дапаўненьняў: [пра падрыхтоўку да святкаваньня 500 год Скарыны] // СК. — 1989. — 10 чэрв. — С. 3; Помнік Я. Журбе // ЛіМ. — 1989. — 29 верас. — С. 4; Закаханых у Бацькаўшчыну цяжкасці не засмучаюць: [клуб «Вытокі»] // СК. — 1990. — 1 жніўня. — С. 2; Зазірнем у гісторыю: [храм Св. Сафіі] // СК. — 1990. — 6 жніўня. — С. 1; Не культаваць старыя дагматы. Адкрыты ліст айцу М.М. Уляхіну: [рыторыка адносна імя і канфесійнай прыналежнасці Ф. Скарыны] // СК. — 1990. — № 98. — С. 3; Назвы і шыльды: [пра беларусізацыю назваў] // СК. — 1990. — 25 снеж. — С. 3; Вернем гістарычную памяць: [гарадская тапаніміка] // СК. — 1991. — 2 крас. — С. 2; Вернем гістарычную памяць // ПВ. — 1991. — № 47. — С. 2; Яшчэ раз пра Унію: [подпісы Камлыга, Макарэвіч, Скрыпка] // СК. — 1991. — 11 чэрв. — С. 2; 1812 год на Беларусі // ПВ. — 1992. — 4 жніўня. — С. 3; Сустрэча з Радзімай праз паўстагоддзя: [прыезд К. Акулы] // ПВ. — 1992. — 14 жніўня. — С. 2; Ня толькі барацьба з ворагам: [1812] // НГ (НвП). — 1992. — 28 жніўня. — С. 3; Святы абавязак: [пра захаванне магілак] // ПВ. — 1992. — 1 верас. — С. 3; Да энцыклапедыі далекавата: [рэц. на кнігу «Архітэктура Беларусі»] // ЛіМ. — 1993. — 22 кастр. — С. 11; Яшчэ пра «Фэльку з Рукшэніц» // ЛіМ. — 1994. — 19 жніўня. — С. 4; Гісторыя аднаго будынка: [Сафійскі базыльянскі манастыр] // НГ (НвП). — 1992. — 8 верас. — С. 3; Жыцьцё Св. Параскевы: [пераклад, апрацоўка, каментары паводле І. Сцябельскага] // Царква. — 1998. — № 2. — С. 12–13; Майдэборскаму праву Полацка — 500 год // Химик. — 1998. — 7 ліп. — С. 2; Самакіраваньне: Эўрапейская традыцыя: 500-м угодкам былых полацкіх вольнасьцяў прысьвячаецца // Інфармацыйны бюлетэнь Наваполацкай рады БНФ. — 1998. — № 2. — С. 2–3; Першая прыступка да мартыралёгу: [рэц. на кнігу «Страчаная спадчына»] // Полацкая ініцыятыва (Полацк). — 1998. — № 2. — С. 2, 4; Расіца: Смерцю смерць перамогшы: [пра святароў Ляшчэвіча і Кашыру] // Царква. — 1999. — № 2. — С. 10–11, 13; Паведамленне пра жорсткія злачынствы, учыненыя вялікім князем Маскоўскім… 11 і 12 ліпеня 1705 году…: [забойства базыльянаў у Полацку, паводле рукапісу з французскай Нацыянальнай бібліятэкі з тлумачэннямі] // Царква. — 1999. — № 2. — С. 12–13; Нашыя сьвятыні ў Расеі: [храмы Невельшчыны і Себешчыны] // Царква. — 2000. — № 2. — С. 14–15; Асоба эўрапэйскага маштабу: [Фларыян Грабніцкі] // ПК. — 2003. — № 4. — С. 3– 4, 6; Постаць эўрапэйскага маш-

табу: [Фларыян Грабніцкі] // Царква. — 2004. — № 1. — С. 12–14; Нябесны апякун Полацка: [геральдыка] // ПКр. — 2004. — № 5. — С. 1–2; Нецывілізаванасьць: [стан аховы помнікаў у Полацку] // Тамсама. — С. 3–4; Наша традыцыя самакіраваньня // ПКр. — 2004. — № 8. — С. 5–8; Патрэба ў грунтоўнасьці і праўдзівасьці: [паштовы двор у Полацку] // // ПКр. — 2004. — № 9. — С. 2; У Калінінградзе асьвячаны помнік Скарыну: [пра ўрачыстасці з нагоды] // Царква. — 2005. — № 2. — С. 15; Сьвяты Язафат у Сусьветным сеціве: [агляд дакументаў, прац, выяваў] // // ПКр. — 2005. — № 16. — С. 4–6; Дзень волі ў Караляўцы // ПКр. — 2005. — № 12. — С. 4; Петровское наследие // ПКр. — 2005. — № 13. — С. 3; Памяці пісьменніка й патрыёта // ПКр. — 2005. — № 15. — С. 5; Мар'янскія ўрачыстасці: [былы марыянскі манастыр у Друі] // Тамсама; Шанаваньне Сьвятога Язафата ў сьвеце: [аб'екты, структуры, які носяць яго імя] // ПКр. — 2005. — № 18. — С. 5–9; Прэзэнтацыя гістарычнага часопіса // Тамсама. — С. 1; Рэзідэнцыя полацкіх уладык: [палац у Струнні] // Царква. — 2007. — № 3. — С. 11; Полацак–Пскоў: Апошняя чыгунка імпэрыі: [рэц. на артыкул В. Мудрова] // НН. — 2008. — 4 верас. — С. 10.

Інтэрнэт-артыкулы: (тэксты артыкулаў размешчаны на сайтах «Радзіма майго духу», рэжым доступу: http://radzima.org/pub/artykul.php?sn=12, а таксама ГА «Усяслаў Чарадзей», рэжым доступу: http://charadziej.org/Bel/Culture/Vytoki/vytoki001.html і інш.); Балтызмы ў беларускіх гаворках, як адзнака этнічных працэсаў; Паведамленьне пра стан рэчаў у Масковіі, пакорліва дасланы ў 1707 годзе Яго Вялебнасьці місыянэрам з Масквы: [фрагмэнт кнігі «Полацкія пакутнікі»]; Экспэдыцыя па маргінальных беларускіх тэрыторыях; Гімнаграфія Ф.Скарыны й С. Полацкага: Рознасьць падыходаў да апрацоўкі: [тэкст дакладу на III канфэрэнцыі МАБ]; Полацкая даўніна; Полацкая традыцыя самакіраваньня; Прывілей месту Полацкаму на майдборскае права ды інш. вольнасьці; Фларыян Грабніцкі. Асоба эўрапэйскага маштабу; Полацкая гэральдыка; Дарогі Торвалада Кодрансана; Вулкі й Камяніцы; Полацкія могілкі; Калектыўная (Муміна); Экімань; Экіманскія могілкі; Церковь Св. Юрия. д. Экимань; Струньня; Крыжаўзьвіжанская царква ў Струньні; Палац полацкіх архібіскупаў у Струньні; Валова азярцо ў Полацку; Абарончая лінія Полацка 1942–1944; Варонічы; Варанецкае замчышча; Двор Лісоўскіх у Варонічах; Захарнічы; Сядзіба Хруцкіх у Захарнічах; Горад сэрца // Сайт часопіса ARCHE. — Рэжым доступу: arche.bymedia.net.6/bautovic606.htm; Горад майго сэрца // Сайт «Латвійскае таварыства беларускай культуры "Сьвітанак"». — Рэжым доступу: www.svitanak.lv/public/?id=81&ln=br&news_id=346; Пра апошнюю чыгунку імпэрыі мог бы расказаць Янка Купала: [водгук на артыкул В. Мудрова] // Сайт газеты «НН». — Рэжым доступу: www.nn.by/index.php?c=ar&i=19475.

Літ.: Кісялёў Г. Шлях да ісціны: [водгук на арт. «Яшчэ пра «Фэльку з Рукшэніц»] // ЛіМ. — 1994. — 9 верас. — С. 8; Віцязь С. «Каменны комплекс на Янавым возеры» // БД. — 1997. — № 6. — С. 150–155; Пазьнякоў В. Інвентар вывезенага у Расею: [рэц. на кнігу «Архіў уніяцкіх мітрапалітаў. Т. 1»] // НН. — 1999. — 29 ліст. — С. 7; Козік А. Старабеларускія рэлігійныя гімны: [водгук на кнігу «Вянок акафістаў»] // ВК. — 1999. — 10 снеж. — С. 2; Кроква В. Пацярпелі за веру: [рэц. на кнігу «Полацкія пакутнікі»] // НН. — 2000. — 7 жніўня; Творчасць вяртаецца на Беларусь: [рэц. на кнігу «Сьвяты Язафат»] // НСл. — 2001. — 23 мая. — С. 4; Сцяпанаў Ю. Кніга пра сьвятога Язафата: [рэц. на кнігу «Сьвяты Язафат»] // Царква. — 2001. — № 1. — С. 15; Шарах М. Прэзэнтацыя выдавецтва «Сафія» // Царква. — 2001. — № 2. — С. 5; Лазавы А. Насьледуючы асьветнікам: [М. Баўтовіч] // Полацкі край (Бюлетэнь Полацкіх недзяржаўных арганізацыяў). — 2004. — № 8. — С. 4; Усошын Я. Перапіска Я. Кунцэвіча і Л. Сапегі: Сапраўднае і сфальшаванае: [рэц. на кнігу «Эпісталяцыя Сьвятога Язафата»] // Царква. — 2006. — № 4. — С. 19; Усошын Я. Памяці пакутніка: [пра кнігу «Эпісталяцыя Сьвятога Язафата»] // Наша Вера. — 2007. — № 1; Яскар А. Колькі каштаваў хлеб у 1905 г.?: [кніга «Полацкая даўніна»] // ИП. — 2008. — № 5. — С. 3; Красоўская А. Дасягальная «Полацкая даўніна»: [прэзентацыя кнігі «Полацкая даўніна» у Наваполацку] // Сайт «Ximik.Info». — Рэжым доступу: http://ximik.info/modules.php?name= News&file=article&sid=1980; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Баўтовіч М.М. (22.11.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Баўтовіч М.М. (3.12.2008): [электронны рэсурс] // Тамсама.



**БЕЛІЦКАЯ** ЛЮДМІЛА ІВАНАЎНА (19.04.1944, г.п. Лёзна Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыла Глыбоцкую СШ № 2 (1960), фізіка-матэматычны факультэт ВДПІ (1967). Працавала настаўніцай у г. Мезень Архангельскай вобл. (1970–1979), г. Віцебску (1979–1985), праграмістам ПКБ АСК (1985–1996), кіраўніком краязнаўчага гуртка пры ВАААППДіП (1996–2006).

Краязнаўствам стала займацца, калі пачала працаваць ў ВАААППДіП (1996). Займаецца вывучэннем гісторыі і культуры г. Віцебска. Разам з членамі гуртка брала ўдзел у шэрагу рэспубліканскіх і абласных конкурсаў, канферэнцый краязнаўчай тэматыкі. Падтрымлівае кантакты з некаторымі беларускімі і замежнымі грамадскімі арганізацыямі, з якімі ладзіць супольныя праекты: «Экадом», «Новая плынь», «Зялёны крыж», віцебскім аддзяленнем фонду Л. Сапегі, «Камунікат», кафедрай славянскіх моў Варшаўскага ўніверсітэта.

Мае шэраг рукапісаў, сярод якіх: «Замкі Віцебска», «Віцебск часоў Рэчы Паспалітай», «Віцебск у складзе Расіі», «Віцебск часоў Шагала», «Пацыфісцкая прагулка па Віцебску», «Літаратурная прагулка па Віцебску», «Памяці нашых пакутнікаў», «Помнікі, якіх няма», «Хронология Витебска», «История репрессий, дискриминации и гонений в Витебске», «Общая оценка современного общества с точки зрения соблюдения прав человека на примере Витебска», «Археология без раскопок». Намаганнямі гурткоўцаў праводзяцца акцыі праекта «Помнікі, якіх няма». Пры падтрымцы *ІАТР*-цэнтра разам з гуртоўцамі распрацавала сайт

у інтэрнэце «Vitebskhronos», прысвечаны храналогіі гісторыі Віцебска, дзе змешчаны некаторыя матэрыялы, падрыхтаваныя гурткоўцамі.

Тв.: [Запрашэнне на акцыю памяці ахвяр рэпрэсій у Віцебску 14.11. 2002] // ВК. — 2002. — № 87. — С. 3.
Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебскай вобл.». Беліцкая Л.І. (17.08.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**БІРУКОЎ** ВІКТАР МІКАЛАЕВІЧ (28.04.1956, в. Бук Талачынскага раёна Віцебскай вобл.), журналіст. Скончыў філал. факультэт Брэсцкага педагагічнага інстытута (1977). Працуе гал. рэдактарам газеты «Наша Талачыншчына».

Даследуе архітэктуру палацава-паркавых комплексаў краю, побытавую гісторыю Талачыншчыны. Свядома займацца краязнаўствам пачаў пад уплывам К.І. Рамановіча ў 1997 г. Аўтар шматлікіх матэрыялаў краязнаўчага характару ў газеце «Сцяг Ільіча» («Наша Талачыншчына»), нарысаў пра вёскі Талачынскага раёна. «Чалавек года Віцебшчыны – 2008».

Тв.: Высокагарадзецкія падпольшчыкі // СІ. — 1996. — № 45. — С. 2; Ці быць званам манастыра: [помнік гісторыі] // СІ. — 1998. — № 25. — С. 2; І ў правінцыі ёсць свае таленты і творцы: [Ю.В. Палякоў] // СІ. — 1999. — № 1. — С. 2; Да новых друцкіх таямніц: [інтэрв'ю з В.М. Ляўко] // СІ. — 1999. — № 28. — С. 2; Святыні роднае зямлі: [былыя маёнткі] // СІ. — 1999. — № 55. — С. 2; (разам з К. Рамановічам) Прыгажосць зямлі і нябёсаў: [рэшткі палацаў на Талачыншчыне] // СІ. — 2000. — № 4–7; Найвялікшы скарб зямлі — яе людзі: [Друцк] // СІ. — 2000. — № 14. — С. 2; Сцяжынкі новых адкрыццяў: [Друцк] // СІ. — 2000. — № 31. — С. 4; Коласава: [вёска ў Талачынскім раёне] // НТ. — 2003. — № 21. — С. 2; Замошша: [вёска ў Талачынскім раёне] // НТ. — 2003. — № 27. — С. 2; Станцыя цыганская: [цыганы ў Талачыне] // НТ. — 2003. — № 42. — С. 2; Родны кут: [кузня ў в. Славені] // НТ. — 2003. — № 89. — С. 2; Воўкавічы: [вёска ў Талачынскім раёне] // НТ. — 2004. — № 4. — С. 2; Лемніца: [вёска ў Талачынскім раёне] // НТ. — 2004. — № 45. — С. 2; Няклюдава: [вёска ў Талачынскім раёне] // НТ. — 2004. — № 65. — С. 2; Слаўнае // НТ. — 2004. — № 69. — С. 2; Абольцы // НТ. — 2004. — № 103. — С. 2; Усе ў адным страі: [браты Хірэвічы] // НТ. — 2004. — № 37. — С. 2; Трагічны лёс партызанскай сям'і // НТ. — 2005. — № 9. — С. 3; З нагоды жалобы: [К. Рамановіч] // НТ. — 2005. — № 33. — С. 2; Наша мінуўшчына — гэта кожнага з нас пачаткі: [помнікі даўніны на Талачыншчыне] // НТ. — 2005. — № 64–65. — С. 4; Замошша // НТ. — 2005. — № 73–74. — С. 3; Такіх месцаў у нас няшмат: [ур. Скрыпуцёва] // НТ. — 2005. — № 85. — С. 4; Абольцы // НТ. — 2005. — № 86. — С. 2; Радзіма пачынаецца з роду // НТ. — 2006. — № 8. — С. 1; Пагорак памяці: [ур. Серкаўшчына] // НТ. — 2006. — № 12. — С. 2; Час перад памяццю бяссільны: [К. Рамановіч] // НТ. — 2006. — № 16. — С. 3; Кісялёва // НТ. — 2006. — № 27. — С. 3; Хранители нравственности: [цэрквы Талачыншчыны] // НТ. — 2006. — № 42. — С. 4; Толькі ў памяці жыве: [былы касцёл у в. Абольцы] // НТ. — 2006. — № 62. — С. 4; (разам з І. Пікулік) Аб вядомым і невядомым: [кнігі ў музеі] // НТ. — 2006. — № 67. — С. 3; Яны часоў мінулых слава: [ударнікі першай пяцігодкі] // НТ. — 2006. — № 75. — С. 2; Переименование улиц… Это до сих пор покоя не дает: [тапаніміка Талачына] // НТ. — 2007. — № 38. — С. 3; Каб любіць Беларусь нашу мілую… // НТ. — 2007. — № 78. — С. 4; Мемарыяльная дошка на радзіме героя: [Ф.К. Анташкевіч] // НТ. — 2008. — № 39. — С. 2; (разам з А. Лазука) Буторы. Храм Святых равноапостольных Петра и Павла // НТ. — 2008. — № 46. — С. 3; За Радзіму змагаўся юнак // НТ. — 2008. — № 53. — С. 2; Чароўны край — прасторы Серкавіц // НТ. — 2008. — № 78. — С. 4; Пошук вядзе далей, але кропку ставіць рана: [М. Звярковіч] // НТ. — 2008. — № 84. — С. 2; Свае таямніцы Друцк толькі пачынае адкрываць: [раскопкі кургана з масавым пахаваннем XI–XII стст.] // НТ. — 2008. — № 85. — С. 3.
Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Бірукоў В.М. (31.03.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**БОНДАР** МІКАЛАЙ (8.11.1962, в. Грыдні Нараўлянскага раёна Гомельскай вобл.), краязнаўца. Пераехаў у Бешанковіцкі раён пасля аварыі на ЧАЭС. Працаваў у раённым цэнтры пазашкольнай працы. Разам з вучнямі даследаваў гісторыю краю. Браў удзел у аднаўленні Свята-Нікольскай царквы ў в. Дабрыгоры Бешанковіцкага раёна. Сёння ён працягвае рэстаўрацыйную дзейнасць у г. Полацку. Жыве ў п. Ула Бешанковіцкага раёна.

Літ.: Мурашкина В. Дорога к своему храму: [М.Л. Бондар] // НС. — 2003. — № 97. — С. 4; Кавалеўскі С. Ула: [фота] // НС. — 2004. — № 134. — 6 ліст. — С. 5.



**БОНДАРАВА** АЛЕНА МІХАЙЛАЎНА (19.04.1980, в. Бабінавічы Лёзненскага раёна Віцебскай вобл.), архівіст. Скончыла СШ № 1 г.п. Лёзна (1997), гіст. факультэт ВДУ (2005). Працавала старшым інспектарам канцылярыі ў Інспекцыі дзяржаўнага падатковага камітэта па Лёзненскім раёне (2.12.1998–15.11.1999), архівістам, вядучым архівістам у ДАВВ (16.11.1999–12.02.2007), вядучым спецыялістам аддзела па архівах і справаводстве галоўнага ўпраўлення юстыцыі Віцебскага аблвыканкама (з 13.02.2007).

Краязнаўчую дзейнасць распачала пад час працы ў ДАВВ, пад уплывам работы з архіўнымі дакументамі, выконваючы службовыя абавязкі. Асноўнымі кірункамі краязнаўчых росшукаў з'яўляюцца гісторыя і культура Віцебшчыны, Лёзненшчыны, нацыянальныя меншасці, знакамітыя людзі, гісторыя канфесій роднага краю.

Адзін са складальнікаў кнігі «Витебск: Классика и Авангард». Адказны складальнік зборнікаў «Здесь павшие герои спят», «Краткий справочник о городских и районных архивах по личному составу Витебской области» (Витебск, 2008); «Тематический перечень документов. К 90-летию образования органов юстиции Витебской области» (Витебск, 2008). Брала ўдзел у падрыхтоўцы зборніка «Православная церковь на Витебщине (1918–1991): документы и материалы» (2006). Аўтар артыкулаў па гісторыі Віцебшчыны і Лёзненшчыны, якія змешчаны на старонках мясцовага перыядычнага друку. Некаторыя краязнаўчыя артыкулы змешчаны на сайце http://www.liozno.narod.ru.

Удзельнічае ў навуковых канферэнцыях (з 2005). Аўтар артыкулаў па гісторыі партыйна-дзяржаўнага, архіўнага будаўніцтва Віцебшчыны ў ХХ ст.

Брала ўдзел у падрыхтоўцы дакументальнага відэафільма «Герб и флаг Республики Беларусь», дзе рыхтавала сюжэт пра мастака Віцебскага мастацкага тэхнікума Валянціна Віктаравіча Волкава, які распрацаваў праект Дзяржаўнага герба БССР («Белорусский видеоцентр», аўтар сцэнарыя Г. Злабенка, рэжысёр В. Скварцова, 2005).

Тв.: Кнігі, артыкулы ў навуковым друку: Витебск: Классика и Авангард. История Витебского художественного училища в документах Государственного архива Витебской области (1918–1923) / сост. М.В. Пищуленок, Т.М. Свистунова, Т.В. Буевич [и др.]. — Витебск: ВОТ, 2004. — 336 с.; Здесь павшие герои спят: Перечень документов по организации перезахоронений воинов, партизан и жертв нацизма в послевоенное время / ред. кол.: Е.М. Бондарева (отв. ред.) [и др.]. — Витебск: ИП Синюкович Д.В., 2007. — 88 с.; Утварэнне і дзейнасць органаў кантролю на Віцебшчыне (1918–1934 гг.) // Актуальные проблемы новой и новейшей истории Европы и США: материалы Респ. науч. конф., Минск, 31 марта 2005г. / БГПУ; редкол. Г.А. Космач (науч. ред.) [и др.]. — Мн.: БГПУ, 2005; Становішча архіўнай справы і справаводства // АіС. — 2007. — № 6, 2008. — № 1. — № 3, 5.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Высочанский район 80 лет назад // СП (Л). — 2004. — 6 ліп. — С. 2; Из истории Лиозненщины (1924–1931) // СП (Л). — 2004. — 10, 17 ліп.; Латыши на Лиозненщине // СП (Л). — 2004. — 2 ліст. — С. 2; Евреи на Лиозненщине // СП (Л). — 2005. — 9 жніўня. — С. 2; Поляки на Лиозненщине // СП (Л). — 2005. — 10 верас. — С. 7; Из истории одной разрушенной церкви // СП (Л). — 2006. — 25 лют. — С. 2; Якуб Колас на Лёзненшчыне // СП (Л). — 2007. — 28 сак. — С. 7; На капитанском мостике: [першыя сакратары Віцебскага гаркама КПБ (1938–1991) і старшыні Віцебскага гарвыканкама (1938–2008) // ВВ. — 2008. — № 3.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Бондарава А.М. (27.11.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**БРУЕВА** ЛАРЫСА НАВУМАЎНА (24.02.1953, г. Віцебск), педагог. Старшыня Беларускай асацыяцыі пошукавых клубаў «Пошук». Скончыла ПТВ № 96 г. Віцебска. Працавала майстрам ў ПТВ № 96 (1969–1990), на розных пасадах у ВААППДіП (1990–2006).

Цікавасць да вывучэння роднага краю, турызму прывіла класны кіраўнік, кіраўнік турыстычнага клуба СШ № 3 г. Віцебска Ірына Рыгораўна Азеран. Прымаючы актыўны ўдзел у працы клуба, з 5-га класа ўдзельнічала ў шматлікіх паходах, паездках і экскурсіях па Віцебскай вобл., Беларусі і СССР. У час вучобы ў ПТВ № 96 працягвала займацца турызмам, спартыўным арыентаваннем. Вялікую ролю ў жыцці адыграў дырэктар вучылішча, заслужаны настаўнік БССР Міхаіл Філіпавіч Аронаў. Па яго прапанове, пасля заканчэння вучылішча засталася ў вучылішчы і адпрацавала 20 гадоў майстрам вытворчага навучання. Стварыла ў ПТВ турыстычны клуб «Искатель» (1969). Актыўна займалася




турыстычнай працай з моладдзю. Напрыклад, на працягу кожнага года праводзіліся 3 агульныя для вучылішча турзлёты (восень, зіма, вясна). На працягу 7 гадоў запар каманда вучылішча займала прызавыя месцы на рэспубліканскіх турыстычных спаборніцтвах.

Заняткі турызмам садзейнічалі ўключэнню ў больш актыўны пошукавы рух. У адным з паходаў па Беларусі пазнаёмілася з Маратам Рыгоравічам Гаравым, які адзін з першых на Беларусі стаў займацца пошукавай дзейнасцю. Наведаўшы музей, створаны ў адной з гомельскіх ПТВ, вырашыла заняцца пошукавай дзейнасцю больш сур'ёзна. У 1983 г. клубам было прынята рашэнне стварыць музей 953-га Віцебскага штурмавога авіяпалка. Пачалі працу па зборы матэрыялаў пра баявы шлях гэтага воінскага злучэння. У выніку шматгадовай дзейнасці ў ПТВ № 96 г. Віцебска быў створаны музей авіяпалка. У 1990 г. музею было нададзена званне народнага. Шляхам правядзення размоў з мясцовымі жыхарамі сталі шукаць месцы гібелі савецкіх самалётаў. Першы самалёт знайшлі каля в. Паляі Варонаўскага с/с Віцебскага раёна.

Актыўна ўключыўшыся ва Усесаюзны пошукавы рух, клуб стаў браць удзел у правядзенні Вахтаў Памяці. Л. Н. Бруева выступіла ініцыятарам і адным з арганізатараў пошукавага летніка аддзела народнай адукацыі на воз. Лосвіда (лета 1990). Стала ініцыятарам і арганізатарам стварэння асацыяцыі пошукавых клубаў Віцебскай вобл. (1990), потым і Беларускай арганізацыі. Арганізатар правядзення Вахт Памяці 1991 г. (в. Арлова), 1992 г. (в. Заронава), 1995 г. (Дубровенскі раён).

З мэтай каардынацыі дзейнасці пошукавых атрадаў вобласці і рэспублікі выспела рашэнне аб стварэнні рэспубліканскай асацыяцыі пошукавых клубаў. Па прапанове дырэктара РЦДЮТЭ Міністэрства адукацыі С.С. Мітраховіча такая асацыяцыя была створана на аснове віцебскага абласнога аб'яднання, якое уключала 12 пошукавых атрадаў і клубаў. Рэспубліканская асацыяцыя пошукавых клубаў «Пошук» («поисковые отряды школ, училищ, клубов») была зарэгістравана ў Міністэрстве юстыцыі ў сакавіку 1995 г. Прэзідэнтам стала Л.Н. Бруева, намеснікамі Мікалай Мікалаевіч Дубовік і Надзея Сцяпанаўна Астапенка.

Ініцыятар стварэння некалькіх помнікаў на тэрыторыі Віцебскай вобл.: лётчыкам 953-га штурмавога авіяпалка на 10-м кіламетры шашы Віцебск – Масква (непадалёк ад в. Вароны, дзе 3.02.1944 г. былі збіты 7 экіпажаў гэтай воінскай часці). У некалькіх вёсках Сенненскага раёна, на месцы танкавай бітвы 6–7.07.1941 г. (каля в. Чарнагосце), у гонар байцоў-салдат 1-й Маскоўскай штурмавой камсамольскай брыгады.

Суддзя рэспубліканскай катэгорыі па спартыўным арыентаванні.

Тв.: Кнігі: Пока не похоронен последний солдат: Из истории поискового движения в Витебской области: справочное издание. — Орша: Оршанская типография, 2009. — 496 с.; Пока не похоронен последний солдат: [электронны рэсурс]. — Віцебск, 2004. — Рэжым доступу: www.kraj.vitebsk.net/?page=vov&sod=_bru_00; Сборник документов и методических рекомендаций, регламентирующих деятельность общественного объединения «Белорусская республиканская ассоциация «Пошук» / сост. Бруева Л.Н. — Витебск. — 120 с.

Артыкулы ў перыядычным друку: Пошук вядзе «Шукальнік» // ВР. — 1990. — № 110. — С. 4; Поисковому клубу — 25 лет: [РВС] // НС. — 1996. — № 16. — С. 5; Памяць, жывая ў стагоддзях // ДнП. — 1996. — № 59. — С. 2; З далёкай станцыі Кардымаўская // ДнП. — 1996. — № 63. — С. 2; Куфцерын У. Даруйце нам, забытыя салдаты // ДнП. — 1997. — № 66. — С. 2; Нязгасны агонь «Вахты Памяці – 1997» на Дубровеншчыне // ДнП. — 1997. — № 74, 75, 77, 83, 87, 88; Ідзём дарогай слаўнаю // ГС. — 1998. — № 31. — С. 2.

Літ.: Шелухо В.Д. Дорогамі мужнасці і памяці. Заўсёды ў пошуку. З вопыту работы клубаў «Шукальнік» ПТВ-96 г. Віцебска і «Рамантык» Падсвільскай базы юных турыстаў Віцебскай вобл. — Мн.: Полымя, 1993. — 29 с.; Мартынов В. Пока не похоронен последний: [Л. Бруева] // НС. — 1995. — № 49. — С. 3; Інтэрв'ю Л.Н. Бруевай (21.09.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**БРУЦКІ** АНАТОЛЬ ПАЎЛАВІЧ (*Палескі* А.) (23.05.1949, в. Белавуша Столінскага раёна Брэсцкай вобл.), журналіст, краязнаўца. Скончыў філал. факультэт БДУ (1971). Член Беларускага саюза журналістаў (1982). Працаваў рэдактарам Шумілінскай раённай газеты «Герой працы» (1982–1989), прэс-сакратаром Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў (1990–1994), у апараце Віцебскага аблвыканкама (з 1994).

Аўтар шэрагу артыкулаў, змешчаных у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку («Веснік Глыбоччыны», «Віцебскі рабочы», «Герой працы», «Жыццё Прыдзвіння», «Народнае слова», «Патрыёт»), у якіх разглядае тапаніміку, легенды і паданні, гісторыю і культуру Віцебшчыны. Значнае месца ў публіцыстыцы займае апісанне мінулага краю, яго традыцый, лёс славутых землякоў і асоб, якія звязалі сваё жыццё з краем: А. Пальмбаха, Гіль-Радзіёнава, георгіеўскіх кавалераў — ураджэнцаў Віцебшчыны. Удзельнік творчых груп па падрыхтоўцы даведніка «У краі блакітных азёр» (Віцебск, 2000), гісторыка-дакументальных хронік «Памяць» Шумілінскага і Лёзненскага раёнаў. Шмат падарожнічае па Віцебшчыне.

Аўтар дакументальнай аповесці «Капкан для душагуба» (2001), у якой распавядае пра пошукі і выкрыццё маньяка Міхасевіча ў «Віцебскай справе». Шэраг матэрыялаў маюць вострую сацыяльна-гістарычную накіраванасць. Прыцягнуў увагу да месца растрэла супрацоўнікамі НКУС у ліпені 1941 г. калоны зняволеных каля в. Мікалаёва Шумілінскага раёна.

Тв.: Злыя дажджы // Публицисты / Е.Л. Семенович, Б.В. Стрельцов, Т.В. Соколовский. — Мн., 2000. — С. 59–76; «Помні імя сваё»: [адкыццё музея ў Шуміліна] // ГП. — 1986. — № 147. — С. 2; Нам засталася спадчына // ГП. — 1987. — № 65. — С. 2; (разам з У. Батаковым) Акадэмік Вышалескі // ГП. — 1987. — № 132. — С. 3; Тайна цёткі Домны: [в. Пронскія] // ВР. — 1990. — № 16. — С. 3; Адкуль ты, асілак: [Вялікі камень] // ВР. — 1990. — № 183. — С. 7; Твар у твар з праўдай. З хронікі 1978 і 1935 гадоў // ВР. — 1990. — № 109. — С. 2; Тройца — зялёныя святкі // ГП. — 1990. — № 66. — С. 4; На добрае здароўе, на добры век // ГП. — 1990. — № 78. — С. 4; Ой, рана ды на Яна // ГП. — 1990. — № 80. — С. 4; А ў цёмным лесе // ГП. — 1990. — № 117. — С. 4; «А ў цёмным лесе…» // ЛІ. — 1990. — № 154. — С. 4; У тую ноч я стаў сівым // ВР. — 1991. — № 2. — С. 3; Арыштаваны крыж // НС. — 1991. — № 37. — 2; (разам з С. Цярэнцевым) У пошуках хлеба і ісціны: [Я. Драздовіч] // ВР. — 1991. — № 114. — С. 3; Небольшой презент от фюрера: [лёс малалетняга вязня К. Малярова] // ГП. — 1991. — № 58. — С. 4; Земскі ўрач // ГП. — 1992. — № 58. — С. 2; А на небе зорак многа… // ВР. — 1992. — № 124. — С. 4; Святло памяці: [успаміны дзеда] // ГП. — 1993. — № 34. — С. 3; Партыйны анекдот: [з гісторыі палітычных даносаў] // НС. — 1995. — № 11, 12; Аляксандр-Бакшы, які нарадзіўся ў Дрысе: [А. Пальмбах] // НС. — 1997. — № 47, 48; Нам засталася спадчына: [Полацк] // НС. — 1997. — № 54. — С. 3; «Женат на газете»: [М.П. Кахно] // НС. — 1997. — № 80. — С. 2; Неизвестное о войне // НС. — 2000. — № 70. — С. 2; Чорная помста магната: [Дуброўна] // НС. — 2001. — № 38. — С. 5; Аляксандр-башкы, родам з Дрысы: [А. Пальмбах] // ДзП. — 2002. — № 13, 15–16, 17, 25, 41, 43; Шэленберг супраць Гіля // П. — 2004. — № 24, 26, 28; Калі неба плакала крывёй // ГП. — 2004. — № 42, 44; Лёс камбата Сапрыкіна // НС. — 2004. — № 56. — С. 5; Забытыя героі: [георгіеўскія кавалеры] // П. — 2005. — № 24. — С. 2; Забытыя героі: [георгіеўскія кавалеры — ураджэнцы Віцебшчыны] // ГП. — 2005. — № 67. — С. 7; Георгіеўскія кавалеры // ЛК. — 2005. — № 23. — С. 2; «Згубленая вайна»: [Першая сусветная вайна на Віцебшчыне] // НС. — 2005. — № 125. — С. 4–5; Дуброўна // НС; Белая царква // ЖП. — 2006. — № 10, 12; «… Чорны, белы і ніякі» // ЖП. — 2007. — 16, 23, 30 студз., 6, 13 лют. — С. 3; Замок і ключ // ЖП. — 2006. — № 41. — С. 3; Рукі на ўсе штукі // ЖП. — 2006. — № 46, 48, 52, 54, 56, 58, 60, 62; На дзедавых разлогах… // ЖП. — 2006. — № 74, 76, 78, 80; Гіль супраць Шэленберга // Беларуская ніва. — 2007. — Верасень; Сцежкамі прадзедаў // ЖП. — 2008. — № 43–46, 49, 51–53, 56, 58; У згодзе з прыродай // ЖП. — 2008. — № 77–79; Які бацька, такі сын // ЖП. — 2008. — № 87–90, 94, 96, 2009. — № 8,9; Хвалі і берагі: [гідраніміка Віцебшчыны] // ЖП. — 2008. — № 77. — 2009. — № 14, 18; Адкуль пайшла назва // ЖП. — 2009. — № 22, 24, 27, 30, 31, 32, 36; Імя ў спадчыну // ЖП. — 2009. — № 38–40, 44, 46, 48, 51, 53, 55.

Літ.: Бруцкий А.П. // Публицисты / Е.Л. Семенович, Б.В. Стрельцов, Т.В. Соколовский. — Мн., 2000. — С. 59; Звязаны лёсам // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебск: у 2-х кн. — Мн.: БелЭн, 2002. — Кн. 1. — С. 549.



**БУБАЛА** АНТОН ФРАНЦАВІЧ (27.10.1942. в. Гісялёва Асвейскага раёна Полацкай вобл. (цяпер Верхнядзвінскі раён Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыў Даўгаўпілскі дзяржаўны педагагічны інстытут (фізіка і тэхнічныя дысцыпліны) (1963), геаграфічны факультэт Дзяржаўнага педагагічнага інстытута г. Камсамольск-на-Амуры (1974, завочна). Працаваў у школах Рэзэкненскага раёна Латвіі (1963), служыў у СА (1963–1965), настаўнікам у СШ № 1 Верхнядзвінска (1966), СШ № 1 г. Амурска Хабараўскага


Не пакідайце ж мовы беларускай!

Рубон

№ 7 (24)
чэрвень 2002

Верхнядзвінскай раённай рады
Грамадскай арганізацыі ТАВАРЫСТВА
БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ІМЯ ФРАНЦЫСКА
СКАРЫНЫ

"Двина–Дзвіна–Даугава"

краю (1966–1976), Любіноўскай ВШ Міёрскага раёну (1969–1970), Асвейскай школе-інтэрнаце (1970), завучам Боркавіцкай СШ Верхнядзвінскага раёна (1976–1979), у Верхнядзвінскім райкаме КПБ (1979–1984), загадчыкам аддзела культуры Верхнядзвінскага райвыканкама (1984–1985), настаўнікам у Бароўскай школе (1985–1987), у рэдакцыі газеты «Дзвінская праўда» (1987–1989), у райкаме КПБ (1989–1991), інструктарам у Верхнядзвінскім райвыканкаме (1991–1994), настаўнікам у Шайтараўскай СШ Верхнядзвінскага раёна (1994–1995), у навукова-метадычным цэнтры пры аддзеле культуры, пры Верхнядзвінскім РДК (1995–1996), настаўнікам у Сенькаўскай школе (1995 – жнівень 2003), настаўнікам у Галубаўскай школе (2004–2007). Кіраўнік гурткоў пры цэнтры пазашкольнай працы (турызм, краязнаўства, арыентаванне, з 1995).

Краязнаўствам пачаў займацца з 1972 г., пад час навучання на геаграфічным факультэце, матэрыялы для кантрольных прац збіраў на радзіме. Важную ролю ў фарміраванні зацікаўленасці да роднага краю аказалі бацькі, асабліва бабуля, праз расказы пра мінулае, пра глухія мясціны, пра навакольныя рэчкі, пошук лекавых траў і г.д. Абуджалі цікавасць кнігі «Па слядах Рабінзона», «Палескія рабінзоны», «Прырода Беларусі» і інш. З канца 1980-х гг. значны ўплыў аказалі дзейнасць А.В. Куржалава, удзел у мерапрыемствах: канферэнцыях, семінарах, паездках.

Даследуе гісторыю і культуру Верхнядзвіншчыны, аддаючы перавагу наступным тэмам: славутыя землякі, цікавыя мясціны і прыродныя аб’екты, годныя статуса ахоўных; вайна 1812 г. на Верхнядзвіншчыне, «белыя плямы» на геаграфічнай мапе краю. Актыўна займаецца распрацоўкай турыстычных маршрутаў па раёне, праводзіць разведку на мясцовасці і сістэматызацыю выяўленай інфармацыі.

Адзін з арганізатараў навукова-практычных канферэнцый і краязнаўчых экспедыцый рэгіянальнага маштабу (школьных і міжшкольных) — «Па мясцінах “Асвейскай трагедыі”», «Па слядах вайны 1812 г.» і інш. Удзельнічаў у навукова-практычных канферэнцыях: «Радавод Лапацінскіх» (Сар’я, 2000), «500 год Асвеі» (Асвея, 2003), навукова-практычнай канферэнцыі да 160-годдзя І.Д. Чэрскага (Валынцы, 2006).

Падтрымлівае кантакты з Інстытутам гісторыі, ІМЭФ НАН Беларусі, Полацкім філіялам ДАВВ, Таўрычаскім музеем у Севастопалі, Калінкавіцкім краязнаўчым музеем, ТБМ імя Ф. Скарыны, БДТАПГіК, прыродаахоўнымі арганізацыямі, аддзеламі культуры, моладзі, спорту і турызму Верхнядзвінскага РВК, бібліятэкамі, народнымі клубамі, БРСМ і іншымі арганізацыямі.

Укладальнік кнігі «Памяць» Верхнядзвінскага раёна. Аўтар шэрагу артыкулаў, фотаздымкаў, мапаў, матэрыялаў да раздзелаў «Імі ганарацца землякі», «Іх шлях пралёг». Дзясяткі публікацый змяшчаліся ў раённай газеце «Дзвінская праўда» без подпісаў.

Аўтар, рэдактар кніг, брашур, буклетаў, календароў, камплектаў фотапаштовак, прысвечаных Верхнядзвіншчыне, сярод якіх адзначым: «Храмы и монастыри Полоцкой епархии», «Край Асвейскіх азёр», «Тут зоркі купаюцца ў чыстай вадзе» і інш.

У бюлетэні «Рабочы Дзвінскага памежжа» ў 2000 г. змясціў серыю з 15 артыкулаў пад назвай «Партызанская вайна», у 2001 г. апублікаваў серыі «Паданні роднае зямлі», «Што засталося ў памяці пра паноў». Лёсу рэпрэсаваных землякоў прысвечаны цыкл «Пакутлівая памяць Поўначы» (2001, № 1–5). Аўтар серыі крыжаванак, чайнвордаў і віктарын краязнаўчага характару «Ад А да Я». Складальнік спісаў рэпрэсаваных, загінуўшых у гады Другой сусветнай вайны землякоў. Аўтар артыкулаў у часопісе «Родная прырода», зборніку «Бацькаўшчына», газетах «Наша слова», «НН», «Звязда», «Туризм и отдых», «Дзвінская праўда», «Колокол Придвинья», «Рубон», «Рабочы Дзвінскага памежжа» і інш. Валодае прыгожай, сакавітай мовай, піша у высокамастацкім стылі. Паэт, аўтар некалькіх зборнікаў паэзіі.

Мае некалькі ненадрукаваных прац: «Падарожжы па Верхнядзвіншчыне», у якой змешчаны 33 распрацаваныя маршруты — пешыя, водныя, лыжныя, веласіпедныя, аўтамабільныя, конныя, комплексныя, а таксама апісанні, карты, ілюстрацыі, «Паданні нашае зямлі». Піша сцэнары і ўдзельнічае ў здымках відэафільмаў на розныя тэмы з жыцця раёна. Мае свае слайд-фільмы. З найлепшых, прысвечаных Верхнядзвінскаму раёну, — відэафільм «Глянь, на якой зямлі стаіш!», зняты да 60-годдзя вызвалення Верхнядзвіншчыны (аператар У. Казлоў).

Удзельнічаў у стварэнні шэрагу музеяў, выстаў, калекцый дзяржаўных арганізацый і ўстаноў, а таксама прыватных збораў. Некаторыя дакументы перадаў у розныя дзяржаўныя ўстановы: пратаколы сходаў камсамольскай арганізацыі калгаса «Бальшавік» Дрысенскага раёна ў ВАКМ, не ўключаныя ў кнігу «Памяць» матэрыялы (па ўсіх раздзелах, у тым ліку

энцыклапедыя населеных пунктаў, спісы рэпрэсаваных землякоў без скарачэнняў і інш.) у раённую бібліятэку; фотаматэрыялы, дакументы і лісты па тэматыцы Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі раёна, якія былі замоўлены для раённага музея — у аддзел культуры райвыканкаму. Дапамог даследчыцы з Украіны Л. Грыненцы ў пошуках месца нараджэння вядомага земляка К.К. Касцюшкі-Валюжыніча, заснавальніка Таўрычаскага музея старажытнасцяў у Севастопалі.

Актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця раёна. З'яўляўся старшынёй клуба «Шукальнік», ініцыятарам і арганізатарам правядзення «Снежных дэсантаў» на працягу 1980–1990-х гг. актыўны ўдзельнік клуба «Белыя вароны» ў в. Каханавічы. Ініцыятар, арганізатар правядзення і актыўны ўдзельнік раённых турзлётаў, пешых, водных паходаў па родным краі. У час падарожжаў праводзіць збор інфармацыі па гісторыі і культуры краю, займаецца добраўпарадкаваннем месцаў пахаванняў Другой сусветнай вайны.

Узнагароджаны граматай ЦК ВЛКСМ за працу «Эканоміка-геаграфічная характарыстыка Амурскага цэлюлозна-папяровага камбінату» (1973), граматай Міністэрства адукацыі БССР.

Тв.: Кнігі: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна / уклад. А.Ф. Бубала. — Кн. 1. — Мн.: Паліграфафармленне, 1999. — 528 с. — Кн. 2. — Мн.: БелЭн, 2002. — 648 с.; Храмы Верхнедвинщины: календарь на 2005–2006 гг. — Новополоцк: О.В. Молодечкин, 2004; Верхнедвинский край / ред. А. Бубала. — Новополоцк: О.В. Молодечкин, 2004; Храмы и монастыри Полоцкой епархии / ред. А. Бубала. — Новополоцк: О.В. Молодечкин, 2006; Край Асвейскіх азёр. — Наваполацк: А.У. Маладзечкін, 2007. — 30 с.; Тут зоркі купаюцца ў чыстай вадзе. — Наваполацк: А.У. Маладзечкін, 2008.

Артыкулы ў кнігах: Музей сялянскага побыту // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна: у 2-х кн. — Мн.: БелЭн, 1999. — Кн. 1. — С. 324; Палярнае ззянне над Верхнядзвінскам // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна: у 2-х кн. — Мн.: БелЭн, 2002. — Кн. 2. — С. 231; (разам з Б. Шымуком) Жыццё на передавой // Тамсама. — С. 253–254; Панізьнік Сяргей Сцяпанавіч // Тамсама. — С. 257–258; Бігосаўскі чыгуначны вакзал // Тамсама. — С. 264–266; Касцёл Раства Панны Марыі // Тамсама. — С. 268–269; Сядзіба ў вёсцы Вопытная // Тамсама. — С. 269–271; Жалобны арган Росіцы // Тамсама. — С. 272–274; Як гавораць на Верхнядзвіншчыне // Тамсама. — С. 279–380; Музеі Верхнядзвіншчыны // Тамсама. — С. 322–324; Наш родны кут // Тамсама. — С. 329–332; Гара Рагнеды // Бацькаўшчына. Зборнік гістарычнай літаратуры / уклад. С. Панізьнік. — Мн.: Юнацтва, 1999. — С. 358–562; Манькаў лужок, Халерная гара, Таямніца Банэта, Незвычайны начлежнік // Легенды і паданні Віцебшчыны: зборнік матэрыялаў абласнога конкурса «Легенды і паданні роднага краю» / склад. Н. Зайцава. — Віцебск, 2002. — С. 57–58, 65–66, 72, 74; Сапежанскія мясціны Верхнядзвіншчыны // Вялікі канцлер Вялікага княства. Да 450-годдзя з дня нараджэння Льва Сапегі: зб. матэрыялаў I Міжнародных Сапежанскіх чытанняў, 3–4 снежня, Брэст, II і III Рэспубліканскіх Сапежанскіх чытанняў у Віцебску–Астроўна, 28–29 чэрвеня 2003 г., 28–29 кастрычніка 2006 г.; склад., рэд. Г.М. Праневіч. — Мн.: І.П. Логвінаў, 2007. — С. 124–128.

Артыкулы ў перыядычным друку: «Блакітнымі сцяжынкамі памяці» (падарожжа па Сар'янцы) // ДзП. — 1984. — Май; Зорным маршрутам // ДзП. — 1985. — № 10. — С. 3; У памяці нашчадкаў // ДзП. — 1985. — № 21. — С. 2; Пісьмо з Ізраіля. Я нарадзілася яўрэйкай // ЛіМ. — 1986. — 23 жніўня. — С. 6; Пакланіся помніку, прахожы!: [в. Першамайская] // ДзП. — 1986. — № 61. — С. 2; Ад чыстых вытокаў. Падарожжа па рацэ Дрыса // ДзП. — 1986. — № 95, 99–102; Напрамак дзейнасці — жывая памяць // ДзП. — 1987. — № 32–33; Па водных шляхах: [па р. Вужыца] // ДзП. — 1987. — № 63. — С. 2, 3; Сцежкамі памяці // ДзП. — 1987. — № 105. — С. 3; «Хворыя» дарогі // ДзП. — 1987. — № 110–111; Хісткія масткі клопатаў: [сац. тэматыка] // ДзП. — 1987. — № 126. — С. 2; Вернасць роднай зямлі: [Замашанская воласць] // ДзП. — 1987. — № 127, 128; І ціха парк шуміць: [парк у в. Сар'я] // ДзП. — 1987. — № 130. — С. 2, 4; Не атруціць жывыя крыніцы: [экалагічнае становішча Верхнядзвіншчыны] // ДзП. — 1987. — № 131; Гаспадар — сам калектыў // ДзП. — 1987. — № 134. — С. 3; Каменных карункаў карагод: [касцёл] // ДзП. — 1987. — № 135, 137; Правалы ў памяці і сумленні // ДзП. — 1987. — № 136. — С. 3; Памяць сустрэч і растанняў: [вакзал у Бігосаве] // ДзП. — 1987. — № 145. — С. 2; (разам з С. Крыцкім) Стукае сэрца ў памяць // ДзП. — 1988. — № 2. — С. 3; Жалобны арган Росіцы // ДзП. — 1988. — № 27. — С. 3; Раніца калгаса «Брывіба» // ДзП. — 1988. — № 49. — С. 2; Песенны вянок Латгаліі // ДзП. — 1988. — № 51. — С. 3; Эстафета памяці // ДзП. — 1988. — № 52. — С. 3; Кветкі на граніце: [І. Чэрскі] // ДзП. — 1988. — № 55. — С. 2; У пасынках — школьны турызм // ДзП. — 1988. — № 76. — С. 2, 4; Не спыніцца ў шляху: [пошукавы рух у раёне] // ДзП. — 1988. — № 88. — С. 2; Пяе калыханку Дзвіна: Падарожжа водным шляхам ад вытоку Дзвіны да Верхнядзвінска // ДзП. — 1988. — № 111, 113, 115, 116–117, 122–126, 128, 133, 140, 145, 152. — 1989. — № 3; Ці пазнаюць нашчадкі: [жылыя дамы XIX ст. у Верхнядзвінску] // ДзП. — 1988. — № 124. — С. 3, 4; Пошук і пераадоленне: [Беларусь – Латвія] // ДзП. — 1988. — № 134, 143, 144; Пратаколы з вучнёўскага сшытку: [грамадскае жыццё ў 1930-я гг. у раёне] // ДзП. — 1989. — № 7, 8, 20, 31, 32, 36, 41, 42, 44, 48, 49; Прыйсці да роднай зямлі // ДзП. — 1989. — № 20, 27; Герастраты з 80-х: [разбурэнне старасвецкага будынку на ст. Вопытная] // ДзП. — 1989. — № 34. — С. 3; След на зямлі // ДзП. — 1989. — № 46, 50, 52, 53; Калі пагаслі кастры // ДзП. — 1989. — № 75. — С. 3; На востраве: [воз. Асвея] // ДзП. — 1989. — № 84. — С. 1, 2; Паставіць помнік // ДзП. — 1989. — № 120. — С. 2; Пакланіся магіле // ДзП. — 1990. — № 8. — С. 1, 2; Адрачэнне ці адраджэнне?: [стан помнікаў гісторыі і культуры ў Верхнядзвінскім раёне] // ДзП. — 1990. — № 31–32; Не папракайце ў абыякавасці: [палеміка адносна стварэння кнігі «Памяць»] // ДзП. — 1990. — № 77. — С. 3; «З варагаў у грэкі» // ДзП. — 1990. — № 88. — С. 2; Ці тая пазіцыя: [палеміка адносна кнігі «Памяць» і ўшанавання памяці загінуўшых землякоў] // ДзП. — 1990. — № 117. — С. 2; Ніхто не выйшаў на родны ганак // ДзП. — 1991. — № 10. — С. 3; (разам з Б.П. Шымуком) Нашы «дзяды Талашы» // ДзП. — 1991. — № 87. — С. 3; Помні імя сваё // ДзП. — 1991. — № 99, 101; Не паддацца спакусе // ДзП. — 1991. — № 102. — С. 2; Ля жалобных муроў Росіцы: [трагедыя] // ДзП. — 1993. — № 16. — С. 2, 3; Што ў імені табе маім?: [тапаніміка Верхнядзвінскага раёна] // ДзП. — 1993. — № 34. — С. 2; Шляхам нашых продкаў: [шлях «з варагаў у грэкі»] // ДзП. — 1993. — № 77, 78; Зоркі

над абеліскамі: [пра перапахаванне загінуўшых і фармалізм] // ДзП. — 1994. — № 12. — С. 2; А Бог на ўсіх адзін. Гісторыя аднаго помніка: [Сар'я] // ДзП. — 1994. — № 31, 34, 38, 45–47, 54; Дык чаго крычым: [палеміка адносна пазіцыі БНФ] // ДзП. — 1994. — № 42. — С. 2; След на зямлі // ДзП. — 1994. — № 46, 50, 52, 53; На Радзіме маёй абеліскі святыя… // ДзП. — 1994. — № 54, 55, 56; Паўночныя азёры // НГ. — 2006; Не зычце залатыя горы: адносна праекта будаўніцтва цэлюлозна-папяровага камбінату // ДзП. — 1993. — № 50; Дзе сэрца Асвея лагодзіць // РП. — 1996. — № 4 — С. 7–8; У пошуку французскай магілы // ДзП. — 2006. — № 70; Вяртанне на радзіму: К. Касцюшка-Валюжыніч заснавальнік Таўрычаскага музею // ДзП. — 2006. — № 89, 94, 98, 105; Дзе памяць пакінула след: Краязнаўчая вандроўка па Свальнянскіх лясах // ДзП. — 2006. — № 101; Дакапацца да каранёў: археалагічныя знаходкі // ДзП. — 2007. — № 3; Глыбокія карані: [род Сартаковых на Дрысеншчыне] // ДзП. — 1999. — № 3. — С. 2; Крыважэрнае аблічча вайны // ДзП. — 1999. — № 35. — С. 2; Блакітныя вочы азёр // Рубон. — 2002. — № 1. — С. 1, 2; З душою чыстаю і чуткай: [паэт В. Барташэвіч] // Рубон. — 2002. — № 2; Мястэчка маё: [сцэнар да відэафільму пра Верхнядзвінск] // Рубон. — 2002. — № 3, 4; Гошка-жартун // Рубон. — 2002. — № 6. — С. 2; Ля восеньскіх кастроў // ДзП. — 2003. — № 93. — С. 3; Мы ідзем па зямлі // ДзП. — 2004. — № 86. — С. 3; Знаходкі турыстычнай восені // ДзП. — 2004. — № 100. — С. 2; Будзе конік да рання цікаць заведзенай мінай: [тэма вайны ў літаратараў Верхнядзвіншчыны] // ДзП. — 2005. — № 37. — С. 2; Землякі-сібіракі: [паэт В. Бураў, які ў Сібіры піша па-беларуску] // Рубон. — 2005. — № 33, 34; Сапега на Верхнядзвіншчыне // Рубон. — 2006; Край неразгаданых таямніц: [падарожжа ўздоўж «кацярынінскага шляху»] // ДзП. — 2007. — № 66, 70, 72, 76–80, 82, 83; «Белыя вароны» зладзілі свята // ДзП. — 2007. — № 85. — С. 3; Заклік да дзейнасці — загад Памяці // ДзП. — 2007. — № 102, 103; Зіма турыстаў не палохае // ДзП. — 2008. — № 5. — С. 2; «На ганку» раённага музея // ДзП. — 2008. — № 27. — С. 2; Каб не патанулі скарбы: [меркаванні адносна будаўніцтва гідраэлектрастанцыі на Дзвіне] // ДзП. — 2008. — № 29. — С. 3; Свята турыстычна-краязнаўчае // ДзП. — 2008. — № 89–90.

Літ.: Няхай слова справай адзавецца. Сустрэча з выбаршчыкамі: [інтэрв'ю кандыдата ў дэпутаты А. Бубалы] // ДзП. — 1990. — № 23. — С. 2, 3, 4; «Памяць» для нашай памяці // ДзП. — 1991. — № 63. — С. 1, 2; Герасімёнак А. Гісторыю без скажэнняў: [палеміка] // ДзП. — 1994. — № 57, 60, 63; Пакульніцкая Я. Да Антося на сяло // ДзП. — 1994; Пакульніцкая Я. Час збіраць камяні: [180 г. І. Храпавіцкаму] // ДзП. — 1997. — № 79. — С. 1, 2; Шпакоўская Г.І. Бубала! // НС. — 1997. — 25 кастр. — С. 3; Глацёнак Н. Ад родных вытокаў: [60 год А. Бубала] // ДзП. — 2002. — № 86. — С. 2; Шпакоўская Г. Інтэрв'ю на Халернай гары: [А.Ф. Бубала, паданні Верхнядзвіншчыны] // НС. — 2002. — № 106. — С. 6; Шпакоўская Г. Краязнаўства — рухавік турызму // НС. — 2006. — 11 лют.; Пакульневіч Я. Якім быць раённаму музею? // ДзП. — 2008. — № 6. — С. 2.



**БУБЕНЬКА** ТАЦЦЯНА СТАНІСЛАВАЎНА (8.06.1957, г. Беразіно Мінскай вобл.), археолаг. Кандыдат гіст. навук (1991). Скончыла гіст. факультэт БДУ (1980). Працавала ў Інстытуце гісторыі АН БССР (НАН Беларусі) (1977–1994), загадвала сектарам аховы помнікаў і археалогіі Віцебскага гарвыканкама (1994–1998). Працуе ў ВДУ (з 1998).

Вывучае гарадскія і сельскія паселішчы Беларусі IX–XVIII стст. Даследавала археалагічныя помнікі ў Віцебскім, Лепельскім, Чашніцкім раёнах Віцебскай вобл. Праводзіла раскопкі Віцебскага Ніжняга замка (1981–1985, 1987–1989, 1991–1993). Асаблівы аб'ект навуковых зацікаўленасцяў — сярэднявечны Віцебск, Ніжні замак Віцебска. Абараніла кандыдацкую дысертацыю «Посад Витебска X – первой половины XIV в. (по материалам исследований Нижнего замка)» (Л., 1991). Знайшла падмуркі каменнай Нарожнай вежы віцебскага Ніжняга замка, што пацвердзіла звесткі з летапісных крыніц пра існаванне каменных замкаў у горадзе.

Адзін з аўтараў навучальнага дапаможніка «История и материальная культура г. Витебска (X–XVIII вв.)». Аўтар шэрагу публікацый, прысвечаных гісторыі і археалогіі старажытнага і сярэдневяковага Віцебска.

Тв.: Кнігі: Средневековый Витебск. Посад — Нижний замок (X – первая половина XIV в.). — Витебск: ВГУ, 2004. — 276 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Гарадзішча, курганны могільнік: [в. Гара Чашніцкага раёна] // ЗПГіКБ. Віцебская вобл. — Мн.: БелСЭ, 1985. — С. 445–446; Курганныя могільнікі (в. Гогалеўка) // Тамсама. — С. 446; (разам з В.Б. Караткевіч) Гарадзішча, курганны могільнік: [в. Грынькі Чашніцкага раёна] // Тамсама. — С. 446; (разам з В.Б. Караткевіч) Гарадзішча: [в. Дварэц Чашніцкага раёна] // Тамсама. — С. 446–447; Гарадзішча: [в. Малая Вядрэнь Чашніцкага раёна] // Тамсама. — С. 449; Селішча: [в. Падрэзы] // Тамсама. — С. 451; Гарадзішча: [в. Рудніца] // Тамсама. — С. 452; Курганныя могільнікі: [в. Рыжанкі, Сіманавічы] // Тамсама. — С. 452; Гарадзішча: [в. Ясяноўкі Чашніцкага раёна].

Артыкулы ў навуковым друку: Раскопки окольного города феодального Витебска // АО-1982. — М., 1984. — С. 348–349; (разам з Л. Калядзінскім) Шахматы и шашки в средневековом Витебске // Шахматы, шашки БССР. — 1984. — № 4. — С. 9; Исследования в Витебске // АО-1983. — М., 1985. — С. 382–383; Исследования в Витебске // АО-1984. — М., 1986. — С. 338–339; Исследования Витебского отряда // АО-1985. — М., 1987. — С. 445–446; (разам з М.А. Ткачовым, Л.У. Калядзінскім) Средневековый Витебск // Труды V Международного конгресса славянской археологии. — М., 1987. — Т. 3. — Вып. 1б; Посад Витебска X – первой половины XIV в. (по материалам исследований Нижнего замка): автореф. дисс… канд. ист. наук. — Л., 1991; Жыллё феадальнага Віцебска // З глыбі вякоў. Наш край: гісторыка-культуралагічны зборнік. — Мн.,

1992. — № 1. — С. 46–68; Ювелірныя ўпрыгожванні Віцебска X–XIV стст. (па матэрыялах даследаванняў Ніжняга замка) // Тамсама. — С. 110–131; (разам з М.А. Ткачовым) Да пытання аб каменных умацаваннях Дольнага замка Віцебска // Гісторыка-археалагічгы зборнік. — Мн., 1993. — № 2. — С. 153–161; Крыж XVI ст. з Віцебска // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння. — Мн., 1994. — С. 245–248; (разам Хмяльніцкай Л.У.) Кафля з гербамі Агінскіх з Віцебска // Гісторыка-археалагічгы зборнік. — Мн., 1994. — № 3. — С. 115–121; Да пытання аб лакалізацыі царквы Святой Параскевы Пятніцы ў Віцебску // Віцебскі сшытак. — 1995. — № 1. — С. 5–7; (разам Л. Хмяльніцкай) Кафля з гербамі Агінскіх з Віцебска // Тамсама. — С. 63–64; Планировка и застройка посада средневекового Витебска, X–XIV вв. // Гісторыка-археалагічгы зборнік. — Мн., 1996. — № 8. — С. 57–65; Кожаная обувь средневекового Витебска XII–XVIII вв. (по материалам исследований Нижнего замка) // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі: Новыя матэрыялы і даследаванні. — Мн., 1993. — С. 127–131; Социотопографическая структура посада средневекового Витебска X – первой половины XIV в. // Славянский средневековый город. Труды VI Международного конгресса славянской археологии. — М., 1997. — Вып. 2. — С. 23–30; Стеклянные украшения средневекового Витебска (по материалам раскопок Нижнего замка) // Материалы по археологии Беларуси. — Мн., 2001. — № 3. — С. 154–164; Оружие и предметы военного снаряжения средневекового Витебска // Материалы международной научно-теоретической конференции «Славянский мир и славянские культуры в Европе и мире: место и значимость в развитии цивилизаций и культур (история, уроки, опыт, современность)». — Витебск, 2002. — С. 179–181; Кузнечное ремесло средневекового Витебска // Актуальный праблемы гісторыі Беларусі, перспектывы развіцця: матэрыялы рэспуб. навук канф.: у 4 ч. Ч. 1. — Гродна, 2003. — С. 283–289; Камнесечное дело средневекового Витебска // История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур: материалы международной научно-теоретической конференции. — Витебск, 2003. — С. 414–416.

Літ.: Матэрыялы Бубенькі Т.С. (артыкулы, біяграфія) // НА ВАКМ 1174; Бубенька Т.С. // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. — Мн.: БелЭн, 1993. — С. 103; Звязаны лёсам // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебска: у 2-х кн. — Мн.: БелЭн, 2002. — Кн. 2. — С. 549; Фенченко А. Татьяна Бубенько: «Археология — моя судьба» // ВК. — 2005. — № 19. — С. 3.

**БУЕВІЧ** ТАЦЦЯНА УЛАДЗІМІРАЎНА, намеснік дырэктара ДАВВ. Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў навуковым і перыядычным друку.

Тв.: Артыкулы ў навуковым друку: Особенности документов по личному составу партийных комитетов областных партийных организаций (на примере Витебского обкома КПБ) // АіС. — 2004. — № 4. — С. 95–98; История освобождения Витебщины в документах военных комитетов КПБ // Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, 24 чэрвеня 2004 г. — Віцебск: ВДУ. — С. 86–90; О событиях Великой Отечественной войны на Витебщине // Быў подзвіг. І была Перамога: матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаных 60-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, Мінск, 12 мая 2005 г. / адк. рэд. Ю.У. Несцяровіч, У.В. Фядосаў. — Мн.: БелНДІДАС, 2005. — С. 36–40; История освобождения Витебщины в документах военных комитетов КПБ // Выстояли и победили: свидетельствуют архивы. — Витебск: ГУ ГАВО, 2005. — С. 21–23; История создания и деятельность истребительных отрядов на Витебщине // Тамсама. — С. 38–40.

Артыкулы ў перыядычным друку: Из истории ничего не вычеркнуть // Віцьбічы. — 2000. — 15 лют.; Они были первыми // Віцьбічы. — 2000. — 28 крас., 11, 18 мая; Райкомы возглавляли люди труда // Віцьбічы. — 2000. — 15 чэрв., 24 жніўня; О благих намерениях и о работе без выходных и праздников // Вечерний Витебск. — 2000. — 5 жніўня; «Театр уж полон…» // Віцьбічы. — 2001. — 25 сак.; Промышленность Витебска в 20-е гг. // Віцьбічы. — 2001. — 13 крас.; Промбанк и Комбанк // Віцьбічы. — 2001. — 25 кастр.

**БУКА** АЛЯКСАНДР ВІКТАРАВІЧ (7.08.1988, г. Валга Эстонскай ССР). Скончыў ліцэй БДУ, юрыдычны факультэт БДУ. Краязнаўчую дзейнасць распачаў у лютым 2005 г. Даследуе гісторыю вёскі Залескі Глыбоцкага раёну. Напісаў рэферат «Гісторыя в. Залескі ў гады Вялікай Айчыннай вайны».

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Бука А.В. (30.03.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**БУКІНА** АЛА АЛЯКСАНДРАЎНА (12.12.1933, г. Ленінград). Скончыла СШ № 10 г. Віцебска (1952), геолага-геаграфічны факультэт БДУ (1957). Працавала выкладчыкам геаграфіі ў Бабыніцкай СШ Ветрынскага (цяпер Полацкага) раёна (1957–1961), на пасадах загадчыка аддзела прыроды, ст. навуковага супрацоўніка, гал. захавальніка фондаў ВАКМ (1962–2002). Працавала экскурсаводам у Віцебскім экскурсійным бюро (1970–1995), гал. захавальнікам фондаў ВРГКМ (2003–2009).

Займацца краязнаўчай дзейнасцю пачала ў 1962 г., з паступленнем на працу ў ВАКМ. Пэўны ўплыў на фарміраванне зацікаўленасці зрабілі Вольга Філіпаўна Якушка і Анатоль Максімавіч Дарафееў. Асноўнымі тэмамі даследавання з'яўляюцца прырода Віцебшчыны, гісторыка-дакументальная спадчына рэгіёна. Прыняла ўдзел у стварэнні экспазіцый «Геалогія Віцебшчыны», «Ахова прыроды Віцебскай вобл.» ВАКМ, распрацавала тэматыка-экспазіцыйны план музея П.М. Машэрава ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце.

Брала актыўны ўдзел у навукова-практычных канферэнцыях, прысвечаных розным пытанням краязнаўства. Аўтар артыкулаў, прысвечаных помнікам прыроды і ахоўваемым тэрыторыям Віцебшчыны, І.П. Сікору ў «Энцыклапедыі прыроды Беларусі». Склала для

энцыклапедычнага даведніка «Витебск» артыкулы, прысвечаныя геаграфіі, ахове прыроды ў Віцебскай вобл. Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў навуковым, рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Артыкулы ў навуковым друку: Памятники природы Витебщины: [буклет]. — Витебск: Типография им. Коминтерна, 1976; Браславский природный комплекс в Белорусском Поозерье // Краткие тезисы докладов к практической конференции «Памятники природы Псковской области и их охрана». — Псков, 1979; Віцебск // Энцыклапедыя прыроды Беларусі. Т. 1. — Мн.: БелЭн, 1983. — С. 446; Віцебская вобл. Прыродакарыстанне і ахова прыроды // Тамсама. — С. 468; Віцебскі раён. Прыродакарыстанне і ахова прыроды // — С. 471–472; (разам з Е. Кічынай) Дыпломы расказваюць: [садавод Я.К. Мароз] // ПГіКБ. — 1984. — № 4. — С. 37–38; Партрэты Эльжбеты і Антонія Пузынаў з касцёла ў Лучаі // Віцебскі сшытак. — 1995. — № 1. — С. 58–59; Музей Антона Брадоўскага ў Віцебску // Віцебскі сшытак. — 2000. — № 4. — С. 202–205; Музейная спадчына Віцебска // Тамсама. — С. 206; (разам з В. Шышанавым) К истории нумизматической коллекции А.Р. Бродовского // Десятая Всероссийская нумизматическая конференция, Псков, 15–20 апреля 2002 г.: тез. докл. и сообщ. — М., 2002. — С. 303–304.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: (разам з Н. Лагойка) Из сокровищ старой ратуши: [нумізматычная калекцыя ВАКМ] // ВК. — 1991. — № 20. — С. 6; Пошлина на бороды // НС. — 1993. — № 63. — С. 5; Во врата грядущих времен: [медалі] // НС. — 1993. — № 74. — С. 4; Старинные часы // НС. — 1993. — № 122. — С. 3; Трубка с портретом любимой // НС. — 1993. — № 138. — С. 3; Чудо-самовар // НС. — 1994. — № 23. — С. 5; Литографический камень // НС. — 1994. — № 54. — С. 3; Рыцарский пояс XVII века // НС. — 1997. — № 141. — С. 5; Белорусский Мичурин из Фатыни // НС. — 2003. — № 30 (1736). Рыцарский пояс XVIII века // НС; Музей: Сбор экспонатов // ЖП. — 2003. — № 28. — С. 2; Беларуский Мичурин из Фатыни: [К. Мароз] // НС. — 2003. — № 30. — С. 5; Хранилище истории: [ВРКМ] // ЖП. — 2006. — № 36. — С. 4.

Літ.: Ковалевская О. Создается музей района: [ВРКМ] // НС. — 2003. — № 152. — С. 5; Інтэрв'ю з А.А. Букінай (1.06.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**БУНТО** ВІКТАР ЕЛІСЕЕВІЧ (*В. Елісееў*) (20.11.1961, г. Дзісна Міёрскага раёна Віцебскай вобл.), педагог, краязнаўца. Скончыў геаграфічны факультэт БДУ (1984). Працуе настаўнікам геаграфіі Кансталінскай БШ Браслаўскага раёна. Краязнаўчыя даследаванні пачаў праводзіць з 1994 г. Значны ўплыў на фарміраванне зацікаўленасці аказаў родны дзядзька, вядомы краязнаўца Глыбоччыны Я. Бунто, а таксама супрацоўнік Браслаўскага музейнага аб'яднання К. Шыдлоўскі.

Даследуе гісторыю і экалогію Браслаўшчыны. Выявіў шэраг помнікаў геалогіі на Браслаўшчыне. Удзельнічаў у складанні кнігі «Памяць» Браслаўскага раёна. Арганізатар краязнаўчых вандровак па тэрыторыі Браслаўшчыны, у час якіх вывучае помнікі геалогіі і археалогіі. Аўтар артыкулаў у навуковым («Браслаўскія чытанні») і мясцовым перыядычным друку («Браслаўская звязда», «Павет»), а таксама ў інтэрнэце. Жыве ў в. Пагошча Браслаўскага раёна.

Тв.: Таямніца трагедыі Лабэцкіх // Браслаўскія чытанні: матэрыялы V навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 939-годдзю першай згадкі Браслава ў пісьмовых крыніцах. — Браслаў – Наваполацк: Усяслаў Чарадзей, 2001. — С. 12–14; Тыдзень на раскопках // БЗ. — 1999. — № 61. — С. 3, 4; Камень-волат ля вёскі Латочкі // Павет. — 2002. — № 7–8 (11–12). — С. 8, 11; Браслаўскі камень — волат: [Вількавіцкі камень] // БЗ. — 2003. — № 4. — С. 3; Бываліцы, запісаныя Віктарам Бунтам // Павет. — 2003. — № 4 (17). — С. 7; Паляўнічыя за валунамі // Павет. — 2003. — № 9 (22). — С. 7–8; Дзезерціры // Павет. — 2003. — № 11 (24). — С. 5, 7; Раскопкі курганнага могільніка Пагошча // Павет. — 2005. — № 8 (45). — С. 4.

Літ.: Скалабан В. Сучасныя беларускія краязнаўцы // КГ. — 2005. — № 12 (77). — С. 2.



**БУНТО** ІОСІФ (Язэп) УЛАДЗІМІРАВІЧ (22.07.1926, в. Мацюкі Чарэскія Браслаўскага пав. Віленскага ваяв., цяпер в. Беларуская Дварнасельскага с/с Міёрскага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыў пачатковую школу ў в. Дварнасельская (1941), вучыўся ў беларускай гімназіі ў г. Індра, Латвія (1942–1944), скончыў БІНГ (1963). Працаваў інструктарам-рэвізорам у Пліскім райспажыўсаюзе (1958–1959), рэвізорам упраўлення гандлю Маладзечанскага аблвыканкама (1959–1960), ст. рэвізорам Глыбоцкага райспажыўсаюза, ст. юрысконсультам (1960–1986).

Усё свядомае жыццё цікавіцца гісторыяй краю. Значны ўплыў на фарміраванне любові да Радзімы, свайго краю аказала вучоба ў беларускай гімназіі ў Індры (Латвія) 1942–1944 гг., і асабліва

настаўнік гісторыі Аўген Аніська. Браў удзел у зборы фальклорнага матэрыялу, які потым быў змешчаны ў кнізе Мішуціна «Обычаи и обряды русского населения в Латгалии». Больш арганізаваную краязнаўчую дзейнасць распачаў у 1970 г., калі пачаў вывучаць архіўныя дакументы і збіраць гістарычную літаратуру. Актыўна пачаў займацца краязнаўчымі даследаваннямі і публікацыяй матэрыялаў пасля выхаду на пенсію (з 1990).

З той прычыны, што па пашпарце быў запісаны палякам, у войска адразу ў 1944 г. не забралі (бралі толькі з 20 гадоў). Быў мабілізаваны на аднаўленчыя работы ў г. Полацк (будавалі будынак аблвыканкама). Быў абвінавачаны ў антысавецкай прапагандзе і асуджаны па артыкуле 58 п. 10 на дзесяць гадоў выпраўленчых работ. Пакаранне адбываў ў Архангельскай вобл. Адсядзеў 4 гады (1949–1952). Пазней справа была перагледжана і судзімасць скасавана.

Комплексна вывучае гісторыю Глыбоччыны, Міёршчыны, Браслаўшчыны і тых рэгіёнаў, якія ўваходзілі ў Браслаўскі і Дзісненскі паветы ІІ Рэчы Паспалітай, жыццёвы шлях вядомых дзеячаў Зах. Віцебшчыны, падзеі паўстанняў 1830–1831 гг. і 1863 г. на Браслаўшчыне і Дзісеншчыне. Удзельнік шэрагу краязнаўчых канферэнцый, сярод якіх: Браслаўскія чытанні (1994, 1997, 2000, 2003), Дзісненскія чытанні (1996), навукова-краязнаўчых чытанняў у г. Глыбокім (1991, 1999), чытанняў, якія ладзяцца культурна-асветніцкім цэнтрам імя Я. Драздовіча (в. Германавічы).

Браў удзел у падрыхтоўцы выдання «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі». Выяўляў матэрыялы пра помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры Глыбоцкага раёна. Склаў спіс рухомых і нерухомых каштоўнасцяў Глыбоцкага раёна і падрыхтаваў даведкі пра іх. Падрыхтаваў спіс літаратуры па гісторыі былых Дзісненскага і Браслаўскіх пав. (больш 350 найменняў). Аднак з падрыхтаванага для абмеркавання двухтомнага макета [Помнікі Віцебскай вобл. Макет для абмеркавання. Мн., 1981. Т. 1, 668 с. Т. 2, 645 с.] шмат інфармацыі было выключана па ідэалагічных меркаваннях і з-за значнага аб’ёму падрыхтаваных матэрыялаў (рухомыя помнікі (іконы), месцы здзяйснення подзвігаў і інш.). З мэтай выяўлення інфармацыі пра гісторыка-культурныя каштоўнасці краю працаваў у архівах і бібліятэках БССР, а таксама г. Вільнюса ў Літве. Цікавы факт: калі прыехаў у Вільнюскі архіў, каб падрыхтаваць матэрыялы для «Збору», атрымаў адмову ад загадчыка ў выдачы патрэбных спраў. Выказаў начальніку папрок і адзначыў, што калі адбываў пакаранне ў лагеры, літоўцы заўжды прыязна ставіліся да беларусаў. Пасля гэтага быў атрыманы дазвол і аказана ўсялякая падтрымка.

Удзельнічаў у навуковым жыцці краіны, пісаў рэцэнзіі. Напрыклад, пасля таго, як даслаў у рэдакцыю «Беларускай энцыклапедыі» аналіз памылак, якія былі дапушчаны пры выданні «Гісторыі БССР», атрымаў падзяку рэдактара, ганарар, а таксама прапанову супрацоўнічаць. Дапамагаў навукоўцам (Г.В. Штыхаву) у падрыхтоўцы навуковых артыкулаў, удакладненні акалічнасцяў, а таксама, аказаў дапамогу ў зборы матэрыялаў, у падрыхтоўцы шэрагу прац мясцовым і замежным краязнаўцам (К. Шыдлоўскаму, У. Скрабатуну, К. Шыталю, Я. Забэле і інш.).

Заказваў і набываў усе выданні, якія былі звязаны з гісторыяй Беларусі. Часта бываючы ў камандзіроўках, набываў букіністычную літаратуру, якая мела дачыненне да гісторыі Віцебшчыны. Праз міжбібліятэчны абанемент выпісваў рэдкія дарэвалюцыйныя выданні, польскія кнігі міжваеннага перыяду з Масквы, Ленінграда, рабіў копіі матэрыялаў па гісторыі Заходняй Віцебшчыны.

Браў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы кнігі «Памяць» Глыбоцкага раёна. Напісаў шэраг артыкулаў. Значная колькасць матэрыялаў па гісторыі раёна XVI–XVIII стст., сабраных і падрыхтаваных асабіста, ляглі ў аснову артыкулаў, напісаных для кнігі навукоўцамі з Інстытута гісторыі НАН Беларусі.




Аўтар артыкулаў у «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», «Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобл.», бюлетэні «Нашы карані» (Паставы). Апублікаваў шэраг матэрыялаў у перыядычным і мясцовым друку: газетах «Народнае слова», «Веснік Глыбоччыны», «Вольнае Глыбокае», «Браслаўская звязда», «Кліч Радзімы» (Шаркоўшчына), «Сцяг працы» (Міёры).

Падрыхтаваў да друку працу «Гісторыя Чарэскага краю XVI–XX стст.». Сабраў калекцыю кніг па гісторыі Беларусі, геаграфічных карт Браслаўска-Дзісненскага рэгіёна, выдадзеных у XVII–XX стст. на польскай і расейскай мовах: [ЭГБ. Т. 4. С. 22]. Зрабіў пераклад з польскай мовы кніг О. Гэдэмана «Глыбокае»,

«Школа валяр'янаўскіх піяраў Лужэцкіх». Адзін з найбольш аўтарытэтных краязнаўцаў Глыбоцкага краю.

Тв.: Артыкулы ў энцыклапедыях і кнігах «Памяць»: (разам з У.В. Алісейчык) Дзісна // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. — Мн., 1985. — С. 306–307; Беразвечча // ЭГБ. Т. 2. — Мн., 1994. — С. 16; (разам з В.Л. Насевічам) Галубічы // ЭГБ. Т. 2. — Мн., 1994. — С. 458–459; Глыбоцкі раён // ЭГБ. Т. 3. — Мн., 1996. — С. 52–53; Дзісна // ЭГБ. Т. 3. — Мн., 1996. — С. 231; Лужкі // ЭГБ. Т. 4. — Мн., 1997. — С. 396; Міёрскі раён // ЭГБ. Т. 5. — Мн., 1999. — С. 130–131; Мосар // ЭГБ. Т. 5. — Мн., 1999. — С. 222; Новы Пагост // ЭГБ. Т. 5. — Мн., 1999. — С. 333; Падсвілле // ЭГБ. Т. 5. — Мн., 1999. — С. 375; Пераброддзе // ЭГБ. Т. 5. — Мн., 1999. — С. 463; Пліса // ЭГБ. Т. 5. — Мн., 1999. — С. 513; Празарокі // ЭГБ. Т. 5. — Мн., 1999. — С. 561; Свіла // ЭГБ. Т. 6. Кн. 1. — Мн., 2001. — С. 260; (разам з А.П. Кур'яновіч, А.А. Тарыкавым) Старонка мінулага // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 31–39; Род Корсакаў і яго роля ў гісторыі Глыбоччыны // Тамсама. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 73–74; Паўстанне 1831 г. на Глыбоччыне // Тамсама. — С. 75–77; Паўстанне 1863 г. на Глыбоччыне // Тамсама. — С. 86–87; З гісторыі населеных пунктаў Глыбоччыны // Тамсама. — С. 438–445.

Артыкулы ў навуковым друку: Тайна Беразвецкай турмы // Браслаўскія чытанні: матэрыялы III навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 200-м угодкам паўстання 1794 года, 21–22 красавіка 1994 г. — Браслаў, 1994. — С. 6–7; Аб пабудове чыгункі Варапаева – Друя // Браслаўскія чытанні: матэрыялы IV навукова-краязнаўчай канферэнцыі, 24–25 красавіка 1997 г. — Браслаў, 1997. — С. 90–92; Ваенныя падзеі 1920 года на тэрыторыі Браслаўска-Дзісненска-Глыбоцкага рэгіёна // Браслаўскія чытанні: матэрыялы VI навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 150-й гадавіне з дня нараджэння браслаўскага лекара, грамадскага дзеяча Станіслава Нарбута (1853–1926), 7–8 мая 2003 года. — Браслаў, 2003. — С. 12–13.

Артыкулы ў перыядычным друку: Паўстанне 1831 года і Мураўёў на Глыбоччыне // ВГл. — 1991. — № 97, 98, 99; Таварыства беларускай школы ў 30-я гады // ВГл. — 1992. — № 71. — С. 2; Беларуская сялянска-работніцкая грамада на Глыбоччыне // ВГл. — 1993. — № 47. — С. 2; Памятныя дні 1944 г. // ВГл. — 1993. — № 52. — С. 3; Яўрэі на Глыбоччыне // ВГл. — 1993. — № 61. — С. 2; Паўстанне 1863 г. на Глыбоччыне // ВГл. — 1993. — № 68. — С. 2; Род Корсакаў і яго роля ў гісторыі Глыбоччыны // ВГл. — 1993. — № 73. — С. 2; Корсакі Глыбоцкія // ВГл. — 1993. — № 76, 78; Корсакі Удзелаўскія, Галубіцкія // ВГл. — 1993. — № 80. — С. 2; Новыя звесткі пра Вацлава Ластоўскага // ВГл. — 1994. — № 9. — С. 3; Глыбокаму — 480 гадоў // ВГл. — 1994. — № 100, 102. — С. 3; Раёну — 55 гадоў // ВГл. — 1995. — № 4. — С. 2; Праз гады і выпрабаванні // ВГл. — 1996. — № 29. — С. 2; Шкада, што ў кнігу не трапілі // Тамсама. — С. 3; З гісторыі дзісненскага замка // СП (Мёры). — 1996. — № 69. — С. 2; Вяртанне Вацлава Ластоўскага // ВГл. — 1997. — № 93. — С. 3; Жыццё і творчасць Т. Даленгі-Мастовіча // ВГл. — 1998. — № 62. — С. 2; Галубічы // ВГл. — 1999. — № 61. — С. 3; Род Зяновічаў на Глыбоччыне // ВГл. — 2001. — № 60. — С. 4.

Літ.: Цярохін У. Калекцыяніраванне // ЭГБ. Т. 4. — Мн., 1997. — С. 22; Зінкевіч А. Руплівы краязнаўца // ВГл. — 1996. — № 58. — С. 1; Шык У. Иосиф Бунто: «Вольно обошлись с историей даже в Хатыни» // ВК. — 2002. — № 5. — С. 3; Скалабан В. Сучасныя беларускія краязнаўцы // КГ. — 2005. — № 12 (77), сакавік. — С. 2; «Краязнаўцы Віцебшчыны». Бунто Я.У. (8.01.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Інтэрв'ю з Я.У. Бунто (28.07.2008) // Тамсама.

**БУРАКОВА** НІНА, музейны работнік. Працуе ў Гарадоцкім раённым краязнаўчым музеі. Аўтар артыкулаў у перыядычным друку на краязнаўчую тэматыку.

Тв.: Природные, исторические и культурные объекты Городокского района и их использование в туристско-краеведческих целях // Гарадоччына ўчора, сёння, заўтра: матэрыялы I Гарадоцкіх чытанняў, 26 кастрычніка 2007 г. / рэдкал.: А.М. Дарафееў (адк. рэд.) [і інш.]. — Гарадок: ГРКМ, 2008. — С. 144–146; Сялянскі быт // ГВ. — 2001. — № 103. — С. 2, 4; Жаночыя рамёствы // ГВ. — 2002. — № 16, 20, 21; Мужчынскія рамёствы // ГВ. — 2002. — № 29, 30, 32; Быт жыхароў Гарадка // ГВ. — 2002. — № 41. — С. 3, 4; Рэлігійныя вераванні // ГВ. — 2002. — № 50, 52; З музейнай экспазіцыі // ГВ. — 2002. — № 65. — С. 3; Рэлігійныя вераванні // ГВ. — 2003. — № 3.



**БУРДО** АНАТОЛЬ АЛЯКСЕЕВІЧ, актывіст пошукавага руху на Віцебшчыне. Выкладчык ПТВ № 19 г. Віцебска. Арганізаваў ваенна-патрыятычны клуб «Пошук» у ПТВ № 19 г. Віцебска (1983). Арганізатар і кіраўнік народнага музея баявой славы Віцебскай чырвонасцяжнай ордэна Суворава 251-й стралковай дывізіі (з 1988). На працягу некалькі гадоў кіраваў працай па стварэнні экспазіцыі, вывучэнні баявога шляху воінскага злучэння, праводзіў выяўленне дакументаў у архіве МА РФ (Падольск).

Удзельнік раскопак на месцах баёў, перапахавання рэштак загінуўшых воінаў СА (Ціхмянаўская вышыня (1988), вёскі Новае сяло і Шабаны Дубровенскага раёна (1988), в. Тхорына Дубровенскага раёна (1990), в. Шаркі Віцебскага раёна (1991), в. Шапечына Віцебскага раёна (1991), в. Лябёды Віцебскага раёна (1989), в. Баталі Гарадоцкага раёна (1990), в. Арлова Віцебскага раёна (1991), на тэрыторыі 5-га палка, г. Віцебск (1991), у Глыбоцкім і Ушацкім раёнах (1991), в. Копці Віцебскага раёна (1992), г. Полацку (1993), Лёзненскім раёне (1993,

1995), у раёне р. Лучоса (1994, 1995), в. Кузюранкі Гарадоцкага раёна (1996) і некаторых месцах РФ). Удзельнічаў у зборы матэрыялаў пра баі на тэрыторыі Віцебскай вобл.

Ініцыятар усталявання памятнага знака ў гонар воінаў 251-й стралковай дывізіі ў в. Дыманова-2 (1999), каля в. Шаркі (2000), каля в. Уланавічы на месцы расстрэлаў падпольшчыкаў, партызан і мірных грамадзян, мемарыяльнага знака «Лучоса» воінам 5-й, 33-й і 39-й армій у в. Шапечына (2003).

Аўтар публікацый на тэму пошукавай дзейнасці на тэрыторыі Віцебшчыны ў мясцовым перыядычным друку. Аўтар кнігі «Не предай забвению!», у якой у форме нарысаў змяшчаюцца матэрыялы, апублікаваныя раней ў газетах Віцебска пра асобныя старонкі Другой сусветнай вайны на Віцебшчыне.

Тв.: Кнігі: Не предай забвению! Малоизвестные страницы войны (из опыта поисковой работы). — Витебск: Диджитал-Экспресс, 2008. — 90 с.

Артыкулы ў перыядычным друку: З хронікі баёў за Віцебск: [1941] // ВР. — 1991. — № 225. — С. 4; Девочка по имени Лучеса // Віцьбічы. — 1993. — № 33. — С. 3; Чёрные пруды: [месцы расстрэлаў у 1941 г. каля Уланавіч] // ВК. — 2002. — № 4. — С. 4; Судьба батареи капитана Флёрова // АГ. — 2002. — № 33. — С. 3.

Літ.: Кліманскі Л. Дарогамі памяці // СІ. — 1990. — № 112. — С. 2.



**БУТКЕВІЧ** СЯРГЕЙ СЯРГЕЕВІЧ (*ВК, Валерий Встречный, Владислав Ковалевский, Влад Коваль, Иван Битный, Максим Архипов, Ной Чудесаблин, Сергей Кент, Сергей Сергеев, Сергей Шубин, Степан Старожил, Ян Ремицан*) (6.10.1941, г. Орск Чкалаўскай вобл. РСФСР, цяпер Арэнбургскай вобл. РФ – 29.05.2010), журналіст, краязнаўца. Скончыў СШ № 6 г. Віцебска (1958), філал. факультэт БДУ (1964). Быў выключаны з універсітэта з фармулёўкай «за неэтычныя паводзіны», а насамрэч за ўдзел у нефармальнай групе, якая збіралася на кватэры Кіма Хадзеева і займалася чытаннем самвыдатаўскай літаратуры, абмеркаваннем актуальных тэм міжнароднага і ўнутрыпалітычнага становішча краіны. Быў адноўлены і скончыў БДУ (1964). Працаваў настаўнікам рускай, беларускай мовы і літаратуры ў Віцебскім станкаінструментальным тэхнікуме, на падрыхтоўчых курсах ВДПІ, Віцебскім палітэхнічным тэхнікуме (1964–1970). Адначасова пачаў супрацоўнічаць з рэдакцыяй газеты «Віцебскі рабочы», Віцебскім радыё. Працаваў у аддзеле інфармацыі Віцебскай студыі тэлебачання (1970–1974), у рэдакцыі газеты «Віцебскі рабочы» (1974–1982), уласным карэспандэнтам БелТА (1982–1985), газеты «Савецкая Беларусь» па Віцебскай вобл. (1985–1991), «Народнай газеты» па Віцебскай вобл. (1991–1994), пазаштатным карэспандэнтам у газетах «Народная воля», «Витебский курьер», бюлетэні «Курьер из Витебска». Член Саюза журналістаў Беларусі (1972). Выконваў абавязкі старшыні БАЖ (1996–2000).

Аўтар шматлікіх артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку на краязнаўчую тэматыку, ў якіх аналізаваў культурнае жыццё Віцебшчыны, рабіў рэцэнзіі на тэатральныя пастаноўкі Віцебскага НАДТ, мастацкія выставы, пісаў пра віцебскіх дзеячаў культуры, акцёраў. Першая публікацыя выйшла ў 1966 г. Асаблівую цікавасць выклікаюць артыкулы, прысвечаныя побытаваму жыццю горада і вобласці ў 1950–1980-я гг. ХХ ст. Браў удзел у стварэнні кніг «Витебская область», «Золотые звезды Витебщины».

Тв.: Лед тронулся через тридцать лет // НГ. — 1993. — 17 сак.; Поздравление с Рождеством: [П.М. Наваржэўскі] // ВК. — 1997. — № 1. — С. 6; Реанимация малой авиации? // ВК. — 1998. — 23 студз.; Мирон — опять на высоте! // ВК. — 1998. — 6 лют.; Уроки сталинской школы: [Б. Берман] // ВК. — 1998. — 6 лют.; Агитпробег по следам Машерова // ВК. — 1998. — 13 лют.; С меркурием шутки плохи: [ртуць] // ВК. — 1998. — 13 лют.; Триста адресов Евсея Генделя: [нач. Віцебскага будупраўлення № 114] // ВК. — 1998. — 27 лют.; Секрет «неуловимого Мирона» разгадан: [фельетон] // ВК. — 1998. — 1 крас.; Такой большой и ненужный «Эвистор» // ВК. — 1998. — 3 крас.; Счастливого пути: [трамвай у Віцебску] // ВК. — 1998. — 22 мая; Годы скорби, минута молчания и…: [канцлагер у Лёзненскім раёне ў 1944 г.] // ВК. — 1998. — 12 чэрв.; «Отчизны капелька моя»: [Барань] // ВК. — 1998. — 16 чэрв.; Курган Дружбы — за границей: [курган Дружбы на мяжы РБ, РФ і Латвіі] // ВК. — 1998. — 10 ліп.; Мирон против генералиссимуса // ВК. — 1998. — 4 верас.; Образ жизни перед образом смерти: [заг. кафедры госпітальнай хірургіі ВДМІ У.У. Анічкін] // ВК. — 1998. — 25 верас.; Люди, победившие Тигра: [асобы 1998 г.] // ВК. — 1998. — 31 снеж.; Военный молится о мире: [Св. Ліс] // ВК. — 1999. — 8 студз.; Герой нашего времени: [В. Цыганкоў] // ВК. — 1999. — 12 студз.; Остров Олега Крошкина // ВК. — 1999. — 16 лют.; Дитя природы: [справа Л.М. Куліка] // ВК. — 2000. — 2 сак.; На Браславщине поймали чудо-юдо: [«КІТ»] // ВК. — 2000. — 19 сак.; Мост длиной в полвека: [Копысь] // ВК. — 2000. — 21 мая; «Оршанская ТЭЦ. Следующая станция — в XXI веке» // ВК. — 2000. — 2 жніўня; Нашла коса… на скальпель // ВК. — 2000. — 14 верас.; От Австрии до Витебска — рукой подать. Если это рука друга: [В. Вольдрых] // ВК. — 2000. — 25 жніўня; Народ без прессы не останется // ВК. — 2000. — 8 ве-

рас.; Обжигая правдой: [У. Базан] // ВК. — 2000. — 29 верас.; «Обрезание» по-витебски // ВК. — 2000. — 6 кастр.; Театр в полете // ВК. — 2000. — 6 кастр.; Песни подземелья // ВК. — 2000. — 27 кастр.; Дело о «вавилонской стоянке» // ВК. — 2001. — 9 лют.; Имущество для узкого круга, или Размышления у разбитого «Коллажа» // ВК. — 2001. — 20 лют.; Акварель неисчерпаема, как Вселенная: [Ф. Гумен] // ВК. — 2001. — № 23. — С. 3; Восхождение к идеалу: [віцебскі вакальны ансамбль «Рэзананс»] // ВК. — 2001. — 6 крас.; Тайна комбрига Родионова // ВК. — 2001. — № 57–60; Рыцарь прощального образа: [мастаку І. Бароўскаму — 80 гадоў] // ВК. — 2001. — 16 ліст. — С. 3; «Реванш» Владимира Швальбо: [віцяблянін, засл. трэнер БССР, СССР, наст. сборнай СССР па скачках на батуце] // ВК. — 2002. — 4 студз.; Годы и строки: [журналіст В. Пятрушын] // ВК. — 2002. — 4 студз.; Золотая осень человека с ружьём: [І.А. Шіпула] // ВК. — 2002. — 19 сак.; Незаменимый: [макетчык «Віцебскграмадзянпраект» В.П. Папуша] // ВК. — 2003. — 31 студз.; Епархии — от культуры: [перадача Віцебскаму епархіяльнаму упраўленню будынка на вул. Чэхава] // ВК. — 2003. — 11 крас.; Мучительный возраст «Доломита» // ВК. — 2003. — 8 ліп.; На оршанском замчище найдена монета чеканки XVII века с изображением герба «Погоня» // ВК. — 2003. — 29 ліп.; Богатство Григория Корначева // ВК. — 2003. — 6 ліст.; Комета по имени Лазакович: [Т.В. Лазаковіч, спартсменка] // ВК. — 2004. — № 18. — С. 1, 2; Первомай 1947: На парад через Двину // ВК. — 2004. — 30 крас. — С. 3; Смерть по разнарядке: [рэпрэсіі ў Віцебску, К. Вейнберг, латышы] // ВК. — 2004. — 2 крас.; Прах Гитлера — в Западной Двине: [святкаванне дня горада ў Віцебску ў 1974 г.] // ВК. — 2004. — 1 мая; Украину хотели переселить // ВК. — 2004. — № 39. — С. 4; Поколение, готовое к подвигу // ВК. — 2004. — 22 чэрв. — С. 1, 2; Желтая лихорадка: [вьетнамскае зямляцтва ў Віцебску] // ВК. — 2004. — 2 ліп.; Маразм крепчал // ВК. — 2004. — 9 ліп.; Ни дня без стройки: [В.І. Сазонаў] // ВК. — 2004. — 6 жніўня; В сентябре вспоминается школа: [Віцебск ў 1940–1950-я] // ВК. — 2004. — 24 верас. — С. 1, 3; О тех, кого нельзя забыть: [настаўнікі С.М. Васільеў, Р.Е. Фарбер, Б.П. Міцкевіч] // ВК. — 2004. — 1 кастр.; Город, который построил он: [Э.Б. Заліўскі] // ВК. — 2004. — 15 кастр.; Красный день календаря: [святкаванне 7 лістапада] // ВК. — 2004. — 5 ліст. — С. 3; На Тихмяновской высоте: [в. Воспенкі Лёзненскага раёна] // ВК. — 2004. — 19 ліст. — С. 3; «О Сталине мудром, родном и любимом…» // ВК. — 2004. — № 98. — С. 3; Афганский синдром // ВК. — 2004. — 24 снеж.; Вечнозеленая надежда: [святкаванне Новага года] // ВК. — 2004. — 31 снеж.; Московский литератор крупно потерпел в Витебске: [Л. Анікееў] // ВК. — 2005. — 21 студз.; Великая сила искусства: [акцёры] // ВК. — 2005. — № 3. — С. 3; Настоящая зима // ВК. — 2005. — № 5, 7; Настоящая зима: [зімнія забавы віцяблянаў] // ВК. — 2005. — № 5. — С. 7; Бородулин и другие // ВК. — 2005. — № 15. — С. 3; История УКГБ попала в переплет // ВК. — 2005. — № 19. — С. 3; Щи или каша?: [з гісторыі тэлебачання Віцебска] // ВК. — 2005. — № 24. — С. 7; Народ ликовал: [12.04.1961] // ВР. — 2005. — 12 крас.; Нина Сулецкая: «Уважение к прошлому спасет мир» // ВР. — 2005. — № 28. — С. 5; От великого до смешного: [Ленін у жыцці віцяблян] // ВК. — 2005. — 22 крас.; Маленькая тайна большой комнаты: [Віцебскі радыёкамітэт] // ВК. — 2005. — 6 мая; Пишет как дышит: [Ф. Гумен] // ВК. — 2005. — 14 чэрв.; Второе дыхание «Сосновки» // ВК. — 2005. — 28 чэрв.; Немолкнущий голос пророка: [У. Высоцкі, Віцебшчына] // ВК. — 2005. — 22 ліп.; «А составы идут за составами…»: [чыгункі] // ВК. — 2005. — 5 жніўня; Без страха и упрека: [заслужаны будаўнік Беларусі П.М. Наваржэўскі] // ВК. — 2005. — 12 жніўня; «…И пальцы тянутся к перу, перо к бумаге…»: [побытавая гісторыя] // ВК. — 2005. — 3 верас.; Страницы из книги жизни: [бібліятэкі Віцебска, І.А. Бабкоў] // ВК. — 2005. — 16 верас.; Будут новые сады: [М.і Р. Загароўскія] // ВК. — 2005. — 30 верас.; Крылья Георгия Кудряшова: [вынаходнік махалёта] // ВК. — 2005. — 21 кастр.; «Пейте соков натуральных!»: [побытавая гісторыя: сокі] // ВК. — 2005. — 25 ліст.; Вселенная изографа Киселева: [мастак] // ВК. — 2005. — 15 ліст.; Невозвращенец, или Наш человек в Антверпене: [М. Нізавец, ураджэнец Барані, занесены ў кнігу рэкордаў Гінэса] // ВК. — 2005. — 30 снеж.; Ведай нашых. Талачынскі адрас гімну ЗША // Народная воля. — 2005. — 21 крас.; «…И закусочка на бугорке»: [побытавая гісторыя: святы, алкаголь] // ВК. — 2006. — 20 студз.; Путешествие в глубину души: [мастак В. Ральцэвіч] // ВК. — 2006. — 3 лют.; За молодых // ВК. — 2006. — 10 лют.; Ужин для немца: [побытавая гісторыя] // ВК. — 2006. — 17 лют.; Павлу Северинцу «делают биографию» // ВК. — 2006; Новостройка у речки-вонючки: [в. Вяляшкавічы] // ВК. — 2006. — 17 сак.; Бикфордов шнур: [выбухі ў Віцебску 14 і 22 верасня 2005] // ВК. — 2006. — 24 сак.; Фотография к размышлению: [творчае аб'яднанне «Квадрат», Ф. Гумен] // ВК. — 2006. — 28 сак.; Площадь Свободы для узкого круга // ВК. — 2006. — 14 крас.; Дело на все времена: [70 год інстытуту «Белдзяржпраект»] // ВК. — 2006. — 18 крас.; Всегда готовые: [піянерская арганізацыя] // ВК. — 2006. — 19 мая; Дым Отечества: [цыгарэты] // ВК. — 2006. — 30 мая; Смерть жаворонка в зените: [паэт А. Сербантовіч, «беларускі Еўтушэнка»] // ВК. — 2006. — 2 чэрв.; На войне с микробами: [Віцебская абласная санітарна-эпідэміялагічная станцыя] // ВК. — 2006. — 16 чэрв.; Упраздненный общепит: [побытавая гісторыя] // ВК. — 2006. — 28 жніўня; Скорбь и утешение: [А.М. Брылёў] // ВК. — 2006. — 1 верас.; Встречи на минском Бродвее // ВК. — 2006. — 29 верас., 3 кастр.; Друг по имени Ежик // ВК. — 2006. — 3 кастр.; Отпечаток личности: [фатограф Г. Беліцкі] // ВК. — 2006. — 20 кастр.; Незабываемый театр // ВК. — 2006. — 21 ліст.; Судьба, отбитая у смерти: [Г. Маркаў] // ВК. — 2006. — 28 ліст.; Сцены из пьесы: [акцёр І. Дорскі] // ВК. — 2006. — 15 снеж.; Разам з праўдай: [П. Севярынец] // ВК. — 2006. — 29 снеж.; Остров Евгения, или Творчество в ритме сердца: [Я. Шабан] // ВК. — 2007. — 5 студз.; Текстильный «флагман» на мели: [АТ «КІМ»] // ВК. — 2007. — 12 студз.; Вспомнм. Подумаем. Помолчим: [халакост на Віцебшчыне] // ВК. — 2007. — 26 студз.; Путеводитель по биографии поэта: [рэц. на кнігу «Д. Сімановіча] // ВК. — 2007. — 30 студз.; Глубокское чудо молит о помощи: [царква Раства Багародзіцы] // ВК. — 2007. — 2 лют.; Руины к празднику: [бамбардыроўка Віцебска сав. авіяцыяй 22–23.02.1942] // ВК. — 2007. — 23 лют.; Стена вокруг «неправильной» церкви: [Беларуская евангелісцкалютэрынская царква] // ВК. — 2007. — 27 лют.; Старшая среди равных: [А.Д. Севасцьянава] // ВК. — 2007. — 8 сак.; Парижские тайны: [в. Парыж Пастаўскага раёна] // ВК. — 2007. — 23 крас.; «Адская машина»: [знішчэнне Мікалаеўскага сабора ў Віцебску, у 1957 г.] // ВК. — 2007. — 10 крас.; «Покушение» на мавзолей: [Ленін у жыцці грамадзян БССР] // ВК. — 2007. — 20 крас.; Спасительный скальпель // ВК. — 2007. — 11 ліп.; Изобильная шипучка: [побытавая гісторыя Віцебска др. паловы XX ст.] // ВК. — 2007. — 27 крас.; Всенародная Наташа: [Народная актрыса РСФСР В. Кібардзіна — дачка віцебскага архітэктара] // ВК. — 2007. — 13 верас.; Рокировка: [Б. і Р. Лядэнка] // ВК. — 2007. — 13 верас.; Многоточие: [П. і Т. Севярынец] // ВК. — 2007. — 11 ліп.; Скрозь прызму таленту і сумлення: [У. Базан] // ВК. — 2007. — 6 верас.; Прямая борозда: [мастак В. Ціханенка] // ВК. — 2007. — 21 верас.; Здоровье — на экспорт: [санат. «Лётцы»] // ВК. — 2007. — 12 кастр.;

Неизвестный Суворов // ВК. — 2007. — 12 кастр.; Миша стал героем: [М.І. Кац, дырэктар калгаса «Чырвоная Армія»] // ВК. — 2007. — 29 кастр.; Сорванный урок: [СШ № 6 г. Віцебска] // ВК. — 2007. — Лістапад; Ни дня без стройки: [М. Гарыдавец] // ВК. — 2007. — 14 снеж.; Знак беспамятства: [Кіраўскі мост] // ВК. — 2007. — 28 снеж.; И Левин, такой молодой: [рэц. на кнігу А. Падліпскага, прысвечаную Б. Левіну] // ВК. — 2007. — 28 снеж.; И смешно, и грустно: [45 год «Віцебскэнерга»] // ВК. — 2007. — 28 снеж.; Время и место Бориса Хамайды // ВК. — 2008. — 16 студз. — С. 1, 5, 6; Преждевременный человек: [«Справа М. Барады»] // ВК. — 2008. — 13 лют. — С. 4–5; Незаменимый Янковский: [рабочы з Барані, які мае прац. стаж больш за 60 гадоў] // ВК. — 2008. — 13 лют.; Эпизоды за кадром: [М. Пташук і Віцебск] // ВК. — 2008. — 22 лют.; Короткевичу от государства: [помнік] // ВК. — 2008. — 18 крас.; Завещание мастера: [П. Явіч] // ВК. — 2008. — 3 снеж. — С. 5–6; Маленький зал для большого художника: [Ф. Гумен] // ВК. — 2008. — 26 верас. — С. 8; Крест на реликвии: [сядзібны дом маёнтка «Мілае» ў в. Мазалава] // ВК. — 2008. — № 5. — С. 1, 5; Бал сатаны: [будаўніцтва і гіст. спадчына ў Віцебску] // ВК. — 2008. — № 9. — С. 4, 6; Не дождался…: [В. Бяляўскі] // ВК. — 2008. — № 10. — С. 2; Не шевелитесь — за вами следят: [інфармацыя КДБ пра апазіцыйныя структуры Віцебскай вобл.] // ВК. — 2008. — № 12. — С. 1, 4.

Літ.: Крученкова О. Нам нужна не оттепель, а настоящая весна… // ВК. — 2001. — 12 кастр.; Павлова Е. О печати — печально // ВК. — 2008. — № 9. — С. 1, 3; Інтэрв'ю з С.С. Буткевічам (20.02.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**БУХАВЕЦКІ** АЛЯКСЕЙ ГЕНАДЗЕВІЧ (22.04.1973), калекцыянер. Працуе экспедытарам у фірме «Рэўкон-Полацк». Займацца даследаваннямі гісторыі Полацка пачаў з 1995 г. пад уплывам Л.В. Аляксеева. Вывучае старажытныя крыжы. Браў удзел у археалагічных раскопках, якія праводзіліся у г. Полацку. Праводзіць сезонныя назіранні за станам культурнага слоя ў месцах будаўніцтва і збірае пад'ёмны матэрыял. Мае прыватную калекцыю аб'ектаў матэрыяльнай культуры IX–XIX стст. Шэраг рэчаў перадаў у фонды НПГКМЗ.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Бухавецкі А.Г. (12.10.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**БУХАВЕЦКІ** АНДРЭЙ ГЕНАДЗЕВІЧ (22.04.1973, г. Полацк), краязнаўца. Жыве ў г. Полацку. Скончыў 9 класаў СШ № 1 г. Полацка (1988), ПТВ № 66 г. Полацка (1990). Вывучае падземныя камунікацыі і дрэнажныя сістэмы Полацка, матэрыяльную культуру Полаччыны. Займацца даследаваннямі гісторыі Полацка пачаў у сярэдзіне 1990-х гг. Важную ролю таксама адыграла знаёмства з Л.В. Аляксеевым. Браў удзел у археалагічных раскопках, якія праводзіліся у г. Полацку. Праводзіць сезонныя назіранні за станам культурнага слоя ў месцах будаўніцтва і збірае пад'ёмны матэрыял. Даследуе рэчышча р. Палаты. Мае прыватную калекцыю аб'ектаў матэрыяльнай культуры IX–XIX стст.



Сабраў успаміны старажылаў г. Полацка пра Полацкі кадэцкі корпус (дыктафонныя і пісьмовыя запісы 10 рэспандэнтаў).

Займаецца рэканструкцыяй культавых збудаванняў г. Полацка і стварае зменшаныя маштабныя макеты: касцёл Св. Стэфана, храм Барыса і Глеба Бельчыцкага манастыра. Бярэ ўдзел у працы краязнаўчага гуртка СШ № 8 г. Полацка. Удзельнічаў у здымках кароткаметражнага фільма «Полацкія лабірынты» (2006). Плануе стварыць і выдаць каталог ювелірных вырабаў (IX–XIX ст.), знойдзеных на Віцебшчыне, на аснове прыватных калекцый жыхароў г. Полацка.

Тв.: Как я искал подземные инженерные сооружения полоцких езуитов // Иезуиты в Полоцке: 1580–1820 гг.: в 2 ч. Ч. 2 / сост., примеч. и вступ. ст. Л.Ф. Данько, А.И. Судник. — Полоцк: А.И. Судник, 2005. — 48 с. — С. 36–38.

Літ.: Васюченко П. Вернуться к Софии // Маладосць. — 2006. — № 12. — С. 62–63; От составителей // Путеводитель по г. Полоцку. — Полоцк, 2006. — С. 8.

**БУЯНОЎСКІ** КАЗІМІР (Bujanowski Kazimierz). Аўтар мемуараў «З успамінаў улана і акаўца зямлі Браслаўскай», у якіх утрымліваюцца звесткі па гісторыі Браслаўшчыны часоў Другой сусветнай вайны.

Тв.: Ze wspomnień ułana i akowca ziemii Brasławskiej. — Olsztyn, 2001. — 236 s.

**БЫХАВЕЦ** ІОСІФ АЛЯКСАНДРАВІЧ (23.12.1915 (5.01.1916), в. Дрэтунь), краязнаўца, педагог. Жыве ў Наваполацку. Скончыў Полацкую сямігодку імя Я. Купалы, Полацкае педвучылішча, лінгвістычны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута (1940). Працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Юравіцкай НСШ (1936–1940), завучам СШ № 11 г. Полацка, дырэктарам Камайскай НСШ Пастаўскага раёна (1940–22.06. 1941), завучам Лынтупскай НСШ (5.07.1945–19.11.1946), дырэктарам Камайскай НСШ (20.11. 1946–08. 1952), завучам, настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Лынтупскай СШ (1952–1981). Жыў у Лынтупах (1952–1979).

Краязнаўствам пачаў займацца, працуючы ў школе. Лынтупская школа мела рускую мову навучання, і дзеля таго, каб зацікавіць вучняў беларускай мовай, пачаў знаёміць дзяцей з творчасцю і жыццёвым шляхам пісьменнікаў, з родным краем, гісторыяй Беларусі. Склаў і выдаў летапіс Лынтупаў (1967, 1972). Вынікі краязнаўчай працы па вывучэнні Лынтупаў падсумаваў у кнізе «Лынтупы і наваколле» (1993). Частка матэрыялаў змешчана ў кнізе «Памяць» Пастаўскага раёна. У кнізе «Сеяць душы ў людзях» (2003) аналізуе ўласны вопыт выкладання беларускай літаратуры і мовы, эпізоды са школьнага жыцця, развагі пра дасягненні і хібы педагогікі. Аўтар шэрагу артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку. Працаваў пазаштатным карэспандэнтам выданняў «Роднае слова», «Настаўніцкая газета», «Пастаўскі край». Публікаваў артыкулы ў «ЛіМе», «Звяздзе», «Чырвонай Полаччыне». Браў удзел у арганізацыі краязнаўчых экскурсій. Выдаваў рукапісны часопісы «Героі жывуць сярод нас», «Нашы ардэнаносцы», «Наша радзіма — Беларусь». Некаторыя нарысы з іх друкаваліся ў раённай газеце.

Арганізаваў музей пры Лынтупскай СШ. Падтрымліваў кантакты з краязнаўцамі г. Швенчоніс (Літва), Полацкім, Пастаўскім краязнаўчымі музеямі. Браў удзел у краязнаўчых канферэнцыях ў Паставах, Полацку. Аказаў уплыў на дзейнасць Я. Драўніцкага, Алеся Венерава.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі пастаўскага райкама КПБ(б), маладзечанскага аблана, Міністэрства асветы БССР.

Тв.: Кніга: Лынтупы і наваколле: гістарычны нарыс. — Паставы: Пастаўская ўзбуйнёная друкарня, 1993. — 84 с.

Артыкулы ў навуковым друку і кнізе «Памяць»: Атэістычнае выхаванне на ўроках літаратуры // Народная Асвета. — 1964. — № 12; Куды не кінь // Бел. мова і літаратура. — 1988. — № 10; Беларускі дудар // РС. — 1991. — № 7; «Хачу, арлы, ляцець з вамі» // РС. — 1992. — № 10; Вайна 1812 г. Французы на Пастаўшчыне // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Пастаўскага раёна. — Мн.: БелТА, 2001. — С. 99–100; Вінакурэнне і барацьба з ім // Тамсама. — С. 100–102; Паданні пра дзівацтвы пастаўскіх шляхціцаў // Тамсама. — С. 544–546; Сляды выдатных людзей на захадзе нашай вобласці // Полацкі занальны архіў.

Артыкулы ў перыядычным друку: Улік мясцовых гаворак // ЛіМ. — 1954; Больш увагі школе // НГ. — 1958. — 15 кастр.; Да самых карэнняў // Звязда (П). — 1966. — 4 мая; Па шляхах герояў // Звязда (П). — 1966. — 19 жніўня; Шчасце заваёвана ў змаганні // Звязда (П). — 1967. — 15 ліп.; Унікальная знаходка: [плакат з У.І. Леніным] // Звязда (П). — 1970; Удмурт і беларус — браты // Звязда (П). — 1971. — 17 ліп.; Інтэрнацыянальнае выхаванне на ўроках літаратуры // Савецкая школа. — 1971. — № 10; Ардэнаносцы Лынтупшчыны // Звязда (П). — 1974. — 25 мая; Заўсёды з намі // Звязда (П). — 1974. — 29 чэрв.; Не губляць набытае // ЛіМ. — 1975. — 2 верас.; Хай удзячна будзе памяць // Звязда (П). — 1981. — 7 мая; Лёс трох пакаленняў // Звязда (П). — 1985. — 25 крас.; Лынтупскія курганы // Звязда (П). — 1986. — № 155. — С. 4; Залаты корань // Звязда (П). — 1988. — 19 ліст.; Наш абавязак // Звязда (П). — 1988. — 9 ліст.; Не ўсё прадумана да канца // Звязда (П). — 1990. — 13 студз.; Мяняюцца Лынтупы // Звязда (П). — 1990. — 20 лют.; Канферэнцыя ў Мінску // Звязда (П). — 1990. — 19 мая; Каб ажыў заштампаваны вобраз // Звязда (П). — 1990. — 14 чэрв.; З жартам і ўсур'ёз // Звязда (П). — 1990. — 24 снеж.; Ці можна абяліць чорнае? // Звязда. — 1990. — 25 ліп.; Толькі два гуляхі // Звязда (П). — 1991. — 21 крас.; Лынтупская трагедыя і яе трактоўка // Звязда (П). — 1991. — 25 чэрв.; (разам з М. Барсток) Недапетая песня: [Т. Лясовіч] // ВР. — 1991. — № 176. — С. 2; На пачатку стагоддзя // ПК. — 1991. — № 88. — С. 2; Лынтупы // ПК. — 1991. — № 101. — С. 2; «Мужыцкая праўда» на Пастаўчышне // Сумежжа. — 1992. — № 7. — С. 3; Паўстанне Т. Касцюшкі ў нашым раёне // ПК. — 1994. — № 19, 20. — С. 2; Патоп на гары // ПК. — 1994. — № 30. — С. 2; Лынтупская трагедыя і яе трактоўка // ПК. — 1994. — № 41. — С. 3.

Літ.: Карлюкевіч А. Выдадзена ў правінцыі: [Лынтупы] // Спадчына. — 1993. — № 6. — С. 93–94; Каханоўскі Г. Лынтупы і наваколлі // Спадчына. — 1993. — № 12; Першая кніга пра Лынтупы // ПК. — 1993. — № 90. — С. 2; Шпакоўская Г. Хроніка Быхаўца // НС. — 2007. — 12 мая. — С. 5–6; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Быхавец І.А. (27.07.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**БЫЧКОЎ** АЛЯКСАНДР ЛЕАНІДАВІЧ (16.11.1951, в. Кабак Сіроцінскага раёна (цяпер в. Заобаль Шумілінскага раёна Віцебскай вобл.)), краязнаўца. Скончыў Вышэйшае ваенна-марское вучылішча імя М.В. Фрунзе (Ленінград). Служыў штурманам на Паўночным флоце на крэйсеры «Кіраў» (1977–1985), на крэйсеры «Маршал Усцінаў» (1985–1989), выкладчыкам у Вышэйшым ваенна-марскім вучылішчы (1990–1991). Цікавіцца гісторыяй Беларусі і роднага краю пачаў пад уплывам творчасці У.С. Караткевіча. Удзельнічаў у экспедыцыях Геаграфічнага таварыства СССР. Сабраў невялікую калекцыю рэчаў, звязаных з

гісторыяй краю. Займаецца добраўпарадкаваннем помнікаў археалогіі на Шуміліншчыне (курганы каля в. Каз'яны).

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Бычкоў А.Л. (16.03.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**БЯЗЗУБІК** ЛІДЗІЯ ЦЯРЭНЦЬЕЎНА (21.11.1923, в. Гарбачова Талачынскага раёна), бібліёграф. Скончыла Коханаўскую СШ (1941), бібліяграфічны факультэт МДПІ (1950). Працавала ў ВАБ (1950–1981). Узначальвала створаны аддзел беларускай і краязнаўчай літаратуры (1967–1981). Аўтар некалькіх бібліяграфічных выданняў, прысвечаных сферам тэмам жыцця Віцебшчыны, персаналіям, якія маюць дачыненне да гісторыі і культуры Віцебшчыны.

Тв.: Край велічы і хараства, мая Віцебшчына, на сцягу тваім ордэн Леніна. Да 50-годдзя савецкай улады: у дапамогу праводзячым вусны часопіс. — Віцебск: ВАБ, 1967. — 15 с.; Витебщина в Великой Отечественной войне: сценарий вечера. — Витебск: ВОБ, 1968. — 13 с.; Витебску — 1000: лекция в помощь библиотекам области. — Витебск: ВОБ, 1972. — 76 с.; (разам з Н.С. Кітовіч) Партызанскі рух і падполле Віцебскай вобл. у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–945 гг.): бібліяграфічны паказальнік. — Віцебск: ВАБ, 1975. — 67 с.; (разам з Н.С. Кітовіч) Вялікі Кастрычнік на Віцебшчыне: бібліяграфічны паказальнік. — Віцебск: ВАБ, 1977. — 40 с.; І скінулі з гары Успенскай // ВР. — 1972. — 18 сак.

Літ.: Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна 80 гадоў / склад. Л.С. Гудзелева. — Наваполацк: А.У. Маладзечкін, 2009. — С. 57.

**БЯЛЯЕЎ** АЛЯКСЕЙ ВІКТАРАВІЧ (17.10.1974, г. Віцебск), гісторык. Кандыдат гіст. навук (2005), дацэнт (2009). Скончыў філал. факультэт ВДУ (1996), аспірантуру гіст. факультэта БДУ (2002). Працаваў настаўнікам гісторыі Рубаўскай СШ г. Віцебска (верасень–снежань 1996), асістэнтам, выкладчыкам кафедры філасофіі ВДУ (1998–1999), выкладчыкам, ст. выкладчыкам, дацэнтам кафедры гісторыі сусветнай і айчыннай культуры БНТУ (з 2002).

Даследуе гісторыю і культуру Віцебшчыны, аддаючы перавагу перыяду Другой сусветнай вайны. У гады вучобы ў школе займаўся ў гуртку юных экскурсаводаў (Віцебская станцыя юных тэхнікаў). У гады навучання ў ВДУ зацікавіўся вывучэннем тапанімікі Віцебскага раёна. Пад кіраўніцтвам прафесара Г.М. Мезенкі выканаў дыпломную работу «Ойконимия Витебского района: структура, семантика» (1997). Даследаваў дзейнасць Віцебскай гарадской управы ў гады акупацыі (1941–1944) пад уплывам і кіраўніцтвам дацэнта, кандыдата гіст. навук Г.М. Якаўлевай. Аўтар артыкула ў кнізе «Памяць» г. Віцебска.

Тв.: Цяжкія гады акупацыі // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебск: у 2-х кн. Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 425–431; Структурно-семантический анализ ойконимии Витебского района // Зборнік навуковых артыкулаў студэнтаў ВНУ Рэспублікі Беларусь. Ч. І: матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі студэнтаў ВНУ Рэспублікі Беларусь, 15–18 мая 1995 г., Мінск. — Мн.: БДУ, 1995. — С. 3–6; Хозяйственно-экономическая деятельность Витебской городской управы в годы оккупации (1941–1944) // Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 27 сакавіка 1999 г.: у 2 ч. — Мінск: БДПУ, 1999. — Ч. І. — С. 96–99; Социально-экономическое положение населения Витебска в период немецко-фашистской оккупации (1941–1944) // Історія слов'янських народів: Актуальні проблеми дослідження. Вип. 6. Слов'янські народи в Другій світовій війні: зб. наукових праць / відп. ред. П.М.Чернега. — Київ, 2000. — С. 186–188.

Літ.: Корзенко Г.В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник. — Мн.: Бел. наука, 2007. — С. 33; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Бялялеў А.В. (3.06.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ВАЙВАДЗІШ** ЭДВАРД (23.01.1897, в. Вайвады Прыдруйскай воласці Дрысенскага пав. Віцебскай губ. – 2000), паэт, педагог, краязнаўца. Пражываў на тэрыторыі Латвійскай Рэспублікі. Займаўся даследаваннямі Прыдзвіння ў 1920–1930-я гг. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (быў абраны ў 100-гадовым узросце ў 1997 г.). Скончыў 2-ю Прыдруйскую школу (1912), курсы паштова-тэлеграфных чыноўнікаў (1915), курсы Чарняева ў г. Петраградзе, агульнаасветныя чатырохгадовыя летнія настаўніцкія курсы пры Дзвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі (1928). Працаваў на Галоўным паштамце, мытні г. Петраграда, пісарам валаснога праўлення (1920–1922), дырэктарам Талаеўскай беларускай школы ў Латвійскай рэспубліцы (1922–1923), Жакелёўскай школы (1923–1924), у 1-й Піедруйскай школе (1924–1930), кіраўніком Вайвадскай беларускай шасцігадовай школы (1930–1935), Плейкаўскай школе (1935–1936). Працаваў на сваім хутары (да 1940), дырэктарам Вайвадскай беларускай сямігодкі (1940–1941), інспектарам павятовай школьнай рады (1941). Арыштаваны нямецкімі акупацыйнымі ўладамі, утрымліваўся ў лагеры Загарт на востраве Руген. Працаваў інспектарам па аднаўленні школ, настаўнікам (1944–1959).

У міжваенны час, пражываючы ў Латвіі, з'яўляўся добраахвотным карэспандэнтам Дзяржаўнага статыстычнага ўпраўлення па сельскай гаспадарцы. Запаўняў анкеты, у якіх адзначаў тэмпературу паветра, цэны на ўраджай, прылёт і адлёт птушак і інш. інфармацыю. За гэтую дзейнасць узнагароджаны ордэнам за заслугі перад Латвійскай дзяржавай (1935). Удзельнічаў у культурна-асветніцкай працы беларускага таварыства «Бацькаўшчына».

Тв.: Вершы, паэма, загадкі. — Мн.: ННАЦ імя Ф. Скарыны, 1996. — 64 с.; «Я спалучаў павагу да Латвійскай дзяржавы і любоў да беларушчыны» // Прамень. — 1997. — № 2. — С. 2; З гісторыі Вайвадскай школы // КГ. — 2005. — № 3. — С. 4.

Літ.: Вайвадзіш Э. Мае крокі па дрогкай зямлі // Вершы, паэма, загадкі. — Мн, 1996. — С. 44–50; Вайвадзіш Э. З гісторыі Вайвадскай школы // Вершы, паэма, загадкі. — Мн, 1996. — С. 50–51; Панізьнік С. Крывіцкія руны: Беларускія пісьменнікі Латвіі. — Мн.: Бел. кнігазбор, 2003. — С. 15–16; Панізьнік С. «Ува мне жывуць яшчэ карэнні // ГлР. — 1990. — № 2. — С. 7; Панізьнік С. «…Не згублены для беларускай культуры» // НСл. — 1995. — № 5. — С. 4; Лесін С. Разноязычные стихи под крышей единой // Динабург. — 1996. — 24 верас.; Панізьнік С. Жалуды пад векавой кронай // Прамень. — 1996. — № 45. — С. 7; Панізьнік С. Дарога даўжынёй у век. Штрыхі да творчага партрэта Эдварда Вайвадзіша // РС. — 1997. — № 2. — С. 48; Дубовский В. Пролегла дорога // Эрземе: [газета Краслаўскага раёна Латвійскай Рэспублікі]. — 1997. — № 9. — С. 1, 4; Дубянецкі Э., Вайвадзіш Э. Вершы, паэма, загадкі // КіД. — 1997. — Люты. Хатэнка А. Праца вечная крыжа // 1997. — 1 лют. — С. 3; Панізьнік С. «Сэрца просіць аглянуцца» // ЧЗ. — 1997. — 5 лют.; Панізьнік С. Край, багаты адораны… // ГлР. — 1997. — № 6. — С. 1, 5; Валодзька С. Добрае святло настаўніка і паэта // ГлР. — 1997. — № 13. — С. 5; Пучынскі У. Перанятая ад пчол // Сям'я. — 1997. — № 10; Жыбуль В. І ў сто… // Першацвет. — 1997. — Ліпень; Гарадзіцкі А. У кнігу рэкордаў Гінэса // Полымя. — 1998. — № 3.; Рэкорд, варты кнігі рэкордаў Гінэса // Прамень. — 1999. — № 9. — Верасень; Вайвадзіш Эдвард. Некралог // ЛіМ. — 2000. — 7 крас.

**ВАЙЦЯХОВІЧ** АЛЯКСАНДР УЛАДЗІСЛАВАВІЧ (7.05.1974, в. Порплішча Докшыцкага раёна Віцебскай вобл.), педагог. Скончыў ВДПІ (1996) па спецыяльнасці «Настаўнік геаграфіі і біялогіі». Працуе ў Докшыцкім раённым цэнтры дзіцячай творчасці загадчыкам базы юных турыстаў (1999). Краязнаўчую дзейнасць распачаў у Вітуніцкай БШ Докшыцкага раёна (1998). Браў удзел у краязнаўчых чытаннях, арганізаваных Віцебскім абласным цэнтрам пазакласнай працы.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Вайцяховіч А.У. (25.11.2003) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ВАКАР** ЛЮДМІЛА УЛАДЗІМІРАЎНА (4.04.1957, г.п. Багушэўск Сенненскага раёна Віцебскай вобл.), педагог, краязнаўца. Кандыдат мастацтвазнаўства (1996), дацэнт культуралогіі (2003). Скончыла Інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І.Я. Рэпіна (1982) па спецыяльнасці «Тэорыя і гісторыя выяўленчага мастацтва», аспірантуру Беларускай акадэміі мастацтваў (1991–1995). Абараніла кандыдацкую дысертацыю «Інсітнае мастацтва Беларусі ХХ стагоддзя» (27.06.1996) пад навуковым кіраўніцтвам М.Х. Раманюка Праходзіла стажыроўку ў Інстытуце мастацтва Акадэміі навук Польшчы (1997). Працавала экскурсаводам і старшым метадыстам экскурсійнага аддзела ў ВАБПЭ (1976–1982), метадыстам, навуковым супрацоўнікам,

загадчыкам аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў ВАНМЦНТ (1982–1995), выкладчыкам ВДУ (з 1995) на кафедры беларускай літаратуры і культуры, на пасадзе дацэнта на кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры (з 1998). Член Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны (1995). Па сумяшчальніцтве вядучы метадыст па фальклору і этнаграфіі.

Краязнаўствам пачала займацца ў ВАБПЭ (з 1975), працуючы экскурсаводам, потым пад час працы ў ВАНМЦНТ. Займаецца даследаваннем помнікаў гісторыі і культуры, этнаграфіяй, рамёствамі, выяўленчым мастацтвам Віцебшчыны.

Праводзіць арганізацыйную, метадычную і даследчую працу ў вобласці народных рамёстваў і выяўленчага мастацтва. Разам з Т.М. Зубаравай, Н.Л. Федарыставай з аддзела дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва ВАНМЦНТ распрацавала стратэгію ў галіне развіцця народнай культуры праз арганізацыю клубаў народных майстроў, вывядзенне іх на ўзровень аматарскіх калектываў са званнем «народны» і стварэнне на гэтай базе Дамоў рамёстваў. Упершыню методыка была рэалізавана ў 1989 годзе ў Глыбоцкім раёне, і дастаткова хутка ініцыятыву падхапілі Лепельскі, Браслаўскі, Гарадоцкі раёны. Цяпер у кожным раёне і горадзе вобласці працуюць Дамы рамёстваў. Такім чынам, на працягу апошніх пятнаццаці гадоў на Віцебшчыне створана інфраструктура ўстаноў культуры новага тыпу, якая дазваляе весці шырокамаштабную працу па адраджэнні народнай культуры, ствараць і паступова пашыраць матэрыяльную базу для далучэння моладзі да мастацкай спадчыны продкаў.

Адзін з ініцыятараў стварэння і актыўных удзельнікаў працы Клуба аматараў даўніны «Узгор'е» (Віцебск). Адзін з арганізатараў стварэння Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, з'яўлялася старшынёй яго віцебскай абласной арганізацыі (1996–2000).

Ініцыятар і арганізатар правядзення рэспубліканскай выставы і навуковай канферэнцыі «Народны і гістарычны касцюм Віцебскай вобл.» (1991), рэспубліканскай выставы «Летуценні Язэпа Драздовіча», навуковай канферэнцыі, прысвечанай яго творчасці (1993). Ініцыятар і адзін з арганізатараў правядзення I Абласнога свята «Ганчарны круг – 96» (Обаль) і I Рэспубліканскага свята-конкурсу «Ганчарнае кола – 97» (Бачэйкава). Аўтар і кіраўнік праекта Міжнароднага конкурса майстроў народных рамёстваў у межах Міжнароднага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» (1998–2001). Наладзіла працу па даследаванні і папулярызацыі інсітнага мастацтва ў Віцебскай вобл. Ініцыятар правядзення абласной выставы «Талент шчырага сэрца» (1992), у якой прынялі удзел 26 аўтараў, I Нацыянальнай выставы інсітнага мастацтва (1994), праведзенай сумесна з БелІПК на базе Нацыянальнага мастацкага музея (з 20 удзельнікаў выставы 12 — прадстаўнікі Віцебшчыны). У межах Міжнароднага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» была праведзена II Нацыянальная выстава інсітнага мастацтва (2000). Па выніках выставы адбылася Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Інсітнае мастацтва Беларусі. Гісторыя. Суадносіны з народнай культурай. Сучаснасць. Тэндэнцыі развіцця» (2000). Ініцыятар правядзення ў Віцебску III Нацыянальнай выставы інсітнага мастацтва на базе ВАНМЦНТ (2008).

Актыўны ўдзельнік рэспубліканскіх і рэгіянальных канферэнцый. Аўтар шэрагу артыкулаў на тэмы гісторыі і культуры Віцебшчыны на старонках навуковага, рэспубліканскага і мясцовага перыядычнага друку. Праводзіла навуковае рэдагаванне і падрыхтоўку да выдання зборніка «Народная культура Віцебшчыны: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі "Працэсы мадэрнізацыі народнай культуры і вопыт устаноў культуры і адукацыі Віцебшчыны па захаванню традыцый"».

Тв.: Артыкулы ў энцыклапедычных выданнях: Ганчарства Віцебскага Падзвіння // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 2 Віцебскае Падзвінне. — Мн.: Бел. навука, 2004. — С. 891–904.

Артыкулы ў навуковым друку: Узоры мастацтва прымітывізму ў творчасці разьбяроў Браслаўшчыны // Браслаўскія чытанні: матэрыялы II навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 925-годдзю Браслава (1065–1990), 16–17 лютага 1991 г. / навук. рэд. М.А. Ткачоў. — Браслаў: Браслаўскі філіял Пастаўскай узбуйнёнай друкарні, 1991. — С. 7–11; Пра інсітны пачатак творчасці Юдэля Пэна і Марка Шагала // Мастацтва. — 1996. — № 5. — С. 16–20; Маргіналіі жыцця і творчасці Яна Кузьміцкага // Віцебскі сшытак — 1995. — № 1; Барочная экспрэсія народнага абраза: Стылістычны аналіз абразоў з вёскі Латыгава // Віцебскі сшытак. — 1996. — № 2. — С. 83–86; К проблеме примитивизма в творчестве Юделя Пэна и Марка Шагала // Шагаловский сборник: материалы I–V Шагаловских дней в Витебске (1991–1995). — Витебск. — 1996. — С. 64–76; Творчасць Івана Фаміча Хруцкага ў кантэксце беларускай мастацкай традыцыі // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства: матэрыялы IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Віцебск, 24–26 красавіка 1997 г. — Віцебск: ВДУ, 1997. — Ч. I. — С. 83–87; Тыпалагічныя метамарфозы Язэпа Драздовіча // Матэрыялы навукова-практычных канферэнцый «Язэп Драздовіч. Асоба. Творчасць. Мастацтва — insitus» / Беларускі інстытут праблем культуры. — Мн., 1997. — С. 15–20; Спрэчкі пра Івана Хруцкага // Віцебскі сшытак. — 1997. — № 3. — С. 107–115; Выставы народнага мастацтва і святы рамёстваў Віцебшчыны ў другой палове XX стагоддзя / Славянский мир и славянские культуры в Европе и мире: Место и значимость в развитии цивилизаций и культур: История, уроки, опыт, современность: материалы международной научно-

практической конференции. — Витебск: ВГУ, 1998. — С. 227–230; Таямніцы ўнікальнай калекцыі // Мастацтва. — 1999. — № 3. — С. 17–21; Дываны Марыі Ларынай // Мастацтва. — 1999. — № 4–5. — С. 31–34; Шануючы зробленае // Мастацтва. — 1999. — № 8. — С. 50–53; Пра мужыцкасць Фердынанда Рушчыца і шляхетнасць Язэпа Драздовіча, або Пра складнікі беларускай нацыянальнай традыцыі і яе мастацкае ўвасабленне // Мастацтва. — 2000. — № 2. — С. 23–30; Шчодры падарунак // Мастацтва. — 2000. — № 4. — С. 31–34; Рэха сарматызму і творчасці Івана Хруцкага // Мастацтва. — 2000. — № 11. — С. 30–35; Іван Хруцкі і нямецкі бідэрмайер // Беларусь и Европа: Взаимодействие культур. — Витебск: ВГУ, 2000. — С. 71–73; Народны мастак і майстар з Віцебска Хведар Максімаў // Беларусь и Европа: Взаимодействие культур. — Витебск: ВГУ, 2000. — С. 158–160; Стылёвая эвалюцыя творчасці Юдэля Пэна // Віцебскі сшытак. — 2000. — № 4. — С. 182–186; Диалог двух художниц // Мишпоха. — 2000. — № 8. — С. 131–134; «Чарцёж» горада Віцебска 1664 года як помнік інсітнага мастацтва // Інсітнае мастацтва Беларусі: Гісторыя, суадносіны з народнай культурай. Сучаснасць. Тэндэнцыі развіцця: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыіі, 29–30 верасня 2000 г., Віцебскі абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці / склад. Л. Вакар. — Віцебск: ВАБ, 2003. — С. 12–18; Наивные художники Витебска // Феномен наивного искусства и творчества аутсайдеров в наши дни и его проблемы. — М., 2004. — С. 167–182; Творчество Исаака Боровского // ШМЕ. — Витебск: ВОТ, 2005. — С. 147–158; Деятельность Витебского ОНМЦ НТ и КПР по возрождению традиций народного искусства Витебщины // «Народная культура Віцебшчыны: матэрыялы навукова-практычный канферэнцыі «Працэсы мадэрнізацыі народнай культуры і вопыт устаноў культуры і адукацыі Віцебшчыны па захаванню традыцый», 26–27 мая 2005 г.: прысвяч. 160-годдзю М. Нікіфароўскага / рэдкал.: Л. Вакар [і інш.]. — Віцебск: ВДУ, 2007. — С. 43–55; Народная культура ў творчасці інсітных мастакоў // Тамсама. — С. 55–74; «Радовали сердце отдельные начинающие художники из народа…» / Бюллетень Музея Марка Шагала. № 15. — Витебск, 2008; Усходнія матывы ў творчасці Язэпа Драздовіча // Музей XXI стагоддзя: актуальныя праблемы дзейнасці. Навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 65-годдзю з дня заснавання Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. — Мн.: Белпрынт, 2008; Суадносіны шляхецкай і мужыцкай традыцый у беларускім мастацтве на мяжы XIX і XX стагоддзяў // Przegląd Wschodni. T. VII. Zs. 4 (28) — S. 1309–1324.

Каталогі і буклеты: Каталог выставы народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Віцебшчыны АНМЦНТ. — Віцебск: Друк. імя Камінтэрна, 1988. — 16 с.; Каталог выставы «Краскі Паазер'я», прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння Язэпа Драздовіча / Абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці. — Віцебск: Друк. імя Камінтэрна, 1988. — 10 с.; Разьбяры Віцебшчыны / Абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці. — Віцебск: Друк. імя Камінтэрна, 1989. — 12 с.; Каталог І Абласной выставы народнай керамікі «Ганчарны круг – 89» / Абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці. — Віцебск: Друк. імя Камінтэрна, 1989. — 20 с.; Сярод герояў Фёдара Максімава // Мастацтва Беларусі. — 1991. — № 4. — С. 34–37; Узоры мастацтва прымітыву ў творчасці разьбяроў Браслаўшчыны // Матэрыялы II Навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 925-годдзю Браслава / Беларускі фонд культуры; Браслаўскі гісторыка-краязнаўчы музей. — Браслаў: Браслаўскі ф-л Пастаўскай друк., 1991. — С. 7–11; Каталог выставы «Летуценні Язэпа Драздовіча» / Беларускі інстытут праблем культуры; Віцебскі абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці. — Віцебск: Друк. імя Камінтэрна, 1993. — 24 с.; Язэп Драздовіч і Марк Шагал. Паралелі лёсу і творчасці // Культура. — 1993. — 5 ліп. — С. 8; Каталог выставкі. Ф. Максімаў / Віцебскі абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці. — Віцебск: Друк. імя Камінтэрна, 1994. — 30 с.

Артыкулы ў перыядычным друку: Чым цікавы гаршчок? // ВР. — 1989. — № 193. — С. 5; Чысціня полацкай традыцыі // ВР. — 1991. — № 41. — С. 4; Пантэон дзядзькі Пятра: [П. Зяляўскі] // ВР. — 1991. — № 147. — С. 4; Докшыцкія маляванкі // ВР. — 1991. — № 239. — С. 4.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Вакар Л.У. (26.05.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ВАЛЕТКА** ЛІЗАВЕТА ЦІХАНАЎНА, краязнаўца. Працавала дырэктарам Пастаўскага краязнаўчага музея, цяпер на пенсіі. Аўтар артыкулаў у раённай газеце па гісторыі Пастаў.

Тв.: Гартаючы старонкі мінулага // Звязда (П). — 1989. — № 111; Заглянем у нашу гісторыю // ПК. — 1993. — № 79. — С. 2; Першая кніга пра Лынтупы // ПК. — 1993. — № 90. — С. 2; Якая ж будучыня без гісторыі // ПК. — 1994. — № 6. — С. 2; Камбрыг — Герой Савецкага Саюза // ПК. — 2003. — № 126. — С. 3; На урок у музей // ПК. — 2004. — № 54. — С. 3.

**ВАНСОВІЧ** АНАСТАСІЯ АЛЕГАЎНА (29.08.1986, г. Паставы), краязнаўца. Скончыла СШ № 1 г. Пастаў. У школьныя гады брала ўдзел у краязнаўчым руху. Аўтар навукова-даследчых прац «А.С. Юркевіч — навуковец з Пастаўшчыны», «Экалагічная характарыстыка горада Паставы. Складанне экалагічнага пашпарта горада». Сааўтар кнігі «Маньковічы», прысвечанай былому мястэчку на Пастаўшчыне. У даследаванні апісваецца геаграфічнае месцазнаходжанне паселішча, яго ваколіцы, жыллёвыя і грамадскія пабудовы, мясцовыя могілкі і інш. Апісаны асаблівасці былога палаца-паркавага комплексу, храмаў, капліцы, млына, пошты. Запісаны ўспаміны пра даўніну мясцовых насельнікаў, даследаваны перыяд у лёсе У. Дубоўкі, калі ён вучыўся ў мястэчку. Даследчыкі прыводзяць спіс крыніц з 19 найменняў, якімі яны карысталіся пры падрыхтоўцы выдання.

Тв.: (разам з І. Пракаповічам, І. Заяц) Маньковічы: гісторыка-геаграфічны нарыс. — Паставы: Сумежжа, 2004. — 60 с.

Літ.: Сідарэвіч А. Выдадзена ў Паставах // НН. — 2005. — № 29, 5 жніўня. — С. 8; Далідовіч Г. Манькавічы // КГ. — 2005, жнівень. — № 31–32. — С. 8.

**ВАРАТЫНСКАЯ** ГАЛІНА АЛЯКСАНДРАЎНА (21.01.1953, г.п. Ушачы), журналіст. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1997). Скончыла Ушацкую СШ (1970), факультэт журналістыкі БДУ (1980). Працавала ва ўстановах гандлю і культуры Ушацкага раёна, журналістам раённай газеты «Патрыёт».

Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ва ўшацкай раённай газеце «Патрыёт», дзе вяла рубрыку «Нашы землякі». Аўтар некалькіх паэтычных зборнікаў. Старшыня ушацкага раённага ТБМ імя Ф. Скарыны (1989).

Тв.: Помнікі нашай памяці: [помнікі гісторыі і культуры Ушаччыны] // П. — 1989. — № 43. — С. 2; Каб ведалі нашчадкі: [музей у Арэхаўскай СШ] // П. — 1990. — № 55. — С. 2; Госці з Амерыкі: [Бартулі] // П. — 1992. — № 76. — С. 2; Гісторыя і лёсы вёскі Вяркуды // П. — 1992. — № 91. — С. 2–3; Тут пачыналася яе дарога: [Е. Лось] // П. — 1999. — № 11. — С. 2; Выходзіць, што можна: [І. Наваградская] // П. — 1999. — № 49. — С. 2; Аўтар дапаможніка — настаўніца: [Л. Цяцерка] // П. — 2000. — № 1. — С. 2; Прафесар медыцыны з Ушаччыны: [Р.У. Жаваранак] // П. — 2003. — № 52. — С. 2; Е. Лось «…Мацней за іншыя хвалюе» // П. — 2004. — № 14. — С. 2; Кінематаграфіст з Ушаччыны: [У. Халіп] // П. — 2004. — № 102. — С. 4; «Як спяшаўся да вас…»: [П. Броўка] // П. — 2005. — № 25. — С. 2; Глыбокі след: [рэжысёр В. Маслюк] // П. — 2008. — № 24. — С. 2.

**ВАРОНІН** ВАСІЛЬ АЛЯКСЕЕВІЧ (1971, в. Дзёрнавічы Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобл.), гісторык. Кандыдат гіст. навук (2000), дацэнт. Скончыў СШ № 2 г. Верхнядзвінска, гіст. факультэт БДУ (1994), аспірантуру БДУ. Працаваў выкладчыкам у ПДУ (1998–2000), на кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта БДУ (з 2000). Аўтар дысертацыйнага даследавання «Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Полацкага ваяводства ў першай палове XVI стагоддзя» (2000). Займаецца даследаваннем гісторыі Беларускага Падзвіння XIII–XIV стст., гісторыі ВКЛ XV–XVI стст. Аўтар больш за 70 навуковых публікацый.

Тв.: Кніга і аўтарэферат: Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Полацкага ваяводства ў першай палове XVI стагоддзя: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук / БДУ. — Мн.: БДУ, 2000. — 19 с.; Рэестр путных баяр Полацкага ваяводства 1585 года. — Мн.: РІВШ, 2009. — 50 с.

Артыкулы ў кнігах «Памяць» і навуковым друку: Полаччына ў складзе ВКЛ // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Полацка. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 37–41; Полаччына ў складзе Рэчы Паспалітай // Тамсама. — С. 43–46; Полаччына ў складзе Расійскай імперыі // Тамсама. — С. 49–51; Вялікія князі полацкія, канец XIV ст. // Полацк: Карані нашага радавода: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі. — Полацк, 1996. — С. 44–50; Мяшчанскае землеўладанне ў Полацкім ваяводстве ў першай палове XVI ст. // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы III міжнар. навук. канф. — Полацк, 1998. — С. 58–63; Палітычны лад Полацкага ваяводства ў першай палове XVI ст. // БГА. — Т. 5. Сш. 1 (8). — 1998. — С. 27–66; Унутраны гандаль у Полацкім ваяводстве першай паловы XVI ст. // Веснік БДУ. Серыя 3. — 1999. — № 1. — С. 15–17; Полацкая зямля ў знешнім і ўнутраным гандлі Вялікага княства Літоўскага першай паловы XVI ст. // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь. — Мн., 1999. — С. 52–54; Полацкія путныя слугі ва ўрадавай палітыцы ВКЛ, XV – сярэдзіна XVI ст. // БГА. — Т. 7. Сш. 2 (13). — 2000. — С. 305–324; Друцкія князі XIV стагоддзя // БГА. — Т. 9. Сш. 1–2 (16–17). — 2002. — С. 3–29; Тэстамент полацкага бурмістра Давыда Панкова 1559 г. // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі. — Полацк, 2002. — С. 32–40; Полаччына і палачане ў нацыянальна-культурным і рэлігійным жыцці Вялікага княства Літоўскага першай паловы XVI ст. // Białoruskie Zeszyty Historyczne. — № 17. — Białystok, 2002. — S. 211–219; Браслаўскі Прачысценскі манастыр на востраве паводле прывілея Жыгімонта І 1540 года // Браслаўскія чытанні: матэрыялы VI навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 150-й гадавіне з дня нараджэння браслаўскага лекара, грамадскага дзеяча Станіслава Нарбута (1853–1926), 7–8 мая 2003 года. — Браслаў, 2003. — С. 13–15; Дрыса ў XVI ст. // Commentarii Polocenses Historici = Полацкія гістарычныя запіскі. — 2004. — Т. 1. — С. 20–31; «Книга Святого Софея»: Да гісторыі полацкіх кніжных збораў XV–XVI стст. // БГЧ. — 2007. — № 3 — С. 46–51; Падзеі 1307 года ў Полацку: спроба крытычнага разбору // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы. — Полацк, 2009; Войт-ваявода і мяшчане ў канфлікце 1558 года ў Полацку // Соціум. Альманах соціальної історії. — Вип. 7. — Київ, 2007. — С. 59–65.

Артыкулы ў перыядычным друку: Дрыса ў XVI стагоддзі // ДзП. — 2005. — № 66, 69, 71, 78–79, 91, 93, 97, 102, 105. — 2006. — № 3.

Літ.: Міхнюк, У.М. Доктарскія і кандыдацкія дысертацыі па гістарычных навуках у Рэспубліцы Беларусь (1991–2003): бібліягр. паказ. / У.М. Міхнюк. — Мінск: НАРБ, 2006. — С. 18; Варонін В. «Книга Святого Софея»: Да гісторыі полацкіх кніжных збораў XV–XVI стст. // БГЧ. — 2007. — № 3 — С. 46.

**ВАРОНІНА** ТАЦЦЯНА МІХАЙЛАЎНА (27.10.1950, г. Орша), краязнаўца. Скончыла СШ № 7 г. Оршы (1967), факультэт журналістыкі БДУ (1975). Працавала лабарантам на льнокамбінаце г. Оршы (1967–1968), кантралёрам на Мінскім камвольным камбінаце (1968–1969), адказным сакратаром газеты «Вперед» Казельскага раёна (1971–1972), карэспандэнтам газеты «Ленінскі прызыў» (1973–1974), лабарантам на будаўніцтве Брацкай ДРЭС (1974–1975), экскурсаводам у бюро вандровак г. Оршы (1975–1980), бібліятэкарам ЦБС г. Оршы (1980–1989), навуковым супрацоўнікам МКГКА (1989–1995), кіраўніком гуртка, метадыстам аддзела краязнаўства Аршанскага ЦДЮТЭ (1995–2004).




Зацікавілася гісторыяй роднага краю, калі працавала экскурсаводам. Значную ролю ў фарміраванні зацікаўленасці адыграў аршанскі краязнаўца Д.С. Ліхачоў. Пачала збіраць матэрыялы па гісторыі Аршаншчыны. Звяртае асаблівую ўвагу на краязнаўчыя асаблівасці Аршаншчыны, цікавіцца лёсамі славутых людзей краю. Працуючы ў Музеі гісторыі і культуры Оршы, прыняла ўдзел у стварэнні экспазіцыі трох залаў (1989–1992), выставы «Рэчы нашых бабуль» (1994). Удзельнічала ў этнаграфічных і краязнаўчых экспедыцыях па зборы экспанатаў для музейных фондаў МКГіКА. Як метадыст аддзела краязнаўства Аршанскага ЦДЮТЭ адыгрывае значную ролю ў арганізацыі школьнага краязнаўства на Аршаншчыне.

Падрыхтавала турыстычны буклет пра Оршу з картай-схемай (1996). Аўтар-укладальнік (разам з А.М. Шышкевічам), гісторыка-краязнаўчага зборніка для пачатковага азнаямлення «Мой родны край — Аршаншчына», аўтар 8 артыкулаў для яго. Адрэдагавала і выдала зборнік «Оршанские краеведы», які распрацоўвала С.І. Іванова.

Плануе скласці зборнік віктарын, крыжаванак, загадак, рэбусаў па краязнаўстве Оршы, даведнік з маршрутамі аднадзённых паходаў па Аршаншчыне ў дапамогу класным кіраўнікам школ і кіраўнікам краязнаўчых гурткоў. Мае ненадрукаваны «Оршанский букварь: краеведческий справочник», тэлесцэнарый «Орша город интересный».

Брала ўдзел у працы па захаванні помнікаў гісторыі і культуры (д. 17 па вул. Мінскай г. Оршы).

Тв.: Кнігі і артыкулы ў іх: Мой родны край — Аршаншчына: гісторыка-краязнаўчы зборнік для пачатковага азнаямлення / аўт.-саст.: Т.М. Вароніна, А.М. Шышкевіч. — Віцебск, ВАД, 2000. — 160 с.; Першае ўпамінанне Оршы ў летапісе // Тамсама. — С. 54–55; Легенда пра баярына Оршу // Тамсама. — С. 57–60; Аршанскі замак // Тамсама. — С. 64–66; Аршанскія гербы // Тамсама. — С. 68–69; Развіццё Оршы ў XIX – пачатку XX стагоддзя // Тамсама. — С. 89–91; Нашы славутыя землякі // Тамсама. — С. 114–119; Аршанскія музеі. — С. 139–142; Наш горад сёння // Тамсама. — С. 150–152; Слово от редактора // Иванова С.Г. Оршанские краеведы. — Орша, 2002. — С. 5; (разам з Л.Э. Анісовіч) Орша — город интересный: путеводитель по древней Орше. — Мн.: Типография Макарова, 2007. — 8 с.

Артыкулы ў перыядычным друку: Першы клад музея // ЛП. — 1990. — № 137. — С. 4; Цікавыя знаходкі // ЛП. — 1990. — № 171. — С. 4; Узнавіць гісторыю роду // ЛП. — 1991. — № 100. — С. 3; Открываем Оршанщину // АГ. — 2003. — № 190. — С. 3; Прадмет, які сорамна не ведаць // НГ. — 2003. — 2 лют. — С. 3; Трудолюбие — семейная черта Могучих // АГ. — 2008. — № 6. — С. 4.

Літ.: Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 10; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Вароніна Т.М. (15.01.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ВАРОНІЧ** ТАЦЦЯНА УЛАДЗІМІРАЎНА (18.05.1975, г. Мінск), гісторык. Скончыла гіст. факультэт БДУ (1998). Працуе на кафедры эканамічнай гісторыі ў БДЭУ (з 2004).

Пад кіраўніцтвам праф. П.І. Брыгадзіна абараніла дысертацыйнае даследаванне «Губернский город Витебск на рубеже XIX–XX вв.» (2005). Аўтар шэрагу артыкулаў, прысвечаных гісторыі і культуры горада.

Тв.: Губернский город Витебск на рубеже XIX–XX вв.: автореферат дис. … канд. ист. наук, 07.00.02 / БГУ. — Мн.: БГУ, 2005. — 20 с.; Навучальныя ўстановы Віцебска на мяжы XIX–XX стст. // Народная асвета. — 2003. — № 11; Крэдытныя ўстановы Віцебска на мяжы XIX–XX стст. // БГЧ. — 2004. — № 1. — С. 19–23; Торговля в Витебске на рубеже XIX–XX вв. // Вестник БрГТУ. Сер. гуман. наук. — 2003. — № 6.

Літ.: Корзенко Г.В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник. — Мн.: Бел. наука, 2007. — С. 68.

**ВАСІЛЕЎСКАЯ** ТАЦЦЯНА МІКАЛАЕЎНА, працуе ў сельскай бібліятэцы в. Баева Дубровенскага раёна. Збірае матэрыялы па гісторыі роднага краю, легенды і паданні наваколляў, вывучае тапаніміку месца пражывання. Афармляе стэнды і альбомы, праводзіць выставы. Вядзе клуб «Спадчына».

Літ.: Дударава Л. Энтузіяст сваёй справы: [Т.М. Васілеўская] // ДнП. — 2005. — № 75. — С. 2.

**ВАСІЛЬЕЎ** ВІКТАР ВАСІЛЬЕВІЧ (12.06.1954, г. Вышні Валачок Цвярской вобл, РСФСР), педагог. Скончыў СШ № 6 г. Вышні Валачок (1971), фізкультурны, гіст. факультэты СДПІ (1978, 1983). Працуе настаўнікам гісторыі Бабініцкай СШ Віцебскага раёна (з 1980). Вывучае гісторыю мікрарэгіёна месца пражывання, аддаючы перавагу даследаванню падзей Вялікай Айчыннай вайны ў краі, гісторыі школы і тэме вядомых землякоў і выпускнікоў.

Аўтар артыкулаў па гісторыі краю ў перыядычным друку («Советская Белоруссия», «Народнае слова», «Жыццё Прыдзвіння»).

Тв.: Была у летчика мечта // ЖП. — 2008. — 26 крас. — С. 2; Шел парнишке в ту пору 18-й год: [У. Курыленка] // ЖП. — 2008. — 29 крас. — С. 2; Особый батальон: [825-ты Волга-татарскі батальён] // ЖП. — 2008. — 2 ліп. — С. 2; Послание Двине татарского поэта // НС. — 2008. — 31 мая. — С. 6; Прерванный полет: [А. Падзвінскі] // ЖП. — 2008. — 23 верас. — С. 2; У истоков: [дырэктары Бабініцкай СШ Віцебскага раёна] // ЖП. — 2008. — 13 снеж. — С. 2; Генерал из народа: [генерал арміі І. Шаўроў, ураджэнец в. Шабуні Віцебскага раёна] // ЖП. — 2009. — 21 крас. — С. 2.

**ВАСКОЎСКАЯ** СВЯТЛАНА МІХАЙЛАЎНА (26.10.1956, г. Варкута, Комі АССР), краязнаўца. Скончыла факультэт бібліятэказнаўства і бібліяграфіі МДІК (1981). Працуе загадчыцай аддзела маркетынгу і рэкламы Талачынскай раённай ЦБС (з 1982).

Даследуе праваслаўныя святыні Талачыншчыны. Краязнаўчую дзейнасць пачала з удзелу ў Свята-Ефрасіньеўскіх педагагічных чытаннях (2002). Значную ролю ў фарміраванні зацікаўленасці ў тэматыцы даследаванняў і арганізацыі працы аказаў выкладчык ВНУ В.С. Пасэ. На аснове вусных і архіўных крыніц падрыхтавала кароткія звесткі пра цэрквы Талачыншчыны, якія былі надрукаваны ў раённай газеце. У прыватным архіве захоўвае рукапіс «Страницы Православия на Толочинщине».

Тв.: (разам з П.В. Лазука) Православные святыни Толочинского района: прошлое и настоящее. — Витебск, 2004. — 18 с.; (разам з П.В. Лазука) Няклюдаўскі мужчынскі манастыр у гонар святых дабраверных мучанікаў князёў Барыса і Глеба // Праваслаўе. — 2004. — № 12–13. — С. 64–68; (разам з П.В. Лазука) Няклюдаўскі мужчынскі манастыр // Царкоўнае слова. — 2004. — № 17. — С. 14–17; (разам з П.В. Лазука) Храм Покрова Пресвятой Богородицы // НТ. — 2004. — № 96–97. — С. 3; Возвращение к истокам // Тамсама. — С. 6; Православная церковь и светская библиотека: точки соприкосновения // Тамсама; (разам з П.В. Лазука) Храм святых апостолов Петра и Павла в деревне Славени // Праваслаўе. — 2005. — № 13. — С. 12–13.

Літ.: Татаринов Ю. Города Беларуси. Витебщина. Мн.: Энциклопедикс, 2006. — С. 19; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Васкоўская С.М. (9.02.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ВАШЧЫЛА** ІВАН АРЭФ'ЕВІЧ (1900?, хутар Вашчылы паблізу в. Дарахі Гарадоцкага пав. Віцебскай губ., цяпер Руднянскі с/с Гарадоцкага раёна – 1977?, г. Курган), краязнаўца. Вучыўся ў Невельскай гімназіі. З пачаткам Першай сусветнай вайны тры разы збягаў на фронт, аднак быў вернуты паліцыяй. Урэшце стаў «сынам палка» адной з сібірскіх часцей, якая накіроўвалася на руска-германскі фронт. Служыў у пешай, потым кавалерыйскай разведцы. У 16 гадоў стаў поўным георгіеўскім кавалерам. Быў таксама ўзнагароджаны французскімі і англійскімі медалямі, ордэнам Ганны. За заслугі быў ўдастоены афіцэрскага звання. Скончыў 1-ю Пецяргофскую школу прапаршчыкаў (14.05.1916). Даслужыўся да звання паручніка. Быў тройчы паранены. Вучыўся ў лётнай школе ў Гатчыне на «паветранага назіральніка» (штурмана).

Пасля заключэння міру з Германіяй вярнуўся дадому. Па асабістых перакананнях не прыняў палітыкі бальшавікоў і выехаў у Сібір, дзе быў мабілізаваны ў армію адмірала А.В. Калчака. Служыў у аўтароце, потым у падраздзяленні паветраных войскаў. Браў удзел у баявых дзеяннях. Быў цяжка паранены. Напярэдадні разгрому калчакаўскай арміі разам з вядомым асам Першай сусветнай вайны лётчыкам Мурамцавым перайшоў мяжу з Кітаем. Жыў у Манчжурыі. У Харбіне ажаніўся з дачкой былога ўпраўляючага Краснаярскага банка.

Некаторы час служыў у казацкіх часцях генерала Сямёнава. У званні пад'есаула служыў начальнікам штаба Пагранічанскага раёна Далёкаўсходняга саюза ваенных у Манчжурскай імперыі (структурнага падраздзялення Далёкаўсходняга саюза ў Манчжурскай імперыі, які ў сваю чаргу падначальваўся Галоўнаму бюро па справах расійскіх эмігрантаў у Манчжоў-Го).

З'яўляўся актывістам «Национальной организации русских разведчиков» (НОРР, штаб-кватэра знаходзілася ў Парыжы). З'яўляўся начальнікам «Восточного отдела НОРР». У Дзяржаўным архіве Хабараўскага краю знаходзіцца персанальны фонд І.А. Вашчылы У часопісе «Часовой» змешчаны яго фотаздымак (электронная копія на сайце С.В. Волкава). Згадваецца ў слоўніку лётчыкаў, які быў складзены эмігрантамі ў 1960-х гадах у Сан-Францыска.

Служыў у ваенных фарміраваннях Гаміньданаўскай арміі пад началам Чан Кайшы. Сфарміраваў лётную часць з былых лётчыкаў белагвардзейскіх войскаў. У паветраным баі



з лётчыкамі арміі КПК быў цяжка паранены. Даслужыўся да звання падпалкоўніка. Меў магчымасць стаць палкоўнікам, аднак не пагадзіўся, бо ўмовай для гэтага з'яўлялася прыняцце кітайскага падданства.

У 1945 г. разам з падначаленай яму часцю перайшоў на бок Савецкай Арміі. Быў рэпрэсаваны і адсядзеў 11 гадоў у ГУЛАГу. Увесь час хацеў вярнуцца на Радзіму (Гарадоччыну), аднак у выніку таго, што меў абмежаванне на пражыванне ў Еўрапейскай частцы СССР, жыў у г. Курган РСФСР. Працаваў на розных пасадах у школе, выкладчыкам музыкі.

Штогод улетку прыязджаў на Гарадоччыну. Даследаваў тэрыторыю Руднянскага сельскага савета. Прыцягнуў увагу археолагаў да выяўленых ім археалагічных аб'ектаў: курганоў, гарадзішчаў. Адкрыў у 1968 г. і ўвёў у навуковы зварот курганныя могільнікі каля в. Дарахі, у 1975 г. неалітычныя стаянкі на воз. Сенніца. Першым даследаваў і звярнуў увагу спецыялістаў на мясцовасць, якая, верагодна, з'яўлялася месцам пакланення мужчынскаму дзетароднаму органу, так званы «Х… лес». Перапісваўся і меў стасункі з археолагамі Э.М. Зайкоўскім, Ю.А. Зайцам, А. Лапаціным, В. Мікляевым, М. Ткачовым, Г.В. Штыхавым і інш.

Літ.: Микляев А. Подводные археологические исследования озера Сенница 1982–1987 гг. // Сообщения Государственного ордена Ленина Эрмитажа. — LIV. — Л.: Искусство, 1990. — С. 17–21; Сіманюкоў С., Штыхаў Г. Дарахі // ЭГБ. — Мн., 1996. — Т. 3. — С. 208; Інтэрв'ю з Ю.А. Зайцам (26.10. 2007) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Хайрулин М., Кондратьев В. Военлеты погибшей Империи: Авиация в Гражданской войне: [электронны рэсурс] // Курган и Курганцы. — 2008. — № 29. — Рэжым доступу: http://aviakurgan.narod.ru/Gr_war.html; Фонды Хабаровского краевого архива по Трехречью: [электронны рэсурс] // Предыстория: общенациональный историко-культурологический сервер Predistoria.org. — Рэжым доступу: http://www.predistoria.org/index.php?name=Forums&file=viewtopic&p=27229; Худобородов А. Казачья эмиграция в Манчжурии в период Японской оккупации, 1932–1945 годы: [электронный ресурс] // Научная библиотека Челябинского гос. университета. — Рэжым доступу: http://www.lib.csu.ru/vch/10/2002_01/019.pdf; Сайт С.В. Волкова: [электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://swolkov.narod.ru/foto1/190.htm.

**ВЕНГЛІЦКАЯ** (Węglicka) КАТАЖЫНА, аўтар кнігі «Беларускія сцежкі». Некаторыя матэрыялы прысвечаны Віцебшчыне: «Марыцель з Віцебска» (Шагал М.), «Пад Оршай», «На Полацкім тракце і не толькі», «Заедзем да Пастаў» і інш. Матэрыялы ўтрымліваюць гіст. памылкі і недакладнасці.

Тв.: Białoruskie ścieżki kresowe. Gawędy kresowe. — Warszawa: Księzka i Wiedża, 2006. — 425 s.



**ВІЛЬЧЫНСКІ** ІВАН СЦЯПАНАВІЧ (6.02.1912, в. Зялёнка Полацкага пав. – 1.01.1999), краязнаўца, ветэран. Скончыў Кіеўскае ваеннае вучылішча сувязі, Ленінградскую вайсковую акадэмію сувязі імя С. Будённага (1941). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Служыў ва УС СССР (1934–1958), пасля вайны працаваў у Кемераўскім вучылішчы сувязі. Пасля выхаду ў адстаўку працаваў у арганізацыях сувязі Полаччыны.

Узначальваў нештатны аддзел ваенна-патрыятычнага выхавання ў полацкай газеце «Сцяг камунізму». Склаў кароткую гісторыю сувязі Полаччыны. Даследаваў жыццёвыя лёсы асобаў, у гонар якіх названы вуліцы Полацка, аддаючы перавагу ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар шэрагу артыкулаў у газеце «Сцяг камунізму» пад рубрыкай «Вуліцы нашага горада», прысвечаных ветэранам-удзельнікам Другой сусветнай вайны.

Тв.: Дзеля жыцця на зямлі // СК. — 1978. — № 73. — С. 2; Радаснае свята вызвалення // СК. — 1978. — № 103. — С. 2; Незабыўная сустрэча // СК. — 1979. — № 102. — С. 2; Дзеля жыцця на зямлі: [Сушкоў] // СК. — 1979. — № 142. — С. 3; На ўсё жыццё // СК. — 1980. — № 7. — С. 2; (разам з У. Ліхачовым) Аперацыя «Баграціён» і вызваленне Полаччыны // СК. — 1980. — № 67, 69, 73, 85; (разам з У. Ліхачовым) Над Полацкам сцяг вызвалення // СК. — 1980. — № 104. — С. 2; Імя І.А. Краснова // СК. — 1985. — № 72. — С. 3; Імя П.У. Сушкова // СК. — 1985. — № 90. — С. 3; Аб загінуўшых памяць // СК. — 1985. — № 102. — С. 3; Імя генерала Бабахіна // СК. — 1985. — № 105. — С. 2; Імя Магалашвілі // СК. — 1986. — № 31. — С. 3; Набліжалі перамогу: [Г.Р. Катушаў] // СК. — 1986. — № 104. — С. 2; Трывожаць раны генерала: [А.Я. Хвастоў] // СК. —

1986. — № 174. — С. 3; Освобождал Полотчину: [М.М. Броннікаў] // Химик. — 1987. — № 12. — С. 2; Камкоры // СК. — 1987. — № 105. — С. 2; Пахаваны на плошчы: [І.Ф. Марахоўскі] // СК. — 1988. — № 104. — С. 3; Узнагароджаны за вызваленне Полацка: [М.С. Самасенка] // СК. — 1988. — № 116. — С. 3.

Літ.: Ліхачоў У. Ветэран, патрыёт, камуніст // СК. — 1987. — № 21. — С. 2; Вільчынскі І.С. Некралог // ПВ. — 1999. — № 2. — С. 4.

**ВІННІЦА** ГЕНАДЗЬ РУВІМАВІЧ (25.01.1959, г. Орша), краязнаўца. Скончыў 8 класаў СШ № 7 г. Оршы (1974), Аршанскае педагагічнае вучылішча, гіст. факультэт МгДПІ (1988, завочна), Віцебскае вучылішча мастацтваў (1991), Адкрыты ўніверсітэт Ізраіля. Працаваў настаўнікам працоўнага навучання, гісторыі ў школах Оршы, кіраўніком гуртка ў Аршанскім цэнтры творчасці. Стварыў 1-ю яўрэйскую нядзельную школу ў г. Оршы (1994). Выехаў у Ізраіль (1999).

Займаецца вывучэннем гісторыі яўрэяў на Аршаншчыне. Сабраў значныя матэрыялы, працуючы ў архівах Оршы, Мінска, Масквы, ведучы перапіску, сустракаючыся з ахвярамі Халакосту. Падтрымлівае стасункі з рознымі музеямі краіны і музеем Яд Вашэм у Ізраіле.

На аснове выяўленых матэрыялаў напісаў шэраг матэрыялаў, якія надрукаваў у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку. Пачаў пісаць у пачатку 1990-х гг. Напісаў некалькі кніг па гісторыі яўрэйскай абшчыны Оршы. Выданне «Листы истории» прысвечана гісторыі яўрэйскай абшчыны Оршы з XVI ст. У кнігах «Слово памяти» і «Горечь и боль» апісана гісторыя гета ў Оршы, лёс яўрэяў у Віцебскай вобл. у часы Другой сусветнай вайны. У кнізе «Листы памяти» даследаваў гісторыю яўрэйскай абшчыны г. Оршы, лёс яўрэяў Усходняй Беларусі ў часы Другой сусветнай вайны на прыкладзе трох раёнаў Віцебскай і аднаго Мінскай вобл. (Крупскага). У выданні таксама змешчаны нарысы пра вядомых землякоў: Л. Выгоцкага, Б. Ласкіна, С. Друкер. Аўтар некалькіх артыкулаў для кніг «Памяць» г. Оршы і Аршанскага раёна.

31.10.2008 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную праблеме генацыду яўрэйскага насельніцтва ва Усходняй Беларусі. У аснове працы значная колькасць дакументаў і матэрыялаў па Віцебскай вобл. (не зацверджана ВАК).

Тв.: Кнігі: Слово памяти. — Орша: Оршанская типография, 1997. — 112 с.; Горечь и боль. — Орша: Оршанская типография, 1998. — 240 с.; Листы истории. — Витебск: ВОТ, 1999. — 208 с.

Артыкулы ў кнізе «Памяць»: Генацыд беларускага насельніцтва // Памяць: Гісторыка-культурная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 308–311.

Артыкулы ў перыядычным друку: Зарождалось на Оршанщине: [рух Хабад-Любавічы ў в. Ляды Аршанскага раёна] // АГ. — 1996. — № 7. — С. 4; Пачыналася ў Лядах: [Ш.З. Шнэерсон] // ДнП. — 1996. — № 53. — С. 3; Оршанское гетто // АГ. — 1996. — № 99–102; Страшнае слова «гета» // НС. — 1997. — № 74. — С. 3.

Літ.: Копцік Ю. Генадзь Вінніца «Слово Памяти»: [рэцэнзія] // АГ. — 1997. — № 109. — С. 3; Лютынскі В. Г. Вінніца. «Листы истории»: [рэцэнзія] // АГ. — 1999. — № 117. — С. 3; Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 9.

**ВОДНЕВА** ІРЫНА ПЯТРОЎНА (*П. Каваленка*), (13.07.1973). Скончыла Фарынаўскую школу Полацкага раёна (1988), гіст. факультэт БДПІ. Працуе дырэктарам Полацкага краязнаўчага музея. Вывучае гісторыю горада. Аўтар артыкулаў у перыядычным друку, у якіх асвятляюцца асобныя пытанні гісторыі і культуры Полаччыны.

Тв.: Артыкулы ў навуковым друку: Перыядычны друк на Полаччыне ў першай палове XX ст (1917–1936) // Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі. Да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея / уклад. В.Д. Краско. — Полацк: НПГКМЗ, 2008. — С. 33–45; «Віцебскі рабочы» на Полаччыне // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі: па выніках навукова-даследчай работы ў 2007 г. / уклад. Т.А. Джумантаева. — Полацк: НПГКМЗ, 2008. — С. 14–22; Сцяпан Антонавіч Клокаў — полацкі настаўнік, краязнаўца // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею: матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 30–31 кастрычніка 2008 г. / рэдкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. — Мн.: Медысонт, 2009. — С. 396–403.

Артыкулы ў перыядычным друку: На заняткі — у музей // ПВ. — 2004. — № 28–29. — С. 7; Дата з гісторыі горада // ПВ. — 2006. — № 36. — С. 2; Азбука ведаў // ПВ. — 2006. — № 73. — С. 2; Город — мудрец, город — богатырь // ИП. — 2008. — № 5. — С. 4; От Изяслава до Всеслава // ИП. — 2008. — № 6. — С. 5; Там, где думается о вечности: [Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр] // ИП. — 2008. — № 7. — С. 4; Кладезь учености и просвящения: [Полацкі езуіцкі калегіум] // ИП. — 2008. — № 8. — С. 2; Прогулка по Нижнепокровской // ИП. — 2008. — № 9. — С. 2; Их именами гордится Полоцк // ИП. — 2008. — № 10. — С. 4; Берега у Двины серебряные, дно золотое // ИП. — 2008. — № 11. — С. 4; Великие наставники земли Полоцкой // ИП. — 2008. — № 12. — С. 4; Полоцк в Отечественной войне 1812 года // ИП. — 2008. — № 13. — С. 4; Абаронцы Полацка — Зыгін і Шанягін // ИП. — 2008. — № 28. — С. 5; Імя Максіма Багдановіча // ИП. — 2008. — № 31. — С. 5; Героі Полацкай зямлі: [П. Сушкоў, У. Літвінаў] // ИП. — 2008. — № 32. — С. 4; З верай у перамогу // Тамсама; Родам з далёкіх краёў: [В.Ф. Чайко] // ИП. — 2008. — № 34. — С. 4; Любіў сваю зямлю: [А. Матросаў] // ИП. — 2008. — № 34. — С. 4; Ігнат Буйніцкі — заснавальнік беларускага прафесійнага тэатра // ИП. — 2008. — № 36. — С. 4.



**ВОЛКАЎ** ІВАН ІВАНАВІЧ (7.01.1930, в. Пусташы, Полаччына – 2001?), настаўнік, краязнаўца, паэт. Скончыў Полацкае педвучылішча (1953), гіст. факультэт МгДПІ (1958). Працаваў настаўнікам гісторыі ў школах вёсак Галубічы, Чарневічы, больш за 20 гадоў узначальваў школу ў в. Псуя (Глыбоччына). З'яўляўся членам прэзідыума раённага аддзялення БДТАПГіК. Пражываў у в. Псуя Глыбоцкага раёна.




Збіраў фальклорныя, этнаграфічныя матэрыялы: прымаўкі, прыказкі, мясцовыя гаворкі, народныя песні, прыпеўкі, побыт, вераванні, замовы, легенды і паданні роднай мясцовасці. Даследаваў мясцовую тапаніміку. Аўтар рэцэнзій на даведнікі, слоўнікі, энцыклапедыі, у якіх аналізаваў змешчаныя ў кнігах матэрыялы, якія мелі дачыненне да Глыбоччыны. Даслаў у Інстытут мовазнаўства НАН Беларусі больш за 500 мясцовых прыкладаў да слоўніка гаворак Я. Драздовіча, «Слоўнік гаворак Дзісненшчыны».

Склаў слоўнік мясцовых гаворак вёскі Псуя. Асаблівую каштоўнасць маюць матэрыялы па тапаніміцы, лексіцы з тлумачэннямі словаў і прыкладамі іх ужывання.

Браў удзел у падрыхтоўцы выдання кнігі «Памяць» Глыбоцкага раёна. Шэраг матэрыялаў апублікаваў на старонках газет «Звязда», «Шлях Перамогі» (з 1991 г. «Веснік Глыбоччыны»), «Вольнае Глыбокае». Частка матэрыялаў, якія публікаваліся ў мясцовым друку (1994–2000), увайшла ў брашуру «Легенды, паданні азёрнага краю», у якой прадстаўлены матэрыялы, сабраныя і апрацаваныя на Глыбоччыне (мясцовасць вакол азёр Доўгінскай групы, на Псуеўшчыне). Удзельнічаў у конкурсе «Агульны сшытак», які абвясціла газета «Звязда», атрымаў першае месца за збор матэрыялаў у намінацыі «Сам сабе чараўнік».

Значная колькасць сабраных матэрыялаў аформлена ў форме рукапісу «Дыяменты роднай мовы», які захоўваецца ў Глыбоцкім краязнаўчым музеі.

Заслужаны настаўнік Беларусі, узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».


Тв.: Кніга: Легенды, паданні азёрнага краю. Глыбокае. — Наваполацк: Вольнае Глыбокае, 2000. — 50 с.

Артыкулы ў кнізе «Памяць»: (разам з А.В. Раманавым, Ф. Семуровым, А.А. Тарыкавым, П.А. Хомчанка, С.М. Шабалоўскім) Ішла вайна свяшчэнная // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 175–190; Ірына Жарнасек // Тамсама. — С. 417–418; Клава Шакаладава // Тамсама. — С. 214–215; Як «жанілі Цярэшку» // Тамсама. — С. 422–425.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Унікальнае выданне // ШП. — 1987. — № 50. — С. 4; Хто верне веліч паркам? // ШП. — 1987. — № 143. — С. 4; Імёны, што клічуць на подзвіг // ШП. — 1987. — № 147. — С. 3; Гімн культуры народа // ШП. — 1988. — № 8. — С. 2; Што мы ведаем аб нашых старажытных парках? // ШП. — 1988. — № 107. — С. 4; У грозным 1920 годзе // ШП. — 1988. — № 155. — С. 2; Лексіка гаворкі вёскі Псуя // ШП. — 1989. — № 57. — С. 2, 4. — №№ 96, 123, 145; Беларускі Байкал: [воз. Доўгае] // ШП. — 1990. — № 17. — С. 2; Праблемы возера Шо // ШП. — 1990. — № 56. — С. 3; Дыяменты // ВР. — 1990. — № 52. — С. 4; Тры возеры з назвай Белае // ШП. — 1990. — № 61. — С. 3; Дыяменты роднай мовы: паданні, казкі, легенды // ВГл. — 1991. — № 3. — С. 3; Два возеры Пліса // ВГл. — 1991. — № 13. — С. 3; Стрэлы ў начы // ВГл. — 1991. — № 46. — С. 2; Незвычайнае возера Гінькова // ВГл. — 1991. — № 79. — С. 3; Як Цярэшку жанілі // ВР. — 1992. — № 162. — С. 3; Глыбоччына — любоў мая // ВГл. — 1993. — № 53. — С. 3; Пагібель ваўкалака // ВГл. — 1994. — № 8. — С. 2; Папулярны народны жанр // ВГл. — 1995. — № 33. — С. 2; Каруся // ВГл. — 1995. — № 102. — 1996. — № 2, 5, 7, 8, 11; Жыла на свеце Клава Шакаладава // ВР. — 1996. — № 14. — С. 5; Жыла на свеце Клава Шакаладава // ВГл. — 1996. — № 37. — С. 1, 3; Павер'і, фантазіі жыхароў нашага краю // ВГл. — 1997. — № 31. — С. 4; Крыжы // ВГл. — 1997. — № 102. — С. 2; Усю ноч у склепе // Тамсама. — С. 3; Купальскае паданне // ВГл. — 1999. — № 55. — С. 2; Майстар насценных дываноў // ВГл. — 2000. — № 16. — С. 3; Царкавішча // ВГл. — 2000. — № 59. — С. 4; Возера Івесь і яго радовішча сапрапелю // ВГл. — 2000. — № 101. — С. 3; Возера Царкавішча // ВГл. — 2001. — № 7. — С. 3; Забельскае возера // ВГл. — 2001. — № 11. — С. 3.

Літ.: Валодзька Г. Краязнаўцы Паазер'я, яднайцеся // ВР. — 1991. — 4 крас. — С. 3; Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 416; Шпакоўская Г. Сам сабе чараўнік: [І. Волкаў з в. Псуя] // НС. — 1997. — № 106. — С. 4.

**ВОРАНАВА** НАТАЛЛЯ ВІКТАРАЎНА (2.11.1971, Віцебск), архівіст. Скончыла філал. факультэт ВДПІ (1993). Працавала выкладчыкам на кафедры беларускай літаратуры і культуры ВДПІ (1993–1998), гал. архівістам аддзела навуковага выкарыстання і публікацыі дакументаў (з 1998). Займаецца даследаваннямі гісторыі і культуры Віцебшчыны ў межах выканання прафесійных абавязкаў навуковага супрацоўніка ДАВВ. Праводзіць выяўленне дакументаў па гісторыі арганізацый і ўстаноў Віцебскай вобл. Удзельнічае ў рэгіянальных канферэнцыях («Лепельскія чытанні», «Полацкія чытанні»). Адзін са складальнікаў зборнікаў дакументаў, якія выдаваліся ДАВВ: «Витебщина православная», «Выстояли и победили» і інш.

Тв.: Лепельщина периода Великой Отечественной войны и послевоенного восстановления в документах ГАВО // Лепельскія чытанні: навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 565-годдзю г. Лепеля, 24 кастр. 2004 г. — Віцебск, 2004. — С. 49–56.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Воранава Н.В. (29.09.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ВОРАНАЎ** РАМАН ГЕНАДЗЕВІЧ (25.07.1985, г. Патсдам, ГДР), культуролаг, краязнаўца. Скончыў СШ № 5 г. Віцебска (2002), гістфак ВДУ (2007), магістратуру ЕГУ (2010). Працаваў у Мастацкім музеі ВАКМ (2007–2009), турыстычных фірмах г. Віцебска. Аўтар і куратар конкурсу «Віцебск. Ландшафты памяці», які праводзіўся ВАКМ (2009) і быў прысвечаны актуалізацыі ў грамадстве праблем захавання і інтэрпрэтацыі гісторыка-культурнай спадчыны. Выконваў абавязкі куратара краязнаўчай выставы «Нечаканыя ваколіцы» (2009). Добра ведае гісторыю і культуру Віцебска. Аўтар шэрагу артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў інтэрнэце. Выступае ў якасці экскурсавода.

Тв.: Віцебск. Ландшафты памяці: матэрыялы конкурсу гісторыка-культурных інтэрпрэтацый / уклад. Р. Воранаў. — Віцебск, 2010. — 32 с.

**ВРУБЛЕЎСКАЯ** АЛА ЛЕАНІДАЎНА, педагог. Працавала настаўніцай у Празароцкай СШ Глыбоцкага раёна. Адна з арганізатараў школьнага музея І. Буйніцкага (1982). Пераехала ў в. Новы Пагост Міёрскага раёна.



**ВЫСОЦКІ** ВІТАЛЬ ІВАНАВІЧ (?, в. Цвеціна – 2006), краязнаўца. Даследаваў гісторыю Міёршчыны. Аўтар шэрагу артыкулаў на краязнаўчыя тэмы ў раённай газеце «Сцяг працы» (цяпер «Міёрскія навіны»).

Тв.: Артыкулы ў кнізе «Памяць»: Ветэран // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Міёрскага раёна. — Мн.: Бел. навука, 1998. — С. 170–171; Яго складаны лёс: [М. Высоцкі] // Тамсама. — С. 190–191; Мёлер Герман // Тамсама. — С. 531.

Артыкулы ў перыядычным друку: Тамаш // СП (М). — 1979. — 18 снеж.; Паведаў зялёны куфэрак // СП (М). — 1986. — № 123. — С. 3; Міёрскія старадаўнасці // СП (М). — 1988. — № 129. — С. 4; Дзе нарадзіўся // СП (М). — 1988. — № 155; Дзісна старажытная // СП (М). — 1989. — 22 ліп.; З гадоў сівой мінуўшчыны // КР. — 1989. — № 76. — С. 2; Тапаніміка Міёршчыны // СП (М). — 1990. — № 3; Як жаніліся ў Ліпнічах // СП (М). — 1990. — № 24; Вяртанне ў вайну // СП (М). — 1990. — № 68; Латаная ватоўка // СП (М). — 1990. — № 90; Сялянскі сын // СП (М). — 1990. — № 107; Наша мова // СП (М). — 1990. — № 132; Пераборлівы кавалер // СП (М). — 1990. — № 137; З агню ды ў полымя // СП (М). — 1991. — № 5; У хованкі са смерцю // СП (М). — 1991. — № 10; Настаўніца // СП (М). — 1991. — № 34; Чарчаніца // СП (М). — 1991. — № 55; Гарадок // СП (М). — 1991. — 7 верас.; Лонка // СП (М). — 1991. — 7 ліст.; Пагаворым аб назвах // СП (М). — 1992. — № 91; Неацэнны дар // СП (М). — 1992. — № 92; Нашы вытокі // СП (М). — 1992. — № 96; Старыя багі нашых продкаў // СП (М). — 1993. — № 14; Шлюб па-ліпнічанску // СП (М). — 1994. — № 94; Уладар сонца і яго сыны // СП (М). — 1995. — № 9; Жыцень // СП (М). — 1995. — № 13; Лада // СП (М). — 1995. — № 23; Духі цемры // СП (М). — 1995. — № 39; Дзяды // СП (М). — 1995. — № 47; Нашы імёны // СП (М). — 1995. — № 75; Ветэран успамінае // СП (М). — 1996. — № 37–38; За даляглядам гісторыі // СП (М). — 1997. — № 57; Баркулаб Корсак // СП (М). — 2000. — № 42; Нашы імёны // Тамсама. — С. 4; Дом № 1 // СП (М). — 2000. — № 73; Трайныя ўгодкі // СП (М). — 2000. — № 94; Герасімёнкі // СП (М). — 2001. — № 3. — С. 3; Якубёнкі // СП (М). — 2001. — № 13. — С. 2; Нашчадкі Спірыда // СП (М). — 2001. — № 23. — С. 2; Цвецінскі Настрадамус // СП (М). — 2001. — № 30. — С. 3; Незалежны // СП (М). — 2001. — № 56. — С. 2; Дырэктар // МН. — 2002. — № 15. — С. 2; Гаспадар // МН. — 2002. — № 47. — С. 2; Якім // МН. — 2002. — № 56. — С. 2; Сымонавічы // МН. — 2002. — № 73. — С. 2; Раман і Ніхама // МН. — 2002. — № 79. — С. 3; За калючым

дротам // МН. — 2002. — № 97. — С. 3; Блуканне па пакутах // МН. — 2002. — № 103. — С. 2; Мова — душа народа // МН. — 2003. — № 19. — С. 3; Загадкі гідранімікі // МН. — 2003. — № 31. — С. 3; У вадавароце падзей // МН. — 2003. — № 39. — С. 2; Халакост і самаахвярнасць // МН. — 2003. — № 50. — С. 3; Расонская балада // МН. — 2003. — № 53. — С. 2; Аповед пра дзеда Паўкі // МН. — 2003. — № 60. — С. 2; Бацька і сын — артылерысты // СП (М). — 2001. — 1 ліп.; Яе сябры // МН. — 2003. — № 63. — С. 2; Яе «ваенная» візітка // МН. — 2003. — № 85. — С. 2; У Каралевішчах // МН. — 2003. — № 93. — С. 3; Чорны гумар // МН. — 2004. — № 48. — С. 2–3; Яго лагерны нумар 25890 // МН. — 2004. — № 53. — С. 4; Праз выпрабаванні // МН. — 2004. — № 79. — С. 2; Сіроты з Буянова // МН. — 2004. — № 92. — С. 2; Шлях да ведаў // МН. — 2005. — № 2. — С. 3; Эскулап // МН. — 2005. — № 26. — С. 3; Дзісна ў перыяд вайны // МН. — 2005. — № 53. — С. 5; Разумніца Тэкля // МН. — 2005. — № 68. — С. 2; Буянава і яго наваколлі // МН. — 2005. — № 86. — С. 3; Млынары // МН. — 2006. — № 4. — С. 2; Пасля халеры // МН. — 2006. — № 32. — С. 3; Мужычок // МН. — 2006. — № 42. — С. 3; Бабуля Ганна // МН. — 2006. — № 54. — С. 3; Бацька і сын артылерысты // МН. — 2006. — № 55. — С. 2; Прыгадвае мінулае // МН. — 2006. — № 60. — С. 3; Уз'яднанне // МН. — 2006. — № 77. — С. 2; Гаспадар // МН. — 2006. — № 78. — С. 2.

Літ.: Высоцкі В. Тыдзень на «Алімпе» // СП (М). — 2001. — № 41. — С. 2; Высоцкі В. Шлях да ведаў // МН. — 2005. — № 2. — С. 3.

**ВЫСОЦКІ** ЛЕАНІД КАНСТАНЦІНАВІЧ (1905, Чашніччына – ?), журналіст. Атрымаў прафесію настаўніка, працаваў у сістэме народнай адукацыі: загадчыкам школ, інспектарам у Пскоўскай і Гомельскай губернях, супрацоўнікам у органах НКУС (1927–1940), дырэктарам рэспубліканскага дзіцячага туберкулёзнага санаторыя «Крынкі» ў Мінскай вобл. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў партызанам атрада № 760 імя Беразоўскага Бялыніцкай ваенна-аператыўнай групы Магілёўскага абкама КП(б)Б. У пасляваенны час працаваў на савецкай і журналісцкай рабоце ў Бялыніцкім раёне Магілёўскай вобл., газеце «Ленінскі прызыў» Аршанскага гарвыканкама і райвыканкама. Аўтар матэрыялаў у гэтай газеце, прысвечаных гісторыі і культуры Аршаншчыны, сярод якіх: пра Куцеінскую друкарню, «Буквар» С. Собаля, П. Лепяшынскага, С. Грыцаўца, Ю. Смірнова, батарэю капітана Флёрава, пра інш. адметныя падзеі і асобы мінуўшчыны краю. Адзін з аўтараў першага выдання гісторыка-эканамічнага нарыса «Орша» (1962). Сабраў вялікую бібліятэку і прыватны архіў, частка якога была перададзена ў Музей гісторыі і культуры Оршы.

Тв.: Кніга: Орша: историко-экономический очерк. — Мн.: Беларусь, 1962. — 124 с.

Літ.: Лютынскі В. Напісанае застаецца // АГ. — 2002. — № 19. — С. 2.

**ВЫХАДЦАВА** (Гарлачова) ІРЫНА МІКАЛАЕЎНА (29.09.1977, в. Мазалава Віцебскага раёна), педагог, краязнаўца. Бакалаўр гуманітарных навук (1999). Скончыла Мазалаўскую СШ, філал. факультэт ВДУ (1999). Працуе ў Мазалаўскай СШ Віцебскага раёна настаўнікам, завучам (з 1999).

Займаецца вывучэннем гісторыі в. Мазалава і яе ваколіц, высвятленнем лёсу землякоў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Кіраўнік гісторыка-краязнаўчага музея ў Мазалаўскай СШ (2003–2007), кіраўнік краязнаўчага гуртка, потым клуба «Спадчына» (2003–2008). Прыняла ўдзел у абнаўленні экспазіцый «Вялікая Айчынная вайна», «Беларуская сядзіба» ў школьным музеі. Аўтар летапісу Мазалаўскай СШ (2008). Удзельнічае ў экспедыцыі «Наш край», «Жыву ў Беларусі — тым ганаруся». На аснове атрыманых матэрыялаў і досведу працы падрыхтавала работы «Выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу на ўроках беларускай мовы і літаратуры як сродак навучання і выхавання вучняў» і «Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне вучняў сродкамі краязнаўства», якія захоўваюцца ў асабістым архіве і Віцебскім абласным ІПК. Падтрымлівае добрыя адносіны з гісторыка-краязнаўчым музеем Заронаўскай школы.

Тв.: Завочнае падарожжа ў Мілае // ЖП. — 2005. — № 25. — С. 3; Выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу на ўроках беларускай мовы і літаратуры як сродак навучання і выхавання вучняў: [саматуж. выд.]. — Віцебск, 2007. — 66 с.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Выхадцава І.М. (16.04.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Еленская С. Лучший классный // ЖП. — 2007. — № 75. — С. 3.

**ВЯРЦІНСКАЯ** АЛА ВАСІЛЬЕЎНА, музейны работнік. Працуе ў Глыбоцкім гісторыка-этнаграфічным музеі. Зрабіла буклеты, распрацавала некалькі маршрутаў, збірае фотаздымкі і паштоўкі. Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Тайна старажытных курганоў // ВГл. — 2001. — № 61. — С. 3; Палёт у вечнасць // ВГл. — 2001. — № 67. — С. 2.

**ГАГАЛІНСКАЯ** ЛЮДМІЛА ВАСІЛЬЕЎНА (24.04.1959, в. Гаі Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца, бібліятэкар. Скончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум (1979). Працавала бібліятэкарам у Казулінскай бібліятэцы Верхнядзвінскага раёна (1977–1980), у ашчаднай касе г. Верхнядзвінска (потым аддзяленне «Беларусбанку», 1980–1999), бібліятэкарам Верхнядзвінскай раённай бібліятэкі.



Гісторыяй роднага краю зацікавілася ў дзяцінстве. Збірае разнастайную інфармацыю, якая мае дачыненне да гісторыі і культуры Верхнядзвіншчыны. Мае хатні музей. Даследуе грамадзянскія могілкі з мэтай выяўлення няўлічаных пахаванняў ахвяр фашызму. Займаецца пошукам і вывучэннем каменных крыжоў у роднай мясцовасці. Захоўвае матэрыялы па гісторыі родаў, якія мелі зямельныя ўладанні на тэрыторыі краю ці звязаны з гісторыяй раёна: Вярыгаў-Дарэўскіх, Корсакаў, Сапегаў, Шльзенаў, Храпавіцкіх, Лапацінскіх.

Удзельнічала ў раённай навукова-практычнай канферэнцыі «Вялікая Айчынная вайна ў памяці жыхароў Верхнядзвінскага раёна» (27.04.2005). Актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця ў раёне. З'яўляецца намеснікам старшыні Верхнядзвінскага раённага аддзялення таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, кіраўніком народнага клуба сустрэч «Сучаснік» пры раённай бібліятэцы. Аўтар артыкулаў у раённай газеце «Дзвінская праўда».

Тв.: Чарующий свет искусства // ДзП. — 2005. — № 40. — С. 2.

Літ.: Шпаковская Г. Хозяйка домашнего музея: [Л. Гагалінская] // НС. — 2002. — № 85. — С. 8; Вечарына ў Жоўніне // ДП. — 2003. — № 74. — С. 3; Паклонімся абеліскам // ДП. — 2005. — № 37. — С. 2; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Гагалінская Л.В. (2.08.2007) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Каткоў М. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны трэба берагчы // ДзП. — 2008. — № 91. — С. 5.

**ГАЗІН** ДЗМІТРЫЙ РАМАНАВІЧ (17.09.1928, в. Сакольнікі Бараўлянскага с/с Віцебскага раёна). Вучыўся ў Мазалаўскай школе Віцебскага раёна, скончыў сярэднюю школу працоўнай моладзі (1964), Беларускі інстытут чыгуначнага транспарту (1970). Служыў у Савецкай Арміі (1950–1953). Працаваў інжынерам-механікам, загадчыкам камунальнага аддзела райвыканкама Чыгуначнага раёна г. Віцебска, старшынёй упраўлення жыллёвай гаспадаркі Віцебскага гарвыканкама. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Член Савета Віцебскай гарадской арганізацыі ветэранаў. З 1953 г. пражывае ў Віцебску.



Вывучае гісторыю паўночнай часткі Віцебскага раёна, партыз. рух на Віцебшчыне ў часы Вялікай Айчыннай вайны, жыццё і дзейнасць землякоў і выдатных дзеячаў краю. Даследуе гісторыю роднага краю з 1946 г. З 1960-х гадоў стаў пісаць артыкулы пра цікавых людзей, ветэранаў у газеты «Чыгуначнік Беларусі», «Віцебскі рабочы». З мэтай падрыхтоўкі артыкулаў пачаў сістэматычна працаваць у ВАБ, ДАВВ, праводзіць апытанне мясцовых жыхароў, што прывяло да даследавання іншых тэм з гісторыі краю.

Актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця г. Віцебска і Віцебскага раёна. Прымаў удзел у аднаўленні памяці пра Лужаснянскі канцэнтрацыйны лагер, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўтрымліваліся савецкія ваеннапалонныя і мірныя жыхары. У выніку гэтых дзеянняў лагер набыў статус «лагер на лініі фронту», а былыя вязні — магчымасць атрымліваць кампенсацыйныя выплаты з Германіі. Стаў ініцыятарам усталявання ахоўнага знака на курганным могільніку каля в. Сакольнікі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна, памятнага знака на месцы былога маёнтка Кахоўка А. П. Сапунова каля в. Сакольнікі (1998). Ініцыятар усталявання мемарыяльнага знака ў гонар Дзвінскага моста (цяпер Кіраўскі мост) у г. Віцебску (2005). Дапамагаў у стварэнні экспазіцый у музеі Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова, музеі Віцебскага аддзялення Беларускай чыгункі, экспазіцыі, прысвечанай А.П. Сапунову, у Мазалаўскай СШ Віцебскага раёна.









Удзельнічаў у канферэнцыях «90 гадоў ВВАК» (Віцебск, 1998), «150 гадоў А.П. Сапунову» (Віцебск, 1999).

Аўтар шэрагу брашур і кніг па гісторыі Віцебскага раёна: «Мазалаўская Швейцарыя», «Вярхоўскія парогі-перакаты», «Ціраспальскія шляхі-дарогі», «Сапуновские сокровища», «Лужеснянские страницы», «По репинским местам Придвинья», «Пылал Придвинский край» і інш. Аўтар больш за 500 артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў мясцовым друку: газетах «Народнае слова», «Віцебскі рабочы», «Віцьбічы», «Жыццё Прыдзвіння» (Віцебскі раён), «Сцяг працы» (Лёзна), «Голас Сенненшчыны», «Герой працы» (Шуміліна) і інш. Падрыхтаваў да друку, але не выдаў працы: «Успенское взгорье» (прысвечана падзеям войнаў 1812 г. і 1941–1945 гг.), «Сын своего времени» (пра героя Грамадзянскай вайны І.Ф. Шубіна); «Вымнянская жемчужина» (пра Тадулінскі манастыр); «На огненной черте» (падзеі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Мазалаўскага, Курынскага, Заронаўскага с/с Віцебскага раёна); некаторыя інш. матэрыялы, прысвечаныя гісторыі Віцебскага раёна.

Супрацоўнічае з ДАВВ, ВАКМ, Віцебскім абласным аддзяленнем БДТАПГіК, фондам імя А. П. Сапунова. Падтрымлівае добрыя сувязі з ВАБ, кіраўніцтва якой дапамагло выдаць некаторыя кнігі.

Займаецца даследаваннямі гісторыі праваслаўнай царквы на Віцебшчыне. Падрыхтаваў шэраг артыкулаў па гісторыі Полацка-Віцебскай епархіі, якія публікаваліся ў часопісах і газетах: «Архівы і справаводства», «Юстыцыя Беларусі», «Настаўніцкая газета», «Медыцынскі веснік», «Наше Православие», «Преображение», «Царкоўнае слова», «Минские епархиальные ведомости», «Вестник церковной истории».

Падрыхтаваў да выдання жыцці новапраслаўлёных віцебскіх новамучанікаў протаіерэя Мікалая Акаловіча і Уладзіміра Еленеўскага, а таксама зборнік біяграфічных матэрыялаў для кананізацыі віцебскіх новамучанікаў і спаведнікаў (2007). Браў удзел у складанні зборніка жыццеапісанняў рэпрэсаваных праваслаўных святароў і царкоўнаслужачых «Витебский мартиролог» (2008).

Тв.: Кнігі: Материалы для канонизации новомучеников и исповедников витебских: сборник жизнеописаний. — Витебск: Издательский отдел Витебской епархии, 2007; Витебский мартиролог. — Витебск: Издательский отдел Витебской епархии, 2008; Житие святого исповедника Христова Владимира. — Витебск: Издательский отдел Витебской епархии, 2007; Житие святого священномученика Николая, пресвитера Витебского. — Витебск: Издательский отдел Витебской епархии, 2007.

Артыкулы ў навуковым друку: История обновленческого раскола в Витебске // Вестник церковной истории (Москва). — 2007. — № 3; Церковная жизнь на территории Полоцко-Витебской епархии в период немецкой оккупации в 1941–1944 гг. // Вестник церковной истории. — 2008. — № 2 (10); Митрофорный протоиерей Николай Околович // АіС. — 2006. — № 3; Юрист, правозащитник, поборник Православия // Юстиция Беларуси. — 2006. — № 4; Жертвы «Красного колеса» // Медицинский вестник. — 2006. — № 23; Награда белорусским архивистам // АіС. — 2008. — № 3.

Артыкулы ў перыядычным друку: Мікалай Міратворац // НГ (культурологическое приложение «Рэй»). — 2006. — 3 чэрв.; Владимир Николаевич Еленевский: Жизнь православного христианина // МЕВ. — 2006. — № 3; Жизнеописание архиепископа Иннокентия (Ястребова) // МЕВ. — 2007. — № 1; Хроника перенесения мощей преподобной Евфросинии Полоцкой в 1910 году // Царкоўнае слова. — 2007. — № 21; Считаю себя черноризцем // Царкоўнае слова. — 2008. — № 49.

Артыкулы ў выданні «Преображение»: Митрофорный протоиерей Пётр Беляев. — 2006. — № 10; Митрофорный протоиерей Павел Кирик. — 2006. — № 12; Митрополит Минский и Слуцкий Пантелеимон (Рожновский). — 2007. — № 1; Григорович Феодор Иванович. — 2007. — № 2; Митрополит Ставропольский

и Кавказский Серафим (Мещеряков). — 2007. — № 3; Протоиерей Александр Ружинский. — 2007. — № 4; Жизнеописание архиепископа Иннокентия (Ястребова). — 2007. — № 5; Хроника перенесения мощей преподобной Евфросинии Полоцкой в 1910 году. — 2007. — № 6; Жизнеописание Бориса Бялыницкого-Бирули, Ф. И. Григоровича, Г. Полонского. — 2007. — № 7; Жизнеописание архиепископа Иннокентия (Летяева). — 2007. — № 8; Жизнеописание протоиерея Леонида Сапунова. — 2007. — № 9; Жизнеописание священника Игнатия Иосафатова. — 2007. — № 10; Жизнеописание архиепископа Гавриила (Воеводина). — 2007. — № 11; Николай Богородский: педагог, историк, краевед, архивист. — 2007. — № 12; Архивист, археограф и краевед Дмитрий Довгялло. — 2008. — № 1; Жизнеописание протоиерея Дмитрия Наумова. — 2008. — № 2; Жизнеописание священника Феодора Тонковида. — 2008. — № 3; Жизнеописание архиепископа Николая (Покровского). — 2008. — № 4; Жизнеописание Николая Кутлешова. — 2008. — № 5; Жизнеописание протоиерея Илии Румянцева. — 2008. — № 6; Житие священномученика Димитрия Власенкова. — 2008. — № 7; Жизнеописание священномученика протоиерея Василия Малахова // Тамсама; Жизнеописание иеромонаха Серафима (Матвеева). — 2008. — № 9; Жизнеописание священника Алексея Васильева. — 2008. — № 10; Наставник. — 2008. — № 11; Жизнеописание архимандрита Иоанна (Моисеева). — 2008. — № 12.

Матэрыялы ў інтэрнэце: Статистические сведения о духовенстве и приходах Полоцко-Витебской епархии. — Рэжым доступу: www.witebsk.orthodoxy.ru; Историко-статистический очерк города Витебска. — Рэжым доступу: http://www.sapunov.vitebsk.orthodoxy.ru.

Літ.: Автобиографическая справка Горидовец В.В. (26.06.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ГАРЭЛІК** АЛЯКСАНДР ЮР'ЕВІЧ (14.06.1928), педагог, краязнаўца. Працаваў настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства ў СШ г. Браслава (1950–1970-я гг.) і вячэрняй ШПМ. Вёў гісторыка-краязнаўчы гурток, займаўся пошукавай працай. Арганізатар і ўдзельнік турыстычных паходаў і злётаў. Удзельнічаў у археалагічных раскопках на Браслаўшчыне пад кіраўніцтвам Л.В. Аляксеева. На аснове атрыманых матэрыялаў стварыў школьны краязнаўчы музей. У сяр. 1960-х гг. ставілася пытанне аб арганізацыі на яго базе дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея. На жаль, пасля ад'езду з горада значная частка экспанатаў была страчана і толькі невялікая колькасць трапіла ў створаны Браслаўскі гісторыка-краязнаўчы музей (каля 80 экспанатаў — кнігі, альбомы, фотаздымкі). Выехаў спачатку ў Рыгу (1982), потым у ЗША (1984).



Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку, напісаных на аснове матэрыялаў кніг Л.В. Аляксеева і О. Хедэмана. Нягледзячы на заідэалагізаванасць, артыкулы з'яўляліся да сяр. 1980-х гг. самымі грунтоўнымі і шырокадаступнымі па гісторыі горада і спрыялі фарміраванню любові да роднай зямлі.

Выдатнік народнай асветы БССР.

Тв.: Гісторыя нашага горада // Звязда. — 1957. — 25 мая, 23 чэрв., 3 ліп.; Ён быў суворaўскі салдат: [генерал Кульнёў] // БЗ. — 1963. — 14 снеж. — С. 4; Наш горад. Да 900-годдзя Браслава // БЗ. — 1965. — 23 сак.; Любіць і ведаць свой край // БЗ. — 1966. — 3 ліст.; Старажытны і малады // БЗ. — 1977. — № 104, 110, 117, 126, 129.

Літ.: Шыдлоўскі К. Апантаны краязнаўствам // Браслаўскія сшыткі – 1/1996: гістарычны зборнік, прысвечаны 930-годдзю Браслава (1065–1995): [саматуж. выд.]. — Браслаў, 1996. — С. 43; Некаторыя з публікацый А. Гарэліка ў раённай газеце // Тамсама. — С. 43; Юбілеі // Павет. — 2003. — № 7. — С. 7.



**ГАЎРУЦІКАЎ** АЛЯКСЕЙ ЯКАЎЛЕВІЧ (12.08.1942, в. Чубакова Дубровенскага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыў СШ № 1 г. Дуброўна, курсы кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці, ваенна-марское палітычнае вучылішча пры Кіеўскім ВВМПУ (1972). Працаваў загадчыкам сельскага клуба ў саўгасе «Зарубы» Дубровенскага раёна (1959–1961), інструктарам па фізкультуры і спорце там жа (1964–1965), загадчыкам аргаддзела Дубровенскага райкама ЛКСМБ (1965–1968). Праходзіў тэрміновую службу ва УС СССР (1961–1964), у часцях авіяцыі Балтыйскага і Ціхаакіянскага флатоў (1968–1988). Служыў у Эфіопіі (1982–1984). Пасля звальнення ў запас працаваў выкладчыкам пачатковай ваеннай падрыхтоўкі ў СШ № 1 г. Дуброўна, старшым інструктарам пазавайсковай падрыхтоўкі Дубровенскага райвыканкама, у камісіі па складанні гісторыка-культурнай хронікі «Памяць» Дубровенскага раёна. Нам. старшыні Дубровенскага раённага савета ветэранаў вайны, працы і УС. Укладальнік кнігі «Памяць» Дубровенскага раёна.

Займаецца комплекснымі даследаваннямі роднага краю, аддаючы перавагу ўдзелу ў пошукавым руху: увекавечанне імёнаў загінуўшых у Дубровенскім раёне салдат і землякоў, збор інфармацыі пра ход ваенных дзеянняў на Дубровеншчыне, ваенныя часці, якія вызвалялі

раён. Займацца краязнаўчымі даследаваннямі Дубровеншчыны пачаў, калі ўвайшоў у склад камісіі па складанні кнігі «Памяць» Дубровенскага раёна (1993). Убачыў шмат недахопаў, асабліва ў выяўленні імёнаў загінуўшых на тэрыторыі раёна. Пэўны ўплыў на фарміраванне методыкі пошукавых мерапрыемстваў аказала Л.Н. Бруева.

Зрабіў больш за 10 паездак у архіў УС РФ (Падольск), НАРБ, ДАВВ. Шляхам працы ў архівах, аналізу кніг «Памяць» розных рэгіёнаў РФ і былых рэспублік СССР выявіў больш за 10 тысяч імёнаў савецкіх воінаў, якія загінулі, сканалі ад ранаў і згінулі без вестак у баях на Дубровеншчыне ў 1941–1944 гг. Зверыў спісы загінуўшых на тэрыторыі раёна, склаў карткі персанальнага ўліку на 15 тысяч чалавек, якія раней не знаходзіліся на ўліку, унёс іх у картатэку, спісы райваенкамата, а таксама ў спісы па брацкіх могілках.

Склаў спіс ваенных часцей (65 дывізій, 80 брыгад, больш за 500 палкоў, 2 ваенныя шпіталі, 50 медсанбатаў, 38 штрафных рот), якія вызвалялі Дубровеншчыну. Правёў пашпартызацыю 27 воінскіх брацкіх могілак. Зрабіў выпіскі з журналаў баявых дзеянняў 15 дывізій і брыгад.

Напісаў кароткую гісторыю 250 населеных пунктаў раёна і храналогію гістарычных падзей на Дубровеншчыне. Перадаў некаторыя матэрыялы Р.С. Шараю (г. Орша) з мэтай выкарыстання для напісання кнігі. Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў раённай газеце «Дняпроўская праўда». Мае актыўную грамадзянскую пазіцыю, удзельнічае ў грамадскім жыцці раёна. Падтрымлівае сувязь з удзельнікамі вызвалення раёна і сваякамі воінаў, якія загінулі ў Вялікай Айчыннай вайне. Падтрымлівае кантакты з архівам МА РФ (Падольск), ДАВВ, Аршанскім занальным архівам, музеем Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску, пошукавымі атрадамі Віцебшчыны, навучальнымі ўстановамі Віцебскай вобл. Частку матэрыялаў перадаў у занальны архіў г. Оршы, Дубровенскі краязнаўчы музей, раённую бібліятэку.

Тв.: З гісторыі населеных пунктаў // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Дубровенскага раёна. Кн. 1. — Мн.: Паліграфафармленне, 1997. — С. 555–589.

Артыкулы ў перыядычным друку: Аб тых, хто не прыйдзе ніколі // ДнП. — 1990. — 29 снеж. — С. 3; Зберажом святыя імёны // ДнП. — 1993. — № 30. — С. 3, 4; Нязгасны подзвіг арміі і народа // ДнП. — 1994. — № 16. — С. 2; Родныя вытокі: [тапаніміка Дубровеншчыны] // ДнП. — 1994. — № 100. — С. 2; Спадчына // ДнП. — 1994. — 17 снеж. — С. 2; Цана друкаванага слова // ДнП. — 1995. — № 15. — С. 2; Яму даступныя тайны лазера: [П.В. Грыбкоўскі] // ДнП. — 1996. — № 56. — С. 2; Край, дзе мы жывем // ДнП. — 1995. — № 89, 9 ліст.; Памятныя даты на Дубровеншчыне ў новым 1997 г. // ДнП. — 1996. — № 102. — С. 2, 3; Насельніцтва Дубровеншчыны стагоддзе назад // ДнП. — 1997. — № 7. — С. 2; У ліпені 41-га // ДнП. — 1998. — № 54. — С. 3; Не ўсё было так проста: [з гісторыі сельскай гаспадаркі на Дубровеншчыне] // ДнП. — 1998. — № 99. — С. 2; Народы дружили всегда // ДнП. — 1998. — 20 снеж. — С. 3; Пра ўсё раскажа кніга «Памяць» // ДнП. — 1998. — 28 сак. — С. 2; Вучыцца маглі далёка не ўсе // ДнП. — 1999. — 10 лют. — С. 2; Навучанне — абавязковае // ДнП. — 1999. — 17 лют. — С. 3; На абарону заваёў рэвалюцыі: [камбеды] // ДнП. — 1999. — № 11. — С. 2; Цярністы шлях веры // ДнП. — 1999. — № 25, 27; Гісторыя падказвае // ДнП. — 1999. — 23 крас. — С. 2; З глыбінь вякоў да нашых дзён // ДнП. — 1999. — № 32. — С. 2; Яны былі першымі: [дубровенская міліцыя] // ДнП. — 1999. — 3 сак. — С. 3; Адзіным народам, адзінай краінай // ДнП. — 1999. — 15 верас. — С. 2; Сельская гаспадарка ў даваенны перыяд // ДнП. — 1999. — № 40, 42; У нагу з часам: [прамысловасць Дуброўны XVIII–XIX ст.] // ДнП. — 1999. — № 43, 44; Штурм «лініі Манэргейма» // ДнП. — 1999. — № 90. — С. 2; Культурнае развіццё Дубровеншчыны // ДнП. — 2000. — № 3. — С. 2; Равеснік Чырвонай Арміі: [М.Е. Баранаў] // ДнП. — 2000. — № 16. — С. 2; Баі былі надзвычай жорсткімі // ДнП. — 2000. — № 50. — С. 2; Наша і для нас: [газета «ДнП»] // ДнП. — 2001. — № 18. — С. 2; Няўмольнасць: [М.К. Глазуноў] // ДнП. — 2001. — № 36. — С. 3; Каму гэта выгадна? // ДнП. — 2001. — № 40. — С. 2; На алтар Перамогі: [пахаванне загінуўшых на Дубровеншчыне] // ДнП. — 2001. — № 49. — С. 2–3; Яднанне праз вякі: [дубровенцы ў Масковіі] // ДнП. — 2001. — № 50. — С. 2; Рэабілітацыя цаною… крыві: [выкарыстанне штрафбатаў на Дубровеншчыне] // ДнП. — 2001. — № 94. — С. 2; Разам праз вякі: [Дуброўна і Орша] // ДнП. — 2002. — № 11. — С. 2; «Кацюшы» ў баях на Дубровеншчыне // ДнП. — 2002. — № 25. — С. 2, 3; Танкі на мінных паях // ДнП. — 2002. — № 49. — С. 2; Паважай іншых, каб паважалі цябе // ДнП. — 2002. — 21 жніўня. — С. 3; Яны змагаліся за Сталінград // ДнП. — 2003. — № 8. — С. 2; Пісьмы з фронту // ДнП. — 2003. — № 15. — С. 2; Вернасць Радзіме // ДнП. — 2003. — № 36. — С. 2; Край Дубровенскі // ДнП. — 2003. — № 50. — С. 2; Малапрыкметны, неацэнны ўклад: [рамонтныя войскі] // ДнП. — 2003. — № 69. — С. 2; Раны незагойныя // ДнП. — 2003. — 21 чэрв. — С. 2; Запруда, пераправа, мост // ДнП. — 2003. — № 97. — С. 2; Над шырокім Дняпром // ДнП. — 2003. — 3 верас. — С. 3; Каб не быць Іванамі без роду, без племені // ДнП. — 2003. — 1 кастр. — С. 3; Так жылі нашы продкі: [сяр. XIX ст.] // Тамсама; Дзе б ні жылі, а Радзіму праслаўлялі: [дубровенцы ў Масковіі] // ДнП. — 2004. — № 2. — С. 2; Шматгадовае рэха вайны: [міны на Дуброўшчыне] // ДнП. — 2004. — № 23. — С. 2; Трагічны лёс народа: [яўрэі на Дубровеншчыне] // ДнП. — 2004. — № 26. — С. 2; Нашчадкі памятаюць подзвіг славутага земляка: [Казарскі] // ДнП. — 2004. — № 41. — С. 2; Грамадзянін, патрыёт: [А.А. Галаўко] // ДнП. — 2004. — № 50. — С. 1; Дзеці вайны // Тамсама; Квітней і развівайся родная старонка // ДнП. — 2004. — № 57. — С. 2; Вайна і сёння ідзе за намі след у след // НС. — 2004. — № 90. — С. 2; Марудныя вёрсты вайны // ДнП. — 2004. — № 98–100. — 2005 — № 1; Чырвоны сцяг, прабіты кулямі // ДнП. — 2005. — № 15. — С. 2, 3; Свяшчэнная памяць: [Ю.Д. Гарачаў] // ДнП. — 2005. — № 21. — С. 3; Не ўсе імёны яшчэ ўстаноўлены // ДнП. — 2005. — № 56. — С. 2; Пошукі працягваюцца // ДнП. — 2005. — 15 кастр. — С. 3; Круглыя даты 2006 года ў гісторыі Дубровеншчыны // ДнП. — 2005. — № 106. — С. 2; Змагалася штрафная рота: [6000 жыхароў Смаленшчыны загінулі пры вызваленні Дубровеншчыны] // ДнП. — 2006. — № 89. — С. 2; Суровая праўда вайны // ДнП. — 2006. — 1 ліп. — С.3; Рэліквіі мінулай вайны: [стальныя нагруднікі] // ДнП. — 2008. — № 9. —

С. 2; Старонкі гісторыі роднага краю ў архіўных дакументах. Год 1930 // ДнП. — 2008. — № 9. — С. 2, 7; Галоўнае багацце: [гісторыя калгаса «1 мая»] // ДнП. — 2008. — № 28. — С. 2; Загінулі ва Усходняй Прусіі: [спісы загінуўшых дубровенцаў-землякоў] // ДнП. — 2006. — № 63–67. — 2007. — № 31; Горкія вёрсты вайны на шляху да перамогі // ДнП. — 2008. — № 37. — С. 2–3; Сапёры-штурмавікі адступаць не маглі // ДнП. — 2008. — 3 снеж. — С. 3; Жыццё напружанае і стваральнае // ДнП. — 2008. — 10 снеж. — С. 3; З марай аб лепшай будучыні // ДнП. — 2008. — 13 снеж. — С. 3.

Літ.: Увековечить память павших солдат — значит успокоить их души // НС. — 2004. — 8 крас. — С. 2; Васільеў Л. Чалавек з няўрымслівым характарам: [А.Я. Гаўруцікаў] // ДнП. — 2007. — 17 лют. — С. 5; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Гаўруцікаў А.Я. (30.03.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Аўтабіяграфія А.Я. Гаўруцікава (30.03. 2009) // Тамсама; Спіс публікацый А.Я. Гаўруцікава ў газеце «Дняпроўская праўда» // Тамсама.

**ГАЎРЫЛЬЧАНКА** КЛАЎДЗІЯ ЛУКІНІЧНА (1905–?), аматар даўніны. Аўтар 2 рукапісаў на рускай мове «Березвечская обитель», «Петербургские были», якія даслала ў рэспубліканскі цэнтр па напісанні летапісу «Памяць» Міхаілу Захаравічу Башлыкову. Рукапіс «Березвечская обитель» утрымлівае цікавыя звесткі па гісторыі і культуры Глыбоччыны. Надрукаваны ў газеце «Веснік Глыбоччыны».

Тв.: Березвечская обитель // ВГл. — 1993. — № 12–14, 18, 20, 24, 26, 30–35, 38–43.

Літ.: Зінкевіч А. Праз віхуру гадоў // ВГл. — 1993. — № 4. — С. 2–3.

**ГЕЛЕРТ** ЯНІНА ЛЮДВІКА. Унучка С. Нарбута. Удзельнік краязнаўчых чытанняў, на якіх выступае з паведамленнямі па гісторыі роду Нарбутаў на Браслаўшчыне. Аўтар артыкулаў у мясцовым друку на тую ж тэматыку. Жыве ў Польшчы.

Тв.: Лекар Станіслаў Нарбут і гісторыя Браслава // Браслаўскія чытанні: матэрыялы II Навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 925-годдзю Браслава (1065–1990), 16–17 лютага 1991 г. / навук. рэд. М.А. Ткачоў. — Браслаў: Браслаўскі філіял Пастаўскай узбуйнёнай друкарні, 1991. — С. 11–13; Сям'я доктара Нарбута // БЗ. — 1989. — № 70. — С. 2, 3; Лекар Станіслаў Нарбут і гісторыя Браслаўшчыны // БЗ. — 1991. — № 41. — С. 3, 4.

**ГЕЛЬБЕРГ** ЯКАЎ ЛЕЙБАВІЧ (Леанідавіч) (16.05.1922, м. Мена Чарнігаўскай вобл., Украіна), педагог. Дацэнт (1961). Прафесар (1977). Скончыў гіст. факультэт МДУ (1949), аспірантуру пры МДУ (1953–1955). Працаваў ст. выкладчыкам у Кіргізскім універсітэце (1949–1953), ст. выкладчыкам, дацэнтам (1955–1965), нам. дэкана (1961–1965) у Віцебскім ветэрынарным інстытуце, загадчык кафедры у ВТІЛП (1965–1992), дзе працягвае працаваць на пасадзе прафесара кафедры гісторыі і права.

Узнагароджаны ордэнам Александра Неўскага, Айчыннай вайны I і II ступені, Чырвонай Зоркі, 23 медалямі, ганаровымі граматамі Прэзідыума ВС БССР. Заслужаны работнік вышэйшай школы БССР (1976), Ганаровы пагранічнік Венгрыі.

Тв.: Первые пятилетки // Витебск: историко-экономический очерк. — Мн., 1974; (разам з С.Ф. Дахия, В.М. Лайко) Партийные организации Витебщины в период строительства социализма (1921–1937 гг.) // Тезисы докладов научно-теоретической конференции на тему «История Витебской областной организации: традиции и преемственность». — С. 12–21; (разам з С.Ф. Дахия) Создание Витебской областной партийной организации и её деятельность в предвоенные годы (1938–1941) // Тамсама. — С. 21–25.

Літ.: Корзенко Г.В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник. — Мн.: Бел. наука, 2007. — С. 74–75.

**ГЕНІНА** ДОРА НАВУМАЎНА, бібліёграф. Працавала гал. бібліёграфам у ВАБ. Складальнік шэрагу спісаў літаратуры, бібліяграфічных паказальнікаў па гісторыі і культуры Віцебшчыны.

Тв.: Великая Отечественная война, партизанское движение на Витебщине. Наши герои земляки, участники Великой Отечественной войны: краткий рекомендационный список литературы / сост. Д.Н. Генина. — Витебск: ВОБ, 1958. — 41 с.; Витебляне — герои Советского союза / сост. Д.Н. Генина. — Витебск: ВОБ, 1966. — 11 с.; Библиография в помощь изучения родного края / сост. Д.Н. Генина. — Витебск: ВОБ, 1967. — 3 с.; Літаратурная Віцебшчына / сост. Д.Н. Геніна. — Віцебск: ВАБ, 1969. — 22 с.; Витебск в десяти веках: библиографический указатель литературы. — Витебск: Гос. б-ка БССР им. В.И. Ленина, ЦГБ им. М. Горького, 1975. — 160 с.; (разам з М.С. Рыўкіным) Витебск в годы Великой Отечественной войны (1941–1945 гг.): библиографический указатель. — Витебск: ЦГБ им. М.Горького, 1995.

**ГЕНКІН** УЛАДЗІМІР МАКСІМАВІЧ (16.10.1963, г. Віцебск), педагог, філолаг. Кандыдат філал. навук (1999), дацэнт (2003). Скончыў СШ № 18 г. Віцебска (1981), філал. факультэт ВДПІ (1985), аспірантуру пры ВДУ (1994–1997). Працаваў настаўнікам рускай




мовы і літаратуры ў СШ № 16 г. Віцебска (1983–1985), СШ № 36 (1985–1987), служыў ва УС СССР (1987–1989), настаўнікам у СШ № 40 г. Віцебска (1989–1994), выкладчыкам у ВДУ (з 1997).

Даследуе тапанімію Віцебшчыны, адтапанімічныя вытворныя (прыметнікі, назвы жыхароў розных мясцовасцяў). Вывучэнне краю пачаў з мэтай падрыхтоўкі дысертацыі (з 1994). Штогод бярэ ўдзел ў дыялекталагічных экспедыцыях са студэнтамі філалагічнага факультэта ВДУ (з сярэдзіны 1990-х). Абараніў дысертацыю на тэму «Оттопонимные дериваты Витебщины». Аўтар некалькі кніг і шэрагу артыкулаў па тапаніміцы Віцебшыны: «Слоўнік адтапанімных дэрыватаў Віцебшчыны», «Ойконимия и катойконимия Белорусского Поозерья». Актыўны ўдзельнік навуковых канферэнцый (з 1996), сярод іншых адзначым: «Пісьменства і друк на Віцебшчыне: Гісторыя і сучаснасць» (Віцебск, кастрычнік 1996), «Восточнославянский город. К 400-летию пожалования Витебску Магдебургского права» (Віцебск, 1997), IV–VII Міжнародныя канферэнцыі «Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства» (Віцебск, 1997, 2000, 2003, 2006), «Имена собственные на этноязыковом пограничье» (РП, Беласток, 2000), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Проблемы истории и культуры Верхнего Поднепровья» (Магілёў, 2001), IX Международная научная конференция «Polsko-wschodniosłowiańskie powiążania kulturowe, literackie i językowe»(РП, Ілава, 2001), Міжнародная навуковая канферэнцыя «Славянская гидронимия в ареальном, этимологическом, словообразовательном и семантическом аспектах» (Гомель, 2002), Міжнародная навуковая канферэнцыя «Славянская ономастика в ареальном, этимологическом и хронологическом аспектах» (Гомель, 2004), Міжнародная навуковая канферэнцыя «Славянская ономастика в этимологическом, хронологическом и ареальном аспектах» (Гомель, 2006).

Аўтар метадычнага дапаможніка «Ойконимия и катойконимия Белорусского Поозерья», значнай колькасці артыкулаў у навуковым друку.

Тв.: Оттопонимные дериваты Витебщины: автореф. дисс. на соиск. учен. степ. канд. филол. наук / В.М. Генкин. — Мн., 1999. — 20 с.; Слоўнік адтапанімных дэрыватаў Віцебшчыны. — Віцебск: ВДУ, 2005. — 235 с; Ойконимия и катойконимия Белорусского Поозерья: пособие для спецкурсов, спецсеминаров и дисциплин специализации. — Витебск: ВГУ, 2008. — 108 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Оттопонимная лексика в витебской печати // Пісьменства і друк на Віцебшчыне: матэрыялы рэгіянальнай навуковай канферэнцыі, 15–16 кастрычніка 1996 г. — Віцебск, 1996. — С. 103–107; Стилистические и словообразовательные особенности адъектонимов Витебской области // Веснік ВДУ. — 1996. — № 2. — С. 75–79; Катойконимическая номинация и национально-религиозные факторы (на материале катойконимов Витебщины) // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства: Зборнік матэрыялаў IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 24–26 красавіка 1997 г.: у 3-х ч. — Віцебск: ВДУ, 1997. — Ч. I. — С. 119–123; Социолингвистический аспект катойконимической номинации // Веснік ВДУ. — 1997. — №1. — С. 9–13; Женские катойконимические номинации: особенности словообразования и функционирования в речи // Веснік ВДУ. — 1998. — № 1. — С. 56–59; Оттопонимная лексика в словарях и словарь оттопонимной лексики// Vocabulum et vocabularium: Сборник научных трудов по лексикографии. Вып. 5. — Гродно, 1998. — С. 169–173; Топонимия Белорусского Поозерья: проект региональной топонимической энциклопедии // Веснік ВДУ. — 1999. — № 3. — С. 12–16; Катойконимы Витебщины с суффиксом -чанін // От слова к тексту: материалы докладов Международной научной конференции: в 3-х ч. Ч. 2. — Мн., 2000. — С. 36–38; Катойконимы Витебщины с суффиксом -ец // Пятые Поливановские чтения: сборник науч. статей по материалам докладов и сообщений. Ч. II. История и диалектология славянских языков. — Смоленск, 2000. — С. 133–139; Катойконимия Браславского района Витебской области // Studia slavistichne, 2. — Bialystoк, 2000. — С. 285–288; Катойконимия Белорусского Поозерья // Белорусское Поозерье: Язык и духовная культура / под ред. А.М. Мезенко, А.В. Русецкого. — Мн.: Бел. наука, 2001. — С. 82–106; Цели, объем и структура словаря оттопонимных дериватов Витебщины // Разноуровневые характеристики лексических единиц: Сборник научных статей по материалам докладов и сообщений конференции. Ч. 3. Слово и грамматика. Лексикография. — Смоленск, 2001. — С. 203–207; Формант ан-е (анін) в катойконимии Витебщины // Наука и образование в условиях социально-экономической трансформации общества: сборник докладов Международной научной конференции. — Витебск, 2001. — С. 326–328; Ойконимы Витебщины, образованные от личных имен ИВАН, ЯН и их вариантов // Белорусско-русско-польское сопоставительное языкознание и литературоведение. — [Б. м.], [б. г.]; Католический компонент топонимии Витебщины // Chreściańskie dziedzictwo duchowe narodów słowiańskich / Redakcja naucowa Zofia Abramowicz. — Białystok: Wydawnictvo Uniwersytetu w Białystoku, 2003. — S. 657–663; Региональная топонимическая энциклопедия: современный лексикографический проект // Надзённыя праблемы лексікалогіі і анамастыкі славянскіх моў: зборнік навуковых артыкулаў. — Мазыр: УА МДПУ, 2006. — С.5–8; Вариативность в ойконимии Белорусского Поозерья // Имя и слово: Проблемы семантико-прагматического взаимодействия в славянских языках: материалы международ. научной конф., Брест, 19–20 апреля 2007 г.: в 2-х ч. Ч. 2 / под ред. В.И. Синкевича. — Брест: БрГУ. — С. 274–278; Типология вариантов в ойконимии Белорусского Поозерья // Проблемы славянской этимологии и ономастики: сборник научных работ. — Гомель, 2007; Новые тенденции в микро-

топонимии // Славянские языки: Системно-описательный и социокультурный аспекты исследования: материалы III Международной науч.-метод. конф., Брест, 22–23 ноября 2007 г. — Брест: БрГУ, 2008. — С. 209–212; Как «прочитать» название на географической карте // Филолог: сборник материалов для учащихся. — Мн.: Национальный институт образования, 2008. — С. 17–22.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Генкін У.М. (17.12.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ГІЛЬ** МІХАЛ НІКАДЗІМАВІЧ (12.10.1958, г. Паставы Віцебскай вобл.), краязнаўца, выдавец. Скончыў аддзяленне механізацыі Гарадоцкага сельскагаспадарчага тэхнікума. Працаваў інжынерам матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння завода «Беліт» (1981–1999), прадпрымальнікам. Актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю. Старшыня Пастаўскай філіі БСДГ, дэпутат райсавета, кіраўнік рэгіянальнага інфармацыйна-рэсурсавага цэнтра, член праўлення Асамблеі недзяржаўных няўрадавых арганізацый Віцебшчыны (незарэгістраваная), старшыня Пастаўскай раённай арганізацыі ТБМ.




Цікавіцца мясцовай гісторыяй з дзяцінства. Актыўныя краязнаўчыя росшукі пачаў з 1991 г., калі стаў старшынёй раённай арганізацыі ТБМ. Даследуе сядзібы і паркі, дзейнасць Арміі Краёвай на Паазер'і, займаецца перакладамі з польскай мовы кніг і матэрыялаў краязнаўчай накіраванасці, выдадзеных у кан. XIX – 1930-я гг. Браў удзел у экспедыцыях і раскопках на Лынтупшчыне, якія ладзіліся літоўскімі (Вайткавічус) і беларускімі (Э. Зайкоўскі) даследчыкамі.

Аказвае значную падтрымку развіццю краязнаўчага руху на Заходняй Віцебшчыне, Астравеччыне, Мядзельшчыне. Выдаваў газету «Сумежжа» (з 1991, выдадзена больш за 100 нумароў). Пасля «Сумежжа» выдаваў газету «Крэсы», у якой змяшчалася шмат артыкулаў па гісторыі і культуры краю. Выдавец краязнаўчага бюлетэня «Краязнаўцы Паазер'я» (выдадзена больш за 25 нумароў), ілюстраванага бюлетэня «Нашы карані», літаратурна-культурніцкага бюлетэня «Барвы» (4 нумары). Аўтар шэрагу артыкулаў у мясцовым перыядычным друку. Падрыхтаваў і выдаў кнігу «Былыя сядзібы і паркі Паазер'я. Пастаўшчына», заснаванай на звестках чацвёртага тома кнігі Р. Афтаназі «Dzieje rezydencji na davnych kresach Rzeczypospolitej», працах В. Зямчонка, І. Пракаповіча, матэрыялах асабістых экспедыцый і вандровак. Плануе выдаць часткі, прысвечаныя Браслаўшчыне, Глыбоччыне, Міёршчыне, Шаркоўшчыне.




Збірае матэрыялы па гісторыі і культуры роднага краю. Перадаў некаторыя рэчы ў прыватныя калекцыі Ю. Фурса, І. Пракаповіча. Адзін з ініцыятараў пабудовы капліц і ўзвядзенні крыжоў і памятных знакаў на Пастаўшчыне. Падтрымлівае сувязі з Пастаўскім краязнаўчым таварыствам імя К. Тызенгаўза, культурна-асветніцкім цэнтрам імя Я. Драздовіча, Браслаўскім музейным аб'яднаннем. Мае падрыхтаваныя, але ненадрукаваныя працы «Былыя сядзібы і паркі Мядзельшчыны» (сумесна з Я. Драўніцкім), «Армія Краёва на Паазер'і».




Тв.: Кнігі: Былыя сядзібы і паркі Паазер'я. Пастаўшчына. — Паставы: Сумежжа, 2004. — 79 с.; Былыя сядзібы і паркі Паазер'я. Астравеччына. — Паставы: Сумежжа, 2005. — 68 с.; Былыя сядзібы і паркі Паазер'я. Мядзельшчына. — Паставы: Сумежжа, 2009. — 64 с.

Артыкулы ў перыядычным друку: Помніць пра Бацькаўшчыну // Нашы карані (П). — 2003. — № 8. — С. 40; Пленэр збірае мастакоў // Тамсама. — С. 54; Былыя сядзібы Паазер'я // Нашы карані (П). — 2004. — № 14. — С. 35–59; — № 15. — С. 29–32; Госці з Літвы // Нашы карані (П). — 2004. — № 15. — С. 59; Так пачыналася «Рунь» // Барвы. — 2004. — №1. — С. 39; Жыццё і лёс мастака з-пад Кямелішак // Барвы. — 2004. — № 2. — С. 29; Галерэя мастакоў у вёсцы // Тамсама. — С. 42; Ён быў нястомным рэфарматарам // ГлР. — 2007. — № 35. — С. 1, 3.

Пераклады з польскай мовы: Жаброўскі Генрык. Міхнічы. — Паставы: Сумежжа, 2005. — 120 с.; Жамойць Ежы. Свір і касцёл свірскі // Нашы карані (П). — 2003. — № 8. — С. 17–23; Марэлоўскі Мар'ян.

Палац Пілсудскіх у Мосары // Тамсама. — С. 40–45; Афтэназы Раман. Германавічы. Ёды. Лужкі // Нашы карані (П). — 2005. — № 16. — С. 42–49.

Літ.: Шык У. Міхась за мяжу не збіраецца пакуль: [М. Гіль, Паставы] // ВК. — 2000. — № 38. — С. 3; Сідарэвіч А. Выдадзена ў Паставах // НН. — 2005. — № 29. — С. 8; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Гіль М.Н. (20.10.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ГІНЗБУРГ** БАРЫС ЛЬВОВІЧ (20.12.1922, г. Віцебск), урач. Скончыў СШ № 10 г. Віцебска, Віцебскі медыцынскі інстытут (1952). Працаваў галоўным урачом Віцебскай санітарна-эпідэмічнай станцыі (1952–1955), загадчыкам райздраўаддзела, галоўным ўрачом Віцебскага раёна (1955–1983), урачом-метадыстам Віцебскай цэнтральнай раённай паліклінікі (1983–1986). Аўтар артыкулаў па гісторыі, сучасным стане медыцыны ў Віцебскім раёне і лёсе медыкаў у гады вайны.

Тв.: Ваенны лёс бальніцы: [в. Бараўляны] // ЛПр. — 1985. — № 55. — С. 2; Верныя памяці: [ФАП у в. Баршчоўка] // ЛПр. — 1985. — № 72. — С. 3; У адным раду: [медыкі Віцебскага раёна ў Вялікай Айчыннай вайне] // ЛПр. — 1987. — № 23. — С. 3; «Доктар Ваня» // ЛПр. — 1988. — № 56. — С. 2; Суражскія райздравы // ЖП. — 1995. — № 29. — С. 2; Трагедыя Барадзіна // ЖП. — 1998. — № 10. — С. 2; Бальніца, якая ваявала: [Радзімір Махноў] // ЖП. — 1998. — № 48. — С. 2; Медыкі першай Беларускай: [партызанскай брыгады] // ЖП. — 2001. — № 58. — С. 2; Медыкі першай Віцебскай: [партызанскай брыгады] // ЖП. — 2001. — № 62. — С. 2; Чырвоны Крыж: Людзі і справы: [Г.Н. Жаваркава] // ЖП. — 2001. — № 74. — С. 2.

Літ.: Мезенцев В. Врач по призванию: [Б.Л. Гінзбург] // ЖП. — 2002. — № 97. — С. 3; Степаненко Н.И., Степаненко Ю.Н. Гордость здравоохранения Витебщины: биографический справочник. — Витебск: ВОТ, 2009. — С. 159–160.

**ГІНЬКО** ВОЛЬГА ДЗМІТРЫЕЎНА (26.04.1960, в. Дзіўнікі (зараз Галінова) Псуеўскага с/с Глыбоцкага раёна Віцебскай вобл.), педагог, краязнаўца. Працавала настаўніцай пачатковых класаў Гатаўшчынскай СШ Глыбоцкага раёна (1980–1983), дырэктарам Падсвільскага дома піянераў (1983–1987). Цяпер працуе настаўніцай беларускай мовы і літаратуры, намеснікам дырэктара Празароцкай СШ Глыбоцкага раёна (з 1987).

Вядзе актыўную пазакласную работу па вывучэнні роднага краю. Распачала актыўна займацца краязнаўствам у 1989–1990-м гг., калі стала браць удзел у абласной краязнаўчай экспедыцыі «Мой родны кут», якая праводзілася аддзелам беларусазнаўства ВАААППДіП пад кіраўніцтвам А.В. Куржалава.

Даследуе жыццёвы і творчы шлях І. Буйніцкага, гісторыю і культуру в. Празарокі і наваколляў. Стала арганізатарам часовых выстаў «З гісторыі беларускага тэатра», «Тэатр імя Я. Купалы», «Беларускі дзяржаўны тэатр імя Я. Коласа». Стварыла ў школе «Хол педагагічнай славы», пакой «Гісторыя в. Празарокі і культавых устаноў». Удзельнік краязнаўчых канферэнцый, якія ладзяцца аддзелам краязнаўства і беларусазнаўства ВАААППДіП, канферэнцый, прысвечаных жыццю і дзейнасці Б. Эпімаха-Шыпілы, І. Буйніцкага і інш.

Падтрымлівае кантакты з аддзелам краязнаўства і беларусазнаўства ВАААППДіП, Глыбоцкім домам рамёстваў, Глыбоцкім раённым краязнаўчым музеем, Глыбоцкім занальным архівам, Глыбоцкім РЦДТ, Віленскім гістарычным архівам.

Аўтар кнігі «Пралеска сіняй Беларусі: зборнік літаратурных твораў пра Глыбоччыну» (выдадзена пры падтрымцы Віцебскага аддзялення фонда Л. Сапегі, 2002). Некаторыя легенды, сабраныя на Празароччыне апублікаваны ў кнізе «Легенды і паданні Віцебшчыны», артыкул пра І. Буйніцкага — у зборніку «Гонар і слава Віцебшчыны».

Мае ненадрукаваныя працы: «Духоўная спадчына Празароцкага краю», «Невядомыя старонкі жыцця і дзейнасці І. Буйніцкага», «Празароцкая школа — учора, сёння, заўтра» (няскончаная). Некаторыя матэрыялы перадала ў Глыбоцкі краязнаўчы музей, Музей літаратуры і мастацтва СШ № 2 г. Глыбокае.

Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2004), узнагароджана ганаровым знакам «За актыўную працу» Рэспубліканскага савета Педагагічнага таварыства (1994), прызёр конкурса «Жанчына года» Віцебскай вобл. (1998), арганізаванага Віцебскім аблвыканкамам і Віцебскім абласным саветам жанчын, прызёр абласнога конкурса «Настаўнік года» (1991).

Тв.: Пралеска сіняй Беларусі: зборнік літаратурных твораў пра Глыбоччыну: [саматуж. выд.]. — 2002.

Артыкулы ў мясцовым друку: Пра вёску Празарокі, Як ксёндз разбойнікаў выратаваў // Легенды і паданні Віцебшчыны: зборнік матэрыялаў абласнога конкурса «Легенды і паданні роднага краю» / склад. Н. Зайцава. — Віцебск, 2002. — С. 24, 82; На радзіме Ігната Буйніцкага // ВГл. — 1991. — № 20. — С. 3; Празарокі // ВГл. — 1993. — № 81. — С. 2; Па слядах краязнаўчай канферэнцыі // ВГл. — 1993. — № 31. — С. 2; Ізноў пра Ігната Буйніцкага // ВГл. — 1994. — № 26. — С. 2–3; Блуканні па пакутах // ВГл. — 1994. — № 53. — С. 2–3; Ішлі лісты ў Кракаў // ВГл. — 1995. — № 49. — С. 2.

Літ.: Бурэніч Т. Летапісцы роднага краю // ВГл. — 1995. — № 30. — С. 2; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Гінько В.Д. (9.03.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ГЛАГОЎСКАЯ** АЛЕНА (8.04.1959, в. Ярылаўка Беластоцкага пав. Падляшскага ваяводства, РП, палітолаг, гісторык, краязнаўца, журналіст, беларускі грамадскі дзеяч, папулярызатар і прапагандыст беларускай гісторыі і культуры ў Польшчы. Кандыдат гуманітарных навук (1995). Жыве ў Гданьску. Закончыла факультэт журналістыкі і палітычных навук Варшаўскага ўніверсітэта (1983). Працавала ў Гданьскім універсітэце (1984–1998), ад’юнктам на кафедры беларускай культуры ва ўніверсітэце ў Беластоку (з 1998). Актыўна ўдзельнічае ў беларусазнаўчых даследаваннях у Польшчы і ў беларускім руху (старшыня Беларускага культурнага таварыства «Хатка» ў Гданьску, член рэдакцыі польска-беларускага месячніка «Czasopis» (Беласток).

Даследуе дзейнасць беларускага мастака з Браслаўшчыны Пётры Сергіевіча. Праводзіць экспедыцыі па месцах, звязаных з дзейнасцю мастака, арганізавала выставы твораў з прыватных збораў Польшчы ў Гданьску, Беластоку (2003). Рэдактар каталогу «Piotr Sierhijewicz. 1990–1984. Ze zbiorów prywatnych w Polsce. Gdańsk; Sopot; Gdynia, 2002». Вывучае жыццё і дзейнасць Мар’яна Пецюкевіча. Рэдактар выдання і аўтар прадмовы кнігі даследчыка «Кара за службу народу. Абразкі ссыльнага жыцьця» (Беласток, 2001). Разам з Вячаславам Харужым апрацавала і падрыхтавала да друку эпісталярную спадчыну этнографа і з’яўляецца аўтарам прадмовы кнігі «М. Пецюкевіч. Лісты (1956–1982)» (Беласток, 2005). Укладальніца зборніка твораў Міколы Дварэцкага (Міколы Базылюка) «Там і тут» (Гданьск, 2008) і аўтар прадмовы да яго. Аўтар кнігі «Беларусы на Гданьскім узбярэжжы», сярод галоўных герояў якой — браслаўчане Міхал Дварэцкі і Андрэй Вангін Блажэвіч. Удзельніца Браслаўскіх чытанняў 2000, 2003. Арганізатар шэрагу канферэнцый і выстаў.

Аўтар кніг «Białoruś 1914–1940. Kultura pod presą polityki» (Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne, 1996), «Białorusini na Wybrzeżu Gdańskim» (Торунь: Адам Маршалак, 2003).

Тв.: Кнігі і артыкулы ў кнігах, энцыклапедыях: Юзюк Фарботка // ЭГБ. — Т. 6. Ч. II. — Мн.: БелЭн, 2003. — С. 26; Семашкевіч Іван (Янка Быліна) // Тамсама. — С. 436; (разам з А. Лозка) Казлоўскі Уладзіслаў // Беларускі фальклор: энцыклапедыя. — Т. 1. — Мн.: БелЭн, 2005. — С. 611; Białoruś 1914–1940. Kultura pod presą polityki. — Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne, 1996. — 238 s.; (уступ, навуковая рэдакцыя) Aniela Kotkowicz, Weronika Kotkowicz-Klentak. Uspaminy. — Białystok, 1999; (разам з А. Хадубскім) Tożsamość kulturowa. Szkice o mniejszościach narodowych na Pomorzu Gdańskim. — Gdańsk, 2001; Уступнае слова // Кара за службу народу. Абразкі ссыльнага жыцьця. — Беласток, 2001. — С. 5–10; (разам з А. Хадубскім) Tożsamość kulturowa. Szkice o mniejszośćciach narodowych na Pomorzu Gdańskim. Seria druga. — Gdańsk, 2002; Piotr Sierhijewicz 1900–1984. Ze zbiorów prywatnych w Polsce. Katalog. — Gdańsk, 2002. — 24 s.; Białorusini na Wybrzeżu Gdańskim. — Toruń, 2003; (разам з А. Хадубскім) Tożsamość kulturowa. Szkice o mniejszościach narodowych na Pomorzu Gdańskim. Seria trzecia. — Gdańsk, 2003; Уступ // Aniela Kotkowicz, Weronika Kotkowicz-Klentak, Od Budsława do GUAŁagu. — Białystok, 2003. — S. 5–12; (разам з А. Хадубскім) Tożsamość kulturowa. Szkice o mniejszościach narodowych na Pomorzu Gdańskim. Seria czwarta. — Gdańsk, 2004; (разам з А. Хадубскім) Tożsamość kulturowa. Szkice o mniejszośćciach narodowych na Pomorzu Gdańskim. Seria piąta. — Gdańsk, 2005; Уступ // М. Пецюкевіч. Лісты (1956–1982) / рэд. А. Глагоўская, В. Харужы — Беласток, 2005. — С. 5–22; Уступ // Куптэль Міхась. Адгалоскі карэспандэнта. — Сопат, 2006. — С. 3–8; Wprowadzenie // Mikołaj Dworzecki (Mikoła Bazyluk). Tam i tu / zebrała, opracowała i wstępem poprzedziła Helena Głogowska. — Gdańsk, 2008. — S. 5–42; Lew Dobrzyński — artysta i pamięć: katalog wystawy L. Dobrzyńskiego w Muzeum Ziemi Puckiej lipiec-wrzesień 2008. — 8 s.

Артыкулы ў навуковым друку: «Схавалася душа паэта» — слова аб Міколе Дварэцкім // Браслаўскія чытанні: матэрыялы V навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 939-годдзю першай згадкі Браслава ў пісьмовых крыніцах. — Браслаў; Наваполацк: Усяслаў Чарадзей, 2001. — С. 124–126; Канцэпцыя Беларускага ўніверсітэта паводле Мітрафана Доўнар-Запольскага // Трэцяя міжнародныя Доўнараўскія чытанні. — Мн., 2002. — С. 78–81; Кніга пра віцебскага гісторыка, (Л. Хмяльніцкая, Гісторык з Віцебска. Жыццяпіс Аляксея Сапунова, Мінск 2001) // Czasopis. — 2002. — № 3. — S. 38–40; Спадчына Пётры Сергіевіча ў Польшчы // Браслаўскія чытанні: матэрыялы VI навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 150-й гадавіне з дня нараджэння браслаўскага лекара, грамадскага дзеяча Станіслава Нарбута (1853–1926), 7–8 мая 2003 года. — Браслаў, 2003. — С. 24–26; Полацак антырасейскі (D. Kupisz, Połock 1579, Warszawa 2003) // Arche. — 2004. — № 3. — С. 280–282; Язэп Найдзюк — аўтар, выдавец і друкар двух народаў // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры / пад рэд. Т.А. Дзем’яновіч, Л.І. Доўнар, Т.А. Самайлюк. — Мн., 2006. — Ч. 1. — С. 135–142; Янка Купала і Якуб Колас у сьвядомасьці грамадзян Польшчы ў пачатку XXI ст. // Acta Albaruthenica 7. Literatura. Język. Kultura / pod red. M. Timoszuka i M. Chaustowicza. — Warszawa, 2007. — S. 466–482; Мастак з Крутога Берагу // Наша вера. — 2009. — № 3. — С. 58–62; Białorusini w parlamentach II Rzeczypospolitej // Przemiany społeczne, kwestie narodowościowe i polonijne / pod red. A. Chodubskiego. — Toruń. 1994. — S. 123–145; Białruś i Białorusini w podręcznikach historii do szkół podstawowych w Polsce // Białoruskie Zeszyty Historyczne. — 1994. — № 2. — S. 89–96; Białorusini na Pomorzu Gdańskim po II wojnie światowej — przyczynek do problemu // Białoruskie Zeszyty Historyczne. — 1995. — № 1(3). — S. 78–91; Los białoruskiego posła Sergiusza Baranowa // Białoruskie Zeszyty Historyczne. — 1995. — № 2 (4). — S. 146–159; «Vicebski Saytak», 1995, nr 1 // Białoruskie Zeszyty Historyczne. — 1996. — № 2 (6). — S. 176–177; W mieście Marca Chagalla // Czasopis. — 1996. — № 6; Białorusini w Gdańsku i okolicy po 1945 r. // W starej i nowej ojczyźnie. Mniejszości narodowe w Gdańsku / pod red. I. Hałagidy. — Gdańsk, 1997. — S . 9–18; Białorusini w Sopocie // Rocznik Sopocki. — 1997. — S. 67–74; Położenie Białorusinów w regionie nadmorskim po II wojnie światowej // Pomerania Ethnica. Mniejszości narodowe i etniczne na Pomorzu Zachodnim / pod red. M. Giedrojć i J. Mieczkowskiego. — Szczecin, 1998. —

S. 209–217; Kształtowanie się białoruskich granic państwowych w latach 1918–1926 // Granice i pogranicza. Historia codziennoci i doświadczeń / pod red. M. Liedke, J. Sadowskiej, J. Trynkowskiego. T. II. — Białystok, 1999. — S. 28–35; Autobiografia Piotra Sierhijewicza // Białoruskie Zeszyty Historyczne. — 2000. — № 14; Żródła do biografii działaczy białoruskich w zbiorach prywatnych // Białostoczczyzna. — 2000. — № 2. — S. 80–85; «Ukryła się dusza poety» — rzecz o Mikołaju Dworzeckim // Autograf. — 2000. — № 6. — S. 22–24; Na wakacje na Białoruś! (G. Rąkowski, Ilustrowany przewodnik po zabytkach kultury na Białorusi, Warszawa, 1997; tenże, Wśród jezior i mszarów Wileńszczyzny, Warszawa, 2000) // Czasopis. — 2000. — S. 7–8. — S. 52–55; Białoruś: między Grodnem a Witebskiem // Czasopis. — 2000. — № 9. — S. 21–23. — № 10. — S. 19–20; Spuścizna po wileńskim malarzu Piotrze Sierhijewiczu w zbiorach prywatnych w Polsce // Białostoczczyzna. — 2001. — № 3–4; Wkład Mariana Pieciukiewicza w kształtowanie świadomości narodowej Białorusinów // Materiały Muzeum Etnograficznego w Toruniu. — 2009. — № 1. Marian Pieciukiewicz. zcie i działalność. — S. 53–75; Marian Pieciukiewicz jako literat i pamietnikarz // Тамсама. — S. 101–115.

Артыкулы ў перыядычным друку: Białoruski Matejko: [П. Сергіевіч] // Czasopis (Białostok). — 2003. — № 4, 5; Схавалася душа паэта: [М. Дварэцкі] // Павет. — 2001. — № 3, 4; Спадчына віленскага мастака Пётры Сергіевіча ў прыватных зборах у Польшчы // Павет. — 2002 — № 2 (6). — С. 4–5; Браніслаў Эпімах-Шыпіла // Ніва. — 2004. — № 38. — С. 9.

Літ.: Сергіевіч К. Выдадзены ў Польшчы // БЗ. — 2005. — № 45. — С. 3; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Глагоўская А. (13.06.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ГЛІНКА** ТАМАРА ІВАНАЎНА (7.02.1933, г. Віцебск), партыйны работнік, гісторык, архівіст. Скончыла гіст. факультэт МгДПІ (1956), Мінскую вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ (1964), курсы перападрыхтоўкі кіруючых партыйных і савецкіх кадраў пры ЦК КПБ (1972). Працавала старшай піянерважатай 25-й СШ г. Віцебска (1957), на камсамольскай рабоце (1958–1962), асістэнтам кафедры філасофіі, выкладчыкам навуковага камунізму Віцебскага медыцынскага інстытута (1964–1969), інструктарам аддзела навукі і навуковых устаноў Віцебскага абкома КПБ (1969–1974); загадчыкам партархіва Віцебскага абкома КПБ (1974–1988).

За гады працы ў архіве садзейнічала развіццю публікацыйнай работы сярод супрацоўнікаў архіва, з’яўлялася адным з аўтараў выдадзеных архівам альбома і кнігі «Юныя героі Віцебшчыны». Калектыў архіва пад яе кіраўніцтвам правёў значную работу па падрыхтоўцы да друку нарысаў гісторыі абласной партыйнай і камсамольскай арганізацый, кнігі «Бессмяротны подзвіг герояў», прысвечанай Героям Савецкага Саюза – жыхарам Віцебскай вобл. Брала актыўны ўдзел у рабоце па ўстанаўленні дзейнасці падпольных груп, прызнанні ўдзельнікаў партыз. руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.




Узнагароджана медалямі «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», «Ветэран працы», Ганаровай граматай ВС БССР, знакам «Выдатнік архіўнай справы».

Тв.: (вместе с Н.И. Дорофеенко, В.Г. Скопой, Г.М. Акентьевым) Юные герои Витебщины. — Мн.: Народная асвета, 1980. — 127 с.

Літ.: ДАВВ. Ф. 1-п, воп. 170, спр. 162 (асабовая справа Т. І. Глінкі); Долгова А.В. Глинка Т.И // Витебщина архивная: история, фонды, персоналии, сер. XIX–XX вв. — Мн.: БелНДІДАС, 2002. — С. 191; Глінка Т.І. Архівісты Беларусі: біябібліяграфічны даведнік / склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. — Мн.: БелНДІДАС, 2006. — С. 90.



**ГЛУШАКОЎ** ПЛАТОН ФЁДАРАВІЧ (18.10.1913, в. Паддуб’е Віцебскага пав. Віцебскай губ. – 7.05.1996), вайсковец, архівіст. Скончыў Віцебскую фабрычна-завадскую вучэльню кулінараў (1933), Віцебскі педрабфак (1936), Сталінградскае авіяцыйнае вучылішча (1939), Віцебскі вячэрні ўніверсітэт марксізму-ленінізму (1951). Працаваў поварам у сталовай г. Віцебска (1933–1935), служыў у Ваенна-паветраных сілах СССР (1939–1946). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў дырэктарам ДАВВ (1948–1951), начальнікам архіўнага аддзела УМУС па Віцебскай вобл. (1951–1960), загадчыкам архіўнага аддзела Віцебскага аблвыканкама (1960–1974).

Удзельнічаў у аднаўленні дзяржаўных архіваў на Віцебшчыне ў пасляваенныя гады, спрыяў вырашэнню пытання кадравага забеспячэння архіваў гісторыкамі-архівістамі. Акрамя важнай адміністрацыйна-гаспадарчай дзейнасці прымаў актыўны ўдзел у распрацоўцы метадычных дапаможнікаў па архіўнай справе.Удзельнічаў у працы навуковых і навукова-практычных канферэнцый па праблемах архівазнаўства, часта выступаў з лекцыямі і дакладамі перад грамадскасцю, публікаваў артыкулы ў абласных газетах. Аўтар артыкулаў у архіўных бюлетэнях.

Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Аляксандра Неўскага, ордэнам Айчыннай вайны I ст., ордэнам Чырвонай Зоркі, 7 медалямі, Ганаровымі граматамі ВС БССР.

Літ.: ДАВВ. Ф. 1966, воп. 1-л, спр. 242 (асабовая справа П. Ф. Глушакова); Шарендо В.В. Глушаков П.В. // Витебщина архивная: история, фонды, персоналии, сер. XIX–XX вв. — Мн.: БелНДІДАС, 2002. — С. 182; Глушакоў П.В. // Архівісты Беларусі: біябібліяграфічны даведнік / склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. — Мн.: БелНДІДАС, 2006. — С. 90–91.



**ГЛУШКО** (Смірнова) ВАЛЕРЫЯ ГАЎРЫЛАЎНА (8.06.1918, г. Кастрама – 28.08.2000), архіўны работнік. Скончыла СШ у г. Кіраве, Кіраўскі педагагічны рабфак (1936), факультэт рускай мовы і літаратуры Кіраўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя У. І. Леніна (1940), курсы лектараў пры Вышэйшай партыйнай школе пры ЦК ВКП(б) (1945). Працавала ў партыйных і дзяржаўных органах у Кіраўскай вобл. (1940–1945). З 1945 г. на Віцебшчыне. Працавала лектарам Віцебскага абкома КП(б) Б, нам. заг. аддзела прапаганды і агітацыі Віцебскага абкома КП(б)Б (1948–1950), заг. вучэбнага кабінета асноў марксізму-ленінізму Віцебскага медыцынскага інстытута (1950–1952), заг. партархіва Віцебскага абкома КПБ (1952–1974).

За перыяд знаходжання на пасадзе кіраўніка партархіва праводзіла працу па прыёме дакументаў, забеспячэнні іх уліку і захаванасці, ёй закладзены фундамент навуковых даследаванняў. Брала ўдзел у падрыхтоўцы выдання нарысаў, прысвечаных героям Савецкага Саюза – ураджэнцам Віцебскай вобл. Аўтар артыкулаў у мясцовым друку.

Тв.: (разам з З. Жураўлёвай, Т. Кастянюк) У авангардзе ардэнаноснага калектыву // ВР. — 1971. — 9 верас. — С. 2; (разам з Т. Касцянюк) На чале вялікага руху. Да 25-годдзя Віцебскага дывановага камбіната // ВР. — 1972. — 5 ліст. — С. 3–4.

Літ.: ДАВВ. Ф. 1-п, воп. 132, спр. 12; Долгова А.В. Глушко В.Г. // Витебщина архивная: история, фонды, персоналии, сер. XIX–XX вв. — Мн.: БелНДІДАС, 2002. — С. 190; Архівісты Беларусі: біябібліяграфічны даведнік / склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. — Мн.: БелНДІДАС, 2006. — С. 91.



**ГЛУШКОЎ** СЯРГЕЙ МІКАЛАЕВІЧ (24.09.1947, г. Полацк), краязнаўца. Скончыў СШ № 4 г. Полацка (1964). Працаваў слесарам-мантажнікам на прадпрыемствах «Данбаспрамхіммантаж», «Дзяржкамгаз» БССР, «Шкловалакно» (1963–2007).

Займаецца комплекснымі даследаваннямі Полаччыны. Праводзіць росшукі і вывучэнне каменных крыжоў, святых крыніц, сакральных валуноў, капішчаў, мольбішчаў, збірае легенды, паданні, вывучае тапаніміку горада і ваколіц. Папулярызуе звесткі пра выдатных землякоў і асоб, звязаных з Полаччынай. Даўніной цікавіцца з дзяцінства. Павагу да мінуўшчыны выхавалі бацькі — Мікалай Сяргеевіч і Антаніна Міхайлаўна Глушковы — і старэйшы брат Уладзімір, педагог, філолаг. Вялікі ўплыў на фарміраванне зацікаўленасці гісторыяй і прыродай роднага краю, а таксама павышэнне ўзроўню ведаў аказала знаёмства і супрацоўніцтва з А.А. Арцыхоўскім, братамі А.П. і В.П. Грыцкевічамі, В.Ф. Вінакуравым, Г.А. Каханоўскім, Э.А. Ляўковым, А.В. Мальдзісам, С. В. Тарасавым.

Сістэматычна пачаў займацца краязнаўчымі даследаваннямі з 1984 г., калі зацікавіўся геалагічнымі помнікамі прыроды. З таго часу вывучае помнікі геалогіі (камяні, крыніцы). Выявіў шэраг незвычайных валуноў, месцаў былых капішчаў і перадаў звесткі пра іх у Інстытут геафізікі АН БССР. Браў удзел у экспедыцыі Інстытута геафізікі АН БССР, пад кіраўніцтвам Э.А. Ляўкова, В.Ф. Вінакурава, В.І. Ярцава (1987) і працягвае супрацоўнічаць

з навукоўцамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі. У наступныя гады выявіў шэраг капішчаў і рытуальных камянёў (больш 20), сярод якіх адзначым наступныя: «Змееў камень» каля в. Заполле Полацкага раёна, «Перуноў камень», «Камень Шавец» каля в. Турасы Ушацкага раёна, «Пятроў камень» непадалёк ад замчышча, дзе змяшчалася крэпасць Красная, узведзеная ў XVI ст. Мае асабістае перакананне ў тым, што выяўленыя ў ваколіцах Полацка сакральныя комплексы і асобныя культавыя валуны ўваходзяць у агульную сусветную сістэму падобных пабудоў невядомага нам прызначэння, у якую ўваходзяць піраміды Егіпта, Індыі, Мальдзіў, крамлехі і менгіры Еўропы, Урала і іншых рэгіёнаў сусвету.

Даследуе тапаніміку Полаччыны. Для тлумачэння назваў шэрагу айконімаў прыводзіць арыгінальныя і добра абгрунтаваныя версіі (напрыклад, тлумачыць назву мікрараёна «Грамы» каля Полацка, тым, што там змяшчалася капішча Перуна, які меў некалькі іншых імёнаў, сярод якіх — Гром).

У шчыльным кантакце з навукоўцамі Э. Ляўковым і В. Вінакуравым, на апошнім этапе пошуку дапамог выявіць месца нараджэння Ганны Баляславаўны Місуны (вёска Забалацце цяперашняга Полацкага р-на), якая з'яўлялася першай жанчынай-геолагам, што займалася палявымі доследамі ледавіковых адкладанняў у Расійскай імперыі. Даследаваў Бікульніцкае капішча каля воз. Янова ў Полацкім раёне. Разам з братам Уладзімірам і праўнучкай І.Ф. Хруцкага Ядзвігай Аляксандраўнай Мацееўскай выявілі месцы пахаванняў вядомага мастака і яго брата Андрэя каля іх былога маёнтка Захарнічы на Полаччыне, добраўпарадкавалі іх. У 1998 г. на месцы пахавання быў узведзены помнік (арх. Аляксандр Гвоздікаў), які хутка, не адстаяўшы і трох месяцаў, быў знішчаны вандаламі.

На працягу трох гадоў разам з К.М. Анціпавым вёў даследчыцкую работу па вяртанні імя віцэ-адмірала І.А. Павалішына, сядзіба якога знаходзілася ў межах сучаснай в. Янкавічы, на мяжы Полацкага і Расонскага раёнаў. Звяртаўся ў архіў ВМФ РФ, ваенна-гістарычны архіў РФ, Дваранскі сход СПб. Дзякуючы праведзеным даследаванням было вернута імя адмірала екацярынінскіх часоў, узнагароджанага за перамогу ў марскім баі са шведамі пад Выбаргам у 1790 годзе Георгіеўскім крыжом II ст. (аднаго з васьмі адміралаў, узнагароджаных такім ордэнам у Расійскай імперыі) і маёнткам з 600-мі душамі ў Полацкім павеце. У в. Янкавічы імем адмірала названа вуліца, школа, паляўнічы домік. Усталявана шыльда на месцы пахавання Павалішына.

Займаецца даследаваннямі лёсу выдатнага беларускага мастака Яфіма Спажынскага, які жыў і працаваў у Полацкім павеце на мяжы XVIII–XIX стст. Даследуе жыццёвы шлях і сувязі генерала Я.П. Кульнёва з Полаччынай.

Шмат вандраваў як па рэспубліках СССР, так і па рэгіёнах БССР, Полаччыне. Рэгулярна робіць саматужныя вандроўкі па ваколіцах горада. Удзельнічаў у шматлікіх экспедыцыях, якія ладзіліся навукоўцамі Э. Ляўковым, Л. Дучыц, С. Тарасавым, Г. Семянчуком, Д. Дукам, У. Мілюціным, М. Клімавым.

Браў удзел у стварэнні экспазіцыі, прысвечанай віцэ-адміралу І.А. Павалішыну і ген. Я.П. Кульнёву ў Расонскім музеі баявой садружнасці, музея імя Павалішына Янкавіцкай БШ Расонскага раёна, экспазіцыі, прысвечанай І.Ф. Хруцкаму ў музеі СШ в. Палата Полацкага раёна.

У 2009 г. разам з Л. Ф. Данько вызначыў месцазнаходжанне колішняга Мікалаеўскага мужчынскага манастыра на Лучне, заснаванага каля Полацка ў XIII ст. полацкім епіскапам Сімеонам І ля возера Ропна (цяпер в. Калектыўная). Браў актыўны ўдзел у працы па аднаўленні ў Полацку помніка падзеям Айчыннай вайны 1812 г., разбуранага ў 30-я гады XX ст. (2009). Знайшоў памятную пласціну, закладзеную ў падмурак помніка-капліцы пры першым будаўніцтве ў 1848 г.

Удзельнік устаноўчага з'езда па арганізацыі БКТ (снежань 1989), быў абраны ў Цэнтральную Раду ад Полацкай акругі. Браў актыўны ўдзел у рабоце полацкага гісторыка-культурнага аб'яднання «Маладзік», важным вынікам дзейнасці якога была забарона праводзіць забудову шматпавярховымі будынкамі плошчы Свабоды у Полацку. У даследчыцкай працы шчыльна супрацоўнічае з Полацка-Глыбоцкай епархіяй, Музеем баявой садружнасці г.п. Расонаў, ЦДГАВМФ, ЦДВГА, Дваранскім сходам г. Санкт-Пецярбург, Музеем-сядзібай Ф. Цютчава і Я. Баратынскага ў Муранава Маскоўскай вобл., Горацкім мастацкім музеем г. Пераяслаўля, Інстытутам гісторыі, Інстытутам геалогіі НАН Беларусі, бібліятэкамі Полацка, Віцебска, дзяржаўнымі арганізацыямі і ўстановамі Полацкага, Расонскага, Ушацкага, Лепельскага раёнаў.

Фотааматар. Мае прыватны архіў, у які ўваходзяць фотаздымкі помнікаў прыроды, гісторыі і культуры Полаччыны. Арганізаваў дзве фотавыставы — «Ціхая мая радзіма» і «Неслышно времени движенье» — у полацкім Цэнтры нацыянальных культур і рамёстваў

(2007 і 2009 г.), у якія ўвайшлі лепшыя работы (90 здымкаў, у асноўным пейзажы, помнікі гісторыі і культуры), на якіх прадстаўлены г. Полацк і яго ваколіцы.

Аказаў вялікую дапамогу пры падрыхтоўцы даведніка «Краязнаўцы Віцебшчыны».

Тв.: Ці ўмеем паважаць продкаў // СК. — 1987. — № 85. — С. 2; Мадэрн каля старых муроў // СК. — 1987. — № 120. — С. 3; Валун у гонар Чэрскага // СК. — 1988. — № 144. — С. 4; Да Вас, сучаснікі мае // СК. — 1989. — 4 жніўня; Краязнаўчы з'езд // СК. — 1990. — 9 студз.; Хто мы такія? // ПВ. — 1999. — № 95. — С. 3; Масты: паміж мінулым і будучым // ПВ. — 2002. — 29 снеж.; Пра тое, што побач // ПВ. — 2003. — 3 кастр.; Прости нас, Волово озеро! // ПВ. — 2003. — 31 кастр.; Тое, што побач: [могілкі Першай сусветнай вайны] // ПВ. — 2004. — № 15. — С. 5; З надзеяй на ўваскрашэнне: [сядзіба і магіла адмір. Павалішына] // ПВ. — 2004. — № 106–107. — С. 6; (разам з К.М. Анціпавым) Илларион Афанасьевич Повалишин // ГлРс. — 2004. — 20 крас.; Чистая житие… // ПЕв. — 2005. — Сакавік; (разам з К.М. Анціпавым) Семья Повалишиных // ГлРс. — 2006. — 27 верас.; (разам з К.М. Анціпавым) Новое о Повалишиных // ГлРс. — 2006. — 4 жніўня; (разам з К.М. Анціпавым) Новое о Повалишиных // ГлРс. — 2006. — 8 жніўня; Преподобный Варсонофий Оптинский // Вестник культуры. — 2007. — № 6; Наўліцкія таямніцы // ПВ. — 2008. — № 68–69; Двор Хоццевічы // ПВ. — 2008. — № 102.

Літ.: Ляўкоў Э. У пошуках роднага кута. Да 120-годдзя слаўнай зямлячкі Г.Б. Місуна // СК. — 1988. — № 94. — С. 3; Гісторыка-краязнаўчы клуб пачынае дзейнічаць // СК. — 1988. — 3 снеж. — С. 2; Ляўкоў Э. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны. — С. 127, 131; Малашэня Л. Клуб «Вытокі». Закаханых у Бацькаўшчыну цяжкасці не засмучаюць // СК. — 1990. — 1 жніўня; Арлоў У. Таямніцы Полацкай гісторыі. — 2-е выд. — Мн.: Полымя, 2002. — С. 405; Забытая могила героя // Морской флот. — 2006. — № 4. — С. 82–84; Інтэрв'ю з С.М. Глушковым (31.07.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Обращение к потомкам // НС. — 2009. — № 121.

**ГЛУШКОЎ** УЛАДЗІМІР МІКАЛАЕВІЧ (11.05.1938, г. Полацк – 4.01.2007), краязнаўца. Працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў Полацкім педвучылішчы (педкаледжы). Займаўся асветніцкай і літаратурнай дзейнасцю. Разам з братам Сяргеем і праўнучкай І.Ф. Хруцкага Ядзвігай Аляксандраўнай Мацееўскай выявіў месцы пахаванняў вядомага мастака і яго брата Андрэя, браў удзел у іх добраўпарадкаванні. Чалавек энцыклапедычных ведаў. Фотамастак. Аўтар 3 кніг паэзіі: «Может быть…», «Здесь и теперь», «И все и каждый…».

Тв.: Ушануем славутага земляка: [І.Ф. Хруцкі] // СК. — 1987. — № 2. — С 3; Достоин памяти потомков: [И.Ф. Хруцкий] // Хімік. 1987. — № 9. — С. 2; Как вас теперь называть?: [о Скорине] // ПВ. — 2003. — № 94. — С. 3.

Літ.: Алексеенко В. Здесь и теперь // ПВ. — 2005. — 23 жніўня. — С. 7; Еронько Е. Душа за все в ответе // ПВ. — 2005. — 12 жніўня; Некралог // ПВ. — 2007. — № 3. — С. 4.



**ГОЛАСАЎ** ВІКТАР УЛАДЗІМІРАВІЧ (3.09.1953, г. Віцебск – пач. лістапада 2000), краязнаўца, музейны работнік, калекцыянер. Скончыў СШ № 10 г. Віцебска, гіст. факультэт Пскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава (1982). Служыў ва УС СССР (1972–1974). Працаваў рабочым бюро бытавога абслугоўвання (1970–1972), слесарам ў «Рэмбыттэхніцы» (1974), пячатнікам у друкарні (1975–1983), настаўнікам у школе ў Пскоўскім раёне (1983–1985), настаўнікам у СШ пгт. Руба (1985–1986), супрацоўнікам, загадчыкам аддзела навукова-асветніцкай працы, загадчыкам сектара выстаў, заг. філіяла музея прыватных калекцый ВАКМ (1986–2000).

Працуючы ў ВАКМ, меў дачыненне да арганізацыі экспазіцый і правядзення некаторых выстаў. Аўтар шэрагу артыкулаў на краязнаўчыя тэмы ў мясцовым перыядычным друку, сярод якіх цыкл артыкулаў да 100-годдзя віцебскай паштоўкі.

Тв.: Музей служыць выхаванню грамадзяніна і патрыёта // БЗ. — 1986. — № 149. — С. 3; На медалі — мастак: [Ю. Пэн] // ВР. — 1990. — № 46. — С. 1; Бурлюк и Галькевич // ВК. — 1994. — № 10. — С. 4; В первом трамвае по улицам старины // Віцьбічы. — 1996. — № 101. — С. 7; Живая история города: [вуліцы Віцебска] // Віцьбічы. — 1996. — № 121. — С. 8; Ученье свет: [Віцебская гімназія, педінстытут] // Віцьбічы. — 1996. — № 146. — С. 7.

Літ.: НА ВАКМ. Ф. 1002, 1003, 1005–1007; Подлипский А. Виктора нам не хватает: [В. Голасаў] // НС. — 2001. — № 140. — С. 6.

**ГОМАНАЎ** АНДРЭЙ УЛАДЗІМІРАВІЧ (19.10.1968), краязнаўца. Скончыў філал. факультэт БДУ, Акадэмію паслядыпломнай адукацыі. Працаваў выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ў ПТВ № 96, СШ № 45, гімназіі № 1 г. Віцебска (1995–2003), кіраўніком гуртка ў ВАЦППДіП.

Вывучае гісторыю войнаў і фартыфікацыі на тэрыторыі Беларусі, і ў першую чаргу падзеі Вялікай Айчыннай вайны на Віцебшчыне, цікавіцца канфесійным жыццём краю, р. Дзвіной. Браў удзел у стварэнні музея 43-й арміі (у СШ № 36 г. Віцебска), музея пошукавых атрадаў Віцебшчыны. Актыўны ўдзельнік экспедыцый і паходаў па Віцебшчыне. Аўтар ненадрукаваных прац, прысвечаных наступальнай аперацыі на воз. Лосвіда ў студзені 1943 г., фартыфікацыйным збудаванням на тэрыторыі Віцебшчыны.

Тв.: Витебская (Лосвидская) операция (январь 1944 года) // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 18–19 чэрвеня 2009 г. / ВДУ; рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. — Віцебск: ВДУ, 2009. — С. 188–195.
Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Гоманаў А.У. (18.06.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ГОРДЗІН** БАРЫС ЗАЛМАНАВІЧ (†), педагог. Працаваў настаўнікам у Бычыхінскай СШ Гарадоцкага раёна. Стварыў у ёй музей. Вёў актыўную перапіску з ветэранамі воінскіх злучэнняў, якія вызвалялі Гарадоччыну. Меў публікацыі на краязнаўчую тэму ў раённай газеце ў 1980–1990-я гг. Заслужаны настаўнік БССР (1967).

Тв.: На прыкладах гераічнага мінулага // ГВ. — 1985. — № 34. — С. 2.
Літ.: // Памяць: Гарадоцкі раён: Гісторыка-дакументальная хроніка / укл. С.У. Садоўская. Мн.: Беларусь, 2004. — С. 700.

**ГРАБОЎСКІ** ДЗМІТРЫЙ ІВАНАВІЧ (25.05.1957, в. Целяшы Парафьянаўскага с/с Докшыцкага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца, педагог. Скончыў Полацкае педагагічнае вучылішча (1976), гіст. факультэт МДПІ (1982). Працаваў настаўнікам у Ветахмянскай ВШ, Слабадской СШ, Докшыцкай СШ № 1, дырэктарам Бягомльскага музея народнай славы (1985–1989). Загадвае музеем СШ № 1 імя І.С. Палявога , кіраўнік суполкі «Спадчына» пры музеі СШ № 1.

Зацікавіўся краязнаўствам з 1973 г., калі пачаў вучыцца ў Полацкім педагагічным вучылішчы (цяпер Полацкі педкаледж імя Ф. Скарыны). Значны ўплыў аказаў дырэктар Пётр Купрыянавіч Пацэй. Асабліва вялікую ролю ў станаўленні як краязнаўцы аказаў выкладчык МДПІ Мікалай Рыгоравіч Гнеўка.

Займаецца комплексным вывучэннем Докшыччыны, аддаючы перавагу тэме Вялікай Айчыннай вайны ў краі. У часы дырэктарства ў музеі Бягомля больш сур'ёзна вымушаны быў займацца археалогіяй краю, паколькі трэба было ствараць новы, нераспрацаваны раздзел. Займаецца зборам этнаграфічнай спадчыны (шэраг матэрыялаў з вёсак Ваўкалата, Ветахмо, Гарадзішча, Дзегцяры, Калягі, Крукі, Макееўка).



Браў удзел у стварэнні экспазіцый музея Полацкага педвучылішча, абноўленай экспазіцыі Бягомльскага музея народнай славы, Музея імя І.С. Палявога СШ № 1 г. Докшыцы. Удзельнічаў у археалагічных экспедыцыях і разведках пад кіраўніцтвам Л.У. Дучыц, А.В. Квяткоўскай. Падтрымлівае кантакты з Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, ПДУ.

Браў удзел у стварэнні гісторыка-культурнай хронікі Докшыцкага раёна «Памяць». Аўтар шэрагу артыкулаў у мясцовым друку. Адзін з ініцыятараў усталявання мемарыяльнага знака на месцы спаленай фашыстамі вёскі Палоўкі.

Узнагароджаны медалямі «2000 год хрысціянству», «60 год Перамоге ў Вялікай Айчыннай вайне».

Тв.: У кнігу Памяці. Маладосць у подыху Кастрычніка // ЛТ. — 1990. — № 109. — С. 3; Радавы рэвалюцыі // Тамсама; Лёс камкора Лісоўскага // ЛТ. — 1990. — № 152. — С. 2; Шукальнікі слядоў мінулага // РВ. — 2005. — № 80. — С. 2.
Літ.: Чысцякова Т. Музей нашай гісторыі: Альбрэхт Адам ці Фабэр дзю Фар // РВ. — 1999. — № 44. — С. 3; Камінскі І.І. Краязнаўцы Докшыччыны // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Докшыцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 2004. — С. 652; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Грабоўскі Д.І. (26.05.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ГРАБОЎСКІ** С.К., гісторык. Аўтар дысертацыйнага даследавання «Борьба подпольщиков и партизан в Борисовско-Бегомльской зоне против немецко-фашистских оккупантов (июль 1941 – июнь 1944)».

Тв.: Борьба подпольщиков и партизан в Борисовско-Бегомльской зоне против немецко-фашистских оккупантов (июль 1941 – июнь 1944). — Мн.: Институт истории АН БССР. — [Б. м.], [б. г.].
Літ.: Міхнюк У.М. Доктарскія і кандыдацкія дысертацыі па гістарычных навуках у Рэспубліцы Беларусь (1991–2003 гг.): бібліягр. паказ. / У.М. Міхнюк. — Мінск: НАРБ, 2006. — 68 с. — С. 24.



**ГРАЧЫШНІКАВА** (Шыдлоўская) АЛЕНА ІВАНАЎНА (22.09.1956, в. Сар'я Дрысенскага раёна, цяпер Верхнядзвінскі раён), педагог, краязнаўца. Скончыла гіст. факультэт МДПІ (1979). Працавала ў Першамайскай СШ Лёзненскага раёна, СШ № 2 і № 1 г.п. Лёзна.

Краязнаўчую дзейнасць пачала ў 1995 г. Значны ўплыў на станаўленне як даследчыцы аказаў А.В. Куржалаў. Комплексна даследуе Лёзненшчыну, аддаючы перавагу турыстычна-краязнаўчаму кірунку і выхаванню патрыятызму на аснове турыстычнай працы. На працягу шэрагу гадоў вядзе гурток «Мая Лёзненшчына» ў СШ № 1 г.п. Лёзна. Атрыманыя ў выніку даследчай дзейнасці матэрыялы публікуе ў мясцовым перыядычным друку. Аўтар некалькіх буклетаў: «Край герояў, творцаў і вучоных», «Турыстычны маршрут па Лёзненшчыне», «Вядомыя мясціны Лёзненшчыны», «Турыстычна-краязнаўчы гурток "Мая Лёзненшчына"». З'яўлялася навуковым кіраўніком некалькі дзясяткаў вучняў, якія рыхтавалі рэфераты на краязнаўчыя тэмы.

Арганізавала некалькі краязнаўчых выстаў, этнаграфічны музей. Удзельнічала ў рэспубліканскіх краязнаўчых канферэнцыях, якія ладзіліся РЦДЮТЭ (1998–2000), рэспубліканскіх злётах краязнаўцаў (1998, 2000). На конкурсе «Ці ведаеце вы Віцебшчыну» члены гуртка пад кіраўніцтвам А.І. Грачышнікавай занялі II месца (1998). Аўтар зборніка «Выхаванне патрыятызму на аснове турыстычна-краязнаўчай працы» (2008).

У сваёй дзейнасці падтрымлівае стасункі з Лёзненскай раённай бібліятэкай, Лёзненскім ваенна-гістарычным музеем, ВААППДіП і іншымі ўстановамі. Перадала некаторыя матэрыялы ў Лёзненскі ваенна-гістарычны музей, Лёзненскую раённую бібліятэку, Музей народнай славы СШ № 1 г.п. Лёзна.

Ініцыятар усталявання помніка «У гонар незалежнай Беларусі» ў в. Пагосцішча Лёзненскага раёна, дзе ў 1863 г. быў разбіты атрад паўстанцаў пад кіраўніцтвам Ігната Будзіловіча.

Узнагароджана граматай Міністэрства адукацыі РБ (2007).

Тв.: З вопыту педагагічнай работы «Мая Лёзненшчына». — 1997. — 25 ліст. — С. 2; Да 135-годдзя паўстання Кастуся Каліноўскага // СП (Л). — 1998. — 12 верас. — С. 2; Наш зямляк — знакаміты навуковец // 1998. — 1 верас. — С. 2; «Мая Лёзненшчына» // СП (Л). — 1998; Школа мужнасці і загартоўкі // СП (Л). — 1998. — 4 жніўня. — С. 2; Царь Алексей Михайлович в Лиозно // СП (Л). — 1999. — 13 лют. — С. 2; Краяведы ў пошуку // СП (Л). — 2000; Руководитель подпольной группы // СП (Л). — 2005. — № 44. — С. 2.
Літ.: Манойла В. Краязнаўцы аб'ядналіся! // Спадчына (Л). — 2001. — № 2. — С. 1.

**ГРОМАЎ** ЯЎГЕН, краязнаўца. Скончыў СШ № 1 г. Пастаў. Вывучае чыгункі, у тым ліку і на Пастаўшчыне. Аўтар першага сайта ў Інтэрнэце пра Паставы pastavy.euro.ru, на якім размешчана інфармацыя пра горад, яго жыхароў, наваколле. Стварыў сайт пра чыгункі. Аўтар некалькіх артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Гісторыя Манькавіцкай царквы // ПК. — 2001. — № 12. — С. 2.
Літ.: Пракаповіч І. Краязнаўства: адкрыцці і знаходкі // ПК. — 2001. — № 60. — С. 4.

**ГРУЦА** АЛЯКСЕЙ ПЯТРОВІЧ (9.05.1924, в. Пішчыкі Дубровенскага раёна), філолаг. Кандыдат філал. навук (1958), доктар філал. навук (1969). Скончыў Дубровенскую СШ № 1 (1941), МДПІ імя М. Горкага (1951). Служыў ва УС СССР (1944–1947). Працаваў у школах Мінска (1951–1954), Інстытуце мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР (1957–1969), прафесар МДПІ. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР за калектыўную працу па беларускай лінгвагеаграфіі (1972–1983). Праводзіў даследаванні Дубровеншчыны.

Выдатнік Народнай асветы МА БССР.

Літ.: Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Дубровенскага раёна. Кн. 1. — Мн.: Паліграфафармленне, 1997. — С. 513.



**ГРЫБКО** ВІКТАР ВІЛЬГЕЛЬМАВІЧ (19.08.1963, г. Хабараўск, РСФСР), педагог, краязнаўца. Нарадзіўся ў сям'і ваеннаслужачага, карані якога паходзяць з Чэрвеньшчыны. У 1968 г. сям'я пераехала ў г. Рэчыцу Гомельскай вобл. Скончыў Рэчыцкую СШ (1980). З першага разу не паступіў у інстытут, таму год працаваў на метызным заводзе слесарам-рамонтнікам. Вучыўся ў МДПІ (1981–1986), працаваў настаўнікам у г. Рэчыцы (1986, 1988–1990), служыў ва УС СССР (1986–1988). З 1990 г. працуе настаўнікам англійскай мовы і гісторыі ў в. Іванск Чашніцкага раёна Віцебскай вобл.

Пад час вучобы ў МДПІ зацікавіўся археалогіяй. Удзельнічаў у археалагічных раскопках у г. Мсціславе (кіраўнік А.А. Трусаў), на Менскім гарадзішчы ў в. Гарадзішча (кіраўнік Г.В. Штыхаў). У час вучобы праявіў высокую нацыянальную і грамадзянскую пазіцыю ў дачыненні да роднай мовы, гісторыі Беларусі. Напрыклад, толькі ўдваіх з усяго факультэта, разам з Сагановічам Г., размаўлялі на беларускай мове.

З 1983 г. з'яўляўся байцом, а ў 1984 і 1985 гг. камандзірам будатрада камуністычнай працы «Нашчадкі», які працаваў на будаўніцтве Музея народнай архітэктуры і побыту Беларусі каля в. Строчыцы. Усе грошы, заробленыя атрадам, ішлі на закупку экспанатаў для будучага музея, а таксама пералічваліся ў дзіцячыя дамы і інтэрнаты. На аснове будатрада быў створаны фальклорна-этнаграфічны клуб «Нашчадкі» пры МДПІ, у які ўваходзіла нацыянальнасвядомая моладзь навучальнай установы. З'яўляўся адным з арганізатараў і кіраўнікоў клуба. На працягу дзейнасці аб'яднання браў удзел у арганізацыі вечарын, прысвечаных юбілеям славутых асоб Беларусі, сустрэч з паэтамі і пісьменнікамі Беларусі (А. Разанавым, А. Сысам, С. Сокалавым-Воюшам, А. Бембелем (Знічам), А. Глобусам і інш.), выпуску газеты. Разам з нефармальным гарадскім клубам «Майстроўня» (у той час яго ўзначальваў С. Дубавец) арганізоўваў правядзенне першых агульнагарадскіх нацыянальных свят: Гукання вясны, Купалля.

Вялікі ўплыў на ўзнікненне схільнасці да вывучэння гісторыі Беларусі ў цэлым і роднага краю ў прыватнасці аказаў выкладчык гісторыі Беларусі і методыкі выкладання гісторыі МДПІ Мікалай Рыгоравіч Гнеўка. Значную ролю ў далучэнні да актыўнай пошукавай краязнаўчай працы адыграў кіраўнік аддзела беларусазнаўства і краязнаўства ВЦППДіП А.В. Куржалаў праз запрашэнне да ўдзелу ў конкурсах і семінарах і метадычную дапамогу ў падрыхтоўцы прац.

Мэтанакіраваную краязнаўчую працу па вывучэнні мясцовасці пражывання (Чашніччыны, Іванскага краю) распачаў з 1993 г. Даследуе гісторыю вёсак Іванскага с/с, гісторыю рода Валадковічаў, вывучае культурныя і духоўныя помнікі краю. З першага году працы ў в. Іванск пачаў весці ў школе турыстычны гурток. З цягам часу паглыбіўся ў даследаванне гісторыі і культуры краю. Турыстычны гурток пераатварыўся ў краязнаўчы «Спадчына». У 2003 г. ён стаў пераможцам ІІІ этапа рэспубліканскай экспедыцыі «Наш край» у кірунку «Летапісанне родных мясцін».На аснове матэрыялаў, сабраных у краязнаўчых паходах і экспедыцыях, стварыў у Іванскай школе гісторыка-краязнаўчы музей (1996). Актыўна ўдзельнічае ў рэспубліканскіх і рэгіянальных краязнаўчых конкурсах, семінарах і канферэнцыях (з 1997).




Работа над летапісам роднай вёскі, а таксама шматгадовыя росшукі дазволілі атрымаць багаты і цікавы матэрыял, што прывяло да думкі аформіць назапашаны матэрыял у выглядзе праграмы гісторыка-краязнаўчага гуртка, а потым і кніжкі, прысвечанай гісторыі роднай вёскі і ваколіц. Гісторыка-краязнаўчы нарыс «Іванск» быў выдадзены ў выдавецтве «Пейто» у 2000 г. у серыі «Кропка на карце», заснаванай у 1998 г. У 2003 г., азнаёміўшыся з падручнікам «Мой родны край — Аршаншчына» і «Оршеведение», задумаў стварыць дапаможнік для краязнаўчага курса для школ Чашніцкага раёна. Падобны курс па гісторыі Чашніцкага краю, які называўся «Наша спадчына», ужо выкладаў на працягу некалькіх гадоў у Іванскай СШ. У 2004–2007 гг. была праведзена значная работа па ўдакладненні, напісанні, рэцэнзаванні, апрабацыі курса. У 2007 г. пры дапамозе Чашніцкага райвыканкама кніга «Наша Чашніччына» пабачыла свет.

Аўтар шэрагу публікацый у мясцовым і рэспубліканскім друку («Настаўніцкая газета», «Чырвоная змена», «Народнае слова», «Чырвоны прамень»).

Падтрымлівае кантакты з Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, Віцебскім абласным цэнтрам пазашкольнай працы, Чашніцкім краязнаўчым музеем.

Тв.: Кнігі: Іванск. — Мн.: Пейто, 2000. — 68 с.; Наша Чашніччына: Гістарычна-краязнаўчы курс «Чашніказнаўства». — Мн.: Медысонт, 2007. — 228 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Выкарыстанне матэрыялаў і публікацый дзяржаўных, ведамасных, сямейных архіваў пры вывучэнні гісторыі Іванскага краю // Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю: Матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаных 150-годдзю з дня нараджэння А.П.Сапунова. — Віцебск, 2001. — С. 155–158; Выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу ў выхаваўчай рабоце па патрыятычным і гуманістычным выхаванні навучэнцаў сельскіх школ // Пазашкольнае выхаванне. — 2003. — № 3.

Артыкулы ў перыядычным друку: Первый трактор // ЧП. — 2003. — 14 студз.; Я сын таго краю // ЧЗ. — 2000. — 13 студз.; Іванск // НС. — 2001. — 10 лют.; Следы Володковичей на Чашникской земле // ЧП. — 2002. — 19 кастр.; Известно о визите на Чашниччину Янки Купалы // ЧП. — 2003; Без мінулага няма будучыні: [В.В. Грыбко] // ЧП. — 2007. — № 107–108. — С. 1, 5.

Літ.: Міхно У. Свой сярод чужых: [В.В. Грыбко] // ЧП. — 2001. — № 14. — С. 2; Шпакоўская Г. Космас — назва якому краязнаўства // НС. — 2002. — 14 снеж. — С. 3; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Грыбко В.В. (25.11.2003) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Міхно У. Пусціце гісторыю на парог // НГ. — 2007. — 6 крас. — С. 11; Шпакоўская Г. Ведаць і шанаваць // НС. — 2007. — 13 ліст. — С. 5; Новае краязнаўчае выданне // НС. — 2007. — № 45. — С. 4; Грэчка І. Звяно ў бясконцым ланцугу // НГ. — 2008. — 12 ліп. — С. 11; Грэчка І. Захаваць пераемнасць // КГ. — 2008. — № 31. — С. 2.



**ГРЫНЕЎСКІ** ФЁДАР АЛЯКСЕЕВІЧ (12.06.1946, в. Вялікія Рагі Жлобінскага раёна Гомельскай вобл.), відэааматар. Скончыў Копыскую СШ Аршанскага раёна (1964), Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут (1969), мастацка-графічны факультэт ВДПІ (завочна, 1984). Працаваў механікам, майстрам, прарабам, ст. прарабам у ДБР 3 (1969, 1971–1979), начальнікам МСР–5 (1979–1980), прарэктарам па АГП, заг. лабараторыі ТСН, інжынерам (з 1980).

Аўтар шэрагу відэафільмаў, у якіх адлюстроўваецца гісторыя і культура Віцебшчыны: пра гарады і раёны Віцебскай вобл., школы, дзіцячыя садкі, пра мастакоў (Ф. Гумен, Л.С. Анцімонаў, А.Ф. Кавалёў, В.К. Зейлерт, І. Бароўскі), настаўнікаў (Пракоф'еў з Міёраў, Сенько з СШ № 25 г. Віцебска і інш.). Пэўны ўплыў на фарміраванне цікавасці да гісторыі роднага краю меў В.К. Зейлерт. Копіі фільмаў перадаў у ВАКМ, Літаратурны музей, Мастацкі музей. Фільмы дэманстраваліся на канферэнцыях, па рэгіянальным і рэспубліканскім тэлебачанні.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Грынеўскі С.С. (9.03.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ГРЫЦКЕВІЧ** ЛЕАНІД КАНСТАНЦІНАВІЧ (в. Красналукі Чашніцкага раёна), працаваў настаўнікам гісторыі ў Красналуцкай СШ Чашніцкага раёна. Збіраў матэрыялы па гісторыі наваколля, якія выкарыстоўваў на ўроках. Некаторыя матэрыялы выкарыстаны І. Торбінай пры напісанні артыкулаў па гісторыі краю.

Літ.: Торбина И. Махно из Краснолукских лесов: [1918] // ЧП. — 2003. — № 33–34. — С. 4.



**ГРЭБЕНЬ** ЯЎГЕН АЛЯКСАНДРАВІЧ (10.05.1977, г. Віцебск), гісторык. Кандыдат гіст. навук (2005), дацэнт (2008). Скончыў СШ № 3 г. Віцебска (1994), факультэт беларускай філалогіі і гісторыі ВДУ (2000), аспірантуру пры кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта БДУ (2001–2004). Працаваў выкладчыкам кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры ВДУ (2000–2001), выкладчыкам кафедры гісторыі, сусветнай і айчыннай культуры БНТУ (2003–2005), выкладчыкам, дацэнтам кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта БДУ (2003–2009), дацэнтам кафедры гісторыі і беларусазнаўства МДЛУ (2006–2009), выкладчыкам, ст. выкладчыкам, дацэнтам БДАТУ (2003–2005). З 22.09. 2009 г. выконвае абавязкі заг. кафедры філасофіі і гісторыі БДАТУ.

Займаецца даследаваннямі лакальнай гісторыі часоў нацысцкай акупацыі Беларусі. Сабраў вялізную базу аўдыё- і відэаматэрыялаў з успамінамі мясцовых жыхароў пра падзеі 1941–1944 гг. Значную частку складаюць запісы з Віцебшчыны. Абараніў дысертацыю «Привлечение нацистской Германией граждан Беларуси на принудительные работы (1941–1944 гг.)» (2005), у якой выкарыстаны матэрыялы з Віцебшчыны.

Удзельнік шэрагу міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных канферэнцый, на якіх выступае з паведамленнямі на рэгіянальную тэматыку. Аўтар артыкулаў, змешчаных у кнігах, матэрыялах навуковых канферэнцый, часопісах, перыядычных выданнях, кнізе «Памяць» г. Віцебска.

Тв.: Артыкулы ў кнігах: На нямецкай катарзе / Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 1. — Мн.: БелЭН, 2002. —С. 451–453; Віцебскае Прыдзвінне ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Акупацыйны рэжым // Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І.А. Абрамава [і інш.]; уклад. М.В. Півавар. — Мн.: Паркус плюс, 2008. — С. 129–135.

Артыкулы ў навуковым друку: (разам з М. Пішчулёнкам) Жители Витебщины на принудительных работах в Германии // Веснік ВДУ. — 1999. — № 1. — С. 9–12; Использование немецкими оккупационными властями трудовых резервов Беларуси (1941–1944) // Веснік ВДУ. — 2003. — № 1. — С. 11–17; Русская освободительная народная армия Каминского на Лепельщине в 1943–1944 гг. // Лепельскія чытанні: Другая навукова-практычная канферэнцыя: зборнік дакладаў / склад. А.У. Стэльмах. — Лепель, 2006. — С. 56–59; Судебная система на оккупированной территории Беларуси 1941–1944 гг. (на примере суда Зубовской волости Оршанского района) // Беларусь і Германія: Гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнарод. навук. канф., Мінск, 26 красавіка 2007 г. — Мн.: МДЛУ, 2007. — С. 107–111; Некоторые аспекты жизни и быта населения Москаленятской волости Городокского района под немецкой оккупацией (1941–1943 гг.) // Гарадоччына ўчора, сёння, заўтра: матэрыялы І Гарадоцкіх краязнаўчых чытанняў, 26 кастрычніка 2007. — Гарадок, 2008. — С. 68–74; Судебная система на Лепельщине в годы нацистской оккупации (1942–1944 гг.) // ІІІ Лепельскія чытанні: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, 10 кастрычніка 2008 года. — Лепель, 2008. — С. 88–93; Предпринимательская деятельность жителей г. Витебска в период немецкой оккупации (1941–1943 гг.) // Vesture: avoti un cilveki. Proceedings of the 17th International Scientific. Readings of the Faculty of Humanities. — History XI. — Daugavpils: Saule, 2009. — С. 108–115; Алкоголь в жизни белорусского общества в период нацистской оккупации // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 18–19 чэрвеня 2009 г. / ВДУ; рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. — Віцебск: ВДУ, 2009. — С. 81–87; (разам з Д.А. Аляхновічам) Беларусь–Латгалия: Холокост по обе стороны границы // Тамсама. — С. 38–43; На границе с Латгалией. Стратегия выживания населения Браславщины в период немецкой оккупации (1941–1944 гг.) // Vesture: avoti un cilveki. XIX zinatniskie lasijumi. Vesture XIII. — Daugavpils: Saule, 2010. — С. 71–79.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Грэбень Я.А. (21.02.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.


ВИТЕБСКИЙ ОБЛАСТНОЙ КРАЕВЕДЧЕСКИЙ МУЗЕЙ
Кандидат исторических наук
Г. ГРЕЧКИН.
БОРЬБА ЗА УСТАНОВЛЕНИЕ
СОВЕТСКОЙ ВЛАСТИ
В ВИТЕБСКОЙ ГУБЕРНИИ
ВИТЕБСК
1958

**ГРЭЧКІН** Г., гісторык. Кандыдат гіст. навук. Аўтар кніг «Борьба за установление советской власти в Витебской губернии», выдадзенай ВАКМ (1958), у якой з марксісцкіх пазіцый разглядаецца грамадска-палітычнае жыццё горада з лютага (лютаўскай рэвалюцыі) да канца 1917 г. У сваім даследаванні аўтар на матэрыялах перыядычнага друку (49 спасылак), дакументах, змешчаных у зборніках дакументаў (25), матэрыялах архіваў СССР (15), ДАВВ (13 спасылак) аналізуе падзеі грамадска-палітычнага жыцця Віцебска.

Тв.: Борьба за установление советской власти в Витебской губернии. — Витебск: ВОУТ, 1958. — 72 с.



**ГУСЕЙНАВА** ТАМЕЛА ІБРАГІМАЎНА (5.03.1984, Віцебск), педагог. Скончыла гіст. факультэт ВДУ (2006). Працавала ў Дашкольнай адукацыйнай установе № 6 (з 2006). Займацца даследаваннямі Віцебшчыны пачала ў час вучобы ў ВНУ пад уплывам выкладчыка А.М. Дулава. Даследуе крыніцазнаўства гісторыі Віцебшчыны. На кафедры гісторыі Беларусі абараніла дыпломную працу «Памятные книжки Витебской губернии как исторический источник».

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Гусейнава Т.І. (27.09.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ГУТНІКАЎ** ІГАР МІКАЛАЕВІЧ (30.10.1960, г. Орша Віцебскай вобл.), педагог, краязнаўца. Скончыў гіст. факультэт МДПІ (1982). Працаваў выкладчыкам грамадазнаўства ў вучылішчы № 29 г. Віцебска (1982–1983), сакратаром камітэта ЛКСМБ вучылішча № 29 (1983–1985), кіраўніком лектарскай групы Віцебскага абкама ЛКСМБ (1985–1988), заг. кабінета грамадскіх навук Віцебскага ветэрынарнага інстытута (1988–1992), настаўнікам гісторыі СШ № 37 г. Віцебска (1992–2000), кіраўніком гуртка ваенна-гістарычнага краязнаўства (2000–2009), настаўнікам гісторыі ў СШ № 43 г. Віцебска (з 2009).

Даследуе ваенную гісторыю Беларусі і Віцебшчыны, пераважна перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Займацца даследаваннямі пачаў у 2000 г. пад уплывам Л.Н. Бруевай. Разам з інш. членамі асацыяцыі «Пошук» стварыў спіс злучэнняў і часцей РККА, якія ўдзельнічалі ў баях на Беларусі ў 1941 г. Браў удзел падрыхтоўцы тэлеперадачы з цыкла «Цена Победы», прысвечанай вызваленню г. Віцебска (2009). Удзельнічаў у стварэнні мемарыяльнага музея імя М.П. Шмырова ў СШ № 43 г. Віцебска.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Гутнікаў І.М. (2.10.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ДАНІЛАЎ** ІВАН СЯРГЕЕВІЧ (†), педагог. Працаваў дырэктарам школы, у пасялковым савеце на Гарадоччыне. У другой палове XX ст. ладзіў турыстычна-краязнаўчыя вандроўкі. прычыніўся да стварэння школьнага музею у г.п. Езярышча Гарадоцкага раёна. Заслужаны настаўнік БССР (1965).

Літ.: Матэрыялы Гарадоцкага раённага гісторыка-краязнаўчага музея.



**ДАНЬКО** ЛЕЎ ФЁДАРАВІЧ (29.07.1969, г. Полацк), краязнаўца, выдавец. Скончыў СШ № 3 г. Полацка (1986), гіст. факультэт БДУ (1993). Працаваў навуковым супрацоўнікам у ПКМ (1986–1994), выкладчыкам ПДУ і дырэктарам Музея гісторыі ПДУ (1994–1995), гал. рэдактарам выдавецкага аддзела МПКП «Дыяна» (1994–2001), індывідуальным прадпрымальнікам.

З самага дзяцінства зацікавіўся гісторыяй роднага краю. Гэтаму спрыяла атмасфера ў сям'і: вялікая бібліятэка, сямейныя паданні, расповеды маці, нумізматычная калекцыя бацькі, успаміны бацькі аб мінулай вайне, якую прайшоў ад Зах. Еўропы да Манжурыі. Школьнікам прачытаў кнігі, якія вызначылі пазнейшыя зацікаўленнасці: «О чём рассказывают монеты» В.Н. Рабцэвіча і «Полацк» Г.В. Штыхава. Займаецца комплексным даследаваннем Полаччыны, аддаючы перавагу асобным пытанням царкоўнага краязнаўства, археалогіі Полацка, нумізматыцы, вывучэнню каменных крыжоў, культавых камянёў, выдавецкай дзейнасці. Мае шырокую эрудыцыю, валодае добрым пачуццём мовы.




У час працы ў ПДУ стаў адным з арганізатараў гістарычнага клуба, пазней гісторыка-культурнага таварыства «Полацкі рубеж», якое існаваоа пры Музеі гісторыі ПДУ (1994–1997) і аб'ядноўвала студэнтаў першага набору гістарычнага факультэта ПДУ (1994). У час працы ў ПКМ браў удзел у навукова-практычных канферэнцыях (1987, 1992). Стаў рэдактарам і выдаўцом гісторыка-культурнага альманаха «Полацкі летапісец» (выйшла 2 нумары: 1992, 1993). Змясціў у іх некалькі сваіх артыкулаў, а таксама надрукаваў успаміны палачаніна Міхаіла Андрэеева, прысвечаныя пошукам падземных хадоў у Полацку. Выдаў 3 кнігі ў серыі «Бібліятэка "Полацкага летапісца"»: Д.М. Володихин «Спорные вопросы истории Белой Руси» (1997), А.П. Сапунов «Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке» (1997), В.В. Новодворский «О взятии Полоцка войсками Стефана Батория в 1579 г.» (1997). З'яўляецца навуковым рэдактарам серыі «Наследие Полоцкой земли» (з 2004) і аўтарам прадмоў і каментарыяў да выданняў, выдаўцамі якіх з'яўляюцца А.І. Суднік і А.М. Супрановіч. Выйшла 6 кніг серыі. Гісторык-кансультант пры выдавецкай групе пры Полацкім Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры.

Тв.: История Полоцка и его уделов конца XII – первой четверти XIII вв. по «Хронике Ливонии» Генриха Латвийского // Полоцкий летописец: историко-литературный журнал. — № 1. — Полоцк: Полацкая друкарня імя Ф. Скарыны, 1992. — С. 33–36; Краткая история Полоцкой градской церкви Покрова Пресвятыя Богородицы // Тамсама. — С. 82–86; Иезуиты в Полоцке: 1580–1820 гг.: в 2 ч. Ч.1 /сост., примеч. и вступ. ст. Л.Ф. Данько, А.И. Судник. — Полоцк: А.И. Судник, 2005. — 40 с.

Літ.: Арлоў У. Таямніцы Полацкай гісторыі. — 2-е выд. — Мн.: Полымя, 2002. — С. 202; Інтэрв'ю з Л.Ф. Данько (21.11.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ДАРАФЕЕНКА** МІКАЛАЙ УЛАДЗІМІРАВІЧ (21.01.1923, в.Заверына Лёзненскага раёна), журналіст. Член Саюза журналістаў Беларусі. Вучыўся ў Віцебскім аэраклубе. Скончыў Чарнігаўскую авіяцыйную школу пілотаў, Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС. Працаваў літсупрацоўнікам, загадчыкам аддзела культуры і быту ў рэдакцыі газеты «Віцебскі рабочы», загадчыкам сектара друку аддзела прапаганды і агітацыі Віцебскага абкама КПБ, памочнікам сакратара абкама партыі, другім сакратаром Першамайскага райкама КПБ, старшынёй Чыгуначнага райвыканкама, намеснікам старшыні камітэта па радыёвяшчанні і тэлебачанні Віцебскага аблвыканкама, старшынёй камітэта па радыёвяшчанні і тэлебачанні Віцебскага аблвыканкама. Працаваў рэдактарам газеты «Віцебскі рабочы» (1970–1983), узначальваў абласную журналісцкую арганізацыю. Заслужаны работнік культуры БССР.



Разам з жонкай Н.І. Дарафеенка займаўся вывучэннем дзейнасці віцебскага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Адзін з аўтараў кнігі «Віцебскае падполле», нарысаў па гісторыі Віцебска.

Тв.: (разам з М.І. Пахомавым, Н.І. Дарафеенка) Витебское подполье. — Мн.: Беларусь, 1974. — 248 с.; «Віцебскі рабочы» // ЭЛіМБ. — Мн.: БелСЭ, 1985. — Т. 2. — С. 658.

Літ.: Скапа У. Дзве камандзіроўкі // «Віцебскі рабочы» — 80 лет / рэд.-склад. У.Р. Скапа. — Віцебск, 1997. — С. 140–144; Скапа У. Вернасць прызванню // ВР. — 1998. — 21 студз. — С. 3.

**ДАРАФЕЕНКА** (Маісеева) НІНА ІВАНАЎНА (10.01.1923, в. Уласава Суражскага раёна Віцебскай вобл., цяпер Віцебскі раён). Кандыдат гіст. навук (1968), дацэнт (1971). Скончыла шасцімесячныя педагагічныя курсы ў Віцебску (1941), гіст. факультэт Пермскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (1949), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1956). Удзельніца патрыятычнага падполля і партыз. руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны.



Працавала ў школах Суражскага раёна (1944), другім сакратаром райкама камсамола (1945–1947), інспектарам Віцебскага аблана (1948–1950), інструктарам Віцебскага абкама партыі (1950–1952), загадчыкам кабінета грамадскіх навук Віцебскага медінстытута (1952–1962), выкладчыкам у ВДПІ, на кафедры гісторыі і эканамічнай тэорыі (1962–1980).

Даследуе гісторыю партыз. і падпольнага руху супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Віцебшчыны. Абараніла кандыдацкую дысертацыю па гісторыі і дзейнасці віцебскага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1967), на аснове якой быў зацверджаны спіс віцебскага падполля. Працавала ў архіве, правяла апытанне і інтэрв'юіраванне некалькіх соцень чалавек, сабрала ўспаміны. На аснове сабраных матэрыялаў напісала кнігу (разам з М.І. Пахомавым і М.І. Дарафеенкам) «Витебское подполье». Дзякуючы вялікай пошукавай працы была падрыхтавана і выдадзена таксама кніга «Юные герои Витебщины», прысвечаная падлеткам і юнакам Віцебшчыны – удзельнікам антыфашысцкага супраціву. Аўтар матэрыялаў, змешчаных у Беларускай савецкай энцыклапедыі, навуковым і перыядычным друку.




Брала ўдзел у падрыхтоўцы экспазіцый ВАКМ, прысвечаных гісторыі партыз. руху на Віцебшчыне. Выступала з лекцыямі «Працоўныя Віцебска і Віцебскай вобл. у гады Вялікай Айчыннай вайны».

Мае вялікую ненадрукаваную працу, прысвечаную гісторыі Віцебскай абласной арганізацыі ЛКСМБ.

Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «Партызану Айчыннай вайны» I ступені і інш. Заслужаны работнік вышэйшай школы БССР (1978).

Тв.: Кнігі: (разам з М.І. Пахомавым, М.І. Дарафеенкам) Витебское подполье. — Мн.: Беларусь, 1974. — 248 с.; (разам з У.Г. Скапа, Т.І. Глінкам, Г.М. Акенцьевым) Юные герои Витебщины. — Мн.: Народная асвета, 1980. — 127 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Витебская областная партийная организация в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941–1945) // Тезисы докладов научно-теоретической конференции на тему «История Витебской областной организации: традиции и преемственность». — Витебск, 1988. — С. 25–33; Аб Веры Харужай — новае слова // Политический собеседник. — 2001. — № 5 (6); Аб Веры Харужай — новае слова // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 18–19 чэрвеня 2009 г. / ВДУ; рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. — Віцебск: ВДУ, 2009. — С. 110–117; Из глубин далеких лет: [унія] // ВР. — 2000. — № 130. — С. 2.

Літ.: Дарафеенка Н.І. // ЭГБ. Т. 3. — Мн., 1996. — С. 208; Звязаны лёсам // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебск: у 2-х кн. — Мн.: БелЭн, 2002. — Кн. 1. — С. 553; Константинова Н. Живите долго, Нина Ивановна! // ЖП. — 2008. — № 2. — С. 2; Кухарева В.Т. Из Суража в науку: [Н. Дорофеенко] // ЖП. — 2008. — № 8. — С. 2; Дулаў А.М. Н.І. Дарафеенка — удзельніца руху супраціўлення і даследчыца Віцебскага падполля // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 18–19 чэрвеня 2009 г. / ВДУ; рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. — Віцебск: ВДУ, 2009. — С. 117–129.



**ДАРАФЕЕЎ** АНАТОЛЬ МАКСІМАВІЧ (10.08.1941, в. Верамеева Першамайскага с/с Гарадоцкага раёна Віцебскай вобл. – 29.07. 2010), педагог, эколаг, краязнаўца. Ганаровы член Педагагічнага таварыства РБ, ганаровы член Беларускага таварыства аховы прыроды (1979, 1991), ганаровы член ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (2000). Кандыдат біялагічных навук (1972), дацэнт (1973), акадэмік-заснавальнік Міжнароднай акадэміі экалогіі (1992), правадзейны член Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі (1994), член-карэспандэнт Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў (1994), член-карэспандэнт Беларускай інжынернай акадэміі (1994), правадзейны член Маскоўскага таварыства выпрабавальнікаў прыроды, РГТ.

Скончыў біёлага-хімічны факультэт ВДПІ (1964, з адзнакай). Працаваў выкладчыкам, прарэктарам па навуковай рабоце, загадчыкам кафедры экалогіі ВДПІ (1964–1990), старшынёй Дзяржкамітэта РБ па экалогіі, міністрам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя РБ (1990–1994), першым прарэктарам (1994–2002), загадчыкам кафедры экалогіі і аховы прыроды ВДУ (2002–2010).

Працаваў над вывучэннем наземных пазваночных Беларускага Паазер'я (фауна, экалогія, выкарыстанне, ахова). Матэрыялы даследаванняў пакладзены ў аснову артыкулаў для Чырвонай кнігі БССР (1-е і 2-е выданні).

Краязнаўчую дзейнасць распачаў, калі быў студэнтам педінстытута. Вялікі ўплыў на фарміраванне поглядаў і цікавасці да краязнаўчых даследаванняў меў загадчык кафедры заалогіі ВДПІ Анатоль Іванавіч Радкевіч. Праводзіў комплекснае вывучэнне Віцебшчыны, аддаючы перавагу некаторым пытанням прыродазнаўчага, літаратурнага, гістарычнага краязнаўства. Даследаваў становішча нацыянальных меншасцяў Віцебшчыны. Арганізатар справы па мемарыялізацыі мясцін, звязаных з жыццём і дзейнасцю выдатных землякоў — Я. Баршчэўскага, К. Вераніцына, Я.К. Мароза, П.М. Машэрава, палкоўніка У.М. Карпава і інш. Аказаў дапамогу ў стварэнні экспазіцыі аддзелаў прыроды і этнаграфіі ВАКМ, Гарадоцкага, Расонскага, Полацкага краязнаўчых музеяў. Актыўны ўдзельнік навуковага жыцця краіны. Арганізатар і удзельнік Міжнародных арніталагічных кангрэсаў, Усесаюзных, рэспубліканскіх заалагічных і арніталагічных канферэнцый. Ініцыятар і арганізатар правядзення літаратурна-краязнаўчых і навуковых міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных канферэнцый і чытанняў, прысвечаных Я. Баршчэўскаму, паэме «Тарас на Парнасе», Гарадоцкіх краязнаўчых чытанняў (2007) і іншых мерапрыемстваў. Ініцыятар і арганізатар правядзення шматлікіх прыродна-літаратурна-краязнаўчых экспедыцый па Віцебшчыне. Ініцыятар стварэння Нацыянальнага парка «Браслаўскія азёры», ландшафтных, паляўнічых, батанічных заказнікаў на Беларусі, і на Віцебшчыне ў прыватнасці.

Выдатны знаўца Віцебшчыны і наваколляў Віцебска. У 70–80-я гады ХХ ст. актыўна ўдзельнічаў у працы Віцебскага абласнога аддзялення БДТАПГіК. Дзякуючы яго намаганням быў захаваны для нашчадкаў помнік археалогіі — гарадзішча Буракова ў Гарадоцкім раёне, хоць і ў пашкоджаным стане. Даследаваў дзейнасць і лёс выдатных выпрабавальнікаў-віцяблян, калекцыі У.А. Плюшчэўскага-Плюшчыка.

Аўтар больш за 150 навуковых прац па арніталогіі, ахове прыроды і методыцы выкладання заалогіі, у тым ліку 7 кніг. Адказны рэдактар і ўкладальнік 10 зборнікаў, 2 прэс-рэлізаў. Аўтар некалькіх артыкулаў у кнізе «Памяць» Гарадоцкага раёна. Аўтар-укладальнік

і рэдактар зборніка «Гарадоччына ўчора, сёння, заўтра». Пакінуў больш за 120 сшыткаў дзённікавых запісаў. У рукапісах знаходзяцца дзённікі экалагічных назіранняў (1959–2009), «Акварэлі прыроды» (12 кніжак нарысаў аб прыродзе). У мясцовым і рэспубліканскім друку змяшчаліся шматлікія артыкулы, прысвечаныя экалогіі, гісторыі і культуры Віцебшчыны. Хатні бібліятэчны збор змяшчае больш за 5 тысяч тамоў. Шэраг матэрыялаў (кнігі, копіі артыкулаў, некаторыя калекцыі і інш.) перадаў у ВАКМ, Гарадоцкаму раённаму, Лепельскаму, Полацкаму, Расонскаму краязнаўчым музеям, экалагічнаму музею Краснапольскай СШ Расонскага раёна.

Узнагароджаны Граматай ВС БССР (1982), медалём «За працоўныя заслугі» (2001), нагрудным знакам «За выдатныя поспехі ў рабоце МВА СССР» (1979), срэбным медалём ВДНГ СССР (1988), памятным медалём Геаграфічнага таварыства «У гонар 100-годдзя акадэміка Я.П. Паўлоўскага» (1985), 2 медалямі МВА СССР «За поспехі ў арганізацыі навуковай работы студэнтаў» (1977, 1990). Выдатнік асветы СССР (1984), выдатнік вышэйшай школы СССР (1984), выдатнік народнай асветы БССР (1988).

Тв.: Артыкулы ў навуковым друку: Язэп Драздовіч на Гарадоччыне // Памяць: Гарадоцкі раён: Гісторыка-дакументальныя хроніка / укл. С.У. Садоўская. — Мн.: Беларусь, 2004. — С. 164–165; Гарадоцкая старонка з жыцця пісьменніка А. Пшчолкі // Тамсама. — С. 215–218; Палкоўнік артылерыі Каразееў Г.П. // Тамсама. — С. 416–417; Латышы на Городокщине // Беларусь і Латвія: Адміністрацыйнае, сацыянальна-эканамічнае і культурнае ўзаемадзеянне ў Дзвінскім рэгіёне: матэрыялы Міжнар. навук. канф «Разам на працягу стагоддзяў (беларуска-латышскія ўзаемадачыненні ў Дзвінскім рэгіёне)», Віцебск, 14–15 ліст. 2006 г. / пад рэд. Л. Хмяльніцкай. — Мн.: Тонпік, 2006. — С. 84–101; Гарадоччына ўчора, сёння, заўтра: матэрыялы І Гарадоцкіх краязнаўчых чытанняў, 28 кастрычніка 2007 г. / ГРКМ; А.М. Дарафееў (адк. рэдактар) [і інш.]. — Гарадок, 2008. — 151 с.

Артыкулы ў перыядычным друку: Новы заказнік на Браслаўшчыне: [воз. Снуды] // ВР. — 1985. — № 98. — С. 4; Вартаўнік прыроды: [У.А. Радкевіч] // ВР. — 1986. — № 130. — С. 4.

Літ.: Аўсіевіч М. Анатоль Дарафееў: Сусветны вопыт — здабытак агульны // РП. — 1992. — № 11–12. — С. 2–3; Казаннікаў А. А.М. Дарафееў: Выхаваць экалагічную культуру // РП. — 1993. — № 3. — С. 8–9; Дарафееў А.М. // ВДУ: Падзеі. Людзі. Лёсы \ пад рэд. А.У. Русецкага, А.М. Дарафеева. — Віцебск: ВДУ, 1998. — С. 98; Шпакоўская Г. Птушка шчасця жыве на Беларусі // ГВ. — 2001. — № 98. — С. 3; Птушка шчасця жыве ў Беларусі: [А.М. Дарафееў] // НС. — 2001. — № 137. — С. 5; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Дарафееў А.М. (27.11.2003) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ДЖУМАНТАЕВА** ТАМАРА АЛЯКСАНДРАЎНА (3.09.1959, г. Полацк), музейны работнік. Скончыла гіст. факультэт МДПІ (1983), Дзяржаўную акадэмію культуры (СПб, 1993). Працуе намеснікам па навуковай працы дырэктара Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Аўтар тэкста (разам з М.М. Ільніцкім) да фотаальбома «Полацк музейны», у якім асвятляецца гісторыя музейнага будаўніцтва ў Полацку на працягу XVIII–XXI стст., змяшчаюцца звесткі пра 11 музеяў, якія ўваходзяць у склад запаведніка. Абараніла кандыдацкую дысертацыю «Музеі Полацка ў культурнай прасторы горада» (2009, не зацверджана ВАК Беларусі). Укладальнік зборнікаў матэрыялаў навукова-практычных канферэнцый, праведзеных у НПГКМЗ, і аўтар артыкулаў у іх.




Тв.: Артыкулы ў навуковым друку: (разам з Г.В. Штыхавым, Л. Сяргеенкай) Полацк // ЭГБ. Т. 5. — Мн: БелЭн, 1999. — С. 518–522; Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік // ЭГБ. — Т. 5. — Мн: БелЭн, 1999. — С. 354–535; Краязнаўчы музей Полацка, пач. XX ст. – 70-я гады XX ст. // НПГКМЗ: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі па выніках навукова-даследчай работы ў 1999 г. — Полацк, 2000. — С. 15; Музей езуіцкага калегіума і кадэцкага корпуса // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Полацка. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 282–285; Полацк музейны: фотаальбом / аўт.-уклад. Т.А. Джумантаева, М.М. Ільніцкі. — Мн.: Беларусь, 2006. — 283 с.; Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі: па выніках навукова-даследчай работы ў 2007 г. / уклад. Т.А. Джумантаева. — Полацк: НПГКМЗ, 2008. — 120 с.

Артыкулы ў перыядычным друку: Вуліцы старажытнага Полацка // ПВ. — 1991. — № 115. — С. 3; Закон нашых продкаў: [500-годдзе Магдэбурскага права ў Полацку]; Нам засталася спадчыка // ПВ. — 2002. — № 75. — С. 3.



**ДЗЕВЯКОВІЧ** ЛАРЫСА ІВАНАЎНА (13.04.1951, г. Дрыса), краязнаўца, педагог. Скончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум (1970), гіст. факультэт БДУ (1979). Працавала бібліятэкарам у СШ № 2 г. Верхнядзвінска (1970–1978), настаўнікам гісторыі ў СШ № 2 г. Верхнядзвінска (з 1978). Кіраўнік краязнаўчага музея ў СШ № 2 г. Верхнядзвінска.

Пачала займацца літаратурным краязнаўствам пад час працы ў бібліятэцы. Працуючы настаўнікам гісторыі, прычынілася да аднаўлення экспазіцыі школьнага музея. Сабрала і афарміла шэраг матэрыялаў па вызваленні раёна ў часы Вялікай Айчыннай вайны (успаміны ветэранаў). «Старонкі гісторыі піянерскай арганізацыі СШ № 2», «Гісторыя камсамольскай арганізацыі школы», «Гісторыя дзейнасці Прошкаўскай падпольнай арганізацыі», пра былога дырэктара школы С.Р. Качонка і інш. Удзельнічае ў школьных, раённых і абласных навуковых канферэнцыях. У 1980–1990-я гг. пісала артыкулы ў раённую газету «Дзвінская праўда», прымеркаваныя да юбілеяў вядомых землякоў і падзей. Падрыхтавала матэрыялы па гісторыі школы СШ № 2 г. Верхнядзвінска.

Тв.: Яшчэ адно вядомае імя: [К. Ловін— арганізатар будаўніцтва Чалябінскага трактарнага завода] // ДзП. — 1998. — № 49–50. — С. 3; Цяжкі шлях рэвалюцыянера: [М.Л. Перлашкевіч] // ДзП. — 1998. — № 55. — С. 2.

Літ.: Сцежкамі памяці: [музей] // ДзП. — 1986. — № 25. — С. 2; На перадавой лініі // ДзП. — 1990. — № 69. — С. 2; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Дзевяковіч Л.І. (20.06.2007) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ДЗЕМІДОВІЧ** ІГАР СЛАВАМІРАВІЧ (*Ігар Летуценнік*) (22.12.1969, в. Жоўніца Шаркоўшчынскага раёна), краязнаўца, педагог. Скончыў гіст. факультэт БДПУ (1995). Працуе настаўнікам гісторыі ў Каўшэлеўскай БШ (з 1990). Краязнаўчую дзейнасць распачаў з 1992 г. са стварэння краязнаўчага музея ў Стральцоўскай БШ. Настаўнікам у краязнаўстве лічыць А.Э. Рачонак. Распрацоўвае тэмы: радавод Канаплянскіх, жыццё і дзейнасць Г. Цітовіча, гісторыю, культуру, прыродны свет мікрарэгіёна в. Каўшэлева. Адшукаў некалькі прац Я. Драздовіча: карціну «Сініцы», ляскі (выразаныя з дрэва палкі-посахі), якія перадаў у краязнаўчы музей у в. Германавічы. Прыняў удзел у стварэнні краязнаўчага музея ў Стральцоўскай БШ Шаркоўшчынскага раёна (1993), музея «Чалавек і прырода» ў Каўшэлеўскай БШ Шаркоўшчынскага раёна (2000). Удзельнічаў у некаторых канферэнцыях, напрыклад, прысвечаных 100-годдзю М. Гарэцкага (Мінск, 1993) і 200-годдзю паўстання Т. Касцюшкі (Мінск, 1994). Друкуе артыкулы ў мясцовым перыядычным друку, у прыватнасці, у газеце «Голас Радзімы» (артыкулы, прысвечаныя гісторыі Стральцоўскай школы, «Шалёнаму» каменю і інш.). Піша вершы. Выступае пад псеўданімам Ігар Летуценнік.

Тв.: Школа ў Гапонах // КР. — 1992. — № 80, 81.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Дземідовіч І.С. (10.03.2005) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ДЗІКАРАВА** АЛЁНА, Пражывае ў п. Асінторф Аршанскага раёна. Працуе загадчыцай бібліятэкі. Даследуе гісторыю пасёлка, жыццёвыя лёсы жыхароў. Аўтар артыкулаў у перыядычным друку на краязнаўчую тэматыку.

Тв.: І светлы вобраз душы: [А.І. Сцепанкоў] // ДнП. — 2001. — № 53. — С. 2; Людскія лёсы ў інтэр'еры гісторыі // ДнП. — 2001. — № 58. — С. 3; Не першыя, але… першапраходцы: [Асінторф] // ДнП. — 2002. — № 25. — С. 2; З верай, надзеяй, любоўю // ДнП. — 2002. — № 30. — С. 2; Красота Осинторфовского края: [7 цудаў Дубровеншчыны] // ДнП. — 2008. — № 28. — С. 2–3.

**ДЗМІТРЫЕЎ** ЮРЫЙ УСЕВАЛАДАВІЧ (*Д. Юр'еў*) (16.04.1941, г. Ленінград), краязнаўца. Скончыў Вышэйшую ваенную акадэмію сувязі (Ленінград, 1972). Служыў ва УС СССР (1961–1987), працаваў у Цэнтральным ваенна-марскім музеі г. Ленінграда, Лёзненскім ваенна-гістарычным музеі. Краязнаўчую дзейнасць распачаў пад час працы ў Лёзна. Даследуе гістарычнае мінулае Лёзна, асаблівую ўвагу надае вывучэнню гісторыі краю ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Падтрымлівае сувязі з Беларускім саюзам афіцэраў, Лёзненскай цэнтральнай бібліятэкай. Некаторыя матэрыялы друкуе ў раённай газеце «Сцяг перамогі».

Тв.: Полёт во времени над Лиозно // СП (Л). — 2001. — 30 чэрв. — С. 3; Один из первых: [Д.М. Корхін] // СП (Л). — 2001. — 2 чэрв. — С. 2; Имена в истории: [вуліцы Лёзна, названыя ў гонар вызваліцеляў] // СП (Л). — 2002. — № 79. — С. 2.



**ДЗЯДЗЕНКА** ДЗМІТРЫЙ ВІКТАРАВІЧ (17.10.1972, г. Орша), гісторык. Скончыў СШ № 16 г. Оршы (1989), філал. факультэт БДУ (1994). Працаваў карэктарам у газеце «Беларускі ўніверсітэт» (цяпер «Універсітэт») (1994–1997, 2000–2007), рэдактарам Галоўнай дырэкцыі Белдзяржтэлерадыёкампаніі (1997–2000).

Цікавіцца гісторыяй Оршы пачаў пад час вучобы ў школе. Першы артыкул на краязнаўчую тэматыку напісаў пад уплывам старэйшых сяброў-краязнаўцаў у пачатку 1990-х гг. У вялікай ступені сваім настаўнікам у краязнаўстве лічыць аршанскага краязнаўцу В.М. Сцяпанава. Займаецца вывучэннем шляхецкіх радаводаў, лёсамі ўраджэнцаў Оршы, літаратурнымі і фальклорнымі тэкстамі, звязанымі з Аршаншчынай. Супрацоўнічаў з Музеем славутых землякоў. Браў удзел у краязнаўчых чытаннях, якія ладзіліся ў Оршы. Аўтар артыкулаў, надрукаваных у кнізе «Памяць» Оршы і Аршанскага раёна, «Аршанскіх краязнаўчых зборніках», часопісах «Беларуская мінуўшчына», «Полымя», мясцовых перыядычных выданнях. Аўтар перакладаў з англійскай мовы артыкулаў, якія мелі дачыненне да гісторыі краю.

Тв.: Кнігі: Аршанская шляхта: [саматуж. выд.]. — Мн., 1996. — 64 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Мяцежны жнівень 1918-га // Аршанская мінуўшчына (Гісторыя Оршы ў друку). — Вып. 1 / уклад. Ю. Копцік. — Орша: Аршанская друкарня, 1997. — С. 71–77; Выхаванец аршанскіх езуітаў: [Ф. Дзержынскі] // Аршанская мінуўшчына (Гісторыя Оршы ў друку). — Вып. 1 / уклад. Ю. Копцік. — Орша: Аршанская друкарня, 1997. — Тамсама. — С. 104–105; Аршанская шляхта // Памяць: Гісторыка-культурная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 78–79; «Аршанскі зборнік» // Тамсама. — С. 94; «Вулканілась жыццё на рубяжы вякоў» // Тамсама. — С. 213–215; Самуэль Кміціч: рэальная асоба і літаратурны персанаж // Аршанскі краязнаўчы зборнік № 2. — Орша: Аршанская друкарня, 1997. — С. 18–27; Васіль Лужынскі і скасаванне уніі на Аршаншчыне // Тамсама. — С. 51–57; Ад «Маладняка» да «Узвышша» // Полымя. — 1996. — №1. — С. 273–292; Раман, забыты на стагодзьдзі: [прадмова да перакладу ўрыўкаў рамана «Гісторыя, альбо Праўдзівае апісаньне жыцьця сьвятых Варлаама і Іасафа»] // Культура. — 1996; Як Сапегі Оршай кіравалі // БМ. — 1996. — № 6. — С. 33–35; Аршанскае й Сенненскае паўстанні // Спадчына. — 1999. — № 4. — С. 108–117.

Артыкулы ў перыядычным друку: Аршанскае і Сенненскае паўстанні // — 1999. — № 4; «Аршанскі зборнік» // ЛП. — 1990. — № 67. — С. 3; Мяцежны жнівень 1918-га // АГ. — 1992. — № 95. — С. 3, 4; «Пацікавіцца сваім радаводам»: [ЗБШ, У. Вяроўкін-Шэлюта] // Выбар. — 1993. — № 5. — С. 2; Хто нашы продкі: [бел. шляхта] // АГ. — 1993. — № 6. — С. 4; Выхаванец аршанскіх езуітаў // АГ. — 1993. — № 96. — С. 3; Аршанская шляхта // АГ. — 1993. — № 106. — С. 3; Самуэль Кміціч — рэальная асоба і літаратурны персанаж // АГ. — 1996. — № 15. — С. 2; Манаскі бунт: [аб пераводзе Куцеінскага манастыра ў падпарадкаванне епархіі ў пач. XVIII ст.] // АГ. — 1996. — № 89. — С. 2; Таварыства Ісуса ў Воршы // АГ. — 1996. — № 120–122, 124; Аршанскае і Сенненскае паўстанні: [1918 г.] // АГ. — 1999. — № 4. — С. 2.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Дзядзенка Д.В. (9.11.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ДЗЯДЗІНКІН** АЛЯКСАНДР ЛЕАНІДАВІЧ (6.07.1978, г. Віцебск), педагог. Кандыдат гіст. навук (2004). Скончыў СШ № 37 г. Віцебска (1995), факультэт беларускай філалогіі і гісторыі ВДУ (2000), аспірантуру пры ВДУ (2003). Працаваў настаўнікам гісторыі ў Кіраўскай СШ Віцебскага раёна (1998–2000). З 2000 г. — на розных пасадах у ВДУ. Начальнік навукова-даследчага сектара (з 2010).

Краязнаўчую дзейнасць распачаў пры напісанні дыпломнай работы «Этнічныя працэсы на Віцебшчыне» (1999, кіраўнік В.У. Акуневіч), працягнуў пры напісанні кандыдацкай дысертацыі. Асноўныя тэмы даследаванняў: нацыянальныя меншасці на Віцебшчыне, нацыянальная палітыка савецкай улады. З 1999 г. удзельнічае ў навукова-практычных канферэнцыях, на якіх выступае з паведамленнямі, якія пераважна засноўваюцца на мясцовым (Віцебскім) матэрыяле. Браў удзел у падрыхтоўцы краязнаўчых нарысаў пра Віцебскі раён.

Тв.: (разам з В.У. Акуневічам) Этнакультурныя кантакты ў асяроддзі сумеснага пражывання беларускага і польскага этнасу на Віцебшчыне ў канцы XIX–XX ст. // Беларусь и Европа: взаимодействие культур. — Витебск: ВГУ, 2000. — С. 73–75; Этнічныя працэсы на Віцебшчыне ў канцы XIX – 20-я гады XX ст. // V Респу-

бликанская научная конференция студентов, магистрантов и аспирантов Республики Беларусь: материалы конференции: в 5 ч. Ч. 1. — Гродно, 2000. — С. 58–60; Культурна-асветніцкая дзейнасць органаў адукацыі Віцебскага губвыканкама ў адносінах да нацыянальных меншасцей // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы навуковай канферэнцыі. — Мн., 2001. — С. 199–201; Этнаканфесійны аспект палітыкі бальшавікоў на Віцебшчыне ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва (1920–1930-я) // Этносоциальные и конфессиональные процессы в трансформирующемся обществе: материалы международной научной конференции. — Гродна, 2001. — С. 26–29; Матэрыялы фондаў віцебскіх губкама РКП(б) і акружкама КП(б)Б як крыніца вывучэння нацыянальнай палітыкі // Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю: матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаныя 150-годдзю з дня нараджэння А.П. Сапунова. — Мн.; Віцебск, 2002. — С.85–87; «Беларускае пытанне» ў палітыцы Віцебскай губернскай арганізацыі РКП(б) // VI Республиканская научная конференция студентов и аспирантов Беларуси: тезисы докладов. Ч. II. — Витебск, 2002. — С. 11–13; Станаўленне сістэмы адукацыі нацыянальных меншасцей на Віцебшчыне, лістапад 1917 – сакавік 1924 гг. // История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур: материалы международной научно-теоретической конференции. — Витебск, 2003. — С. 159–160; (разам В.У. Акуневічам, А.М. Дулавым) З гісторыі Віцебскага ўніверсітэта // Веснік ВДУ. — 2003. — № 4. — С. 3–9; (разам з В.У. Акуневічам) Рэпрэсіі ў адносінах да нетытульных этнічных супольнасцей Беларусі як элемент нацыянальнай палітыкі савецкай улады: на прыкладзе Віцебшчыны канца 1920-х – 1930-х гадоў // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: Стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця: матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі: у 4 ч. Ч. 3. — Гродна: ГрДУ, 2003. — С. 142–145; Сацыяльна-эканамічная палітыка савецкай улады ў адносінах да яўрэяў у 1920-я гады: па матэрыялах Лепельшчыны // Раманаўскія чытанні: зборнік матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі. — Магілёў, 2004. — С. 22–24; Уключэнне ў склад Расійскай імперыі // Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І.А. Абрамава [і інш.]; аўт.-уклад. М.В. Півавар. — Мінск: Паркус-плюс, 2008. — С. 88–90; Падзеі вайны 1812 года // Тамсама. — С. 88–91; Мерапрыемствы савецкай ўлады ў галіне нацыянальнай палітыкі // Тамсама. — С. 112–114.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Дзядзінкін А.Л. (24.07.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ДЗЯДЗІНКІНА** СВЯТЛАНА (*Святлана Гук, С. Гук*), журналіст. Скончыла журфак БДУ. На працягу шэрагу гадоў вяла «Экалагічную старонку» ў газеце «Народнае слова». Аўтар шматлікіх артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку (часопісах «Родная прырода», «Дзеяслоў», газетах «Літаратура і мастацтва», «Віцебскі рабочы»), у якіх асвятляе пытанні навакольнага асяроддзя, гісторыі і культуры Віцебшчыны. Цяпер працуе ўласным карэспандэнтам «Народнай газеты» па Віцебскай вобл. (з 2006). Аўтар кнігі для дзяцей школьнага узросту «Бабраня на Бузянцы» пра Бярэзінскі біясферны запаведнік (2009).

Тв.: Артыкулы ў часопісах: На Лучосе // РП. — 1986. — № 6. — С. 3; Ці будзе жыць Чортава Барада? // РП. — 1989. — № 5. — С. 24–25; Па шляху продкаў // РП. — 1990. — № 5. — С. 32; Призраки Освейского озера // РП. — 2009. — № 12. — С. 22–23; Белыя вежы вольнага месца. Для блакітных караляў Браслаўскага краю Слабодка — самы бліскучы дыямент. // РП. — 2010. — № 3 — С. 17–20.

Артыкулы ў перыядычным друку: Берагі сярэбраныя, а дно залатое былі калісьці ў Заходняй Дзвіны. А сёння?: [стан ракі] // ВР. — 1987. — № 17. — С. 4; Настаўнік акадэміка: [М.Т. Варанецкі з Багушэўска] // ВР. — 1987. — № 39. — С. 4; «Нічыйная дуброва»: [Чортава барада] // ВР. — 1988. — № 182. — С. 4; Сотвори и не тронь: [В.А. Ламака, глыбоцкі дэндрасад] // НС. — 1992. — № 68. — С. 5; Земля родная должна стать территорией доверия: [V міжнародная канферэнцыя «Дзвіна-Даўгава»] // НС. — 1997. — № 133. — С. 4; Іванск // НС. — 1999. — № 6. — С. 2; Касцёл Святой Варвары // НС. — 1999. — № 125. — С. 5; Дерево памяти растет в старинном парке: [стан сядзіб Віцебшчыны] // НС. — 1999. — № 31. — С. 4; Да не иссякнет вода в кринице: [крыніцы Віцебшчыны] // НС. — 2001. — № 34. — С. 5; Узыходжанне на Парнас памяці: [Гарадоцкія чытанні] // НС. — 2001. — № 142. — С. 5; Пра што пісалі беларусы ў сваіх дыярыўшах?: [В. Таранеўскі] // НС. — 2002. — № 150. — С. 5; Целебный родник Барковщина // НС. — 2003. — № 33. — С. 5; В пойме Шевинки // НС. — 2003. — № 71. — С. 5; Защитим природу всем миром: [экалагічная канферэнцыя] // НС. — 2003. — № 143. — С. 5; Чертова борода и дорога // НС. — 2004. — № 32. — С. 6; Таямніцы пячоры каля возера Гінькова: [в. Празарокі] // НС. — 2005. — № 92. — С. 5; Жемчужины нашего края: [помнікі прыроды Глыбоччыны] // НС. — 2005. — № 98. — С. 4; Глыбоцкі край. Сапраўднае падарожжа аматараў таямнічага // ТиО. — 2005. № 39; Красный Бор обретает всемирную известность // НС. — 2006. — № 6. — С. 5; Загадкі пра песняроў у горадзе на Дзвіне // НГ. — 2007. — 3 ліст. — С. 1; Птушка шчасця гарадоцкіх майстроў // НГ. — 2008. — 1 сак. — С. IV; Каким будет герб Бегомля // Тамсама; Шукаем цуды ў сваёй Айчыне. Віцебская вобл. — край дзівосных адкрыццяў і чароўных гісторый // НГ. — 2008. — 29 крас. — С. IV; Салаўіны гай Валодзькавай гаспадаркі // Тамсама; Витебские татары: на языке своих предков… // НГ. — 2008. — 23 мая; Увесь Заронаўскі край — гэта цуд! // НГ. — 2008. — 9 ліп. — С. IV.; На Беларусі Бог жыве // НГ. — 2008. — 24 жніўня; Чаму Чарневічы не падаюць у дэмаграфічную яму // НГ — 2008. — 14 кастр. — С III; Колокол над 5-м полком // НГ. — 2008. — 12 ліст.; Чый летапіс цікавейшы? // НГ. — 2008. — 9 снеж. — С. 2; Карона для «Валадаркі азёр» // НГ. — 2009. — 25 крас.; О чем расскажет партизанская землянка // Тамсама; «Заборский фэст»: все только начинается» // НГ. — 2009. — 23 чэрв.; Моцная плынь часапісу. 7 цудаў Бешанковіцкага раёна // НГ. — 2009. — 3 чэрв.; Давно, мой любимый город, я тебя не видел. Тени замков на улицах Витебска…// НГ. — 2009. — 11 ліп.; Прыдзвінскае наваколле — хараство рук людскіх. 7 цудаў

Віцебскага раёна // НГ. — 2009. — 11 жніўня. — С. 15; Парнас для гарадоцкіх талентаў. 7 цудаў Гарадоцкага раёна.// НГ. — 2009. — 2 верас.; Глыбокі след у гісторыі. Глыбоцкі раён мае надзвычай цікавую гісторыю // НГ. — 2009. — 23 верас.; Святло сунічных бароў Лёзненскага памежжа // НГ. — 2009. — 2 снеж.; Сенсацыі з паверхні глебы: [В.А. Ермалёнак] // НГ. — 2009. — 17 снеж.; Рукапісы не гараць? Куды вядзе таямнічы след полацкіх рарытэтаў // НГ. — 2010. — 26 лют.

**ДЗЯНІСАЎ** АНТОН УЛАДЗІМІРАВІЧ, гісторык. Кандыдат гіст. навук (2008). Даследуе гісторыю краязнаўчага руху на Беларусі ў 1920–1930-я гг. Абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Краязнаўчы рух у БССР у 20–30-я гг. ХХ ст.». Аўтар шэрагу артыкулаў у навуковым і перыядычным друку па тэарэтычных пытаннях краязнаўства. Пэўная колькасць артыкулаў прысвечана Полаччыне, напрыклад, «Краязнаўства Полаччыны на старонках часопіса "Наш край"».

Тв.: Краязнаўчы рух у БССР у 20–30-я гг. ХХ ст.: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02; БДПУ. — Мінск, 2008. — 16 с.; Краязнаўства Полаччыны на старонках часопіса «Наш край» / А.У. Дзянісаў // Полымя. — 2007. — № 2. — С. 211–215; (разам з В.У. Скалабанам) Мікола Каспяровіч. Там, дзе тварыў Каганец // Полымя. — 2007. — № 3. — С. 190–198; Развіццё краязнаўчага руху ў БССР у 1920–1930-я гг. // БГЧ. — 2008. — № 4. — С. 24–32; Дзейнасць школьных краязнаўчых гурткоў у 1920-х гг. у БССР // Гісторыя: Праблемы выкладання. — 2008. — № 7. — С. 47–52; Полаччына на старонках краязнаўчага часопіса «Наш край» у 1920-я гг. // Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі. Да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея / уклад. В.Д. Краско. — Полацк: НПГКМЗ, 2008. — С. 57–65.



**ДЗЯРНОВІЧ** АЛЕГ ІВАНАВІЧ (19.08.1966, г. Мінск), гісторык. Кандыдат гіст. навук (2004). Скончыў гіст. факультэт БДУ (1990), аспірантуру Інстытута гісторыі НАН Беларусі (1991–1994). Працаваў археолагам у інстытуце «Белспецпраектрэстаўрацыя» (1990–1991), на пасадах малодшага навуковага супрацоўніка, навуковага супрацоўніка, старшага навуковага супрацоўніка ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі (з 1991). Стажыраваўся пры Варшаўскім універсітэце (1992, 2002, 2004), Вышэйшай школе сацыяльных даследаванняў (Парыж, 2005). Заснавальнік і гал. рэдактар навуковага альманаха «Metriciana: Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага» (з 2001).

Цікавіцца гісторыяй Віцебскага рэгіёна пачаў пад час навучання ва ўніверсітэце. Значны ўплыў аказаў прафесар М. Ткачоў. Асноўныя кірункі краязнаўчых росшукаў, якія тычацца Віцебшчыны: крыніцазнаўства гісторыі Віцебшчыны, зносіны Віцебска і Рыгі ў XIII–XVII стст., гісторыя адміністратыўна-тэрытарыяльнага падзелу і землеўладання на Віцебшчыне ў XIV–XVII ст., нонканфармізм у другой палове ХХ ст.

Актыўны ўдзельнік навуковага жыцця краіны. Браў удзел у некаторых канферэнцыях, прысвечаных гісторыі і культуры Віцебшчыны: Браслаўскія чытанні (Браслаў, 1997), V міжнародная канферэнцыя «Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі» (Полацк, 2007). Падтрымлівае добрыя стасункі з некаторымі арганізацыямі і ўстановамі Віцебшчыны, сярод якіх Браслаўскае гісторыка-краязнаўчае аб'яднанне, Нацыянальны полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, ВДУ.

Аўтар кніг, у якіх адлюстроўваецца гісторыя Паўночнай Беларусі: «Віцебска-Рыжскія акты XIII–XVII стст.» (2005), «Метрыка Вялікага княства Літоўскага: Кніга 560 (1542 год): Кніга перапісаў № 3» (2007), якая прысвечана дэмаркацыі мяжы паміж ВКЛ і Лівоніяй на тэрыторыі Браслаўскага пав. і Полацкага ваяводства ў 1542 г. Праблематыка нонканфармізму ў другой пал. ХХ ст., у тым ліку і на тэрыторыі Віцебшчыны, адлюстравана ў выданнях: «Дэмакратычная апазіцыя Беларусі: 1956–1991. Пэрсанажы і кантэкст» (1999), «Нонканфармізм у Беларусі: 1953–1985» (2004).

У стадыі падрыхтоўкі да выдання поўны корпус «Віцебска-Рыжскіх актаў XIII–XVII стст.»

Тв.: Кнігі: Віцебска-Рыжскія акты XIII–XVII ст.: Дагаворы і службовая карэспандэнцыя паміж органамі кіравання горада Віцебска і ганзейскага горада Рыгі (з былога комплекса Ruthenica Дзяржаўнага Гістарычнага Архіва Латвіі). Выпуск I: Дакументы гаспадарча-гандлёвыя, XV–XVI ст. / НАН Беларусі, Інстытут гісторыі. — Мн.: Athenaeum, 2005. — 88 с. (Athenaeum, Том XI); Метрыка Вялікага княства Літоўскага: Кніга 560 (1542 год): Кніга перапісаў № 3 (копія канца XVI ст.) / НАН Беларусі. Інстытут гісторыі; падр. А. І. Дзярновіч. — Мн.: Бел. навука, 2007. — 157 с.; Дэмакратычная апазыцыя Беларусі: 1956–1991. Пэрсанажы і кантэкст: даведнік / пад рэд. А. Дзярновіча. — Менск: АНГ, 1999; Нонканфармізм у Беларусі: 1953–1985: даведнік. Т. 1 / аўт.-уклад. А. Дзярновіч. — Мн.: Athenaeum, 2004. — 252 с. — (Athenaeum, Том IX; Калекцыя «Архіў Найноўшае Гісторыі»).

Артыкулы ў навуковым друку: Пачатак мяжы: Дэмаркацыя мяжы паміж Вялікім княствам Літоўскім і Лівоніяй на тэрыторыі Браслаўшчыны ў XV–XVI стст. // Браслаўскія чытанні: матэрыялы IV навукова-краязнаўчай канферэнцыі, 24–25 красавіка 1997 г. — Браслаў, 1997. — С. 74–76; Прызабытая публікацыя матэрыялаў Метрыкі ВКЛ [маскоўскія апісанні Полацкага ваяводства ў др. пал. XVI ст.] // Metriciana: Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага. Т. I. — Мн., 2001. — С. 145–151; Архіўны комплекс Moscowitica-Ruthenica (Дзяржаўны гістарычны архіў Латвіі) і яго важнасць для вывучэння гісторыі Беларусі // Сучасныя праблемы дакументазнаўства, архівазнаўства і археаграфіі: матэрыялы навук.-практ. канф., прысвеч. 85-годдзю Дзярж. архіўн. службы і 80-годдзю НАНБ, Мінск, 12 красавіка 2007 г. / Складальнікі В. С. Пазднякоў, П. П. Журкевіч. — Мн.: БелНДІДАС, 2007. — С. 168–174; Гарадская сядзіба Полацка XVII ст. (паводле інвентара з Радзівілаўскага архіва) // Тэзісы V Міжнароднай канферэнцыі «Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі» / уклад. Г. М. Раманенкава. — Полацк: НПГКМЗ, 2007. — С. 17–20; «Тубылец віцебскі»: новы дакумент з былога архіўнага комплекса Moscowitica-Ruthenica (Дзяржаўнага гістарычнага архіва Латвіі) // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 8. — Мн., 2007. — С. 199–206; Moscowitica-Ruthenica: Рижский архивный комплекс по истории Восточной и Центральной Европы XIII–XVII вв. // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы. Вып. 1. — Мн.: БГУ, 2008. — С. 20–26; [Рэцэнзія] Rohdewald, Stefan. Vom Polocker Venedig. — Stuttgart: Franz Steiner Verlag, 2005. — 604 s. (Родэвальд, Штэфан. Аб Полацкай Венецыі: Калектыўныя дзеянні сацыяльных групаў горада паміж Усходняй і Цэнтральнай Еўропай (Сярэднявечча, ранні Новы час, XIX ст. да 1914 г.): [крыніцы і штудыі па гісторыі Усходу Еўропы. Т. 70] // Commentarii Polocenses Historici = Полацкія гістарычныя запіскі. Т. III. — 2008. — С. 173–174; Цена обиды: Локальные пограничные конфликты в первой половине XVI в. и проблема измерения ущерба (по материалам Книги № 560 Метрики Великого Княжества Литовского) // Vēsture: avoti un cilvēki. XVII zinātniskie lasījumi. Vēsture XI / arb. red. H. Soms. — Daugavpils: Saule, 2009. — С. 91–96; Калі Полацак стаў Вэнэцыяй?: [Рэцэнзія на кнігу Ш. Родэвальда «Аб Полацкай Вэнэцыі» («Vom Polocker Venedig»), 2005 // НН. — 2008. — № 25. — С. 11; Дзярновіч А.І. Гарадская сядзіба Полацка XVII ст. (паводле інвентара з Радзівілаўскага архіва) // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы. — Полацк, 2009.

Літ.: Кто есть кто в Беларуси = Хто ёсць хто ў Беларусі = Who’s Who in Belarus, 1999. — М.: Универсиет, 1999. — С. 50–51; Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. Т. 1. — Мн.: БелЭн, 2005. — С. 589; Груша А. Віцебска-рыжскія акты і праблема іх выдання // БГА. — 2005. — Т. 12, сш. 1–2 (22–23). — С. 210–240; Рыбчонак С. Віцебск–Дзвіна–Рыга: Пачатак новага археаграфічнага праекта. Віцебска-Рыжскія акты XIII–XVII ст.: Дагаворы і службовая карэспандэнцыя паміж органамі кіравання горада Віцебска і ганзейскага горада Рыгі (з былога комплекса Ruthenica Дзяржаўнага Гістарычнага Архіва Латвіі) // Архіварыус. — 2006. — № 4. — С. 208–211; Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник / сост. Г.В. Корзенко. — Мн.: Бел. навука, 2007. — С. 94–95; Институт истории Национальной академии наук Беларуси в лицах (1929–2008 гг.): биобиблиографический справочник / Г. В. Корзенко [и др.]; НАН Беларуси, Ин-т истории. — Мн.: Бел. наука, 2008. — С. 158; Семянчук А. Беларуская Метрыкана // Białoruskie Zeszyty Historyczne. — 2008. — № 29. — S. 280–281; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Дзярновіч А.І. (5.03.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ДЗЯРНОВІЧ** СЯРГЕЙ (1974, г. Беразіно Мінскай вобл.), археолаг. Скончыў гіст. факультэт БДПУ (1996), аспірантуру Інстытута гісторыі НАН Беларусі па спецыяльнасці «Археалогія» (1999). Працуе ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі. Распрацоўвае праблему гісторыка-культурных узаемаадносін паміж насельніцтвам тэрыторыі сучаснай Беларусі і Скандынавіі пад час эпохі вікінгаў (IX – пач. XII ст.), даследуе археалагічныя помнікі Паазер’я.

Тв.: Паўночнаеўрапейскія старажытнасці з Браслаўскага Паазер’я ў кантэксце культурна-гістарычных працэсаў IX – пачатку XII ст. // Браслаўскія чытанні: матэрыялы VI навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 150-й гадавіне з дня нараджэння браслаўскага лекара, грамадскага дзеяча Станіслава Нарбута (1853–1926), 7–8 мая 2003 г. — Браслаў, 2003. — С. 27–29; Сувязі Полацка са Скандынавіяй у эпоху вікінгаў // БГЧ. — 2004. — № 4.

**ДРАБЫШЭЎСКІ** УЛАДЗІМІР ПАЎЛАВІЧ (20.07.1936, г.п. Ветрына Полацкага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыў гіст. факультэт МгДПІ (1959). Працаваў настаўнікам, намеснікам дырэктара, дырэктарам Зялёнкаўскай СШ Полацкага раёна (1959–2006).

Займаецца даследаваннем партыз. руху і гісторыяй народнай адукацыі на Полаччыне. Вывучаць родны край пачаў пад час працы ў школе. Пэўны ўплыў на дзейнасць аказаў М.А. Маніс. Стварыў у Зялёнкаўскай СШ Полацкага раёна Музей баявой славы. Бярэ ўдзел у рэгіянальных навуковых канферэнцыях. Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку («Полацкі веснік»).

Тв.: Тройчы ардэнаносец // СК. — 1988. — № 80. — С. 3; Хто памятае канферэнцыю: [гісторыя камсамольскай арганізацыі] // СК. — 1989. — № 120. — С. 2; Вернутыя з небыцця: [в. Юравічы] // ПВ. — 1994. — № 92. — С. 4.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Драбышэўскі У.П. (22.11.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ДРАЎНІЦКІ** ІВАН ПЯТРОВІЧ (6.05.1932, в. Гвоздавічы Свянцянскага пав. Віленскага ваяводства (цяпер Пастаўскі раён)), настаўнік, краязнаўца. Скончыў Пастаўскае педвучылішча, філал. факультэт МДПІ. Працаваў настаўнікам беларускай мовы Клюшчанскай школы (1952–1953), дырэктарам Маласырмежскай сямігодкі (1953–1954), дырэктарам Стаўпяняцкай школы (1956–1958), дырэктарам Куцькаўскай школы (1958–1992). Служыў у ВМФ СССР(1954–1956). З 1992 г. на пенсіі.

Краязнаўчую дзейнасць распачаў у 1960 г. у Камароўскай (Куцькаўскай) СШ Мядзельскага раёна Мінскай вобл. Вялікі ўплыў на краязнаўчую дзейнасць аказалі Іосіф Быхавец, Якаў Якубоўскі, Адам Мальдзіс. Комплексна даследуе Свіршчыну, Нальшаншчыну — край, які цяпер уваходзіць у склад Гродзенскай, Мінскай і Віцебскай (Пастаўшчына) абласцей. Распрацоўвае тэмы «Славутыя землякі», «Легенды і паданні краю», вывучае мікратапаніміку наваколляў. Зрабіў цікавыя вынаходкі. Доўгі час з’яўляўся кіраўніком клуба «Валошкі».




Аўтар артыкулаў для кніг «Памяць» Пастаўскага раёна. Мае артыкулы краязнаўчай тэматыцы ў часопісах «Куфэрак Віленшчыны», «Байрам», «Нашы карані», «Роднае слова» (урок-распрацоўка, прысвечаны літаратурнай карце Мядзельшчыны), «Праблемы выхавання». Друкуецца ў раённых газетах «Астравецкая праўда», «Нарачанская зара», «Пастаўскі край».

Аўтар кніг «Мая Віленшчына» (2004), «Мястэчка пры Полацкім тракце» (2005), «Касцёл у Канстанцінаве», у сааўтарстве «Пацеркі хваляў і сосен бурштын». Мае некалькі кніг у рукапісах: «Гісторыя вёскі Куцькі», «Мястэчка Свір», «Радавод Драўніцкіх».

Выдатнік асветы СССР, БССР. Узнагароджаны Ганаровай граматай ВС БССР.

Тв.: Кнігі: Мая Віленшчына. — Паставы: Сумежжа, 2004. — 60 с.; Мястэчка пры Полацкім тракце: [саматуж. выд.].

Артыкулы ў навуковым друку: Кавальскі Юзаф // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Пастаўскага раёна. — Мн.: БелТА, 2001. — С. 119–120; Ромер-Ахенкоўская Ганна // Тамсама. — С. 121; «Валошкі» Мядзельшчыны // Праблемы выхавання. — 2005. — № 1. — С. 21–23.

Артыкулы ў перыядычным друку: Наш знакаміты зямляк // ПК. — 1995. — № 51. — С. 3; Змагар за волю Іларыян Даноўскі // ПК. — 1995. — № 101. — С. 4; Была ў Казлоўшчыне такая школа // ПК. — 1996. — № 6. — С. 2; З роду Чаховічаў // ПК. — 1996. — № 61. — С. 3; Урач Юзаф Кавальскі // ПК. — 1996. — № 99. — С. 2; Мастак і патрыёт // ПК. — 1997. — № 8. — С. 3; Адам Міцкевіч і Пастаўшчына // ПК. — 1998. — № 65. — С. 2; Сябра Адама Міцкевіча // ПК. — 1998. — № 100. — С. 2; Камаі: легенды і гісторыя // ПК. — 2000. — № 46. — С. 2; Антыцарскія паўстанні на Віленшчыне // Нашы карані (Паставы). — 2003. — № 5. — С. 4–24; Яська Драўніцкі. Постаці нашай гісторыі // Нашы карані (Паставы). — 2003. — № 3. — С. 16–51; Яўрэі на Свіршчыне // Нашы карані (Паставы). — 2003. — № 9. — С. 4–14; Яська Драўніцкі. Мястэчка пры Полацкім тракце // Нашы карані (Паставы). — № 11; Кароткі водны шлях // Нашы карані (Паставы). — 2004. — № 15. — С. 53–54.

Літ.: Чарняўскі М. Нястомны шукальнік даўніны // ПК. — 1997. — № 32. — С. 2; Інтэрв’ю з І.П. Драўніцкім (24.02.2004) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ДРУЖКОВА** КСЕНІЯ (Кансуэла) ВАСІЛЬЕЎНА (*Эла, Кансуэла*) (4.04.1962, в. Нова-Аляксандраўка Віцебскага раёна), краязнаўца. Скончыла СШ № 2 г. Рагачова (1979), віцебскае культасветвучылішча (1981), вучылася ў Ленінградскім інстытуце культуры імя Н.К. Крупскай (1986–1988). Працавала ў Міжнародным доме самадзейнай творчасці, Віцебскім гарадскім доме культуры (1982–1992). Цяпер працуе экскурсаводам у ВАКМ (з 1992).

Даследаваць родны край пачала з прыходам на працу ў музей. Значны ўплыў зрабілі Д.Р. Газін і В.У. Голасаў. Займаецца пераважна вывучэннем культурнага жыцця Віцебшчыны, роляй асоб у гісторыі рэгіёну. Брала ўдзел у канферэнцыях «Дзвіна-Даўгава» (2008–2009).

Аўтар артыкулаў у перыядычным друку (часопісы «Беларуская думка, «Мастацтва», газеты «Культура», «Настаўніцкая газета», «Народнае слова», «Віцебскі рабочы», «Віцьбічы» «Жыццё Прыдзвіння», «Витебский проспект»), у якіх адлюстроўвае культурнае жыццё горада.

Тв.: У Караткевіч і Віцебск // ЖП. — 2001. — № 4. — С. 4; Гаспадыня дома Шагала // ВР. — 2001. — 7 ліп. — С. 6; «Милое» в немилости у времени // ВР. — 2004. — 2 кастр.; Интеллектуальный презент горожанам // ВР. — 2005. — № 106. — С. 4; Исследователь: [інт. з В. Шышанавым] // ВП. — 2005. — № 38. — С. 3; В Здравнево, к Репину // ЖП. — 2005. — № 68. — С. 3.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Дружкова К.В. (3.04.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.





**ДУК** ДЗЯНІС УЛАДЗІМІРАВІЧ (29.05.1977, г. Наваполацк), гісторык, археолаг. Кандыдат гіст. навук (2004), дацэнт (2006). Скончыў СШ № 6 у г. Новаполацку, гісторыка-філал. факультэт ПДУ (1999). Працуе выкладчыкам гістарычных дысцыплін у ПДУ (з 1999), загадчыкам кафедры гісторыі і сацыялогіі ПДУ (2005–2006), загадчыкам кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі ПДУ (з 2006).

Краязнаўчую дзейнасць распачаў з 1996 г. пад уплывам дзейнасці Г.В. Штыхава, С.В. Тарасава, А.А. Егарэйчанскага. Даследуе археалогію сярэднявечнай Полаччыны і Полацка часоў сярэднявечча і ранняга Новага часу. Штогод праводзіць археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Полацка і Полацкага, Расонскага, Верхнядзвінскага раёнаў. Справаздачы аб палявых археалагічных даследаваннях і наглядзе за правядзеннем будаўнічых работ у горадзе Полацку на працягу 2000–2008 гг. захоўваюцца ў архіве Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Калекцыі з раскопак г.п. Асвеі, г. Полацка, Полацкай акругі перадаў у НПГКМЗ.

Абараніў кандыдацкую дысертацыю «Матэрыяльная культура насельніцтва Полацка XVI–XVIII ст. (па выніках археалагічных даследаванняў)» (2004, навуковы кіраўнік Г.В. Штыхаў).

Актыўна ўдзельнічае ў навуковым жыцці краіны і Усходняй Еўропы (РФ, РП). Браў удзел у канферэнцыях «Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі» (з 2001), ва ўсіх штогадовых справаздачных канферэнцыях Інстытута гісторыі НАН Беларусі «Археалагічныя адкрыцці» (з 2003), іншых шматлікіх канферэнцыях. У сваёй дзейнасці актыўна супрацоўнічае з дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі і ўстановамі.

Тв.: Кнігі: Матэрыяльная культура насельніцтва Полацка XVI–XVIII стст. (па выніках археалагічнага вывучэння) / Аўтарэферат дыс. … кандыд. гіст. навук. — Мн., 2004. — 24 с.; Гісторыя Полацка: па матэрыялах археалагічных даследаванняў: вучэбна-метадычны комплекс для студ. спец. «Гісторыя Беларусі», «Гісторыя. Англійская мова». — Наваполацк: ПДУ, 2006. — 112 с.; Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада. — Наваполацк: ПДУ, 2007. — 268 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Паходжанне і ранняя гісторыя Полацка, VIII–X стст. // Материалы XXVIII студенческой научной конференции ПГУ. — Новополоцк: ПГУ, 1999. — С. 6–7; Полацкая каробчатая кафля XV – сярэдзіны XVI стст. // V Республиканская научная конференция студентов, аспирантов и магистрантов Республики Беларусь (НИРС-2000): мат. конф.: в 5 ч. Ч. 1. — Гродно: ГрГУ, 2000. — С. 124–128; Матэрыяльная культура гарадоў Беларусі ранняга Новага часу: адметнасці станаўлення і развіцця // Традиции и обычаи народов России и Беларуси: межд. конф., 23–25 мая 2001 г., г. Минск: доклады и сообщения: в 2 т. Т. 2 / науч. ред. и сост. Н.А. Лобанов. — Мн.: Изд-во МИУ, 2001. — С. 45–50; Аб прыналежнасці некаторых груп полацкай кафлі з геральдычнымі матывамі // Каштоўнасці мінуўшчыны – 4: Помнікі археалогіі: Праблемы аховы і вывучэння: матэрыялы канферэнцыі, Мінск, 23 лістапада 2000 г. / пад рэд С. Марцэлева. — Мн.: Лекцыя, 2001. — С. 108–119; Аб адным «паралельным» сюжэце полацкай і магілёўскай кафлі з выявамі рыцараў // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: зборнік навуковых прац / уклад. І.А. Пушкін. — Магілёў: Магілёўская ўзбуйнёная друкарня, 2001. — С. 47–51; Цеплыня ад цеплыні: дэкор полацкай кафлі XVII ст. // Мастацтва. — 2001. — № 5. — С. 42–46; Полацкая кафля і вера палачанаў // Спадчына. — 2001. — № 1–2. — С. 163–169; Полацкая кафля XIV – сярэдзіны XVI стст. // ГАЗ. — 2001. — № 16. — С. 167–173; Культурныя сувязі палачан (па выніках вывучэння пячной кафлі XIV–XVII стст.) // Матэрыялы міжнароднай навуковай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі да 75-годдзя Полацкага краязнаўчага музея, 18–19 мая 2001 г. / уклад. В.Д. Краско. — Полацк, 2001. — С. 33–37; (разам з В. Шайковым) Паходжанне і ранняя гісторыя Полацка (VIII–X стст.) // БГЧ. — 2001. — № 6. — С. 14–18; (разам з П.І. Мішыным) Семантыка некаторых выяў полацкай кафлі з анімалістычнымі матывамі // ГАЗ. — 2002. — № 17. — С. 236–240; Вывучэнне і ахова культурнага пласта гістарычнага цэнтра Полацка // Каштоўнасці мінуўшчыны – 6: Гістарычныя цэнтры гарадоў Беларусі: Праблемы і шляхі іх вырашэння: мат-лы канф., Мінск, 28 лістапада 2002 г. / пад агул. рэд. С. Марцэлева. — Мн.: Знамение, 2003. — С. 111–124; К вопросу о происхождении городов и государственности на территории Белорусского Подвинья // Славянскі свет: Міжэтнічныя адносіны на мяжы трэцяга тысячагоддзя: зб. матэрыялаў міжнар. навукова-практ. канф. студэнтаў і аспірантаў ВНУ, 16–17 лістапада 2001 г. / БрДУ. — Брэст: БрДУ, 2002. — С. 27–31; Археалагічны комплекс «Пабудова першай паловы XVI ст.» (па выніках раскопак 2001–2002 гг. на Вялікім пасадзе г. Полацка) // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі // Матэрыялы IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі. — Полацк: НПГКМЗ, 2003. — С. 88–106; Состояние, актуальные проблемы и перспективы развития археологии Полоцка // Тамсама. — С. 107–111; Полацкая керамічная вытворчасць XIV–XVI стст.: Усходнія і заходнія ўплывы // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця: матэрыялы рэспуб. навук. канф.: у 4 ч. Ч. 1 / пад. рэд. І.П. Крэня, С. І. Навіцкага, І.А. Змітровіча. — Гродна: ГрДУ, 2003. — С. 217–224; Матэрыялы да геральдычнай карты месцазнаходжання двароў полацкай шляхты XVI–XVII стст. // Герольд Litherland. Год II. — 2002. —

№ 3–4 (7–8). — С. 84–89; Полацкі дэкаратыўны посуд XVI–XVIII стст. // Вестник ПГУ. — 2002. — Т. 1. — № 4. — С. 34–40; Побыт і матэрыяльная культура палачан XVI–XVIII стст. // БГЧ. — 2004. — № 5. — С. 48–55; Раскопкі на Вялікім пасадзе Полацка ў 2002 г. // ГАЗ. — 2003. — № 18. — С. 280; Новые данные о находках в Полоцке предметов вооружения XIV–XVII вв. // Археология и история Пскова и Псковской земли: материалы 50-го научного семинара: сб. статей / под ред. В.В. Седова. — Псков, 2004. — С. 318–325; Шляхі пранікнення і распаўсюджвання культурна-стылістычных накірункаў у матэрыяльнай культуры насельніцтва Полацка ад пачатку XVI да канца XVII ст. // Сімяон Полацкі: Светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць: матэрыялы II Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 18–19 лістапада 2004 г. — Полацк: НПГКМЗ, 2005. — С. 45–57; (разам з А. Салаўёвым) Кожевенно-сапожное ремесло Полоцка XVI–XVIII вв. (по итогам археологического надзора на территории Великого посада в 2000–2002 гг.) // ГАЗ. — 2004. — № 19. — С. 241–250; Археалагічныя раскопкі і разведкі ў Полацку ў 2003 г. // ГАЗ. — 2004. — № 19. — С. 302–303; Да вынікаў археалагічнага нагляду за будаўнічымі работамі на тэрыторыі былога Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра ў Полацку ў 2003 г. // Тамсама. — С. 304; Феномен станаўлення дзяржаўнасці на землях полацкіх крывічоў (IX–XI стст.) // Спадчына. — 2003. — № 6. — С. 40–46; Побыт і матэрыяльная культура палачан XVI – першая палова XVII ст. // Рэфармацыя і грамадства, XVI стагоддзе: матэрыялы міжнар. навук. канф. / склад. С. Акінчыц; гал. рэд. А. Грыцкевіч. — Мн.: Бел. кнігазбор, 2005. С. 212–221; Да пытання гістарыяграфіі метадалогіі археалагічнага даследавання Беларусі ў XIX ст. // Вестник ПДУ. Серия А. Гуманитарные науки. — 2005. — № 7. — С. 31–39; (разам з С. Тарасавым) Да пытання тапаграфічнага развіцця Вялікага пасада Полацка ў XI ст. // ГАЗ. — 2005. — № 20. — С. 163–168; Унікальная знаходка з Полацка і керамічная чарнільніца з выявай князёў Барыса і Глеба // ГАЗ. — 2005. — № 20. — С. 186–189; Археалагічныя раскопкі ў Верхнядзвінскім і Расонскім раёнах // ГАЗ. — 2005. — № 20. — С. 243–244; Археалагічныя раскопкі на Запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка // ГАЗ. — 2005. — № 20. — С. 245–247; Большой пожар за две копейки // Родина. — 2006. — № 4. — С. 14–15; Лакалізацыя асобных тапаграфічных аб'ектаў Полацка XVI–XVII стст. // БГЧ. — 2006. — № 6. — С. 44–46; Камни из саги о Тидрике Бернском // Родина. — 2006. — № 10. — С. 44–46; Археалагічная разведка на Запалоцкім пасадзе Полацка ў 2003 г. // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. — № 11. — 2006. — С. 104–113; Да вынікаў археалагічных раскопак на Запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка ў 2004 г. // Археалагічны зборнік. Вып. 1 / Нац. музей гісторыі і культуры Беларусі; уклад. М.А. Плавінскі, В.М. Сідаровіч. — Мн.: Юніпак, 2006. — С. 52–57; Археалагічныя раскопкі і нагляд за будаўнічымі работамі ў Полацку ў 2005 г. // ГАЗ. — 2006. — № 21. — С. 211; (разам з М. Плавінскім) Аб полацкім некропалі X–XIII стст. // ГАЗ. — 2006. — Вып. 22. — С. 173–186; Палата, Запалоцце, Полацк — пачатак сярэдневяковага горада // БГЧ. — 2007. — № 3. — С. 33–36; Выратавальныя археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Вялікага пасада Полацка ў 2005 годзе // Вестник ПГУ. Серия А. Гуманитарные науки. — 2007. — № 1. — С. 2–15; (разам з А.А. Салаёўым) Новыя знаходкі рэнесанснай кафлі ў Полацку: Да пытання аб сацыятапаграфічнай структуры Запалоцкага пасада ў першай палове XVI ст. // Памятники эпохи железа и средневековья Беларуси. К 60-летию О.Н. Левко / Материалы по археологии Беларуси. — Мн.: Институт истории НАН Беларуси, 2007. — № 14. — С. 215–221; Святая София о седми версех // Родина. — 2007 — № 6 — С. 63–67; Древо жизни Полоцкого городища // Родина. — 2007. — № 10. — С. 37–39; Полацкае гарадзішча: міфы і рэаліі (па выніках археалагічных раскопак 2007 г.) // Тэзісы V міжнароднай канферэнцыі «Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі» / уклад. Г.М. Раманенкава. — Полацк: НПГКМЗ, 2007. — С. 21–23; Станаўленне Полацка ў IX–XIII стст. // БГЧ. — 2007. — № 11. — С. 25–31; Археалагічныя раскопкі ў горадзе Полацку і Полацкім раёне ў 2006 г. // ГАЗ. — 2007. — № 23. — С. 229–230; Величие и безвестие: Храмы Бельчицкого Борисоглебского монастыря в Полоцке // Родина. — 2008. — № 8. — С. 43–45; Старажытныя славяне полацкага гарадзішча, 780–1310 гг. // БГЧ. — 2008. — № 7; (разам з Філіпенкавай С. Б., Т.М. Глазырынай) Гісторыя станаўлення і развіцця ПДУ // ПДУ: Вытокі, гісторыя станаўлення і дзейнасць. Да 40-годдзя заснавання. — Наваполацк: ПДУ, 2008. — С. 6–36; The State, Actual Problems and Perspectives of Development of the Archeology of Polotsk // The Marine Archeology of the Baltic Sea Area (IV). — 2002. — P. 22–25; Duk D., Miszyna P. Ethnic Processes on the Territory of the Belarussian Dvina Region in the Condition of Transaction from Heatheism to Christianity // Ksipnga – Nauka – Wiara w jredniowiecznej Europie. — Poznaj: Wyd. PTPN, 2004. — S. 144–150.

Літ.: Корзенко Г.В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник. — Мн.: Бел. наука, 2007. — С. 103–104; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Дук Д.У. (18.09.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ДУК** ІВАН ПЯТРОВІЧ, педагог, краязнаўца. Скончыў двухгадовыя настаўніцкі інстытут пры ВДПІ, МДПІ. Працаваў настаўнікам гісторыі ў в. Іллюшына Ушацкага раёна. Збіраў матэрыялы па гісторыі, культуры, эканоміцы Ушаччыны. Праводзіў апытанні мясцовых жыхароў, працаваў у архіве. Меў вялікі прыватны архіў. Аказваў істотную дапамогу Ушацкаму музею народнай славы, перадаў у яго частку сабраных матэрыялаў. Дапамагаў прыватным асобам, якія займаліся высвятленнем лёсаў сваіх сваякоў, што загінулі на Ушаччыне ў часы Другой сусветнай вайны. Некаторыя матэрыялы надрукаваў у мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Ушачы — сто гадоў назад // ЧП. — 1991. — № 53. — С. С. 2; Мы жылі так, як падказвала сумленне // ЧП. — 1991. — № 56. — С. 3.

Літ.: Гісторык па прызванню // П.; Караленка В. Гісторыя нашага краю // П. — 1992. — № 82. — С. 2.

**ДУДАРАВА** ЛЮДМІЛА АЛЯКСЕЕЎНА (18.06.1970, в. Мардахі Дубровенскага раёна Віцебскай вобл.), скончыла Аршанскі механіка-тэхналагічны тэхнікум, факультэт бібліятэказнаўства і бібліяграфіі БДУК (2001). Працавала бібліятэкарам ў Мардашэвіцкай сельскай бібліятэцы, дырэктарам ЦБС Дубровенскага раёна. Цяпер працуе гал. спецыялістам аддзела культуры ў Дубровенскім райвыканкаме. Вывучае гісторыю в. Мардахі і навакольных населеных пунктаў, г. Дуброўна, Дубровенскага раёна, а таксама гісторыю бібліятэчнай справы ў краі. Збірае матэрыялы па гісторыі і культуры краю. Пры бібліятэцы стварыла этнаграфічны куток, у якім утрымліваліся прылады працы XIX ст., рэчы хатняга ўжытку, фотаздымкі, пісьмовыя крыніцы — усяго больш за 3 тысячы адзінак захоўвання. Не існуе ў сувязі з расфарміраваннем (2008).

Пазаштатны карэспандэнт раённай газеты «Дняпроўская праўда». Падрыхтавала і абараніла дыпломную работу «Дубровенскі край у раённай газеце “Дняпроўская праўда”» (2001). Выданне з’яўляецца навукова-дапаможным бібліяграфічным паказальнікам, у якім сабраны звесткі пра матэрыялы, што публікаваліся ў мясцовай газеце на працягу 32 гадоў. Даведнік мае 15 раздзелаў, а таксама паказальнік персаналій і геаграфічных назваў.

Тв.: «Малая Радзіма» ў кожнага свая: [мікратапонімы в. Баева] // ДнП. — 2001. — № 94. — С. 3; Вучыць быць патрыётам // ДнП. — 2001. — № 68. — С. 2, 3; Будзьце шчаслівы ўдвайне: [У.В. Айдукас] // ДнП. — 2004. — № 50–51. — С. 3; Ад родных вытокаў — да кожнага сэрца // ДнП. — 2004. — № 58. — С. 2; Энтузіяст сваёй справы: [Т.М. Васілеўская] // ДнП. — 2005. — № 75. — С. 2.

Літ.: Дубровенскі Л. Запаветная мара — стварыць музей: [Л.А. Дударава] // ДнП. — 1999. — 3 ліп. — С. 2–3; Кулакоў Ф. Арыентыр у моры публікацый: [рэц. дыпломнай работы Л. Дударавай «Дубровенскі край у раённай газеце “ДнП”»] // ДнП. — 2001. — № 58. — С. 2; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Дударава Л.А. (31.03.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ДУДАРАЎ** ЛЕАНІД ВАСІЛЬЕВІЧ (Л. Дубровенскі, Л. Васіллеў) (18.10.1947, г.п. Дуброўна), журналіст. Скончыў СШ № 1 г.п. Дуброўна (1966), вучыўся ў ВПШ пры ЦК КПБ (1978–1981). Служыў ва УС СССР (1966–1968). Працаваў у ПТВ № 35 г.п. Дуброўна (1968–1972), рэдакцыі раённага радыё (1973–1983), у рэдакцыі дубровенскай раённай газеты «Дзвінская праўда» (з 1983).



Пытаннямі гісторыі і культуры Дубровеншчыны займаўся ў межах выканання службовых абавязкаў. Аўтар шматлікіх артыкулаў у мясцовым перыядычным друку. Асаблівую ўвагу надае апісанню лёсаў славутых землякоў, сярод якіх, напрыклад, першая ў свеце жанчына-філосаф, прафесар Г. Тумаркіна, якая працавала ў Венскім універсітэце, беларускі мастак-манументаліст Ю. Гаўрын, аўтар кнігі «Это было не во сне» В. Тумаркіна, дырэктар аднаго з НДІ НАН Беларусі Н.М. Шумейка і іншых.

Падрыхтаваў нарысы пра славутых землякоў, прадпрыемствы раёна (не выдадзены).

Тв.: Помняць героя землякі: [П.С. Федарцоў] // ДнП. — 1990. — № 55. — С. 2; Краязнаўчы музей у Святашыцах // ДнП. — 1990. — № 49. — С. 3; Назваць імя сваё // ДнП. — 1992. — № 24. — С. 2; Дарагія рэліквіі: [П.К. Струганкаў] // ДнП. — 1992. — № 41. — С. 3; Помніць аб сваёй гісторыі // ДнП. — 1992. — № 55. — С. 2; Боль адступае перад мужнасцю: [Г. Субач] // ДнП. — 1996. — 2 ліст. — С. 2; Успомнім камунараў // ДП. — 1998. — 1 ліп. — С. 2; След на зямлі: [Л. Матыль] // ДнП. — 1999. — 6 сак.; Таццянін лёс: [Т.Л. Шаранда] // ДнП. — 1999. — 16 чэрв. — С. 2;Запаветная мара — стварыць музей: [Л.А. Дударава] // ДнП. — 1999. — 3 ліп. — С. 2–3; З ЦК камсамола ў вясковую школу: [М.І. Швыдрык] // ДнП. — 1999. — № 68. — С. 1, 2; Вышыванкі на сувоі жыцця: [В.М. Недасека] // ДнП. — 2000. — 8 студз. — С. 3; Віцебскія піяры ў Дуброўне // ДнП. — 2000. — № 28. — С. 2–3; Прафесар гісторыі з в. Дзяцель: [У.Ф. Ладысеў] // ДнП. — 2000. — № 56. — С. 2; Дубровенскія прысмакі // ДнП. — 2001. — 6 студз. — С. 2; Юбілей героя: [Т.Я. Дзенісенка, Герой Сацыялістычнай працы] // Тамсама. — С. 3; Цаной жыцця // ДнП. — 2001. — № 58. — С. 3; Ад вясковага хлопчыка да прафесара: [І.Я. Лепешаў] // ДнП. — 2000. — № 59. — С. 2; Памяць пра землякоў захоўваюць нашчадкі // ДнП. — 2005. — № 42. — С. 2; Жанчына стагоддзя: [В. Царашкова] // ДнП. — 2006. — № 50. — 8; Каплічка на могілках // ДнП. — 2005. — № 87. — С. 2; Пісьменнік Сямён Мірэр // ДнП. — 2006. — № 88. — С. 2; Вядомае і невядомае аб нашых землях: [А. Чарняк] // ДнП. — 2006. — № 72. — С. 2; Доўгі шлях да свята // ДнП. — 2007. — 8 мая. — С. 2; Абараняў дубровенец Маскву: [А.А. Байкоў] // Тамсама; Яны былі першымі: [Дубровенскі райваенкамат, 1948] // Тамсама. — С. 3; Салдат, настаўнік, камісар: [М.Т. Піменаў] // ДнП. — 2007. — № 68. — С. 6; Касцёл Маткі Боскай Фацімскай // ДнП. — 2007. — 24 кастр. — С. 4; Дзве Валянціны // ДнП. — 2007. — 28 ліст. — С. 2; Першы заслужаны трэнер Беларусі на Дубровеншчыне: [Ю.У. Максак] // Тамсама. — С. 4; Франтавы сувязіст з Шухаўцоў: [А.П. Сопелеў] // ДнП. — 2008. — 25 чэрв. — С. 1,4; Гвардзеец «смірноўскай» роты: [М.А. Малашанка] // Тамсама. — С. 4; Праект «Дом без адзіноты», або Сардэчная сустрэча з валанцёрамі са Швейцарыі // ДнП. — 2009. — 28 ліст. — С. 6.

Літ.: Чапялова Л. Чалавек справы, або Россып шчодрасці і высокароднасці: [60-годдзе Л. Дударава] // ДнП. — 2007. — 17 кастр. — С. 2.

**ДУЛАЎ** АНАТОЛЬ МІКАЛАЕВІЧ (27.01.1978, г. Віцебск), педагог. Кандыдат гіст. навук (2006). Скончыў СШ № 1, факультэт беларускай філалогіі і гісторыі ВДУ (2000), аспірантуру пры ВДУ імя П.М. Машэрава па спецыяльнасці «Айчынная гісторыя» (2003). Працуе выкладчыкам (з 2000), дацэнтам на кафедры гісторыі Беларусі ВДУ (з 2007).



Вывучэннем гісторыі Віцебшчыны пачаў займацца ў час навучання ў ВДУ. Значны ўплыў на фарміраванне навуковых інтарэсаў аказала Г.М. Якаўлева. Займаецца вывучэннем становішча жанчын, сацыяльнай і канфесійнай гісторыі Віцебшчыны канца XIX–XX ст. Выкладаў курсы «Гістарычнае краязнаўства», «Краязнаўства Беларусі». Кіраўнік студэнцкага краязнаўчага гуртка ў ВДУ, сябра навукова-метадычнай рады ВАКМ.

Браў удзел у падрыхтоўцы шэрагу навукова-практычных канферэнцый, якія ладзіліся ВДУ (2004, 2009, 2010), кнігі «Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы» (рэдагаваў гістарычны раздзел, аўтар шэрагу артыкулаў). Выступіў знешнім рэцэнзентам артыкулаў «Витебский в честь сошествия Святого Духа на апостолов женский монастырь», «Витебская и Оршанская епархия» для «Православной энциклопедии».

Тв.: Из истории женского движения в первые годы советской власти (на материале Витебской губернии) // V Республиканская научная конференция студентов, магистрантов и аспирантов Республики Беларусь (НИРС — 2000): материалы конференции: в 5 ч. Ч. 1. — Гродно: ГрГУ, 2000. — С. 61–62; (разам з Г.М. Якаўлевай) Из истории женского движения в первые годы советской власти на материале Витебской губернии // Иной взгляд: Международный альманах гендерных исследований. — Мн., 2000. — Май. — С. 29–30; Советская власть и крестьянка Витебщины в первой половине 1920-х гг. // Беларусь и Европа: Взаимодействие культур (история, уроки, опыт, современность): материалы международной научно-практической конференции, 30 ноября – 1 декабря 2000 г. — Витебск: ВГУ, 2000. — С. 139–142; Попытка организации советского женского движения на Витебщине в первой половине 1920-х годов: Трудности и успехи // Женщина. Образование. Демократия: материалы 2-й международной междисциплинарной научно-практической конференции, 3–4 декабря 1999 г. — Мн.: Энвила, 2000. — С. 183–185; Проституция и борьба с ней в Витебске в первые годы Советской власти // Женщина. Образование. Демократия: материалы 3-й международной междисциплинарной научно-практической конференции, 8–9 декабря 2000 г. — Мн.: Энвила-М, 2001. — С. 297–299; Арганізацыя аховы мацярынства і дзяцінства ў Віцебскай губ. (20-я гг. XX ст.) // Наука и творчество молодежи — XXI веку: Итоги НИР — 2000: тезисы докладов V (50) научной конференции студентов, магистрантов и аспирантов. — Витебск: ВГУ, 2001. — С. 5; (разам з Г.М. Якаўлевай) Женщины Витебщины в период модернизации 1930-х годов // Женщины в истории: Возможность быть увиденными: сб. науч. ст. Вып. 1 / под ред. И.Р. Чикаловой. — Мн.: БГПУ, 2001. — С. 304–311; (разам з В.І. Часнаковай) «Революция быта»: Решение женского вопроса большевиками в 20-е гг. XX в. на Витебщине // Германский и славянский миры: Взаимовлияния, конфликты, диалог культур (история, уроки, опыт, современность): материалы международной научно-теоретической конференции, 6–8 декабря 2001 г. — Витебск: ВГУ, 2001. — С. 248–252; Витебские работницы в период первых пятилеток (на материале воспоминаний) // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: Стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця: матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі: у 4-х ч. Ч. 3. — Гродна: ГрДУ, 2003. — С. 237–241; (разам В.У. Акуневічам, А.Л. Дзядзінкіным) З гісторыі Віцебскага ўніверсітэта // Веснік ВДУ. — 2003. — № 4. — С. 3–9; Устные источники в исследовании положения женщин БССР в 1930-е гг. // XXI век: Актуальные проблемы исторической науки: материалы междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию истфака БГУ, Минск, 15–16 апреля 2004 г. — Мн.: БГУ, 2004. — С. 176–178; Сацыяльна-эканамічнае жыццё ў першай палове XIX ст. // Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І.А. Абрамава [і інш.]; аўт.-уклад. М.В. Півавар. — Мн.: Паркус-плюс, 2008. — С. 91–94; Паўстанне 1863–1864 гг. // Тамсама. — С. 94–97; Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў 60-90-я гады XIX ст. // Тамсама. — С. 97–101; (разам з В.У. Акуневічам) Віцебскі пав. у пачатку XX ст. // Тамсама. — С. 101–104; Сельская гаспадарка ў 20–30-я гады XX ст. // Тамсама. — С. 114–119; Развіццё прамысловасці ў 20–30-я гг. XX ст. // Тамсама. — С. 120–121; Віцебскі Маркаў Свята-Троіцкі манастыр // Тамсама. — С. 208–210; Тадулінскі Свята-Успенскі манастыр // Тамсама. — С. 210–213; Н.І. Дарафеенка — удзельніца руху супраціўлення і даследчыца віцебскага падполля // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 18–19 чэрвеня 2009 г. / ВДУ; рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. — Віцебск: ВДУ, 2009. — С. 117–129; (разам з Н.В. Салаўёвай) Пісьмовыя крыніцы па гісторыі Віцебскага настаўніцкага інстытута ў фондах музея гісторыі УА «ВДУ імя П.М. Машэрава» // 90 год ВАКМ: матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 30–31 кастрычніка 2008 г. / рэдкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. — Мн., 2009. — С. 132–138.

Літ.: Шпакоўская Г. Анатоль Дулаў: «Раўнапраўе — ідэал, да якога трэба імкнуцца» // НС. — 2007. — 6 сак. — С. 4; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Дулаў А.М. (23.05.2007) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Дулаў А.М.: «Сумленная праца — шлях да поспеху» // Мы і час: [ВДУ]. — 2009. — 16 мая. — С. 3.

**ДУЛЕБА** ГАННА ІВАНАЎНА, ст. навуковы супрацоўнік ІМЭФ НАН Беларусі. Кандыдат гіст. навук. Даследуе гісторыю населеных месцаў Беларусі, народнай адукацыі. Брала ўдзел у падрыхтоўцы тома «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», прысвечанага Віцебскай вобл. Аўтар больш за сто артыкулаў, прысвечаных помнікам архітэктуры, славутым землякам, героям Савецкага Саюза — ураджэнцам раёнаў і гарадоў Віцебшчыны (Аршанскі, Глыбоцкі, Пастаўскі, Сенненскі, Талачынскі раёны). Удзельнічала ў падрыхтоўцы рукапісу «Гарады і вёскі Віцебскай вобл.». Артыкулы, падрыхтаваныя навукоўцам, змяшчаліся ў Энцыклапедыі гісторыі Беларусі, кнігах «Памяць» (Аршанскі, Талачынскі, Шаркоўшчынскі раёны), мясцовых перыядычных выданнях. Разам з А.П. Петрашкевічам падрыхтавала звесткі па гісторыі населеных месцаў Талачыншчыны.

Тв.: (разам з Хаўратовічам І.) Талачын // ЭГБ. Т. 6. Кн. 1. — Мн., 2001. — С. 495; Шаркоўшчына // ЭГБ. Т. 6. Кн. 2. — Мн., 2003. — С. 197–198; Мемарыяльная дошка Смірнову П.С. // ЗПГіКБ. Віцебская вобласць. — Мн.: БелСЭ, 1985. — С. 69; Народныя вучылішчы на Глыбоччыне // ВГ. — 2004. — 21 лют. — С. 3; Народныя вучылішчы Лепельшчыны // ЛК. — 2004. — № 63. — С. 3; З гісторыі народных вучылішчаў Пастаўшчыны // ПК. — 2004. — № 82. — С. 2; З гісторыі народных вучылішчаў Аршаншчыны // АГ. — 2005. — № 81. — С. 3; Пастаўшчына на старонках «Обзора Виленской губернии» // ПК. — 2007. — № 50. — С. 4.



**ДУЧЫЦ** ЛЮДМІЛА УЛАДЗІМІРАЎНА (12.12.1950, г. Мінск), беларускі археолаг. Кандыдат гіст. навук (1982). Скончыла БДУ (1975). Працавала ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі (1974–2006). Вывучае гісторыю паўночнага захаду Полацкага княства, культавыя камяні, каменныя крыжы, крыніцы, археалагічную мікратапаніміку, старажытны касцюм на тэрыторыі Беларусі. Праводзіла раскопкі гарадзішчаў на Браслаўшчыне, курганоў на поўдні Беларусі, гідраархеалагічныя даследаванні ў Падзвінні (1976–1986). Удзельнік Браслаўскіх чытанняў (1989–2007). Аўтар кніг, прысвечаных Браслаўшчыне «Край блакітных азёр», «Браслаўскае Паазер’е ў IX–XIV стст.: гісторыка-археалагічны нарыс». Значная колькасць матэрыялаў, прысвечаных Віцебшчыне, змяшчаецца ў кнізе «Жыватворныя крыніцы Беларусі». Аўтар артыкулаў, змешчаных у энцыклапедыях (ЭГБ, АіНБ, ЗПГіКБ), зборніках матэрыялаў міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных канферэнцый, а таксама ў перыядычным друку. У артыкулах і кнігах значная колькасць матэрыялаў прысвечана Віцебшчыне.




Тв.: Кнігі: Край блакітных азёр. — Мн.: Полымя, 1988. — 39 с.; Браслаўскае Паазер’е ў IX–XIV стст.: гісторыка-археалагічны нарыс. — Мн.: Навука і тэхніка, 1991. — 120 с.; (разам з Э. Зайкоўскім) Жыватворныя крыніцы Беларусі. — Мн.: Ураджай, 2001. — 111 с.

Артыкулы ў энцыклапедыях: Барысавы камяні // ЭГБ. Т. 1. — Мн., 1993. — С. 315; Маскавічы // ЭГБ. Т. 5. — Мн., 1999. — С. 86; Рацюнкі // ЭГБ. Т. 6. Кн. 1. — Мн., 2001. — С. 115; Селішча // ЭГБ. Т. 6. Кн. 1. — Мн., 2001. — С. 277; (разам з В. Шадыра, Э. Зайкоўскім) Субаўшчына // ЭГБ. Т. 6. Кн. 1. — Мн., 2001. — С. 438; Чарневічы // ЭГБ. Т. 6. Кн. 2. — Мн., 2003. — С. 142; Шо // ЭГБ. Т. 6. Кн. 2. — Мн., 2003. — С. 227.

Артыкулы ў навуковым друку: (разам з Е.А. Мельнікавай) Надписи и знаки на костях с городища Маскович // Древнейшие государства на территории СССР: материалы и исследования 1980 г. — М., 1981; Барысавы камяні (гістарыяграфічны агляд) // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. — 1985. — № 4; Курганы Браслаўшчыны // Браслаўскія чытанні: матэрыялы II навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 925-годдзю Браслава (1065–1990), 16–17 лютага 1991 г. / навук. рэд. М.А. Ткачоў. — Браслаў: Браслаўскі філіял Пастаўскай узбуйнёнай друкарні, 1991. — С. 16–20; Зямля нашых продкаў // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 21–29; (разам з В.К. Вінакуравым, Э.А. Ляўко) Культавыя камяні Глыбоччыны // Тамсама. — С. 29–30; Варагі на Браслаўшчыне // Браслаўскія чытанні: матэрыялы IV навукова-краязнаўчай канферэнцыі, 24–25 красавіка 1997 г. — Браслаў, 1997. — С. 18–22; Браслаўчане ў раннім сярэднявеччы (паўсядзённасць і ментальнасць) // Браслаўскія чытанні. Матэрыялы V навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 939-годдзю першай згадкі Браслава ў пісьмовых крыніцах. — Браслаў; Наваполацк: Усяслаў Чарадзей, 2001. — С. 36–38; Старадаўні строй браслаўчан // Браслаўскія чытанні: матэрыялы VI навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 150-й гадавіне з дня нараджэння браслаўскага лекара, грамадскага дзеяча Станіслава Нарбута (1853–1926), 7–8 мая 2003 года. — Браслаў, 2003. — С. 29–31.

Артыкулы ў перыядычным друку: Л. Археалагічныя помнікі Сенненшчыны // ЛІ. — 1985. — № 78. — С. 2; Калісьці славуты водны шлях: [па Дзвіне] // ВР. — 1986. — № 138. — С. 4; Аб старажытнасцях Глыбоччыны // ШП. — 1989. — № 98. — С. 2; (разам з Э. Ляўковым) Што памятаюць камяні // ЛІ. — 1989. — № 106. — С. 4; Помнікі археалогіі на Ушаччыне // П. — 1989. — № 116. — С. 2; «Галодныя магільнікі» // ВР. — 1990. —

№ 163. — С. 5; Курганы на Глыбоччыне // ВГл. — 1991. — № 102, 103, 105; Старадаўнія моднікі. Як апраналіся на Віцебшчыне ў XI–XII ст. // ВР. — 1991. — № 174. — С. 4; (разам з А.С. Квяткоўскай) Пахавальныя помнікі наваколіц Падсвілля // ВГл. — 1994. — № 67, 69, 71; (разам з В.Ф. Вінакуравым, А. Гарбуль) Гэтыя дзіўныя камяні Пастаўшчыны // КрП. — 2000. — № 8, 9; Помнікі мінулых стагоддзяў // П. — 2002. — № 3. — С. 3, 4.

Літ.: Дучыц Л.У. // ЭГБ. — Т. 3. — С. 321.



**ДЭЙНІС** ІВАН ПЯТРОВІЧ (1900, г. Невель – 1985), краязнаўца, педагог. З 1905 г. жыў у Полацку. Скончыў 7 класаў Віцебскай мужчынскай гімназіі. Працаваў у Полацкім харчовым камітэце (лета 1917), чорнарабочым (1918), вучыўся на педкурсах (1919). Працаваў настаўнікам у 1-й Савецкай школе г. Полацка (1920), выкладчыкам прыродазнаўства, фізікі і біялогіі на 43-х Полацкіх аб'яднаных курсах камсаставу РККА (1921). Вучыўся ў БДУ (1925–1929). Працаваў настаўнікам чыгуначнай школы ў Полацку, выкладчыкам лясного тэхнікума (1930–1941). У гады Вялікай Айчыннай вайны — дырэктар Белаярскага дзіцячага дома на Урале, настаўнік у сярэдняй школе ў Курганскай вобл. У 1944 г. узнавіў дзейнасць лясного тэхнікума ў Полацку, выкладаў у ім да 1960 года.

Адзін з найбуйнейшых даследчыкаў гісторыі і культуры г. Полацка XX ст. У 1920-я гг. кіраваў адным з вучнёўскіх краязнаўчых гурткоў пры педтэхнікуме і лестэхнікуме. Браў актыўны ўдзел у дзейнасці Полацкага краязнаўчага таварыства, быў старшынёй яго праўлення (1925). Удзельнічаў у працы камісіі па ўскрыцці мошчаў Ефрасінні Полацкай.

У другой палове XX ст. працягваў вывучэнне полацкай даўніны. Аўтар артыкулаў у навуковым, рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку. Напісаў успаміны пра гісторыю Полацка «Полацк у XX ст. (1905–1967 гг)». Запісы ўяўляюць сабой рукапіс аб'ёмам 220 лістоў (433 старонак па аўтарскай нумарацыі чырвоным алоўкам). Перададзены аўтарам 26 красавіка 1972 г. у Полацкі краязнаўчы музей. Рукапіс захоўваецца ў фондах НПГКМЗ (КП-5-2774). Мемуары выдадзены М. Баўтовічам пад назвай «Полацкая даўніна» ў перакладзе на беларускую мову ў 2007 г.




У архіве захоўваюцца і інш. рукапісы краязнаўцы: «Богоявленский монастырь», «Борисоглебский, или Бельчанский монастырь», «Главная площадь города Полоцка: исторический очерк», «Иезуиты в Полоцке», «Мой командир (воспоминания о начальнике 43-х Полоцких комкурсов Я.Ф. Фабрициусе)», «Полоцк в XX веке», «Полоцкие замки», «Полоцкий лесной техникум», «43-е Полоцкие объединенные курсы комсостава Рабочее-крестьянской Красной Армии», «Софийский собор и униаты в Полоцке», «Спасо-Евфросиньевский монастырь», «Учебные заведения в Полоцке до Октябрьской революции».

Узнагароджаны 3 медалямі, 2 Граматамі ВС БССР. Ганаровы грамадзянін г. Полацка (1967).

Тв.: Кнігі: Полацкая даўніна. — Мн.: Медисонт, 2007. — 330 с.

Крыніцы: Нижний замок в Полоцке // НПГКМЗ. Личный фонд И. П. Дейниса. Кн. 21422/8.

Артыкулы ў перыядычным друку: Такім быў 1918 г. // СК. — 1968. — 1 студз.; Легенды аб святых машчах // СК. — 1973. — 15 чэрв.; Прага да ведаў // СК. — 1977. —1 мая; Курсы чырвоных камандзіраў // СК. — 1978. — 4 лют.; Пра мінулае роднага краю // СК. — 1978. — 28 ліп.; Раніца новага жыцця // СК. — 1978. — 28 снеж.; У першы раз пасля вайны // СК. — 1980. 01 студз.; Масква, Крэмль, правадыру пралетарыяту // Звязда. — 1980. — 20 крас.; Ніжні замак у Полацку // ПГіКБ. — 1983. — № 2.

Літ.: Васючэнка П. У дар бібліятэцы: [Дэйніс І. перадаў бібліятэку лясному тэхнікуму] // СК. — 1977. — № 126; Крупко К. Усім сэрцам: [працы Дэйніса І. па гісторыі Полацка] // СК. — 1978. — 1 мая; Аб узнагароджанні І.П. Дэйніса ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР // СК. — 1978. — 23 снеж.; Дэйніс І.П. Некралог // СК. — 1985. — № 181. — С. 4; Дзвінская Я. Якія таямніцы адкрываў // СК. — 1986. — № 127. — С. 2; Протокол вскрытия и освидетельствования мощей Ефросинии комиссией, выделенной согласно постановлению Полоцкого уездисполкома, утвержденному губисполкомом, состоявшегосся 13 мая 1922 г. в г. Полоцке в Спасо-Ефросиньевском монастыре (Извлечение) // История Беларуси в документах и материалах. — Мн.: Амалфея, 2000. — С. 400–401; Шупенька І. Равеснік стагоддзя: [І. Дэйніс] // ПВ. — 2000. — № 36. — С. 3; Дэйніс Іван // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Полацка. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 779; Краско В.Д. Краязнаўчы рух на Полаччыне ў 20-я гады XX ст. // Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю: матэрыялы архіўных чытанняў. — С. 142–145; Иезуиты в Полоцке: 1580–1820 гг.: в 2 ч. Ч.2: Полоцк, 2005. — С. 29; Баўтовіч М. Полацкі храніст // Полацкая даўніна / І.П. Дэйніс. — Мн.: Медысонт, 2007. — С. 3–4; Яскар А. Колькі каштаваў хлеб у 1905 г.? // ИП. — 2008. — № 5. — С. 3.

**ЕРМАЛАЕВА** (Бахір) МАРЫЯ ДАНІЛАЎНА (5.09.1923 в. Бубнова Веляшкавіцкага с/с Лёзненскага раёна Віцебскай вобл. (зараз не існуе)), педагог, краязнаўца. Скончыла Палёнаўскую чатырохкласную, Веляшковічскую сямігодку, аддзяленне пачатковых класаў Руднянскага педагагічнага тэхнікума (1940), факультэт рускай і беларускай мовы ВДПІ (1950), вышэйшыя курсы замежных моваў. Працавала настаўніцай пачатковых класаў у Сталінскай сямігадовай школе в. Перевалокі Мікульніцкага с/с Руднянскага раёна (1939–1941), пашпартысткай у м. Веляшкавічы (1941–1943), настаўніцай беларускай, нямецкай, рускай моваў у СШ № 1 г.п. Лёзна (1943–1990), настаўніцай моваў Вялікасельскай БШ Лёзненскага раёна (1990–1992).



Даследуе гісторыю роднага краю, аддаючы перавагу тэме «Лёзненшчына ў Вялікай Айчыннай вайне», «Гісторыя народнай адукацыі ў раёне». Праводзіць значную працу па ўвекавечанні памяці ахвяр вайны. Асвятляе лёсы педагогаў раёна ў мясцовым перыядычным друку.

Штогод на працягу 1940–1980-х гг. праводзіла турыстычна-краязнаўчыя паходы для дзяцей СШ № 1 г.п. Лёзна па тэрыторыі Лёзненскага, Аршанскага, Віцебскага раёнаў Віцебскай вобл., Руднянскага раёна Смаленскай вобл. РСФСР. Удзельнічала ў стварэнні музея народнай славы СШ № 1 г.п. Лёзна, ваенна-гістарычнага музея (цяпер раённы краязнаўчы музей). Брала ўдзел у стварэнні кнігі «Памяць» Лёзненскага раёна. Друкавала некаторыя матэрыялы на старонках раённай газеты «Сцяг Перамогі». Перадала шэраг матэрыялаў у раённы краязнаўчы музей, музей СШ № 1 г.п. Лёзна, Лёзненскі РАА.

Тв.: Памяці настаўніка і чалавека // СП (Л). — 1998. — № 86; В мрачные годы фашистской оккупации: [Лёзна] // СП (Л). — 1998. — № 88, 90; Мой учитель // СП (Л). — 2000. — № 51, 52, 53; Память сердца: [раён у гады вайны і пасляваенны час] // СП (Л). — 2001. — № 15, 16; Умел сплотить коллектив // СП (Л). — 2001. — № 29; Жизнь, прожитая не зря // СП (Л). — 2001. — № 48; Жили единой семьёю: [латышы на Лёзненшчыне] // СП (Л). — 2001. — № 61, 62, 64, 66, 69, 70; Из руин и пепла // СП (Л). — 2001. — № 88, 89, 90; Священник. Гражданин. Патриот // СП (Л). — 2002. — № 2, 4, 5; Море — это не только романтика // СП (Л). — 2001. — № 14, 16; Доктор Смирных // СП (Л). — 2002. — № 46. — С. 2; Школа жизни. Школа мужества и добра: [лёсы настаўнікаў Веляшкавіцкай СШ] // СП (Л). — 2002. — № 61–64, 66, 69, 71, 72; Всегда на острие жизни: [школа ў в. Замшына] // СП (Л). — 2003. — № 87. — С. 2; Памяти друга и хорошего человека // СП (Л). — 2003. — № 94; В грозные военные годы // СП (Л). — 2003. — № 95, 96; Была настоящим педагогом // СП (Л). — 2003. — № 30; Жива в памяти людской // СП (Л). — 2003. — № 44, 45, 48; «И память сердца говорит»: [лёсы настаўнікаў Лёзненшчыны] // СП (Л). — 2004. — № 36–37. — С. 3–4; Жила ярко и достойно // СП (Л). — 2005. — № 9; Спасенная праведниками мира // СП (Л). — 2005. — № 81, 83, 84; Пользовалась уважением и признательностью // СП (Л). — 2006. — № 17; Носит улица имя Героя: [Ц.М. Арлоў] // СП (Л). — 2006. — № 72, 86, 89; Они жили на нашей улице // СП (Л). — 2007. — № 16, 29, 30, 40; Что спрятано в Буевском озере? // СП (Л). — 2008. — № 1. — С. 7.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Ермалаева М.Д. (5.09.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Барановский М. Уроки добра и человечности: [М.Д. Ермалаевай — 85 год] // СП. — 2008. — № 69. — С. 2.



**ЕРМАЛЁНАК** ВІТОЛЬД (Вітаўт) АНТОНАВІЧ (*К. Ярмоленскі, В. Сакун, В. Зніч, В. Крывіч*) (28.07.1954, в. Жэймяны Браслаўскага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца, педагог. Вучыўся ў пачатковай школе в. Завер'е Браслаўскага раёна, скончыў Слабадскую СШ Браслаўскага раёна (1971), гіст. факультэт ГрДУ (1976).

Цікавасць да гісторыі Беларусі, роднага краю, станаўленне нацыянальнай самасвядомасці і гістарычнай свядомасці стала фарміравацца пад уплывам расповедаў бацькі пра лёс роду і краю, праз знаёмства з міжваеннай беларускай нацыянальнай і польскай літаратурай (забароненай у савецкі час), у якой змяшчалася інфармацыя пра падзеі, якія не афішыраваліся афіцыйнай дзяржаўнай ідэалогіяй. Пад час вучобы ва ўніверсітэце займаўся ў гісторыка-краязнаўчым гуртку пад кіраўніцтвам прафесара Я.Н. Мараша. У адпаведнасці з тэматыкай гуртка навуковыя даследы адносіліся да сферы краязнаўства. Другой зацікаўленасцю стала педагогіка. Займаўся ёю, як і краязнаўствам, вельмі сур'ёзна. Дыпломная работа была падрыхтавана на актуальную ў той час тэму і разглядала выкарыстанне педагагічнай савецкай спадчыны ў краінах сацыялістычнага лагера. Даследаванне «Ідэі А.С. Макаранкі ў ПНР і ГДР» была напісана на высокім навуковым узроўні,

на аснове нямецкіх і польскіх крыніц і прапанавана да выдання. Праяўляючы асабістую пазіцыю, стаў размаўляць на беларускай мове, за што меў праблемы з адміністрацыяй універсітэта і КДБ. Пад час вучобы 5 гадоў жыў у адным пакоі інтэрната разам з К. Рамановічам, вядомым у будучым краязнаўцам з Талачыншчыны. Разам даследавалі наваколлі Гродна, вывучалі помнікі Першай сусветнай вайны.




Пасля заканчэння ВНУ вярнуўся на радзіму, у Браслаўскі раён. Аднак з той прычыны, што не знайшлося месца настаўніка гісторыі, паехаў у Міёры, куды па размеркаванні трапіла жонка. Працаваў настаўнікам гісторыі ў СШ № 1 г. Міёры (1976–1981), настаўнікам гісторыі ў СШ № 3 (з 1981). З 1976 г. у раённым Доме піянераў Вітольд Антонавіч пачаў весці гурток «Кароткі курс гісторыі Беларусі на прыкладзе мясцовага краю». Назва праз пэўны час была зменена на больш рамантычную — «Арганаўты мінулага». Профіль быў абраны краязнаўча-археалагічны. Праграма была разлічана на 144 гадзіны і прадугледжвала напачатку практычнае вывучэнне мінулага Міёрскага краю. З 1976 г. разам з гуртkоўцамі стаў удзельнічаць у археалагічных раскопках на тэрыторыі Міёрскага раёна. Браў удзел таксама ў раскопках Л. Дучыц, Э. Зайкоўскага, В. Шадыры. Выявіў разам з П.М. Ціхановічам [ЭГБ. Т. 4. С. 12] безкурганны могільнік X–XI мтст. паміж вёскамі Казлоўцы і Шніткі (Міёрскі раён).

Непасрэдны ўдзел у археалагічных раскопках пад кіраўніцтвам спецыялістаў, самаадукацыя далі практычны вопыт, узбагацілі тэарэтычна, далі магчымасць рабіць самастойны аналіз, вывады. З 1990-х гг. археолагі Інстытута гісторыі НАН Беларусі і ВНУ краіны сталі праводзіць менш раскопак, прыцягваючы да іх студэнтаў гістарычных факультэтаў, якія праходзілі археалагічную практыку. Не маючы дазволу на асабістыя раскопкі, разам з гуртkоўцамі перайшоў ад археалагічных раскопак да краязнаўчых разведак. Гэта мела свае станоўчыя бакі. Так, на працягу адной вандроўкі па раёне можна было адшукаць месцы раней невядомых гарадзішчаў, паселішчаў, курганных груп. Акрамя археалагічных доследаў, збіралі ўспаміны пра мінулае краю. Праца гуртка набыла сістэмнасць і пераемнасць. Абавязковай стала тэарэтычная падрыхтоўка. Пачалі весці хроніку гуртка (з 1976). У 1980 г. быў створаны герб гуртка.



Праз пэўны час узнікла духоўная патрэба ў падсумаванні знойдзеных знаходак. Узнікла ідэя стварыць музей. На 1970–1980-я гг. у Міёрскім раёне не было ніводнага музея. З прычыны адсутнасці ў школе памяшкання першая экспазіцыя была створана ў калідоры школы і праз пэўны час разрабавана. У 1983 г. выступіў адным з ініцыятараў святкавання 350-годдзя Міёраў. Падрыхтаваў часовую экспазіцыю ў 2-х пакоях у былым будынку пошты, у якім месціўся аддзел культуры Міёрскага райвыканкама. Перадаў больш за 400 экспанатаў, сярод якіх манеты, кнігі, этнаграфічныя матэрыялы. З гэтага пачалося стварэн-



не раённага краязнаўчага музея. Аднак фінансаванне не было прадугледжана, матэрыялы пачалі раскрадацца.

У 1986 г. на аснове знойдзеных матэрыялаў стварыў краязнаўчы музей у СШ № 3. На 2008 г. асноўны фонд складае 15 тысяч экспанатаў. Многія экспанаты з’яўляюцца ўнікальнымі для нашай краіны, нават для Усходняй Еўропы. Напрыклад, фальшывы арабскі дырхем X ст., якога няма нават у Эрмітажы. За час існавання музея яго наведалі больш за 55 тысяч чалавек. На абласным тэлебачанні студыяй «Вясёлка» была падрыхтавана перадача пра дзейнасць гуртка (трансліравалася 18.10.1985). У 2008 г. на аснове сабраных на Міёршчыне калекцый стварыў у СШ № 3 г. Міёр Музей кнігі і друку, у склад якога ўваходзяць 3 тысячы экспанатаў. У бліжэйшых планах стварэнне музея адукацыі і этнаграфічнага музея. Калі для першага выдзелена памяшканне ў школе, то другі плануецца стварыць ў перавезенай сялянскай хаце і размясціць у двары школы.

Прыняў актыўны ўдзел у стварэнні экспазіцый Міёрскага, Глыбоцкага і Браслаўскага раённых краязнаўчых музеяў, перадаў туды шэраг знойдзеных матэрыялаў. У Браслаўскім музейным аб’яднанні і Міёрскім краязнаўчым музеі праводзіліся 2 персанальныя выставы. Адмовіўся ад прапановы заняць пасаду дырэктара раённага музея (як у свой час ад аспірантуры), бо лічыць, што адміністрацыйная работа вымагае шмат часу. Аказаў дапамогу пры стварэнні шэрагу школьных музеяў раёна і вобл. Перадаў туды частку знойдзеных у час разведак экспанатаў, аказваў кансультацыі. Разам з Т.М. Пацеенак вядзе гісторыю СШ № 3 г. Міёр, якая на 2008 г. складала 8 тамоў.

У пачатку 1990-х далучыўся да шырокага школьнага краязнаўчага руху, арганізаванага на Віцебшчыне аддзелам беларусазнаўства і краязнаўства ВАЦППДіП. Актыўны ўдзельнік конкурсаў, аглядаў музеяў, канферэнцый па школьным краязнаўстве. Гурток і музей штогод становяцца пераможцамі ў абласных і рэспубліканскіх конкурсах. У 1998 г. дзякуючы грамадскай арганізацыі «Памяць і надзея» ездзіў у Вільнюс, дзе працаваў у аддзеле рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта. Знайшоў шмат матэрыялаў пра Дзісненскі пав. Асаблівую значнасць маюць здымкі Яна Булгака, на якіх адлюстраваны помнікі архітэктуры, якія не дайшлі да нашых дзён.

Адзін з арганізатараў канферэнцыі «Дзісненскія чытанні», якая прайшла ў Міёрах (1996). Матэрыялы, на жаль, не былі выдадзены, з прычыны прыпынення дзейнасці фонду Дж. Сораса. Браў актыўны ўдзел у Браслаўскіх чытаннях (1994, 1997, 2000, 2003), навукова-краязнаўчых чытанняў у г. Глыбокім (1991, 1999), канферэнцыі «Археалогія і гісторыя Полацкай зямлі» (1997), рэспубліканскіх школьных краязнаўчых чытаннях. Падтрымлівае цесныя сувязі з Браслаўскім краязнаўчым таварыствам імя О. Хедэмана, ВАЦППДіП.

Асноўныя кірункі даследавання: археалогія, этнаграфія, генеалогія, нумізматыка, архітэктура Міёршчыны і прылягаючых рэгіёнаў. З улікам вялізнай колькасці сабраных матэрыялаў, адной з важных частак краязнаўчай працы В. Ермалёнка з’яўляецца апрацоўка сабраных матэрыялаў, афармленне экспанатаў, пэўныя змены ў экспазіцыі музея, апісанне лёсу экспанатаў, гісторыі знаходак, папулярызацыя гісторыі і культуры Беларусі, Віцебшчыны, Міёршчыны. Распрацаваў турыстычныя маршруты «Бронзавы, сярэбраны і залаты пярсцёнак Міёршчыны».

Аўтар артыкулаў у Энцыклапедыі Беларусі, Энцыклапедыі гісторыі Беларусі. Адзін з аўтараў артыкулаў у гісторыка-дакументальнай хроніцы «Памяць» Міёрскага раёна (1998). Браў удзел у стварэнні гісторыка-дакументальных хронік «Памяць» Глыбоцкага і Браслаўскага раёнаў. Мае шэраг артыкулаў у зборніках «Браслаўскія сшыткі», «Albaruthenica». Аўтар больш за 150 артыкулаў публікацый у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку: «Труд», «Настаўніцкая газета», «Краязнаўчая газета», «Народнае слова», «Сцяг працы», «Міёрскія навіны», «Павет» і інш. Аўтар камплекта паштовак «Турыстычныя маршруты Міёршчыны». Першы артыкул напісаў у раённую газету «Сцяг працы» у 1977 г. па выніках раскопак ў в. Махіроўцы. З гэтага часу стаў актыўна пісаць ў газету з мэтай актывізаваць цікавасць да гісторыі краю. Рэцэнзіі на дзейнасць В.А. Ермалёнка, ягонага гуртка «Арганаўты мінулага», Народнага музея СШ № 3 змяшчаліся ў рэспубліканскіх і рэгіянальных выданнях. У асабістым архіве зберагаецца рукапіс «Наш край — Мёршчына».




Займае актыўную грамадскую пазіцыю. За актыўную патрыятычную дзейнасць некалькі разоў абвінавачваўся ў нацыяналізме і звальняўся з працы. У 1981 г. у Міёрах была пабудавана СШ № 3, у якую пайшоў працаваць настаўнікам гісторыі, дзе працуе

да цяперашняга часу. Актыўна ўдзельнічае ў дзейнасці па абароне помнікаў гісторыі і культуры праз чытанне лекцый, напісанне артыкулаў, выступленні на канферэнцыях, звароты ў дзяржаўныя органы. Браў удзел у выратаванні ад знішчэння археалагічных помнікаў: грунтовага могільніка ў в. Казлоўцы, курганных груп каля вёсак Кублішчына, Лясное, а таксама помнікаў архітэктуры: палаца ў в. Дзедзіна, капліцы ў в. Ідолта, касцёла і царквы ў г. Дзісне. З'яўляўся намеснікам Міёрскага раённага аддзялення БДТАПГіК, уваходзіў у склад Рэспубліканскай рады БДТАПГіК, з'яўляўся сябрам Рэспубліканскага савета Усебеларускай экспедыцыі «Наш край». Стваральнік міёрскага раённага аддзялення ТБМ. Дэлегат Устаноўчага з'езда ТБМ (1989). Дэлегат Усесаюзнага з'езда настаўнікаў у Маскве (1988), дэлегат Усебеларускага кангрэса за незалежнасць (2000).

Узнагароджаны прэміяй Прэзідэнта РБ «За духоўнае адраджэнне» (1999), медалём «60 лет Победы в Великой Отечественной войне», знакам Педагагічнага таварыства «За актыўную працу». «Чалавек года Віцебшчыны» 2009 г. Кандыдат у майстры спорту па класічнай барацьбе.

Мае высокія маральныя якасці. Лічыць, што на ўроках, у музейных экспазіцыях трэба паказваць не веліч мінулых бітваў і іх палкаводцаў, якія б яны не былі, а разбуральны, антымаральны характар войнаў. Ваенна-патрыятычнае выхаванне — гэта перш за ўсё патрыятычнае выхаванне беларуса для Беларусі, а не дзеля гатоўнасці ваяваць і забіваць дзеля чыіхсьці інтарэсаў. Асновы беларускага патрыятызму — у веданні таго багацця культуры, традыцый і звычаяў, якія жывілі наш народ, не далі яму загінуць у змрочныя стагоддзі прыгнёту.

Сяргей Панізьнік прысвяціў верш В. Ермалёнку «Праўду ў вас бяру… (З прамовы вялікага князя Вітаўта)».

*В.А. Ермалёнку, міёрскаму краязнаўцу,*
*музейніку, лаўрэату прэміі*
*«За духоўнае адраджэнне»*

Скарбы збіраю ў музейныя соты.
Зведалі даўнасці моцны нектар
І альпіністы на ўсе ўзвысоты,
І арганаўты на кожны папар.
Рэчаў няіснасць… А ў нас Рэчаіснасць.
Мы ёсць напраўду. Па сутнасці. Вось —
Кнігі, кнігі, якія далі нам агністаць;
Сімвал імклівай крутлівасці — вось…
Мы з незамшарных абшараў, дапраўды!
Бог і ратай мацярык берaглі.
Праўды даю: мы з дзівоснае наўды;
Нельга ў музеі сказаць: «Не маглі».
Тут наша першына, зрух у народы,
Выпас вякоў і цана працадня…
З потам, з крывёю былі ўзнагароды:
Іх на выславу вяртае радня.
Посулы, клятвы, зарокі, згрызоты…
Духу прытул тут з прысягай: «Набудзь!»
Праўду збіраю ў музейныя соты, —
Каб на спажыў, а не ў лапці абуць.

Тв.: Кніга: Очарование Миорского края / В.А. Ермалёнок, П.И. Боголей. — Новополоцк: О.В. Молодечкин, 2007. — 50 с.

Артыкулы ў энцыклапедычных выданнях і кнігах «Памяць»: Міёры // ЭГБ. Т. 5. — С. 131; Міёры // БЭ. Т. 11. — Мн., 2000. — С. 334; Тадэўш Даленга-Мастовіч // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 167–168; Г. Дмахоўскі — паўстанец і скульптар з Забалоцця // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Браслаўскага раёна. — Мн., 1998. — С. 184–185; Аб будаўніцтве порта ў Друі // Тамсама. — С. 261–262; Бяроза на могілках // Тамсама. — С. 422; Несціханы боль праз гады // Тамсама. — С. 574–575; Зямля нашых продкаў // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Міёрскага раёна. — Мн.: Бел. навука, 1998. — С. 27–31; Вывучэнне сівой мінуўшчыны // Тамсама. — С. 32–33; Таямніцы могільніка Казлоўцы // Тамсама. — С. 34–36; Паўстанец і скульптар з Забалоцця // Тамсама. — С. 101–105; Паўстанне 1863 года на Дзісеншчыне // Тамсама. — С. 110; Сведка падзей незабыўных // Тамсама. — С. 158; Слова аб чырвоным кулямётчыку // Тамсама. — С. 168–169; «Беларускі цар» // Тамсама. — С. 196–198; Арцімовіч Станіслаў // Тамсама. — С. 525; Савіч-Забалоцкі Вайніслаў // Тамсама. — С. 535–339; Смірын Маісей // Тамсама. — С. 538–539; Яленскі Пётр // Тамсама. — С. 550; З гісторыі касцёлаў у Міёрах // Тамсама. — С. 566–567; Сядзіба ў Забалацці // Тамсама. — С. 568; Сядзіба ў Міжрэччы // Тамсама. — С. 569–570; Сядзіба

ў Крычаве // Тамсама. — С. 571–573; Гісторыка-краязнаўчы музей СШ № 3 // Тамсама. — С. 586–587; З гісторыі вёскі Узмены // Тамсама. — С. 608–611.

Артыкулы ў зборніках артыкулаў: Генерал Булак-Булаховіч — хто ён? // Браслаўскія чытанні: матэрыялы II навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 925-годдзю Браслава (1065–1990), 16–17 лютага 1991 г. / навук. рэд. М.А. Ткачоў. — Браслаў: Браслаўскі філіял Пастаўскай узбуйнёнай друкарні, 1991. — С. 20–21; Спадчына В. Ластоўскага // Беларусіка. — Мн., 1994; Да пытання будаўніцтва порту у Друі ў 1934–38 гг. // Браслаўскія чытанні: матэрыялы III навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 200-м угодкам паўстання 1794 года, 21–22 красавіка 1994 г. — Браслаў: Браслаўскі філіял Пастаўскай узбуйнёнай друкарні, 1994. — С. 23–26; Аўгуст Адлер з Друі і яго выданні // Браслаўскія чытанні: Матэрыялы IV навукова-краязнаўчай канферэнцыі, 24–25 красавіка 1997 г. — Браслаў, 1997. — С. 86–90; Арганаўты з Міёраў // Наш край. — 1996. — № 8; Улік і апрацоўка экспанатаў школьнага музея // Зборнік матэрыялаў па дзейнасці музеяў навучальных устаноў Віцебскай вобл. — Віцебск, 1998; Публіцыстыка Я. Купалы на ўроках гісторыі ў сярэдняй школе // Я. Купала — публіцыст: зборнік артыкулаў. — Мн., 1998; Чэслаў Сіповіч — служыў Богу і Беларусі // Браслаўскія чытанні: матэрыялы V навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 939-годдзю першай згадкі Браслава ў пісьмовых крыніцах. — Браслаў; Наваполацк: Усяслаў Чарадзей, 2001. — С. 41–43; С. Нарбут і яго сувязі са шляхтай Мёршчыны // Браслаўскія чытанні: матэрыялы VI навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 150-й гадавіне з дня нараджэння браслаўскага лекара, грамадскага дзеяча Станіслава Нарбута (1853–1926), 7–8 мая 2003 года. — Браслаў, 2003. — С. 41–43; З гісторыі Троіцкага касцёла ў Новым Пагосце, збудаванага на сродкі Льва Сапегі // Вялікі канцлер Вялікага княства. Да 450-годдзя з дня нараджэння Льва Сапегі: зб. матэрыялаў I Міжнародных Сапежанскіх чытанняў, 3–4 снежня, Брэст, II і III Рэспубліканскіх Сапежанскіх чытанняў, Віцебск, 28–29 чэрвеня 2003 г., Астроўна, 28–29 кастрычніка 2006 г.; склад., рэд. Г.М. Праневіч. — Мн.: І.П. Логвінаў, 2007. — С. 129–133.

Артыкулы ў рэспубліканскім перыядычным друку: Стары падручнік у новай вокладцы // НГ. — 1990; Паўмоўе манкуртаў // НГ. — 1991; Дзве плыні вялікае ракі // НГ. — 1993. — 8 мая; Храните деньги в горшке // Труд. — 2000. — 23 ліст.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: 1919 г. // СП. — 1977. — 5 сак.; Таямніцы роднага краю // СП. — 1977. — 5 ліст.; Паўстанне 1831 г. на Дзісненшчыне // СП. — 1978. — 3 чэрв.; Археалагічныя помнікі роднага краю // СП. — 1978. — 2 снеж.; Перабродздзе // СП. — 1979. — 4 снеж.; Захаваць для сябе і нашчадкаў // СП. — 1980. — 27 мая; Музей у школе // СП. — 1981. — 20 мая; Знаходка расказвае. Таямніца Чорнай тары // СП. — 1981. — № 143; Будзьце ўважлівыя // СП. — 1981; Новыя знаходкі // СП. — 1982. — 24 ліп.; Гісторыя аднаго скарба // СП. — 1982. — 6 лют.; Старажытныя прылады // СП. — 1982. — 19 снеж.; Паляўнічыя за таямніцаю // СП. — 1983. — 2 студз.; Іх памяць жыве // СП. — 1984. — 7 крас.; Я гэта бачыў // СП. — 1984. — 12 крас.; Пошук // СП. — 1984. — 9 жніўня; Напамін аб вайне // СП. — 1984. — 13 верас.; Старажытныя знаходкі // СП. — 1984. — 2 кастр.; Загадкавая рэліквія // СП. — 1984. — 4 снеж.; Шукаем і знаходзім // СП. — 1984; Іх памяць жыве // СП. — 1984; Таямніцы стагоддзяў // СП. — 1984; На вашу кніжную паліцу // СП. — 1985. — 17 чэрв.; Зарніцы // СП. — 1985. — 13 ліп.; Пошук // СП. — 1985; Заўсёды ў пошуку // СП. — 1985; Пачынальнік (Адкрытая кніга Міёршчыны) // СП. — 1986. —1 лют.; Па Індыі // СП. — 1986. — 25 мая – 1 чэрв.; Дакрануўшыся да таямніц // СП. — 1986. — 15 чэрв.; Прапануем прачытаць // СП. — 1986. — 5 ліп.; Прыцянуць да адказнасці // СП. — 1986. — 20 снеж.; Любіце і шануйце родную мову // СП. — 1987. — 29 студз.; Беларускі цар. Рэдкая знаходка. Сведка падзеі // СП. — 1987. — 3 лют.; Пошук // СП. — 1987. — 5 ліп.; Верныя свайму дэвізу // СП. — 1987. — 19 ліп.; Сведка падзей незабыўных // СП. — 1987. — 21 ліп.; Сустрэча з героем // СП. — 1987. — 24 ліст.; Рэха падзей 1812 г. // СП. — 1987. — 1 снеж.; Расчынім дзверы музея // СП. — 1988. — 2 крас, 17 крас, 17 мая; Новыя таямніцы // СП. — 1987. — 11 жніўня; Музей ў Браславе // СП. — 1988. — 19 ліст.; Імчала конніца Гая // СП. — 1988. — 26 ліст.; Сустрэча // СП. — 1988.; На кніжную паліцу // СП. — 1988. — 8 чэрв.; Пошук вядуць «Арганаўты мінулага» // БЗ. — 1989. — 15 жніўня; Міёрскія школьнікі на растоўскай зямлі // СП. — 1989. — 20 кастр.; З'езд апраўдаў мае надзеі // СП. — 1989. — 14 лют.; Свята роднай мовы // СП. — 1989. — 14 сак.; Таварыства беларускай мовы // СП. — 1989. — 18 ліп.; Адраджэнне народнага свята // СП. — 1990. — 11 студз.; Пошук гісторыі // СП. — 1990. — 19 лют.; Адкуль у вёскі імя? // СП. — 1990. — 6 сак.; Падпішыся на беларускія выданні // СП. — 1990. — 17 крас.; Край наш светлы, бо кніжны // ВР. — 1990. — № 81. — С. 4; Са старога беларускага гумару // СП. — 1990. — 30 чэрв.; Петра Просты — пісьменнік з Дзедзіна // СП. — 1990. — 18 снеж.; Ветэран // СП. — 1990. — 11 жніўня; З гісторыі Навалакі // СП. — 1990. — 16 ліст.; Верны сын маці-Беларусі // СП. — 1990. — 22 ліст.; Спытайце ў кнігарні // СП. — 1990. — 6 снеж.; Аднавіць справядлівасць // СП. — 1991. — 12 лют.; Тыдзень беларускай культуры // СП. — 1990. — 14 лют.; Міёры — Мёры // СП. — 1991. — 21 сак.; З камп'ютэрам па-англійску // СП. — 1991. — 16 крас.; Слова пра настаўніка: [Ф. Манцэвіч] // ВР. — 1991. — № 223. — С. 4; Таямніца Наўгародаў // СП. — 1992. — 4 студз.; Лондан і канферэнцыя ў гонар нашага земляка // СП. — 1992. — 18 крас.; Першыя жыхары нашага краю // СП. — 1992. — 5 лют.; Гісторыя вёсак і гаспадарка роднага краю ў мінулым // СП. — 1992. — 14 верас.; 1812 год // СП. — 1992. — 18 лют.; За гісторыяй Міёршчыны ў Пецярбург // СП. — 1992. — 14 верас.; На якой мове размаўлялі ў нас раней // СП. — 1992. 19 верас.; Краязнаўцы з Міёршчыны ў Польшчы // СП. — 1992. 26 верас.; Старонкі з ваеннай гісторыі // СП. — 1992. — 29 верас.; Нашы славутыя землякі // СП. — 1992. — 14 ліст.; Кароткая гісторыя Беларусі // СП. — 1992. — 5 снеж.; Тадэўш Даленга-Мастэвіч // Веснік Глыбоччыны. — 1993. — 22 студз.; З гісторыі Узмен // СП. — 1993. — 4 мая; Дзве плыні вялікае ракі // Настаўніцкая газета. — 1993. — 8 мая; Чырвоны «граф Суліма» з Белай Русі // СП. — 1993. — 24 чэрв.; Была школа ў Старым Пагосце // СП. — 1994. — 21 лют.; Падарунак. Межы не перашкода. Выстава да юбілею // СП. — 1994. — 26 ліп.; З гісторыі вёскі Чэрасы // СП. — 1994. — 16 жніўня; Прачытайце гэту кнігу // СП. — 1994. — 20 кастр.; Саюз палякаў // СП. — 1994. — 6 снеж.; Навінкі кніжных паліц // СП. — 1994. — 12 снеж.; Буквар з 1920 г. // СП. — 1995; Паўстанец з Забалацця: [Г. Дмахоўскі] // НС. — 1995. — № 118. — С. 5; Дзедзінскі палац // НС. — 1996. — № 115. — С. 6; Імя вядома // СП. — 1996. — 7 мая; Загінулі пад Монтэ-Касіна // СП. — 1996. — 18 жніўня; Сядзібаў Міжрэччы // СП. — 1997. — 22 крас.; Служыў Богу і Беларусі // СП. — НС. — 1996. — 29 жніўня; Гады не перашкода // НС. — 1996.; Арганаўты з Міёраў // Наш край. — 1996. — № 8; Асвея // НС. — 1996. — № 91. — С. 6; Числаў Сіповіч // СП. — 1996; Сядзіба ў Крычаве // СП. — 1997. — 8 мая; Ян Гушча // СП. — 1997. — 26 жніўня; Гісторык з Дзісны // СП. — 1997. —

5 мая; Аптэкар з Друі // БЗ. — 1997. — 23 жніўня; Браніслаў Туронак // СП. — 1997. — 9 верас.; З гісторыяй на «вы» // СП. — 1998; У музеях і бібліятэках Вільнюса // СП. — 1998. — 15 верас.; Край наш светлы, бо кніжны // ВР. — 1999. — 30 крас.; Згублена знаходка // СП. — 1999. — 20 ліп.; Канферэнцыя ў Глыбокім // СП. — 1999. — 20 ліп.; Скарбонка // СП. — 1999. — 26 чэрв.; Міёрам — 445 // СП. — 1999. — 26 чэрв.; Канферэнцыя ў Браславе // СП. — 2000. — 20 мая; Прафесар матэматыкі з Дзісны // СП. — 2000. — 14 чэрв.; Скарб з Дварчанаў // СП. — 2000. — 5 ліп.; Краязнаўчая вандроўка ў Лявонпаль // СП. — 2000. — 8 ліп.; 1812 год // СП. — 2000. — № 95; Таямнічы могільнік // СП. — 2001. — 19 чэрв.; Апошняя з роду Замбжыцкіх // СП. — 2001. — 18 верас.; Апошняя з роду Замбжыцкіх // Павет. — 2001. — № 1. — С. 3–4; Краязнаўчая вандроўка Дзісна – Язна // СП. — 2001. — 2 кастр.; Знаходка, якую даўно чакалі // СП. — 2001. — 9 кастр.; Мёры–Дзісна–Язна // Павет. — 2001. — № 2. — С. 5–6; Знаходка, якую даўно чакалі // Павет. — 2001. — № 3. — С. 2, 7; Таямнічы могільнік // Тамсама. — С. 4; Хірург Донат Масальскій // Павет. — 2002. — № 1 (5). — С. 3; Паляўнічыя за таямніцамі // Павет. — 2002. — № 6 (10). — С. 3, 8; З гісторыі роду Клёттаў // Павет. — 2003. — № 2 (15). — С. 4–5; Краязнаўчая вандроўка ў Казакова // Павет. — 2003. — № 9 (22). — С. 6–7; Сядзіба ў Каменполлі // Павет. — 2003. — № 12 (24). — С. 4; Перабродская валасць у 1873 годзе // Павет. — 2004. — № 4 (29). — С. 6; На берагах Павянужкі: Экспедыцыя «Арганаўтаў мінулага» // Павет. — 2004. — № 12 (37). — С. 4–6; Новае выданне аб Дзісненскай гімназіі // Павет. — 2004. — № 12 (37). — С. 8; З гісторыі сядзібы ў Ідолта // Павет. — 2005. — № 1 (38). — С. 4–5; Даследчыкі таямніц // Павет. — 2005. — № 7 (44), 8 (45); Ад гуртка да музея, ад музея — да малавывучаных старонак гісторыі: Накірункі дзейнасці археолага-краязнаўчага гуртка па выхаванні нацыянальнай самасвядомасці // КГ. — 2006. — № 23. — С. 4; Чым багатае Казакова? // КГ. — 2005. — № 17. — С. 1, 5; Досвед адной вандроўкі да былой вёскі // КГ. — 2007. — № 15–16, красавік. — С. 6; Залаты пярсцёнак Мёршчыны // Павет. — 2008. — № 4 (63). — С. 4–6; Тэкля Урублеўская // Павет. — 2008. — № 4 (63). — С. 7–8.

Літ.: Таляронак У. «Арганаўты» жывуць у Міёрах // ВР. — 1985. — № 34. — С. 4; Пучынскі Ул. Беларускі краязнаўчы музей у школе на фоне супярэчнасцяў // Настаўніцкая газета. — 1991. — 13 крас. — С. 1, 2; Масло Е. Аргонавты живут в Миорах // ТиО. — 1996. — Январь. — С. 5; Шпакоўская Г. Арганаўты мінула // НС. — 1996; Дзмітрыева Л. Падзвіжнік роднага краю // СП. — 1996. — 3 снеж. — С. 2,3; Ермаленок В.А. // Кто есть кто в Республике Беларусь. Т. 1. Наука, образование / под ред. И.В. Чекалова. — Мн.: Энциклопедикс, 2001. — С. 187; Ермалёнак В.А. // ЭГБ. — Т. 6. Кн. 2. — Мн., 2003. — С. 382; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Ермалёнак В.А. (25.11.2003) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Страбкова А. Спрадвечныя каштоўнасці беларусаў // НГ. — 2004. — 27 крас.; Ермалёнкі да дваццатага калена // НС. — 2004. — 22 чэрв. — С. 5; Кавалевіч А. І доўжыцца радавод // Міёрскія навіны. — 2005. — 7 чэрв. — С. 2; Сучасныя краязнаўцы Беларусі. Ермалёнак В.А. // КГ. — 2005. — № 21. — С. 3; Занкавец А. «Экспонаты для исторического музея можно найти везде» // ЗЮ. — 2005. — 29 ліп. — С. 3; Кавалевіч А. Бронзавы ліставей. — Полацк: Наследие Ф. Скорины, 2006. — С. 82–88; Шпакоўская Г. Краязнаўства — рухавік турызму // НС. — 2006. — 11 лют. — С. 3; Дрыла М. Далёка Эрмітажу да Міёраў // Звязда. — 2006. — 6 верас. — С. 4; Інтэрв'ю з В.А. Ермалёнкам (19.06.2007) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ЕРМАШКЕВІЧ** МІХАЛ ПЯТРОВІЧ (14.07.1966, г. Сянно), святар. Скончыў СШ № 1 г. Сянно (1983), мастацка-графічны факультэт ВДПІ (1989). Працаваў у Сенненскім доме піянераў (1989–1991). Уступіў у дамініканскі ордэн, вучыўся ў Папскай тэалагічнай акадэміі ў Кракаве (1991–1998). Служыў у касцёле Узвіжання Святога Крыжа ў г. Баранавічы (1998–2000), у касцёле Св. Барбары ў Віцебску (з 2000).

Вывучае гісторыю і культуру Віцебшчыны, гісторыю касцёла, культавую архітэктуру. Калі працаваў у Доме піянераў, вёў гурток архітэктуры. Разам з дзецьмі вырабіў з гіпсу макет Сенненскай Мікалаеўскай і Пакроўскай цэркваў, францысканскага касцёла, будынкі грамадзянскай архітэктуры XIX ст. Планаваў падрыхтаваць макет – гістарычную рэканструкцыю г. Сянно XIX ст. Аўтар артыкулаў на краязнаўчую, канфесійную і сацыяльную тэматыку на старонках перыядычнага друку.

Тв.: Каму будзе кепска?: [аб перадачы Сафійскага сабора вернікам] // ВР. — 1990. — № 119. — С. 6; Помнікі мінулага: [знішчаны касцёл у г. Сянно] // ГС. — 1992. — № 30. — С. 2; (разам з В. Бандарэвічам) Аб зямлі Сенненскай, старажытнай і заўсёды маладой // ГС. — 1992. — № 64, 72, 81, 100. — 1993. — № 3, 9, 11, 13; Канстантова: [пераклад матэрыялаў з кнігі Р. Афтаназі] // ГС. — 1998. — № 67. — С. 2.

Літ.: Скварцова Н. Архітэктурны гурток // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна / уклад. С.В. Шайко. — Мн.: Паліграфафармленне, 2003. — С. 566.



**ЕРМАШКЕВІЧ** ПЁТР ІВАНАВІЧ (21.09.1928, в. Матарэйшчына Сенненскага раёна), журналіст. Скончыў Гомельскае педагагічнае вучылішча. Працаваў электраманцёрам, выхавацелем у дзіцячым доме, радыётэхнікам, настаўнікам, літаратурным супрацоўнікам, заг. аддзела, намеснікам рэдактара Сенненскай раённай газеты «Ленінская іскра». Браў удзел у стварэнні кнігі «Памяць» Сенненскага раёна. Аўтар шэрагу артыкулаў пра людзей Сенненскага раёна, падзеі Вялікай Айчыннай вайны, тапаніміку на старонках перыядычнага друку («Віцебскі рабочы», «Голас Сенненчыны»).

Тв.: Артыкулы ў кнізе «Памяць»: Селянін, марак, рабочы: [М.М. Шубка] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна / уклад. С.В. Шайко. — Мн.: Паліграфафармленне, 2003. — С. 88; У баях за Сянно // Тамсама. — С. 141; Назвалі гармату «Марфутай» // Тамсама. — С. 240; І лячылі, і ваявалі // Тамсама. — С. 240–242; Героі-вызваліцелі // Тамсама. — С. 292–293; З кагорты герояў // Тамсама. — С. 299; …Той памятны бой // Тамсама. — С. 299–300; Подзвіг штурмана // Тамсама. — С. 300–301; Устаноўленыя імёны // Тамсама. — С. 303; Вучоныя // Тамсама. — С. 538–540.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: (разам з П. Бельскім) Беражліва захоўваць культурную спадчыну: [справаздачная канферэнцыя Сенненскага раённага аддзялення БДТАПГіК] // ЛІ. — 1989. — № 37. — С. 2, 3; Партызанскімі сцежкамі, франтавымі дарогамі: [Г.К. Грабельнік] // ЛІ. — 1990. — № 62. — С. 3; Адважны кулямётчык: [У.П. Алейнікаў] // ЛІ. — 1990. — № 75. — С. 2, 4; Равеснік стагоддзя: [Д.Л. Грэбнеў] // ЛІ. — 1990. — № 92. — С. 2; Там, дзе ішлі на прарыў: [Ушачы] // ЛІ. — 1991. — № 114. — С. 2; Партызанскі разведчык: [Г.П. Ганчарэнка] // ГС. — 1993. — № 65. — С. 2; Ад Хасана да Кенігсберга: [С.М. Кухаронак] // ГС. — 1993. — № 82. — С. 2; Радкі з ненапісанай кнігі // ГС. — 1996. — № 37. — С. 2; Святло ведаў у глыбінцы. Расоснянскай школе — 110 гадоў // ВР. — 1997. — № 4. — С. 5; (разам з М. Камаром) Подзвіг у небе // Тамсама; З разліку партызанскай гарматы: [У.Ф. Якуш] // ГС. — 2001. — № 31. — С. 2; Партызан-кулямётчык: [В.Б. Воранаў] // ГС. — 2001. — № 46. — С. 2; Апошнія хвілітны Гараўца // ГС. — 2001. — № 53–54. — С. 2; Служыў на Байкануры: [Ц.Ц. Цеплякоў] // ГС. — 2003. — № 83. — С. 2; Лёс авіятара, педагога: [П.Т. Зайко] // ГС. — 2004. — № 30. — С. 2; Дзень першы мірны: [Л.П. Валынка] // ГС. — 2005. — № 30. — С. 2; У дружбе з друкаваным словам: [«Голас Сенненчышы»] // ГС. — 2005. — № 40. — С. 2; У небе і на зямлі Каўказа: [М.І. Акулёнак] // ГС. — 2006. — № 2. — С. 2, 3; Адкуль назвы: [тапаніміка Сенненшчыны] // ГС. — 2006. — № 37–38. — С. 3, 4.

Літ.: З юбілеем, Пётр Іванавіч // ГС. — 2003. — Верас.

Ж**АБРОЎСКІ** ГЕНРЫК (1923, в. Міхнічы Пастаўскага пав. Віленскага ваяводства – 1996), краязнаўца, інжынер-гідролаг. Скончыў 2 класы Пастаўскай гімназіі. У гады Другой сусветнай вайны ўдзельнічаў у антыфашысцкім супраціве (партыз. атрад «Бура» АК). У 1944 г. быў мабілізаваны ў СА і служыў у чыгуначных войсках, потым ў Войску Польскім. Скончыў Варшаўскую Політэхніку. Працаваў у Польскім інстытуце гідралогіі і метэаралогіі (Беласток, Вроцлаў). Узначальваў гідралагічна-метэаралагічную станцыю ў г. Новы Сонч. Узнагароджаны залатой адзнакай «За заслугі ў барацьбе з паводкай».



Напісаў успаміны аб сваім побыце ў войску ў час вайны. Збіраў матэрыялы па гісторыі Пастаўшчыны. Аўтар працы, прысвечанай в. Міхнічы ў Пастаўскім раёне, якую пераклаў з польскай і выдаў М. Гіль. Зрабіў картасхему г. Паставы 1939 г. Знайшоў, запісаў і пераклаў на польскую мову народны лучайскі верш «Кірха», прысвечаны барацьбе сялян у 1905 г.

Тв.: Манаграфія вёскі Міхнічы і ваколіц у Пастаўскім павеце на Віленшчыне / пераклад М. Гіля. — Паставы: Сумежжа, 2005. — 118 с.; Кірха // Дзе Мядзелка песні пяе… Пастаўшчына літаратурная. — Мн., 2006. — С. 47–48.

Літ.: Сідарэвіч А. Выдадзена ў Паставах // НН. — 2005. — № 29. — С. 8; Дзе Мядзелка песні пяе… Пастаўшчына літаратурная. — Мн., 2006. — С. 257–258.

**ЖУКОЎСКІ** ВІКТАР ВАСІЛЬЕВІЧ (12.08.1955, г. Маладзечна), педагог, краязнаўца. Скончыў СШ № 4 г. Маладзечна (1972), геаграфічны факультэт БДУ (1981). Працаваў на радыё механікам, інжынерам у аддзеле камплектацыі Маладзечанскага радыёзавода «Спутник» (1972–1974), настаўнікам геаграфіі, намеснікам па выхаваўчай працы ў СШ № 18 г. Оршы (Барані). Служыў ва УС СССР (1972–1974). Сапраўдны член Геаграфічнага таварыства Беларусі (2002). Жыве ў г. Барані Аршанскага раёна Віцебскай вобл.

Яшчэ ў дзяцінстве цікавіўся гісторыяй мясцовасці пражывання. Пэўны ўплыў аказаў дырэктар Маладзечанскага краязнаўчага музея Г. Каханоўскі, які пражываў па суседстве. Больш сур’ёзна вывучэннем роднага краю заняўся пад час працы ў школе. Даследуе геаграфію, гісторыю і культуру г. Оршы, Аршанскага раёна, г. Барані, гісторыю СШ № 18. У пачатку 1990-х гг. пачаў займацца велатурызмам. Сабраныя на працягу вывучэння краю матэрыялы пачаў афармляць і друкаваць у часопісах «География в школе», «Пазашкольнае выхаванне», мясцовым перыядычным друку.

Падрыхтаваў да выдання геаграфічны даведнік «Физическая география Оршанского района». Браў удзел у стварэнні зборніка «Мой родны край — Аршаншчына», аўтар чатырох артыкулаў, прысвечаных прыродзе краю. Напісаў і выдаў вучэбны дапаможнік «Оршеведение» (2002, 2008), «Город Барань» (2004), а таксама некалькі буклетаў. Аўтар шэрагу артыкулаў у перыядычным рэспубліканскім і мясцовым друку («Краязнаўчая газета», «Настаўніцкая газета», «Віцебскі рабочы», «GzN»). У «Аршанскай газеце» надрукаваў серыю артыкулаў, прысвечаных 400-годдзю г. Барані, а таксама некаторыя раздзелы выдання «Оршеведение». Падтрымлівае сувязі з Геаграфічным таварыствам Беларусі, Цэн-









трам дзіцяча-юнацкага турызму і краязнаўства г. Оршы, музейным комплексам гісторыі і культуры Аршаншчыны.

Тв.: Кнігі і брашуры: Физическая география Оршанского района: [саматуж. выд.]. — Мн., 1999. — 56 с.; Оршеведение. — Орша: Диаль, 2002. — 120 с.; Город Барань. В помощь изучающим оршеведение. — Орша: Диаль, 2004. — 40 с.; (разам з А. Яковіным) XXX лет государственной общеобразовательной школе № 18 г. Барани: [саматуж. выд.]. — Орша, 2005. — 44 с.; Выхаваўчая работа ў ДАСШ № 18 г. Барані на старонках «Аршанскай газеты». — Барань, 2005. — 43 с.; (разам з Н. Івановай) Улицы города Барани: [саматуж. выд.]. — Орша, 2006. — 60 с.; Велосипедные походы ГОСШ № 18 г. Барани: [саматуж. выд.]. — Орша, 2006. — 56 с.; (разам з Д. Радкевіч) ГОСШ № 18 г. Барани на страницах оршанских газет. — Орша, 2007. — 50 с.; Оршеведение: производственно-практическое издание. — 2-е изд. — Орша: Оршанская типография, 2009. — 208 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Рэльеф Аршанскага раёна // Мой родны край — Аршаншчына: гісторыка-краязнаўчы зборнік для пачатковага азнаямлення / аўт.-саст. Т.М. Вароніна, А.М. Шышкевіч. — Віцебск: Віцебская друкарня, 2000. — С. 6–8; Рэкі Аршаншчыны // Тамсама. — С. 8–12; Азёры нашага раёна // Тамсама. — С. 12–15; Клімат Аршанскага раёна // Тамсама. — С. 38–42; Есть такой курс Оршеведение // БД. — 2001. — № 7; Рэгіянальная геаграфія: Праблемы развіцця і выкладання // Оршеведение: вчера, сегодня, завтра. — Могилев, 2004; Курс «Оршеведения» // Румлёўскія чытанні. Навукова-практычная канферэнцыя, 17 лютага 2005, г. Гродна. — Гродна, 2005.

Артыкулы ў перыядычным друку: На радзіме пісьменніка: [В. Дунін-Марцінкевіч] // АГ. — 1994. — № 36. — С. 3; Наш Дняпро // АГ. — 1994. — № 86. — С. 3; Клімат Аршаншчыны // АГ. — 1996. — № 143–144; Настаўнік настаўнікаў Аршаншчыны: [А.А. Задраеўскі] // АГ. — 1998. — № 103. — С. 2; Вуліцы горада: [Барані — 400] // АГ. — 1998. — № 110. — С. 3; Фірма Лёс // АГ. — 1998. — № 112. — С. 3; Музеі // АГ. — 1998. — № 121. — С. 2; Мой родны горад // АГ. — 1998. — № 127; Оршазнаўства // АГ. — 1999. — № 132. — С. 3; Тыдзень — «Оршазнаўству» // АГ. — 1998. — № 145; Школьнікі пра «Оршазнаўства» // АГ. — 2000. — № 15. — С. 2; Збіралі легенды // АГ. — 2001. — № 6. — С. 4; Балоты Аршаншчыны // АГ. — 2001. — № 65. — С. 3; Оршанский замок // АГ. — 2003. — № 96–97. — С. 8.

Літ.: Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 12; Барыс С. Аршазнаўства // БГЧ. — 2003. — № 8. — С. 71–72; Маркевіч М. Усё пра Аршаншчыну: [рэц. на кнігу «Оршеведение»] // НС. — 2003. — № 38. — С. 5; Маркевіч М. Усё пра ўсё і для ўсіх узростаў: [«Оршеведение» В. Жукоўскага] // АГ. — 2003. — № 44. — С. 2; Маркевіч М. Подарок городу и району: [рэцэнзія на кнігу Жукоўскага В. «Физическая география Оршанского района»] // АГ. — 2006. — № 115. — С. 3; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Жукоўскі В.В. (21.10.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ЖУРАЎЛЁВА** (Казначэева) ЗІНАІДА АНДРЭЕЎНА (28.05.1927, ст. Аўраамская Гомельскай акругі), гісторык, архівіст. Скончыла СШ у г. Барысаглебску Варонежскай вобл. (1945), МДГАІ (1949). Працавала ст. навуковым супрацоўнікам Дзяржархіва Баранавіцкай вобл. (1949–1953). З 1953 г. на Віцебшчыне. Займала пасады ст. навуковага супрацоўніка, ст. інспектара па асноўнай дзейнасці архіўнага аддзела Віцебскага аблвыканкама, навуковым супрацоўнікам партархіва Віцебскага абкама КПБ, заг. архіўнага аддзела Віцебскага аблвыканкама (1953–1983).

Зрабіла вялікі ўклад у развіццё архіўнай галіны на Віцебшчыне. Кваліфікавана кіравала архіўнымі ўстановамі вобласці. З'яўлялася кансультантам шэрагу навукова-даследчых тэм па архівазнаўстве. Неаднаразова прымала ўдзел у навуковых канферэнцыях архівістаў СССР і БССР.

З'яўлялася членам рэдкалегіі і складальнікам даведніка «Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. і яго філіял у Полацку (1917–1941)», аўтарам «Очерков по истории г. Орши» (1962, 1967). Праводзіла значную працу па выяўленні дакументаў для зборнікаў «Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии» (1957), «Комитеты бедноты в БССР» (1958), «Революционные комитеты в Белоруссии» (1961).

Аўтар шэрагу артыкулаў у мясцовым перыядычным друку. Актыўна прымала ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні радыё і тэлеперадач на тэмы: «Віцебшчына перадваенная», «Пісьмы працоўных Віцебшчыны У. І. Леніну», «Першамай 1920 г. на Віцебшчыне», «З гісторыі Віцебскай камсамольскай арганізацыі», «З гісторыі забастовачнага руху рабочых ільнопрадзільнай фабрыкі "Дзвіна" (1900–1917)» і інш. (каля 40 перадач). Выступала з лекцыямі і дакладамі перад грамадскасцю, з'яўлялася сакратаром Навуковага савета пры архіўным аддзеле Віцебскага аблвыканкама, членам бюро Віцебскага гарадскога аддзялення БДТАПГіК.

Заслужаны работнік культуры БССР. Узнагароджана медалямі «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І. Леніна», «Ветэран працы», Ганаровымі граматамі ВС БССР.

Тв.: Орша: историко-экономический очерк. — Мн.: Беларусь, 1962. — 124 с.; (разам з М.Л. Байновай) От рабочего контроля к государственному управлению промышленностью // ВР. — 1957. — 2 чэрв. — С. 2; (разам з В. Глушко, Т. Кастенюк) У авангардзе ардэнаноснага калектыву // ВР. — 1971. — 9 верас. — С. 2; (разам з Т.Н. Костенюк) Коммунисты всегда впереди. К 90-летию станкостроительного завода им. Коминтерна // ВР. — 1972. — 9 верас. — С. 3; (разам з Т. Касцянюк) У авангардзе калектыву // ВР. — 1973. — 9 чэрв. — С. 3.

Літ.: ДАВВ. Ф. 1-п, воп. 179, спр. 86; Ф. 289, воп. 1-к, спр. 125 (Асабовая справа З.А. Жураўлёвай); Долгова А.В. Журавлева З.А. // Витебщина архивная: История, фонды, персоналии, сер. XIX–XX вв. — Мн.: БелНДІДАС, 2002. — С. 185; Жураўлёва З.А. // Архівісты Беларусі: біябібліяграфічны даведнік / склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. — Мн.: БелНДІДАС, 2006. — С. 103.



**ЖЫГУНОЎ** АЛЯКСАНДР (Алесь) МІХАЙЛАВІЧ (27.02.1954, в. Тройца Шклоўскага раёна), журналіст, паэт. Скончыў Старасельскую ПШ, Новабрашчынскую СШ (1970), філал. факультэт БДУ (1976). Працаваў дырэктарам клуба ў в. Баркі Шклоўскага раёна, настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Чарневіцкай СШ Глыбоцкага раёна (1976–1980), карэспандэнтам Глыбоцкага раённага радыё, карэспандэнтам раённай газеты «Шлях Перамогі» (цяпер «Веснік Глыбоччыны»), настаўнікам у Плiскай СШ (з 1992). Аўтар артыкулаў, прысвечаных людзям культуры Глыбоччыны. Член Саюза пісьменнікаў (1982).

Тв:. Не маем права занядбаць. Да 100-годдзя Я. Драздовіча // ШП. — 1988. — № 8. — С. 2; Вяртанне Алеся Дубровіча // ВР. — 1988. — № 215. — С. 4; Я — Драздовіч Язэп // ШП. — 1988. — № 121. — С. 3; «Я — Драздовіч Язэп» // ВР. — 1988. — № 192. — С. 3; Ведай свой край, даражы яго мінулым: Я — Язэп Драздовіч // ЛТ. — 1988. — № 124. — С. 1; Паэт Янка Пачопка // ШП. — 1989. — № 5. — С. 2; Цёркін з Шыцікаў // ШП. — 1990. — № 63. — С. 3; З пяшчотай і журбой, або Вырас у глыбінцы паэт: [М. Баравік] // ВР. — 1991. — № 57. — С. 3; Чарневічы на карце Глыбоччыны // ВГл. — 2007. — 29 жніўня. — С. 3.

Літ.: Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 418; Пісьменнікі Віцебшчыны: даведнік. — Віцебск: ВАД, 2001. — С. 33.

**ЖЫЖНЕЎСКАЯ** НАТАЛЛЯ ВАСІЛЬЕЎНА (30.04.1923, в. Чаравяты Ушацкага раёна Віцебскай вобл. – 4.05.2009), краязнаўца. Скончыла Віцебскае педагагічнае вучылішча (1941), аддзяленне журналістыкі Мінскай вышэйшай партыйнай школы (1964). Працавала ў Кастрычніцкім райкаме камсамола г. Віцебска, рэдакцыі газеты «Віцебскі рабочы», загадчыкам аддзела пісьмаў рэдакцыі газеты «Калгасная трыбуна» («Ленінская праўда») Віцебскага раёна (з 1954). Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны.

У віцебскай раённай газеце «Ленінскі прызыў» вяла рубрыку «Летапіс народнай славы», прысвечаную гісторыі Віцебскага раёна ад Кастрычніцкай рэвалюцыі. З мэтай падрыхтоўкі матэрыялаў для гэтай рубрыкі збірала матэрыялы па гісторыі раёна савецкага перыяду. Аўтар шэрагу артыкулаў пра герояў вайны і працы, лепшых людзей Віцебскага раёна.

Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, іншымі медалямі СССР, Ганаровай граматай ВС БССР.

Тв.: Віцебскі раён // ЭГБ. Т. 2. — С. 335–336.

Артыкулы ў перыядычным друку: Подзвігу жыць вечна: [Герой Савецкага Саюза Г.Ф. Пацёмкін] // Лпр. — 1975. — 20 лют.; Першая Беларуская. Летапіс народнай славы // ЛПр. — 1985. — № 36. — С. 3; Саратнік Ільіча: [М.М. Барадзін] // ЛПр. — 1985. — № 48. — С. 3; Дарога да Берліна // ЛПр. — 1985. — № 49. — С. 3; (разам з В. Кухаравай) Шлі з баямі 51-я і 39-я // ЛПр. — 1985. — № 54. — С. 3; Тут быў здзейснены подзвіг: [в. Старае Сяло] // ЛПр. — 1985. — № 64. — С. 3; Падзяліся з людзьмі багаццем: [бібліятэка ў п. Кіраўскі] // ЛПр. — 1985. — № 73. — С. 2; Карэнні ў народзе: [адукацыя ў Віцебскім раёне ў сав. часы] // ЛПр. — 1985. — № 76. — С. 3; Прысягнуўшыя зямлі: [сям'я Сафрончыкаў з в. Астраўскія Віцебскага раёна] // ЛПр. — 1985. — № 82. — С. 2; Імя Чырвонасцяжнага Ленінскага камсамола // ЛПр. — 1985. — № 112. — С. 3; Імя, авеянае легендамі // ЛПр. — 1985. — № 135. — С. 3; У баях за вызваленне роднага краю) // ЛПр. — 1986. — № 33. — С. 3; Экіпаж: [гібель сав. самалёта каля в. Загор'е] // ЛПр. — 1988. — № 152. — С. 2; Сэрцы, аддадзеныя людзям // ЖП. — 1998. — № 51. — С. 2.

Літ.: Краязнаўцы Віцебскага раёна // Памяць: Віцебскі раён: Гісторыка-дакументальная хроніка / уклад. У.І. Мезенцаў. — Мн.: Маст. літ., 2004. — С. 723; Жижневская Н.В.: [некралог] // ЖП. — 2009. — 8 мая. — С. 6.



**ЗАБАЎЛЕНКА** (Яфрэмава) ЛІЛІЯ ПЯТРОЎНА (20.03.1946, г. Сураж Віцебскага раёна), краязнаўца. Скончыла факультэт нямецкай мовы МДПІЗМ. Працавала настаўніцай нямецкай мовы ў Суражскай СШ (1968–1971), у Віцебскім бюро па працаўладкаванні насельніцтва (1972–1985), на розных пасадах на мэблевай фабрыцы, у Заронаўскай, Астраўской БШ Віцебскага раёна.

Да вывучэння роднага краю падштурхнула знаёмства з віцебскім краязнаўцам А.М. Падліпскім, а таксама супрацоўніцтва з А.Т Самойлавым (2001–2008). Цікавіцца гісторыяй Суража, былых памешчыцкіх сядзіб у Брытполлі, Касплянах. Фотааматар. Арганізавала некалькі фотавыстаў (сярод іншых «Мой Сураж»), якія дэманстраваліся ў «Музычнай гасцёўні» г. Віцебска, школах і бібліятэках Віцебскага раёна. Аўтар каляровага буклету «Сураж. 440 лет» выдадзенага за кошт земляка Л. Якаўлева, а таксама артыкулаў у мясцовым перыядычным друку, у якіх прапагандуе гісторыю і культуру Суража, жыццёвыя лёсы суражан («Народная газета», «Народнае слова», «Жыццё Прыдзвіння»). Паэт. Аўтар паэтычных зборнікаў, у якіх апявае прыгажосць роднага краю: «С любовью к Суражу», «Песни о Сураже родном» (2007).

Тв.: Сураж. 440 лет: [буклет]. — Витебск, 2004; Из истории Суража // ВК. — 2001. — № 70. — С. 3; Самый красивый дом в поселке: [п. Лужасна] // НС. — 2007. — № 106. — С. 4.

Літ.: Подлипский А. С любовью о Сураже: [рэц. на кнігу Л. Забаўленка] // НС. — 2004. — № 120. — С. 2; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Забаўленка Л.П. (12.04.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ЗАБЭЛА** (Забелло) ЛЕАНІД АЛЯКСАНДРАВІЧ (?–1.08.1996), краязнаўца. Стваральнік Музея віцебскага трамвая і прапагандыст ведаў пра электрычны транспарт у Віцебску. Працаваў у Віцебскім трамвайна-тралейбусным упраўленні (1959–1985). Звярнуў увагу на тое, што ні жыхары горада, ні нават супрацоўнікі трамвайна-тралейбуснага ўпраўлення не ведаюць, што віцебскі трамвай старэйшы ў БССР. Стаў збіраць матэрыялы, паставіўшы мэтай напісанне кнігі і стварэнне музея. Запісваў успаміны работнікаў дарэвалюцыйных часоў, працаваў у архівах Беларусі (НАРБ, ДАВВ, БДАКД). На працягу 1966, 1974, 1985 гадоў падрыхтаваў тры экспазіцыі. У 1978 г. было прынята рашэнне аб стварэнні музея, які быў адкрыты ў 1985 г.




На аснове сабранай інфармацыі падрыхтаваў рукапіс, на матэрыялах якога былі выдадзены кнігі «История Витебского трамвая» (1998) і «История электрического транспорта Витебска 1898–2003» (2003).

Тв.: История витебского трамвая. — Витебск: ВОУТ, 1998. — 128 с.; История электрического транспорта Витебска 1898–2003 гг. — Витебск: ВОУТ, 2003.; Бяжыць па гораду трамвай // ВР. — 1988. — № 152. — С. 4.

Літ.: Гончарова В. Летописец родного предприятия: [Л. Забэла] // НС. — 1997. — № 71. — С. 3; История электрического транспорта Витебска 1898–2003. — Мн.: ЮСТМАН, 2003. — 144 с. — С. 5–8.

**ЗАБЭЛА** ЯЎГЕНІЎШ (Eugeniusz Zabiełło) (1920), краязнаўца. Жыве ў Польшчы. Вучыўся ў Дзісненскай гімназіі (1934–1939). Удзельнік Другой сусветнай вайны. Ваяваў у 2-й арміі Войска Польскага (з 1944). Скончыў медыцынскі факультэт Познаньскага ўніверсітэта. Служыў ваенным урачом (1952–1977). На пенсіі зацікавіўся гісторыяй малой радзімы. Аўтар кніг па гісторыі Дзісны, Беразвечча.

У кнізе «Дзісна — бастыён на Дзвіне» (1998) разглядае гісторыю месца ад старажытнасці да 1944 г. Выданне мае 26 раздзелаў і дадаткі. Напісана на высокім навуковым узроўні, мае 290 спасылак на крыніцы. Асаблівую каштоўнасць уяўляюць 5 і 6 часткі, дзе сабраны матэрыялы пра горад у міжваенныя гады (1919–1939). Мае больш за сто ілюстрацый. Пераказ кнігі ў рэдакцыі Л. Матэленка змешчаны ў міёрскай газеце «Сцяг працы». У выданні падаецца гісторыя горада як аплота «пальшчызны» на ўсходзе II Рэчы Паспалітай.

Кніга «Беразвечча на службе Бога і ва ўладзе дэманаў», выдадзена Таварыствам аматараў Вільні і віленскай зямлі (аддзел у Быдгошчы). На аснове мясцовых матэрыялаў у кнізе

прадстаўлена гісторыя Беразвечча, славутага базыльянскага кляштара. Распрацаваны новыя, маладаследаваныя беларускай гістарыяграфіяй тэмы: «Ільняная доследная станцыя ў Беразвеччы», «Корпус аховы памежжа ў Беразвеччы», «Савецкая акупацыя ў 1939–1941 гг.», «Нямецкая акупацыя ў 1941–1944 гг.». Раздзел, прысвечаны падзеям 1939–1941 гг., займае амаль траціну кнігі. У ім апісаны трагічны лёс вязняў турмы НКУС № 28, якая месцілася ў былым базыльянскім кляштары, і так званы «марш смерці» Беразвечча – Ула. У кнізе 55 ілюстрацый.

Тв.: Dzisna bastion nad Dźvina. — Bydgoszcz, 1998. — 400 s.; Berezwecz w służbie bóga i w mocy demonyw. — Bydgoszcz, 2000. — 128 s.
Літ.: Ермалёнак В. Дзісна «бастыён на Дзвіне» // СП (М). — 1999. — № 60. — С. 3; Скрабатун У. Навінкі з кніжнай паліцы // ВГ. — 2000. — № 25. — С. 4; Дзісна — бастыён над Дзвіной // СП (М). — 2000. — № 16–27.

**ЗАВІША** БАГУСЛАЎ (сапр. Станіслаў Вангін), аўтар кнігі «Вандроўнікі з-над Дзвіны». У выданні падаецца гісторыя роду з 1890-х па 1990-я гг. Віцебшчыне прысвечаны гады 1890-я, калі сям'я жыла ў мясцовасці Геленполь (Выгары) на правым беразе Дзвіны, і 1920–1930-я гг. на Браслаўшчыне.

Тв.: Wędrowcy znad Dźwiny. — Warszawa: Piotrowska M., 1999. — 124 s.

**ЗАДОРА-ЧЫЖЭЎСКІ** МІРАСЛАЎ УЛАДЗІМІР ЕПІФАН (M. Zadora-Ciszewski) (7.04.1889, г. Кракаў – 23.11.1964), мемуарыст. Скончыў гімназію імя Яна Сабескага ў Кракаве (1909), філасофскі факультэт Ягелонскага ўніверсітэта ў Кракаве (1912) па спецыяльнасці сельская гаспадарка. Арандаваў маёнтак на Віцебшчыне. У Першую сусветную вайну быў у эвакуацыі ў Волагдзе, потым выехаў на Віленшчыну, удзельнічаў у савецка-польскай вайне, займаў пасады павятовага камісара, старасты ў Гродне і Вілейцы. Атрымаўшы ад дзяржавы за службу маёнтак Узмёны (цяпер Міёрскі раён), потым Бірукі ў гміне Новы Пагост (цяпер Міёрскі раён), стварыў узорную гаспадарку, удзельнічаў у грамадска-палітычным жыцці краю. З пачаткам Другой сусветнай вайны і далучэннем Заходняй Беларусі да БССР выехаў у Літву, дзе жыў з сялянскай працы. Вярнуўся ў Бірукі (1941–1943), жыў у Друі, ратуючыся ад савецкіх партызан (1943–1944). Пасля заканчэння вайны выехаў у ПНР, жыў у г. Гліўцы. Аўтар кнігі «Мае ўспаміны з Браслаўшчыны 1918–1939».

Тв.: Moje wspomnienia z Brasławszczyzny, 1918–1939.
Літ.: Ciszewska-Wusatowska A. Nota biograficzna // Moje wspomnienia z Brasławszczyzny, 1918–1939. — S. 1–5.



**ЗАЙЦАВА** НАТАЛЛЯ ВІКТАРАЎНА (7.04.1973, г. Віцебск), педагог, метадыст. Скончыла аддзяленне беларускай філалогіі і гісторыі ВДУ (1996). Працавала ў СШ № 32 г. Віцебска ст. піянерважатай, настаўніцай беларускай мовы і літаратуры (1990–1991). З 1993 г. працуе метадыстам аддзела беларусазнаўства і краязнаўства ў ВАААППДіП. Краязнаўствам стала займацца ў 1989 г., як удзельніца краязнаўчага гуртка пад кіраўніцтвам А.В. Куржалава і настаўніцы СШ № 32 Т.І. Сімашка.

Займаецца вывучэннем этнаграфіі, фальклору, геральдыкі, мастацтва Віцебшчыны. Брала ўдзел у зборы прадметаў для краязнаўчага кутка пры ВАААППДіП, збірала матэрыялы пра жыццёвы і творчы шлях М. Матукоўскага для літаратурнага музея г. Віцебска. Удзельнічала ў шэрагу этнаграфічных экспедыцый, рэспубліканскіх краязнаўчых чытанняў, брала ўдзел у правядзенні краязнаўчых летнікаў.

З'яўляючыся метадыстам аддзела беларусазнаўства і краязнаўства, вядзе значную метадычную работу па развіцці школьнага краязнаўства ў Віцебску і Віцебскай вобл. Рэдактар зборніка матэрыялаў «Легенды і паданні Віцебшчыны» і артыкулаў у ім, напрыклад, «Свой край у пашане мець прымусь» (да 120-годдзя са дня народзінаў Я. Купалы і Я. Коласа). Аўтар артыкулаў, прысвечаных школьнаму краязнаўству ў педагагічным друку (часопісах «Праблемы выхавання», «Пазашкольнае выхаванне», «Адукацыя і выхаванне»), рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Легенды і паданні Віцебшчыны: зборнік матэрыялаў абласнога конкурса «Легенды і паданні роднага краю» / склад. Н. Зайцава. — Віцебск, 2002. — 143 с.
Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Зайцава Н.В. (23.06.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ЗАЙКОЎСКІ** ЭДВАРД МІХАЙЛАВІЧ (18.11.1952, в. Дубашы Валожынскага раёна Мінскай вобл.), археолаг. Кандыдат гіст. навук (1985). Скончыў гіст. факультэт БДУ (1975), аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР (1977–1980). Працуе ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі (з 1980).

Даследуе помнікі неаліту і бронзавага веку, язычніцкія вераванні і першабытнае мастацтва на тэрыторыі Беларусі. На тэрыторыі Віцебшчыны раскопваў паселішчы каля вёсак Бабінавічы ў Лёзненскім раёне, Ворань у Лепельскім, Пліса ў Глыбоцкім раёне, Задзеўскае ў Пастаўскім раёне, тарфянікавыя паселішчы Крывіна-2 і Крывіна-3 у Сенненскім раёне. Абараніў кандыдацкую дысертацыю «Неолит и бронзовый век Белорусского Подвинья» (1985).

Вывучае гісторыю духоўнай культуры, рэлігіі на беларускіх землях. Выявіў і даследаваў шэраг месцаў, звязаных з адпраўленнем язычніцкіх культаў на тэрыторыі Віцебшчыны. Праводзіў раскопкі язычніцкіх свяцілішчаў каля вёсак Турэц Полацкага раёна, Краснікі Докшыцкага раёна. Аўтар навукова-папулярных прац, прысвечаных старажытнаму мастацтву.

Тв.: Першабытныя помнікі Паўночнай Беларусі. — Мн.: Навука і тэхніка, 1990. — 44 с.; (разам з Л. Дучыц) Жыватворныя крыніцы Беларусі. — Мн.: Ураджай, 2001. — 111 с.

Літ.: Зайкоўскі Э.М. // ЭГБ. — Т. 3. — Мн.: БелЭн., 1993. — С. 395; Корзенко Г.В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник. — Мн.: Бел. наука, 2007. — С. 131.

**ЗАКОННІКАЎ** ІВАН, педагог, краязнаўца. Бацька паэта Сяргея Законнікава. Працаваў настаўнікам ва Ушацкім раёне. Адшукаў у в. Глыбачка Ушацкага раёна магілу Фелікса Тапчэўскага, літаратара, які стаяў ля вытокаў сучаснай беларускай мастацкай літаратуры.

Літ.: Чарняўская С.С. Фелікс Тапчэўскі — хто ён? // ПВ. — 1999. — № 99. — С. 2; Карлюкевич А. Храня сознание о былом // Моя Толочинщина: Страницы истории. — Мн.: Бизнесофсет, 2005. — С. 7.



**ЗАЛІЛАЎ** ІГАР ЗУФЕРАВІЧ (3.12.1941), краязнаўца. Скончыў БДУ (1981). Працаваў у Полацкім гісторыка-археалагічным запаведніку, у тым ліку і дырэктарам.

Вывучае помнікі эпіграфікі. Даследуе тэксты і выявы на каменных крыжах і культавых камянях Полаччыны. Займаецца зборам і вывучэннем графіці Полацкіх храмаў. Рыхтуе да выдання кнігу па графіці Сафійскага сабора і Спаса-Праабражэнскай царквы. Працуючы ў ПГАЗ, выступіў адным з ініцыятараў некаторых мерапрыемстваў па папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны Полаччыны. Напрыклад, разам з супрацоўнікамі запаведніка выступіў з прапановай перамяшчэння аднаго з Барысавых камянёў з рэчышча р. Заходняя Дзвіна ад в. Падкасцельцы на тэрыторыю полацкага Верхняга замка, што і было зроблена з дазволу Міністэрства культуры БССР і АН БССР (1983, кастрычнік).

Браў удзел у працы гісторыка-культурнага аб'яднання «Маладзік» у Полацку (1987–1989).

Тв.: (разам з В. Гліннікам) Калажанскія графіці з XIII ст. // Гісторыка-археалагічны зборнік. — 1996. — № 8. — С. 85–88.

Літ.: Каментар да артыкула «Полацкія краязнаўцы» / падр. С.У. Глушкоў (2.04.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ЗАМАЛІНА** ЛЮДМІЛА ГЕНАДЗЕЎНА (13.12.1956 в. Веляшковічы Лёзненскага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыла Веляшковіцкую СШ (1973), гіст. факультэт БДУ (1980). Працавала піянерважатай у СШ № 4 г. Віцебска (1977–1980), на розных пасадах на Віцебскім тэлезаводзе (1980–1996), рэдкалегіі кнігі «Памяць» г. Віцебска, у Музеі воінаўінтэрнацыяналістаў, ДАВВ (1999–2000). Аўтар артыкулаў па гісторыі Віцебска.

Тв.: Витебской ученой архивной комиссии — 90 // Віцьбічы. — 1999. — 26 чэрв.; «Придите же, мудрые и научите нас!»: [В.А. Кадыгробов] // Віцьбічы. — 1999. — 28 снеж.; Это было недавно, это было давно // Віцьбічы. — 1999. — 28 снеж.; Вінаваты, што быў усебакова адукаваны: [М. Каспяровіч] // Віцьбічы. — 2000. — 20 ліп.

Літ.: ДАВВ. Ф. 289, воп. 1-к, спр. 208 (асабовая справа Л.Г. Замалінай).

**ЗАРЭЦКІ** Д., краязнаўца. Даследаваў Лепельшчыну. Вывучаў розныя пытанні гісторыі і культуры краю, аддаючы перавагу высвятленню лёсаў славутых землякоў і асоб, звязаных з Прыдзвіннем, гісторыі краю ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Матэрыялы росшукаў публікаваў на старонках мясцовага перыядычнага друку. Некалькі артыкулаў змешчаны ў кнізе «Памяць» Лепельскага раёна.

Тв.: Рыгор Кладніцкі // Памяць: Лепельскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 105; Воіны нябачнага фронту // Тамсама. — С. 229–230; Ёй і сёння 21 год // Тамсама. — С. 234; Лёс настаўніцы Лізаветы Захараўны Казлоўскай // Тамсама. — С. 235–237; Партызанскі камісар: [А. Марунька] // Тамсама. — С. 261; Адважная партызанка: [В.А. Маргевіч] // Тамсама. — С. 262–263; Няроўны бой: [каля в. Іван Бор] // Тамсама. — С. 289–290; Ён быў піянерам: [І.І. Кавалёў] // Тамсама. — С. 305; Апошняя граната: [А. Жванскі] // Тамсама. — С. 320; Лепяльчане ўшаноўваюць героя // ЛС. — 1987. — № 46. — С. 2; Так выяваў зямляк // ЛС. — 1987. — № 56. — С. 2; Слаўны сын Расіі // ЛС. — 1987. — № 61. — С. 2; Камбрыг Караленка // ЛС. — 1987. — № 77. — С. 2; Дзіўны быў час: [І.М. Смірноў] // ЛС. — 1987. — № 108. — С. 2; Адважная практыка // ЛС. — 1987. — № 112. — С. 2; Жыццё аддала за Радзіму // ЛС. — 1988. — № 17. — С. 2; Пралетарскі трыбун // ЛС. — 1988. — № 53. — С. 3; Ушанаваць памяць землякоў // ЛС. — 1989. — № 65. — С. 2; Нястомны даследчык роднага краю: [Р. Кладніцкі] // ЛС. — 1989. — № 68. — С. 3.

**ЗАХАРАВА** КАЦЯРЫНА ЛЕАНІДАЎНА (22.01.1964. г. Полацк), педагог. Скончыла СШ № 2 г. Полацка (1981), МДІК па спецыяльнасці бібліятэкар-бібліёграф (1987). Працуе бібліятэкарам у Полацкім дзяржаўным аграрна-эканамічным каледжы.

Кіраўнік краязнаўчага гуртка «Мясцовае кола», які дзейнічае пры гэтай установе. Значны ўплыў на фарміраванне цікавасці да гісторыі роднага краю аказаў настаўнік гісторыі Грыгорый Арцем'евіч Калачоў. Арганізавала пошукавую працу па зборы экспанатаў і ўспамінаў для стварэння музея гісторыі каледжа. Рыхтуе тэкставую базу звестак для адкрыцця краязнаўчага сайта ў інтэрнеце. Бярэ актыўны ўдзел у канферэнцыях, якія праводзіліся ў Полацку, Віцебску, Гродна. Штогод рыхтуе навучэнцаў да краязнаўчых чытанняў «Наследие Полоцкой земли», дзе яе выхаванцы неаднаразова атрымлівалі прызавыя месцы. На 8-м Міжнародным конкурсе «Уроки холокоста — путь к толерантности» (2009) навучэнцы каледжа атрымалі грамату за лепшую працу — «Войной украденное детство». Супрацоўнічае з ПДУ, Полацкім занальным архівам, НАРБ, НПГКМЗ.

Тв.: История образования и развития Полоцкой сельскохозяйственной школы в 1951–1956 гг. // Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі. Да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея / уклад В. Д. Краско. — Полацк: НПГКМЗ, 2008 — С. 67–83; О судьбах детей Полоцка в период оккупации 1941–1944 гг.:[аўдыёзапіс] // Полацкае радые / Архіў К.Л. Захаравай.

Літ.: Каментар да артыкула «Полацкія краязнаўцы» / падр. С.У. Глушкоў (2.04.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ЗАЯЦ** ІРЫНА МІКАЛАЕЎНА (4.07.1986, г. Ветка), краязнаўца. Скончыла СШ № 1 г. Пастаў. У школьныя гады брала ўдзел у краязнаўчым руху. Аўтар навукова-даследчых прац «Класіфікацыя назваў паселішчаў Пастаўскага раёну», «Страчаныя помнікі г. Пастаў і ваколіцаў», «Генацыд яўрэйскага насельніцтва на Пастаўшчыне».

Адзін з аўтараў кнігі «Маньковічы», у якой апісваецца геаграфічнае месцазнаходжанне паселішча, яго ваколіцы, жыллёвыя і грамадскія пабудовы, мясцовыя могілкі і інш. Даецца апісанне асаблівасцяў былога палацава-паркавага комплекса, храма, капліцы, млына, пошты, змяшчаюцца ўспаміны мясцовых жыхароў пра даўніну, даследуецца той перыяд жыцця У. Дубоўкі, калі ён вучыўся ў мястэчку.




Стала ініцыятарам стварэння кнігі, прысвечанай мястэчку Задзеўе, якое супернічала з Паставамі, аднак было разбурана ў час Першай сусветнай вайны і не аднавіла былой славы. З мэтай падрыхтоўкі выдання пытала жыхароў вёсак Дукі, Задзеўе, Ліцвінкі, знайшла запісы ксяндзоў, сабрала легенды і паданні краю. Сабраныя матэрыялы сталі асновай кнігі «Мястэчка над возерам. Задзеўе і ваколіцы», напісанай разам з І. Пракаповічам. Разам з ім жа падрыхтавала і выдала кнігу «О Беларусь, мая

шыпшына… На радзіме У. Дубоўкі», прысвечаную У. Дубоўку, якая змяшчае ўспаміны, пісьмы, творы аб родных мясцінах, выказванні і вершы сучаснікаў і інш. матэрыялы.

Тв.: (разам з І. Пракаповічам, А. Вансовіч) Маньковічы: гісторыка-геаграфічны нарыс. — Паставы: Сумежжа, 2004. — 60 с.; (разам з І. Пракаповічам) Мястэчка над возерам: Задзеўе і ваколіцы. — Мн.: Ковчег; 2006. — 56 с.; (разам з І. Пракаповічам) О Беларусь, мая шыпшына… На радзіме У. Дубоўкі. — Мн.: Тонпік, 2007. — 128 с.

Літ.: Сідарэвіч А. Выдадзена ў Паставах // НН. — 2005. — № 29, 5 жніўня. — С. 8; Далідовіч Г. Манькавічы // КГ. — 2005, жнівень. — № 31–32. — С. 8; Лекарэвіч Л. Аснова для далейшых даследаванняў // ПК. — 2007. — № 13. — С. 4.



**ЗЕЛЕНТАЎ** ЭДУАРД ІВАНАВІЧ, краязнаўца. Начальнік інспекцыі прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя Сенненскага раёна. Цікавіцца гісторыяй Сенненшчыны. Зрабіў факсімільнае выданне кнігі К.Ц. Анікіевіча «Сенненский уезд Могилевской губернии. Опыт описания в географическом, историческом, этнографическом, бытовом, промышленном и статистическом отношениях» (Магілёў, 1907). Разаслаў выданне па школах, арганізацыях, установах, аматарам роднага краю. Выданне і распаўсюджванне кнігі стала своеасаблівым штуршком для шэрагу асоб у Сянно і раёне для пачатку вывучэння роднага краю. Працуючы на пасадзе нам. старшыні Сенненскага райвыканкама, Э.І. Зелентаў стаў адным з ініцыятараў стварэння ў горадзе раённага краязнаўчага музея і прыклаў значныя намаганні да рэалізацыі гэтай ідэі. Аказвае дапамогу ў пачынаннях і ініцыятывах, якія папулярызуюць гісторыю, культуру, прыроду Сенненшчыны.

Літ.: Мінулае і будучае нашай Сеннешчыны // ГС. — 2005. — 6 верас. — С. 2; Бандарэвіч В. Юбілей забытай кнігі – 2007: [К.Ц. Анікіевіч] // ГС. — № 89. — С. 2–3.



**ЗУБРЭВІЧ** КАЦЯРЫНА ВІКТАРАЎНА (6.10.1987, г. Наваполацк), краязнаўца. Скончыла СШ № 7 г. Наваполацка (2006), вучыцца на гіст. факультэце ВДУ.

Даследуе асобныя пытанні гісторыі і культуры Віцебшчыны, аддаючы перавагу вывучэнню культурнага жыцця горада ў XIX–XX стст.: тэатральнага жыцця, гісторыі Віцебскай мастацкай школы, дзеячоў культуры, звязаных з Віцебскам. Значны ўплыў на фарміраванне зацікаўленасці адыграла Т.В. Катовіч, якая кіравала напісаннем курсавой работы «Тэатральнае жыццё г. Віцебска пачатку XX ст.». У межах падрыхтоўкі курсавога праекта працавала ў ДАВВ. На аснове архіўных і літаратурных крыніц змагла скласці карціну тэатральнага жыцця горада першай чвэрці XX ст. (да 1926 г.): дзейнасць тэатральных устаноў горада, іх месцазнаходжанне, рэпертуар, асобы, якія адыгрывалі значную ролю ў тэатральнай справе, акрэсліць асноўныя тэндэнцыі развіцця. У працэсе работы выявіла значную колькасць новай інфармацыі і ўдакладніла шэраг ужо вядомых фактаў з тэатральнага жыцця Віцебска. Работа была выкарыстана ў якасці першай главы ў кнізе «Тэатральнае жыццё Віцебшчыны XX ст.» Т.В. Катовіч.

Брала ўдзел у міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных навуковых канферэнцыях, сярод якіх «III Машэраўскія чытанні» (2009), «Рэгіянальная навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў ВНУ Магілёўскай вобл.» (2009), «Витебщина краеведческая» (2009).

Актыўны ўдзельнік грамадскага і культурнага жыцця ВНУ і горада. Ладзіць экскурсіі па тэатральных месцах Віцебска, аўтар электронных прэзентацый на гэту тэму. Узнагароджана дыпломам І катэгорыі на Рэспубліканскім конкурсе навуковых прац студэнтаў (2009).

Тв.: (разам з Т.В. Катовіч) Театральная жизнь Витебска с конца XIX в. до 1926 года // Театральная культура Витебщины XX века / Т.В. Котович. — Витебск: ВГУ, 2009. — С. 6–48; Основные тенденции развития репертуара Витебского губернского показательного театра в послереволюционный период // III Машеровские чтения: материалы республиканской научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 24–25 марта 2009. — Витебск: ВГУ, 2009. — С. 80–82; З чаго пачынаецца кансерваторыя? // Культура. — 2009. — 19–25 снеж.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Зубрэвіч К.В. (29.12.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ЗЯМЧОНАК** ІОСІФ (22.02.1963 г., в. Цівунцы Пастаўскага раёна Віцебскай вобл.), гісторык, педагог, краязнаўца. Член ГА «Міжнародная асацыяцыя беларусістаў». Сябра Рады Беларускага краязнаўчага таварыства імя Тодара Нарбута, каардынатар Гарадзенскай краязнаўчай асацыяцыі па Віцебскай вобл. (да выязду за мяжу). Скончыў Варапаеўскую СШ Пастаўскага раёна (1980), Ленінградскае тэхнічнае вучылішча № 65 (1981), Аршанскае педагагічнае вучылішча (1987), гіст. факультэт БДУ (1994). У 1996–1999 гг. быў суіскальнікам вучонай ступені кандыдата гіст. навук у БДУ на кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гіст. факультэта, стажорам Інстытута гісторыі Падляшскай Акадэміі (г. Седльце, РП, 2000–2003). Працаваў настаўнікам ў Гуцкай СШ (1987–1994), Варапаеўскай СШ Пастаўскага раёна (1994–2000). З 2003 г. працуе ад’юнктам (навуковым супрацоўнікам) кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта (РП).

Зацікавіўся краязнаўствам пад час беларускага нацыянальнага адраджэння другой паловы 80-х гадоў XX ст. Пэўны ўплыў аказаў І. Пракаповіч, а таксама вывучэнне прац А.П. Сапунова. У час вучобы ў БДУ напісаў і абараніў дыпломную працу пад назвай «Варапаева. Гістарычны нарыс», на падставе якой у пазнейшыя гады з’явілася некалькі кніг. Навуковы кіраўнік Леанід Аляксандравіч Жылуновіч прапанаваў паступіць у аспірантуру БДУ.

Даследуе мінуўшчыну малых паселішчаў беларускай часткі даўняй Віленшчыны ўздоўж старажытнага тракту Стэфана Баторыя (Вільня – Полацк) на сучасным беларуска-літоўскім памежжы: Паставы, Варапаева, Дунілавічы, Лучай, Парыж, Асінагарадок, Ляхаўшчына і інш.

З другой паловы 1980-х да канца 1990-х гг. абхадзіў і аб’ездзіў Пастаўшчыну і суседнія раёны з мэтай вывучэння гісторыі і культуры рэгіёна. Працаваў як даследчык у архівах, бібліятэках і музеях Мінска, Віцебска, Гродна, Полацка, Пастаў, Глыбокага і інш. гарадоў. Прыватна выязджаў для пошукавай працы ў архівы і бібліятэкі Расіі і Польшчы: Масквы, Пецярбурга, Варшавы, Вроцлава, Кракава і інш. Пад час працы ў школах арганізаваў турыстычна-краязнаўчы клуб «Волаты» і распрацаваў аўтарскую праграму курса краязнаўства для школ Пастаўскага раёна «Ведай свой край», якая грунтавалася на выніках навукова-краязнаўчых даследаванняў, праведзеных на працягу 10 гадоў працы ў школах. Выкладаў па гэтай праграме на працягу 1995–1999 гг. Да праграмы распрацаваў навучальны дапаможнік (у электронным варыянце).

Займаючыся актыўна навуковымі і краязнаўчымі даследаваннямі, у другой палове 1980-х гг. выдаў каля 15 брашур і кніг. У першай палове 1990-х гг. заснаваў серыю «Мястэчкі даўняй Віленшчыны», якая складалася з кніг, прысвечаных малым паселішчам Віленшчыны, якія па цяперашнім адміністарцыйна-тэрытарыяльным падзеле знаходзяцца на Пастаўшчыне. Першай была кніга, прысвечаная гісторыі Варапаева, — «Мястэчка пры гасцінцы. Старонкі гісторыі Варапаева і бліжэйшых населеных пунктаў» (Мінск, 1995). Наступнай — «Паставы. Горад на сумежжы культур 996–1996», якая ўжо была падрыхтавана да друку ў адным з мінскіх выдавецтваў, але так і не пабачыла свет. Падобны лёс напаткаў і чарговыя кнігі: «Гістарычнае краязнаўства Пастаўшчыны», «Данілавічы 1473–1998. Гістарычны нарыс», «Лучай. Гісторыя маёнтка, мястэчка і вёскі, 1542–1998 гг.». Дзве апошнія былі надрукаваны толькі ў 2004 годзе з дапамогай выдавецкай ініцыятывы «Сумежжа» ў Паставах і Віцебскай філіі Фонда імя Льва Сапегі. У 2000 г. былі выдадзены кнігі «Ваколіцы Парыжа. Старонкі









гісторыі Пастаўскага Паазер'я» (дзякуючы Гродзенскаму грамадскаму аб'яднанню «Ратуша», якое ўзначальваў Аляксандр Мілінкевіч), а таксама «Храмы Залатога пояса Пастаў» (Мінск).

Аўтар артыкулаў у энцыклапедычных выданнях Беларусі, прысвечаных Пастаўшчыне (Энцыклапедыя гісторыі Беларусі, Энцыклапедыя Вялікага княства Літоўскага). Апублікаваў каля 100 артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку.

У прыватным архіве мае ненадрукаваныя працы: «Мястэчка над Зарніцай. Варапаева 1722–2002», «Паставы. Горад на сумежжы культур 996–1996», «Трактам Стэфана Баторага. Мястэчкі даўняй Віленшчыны», «Гістарычнае краязнаўства Пастаўшчыны».

З 1996 года ўдзельнічаў у 20-ці міжнародных краязнаўчых і навуковых канферэнцыях, сярод якіх: «Стефан Баторий и Восточная Европа в его время» (Гродна, 1996), «Дзісненскія чытанні» (Міёры, 1996), «Браслаўскія чытанні» (Браслаў, 1997), «Глыбоччына: погляд у мінулае» (Глыбокае, 1999), «Фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў» (Наваполацк, 1999), «Погляд у мінулае» (II Дзісненскія чытанні, Глыбокае, 1999), Міжнародны кангрэс па асвеце (Мінск, 2000), IX Навуковыя чытанні памяці Л. С. Мухарынскай (1906–1987) (Мінск, 2001), «Rzeczpospolita Oboja Narodyw i jej tradycje do 1945 roku» (Седліца, 2002), «Беларуска-польскія літаратурныя, моўныя і гістарычныя сувязі. Да 125-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа» (Мінск, 2007). З'яўляўся адным з арганізатараў канферэнцыі «Педагогическая публицистика Райнольда Тызенгауза» (Паставы, 1999).

З беларускіх устаноў і грамадскіх арганізацый да канца 2000 г. падтрымліваў кантакты з Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў, Гарадзенскай краязнаўчай асацыяцыяй (быў яе каардынатарам па Віцебскай вобл.), Беларускім краязнаўчым таварыствам імя Тодара Нарбута (сябар кіраўнічай рады), Культурна-асветніцкім цэнтрам імя Я. Драздовіча і інш.

У 1999 г. па палітычным прычынах быў змушаны да эміграцыі ў Польшчу, дзе справамі краязнаўчымі займаецца толькі эпізадычна. Пасля адбыцця стажыроўкі ў Інстытуце гісторыі Падляшскай акадэміі (г. Седльце, РП), дзе з'яўляўся першым аспірантам-гісторыкам з Беларусі, абараніў кандыдацкую дысертацыю ў Інстытуце гісторыі навукі Польскай акадэміі навук у Варшаве (2002). Атрымаў эксклюзіўны дыплом са спецыялізацыяй не толькі ў галіне гісторыі навукі (што традыцыйна), але і асветы. Кандыдацкая дысертацыя, напісаная на польскай мове і абароненая пад навуковым кіраўніцтвам прафесара Зофіі Хыра-Роліч, прысвечана ролі роду Тызенгаўзаў у развіцці навукі і асветы Беларусі (ад 60-х гадоў XVIII ст. да 1880 года), на падставе якой створана некалькі кніг.

Працуе ў Варшаўскім універсітэце на пасадзе ад'юнкта (з 2003). Займаецца праблематыкай еўрапейскай інтэграцыі ў беларускім кантэксце, а таксама гістарыяграфіяй Беларусі XX стагоддзя і гістарычнай бібліяграфістыкай. Браў удзел у папаўненні збору Пастаўскага краязнаўчага музея, падрыхтоўцы экспазіцыі, арганізаванай у былым палацы Тызенгаўзаў у Паставах. Мае прыватную калекцыю ў Варапаеве і ў Варшаве.

Узнагароджаны знакам Педагагічнага таварыства РБ «За актыўную працу», дыпломам Міністэрства культуры РБ (1997).

Тв.: Кнігі: Мястэчка пры гасцінцы: Старонкі гісторыі Варапаева і бліжэйшых населеных пунктаў. — Мн.: Беларусь-Інфарм-сэрвіс, 1995. — 128 с.; Ведай свой край: аўтарская праграма. — Паставы, 1998. — 104 с.; Ваколіцы Парыжа: Старонкі гісторыі Пастаўскага Паазер'я. — Гродна, 1998. — 2-е выд. — Гродна, 2000. — 104 с. — 3-е выд. — Гродна, 2004. — 105 с.; Праграма курса «Краязнаўства». — Варапаева; Віцебск, 1999. — 12 с.; Залаты пояс Пастаў: навукова-метадычная распрацоўка краязнаўча-турыстычных маршрутаў Пастаўскага раёна для арганізацыі аўтобусных, пешых, веласіпедных, лыжных і інш. экскурсій і вандровак: аўтарскі праект. — Паставы, 1999. — 78 с.; Аўтарская праграма «Ведай свой край» краязнаўча-турыстычнага клуба «Волаты». — Варапаева, 1999. — 24 с.; Браславщина: справочник на каждый день. — Мн., 2000. — 85 с.; Поставщина: справочник на каждый день. — Мн., 2000. – 63 с.; Райнольд Тызенгауз. Кредо служащего: [саматуж. выд.] / сост. И. Земченок. — Витебск, 2000. — 44 с.; Храмы Залатога поясу Пастаў. — Мн.: Экаперспектыва, 2000. — 102 с.; Лучай: Гісторыя маёнтка, мястэчка і вёскі, 1542–1998. — Паставы: Сумежжа, 2004. — 67 с.; Данілавічы, 1473–1998: гістарычны нарыс. — Паставы: Сумежжа, 2004. — 60 с.; Rajnold Tyzenhauz, Jak wychowywać dzieci / wybór pism, wyboru dokonał oraz słowem wstępnym opatrzył Józef Ziemczonok. — Warszawa, 2006. — 138 s.; Twórczość Rajnolda Tyzenhauza. — Warszawa, 2007. — 94 s.; Trzej Tyzenhauzowie: szkice biograficzne. — Warszawa, 2007. – 150 s.; Konstanty Tyzenhauz, 1786–1853. Uczony. Mecenas. — Warszawa, 2007. — 140 s.

Артыкулы ў энцыклапедычных выданнях і навуковым друку: Лучай // ЭГБ. — Т. 4. — Мн., 1997. — С. 404–405; Лынтупы // Тамсама. — С. 407; Паставы // ЭГБ. — Т. 6. — Мн., 1999. — С. 429–430; Паставы // Энцыклапедыя ВКЛ. — Т. 2. — Мн.: БелЭн, 2006. — С. 406; Бароны Тызенгаўзы ў гісторыі Паставаў // Спадчына. — 1997. — № 5. — С. 127–147; Паставы Віленскія ў часы Тызенгаўзаў, 1760–1880 гг. // Браслаўскія чытанні: матэрыялы IV навукова-практычнай канферэнцыі, 24–25 красавіка 1997 г. — Браслаў, 1997. — С. 92–99; Канстанцін Тызенгаўз вачыма гісторыка // Біялогія. Праблемы выкладання. — 1998. — № 4. — С. 109–112; Дзевятоўскі Антоній // Кантакты і дыялогі. — 1998. — № 10–11. — С. 25–26; Рэйнгольд Тызенгаўз аб садоўніцтве // Біялогія. Праблемы выкладання. — 1999. — № 4. – С. 99–101; Тызенгаўзы Пушкінскага атачэння // Асновы мастацтва. — 1999. — № 2. — С. 59–69; Музычная культура па Райнольду Тызенгаўзу //

Дыялог. Культурна-рэлігійны часопіс. — 2000. — № 10. — С. 12–13; Данілавічы // Нашы карані. — 2004. — № 13. — С. 4–31; Лучай // Нашы карані. — 2004. — № 14. — С. 14–45; Гісторыя Беларусі ў гістарыяграфіі Польшчы (90-я гг. XX ст.) // Droga ku wzajemnosci: 50 lat bialorutenistyki na Uniwersytecie Warszawskim / Katedra Bialorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego; redakcja naukowa Mikolaj Timoszuk i Mikolaj Chaustowicz. — Warszawa, 2007. — С. 396–403; Muzeum zoologiczne Konstantego Tyzenhauza w Postawach (1814–1856) // Kwartalnik Historii Nauki i Techniki. — 2001. — № 2. — S. 121–140.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Пастаўшчына на мяжы стагоддзяў // ПК. — 1993. — № 70; З мінуўшчыны Варапаева і наваколля // ПК. — 1993. — № 79; Падарожжа ў гісторыю // ПК. — 1993. — № 90; Паставы і валасць у пачатку XX стагоддзі // ПК. — 1994. — № 2; Вясельны абрад // Тамсама; Талент, узгадаваны ў турмах // Звязда. — 1994. — № 197; Перакрыжаванні лёсаў // ЛіМ. — 1994. — № 28. — С. 4; З гісторыі Свянцянскага прарыва // Сумежжа. — 1994. — № 1; А даўгі застаюцца // Сумежжа. — 1994. — № 2; Сталін-малодшы хоць і піў, але быў чалавечным // Сумежжа. — 1994. — № 3; Гады маладосці, сэрца успамін // Сумежжа. — 1994. — № 4; Шляхецкія фаміліі Пастаўшчыны // Сумежжа. — 1994. — № 5; Лічыўся райцэнтрам, а горадам не стаў // Сумежжа. — 1994. — № 7–10; Кулацкія справы. Як шла прымусовая калектывізацыя ў Дунілавіцкім раёне // Сумежжа. — 1994. — № 10–14; Іх змалацілі цапамі рэпрэсій // НС. — 1994. — № 92. — С. 6; Мястэчка пры гасцінцы // Сумежжа. — 1995. — № 1–4; Сталінскі «сенакос» на Пастаўшчыне // Сумежжа. — 1995. — № 7–8; Новае пра Сікору // НС. — 1996. — 29 кастр.; Вучоны з Пастаў // Падарожнік. — 1996. — № 9; З гісторыі Пастаўшчыны // Пагоня. — 1996. — 19–25 ліп.; Паставы эпохі Тызенгаўзаў // НС. — 1996. — № 27. — С. 6; Новае пра Сікору: [з успамінаў Ф. Віслаўха] // НС. — 1996. — № 124. — С. 5; Школы мастацтваў маёнтка Паставы // Падарожнік. — 1997. — № 3. — С. 6; Вёска Лучай (Пастаўскі раён) // Падарожнік. — 1997. — № 5; Вёска Казлоўшчына (Пастаўскі раён) // Падарожнік. — 1997. — № 6; Ігнацій Дамейка — вучоны і падарожнік // Падарожнік. — 1997. — № 7; Вёска Манькавічы (Пастаўскі раён) // Тамсама; Графы Пшаздзецкія герба «Шахматная вежа» ў гісторыі Пастаўшчыны // Падарожнік. — 1997. — № 8–9; Хірург ад Бога // ПК. — 1997. — № 38. — С. 2; Святар і будаўнік // НС. — 1997. — № 72. — С. 5; Раскіданае гняздо, альбо Чаму беларускі Парыж знік з карты свету // Народная воля. — 1997. — № 183; Сямашкі герба «Лебедзь» // Падарожнік. — 1998. — № 2–4; Крамлёўскі камунальнік: Ад Плісы да «Баля ў Сатаны» // Падарожнік. — 1998. — № 5. — С. 23; Канстанцін Тызенгаўз: Натураліст і мецэнат // Сумежжа. — 1998. — № 1–2; Залатое кола Беларусі. Погляд з Пастаў // Сумежжа. — 1998. — № 3–4; Скарбы Тызенгаўзаў і іх нашчадкаў // Тамсама; Колькі год Паставам // Сумежжа. — 1998. — № 5–6. — С. 1; Да гісторыі рода: Фердынанд Тызенгаўз. Пецярбугская галіна // Тамсама. — С. 6–9; Збігнеў Сямашка // Народная воля. — 1998. — № 138. — С. 3; Граф Рэйнгольд Тызенгаўз: жыццё праз прызму супрацоўніцтва // НС. — 1998. — № 97. — С. 5; Землякі замежжа // Сумежжа. — 1998. — № 7–8, 9; Адам Міцкевіч і наш край // Сумежжа. — 1998. — № 9. — С. 7; Раскопкі на паганскім капішчы // Тамсама; Невядомыя імёны: Адам Паўловіч (1912–1984 гг.) і Венедыкт Макрак (1887–1935 гг.) // ВГл. — 1999. — № 91. — С. 4; «Волаты» Варапаева // Падарожнік. — 1998. — № 1. — С. 9–10; Сімяон Полацкі і царкоўнае вучылішча на Броннай слабадзе Масквы // Падарожнік. — 1998. — № 12. — С. 15–16; Па слядах райскай птушкі // НС. — 1999. — № 14. – С. 5; Р. Тизенгауз. «Что делать после окончания учёбы, или Ответы молодого человека на свои вопросы» // НС. — 1999. — № 58. — С. 8; Філасофска-педагагічная публіцыстыка Тызенгаўза // НГ. — 1999. — Жнівень. — С. 4; Ваколіцы Парыжа: Старонкі гісторыі Пастаўскага Паазер'я // Краязнаўца Паазер'я. — 2000. — № 3–9; Данілавічы: Мястэчкі старажытнай Віленшчыны // Крэсы. — 2000. — № 1. — С. 1–4; Лучай 1542–1999 гг.: Гісторыя маёнтка, мястэчка і вёскі // Крэсы. — 2000. — № 2. — С. 1–7; Паставы Віленскія: ггістарычны нарыс // Крэсы. — 2000. — № 12. — С. 1–4.

Літ.: Казлоў Л. Мястэчка пры гасцінцы // Падарожнік. — 1996. — № 4. — С. 14; Шпакоўская Г. Іосіф Зямчонак. «Я маю тое, што людзі называюць шчасцем» // НС. — 1996. — № 92. — С. 5; Земчонок И. // Кто есть кто в Республике Беларусь: Люди дела: энциклопедия. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 218; Шык У. Настаўнік, у вугал // ВГ. — 2000. — № 1 (33). — С. 2; Мальдзіс А. Ліст з Мінска // ВГ. — 2000. — № 5 (37) — С. 1; Іванова Г. Краязнаўчая скарбонка папаўняецца // Народная газета. — 2000. — № 111. — С. 2; Па ваколіцах Парыжа // Крэсы. — 2000. — № 7–8. — С. 1; Сідарэвіч А. Выдадзена ў Паставах. — Рэжым доступу: http://www.nn.by/index.pl?theme=nn/2005/29&article=ku-pastavy; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Зямчонак І. (26.02.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ІВАНКОВІЧ** УЛАДЗІМІР УЛАДЗІМІРАВІЧ (8.01.1970, г.п. Лынтупы), аматар даўніны. Скончыў аддзяленне сувязі Вільнюскага політэхнічнага тэхнікума (1986). Фермер (з 1993). Цікавіцца гісторыяй роднага краю пачаў пад час вучобы ў школе, пад уплывам дырэктара Свіркайскай СШ Пастаўскага раёна Івана Якаўлевіча Лемешава. Значны ўплыў аказала дзейнасць Міхала Гіля і Алеся Цвіркунова (Мінск). Даследуе гісторыю Віленскага краю. Стварыў прыватны музей у г.п. Лынтупы. Браў удзел у даследаваннях літоўскіх навукоўцаў (Вайткявічус, 2005). Удзельнічаў у добраўпарадкаванні тэрыторыі, а таксама ва ўсталяванні помнікаў, памятных крыжоў і капліц у гонар гістарычных падзей у родным краі (паўстанцам 1831 г. у в. Жакі, Лынтупскі с/с, невядомаму польскаму жаўнеру ў г.п. Лынтупы, капліцы ў в. Радута).

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Іванковіч У.У. (20.10.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ІВАНОВА** (Гарошкіна) СВЯТЛАНА РЫГОРАЎНА (24.11.1952, г. Орша – 9.11. 2000), краязнаўца, педагог. Скончыла СШ № 1 г. Оршы (1970), гіст. факультэт МДПІ (1976), інстытут марксізму-ленінізму пры Аршанскім гаркаме КПБ (1985). Працавала на малочным заводзе (1970–1971), настаўнікам гісторыі і замежнай мовы, завучам у СШ п. Копысь (1976–1980), настаўнікам замежнай мовы СШ № 1 г. Оршы (1980–1985), арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай работы (1985–1999). Кіравала клубам інтэрнацыянальнага сяброўства «Мерыдыян», палітычным клубам «Радзіма», з’яўлялася лектарам гарадского таварыства «Веды».




Вяла краязнаўчы гурток, стварыла краязнаўчы клуб «Автограф». Распрацавала гульню «Аршанская спадчына», праграму «Воспитай краеведа». Даследавала краязнаўчы рух на Аршаншчыне і стварыла даведнік «Аршанскія краязнаўцы», які быў выдадзены пасмяротна Т. Варонінай у 2002 г.

Тв.: Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — 32 с.
Літ.: Иванова (Горошкина) С.Г. Некролог // АГ. — 2000. — № 135. — С. 2; Воронина Т. Слово от редактора // Оршанские краеведы: биографический справочник / С.Г. Иванова. — Орша, 2002. — С. 4.



**ІВАНОВА** (Казлова) ТАЦЦЯНА ПЯТРОЎНА (24.11.1961, г. Віцебск). Кандыдат гіст. навук (2008). Скончыла СШ № 29 г. Віцебска (1978), гіст. факультэт БДУ (1983), інстытут марксізма-ленінізма пры Віцебскім абкаме КПБ, апірантуру пры ВДУ (2005). Працавала настаўнікам гісторыі ў СШ № 29 г. Віцебска (1985–1999), навуковым супрацоўнікам у ДАВВ (1999–2000), выкладчыкам у Міжнародным недзяржаўным інстытуце працоўных і сацыяльных адносін (з 2000).

Зацікавілася краязнаўствам у час вучобы ў школе. Выступала з дакладам «Віцебскае падполле». Значны ўплыў на фарміраванне цікавасці да гісторыі Віцебшчыны аказала знаёмства з А.В. Куржалавым, А.М. Падліпскім.

Вывучае дзейнасць дзяржаўных органаў кіравання Віцебскай губ. у 1917–1924 гг., гісторыю прафсаюзнага руху на Віцебшчыне, акупацыйны рэжым у Віцебску ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

У час працы ў СШ № 29 з’яўлялася загадчыцай школьнага музея (1984–1988)

Удзельнічала ў IX і X экскурсійна-краязнаўчых спаборніцтвах настаўнікаў г. Віцебска. заняла 2-е месца двойчы: у 1986 г. і 1987 г. Актыўна ўдзельнічае ў навуковых канферэнцыях (з 2001).

З’яўлялася суіскальнікам кафедры гісторыі КПСС БДУ. Пісала кандыдацкую дысертацыю «Дзейнасць КПБ па фарміраванню ў працоўных рэспублікі культуры міжнацыянальных суадносін» (1987–1992). Абараніла дысертацыю на тэму «Деятельность государственных органов управления Витебской губ. в 1817–1924 гг.» (2008, навуковы кіраўнік В. А. Космач). Аўтар шэрагу артыкулаў у мясцовым і рэспубліканскім друку.

Тв.: Артыкулы ў навуковым друку: Деятельность государственных органов управления Витебской губернии в 1917–1924 гг. / автореферат диссертации канд. истор. наук, спец. 07.00.02 «Отечественная история». — Минск: БГПУ, 2008. — 24 с.; Латыши на Витебщине в конце 10-х – 20-е годы XX века // Беларусь и Европа: Взаимодействие культур (история, уроки, опыт, современность): материалы междунар. научно-практ. конфер., Витебск, 30 ноября – 1 декабря 2000 г. / ВГУ; редкол.: В.А. Космач [и др.]. — Витебск, 2000. — С. 108–111; Вопросы трудовой дисциплины в органах управления Витебской губернии в 1919 г. // Актуальные проблемы гармонизации социально-трудовых отношений: материалы IV Междунар. научно-практ. конф., Витебск, 23 ноября 2001 г. / ФПБ МИТСО ВФ; редкол.: С.М. Горячева [и др.]. — Витебск, 2001. — С. 24–27; Деятельность государственных органов управления Витебской губернии в условиях Первой мировой войны (1917–1918 гг.) // Германский и славянский миры: Взаимовлияния, конфликты, диалог культур (история, уроки, опыт, современность): материалы междунар. научно-теорет. конф., Витебск, 6–8 декабря 2001 г. / ВГУ; редкол.: В.А. Космач [и др.]. — Витебск, 2001. — С. 354–357; О культурно-просветительной политике местных органов управления на Витебщине в 1917–1924 гг. // Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю: матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаныя 150-годдзю з дня нараджэння А.П. Сапунова, Віцебск, 6–7 чэрвеня 2001 г. / БелНДІДАС; склад. В.У. Скалабан [і інш.]. — Мн., 2002. — С. 70–73; Кадровый состав государственных органов управления Витебской губернии в 1917–1919 гг. // Материалы V научной сессии преподавателей и студентов МИТСО, Витебск, 25 апреля 2002 г. / УО ФПБ МИТСО ВФ; ред. И.В. Мандрик, С.М. Горячева. — Витебск, 2002. — С. 35–43; Проблема бюрократизации государственных органов управления Витебской губернии в 1917–1919 гг. // Актуальные проблемы гармонизации социально-трудовых отношений: материалы V Междунар. научно-практ. конф., Витебск, 22 ноября 2002 г. / УО ФПБ МИТСО ВФ; под общ. ред. И.В. Мандрика. — Витебск, 2002. — С. 24–29; Культурно-просветительная деятельность государственных органов управления Витебской губернии в 1917–1924 гг. // Славянский мир и славянские культуры в Европе и мире: Место и значимость в развитии цивилизаций и культур (история, уроки, опыт, современность): материалы междунар. научно-теор. конф., Витебск, 31 октября – 1 ноября 2002 г.: в 2-х ч. / ВГУ; редкол.: В.А. Космач [и др.]. — Витебск, 2002. — Ч. 2. — С. 142–144; Деятельность властей Витебской губернии по организации и обеспечению частей Красной Армии в 1919–1920 гг. // История и культура Европы в контексте становления и развития региональных культур: Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности: материалы междунар. научно-теор. конф., Витебск, 30–31 октября 2003 г. / ВГУ; реценз. Б.А. Туполев, Г.А. Космач; редкол.: В.А. Космач [и др.]. — Витебск, 2003. — С. 154–157; На рубеже между РСФСР и ССРБ. Витебская губерния: Проблемы приграничья // Актуальные проблемы гармонизации социально-трудовых отношений: материалы VI Междунар. научно-практ. конф., Витебск, 27–28 ноября 2003 г. / УО ФПБ МИТСО ВФ; реценз. В.М. Шорец, В.И. Пушкин; редкол.: И.В. Мандрик [и др.]. — Витебск, 2003. — С. 47–49; Органы управления и периодическая печать Витебской губернии в 1917–1924 гг. // Веснік ВДУ. — 2005. — № 4. — С. 30–35; Деятельность государственных органов управления Витебской губернии во время польско-советской войны 1919–1920 гг. // Журнал междунар. права и междунар. отношений. — 2005. — № 3. — С. 46–50; Первые коллективные договоры между отделением профсоюза советских и торговых служащих и правлением Витебского союза потребительских обществ // Становление и развитие профсоюзного движения на Витебщине. Вестник № 1 / УО ФПБ МИТСО ВФ; редкол.: И.В. Мандрик [и др.]. — Витебск, 2005. — С. 37–39; Из истории первых концлагерей советской власти (Витебский концлагерь в 1919–1923 гг.) // Материалы VII научной сессии преподавателей и студентов, Витебск, 21 мая 2004 г. / УО ФПБ МИТСО ВФ; редкол.: И.В. Мандрик [и др.]. — Витебск, 2005. — С. 12–15; Профсоюзное движение потребительской кооперации Витебской губернии в 1917–1924 гг. // Актуальные проблемы гармонизации социально-трудовых отношений: материалы VII Междунар. научно-практ. конфер., Витебск, 4 марта 2005 г.: в 2 кн. / УО ФПБ МИТСО ВФ; под общ. ред. И.В. Мандрика, В.А. Космача. — Витебск, 2005. — Кн. 1. — С. 37–39; Трудности в организации советских хозяйств в Витебской губернии в 1918–1920 гг. // Материалы VIII научной сессии преподавателей и студентов, Витебск, 28 апреля 2005 г. / УО ФПБ МИТСО ВФ; редкол.: И.В. Мандрик [и др.]. — Витебск, 2005. — С. 36–40; Политика оккупационных властей в г. Витебске во время Великой Отечественной войны // Европа во Второй мировой войне: История, уроки, современность: материалы междунар. научно-практ. конф., 5–6 мая 2005 г. — Витебск, ВГУ, 2005; Руководство народным образованием как важный аспект деятельности государственных органов управления Витебской губернии в 1917–1924 гг. // Вестник ПГУ. — 2006. — № 1. — С. 34–43; Социально-экономическая деятельность государственных органов управления Витебской губернии во время политики «военного коммунизма» и нэпа // Материалы IX научной сессии преподавателей и студентов, Витебск, 27 апреля 2006 г.: в 2-х ч. / УО ФПБ МИТСО ВФ; редкол.: И.В. Мандрик [и др.]. — Витебск, 2006. — Ч. 2. — С. 203–205; Взаимодействие государственных органов управления и профсоюзных организаций Витебской губернии в начальный период нэпа (1921–1923) // Профсоюзы и социальное партнерство в системе факторов динамичного развития общества: материалы междунар. научно-практ. конф., Минск, 24–25 ноября 2006 г. — Мн.: МИТСО, 2007. — С. 68–72; Роль профсоюзов в осуществлении руководства Витебской потребкооперацией в 30-х гг. XX века / ред. И.В. Мандрик [и др.]. // Профсоюзы и социальная безопасность: материалы VIII международной научно-практической конференции, 20 ноября 2007 г. — Витебск: МИТСО ВФ, 2008; Деятельность органов управления Витебской губернии по организации быта горожан в начале 1920-х годов // Материалы XI научной сессии преподавателей и студентов, 18 апреля 2008 г.: сборник докладов: в 3-х ч. — Витебск: ВФ УО ФПБ МИТСО, 2008. — Ч.3. — С. 147–151; Социальная политика органов управления Витебской губернии в 1917–1919 гг. // Материалы Международной научно-практической конференции «Пути, тенденции и направления социальной сферы», Витебск, ВГУ, 23 мая 2008 г. — С. 86–88; Становление и развитие профсоюзного движения в системе потребительской кооперации Витебской губернии в 1917–1920-е гг. // Труд. Профсоюзы. Общество. — 2009. — № 4. — С. 12–15; Канфесіянальная сітуацыя на тэрыторыі Віцебскай губ. у 1917–1924 гг. // БГЧ. — 2010. — № 1. — С. 20–25; Аспекты правовой деятельности государственных органов управления Витебской губернии в 1917–1924 гг. // Проблемы формирования правовой культуры молодежи на современном этапе: материалы междунар. научн.- практ. конфер., 24–25 апреля 2009 г. — Витебск: ВГУ, 2009. — С. 108–110; Роль Витебского областного совета профсоюзов в развитии промышленного производства в 1948–1958 гг. // Профсоюзное образование: История, современность и перспективы

развития: материалы научно-практической конференции. 21 апреля 2009 г. — Мн.: УО ФПБ МИТСО; Витебское подполье: Историографический аспект. Трудности организации и деятельности // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, 18–19 чэрвеня 2009 г. — Віцебск: ВДУ, 2009. — С. 172–176; Витебский регион в контексте международного сотрудничества // Материалы XII сессии преподавателей и студентов ВФ МИТСО. — Витебск, 2009. — С.162–165; Сотрудничество на уровне регионов как приоритетный вид сотрудничества (на примере Витебской области) // Социально-экономическое развитие предприятий и регионов Беларуси: инновации, социальные ориентиры, глобализация / Материалы докладов международной научно-практической конференции. Ч. 1. — ВГТУ, 2009. — С.224–227.

Артыкулы ў перыядычным друку: А в 1897 г. в Витебске жили… // Віцьбічы. — 2000. — 18 лют. — С. 7; Трагедия в Иловском рву // Віцьбічы. — 2000. — 20 крас. — С. 2; Маленький островок витебской Репининианы // ВР. — 2000. — 25 крас.; Какие газеты читали в Витебске в 1919 г. // НС. — 2000. — 4 мая. — С. 2; Архив — кладезь нераскрытых тайн // Віцьбічы. — 2000. — 22 жніўня. — С. 7; В оккупированном Витебске // НС. — 2000. — 9 верас. — С. 2.

Літ.: ДАВВ. Ф. 289, воп. 1-к, спр. 210 (асабовая справа Т.П. Івановай); Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Іванова Т.П. (29.09.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ІВАНОЎ** КАНСТАНЦІН ІВАНАВІЧ (15.08.1960, в. Кажуроўшчына Кавалёўскага с/с Лёзненскага раёна), педагог, краязнаўца. Скончыў Янавіцкую СШ (1977), гіст. факультэт МгДПІ (1988). Працаваў настаўнікам гісторыі ў Ветухноўскай СШ Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобл. (1988–1989), завучам, настаўнікам гісторыі ў Калышанскай СШ Лёзненскага раёна (з 1989).

Даследуе гісторыю в. Калышкі і наваколляў. Пэўны ўплыў аказаў А.В. Куржалаў. Удзельнічаў у абласным конкурсе «Легенды, паданні роднага краю», які ладзіўся ВАААППДіП (2002). Падтрымлівае кантакты з ГДК г. Віцебска і асабіста А.В. Шульманам. Аўтар некалькіх артыкулаў у раённай газеце «Сцяг перамогі».

Тв.: Легенды пра буракова балота // СП. — 1998. — 25 жніўня. — С. 4.

Літ.: Манойла В. Краязнаўцы аб'ядналіся! // Спадчына (Л). — 2001. — № 2. — С. 1; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Іваноў К.І. (16.10.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.




**ІВАНОЎ** УЛАДЗІМІР АЛЯКСЕЕВІЧ (3.09.1947, г. Віцебск), турыст, краязнаўца. Скончыў юрыдычны факультэт БДУ (1980). Пачаў працаваць з 1967 г. Працуе на Віцебскай мытні (з 1993). Зацікавіўся краязнаўствам, прыняўшы ўдзел у конкурсе «Мой радавод» газеты «Віцьбічы» (1996). З гэтага часу пачаў збіраць інфармацыю рознага характару, прысвечаную Віцебску і Віцебшчыне. Мае публікацыі ў мясцовым друку («Народнае слова», «Віцебскі кур'ер»). Сабраў інфармацыю пра фартыфікацыйныя збудаванні на Віцебшчыне з розных пісьмовых крыніц і выдаў кнігу «Замки Витебской земли». Аўтар кніг «Очерки по истории таможенного дела и внешней торговли на Беларуси X–XX веков» (2003). Стварыў музей Віцебскай мытні (2001). Мае намер выдаць працы «Мой радавод», «Краеведческие водные маршруты Витебщины».

Тв.: Замки Витебской земли: [саматуж. выд.]. — Витебск, 2003. — 44 с.; Очерки по истории таможенного дела и внешней торговли на Беларуси X–XX веков: [саматуж. выд.]. — Витебск, 2003. — 44 с., История моей родни — история моей Родины // Віцебскі сшытак. — 1997. — № 3. — С. 198–199; Таможни на Витебщине в XV–XVIII веках // НС. — 2001. — № 89. — С. 6; По рекам и озерам Беларуси // ВК. — 2005. — № 42. — С. 3.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Іваноў У.А. (25.11.2003) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ІГНАЦЦЕВА** ТАМАРА ГЕОРГІЕЎНА (4.12.1938, г. Орша), краязнаўца. Скончыла філал. факультэт Смаленскага педагагічнага інстытута (1965). Працавала бібліятэкарам у СШ № 5 г. Оршы (1959–1961), настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў ШПМ № 1 г. Оршы (1961–1970), арганізатарам пазашкольнай і пазакласнай працы СШ № 4 г. Оршы (1970–1973), інструктарам і загадчыкам аддзела Аршанскага гаркама КПБ (1973–1991), галоўным захавальнікам фондаў МКГіКА (1992–2002), навуковым супрацоўнікам МКГіКА (2002–2005).

Даследуе гісторыю і стан помнікаў даўніны Аршаншчыны, лёсы славутых землякоў і асоб, якія звязалі свой лёс з краем, гісторыю Оршы ў пасляваенныя гады (з 1944). Брала ўдзел у стварэнні экспазіцыі музея У. Караткевіча, экспазіцыі савецкага

перыяду гісторыі Музея гісторыі і культуры г. Оршы, вялікай колькасці выстаў. Удзельнічала ў экспедыцыях па зборы матэрыяльнай і духоўнай спадчыны Аршаншчыны ў фонды МКГіКА.

Уваходзіла ў склад працоўнай групы па падрыхтоўцы кніг «Памяць» Оршы і Аршанскага раёна. Удзельнічала ў зборы матэрыялаў і складанні спісаў рэпрэсаваных і загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны ўраджэнцаў Аршаншчыны. Выступала з дакладамі на некаторых рэгіянальных канферэнцыях («Аршанскія навукова-краязнаўчыя чытанні», «Куцеінскія чытанні»).

Аўтар некалькіх артыкулаў, змешчаных у «Аршанскім краязнаўчым зборніку» (№ 2, 1997), зборніку «Куцеінскія чытанні» (2005). Мае шматлікія публікацыі ў перыядычным друку.

Узнагароджана медалём «За працоўную адзнаку» (1981), «Ветэран працы» (1988).

Тв.: (разам з А. Шнэйдарам) На главной магистрали. К юбилеям городов Орши Друцка, Копыси и Толочина / сост. Г.Ч. Ленкевич, А.А. Шнейдер. — Мн: Кнігазбор, 2008; Художник жизненной правды // Паведамленні 3-й Аршанскай навукова-краязнаўчай канферэнцыі. — Орша. — С. 32–34.

Артыкулы ў перыядычным друку: Мінуўшчына нашага краю // АГ. — 2004. — № 108. — С. 3; Война и оккупация в Орше в воспоминаниях детей // АГ. — 2004. — № 126. — С. 3; Юбілейная выстава мастака А. Люцікава // АГ. — 2004. — № 130. — С. 2; Вобраз Ул. Караткевіча ў фалерыстыцы // АГ. — 2004. — № 141. — С. 3; У падарунку — сотні значкоў // АГ. — 2005. — № 28. — С. 3; Ведай свае грошы // АГ. — 2005. — № 38. — С. 3; Шла война народная // Телеком. — 2005. — № 19.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Ігнаццева Т.Г. (15.01.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ІЗОСІМАВА** ВЕРА ВАСІЛЬЕЎНА, краязнаўца, педагог. Працавала дырэктарам Боркавіцкай СШ Верхнядзвінскага раёна. Спрыяла дзейнасці музея ў СШ в. Боркавічы. Аўтар артыкулаў па гісторыі Боркавічаў.

Тв.: «Дэсантнікі» ў паходзе // ДзП. — 1991. — № 20. — С. 2; Саўгас «Боркавічы»: Былое і сучаснае // ДзП. — 1999. — № 58, 60, 66–67.

Літ.: Краязнаўчы музей Боркавіцкай СШ // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна. — Мн.: Паліграфафармленне, 2000. — Кн. 2. — С. 322.

**ІЛЫН** ВЯЧАСЛАЎ АЛЯКСАНДРАВІЧ (21.07.1963, г. Гарадок), краязнаўца. Скончыў Гарадоцкі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі (1982). Працаваў на інжынерна-тэхнічных і кіруючых пасадах. Пачаў цікавіцца гісторыяй храма, калі стаў удзельнічаць ў адраджэнні Свята-Мікалаеўскай царквы ў г.п. Шуміліна. Шчыльна супрацоўнічае ў сваёй працы з выдавецкім аддзелам Віцебскай епархіі, рэдакцыяй газеты «Гарадоцкі веснік», ДАВВ. Разам з В.В. Улюценка выдаў кнігу «Пятенка. Православные храмы Шумилинщины». Аўтар артыкулаў на краязнаўчыя тэмы ў мясцовым перыядычным друку: «Наше православие», «Герой працы», «Гарадоцкі веснік». Старшыня прыходскага савета Свята-Мікалаеўскага храма г.п. Шуміліна.

Тв.: (разам з В.В. Улюценка) Пятенка. Православные храмы Шумилинщины. — Витебск, 2007. — 46 с.; Іх імёнамі названы: [г. Гарадок] // ГВ. — 1994. — № 39. — С. 2; Забыліся на вёску ўлады: [в. Немцава] // ГВ. — 1996. — № 49. — С. 3; Камнячос з Міроненак // ГВ. — 1997. — № 5. — С. 2;

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Ільін В.А. (21.02.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ІЛЬНІЦКІ** МІКАЛАЙ МІКАЛАЕВІЧ (4.01.1949, в. Баранава Полацкага раёна – 6.11.2006), музейны работнік. Скончыў СШ № 9 г. Полацка, БДУ. Працаваў выкладчыкам ў ПТВ № 2 г. Полацка, у Полацкім гаркаме КПБ, дырэктарам СШ № 13, дырэктарам НПГКМЗ (1994–2006). З'яўляючыся кіраўніком Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка, праводзіў значную працу па папулярызацыі гістарычнай спадчыны горада, стаў адным з ініцыятараў стварэння некаторых музеяў, узвядзення шэрагу помнікаў, правядзенню значнай колькасці ініцыятыў у горадзе. Адзін з аўтараў-укладальнікаў альбома «Полацк музейны».

Нацыянальны Полацкі
гісторыка-культурны музей-запаведнік

Тв.: Полацк музейны: фотаальбом / аўт.- уклад. Т.А. Джумантаева, М.М. Ільніцкі. — Мн.: Беларусь, 2006. — 283 с.; Падарожжа па былой Ніжне-Пакроўскай у трэцяе тысячагоддзе // ПВ. — 2000. — № 96. — С. 2.

Літ.: Лепшыя музеі — у горадзе Полацку: [М.М. Ільніцкі] // НС. — 2004. — № 155. — С. 3.

**ІЛЬЮШОНАК** ГАЛІНА АНАТОЛЬЕЎНА (18.01.1963, г. Полацк), педагог. Скончыла СШ № 1 г. Полацка (1980), гіст. факультэт БДУ (1988). Працуе ў Полацкім дзяржаўным аграрна-эканамічным каледжы (з 2007). Даўнінай зацікавілася яшчэ ў школьныя гады, чаму паспрыяла ўлюбёная ў свой прадмет настаўніца гісторыі Зоя Іванаўна Фаміна. На далейшы сталы занятак гісторыяй і краязнаўствам значна паўплывалі вядомыя навукоўцы В.Н. Рабцэвіч і Э. М. Загарульскі. Займалася аднаўленнем экспазіцыі музея гісторыі школы і горада ў СШ № 1 г. Полацка. Адзін з укладальнікаў зборніка «Полоцк глазами школьника». Цяпер вядзе калектыўную працу па складанні і падрыхтоўцы да выдання навучальнага дапаможніка для вучняў 6-х класаў па факультатыўным курсе гісторыі Полацкага княства. У справе краязнаўства трымае сувязь з ПДУ.

Тв.: Полоцк глазами школьника: исследовательские работы учеников школ города / сост. Г.А. Ильюшонок, И.В. Сыщикова, И.Л. Шашкова. — Полоцк: Отдел образования Полоцкого горисполкома, 2006. — 208 с.



**ІСАЧАНКА** ЛЮДМІЛА МІКАЛАЕЎНА (10.05.1931, г. Клін Маскоўскай вобл., РСФСР), гісторык, архівіст. Скончыла Клінскую СШ № 2 (1949), МДГАІ (1954). Працавала ў ДАВВ на пасадзе начальніка аддзела фондаў Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва, ст. навуковым супрацоўнікам, начальнікам аддзела выкарыстання і публікацыі дакументальных матэрыялаў, загадчыкам аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў (1954–1986).

Выканала вялікую працу па забеспячэнні захаванасці дакументаў, удасканаленні навукова-даведачнага апарату архіва і выкарыстанні дакументаў у навуковых, народнагаспадарчых і агітацыйна-прапагандысцкіх мэтах. Праводзіла тэматычнае выяўленне дакументаў для шэрагу зборнікаў дакументаў, аглядаў, пералікаў. У перыядычным друку апублікаваны каля 50-ці падрыхтаваных ёю падборак дакументаў і артыкулаў на розныя тэмы, у т. л. «З гісторыі аднаўлення завода імя С.М. Кірава», «М.І. Калінін у Віцебску», «Першы з’езд Саветаў Віцебшчыны» і інш. Папулярызавала архіўныя дакументы па радыё і тэлебачанні, удзельнічала ў шэрагу навуковых канферэнцый і семінараў. З’яўлялася членам абласной арганізацыі таварыства «Веды».

Узнагароджана медалямі «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І. Леніна», «Ветэран працы», знакам «Ударнік 11-й пяцігодкі».

Тв.: (разам з Т. Касцянюк, У. Зайцавым) Пачатак адраджэння. З гісторыі дзейнасці абласной партарганізацыі // ВР. — 1975. — 25 снеж. — С. 2; Першыя калектыўныя гаспадаркі // ПК (Г). — 1976. — 21 жніўня; Дакументы любві і падзякі // ЛС. — 1980. — 22 крас.; Документы расказваюць // ВР. — 1981. — 9 ліп.; Брацкая дапамога // ВР. — 1982. — 7 ліст.; Документы рассказывают // Рабочее слово (Витебский телезавод). — 1985. — 28 жніўня; «З усведамленнем грамадскай важнасці» // ВР. — 1985. — 2 мая; Я. Купала ў «Віцебскім рабочым» // ВР. — 2002. — 6 жніўня; Я. Колас і «Віцебскі рабочы» // ВР. — 2002. — 19 ліст.

Літ.: ДАВВ. Ф. 389, воп. 1-к, спр. 145 (асабовая справа Л. М. Ісачанкі); Шарендо В.В. Исаченко Л.Н. // Витебщина архивная: История, фонды, персоналии, сер. XIX–XX вв. — Мн.: БелНДІДАС, 2002. — С. 187; Архівісты Беларусі: біябібліяграфічны даведнік / склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. — Мн.: БелНДІДАС, 2006. — С. 135.

**КАВАЛЕВІЧ** (Калоша) АЛЯКСЕЙ ПЯТРОВІЧ (18.07.1929, в. Мілявічы Мастоўскага раёна Гродзенскай вобл.), журналіст. Скончыў Мілявіцкую ПШ Дзярэчынскую сямігодку ў Зельвенскім раёне (1950), ГрДПІ (1954). Працаваў выкладчыкам беларускай мовы ў школах Воранаўскага раёна, дырэктарам Клайшанскай ВШ. У 1963 годзе пераехаў у г. Міёры Віцебскай вобл. Працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Міёрскай СШ, інспектарам рана, у рэдакцыі газеты «Сцяг працы» (цяпер «Міёрскія навіны», 1969–1997). Выдаў 8 кніг, у якіх апісвае лёсы цікавых людзей Міёршчыны.

Кніга «Сустрэча праз гады» (1996) змяшчае 92 нарысы і замалёўкі, якія прысвечаны лепшым людзях Міёршчыны: рабочым, настаўнікам, урачам, работнікам культуры, сельскай гаспадаркі, удзельнікам вайны і партыз. руху, асобам, якія ўзнагароджаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі. Гэтай жа тэме прысвечаны кнігі «Наш родны кут» (1998), «Бронзавы ліставей» (2006). У паэтычным зборніку «Прыгоды Дзеда Мароза і Снягурачкі на Міёршчыне» (1997) распавядаецца пра дасягненні за год усіх працоўных калектываў краю. У кнізе змяшчаецца інфармацыя аб прадпрыемствах, якія на цяперашні момант ужо не існуюць. Кніга «Бацькоўскія карані» (1999) прысвечана сям'і Скавародкаў — дынастыі хлебаробаў Міёршчыны. У выданні «Волат на пустэчы» (2000) распавядаецца гісторыя стварэння і станаўлення аднаго з буйнейшых прадпрыемстваў Міёршчыны — камбікормавага завода. Кніга нарысаў і замалёвак «Ах, мая рэдакцыя!» (2002) прысвечана раённай газеце.



Узнагароджаны знакам «Выдатнік народнай асветы БССР», заслужаны журналіст Саюза журналістаў Рэспублікі Беларусь (1999) і лаўрэат прэміі Саюза журналістаў Беларусі.

Тв.: Ноч з Юзікам. — Мн.: ТК «Міласэрнасць–90», 1994. — 95 с.; Сустрэча праз гады: нарысы. Замалеўкі: [Спадчына Ф.Скарыны]. — Міёры, 1996. — 195 с.; Навагодняя прыгоды Дзеда Мароза і Снягурачкі на Міёршчыне. — Міёры, 1997. — 86 с.; Наш родны кут: замалеўкі, нарысы, апавяданні. — Міёры, 1998. — 71 с.

**КАВАЛЕЎСКІ** СЯРГЕЙ МІКАЛАЕВІЧ (11.12.1966, г. Віцебск), журналіст. Скончыў СШ № 12 г. Віцебска (1984), ПТВ № 154 (1985). Працуе ў газеце «Народнае слова» (з 1998). Аўтар артыкулаў на краязнаўчыя тэмы, у тым ліку больш 30 артыкулаў у рубрыцы «Кропка на карце», у якой распавядае пра населеныя пункты Віцебскай вобл. Браў удзел у міжнароднай экспедыцыі ад вытокаў Заходняй Дзвіны да Віцебска.



Тв.: Абольцы // НС. — 1997. — № 139. — С. 6; Юрцава // НС. — 1997. — № 142. — С. 6; Падарунак аматарам гісторыі: [«Віцебскія сшыткі»] // НС. — 1997. — № 56. — С. 6; Ехаў Бунін цераз Віцебск // НС. — 1997. — № 7. — С. 5; Замосточье // НС. — 1999. — № 16. — С. 4; Тартэцыя супраць часу: [Юрцава] // НС. — 1999. — № 49. — С. 4; Ляўкі Купалаўскія // НС. — 1999. — № 55. — С. 4; Багушэўск // НС. — 1999. — № 103. — С. 3; На старых ставах: [Паставы] // НС. — 1999. — № 124. — С. 8; Каменаполле: Дом, стайня, парк // НС. — 1999. — № 131. — С. 5; Ім ганарацца ў Зазыбах // НС. — 1999. — № 140. — С. 5; Друцк // НС. — 1999. — № 153. — С. 8; Надмагільны помнік трымае школу: [в. Абольцы] // НС. — 2000. — № 2. — С. 4; Лесіна (Кулакі): [вёска] // НС. — 2000. — № 10. — С. 5; Кривая дорожка из прошлого века: [злачыннасць у кан. XIX ст. у Віцебску] // НС. — 2000. — № 25. — С. 6; Барань // НС. — 2000. — № 35. — С. 4; Каменны крыж // НС. — 2000. — № 54. — С. 5; Дзярэўня: [вёска] // НС. — 2000. — № 55. — С. 8; Перад Барадзіно былі Клясціцы // НС. — 2000. — № 64. — С. 4; Выстаўка: [вёска ў Віцебскім раёне] // НС. — 2000. — № 134. — С. 4, 5; Ілава // НС. — 2001. — № 4. — С. 6; Магнолія: [вёска ў Сенненскім раёне] // НС. — 2001. — № 98. — С. 6; Мікуліна // НС. — 2001. — № 133. — С. 4–5; Аболецкая гара // НС. — 2001. — № 136. — С. 5; Мішневічы // НС. — 2001. — № 150. — С. 5; Царква на вуліцы Леніна: [Свята-Пакроўская царква ў г. Талачыне] // НС. — 2002. — № 8. — С. 6; Дзісна // НС. — 2002. — № 40. — С. 3–4; Берега, на которых мы живем: [Дзвіна] // НС. — 2002. — № 94. — С. 4–5; Верхнія Грапуны: [вёска] // НС. — 2002. — № 115. — С. 4–5; (разам з А. Быньковым) Бычыха і Быкі // НС. — 2002. — № 138. — С. 4–5; Камень // НС. — 2003. — № 14. — С. 5; Жахоўшчына: [вёска ў Бешанковіцкім раёне] // НС. — 2003. — № 39. — С. 5; Не перейти грань духовности: [раскопкі нямецкіх могілак каля в. Перавоз Віцебскага раёна] // НС. — 2003. — № 126. — С. 2; Бычкі: [Ушацкі раён] // НС. — 2003. — № 145. — С. 5; Шо // НС. — 2004. — № 1. — С. 11; Глыбокае возера Доўгае // НС. — 2004. — № 11. — С. 5; Уна: [вёска ў Лёзненскім раёне] // НС. — 2004. — № 27. — С. 4–5; Карысць з крыніц // НС. — 2004. — № 107. — С. 5; Падсвілле // НС. — 2004. — № 117. — С. 6; Ула // НС. — 2004. — № 134. — С. 5; Валова гара // НС. — 2004. — №; Некрашова // НС. — 2005. — № 26. — С. 4–5; Беліца (Полымя) // НС. — 2005. — № 134–135. — С. 12–13; Чурылава: [вёска ў Бешанковіцкім раёне] // НС. — 2005. — № 146. — С. 6; Расасна // НС. — 2006. — № 50–51. — С. 9; Скрыпуцёва крыніца: [в. Ваўковічы Талачынскага раёна] // НС. — 2006. — № 110. — С. 16; Забайкал // НС. — 2006. — № 111. — С. 5; Краснапольцы (да 1963 г. Амерыка) // НС. — 2007. — № 31. — С. 5.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Кавалеўскі С.М. (4.10.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**КАЗЛОВА** СВЯТЛАНА МІКАЛАЕЎНА, музейны работнік. Працуе ў ВАКМ, дырэктарам філіяла ВАКМ «Літаратурны музей». Аўтар артыкулаў на тэмы гісторыі і культуры ў мясцовым перыядычным друку.

Тв.: (разам з В.В. Гронскім) Памятка студэнцкаму будаўнічаму атраду пра працу пошукавых груп па зборы рэліквій рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. — Віцебск: ВАКМ; Віцебскі абласны студэнцкі будаўнічы атрад імя М.П. Шмырова, 1986. — НА ВАКМ, спр. 706.

Артыкулы ў перыядычным друку: Якімі скарбамі багатыя… // ВР. — 1990. — № 106. — С. 4; Джын Хатабыч з Падзвінскай вуліцы? // ВР. — 1990. — № 153. — С. 4; Недаспяваныя песні, па слядах рэпрэсіраваных пісьменнікаў-землякоў // ВР. — 1991. — № 8. — С. 5; Вандроўка з Полаччыны: [Я. Баршчэўскі] // НС. — 1991. — № 10. — С. 7; Гартаючы старыя календары // НС. — 1992. — № 13. — С. 13. — С. 5; І сярод узораў пачнеш вышукваць вясёлкавую кветку: [Я. Баршчэўскі] // НС. — 1996. — № 135. — С. 6.

**КАЗЛОЎ** ЛЕАНІД ЛЕАНІДАВІЧ, педагог. Працаваў выкладчыкам гісторыі Нямойтаўскай СШ Сенненскага раёна, дырэктарам Пурплёўскай НСШ Сенненскага раёна, працуе дырэктарам Сенненскай школы-інтэрната. Займаецца вывучэннем гісторыі і культуры Сенненшчыны. Аўтар артыкулаў па гісторыі раёна ў перыядычным друку.

Тв.: У першыя гады савецкай улады // ВІ. — 1990. — № 134, 149; Першабытная гісторыя Сенненшчыны // ГС. — 1993. — № 86. — С. 2, 3.

**КАЗЛОЎСКІ** ПАВЕЛ РЫГОРАВІЧ (3(16).12.1911, г. Санкт-Пецярбург – 19.12.1996), гісторык. Доктар гіст. навук (1974). Вучыўся ў Віленскім універсітэце. Скончыў БДУ (1960). Працаваў рэпетытарам, сакратаром у адваката. У гады Вялікай Айчыннай вайны ваяваў у партыз. атрадзе ў Вілейскай вобл. Працаваў у Пракуратуры БССР (1944–1957), Інстытуце гісторыі АН БССР (1957–1986).

Даследаваў гісторыю сельскай гаспадаркі і сялянства Беларусі XVII–XVIII стст. Аўтар артыкулаў па гісторыі партыз. руху на Браслаўшчыне, Міёршчыне і гаспадарчага жыцця ў Заходняй Віцебшчыне.

Тв.: Кнігі: (разам з П.Я. Сырамахам) Пусть знают и помнят потомки. Браславщина в 1941–1944 гг. — Мн., 1994.

Артыкулы ў навуковым друку і кнігах «Памяць»: (разам з П.Я. Сырамахам) В краю голубых озер // Из истории партизанского движения в Белоруссии (1941–1944 гг.): сборник воспоминаний. — Мн., 1961. — С. 418–427; Панскі двор і вёска ў Друйскім графстве // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Браслаўскага раёна. — Мн., 1998. — С. 151–158; Браслаўшчына партызанская // Тамсама. — С. 307–318; Як жылі і аб чым марылі партызаны // Тамсама. — С. 346–349; Панскі двор і вёска ў Друйскім графстве // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Міёрскага раёна. — Мн.: Бел. навука, 1998. — С. 79–83.

Артыкулы ў перыядычным друку: Панскі двор і вёска два стагоддзі назад // СП (М). — 1995. — № 57. — С. 3; Браслаўскія партызаны // ДЗ. — 1992. — № 46–48, 51–54; Друйскае графства ў канцы XVIII стагоддзя // БЗ. — 1994. — № 45, 47.

Літ.: Казлоўскі П.Р. // ЭГБ. — Т. 4. — Мн.: БелЭН, 1997. — С. 12.

**КАЛАНІЦКІ** АЛЯКСЕЙ ЯКАЎЛЕВІЧ, былы жыхар м. Янавічы. Выкладаў у 1911–1927 гг. матэматыку ў школе. Сабраў багаты краязнаўчы матэрыял, у якім адлюстраваны ўсе бакі жыцця мястэчка. Апошнія гады жыў у Маскве. У 1967 г. даслаў рукапіс у Янавіцкую СШ Віцебскага раёна. Частка матэрыялаў публікавалася ў «Краязнаўчай газеце». Некаторыя матэрыялы захоўваюцца ў ВРГКМ.

Літ.: Тэатральная самадзейнасць у м. Янавічы // КГ. — 2006. — № 45. — С. 3.

**КАЛБАСІЧ** ЮРЫ, краязнаўца. Збірае рэчы матэрыяльнай культуры, звязаныя з гісторыяй і культурай Глыбоччыны. Калекцыянуе старыя фотаздымкі, запісвае ўспаміны. Перавёў у электронную форму дакументы з царкоўнага архіва. Мае цесныя кантакты з краёвымі зямляцтвамі ў Польшчы. Зрабіў макет Беразвецкай царквы. Аўтар некаторых матэрыялаў на краязнаўчую тэматыку на старонках мясцовага перыядычнага друку, а таксама ў інтэрнэце: http://www.westki.info/blogs/jury.

Тв.: Сям’я Дубашынскіх была прыкладам для ўсяго наваколля // Нашы карані (Паставы). — 2003. — № 3. — С. 30–32.



**КАЛІНОЎСКІ** ІВАН ІВАНАВІЧ (5.01.1946, в. Ляхава Ушацкага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыў медыцынскае вучылішча (1966), Ленінградскую вышэйшую школу культуры па спецыяльнасці «Турызм» (1986). Працаваў у медыцынскіх установах г. Полацка, служыў ва УС СССР (1966–1975), экскурсаводам у Полацкім бюро падарожжаў і экскурсій, дырэктарам турыстычнай установы (з 1975).

Вывучаць родны край пачаў пад час працы ў бюро падарожжаў. Некаторы ўплыў на фарміраванне цікавасці да гісторыі і культуры Полаччыны аказаў В.Р. Карасёў. Займаецца распрацоўкай новых і ўдасканаленнем існуючых экскурсійных маршрутаў па Віцебшчыне.

Аўтар тэкстаў для шэрагу інфармацыйных выданняў, фотаальбомаў, прысвечаных Полацку і Полаччыне, сярод якіх буклеты «В краю Полоцком», «Славен город Полоцк», «По Западной Двине — “из варяг в греки”», «Познай Витебщину», «Усадьбы известных людей на Полотчине», «Вдоль Западной Двины и Днепра “из варяг в греки”». Аўтар тэксту да фотаальбома «Полацк», «Полацк і ваколіцы». Некаторыя матэрыялы па гісторыі Полацка друкаваў у рубрыцы «Полацк турыстычны» ў газеце «Полацкі веснік». Па замове Міністэрства спорту і турызму, Нацыянальнага агенцтва па турызме напісаў кантрольны тэкст на тэмы: «Полацк — старажытнейшы горад Беларусі», «Па слядах шляху “з варагаў у грэкі”», анатацыі на існуючыя экскурсійныя маршруты Віцебшчыны.




Распрацаваў некалькі новых турыстычных маршрутаў, сярод іншых адзначым: «Да духоўных святыняў» (Полацк – Глыбокае – Мосар – Удзела – Парыж – Будслаў); «Падарожжа па Пастаўскай зямлі» (Полацк – Паставы – Камаі – Вучай); «Літаратурнымі сцяжынамі Падзвіння» (Полацк – Ветрына – Празарокі – Бычкі – Пуцілкавічы – Ушачы); «Па слядах шляху “з варагаў да грэкаў”» (Полацк – Дзісна – Міёры – Браслаў).

Мае ненадрукаваныя працы: «Літаратурнымі сцяжынамі Прыдзвіння», «Экскурс па г. Полацку». Працуе над кнігай для 6 класа ў межах курса «Полацказнаўства», фотаальбомам, які прысвечаны 1150-годдзю Полацка. Некаторыя матэрыялы перадаў у НПГКМЗ, бібліятэкі і музеі вобласці.

Жыве ў в. Гомель Полацкага раёна.

Тв.: Кнігі: Полацк: [фотаальбом]. — Мн.: Беларусь, 2001. — 144 с.; Полоцк: путеводитель. — Мн.: Рифтур, 2002. — 42 с.; Полоцк: фотоальбом. — Мн., 2004. — 134 с.; Полацк і яго ваколіцы. — Мн.: Вышэйшая школа, 2005. — 143 с.

Буклеты: В краю Полоцком: [буклет]. — М., 1985; Славен город Полоцк: [буклет]. — Мн., 2007; Усадьбы известных людей на Полотчине: [буклет]. — Мн., 2007; По Западной Двине — «из варяг в греки»: [буклет]. — Мн., 2007; Познай Витебщину: [буклет]. — Мн., 2007; Вдоль Западной Двины и Днепра «из варяг в греки»: [альбом-буклет]. — Мн., 2007.

Артыкулы ў перыядычным друку: Познай свой край // Химик. — 1985. — № 12. — С. 2.

Літ.: Николаев Игорь. На родину Быкова и Бородулина: [тур. маршрут «Литературными тропами Придвинья»] // ИП. — 2008. — № 5. — С. 3; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Каліноўскі І.І. (19.01.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**КАЛЯДЗІНСКІ** ЛЕАНІД УЛАДЗІМІРАВІЧ (17.02.1952, г. Мінск), археолаг. Кандыдат гіст. навук (1991), дацэнт (1999). Скончыў гіст. факультэт БДУ (1977). Працаваў у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі (1974–1994). Выкладаў у Беларускай акадэміі мастацтваў (1991–1993), працуе на пасадзе дацэнта кафедры дапаможных гіст. дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ (з 1994).

Праводзіў археалагічныя даследаванні Віцебскага Верхняга замка. Абараніў кандыдацкую дысертацыю «Верхні замак Віцебска ў XI–XVIII стст.» (1991, навуковы кіраўнік П.Ф. Лысенка). У час падрыхтоўкі «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» праводзіў даследаванні помнікаў археалогіі і археалагічныя разведкі на тэрыторыі Віцебскага раёна.

Тв.: Раскопки в Витебске // Археологические открытия 1979 г. — М., 1980; (разам з М.А. Ткачовым) Итоги археологического изучения Витебска в 1976–1980 гг. // Древнерусское государство и славяне. — Мн., 1983; (разам з М.А. Ткачовым) Раскопкі на Верхнім замку // ПГіКБ. — 1984. — № 1. — С. 35–37; (разам з Т. Скрыпчанка, М. Ткачовым) Віцебскія бранзалеты // ПГіКБ. — 1984. — № 4; (разам з М.А. Ткачовым) Драўляныя вырабы і дрэваапрацоўка ў сярэдневяковым Віцебску // Помнікі культуры: Новыя адкрыцці. — Мн., 1985. — С. 174–183; Основные этапы исторического формирования Верхнего замка Витебска // Актуальные проблемы историко-археологических исследований: тез. докл. VI респ. конф. молодых археологов. — Киев, 1987; (разам з М.А. Ткачовым, Т.С. Бубенька) Средневековый Витебск // Труды V Международного конгресса славянской археологии. — М., 1987. — Т. 3, вып. 1б; Ремесло Витебска в XII–XVII (по материалам раскопок Верхнего города) // Древнее производство, ремесло и торговля по археологическим данным. — М., 1988; Земледелие в средневековом Витебске, XIII–XVI вв. // Сельское хоз-во: История, соврем, опыт и перестройка: тез. конф. — Мн., 1988. — С. 18–19; Транспортные средства Витебска XII–XVII вв. // Древности Литвы и Белоруссии. — Вильнюс, 1988. — С. 119–124; Летописный Витебск: Истоки и генезис // Города Верхней Руси: Истоки и становление: материалы науч. конф. — Торопец, 1990. — С. 51–55; Древнерусский Витебск: Развитие топоструктуры в XI–XIII вв. // Тез. второй Гомельской обл. науч. конф. по ист. краеведению «Гомельщина: археология, история, памятники». — Гомель, 1991. — С. 78–81; Верхні замак Віцебска ў XI–XVII ст.: Этапы станаўлення // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: навук. канф., прысвеч. 1130-годдзю Полацка: тэзісы дакладаў. — Полацк, 1992; Віцебскі храм Св. Міхаіла // Весці АН Беларусь. Серыя гуманітарных навук. — 1995. — № 1. — С. 59–66; «Витебск — три стены каменные…» // БГЧ. — 1995. — № 2. — С. 27; О церкви Св. Михаила в Витебске, конец XI – начало XII // Проблемы изучения древнерусского зодчества. — СПб., 1996; Пра абарончы вал дзядзінца летапіснага Віцебска // Заслаўскія чытанні, 1995 г. — Заслаўе, 1997. — С. 57–60; Аксиомы, теоремы и софизмы в интерпретации становления Верхнего замка Витебска // Castrum urbis et bellum. — Барановичи, 2002. — С. 219–231.

Артыкулы ў перыядычным друку: Першы храм Віцебска: [Св. Міхаіла] // Віцьбічы. — 1992. — № 39. — С. 2; Ціха: загучаць гуслі з XIV ст. // НС. — 1993. — № 129. — С. 2

Літ.: Калядзінскі Л.У. // ЭГБ. Т. 4. — С. 38. Ткачоў М. А. Калядзінскі Л.У. // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. — Мн.: БелЭн, 1993. — С. 297–298; Корзенко Г.В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник. — Мн.: Бел. наука, 2007. — С. 149–150.

**КАМІНСКАЯ** ГАЛІНА ЯСОНАЎНА (23.10.1940, в. Хвашчова Лепельскага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыла Аршанскае педагагічнае вучылішча (1958), Смаленскі педагагічны інстытут па спецыяльнасці «Геаграфія» (1969). Працавала ў школах Сенненскага раёна настаўніцай геаграфіі, арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай работы, намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце ў Янавіцкай СШ. На працягу многіх гадоў праводзіла работу па зборы дакументаў па гісторыі Янавічаў для школьнага музея, якім сама кіравала. Стварыла ў музеі аддзел этнаграфіі. Аўтар артыкулаў на сацыяльную і педагагічную тэматыку ў газеце «Ленінская праўда» Віцебскага раёна. Узнагароджана ордэнам Дружбы народаў.

Тв.: Пачуццё Радзімы // ЛПр. — 1985. — № 19. — С. 3.

Літ.: Краязнаўцы Віцебскага раёна // Памяць: Віцебскі раён: Гісторыка-дакументальная хроніка / уклад. У.І. Мезенцаў. — Мн.: Маст. літ., 2004. — С. 723.



**КАНАПЕЛЬКА** АНАТОЛЬ МІКАЛАЕВІЧ (16.11.1939, г.п. Расоны – 18.12.2002), паэт, перакладчык, літаратуразнаўца, педагог. Скончыў філал. факультэт МгДПІ. Працаваў выкладчыкам у ВДПІ, ВДУ (1968–2002). Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1968).

Аўтар навуковых прац, прысвечаных творчасці пісьменнікаў, жыццё і дзейнасць якіх звязана з Віцебшчынай. Шэраг матэрыялаў быў надрукаваны ў газеце «Народнае слова» у рубрыцы «Анталогія беларускай паэзіі». Усяго 55 асоб, ад Ф. Скарыны, Сімяона Полацкага, Я. Баршчэўскага да Л. Сом і Л. Сіманёнак. Матэрыялы выйшлі асобным выданнем «Старонкі творчых біяграфій» (2003). Пераклаў з польскай мовы балады і вершы Я. Баршчэўскага. Аўтар вершаў, якія друкаваліся на старонках рэспубліканскага і мясцовага перыядычнага друку. Выдатнік адукацыі РБ (1998).

Тв.: Кнігі: Старонкі творчых біяграфій. — Віцебск: ВДУ, 2003. — 81 с.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Уладзімір Дубоўка // НС. — 1999. — № 30. — С. 5; Тодар Кляшторны // НС. — 1999. — № 66. — С. 5; Анатоль Вялюгін // НС. — 1999. — № 69. — С. 5; Алесь Дубровіч // НС. — 1999. — № 95. — С. 5; Патрыярх беларускага адраджэння // НС. — 1999. — № 103. — С. 5; Мікола Сямашка // НС. — 1999. — № 106. — С. 5; Рыгор Жалязняк // НС. — 1999. — № 113. — С. 5; Андрэй Ушакоў // НС. — 1999. — № 119. — С. 5; Уладзімір Караткевіч // НС. — 1999. — № 138. — С. 8; Міхась Машара // НС. — 1999. — № 149. — С. 6; Пімен Панчанка // НС. — 2000. — № 14. — С. 5; Алесь Ставер // НС. — 2000. — № 22. — С. 5; Юрась Свірка // НС. — 2000. — № 25. — С. 6; Уладзімір Скарынкін // НС. — 2000. — № 55. — С. 5; Рыгор Барадулін // НС. — 2000. — № 67. — С. 5; Давід Сімановіч // НС. —

2000. — № 72. — С. 4; Генадзь Бураўкін // НС. — 2000. — № 96. — С. 5; Анатоль Вярцінскі // НС. — 2000. — № 105. — С. 5; Уладзімір Папковіч // НС. — 2000. — № 116. — С. 5; Еўдакія Лось // НС. — 2000. — № 123. — С. 5; Янка Сіпакоў // НС. — 2001. — № 6. — С. 5; Сяргей Законнікаў // НС. — 2001. — № 21. — С. 5; Сяргей Панізьнік // НС. — 2001. — № 35. — С. 5; Вера Вярба // НС. — 2001. — № 66. — С. 5; Яўгенія Мальчэўская // НС. — 2001. — № 60. — С. 5; Галіна Варатынская // НС. — 2001. — № 92. — С. 5; Барыс Беляжэнка // НС. — 2001. — № 112. — С. 5; Пятро Ламан // НС. — 2001. — № 122. — С. 5; Генадзь Дмітрыеў // НС. — 2001. — № 140. — С. 5; Ігар Пракаповіч // НС. — 2002. — № 14. — С. 5; Марыя Баравік // НС. — 2002. — № 29. — С. 5; Людміла Сіманёнак // НС. — 2002. — № 38. — С. 5; Лявон Няўдах // НС. — 2002. — № 57. — С. 5; Лера Сом // НС. — 2002. — № 103. — С. 5; Аркадзь Нафрановіч // НС. — 2002. — № 123. — С. 5; Алесь Шпыркоў // НС. — 2002. — № 147. — С. 5; Тамаш Ляшонак // НС. — 2002. — № 152. — С. 5.

Літ.: Пісьменнікі Віцебшчыны: даведнік. — Віцебск: ВАД, 2001. — С. 40–42; Шпакоўская Г. Анатоль Канапелька // НС. — 2003. — № 3. — С. 5; «Чалавек нараджаецца зоркаю...»: творчы партрэт Анатоля Канапелькі / склад. І.В. Саматой, В.М. Маслоўская. — Віцебск: ВДУ, 2005. — 27 с.

**КАНАПЕЛЬКА** СЯРГЕЙ МІХАЙЛАВІЧ (19.01.1951, в. Шапуры Сялюцкага (цяпер Акцябрскага) с/с Віцебскага раёна), краязнаўца. Скончыў ВДМІ (1974). Служыў ва УС СССР і Міністэрстве ўнутраных спраў СССР і Беларусі (1975–1996), дырэктарам Віцебскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея.

Зацікавіўся краязнаўствам ў 1997 г., калі выконваў абавязкі дэпутата Акцябрскага с/с Віцебскага раёна. Асноўным кірункам дзейнасці лічыць вывучэнне гісторыі Акцябрскага с/с, школы-камуны імя М. Калініна ў в. Сялюты. Распрацоўвае тэму славутых землякоў (генерала авіяцыі П.І. Друзянкова, прафесара Г.І. Мастыкі, прафесара У.М. Велічэнкі, акадэміка А.А. Ахрэма, Героя Савецкага Саюза Г.П. Собалева, Героя Сацыялістычнай працы Р.І. Дарафеенка і інш.). Склаў радавод М. Лынькова да 6-га калена. Вывучае гісторыю народнай адукацыі Віцебскага раёна. Склаў картатэку настаўнікаў, якія працавалі ў Акцябрскім (Сялюцкім с/с) у 1917–2000 гг. Аўтар публікацый на краязнаўчую тэматыку ў газетах «Жыццё Прыдзвіння», «Віцебскі рабочы», «Народнае слова». Некаторыя матэрыялы перадаў у ВРГКМ.

Тв.: Школа-коммуна имени Калинина в Селютах // Дети войны: материалы круглого стола «Детские дома в г. Витебске и Витебской области на временно оккупированной территории в годы Великой Отечественной войны 1941–1944 гг.» / сост. Д.В. Яковлева. — Витебск: ВОТ, 2007. — С. 25–28.

<u>Артыкулы ў перыядычным друку</u>: Глубокий след // ЖП. — 1998. — 14 кастр. С. 3; Селютовские коммунары // ЖП. — 1999. — 18 мая. С. 1; Мемарыяльны знак М. Лынькову // ЖП. — 1999. — 4 снеж. — С. 2; М. Лынькоў нарадзіўся на Віцебшчыне // ВР. — 1999. — 27 ліст. — С. 2; Векапомны Міхась Лынькоў — наш зямляк // ЖП. — 1999. — № 88. — С. 3; Рождение школы: [пас. Акцябрскі] // ЖП. — 2000. — № 85. — С. 3; В какой деревне я живу?: [в. Шапуры] // НС. — 2000. — № 92. — С. 4; Уроженец Шапуров обучал французских летчиков // ЖП. — 2004. — № 70. — С. 2; Кто они, солдаты Первой мировой? // ЖП. — 2008. — № 23. — С. 3; Авроровец: [Ф. Дзенісенка] // ЖП. — 2009. — 12 мая. — С. 3.

Літ.: Краязнаўцы Віцебскага раёна // Памяць: Віцебскі раён: Гісторыка-дакументальная хроніка / уклад. У.І. Мезенцаў. — Мн.: Маст. літ., 2004. — С. 724; Інтэрв'ю С.М. Канапелькі (26.02.2004) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**КАРАБАНЬ** ГАЛІНА ПЯТРОЎНА, музейны работнік. Працавала ва Ушацкім музеі народнай славы імя У.Е. Лабанка. Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў мясцовым перыядычным друку.

Тв.: (разам з Г. Багдановіч) Запрашаем у музей // П. — 1987. — № 59. — С. 2; Сустрэча з гісторыяй // П. — 1987. — № 81. — С. 2; Паводле архіўных звестак: [адукацыя і культура Ушаччыны ў 1920–1940-я гг.] // П. — 1993. — № 33. — С. 2; Забытыя старонкі гісторыі: [раскулачванне] // П. — 1993. — № 38. — С. 2; Забытыя старонкі гісторыі: [стан с/г у 1924 г.] // П. — 1993. — № 49. — С. 2.

**КАПЫЛ** СЯРГЕЙ ПЯТРОВІЧ (1953), краязнаўца. Скончыў ваеннае вучылішча. Служыў ва УС СССР. Цяпер працуе навуковым супрацоўнікам НПГКМЗ. Вывучае гісторыю ваенных дзеянняў у Прыдзвінні ў ХХ ст., гісторыю стварэння Полацкага ўмацаванага пункта і вядзення баявых дзеянняў злучэннямі і часцямі 22-й арміі летам 1941 г.

Тв.: <u>Кнігі:</u> (разам з С.П. Капылом) «Линия Сталина». Полоцкий укрепрайон, 1919 — 1941 гг. — Полоцк: Полоцкое книжное издательство, 2009. — 55 с.

<u>Артыкулы ў навуковым друку</u>: (разам з В. Камісаравым, С. Паляковым) Полоцкая твердыня, 1941г. // БВГ. — 2006. — № 135–136; Полоцкая твердыня // Армия. — 2008. — № 5; Малоизвесные страницы боевой биографии 20-й гвардейской стрелковой дивизии (174-й стрелковой дивизии 1-го формирования) // Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі. Да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея / уклад. В.Д. Краско. — Полацк: НПГКМЗ, 2008. — С. 105–115.

<u>Артыкулы ў перыядычным друку</u>: (разам з С. Паляковым) Полоцк. Крепость // ПВ. — 2006. — № 56. — С. 4; (разам з С. Паляковым) Судьба солдата // ПВ. — 2006. — № 95.

**КАРАЛЕНКА** ВОЛЬГА ВАСІЛЬЕЎНА (1966, г.п. Ушачы), журналіст. Скончыла Ушацкую СШ (1983), факультэт журналістыкі БДУ (1988). Працуе ва ўшацкай раённай газеце «Патрыёт». Аўтар шэрагу артыкулаў па гісторыі і культуры Ушацкага раёна.

Тв.: «Француз» з Бадзяліна: [М.Н. Цецяраў] // П. — 1989. — № 24. — С. 2; Жаночы лёс, абпалены вайной: [П.В. Ціхамірава] // П. — 1989. — № 41. — С. 3; Музей Кузняцова расказвае // П. — 1989. — № 52. — С. 2; Гэта бачыла наша зямля: [злачынствы нямецкіх захопнікаў 1941–1944 гг. на Ушаччыне] // П. — 1990. — № 35. — С. 3; Што ведаем пра сябе: [фальклор] // П. — 1990. — № 84. — С. 2; Народная творчасць Ушаччыны // П. — 1991. — № 87. — С. 2, 4; Гісторыя нашага краю // П. — 1992. — № 82. — С. 2; Жыла-была вёсачка: [вёскі Ушаччыны, якія знікаюць] // П. — 1998. — № 18. — С. 4; Гісторыя вёскі ў лёсах людскіх: [в. Забор'е] // П. — 1998. — № 24. — С. 2; Раскулачаны і высланы з пагранпаласы… // П. — 1998. — № 45. — С. 3; Пакалечаныя лёсы людзей: [рэпрэсіі на Ушаччыне] // П. — 1999. — № 43. — С. 4; Вестка з вайны: [А. Жалейка] // П. — 1999. — № 45. — С. 5; Ва Ушачах начаваў // П. — 2000. — № 13. — С. 2; Пішам летапіс з 30-х гадоў: [газета «Патрыёт»] // П. — 2000. — № 14. — С. 5; Праводзіны рэдактара: [1935] // П. — 2000. — № 22. — С. 5; Заступнік ушачан: [Св. Лаўрэн] // П. — 2000. — № 33. — С. 2; І стала вёска хутарамі // П. — 2000. — № 38. — С. 5; Гадзіннік спыніўся назаўтра: [рэпрэсіі на Ушаччыне] // П. — 2000. — № 47. — С. 2; Будавалі залу, знайшлі «склеп» // П. — 2000. — № 60. — С. 3; Засталіся ад гарматы …: [ДОТ] // П. — 2001. — № 26. — С. 2; Раскіданае гняздо: [рэпрэсіі на Ушаччыне] // П. — 2001. — № 88. — С. 2; Ці ведаеце вы Ушачы?: [успаміны былой жыхаркі Асман] // П. — 2002. — № 70, 72; Каму належаў Ліпавец?: [гісторыя Ушаччыны] // П. — 2004. — № 7. — С. 2; Усайская валасць, тут жылі… // П. — 2004. — № 8. — С. 3; Са светлай радасцю ў свой храм: [касцёл Св. Лаўрэна] // П. — 2004. — № 86. — С. 2; Такая розная вайна // П. — 2005. — № 11. — С. 2; Магіла невядомага салдата // П. — 2005. — № 17. — С. 2; Адрэстаўраваць можна не ўсё: [помнікі гісторыі і культуры Ушаччыны] // П. — 2005. — № 31. — С. 2; Нумізматыка — малодшая сястра гісторыі: [С. Аваднёў, калекцыянер] // П. — 2005. — № 63. — С. 2; Храм узводзіцца ўсім мірам: [Ушачы] // П. — 2007. — № 70. — С. 2; Філосаф, палітык, паэт: [Хаім Жытлоўскі, гр.-паліт. дзеяч, нарадзіўся ва Ушачах] // П. — 2008. — № 8. — С. 2.

**КАРАЛЁЎ** ВАЛЕРЫЙ ВАСІЛЬЕВІЧ (*А. Залескі*) (нарадзіўся ў Мінску), краязнаўца. Вучань В.А. Ермалёнка. На аснове бібліятэкі і збору дзеда Віталіса Багдановіча напісаў і апублікаваў шэраг артыкулаў у рэспубліканскім, мясцовым і замежным перыядычным руку («Чырвоная змена», «Выбар», «ЛіМ», «Сцяг працы» («Міёрскія навіны»), «Паўночны край», «Ніва» (Беласток), «Павет»). Аўтар чатырох матэрыялаў, змешчаных у кнізе «Памяць» Міёрскага раёна. Перадаў некаторыя матэрыялы ў Браслаўскі гісторыка-краязнаўчы музей, ПГКМЗ, музей СШ № 3 г. Міёр.

Займаўся даследаваннем гісторыі Міёршчыны, аддаючы перавагу 1920–1930-м гг. Абапіраючыся на польскія крыніцы, аналізуючы тагачасную літаратуру, апісвае падзеі савецка-польскай вайны, стан адукацыі, жыццёвыя лёсы землякоў. З асаблівым замілаваннем апісвае родныя Волкавічы. Жыве ў Францыі.

Тв.: Аб іх не гаварылі голасна // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Міёрскага раёна. — Мн.: Бел. навука, 1998. — С. 290–292.

Артыкулы ў перыядычным друку: Скарбы з гарышча // СП (М). — 1990. — № 133. — С. 3; Сведкі абвінавачваюць // СП (М). — 1991. — № 11. — С. 3; Чароўнае слова. Самае страшнае. Хітры бацька // СП (М). — 1991. — № 75; І камяні гавораць // СП (М). — 1991. — № 86. — С. 3; Нам засталася спадчына // СП (М). — 1992. — № 60. — С. 2, 3; Адукацыя, 20–30-я гады // СП (М). — 1992. — № 102. — С. 3; Школа ў Волкаўшчыне // СП (). — 1993. — № 13. — С. 2; Карчма ў Волкаўшчыне // СП (М). — 1993. — № 26; Малое паселішча // СП (М). — 1993. — № 38; Георгіеўскі кавалер // СП (М). — 1993; Бітва на Аўце // КР. — 1994. — № 95. — С. 2; Лёс настаўніка // СП (М). — 1999. — № 32. — С. 3; Унія: Гісторыя і сучаснасць // СП (М). — 2000. — № 80. — С. 3; Хрысціянізацыя // СП (М). — 2000. — № 98, 104; У завірусе савецка-польскай вайны // МН. — 2001. — № 17. — С. 3; Перасяленні // МН. — 2002. — № 77. — С. 3; Зямельныя ўладанні, мяжуючыя з маёнткам Навалока // МН. — 2002. — № 33. — С. 4; Пад гербам «Бялыня» // МН. — 2003. — № 47. — С. 3; Волкаўшчына і яе ваколіцы // МН. — 2003. — № 53. — С. 3; Унія: Ад заняпаду да ліквідацыі // МН. — 2003. — № 59. — С. 3, 4; У час Лівонскай вайны // МН. — 2003. — № 65. — С. 3, 4; Беларуская лазня // МН. — 2003. — № 84. — С. 4; Хто карміў салдат Перамогі? // МН. — 2003. — № 93. — С. 3; Як пашыраліся гарызонты вёскі // МН. — 2003. — № 95. — С. 4; Пісьменнасць. Адукацыя // МН. — 2003. — № 101–104; Паданні Ваўкоўшчыны і яе ваколіц // Павет. — 2003. — № 10 (23). — С. 4; Партызанскі дакумент // Тамсама. — С. 5; Мабілізацыя ў Мёрах — 1941 г. // Павет. — 2004. — № 2 (27). — С. 6–7; Георгіеўскі кавалер: [М.М. Багдановіч] // Тамсама. — С. 7; Полымем жорсткасці абпалены лёс: [А. Юршэвіч] // Павет. — 2004. — № 3 (28). — С. 4–5; У апошнія дні // Павет. — 2004. — № 6 (31). — С. 5–7; Баркулаб Корсак // Павет. — 2004. — № 7 (32). — С. 7–8; Адукацыя пад час нямецка-фашысцкай акупацыі // Павет. — 2004. — № 9 (34). — С. 4; Песняў крылы лебядзіныя // МН. — 2004. — № 24. — С. 4; Найлепшы час, як выспявае душа // МН. — 2004. — № 33. — С. 3; Жорсткасцю апалены лёс // МН. — 2004. — № 58. — С. 3; Кідок з Дзісны на Боркавічы // МН. — 2004. — № 62. — С. 4.

**КАРАЛЁЎ** ГЕОРГІЙ АЛЯКСЕЕВІЧ (12.05.1933, г. Віцебск), журналіст. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ (1959). Працаваў у рэдакцыі раённай газеты «Чырвоны хлебароб» («Ленінец», «Сцяг Ільіча») у г. Талачыне (1957–1962), уласным карэспандэнтам па аршанскім рэгіёне газеты «Віцебскі рабочы» (1962–2007).

Даследуе гістарычнае мінулае Аршанскага, Талачынскага і Дубровенскага раёнаў. Аўтар некалькіх артыкулаў і матэрыялаў у дакументальнай хроніцы «Памяць» Аршанскага, Дубровенскага і Талачынскага раёнаў. Матэрыялы пра землякоў друкаваў у выданнях, прысвечаных ветэранам партыйнага камуністычнага руху: «Знаменосцы трудовой славы», «Ветераны ленинской партии». Аўтар буклета «П.П. Лепяшынскі ў Оршы» (Віцебск, 1987). Браў удзел у падрыхтоўцы кніг «Памяць» Дубровенскага, Талачынскага раёнаў, выдання «Почётные граждане Орши». Аўтар артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым друку. Матэрыял, прысвечаны гісторыі Друцка, атрымаў адзнаку археолага Л.В. Аляксеева. Некаторыя матэрыялы перадаў у музеі г. Оршы.

Узнагароджаны Граматай ВС БССР (1977), медалём «За трудовую доблесть» (1987), медалём ВДНГ СССР (1972). Член Саюза журналістаў РБ (1997), заслужаны журналіст Беларусі.

Тв.: Артыкулы ў навуковым друку: Земля кормилица: [З.І. Баркоўскі] // Знаменосцы трудовой славы. — Мн., 1984. — С. 33–38; Кремлёвский курсант: [Г.Т. Шчарбінскі] // Ветераны ленинской партии. — Мн., 1987. — С. 82–90; Горад над Друццю // Беларусь. — 2001. — № 10; Справа, якая цягнулася 35 гадоў // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна. — Мн.: БелСЭ, 1988. — С. 56–57; (разам з Л.К. Высоцкім) П.М. Лепяшынскі ў Слаўным // Тамсама. — С. 67–68; Распятый на кресте: [Ю.В. Смірноў] // Память: Историко-документальная хроника Дубровенскага района. Кн. 2. — Мн.: Паліграфафармленне, 1996. — С. 119; Першая ластаўка // Дзвіна. — Мн., 1992.

Артыкулы ў перыядычным друку: У залпах тысяч батарэй… // ВР. — 1985. — № 6. — С. 2; Ля арліных вышынь: [П.М. Шайтар] // ВР. — 1987. — № 25. — С. 3; Зямля акадэмікаў: [4.12.1986 тры ўраджэнцы Аршаншчыны сталі акадэмікамі] // ВР. — 1987. — № 75. — С. 4; Арганізатар, баец, рэвалюцыянер: [П.М. Лепяшынскі] // ЛП. — 1988. — № 41. — С. 2; Пранеслі дружбу праз жыццё // ВР. — 1988. — № 50. — С. 2; Жыццё ў шматгранных праяўленнях. У Оршы Коласа шукалі // ВР. — 1992. — № 143. — С. 4; 2. У Оршы Коласа знайшлі // ВР. — 1992. — № 144. — С. 4; Фальшыўка праўдзе не патрэбна: [рэцэнзія] // ВР. — 1993. — № 79. — С. 2; Сям'я патрыётаў: [Жолудзевы] // ВР. — 1995. — № 54. — С. 4; Пад музыку турбін // ВР. — 1995. — № 169. — С. 3; З буссоллю і блакнотам: [М.П. Врончанка] // ВР. — 1996. — № 10. — С. 5; Пасланне, перапісанае праз стагоддзі: [Рагвалодаў камень] // ВР. — 1998. — № 136. — С. 8; Такие знакомые и незнакомые…: [Пушкін і Віцебшчына] // ВР. — 1999. — № 62. — С. 2; Жыццё ў шматгранных праяўленнях: [Я.Колас на Аршаншчыне] // НТ. — 2002. — № 76, 77, 81; Іх імёны ў памяці нашай назаўсёды: [П.А. Галецкі] // НТ. — 2005. — № 27, 31–32; Династии от Кобылы // ТЭ. — 2008. — № 22, 23.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Каралёў Г.А. (20.01.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**КАРАЛЁЎ** (*Паўлаў*) МІХАІЛ ІВАНАВІЧ (10.04.1952, г. Талачын), журналіст. Скончыў Ленінградскае вышэйшае ваеннае вучылішча радыёэлектронікі (1973), Харкаўскую радыётэхнічную акадэмію (1983). Служыў ва УС СССР і РФ (1973–1995). Працуе намеснікам гал. рэдактара газеты «Наша Талачыншчына» (з 2007). Комплексна вывучае Талачынскі раён, аддаючы перавагу даследаванням перыядаў гісторыі на стыку эпох, Талачыншчыну ў складзе царскай Расіі, савецкія пераўтварэнні 1920–1930-х гг., гісторыю раёна 1941–1944 гг., жыццё ў СССР і ў незалежнай Беларусі. Асаблівую цікавасць выклікаюць росшукі, якія датычацца часоў Вялікай Айчыннай вайны і знайшлі адлюстраванне ў газетных артыкулах: «Танковый след» — пра пошукі нямецкага танка «каралеўскі тыгр», «Родом из Друцка» — пра генерала В. Гурко, «Правитель Монголии и Толочинская ветвь» — пра род Унгернаў, «Жаркое небо Египта» і інш.

Тв.: Городище: [былая вёска ў Талачынскім раёне] // НТ. — 2005. — № 101. — С. 4; Родом из Друцка: [ген. В.У. Гурко] // НТ. — 2006. — № 6. — С. 2; (разам з М.Г. Хмялюк) Правитель Монголии и Толочинская ветвь: [барон Унгерн] // НТ. — 2006. — № 62. — С. 4; Танковый след: [унікальная знаходка танка «каралеўскі тыгр»] // НТ. — 2006. — № 88–89. — С. 7; Поиск продолжается: [знаходка ў р. Друць нямецкага танка Т-VI] // НТ. — 2007. — № 23, 26; Разбросавшие камни: [святая крыніца] // НТ. — 2007. — № 42. — С. 4; Московские трофеи Наполеона: [залаты скарб Напалеона на Талачыншчыне] // НТ. — 2007. — № 90–93, 95; (разам з М.Г. Хмялюк) Отныне и во веки веков…: [да 155-годдзя каталіцкага храма і 15-годдзя парафіі ў Талачыне] // НТ. — 2007. — № 102. — С. 3; Д'артаньян из Толочина: [В.Ф. Зайцаў] // НТ. — 2008. — № 3. — С. 2; Где-то под Толочином: [першыя баі РСЧА у 1918 г.] // НТ. — 2008. — № 5. — С. 3; Витебский пехотный полк // НТ. — 2008. — № 16. — С. 1, 2; Жаркое небо Египта: [Я.Ф. Дзідзенка] // НТ. — 2008. — № 30. — С. 4; Лики войны // НТ. — 2008. — № 42. — С. 4; Дорогой тысячелетий // НТ. — 2008. — № 48. — С. 3; Имя на памятной доске: [Герой Савецкага Саюза Кожар І.П. — ураджэнец Коханава] // НТ. — 2008. — № 64. — С. 44; «Матерь Полтавской баталии» // НТ. — 2008. — № 76. — С. 2; Шаг к единству: [царкоўная унія] // НТ. — 2008. — № 96. — С. 2.






**КАРАСЁЎ** ВІКТАР РАМАНАВІЧ (12.02.1937, в. Рыбакі Полацкай акругі, цяпер г.п. Ветрына Полацкага раёна), краязнаўца. Скончыў Латвійскі дзяржаўны ўніверсітэт (1968). Служыў у войску, працаваў настаўнікам гісторыі ў розных школах г. Полацка (1983–1989), СШ імя Д.В. Цябута г.п. Ветрына (1995–2005).

Краязнаўчымі даследаваннямі стаў займацца з 1994 г. Значны ўплыў на фарміраванне зацікаўлення гісторыяй роднага краю аказаў А. Падліпскі. Вывучае гісторыю г.п. Ветрына і Полаччыны.

Выявіў месца пахавання беларускага і рускага этнографа, археолага, фалькларыста, краязнаўцы А.М. Семянтоўскага, які вывучаў Віцебшчыну ў другой палове XIX ст., устанавіў памятны знак на яго магіле. Сумеснымі намаганнямі краязнаўцы і яўрэйскай абшчыны быў усталяваны памятны знак на месцы згубы яўрэяў у Ветрыне ў часы Другой сусветнай вайны. Даведаўшыся пра тое, што вядомы абаронца Брэсцкай крэпасці Пеця Клыпа да Вялікай Айчыннай вайны жыў у Ветрыне і вучыўся ў Ветрынскай школе, увёў у навуковы ўжытак гэты матэрыял, арганізаваў усталяванне мемарыяльнай шыльды на будынку Ветрынскай СШ (2002). Адшукаў і апублікаваў матэрыялы пра братоў Івана і Антона Весценбергаў, якія з'яўляліся партызанскімі разведчыкамі і былі растраляны фашыстамі вясной 1944 г. У 2004 г. у іх гонар на тэрыторыі школы адкрыты памятны знак. Ва ўшанаванне славутага земляка, выдатнага дзеяча беларускай культуры, выдаўца, фалькларыста, мовазнаўцы, літаратуразнаўцы Б.І. Эпімаха-Шыпілы на яго радзіме, у в. Залессе, быў усталяваны памятны знак (2006). Адзін з ініцыятараў і стваральнікаў музея Ветрына і музея Ветрынскай школы (2003, з нагоды юбілеяў — 500-годдзя Ветрына і 140-годдзя Ветрынскай школы).

Актыўна ўдзельнічае ў грамадскім і культурным жыцці краю. З'яўляецца членам раённага каардынацыйнага Савета па ахове гісторыка-культурнай спадчыны (з 2000), літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне». Бярэ ўдзел міжнародных, рэспубліканскіх і абласных канферэнцый краязнаўчай накіраванасці.

Аўтар шэрагу артыкулаў у мясцовым і рэспубліканскім перыядычным друку. На аснове шматлікіх матэрыялаў, сабраных на працягу дзесяцігоддзяў, напісаў кнігі, прысвечаныя роднаму кутку і Ветрынскай школе: «Ветрына і наваколле», «Мая любоў Ветрына», «Сэрца майго часцінка».

Тв.: Кнігі: Ветрына і наваколле: храналогія гісторыі. — Віцебск: ВАД, 1999. — 48 с.; Мая любоў — Ветрына: гістарычныя нарысы. — Полацк: Полацкая друкарня, 2004. — 200 с.; Майго сэрца часцінка: нарысы з гісторыі Ветрынскай школы. — Полацк: Полацкая друкарня, 2004. — 312 с.

Артыкулы ў перыядычным друку: У гонар героя: [І.Е. Аляксееў] // СК. — 1985. — № 63. — С. 2; Будзе музей земляка: [Суднік М. — дырэктар Інстытута мовазнаўства НАН Беларусі] // НС. — 1997. — № 141. — С. 6; Яшчэ раз пра Ганну Місуну // ПВ. — 1998. — 16 снеж. — С. 2; Найвялікшае шчасце — служыць людзям: [М.П. Ракомса] // ПВ. — 1999. — № 6. — С. 2; Так пачыналася вайна. Старонкі гісторыі Ветрына // ПВ. — 1999. — № 59. — С. 3; Ветрына–чэрвень 1944-га // ПВ. — 1999. — № 63. — С. 3; Лётчык з Дубраўкі: [Ф. Барэйка] // ПВ. — 1999. — № 71. — С. 3; Маршал Чуйкоў В. і Полаччына // ПВ. — 1999. — № 81. — С. 2; Восень 1939-га: Час уз'яднання // ПВ. — 1999. — № 82. — С. 2; Тут кропка адліку яго высокага ўзлёту: [вядучы інжынер-тэхнолаг ракетна-касмічнай карпарацыі «Энергія» У. Залескі з в. Бабынавічы] // ПВ. — 2000. — 14 студз. — С. 2; Юны абаронца Брэсцкай крэпасці жыў і вучыўся ў Ветрына // ПВ. — 2000. — № 16, 18; Сяброўкі-медсёстры // ПВ. — 2000. — № 20. — С. 2; І такія былі маладыя хлопцы // ПВ. — 2000. — № 37. — С. 4; Крылы дала Полаччына: [У.Ф. Лабок] // ПВ. — 2000. — № 68. — С. 3; Чараўнік роднага слова: [М.Р. Суднік] // ПВ. — 2000. — № 93. — С. 2; Хрысціянскія храмы Ветрыншчыны // ПВ. — 2001. — № 57, 58; Багатая на ўраджай восень яе жыцця: [А.В. Яцкевіч] // ПВ. — 2001. — № 67. — С. 2; З кагорты юных абаронцаў Айчыны // ПВ. — 2002. — № 16, 17; Этнограф, гісторык, патрыёт: [А.М. Семянтоўскі] // ПВ. — 2002. — № 66. — С. 3; Даніна памяці. Генацыд яўрэяў у Ветрына // ПВ. — 2002. — № 89. — С. 3; Засталіся маладымі: [В. Біганава, Г. Вайтовіч] // ПВ. — 2003. — № 22. — С. 7; Руплівец роднага слова: [Суднік М.Р. — дырэктар Інстытута мовазнаўства АН БССР] // ПВ. — 2003. — № 95. — С. 10; (разам з У. Яцкевіч) Добры чалавек: [М.М. Сівіцкі] // ПВ. — 2003. — № 100. — С. 3; Дзяцінства, растралянае вайной // ПВ. — 2004. — № 77. — С. 8; Настаўнік, камбрыг, дзяржаўны дзеяч: [Д.В. Цябут, камандзір партыз. брыгады] // ПВ. — 2004. — № 74–75. — С. 7; Подзвіг маці: [Д.Р. Мялешка] // ПВ. — 2005. — № 99–100. — С. 2; У гонар землякоў-пісьменнікаў: [В. Гарбук, М. і С. Сямашкі] // ПВ. — 2006. — № 54, 56, 64; Яе вялікасць — маці // ПВ. — 2006. — № 33. — С. 5; Герой, які служыў Айчыне, не памірае: [генерал Я. Кульнеў] // ПВ. — 2007. — 24 ліп. — С. 4.

Літ.: Гайвеновіч В. Па залах школьнага музею // ПВ. — 1999. — № 12. — С. 2; Лепешка А. Новых удач Вам, Віктар Раманавіч // ПВ. — 2002. — № 13. — С. 2; Гайвеновіч В. Музей школы і роднага мястэчка

адкрыўся ў Ветрынскай СШ // ПВ. — 2003. — № 10. — С. 2; Малашэня Л. Ветрына // НС. — 2004. — № 126. — С. 5; Гісторыка-краязнаўчыя чытанні ў Полацку // КГ. — 2006. — № 46 (159). — С. 2; Сучасныя беларускія краязнаўцы // КГ. — 2007. — № 30 (191). — С. 2; Мацюшонак Т. Каб іншыя так любілі // Культура. — 2007. — 3 ліст. — С. 14–15.






**КАРАТКЕВІЧ** (Нікіціна, Ватковіч) ВАЛЯНЦІНА БРАНІСЛАЎНА (28.06.1934, с. Белаводскае Маскоўскага раёна, Кыргызстан – 28.02.1983), краязнаўца. Кандыдат гіст. навук (1965). Жонка пісьменніка У.С. Караткевіча. Скончыла БДУ (1956). Працавала навуковым супрацоўнікам у Ашмянскім краязнаўчым і Брэсцкім гісторыка-краязнаўчым музеях, выкладчыкам у БДПІ, ст. навуковым супрацоўнікам ў ІМЭФ АН БССР (1969–1983).

Даследавала старажытнасці паморскай культуры на тэрыторыі Беларусі, займалася вывучэннем гарадоў. Брала актыўны ўдзел у стварэнні «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», з’яўлялася членам рэдкалегіі. З мэтай падрыхтоўкі тома, прысвечанага Віцебскай вобл., праводзіла даследаванні раёнаў і гарадоў гэтага рэгіёна. Праводзіла археалагічныя даследаванні Ушацкага, Чашніцкага раёнаў. Аўтар амаль сотні артыкулаў у «Зборы помнікаў гісторыі і культуры», прысвечаных помнікам археалогіі, архітэктуры, славутым землякам, героям Савецкага Саюза — ураджэнцам раёнаў і гарадоў Віцебшчыны. Аўтар кнігі «Памятники истории Витебска» (1975).

Тв.: Памятники истории Витебска. — Мн.: Полымя, 1975. — 24 с.; Уводзіны // ЗПГіКБ. Віцебская вобл. — С. 38–39; (разам з А.А. Воінавым) Ансамбль вуліцы Кірава // Тамсама. — С. 47; Будынак, у якім быў створаны ваенна-рэвалюцыйны камітэт // Тамсама. — С. 49–50; (разам з Т. Чарняўскай) Губернатарскі палац // Тамсама. — С. 52–53; Дом, у якім знаходзіўся Віцебскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў // Тамсама. — С. 53–54; Мемарыяльная дошка У.І. Леніну // Тамсама. — С. 69; Месца паўстання гараджан у 1623 г. // Тамсама. — С. 70; Радзіма І. Бескіна // Тамсама. — С. 82; Радзіма Р. Жалезняка // Тамсама. — С. 82–83; Радзіма А. Маўзона // Тамсама. — С. 83; Радзіма П. Нікіфарава // Тамсама. — С. 83; БелДРЭС // Тамсама. — С. 99; (разам з А. Кулагіным) Сядзіба (в. Высокае Аршанскага раёна) // Тамсама. — С. 103–104; Радзіма А.А. Гейнэ // Тамсама. — С. 122; Брацкая магіла сав. воінаў і партызан (в. Саннікі Бешанковіцкага раёна) // Тамсама. — С. 130–131; Воінскія могілкі (в. Узрэчча) // Тамсама. — С. 131–132; Магіла У. Сімацкага (г.п. Асвея) // Тамсама. — С. 162; Радзіма Кобзуна І. // Тамсама. — С. 164; Радзіма А.К. Антоненкі (в. Васькавічы Віцебскага раёна) // Тамсама. — С. 183; Радзіма М.Я. Нікіфароўскага // Тамсама. — С. 184; Радзіма М.І. Аверчанкі (Гарадоцкі раён) // Тамсама. — С. 215; Магіла А.Я. Казлова (в. Мяжа Гарадоцкага раёна) // Тамсама. — С. 217; Радзіма П.В. Сухога // Тамсама. — С. 227–228; Вайсковыя могілкі (г.п. Лёзна) // Тамсама. — С. 288; Магіла І. Шляхценкі (в. Веляшковічы Лёзненскага раёна) // Тамсама. — С. 291; Радзіма Я.М. Фаміна (в. Калышкі) // Тамсама. — С. 295; Брацкія могілкі савецкіх воінаў (в. Смародзіна Лёзненскага раёна) // Тамсама. — С. 299; Брацкія могілкі (в. Чарніцы) // Тамсама. — С. 300; (разам з Т. Чарняўскай) Забудова плошчы Леніна ў Полацку // Тамсама. — С. 343–344; Помнік У.М. Азіну // Тамсама. — С. 347–348; Радзіма Л.С. Корнева // Тамсама. — С. 353; Радзіма Сімяона Полацкага // Тамсама. — С. 353; Радзіма С.М. Канашэнкі // Тамсама. — С. 376; (разам з Н.С. Ліхтаровіч) Сядзіба, месца працы Янкі Купалы (Старая Беліца) // Тамсама. — С. 407; Радзіма А. Рылько // Тамсама. — С. 418; Брацкія могілкі (г.п. Ушачы) // Тамсама. — С. 423; Дом, у якім размяшчаліся аператыўная група ЦК КП(б)Б і БШПР // Тамсама. — С. 423–424; Курганны могільнік (Ушачы) // Тамсама. — С. 424; Месца размяшчэння партыз. брыгады імя В.І. Чапаева // Тамсама. — С. 424–425; Помнік Н.Л. Касцючэнка // Тамсама. — С. 425; Сядзіба (в. Арэхаўна Ушацкага раёна) // Тамсама. — С. 425–426; Помнік ахвярам фашызму (в. Бабовішча Ушацкага раёна) // Тамсама. — С. 426; Месца размяшчэння партыз. брыгады імя У.І. Леніна // Тамсама. — С. 427; Месца размяшчэня партыз. брыгады імя А. Данукалава // Тамсама. — С. 427; Гарадзішча, курганы (вв. Гарадзец-3, Заазер’е, Замошша, Усая, Чамярычына) // Тамсама. — С. 427, 428, 429; Брацкая магіла (в. Глыбачка Ушацкага раёна) // Тамсама. — С. 428; Брацкая магіла (вёскі Дубраўка, Жары) // Тамсама. — С. 428; 429; Месца стварэння Чашніцкай партыз. брыгады // Тамсама. — С. 429; Дом, дзе размяшчаўся штаб партыз. брыгады С.М. Кароткіна // Тамсама. — С. 430–431; Месца размяшчэння штаба 1-й партыз. брыгады А. Суворава // Тамсама. — С. 431; Месца стварэння партыз. брыгады імя ВЛКСМ // Тамсама. — С. 432; Месца спаленай вёскі (в. Мурагі) // Тамсама. — С. 433; (разам з Л.Г. Лапцэвіч) Мемарыяльны комплекс «Прарыў» // Тамсама. — С. 433–435; Месца размяшчэння падпольнай друкарні падпольнай газеты «Прымежны калгаснік» // Тамсама. — С. 435; Дом, дзе размяшчаўся штаб 16-й Смаленскай партыз. брыгады // Тамсама. — С. 437; Дом, дзе размяшчаўся штаб партыз. брыгады «За Савецкую Беларусь» // Тамсама. — С. 439–440; Дом, дзе размяшчаўся штаб партыз. брыгады імя К. Варашылава // Тамсама. — С. 440; Месца стварэння атрада «Смерць фашызму» // Тамсама; Брацкая магіла, помнік вызвалення (г. Чашнікі) // Тамсама. — С. 442; Мемарыяльная дошка ў гонар Сенненскай партыз. брыгады // Тамсама. — С. 444; Гарадзішча, курганны могільнік, курган (в. Аўсянкі,

Грынькі, Дварэц, Палітаддзел Чашніцкага раёна) // Тамсама; Месца стварэння Лепельскага партыз. атрада № 68 // Тамсама. — С. 445; Радзіма К.В. Кіркіжа // Тамсама; Мемарыяльная дошка падпольшчыкам і партызанам // Тамсама. — С. 446; Мемарыяльная дошка ў гонар Чашніцкіх падпольных райкомаў КП(б)Б, ЛКСМБ // Тамсама. — С. 447; Радзіма І.М. Красніка // Тамсама. — С. 448; Помнік воінам Айчыннай вайны 1812 г. (в. Копцэвічы Чашніцкага раёна) // Тамсама; Помнік Ф. Азміцелю // Тамсама. — С. 450; Месца жыцця і дзейнасці В.М. Цяпінскага // Тамсама. — С. 453; Замчышча, курганны могільнік: [в. Красамай Шумілінскага раёна] // Тамсама. — С. 468.

Літ.: Казлоўская М.М. Караткевіч В.Б. // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. — Мн.: БелСЭ, 1993. — С. 311.



**КАРАТКЕВІЧ** УЛАДЗІМІР СЯМЁНАВІЧ (26.11.1930, г. Орша – 25.07.1984), выдатны беларускі пісьменнік. У нататцы закранем толькі тыя старонкі біяграфіі паэта, якія маюць дачыненне да вывучэння Віцебшчыны.

З'яўляўся вядучым праграмы «Спадчына», якая ішла на Беларускім тэлебачанні і асвятляла мінулае краіны: яе гісторыю, кнігі, адзенне, помнікі даўніны. Асобная перадача была прысвечана Полацку і Полаччыне. У рэспубліканскім перыядычным друку ўзнімаў праблемы аховы помнікаў даўніны, нацыянальнай спадчыны. Дбаў аб стварэнні ў БССР музею народнай архітэктуры і быту. У складзе экспедыцыі сектара «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» ІЭМФ АН БССР даследаваў Бешанковіцкі, Чашніцкі, Лепельскі раёны Віцебскай вобл. (22–31.07.1971), Бярэзінскі запаведнік (8.1971), Сенненскі раён (1975). Аўтар артыкула ў «Зборы помнікаў гісторыі і культуры» пра в. Ст. Беліца Сенненскага раёна. Удзельнік з'ездаў БДТАПГіК.

Жонка, Валянціна Браніслаўна Караткевіч, брала ўдзел у стварэнні «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» як супрацоўнік ІЭМФ АН БССР.

Тв.: (разам з Н.С. Ліхтаровічам) В. Старая Беліца. Сядзіба, месца працы Янкі Купалы // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебскай вобл. — Мн.: БелСЭ, 1985. — С. 407.

Літ.: Падарожжа ў будучую кнігу: У творчых лабараторыях землякоў // ВР. — 1972; Гілевіч Н. Уладзімір Караткевіч: Летапіс жыцця і творчасці // АГ.

**КАРГЕР** МІХАІЛ КАНСТАНЦІНАВІЧ (17 (30).05.1903, г. Казань – 26.08.1976), савецкі археолаг і мастацтвазнаўца. Доктар гіст. навук (1959), прафесар (1949). Скончыў Петраградскі ўніверсітэт (1927). Працаваў у Ленінградскім універсітэце загадчыкам кафедры гісторыі мастацтва (1949–1973), загадчыкам (дырэктарам) Дзяржаўнай акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры (Ленінградскае аддзяленне Інстытута археалогіі АН СССР, 1953–1971), выкладаў у Акадэміі мастацтваў (1938–1950). Вывучаў славяна-рускую археалогію і гісторыю старажытна-рускай культуры і мастацтва. З сярэдзіны 1950-х гг. пад яго кіраўніцтвам былі здзейснены археалагічныя і рэстаўрацыйныя работы ў 20 гарадах. Даследаваліся старажытныя археалагічныя помнікі ў Тураве, Навагрудку, Ваўкавыску, Полацку (сярод іншых Бельчыцкі манастыр), царква Дабравешчання ў Віцебску. Лаурэат Сталінскай прэміі СССР (1952). Узнагароджаны ордэнам Леніна.

Тв.: Храм-усыпальница в Евфросиньевском монастыре в Полоцке // СА. — 1977. — № 1; Отчет о раскопках Полоцкой археологической экспедиции Института истории АН БССР в 1957 г. // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Спр. 25; Отчет об археологических раскопках, проведенных Архитектурно-археологической экспедицией Ленинградского государственного университета в г. Полоцке в 1961 г. // Тамсама. Спр. 119; Отчёт об археологических раскопках, проведённых Архитектурно-археологической экспедицией Ленинградского государственного университета в г. Полоцке в 1962 г. // Тамсама. Спр. 166; Отчёт об археологических раскопках, проведённых Архитектурно-археологической экспедицией Ленинградского отделения Института археологии АН СССР и Ленинградского государственного университета в г. Полоцке в 1964 г. // Тамсама. Спр. 251; Отчёт о раскопках руин древнего храма на Верхнем замке Полоцка в 1967 г. // Тамсама. Спр. 308.

Літ.: Вагнер Г. К., Кирпичников А. Н., К 60-летию М. К. Каргера // СА. — 1963. — № 4; Кирпичников А.Н. К 70-летию М.К.Каргера // Культура средневековой Руси. Л., 1974; Булкин В.А. Каргер М.К.: [электронны рэсурс]. СПб.: Энциклопедия, 2005. — Рэжым доступу: // www.encspb.ru/article.php?kod=2804015105.

**КАРЖАНЕЎСКАЯ** АЛА БРАНІСЛАВАЎНА, настаўнік гісторыі і геаграфіі, кіраўнік этнаграфічнага пакоя ў школе в. Гірэйша Браслаўскага раёна. Стварыла этнаграфічны пакой пры школе, у якім маюцца раздзелы: «Пляценне», «Рукадзелле, вышыўка, ткацтва», «Ганчарныя вырабы» і інш. Гурткоўцамі створаны працы «Летапісанне Грытунскай школы», «Летапісанне саўгаса "Відзаўскі"» і інш.

Літ.: Каржанеўская А. Нашы жыццёвыя карані // БЗ. — 2001. — № 21. — С. 2.

**КАРНІЛОВІЧ** ЭДУАРД АЛЯКСАНДРАВІЧ (5.04.1936, в. Любанічы Талачынскага раёна Віцебскай вобл.), гісторык. Кандыдат гіст. навук (1971). Скончыў факультэт журналістыкі БДУ (1965), аспірантуру БДУ (1969–1971). Працаваў інструктарам Талачынскага райкама ЛКСМБ (1954–1955), сакратаром камітэта камсамола Мінскага будтрэста № 4, інструктарам Сталінскага райкама ЛКСМБ г. Мінска (1959–1961), рэдактарам, ст. рэдактарам маладзёжных праграм Беларускага тэлебачання (1962–1964), інструктарам Мінскага абкама ЛКСМБ (1965–1966), загадчыкам кабінета філасофіі і навуковага камунізму, выкладчыкам БТІ (1966–1971), ст. выкладчыкам, дацэнтам кафедры навуковага камунізму (пазней паліталогіі) БІНГ (БДЭУ) (з 1971).



Даследуе ўдзел ураджэнцаў Беларусі ў дзяржаўным кіраўніцтве, рэвалюцыйным руху ў царскай Расіі, біяграфіі беларускіх палітычных дзеячаў XX ст., у прыватнасці, Віцебшчыны. Аўтар прац «Рэвалюцыяй прызваныя» (1980), «Людзі рэвалюцыйнага подзвігу» (1985). Складальнік зборнікаў (разам з Э.А. Забродскім) успамінаў ураджэнцаў Беларусі, сярод якіх ёсць дзеячы з Віцебшчыны, пра падзеі Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі 1917 г. («У жалезных батальёнах рэвалюцыі», 1987).

Працаваў у ДАВВ з мэтай выяўлення матэрыялаў пра ўраджэнцаў Віцебшчыны для кнігі «Грамадска-палітычныя дзеячы Беларусі (1900–1941 гг.)»: В.А. Арцымовіча, А.І. Дзякава, Ю.П. Жаўлевіча, А.К. Марусевіча, Л.В. Пятражыцкага, А.Г. Сліттэн, Ф.Я. і М.Я. Цыганковых, М.В. Цясленкі і інш. Шэраг матэрыялаў пра рэвалюцыянераў-землякоў апублікаваў у кнігах «Памяць» гарадоў і раёнаў Віцебскай вобл., мясцовых перыядычных выданнях Віцебшчыны, напрыклад, артыкулы «Наркам працы» (А.М. Ціхан), «Пад імем "швітурыс"» (С.С. Турла) і інш.

Тв.: Кнігі: Публицистическая и редакторская деятельность Платона Головача: автореф. канд. дис. — Минск, 1971. — 16 с.; (разам з Р. В. Булацкім) Платон Галавач — публіцыст. — Мн., 1973; На гребне истории. — Мн.: Беларусь, 1989. — 240 с.; Генерал славянской рати. — Мн.: Беларусь, 2007. — 190 с.

Артыкулы ў навуковым друку і кнігах «Памяць»: Рэвалюцыяй мабілізаваны // Полымя. — 1980. — № 3; Старейший профессионал // Корнилович Э.А. Люди революционного подвига. — Мн., 1985; Як Акулік спрачаўся з Бухарыным // Маладосць. — 1999. — № 11; Сацыяўлаг, правазнаўца, грамадскі дзеяч: [Л.І. Петражыцкі] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна / уклад. С.В. Шайко. — Мн.: Паліграфафармленне, 2003. — С. 67; Слухач школы ў Ланжумо: [Б. Брэслаў] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна. — Мн.: БелСЭ, 1988. — С. 76–80; Рэвалюцыянер з Коханава: [С. Левіт] // Тамсама. — С. 84–86; Матрос з Кранштата: [Я. Маслакоў] // Тамсама. — С. 86–88; Старшыня губсавета: [Н.У. Маслакоў] // Тамсама. — С. 88–91; Як след бліскавіцы: [М. Сімановіч] // Тамсама. — С. 91–93; На быстрыні жыцця: [І.І. Рыжыкаў] // Тамсама. — С. 627–628; Яркасць сэрца чалавечага: [Я. Клімчанка] // Тамсама. — С.628–630; Бальшавік з Янова: [К. Янушкевіч] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Міёрскага раёна. — Мн.: Бел. навука, 1998. — С. 154–157; Красный генерал: [А.У. Станкевіч] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Пастаўскага раёна. — Мн.: БелТА, 2001. — С. 140–141; Грыдзюшка І.Л. // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Шаркоўшчынскага раёна. — Мн.: БелЭн, 2004. — С. 101–102; Грыдзюшка С.С. // Тамсама. — С. 102.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Усюды быў камісарам: [М. Сімановіч] // СІ. — 1987. — № 82–85; Старшыня губсавета: [У.М. Маслакоў] // СІ. — 1987. — № 110–113; Нарком працы // Звязда (П). — 1987. — № 27, 28, 30–36; Нашы землякі: «Пішы аб сваім жыцці» (Б.І. Перэльман) // КР. — 1987. — № 95–97; Вышыні Ганны Зямец // БЗ. — 1987. — № 85, 86, 88, 89; Бальшавік з Янова // СП (М). — 1988. — № 133. — С. 3, 4; Нашы землякі пра У.І. Леніна // ВР. — 1989. — № 79. — С. 3; За што цкавалі Зарэцкага // СІ. — 1990. — № 59–62; «Пад імем "швітурыс"» // Звязда (П). — 1990. — № 71–74; Хто пра яго ведае: [сацыял-дэмакрат пач. XX ст. М. Васілеўскі] // СІ. — 1992. — № 32. — С. 2; Герой вайны: [ураджэнец Талачыншчыны XIX ст. генерал Р.М. Чарняеў] // СІ. — 1994. — № 33–35; Непахіснасць рэдактара: [Стэрнін Н., ураджэнец Оршы, рэдактар «Звязды»] // АГ. — 1994. — № 80. — С. 2; Працавіты кнігаафарміцель: [М.В. Валянтовіч] // СІ. — 1996. — № 50–51. — С. 2; «Каб не адстаць ад навукі…»: [юрыст, прафесар Петражыцкі Л.І., ураджэнец маёнтка Калантаёва Сенненскага пав.] // ГС. — 1996. — № 48. — С. 2; Перводумцы: [члены І Дзяржаўнай Думы з Віцебшчыны] // ВР. — 1996. — № 142. — С. 5; У імя роднай зямлі: [І. Буевіч] // ГС. — 1997. — № 14. — С. 4; Рыцарь науки и добра: [Л.І. Петражыцкі] // ГС. — 2000. — № 69. — С. 3; Генералы з Халяпінкі: [род Хамянтоўскіх на Талачыншчыне] // СІ. — 2002. — № 65, 67; У Достоевского учился мудрости: [Хамянтоўскі] // СІ. — 2002. — № 71. — С. 2; Варанцэвіцкі настаўнік: [В.К. Прускі] // НТ. — 2001. — № 32–35, 37–40; Потомок Друцких князей: [І.Э. Друцкі-Любецкі] // НТ. — 2006. — № 94. — С. 4; На трыбуне Дзярждумы сто гадоў таму, 1.06. 1906 г. прамаўляў наш зямляк: [М.Е. Сямёнаў] // ЧП. — 2006. — № 125–126. — С. 4.

Літ.: Карніловіч Эдуард Аляксандравіч // ЭГБ. — Т. 4. — Мн., 1997. — С. 120; Сучасныя беларускія краязнаўцы // КГ. — 2006. — № 47 (снежань). — С. 2; Карніловіч Эдуард Аляксандравіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал. І.П. Шамякін [і інш.]. — Мн., 1988. — С. 643; Корзенко Г.В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник. — Мн.: Бел. наука, 2007. — С. 182–183.



**КАРНЯЛЮК** КАНСТАНЦІН СЦЯПАНАВІЧ, педагог, краязнаўца. Аўтар шэрагу артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Гісторыя вёскі: [тапаніміка в. Копці] // ЖП. — 1992. — № 64. — С. 3; Яго бяссмертны Міколка-паравоз // ЖП. — 1991. — № 71. — С. 3; Таленавітыя землякі: [Зарэцкі М., Петрашкевіч А. — талачынцы] // СІ. — 1992. — № 52. — С. 2; Горад з легенды // ПВ. — 1992. — № 76. — С. 1; Смаляны // АГ. — 1992. — № 92. — С. 3; Невычэрпны скарб: [беларуская мова] // ДнП. — 1992. — № 99. — С. 2; Курганы славы — сведкі мужнасці // ГР. — 1994. — № 3. — С. 2; Каб ведалі свой край // ПК. — 1995. — № 63. — С. 2; Забытыя даследаванні землякоў: [К.Ц. Анікіевіч] // ГС. — 1997. — № 28. — С. 2; А кветкі на магілах завялі: [міфалогія] // ГС. — 1997. — № 88. — С. 2, 3; Мы жывем, каб вяртацца, дзе маленства сляды: [А. Вярцінскі] // ЛК. — 1997. — № 94. — С. 3; Яго малая радзіма — вёска Пушкары: [А. Асіпенка] // ЖП. — 1997. — № 72. — С. 3; Неўміручая песня Дзвіны: [Т. Хадкевіч] // ДзП. — 1997. — № 78. — С. 3; Шляхі вялі праз Полацк: [падарожнікі] // ПВ. — 1997. — № 88. — С. 3; Творцы з Дуброўшчыны // ДнП. — 1997. — № 75. — С. 2; Слынныя людзі Пастаўшчыны // ПК. — 1998. — № 6. — С. 2; Юр'я, устань рана// ПК. — 1998. — № 32. — С. 2; «У кожнага чалавека ёсць свой гожы край…»: [Я. Сіпакоў] // АГ. — 1998. — № 12. — С. 2; На карысць Бацькаўшчыне: [У. Караткевіч] // АГ. — 1999. — № 139. — С. 4; Вернасць роднай мове: [Груца А., ураджэнец Дубровеншчыны — выкладчык] // ДнП. — 1999. — № 37. — С. 2; У зямлі Дубровенскай // ДнП. — 2000. — № 42. — С. 2; Слаўны сын зямлі беларускай: [І.Д. Чэрскі] // ДзП. — 2000. — № 43. — С. 2; Голас маці гучыць са Слабады // СІ. — 2000. — № 101. — С. 2; Валуны // ГП. — 2001. — № 40. — С. 3; І славіцца Аршанскі лён у свеце // АГ. — 2001. — № 19. — С. 3; Назвы паселішчаў раскажуць // ДнП. — 2001. — № 40. — С. 2; Дубровенскія цацкі. Радыё ў пачатку вайны // ДнП. — 2001. — № 58. — С. 2; І была ў Рэпіна прысада з ядлоўцу // ЖП. — 2003. — № 90. — С. 2; Нашы беларускія скарбы // ГП. — 2004. — № 85. — С. 3; У некранутай прыгажосці і непаўторнасці: [помнікі прыроды Шумілінскага раёна] // ГП. — 2005. — № 8. — С. 3; Адкрыўся царкоўны музей // ЖП. — 2005. — № 36. — С. 3; Зямля пад белымі крыламі // ДнП. — 2005. — № 71. — С. 2; Помнікі мінуўшчыны // ЛК. — 2005. — № 78. — С. 3; У Віцебску сілы згуртоўваў Яжоў // ВК. — 2005. — № 84. — С. 3; Чаму назва «беларускі» стала пустым гукам? // ВК. — 2005. — № 92. — С. 3; Бараўлянскія перлінкі: [да даведніка па красамоўству] // НС. — 2005. — № 109. — С. 5; Жамчужыны народнай мудрасці // ПВ. — 2006. — № 16. — С. 7; Карнялюк К. Беларуская хатка // ЛК. — 2006. — № 31. — С. 3; Першае беларускае выдавецтва друку і культуры // ГП. — 2006. — № 30. — С. 7; Пабудуй сваю хату на роднай зямлі // МН. — 2007. — № 28. — С. 2; Спіс рэкордаў і адметнасцяў Віцебшчыны // ДнП. — 2007. — № 68. — С. 6, 7, 8; Беларускія юбілеі года // НС. — 2006. — № 33. — С. 5; Як Сабачонкі сталі Горамі.



**КАРПЕКІН** КАНСТАНЦІН РЫГОРАВІЧ (4.08.1985, в. Якубаўшчына Лёзненскага раёна, Віцебскай вобл.), краязнаўца. Магістр педагагічных навук (2008). Скончыў Першамайскую СШ у в. Якубаўшчына Лёзненскага раёна (2002), гіст. факультэт ВДУ (2007). Паступіў у аспірантуру пры Інстытуце гісторыі НАН Беларусі (на завочнае аддзяленне, 2008). Працуе ў ДАВВ (з 2007).

Краязнаўчымі даследаваннямі роднага краю пачаў займацца сістэматычна з 2001 г., пад уплывам бабулі — Варвары Іларыёнаўны Казлоўскай, а таксама маці — Зінаіды Андрэеўны Карпекінай. Вывучае канфесійную гісторыю Віцебшчыны, гісторыю Лёзненшчыны да 1917 г. Тэма дысертацыі звязана з гісторыяй іудзейскіх абшчын на тэрыторыі Беларусі ў XX ст. Бярэ актыўны ўдзел у навуковых канферэнцыях (з 2005), на якіх выступае з дакладамі на рэгіянальную тэматыку. Праводзіць візуальную разведку на месцах былых паселішчаў Лёзненшчыны. Аўтар шэрагу артыкулаў па гісторыі і культуры Віцебшчыны.

Тв.: <u>Артыкулы ў навуковым друку:</u> Рух за адкрыццё праваслаўных цэркваў на Лёзненшчыне ў 1930 г. // «НИРС-2005»: сборник тезисов докладов X Республиканской научной конференции студентов и аспирантов высших учебных заведений Республики Беларусь, Минск, 14–16 февраля 2006 г. / редкол.: С.К. Рахманов [и др.]. — Мн., 2005. — С. 233; Становішча каталіцкай царквы на Лёзненшчыне ў 1919—1928 гг. // I Машеровские чтения: материалы региональной научной конференции студентов, магистрантов, аспирантов и молодых учёных, Витебск, 5 мая 2005 г. / ВГУ; редкол.: Г.И. Михасёв (гл. ред.) [и др.]. — Витебск, 2005. — С. 154–156; Барацьба з іудзейскімі святамі на Віцебшчыне ў першай палове 1920-х гг. // Творчество молодых — будущее Родины: сборник материалов IX (54) научно-практической конференции студентов, магистрантов и молодых учёных, Витебск, 2006 г. / ВГУ; редкол.: Г.И. Михасёв (гл. ред.) [и др.]. — Витебск, 2006. — С. 90–91; Арганізацыйнае афармленне антырэлігійных устаноў на Віцебшчыне ў 1920-я гг. // Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья: материалы международной научно-теоретической конференции, Витебск, 19–20 апреля 2007 г. / ВГУ; редкол.: В.А. Космач (гл. ред.) [и др.]. — Витебск, 2007. — С. 275–277; Прычыны нязначнай выніковасці антырэлігійнай прапаганды 1920-х гг. на Віцебшчыне // II Машеровские чтения: региональная научно-практическая конференция студентов, магистрантов и аспирантов, Витебск,

24–25 апреля 2007 г. / ВГУ. — Витебск, 2007. — С. 19–20; Віцебск першай чвэрці XX ст. і яго сувязь з сусветным музычным жыццём // Наука. Образование. Технологии-2008: материалы Междунар. науч.-практ. конф., 21–22 марта 2008 г., Барановичи: в 3 кн. / под общ. ред. В.В. Таруца. — Барановичи, 2008. — Кн. 3. Актуальные проблемы реформирования педагогического образования / редкол.: Н.В. Зайцева (гл. ред.) [и др.]. — С. 91–93; Піянерская арганізацыя 1920-х гг. як сродак атэістычнага выхавання (паводле матэрыялаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобл.) // X (55) Региональная науч.-практ. конф. преподавателей, научных сотрудников, аспирантов и студентов ун-та: сборник статей / ВГУ; редкол.: А.П. Гладков (отв. ред.) [и др.]. — Витебск, 2008. — С. 185–186; Хедэры і і антыхедэрныя кампаніі: Праблемы выхавання яўрэйскіх дзяцей і моладзі на Віцебшчыне // Теория и практика социализации детей и молодежи: материалы международной научн.-практ. конференции, Витебск, 13 марта 2008 г. / Ассоциация студенческой молодежи городов Витебска и Новополоцка; ВГУ; Витебская ассоциация психологов; редкол.: С.Л. Богомаз [и др.] — Витебск, 2008. — С. 147–149; Дзейнасць прыхільнікаў абнаўленчага царкоўнага руху на Лепельшчыне ў пачатку 1920-х гг. (паводле матэрыялаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобл.) // III Лепельскія чытанні: матэр. навук.-практ. канф., Лепель, 10 кастр. 2008 / УК «Лепельскі раённы краязнаўчы музей»; адк. за выпуск У.А. Баранаў. — Віцебск, 2008. — С. 56 — 59.

Артыкулы ў перыядычным друку: Як на Лёзненшчыне зачыняліся цэрквы // СП (Л). — 2005. — 22 кастр. — С. 7; Пратэстантызм на Лёзненшчыне (1920-я гг.) // СП (Л). — 2006. — 13 чэрв., 24 чэрв.; Лёс калышанскай царквы Архістраціга Міхаіла (1917–1930-я гг.) // СП (Л). — 2006. — 9 верас., 12 верас.; Старажытныя могілкі, альбо Пра судакрананне мінулага і сучаснага // КГ. — 2007. — № 45. — С. 3; Легенды Лёзненшчыны // КГ. — 2008. — № 10. — С. 6; Малькава ці Якубаўшчына? // КГ. — 2008. — № 23. — С. 6; Сведкі царкоўнага жыцця // НС. — 2008. — 2 мая. — С. 9; Асацыяцыі // КГ. — 2008. — № 35. — С. 1; Чараўнікі-ведзьмакі і іх дзействы ў ваколіцах мястэчка Лёзна // КГ. — 2008. — № 48. — С. 7; Незайздросны лёс станіславоўскіх муроў // СП. — 2008. — 9 снеж. — С. 2; Укруціце лямпачку ў ліхтар, альбо Пра камунальныя праблемы віцяблян у 1926 годзе // НС. — 2009. — 4 жніўня. — С. 7; Местечко с пятью синагогами // Мишпоха. — 2009. — № 24. — С. 36–37; Даць нованароджанай імя Леніна! // НС. — 2009. — 25 жніўня. — С. 5; Спадкаемніца Малькаўскай і Якубаўшчынскай школ // СП (Л). — 2009. — 1 верас. — С. 3; Синагоги Суража // Моё местечко: [электронны рэсурс]. — 2009. — Рэжым доступу: http:// shtetle.co.il/Shtetls/surag/ karpekin_surag.html; Самая старажытная: [царква ў вёсцы Пагосцішча] // СП (Л). — 2009. — 1912. — С. 3; Архивные документы о бешенковичских синагогах // Моё местечко: [электронный ресурс]. — 2009. — Рэжым доступу: http:// shtetle.co.il/Shtetls/beshenko-vichi/beshenkovichi_syn.html.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Карпекін К.Р. (30.06.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**КАРЦЕЛЬ** І., ураджэнец Расоншчыны, жыў у г. Юрга РСФСР. Аўтар некалькіх артыкулаў па гісторыі Расончышы, надрукаваных у газеце «Камуністычны шлях».

Тв.: Беражыце здабытае // КШ. — 1988. — № 83. — С. 1, 2; На пачатку вялікага шляху // КШ. — 1988. — № 148. — С. 1, 2; Кухня д’ябла: [рэпрэсіі на Расоншчыне] // КШ. — 1989. — № 146, 147, 149, 151, 153.

**КАСАТАЯ** ТАЦЦЯНА УЛАДЗІМІРАЎНА (22.12.1983, в. Цвеціна Міёрскага раёна Віцебскай вобл.), педагог. Скончыла гіст. факультэт ВДУ (2006). Працуе ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі. Краязнаўчымі даследаваннямі пачала займацца пад час вучобы ў школе пад уплывам настаўніцы Ірыны Восіпаўны Галузы. Збірала матэрыялы па гісторыі роднай вёскі, паходжанні яе назвы, брала ўдзел у стварэнні школьнага музея. У час вучобы ў ВДУ асноўнай тэмай даследаванняў стала гісторыя пратэстанцкай царквы на Віцебшчыне ў савецкі час. З 2003 г. стала працаваць у архіве. Пэўны ўплыў на фарміраванне краязнаўчых густаў даследчыка аказаў выкладчык А.М. Дулаў. На кафедры гісторыі Беларусі абараніла дыпломную працу «Евангельскія хрысціяне-баптысты на Віцебшчыне у 1944–1985 гг.». Даследаванне падрыхтавана на аснове матэрыялаў ДАВВ. Выкарыстоўваліся фонды Упаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў (пры СНК) пры Віцебскім аблвыканкаме (ДАВВ, ф. 4029-п) і Упаўнаважанага Савета па справах рэлігій пры Савеце Міністраў СССР па Віцебскай вобл. (ДАВВ, ф. 1439-п). Работа з’яўляецца першай спробай аналізу праблем развіцця і дзейнасці евангельскіх хрысціян-баптыстаў (ЕХБ) на рэгіянальным узроўні, у межах Віцебскай вобл. Выяўлены як агульныя тэндэнцыі, так і рэгіянальныя асаблівасці развіцця канфесіі. Бярэ ўдзел у рэгіянальных канферэнцыях. Аўтар артыкулаў на тэму канфесійнага жыцця Віцебшчыны ў другой палове XX ст.

Тв.: «Ініцыятыўнікі» і распаўсюджанне іх ідэй у Віцебскай вобл. у першай палове 1960-х гг. // Инновации-2004: Материалы XI Республиканской студенческой научно-практической конференции, г. Мозырь, 22 апреля 2004 г.: в 2-х ч. Ч. 2. — Мозырь: МГПУ, 2004. — С. 82; Пяцідзесятнікі ў Віцебскай вобл. у першай палове 1960-х гг. // IX Республиканская научно-практическая научная конференция аспирантов Республики Беларусь «НИРС–2004»: тезисы докладов: в 8 ч. Ч. 1 / под ред. А.И. Жука. — Гродно: ГрГУ, 2004. — С. 60–61; Государство и протестантские общины Витебщины в начале 60-х XX в. // Сборник тезисов докладов X Республиканской научной конференции вузов Республики Беларусь «НИРС–2005», 14–16 февраля 2005 г.: в 3-х ч. Ч. 3. — Мн., 2005. — С. 235–236; Абшчыны ЕХБ Віцебскай вобл. у другой палове 1960-х – сярэдзіне 1980-х гг. // Творчество молодых — будущее Родины: сборник материалов IX (54) научно-практической конференции студентов, магистрантов и молодых ученых. — Витебск: ВГУ, 2006. — С. 63–64; Становішча пратэстанцкіх абшчын на Віцебшчыне ў міжваенны перыяд // Первая мировая война: История, геополитика, уроки истории и современность. К 90-летию окончания Первой мировой войны и началу формирования

Версальско-Вашингтонской системы международных отношений: материалы международной научной конференции, Витебск, 11–12 ноября 2008 г. / ВГУ; ред. кол. В.А. Космач (гл. ред.) [и др.]. — Витебск: ВГУ, 2008. — С. 263–265; Евангельскія хрысціяне-баптысты на Віцебшчыне ў 1944–1985 гг. // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею: матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 30–31 кастрычніка 2008 г. / рэдкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. — Мн.: Медысонт, 2009. — С. 160–163.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Касатая Т.У. (26.06.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**КАСАТЫ** Л.К., журналіст. Аўтар кнігі, прысвечанай выдатным асобам Міёршчыны. Даследуе «Слова аб палку Ігаравым», атаясамлівае тапонім «Дудуткі пад Полацкам», з якога выпраўляецца Усяслаў на Нямігу, з населеным месцам на Міёршчыне.

Тв.: Дзіцячыя дамы ў паслеваенны час // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Міёрскага раёна. — Мн.: Бел. навука, 1998. — С. 500–504; Ідзем у гісторыю // СП (М). — 1992. — № 63. — С. 3.

**КАСОЎСКАЯ** ІРЫНА ЯЎГЕНАЎНА (11.04.1948, г. Хабараўск – 1.2001). Скончыла СШ № 1 г. Оршы (1966), гіст. факультэт МгДПІ (1970). Працавала настаўнікам гісторыі ў Горацкім раёне, выкладчыкам грамадскіх дысцыплін у Аршанскім медыцынскім вучылішчы (1972–1999).

Зацікавілася мясцовай гісторыяй, калі пачала наведваць урокі гісторыі, якія наладжваліся ў Музеі гісторыі і культуры Аршаншчыны. Разам з членамі краязнаўчага гуртка «Спадчына» падрыхтавала матэрыялы па гісторыі Аршанскага медыцынскага вучылішча, якія былі апублікаваны на старонках мясцовага перыядычнага друку. Актыўна прапагандавала мастацкую спадчыну аршанскіх майстроў. З мэтай прабудзіць любоў да Аршаншчыны праз знаёмства з працай народных майстроў і гонар за іх працу напісала серыю нарысаў «Калі не мы, дык хто?», прысвечаных майстрам Куцеінскіх майстэрняў. Брала ўдзел у «Ефросиньевских чтениях» (Мінск).

Тв.: Каб працаваць дзеля здароўя чалавека: [Аршанскае медвучылішча] // АГ. — 1997. — № 94–96; Майстэрні // АГ. — 1998. — № 78. — С. 2; Разьбяры // АГ. — 1998. — № 79. — С. 2; Іван Рыгоравіч Зайцаў // АГ. — 1998. — № 80. — С. 2; Валянціна Янкоўская // АГ. — 1998. — № 82. — С. 2.

Літ.: Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 15.

**КАСПЕРСКІ** ВЯЧАСЛАЎ АДАМАВІЧ (20.03.1911, в. Жэвань Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобл. – 1991), краязнаўца. Скончыў сямігадовую школу, Аршанскі педагагічны тэхнікум. Працаваў рахункаводам у калгасе, нарміроўшчыкам на прапрыемстве «Асінторф». Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў інкасатарам. У 1971 г. выйшаў на пенсію. Маючы вольны час, пачаў пісаць у газеты і часопісы. Некалькі артыкулаў змешчаны ў кнігах «Памяць» Оршы і Аршанскага раёна і зборніку «Аршанская мінуўшчына». Напісаў успаміны пра вайну і ГУЛАГ.

Друкаваўся ў часопісе «Полымя». Аўтар ненадрукаваных мемуараў «Оршанские очерки», якія апісваюць Оршу 20–30-х гг. ХХ ст. і пасляваенныя падзеі ў жыцці горада. Іншыя рукапісныя матэрыялы захоўваюцца ў музеі.

Тв.: Артыкулы ў навуковым друку: Орша. Двадцатыя; Шумела Задняпроўе кірмашамі; Орша ў мастацкай літаратуры // Аршанская мінуўшчына. — Орша, 1997. — С. 24–35; Орша. Саракавыя // Памяць: Гісторыка-культурная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. Кн. 2. — Мн.: БелЭн, 2000. — С. 375–377.

Артыкулы ў перыядычным друку: Двадцатыя // ЛП. — 1988. — № 204. — С. 2; Саракавыя // ЛП. — 1989. — № 15. — С. 2; І майстэрня, і храм // ЛП. — 1989. — № 52, 55, 56; Шумела Задняпроўе кірмашамі // ЛП. — 1990. — № 153. — С. 2; Орша ў мастацкай літаратуры // ЛП. — 1990. — № 158. — С. 2; Два лёсы // ЛП. — 1989. — № 206. — С. 2.

Літ.: Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 13; Каляндар знамянальных і памятных дат на 2006 г. — Віцебск: ВАБ, 2006. — С. 16.



**КАСТУНОВА** НАДЗЕЯ ІВАНАЎНА (3.12.1984, г. Віцебск), бібліятэкар, бібліёграф. Скончыла Лужаснянскую гімназію Віцебскай вобл. (2002), факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУКМ (2007). Працуе вядучым бібліятэкарам краязнаўчага аддзела ВАБ (з 2007). Займаецца складаннем бібліяграфічных выданняў, прысвечаных розным тэмам жыцця Віцебшчыны, якія маюць дачыненне да гісторыі і культуры рэгіёна. Адзін са складальнікаў «Календара знамянальных і памятных дат на 2007–2010 гг.» і бібліяграфічных паказальнікаў «Віцебская вобл.».

Тв.: (у сааўтарстве) Каляндар знамянальных і памятных дат на 2007–2010 гады. — Віцебск: ВАБ, 2008–2010; (у сааўтарстве) Віцебская вобласць: бібліяграфічны паказальнік, 2007, 2008, 2009, 2010 гг. — Віцебск: ВАБ, 2008–2010.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Кастунова Н.І. (1.04.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**КАСТЭНКА** ТАЦЦЯНА МІКІЦІЧНА (12.01.1945, в. Крывічы Полацкага (цяпер Глыбоцкага раёна), краязнаўца, педагог. Скончыла педвучылішча, гіст. факультэт БДУ (1975). Працавала настаўніцай гісторыі ў Мазалаўскай СШ Віцебскага раёна (1965–2005).

У час навучання на гіст. факультэце абараніла дыпломную работу «Партызанскі рух у Віцебскім раёне». Для яе падрыхтоўкі працавала ў ДАВВ, праводзіла апытанні былых партызан, падпольшчыкаў, мясцовых жыхароў. Працуючы ў Мазалаўскай СШ, пачала вывучаць гісторыю школы, в. Мазалава, калгаса «Прызыў», мікраараёна пражывання. На аснове сабраных пісьмовых і рэчавых матэрыялаў у выдзеленым праўленнем калгаса будынку быў арганізаваны музей баявой і працоўнай славы. Частка калекцыі экспаніравалася ў ВАКМ і ўвайшла ў яго фонды. На пачатку 1980-х гг. быў пабудаваны новы будынак Мазалаўскай СШ, дзе для музея была выдзелена значная плошча. Распрацавала і падрыхтавала экспазіцыі: «Усталяванне савецкай улады ў сельскім савеце», «Правядзенне калектывізацыі, гісторыя калгаса “Прызыў”», «Партызанскі рух у Віцебскім раёне», «Аднаўленне гаспадаркі і гісторыя прадпрыемстваў (птушкафабрыка, прамыслова-механізаваная калона № 29, калгас “Прызыў”)», «Гісторыя школы». У музеі выкарыстаны копіі дакументаў, асабістыя рэчы, успаміны, сабраныя ў выніку паходаў, сустрэч, працы ў архіве. У апошнія гады працы ў школе вяла турыстычна-краязнаўчы гурток, які ажыццявіў значную працу па папулярызацыі гісторыі роднага краю сярод моладзі вёскі.

Літ.: Цветкова С. Краевед из Мазалово // ЖП. — 2002. — 16 ліп. — С. 3; Інтэрв’ю з Т.М. Кастэнка (8.02.2001) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**КАСЦЕНЬ** АЛЕСЬ ДЗМІТРЫЕВІЧ (1955, в. Касцяні Пастаўскага раёна – 17.09.2009), журналіст. Скончыў СШ № 2 г. Паставы, факультэт журналістыкі БДУ. Жыў у г. Паставы. Працаваў журналістам у газетах «Пастаўскі край», «Звязда», «Народнае слова», «Вольнае Глыбокае». Аўтар шэрагу артыкулаў на краязнаўчыя тэмы ў мясцовым перыядычным друку. Адзін з арганізатараў літаратурна-выдавецкай справы на Пастаўшчыне. Кіраваў дзейнасцю літаратурнага аб’яднання «Світанак». Шмат зрабіў для выдання зборнікаў вершаў пастаўскіх аўтараў «Рунь», «Рунь-92», «Рунь-93», «Рунь-2001», а таксама літаратурна-культуралагічнага часопіса «Барвы» (2004). Браў удзел у літаратурным семінары «Даўжанскія вечары – 96», які быў прысвечаны памяці У. Дубоўкі. Аўтар кніг прозы «Золата дзядулі», «Вясковыя і местачковыя гісторыі», «Каменьчыкі ў кірзавым боце». Засталася незакончанай аповесць-успамін пра родны горад Паставы «Мястэчка маёй любові».

Тв.: Рэпрэсіравана па справе педвучылішча // ПК. — 1991. — № 85. — С. 2; Героі, якім даравалі. Яшчэ раз пра лёс беларускіх патрыётаў // Звязда. — 1992. — 15 верас.; Погляд з хутара Лесунова. Верасень 1939-га як акт «вызвалення заходнікаў» ад зямлі // Сумежжа. — 1992. — 22 верас.; Залатыя рукі дзядулі // Сумежжа. — 1992. — № 10–11; Пастаўчане чакалі ад Леніна зямлі і волі. Але кола гісторыі павярнула інакш… // Сумежжа. — 1992. — № 14. — С. 1, 2; Герой ці ахвяра // Сумежжа. — 1992. — № 15. — С. 4; Чаго чакаць нам ад касцёла // НС. — 1992. — № 104. — С. 5; Справа педвучылішчаў. Дагэтуль у Паставах і Глыбокім чакаюць рэабілітацыі ахвяры сталіншчыны // НС. — 1992. — № 115. — С. 3; Едзем да Долмана // Сумежжа. — 1993. — № 1. — С. 4; Пяць яго мабілізацый // Сумежжа. — 1993. — № 17. — С. 2–3; Галгофа айца Канстанціна // КР. — 1993. — № 61, 62; Галгофа айца Канстанціна: [К.Д. Жданаў] // НС. — 1993. — № 66. — С. 4; Алеся і Антось: [Саюз беларускай моладзі] // НС. — 1994. — № 31, 34, 37, 39; Ратавала воіна малітва: [П.В. Аўсіевіч] // НС. — 1994. — № 89. — С. 3; А рыба ў Дзісне яшчэ ёсць // КР. — 1994. — № 91. — С. 3, 4; Стары бацькаў фотаздымак // НС. — 1997. — № 136. — С. 6; Беларусы ў Бутырцы // НС. — 1999. — № 30. — С. 4; Панове мусульмане, альбо мае знаёмыя татары: [Пастаўшчына] // НС. — 1999. — № 50. — С. 4; Мулкія мяхі // НС. — 2000. — № 79. — С. 5; Вясковыя гужы // НС. — 2002. — № 50. — С. 2; Чорная песня металу// ПК. — 2006. — № 134. — С. 3; Мястэчка маёй любові // Дзе Мядзелка песні пяе… Пастаўшчына літаратурная. — Мн., 2006. — С. 52–54.

Літ.: Дзе Мядзелка песні пяе… Пастаўшчына літаратурная. — Мн., 2006. — С. 253; Сідарэвіч А. Памяці таварыша. Алесь Касцень // НН. — 2009. — 20 верас.

**КАСЦЮК** ЮРАСЬ (6.05.1943, м. Пліса Глыбоцкага раёна), журналіст. Скончыў мастацка-графічны факультэт ВДПІ, факультэт журналістыкі БДУ. Працаваў журналістам на радыё, у газетах «Хімік», «Дняпроўская праўда», «Наша трыбуна», у Наваполацкай друкарні. Публікаваў краязнаўчыя матэрыялы ў рэспубліканскіх і мясцовых перыядычных выданнях. За цыкл нарысаў «Падарожжа па малых рэчках» у 1995–1996 гг. стаў лаўрэатам прэміі Віцебскага абласнога Саюза журналістаў Беларусі.

Тв.: Падарожжа па малых рэчках // ВГл. — 1998. — № 29, 33, 34, 36. — С. 2.

**КАСЦЮЧЭНКА** ІГАР ЛЕАНІДАВІЧ (*Георгий Поспелов*) (10.03.1954, в. Заскоркі Вароніцкага с/с Полацкага раёна), журналіст. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ (1986). Працаваў рэдактарам газеты «Полацкі веснік», цяпер Наваполацкай газеты «Информ плюс». У гісторыка-літаратурным часопісе «Полацкі летапісец» апублікаваў артыкул, прысвечаны Полацкаму мушкецёрскаму палку. Аўтар шэрагу артыкулаў на старонках мясцовых перыядычных выданняў, у якіх асвятляе жыццёвыя лёсы вядомых гістарычных асоб і іх сувязі з Полацкам.

Тв.: Полацкі мушкецёрскі (пяхотны) полк у часы напалеонаўскіх войнаў // Полоцкий летописец. Историко-литературный журнал. — 1993. — № 2. — С. 71–74; Горкая чаша ГУЛАГа // ПВ. — 1991. — № 134. — С. 2; Вяртанне: [Св.-Прэабражэнская царква ў в. Шпакоўшчына] // ПВ. — 1990. — № 164. — С. 2; У бітвах з Напалеонам // ПВ. — 1992. — № 67. — С. 3; Бітвы за Полацк // ПВ. — 1992. — № 77. — С. 2; Касцёл Святога Андрэя Баболі ў Полацку // ПВ. — 1997. — № 75. — С. 2; Чалавек года з Полацка: [М.М. Ільніцкі] // ПВ. — 1999. — № 7. — С. 2; Иркутский белорус Олег Рудаков // ИП. — 2003. — № 37. — С. 5; Один за всех, и все за одного. Традиции и нравы Полоцкого кадетского корпуса // ИП. — 2003. — № 38. — С. 6; Правда об Иване Грозном. Был ли завоеватель Полоцка тираном и сыноубийцей? // ИП. — 2003. — № 39. — С. 6; Рогнеда, дочь Рогволода // ИП. — 2003. — № 41. — С. 6; Тайна библиотеки Ивана Грозного // ИП. — 2003. — № 43. — С. 6; Храбрый генерал Кульнев // ИП. — 2003. — № 44. — С. 6; Защитник Петербурга: [П. Вітгенштэйн] // ИП. — 2003. — № 38. — С. 6; Душа обороны Порт-Артура: [генерал Р.І. Кандраценка] // ИП. — 2003. — № 49. — С. 6; Забытый герой: [Бібікаў А., герой вайны 1812 г.] // ИП. — 2004. — № 29. — С. 4.

**КАСЦЯНКА** ЛЮДМІЛА РЫГОРАЎНА (нарадзіўся ў в. Гара Чашніцкага раёна), краязнаўца, музейны работнік. Скончыла бібліятэчны тэхнікум, ВНУ. Працавала бібліятэкарам у в. Дубінцы Чашніцкага раёна, навуковым супрацоўнікам, дырэктарам Чашніцкага гістарычнага музея (з 1997).

Тв.: Этапы барацьбы і перамог: [гісторыя Чашніцкага раёна] // ЧП. — 1999. — № 27–29, 31, 34, 35, 38, 39–42, 47–49; Чашніцкі гістарычны музей // Музеі Беларусі. — Мн.: БелЭн, 2008. — С. 544–547.

Літ.: Кіндзяева Н. Раённы гістарычны музей // ЧП. — 1996. — 10 лют. — С. 2–3; Торбина И. Хранительница музейных реликвий: [Л.Г. Касцянка] // ЧП. — 2005. — № 121–122. — С. 2.

**КАСЦЯНЮК** ТАМАРА НІКІФАРАЎНА (9.03.1939, г. Віцебск), архівіст. Скончыла МгДПІ (1968). Працавала машыністкай у Віцебскім аблвыканкаме (1957–1967), загадчыцай кабінета філасофіі і навуковага камунізму Віцебскага ветэрынарнага інстытута (1967–1969), інструктарам, навуковым супрацоўнікам, галоўным архівістам фонду грамадскіх арганізацый партархіва Віцебскага абласнога камітэта КПБ (1969–1992). Працавала на розных пасадах ва ўпраўленні сацыяльнай абароны Віцебскага аблвыканкама (1992–2001), інспектарам па кадрах Варонаўскага дома-інтэрната для інвалідаў і састарэлых (2001–2005).

Працуючы на пасадзе навуковага супрацоўніка, вяла вялікую асветніцкую дзейнасць у перыядычным мясцовым друку, на радыё і тэлебачанні ў межах выканання прафесійных абавязкаў.

Аўтар больш за 60 артыкулаў у мясцовым перыядычным друку (газеты «Знамя юности», «Віцебскі рабочы», «Сцяг індустрыялізацыі»). Першы артыкул, прысвечаны юбілею Наваполацкага нафтаперaапрацоўчага завода, — «Ордэн на сцягу» — быў надрукаваны ў чэрвені 1970 г. у газеце «Віцебскі рабочы». Аўтар (разам з В.І. Акуневіч) камплекта плакатаў «Призванные Октябрем». Падрыхтавала шэраг перадач на абласным радыё. Асноўная тэматыка даследаванняў — гісторыя Віцебскай абласной і гарадской партыйнай і камсамольскай арганізацыі, гісторыя прадпрыемстваў горада і вобласці. Брала ўдзел у навукова-практычных канферэнцыях.

Узнагароджана медалямі «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», «Ветэран працы» (1983), Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1987).

Тв.: (разам з В.І. Акуневіч) Призванные Октябрем. — Витебск: ВОТ, 1987. — 28 л.; (разам з В. Глушко, З. Жураўлёвай) У авангардзе ардэнаноснага калектыву // ВР. — 1971. — 9 верас. — С. 2; (разам з

З.А. Жураўлёвай) Коммунисты всегда впереди. К 90-летию станкостроительного завода им. Коминтерна // ВР. — 1972. — 9 верас.; (разам з В. Глушко) На чале вялікага руху. Да 25-годдзя Віцебскага дывановага камбіната // ВР. — 1972. — 5 ліст. — С. 3–4; (разам з З. Жураўлёвай) У авангардзе калектыву // ВР. — 1973. — 9 чэрв. — С. 3; (разам з Л. Ісачанка, У. Зайцавым) Пачатак адраджэння. З гісторыі дзейнасці абласной партарганізацыі // ВР. — 1975. — 25 снеж. — С. 2; Молодежь Витебщины в борьбе за технический прогресс (1971–1975) // ВР. — 1977. — 9 ліп.; З руінаў і папялішчаў // ВР. — 1984. — 30 чэрв. — С. 2; Абудзіла рэвалюцыя: [жанчыны ў 1920-я гг.] // ВР. — 1987. — № 42. — С. 2; (разам з В. Савіцкай) «Хочам быць беларусамі». З гісторыі ўваходжання Віцебшчыны ў БССР // СІ. — 1988. — № 202. — С. 2; Пачатак адраджэння // ВР. — 1989. — № 121. — С. 3; Жывая гісторыя ў дакументах // ВР. — 1990. — № 52. — С. 3; На встречу 50-летию образования партийных архивов // ВР. — 1990. — 15 сак.; Страницы истории // Знамя индустриализации. — 1990. — 25 крас.; О братской помощи республик в восстановлении народного хозяйства области // ВР. — 1990. — 1 мая; Навстречу 45-летию Победы // ВР. — 1990. — 18 ліп.; Як здабывалася святло: [60 год БелДРЭС] // ВР. — 1990. — № 204. — С. 4; Памяць у сэрцах нашчадкаў. Да 100-годдзя з дня нараджэння М.П. Шмырова // ВР. — 1991. — 23 ліп. — С. 3; Супрацiўленне. З хронікі першых месяцаў варожага нашэсця // ВР. — 1991. — 16 крас. — С. 3; У цесным узаемадзеянні // ВР. — 1991. — 23 крас. — С. 3; Скрозь змрок 41-га // ВР. — 1991. — № 68. — С. 2; Памяць у сэрцах нашчадкаў: [М. Шмыроў] // ВР. — 1991. — № 140. — С. 3.

Літ.: Інтэрв'ю з Т.Н. Касцянюк (15.07.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**КАТОВІЧ** ТАЦЦЯНА ВІКТАРАЎНА (26.03.1954, г. Віцебск), мастацтвазнаўца, педагог. Доктар мастацтвазнаўства (2008). Скончыла СШ № 3 г. Віцебска (1971), факультэт журналістыкі БДУ (1976). Працавала карэспандэнтам-арганізатарам на Віцебскім раённым радыё (1977–1982), рэдактарам на Віцебскім абласным тэлебачанні (1982–1994), памочнікам мастацкага кіраўніка па інфармацыйна-аналітычнай частцы ў НАДТ імя Якуба Коласа (1994–2001), выкладчыкам, дацэнтам, прафесарам (з 2008) кафедры ўсеагульнай гісторыі ў ВДУ (з 2001).

Займаецца вывучэннем гісторыі Віцебскай мастацкай школы, гісторыяй тэатральнай культуры Віцебшчыны. Даследаванні пачала ў 1993 г. пад уплывам прафесара Г.І. Барышава. Абараніла кандыдацкую дысертацыю «Барока як універсальны стыль культуры Беларусі 16–18 стст.» (1999). Удзельнік шэрагу міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных канферэнцый (з 1994). Адзін з арганізатараў выставы, прысвечанай 75-годдзю НАДТ імя Якуба Коласа (ВАКМ, 2001). Некаторыя дакументы перадала ў ДАВВ, дзе мае асабісты фонд.

Аўтар значнай колькасці артыкулаў у навуковым, рэспубліканскім, мясцовым перыядычным друку на краязнаўчую тэматыку (тэатральнае жыццё НАДТ імя Якуба Коласа, персаналіі). Выступае навуковым кіраўніком студэнцкіх дыпломных работ, значная колькасць якіх мае краязнаўчую тэматыку: творчасць віцебскіх скульптараў, мастакоў, акцёраў, харэографаў, экскурсійныя маршруты Віцебшчыны, ахова гісторыка-культурнай спадчыны Падзвіння.

Тв.: Кнігі: Энциклопедия русского авангарда. — Мн.: Экономпресс, 2003. — 416 с.; Театральная культура Витебщины XX века. — Витебск: ВГУ, 2009. — 180 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Стилистические особенности игры коласовских актёров 70-90-х гг. // Материалы междунар. науч.-творч. конф. БГАДТ им. Якуба Коласа «Беларускае акцёрскае мастацтва», Витебск, 20–21 ноября 1996 г. / БГАДТ им. Якуба Коласа; под ред. Р.Б.Смольского. — Мн., 1997. — С. 75–88; *IFMC* в Витебске // Диалог. Карнавал. Хронотоп. — 1997. — № 4. — С. 152–163; «…Толькі гэтым і жывы»: [творчы партрэт народнага артыста СССР Ф.І. Шмакава] // Мастацтва. — 1997. — № 7. — С. 2–4; Архитектура белорусских храмов эпохи барокко // Веснік ВДУ. — 1997. — № 1 (3). — С. 38–41; Віцебская прастора-час Казіміра Малевіча: [аналіз перфомансаў 2-га Міжнароднага пленэра «Малевич. УНОВИС. Современность»] // Мастацтва. — 1998. — № 12. — С. 6–7; Лаборатория пространства и времени: [Пленэры «Малевич. УНОВИС». Современность и фестивали *IFMC* в Витебске] // Малевич. Классический авангард. Витебск. 2. — Витебск: Изд-во Н.А. Панькова, 1998. — С. 67–77; Витебское пространство-время Казимира Малевича // Диалог. Карнавал. Хронотоп. — 1998. — № 3 — С. 166–173; «Шагал… Шагал…»: спектакль В. Барковского на фоне Витебска // Малевич. Классический авангард. Витебск. 5: сб. науч. ст. — Витебск: ВГУ, 2002. — С. 112–123; Витебск–Санкт-Петербург: Диалог художественных пространств во времени // Материалы IV междунар. науч. конф. «Восточная Европа: феномен Балтии», Санкт-Петербург, 27–28 февраля 2004 г. / Санкт-Петербург. гос. ун-т; редкол.: Ю.И.Романов [и др.]. — СПб., 2004. — С. 160–165; Крэатыўная энергія горада: [аналіз твораў, паказаных на *IFMC* за апошнія дзесяць гадоў // Мастацтва. — 2006. — № 9. — С. 48–51; (разам з А.А. Малей) Коласовский спектакль «Несцерка»: Хронотоп театрального произведения // Ученые записки ВГУ. — 2006. — Т. 5. — С. 148–169; Малевич и конец классического искусства // Материалы междунар. науч.-теорет. конф. «Актуальные проблемы из истории прошлого и современности», Витебск, 21 октября 2007 г. / редкол.: В.А. Космач [и др.]. — Витебск: ВГУ, 2007. — С. 374–375; Ощущение пространства: [Витебский период Казимира Малевича] // БД. — 2008. — № 2. — С. 94–99; *IFMC* і Віцебск: 20 год разам: [аналіз міжнароднага фестываля сучаснай харэаграфіі] // Мастацтва. — 2008. — № 2. — С. 28–29; Об истории создания выстав-

ки, посвященной 75-летию Коласовского театра // Матэрыялы навук. канф. «90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею», Витебск, 30–31 октября 2008 г. / редкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. — Мн.: Медысонт, 2009. — С. 371–379; Коласовская драматургия на Коласовской сцене // Веснік ВДУ. — 2009. — № 2 (52). — С. 106–112.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Катовіч Т.В. (26.01.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Список опубликованных работ Т.В. Котович (26.01.2010) // Тамсама.



**КАХАНКА** УЛАДЗІМІР ПЯТРОВІЧ (20.04.1975, г. Сянно Віцебскай вобл.), архівіст. Скончыў факультэт беларускай філалогіі і гісторыі ВДУ (1998). Працаваў настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства ў СШ № 1 г. Сянно (1998–2000), навуковым супрацоўнікам, загадчыкам аддзела навуковага выкарыстання і публікацыі дакументаў ДАВВ (з 2000).

Краязнаўствам стаў займацца пад час працы ў школе. Пэўны ўплыў фарміравання цікавасці да гісторыі роднага краю аказаў настаўнік СШ № 2 г. Сянно В.В. Бандарэвіч. Займаецца даследаваннямі гісторыі і культуры Віцебшчыны ў межах выканання прафесійных абавязкаў навуковага супрацоўніка ДАВВ. Праводзіць выяўленне дакументаў па гісторыі арганізацый і ўстаноў Віцебскай вобл. Даследуе развіццё архіўнай справы на Віцебшчыне. Арганізатар шэрагу выстаў ДАВВ. Актыўна ўдзельнічае ў рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях (з 2001). Бярэ ўдзел у працы Віцебскага аддзялення археаграфічнай камісіі Белкамархіва, з 2005 г. — яе навуковы сакратар. Аўтар артыкулаў у навуковым і перыядычным друку на краязнаўчую тэматыку. Лічыць, што займаецца краязнаўчай працай толькі па родзе сваіх прафесійных абавязкаў. Адзначае, што сапраўдны краязнаўца — гэта асоба, якая вывучае і распаўсюджвае веды пра свой край асэнсавана і мэтанакіравана.

Тв.: Артыкулы ў навуковым друку: Свидетельствуют документы. К 60-летию начала Великой Отечественной войны // Віцьбічы. — 2001. — 21 чэрв.; Развитие архивного дела на Витебщине в 1944–1991 гг. // Витебщина архивная: История, фонды, персоналии, сер. XIX–XX вв. — Мн.: БелНДІДАС, 2002. — С. 29–40; (разам з В.В. Шарэнда) 80 лет Витебской прокуратуре // Взгляд из прошлого в будущее. — С. 7–39; Передача дореволюционных фондов государственного архива Витебской области в Центральный государственный исторический архив БССР // История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур…, Витебск, 2003. — С. 405–406; Да пытання аб лёсе архіўнай спадчыны Віцебшчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны // Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, 24 чэрвеня 2004 г. — Віцебск: ВДУ, 2004. — С.80–85; Реэвакуация документов архивов Витебщины, вывезенных во время Великой Отечественной войны // Быў подзвіг. І была Перамога: матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаных 60-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, Мінск, 12 мая 2005 г. / адк. рэд. Ю.У. Неясцяровіч, У.В. Фядосаў. — Мн.: БелНДІДАС. — С. 101–107; Полоцк в первые мирные дни // Выстояли и победили: Свидетельствуют архивы. — Витебск: ГУ ГАВО, 2005. — С. 26–28; Оршанщина в первые мирные дни // Тамсама. — С. 32–35.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Ад губерні да вобласці два стагоддзі // Віцьбічы. — 2002. — 12 сак.; Я. Купала ў «Віцебскім рабочым» // ВР. — 2002. — 6 жніўня; Якуб Колас і «Віцебскі рабочы» // ВР. — 2002. — 19 ліст. — С. 6; Новое о Доваторе // НС. — 2003. — № 45. — С. 6; Первые мирные дни сорок четвертого… // ГС. — 2007. — № 46. — С. 1, 7.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Каханка У.П. (29.09.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**КАХАНОЎСКІ** ГЕНАДЗЬ АЛЯКСАНДРАВІЧ (*Габрук Верасень, Г. Гак, Г. Дамашовец, Г. Канстанцінаў*) (8.01.1936, в. Дамашы Маладзечанскага пав. Віленскага ваяв. (цяпер Маладзечанскі раён Мінскай вобл.) – 15.01.1994, пахаваны ў в. Насілава Маладзечанскага раёна), беларускі гісторык, краязнаўца, археолаг, фалькларыст, музеязнаўца, папулярызатар краязнаўчай і музеязнаўчай навукі. Доктар гіст. навук (1992). Вучыўся ў школе і адначасова працаваў у сельскай гаспадарцы. Скончыў Насілаўскую сямігодку (1952), СШ у в. Лебедзева (1955), гісторыка-філал. факультэт Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя У.І. Леніна (1963). Працаваў настаўнікам у Ленкаўскай васьмігадовай школе і ў СШ г. Маладзечна, навуковым супрацоўнікам, намеснікам дырэктара па навуковай рабоце, дырэктарам Мінскага абласнога краязнаўчага музея (Маладзечна) (1964–1981), навуковым супрацоўнікам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (1981–1991), загадчыкам аддзела краязнаўства ў Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Ф. Скарыны (1991). Завочна скончыў аспірантуру пры Інстытуце гісторыі АН

БССР. Ініцыятар стварэння і старшыня Беларускага краязнаўчага таварыства (1989). Член Саюза пісьменнікаў СССР (1986).

Пад час навучання ў інстытуце кіраваў зямляцтвам студэнтаў-беларусаў. Сустракаўся з Уладзімірам Дубоўкам, Канстанцыяй Буйло, Мікалаем Улашчыкам і інш. З-за сваёй патрыятычнай пазіцыі ў канцы 1960–1970-х быў абвінавачаны ў нацыяналізме, звольнены з працы. Толькі дзякуючы ўмяшанню Г. Бураўкіна, Я. Брыля, І. Новікава, М. Танка, гісторыкаў М. Ткачова і М. Чарняўскага быў адноўлены на працы, аднак не меў магчымасці выязджаць за мяжу.

У друку з краязнаўчымі артыкуламі пачаў выступаць з 1962 г. Аўтар кніг нарысаў «Маладзечна» (1971), «Вілейка» (1974), «Адчыніся, таямніца часу» (1984), «Повязь часоў» (1985), а таксама асобных нарысаў-даследаванняў пра невядомыя факты з жыцця і творчасці Я. Купалы — «На запаветнай зямлі» (1974) — і М. Багдановіча — «У родным краі» (1983). Аўтар манаграфій «Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі XVI–XIX стст.» (1984). «Маладзечна, 600 гадоў» (1988), «Беларуская фалькларыстыка. Эпоха феадалізму» (з Л. Малаш і К. Цвіркам, 1989), «Прадвесне навукі» (1990). Складальнік і аўтар прадмовы зборніка «Гэй, смалі, страляй, маланка. Сатыра і гумар Заходняй Беларусі 1920–1939 гг.» (1989). Адзін са складальнікаў і аўтараў літаратурна-мастацкіх календароў «Кола дзён» (1987, 1988), «Беларускі каляндар – 1991» (1990), «Наш край» (1990).

Шэраг матэрыялаў краязнаўчага характару прысвечаны Віцебшчыне. Манаграфія «Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст.» утрымлівае шмат інфармацыі пра персаналіі краязнаўцаў XVII–XIX стст., якія вывучалі Віцебшчыну. Некаторыя артыкулы надрукаваны ў кнігах «Памяць» гарадоў і раёнаў Віцебшчыны, навуковых і перыядычных выданнях краіны.

Узнагароджаны медалём Ф. Скарыны (1992).

Тв.: Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. — Мн.: Навука і тэхніка, 1984. — 120 с.; Віцебскія паўстанцы // ЛіМ. — 1984. — 22 студз.; Вандраванні // Маладосць. — 1984. — № 10; Лёзненскія сцежкі Аляксандра Рыпінскага // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Лёзненскага раёна. — Мн.: БелЭн, 1992. — С. 33–34; Паэт-дэмакрат з Віцебшчыны // Тамсама. — С. 34–35

Літ.: Генадзь Каханоўскі // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. Т. 3. — Мн., 1994. — С. 213–215; Чарняўскі М. Памяці адраджэнца // Культура. — 1994. — 19 снеж.; Кенька М. Збіральнік скарбаў мінуўшчыны // Падарожнік. — 1997. — № 4; Мальдзіс А. Ён валодаў таямніцай часу // Звязда. — 1996. — 11 студз.; Саламевіч Я. Руплівец // ЛіМ. — 1996. — 29 снеж.

**КАЦОВІЧ** БАРЫС САМУІЛАВІЧ, аўтар кнігі «Памяць. Докшыцы – Парафьянава», у якой апісваецца лёс яўрэяў Докшыччыны ў Другой сусветнай вайне, прыводзіцца спіс знішчаных фашыстамі яўрэяў м. Докшыцы.

Тв.: Памяць: Докшыцы – Парафьянава. — Тэль-Авів, 1990.

Літ.: Чысцякоў М.Д. Вяртанне ў Докшыцы // РВ. — 1992. — № 31. — С. 2.



**КВЯЦІНСКІ** ПЁТР ПЯТРОВІЧ (22.09.1946), краязнаўца, грамадскі дзеяч, урач. Скончыў СШ № 13 у г. Полацку, Полацкае медвучылішча (1971), ВДМІ (1978). Працаваў педыятарам у г. Наваполацку, загадчыкам урачэбным участкам в. Каханавічы Верхнядзвінскага раёна. У пачатку 1980-х гг. арганізаваў клуб «Белыя вароны» і актыўна распачаў грамадскую дзейнасць пад дэвізам «Усе абражаныя, непрызнаныя, нямоглыя і хворыя — пад маё крыло». У клуб уваходзяць асобы, якія маюць жаданне пісаць вершы, прозу, займацца жывапісам, аднак не ўваходзяць у афіцыйныя дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі. Клуб ладзіць веласіпедныя вандроўкі па Верхнядзвіншчыне, Беларусі, дапамагае выдаваць зборнікі вершаў, аказвае маральную дапамогу. Членаў клуба больш за 300 па ўсёй Беларусі. Аўтар артыкула ў кнізе «Памяць» Верхнядзвінскага раёна, артыкулаў у «Краязнаўчай газеце», «Народным слове».

У сваёй уласнай сядзібе стварыў «паэтычную» алею: 5 валуноў з выслоўямі паэтаў – ураджэнцаў Дрысеншчыны. Адшукаў магілу І.Я. Храпавіцкага і ягонай жонкі, добраўпарадкаваў пахаванне, усталяваў помнік, зрабіў агароджу. Некаторыя матэрыялы перадаў у Асвейскую бібліятэку. Шмат часу і сродкаў ахвярue на рэлігійную дзейнасць. Пражывае ў в. Каханавічы Верхнядзвінскага раёна.

Тв.: Дакрананне да крыніц // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна: у 2–х кн. — Мн.: БелЭн, 2002. — Кн. 2. — С.

Літ.: Басько У. Хобі П. Квяцінскага // ВР. — 1989. — № 191. — С. 4; Параскевін А. Квяцінскі П.П. (2.02.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Квяцінскі П.П. (27.09.2009) // Тамсама.

**КЕЙЗЕР** ВАЛЕРЫ СЯРГЕЕВІЧ, краязнаўца. Працаваў настаўнікам, журналістам, служыў на мытні ў Браслаўскім раёне. У другой палове 1980-х гг. браў удзел у стварэнні Браслаўскага краязнаўчага музея. У гэты ж час друкаваўся ў газеце «Браслаўская звязда».

Тв.: Інсургент і навуковец: Ю. Копаць // БЗ. — 1986. — № 7. — С. 4.

**КІНДЗЯЕВА** НІНА ТРАФІМАЎНА (7.09.1935, м. Чашнікі Віцебскай вобл. – люты 1998), краязнаўца. Скончыла фізіка-матэматычны факультэт ВДПІ (1958). Працавала настаўніцай матэматыкі, завучам, дырэктарам Вяжоўскай СШ (1958–1965), інспектарам Чашніцкага рана (1965–1967), загадчыцай рана (1967–1970), другім сакратаром Чашніцкага райкама партыі (1970–1990), старэйшым навуковым супрацоўнікам Чашніцкага раённага гістарычнага музея.




Укладальнік і аўтар пераважнай большасці артыкулаў кнігі «Памяць» Чашніцкага раёна (60 артыкулаў, апавяданняў, абагульняючых нарысаў). З мэтай іх падрыхтоўкі працавала ў архівах Віцебска, Мінска, Санкт-Пецярбурга, выкарыстоўвала публікацыі газет, часопісаў. Праводзіла асабістыя даследаванні. Напрыклад, запісала ўспаміны Г.Л. Каплан і надрукавала іх у раённай газеце «Чашники какими я их помню». Сабрала шмат этнаграфічнага матэрыялу: паданні, легенды, песні, замовы рэгіёна. Сама рабіла фотаздымкі курганоў, гарадзішчаў, каменных крыжоў, помнікаў архітэктуры, рэк, азёраў і інш. Займалася гісторыяй вёсак былых Лукомскага і Чарэйскага княстваў, гісторыяй мястэчка Чашнікі. Некаторыя матэрыялы друкаваліся ў газетах «Віцебскі рабочы», «Звязда», «Чырвоны прамень» (Чашнікі).

Тв.: Кнігі: Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Чашніцкага раёна / аўт.-укл. Н.Т. Кіндзяева. — Мн.: Бел. навука, 1997. — 542 с.

Артыкулы ў перыядычным друку: Памяць майго дзяцінства // ВР. — 1989. — № 143. — С. 4; Родны горад: [Чашнікі] // ЧП. — 1990. — № 108. — С. 2–3; Назва яе — Пралетарская: [вул. у Чашніках] // ЧП. — 1991. — № 106. — С. 3; Жыццё нам давала рака: [з успамінаў старэйшага жыхара Чашнікаў Р.Ф. Барткевіча] // ЧП. — 1991. — № 111. — С. 2–3; Глыбіня нашых воч: [рэкі і азёры Чашніччыны] // ЧП. — 1991. — № 132. — С. 2–3; Рачулкі мае мілыя // ЧП. — 1991. — № 136. — С. 4; Ад прадзедаў, ад вякоў: [В. Цяпінскі] // ЧП. — 1991. — № 137. — С. 2; Вязень № 326: [П.Р. Шушкевіч] // ЧП. — 1991. — № 138. — С. 2; Плошча Свабоды // ЧП. — 1992. — № 10. — С. 2–3; «Майго сэрца боль невымерная»: [загуба яўрэяў Чашнікаў 12 лют. 1942 г.] // ЧП. — 1992. — № 16. — С. 2; Легенда аб каханні: [вёска Вялікая Вядрэнь] // ЧП. — 1992. — № 25. — С. 4; Не страцім сувязь пакаленняў: [піянерская арганізацыя Чашнікаў] // ЧП. — 1992. — № 40. — С. 2; Капцэвічы… Копцевічы // ЧП. — 1992. — № 46–48; Яны героі, былі і будуць // ЧП. — 1993. — № 4. — С. 2; Золата для пяцігодкі: [успаміны Р.Л. Рэлеса] // ЧП. — 1993. — № 43. — С. 2, 3; Асветнік свайго народу: [В. Цяпінскі] // ВР. — 1993. — № 46. — С. 4; Аб лёсе і сабе: [успаміны былога старшыні калгаса «Гігант» Г.С. Буцэра] // ЧП. — 1993. — № 49. — С. 2; Слабада, Слабодка… і інш.: [тапаніміка] // ЧП. — 1993. — № 52. — С. 2; Родным кут мой застаецца: [вёскі Чашніччыны] // ЧП. — 1993. — № 61. — С. 2; Не лёгкім быў лёс гэтых жанчын // ЧП. — 1993. — № 65. — С. 2; «Чашники, какими я их помню» // ЧП. — 1993. — № 84–86); Да вышынь пісьменства: [развіццё народнай адукацыі раёна] // ЧП. — 1994. — № 69. — С. 2; Помсцілі ворагу сем'ямі // ЧП. — 1994. — № 78. — С. 2; Доўгімі дарогамі вайны // ЧП. — 1994. — № 93. — С. 2; Наш родны, мілы кут // ЧП. — 1994. — № 98. — С. 2; Летапісец нашага жыцця: [газеце «Чырвоны прамень» — 65 гадоў] // ЧП. — 1995. — № 8. — С. 2; Рэкі раёна // ЧП. — 1995. — № 4. — С. 2; Азёры раёна // ЧП. — 1995. — № 10. — С. 2; Лукомскае княства // ЧП. — 1995. — № 28, 30, 32, 34; Князі Лукомскія // ЧП. — 1995. — № 38, 46, 49, 50, 53; Нашы сустрэчы: [Р. Рэлес] // ЧП. — 1995. — № 67. — С. 2; Кутаўцова Т.Ф. // ЧП. — 1995. — № 68. — С. 2; Адданасць музыцы // ЧП. — 1995. — № 69. — С. 2; Свет радзімы: [Я.Я. Батальёнак] // ЧП. — 1995. — № 75. — С. 2; «І тчэ забыўшыся рука…»: [М.В. Сафонава] // ЧП. — 1995. — № 88. — С. 2; Узрост сталасці: [юбілей газеты «Чырвоны прамень»] // ЧП. — 1995. — № 91. — С. 3; Старшыня: [П.Д. Ермакоў] // ЧП. — 1996. — № 5. — С. 2; Раённы гістарычны музей — наша справаздача // ЧП. — 1996. — № 11. — С. 2–3; Сялянская загартоўка — моцная загартоўка // ЧП. — 1996. — № 15. — С. 2; Чарэйскае княства // ЧП. — 1996. — № 27. — С. 2; Доктар Чэпік // ЧП. — 1996. — № 61. — С. 2; Які адрас Улы? // ЧП. — 1996. — № 80. — С. 2; Настаўніца. Памяці М.Д. Зелянухі // ЧП. — 1996. — № 83. — С. 2.

Літ.: Ці выйдзе кніга «Памяць?» // ЧП. — 1992. — № 22. — С. 2; Іваноў В. Нашы сэрцы — у кнізе «Памяць» // ЧП. — 1993. — № 38. — С. 2; Кніга «Памяць» у выдавецтве // ЧП. — 1994. — № 69. — С. 2; Шарко Н. Кніга, што напісана сэрцам: [Н. Кіндзяева] // ВК. — 1995. — № 36. — С. 4; Шарко Н. Сэрцам з родным краем // ЧП. — 1995. — № 70. — С. 2–3; Шарко Н. Сэрцам з родным краем // Памяць. Чашніцкі раён. — Мн., 1997. — С. 474–476; Міхно У. Кніга яе жыцця // ЧП. — 1996. — № 34. — С. 2, 3, 4; Рэквіем // ЧП. — 1998. — 5 снеж. — С. 2.

**КІРПІЧ** МІКАЛАЙ МІКАЛАЕВІЧ (18.03.1950, в. Жаўніна Ушацкага раёна Віцебскай вобл.), музейны работнік. Скончыў Вялікадолецкую СШ Ушацкага раёна (1967), геаграфічны факультэт (спецыяльнасць «Феналогія») БДУ (1974). Працаваў лабарантам у Вялікадолецкай СШ Ушацкага раёна (1968–1974), настаўнікам геаграфіі ў Маладолецкай СШ (1974), дырэктарам Музея народнай славы імя У.Е. Лабанка ў г.п. Ушачы (з 1975).

Даследуе гісторыю Ушаччыны. Вядзе назіранні за сезоннымі прыроднымі з'явамі на Ушаччыне па праграме Геаграфічнага таварыства СССР, цяпер РГТ (з 1962). Па матэрыялах феналагічных назіранняў напісаў дыпломную працу «Клімат і сезоннае развіццё прыроды Ушацкага раёна». На фарміраванне цікавасці да прыроды і гісторыі роднага краю аказаў бацька Мікалай Арцёмавіч, а таксама настаўніца біялогіі Марыя Сяргееўна Каплеўская.

Аўтар навуковай канцэпцыі і тэматычнага планавання экспазіцый Музея народнай славы ў г.п. Ушачы, а таксама яго філіяла — сядзібы-музея Васіля Быкава ў в. Бычкі Ушацкага раёна. Аўтар-укладальнік, адзін з арганізатараў камісіі па стварэнні кнігі «Памяць» Ушацкага раёна. Аўтар артыкулаў у перыядычным друку на краязнаўчую тэматыку. Мае прыватны архіў, у якім захоўваюцца матэрыялы феналагічных назіранняў. Некаторыя матэрыялы назіранняў (1962–1974) перадаў на захоўванне ў ВДУ.

Падтрымлівае адносіны з РГТ, ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Узнагароджаны Ганаровай граматай Геаграфічнага таварыства СССР.

Тв.: На вечную памяць нашчадкам: [20 год Ушацкаму музею] // П. — 1989. — № 4. — С. 2; Шлях — у чвэрць стагоддзя: [музей] // П. — 1995. — № 44. — С. 2; Ушачы: Вачыма фенолага // П. — 1996. — № 14–16, 23, 24; Капітан далёкага плавання са Скачых: [М.І. Саўчанка] // П. — 1999. — № 22. — С. 5; Няўжо «кулацкі сын» хадзілі ў лапцях: [Ю.С. Качан] // П. — 2000. — № 11. — С. 2; Крокі станаўлення: [музей] // П. — 2000. — № 48. — С. 3; Акадэмік з Забалоцця: [В.С. Буракоў] // П. — 2001. — № 25. — С. 2; Подзвіг — бессмяротны, не ўсе імёны вядомыя // П. — 2004. — № 90. — С. 3.

Літ.: Пашковіч А. Гісторыя раёна патрэбна нашчадкам // П. — 1998. — № 13. — С. 2; Пашкоў А. За дзвярыма музея // П. — 2001. — № 17. — С. 2; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Кірпіч М.М. (4.11.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**КІРЫК** ПАВЕЛ КАНСТАНЦІНАВІЧ (23.12.1912, в. Охнава Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобл. – 20.02.1979, Навагрудчына), святар. Магістр і кандыдат багаслоўя. Протаіерэй. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю (1933), багаслоўскі факультэт Варшаўскага ўніверсітэта (1937), Маскоўскую духоўную акадэмію (1970). Служыў святаром у в. Ажуны Пастаўскага пав. (цяпер чыг. ст. Варапаева), у г. Дзісне (май – кастрычнік 1939). Выехаў з сям'ёй у Вільню, адкуль быў дэпартаваны літоўскімі ўладамі ў Германію (на тэрыторыю акупаванай Польшчы), дзе служыў у в. Гіравое Красненскага пав. Кракаўскага ваяв. (да кастрычніка 1941).

Пераехаў у Беларусь (кастрычнік 1942), пражываў у м. Жыровічы Слонімскага раёна. Служыў сакратаром у кансісторыі Навагрудскай епархіі (сакавік 1942 – ліпень 1944). Выконваў абавязкі дырэктара і выкладчыка багаслоўска-пастырскіх курсаў ў Навагрудку, эканома архірэйскага дома. Служыў другім святаром Барысаглебскай царквы Навагрудка (верасень 1942 – ліпень 1944). Выконваў абавязкі карэліцкага дабрачыннага (сакавік 1943 – кастрычнік 1944), навагрудскага дабрачыннага (кастрычнік 1944 – сакавік 1947), клецкага дабрачыннага (сакавік – лістапад 1947), валожынскага дабрачыннага (лістапад 1947 – лістапад 1949), пастаўскага дабрачыннага (кастрычнік 1949 – красавік 1951). Арыштаваны НКУС (27.04.1951). Прыгавораны да 10 гадоў зняволення, адбываў тэрмін у Бура-Паломскім лагеры МУС каля чыг. станцыі Шарсткі Горкаўскай чыгункі. Вызвалены 25.08.1956. Служыў на пасадах дабрачыннага і святара ў г. Петрыкаве, Бабруйску, Жодзіне, Барысаўскім, Шклоўскім, Баранавіцкім раёнах. З мая 1968 г. клірык Свята-Духава кафедральнага сабора ў Мінску. Рэабілітаваны пракуратурай Віцебскай вобл. (24.08.1992).

Займаўся даследаваннямі Полацка-Віцебскай епархіі. Працаваў над магістарскай дысертацыяй «История Полоцкой епархии». Лёс нататак і матэрыялаў яго магістарскай працы не высветлены. Знайшоў жыццяпіс блажэннага Марціна Тураўскага ў Шклоўскім раёне.

Літ.: Митрофорный протоиерей Павел Кирик // Асабісты архіў святара У.У. Гарыдаўца.

**КІРЫЛАЎ** ТАМАШ-РОБЕРТ (нар. у в. Сорыкі Залескага с/с Глыбоцкага раёна), краязнаўца. Пражывае ў Польшчы. Выдаў некалькі кніг аб пражытым, у якіх услаўляе прыгажосць роднага краю — Залесчыну на Глыбоччыне. Навела «Легенда аб “сароках” з Гарадзішча» (1974) надрукавана ў газеце «Веснік Глыбоччыны» ў перакладзе К. Антонава. Публікаваў свае допісы ў газеце «Ніва» (Беласток).

Тв.: Легенда аб «сароках» з Гарадзішча // ВГл. — 1993. — № 72–75.




**КІСЯЛЁЎ** АНДРЭЙ МІХАЙЛАВІЧ (20.04.1975, г. Віцебск), архівіст. Скончыў факультэт беларускай філалогіі і гісторыі ВДУ (1997). Працаваў токарам на Віцебскім прыборабудаўнічым заводзе (1992–1993), настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў СШ № 32 г. Віцебска (1997–2001), навуковым супрацоўнікам аддзела навуковага выкарыстоўвання і публікацыі дакументаў ДАВВ (2002–2008). Займаецца даследаваннямі гісторыі і культуры Віцебшчыны ў межах выканання прафесійных абавязкаў навуковага супрацоўніка ДАВВ. Праводзіць выяўленне дакументаў па гісторыі арганізацый і ўстаноў Віцебскай вобл. Займаўся зборам матэрыялаў для стварэння музея гісторыі Дарожнай аўтаінспекцыі Віцебскай вобл., Цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку: «Віцебскі кур’ер», «Віцебскі рабочы», «Віцьбічы».

Тв.: «Брандт в правой руке держал желтый портфель…» // Выстояли и победили: Свидетельствуют архивы… Віцебск, 2005. — С. 13–14; Священные места // Тамсама. — С. 41–42; Очковая фабрика // Віцьбічы. — 2002. — 19 снеж.; Маяковский в Витебске // ВК. — 2002. — № 22. — С. 2; Первый Витебский губернский съезд учителей // Віцьбічы. — 2003. — 20 мая. — С. 3.
Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Кісялёў А.М. (29.09.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**КІТОВІЧ** НАТАЛЛЯ СЦЯПАНАЎНА (25.01.1925, г. Віцебск – 23.02.2000), бібліятэкар, бібліёграф. Скончыла СШ № 56 г. Віцебска (1949), бібліятэчны факультэт МДПІ (1953). Працавала бібліёграфам, галоўным бібліёграфам ў ВАБ (1953–1982). Адыграла значную ролю ў стварэнні даведачна-бібліяграфічнага апарата бібліятэкі, сістэмы каталогаў. Аўтар некаторых бібліяграфічных матэрыялаў краязнаўчага зместу па гісторыі і культуры Віцебшчыны.

Тв.: Гісторыя фабрык і заводаў Віцебскай вобл. — Віцебск: ВАБ, 1962. — 6 с.; За шчасце, свабоду роднага края / Кітовіч Н.С. Віцебск: ВАБ, 1964. — 8 с.; Витебску — 1000: Рекомендательные материалы в помощь библиотекам области. — Витебск: ВОБ, 1973. — 19 с.; У.І. Ленин і Віцебшчына: бібліяграфічны паказальнік. — Віцебск: ВАБ, 1982. — 73 с.; (разам з Л.Т. Бяззубік) Партызанскі рух і падполле Віцебскай вобл. у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–945 гг.): бібліяграфічны паказальнік. — Віцебск: ВАБ, 1975. — 67 с.; Вялікі Кастрычнік на Віцебшчыне: бібліяграфічны паказальнік. — Віцебск: ВАБ, 1977. — 40 с.
Літ.: Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна 80 гадоў / склад. Л.С. Гудзелева. — Наваполацк: А.У. Маладзечкін, 2009. — С. 60.



**КІЧЫНА** ЯЎГЕНІЯ МАРКАЎНА (28.11.1930, м. Коханава), музейны работнік. Скончыла СШ № 10 г. Віцебска (1949), гіст. факультэт ВДПІ (1953). Працавала ў СШ № 1 г. Дрыса Віцебскай вобл., цяпер Верхнядзвінск (1953–1956), дзіцячай бібліятэцы імя Н.К. Крупскай г. Віцебка (1956–1958), навуковым супрацоўнікам, загадчыкам аддзела мастацтва ВАКМ (1958–1991).

Даследавала творчасць мастакоў, якія жылі і працавалі на Віцебшчыне. Прыклала значныя намаганні ў стварэнні аддзела мастацтва ВАКМ. Распрацавала першы тэматыка-экспазіцыйны план музея-сядзібы І.Я. Рэпіна. Сабрала значную колькасць матэрыялаў для музея, вяла перапіску са сваякамі мастака (Латвія, Францыя). Удакладніла некаторыя моманты жыцця І.Я. Рэпіна і яго родных. Аўтар кнігі «И.Е. Репин и Здравнево.

В обретении и разлуке» (1990). Перадала шмат рэчаў у музей М. Шагала.




Друкавала артыкулы на тэмы культурнага жыцця Віцебшчыны ў рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку: газетах «Знамя юности», «ЛіМ» «Віцебскі рабочы», «Витебский курьер».

Напісала кнігу аўтабіяграфічнага характару «Они расстались на перроне Оршанского вокзала» (2002), у якой у мастацкай форме адлюстравала падзеі яўрэйскага мястэчка на Віцебшчыне ў першай палове XX ст.

Тв.: Кнігі: И.Е. Репин и Здравнево: В обретении и разлуке. — Витебск: ВОКМ, 1990. — 78 с. — 2-е выд. — Витебск: ВОУТ, 1994. — 111 с.; Они расстались на перроне Оршанского вокзала. — Витебск: ВОБ, 2008. — 168 с.

Артыкулы ў перыядычным друку: Кічына Е.М. Ратуша. Якой ёй быць? // ВР. — 1972. — 27 мая; Сцяжынкі вядуць у Здраўнёва // ВР. — 1990. — № 114. — С. 8; Цяжкая праўда вайны: [Я. Гольбрайх] // ВР. — 1990. — № 178. — С. 4; Калекцыі па-ранейшаму не даступныя: [стан ВАКМ] // ВР. — 1990. — № 185. — С. 4; Цяжкі шлях да ісціны. Аб лёсе творчай спадчыны віцебскай мастацкай школы // ВР. — 1991. — № 128. — С. 3.

Літ.: Симанович Д. Витебский вокзал, или Вечерние прогулки через годы: дневники. — Мн.: Асобны, 2006. — С. 333.

**КЛАЗ** ІЛЬЯ СЯМЁНАВІЧ (*Ілья Гарпенік, К. Ільін*) (17.03.1922, г. Магілёў – 22.12.1980), пісьменнік. Вучыўся ў МДПІ. Працаваў у рэспубліканскім маладзёжным друку, метадыстам Камітэта па справах культасветустаноў пры СМ БССР (1947–1950), літсупрацоўнікам газет «На страже Родины», «Во славу Родины» (1950–1956), загадчыкам аддзела інфармацыі штотыднёвіка «ЛіМ», літсупрацоўнікам бюлетэня «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі» (1975–1980). Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1951).

На аснове гістарычнага матэрыялу напісаў аповесць «Жарцы», у якой апісаў падзеі вайны 1812 г. на Віцебшчыне. Гістарычныя лёсы беларусаў, сярод якіх ураджэнцы Віцебшчыны А. Казарскі і Я. Фамін — адлюстраваў у зборніку «Потомству в пример». Аўтар мастацкага нарыса «Па Дзвіне на вёслах», прысвечанага Віцебшчыне, яе геаграфічным і гістарычным асаблівасцям, напісанага на аснове воднай вандроўцы па Дзвіне ад Суража да Браслаўскіх азёр.

Тв.: Жарцы. — Мн.: Госиздательство БССР, 1955. — 137 с.; Па Дзвіне на вёслах: нарыс. — Мн.: Мастацкая літаратура, 1975. — 144 с.; Потомству в пример. — Мн.: Мастацкая літаратура, 1978. — 144 с.

Літ.: Гурская А.С. Клаз Ілья // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. Т. 3. — Мн.: БелЭн, 1994. — С. 258.

**КЛІМАЎ** МАРАТ (6.02.1972, г. Чавусы Магілёўскай вобл.), археолаг. Кандыдат гіст. навук (2005). Скончыў СШ у г. Чавусы (1989), гіст. факультэт БДУ (1994), аспірантуру Інстытута гісторыі НАН Беларусі (1998). Пад час навучання атрымаў археалагічную спецыялізацыю. Працаваў выкладчыкам у ПДУ (1994–1995), навуковым супрацоўнікам у аддзеле захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны Інстытута гісторыі НАН Беларусі (з 1998). Абараніў кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці «Археалогія» на тэму «Вясковыя паселішчы ў акрузе Полацка: X–XVI стст.» (2005, навуковы кіраўнік Г.В. Штыхаў).



Распрацоўвае тэму «Ваколіцы Полацка ў X–XVII стст.» (з 1994 г.). Акрамя працы ў бібліятэках праводзіць самастойна археалагічныя выведкі і раскопкі на помніках сярэднявечча ў Полацкім раёне (з 1995). Арганізаваў і правёў больш за 20 археалагічных экспедыцый, даследаванняў на тэрыторыі гарадоў (Полацка, Верхнядзвінска, Расонаў, Дзісны); вясковых паселішчаў (Двор Гомель, Рудня, Астроўшчына, Субаўшчына-3, Лучна, Лісна, Сакалова); курганных могільнікаў (Заскаркі-1, Заскаркі-2); сакральнага комплексу (Заскаркі). Праводзіць археалагічныя разведкі па пошуку вясковых паселішчаў на тэрыторыі Полацкага, Шумілінскага, Глыбоцкага, Шаркоўшчынскага, Верхнядзвінскага, Міёрскага і Лепельскага раёнаў. У выніку даследчыкам было выяўлена больш за 150 месцаў былых вясковых паселішчаў. Археалагічная дзейнасць навукоўца шырока асвятлялася ў рэспубліканскім і мясцовым перыядычным

друку (газеты «Звязда», «Аргументы і факты», «Камсамольская праўда» і інш.). Па выніках праведзеных даследаванняў было надрукавана больш за 40 навуковых артыкулаў у энцыклапедыях, кнігах «Памяць», зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый.

Тв.: Акруга Полацка ў X–XIII стагоддзях: Сутнасць і вытокі фарміравання // Полацк: Карані нашага радавода: матэрыялы міжнароднай навук. канфер., Наваполацк, 5–6 верасня 1995 г. — Полацк, 1996; Ваколіца Полацка: Гісторыя ў кантэксце археалагічных крыніц // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы III міжнар. канфер. — Полацк, 1998; Зброя, ваенны рыштунак вершніка і каня з помніка Лучна-1 (па матэрыялах археалагічных раскопак 1999–2000 гг.) // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. — 2001. — № 3; Зямля нашых продкаў // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Полацкага раёна. — Мн.: Вышэйшая школа, 1999. — С. 23–31; Археалагічныя помнікі Полацкага раёна // Тамсама. — С. 31–34; Полацкае княства ў IX–XI стст. // Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 1. — Мн.: Экаперспектыва, 2000. — С. 148–166; Сярэднявечны культавы помнік Заскаркі ў ваколіцах г. Полацка // Гісторыка-археалагічны зборнік. — Мн., 2002. — № 17; Лучна-1: Стратыграфія і храналогія феадальнай сядзібы // Матэрыялы IV Міжнароднай канферэнцыі «Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі». — Полацк, 2002; Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Полацкага і Шумілінскага раёнаў у 2002 г. // Гісторыка-археалагічны зборнік. — Мн., 2003. — № 18; Унікальная знаходка познесярэдневяковага стрэмені на тэрыторыі Беларусі // БГЧ. — 2004. — № 5; Тапаграфія і планіроўка вясковых паселішчаў у акрузе Полацка // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. — 2005. — № 9. — С. 32–41; Вясковыя паселішчы Лепельшчыны ў XI–XVII стст. і ўздзеянне асноўных фактараў у працэсе рассялення // Матэрыялы другой навукова-практычнай канферэнцыі «Лепельскія чытанні», 18–19 кастрычніка 2006; Асаблівасці рассялення ў акрузе Полацка, X – сярэдзіна XVI ст. // Гісторыка-археалагічны зборнік, 2006. — № 21. — С. 130–136; Праблема вялікіх курганоў у сувязі з пытаннем аб з'яўленні новай пахавальнай абраднасці ва ўмовах рассялення на Поўначы Беларусі // МАБ: Археалогія эпохі сярэднявечча. Да 80-годдзя з дня нараджэння Г.В. Штыхава. — Мн., 2008. — № 15.



**КЛОКАЎ** СЦЯПАН АНТОНАВІЧ (16.02.1909, в. Янкавічы Полацкага пав., цяпер Расонскі раён Віцебскай вобл. — 27.12.1992), краязнаўца. Скончыў Расонкую сямігодку (1927), Полацкі педтэхнікум (1930), гіст. факультэт ВДПІ (1939). Працаваў дырэктарам Ветрынскай сямігодкі (1939–1941). У гады Вялікай Айчыннай вайны ў партыз. атрадзе імя Сталіна. Пасля вайны працаваў загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі Расонскага (1944–1949) і Ветрынскага (1949–1952) райкамаў КП(б)Б, дырэктарам СШ № 3, потым № 8 г. Полацка (1952–1969). Заслужаны настаўнік БССР (1967). Жыў у Полацку.

Яшчэ школьнікам пачаў цікавіцца даўнінай, браў удзел у краязнаўчых паходах і экскурсіях. У час працы ў школе вёў актыўную грамадскую, выхаваўчую і даследчыцкую дзейнасць па вывучэнні роднага краю. Выявіў, увёў у навуковы зварот і ініцыяваваў узяцце пад ахову шэрагу помнікаў археалогіі ў Полацкім, Расонскім раёнах.

Аказваў дапамогу ў даследчай рабоце, якую вялі ў Полацку навукоўцы: А.Р. Мітрафанаў, М.К. Каргер, Г.В. Штыхаў. З дапамогай апошняга ўзяў на ўлік усе помнікі Расонскага раёна. Матэрыялы даследчыка былі ўлічаны пры стварэнні карты археалагічных помнікаў. Падрыхтаваў і чытаў многія гады лекцыі пра помнікі археалогіі роднага краю, пра іх захаванне, пра старажытныя помнікі Полацка. Надрукаваў па гэтых тэмах шэраг артыкулаў. Вывучаў падзеі вайны 1812 г. на Полаччыне і лёсы ўдзельнікаў гэтых падзей. Сабраныя матэрыялы пра генерала Я. П. Кульнёва перадаў у Клясціцкую СШ. Шмат гадоў збіраў звесткі пра героя Грамадзянскай вайны У.М. Азіна. На аснове сабраных матэрыялаў і дакументаў (успаміны родных, першага настаўніка, баявых паплечнікаў, землякоў і інш.) быў створаны музей У.М. Азіна ў школе, дзе на той час працаваў С.А. Клокаў. Арганізаваў збор матэрыялу пра Я. Фабрыцыўса, што кіраваў у Полацку Школай чырвоных афіцэраў (1921–1923).

Страціўшы ў 1977 г. зрок, працягваў займацца грамадскім жыццём і вывучэннем краю. Аўтар артыкула ў кнізе «Памяць» Полацкага раёна, шэрагу артыкулаў у перыядычным друку: «Віцебскі рабочы», «Сцяг камунізма», «Полацкі веснік» і інш.

Тв.: Гений русского военного искусства Кульнев Яков Петрович. — СПб., 2005. — 71 с.; (разам з М. Манісам) Айчынная вайна 1812 г. на Полаччыне // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Полацкага раёна. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 55–56.

Артыкулы ў перыядычным друку: Плагіятар і блытанік // ВР. — 1962. — 2 верас. — С. 2; Рэвалюцыйны трымайце крок // ВР. — 1966. — 26 кастр. — С. 3; Сцяжынкамі героікі // СК. — 1969. — 5 сак. — С. 4; Роздум ля Сафійскага сабора // СК. — 1969. — 24 кастр. — С. 3; Помнікі старажытнага Полацку яшчэ чакаюць даследчыкаў // СК. — 1970. — 13 чэрв.; Маўклівыя сведкі далёкага мінулага // СК. — 1971. — 13 чэрв. — С. 3; Старажытнасці Расоншчыны // КШ. — 1972. — 23 ліст. — С. 4; З любоўю да Радзімы // СК. — 1974. — 2 кастр. — С. 3; Легендарны рыцар рэвалюцыі // СК. — 1975. — 5, 6, 9 верас.; Прасліца расказвае // СК. — 1975. — 12 снеж. — С. 4; Даўніна, легенды // СК. — 1976. — 30 сак. — С. 3; Дакументы расказваюць // СК. — 1976. — 14 мая. — С. 4; Дойлідства старажытнага Полацка // СК. — 1976. — 29 чэрв. — С. 3; Легенда

аб «святой вадзе» // СК. — 1976. — 19 студз. — С. 3; Бытуе павер’е // СК. — 1977. — 6 кастр. — С. 3; Октябрь на Полотчине. Рухнул царский трон // Химик. — 1977. — 12 крас. — С. 2; Октябрь на Полотчине. Накануне бури // Химик. — 1977. — 12 мая. — С. 3; Октябрь на Полотчине. Рождение новой эпохи // Химик. — 1977. — 26 чэрв. — С. 2; Начдыў: [У.М. Азін] // ПВ. — 1990. — № 33. — С. 4; След на зямлі: [В.С. Серафімаў] // ПВ. — 1990. — № 176. — С. 3, 4; Адзін ідзе ў армію: [У.М. Азін] // ПВ. — 1991. — № 115. — С. 2; Асцярожна — помнікі гісторыі // ПВ. — 1991. — № 148. — С. 3; Асцярожна — помнікі гісторыі: [краязнаўчая праца] // ГлРс. — 1992. — № 15. — С. 2–3; Разгром фашысцкіх захопнікаў // ПВ. — 1992. — № 68. — С. 3; Герой жыве ў нашчадках // ВР. — 1992. — 13, 15, 17 кастр.; Асцярожна — помнікі гісторыі // ГР. — 1992. — № 15. — С. 2–3; Бой пад Баяршчынай // ПВ. — 1992. — 21 ліп. — С. 3; Разгром французскіх захопнікаў // ПВ. — 1992. — 27 ліп. — С. 3; Герой жыве ў нашчадках: [Я. Кульнёў] // ВР. — 1992. — № 132–134; Генерал — сын капитана // Химик. — 1992. — 6 кастр. — С. 2.

Літ.: Маніс М. След на зямлі // СК. — 1985. — 13 снеж. — С. 2; Клокаў С.А. Некралог // ПВ. — 1993. — № 2. — С. 4; Клокаў Сцяпан // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Полацка. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 725; Воднева І.П. Сцяпан Антонавіч Клокаў — полацкі настаўнік, краязнаўца // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею: матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 30–31 кастрычніка 2008 г. / рэдкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. — Мн.: Медысонт, 2009. — С. 396–403.

**КЛЮЧЫНСКАЯ** АНЭТ. Аўтар тэксту да кнігі «Браслав и Свято-Пантелеймонов скит Всевидящее Око Божественного промысла» (2006), якая ўключае раздзелы: «Старонкі гісторыі Браслава», «Доктар Станіслаў Нарбут», «Нарбутава лячэбніца», «Пратаіерэй Уладзімір Васілеўскі», «Стварэнне праваслаўнага Свята-Панцелеймонавага скіта».

Тв.: Браслав и Свято-Пантелеймонов скит Всевидящее Око Божественного промысла. К столетию Браславской лечебницы. — Полоцк: А.И. Судник, 2006.

**КЛЯНОВІЧ** ЯН (Jan Klenowicz, Джон Конрад, John Konrad), калекцыянер, мецэнат. Ураджэнец Браслава. Зрабіў вялікую працу, каб аб’яднаць выхадцаў з Браслаўшчыны ў Польшчы. Дапамагаў дзейнасці браслаўскага «Польскага дома». Сабраў вялізную колькасць фотаматэрыялаў аб Браслаўшчыне. Ініцыятар выставы «Браслаўшчына», якая экспанавалася ў Гданьску і Варшаве. Спрыяў выданню шэрагу кніг (ініцыяваў іх падрыхтоўку і фінансаваў) па гісторыі грамадска-палітычнага жыцця Браслаўшчыны ў міжваенны перыяд і ў гады Другой сусветнай вайны, у тым ліку «Мае ўспаміны» Я. Янушкевіча. Стварыў фонд Аляксандра Кляновіча (у гонар бацькі), які дапамагае папулярызацыі ведаў пра Браслаўшчыну.

Узнагароджаны ордэнам «Афіцэрскі крыж заслугі перад Польшчай» (2004).

Тв.: Brasław — sylwetka miasta w okresie międzywojennym // Brasławszczyzna. Kresy kresów II Rzeczypospolitej. Informatoe wystawy. Muzeum Etnograficzne w Gdańsku Oliwe listopad 2004 – marzec 2005. — Gdańsk, 2004. — S. 65–72; Pomnik Marszałka Józefa Piłsudskiego w Brasławliu // Тамсама. — S. 72–76; Brasławianie w polskim lotnictwie w Anglii // Тамсама. — S. 117–123; Po 51 latach jade odwiedzic Brasław // Olsztyńcy brasławianie działalność reportaze z podróy, wspomnienia. — Olsztyn, 2007. — S. 16–24; Zydzi w Brasławiu // Тамсама. — S. 25–30.

Літ.: Katolog Brasławski — Literatura. — Warszawa: oddział Warszawski Krajowego Stowarzyszenia Brasławian, 2006.; Jan Klenowicz — John Conrad // Olsztyńcy brasławianie działalność, reportaze z podróży, wspomnienia. — Olsztyn, 2007. — S. 75–76.

**КЛЯЦКОЎ** МІКАЛАЙ ВАСІЛЬЕВІЧ (2.01.1939 в. Крапіўна Аршанскага раёна), педагог, краязнаўца. Скончыў школу, Аршанскае індустрыяльна-педагагічнае вучылішча (1961), геаграфічны факультэт МгДПІ (1979). Працаваў настаўнікам у СШ в. Шаломы Слаўгарадскага раёна, в. Валынцы Верхнядзвінскага раёна, геаграфіі і працоўнага навучання ў Пірагоўскай ВШ Дубровенскага раёна (1965–1967), другім сакратаром Дубровенскага райкома ЛКСМБ (1967–1971), старшынёй Дубровенскага гарадскога Савета дэпутатаў (1971–1974), настаўнікам геаграфіі СШ № 2 г. Дуброўна (1974–2000).

Цікавіцца гісторыяй роднага краю пачаў яшчэ ў час навучання ў школе. Аддае перавагу вывучэнню геаграфічна-гістарычнаму кірунку краязнаўства, даследаванням тапанімікі і антрапанімікі раёна. Удзельнічаў у стварэнні школьнага музея. З выхадам на пенсію стаў больш актыўна даследаваць гісторыю Дубровеншчыны, канцэнтруючыся на вывучэнні антрапанімікі роднага краю. Прааналізаваў больш за 1,5 тысячы прозвішчаў, якія сустракаюцца ў краі, даследуючы спісы выбаршчыкаў, тэлефонныя даведнікі, школьныя журналы, гістарычныя дакументы. У снежні 2006 г. падрыхтаваў працу на 80 старонках (вучнёўскі сшытак), частка якой друкавалася у раённай газеце «Дняпроўская праўда». У працы прыводзіць геаграфію паходжання, этымалогію, статыстыку прозвішчаў Дубровеншчыны. Аўтар артыкула ў кнізе «Памяць» Дубровенскага раёна і некалькіх публікацый у мясцовым перыядычным друку.

Падрыхтаваў, але не выдаў працы «Гісторыя народнай адукацыі раёна», «Даведнік г. Дуброўна».

Тв.: Назвы, з якімі жывем // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Дубровенскага раёна. Кн. 1. — Мн.: Паліграфафармленне, 1997. — С. 550–552; Які сэнс закладзены ў прозвішчы тваім // ДнП. — 2007. — № 69. — С. 2–4; Рака, якая яднае тры народы: [7 цудаў Дубровеншчыны] // ДнП. — 2008. — № 24. — С. 8.
Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Кляцкоў М.В. (2.04.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**КОЖАН** КЛІМЕНЦІЙ АРСЕНЬЕВІЧ (23.01.1930, в. Балбекі Дзісненскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Шаркоўшчынскага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца, педагог. Вучыўся ў Мнюцінскай ПШ (1944–1948), Шкунціўскай НСШ (1948–1951), Глыбоцкім педвучылішчы (1951–1955), філал. факультэце (аддзяленне рускай мовы і літаратуры) БДУ (1955–1960). Член ТБМ, Культурна-асветніцкага цэнтра імя Я. Драздовіча ў Германавічах.

Пасля заканчэння БДУ быў накіраваны на працу ў Браслаўскі раён. Працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў Карасінскай СШ Мяжанскага с/с (1960–1964), настаўнікам гісторыі і геаграфіі ў Рудаўскай ВШ Ахрамавецкага с/с (1964–1966). У 1966 г. пераехаў на радзіму, дзе працаваў школьным інспектарам у Шаркоўшчынскім аддзеле народнай асветы (1966–1967), настаўнікам рускай мовы, літаратуры і гісторыі ў Германавіцкай СШ (1967–1996). Пасля выхаду на пенсію (1996) працаваў навуковым супрацоўнікам на палову стаўкі ў Германавіцкім музеі мастацтва і этнаграфіі імя Я. Драздовіча (1998–2007).

Яшчэ працуючы ў Браслаўскім раёне, зацікавіўся краязнаўствам, гісторыяй Браслава і яго ваколіц. Пераехаўшы ў 1966 годзе ў Шаркоўшчынскі раён, працягнуў сваю працу па вывучэнні родных мясцін. Значны ўплыў на зацікаўленне, тэматыку і методыку краязнаўчай работы зрабілі М. Ермаловіч, Г.А. Каханоўскі, Зоська Верас (Л. Войцік), Л.А. Луцевіч. Асабіста знаёмы з многімі дзеячамі гісторыі і культуры Беларусі. Так, у пачатку 1980-х гг. пазнаёміўся з М. Ермаловічам і, прачытаўшы рукапіс працы «Па слядах аднаго міфа», пачаў больш глыбока цікавіцца гісторыяй Беларусі і раёна. На працягу 1980–1990-х гг. пад час канікул і летняга адпачынку працаваў у архівах і бібліятэках Вільнюса.

Асноўныя кірункі і тэмы краязнаўчых росшукаў: гісторыя і культура Шаркоўшчынскага раёна, былога Дзісненскага пав., гісторыя населеных пунктаў, славутых землякоў (Я. Драздовіча, М. Пецюкевіча, Ю. Туронка, І.В. Лагуна і інш. асоб краю), паўстанне 1831 г., развіццё адукацыі на Дзісненшчыне да 1917 г., гісторыя населеных пунктаў рэгіёна.

Браў удзел у рэспубліканскіх, абласных і рэгіянальных навукова-краязнаўчых канферэнцыях, круглых сталах і інш. мерапрыемствах. Удзельнічаў у Браслаўскіх чытаннях (1989, 1991, 1994, 1997, 2000, 2003), у Дзісненскіх чытаннях (Міёры, 1996, Глыбокае, 1999). Прымаў удзел у 1-м, 2-м і 3-м З'ездах беларусаў свету (1993, 1997, 2001).

Адзін з укладальнікаў гісторыка-культурнай хронікі «Памяць» Шаркоўшчынскага раёна, аўтар значнай колькасці артыкулаў. Аўтар артыкулаў у кнігах «Памяць» Браслаўскага, Лепельскага, Міёрскага раёнаў. Збіраў матэрыялы па гісторыі свайго краю ў архівах Мінска, Вільнюса, Рыгі, Віцебска, Глыбокага, Падольска (РФ).

Пачынаючы з 1960 г., надрукаваў сотні артыкулаў на краязнаўчыя тэмы ў газетах «Віцебскі рабочы», «Чырвоная змена», »Голас Радзімы», «Знамя юности», «Народнае слова», «Літаратура і мастацтва», «Настаўніцкая газета», «Браслаўская звязда», «Вольнае Глыбокае», «Бацькаўшчына» (Германавічы), «Рунь» (Вільнюс). Асабліва шмат артыкулаў было надрукавана ў раённай газеце «Кліч Радзімы» (Шаркоўшчына).



Вёў вялікую грамадскую работу. Быў лектарам па міжнародных і ідэалагічных пытаннях, кіраўніком міжшкольнага метадычнага аб'яднання настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства, старшынёй пярвічнай арганізацыі БДТАПГіК. На працягу чатырох гадоў быў сакратаром партарганізацыі ў Германавіцкай СШ, на працягу 6 гадоў — сакратаром тэрытарыяльнай партарганізацыі пры Германавіцкім с/с. Пасля распаду СССР у Камуністычную партыю Беларусі не вярнуўся. Па запрашэнні настаўнікаў выступае ў школах з лекцыямі, гутаркамі на краязнаўчыя тэмы. Дапамагаў настаўніцы рускай мовы і літаратуры А.Э. Райчонак у стварэнні гісторыка-краязнаўчага музея ў Германавіцкай СШ, а таксама Германавіцкага музея мастацтва і этнаграфіі імя Я. Драздовіча. Удзельнічае ў падрыхтоўцы матэрыялаў для газеты «Бацькаўшчына», якая выдаецца Германавіцкім культурным цэнтрам імя Я. Драздовіча і мясцовай суполкай ТБМ (з 2000).

Добра валодае польскай мовай, робіць пераклады. Напрыклад, пераклаў на беларускую мову артыкул прафесара Люблінскага ўніверсітэта В. Каўчынскай пра гісторыю Дзісненскай гімназіі.

Выдатнік народнай асветы (1984).

Тв.: Артыкулы ў кнігах «Памяць»: З аўтабіяграфіі Мар'яна Пецюкевіча // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Браслаўскага раёна. — Мн., 1998. — С. 590–593; Паўстанне 1831 г. у Дзісненскім павеце // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Міёрскага раёна. — Мн.: Бел. навука, 1998. — С. 97–101; Артыкул з газеты «НН», № 13 // Памяць: Лепельскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 82–83; Паўстанне 1831 года ў Дзісненскім павеце // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Шаркоўшчынскага раёна. — Мн.: БелЭн, 2004. — С. 48–51; Лужкоўскі піярскі калегіум // Тамсама. — С. 75–76; (разам з Л.М. Лабачэўскай) На сумежжы двух стагоддзяў // Тамсама. — С. 83–86; (разам з Л.М. Лабачэўскай) Устанаўленне савецкай улады // Тамсама. — С. 95–99; Адданыя справе рэвалюцыі // Тамсама. — С. 101; Лагун Іосіф Васільевіч // Тамсама. — С. 102; Германавіцкая «Заранка» // Тамсама. — С. 104–105; (разам з Л.М. Лабачэўскай) Нацыянальна-вызваленчы рух // Тамсама. — С. 138–141; Актывіст Грамады Пётр Ластаўка // Тамсама. — С. 142–143; Янка Пачопка — паэт і аграном // Тамсама. — С. 144; Язэп Драздовіч — шлях вечнага вандроўніка // Тамсама. — С. 154–158; (разам з Л.М. Лабачэўскай) Аб раскулачванні кулацкіх гаспадарак // Тамсама. — С. 191–192; Кірылаў Герман Іларыёнавіч // Тамсама. — С. 436–437; Касцюкевіч Пётр Пятровіч // Тамсама. — С. 437; Германавіцкі філіял Шаркоўшчынскага цэнтра цэнтра рамёстваў // Тамсама. — С. 456; Па старонках газеты «НН» // Тамсама. — С. 89–94; Аб адукацыі ў Дзісненскім павеце (1918–1920) // Тамсама. — С. 105–122; Запыты беларускіх паслоў у польскі сейм (1922–1926 гг.) // Тамсама. — С. 148–153; З лістоў Я. Драздовіча // Тамсама. — С. 158–159; Успаміны Ірэны Качан аб Я. Драздовічу // Тамсама. — С. 159–160; Аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР // Тамсама. — С. 178–182; Жыхары Шаркоўшчынскага раёна, асуджаныя ваенным трыбуналам войскаў МУС Полацкай вобл., гаспадаркі якіх былі аднесены да кулацкіх (1948–1951 гг.); Выпіскі з рашэнняў выканкама Шаркоўшчынскага райсавета дэпутатаў працоўных у пасляваенны час МУС // Тамсама. — С. 197–200; Дакументы аб партыз. руху ў Шаркоўшчынскім раёне // Тамсама. — С. 264–273; Дакументы аб вызваленні Шаркоўшчынскага раёна // Тамсама. — С. 288–294; Выпіскі з пратаколаў пасяджэнняў выканкама Шаркоўшчынскага райсавета дэпутатаў працоўных (1945–1946 гг.) // Тамсама.

Артыкулы ў навуковым друку: Паўстанне 1831 года ў Дзісненскім павеце // Браслаўскія чытанні: матэрыялы ІІ навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 925-годдзю Браслава (1065–1990), 16–17 лютага 1991 г. / навук. рэд. М.А. Ткачоў. — Браслаў: Браслаўскі філіял Пастаўскай узбуйнёнай друкарні, 1991. — 28–30; Мар'ян Пецюкевіч: Жыццё і дзейнасць // Браслаўскія чытанні: матэрыялы ІІІ навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 200-м угодкам паўстання 1794 года, 21–22 красавіка 1994 г. — Браслаў: Браслаўскі філіял Пастаўскай узбуйнёнай друкарні, 1994. — С. 34–39; Беларусы ў Латвіі: Гісторыя і сучаснасць // Браслаўскія чытанні: матэрыялы ІV навукова-краязнаўчай канферэнцыі, 24–25 красавіка 1997 г. — Браслаў, 1997. — С. 162–167; Летапіс памяці працягваецца // Браслаўскія чытанні: матэрыялы V навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 935-годдзю першай згадкі Браслава ў пісьмовых крыніцах / К. Шыдлоўскі (гл. рэд.) [і інш.]. — Браслаў, 2000. — С. 50–51; Пётр Касцюкевіч // Браслаўскія чытанні: матэрыялы VІ навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 150-й гадавіне з дня нараджэння браслаўскага лекара, грамадскага дзеяча Станіслава Нарбута (1853–1926), 7–8 мая 2003 года. — Браслаў, 2003. — С. 52–54.

Артыкулы ў перыядычным друку: Германавічам — 400 гадоў // КР. — 1980: Лужскі Гарадзец // КР. — 1981. — 11 крас.; Ёды // КР. — 1981. — 29 кастр.; Першы зборнік: [першы зборнік верша Міхася Машары «Малюнкі»] // КР. — 1983. — 17 лют.; Адзін з многіх // КР. — 1983. — 21 крас.; Сустрэчы ля блакітных азёр // КР. — 1983. — 26 мая; Для шчасця народа: [П. Мядзёлка]// КР. — 1983. — 22 верас.; Аб устанаўленні савецкай ўлады на тэрыторыі Шаркоўшчынскага раёна 1917–1920 гг. // КР. — 1981. — 7 ліст.; Выдатныя ўрокі грамадзянскасці (школьнае краязнаўства // КР. — 1984. — № 95; Вечны вандроўнік // КР. — 1985. — 20 мая; З любоўю да роднага краю // КР. — 1985. — 21 мая; Першаму беларускаму календару — 75 гадоў // КР. — 1985. — 18 ліп.; Усё жыццё — рэвалюцыі: [да 100-годдзя рэвалюцыянера А.М. Буйкі] // КР. — 1985. — 26 снеж.; Ён ўсіх на зваў у космас»: [Я. Драздовіч] // КР. — 1986. — 12 крас.; Слова пра юбіляра: [60 гадоў П. Касцюкевічу, мастаку і паэту родам з Шаркоўшчынскага раёна] // КР. — 1986. — 26 ліп.; Лаўровы вянок дзядзьку Ігнату: [да 125-годдзя Ігната Буйніцкага] // ВР. — 1986. — № 160. — С. 4; «Нашай Ніве» — 80 // КР. — 1986. — № 143. — С. 2; Помнікам архітэктуры — больш увагі // КР. — 1986. — № 150. — С. 4; Паэт і аграном: [Пачопка Я. з в. Лешнікі Глыбоцкага раёна] // КР. — 1987. — 11 чэрв.; Супраць самадзяржаўя // КР. — 1987. —1 верас.; Важны фактар выхавання // КР. — 1987. — 22 кастр.; Рэвалюцыйная бура: [1905–1907] // КР. — 1987. — 24 кастр.; Першая сусветная // КР. — 1987. — 27 кастр.; За ўладу Саветаў // КР. — 1987. — 3 ліст.; Крокі станаўлення: [усталяванне савецкай улады на Шаркоўшчыне ў 1918–1919 гг.] // КР. — 1987. — 12 ліст.; Трывожны год // КР. — 1987. — 21 ліст.; Сялянкі пясняр: [да 85-годдзя М. Машары] // КР. — 1987. — 26 ліст.; Пётр Касцюкевіч — воін, мастак, паэт // БЗ. — 1987. — № 60. — С. 2; Успаміны пра Цішку Гартнага // КР. — 1987. — № 145. — С. 3; Багатая гісторыя // КР. — 1987. — № 150. — С. 3; Голас дайшоў праз гады // ВР. — 1987. — № 99. — С. 4; Мужны змагар за волю: [да 150-годдзя К. Каліноўскага] // КР. — 1988. — 16 лют.; Шаркоўшчына // КР. — 1988. — 21, 23 чэрв.; Мастак, педагог, асветнік: [да 100-годдзя Я. Драздовіча] // КР. — 1988. — 11 кастр.; Пара прабудзіцца: [Пётр Ластаўка, жыў у Польшчы, нарадзіўся ў в. Жукі Ложныя, каля Германавіч] // КР. — 1989. — 1 студз.; Заплылі слязой на соснах шрамы: [партызанская брыгада «Кастрычнік»] // КР. — 1989. — 27, 29 чэрв., 1 ліп.; Стаялі ў змаганні: [партызанская брыгада «Кастрычнік»] // КР. — 1989. — 15, 18 ліп.; Пётр Ластаўка // КР. — 1989. — 3 жніўня., 8 жніўня; Савецкую ўладу падтрымліваем: [дзейнасць Я. Драздовіча ў Германавічах пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі] // КР. — 1989. — 26 жніўня; Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года (да 410-годдзя Статута) // КР. — 1989. — 5 верас.; Любіць і ведаць свой край // КР. — 1990. — № 16; Вільня і беларусы // КР. — 1990. — 29 мая; З песняй па свеце: [да 90-годдзя М.І. Забэйды-Суміцкага] // КР. — 1990. — 26 чэрв.; Слаўная гісторыя палка: [1406-ы зенітна-артылерыйскій полк, удзельнічаў у вызваленні Шаркоўшчынскага раёна] // КР. — 1990. — 3 ліп. — № 79, 82, 84, 85, 87, 91; Урокі нашай гісторыі: [да 580-годдзя Грунвальдкай бітвы] // КР. — 1990. — 2 жніўня; Пётра Сергіевіч // КР. — 1990. — 9 жніўня; Адваёўваць

для сваёй ідэі: [аб перапісцы Я. Драздовіча і П. Сергіевіча] // КР. — 1990. — 25 кастр.; Янка Пачопка: [да 100-годдзя] // КР. — 1990. — 13 снеж.; «Я з вечна вандроўных…» // БЗ. — 1989. — № 73. — С. 2; Супраць рускага царызму // КР. — 1991. — 10 чэрв.; Доктар Браніслаў Туронак: [да 95-годдзя] // КР. — 1991. — 26 чэрв.; Паўстанне 1831 г. у Дзісненскім павеце // БЗ. — 1991. — № 66, 67; Расія пры імператару Мікалаю II // КР. — 1991. — № 77–79; Нашы сімвалы спавіты стагоддзямі // НС. — 1995. — № 46. — С. 5; Мар'ян Пецюкевіч: Жыццё і дзейнасць // БЗ. — 1995. — № 50, 51; Шкуніцкі: [з гісторыі вёскі] // КР. — 1998. — 14 кастр.; Віленскай беларускай гімназіі 80 гадоў // НС. — 1999. — № 26. — С. 5; Іду, крычу, люблю, жыву: [М. Райчонак] // НС. — 1999. — № 77. — С. 6; Мястэчка Германавічы: Учора, сёння, заўтра // ВГ. — 2001. — № 12. — С. 2; Караінскай школе — 50 гадоў // ВГ. — 2002. — 1–7 лют.; Улюбёны ў Беларусь: [да 80-годдзя Лявона Луцкевіча, зяця Зоські Верас] // ВГ. — 2002. — 28 сак., 3 крас.; Язэп Драздовіч і нябесныя бегі // НС. — 2003. — № 44. — С. 4; Шаркоўшчыне — 500 гадоў // НС. — 2003. — № 122. — С. 2; Слаўны сын Беларусі: [да 85-годдзя з дня нараджэння М. Ермаловіча] // ВГ. — 2006. — 15 чэрв.; Паўстанне 1831 года ў Дзісненскім павеце: [да 175-годдзя паўстання] // ВГ. — 2006. — 26 кастр., 2 ліст.; Георгію Штыхаву — 80 гадоў // ВГ. — 2007. — 2 жніўня; Адаму Мальдзісу — 75 гадоў // ВГ. — 2007. — 16 жніўня; Памяці Галіны Войцік: [дачкі Зоські Верас] // ВГ. — 2007. — 13 верас.; Вячаславу Бука — 65 гадоў: [прафесар, доктар біялагічных навук, загадчык аддзела біяхімічнай фармакалогіі і біяхіміі НАН Беларусі, родам з в. Шаркі Шаркоўшчынскага раёна] // ВГ. — 2007. — 18 кастр.; Гэту сцежку ведалі многія: [да 115-годдзя з дня нараджэння Зоські Верас] // ВГ. — 2007. — 25 кастр., 1 ліст.

Літ.: Іларыёнаў Г. Памяццю ўрастаем у свой край // КР. — 1991. — № 4. — С. 3; Лабачэўская Л. Шляхамі вечнага вандроўніка // КР. — 1993. — № 43. — С. 1, 3; Яшчэ не вечар! // НС. — 1996. — 23 студз. — С. 2; Януш І. Даследчык мінуўшчыны // НС. — 2006. — 31 студз. — С. 5; Майсяёнак А. З любоўю да роднага краю // ВР. — 2006. — 31 студз.; Корсак Э. Для адпачынку часу не стае // КР. — 2006. — 25 студз.; Лупач З. «Нам трэба ганарыцца помнікамі гісторыі і культуры свайго народу» // ВГ. — 2006. — 19 студз.; Кожан Кліменцій Арсеньевіч. Аўтабіяграфія (5.11.2007) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Кожан К. А. Краязнаўчая работа (5.11.2007) // Тамсама; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Кожан К.А. (5.11.2007) // Тамсама.

**КОЖАР** НАДЗЕЯ УЛАДЗІМІРАЎНА (15.11.1949), краязнаўца. Скончыла філал. факультэт БДУ. Працавала выхавацелькай ў дзіцячым садку, супрацоўніцай, потым гал. захавальніцай фондаў Расонскага музея баявой садружнасці (1978–2005). Брала ўдзел у арганізацыі музея, афармленні экспазіцый, прысвечаных П.М. Машэраву, у стварэнні музея пад адкрытым небам у Роўным Полі. Аўтар вялікай колькасці нарысаў, замалёвак, апавяданняў пра землякоў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, пра легенды і паданні, тапаніміку Расоншчыны, якія змяшчае на старонках раённай газеты «Голас Расоншчыны».

Тв.: <u>Артыкулы ў перыядычным друку:</u> Герой Савецкага Саюза — Аляксандр Кірылавіч Шэлепень // КШ. — 1988. — № 20. — С. 2; Ішоў бой за Парэчча: [1943] // КШ. — 1989. — № 79. — С. 2; Расонскія мадоны: [Н.С. Шалаева] // ГлРс. — 2001; Хадзіў у разведку салдат // ГлРс. — 2003. — № 45. — С. 2; Кветкі памяці: [І.А. Анкудзінаў] // ГлРс. — 2003. — № 48. — С. 3; Рамонкі, спаленыя вайной // ГлРс. — 2003. — № 52. — С. 3; Навечна ў памяці: [В.Я. Лапенка] // ГлРс. — 2003. — № 55. — С. 3; Зорка Радзівона Ахоціна // ГлРс. — 2003. — № 66. — С. 3; Святло ўдзячнага сэрца: [Ч.У. Кукуладзэ] // ГлРс. — 2003. — № 72. — С. 2; Юнацтва прайшло ў агні: [У.А. Шарпенка] // ГлРс. — 2004. — № 2. — С. 2; Першы настаўнік: [К.М. Хавецкі] // ГлРс. — 2004. — № 8. — С. 4; Агеньчыкі далёкай славы: [С.І. Мажайскі] // ГлРс. — 2004. — № 19. — С. 3; Подзвігі іх будуць жыць у вяках // ГлРс. — 2004. — № 24. — С. 3; Навечна ў памяці: [У. Кажамячанка] // ГлРс. — 2004. — № 27. — С. 2; Мужнасць патрыёта: [Р.Д. Шалаеў] // ГлРс. — 2004. — № 36. — С. 2; З удзячнасцю за мужнасць: [П.В. Глазкін] // ГлРс. — 2005. — № 5. — С. 2; Зорны шлях героя: [С.І. Жукаў] // ГлРс. — 2005. — № 11. — С. 2; Помнікі сярод белых снягоў // ГлРс. — 2005. — № 12. — С. 3; Квітнелі ружы Балгарыі: [І.С. Майсейчанка] // ГлРс. — 2005. — № 29. — С. 3; Наказ праз дзесяцігоддзі: [В.З. Яфрэменка] // ГлРс. — 2005. — № 85. — С. 1; Снежань у гісторыі Расоншчыны // ГлРс. — 2005. — № 95, 99; Месяцы ў гісторыі Расоншчыны // ГлРс. — 2006. — № 3, 10, 27, 37, 44, 52, 62, 64, 73, 79; Гавораць былыя супрацоўнікі музея // ГлРс. — 2006. — № 51. — С. 3; Пра партыз. разведчыка і нямецкага «языка» // ГлРс. — 2006. — № 62. — С. 3; Повалишинские дубы // ГлРс. — 2006. — № 82. — С. 4; Гара Рагвалода і Рагнеды // ГлРс. — 2006. — № 83. — С. 4; З Полацка на самалёце // ГлРс. — 2006. — № 84. — С. 3; Даўніна стукае ў сэрцы: [в. Сакалішча] // ГлРс. — 2006. — № 87. — С. 3; Тут Ян Баршчэўскі нарадзіўся // ГлРс. — 2007. — № 3. — С. 4; Помнік бессмяротнасці: [помнікі лётчыкам у в. Сяляўшчына] // ГлРс. — 2007. — № 5. — С. 4; Шыпшына над возерам: [легенда] // ГлРс. — 2007. — № 8. — С. 4; Тут мужнасцю продкаў усё навокал напоўнена: [Я.П. Кульнёў] // ГлРс. — 2007. — № 11. — С. 4; Ля партызанскіх зямлянак: [«Музей партыз. побыту»] // ГлРс. — 2007. — № 19–20. — С. 6; Краше тут: [народная этымалогія назвы в. Крашуты] // ГлРс. — 2007. — № 34. — С. 4; Панская затока // ГлРс. — 2007. — № 53. — С. 4; Пашчасціла працаваць побач: [П.М. Машэраў] // ГлРс. — 2008. — № 7. — С. 2; Викентия: [В.В. Дамброўская] // ГлРс. — 2008. — № 39. — С. 3; Змястоўны дыялог // ГлРс. — 2008. — № 48. — С. 5; Успаміны старога маёнтка: [Расоны] // ГлРс. — 2008. — № 93. — С. 4.

Літ.: Прудоўскі Р. Жывы вянок яе зямнога шчасця // ГлРс. — 2004. — № 69. — С. 3.

**КОЗАК** КУЗЬМА ІВАНАВІЧ (16.09.1955, в. Альшаны Столінскага раёна Брэсцкай вобл.), гісторык. Скончыў МДПІ (1981). Працаваў настаўнікам Крывіцкай СШ Салігорскага раёна, нам. дырэктара НАРБ, дацэнтам кафедры крыніцазнаўства БДУ (з 1995). Даследуе гісторыю Другой сусветнай вайны, архівазнаўства, напалеонаўскія войны. Адзін з укладальнікаў гісторыка-культурнай хронікі «Памяць» Пастаўскага раёна. Аўтар шэрагу артыкулаў у ёй.

Тв.: (разам з У.Я. Магільніцкім) Прырода раёна // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Пастаўскага раёна. — Мн.: БелТА, 2001. — С. 22–28; Пастаўская воласць на мяжы XIX–XX ст. // Тамсама. — С. 110–117; (разам з С.А. Захаравым) Пастаўшчына ў гады Першай сусветнай вайны // Тамсама. — С. 123–130; Часы міжуладдзя: [1917] // Тамсама. — С. 131–135; У складзе Польшчы // Тамсама. — С. 144–155; Да новага жыцця: [1939–1941] // Тамсама. — С. 166–170; Вернутыя імёны: [рэпрэсіі на Пастаўшчыне] // Тамсама. — С. 181–182; Цяжкі час акупацыі // Тамсама. — С. 203–210; Армія Краёва на Пастаўшчыне // Тамсама. — С. 309–311.

Літ.: ЭГБ. Т. 6. Кн. 2. — Мн., 2001. — С. 401; Корзенко Г.В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник. — Мн.: Бел. наука, 2007. — С. 171–172.



**КОЛАСАЎ** КАНСТАНЦІН МІКАЛАЕВІЧ (25.12.1917, в. Пухі Віцебскага пав. Віцебскай губ. (цяпер Заронаўскага с/с Віцебскага раёна Віцебскай вобл.) – 21.11.1977), архівіст, краязнаўца. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1938), камандзірскія курсы Харкаўскай радыётэхнічнай акадэміі (1954), гадавыя курсы кіруючых работнікаў і спецыялістаў пры МДГАІ (1966). Працаваў на Віцебскай швейнай фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» (1934), тэхнікам-геадэзістам Віцебскага абласнога зямельнага аддзела (1938). Служыў ва УС СССР (1938–1958). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў дырэктарам ДАВВ (1958–1977).

За час кіраўніцтва калектывам ДАВВ правёў вялікую працу па арганізацыі будаўніцтва новага будынка архіва (1963), перавозцы ў яго дакументаў з былога Маркавага манастыра. Зрабіў істотны ўклад у арганізацыю работы па выкарыстанні дакументальных матэрыялаў праз сродкі масавай інфармацыі (друк, радыё, тэлебачанне, фотавыставы), выступаў з лекцыямі і дакладамі перад грамадскасцю.

Аўтар больш за 75 артыкулаў у мясцовым перыядычным друку на краязнаўчую тэматыку. З яго ўдзелам падрыхтаваны і праведзены 20 радыёперадач і 30 тэлеперадач, у якіх асвятляліся розныя тэмы па гісторыі Віцебшчыны: «Этапы рэвалюцыі», «Герой шабельных паходаў» (І.Ф. Шубіна), «Наступальныя аперацыі Чырвонай Арміі пры вызваленні Віцебска», «На рубяжы XX стагоддзя» (з гісторыі Віцебска), «Першыя крокі» (да 40-годдзя Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Коласа) і інш.

З'яўляўся членам прэзідыума Віцебскага абласнога савета БДТАПГіК. Узначальваў гісторыка-археалагічную секцыю гэтай арганізацыі. Меў званне «Ганаровы член БДТАПГіК» (1988). Быў членам саветаў абласнога краязнаўчага музея, народнага музея У. І. Леніна.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За Перамогу над Германіяй», «30 гадоў Савецкай Арміі і Флоту», «За доблесную працу», «У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна».

Тв.: У дні ўсенароднага смутку // ВР. — 1960. — 12 сак. — С. 2; Гэта было ў 1922 // ВР. — 1962. — 28 сак. — С. 2; Дакументы расказваюць // ВР. — 1962. — 10 жніўня. — С. 3; Дакументы апраўдваюць // ВР. — 1962. — 31 жніўня. — С. 3; Віцебшчына, год 1922 // ВР. — 1962. — 30 снеж. — С. 3; За шчасце народнае // ВР. — 1963. — 23 лют. — С. 3; З гвардыі рэвалюцыянераў // ВР. — 1965. — 5 верас.; У тыя незабыўныя дні // ВР. — 1965. — 6 ліст.; 17 баявых сцягоў // ВР. — 1965. — 16 ліст.; Герой шабельных паходаў // ВР. — 1968. — 9 студз.; Першыя радасці // ВР. — 1968. — 27 чэрв.; Трэці губернскі з'езд Саветаў // ВР. — 1968. — 7 верас.; Да 50-й гадавіны гарадоцкіх бальшавікоў // ВР. — 1968. — 8 кастр.; За зямлю, за волю, за лепшую долю // ВР. — 1968. — 5 ліст.; (разам з Я. Рыклінам): Па слядах адной тэлеграмы У.І. Леніну // ВР. — 1970. — 20 студз. — С. 2–3; Аб чым расказала старая карта // ВР. — 1971. — 29 крас.; Віцебшчына, год 1922 // ВР. — 1971. — 1 кастр.; Калышанскія грошы // ВР. — 1971. — 21 снеж.; Вялікі саюз сярпа і молата // ВР. — 1972. — 13 снеж. — С. 2–3; Гарачае лета // ВР. — 1972. — 23 чэрв. — С. 2.; Праспект Фрунзе // ВР. — 1972. — 27 мая; Байцы-інтэрнацыяналісты // ВР. — 1973. — 21 лют. — С. 2; «…Самая лепшая павязка на мае раны» // ВР. — 1973. — 22 крас. — С. 2; І стала мара явай // ВР. — 1974. — 17 верас. — С. 2; Першае скліканне // ВР. — 1975. — 15 чэрв. — С. 2 Партрэт камуніста. Па старонках франтавых газет // ВР. — 1975. — 1 мая. — С. 2; Старонкі рэвалюцыйнай барацьбы // ВР. — 1976. — 17 верас.

Літ.: ДАВВ. Ф. 289, воп. 1-к, спр. 90 (асабовая справа К.М. Коласава). Долгова А. В., Шарендо В.В., Колосов К.Н. // Витебщина архивная: История, фонды, персоналии, сер. XIX–XX вв. — Мн.: БелНДІДАС, 2002. — С. 184; Архівісты Беларусі: біябібліяграфічны даведнік / склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. — Мн.: БелНДІДАС, 2006. — С. 136.



**КОПЦІК** ЮРЫ АЛЯКСАНДРАВІЧ (*Ю. Аршыца*) (29.01.1957, г. Орша). Скончыў 8 класаў СШ № 13 г. Оршы (1972), аддзяленне клубнай работы Віцебскага культасветвучылішча (1975). Працаваў дырэктарам Якубаўскага СДК Дубровенскага раёна (1975), кіраўніком аркестра народных інструментаў, мастацкім кіраўніком дамоў культуры г. Оршы (1975–1978), электрыкам на прадпрыемствах (1985–1989), карэспандэнтам «Аршанскай газеты» (1990–1997) і інш. газет г. Оршы. Кіраваў краязнаўчым гуртком у ЦДЮТЭ г. Оршы.

Даследуе гісторыю і культуру Оршы, аддаючы перавагу перыяду XVI стагоддзя, маскоўска-літоўскім войнам XVI ст., тапаніміцы роднага краю. Пэўны ўплыў на фарміраванне поглядаў і зацікаўленасці ў вывучэнні гісторыі роднага краю аказаў Ю. Вольф. Гісторыяй роднага краю зацікавіўся пасля таго, як скончыў вучылішча і пачаў працоўную дзейнасць. Краязнаўчыя даследаванні атрымалі сістэмнасць, калі стаў браць удзел у працы гісторыка-культурнага клуба «Повязь» г. Оршы.




Займае актыўную грамадскую пазіцыю. Адыграў ролю ў краязнаўстве Аршаншчыны тым, што на старонках мясцовага перыядычнага друку ўзняў праблемы аховы помнікаў гісторыі і культуры, стану беларускай мовы, экалагічнага становішча горада і наваколляў, гарадской геральдыкі, палітычных рэпрэсій, існавання старадаўніх падземных хадоў у Оршы, верагоднасці існавання ў часы сярэднявечча аднаго з адгалінаванняў шляху з «варагаў у грэкі» і інш.

Удзельнічаў у шэрагу міжнародных і рэгіянальных навуковых канферэнцый: «Праблемы беларускага краязнаўства» (1989), «Полацкая акадэмія і актуальныя праблемы нацыянальнай культуры» (1992), «Разам на працягу стагоддзяў» (2006), «Археологическая наука: состояние, методология и перспективы» (2008) і інш.




Укладальнік краязнаўчага зборніка «Аршанская мінуўшчына» (1997). Рэдактар кнігі «Легенды і паданні Аршаншчыны» (2004), аўтар кнігі «Аршанская бітва і Аршанскі фэст». Рэдагаваў кнігу Я.Н. Крашанніннікава «У Аршанскім падполлі» (1998). Аўтар некалькіх артыкулаў у ёй. Аўтар артыкулаў у кнігах «Памяць» Оршы і Аршанскага раёна, зборніках матэрыялаў і канферэнцый. З канца 1980-х гг. друкуе артыкулы на краязнаўчую тэматыку ў рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку (часопісы «Беларуская мінуўшчына», «Родная прырода», газеты «Чырвоная змена», «ЛіМ», «Аршанская газета», «Телеком-Экспресс» і інш.).

Мае невялікі прыватны архіў і музей, частку экспанатаў якога перадаў у Аршанскі музей гісторыі і культуры, ВАКМ.

Тв.: Кнігі: Аршанская мінуўшчына: [гісторыя Оршы ў друку]. Вып. 1 / уклад. Ю. Копцік. — Орша: Аршанская друкарня, 1997. — 108 с.; Легенды і паданні Аршаншчыны. — Орша, 2004. — 62 с.; Аршанская бітва і Аршанскі фэст: гісторыя: [саматуж. выд.]. — Орша, 2007. — 35 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Орша ў перыяд маскоўска-літоўскіх войнаў XVI стагоддзя // Аршанскі краязнаўчы зборнік. — Орша, 1995. — С. 22–26; «Учредить в белорусском городе Орше высшее учебное заведение» // БМ. — 1996. — № 5. — С. 34–36; Аб гербе Оршы // Аршанская мінуўшчына. — Орша, 1997. — С. 44–49; Да пытання аб гербе Оршы // Тамсама. — С. 49–53; «Пройду по Абрикосовой, сверну на Виноградную» // Тамсама. — С. 57–71; (разам з А.П. Грыцкевічам, З.Ю. Капыскім, В.Л. Насевічам, В.М. Сцяпанавым) У складзе Вялікага княства Літоўскага // Памяць: Гісторыка-культурная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 54–62; Латышскія і літоўскія хутары на Аршаншчыне ў апошняй трэціне XIX ст. – першай трэціне XX ст. // Беларусь і Латвія: Адміністрацыйнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае ўзаемадзеянне ў Дзвінскім рэгіёне: матэрыялы Міжнар. навук. канф «Разам на працягу стагоддзяў (беларуска-латышскія ўзаемадачыненні ў Дзвінскім рэгіёне)», Віцебск, 14–15 ліст., 2006 г. / пад рэд. Л. Хмяльніцкай. — Мн: Тонпік, 2006. — С. 102–111.

Артыкулы ў перыядычным друку: Сумны лёс «Белага Ковеля» // ЛП. — 1988. — № 191. — С. 4; Фестываль у Оршы // ЛП. — 1989. — № 11. — С. 4; Уяўны ўрок // ЛП. — 1989. — № 15, 19, 22; Хто забівае раку // ЛП. — 1989. — № 49. — С. 4; Адышло ў небыццё: [Куцеінскі манастыр] // ЛП. — 1989. — № 51. — С. 4; Помняць помнікі: [г. Орша] // ЛП. — 1989. — № 82. — С. 4; Запрашаем на талаку // ЛП. — 1989. — № 103. — С. 4; Помняць помнікі // ЛП. — 1989. — № 110. — С. 4; Адноўлены помнік: [генералу П.М. Труханаву — герою 1812 г.] // ЛП. — 1989. — № 187. — С. 4; Скарбы драўлянага дойлідства // ЛП. — 1990. — № 33. — С. 3; Крумкачы на Кабыляцкай гары // ЛіМ. — 1990. — № 41; Канстанцін Астрожскі // ЛП. — 1990. — № 53, 54; Слова пра словы: [бел. мова] // ЛП. — 1990. — № 63. — с. 3; Аўтограф мінулых стагоддзяў: [скарбы на Аршаншчыне] // ЛП. — 1990. — № 67. — С. 3; Атрутныя крыніцы // ЛП. — 1990. — № 83. — С. 3; Патрабуюць

умяшання // ЛП. — 1990. — № 91. — С. 3; Апошні з хутаран // ЛП. — 1990. — № 107. — С. 2; Грунвальд // ЛП. — 1990. — № 120–123; Лясныя звалкі // ЛП. — 1990. — № 124. — С. 3; Дубровенскія «рупліўцы» // ДнП. — 1990. — № 125. — С. 2; Езуіцкі манастыр // ЛП. — 1990. — № 137. — С. 3; Партрэт вёскі часоў заняпаду імперыі // ЛП. — 1990. — № 155. — С. 3; Раскопкі на гарадзішчы: [г. Орша] // ЛП. — 1990. — № 158. — С. 3; На аднаўленне помніка: [в. Браздзечна] // ЛП. — 1990. — № 161. — С. 3; Раскопкі Чаркасаўскага гарадзішча // ЛП. — 1990. — № 177. — С. 3; Дубровенскія «рупліўцы» // ВР. — 1990. — № 212. — С. 2; Аб гербе Оршы // АГ. — 1991. — № 13. — С. 3; Шыбецкае гарадзішча // ЛП. — 1991. — № 70. — С. 3; Загадкавая краіна Артанія // ЛП. — 1991. — № 101. — С. 3; Дзе была р. Няміга // ЛП. — 1991. — № 109. — С. 3; Ляцела песня над Дняпром // ЛП. — 1991. — № 115, 116; Аб гербе Оршы // АГ. — 1991. — № 13. — С. 2; Археалагічны сезон завершаны // АГ. — 1991. — № 22. — С. 3; Як абіралі Оршу // АГ. — 1991. — № 34. — С. 1; Да пытання аб гербе Оршы // АГ. — 1992. — № 26. — С. 3; «Пройду по Абрикосовой, сверну на Виноградную» // АГ. — 1992. — № 43–46; Будзе ў Барані свой герб // АГ. — 1992. — № 54. — С. 2; Касцёл Святога Іосіфа // АГ. — 1992. — № 63. — С. 2; Кляштар францысканцаў // АГ. — 1992. — № 64. — С. 2; Бернардзінскі кляштар // АГ. — 1992. — № 73. — С. 2; Ці быў баярын Орша заснавальнікам Оршы? // АГ. — 1992. — № 76. — С. 2; «Падземныя хады ў Оршы — гэта не байкі» // АГ. — 1992. — № 77–78. — С. 2; Полацкія нататкі // АГ. — 1992. — № 89. — С. 2; На руінах Вялікага княства // АГ. — 1992. — № 112. — С. 3; Амерыка і яе людзі: [вёска] // АГ. — 1992. — № 129. — С. 2; Ведай і помнік: [рэпрэсіі 1930-х у Оршы] // АГ. — 1992. — № 131. — С. 2; Ці была вайна для нас айчыннай // АГ. — 1992. — № 147. — С. 3; Два лёсы: [рэпрэсіі 1930-х гг.] // АГ. — 1992. — № 152–153; На ўскраіне раёна: [в. Васёва] // АГ. — 1993. — № 22. — С. 2; Нерэабілітаванае дзіця // АГ. — 1993. — № 41. — С. 3; Экалагічны стан Аршаншчыны // АГ. — 1993. — № 47. — С. 3; Да чытача. Летам 41-га: [мемуары Казанцава В.Ю., афіцэра 18-й стралковай дывізіі, якая летам 1941 г. абараняла Оршу] // АГ. — 1993. — № 68, 69, 71, 73–77, 84–86; Артылерыйскі рэдут: [у п. Копысі] // АГ. — 1993. — № 69. — С. 3; Капліца: [на тэрыторыі копыскага кафлянага завода] // АГ. — 1993. — № 71. — С. 2; Ці існаваў горад Одрэск? // АГ. — 1993. — № 84. — С. 2; Фальклорнае свята ў Крапіўне // АГ. — 1993. — № 92. — С. 4; Якія помнікі ахоўвае раённы Фонд аховы помнікаў? // АГ. — 1993. — № 116. — С. 3; Блакітная мара Мішакова // АГ. — 1993. — № 145. — С. 2; Орша ў перыяд маскоўскіх войнаў XVI ст. // АГ. — 1993. — № 147, 149; Орша ў падзеях маскоўска-літоўскіх войнаў XVI ст. // Выбар. — 1994. — № 6. — С. 2; Унікальная знаходка ў Задняпроўі: [знаходка прадмостнага ўмацавання часоў вайны 1812 г.] // АГ. — 1994. — № 11. — С. 3; Як захоўваюцца помнікі // АГ. — 1994. — № 22. — С. 2; Абласная канферэнцыя пошукавых атрадаў // АГ. — 1994. — № 26. — С. 2; Знішчэнне працягваецца?: [стан базыльянскага манастыра ў Оршы] // АГ. — 1994. — № 89. — С. 3; «Невядомы» музей: [музей ПТВ № 110 г. Оршы] // АГ. — 1994. — № 123. — С. 2; Некалькі заўваг апаненту: [дыскусія адносна існавання падземных хадоў у Оршы] // АГ. — 1994. — № 129. — С. 3; Як разбуралася наша гісторыя // АГ. — 1995. — № 12. — С. 3; Гэта салодкае слова — халява: [ахова помнікаў гісторыі] // ЛіМ. — 1995. — 113; Назвы будучых вуліц // АГ. — 1995. — № 15, 16; Чаму не будзе Аршанскай бітвы – 96 // ЛіМ. — 1996. — № 29; Ці ўдасца захаваць помнікі // АГ. — 1996. — № 40. — С. 3; Ахова спадчыны на грамадскіх пачатках // АГ. — 1996. — № 94. — С. 3; Куцеінскія манастыры былі ўніяцкімі? // АГ. — 1996. — № 105. — С. 2; Карты з памылкамі: [карта г. Орша] // АГ. — 1996. — № 128. — С. 4; Самы стары драўляны будынак: [Св. Траецкая царква] // АГ. — 1996. — № 130. — С. 2; «Куды паказвае страла?»: [рэцэнзія артыкула Э. Навагонскага ў БГЧ] // АГ. — 1997. — № 9. — С. 2–3; Наша гісторыя: [80 год «Аршанскай газеце»] // АГ. — 1997. — № 56. — С. 1; Школьнае краязнаўства: праблемы і задачы // АГ. — 1997. — № 68. — С. 3; Здзек над памяццю працягваецца, або Вандалізм перыяду рынкавага сацыялізму // АГ. — 1997. — № 89. — С. 2; Генадзь Вінніца. «Слово Памяти»: [рэцэнзія] // АГ. — 1997. — № 109. — С. 3; Знаёмцеся: «Рша» // АГ. — 1997. — № 112. — С. 3; Паданне пра вёску Засеклі: [рэцэнзія] // АГ. — 1997. — № 119. — С. 2; Ігар Яршоў. «Вежы над Дняпром» // АГ. — 1997. — № 124. — С. 2; Балбасава: На пераломе гісторыі // АГ. — 1997. — № 124. — С. 3; Гарадская канферэнцыя // АГ. — 1995. — № 12. — С. 3; Старонкі гісторыі: Езуіцкі манастыр у Оршы // АГ. — 1997. — 18 кастр. — С. 2; Открытие мира: [М. Марышаў, мастак] // ВК. — 2002. — № 21. — С. 4; Габелены Святланы Бараноўскай // ВК. — 2002. — № 57. — С. 3; Аршанскае краязнаўства: [прэзентацыя кнігі С. Івановай «Оршанские краеведы»] // ВК. — 2002. — № 87. — С. 2; «Наш край» падводзіць вынік: [Орша] // ВК. — 2003. — № 12. — С. 4; Фаталіст Андрэй Мельнікаў // ВК. — 2003. — № 15. — С. 3; Новыя версіі пра назву: [Талачын] // СІ. — 2003. — № 104–105. — С. 4; Талачын ці Талочын? // Культура. — 2004. — № 17–18; «Оршанский Стоунхэндж»: Дутая сенсация // ВК. — 2005. — № 85. — С. 4; Музей милиции: [Орша] // ВК. — 2005. — № 90. — С. 3; Сосновый парк ждет решения: [Барань] // Тамсама. — С. 4; Архітэктурныя прагулкі: Мінская, 17 // АГ. — 2007. 24 ліст., 22. 12. ; «Оршанский Стоунхэндж», или История дутой сенсации // ТЭ. — 2007. — № 33. — С. 3.

Літ.: Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 14; Яршоў І. Дазвольце не пагадзіцца: [адказ на рэцэнзію на кнігу «Вежы над Дняпром»] // АГ. — 1998. — № 6. — С. 2; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Копцік Ю. (10.12.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**КОСМАЧ** ВЕНІЯМІН АРКАДЗЕВІЧ (1.10.1959, в. Талуі Маладзечанскага раёна Мінскай вобл.), педагог, гісторык. Доктар гіст. навук (1995). Скончыў гіст. факультэт БДУ (1982). Працаваў настаўнікам у Хажоўскай СШ Маладзечанскага раёна, выкладчыкам, дацэнтам, загадчыкам кафедры грамадска-гуманітарных навук у ВДМІ (1985–1998), загадчыкам кафедры тэорыі і гісторыі права, дэканам юрыдычнага факультэта Віцебскага філіяла МІПіСА, загадчыкам кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры (1998), дэканам гіст. факультэта ВДУ (2001–2009), дырэктарам Віцебскага філіяла МІПіСА (з 2009). Даследуе гісторыю знешняй культурнай палітыкі Германіі, савецка-германскія і

беларуска-германскія адносіны. Аўтар больш за 40 навуковых прац. Мае артыкулы, прысвечаныя гісторыі і культуры Віцебшчыны.

Тв.: Витебщина в 1930-е годы // Славянскі свет: Мінулае і сучаснае: матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі, Мінск, 26 сакавіка 2004 г.: у 3 ч. / МДПУ; рэдкал.: А.П. Жытко [і інш.]. — Мн., 2004. — Ч. 2. — С. 337–356; Витебск в годы оккупации (1941–1944): Страницы истории // Гісторыя: Праблемы выкладання. — 2005. — № 4. — С. 35–39; Попытка спастись. «Адаптация» коллаборационистов в первые послевоенные годы в г. Витебске // — С. 100–101.

Літ.: Космач В.А. // ЭГБ. — Т. 6. Кн. 2. — Мн., 2003. — С. 402. ; Звязаны лёсам. Космач В.А. // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебска: у 2-х кн. — Мн.: БелЭн, 2002. — Кн. 2. — С. 556.




**КОСМЫКАЎ** МІХАІЛ МІХАЙЛАВІЧ (26.07.1954, в. Хальч Веткаўскага раёна Гомельскай вобл.), краязнаўца. Скончыў СШ (1971), Гродзенскае культасветвучылішча (1975), Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт (1981). Працаваў дырэктарам СДК (1975–1976), настаўнікам гісторыі (1981–1982), загадчыкам аддзела пісьмаў (1982–1989), настаўнікам гісторыі СШ № 2 г.п. Лёзна (1989–2001). З’яўляўся старшынёй Лёзненскай Рады ТБМ.

З пераездам на Лёзненшчыну актыўна вывучаў яе гісторыю і культуру. Свой вопыт выклаў у брашуры «Хвала Бацькаўшчыне». У ёй змясціў праграмы курсаў па выбары па гісторыі Беларусі, а таксама праграму факультатыва па гісторыі краю, разлічаную на 3 гады, 34 гадзіны на год. Выклікае цікавасць краязнаўчая віктарына па гістарычнай спадчыне Лёзненшчыны і метадычныя распрацоўкі ўрокаў. Аўтар артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку, а таксама ў бюлетэнях грамадскіх аб’яднанняў («Спадчына»).

Тв.: Хвала Бацькаўшчыне. З вопыту педагагічнай творчасці: [саматуж. выд.]. — Віцебск, 2001. — 55 с.; Развітальнае слова пра паэта // Спадчына (Л). — 2001. — № 2 (5). — С. 2; Скарбы нашай зямлі // Спадчына (Л). — 2001. — № 2 (5). — С. 4.

Літ.: Бандарэнка У. Знаходкі з-пад Альховіка, ці Урок гісторыі, які запомніцца надоўга // СП (Л). — 1999. — 26 студз. — С. 3.

**КРАЕЎСКІ** УЛАДЗІМІР ЗАХАРАВІЧ (1.03.1954), мастак. Скончыў БПІ (1976). Вывучае архітэктуру гарадоў Беларусі. Стварыў серыю карцін, на якіх адлюстраваў помнікі архітэктуры XIX – сяр. XX ст. г. Віцебска (касцёл Св. Антонія, ратушу, забудову старога горада). Карціны выклікаюць асаблівую цікавасць па прычыне таго, што шэраг помнікаў не дайшлі да нашага часу. Творчасць мастака спрыяе прапагандзе ведаў пра помнікі гісторыі і культуры горада, фарміраванню грамадзянскіх якасцяў, любові да роднага месца.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Краеўскі В.З. (16.07.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**КРАСКО** ВОЛЬГА ДАВЫДАЎНА (8.09.1958, г. Полацк), краязнаўца, музейны работнік. Скончыла гіст. факультэт БДУ, Інстытут праблем культуры. Працавала ў Полацкім краязнаўчым музеі (1986–2007), у тым ліку дырэктарам (1995–2007). Брала ўдзел у стварэнні экспазіцыі ПКМ. Адзін з арганізатараў правядзення канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю Полацкага краязнаўчага музея (2008) укладальнік зборніка матэрыялаў канферэнцыі. Аўтар артыкулаў у кнізе «Памяць» г. Полацка, навуковым і перыядычным друку.

Тв.: Заводы і фабрыкі Полацка ў 1-м дзесяцігоддзі 20 ст. // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Полацка. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 239–240; Дробнарамесніцкая вытворчасць у 1920-я гады ў Полацку // Тамсама. — С. 362–363; Праблемы паказу і інтэрпрэтацыі савецкай гісторыі ў экспазіцыі краязнаўчага музея // Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі. Да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея / уклад. В.Д. Краско. — Полацк: НПГКМЗ, 2008. — С. 117–123.

Артыкулы ў перыядычным друку: Настаўнік героя: [К.М. Кавецкі — настаўнік У.М. Азіна] // СК. — 1986. — № 157. — С. 3; Што мы ведаем пра Скарыну… // СК. — 1990. — № 133. — С. 2; Што мы ведаем пра Скарыну // ВР. — 1990. — № 156. — С. 4; З гісторыі чыгункі // ПВ. — 1996. — № 101. — С. 4; Слова пра музей: [ПКМ — 70 год] // ПВ. — 1996. — № 104. — С. 2; «Рэабілітаваны пасмяротна» // ПВ. — 1998. — № 74. — С. 3.

Літ.: Усовская О. Потенциал у нас огромный: [ПКМ, В. Краско] // ИП. — 2001. — № 18. — С. 2; Трапезникова Л. По ступеням судьбы Ольги Краско // ПВ. — 2006. — № 24. — С. 3.

**КРАСНОВА** АЛІНА КАНСТАНЦІНАЎНА (16.03.1941, в. Шпакі Дзісненскага раёна Полацкай вобл. (цяпер Міёрскі раён Віцебскай вобл.)), педагог, краязнаўца. Скончыла філал. факультэт Даўгаўпілскага педагагічнага інстытута (1973). Працавала настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў Дзісненскай СШ (1962–1979), настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Ветрынскай СШ Полацкага раёна (1979–2004), загадчыцай народнага комплекснага Музея Б. Эпімаха-Шыпілы ў СШ в. Ветрына (1988–2006).

Краязнаўчую дзейнасць распачала з сяр. 1980-х гадоў. Адна са стваральнікаў музея «Беларуская хатка» (1988), Музея Б.І. Эпімаха-Шыпілы (1998) у Ветрынскай СШ. Вялікі ўплыў на станаўленне як краязнаўцы аказаў Куржалаў А.В. Даследуе жыццё славутых землякоў, літаратурныя традыцыі і этнаграфічную спадчыну рэгіёна пражывання. Распрацоўвае тэмы «Гісторыя славутага роду Эпімахаў-Шыпілаў», «Народныя святы Ветрыншчыны», «Свята рушніка», «Беларуская рукапісная хрэстыматыя Б.І. Эпімах-Шыпілы».

Брала ўдзел у Першых навуковых Шыпілаўскіх чытаннях (1999), навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 90-годдзю ВВАК (Віцебск, 1999), навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 145-гадавіне Б. Эпімах-Шыпілы (2004). Падтрымлівае кантакты з Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва, Літаратурным дзяржаўным музеем Я. Купалы, Інстытутам літаратуры імя Я. Купалы НАН Беларусі, БелНДІДАС, ННАЦ імя Ф. Скарыны, ВАКМ, НПГКМЗ.

Аўтар шэрагу артыкулаў у навуковым і перыядычным друку («Настаўніцкая газета», «Полацкі веснік»). З'яўляецца ўкладальнікам кнігі «Б.І. Эпімах-Шыпіла і яго час» (2004).

Выдатнік асветы РБ (1999), узнагароджана граматамі Міністэрства адукацыі БССР і РБ (1985, 1999).

Тв.: Кнігі: Б.І. Эпімах-Шыпіла і яго час. — 2004.

Артыкулы ў навуковым друку: Пошукава-даследчая работа музея Браніслава Эпімаха-Шыпілы // 90 гадоў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі: матэрыялы навуковай канферэнцыі, 24 лістапада 1999 г., Віцебск. — Мн.: БелНДІДАС, 2000. — С. 75–80; Сядзіба Двор-Залессе Полацкае // Матэрыялы міжнародных навуковых чытаннях «На шляхах да ўзаемаразумення».

Артыкулы ў перыядычным друку: Памяць жыве і сёння // ПВ. — 1998. — 10 сак. — С. 3; Ушанаваць памяць земляка: [Б. Эпімах-Шыпіла] // ПВ. — 1999. — № 5. — С. 1; Успамінаюць нашчадкі // ПВ. — 1999. — № 57. — С. 2; Асветнік і выдавец: [Б. Эпімах-Шыпіла] // ПВ. — 2004. — № 70. — С. 3; Сядзіба Двор-Залессе Полацкае // ПВ. — 2004. — № 105. — С. 7; Выдавец і прапагандыст беларускай кнігі // ПВ. — 2004. — № 120–121. — С. 7.

Літ.: Малашэня Л. Ветрына // НС. — 2004. — № 126. — С. 5; Інтэрв'ю А.К. Красновай (29.11.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**КРАЎЗЭ** КАЗІМІР (Krauze Kazimierz), мемуарыст. У гады Другой сусветнай вайны быў удзельнікам 24-й партыз. брыгады Віленскай акругі АК. Аўтар кнігі «Апошні рапарт», выдадзенай у серыі «Wileński przekaz» (№ 14). Кніга складаецца з уступнага слова ад рэдакцыі, слова аўтара, 10 раздзелаў, спісу прозвішчаў і псеўданімаў, памяткі. У раздзелах падаюцца звесткі пра дзейнасць 23-й партызанскай брыгады «Браслаў», 24-й брыгады «Дрысвяты», 23–26-га дыверсійных аддзелаў, Саюза ўзброенай барацьбы Арміі краёвай раёна Браслаў «Язь». Утрымлівае значную колькасць матэрыялаў, прысвечаных Браслаўшчыне. Інфармацыя выкарыстана Ю. Чэканам у кнізе «Гісторыя Браслаўскага павету ў XX стагоддзі».

Тв.: Ostatni raport. — Wileński przekaz. — № 14.

Літ.: Czekan J. Historia powiatu Brasławskiego XX stulecia. — Kęterzyn: GriF, 2001. — S. 2.

**КРАГЕЛЬ** ТАДЭВУШ (Tadeusz Krahel), святар. Аўтар кніг «400 гадоў касцёлу ў Новым Пагосце. 1593–1993» (Беласток, 1993), «Мучанікі з Беразвечча» (1998), «Бласлаўлёны ксёндз Станіслаў Пырэк» (Улацлавэк, 2001). У кнігах падаецца канфесійная гісторыя Браслаўшчыны, Глыбоччыны з XVI па XX ст., лёсы ксяндзоў, якія прынялі пакутніцкую смерць у гады Другой сусветнай вайны ў Беразвеччы: М. Багаткевіча, У. Мацковяка, С. Пыртэка.

Тв.: 400 lat kościoła w Nowym Pohoście, 1593–1993. Z dziejów kościola i parafii. — Białostok, 1993. — 40 s.; Męnczennicy z Berezwecza. — Białostok, 1998. — 73 s.; Błagosławiony Księndz Stanisław Pyrtek // Męczennicy, 1939–1945. Zsz. 3. — Włocławek: wydawnictwo Duszepastyrstwa Rolników, 2001.



**КРАЧКОЎСКІ** АНАТОЛЬ ВЯЧАСЛАВАВІЧ (*А. Новік, Вячэслін, А. Касцюковіч*) (6.04.1949, в. Круляўшчызна Докшыцкага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца, журналіст. Скончыў філал. факультэт БДУ (1975). Служыў ва УС СССР (1968–1970). Працаваў слесарам-іструментальшчыкам у БМУ-6, інструктарам, лектарам, загадчыкам сектара партыйнага ўліку Шумілінскага райкама КПБ, загадчыкам аддзела пісьмаў шумілінскай раённай газеты «Герой працы», дырэктарам Бешанковіцкага гісторыка-краязнаўчага музея, у рэдакцыі газеты «Зара» Бешанковіцкага раёна (з 1990 г. карэспандэнтам, загадчыкам сельгасаддзела, адказным рэдактарам). Цяпер працуе навуковым супрацоўнікам у Бешанковіцкім раённым краязнаўчым музеі. Член Саюза журналістаў Беларусі (1991).

Даследуе гістарычнае мінулае Бешанковіцкага раёна (археалогію, этнаграфію), жыццё і дзейнасць знакамітых землякоў, выдатных людзей блізкага і далёкага замежжа, звязаных розным чынам з Бешанковіцкім краем. Вывучаць гісторыю і культуру роднага краю пачаў у краязнаўчым гуртку Круляўшчызненскай СШ Докшыцкага раёна (1965). Значны ўплыў на фармаванне зацікаўленасці аказаў настаўнік гэтай школы А.У. Чарнаруцкі. У складзе гуртка ўдзельнічаў у паходах па родным краі.

Першы дырэктар Бешанковіцкага раённага гісторыка-краязнаўчага музея (1981–1989). Узначальваў працу па яго стварэнні. У якасці кіраўніка музея непасрэдна ўдзельнічаў у зборы экспанатаў і стварэнні экспазіцый. З гэтай мэтай працаваў і падтрымліваў адносіны з Цэнтральным дзяржаўным ваенна-гістарычным архівам СССР, Цэнтральным дзяржаўным архівам Савецкай Арміі, Цэнтральным Дзяржаўным архівам народнай гаспадаркі СССР, ЦДГА ВМФ СССР, Цэнтральным ваенна-марскім архівам МА СССР, Цэнтральным дзяржаўным архівам старажытных актаў СССР, Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архівам СССР (Ленінград), Цэнтральным архівам МА СССР, Цэнтральным музеем УС СССР, Галоўным упраўленнем кадраў МА СССР, НГАБ, ДАВВ, ДАМВ, занальнымі архівамі ў гарадах Глыбокім, Оршы, Полацку, Вільнюскім дзяржаўным архівам, Нацыянальнай бібліятэкай РБ, публічнай бібліятэкай імя М.Я. Салтыкова-Шчадрына (г. Санкт-Пецярбург), ВАБ. Стварыў краязнаўчы музей у Рубежскай сярэдняй школе Бешанковіцкага раёна (1989).

За час працы ў музеі сабраў значную колькасць матэрыялаў. Пры падтрымцы выдавецтва «Полымя» выдаў кнігу «Край наш Наддзвінскі» (1990), а пасля прапанаваў раённаму кіраўніцтву стварыць кнігу «Памяць». Паабяцаў, што калі дадуць пяць сакратарак-машыністак, то падрыхтуе рукапіс за палову года. Па асабістым распараджэнні першага сакратара райкама КПБ для гэтай працы было сабрана 10 работнікаў, і рукапіс быў падрыхтаваны за тры месяцы. Значная колькасць матэрыялаў не ўвайшла ў выданне, але яны сталі асновай іншых кніг: «Светлы бешанковіцкі куток» (2001), «…Біліся як ільвы. Да 190-годдзя бітвы пад Астроўна», «Акрыленыя. З гісторыі аднаго авіяпалка» (гісторыя 132-га дальнебамбардзіровачнага палка, які размяшчаўся ў Бешанковічах і Уле), «Бачэйкава», «Залатая Зорка Міхаіла Ткачэнкі», «Бешанковічы. Гісторыка-эканамічны нарыс», «Ула. У сутоцы дзвюх рэк», «Астроўна. Мястэчка на беразе возера», «Акадэмік жывапісу з Улы» (акрамя першай — падрыхтаваны і выданы саматужна) і інш.









Асаблівую ўвагу выклікае «Энцыклапедычны даведнік Бешанковіцкага раёна», праца над якім працягвалася трыццаць гадоў. Па алфавітным прынцыпе змяшчаюцца артыкулы, прысвечаныя тапаніміцы, населеным пунктам, персаналіям, гістарычным падзеям, эканоміцы, геаграфіі, прыродзе Прыдзвінскага краю ў межах сучаснага раёна. У падрыхтаваную «Ваенную энцыклапедыю Бешанковіцкага раёна» ўваходзяць артыкулы пра падзеі ваеннай гісторыі ў краі, а таксама пра землякоў, якія ўдзельнічалі ў Крымскай, Першай сусветнай, савецка-фінскай, Вялікай Айчыннай войнах. Змяшчаюцца матэрыялы пра кавалераў двух і болей ордэнаў і медалёў «За адвагу» ці «За баявыя заслугі». Сярод інш. ненадрукаваных, але падрыхтаваных да выдання прац прыгадаем: «Зямля пад чорнымі крыламі» (Бешанковіцкі раён у гады Вялікай Айчыннай вайны), «Храналогія гісторыі Бешанковіцкага раёна», «Гонар і слава Прыдзвіння», «Гісторыя Бешанковіцкага раёна», «Людзі вёскі прыдзвінскай», «Цяжкія гады станаўлення» (гісторыя раёна).




Аўтар некалькіх соцень артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку (бюлетэні «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», часопісе «Нёман», газетах «Звязда», «Советская Белоруссия», «Чырвоная змена», «Знамя Юности», «Веснік Глыбоччыны», «Голас Сенненшчыны», «Кліч Радзімы», «Лепельскі край» і ў бешанковіцкай раённай газеце «Зара»).




Узнагароджаны медалём «За воінскую доблесць. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І. Леніна», настольным медалём «2000-годдзя прыняцця хрысціянства».

Тв.: Кнігі: Край наш Наддзвінскі. — Мн.: Полымя, 1990. — 80 с.; Гісторыка-дакументальная хроніка «Памяць». Бешанковіцкі раён. — Мн.: БелСЭ, 1991. — 423 с.; Светлы бешанковіцкі куток. — Віцебск, 2001. — 152 с.; «…Біліся як ільвы». Да 190-годдзя бітвы пад Астроўна: [саматуж. выд.]. — Бешанковічы, 2002. — 47 с.; Пакуль б'ецца сэрца ў грудзях: [саматуж. выд.]. — Бешанковічы, 2003. — 84 с.; Акрыленыя. З гісторыі аднаго авіяпалка: [саматуж. выд.]. — Бешанковічы, 2004. — 140 с.; Бачэйкава: гісторыка-эканамічны нарыс. — Бешанковічы, 2005. — 99 с.; Да 100-годдзя з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза Л. М. Даватара: [саматуж. выд.]. — Бешанковічы, 2005. — 123 с.; Залатая Зорка Міхаіла Ткачэнкі: [саматуж. выд.]. — Бешанковічы, 2005. — 101 с.; Бешанковічы: гісторыка-эканамічны нарыс: [саматуж. выд.]. — Бешанковічы, 2008. — 120 с.; Ула. У сутоцы дзвюх рэк: [саматуж. выд.]. — Бешанковічы. — 253 с.; (разам з І.В. Ганчаровым) Астроўна. Мястэчка на беразе возера: [саматуж. выд.]. — Бешанковічы, 2009. — 280 с.; Акадэмік жывапісу з Улы. Іван Фаміч Хруцкі: [саматуж. выд.]. — Бешанковічы, 2009. — 100 с.

Артыкулы ў навуковым друку і кнігах «Памяць»: (разам з В.Л. Насевічам) Старонкі мінулага // Гісторыка-дакументальная хроніка «Памяць». Бешанковіцкі раён. — Мн.: БелСЭ, 1991. — С. 17–28; Пётр І, Бешанковічы і падзеі Паўночнай вайны // Тамсама. — С. 38–40; Дзекабрысты і Наддзвінне // Тамсама. — С. 40–42; Бешанковіцкія кірмашы // ПГіКБ. — 1989. — № 1. — С. 22–24; За зямлю, за волю // Тамсама. — С. 45–50; За ўладу Саветаў // Тамсама. — С. 66–71; Рэвалюцыяй мабілізаваны: [Л. Грынвальд-Муха] // Тамсама. — С. 81–83; Качагар з «Аўроры»: [А.М. Лазараў] // Тамсама. — С. 83; Шлях бальшавіка // Тамсама. — С. 84; Боцман з крэйсера «Расія» // Тамсама. — С. 84–85; З гісторыі камсамольскага руху // Тамсама. — С. 102–104; Удзельнік Чалюскінскай эпапеі // Тамсама. — С. 105–106; Вайна свяшчэнная // Тамсама. — С. 111–120; У мірнай працы // Тамсама. — С. 382–388; Бешанковіцкі гісторыка-краязнаўчы музей // Тамсама. — С. 420–421; Застарынскі Сусанін // Шчырая споведзь радка. — Віцебск: ВАБ, 2003. — С. 66–72; Знакамітасці ў Бешанковічах // Тамсама. — С. 72–76; Паслядоўнікі клятвы Гіпакрата // Тамсама. — С. 76–80; Кампазітар, паэт, мецэнат // Тамсама. — С. 83–85; Памяткі Сапегаў у Бешанковіцкім раёне // Вялікі канцлер Вялікага княства. Да 450-годдзя з дня нараджэння Льва Сапегі: зб. матэрыялаў І Міжнародных Сапежанскіх чытанняў, 3–4 снежня, Брэст, ІІ і ІІІ Рэспубліканскіх Сапежанскіх чытанняў у Віцебску, 28–29 чэрвеня 2003 г., Астроўна 28–29 кастрычніка 2006 г.; склад., рэд. Г.М. Праневіч. — Мн.: І.П. Логвінаў, 2007. — С. 137–142; Гісторыя Бешанковічаў // Нёман. — 2009. — № 9.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Гарадзішчы, селішчы, курганы // Зара. — 1984. — 14 ліп. — С. 2; Мястэчка бунтаўшчыкоў // Зара. — 1984. — 20 кастр. — С. 2; З кагорты бальшавікоў // Зара. — 1985. — 26 верас. — С. 2; Соржыцкі бунт // Зара. — 1985. — 12 ліст. — С. 2; Жыве памяць пра земляка: [А.І. Берасцень] // ВР. — 1985. — № 178. — С. 4; Рабочы рух у Прыдзвінні // Зара. — 1986. — 18 студз. — С. 2; Яны жывуць на вуліцах герояў // Зара. — 1986. — 9 мая. — С. 2; Да бешанковіцкіх рамеснікаў // ВР. — 1986. — 28 кастр. — С. 2; Нашы знакамітыя землякі. «З Прыдзвіння да Балтыкі» // Зара. — 1986. — 6 ліст. — С. 4; Багатая спадчына: [І. Хруцкі] // ЛС. — 1986. — № 107. — С. 4; З гісторыі Ульскай крэпасці // ВР. — 1986. — № 69. — С. 4; Замкі Лепельшчыны // ЛС. — 1986. — № 137. — С. 4; Так зараджаліся школы: [развіццё народнай адукацыі на Шумілiншчыне] // ГП. — 1986. — № 111. — С. 3; З Прыдзвіння да Балтыкі: Асташкевіч С.Н. // ЛС. — 1987. — № 70. — С. 2; Пасля вызвалення // ЛС. — 1987. — № 122. — С. 2; Рэвалюцыяй

мабілізаваны: [Л.В. Грынвальд-Муха] // ЛС. — 1987. — № 131. — С. 3; Качагар легендарнай «Аўроры» // Зара. — 1987. — 3 кастр. — С. 2; Рэўкомы Прыдзвіння // Зара. — 1987. — 20 кастр. — С. 2; З пакалення карчагінцаў // Зара. — 1987. — 29 кастр. — С. 2; Удзельнікі гераічнай Чалюскінскай эпапеі // Зара. — 1987. — 3 ліст. — С. 2; Боцман з «Расіі» // Зара. — 1987. — 19 ліст. — С. 2; Баявы васемнаццаты год // ГП. — 1987. — № 113. — С. 2; З кагорты змагароў: [І.А. Мяніцкі] // ВР. — 1987. — № 189. — С. 4; З Прыдзвіння да Балтыкі: [маракі з «Аўроры» — віцябляне] // ВР. — 1987. — № 220. — С. 4; Абараняючы Бешанковічы // Зара. — 1988. — 23 лют. — С. 2; Без мінулага няма будучыні // Зара. — 1988. — 31 сак. — С. 2, 3; На варце свяшчэннага агню памяці // Зара. — 1988. — 3 крас. — С. 2, 3; З вытокаў рэвалюцыйнай традыцыі // Зара. — 1988. — 1 мая. — С. 2, 3; Наш святы абавязак // Зара. — 1988. — 3 мая. — С. 3; Буравеснікі калгаснага жыцця // Зара. — 1988. — 21 мая. — С. 2; Народжаны рэвалюцыяй // Зара. — 1988. — 28 мая. — С. 2, 3; Новыя старонкі гісторыі // Зара. — 1988. — 23 мая. — С. 2, 3; Вызваленне // Зара. — 1988. — 25 чэрв. — С. 2, 3; За Савецкую Беларусь // Зара. — 1988. — 19 ліп. — С. 2, 3; Шануючы памяць землякоў // Зара. — 1988. — 30 ліп. — С. 2; Так нараджаліся на Прыдзвінні школы // Зара. — 1988. — 2 жніўня. — С. 2; На пачатку станаўлення // Зара. — 1988. — 11 кастр. — С. 2, 3; Па ўласным хаценні // Зара. — 1988. — 13 снеж. — С. 2; «Мы ляталі ў небе адным…» // Зара. — 1988. — 17 снеж. — С. 2; Захаваць старадаўнія паркі // ВР. — 1988. — № 80. — С. 4; З Прыдзвіння да Балтыкі: [А.М. Лазараў] // ЛІ. — 1988. — № 106. — С. 2; Палымяны бальшавік: [В.З. Жыгуноў] // ЛІ. — 1988. — № 119. — С. 2; Першыя крокі савецкай ўлады // ЛІ. — 1988. — № 124. — С. 2; Павятовы выканкам дзейнічае // ЛІ. — 1988. — № 124. — С. 2; Удзельнік велічных падзей: [Ф.Ц. Ласякін] // ЛІ. — 1988. — № 147. — С. 2; Бешанковіцкі парк // Зара. — 1989. — 28 студз. — С. 2; З дывізіі Васіля Блюхера // Зара. — 1989. — 23 сак. — С. 2; Кавалер залатой зоркі // Зара. — 1989. — 26 чэрв. — С. 2, 3; (разам з А. Ярохіным) Пакуль б'ецца сэрца ў грудзях… // Зара. — 1989. — 8 ліп. — С. 2, 3; Пётр і Бешанковічы. Старонкі гісторыі // Зара. — 1989. — 14 верас. — С. 2, 3; Дзекабрысты і Наддзвінне. Старонкі гісторыі // Зара. — 1989. — 16 верас. — С. 2, 3; Шляхі вялі праз Бешанковічы // Зара. — 1989. — 3 кастр. — С. 2, 3; З мінулага Бачэйкава // Зара. — 1989. — 5 кастр. — С. 2, 3; Удзельнік Мінскага падполля // Зара. — 1989. — 7 ліст. — С. 2; Памяць. Бешанковіцкі раён // Зара. — 1990. — 1 сак. — С. 2–3; Ула ў мінулым // Зара. — 1990. — 20 сак. — С. 2, 3; Подзвіг Сцяпана Гаршкова // ЛТ. — 1990. — № 51. — С. 3, 4; (разам з А. Чарнаруцкім) Край Крулеўшчынскі // ЛТ. — 1990. — № 65–71; Круляўшчызна ці Сеславіна? // ЛТ. — 1990. — № 103. — С. 2, 4; (разам з А. Чарнаруцкім) Экіпаж крылатай машыны // ЛТ. — 1990. — № 100, 103, 106; Салдацкая слава // Зара. — 1990. — 16 чэрв. — С. 2; Вазьмі творчасць у паплечнікі // Зара. — 1990. — 19 чэрв. — С. 2; Разведчык над Улай // Зара. — 1990; Засталася спадчына // Зара. — 1990. — 25, 28 жніўня; Мястэчка Бешанковічы // Зара. — 1990. — 25 верас. — С. 2; Плытагоны // Зара. — 1990. — 2 кастр. — С. 2; Эх, дарогі, дарогі!. // Зара. — 1990. — 1 ліст. — С. 2; Карчма на Прыдзвінні: з этнаграфічнай спадчыны раёна // Тамсама; Дзеля дабрабыту калгаснікаў // Зара. — 1990. — 3 ліст. — С. 2; Першыя. Гісторыя калектывізацыі // Зара. — 1990. — 6 ліст. — С. 2; Пасля вызвалення // Зара. — 1990. — 10 ліст. — С. 2; А час бяжыць няўмольна // Зара. — 1990. — 13 ліст. — С. 2; Непрыкметны чалавек // Зара. — 1990. — 15 ліст. — С. 2; Цвітуць любімыя вяргіні // Зара. — 1990. — 20 ліст. — С. 2, 3; Дзве родныя мясціны, Радзіма — адна // Зара. — 1990. — 1 снеж. — С. 2, 3; Начальнік палітычнага адзела // Зара. — 1990. — 8 снеж. — С. 2; Дом з чырвонай зорачкай // Тамсама; Дыялог з… мінулым стагоддзем // Зара. — 1991. — 24 студз. — С. 2; Настаўнік, герой, патрыёт // Зара. — 1991. — 7 лют. — С. 2; Сцежкі маршала Чуйкова // Зара. — 1991. — 23 лют. — С. 2; На ўсё жыццё // Зара. — 1991. — 8 сак. — С. 2; Рэабілітаваны навекі // Зара. — 1991. — 12 сак. — С. 2; Калі баліць чужое… // Зара. — 1991. — 4 сак. — С. 2; Разам з Машэравым // Зара. — 1991. — 16 крас. — С. 2, 3; Лёсы людскія: Сям'я Карпекаў // Зара. — 1991. — 9 мая. — С. 2; Працавітая, добрая, шчырая // Зара. — 1991. — 23 мая. — С. 3; На колах усё жыццё // Зара. — 1991. — 6 чэрв. — С. 1, 2; Апошняя вышыня маёра Гайдукова // Зара. — 1991. — 13 чэрв. — С. 2; Трактарыстка з Заполля // Тамсама; Ад Тамбова да Сокарава // Зара. — 1991. — 27 чэрв. — С. 2, 3; Суровыя гады калектывізацыі // Зара. — 1991. — 16 ліп. — С. 2; Аперацыйная сястра Ніна Дарожка // Зара. — 1991. — 23 ліп. — С. 2; Родам з Пажарышча // Зара. — 1991. — 25 ліп. — С. 2, 3; Лічылі загінуўшым // Зара. — 1991. — 3 жніўня. — С. 2; Старажылы вёскі Гракава // Зара. — 1991. — 27 жніўня. — С. 2; У гады ліхалецця і станаўлення // Зара. — 1991. — 29 жніўня. — С. 3; Яе гады — яе багацце // Зара. — 1991. — 7 верас. — С. 2; Друкаваны орган жыхароў Прыдзвіння // Зара. — 1991. — 19 кастр. — С. 2; Сям'я партызанаў Сінкевічаў // Зара. — 1991. — 22 кастр. — С. 2, 3; Ветэран з вуліцы Зарэчнай // Зара. — 1991. — 2 ліст. — С. 2; На чале партыз. руху // Зара. — 1991. — 5 ліст. — С. 2; Партызанская сям'я // Зара. — 1991. — 10 снеж. — С. 2; За тое, што ёсць сярод нас // Зара. — 1991. — 28 снеж. — С. 2; Роднай зямлі карані // Зара. — 1993. — 14 студз. — С. 3; Сапёр трэцяга беларускага // Зара. — 1993. — 28 студз. — С. 3; Сын старшыні // Зара. — 1993. — 4 лют. — С. 3; У чым твая сутнасць, вул. Савецкая? // Зара. — 1993. — 8 лют. — С. 2; Гады, гады — жыцця імгненні // Зара. — 1992. — 25 лют. — С. 2; Дынастыя Калінавых // Зара. — 1993. — 3 сак. — С. 3; Помнікі спраў мінулых // Зара. — 1992. — 14 сак. — С. 3; Як ты выжыў, салдат? // Зара. — 1993. — 28 сак. — С. 2; Ад Бешанковіч да Кёнігсберга // Зара. — 1993. — 6 чэрв. — С. 2; Залатая зорка педагога // Зара. — 1993. — 27 чэрв. — С. 2; З брыгады Заслонава // Зара. — 1993. — 14 ліп. — С. 3; І на моры, і на сушы // Зара. — 1993. — 25 ліп. — С. 2; Някідкія радкі біяграфій // Зара. — 1993. — 22 жніўня. — С. 2; Незагойная рана бацькоў // Зара. — 1993. — 8 верас. — С. 2; Бабуля Агаф'я // Зара. — 1993. — 3 кастр. — С. 2; Настальгія аб мінулым // Зара. — 1992. — 4 кастр.; Масты вялі на захад // Зара. — 1993. — 24 кастр. — С. 2; Удзельнік вызвалення // Зара. — 1993. — 27 кастр. — С. 2; Аб тым, хто не здрадзіў // Зара. — 1993. — 7, 10 ліст.; Аповед пра камісара // Зара. — 1993. — 5 снеж. — С. 2; Родам са Стрыжова // Зара. — 1993. — 8 снеж. — С. 2; Дарогі камбрыга Базылевіча // Зара. — 1993. — 15 снеж. — С. 2; Жыццё пражыць — не поле перайсці // Зара. — 1993. — 29 снеж. — С. 2; Дарогамі выпрабаванняў // Зара. — 1993. — 31 снеж. — С. 2, 4; На сябе толькі разлічвае // Зара. — 1993. — 5 студз. — С. 2, 3; Крадзяжу памяці быць не павінна // Зара. — 1993. — 12 студз. — С. 2, 3; Вучоны і педагог // Зара. — 1993. — 16 студз. — С. 2; Зямля стала роднай // Зара. — 1993. — 6 лют. — С. 2; Не шкадуючы жыцця // Зара. — 1993. — 8 мая. — С. 1, 2; Жыццё не песціла // Зара. — 1993. — 1 чэрв. — С. 3; Чаканне маці // Зара. — 1993. — 26 чэрв. — С. 3; Вязень Равенсбрука // Зара. — 1993. — 31 ліп. — С. 2, 4; Вяртанне з пекла // Зара. — 1993. — 18 верас. — С. 2; Спякотным летам 41-га // Зара. — 1993. — 4 ліст. — С. 2, 4; Апаленыя крылы юнацтва // Зара. — 1993. — 6 ліст. — С. 2; Праз выпрабаванні // Зара. — 1993. — 9 ліст. — С. 3, 4; Сэрца маці // Зара. —

1994. — 6 студз. — С. 2; Праз выпрабаванні // Зара. — 1994. — 29 студз. — С. 2; Ардэнаносец з Улы // Зара. — 1994. — 26 лют. — С. 2; Журналісты Шаіркі // Зара. — 1994. — 7, 12 мая; Бэзавы куст Радзімы // Зара. — 1994. — 24 мая. — С. 3; Ваявалі ў знішчальным // Зара. — 1994. — 18, 28 чэрв.; Ахвяры мінулай вайны // Зара. — 1994. — 6 чэрв. — С. 2; Марыя і Надзея // Зара. — 1994. — 12 ліп. — С. 2, 3; Ганаровы грамадзянін // Зара. — 1994. — 1 ліст. — С. 2; Юбілей гістарычнай значнасці // Зара. — 1994. — 8 ліст.; Дачка Рэпіна ўчора, сёння і ? // ГП. — 1994. — № 51. — С. 3; Ветэран са школьнай // Зара. — 1995. — 31 студз. — С. 2; Вайны мінулай ветэран // Зара. — 1995. — 19 крас. — С. 2, 4; Абпалены вайной // Зара. — 1995. — 11 ліп. — С. 2, 4; Праз выпрабаванні // Зара. — 1995. — 31 кастр. — С. 3; Да нас вярнулася свята // Зара. — 1995. — 4 ліст. — С. 2; Праяўляў мужнасць // Зара. — 1995. — 9 снеж. — С. 2; Сейбіт разумнага, добрага, вечнага // Зара. — 1996. — 30 сак. — С. 3; Ваяваў сумленна, жыў дастойна // Зара. — 1996. — 19 крас. — С. 2, 4; След на скрыжаваннях гісторыі // Зара. — 1996. — 30 крас. — С. 3; Звязаны з Прыдзвіннем // Зара. — 1996. — 18 мая. — С. 2; Гістарычныя і памятныя месцы Бешанковіцкага раёна // Зара. — 1996. — 13, 16 ліп.; Прывілей ніякіх не мела // Зара. — 1996. — 20 жніўня. — С. 2, 3; Уладальнікі маёнтка // Зара. — 1997. — 18 студз. — 2; Паштовая сувязь на Прыдзвінні// Тамсама. — С. 2, 4; У віхуры падзей // Зара. — 1997. — 25 студз. — С. 2; Нашэсце французаў // Зара. — 1997. — 2 лют. — С. 2; Аляксандр I у Бешанковічах // Зара. — 1997. — 14 сак. — С. 2, 3; Паміж молатам і кавадлам // Зара. — 1997. — 25 сак. — С. 2; На мірнай рэйкі // Зара. — 1997. — 2 крас. — С. 2; Ва ўмовах грамадзянскай вайны // Зара. — 1997. — 22 крас. — С. 2; Ульская крэпасць // Зара. — 1997. — 2 ліп. — С. 4; Млыны Прыдзвіння // Зара. — 1997. — 2 жніўня. — С. 4; Франтавік, краязнавец // Зара. — 1997. — 30 верас. — С. 2, 3; Вера праз ўсё жыццё Франтавік, краязнавец // Зара. — 1997. — 15 ліст. — С. 2; Скарга старога дуба // Зара. — 1997. — 25 ліст. — С. 2; Доўгачаканая сустрэча // Зара. — 1998. — 6 студз. — С. 3; Як Стрыжава апярэдзіла Маскву: [в. Стрыжава] // ВР. — 1998. — № 9. — С. 5; Пасля паўстання 1863 г. // Зара. — 1998. — 24 студз. — С. 2; Храптовічы // Зара. — 1998. — 21 лют. — С. 4; Жыццё прысвяціла дзецям // Зара. — 1998. — 24 лют. — С. 2; Пад крылом — Бешанковічы // Зара. — 1998. — 8 мая. — С. 2, 4; Крывінская воласць // Зара. — 1998. — 16 мая. — С. 2, 3; Храналогія гісторыі Бешанковіч // Зара. — 1998. — 14 ліп., 17 ліст., 1 снеж.; Фролкавічы // Зара. — 1998. — 14 ліп. — С. 4; Кміта-Чарнабыльскі // Зара. — 1998. — 15 жніўня. — С. 4; Жанчына з характарам // Зара. — 1998. — 1 верас. — С. 2; Ваяваў і жыў сумленна // Тамсама. — С. 3; Праз гады і выпрабаванні // Зара. — 1998. — 29 верас., 6, 13. 20 кастр.; Воднае багацце Прыдзвіння // Зара. — 1998. — 29 верас. — С. 4; Лёс бібліятэкі Іякіма Храптовіча // Зара. — 1998. — 20 кастр. — С. 3, 4; Над горамі Афганістана // Зара. — 1998. — 10 ліст. — С. 2, 3; Радкі, што дыхаюць вайной // Зара. — 1998. — 28 ліст. — С. 2; Яго падпольная мянушка — «Кімка» // Зара. — 1998. — 8 снеж. — С. 3; Яны былі першымі // Зара. — 1999. — 26 студз. — С. 2; Заслужаныя людзі Прыдзвіння // Зара. — 1999. — 9 лют. — С. 2; Генерал зямлі астровенскай // Зара. — 1999. — 2 сак. — С. 2; Жмені сонечных промняў // Зара. — 1999. — 6 сак. — С. 2; З блакаднага Ленінграда // Зара. — 1999. — 13 сак. — С. 2; Подзвігу землякоў — жыць у вяках // Зара. — 1999. — 8 мая. — С. 2; Дзвіну фарсіравалі героі // Зара. — 1999. — 26 чэрв. — С. 2; Застарынскі Сусанін // Зара. — 1999. — 26, 29 чэрв.; Хлапчанё — камандзір // Зара. — 1999. — 13 ліп. — С. 2, 3; Заслужаны мастак Расіі з берагоў Дзвіны // Зара. — 1999. — 14 верас. — С. 2; Гняздзілаўскія ўдовы // Зара. — 1999. — 3 ліст. — С. 2; Франтавыя дарогі Міхаіла Пятрова // Зара. — 1999. — 7 снеж. — С. 3; Родам з Улы // Зара. — 2000. — 6 студз. — С. 2; Гісторыя славутых родаў Беларусі: Храптовічы // Зара. — 2000. — 29 лют. — С. 2; Акупацыя і вызваленне Бешанковіч // Зара. — 2000. — 8 крас. — С. 1, 2; Гісторыка-патрыятычны клуб «Салдацкая слава» // Зара. — 2000. — 11 крас. — С. 2; Жаночая доля // Зара. — 2000. — 13 крас. — С. 2; Агінскія // Зара. — 2000. — 13 мая. — С. 2, 4; Сапегі // Зара. — 2000. — 13, 27 чэрв.; Яны штурмавалі Ульскую крэпасць // Зара. — 2000. — 1 ліп. — С. 2; Цеханавецкія // Зара. — 2000. — 11, 25 ліп.; Вельмі валявая жанчына // Зара. — 2000. — 1 жніўня. — С. 3; Палёт ў бяссмерце // Зара. — 2000. — 5 жніўня. — С. 2; Лукомскія // Зара. — 2000. — 8 жніўня. — С. 2; Лёс Якава — сына Сталіна // Зара. — 2000. — 12 верас. — С. 2; Зямляк вярнуўся на Радзіму // Зара. — 2000. — 26 верас. — С. 2; Ваяваў не дзеля славы // Зара. — 2000. — 17 кастр. — С. 2; Памяць — паняцце рэальнае // Тамсама. — С. 2, 4; Гісторыя адной сям'і // Зара. — 2000. — 24 кастр. — С. 3; Акрыленыя // Зара. — 2000. — 14 ліст. — С. 2; Збіральніцтва // Зара. — 2000. — 18 ліст. — С. 2; На шляху да рэйхстага // Зара. — 2000. — 19 снеж. — С. 3; Смалакуры: З гісторыі смалакурняў Бешанковіцкага раёна // Зара. — 2001. — 6 студз. — С. 2; Бортнікі: З гісторыі пчалярства // Тамсама; Млыны // Тамсама; Следавікі, каменныя крыжы // Тамсама; Бешанковіцкі край вачамі вучоных // Зара. — 2001. — 3 сак. — С. 2; Гарбарства // Тамсама; Клады манет // Тамсама; Babровыя гоны // Тамсама; Бярэзінская водная сістэма // Тамсама; Жанчына года Віцебшчыны: Галоўны ўрач Бачэйкаўскай участковай бальніцы Марына Васільеўна Папко // Зара. — 2001. — 24 сак. — С. 2; Бешанковіцкі прычал палкоўніка Барышава // Зара. — 2001. — 31 сак. — С. 2; Яны былі першымі // Зара. — 2001. — 21 крас. — С. 2; Снайпер Фёдар Ахлапкоў // Зара. — 2001. — 8 мая. — С. 2; Калісьці славуты шлях: р. Заходняя Дзвіна // Зара. — 2001. — 26 мая. — С. 2; Адважны камісар: Іван Фёдаравіч Каранеўскі // Зара. — 2001. — 12 чэрв. — С. 2; Да апошняга патрона // Зара. — 2001. — 12 чэрв. — С. 2; Валюшнае рамяство // Зара. — 2001. — 26 чэрв. — С. 2; Генерал — навуковец // Тамсама; Бондарства // Тамсама; У раёне — друкаваная газета: «Зары» — 70 // Зара. — 2001. — 10 ліп. — С. 2; Лёс Бачэйкаўскага палаца // Тамсама. — С. 3, 4; Віцебскія паўстанцкія атрады 1863–1864 гг. // Тамсама. — С. 2; Краязнаўчая газета: [«Витебские губернские ведомости», 1838–1918] // Тамсама. — 7 жніўня. — С. 2; Прыцягненне зямлі: Іван Цімафеевіч Бабаедаў // Зара. — 2001. — 21 жніўня. — С. 2, 3; Хата вокнамі ў сад. Да 70-годдзя газеты «Зара» // Тамсама. — С. 2; Майстры кавальскай справы: З гісторыі кавальства ў Бешанковічах // Зара. — 2001. — 25 жніўня. — С. 2; Віцебская архіўная камісія // Тамсама. — С. 2; Подзвіг афіцэра // Зара. — 2001. — 2 кастр. — С. 2; Герой бітвы ля Астроўна: Пётр Пятровіч Канаўніцын (1788–1822) // Тамсама; Ткалі жанчыны палатно // Зара. — 2001. — 10 ліп. — С. 2; Гандлёвыя плошчы // Зара. — 2001. — 28 жніўня. — С. 2; Героі бітвы ля Астроўна // Зара. — 2001. — 2 кастр. — С. 2; На крутым пераломе // Зара. — 2001. — 9 кастр. — С. 4; Удзельнікі кастрычніцкіх падзей: Ураджэнцы Бешанковіцкага раёна // Зара. — 2001. — 23 кастр. — С. 3, 4; Рамёствы дрэваапрацоўкі // Тамсама. — С. 3; Шлях камбата: Герой Савецкага Саюза Міхаіл Еўстахавіч Валошын // Зара. — 2001. — 3 ліст. — С. 2; Ратавалі зямлю ад снарадаў // Зара. — 2001; Трагедыя ульскіх яўрэяў: Ткалі жанчыны палатно // Зара. — 2002. — 5 студз. — С. 2; Садавод-аматар Язэп Мароз // Зара. — 2002. — 5 лют. — С. 3–4; Людзі на балоце: Жыхары в. Кудзяны // Зара. — 2002. — 9 крас. — С. 2; З роду

старая даведка // ДнП. — 1997. — № 7. — С. 2; Пра такіх складалі песні: [І. Меяровіч] // ДнП. — 1997. — № 19. — С. 2; На брацкіх магілах не ставяць крыжоў: [С.К. Трапкоў] // ДнП. — 1997. — № 37. — С. 2; Юнак з легенды: [рэцэнзія на кнігу «Юнак з легенды»] // ДнП. — 1997. — № 40. — С. 2; Так здабывалася слава: [К. Рубіцель] // ДнП. — 1997. — № 47. — С. 2; Вахта Памяці не канчаецца // ДнП. — 1997. — № 52. — С. 2; У сэрцах, памяці, назвах // Тамсама; У душы і гонар і боль // Тамсама; Праваслаўныя хіліліся да Масквы // ДнП. — 1997. — № 63. — С. 3; Два стагоддзі назад // Тамсама; Гісторыі ход неабарачальны: [1905] // ДнП. — 1997. — № 74. — С. 2; Салдаты рэвалюцыі // ДнП. — 1997. — № 87. — С. 2; Марэя ў гісторыі стагоддзяў: [рака ў Дубровенскім раёне] // ДнП. — 1997. — № 89. — С. 2; Наватар пчаляр-аматар: [Рэйнгольд] // Тамсама; Подзвіг Марыі Акцябрскай // ДнП. — 1997. — № 96. — С. 2; Край родны праславілі словам: [Аршаншчына літаратурная] // АГ. — 1997. — № 38, 42, 45, 51–52, 56; Вогненныя вёрсты // ДнП. — 1998. — № 2. — С. 2; Ішоў васемнаццаты год // ДнП. — 1998. — № 20. — С. 2; Служылі ў авіяцыі // ДнП. — 1998. — № 48. — С. 2; Апора дыктатуры: [камбеды] // ДнП. — 1998. — № 53. — С. 2; Фронт у тыле ворага // ДнП. — 1998. — № 64. — С. 2; Выпрабаванне часам: [калектывізацыя на Дубровеншчыне] // ДнП. — 1998. — № 68. — С. 2; У Смаленскім княстве // Тамсама; Плямы сырасці на экспанатах // ДнП. — 1998. — 28 ліст. — С. 2; Апраўданняў няма: Рэпрэсіі на Дубровеншчыне // ДП. — 1998. — № 77. — С. 2; З гісторыі назвы калгасу: [«40 год Кастрычніку»] // ДнП. — 1998. — № 87. — С. 2; Крывавы лістапад: [1943 г. на Дубровеншчыне] // Тамсама; Праз процітанкавыя равы і мінныя палі // ДнП. — 1998. — № 99. — С. 2; Зорка над балотам: [будаўніцтва БелДРЭС] // ДнП. — 1999. — № 2. — С. 2; Зямля нашых продкаў: [гісторыка-культурныя каштоўнасці Дубровеншчыны] // ДнП. — 1999. — № 11. — С. 2; Будні ваенных медыкаў // ДнП. — 1999. — № 14. — С. 2; Сокі роднай зямлі: [М.В. Чумакоў] // ДнП. — 1999. — № 32. — С. 2; Сузор'е герояў: [Героі Савецкага Саюза – дубровенцы] // ДнП. — 1999. — № 35. — С. 2; Шляхі-дарогі // Тамсама; Подых рэвалюцыі: [1914–1918] // ДнП. — 1999. — № 38. — С. 2; Ініцыятыву трэба падтрымаць: [А. Усаў] // ДнП. — 1999. — № 40. — С. 2; Наспявала навальніца: [1944] // ДнП. — 1999. — № 44. — С. 2; У адным партыз. палку // ДнП. — 1999. — № 45. — С. 2, 3; Суровая праўда вайны ў пісьмах франтавікоў // ДнП. — 1999. — № 66. — С. 2; Жывыя і мёртвыя: [1944] // ДнП. — 1999. — № 94. — С. 1, 3; Каб нікому крыўдна не было: [пазіцыя адносна стану бел. мовы] // ДнП. — 2000. — № 13. — С. 2; Рахунак Пятра Кузьмянкова // ДнП. — 2000. — № 27. — С. 2; Імгненне і вечнасць: [С.А. Каваленка] // ДнП. — 2000. — № 31. — С. 1, 2; Сівыя дзеці вайны // ДнП. — 2000. — № 37. — С. 2; Іх імёны звязаны з Лядамі // ДнП. — 2000. — № 42. — С. 2; Пажоўклыя ліcткі напамінаюць // Тамсама; Першае мірнае паўгоддзе // ДнП. — 2000. — № 60. — С. 2; Каб былі хлеб і песні: [клубы на Дубровеншчыне] // Тамсама; Цаной жыцця: [Героі Савецкага Саюза на Дубровеншчыне] // ДнП. — 2000. — № 71. — С. 2; Па старой смаленскай дарозе: [гіст. асобы на Дубровенчышне] // Тамсама; Верны сын Айчыны: [Я. Салаў] // ДнП. — 2000. — № 75. — С. 2; Вогненныя вёрсты // ДнП. — 2000. — № 83. — С. 2; Краявіды Дубровеншчыны ў палотнах мастакоў // ДнП. — 2000. — № 96. — С. 2; Незабыўныя вехі: [калектывізацыя на Дубровеншчыне] // ДнП. — 2001. — № 1. — С. 2; Памятаем і ганарымся: [славутыя роды Дубровеншчыны] // ДнП. — 2001. — № 6. — С. 2; Подзвігу заставацца ў страі: [рэц. на кнігу Б.Ф. Шалухі] // ДнП. — 2001. — № 16. — С. 2; Пра вучняў і настаўнікаў адной школы: [в. Асінторф] // ДнП. — 2001. — № 36. — С. 2; З першых дзён акупацыі // ДнП. — 2001. — № 40. — С. 2–3; Поплеч з аршанскімі падпольшчыкамі // ДнП. — 2001. — № 56. — С. 2; Арыентыр у моры публікацый: [рэц. дыпломнай работы Дударавай Л. «Дубровенскі край у раённай газеце "ДнП"»] // ДнП. — 2001. — № 58. — С. 2; Трактарысты // ДнП. — 2001. — № 75. — С. 2; Барацьба нарастала: [1941] // Тамсама; Глыбокія карані: [В.Ф. Праскураў] // Тамсама; Так выхоўваўся патрыятызм // ДнП. — 2001. — № 89. — С. 2; Суровыя будні // Тамсама; Узнімаліся юныя, адважныя // ДнП. — 2001. — № 99. — С. 2; Школа камунізму для сялянства // ДнП. — 2002. — № 25. — С. 2; Дуброўна на шляху Напалеона // ДнП. — 2002. — № 67. — С. 2–4; Георгіеўскі сцяг на брыгу «Меркурый» // ДнП. — 2003. — № 12. — С. 2; Партызанскі спявак // Тамсама; Поле вайны, поле памяці // ДнП. — 2003. — № 15. — С. 2; Берэт і зорка на абеліску // Тамсама; Расцілалася пад крыламі Еўропа // ДнП. — 2003. — № 26. — С. 2; Прадвеснік рэвалюцыі: [святкаванне 1 мая на Дубровеншчыне] // ДнП. — 2003. — № 34. — С. 2, 4; «Мы на дело идём»: [партызаны на Дубровеншчыне] // ДнП. — 2003. — № 69. — С. 2; Ішлі на бітву партызаны // ДнП. — 2004. — № 41. — С. 2, 4; Зорка пуцяводная // ДнП. — 2004. — № 46. — С. 2; Дні, якія забыць нельга // ДнП. — 2004. — № 50–51. — С. 2, 3; Балада пра партызанскі хлеб // ДнП. — 2004. — № 57. — С. 2–3; Аршанская мытня на Дубровеншчыне // ДнП. — 2004. — № 75. — С. 2–3; З арлінага племені // ДнП. — 2004. — № 90. — С. 1, 3; Залатая зорка: [К.З. Рубіцель — Герой Сац. Пврацы] // ДнП. — 2004. — № 99. — С. 2; Фронт і мірнае поле // ДнП. — 2004. — № 104. — С. 2; У логаве звера: [Р.С. Стральцоў] // ДнП. — 2005. — № 8. — С. 2; Адкрытая кніга роднай старонкі: [в. Баёва] // ДнП. — 2005. — № 10. — С. 2; Падзвіжнік культуры, альбо Аповед пра гарачае сэрца Уладзіміра Емельянавіча Волаха // ДнП. — 2005. — № 12. — С. 2; Кавалер трох баявых ордэнаў: [А.К. Дземчанка] // ДнП. — 2005. — № 36–38. — С. 3; Пліта пад дубам: [падпольшчыкі Дубровеншчыны] // ДнП. — 2005. — № 51–52. — С. 2; Музея другое нараджэнне // Тамсама. — С. 4; Творцы сваёй гісторыі // ДнП. — 2005. — № 56. — С. 2; У нас была свая «Планета»: [камсамол] // ДнП. — 2005. — № 62. — С. 2; Жыў чалавек на свеце: [М.А. Шкадаў] // ДнП. — 2005. — № 64. — С. 2; Застаўся жывым у вершах і песнях: [Ю. Смірноў] // ДнП. — 2005. — № 72. — С. 2; Было не толькі захапленне: [Асінторф] // ДнП. — 2005. — № 87. — С. 2; Позірк у даўніну: [царкоўна-прыходскія школы] // ДнП. — 2005. — № 106. — С. 2; Долг перед павшими и живыми // Тамсама. — С. 2–3; Школа лёсаў людскіх: [50 год Будскай СШ] // ДнП. — 2006. — № 5. — С. 2; Такой была і застаецца // ДнП. — 2006. — № 35. — С. 2; Народ пакутаваў і змагаўся // ДнП. — 2006. — № 49. — С. 2; Суровымі партызанскімі сцежкамі хадзілі беларускія сыны // ДнП. — 2006. — № 53. — С. 3, 4; Ад зямлянак да аграгарадкоў // ДнП. — 2006. — № 62. — С. 2; Вострым пяром публіцыста: [літаратар В.Ф. Праскураў] // Тамсама; Дата ў летапісе, напісаная чырвоным радком: [1944] // ДнП. — 2006. — № 53. — С. 2–3; Для сучаснікаў і нашчадкаў // ДнП. — 2008. — № 68. — С. 2.

Літ.: Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 18; Каляндар знамянальных і памятных дат на 2006 г. — Віцебск: ВАБ, 2006. — С. 17.

**КУНЦЭВІЧ** ФРАНЦІШАК ЦІМАФЕЕВІЧ (1928, в. Германавічы – 1999), мемуарыст. Скончыў да вайны 6 класаў Германавіцкай школы, У часы Другой сусветнай вайны ўдзельнічаў у антыфашысцкім супраціве (у брыгадзе І. Гіль-Радзіёнава). Пасля вайны жыў у Польшчы (г. Гданьск). Адзін з натхняльнікаў дзейнасці і кансультант культурна-асветніцкага цэнтра імя Я. Драздовіча (в. Германавічы, Шаркоўшчынскі раён). Напісаў кнігу пра дзяцінства, якая змяшчае цікавыя звесткі пра Германавічы даваенных часоў і перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Захоўваеца ў рукапісным варыянце. Частка апублікавана ў гісторыка-дакументальнай хроніцы «Памяць. Шаркоўшчынскі раён».

Літ.: Райчонак А. Імя ў гісторыі // КР. — 1999. — № 22. — С. 2.



**КУРЖАЛАЎ** АЛЕГ ВАСІЛЬЕВІЧ (18.10.1953, г. Віцебск), загадчык аддзела краязнаўства і беларусазнаўства ВАЦПДДіП. Скончыў СШ № 29 г. Віцебска, гіст. факультэт БДУ (1975). Вучыўся разам з У. Арловым, Э. Зайкоўскім, Г. Кулажанка. Прымаў удзел у рабоце будатрадаў. Пасля заканчэння навучання быў размеркаваны ў Бешанковіцкі раён у Пяцігарскую школу (1975). Потым працаваў загадчыкам арганізацыйнага аддзела Бешанковіцкага райкама ЛКСМБ (1975–1978). Пераехаў у Віцебск, дзе працаваў адказным сакратаром Кастрычніцкага раённага савета БДТАПГіК (1978–1985). Разам з гэтым выкладаў у вячэрняй школе гісторыю. Працаваў загадчыкам аддзела экскурсій Віцебскай абласной станцыі юных турыстаў (1985–1992). Пасля рэарганізацыі ўстановы ў Віцебскае абласное аб’яднанне па арганізацыі пазашкольнай работы займае пасаду загадчыка аддзела краязнаўства і беларусазнаўства (з восені 1995).

Да краязнаўства далучаўся паступова, працуючы на пасадах, так ці інакш звязаных з краязнаўствам (з 1979). Па асабістым меркаванні, перадумовай для гэтага была гістарычная адукацыя, хаця ва ўніверсітэце краязнаўствам не займаўся (дыпломная была па студэнцкім руху ў Францыі). Працуючы на пасадзе адказнага сакратара Кастрычніцкага савета БДТАПГіК, пачаў займацца вывучэннем і прапагандай помнікаў гісторыі і культуры падведамственнай тэрыторыі.

Сур’ёзна ставячыся да пытання ўліку ахоўных аб’ектаў, рыхтаваў адпаведныя дакументы (інфармацыйныя даведкі, гістарычныя запіскі, абгрунтаванні), неабходныя для ўзяцця пад ахову выяўленых аб’ектаў. Вычытваў гранкі другога тома «Збора помнікаў гісторыі і культуры», прысвечанага Віцебскай вобл. Па яго ініцыятыве былі ўсталяваны дзве мемарыяльныя дошкі: адна з іх у гонар паўстання 1863 г. на будынку ратушы (знята і не адноўлена з пачатку рэстаўрацыі будынку).

У першай палове 1980-х гг. з пачаткам руйнавання старой забудовы г. Віцебска (будынкаў па вуліцы Леніна, старой аптэкі на плошчы Свабоды) выказваўся супраць знішчэння ахоўваемых аб’ектаў. Напрыклад, пісаў дакладныя ў гарвыканкам, не паставіў подпісу пад рашэннем аб зносе будынка аптэкі. Шырокі рэзананс атрымаў артыкул «Выбух» С. Навумчыка ў «ЛіМе», прысвечаны зносу будынка.

У 1984 г. актыўна ўдзельнічаў у працы па выратаванні Пакроўскай царквы, якую па прапанове першага сакратара Віцебскага абкама КПБ С.Ц. Кабяка планавалася зруйнаваць, а на яе месцы пабудаваць шматпавярховы дом. Пачалося нават свідраванне сцен царквы з мэтай закладкі толавых шашак. Як кіраўнік раённага аддзялення БДТАПГіК даслаў запыт у «Белрэстаўрацыю» аб гістарычнай каштоўнасці гэтага помніка. Звярнуўся да архітэктараў Віцебска (Я. Калбовіч) з прапановай распрацаваць каляровы праект стварэння ў будынках манастыра карціннай галерэі, залы арганнай музыкі. Падрыхтаваныя матэрыялы даслаў у Маскву, у Міністэрства культуры СССР. Не чакаючы адказу з Масквы, стаў збіраць калектыўныя лісты супраць зносу будынка. Такія лісты былі сабраны ад некаторых арганізацый, ад будаўнікоў, што ў той час працавалі на рэстаўрацыі ратушы. Нарэшце прыйшоў адказ з Масквы ў Міністэрства культуры БССР, Рэспубліканскі савет БДТАПГіК і Дзяржбуд, у якім станоўча ацэньвалася ініцыятыва стварэння культурнага комплексу ў будынках былога манастыра. Працы па разбурэнні былі прыпынены, а потым і згорнуты ўвогуле. Новы кіраўнік вобласці — В.Г. Грыгор’еў — пераглядзеў справу аб зносе будынкаў манастыра і праз пэўны час прыняў рашэнне аб перадачы будынка праваслаўнай царкве.



За дзейнасць, якая перашкодзіла зносу будынка, быў выклíканы на парткам і звольнены з працы (з фармулёўкай «за неўзгадненне дзейнасці з кіраўніцтвам»). Але яшчэ некалькі гадоў ён працягваў дзейнасць па ахове помнікаў. Напрыклад, у сувязі з будаўніцтвам у ахоўнай зоне будынка статыстычнага цэнтру (па вуліцы Леніна), разам з С. Цярэнцевым напісаў дзясяткі лістоў у адпаведныя інстанцыі, міністэрствы, пракуратуру аб тым, што будаўніцтва шматпавярховага будынка скажае гістарычную забудову, змяняе гістарычныя дамінанты горада. Атрымаўшы планы ахоўных зон, даказваў неправамоцнасць такога будаўніцтва (гл. артыкул Цярэнцева «Небоскрёбная дикость» у газеце «Віцебскі рабочы»).

Працуючы ў Віцебскім абласным цэнтры пазашкольнай працы, стаў адным з арганізатараў школьнага краязнаўства на Віцебшчыне. Выступіў адным з ініцыятараў і арганізатараў правядзення першай сур'ёзнай справы па нацыянальным адраджэнні ў галіне народнай адукацыі. У 1989/90 навучальным годзе былі праведзены экскурсійна-навучальныя спаборніцтвы настаўнікаў г. Віцебска пад назвай «Літаратурная Віцебшчына». Асабліва значным быў конкурс пад агульнай назвай «Мой родны кут». У выніку гэтага да краязнаўства далучылася значная колькасць настаўнікаў. Гісторыяй сваёй мясцовасці зацікавілася шырокае кола жыхароў горада і вобласці. Шматлікія матэрыялы, сабраныя пад час конкурсу (у тым ліку лісты В. Быкава, якія былі адшуканы на гарышчы бацькоўскай хаты ў в. Бычкі), былі перададзены ў фонды ВАКМ.

На працягу 1990-х – пачатку XXI ст. стаў ініцыятарам, арганізатарам і распрацоўшчыкам шматлікіх ідэй і праектаў у школьным краязнаўстве Віцебшчыны: правядзення конкурсаў, экспедыцый, віктарын, конкурсаў-аглядаў музеяў і краязнаўчых калектыўваў, ушанаванне памятных дат, конкурсаў на лепшы зборнік літаратурных твораў, прысвечаных роднаму краю, і інш. мерапрыемстваў.

Працуючы на пасадзе загадчыка аддзела краязнаўства і беларусазнаўства, лічыць сябе не столькі краязнаўцам-практыкам, як арганізатарам школьнага краязнаўства ў Віцебскай вобл. (*А.К.*). Выконваючы службовыя абавязкі, даваў мноства рэкамендацый і кансультацый па стварэнні шэрагу школьных музеяў на Віцебшчыне. Напрыклад, пры стварэнні экспазіцыі, прысвечанай М.Я. Нікіфароўскаму ў Вымнянскай СШ Віцебскага раёна, Б. Эпімаху-Шыпіле ў Ветрынскай СШ Полацкага раёна, «Хата ў жыцці беларуса» у СШ № 5 г. Наваполацка. Удзельнічаў у распрацоўцы зместу экспазіцыі дзяржаўнага музея У.С. Караткевіча ў Оршы, шэрагу кароткачасовых выстаў, напрыклад, «Педагогі-краязнаўцы Віцебшчыны» і інш. У 1995 г. арганізаваў правядзенне краязнаўчых чытанняў педагагічных работнікаў Віцебскай вобл. па тэме «М.Я. Нікіфароўскі і Віцебшчына» ў в. Вымна Віцебскага раёна, на радзіме даследчыка, у сувязі з 150-годдзем з дня яго нараджэння. Браў удзел у шэрагу рэспубліканскіх і абласных краязнаўчых канферэнцый у якасці арганізатара і ўдзельніка. Напрыклад, чытанні, прысвечаныя 140-годдзю Б.І. Эпімаха-Шыпілы ў в. Ветрына (1999), архіўныя чытанні, прысвечаныя 150-годдзю А.П. Сапунова, г. Віцебск (2001) і інш.

Супрацоўнічае з шэрагам дзяржаўных і грамадскіх арганізацый і ўстаноў, шукае спонсараў для заахвочвання ўдзельнікаў розных конкурсаў, выдання кніг, брашур, метадычных дапаможнікаў і інш. прадукцыі аддзела.

Займаецца вывучэннем легенд і паданняў Віцебшчыны, цікавіцца гісторыяй роду Гуркаў-Рамейкаў і асабліва постаццю генерал-фельдмаршала І.У. Гуркі, лепельскімі каранямі паэта Т. Кляшторнага. Дапамагаў настаўнікам Ветрынскай СШ у даследаваннях па вывучэнні біяграфіі Б. Эпімаха-Шыпілы.

Мае шэраг публікацый у мясцовым і рэспубліканскім друку, прысвечаных пытанням развіцця краязнаўства, аховы помнікаў. Першы артыкул быў надрукаваны ў малатыражнай газеце ВА «Маналіт» і прысвечаны будынкам былога Трынітарскага манастыра. Аўтар ідэі і гал. рэдактар «Зборніка матэрыялаў аб дзейнасці музеяў навучальна-выхаваўчых устаноў Віцебшчыны». З'яўляецца рэдактарам шэрагу кніжак і брашур, падрыхтаваных аддзелам беларусазнаўства і краязнаўства абласнога аб'яднання пазашкольнай працы. Сярод іх: «Колькі слоў пра мясцовыя паданні», «Беларускія легенды і паданні (рэкамендацыйны спіс літаратуры з каментарыямі)», «Уступнае слова» да метадычнага дапаможніка «Сучасны іменнік Віцебшчыны». Рэцэнзіі і публікацыі аб дзейнасці змяшчаліся ў шэрагу публікацый у сувязі з дзейнасцю аддзела, які ўзначальвае. Мае асабісты архіў.

Тв.: Віктарына па краязнаўству // БГЧ. — 1995. — № 2. — С. 190–193; Алімпіяда па беларусазнаўству і краязнаўству і яе месца ў сістэме працы з адоранымі дзецьмі і фарміраванні ў навучэнцаў грамадзянскасці і патрыятызму / А.В. Куржалаў, А.А. Чарнышова, Л. Сіманёнак. — Віцебск: ВАААППДіП, 2008. — 182 с.

Літ.: Партоліна Н. Літаратурны вянок малой радзіме: [Л.М. Амбразевіч] // ВК. — 2002. — № 96. — С. 4; Інтэрв'ю А.В. Куржалава (29.12.2004) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Скалабан В. Куржалаў А.В. Сучасныя беларускія краязнаўцы: матэрыялы да слоўніка // КГ. — 2005. — № 39. — С. 2.



**КУРСО** НЭЛІ ВАСІЛЬЕЎНА (30.03.1945, в. Занькі Лепельскага раёна Віцебскай вобл.), бібліятэкар, бібліёграф. Скончыла СШ № 11 г. Віцебска (1962), бібліятэчны факультэт Ленінградскага інстытута культуры імя Н.К. Крупскай (1970). Працавала памочнікам бібліятэкара ў абласной дзіцячай бібліятэцы імя Н.К. Крупскай (1962–1979), старшым інспектарам ва ўпраўленні культуры Віцебскага аблвыканкама (1979–1982), загадчыцай аддзела беларускай і краязнаўчай літаратуры, нам. дырэктара па навуковай працы ВАБ (1982–2007). З 1994 г. узначальвала сектар краязнаўчай літаратуры.

Краязнаўчую дзейнасць распачала з 1970 г. Брала ўдзел у стварэнні шэрагу перасоўных выстаў краязнаўчай накіраванасці ў ВДПІ, ВАКМ, Інстытуце павышэння кваліфікацыі настаўнікаў, абласным цэнтры пазашкольнай працы і інш. Удзельнічала ў краязнаўчых навукова-практычных канферэнцыях (з сяр. 1980-х). Займалася складаннем бібліяграфічных выданняў, прысвечаных розным тэмам жыцця Віцебшчыны, персаналіям, якія маюць дачыненне да гісторыі і культуры Віцебшчыны. Складальнік бібліяграфічных паказальнікаў, якія выдадзены краязнаўчым аддзелам ВАБ: «Прырода і прыродныя рэсурсы Віцебскай вобл.» (1989), «Віцебск у творах мастацкай літаратуры» (1998), «Віцебшчына тэатральная», «Гісторыя славутых родаў Віцебшчыны» і інш. Аўтар буклетаў, прысвечаных выдатным краязнаўцам Віцебшчыны: А.П Сапунову., М. Каспяровічу (выдадзены краязнаўчым аддзелам ВАБ).

Тв.: Прырода і прыродныя рэсурсы Віцебскай вобл. — Віцебск: ВАБ, 1989. — 58 с.; Віцебшчына тэатральная: бібліяграфічны паказальнік. — Віцебск: ВАБ, 1998. — 66 с.; Віцебшчына ў творах мастацкай літаратуры: бібліяграфічны паказальнік. — Віцебск: ВАБ, 2000. — 105 с.; (разам з А.А. Міхайлавай) Гісторыя славутых родаў Віцебшчыны: бібліяграфічны паказальнік. — Віцебск: ВАБ, 2000. — 32 с.; Віцебская вобласць: бібліяграфічны паказальнік, 2002, 2003, 2004, 2005; Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Віцебшчыны: бібліяграфічны паказальнік. — Віцебск: ВАБ, 2003. — 82 с.; Аляксей Парфёнавіч Сапуноў: [буклет]. — Віцебск: ВАБ, 2001; Беларускі краязнавец М.І. Каспяровіч: [буклет]. — Віцебск: ВАБ, 2001.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Курсо Н.В. (24.06.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна 80 гадоў / склад. Л.С. Гудзелева. — Наваполацк: А.У. Маладзечкін, 2009. — С. 61.

**КУТУЗАЎ** А., краязнаўца. Аўтар артыкулаў на розныя краязнаўчыя тэмы, якія друкаваліся ў другой палове ХХ ст. на старонках раённых газет Віцебскай вобл.: «Зара», «Лепельскі сцяг», «Прамень камунізма» і інш.

Тв.: Артыкулы ў кнігах «Памяць»: З гісторыі г. Сянно // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна / уклад. С.В. Шайко. — Мн.: Паліграфафармленне, 2003. — С. 48–49; Сялянскі рух на Сенненшчыне // Тамсама. — С. 59–60; Выбары ў Думу: [Сенненшчына] // Тамсама. — С. 63; Прыфрантавы райкам: [Сенненскі рэўкам 1919 г.] // Тамсама. — С. 93.

Артыкулы ў перыядычным друку: Шчырая дапамога фронту // Зара. — 1958. — 27 верас. — С. 3; (разам з Б. Пахвалавым) Бешанковічы ў мінулым // Зара. — 1959. — 5 снеж.; Старонкі гераічнага мінулага // ЛС. — 1968. — 23 студз.; Ад лютага да Вялікага Кастрычніка // ЛС. — 1968. — 10 лют.; У барацьбе і трывозе ішоў баявы 18 год // ЛС. — 1968. — 16 сак.; Камбеды Лепельшчыны // ЛС. — 1968. — 2 крас.; Гэта было ў 1919–1920 гг. З гераічнага мінулага Лепельшчыны // ЛС. — 1968. — 8 чэрв.; Ад лютага да Кастрычніка // ПК. — 1987. — № 90. — С. 2; Кастрычніцкія дні на Гарадоччыне // ПК. — 1987. — № 101. — С. 2–3.

**КУРЦЭВІЧ** ДЗМІТРЫ БЯРНАРДАВІЧ (21.09.1970), краязнаўца. Скончыў Воўкаўскую СШ Пастаўскага раёна (1988), гіст. факультэт ВДУ (2008). Працаваць пачаў у калгасе «Герой працы» Глыбоцкага раёна. Краязнаўчую дзейнасць распачаў у сярэдзіне 1990-х гг. Займаецца вывучэннем гісторыка-культурнай спадчыны Глыбоччыны. Мае асабістую калекцыю з прадметаў матэрыяльнай культуры, якая адлюстроўвае быт насельніцтва Глыбоччыны ад старажытнасці да сучаснасці (старадаўнія рэчы, фотаздымкі, газеты і інш.). Прымаў удзел у некаторых краязнаўчых канферэнцыях канца 1990-х гг. на Глыбоччыне. Падтрымлівае кантакты з грамадскімі арганізацыямі і ініцыятывамі, у тым ліку «Сумежжам». У 2000–2001 гг. выдаваў вясковую газету «Рэха Дзеркаўшчыны». Выйшла 10 нумароў.

Літ.: Інтэрв'ю з Д.Б. Курцэвічам (18.06.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**КУР'ЯНОВІЧ** АНТОН (†), журналіст. Працаваў нам. рэдактара «Весніка Глыбоччыны». Браў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы кнігі «Памяць» Глыбоцкага раёна. Аўтар артыкулаў у ёй. З мэтай выяўлення матэрыялаў працаваў у архіве ў Вільнюсе. Паўплываў на фарміраванне краязнаўчай зацікаўленасці ў У. Скрабатуна.

Тв.: (разам з І.У. Бунто, А.А. Тарыкавым) Старонка мінулага // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 31–39; (разам з П.К. Башко, А.М. Сідарэвіч, А.А. Тарыкавым) Час барацьбы і выпрабаванняў // Тамсама. — С. 111–116; (разам з П.В. Галай, А.А. Тарыкавым) У складзе польскай дзяржавы // Тамсама. — С. 131–139; На заходніх рубяжах // Тамсама. — С. 190–191; Быль стала легендай // ШП. — 1987. — № 34. — С. 3.



**КУХАРАВА** (Лаўрыненка) ВАЛЯНЦІНА ЦІМАФЕЕЎНА (11.02.1922, п. Слабада Цэнтральна-Чарназёмнай вобл. (цяпер п. Барысаўка Белгарадскай вобл., Расія) – 2009), краязнаўца, педагог. Скончыла Слабадскую СШ (1939), натуральна-геаграфічны факультэт Белгарадскага настаўніцкага інстытута (1941), геаграфічны факультэт МгДПІ (1955). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Працавала ў школе ў п. Карасуль Ішымскага раёна Омскай вобл. выкладчыцай хіміі, біялогіі, геаграфіі. У лістападзе 1942 г. добраахвотна пайшла ў войска. Не трапіўшы ў школу снайпераў, вучылася ў школе малодшых авіяспецыялістаў у г. Кемерава. Служыла радыстам-метэаназіральнікам у 423-й асабовай эскадрыллі сувязі 7-й паветранай арміі на Карэльскім фронце ў званні сяржанта (1943–1945). Пасля дэмабілізацыі вярнулася на радзіму і працавала інструктарам у Барысаўскім рана Белгарадскай вобл. (1945–1948), потым пераехала на радзіму мужа — у Суражскі раён БССР, дзе працавала інструктарам Суражскага рана (1948–1960), настаўніцай геаграфіі ў Суражскай СШ, кіраўніком гуртка ў Суражскім доме піянераў і школьнікаў, дырэктарам вячэрняй школы, настаўніцай геаграфіі ў СШ г. Суража (1960–1977).

Займалася комплекснымі даследаваннямі Суражчыны. Сярод інш. кірункаў перавагу надавала пошукаваму руху (выяўленне імёнаў і лёсаў салдат, загінуўшых на тэрыторыі Суражчыны), высвятленню жыццёвых лёсаў землякоў, асветніцкай працы сярод мясцовага насельніцтва, збіранню матэрыялаў, арганізацыі і кіраўніцтву школьным музеем.

Даследаваць гісторыю і культуру Суражчыны пачала, калі стала працаваць у школе. Значную ролю ў актывізацыі краязнаўства адыграла вучоба ў МгДПІ, дзе выкладчыкі надавалі важную ролю методыцы вывучэння роднага краю і праводзілі шмат практычных заняткаў.

Пражываючы пасля вайны ў Суражы, звярнула ўвагу на тое, што мясцовыя жыхары амаль не цікавяцца роднай гісторыяй. Звязвала гэта з тым, што большая частка жыхароў горада была не была мясцовай: яўрэяў, якія складалі значную частку насельніцтва мястэчка, знішчылі ў часы вайны немцы; людзі, якія перасяліліся ў горад, былі збольшага абыякавымі да гісторыі краю. Пачала збіраць матэрыялы і друкаваць артыкулы пра жыццёвыя лёсы людзей, якія ўдзельнічалі ў вайне. Потым пісала пра жыхароў горада, якія праславіліся ў значных падзеях (бралі ўдзел у лакальных канфліктах, выпрабаваннях ядзернай зброі, мелі дачыненне да пабудовы касмадромаў СССР і інш.). Першыя матэрыялы былі прысвечаны ўдарнікам камуністычнай працы. Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў перыядычным друку.

Аўтар кнігі «Сурож и сурожане. История в лицах и фактах» (не выдадзена), у якой сабраны нарысы па гісторыі, геральдыцы, звесткі пра цікавыя мясціны, славутых землякоў, паданні пра месца і яго наваколлі, артыкулы краязнаўцаў, прысвечаныя Суражу. Найбольшая ўвага нададзена гісторыі савецкага часу, асабліва перыяду Вялікай Айчыннай вайны (раздзел «Годы, опалённые войной»). Шмат матэрыялаў прысвечана гісторыі школы, эксперыментальнай базе, лясгасу, бальніцы. Прыкладаюцца дакументы, даведкі, карты.

Арганізавала музей гісторыі школы г. Суража, у якім таксама былі афармлены экспазіцыі, прысвечаныя партызанскай барацьбе і вызваленню горада і раёна. Для гэтага арганізавала працу па збіранні матэрыялаў, якія мелі дачыненне да гісторыі наваколляў. Сярод сабраных экспанатаў — каменныя прылады працы, рэчы, звязаныя з вайной 1812 г., Вялікай Айчыннай вайной, пасляваенным перыядам гісторыі. Брала ўдзел у археалагічных раскопках на суражскім замчышчы пад кіраўніцтвам М. Ткачова. Аформіла стэнды, прысвечаныя гісторыі Суража ў Доме піянераў.

Актыўна займалася грамадскай дзейнасцю. Член КПСС з 1950 г. На рашэнне ўступіць у партыю паўплываў лёс бацькі, які быў расстраляны ў 1937 г. «за членства ў эсэраўскай партыі». Арганізатар шэрагу грамадскіх ініцыятыў у горадзе: усталявання памятнага знака на месцы знішчэння яўрэйскага насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны (каля в. Любшчына), узяцця пад ахову як помніка вытворчай дзейнасці часткі брукаванай дарогі «Екацярынінскі тракт», аховы рэштак паркаў і насаджэнняў былых панскіх сядзіб, якія захаваліся да нашага часу, і інш. Шмат матэрыялаў перадала ў музей Інстытута гісторыі НАН Беларусі, ВРКМ, музей Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова, мясцовым журналістам.

Важнейшымі заслугамі і дасягненнямі В.Ц. Кухаравай з'яўляюцца асветніцкая дзейнасць сярод жыхароў горада Суража, грамадскія ініцыятывы, пошукавая дзейнасць і аднаўленне гістарычнай памяці мясцовага насельніцтва. У мястэчку бытавала прымаўка: «У Суражы ўсе ведаюць бацюшку і Кухараву».

Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За абарону Савецкага Запаляр'я», знакам «Выдатнік асветы» (1954) і інш.

Тв.: Суседзі з вуліцы Касплянскай // ЛПр. — 1985. — № 16. — С. 3; (разам з Н. Жыжнеўскай) Шлі з баямі 51-я і 39-я // ЛПр. — 1985. — № 54. — С. 3; Настаўнікі былі воінамі: [Сураж] // ЛПр. — 1985. — № 58. — С. 4; Муса Джаліль: [пераход 825-га волжска-татарскага батальёна на бок партызан каля в. Вярхоўе] // ЛПр. — 1986. — № 20. — С. 3; У першыя дні вайны // ЛПр. — 1987. — № 23. — С. 3; Той далёкі 1919… // ЛПр. — 1988. — № 26. — С. 3; Салдацкая ўдава // ЛПр. — 1989. — № 10. — С. 2; Камбрыг Сакалоў // ЛПр. — 1989. — № 25. — С. 3; Медаль за горад… // ЛПр. — 1989. — № 56. — С. 3; Ведаць сваю гісторыю // ЛПр. — 1989. — № 117. — С. 3; Суражу — 425 год // ЛПр. — 1990. — № 3. — С. 3; Рускі немец: [Н.М. Лайер, жыве ў Суражы] // ЛПр. — 1990. — № 21. — С. 2; Жанчыны Суража // ЛПр. — 1990. — № 31. — С. 3; Суражанкі // ЛПр. — 1990. — № 141. — С. 3; Змагаліся, як маглі: [партыз. рух] // ЛПр. — 1991. — № 93. — С. 2; Калі цвіў светнік: [размініраванне Суражскага раёна, удзел юнакоў-суражан] // ЖП. — 1994. — № 1. — С. 2; Па шляху жыцця. 200 год СШ: [адукацыя ў Суражы] // ЖП. — 1994. — № 19. — С. 1, 2; З роду Антонавых // ЖП. — 1994. — № 34. — С. 2, 3; На святога Іллю: [загуба яўрэяў Суража ў жніўні 1941 г. у Любшчыне] // ЖП. — 1994. — № 69. — С. 3; Так было…: [1945] // ЖП. — 1995. — № 21. — С. 2; Девчонки помогали фронту // НС. — 1995. — № 49. — С. 4; Судьба: [А.П. Жолудзева] // ЖП. — 1995. — № 83. — С. 2; Батька Минай и его дети // ЖП. — 1997. — № 15. — С. 3; Комбриг Соколов // ЖП. — 1997. — № 33. — С. 2; Это нужно живым // ЖП. — 1999. — № 3. — С. 3; Легенда о Суражском замке. О Западной Двине // ЖП. — 1999. — № 13. — С. 2; Вокзал для… суражан, или Кто снимет проклятие с Суража? // ЖП. — 2000. — № 34. — С. 4; Удивительные мужчины — суражские связисты // ЖП. — 2001. — № 88. — С. 2; А на кладбище неспокойненько: [могілкі Суража] // ЖП. — 2001. — № 94. — С. 3; Судьба на скрижалях столетия: [Ст.М. Радзіён] // ЖП. — 2002. — № 74. — С. 2; Легенда о Черной даме // ЖП. — 2001. — № 89. — С. 2; Суражской библиотеке — 100 лет // НС. — 2004. — № 6. — С. 2; Дороги Семена Кузьмина // ЖП. — 2004. — № 59. — С. 2; Живи и помни: [мемарыяльны комплекс у в. Копці] // ЖП. — 2004. — № 64. — С. 2; Без званий и наград // ЖП. — 2004. — 11 снеж. — С. 2; У каждого была своя война: [лёс сям'і В.П. Крываносава] // ЖП. — 2005. — № 3. — С. 2; «За Суражем виднеется курган — казнили там фашисты партизан» // ЖП. — 2005. — № 7. — С. 2; Для суражан милее края нет // ЖП. — 2006. — № 33. — С. 2; Врач по призванию: [А.П. Абрамок] // ЖП. — 2006. — № 50. — С. 2; «Вместо сердца пламенный мотор»: [Віцебскі аэраклуб] // ЖП. — 2006. — № 63. — С. 4; Из Суража в науку: [Н. Дорофеенко] // ЖП. — 2008. — № 8. — С. 2; Дети войны // ЖП. — 2008. — № 16. — С. 3; Почетные граждане Словакии жили в Задубровье // ЖП. — 2008. — № 19. — С. 3; Суражане на космодроме // ЖП. — 2008. — № 27. — С. 3; Детдомовцы // ЖП. — 2009. — 2 ліп. — С. 6.

Літ.: Кухарева В.Т. Женщина на войне: [аўтабіяграфічныя звесткі пра ўдзел в Вялікай Айчыннай вайне] // ЖП. — 2000. — № 36. — С. 2; Мезенцев В.И. Неутомимый краевед // ЖП. — 2002. — 9 лют. — С. 1; Лавейкина С. Сураж и суражане // ЖП. — 2003. — № 56. — С. 2; Краязнаўцы Віцебскага раёна // Памяць: Віцебскі раён: Гісторыка-дакументальная хроніка / уклад. У.І. Мезенцаў. — Мн.: Маст. літ., 2004. — С. 724.

**КШЭМІНСКІ** КАМІЛЬ (Kamil Krzemiński) (1923, г. Ваўкавыск), краязнаўца, фармацэўт. Скончыў 6 класаў сярэдняй школы ў Круляўшчызне і 3 класы ў гімназіі імя Люблінскай уніі ў Глыбокім (1936–1939). Атрымаў адукацыю фармацэўта ў Лодзі (1951). Служыў у войску на пасадах фармацэўта, а потым, па звальненні, у аптэках у г. Дольны Шлёнск. З атрыманнем эмерытуры працаваў бібліятэкарам у аддзяленні Акадэміі медыцыны ў Вроцлаве (1976–1994). Доктар медыцынскіх навук (1995).

У час навучання ў гімназіі жыў у Глыбокім на вуліцы Пешай. Аўтар кнігі «Сярэднія школы Прыдзвіння» (2005). Выданне складаецца з 3 раздзелаў і прадмовы. У першай частцы «Глыбокае» даецца характарыстыка Дзісеншчыны, аналізуюцца прырода, клімат, гісторыя, адміністрацыйны падзел, гандаль, рамёствы, промыслы Браслаўскага і Пастаўскага пав., сельская гаспадарка, народанасельніцтва, шляхі зносін, агульны стан сярэдняй адукацыі ў краі ў часы II Рэчы Паспалітай. Першы раздзел другой часткі прысвечаны прыватнай польскай гуманітарнай гімназіі імя Люблінскай уніі, другі раздзел — Беразвеччу, польскім, яўрэйскім прыватным, сярэдне-прафесійным школам у Глыбокім, спробе стварэння беларускай гімназіі ў Глыбокім. У другой частцы асвятляюцца пытанні сярэдняй адукацыі ў Браслаўскім пав.: прыватнай гімназіі сумеснага навучання Таварыства сярэдняй школы ў Браславе, 8-класнай гімназіі імя Стэфана Баторыя ў Друі, школы ў Паставах, польскай гімназіі сумеснага навучання ў Докшыцах, рускай гімназіі ў Докшыцах. Трэцяя частка прысвечана гісторыі дзяржаўнай гімназіі імя ксяндза Г. Пірамовіча ў Дзісне, рускай гімназіі ў Дзісне. Акрамя апісання гісторыі навучальных устаноў падаецца інфармацыя пра будынкі, школьныя арганізацыі, настаўнікаў, дырэктараў, спісы навучэнцаў, інфармацыя пра выдатных асоб і інш. Выданне не пазбаўлена некаторых недакладнасцяў і прапагандысцкіх штампаў, памылак і дылетантскага падыходу.

Тв.: Szkole ponadpodstawowe Naddżvinnia 1919–1939. — Mado, 2005. — 520 s.

Літ.: Шыдлоўскі К. Сярэднія школы Прыдзвіння // Павет. — 2004. — № 12 (37). — С. 8; Сергіевіч К. Выдадзены ў Польшчы // БЗ. — 2005. — № 45. — С. 3.

ЛАБАЧЭЎСКАЯ Л., журналіст. Працавала ў рэдакцыі Шаркоўшчынскай раённай газеты «Кліч Радзімы». Аўтар артыкулаў, прысвечаных гісторыі і культуры Шаркоўшчыны.

Тв.: (разам з К.А. Кожанам) На сумежжы двух стагоддзяў // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Шаркоўшчынскага раёна. — Мн.: БелЭн, 2004. — С. 83–86; (разам з К.А. Кожанам) Устанаўленне савецкай улады // Тамсама. — С. 95–99; (разам з К.А. Кожанам) Нацыянальна-вызваленчы рух // Тамсама. — С. 138–141; (разам з К.А. Кожанам) Аб раскулачванні кулацкіх гаспадарак // Тамсама. — С. 191–192; Шляхамі вечнага вандроўніка // КР. — 1993. — № 43. — С. 1, 3; Старонкі мінулага // КР. — 1992. — № 26, 27, 29, 60, 63, 64; Яшчэ адзін лёс // КР. — 1992. — № 82. — С. 3; Юннаты з Лужкоў // КР. — 1994. — № 9. — С. 2; Купалле над Дзісной // КР. — 1994. — № 51. — С. 4; Вандроўка між Мнютай і Аўтай // КР. — 1998. — № 74, 76, , 77, 79; «Гарт»: праўда і домыслы пра Саюз беларускіх патрыётаў // КР. — 1998. — № 91. — С. 3, 4; «Спадчыну не ведаю…» // КР. — 1999. — № 52, 54; У Пунькі да Драздовіча // КР. — 1999. — № 73. — С. 3; Сцяжынкамі жыцця Імя ў гісторыі // КР. — 2000. — № 29–31. — С. 2; Захаваць спадчыну // КР. — 2001. — № 21. — С. 2; Адкрытая скарбніца // КР. — 2001. — № 36. — С. 2.

**ЛАЗОЎСКАЯ** БРАНІСЛАВА, працавала ў Сенненскім раённым краязнаўчым музеі. Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў перыядычным друку.

Тв.: Аб чым маўчаць камяні? // ГС. — 2004. — № 60. — С. 2; Ад імператрыцы Кацярыны да нашых дзён: [паштовая станцыя ў в. Паграбёнка] // ГС. — 2004. — № 94. — С. 2; Савінічаў дуб: [тапаніміка] // ГС. — 2005. — № 11. — С. 1; Ішла вайна… // ГС. — 2007. — № 52. — С. 4; Герои Беларуси: [Ю. Каракетаў, Б. Хаіркізаў] // ГС. — 2008. — № 47. — С. 2.



**ЛАЗУКА** ІВАН ЕМЕЛЬЯНАВІЧ (10.09.1948, в. Балбечча Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобл.), журналіст, краязнаўца, паэт. Член Беларускага саюза журналістаў. Скончыў БДУ, ВПШ пры ЦК КПБ. Працаваў рэдактарам Сенненскай і Докшыцкай раённых газет, у Сенненскім райвыканкаме (1992–2000). Браў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы Сенненскай раённай кнігі «Памяць». Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў перыядычным друку.

Тв.: Артыкулы ў кнізе «Памяць»: Ваяваў на Халхін-Голе // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна / уклад. С.В. Шайко. — Мн.: Паліграфафармленне, 2003. — С. 124; Было дваццаць чатыры гады // Тамсама. — С. 298; Прамой наводкай // Тамсама. — С. 301–302; Лісты з фронту // Тамсама. — С. 302; Клуб «Памяць» // Тамсама. — С. 303; Толькі два эпізоды // Тамсама. — С. 305–306; Нялёгкі слаўны лёс: [В.А. Злотка] // Тамсама. — С. 519; Ад бровара — да сучаснага прадпрыемства // Тамсама. — С. 520–521; Рыжкова Г.П. // Тамсама. — С. 552; Скапа У.Р. // Тамсама. — С. 552–553; Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч // Тамсама. — С. 557; Ніколі не згладзіцца ў памяці // Тамсама. — С. 560–561; «Шчаслівы талісман» беларускай каманды // Тамсама. — С. 565; Душа Багушэўскага народнага // Тамсама. — С. 578; Квартэт Кавалёвых // Тамсама. — С. 579.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Прайшоў праз лёс Халхін-Гол: [П.К. Астапаў] // ГС. — 1994. — № 44. — С. 2; Абавязаны памятаць: [Сенненскі раён у гады вайны] // ГС. — 1994. — № 45. — С. 2; Ці ведаеце вы іх? // ГС. — 1994. — № 50. — С. 2; «На трафейнай паперы» // Тамсама. — С. 3; Гэта трэба жывым: [знішчэнне яўрэяў Сянно ў 1941 г.] // Выбар. — 1995. — № 2. — С. 2; Спісы заканчваюцца, работа працягваецца // ГС. — 1996. — № 35. — С. 1; За родную зямлю: [Л.Ф. Цуран] // ГС. — 1997. — № 36. — С. 2; Ульянавіцкі Матросаў: [С. Каваленка] // НС. — 1997. — № 70. — С. 4; Яму было 24: [Герой Савецкага Саюза С.А. Каваленка] // ГС. — 1998. — № 38. — С. 2; Часу ўсё менш: [кніга «Памяць»] // ГС. — 1998. — № 51. — С. 2; Пад горадам Н. // ГС. — 1998. — № 54. — С. 2–3; Каб памяталі нашчадкі: [Сенненскі раённы патрыятычны клуб «Памяць»] // ГС. — 1999. — № 5. — С. 2; Яе вялікасць актрыса: [З.І. Канапелька] // ГС. — 1999. — № 60. — С. 2, 3.

Літ.: Дробаў Л.Н. Лазука І.Е. // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна / уклад. С.В. Шайко. — Мн.: Паліграфафармленне, 2003. — С. 551.

**ЛАЗЮК** АЛЯКСАНДР ЯЎГЕНАВІЧ (1.01.1958, в. Варосіна Пінскага раёна Брэсцкай вобл.), журналіст, краязнаўца. Скончыў гісторыка-філал. факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны (1980), Мінскую ВПШ (1990). Старшыня сенненскай суполкі ТБМ. Пераехаў на Сенненшчыну з зоны радыяцыйнага забруджвання. Аўтар артыкулаў па гісторыі і культуры Сеннешчыны, у тым ліку нізкі артыкулаў «Сенненшчына літаратурная», прысвечаных пісьменнікам Сенненскага раёна і паэтам, лёс якіх звязаны з краем.

Тв.: Працэс знішчэння культурнай спадчыны не спынены: [помнікі гісторыі і культуры Сенненшчыны] // ГС. — 1992. — № 78. — С. 2, 3, 4; Мясцовы Кулібін: [Л.М. Яўпак] // ГС. — 1992. — № 79. — С. 3; Беларускі ксёндз, таленавіты паэт, які жыў і памёр у Сянно: [Зязюля А. (А.С. Астрамовіч)] // ГС. — 1993. — № 44. —

С. 2; «Непадалёку дзень і ноч дыміў крэматорый» // ГС. — 1993. — № 49. — С. 2; Кнігу «Памяць» створым сумесна // ГС. — 1994. — № 28. — С. 2; «Жыў-здароў…»: [А.Р. Мальтанаў] // ГС. — 1994. — № 30. — С. 2; Шчыры беларус: [А. Зязюля] // ГС. — 1994. — № 32. — С. 3; Волатаў духа калыхала і наша зямля // ГС. — 1994. — № 73. — С. 1, 3; З любоўю да роднага краю: [В. Бандарэвіч] // ГС. — 1997. — № 42. — С. 2; Пачыналася з падполля // ГС. — 1998. — № 13. — С. 1, 2, 4; Подзвігам праслаўлены: [Герой Савецкага Саюза А.Ф. Пятаковіч] // ГС. — 1998. — № 74. — С. 2; З кагорты герояў: [Герой Савецкага Саюза А.Д. Мацюшаў] // ГС. — 1998. — № 89. — С. 2; Подзвіг штурмана: [І.Т. Тамашэўскі] // ГС. — 1998. — № 92–93. — С. 6; Да гістарычных фактаў трэба ставіцца ўзважана: [да 160-годдзя М.П. Пржэвальскага] // ГС. — 1999. — № 32. — С. 2–3; Вазіў маршала Жукава: [В.Т. Казырыцкі] // ГС. — 1999. — № 54. — С. 2, 4; Алесь Жаўрук (1910–1942) // ГС. — 2000. — № 47. — С. 2; Уладзімір Дубоўка (1900–1976) // ГС. — 2000. — № 54. — С. 2; Андрэй Зязюля (1878–1921) // ГС. — 2000. — № 56. — С. 2; Тадэвуш Лада-Заблоцкі (1811–1847) // ГС. — 2000. — № 63. — С. 2; Уладзімір Караткевіч (1930–1984) // ГС. — 2000. — № 87. — С. 2; Караль Жэры (1743–?) // ГС. — 2000. — № 93. — С. 3; Святло беларускай свядомасці: [ксёндз А. Астрамовіч] // ГС. — 2002. — № 100. — С. 2; Незвычайнае ў звычайным (Сянно – Вароніна – Ст. Беліца – Чарэя – Лукомль – Чашнікі) // ГС. — 2000. — № 89, 90, 95, 97, 99, 101. — 2001. — № 1, 4, 7, 9, 15, 22, 56; Званы Друцка — званы памяці // ГС. — 2002. — № 22, 30, 33, 38, 42, 47, 56; Загінулі пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку // ГС. — 2006. — № 14. — С. 2; Легенды роднай зямлі // ГС. — 2008. — № 13, 20, 34; Краязнаўства: вывучаем і захоўваем: [вынікі алімпіяды] // ГС. — 2008. — № 24. — С. 7; У першыя пасляваенныя гады // ГС. — 2008. — № 50. — С. 2; Праз гады і эпохі: [В.Р. Мазур] // ГС. — 2008. — № 72. — С. 2; Наша з табой біяграфія: [кніга Народнай славы калгаса К. Маркса] // ГС. — 2008. — № 87. — С. 3.

Літ.: Сянно з блакітнымі вачыма: зборнік літаратурных твораў аб родным краі. — Сянно, 2002.

**ЛАЙКО** ВАСІЛЬ МЯФОДЗЬЕВІЧ (1920, м. Чашнікі), гісторык. Кандыдат гіст. навук (1965), дацэнт. Скончыў школу (1937), ВДПІ, ВПШ (1949). Працаваў у Замацкай школе Чашніцкага раёна, на партыйнай і камсамольскай рабоце ў г. Мінске і Барысаўскім раёне. Пасля абароны дысертацыі працаваў выкладчыкам гісторыі, дацэнтам, дэканам ў ВДТІ. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля выхаду на пенсію працаваў у камісіі па напісанні кнігі «Памяць» г. Віцебска.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны, двума ордэнамі «Знак Пашаны», Ганаровай граматай ВС БССР.

Тв.: (разам з С.Ф. Дахия, Я.Л. Гельбергам) Партийные организации Витебщины в период строительства социализма (1921–1937 гг.) // Тезисы докладов научно-теоретической конференции на тему «История Витебской областной организации: Традиции и преемственность». — С. 12–21; Чым жылі, гандлявалі нашы продкі // ЖП. — 1996. — № 5. — С. 3.

Літ.: Міхно У. Ва ўсе эпохі, у кожны час раслі вучоныя ў нас // ЧП. — 2006. — № 11–12. — С. 3; Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Чашніцкага раёна. — Мн.: Бел. навука, 1997. — С. 453; Міхно У. А вярба ў Чашніках расце: [В.М. Лайко] // ЧП. — 2007. — № 11–12. — С. 3.

**ЛАКОТКА** АНАТОЛЬ АРКАДЗЕВІЧ (20.11.1965, в. Русачкі Міёрскага раёна (цяпер г. Міёры)), біёлаг. Скончыў біялагічны факультэт ВДПІ (1990). Працуе ст. выкладчыкам кафедры экалогіі ВДУ.

Цікавіцца гісторыяй Беларусі даваеннага (да Другой сусветнай вайны) перыяду. Даследуе біялагічныя аб’екты Віцебшчыны. Мае прыватную калекцыю, якая складаецца з прадметаў побыту, утылітарных рэчаў, мэблі XIX – першай паловы XX ст. Самастойна аднаўляе іх і дапамагае з рэстаўрацыяй іншым. Браў удзел у стварэнні некаторых прыродазнаўчых і этнаграфічных экспазіцый ВАКМ, Гарадоцкага раённага краязнаўчага музея, заалагічнага музея ВДУ, біялагічнага музея СШ у в. Алексінічы. Адзін з арганізатараў і ўдзельнік экспедыцый па вывучэнні Беларускага Паазер’я (1986–2009). Некаторыя матэрыялы перадаў у навуковыя ўстановы Санкт-Пецярбурга, Мінска, біялагічны музей БДУ.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Лакотка А.А. (8.05.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ЛАРКОВА** НІНА ЛЯВОНАЎНА (1.11.1956, в. Межыёва Алёнавіцкага с/с Талачынскага раёна Віцебскай вобл.), бібліятэкар, краязнаўца. Скончыла зааінжынерны факультэт Віцебскага ветэрынарнага інстытута (1982). Працавала галоўным заатэхнікам калгаса «Новая праца» Лёзненскага раёна (1982–1985), бібліятэкарам Валасоўскай, потым Сасноўскай сельскай бібліятэцы Віцебскай РЦБС (з 1988).

Зацікавілася гісторыяй роднага краю з 1996 г., калі паўстала патрэба ў складанні гісторыі бібліятэкі. Пэўны ўплыў на афармленне зацікаўленасці мела знаёмства з А.А. Шнэйдэрам і Т.П. Марчык.

Праводзіць вывучэнне гісторыі мясцовасці ў зоне абслугоўвання бібліятэкі. Склала летапіс вёскі Сасноўка, які складаецца з 5 частак: «Дарэвалюцыйны перыяд», «Паслярэвалюцыйны перыяд», «Вайна», «Пасляваенная гісторыя», «Сучасная гісторыя». Па кожным раздзеле сабраны копіі дакументаў, фотаздымкі, успаміны жыхароў, артыкулы па гісторыі вёскі, надрукаваныя ў перыядычных выданнях, аўтарскія нарысы. Захоўваюцца ў бібліятэцы в. Сасноўка Віцебскага раёна. Надрукавала шэраг артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку, большасць у газеце «Жыццё Прыдзвіння». Лічыць, што для краязнаўцы ўласцівымі мусяць быць сістэма ў працы і рэгулярнасць, а сваю дзейнасць лічыць пабочным аматарскім заняткам ад прафесійнай дзейнасці (працы ў бібліятэцы).

Падтрымлівае сувязі з ДАВВ, Віцебскім абласным цэнтрам пазашкольнага выхавання моладзі, НАРБ, Дзяржаўны музей гісторыі г. Мінска, ДАРФ (СПб.).

Тв.: Русакі, Паўлючонкі, Скрэбні // ЖП. — 2008. — № 14. — С. 4; Гарадняны, Валасова, Сасноўка… // ЖП. — 2008. — № 27. — С. 2; Карані мінуўшчыны // ЖП. — 2009. — 7 ліп. — С. 4.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Ларкова Н.В. (15.05.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ЛАСТОЎСКАЯ** РЭГІНА НОРБЕРТАЎНА (5.04.1948, в. Савічы Пастаўскага раёна Маладзечанскай вобл., цяпер Віцебскай вобл.), педагог, краязнаўца. Скончыла гіст. факультэт МДПІ (1972). Працавала ст. піянерважатай у Савіцкай СШ Пастаўскага раёна (1967–1972), дырэктарам Груздаўскай БШ (1972–1973), інструктарам школьнага аддзела Віцебскага абкама ЛКСМБ (сакавік – ліпень 1973), першым сакратаром Пастаўскага райкама ЛКСМБ (1973–1975), настаўніцай Пастаўская вячэрняй школы (1975–1980), настаўніцай, нам. дырэктара па выхаваўчай працы СШ № 2 г. Паставы (з 1980).



Вывучэнне гісторыі роднага краю пачала працуючы піянерважатай. Цікавіцца гісторыяй Паставаў і наваколля, аддаючы перавагу наступным тэмам: «Акупацыйны рэжым на Пастаўшчыне», «Дзеці вайны», «Воіны-інтэрнацыяналісты», «Вызваленне Пастаўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».

Мае актыўную грамадскую пазіцыю. Аўтар артыкула пра аднаўленне помніка польскім жаўнерам. Збірае фальклорныя матэрыялы. На аснове запісанай гісторыі матэрыялаў Р.Н. Ластоўскай і Н.М. Захарэвіч журналістка газеты «Звязда» Ляўковіч А. напісала артыкул «Рамэа і Джульета Дунілавіцкага павета».

Ініцыятар, стваральнік і кіраўнік музея баявой і працоўнай славы СШ № 2 г. Пастаў (з 4.11.1987). Ініцыятар адкрыцця мемарыяльнай дошкі каля клёна Героя (май 2004). Бярэ ўдзел у якасці навуковага кіраўніка вучнёўскіх навуковых канферэнцыях. Музей СШ № 2 г. Пастаў заняў І месца на конкурсе-аглядзе музеяў Віцебскай вобл.

Узнагароджана Граматай МА БССР (1988).

Тв: Запрашаем у музей // Звязда (П). — 1988. — 22 лют.; Свята музея // Звязда (П). — 1988. — 15 ліст.; Жыццё праз стагоддзі // Звязда (П). — 1992. — № 32, 33, 35; Свой край пазнаём // Звязда (П). — 1993. — 20 кастр.; Каханне зямное // Звязда. — 1995. — 20 мая; І цікава і карысна // ПК. — 1997. — 26 ліст.; Каб памяць жыла // ПК. — 2001. — 16 чэрв.; Саграваў нашы сэрцы // ПК. — 2001. — № 52–53; Красуйся, вёсачка радная // ПК. — 2001. — № 76; Патрыятычнае выхаванне — прыярытэтнае // ПК. — 2001. — № 99; Шкада, што «Памяць» не поўная // ПК. — 2002. — № 11; Глядзяць на вас з музейных стэндаў // ПК. — 2002. — № 63; Захоўваюць гісторыю // ПК. — 2002. — № 106; Сэрцам расказалі гісторыю вайны // ПК. — 2004. — № 35–36; Каб жыла памяць // ПК. — 2004. — № 112; Памяць загінуўшых воінаў варта ўвекавечыць па-людску // ПК. — 2004. — № 154–155; Музей вядзе пошук // Народная газета. — 2004. — № 170–171; Шануем пераможцаў, прадаўжаем пошук // ПК. — 2005. — № 31–32; Рыхтуем новы раздзел «Дзеці вайны» // ПК. — 2006. — № 11–12; Выпрабаванне на мужнасць // ПК. — 2006. — № 151–152; Жыві і помні // ПК. — 2006. — 10 ліст.; Усюды паспявае // ПК. — 2007. — № 7; Яны калісьці былі побач // ПК. — 2007. — № 85; Шчырая дапамога, сардэчная ўдзячнасць // ПК. — 2007. — № 97; Калі ўжо не будзе сведак // ПК. — 2008. — № 36.

Літ.: Пішч Г. Адкрыўся ў школе музей // ПК. — 1987. — № 137; Касцень А. Новая экспазіцыя музея // ПК. — 1990. — № 134; Ляўковіч А. Рамэа і Джульета Дунілавіцкага павета // Звязда. — 1995. — 19 жніўня; Рампольскі К. У музея юбілей // ПК. — 1997. — № 90; Дзеравянка Г. Сустрэча з воінамі-інтэрнацыяналістамі // ПК. — 1999. — № 18; Дзеравянка С. Загінулі ад рук акупантаў // ПК. — 2002. — № 61; Курыловіч П. Захоўваюць гісторыю // ПК. — 2002. — Ліст.; Шапалава А. Жыве памяць // ПК. — 2004. — № 28; Курыловіч П. Ціха шэпча клён героя // ПК. — 2004. — № 67; Кашырына Н. Мінулае не забываецца // ПК. — 2004. — 17 ліст.; Трубач І. Сустрэча з «афганцамі» // ПК. — 2006. — № 29; Захавальнікі і носьбіты гісторыі: юбілей музея СШ № 2 // ПК. — 2007. — № 89. — С. 2; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Ластоўская Р.Н. (23.09.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Ліст-каментар Ластоўскай Р.Н. (24.09.2008) // Тамсама.

**ЛЕАНЕНКА** СТАНІСЛАЎ ПЯТРОВІЧ (11.05.1970, в. Валкаўцы Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобл.), педагог. Скончыў ВДПІ (1992). Працуе ў Дабрыгорскай школе Бешанковіцкага раёна. Стварыў у школе этнаграфічны куток на аснове краязнаўчага матэрыялу, які збіраў разам з вучнямі. Члены гуртка пад яго кіраўніцтвам неаднаразова ўдзельнічалі ў рабоце раённай вучнёўскай канферэнцыі, дзе былі ўзнагароджаны за працы «Вёскі Бешанковіцкага раёна» (з тлумачэннем назваў вёсак), «Апавяданне пра валуны», «Парк Красавіцкага ў вёсцы Дабрыгоры», «Анатоль Ярмак» (пра жыццё і дзейнасць знакамітага мастака). Работы захоўваюцца ў школе.

Літ.: Белавус А. Краязнаўчыя даследаванні Бешанковіцкага раёна ў канцы XX – пачатку XXI ст.: [вучнёўская навуковая работа, 2008. — 6 с. // Захоўваецца ў Лужаснянскай школе-інтэрнаце-гімназіі.



**ЛЕАНЕНЯ** ВІКТАР ЛУК'ЯНАВІЧ (4.01.1940, в. Новыя Макраны Клецкага раёна Мінскай вобл.), паэт, гідратэхнік, краязнаўца. Скончыў Пінскі гідратэхнікум (1961) па спецыяльнасці «Будаўніцтва сельскіх ГЭС і гідрамеліярацыя», гідрафакультэт Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. Адслужыў тэрміновую службу ва УС СССР. Працаваў геадэзістам, вышукальнікам. Праводзіў даследаванні на Палессі, Вілейшчыне, Маладзечаншчыне, Мядзельшчыне, Віцебшчыне. Працаваў галоўным інжынерам полацкіх меліярацыйных арганізацый, начальнікам будаўнічай лабараторыі Віцебскмеліявадгаса.

Пачаў займацца літаратурнай дзейнасцю ў час службы ў войску. Пісаў нарысы, у тым ліку і на краязнаўчую тэматыку. Шматлікія вандроўкі, краявіды, прыкметныя асаблівасці пэўных рэгіёнаў, апавяданні мясцовых жыхароў пра гістарычныя падзеі падштурхнулі цікавасць да гісторыі, чытання і збору гістарычнай літаратуры. Пераехаў на пастаяннае месца жыхарства ў Полацк (1964), пачаў даследаваць мясцовую гісторыю. Вынікі росшукаў і свае меркаванні адносна помнікаў гісторыі і культуры горада пачаў друкаваць у мясцовым перыядычным друку. Паспрабаваў скласці храналогію «сталіцы першага беларускага княства ад старадаўніх часоў да нашых дзён». Праца над храналогіяй натхніла на напісанне некалькіх эсэ і нарысаў па гісторыі Полацка.

Цікавіцца гісторыяй населеных пунктаў і тапанімікай Полаччыны. Аўтар твора «Герадотава мора (нататкі меліяратара)». Аўтар зборніка вершаў «Хто можа схаваць агонь?», другі раздзел якога прысвечаны Полаччыне: «Грамы» (легенда аб паходжанні назвы раёна), «Купальскае дзіва» (легенда аб паходжанні полацкіх падзямелляў), «Першая сталіца», «Міёры», Браслаў», «Скарына», «Полацкая застава», «Святая Еўфрасіння», «Усяслаў Чарадзей» і інш. Працуе над хронікай жыцця сялянскай сям'і ад канца XIX ст. да нашых дзён, рабочая назва «Маё касмічнае месца».

Мае ненадрукаваня працы: «Храналогія Полацка з V ст. да нашых дзён», «Полацкія версіі» (нататкі, эсэ, нарысы пра гістарычныя падзеі ў Полацку), «Полацкія былі» (цыкл вершаў, прысвечаных Полацку, рукапіс перададзены ў бібліятэку імя Я. Купалы), «Эротыка і любоўныя ўцехі ад старажытнасці да нашых дзён» (эсэ), «Водяной дух. Из истории мелиорации Витебщины и Полотчины». Перадаў у ПКМ каменную сякеру, якая была знойдзена каля в. Перавоз Расонскага раёна, а таксама некаторыя інш. рэчы.

Тв.: Герадотава мора: Нататкі мэліяратара // Arche. — 2005. — № 1 (35). — Рэжым доступу: http://arche.bymedia.net/2005-1/leanienia105.htm; Працяг трагедыі // Маладосць. — 1990. — № 6; Меліяраваць разумна: [Віцебшчына] // РП. — 1991. — № 4. — С. 3.

<u>Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку</u>: Дзень учорашні, дзень сённяшні // СК. — 1985. — № 84. — С. 3; Буракі // СК. — 1985. — № 104. — С. 3; Зберажом нашы рэкі // СК. — 1986. — № 115. — С. 3; Вераванні і час // СК. — 1986. — № 117. — С. 4; Паглядзім гораду ў твар // СК. — 1987. — № 191. — С. 3; Ствараць прыгажосць // СК. — 1988. — № 101. — С. 3; Кропля вады камень точыць // СК. — 1989. — № 126. — С. 3; Адкуль цячэ рака Серабранка? // ПВ. — 1990. — № 157, 159; Расплата. Сумныя развагі ля Дзвінскай вады // ВР. — 1990. — № 217. — С. 4; Тваё імя чалавек // ПВ. — 1991. — № 47. — С. 2; Што мелі?: [сельскагаспадарчая вытворчасць у Полацкім пав. у XIX ст.] // ПВ. — 1991; Вярнуць гістарычную памяць: [назвы вуліц Полацка] // ПВ. — 1991; Ці ёсць надзея?: [лёс Полацкага летапісу] // ПВ. — 1991; Скажонае аблічча Святой Еўфрасінні: [лёс царквы Спаса ў Полацку] // Народная воля. — 2004; Вёскі і мястэчкі // ПВ. — 2006. — № 20. — С. 5; Салаўіны ручай: [з гісторыі назваў вуліц Полацка] // ПВ. — 2007.

**ЛЯСКОЎСКІ** УЛАДЗІСЛАЎ КАНСТАНЦІНАВІЧ (*Канстанцінаў*) (23.08.1933 (па пашпарце 8.07.1934), в. Запруддзе Навапагосцкай гміны Віленскага ваяв., цяпер Шаркоўшчынскі раён Віцебскай вобл.), педагог, краязнаўца. Скончыў ВДПІ (1961). Працаваў настаўнікам у школах Відзаўскага і Шаркоўшчынскага раёнаў (1954–1965), служыў у войску (1956–1958), дырэктарам школы (1965–1966), інспектарам Шаркоўшчынскага рана (1967–1994).



Займацца краязнаўствам пачаў у 1950-я гг. Даследуе гісторыю і культуру Шаркоўшчынскага раёна і былога Дзісненскага пав. Браў удзел у стварэнні музея ў Шаркоўшчынскай СШ № 1. Аўтар артыкулаў у кнігах «Памяць» Мёрскага і Шаркоўшчынскага раёнаў. Сааўтар кнігі «Германавічы». Падрыхтаваў і выдаў кнігу «Шаркоўшчына і наваколле (гістарычная хроніка)» (2009), якая складаецца з матэрыялаў, сабраных аўтарам і перакладаў артыкулаў з польскай мовы. Аўтар больш за 100 артыкулаў у навуковым, рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку: «Настаўніцкая газета», «Наша слова», «Пагоня», «Кліч Радзімы», рэгіянальны бюлетэнь «Бацькаўшчына», ілюстраваны бюлетэнь «Нашы карані». Мае ненадрукаваныя працы «Лужэцкая школа ксяндзоў-піяраў», «Змова Канарскага».




Браў удзел у краязнаўчых канферэнцыях, якія ладзіліся ў 1990 – пач. 2000-х гг.: Браслаўскія чытанні, Дзісненскія чытанні. Супрацоўнічае з Германавіцкім культурна-асветніцкім цэнтры імя Я. Драздовіча, Віцебскім аддзелам фонду імя Л. Сапегі, ТБМ.

Выдатнік народнай асветы (1983). Узнагароджаны знакам Педагагічнага таварыства БССР «За актыўную працу» (1976), знакам ЦК ВЛКСМ «За освоение целины» (1957).

Тв.: Кнігі: (разам з А. Адамковічам, А. Райчонак) Германавічы. — Паставы: Сумежжа, 2006. — 95 с.; Шаркоўшчына і наваколле: гістарычная хроніка / уклад. У. Ляскоўскі. — Паставы: Сумежжа, 2009. — 95 с.

Артыкулы ў кнігах «Памяць»: Удзельнікі паўстання 1831 года з Дзісненскага пав. // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Міёрскага раёна. — Мн.: Бел. навука, 1998. — С. 107–109; Удзельнікі паўстання 1863–1864 гг. // Тамсама. — С. 111; Паўстанне 1831 г. у Дзісненскім павеце // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Шаркоўшчынскага раёна. — Мн.: БелЭн, 2004. — С. 51–53, 73–75; Знакамітыя роды, знітаваныя лёсам з Шаркоўшчынай // Тамсама. — С. 77–83, 141–142, 187–190; (разам з К. Кожанам) Аб раскулачванні сялянскіх гаспадарак // Тамсама. — С. 191–193, 277–281.

Артыкулы ў навуковым друку: Спадзяючыся пабачыць праўду // БГЧ. — 1993. — № 4; Антыпартызанская аперацыя «Герман» // Браслаўскія чытанні: матэрыялы VI навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 150-й гадавіне з дня нараджэння браслаўскага лекара, грамадскага дзеяча Станіслава Нарбута (1853–1926), 7–8 мая 2003 года. — Браслаў, 2003. — С. 67–70; Леў Сапега — уласнік Шаркоўшчыны // Вялікі канцлер Вялікага княства. Да 450-годдзя з дня нараджэння Льва Сапегі: зб. матэрыялаў I Міжнародных Сапежанскіх чытанняў, 3–4 снежня, Брэст, II і III Рэспубліканскіх Сапежанскіх чытанняў у Віцебску–Астроўна, 28–29 чэрвеня 2003 г., 28–29 кастрычніка 2006 г.); склад., рэд. Г.М. Праневіч. — Мн.: І.П. Логвінаў, 2007. — С. 142–143.

Артыкулы ў перыядычным друку: Ажывае мінулае // НГ. — 1990. — 2 сак. — С. 4; Пад шатамі машараўскіх дубоў // НГ. — 1990. — 16 мая. — С. 3; Пад шатамі машараўскіх дубоў // КР. — 1990. — № 63. — С. 3; Хвасцізм // КР. — 1994. — № 8. — С. 3; Тым багацейшымі духоўна будзем // КР. — 1994. — № 44. — С. 3; Раскулачванне — гэта генацыд // Пагоня (Гр). — 1998. — 17, 19, 24 ліст.; Раса нябёсаў // КР. — 1999. — 17 лют.; Радаводы знакамітых уладальнікаў Шаркоўшчынскай зямлі // КР. — 1999. — № 89, 92, 93; Плятары // КР. — 1999. — № 94. — С. 4; Канаплянскія // КР. — 1999. — № 101. — С. 4, — 2002. — № 2. — С. 4; Архівы расказваюць // КР. — 2000. — 17 мая. — С. 4; Калектывізацыя № 2 // Крэсы. — 2000. — № 9, лістапад; Шырыны // КР. — 2002. — № 3, 5; Трагічная ноч // НВ. — 2002. — 26 крас.; Шляхціцы Канаплянскія // НСл. — 2004. — № 10; Спіс паўстанцаў 1863 года ў Дзісненскім павеце // НСл. — 2004. — № 15; Шляхта Вярыгі гербу «Шранява» // НСл. — 2004. — № 16; Графы Лапацінскія гербу «Любіч» // НСл. — 2004. — 31 сак.; Шаркоўшчынская зямля // Нашы карані. — 2005. — № 16. — С. 4–32; Паўстанне Дзісненскага павету // НСл. — 2006. — № 21–23; Спіс удзельнікаў паўстання 1831 г. у Дзісненскім павеце // НСл. — 2006. — № 13. — С. 3.

Артыкулы ў бюлетэні культурна-асветніцкага цэнтра «Бацькаўшчына» (Германавічы): Новае старое // Б. — 2000. — № 2; Род Канаплянскіх і іх роля // Б. — 2000. — № 3; З гісторыі Дзісненскага ўезда // Б. — 2000. — № 6; Зяновічы // Б. — 2000. — № 10; Калектывізацыя № 2 // Тамсама; Графы Лапацінскія // Б. — 2000. — № 11; Род Вазгірдаў // Б. — 2001. — № 1; Гістарычныя звесткі аб Шаркоўшчыне // Б. — 2001. — № 3, 4, 6; Адукацыя ў раёне ў 1941–1944 гадах // Б. — 2001. — № 12; Шляхецкі род Федаровічаў // Б. — 2002. — № 2; Трагічны юбілей // Б. — 2002. — № 5; Паўстанне «зялёных» у 1919 г. у Дзісненскім павеце // Б. — 2002. — № 11; Беларуская мова ў царкве 180 год таму назад // Б. — 2003. — № 1; Вернутыя імёны // Б. — 2003. — № 2; Наш зямляк Арцём Вярыга // Б. — 2003. — № 4–5; Партызанскі рух і антыпартызанская аперацыя «Герман» // Б. — 2003. — № 6–7; Шаркоўшчыне — 500 год // Б. — 2003. — № 8; Антысавецкі рух у раёне // Б. — 2003. — № 11; Радавод Сапегаў // Б. — 2003. — № 11–12; У нас была прававая дзяржава //

Б. — 2004. — № 2; Шляхціцы Канаплянскія. Графы Плятары // Б. — 2004. — № 4; Нашы землякі, якія загінулі ў арміі Андэрса // Б. — 2004. — № 6; Хроніка вайны. Альтэрнатыўны погляд // Тамсама; Паўстанне Дзісненскага павету // Б. — 2006. — № 2; Кароткая гісторыя будаўніцтва чыгункі Варапаева – Друя // Б. — 2007. — № 6; Беразвечча — дарога смерці // Б. — 2009. — № 4–5.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Ляскоўскі У.К. (15.11.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ЛЯЎКО** ВОЛЬГА МІКАЛАЕЎНА (21.5.1947, в. Астравок Капыльскага раёна Мінскай вобл.), археолаг. Кандыдат гіст. навук (1980), доктар гіст. навук (2000). Скончыла гіст. факультэт БДУ (1972). Працуе ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі на розных пасадах (з 1970). Загадчык Цэнтра гісторыі даіндустрыяльнага грамадства і аддзела захавання і выкарыстання гістарычнай спадчыны Інстытута гісторыі НАН Беларусі (з 2006).

Вывучае гісторыю віцебскай зямлі, матэрыяльную культуру XIV–XVIII стст. Даследавала старажытныя беларускія гарады (Віцебск, Орша, Гарадок, Талачын, Копысь), замкі (Езярышча, Смальяны, Шклоў), Куцеінскі (Орша) і Святадухаўскі (Віцебск) манастыры, гарадзішчы, курганныя могільнікі, селішчы паўночна-ўсходняй Беларусі эпохі жалеза і сярэдневякоўя. Абараніла кандыдацкую дысертацыю «Витебск XIV–XVIII вв. (по археологическим данным)» (1980, навуковы кіраўнік Г.В. Штыхаў), доктарскую дысертацыю «Формирование и развитие территориально-административных центров северо-восточной Беларуси в IX–XVIII ст.» (2000), прадметам даследавання якой з'яўляецца фарміраванне і развіццё тэрытарыяльна-адміністрацыйных цэнтраў усходняй Віцебшчыны перыяду сярэднявечча. Аўтар шматлікіх артыкулаў ў навуковым і перыядычным друку на тэмы археалогіі і матэрыяльнай культуры Віцебшчыны.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Прэзідыума НАН Беларусі, Ганаровай граматай Аршанскага гарвыканкама «За паспяховую дзейнасць, карысную для Оршы, уклад у развіццё горада» (2002).

Тв.: Кнігі: Витебские изразцы XIV–XVIII вв. — Мн.: Наука и техника, 1981. — 46 с.; Витебск XIV–XVIII вв. — Мн.: Наука и техника, 1984. — 120 с.; Экскурсия по древнему Витебску. — Мн.: Полымя, 1984. — 32 с.; Торговые связи Витебска в X–XVIII вв. — Мн.: Наука и техника, 1989. — 85 с.; Средневековое гончарство северо-восточной Белоруссии. — Мн.: Наука и техника, 1992. — 63 с.; Средневековая Орша и ее округа: историко-археологический очерк. — Орша: Оршанская типография, 1993. — 51 с.; Культовые памятники Орши к XVI–XVIII вв.: историко-археологическое исследование. — Орша: Оршанская типография, 1996. — 52 с.; Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси: Формирование и развитие. — Мн.: Бел. наука, 2004. — 280 с.; Витебск. — Мн.: Бел. наука, 2010. — 335 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Памятники второй половины I тыс. н.э. северо-восточной Белоруссии в свете формирования племенных княжеств // Гісторыка-археалагічны зборнік. — 1994. — № 5; Смаленска-Полацкае памежжа ў Верхнім Падняпроўі (па археалагічных і пісьмовых крыніцах) // Гісторыка-археалагічны зборнік. — 1997. — № 12; Население Днепро-Двинского междуречья в VI–XI вв. // Труды VI МКСА. — Т. 3. — М., 1997; Племенные структуры, погосты и волости Оршанского Поднепровья в конце I – начале II тысячелетия // Веснік МДУ. — 2001. — № 1; Улица Подвинская в Витебске (археологическое изучение в 1979–1998 годах) // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. — 2003. — № 6.

Літ.: Ляўко В.М. // ЭГБ. — Т. 4. — С. 427; Ляўко В.М. // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. — Мн.: БелЭн, 1993. — С. 383; Корзенко Г.В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник. — Мн.: Бел. наука, 2007. — С. 217–218.



**МАГІЛЬНІЦКІ** УЛАДЗІМІР ЯРАСЛАВАВІЧ (5.09.1943, в. Вайшкуны Пастаўскага раёна), краязнаўца. Скончыў гіст. факультэт БДУ (1974). Працаваў на камсамольскай і партыйнай рабоце, начальнікам Пастаўскай раённай інспекцыі аховы прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя (1989–2005).

Комплексна даследуе Пастаўшчыну, аддаючы перавагу вывучэнню прыроды, экалагічнага стану краю. Вывучае крыніцы. Цікавіцца прыродай, гісторыяй і культурай краю пачаў у дзяцінстве. Аўтар кніг «Природа Поставского края», «Мая вёсачка Вайшкуны». Мае ідэю падрыхтаваць комплексную працу, прысвечаную г.п. Лынтупы, крыніцам Пастаўшчыны, другое выданне кнігі «Прырода Пастаўскага краю» (удакладненнае і дапоўненае).

Узнагароджаны ордэнам «Знак пашаны» (1978), трыма медалямі, граматамі аблвыканкама, Міністэрства прыродных рэсурсаў.

Тв.: Шчэрбніцкія крыніцы // ПК. — 1999. — 3 лют. — С. 2; Природа Поставского края. — Молодечно: Победа, 2000; (разам з К.І. Козак) Прырода раёна // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Пастаўскага раёна. — Мн.: БелТА, 2001. — С. 22–28; Мая вёсачка Вайшкуны. — Мн.: Кнігазбор, 2010.
Літ.: Природа Поставского края: [рэцэнзія] // ПК. — 2000. — № 91. — С. 3.

**МАЖЭЙКА** ЗІНАІДА ЯКАЎЛЕЎНА (в. Аношкі Лепельскага раёна), даследчык. Кандыдат мастацтвазаўства. Брала ўдзел у стварэнні музыкальна-этнаграфічнай стужкі «Галасы вякоў», «Пранясі, Божа хмару», «Крывыя вечары» і інш. Выдала зборнік фальклору, запісанага на Лепельшчыне. Жыве ў Мінску.

Літ.: Януш І. Адкуль мы пайшлі // ЛК. — 2000. — № 50. — С. 2.

**МАЗУР** АЛЕСЬ УЛАДЗІМІРАВІЧ (1940, в. Стары Свержань Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобл. – 2009), журналіст. Доўгі час працаваў у талачынскай раённай газеце «Сцяг Ільіча» (цяпер «Наша Талачыншчына»), часта друкаваўся ў «ЛіМе», «Чырвонай змене», «Настаўніцкай газеце», «Віцебскім рабочым», «Віцебскім кур'еры», у часопісах «Беларусь», «Маладосць», «Полымя». Аўтар артыкулаў па гісторыі і культуры Віцебшчыны на старонках перыядычнага друку. Браў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці рэгіёна. Адзін з стваральнікаў у Талачыне народнай літаратурнай гасцёўні «Друць», яе ганаровы член. Член Саюза пісьменнікаў. Аўтар паэтычных зборнікаў «Святліца», «Мы — жыцця галінкі».

Тв.: Палову жыцця з кінакамерай // ВР. — 2000. — 3 чэрв.; Как прекрасен этот мир: [кінавідэаклуб «Летапіс»] // НТ. — 2001. — № 8. — С. 2; Друцкае Евангелле // ВК. — 2001. — № 58. — С. 3; Духоўная сувязь стагоддзяў: [Талачын] // ВК. — 2001. — № 68. — С. 3; Тут працаваў Колас: [в. Сані Талачынскага раёна] // ВК. — 2001. — № 81. — С. 2; Сяброўскі аўтограф Караткевіча // ВК. — 2002. — № 2. — С. 3; Як праславілі «Ручнікі»: [Вера Вярба] // ВК. — 2002. — № 7. — С. 3; Палатно нялёгкага лёсу: [тэкстыльная фабрыка ў Талачыне] // ВК. — 2002. — № 21. — С. 2; «Ты помнишь, Алёша…»: [Сіманаў на Талачыншчыне] // ВК. — 2002. — № 35. — С. 3; Старонкі гісторыі: [Барысаў камень каля в. Вялікі Гарадзец] // ВК. — 2002. — № 53. — С. 3; Іх шлях ляжаў праз Талачын // ВК. — 2002. — № 63. — С. 3; Згадкі пра Караткевіча з далёкай Амерыкі // ВК. — 2003. — № 15. — С. 3; Каб прыгажэў родны горад: [Талачын] // ВК. — 2003. — № 61. — С. 4; О славе Толика Казбека: [Таплавердыеў М. — партызан на Талачыншчыне] // ВК. — 2004. — № 44. — С. 3; Настоящий герой — без геройского звания: [Усаў А., ураджэнец в. Барэцк Дубровенскага раёна, у бai знішчыў 22 фашысцкіх танка] // ВК. — 2005. — № 14. — С. 3; Он сказку делал былью: [К. Рамановіч] // ВК. — 2005. — № 25. — С. 3; Опрокинутое небо: [Гастон Ж., лётчык эскадрыллі «Нармандыя–Нёман»] // ВК. — 2005. — № 47. — С. 3; Другое жыццё старога парка: [Забайкал, Талачынскі раён] // ВК. — 2005. — № 83. — С. 4.
Літ.: Шнэйдар А. Споведзь шчырай душы: [паэт А. Мазур] // НТ. — 2001. — № 67. — С. 2; «Пайшоў, ніколі ўжо не вернецца…»: [электронны рэсурс] // ВР: [сайт]. — Рэжым доступу: http://www.vitnews.by/arhiv2009/Arhiv_6_1501.html.

**МАЙСЁНАК** АЛА ПЯТРОЎНА, педагог, краязнаўца. Працуе дэфектолагам у Дзісненскай школе-інтэрнаце. Разам з настаўнікам гісторыі школы-інтэрната Л.М. Фурсавым, пры дапамозе В.А. Ермалёнка стварыла музей у школе. Музей мае 2 раздзелы: першы прысвечаны гісторыі Дзісны, у якім распрацаваны тэмы: «Славутыя імёны», «Замак», «Вогненныя гады», «Яўрэі ў жыцці горада». У другім, этнаграфічным, прадстаўлены рамёствы Дзісненшчыны і народная творчасць.

Тв.: Дзісненскай школе-інтэрнату — 40 год. Музей ў Лявонпалі // СП (М). — 2000. — № 87. — С. 2, 4.
Літ.: Шымуковіч Ф. Паміраючы горад // СП (М). — 2000. — № 10. — С. 3.



**МАЙСЯЁНАК** АНДРЭЙ ГЕОРГІЕВІЧ (*Андрэй Дзіснёнак*) (1.06.1943, г. Глыбокае), вучоны ў галіне біяхіміі і вітаміналогіі, гісторык медыцыны, краязнаўца. Член-карэспандэнт НАН Беларусі (2000), акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі (1997), доктар біялагічных навук (1996), прафесар (1997). Скончыў Варапаеўскую СШ (1959), Гродзенскі медыцынскі інстытут (1965), аспірантуру пры ім (1968). Абараніў кандыдацкую дысертацыю (1971). Працаваў у мединстытуце, а з 1970 г. вучоным сакратаром, загадчыкам лабараторыі, нам. дырэктара па навуковай працы, в.а. дырэктара (1996–1998) Аддзела рэгуляцыі і абмену рэчываў АН БССР (з 1980 г. Інстытута біяхіміі АН БССР, г. Гродна). Аўтар больш за 500 навуковых прац, 6 манаграфій, 15 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы. Аўтар шматлікіх артыкулаў па гісторыі медыцыны Беларусі. Навуковы кіраўнік больш за 20 абароненых кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Выхоўваўся ў сям'і ўрача. Атачэнне, лад жыцця спрыялі фарміраванню любові да Радзімы, цікавасці да яе гісторыі і культуры. Настаўнікам музыкі быў В. Сушко. Бацькі сябравалі з Г.І. Цітовічам. Маці працавала завучам СШ у м. Лужкі, дзе пасля вайны працаваў Я. Драздовіч.

Даследуе гісторыю Дзісненскага краю. Адзін з першых прыцягнуў увагу да жыцця і лёсу Я. Драздовіча, удакладніў шэраг фактаў з яго біяграфіі, час, месца і абставіны смерці. Сабраў вялікую колькасць матэрыялаў па гісторыі Шаркоўшчыны.

Вядзе актыўную грамадскую і краязнаўчую працу. Адзін з арганізатараў краязнаўчай працы на Гродзеншчыне ў канцы 1980-х – 1990-я гг. З'яўляўся намеснікам старшыні камісіі Гродзенскага абласнога савета дэпутатаў па навуцы, культуры і адукацыі (1989–1996). Старшыня Гродзенскай краязнаўчай асацыяцыі (1989–2003). Адзін з арганізатараў Браслаўскіх, Дзісненскіх, Навагрудскіх краязнаўчых чытанняў у рамках праграмы «Наш радавод» пры Гродзенскім абласным аддзяленні БФК. Ініцыятар вяртання імя доктара С. Нарбута ў гістарычную спадчыну Браслаўшчыны. Аўтар ідэі стварэння беларускага фонду А. Міцкевіча. Займаецца стварэннем нацыянальнага фонду рукапісаў, старадрукаў, рэдкай кнігі і перыёдыкі імя Я.Л. Храптовіча. Выступае ў СМІ па праблемах вывучэння і захавання гісторыка-культурнай спадчыны, гісторыі медыка-біялагічных навук. Адзін з ініцыятараў выдання «Краязнаўчай газеты».

Аўтар артыкулаў пра вядомых землякоў у кнігах «Памяць» Браслаўскага, Глыбоцкага, Міёрскага, Шаркоўшчынскага раёнаў, а таксама г. Гродна. Даследаваў малавядомыя старонкі жыцця Я. Драздовіча, ураджэнца в. Чарневічы (Глыбоччына), камбрыга, камендanta г. Ленінграда П.В. Пугачэўскага, медыкаў з Глыбоччыны У. Шырана і М. Алехны-Гушчы і інш. Перадаў шэраг рэчаў і кнігазбораў у Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей, Браслаўскі гісторыка-краязнаўчы музей, Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей, Германавіцкі музей мастацтва і этнаграфіі. Для кнігі «Памяць» Шаркоўшчынскага раёна напісаў «Нарысы з жыцця сям'і», якія не былі надрукаваны. Артыкулы на краязнаўчую тэматыку друкаваліся ў рэспубліканскіх («Свіцязь», «Чырвоная змена», «Краязнаўчая газета») і мясцовых («Браслаўская звязда», «Веснік Глыбоччыны», «Кліч Радзімы», «Міёрскія навіны») перыядычных выданнях.

Мае бібліятэку, якая налічвае больш за 5 тысяч тамоў, з вялікай колькасцю літаратуры на краязнаўчую тэматыку, прыватны архіў, у якім утрымліваецца значны матэрыял па гісторыі медыцыны Беларусі, гісторыі Гродзенскага медыцынскага інстытута. Ініцыятар усталявання помнікаў С. Нарбуту і Грунвальдскай бітве ў Гродна. Браў удзел у стварэнні музея-аптэкі ў Гродна. Перадаў туды лекі міжваеннага часу, якія захоўваў бацька. Некаторыя матэрыялы перадаў у Музей гісторыі медыцыны.

Узнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку», лаўрэат міжнароднай польскай прэміі за беларуска-польскае супрацоўніцтва ў галіне культуры, прэміі імя Б. Кіта (2003).

Тв.: Артыкулы ў кнігах «Памяць» і навуковым друку: Генерал з Чарневіч: [П.В. Пугачэўскі] // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 164–165; Крыжовы шлях лекараў з Глыбоччыны // Тамсама. — С. 173–174; Светаадчуванне і жыццёвы шлях Э. Плятар // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Браслаўскага раёна. — Мн., 1998. — С. 174–179; Станіслаў Нарбут // Тамсама. — С. 202–206; Вянцэслаў Пелікан // Тамсама. — С. 209–210; Доктар Шыран з вёскі Лужкі // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Шаркоўшчынскага раёна. — Мінск: БелТА, 2004. — С. 144–146; (разам з П. Шарэйка) В. Пелікан: Ад Слоніма да Браслаўшчыны // Браслаўскія чытанні: матэрыялы II навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 925-годдзю Браслава (1065–1990), 16–17 лютага 1991 г. / навук. рэд. М.А. Ткачоў. — Браслаў: Браслаўскі філіял Пастаўскай узбуйнёнай друкарні, 1991. — С. 45–53; Ад Рубана да Хронана: Светаадчуванне і жыццёвы шлях Эміліі Плятэр // Браслаўскія чытанні: матэрыялы

III навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 200-м угодкам паўстання 1794 года, 21–22 красавіка 1994 г. — Браслаў: Браслаўскі філіял Пастаўскай узбуйнёнай друкарні, 1994. — С. 43–49; Памяці вялікага гуманіста // Браслаўскія чытанні: матэрыялы VI навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 150-й гадавіне з дня нараджэння браслаўскага лекара, грамадскага дзеяча Станіслава Нарбута (1853–1926), 7–8 мая 2003 года. — Браслаў, 2003. — С. 7–8.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Доктар Шыран з вёскі Лужкі // КР. — 1988. — № 114–115; Слаўнае імя Прыдзвіншчыны // КР. — 1988. — № 136. — С. 2; Доктар Нарбут // БЗ. — 1989. — № 67, 69; Хвароба і скананне вандроўнага мастака // ЛіМ. — 1989; Венцыслаў Пелікан // БЗ. — 1991. — № 120. — С. 3, 4; Трагедыя Жынёў з Мікуліч // ВГл. — 1994. — № 10. — С. 3; Генерал з Чарневічаў // ВГл. — 1994. — № 11, 17, 18, 20 . — С. 2; Пастаўскі сюжэт у жыцці акадэміка астранаўтыкі // Сумежжа. — 1994. — № 14–19; Імя, вернутае з нябыту: [С. Нарбут] // БЗ. — 1996. — № 26. — С. 2; Старонкі гісторыі Друйскай аптэкі і яе ўладальнікаў // Павет. — 2001. — № 2, верасень. — С. 4; Памяці Станіславы Герасімовіч // Павет. — 2004. — № 9 (34), верасень. — С. 7; Старонкі гісторыі Друйскай аптэкі // БЗ. — 2004. — № 84. — С. 3.

Літ.: Майсяёнак А.Г. // ЭГБ. Т. 6. Кн. 2. — Мн., 2003. — С. 411; Ігнатовіч Ф., Талерчык А. Навуковец, краязнавец // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 420: [фота]; Кожан К. Навуковец і краязнавец // КР. — 2004. — № 29. — С. 2: [фота]; Навасельскі Л. Навукоўца і краязнавец // МН. — 2004. — № 70. — С. 3; Журавлёв В. «Суха теория, мой друг, а древо жизни пышно зеленеет» // Биржа информации. — 2004. — № 46. — С. 8.



**МАКАРАЎ** МАКСІМ ДЗМІТРЫЕВІЧ (31.12.1976, г. Віцебск), гісторык, краязнаўца. Скончыў СШ № 31 г. Віцебска, гіст. факультэт БДУ (1998), аспірантуру пры Торуньскім універсітэце М. Каперніка (РП). Кандыдат гіст. навук (2006). Працуе ст. навуковым супрацоўнікам у РУП «Тэхнапарк» БНТУ «Металіт».

Вывучае гісторыю Падзвіння, г. Віцебска XIV–XVI стст. Займацца краязнаўчымі даследаваннямі пачаў у канцы 1988 г., калі стаў браць удзел у працы гісторыка-краязнаўчага гуртка пад кіраўніцтвам А.В. Куржалава. Пэўны ўплыў аказала І.А. Абрамава, якая працавала настаўніцай гісторыі.




Браў актыўны ўдзел у працы віцебскага гісторыка-культурнага грамадскага аб'яднання «Узгор'е», клубах гіст. рэканструкцыі. Абараніў дысертацыю на тэму «Ад пасаду да магдэбургіі. Юрыдычнае становішча насельніцтва гарадоў Беларускага Падзвіння ў 14–16 ст.», аснову якой склалі матэрыялы па гісторыі Віцебска, Полацка, Суража, Улы, Дзісны. На аснове матэрыялаў даследавання выдаў кнігу «Ад пасада да магдэбургіі. Прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – першай палове XVII ст.». Аўтар артыкулаў, прысвечаных некаторым населеным месцам Віцебшчыны, у «Энцыклапедыі ВКЛ», у навуковым, перыядычным рэспубліканскім і мясцовым друку. Актыўны ўдзельнік рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцый (з 2003).

Тв.: Ад пасада да магдэбургіі: Прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – першай палове XVII ст. — Мн.: Экаперспектыва, 2008. — 248 с.; Полацкае права // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. — Мн.: БелЭн, 2006. — Т. 2. — С. 449 — 451; Сураж // Тамсама. — С. 646; Ула // Тамсама. — С. 685–686; Віцебская зямля ў XIII–XVIII стст. // Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы. — Мн.: Паркус плюс, 2008. — С. 75–85.

Артыкулы ў зборніках навуковых артыкулаў: Да пытання пра выкарыстанне тэрміну «Данжон» (donjon) у беларускай гістарычнай літаратуры // Гістарычны альманах. — 2001. — Т. 5; Віцебскае мейскае права // Гістарычны альманах. — 2003. — Т. 8; Віцебскае мейскае права // Материалы международной научно-теоретической конференции «Славянский мир и славянские культуры в Европе и мире: Место и значимость в развитии цивилизаций и культур (история, уроки, опыт, современность)», 31 октября – 1 ноября 2002 г., г. Витебск. — Витебск: ВДУ, 2002; Полацкі і Віцебскі земскія прывілеі: Да гісторыі стварэння тэкстаў дакументаў // Białoruskie Zeszyty Historyczne. — № 20. — Białystok, 2003; Мейскія ўлады Віцебска да ўвядзення магдэбургскага права, канец 15 ст. – 1597 г. // Гістарычны альманах. — 2004. — Т. 10; Крупенічы: Гісторыя віцебскага мяшчанскага роду XVI ст. // Архіварыус. — 2006. — Вып. 4. — С. 159–167; Віцебская зямля ў XIII–XVIII стст. // Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І.А. Абрамава [і інш.]; аўт.-уклад. М.В. Півавар. — Мінск: Паркус плюс, 2008. — С. 75–85; Witebskie prawo miejskie w XVI wieku // Zapiski historyczne. — T. LXVIII. — 2003. — Z. 1. — S. 7–17.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Гісторыя таго часу: [Лівонская вайна] // ВК. — 1992. — № 28. — С. 6; Дапамога не паспела: [аблога Віцебска ў 1654 г.] // ВК. — 1992. — № 47. — С. 4.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Макараў М.Д. (6.11.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**МАКЕЕНАК** ВЕРА ІВАНАЎНА, бібліятэкар у бібліятэцы-клубе в. Лісна Верхнядзвінскага раёна. Вядзе краязнаўчы гурток, стварыла музейную калекцыю, падрыхтавала альбомы па гісторыі краю. Збірае вусную народную творчасць.

Літ.: Пакульневіч Я. «Курганы шмат аб чым нам гавораць…»: [Верхнядзвінскі дэндрапарк] // ДзП. — 2001. — № 94. — С. 2.



**МАЛІНОЎСКІ** МІХАІЛ (Міхась) МІХАЙЛАВІЧ (25.07.1945, в. Угрынь (х. Ровеста) Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобл.), краязнаўца, журналіст. Выхоўваўся ў Парэцкім дзіцячым доме № 2, вучыўся ў Парэцкай рускай СШ, Ашмянскай школе-інтэрнаце Гродзенскай вобл. Член Саюза журналістаў СССР (1976), правадзейны член Геаграфічнага таварыства пры АН СССР (1979). Служыў ва УС СССР 27 гадоў.

Аўтар 12 выданняў на краязнаўчую тэматыку, сярод якіх ёсць прысвечаныя Віцебшчыне («З берагоў Друці і да р. Мышанкі»).

Узнагароджаны 10 медалямі СССР, узнагародамі ЦК ВЛКСМ, нагруднымі знакамі «Прапагандысту кнігі» (1970), «Выдатнік друку Беларусі» (2005), ганаровымі граматамі міністэрстваў РБ.

Тв.: Кнігі: З берагоў Друці і да р. Мышанкі. — Баранавічы: БелАніГал, 2008. — 240 с.

Артыкулы ў перыядычным друку: Шнэйдэр — кравец-творца, які «шые» кінастужкамі гісторыю роднага краю // Культура. — 2001. — 3, 6 крас.; Адкуль твая назва, горад // НТ. — 2001. — № 91. — С. 2; Кукавала зязюля ў Талачынскім лесе: [Тэрэза Гардзялкоўская] // НТ. — 2004. — № 67. — С. 2; Ад Панчанкі з Талачына ў зніклыя Гедэйкі // НТ. — 2005. — № 119. — С. 3; Заўсёды побач творчасць і праца // НТ. — 2005. — 12 кастр.

**МАЛЧУН** ЛІДЗІЯ АРКАДЗЕЎНА (23.08.1949, в. Сідоры Глыбоцкага раёна Віцебскай вобл.), гісторык, архівіст. Скончыла СШ у г. Глыбокае, МДПІ (1977). Працавала ў аддзеле камплектавання, ведамасных архіваў і экспертызы каштоўнасці дакументаў філіяла ДАВВ у г. Глыбокае на розных пасадах (з 1972). З 2001 г. — дырэктар гэтай установы.

Асаблівую ўвагу надае ўдасканаленню матэрыяльна-тэхнічнай базы, камплектаванню архіва і працы з ведамствамі, забеспячэнню захаванасці дакументаў. Брала ўдзел у падрыхтоўцы зборнікаў дакументаў: «Витебщина архивная: история, фонды, персоналии (сер. XIX–XX вв.)» (2002), «Витебск: классика и авангард. История Витебского художественного училища в документах Государственного архива Витебской области (1918–1923)» (2004), «Выстояли и победили. Свидетельствуют архивы» (2005).

Узнагароджана медалём «Ветэран працы», знакамі «Выдатнік архіўнай справы», «Ганаровы архівіст Беларусі».

Літ.: Раслевіч З. М. Малчун Л.А. // Архівісты Беларусі: біябібліяграфічны даведнік / склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. — Мн.: БелНДІДАС, 2006. — С. 149.

**МАМЯКА** АНАСТАСІЯ ПРАКОПАЎНА (†), былая настаўніца біялогіі. Пражывала ў в. Варкуды Ушацкага раёна. Склала гісторыю школы ў в. Гарбаціца Ушацкага раёна. У раённай газеце асвятляла некаторыя старонкі гісторыі Варкудскага с/с.

Тв.: Люблю свой край, старонку гэту // П. — 2000. — № 48, 52, 56.

**МАНДРЫК** ІВАН АДАМАВІЧ, краязнаўца. Аўтар шэрагу артыкулаў у перыядычным друку, у якіх закранае пытанні гісторыі, культуры Віцебшчыны, пераважна савецкага перыяду.

Тв.: Артыкулы ў перыядычным друку: Узор для пераймання: [100 год С.М. Кіраву] // ВР. — 1986. — № 63. — С. 3; Партызанская легенды і былі: [рэц. на кнігу «Такой і павінна быць легенда»] // ВР. — 1986. — № 170. — С. 4; Водгалас юнацтва баявога: [Ф.Я. Воранаў] // ВР. — 1987. — № 243. — С. 3; Брыгаду назвалі Віцебскай // ВР. — 1990. — № 88. — С. 4; Па загаду сэрца: [школьныя музеі] // ВР. — 1990. — № 124. — С. 3; Сар'янскі парк // ВР. — 1991. — № 105. — С. 5; Юнацтва гартавалася ў баях. Старонкі ў баявы летапіс камсамола Віцебшчыны // ВР. — 1991. — № 114. — С. 2; Стаіць у Сар'і парк і святы храм // НС. — 1992. — № 5. — С. 5; О «родимых пятнах» прошлого // НС. — 1992. — № 47. — С. 3; Комендант Комариного острова // НС. — 2001. — № 77. — С. 6; Один из тех, кто освобождал Витебск // НС. — 2004. — № 56. — С. 4; Крылатые герои: [в. Кукавячына] // НС. — 2006. — № 60. — С. 13.

**МАНДРЫК** ІВАН УЛАДЗІМІРАВІЧ (9.05.1941, в. Пасад Багушэўскага (цяпер Сенненскага) раёна Віцебскай вобл.), гісторык. Кандыдат гіст. навук (1982), доктар гіст. навук (2004), прафесар (2005). Скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры (1967), Мінскую вышэйшую партыйную школу (1973), аспірантуру пры МДПІ (1982). Працаваў токарам на Віцебскім заводзе электравымяральных прыбораў (1959–1964), сакратаром Чыгуначнага райкама ЛКСМБ г. Віцебска, загадчыкам аддзела Чыгуначнага райкама КПБ г. Віцебска (1973–1978), інструктарам Віцебскага абкама КПБ (1978–1982), на выкладчыцкіх пасадах у ВДПІ (1982–1996), дырэктарам Віцебскага філіяла МІПіСА (да 2009).

Даследуе гісторыю партыйных, прафсаюзных арганізацый Беларусі, а таксама ВНУ. Браў удзел у стварэнні музея П.М. Машэрава, музея гісторыі ВДПІ (1982–1986). Аўтар артыкулаў у навуковым і перыядычным друку па гісторыі сацыяльных і эканамічных адносін на Віцебшчыне. Мае невыдадзеныя працы: «Віцебскі філіял Міжнароднага інстытута працоўных і сацыяльных даследаванняў», «Віцебскі абласны цэнтр прафсаюзаў».

Узнагароджаны Ганаровай граматай ВС БССР, медалямі «За працоўную доблесць», «100 лет профсоюзному движению».

Тв.: Да пытання аб стварэнні арганізацыі РСДРП(б) на Віцебшчыне, люты – кастрычнік 1917 г. // Веснік БДУ. — 1989. — № 3; Деятельность областной партийной организации по повышению эффективности промышленного производства (1966–1985) // Тезисы докладов научно-теоретической конференции на тему «История Витебской областной организации: традиции и преемственность». — С. 41–46; Прамысловасць вобласці ў 1960–1980-я гг. // Тэзісы дакладаў навукова-практычнай канферэнцыі. — Віцебск, 1996.

Артыкулы ў перыядычным друку: Запаветная мара: [далучэнне Зах. Беларусі] // ВР. — 1989. — 14 ліст.; Пярэдадзень Вялікага Кастрычніка: [70 гадоў Лютаўскай рэвалюцыі] // ВР. — 1987. — № 49. — С. 2; Ці вінаваты бальшавізм? // ВР. — 1991. — № 3. — С. 1, 2; Эрыдан, Рубон, Руба: [р.п. Руба] // НС. — 1992. — № 61. — С. 3; Па добрай волі: [1939] // ВР. — 1999. — № 105. — С. 3.

Літ.: Мандрык І.У. // Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава: Падзеі. Людзі. Лёсы / пад рэд. А.У. Русецкага, А.М. Дарафеева. — Віцебск: ВДУ, 1998. — С. 160; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Мандрык І.У. (30.03.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**МАНІС** МІКАЛАЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ (1912, Варшава – 1996), краязнаўца, педагог. Скончыў Асвейскую сямігадовую школу (1927), Полацкае педвучылішча (1930), фізіка-матэматычны факультэт БДУ (1936), ваеннае вучылішча лётчыкаў (1937). Працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў Обальскай школе сялянскай моладзі, Полацкім педвучылішчы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў у школах г. Полацка (з 1947), быў дырэктарам СШ № 13.

Даследаваў гісторыю і культуру г. Полацка і Полаччыны. Праводзіў вялікую краязнаўчую работу, апублікаваў дзясяткі артыкулаў па гісторыі Полацка і Полацкага раёна. Адзін з аўтараў кнігі «Полацк» (1962). Браў удзел у падрыхтоўцы матэрыялаў для кніг «Памяць» Полацка і Полацкага раёна, аўтар артыкулаў у іх. Комплексна даследаваў гісторыю Полаччыны, аддаючы перавагу гісторыі савецкага перыяду. Вывучаў рэвалюцыйны рух на Полаччыне і ў 3-й арміі Заходняга фронту. Сустракаўся з удзельнікамі рэвалюцыйнага руху і Грамадзянскай вайны, збіраў іх успаміны. На аснове сабраных матэрыялаў была напісана і выдадзена кніга «Память о них жива в Белоруссии» (1988). Удзельнічаў у працы Полацкага аддзялення БДТАПГіК, быў лектарам таварыства «Веды», дзе чытаў лекцыі па гісторыі Полацка.

Ганаровы грамадзянін г. Полацка (1966).

Тв.: Кнігі: Память о них жива в Белоруссии. — Мн.: Полымя, 1988. — 143 с.

Артыкулы ў кнізе «Памяць»: (разам з С.А. Клокавым) Айчынная вайна 1812 г. на Полаччыне // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Полацкага раёна. — Мн.: Вышэйшая школа, 1999. — С. 55–56; (разам з С.С. Чарняўскай) Полаччына ў другой палове XIX – пач. XX ст. // Тамсама. — С. 59–63; Устанаўленне савецкай улады // Тамсама. — С. 49 — 51; Полацк у вайне 1812 г. // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Полацка. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 258–261; У часы І сусветнай вайны // Тамсама. — С. 306–308; Час барацьбы і выпрабаванняў // Тамсама. — С. 317–38; (разам з С.С. Чарняўскай) Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі // Тамсама. — С. 358–362.

Артыкулы ў перыядычным друку: Полацк у гады І сусветнай вайны // СК. — 1974. — № 34, 39, 41, 43, 49; Вялікі Кастрычнік і устанаўленне Савецкай улады на Полаччыне // СК. — 1974. — № 53, 58, 64, 65, 78, 81, 85–87, 92; Працоўныя Полаччыны змагаюцца ў барацьбе з кайзейраўскімі захопнікамі // СК. — 1974. — № 93, 98, 108, 114, 117; У першых радах абаронцаў заваёў Кастрычніка // СК. — 1977. — № 129; Барацьба палачан з белапольскімі акупантамі // СК. — 1977. — № 139; На шляху сацыялістычнага будаўніцтва. Аднаўленне народнай гаспадаркі // СК. — 1977. — 27 жніўня; 14 верас.; Полацк у гады першых пяцігодак // СК. — 1977. — 23 верас.; 30 верас.; 14 кастр.; Вернасць сцягу // СК. — 1980. — 8 ліп.; Народжаны ў агні рэвалюцыі (60 год ЛКСМБ) // СК. — 1980. — 15 жніўня; Паражэнне ворага: Аб гераічнай абароне Полацка у

вайне 1812 г. // ПГіКБ. — 1982. — № 4; Масква, Крэмль, Леніну // ВР. — 1980. — 20 крас. — С. 2; Старшыня ваенрэўкома // ВР. — 1982. — 7 ліст. — С. 2; Юнацтва, апаленае агнём: [У. Шкірэнка] // СК. — 1985. — № 15. — С. 3; Слаўны сын Полаччыны: [В. Чувахоў] // СК. — 1985. — № 52. — С. 3; Настаўнікі: [ветэраны] // СК. — 1985. — № 134. — С. 2; Застаецца ў страі: [У.А. Германовіч] // СК. — 1985. — № 161. — С. 2; Шляхамі цяжкіх перамог: [да 75-годдзя Г. Геродніка] // СК. — 1986. — № 19. — С. 4; Так і застаўся камісарам: [П.К. Пацэй] // ВР. — 1986. — № 24. — С. 4; Шляхам цяжкіх перамог: [Геродніку Г. — 75 год] // ВР. — 1986. — № 25. — С. 4; Апаліла полымя вайны: [В.Я. Баханькоў] // СК. — 1986. — № 28. — С. 3; І з Одэра вады адведаў: [І.А. Сухарукаў] // СК. — 1986. — № 138. — С. 2; За шчасце, за волю. Рэвалюцыйныя падзеі 1905–1907 гг. на Полаччыне // ВР. — 1987. — № 55. — С. 3; Рэвалюцыя крочыць па Полацкай зямлі: [лета 1918 г.] // СК. — 1987. — № 108, 153, 156; Ад бяспраўя да поўнаўладдзя: [Полаччына] // ВР. — 1987. — № 119. — С. 3; Ад Старынцаў да Мадрыда: [В.Е. Купрыянаў] // ВР. — 1987. — № 196, 199, 201; Вернасць сцягу: [1918] // ВР. — 1988. — № 32–34; Народжаная ў полымі рэвалюцыі. Пачатковыя старонкі летапісу Полацкай камсамольскай арганізацыі // СК. — 1988. — № 131. — С. 2; Кастрычнік у лёсах працоўных Полацка // СК. — 1988. — № 204, 205; Ляцяць у паднябессе жураўлі // ВР. — 1989. — № 163. — С. 4; За ўладу Саветаў: [100 год С.А. Анучыну] // СК. — 1989. — № 165. — С. 3; Полаччына, 1905 год // СК. — 1990. — № 16. — С. 2, 3; Палачане — Леніну // СК. — 1990. — № 63. — С. 1, 2; У тыя вогненныя дні: па старонках памяці і газеты «Бальшавіцкі шлях» // СК. — 1990. — № 101–104; Скарына і яго землякі. Слова пра палачан, якія ўнеслі свой уклад у развіццё асветы, навукі і культуры // ВР. — 1990. — № 165, 166, 169; Ззянне яе подзвігу, або Крокі ў бессмяротнасць: [З. Тусналобава-Марчанка] // ВР. — 1990. — № 227. — С. 4; Айчыны верныя сыны: [1812 г. на Віцебшчыне] // ВР. — 1991. — № 93, 94, 96, 98; У тыя дні агнявыя. Па старонках памяці і полацкай газеты-партызанкі // ВР. — 1992. — № 105–109; Ворагу не скарыліся: [жыхары ўсходняй часткі раёна ў 1941–1944 гг.] // ПВ. — 1993. — № 96, 99, 103. — 1994. — № 12; Яны былі першымі: [3-я Беларуская партыз. брыгада] // ПВ. — 1994. — № 52. — С. 2; Святло з усходу: [вызваленне раёна] // ПВ. — 1994. — № 53. — С. 2; Полацкая Хатынь: [в. Сосна] // ПВ. — 1995. — № 30. — С. 2; Памяць аб ім незабыўная: [С.В. Сухавей] // ПВ. — 1995. — № 78. — С. 3; Жудасная расправа гітлераўцаў над патрыётамі Полацка: [20.09.1942] // ПВ. — 1995. — № 84. — С. 2; Праз усё жыццё: [В.У. Сухавей] // ВР. — 1995. — № 126. — С. 3.

Літ.: Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Полацка. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 726.

**МАРАЧКІН** АЛЕСЬ (30.03.1940), мастак. Скончыў мастацка-графічны факультэт ВДПІ (1962). Даследуе жыццё і дзейнасць Я. Драздовіча. У пошуках спадчыны «вечнага вандроўніка» абышоў, аб’ехаў на веласіпедзе, матацыкле і машыне ўсю Дзісненшчыну. Сабраў багатую калекцыю твораў і рэчаў, звязаных з мастаком, якая была ўпершыню прадстаўлена ў 1979 г. на першай выставе твораў Язэпа Драздовіча ў Палацы мастацтваў у Мінску. Адзін з ініцыятараў стварэння Музея этнаграфіі і мастацтва Я. Драздовіча ў саўгасе «Гарадзец» Шаркоўшчынскага раёна, у які прадаў карціны майстра: «Кніганабыўцы ў друкарні Ф. Скарыны», «На руінах», «Бярэзвеч». Знайшоў на Шаркоўшчыне і перадаў у Музей беларускага кнігадрукавання ў Полацку асобнік Статута ВКЛ.

Літ.: Жыгуноў А. Да Язэпа Драздовіча // ШП. — 1988. — № 72. — С. 3; Лабачэўская Л. Сцяжынкамі жыцця. Імя ў гісторыі // КР. — 2000. — № 29–31. — С. 2.

**МАРКЕВІЧ** СЯРГЕЙ ВАСІЛЬЕВІЧ (1916, в. Стайкі (цяпер Вялікадолецкі с/с Ушацкага раёна — †). Доктар хім. навук. Скончыў Вялікадолецкую СШ Ушацкага раёна, хім. факультэт БДУ. Удзельнік партыз. руху на Ушаччыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар артыкулаў, у якіх асвятляў гісторыю партыз. руху ў краі.

Тв.: Гэта быў пачатак // П. — 1989. — № 56, 58, 59, 61, 63, 64; Бессмяротныя рэйсы // П. — 1990. — № 53, 54.

**МАРОЗ** Э., аматар. Працаваў у міліцыі. Цікавіцца гісторыяй і культурай Міёршчыны. Некаторыя матэрыялы публікуе ў мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Хто капаў каналы // СП (М). — 1990. — № 3. — С. 3; Сакавік 1953 г. // СП (М). — 1990. — № 69. — С. 3; На Падзвінні // СП (М). — 1990. — № 152. — С. 4; Вядзьмак // СП (М). — 1992. — № 98. — С. 3; Дзве кайстры // МН. — 2002. — № 49. — С. 4; Як Чэрчыль і Рузвельт жадалі зрабіць з мяне святара // МН. — 2002. — № 79. — С. 4.

**МАРОЗАВА** ГАЛІНА ПЯТРОЎНА (†), краязнаўца, педагог. Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры СШ № 1 г.п. Шуміліна. Арганізавала музей ў СШ № 1 (1990). Даследавала гісторыю краю ў час Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Першы дырэктар школы // ГП. — 1997. — № 43. — С. 2; Яго імя носіць наша школа: [П.А. Акуцыёнак] // ГП. — 1998. — № 2. — С. 2; Клуб «Пошук» працягвае сваю работу: [гісторыя стварэння музея ў СШ № 1] // ГП. — 1998. — № 21. — С. 3; Ён вучыўся ў нашай школе: [Д.М. Мінчугоў] // ГП. — 1998. — № 42. — С. 3.

Літ.: Антонава Д. Да гісторыі — з павагай // ГП. — 1995. — № 11. — С. 2.

**МАРЦЫНКЕВІЧ** РЭГІНА, журналіст. Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку, прысвечаных розным бакам жыцця Глыбоччыны.

Тв.: Скражынскі кулак Андрэй Шалуха // ВГл. — 1996. — № 4. — С. 3; Помнік пры дарозе // ВГл. — 1996. — № 45. — С. 3; Татары на Глыбоччыне // ВГл. — 1998. — № 68. — С. 2; Салдаты Хромавы // ВГл. — 2000. — № 47. — С. 2; Празароцкі касцёл святкуе 100-гадовы юбілей // ВГл. — 2007. — 15 жніўня. — С. 2; Вёска Івесь — турыстычная Мека // ВГл. — 2007. — 13 кастр. — С. 2.



**МАРЧЫК** ТАМАРА ПЯТРОЎНА (16.05.1956, в. Філіпавічы Жабінскага раёна Брэсцкай вобл.), педагог. Скончыла СШ № 1 г. Крычава Магілёўскай вобл., факультэт дашкольнага выхавання ГДУ (1980), філал. факультэт ВДПІ (1992). Працавала ў дзіцячым садку, настаўніцай у СШ № 43 г. Віцебска (1990–2004), метадыстам у Віцебскім абласным аб’яднанні пазашкольнай працы (1990–2007), Інстытуце развіцця адукацыі (былы Інстытут павышэння кваліфікацыі) (з 2007), загадчыца музея гісторыі адукацыі Віцебскай вобл.

На фарміраванне зацікаўленасці ў вывучэнні гісторыі роднага краю аказаў уплыў вядомы крычаўскі краязнаўца М.Ф. Мельнікаў, які жыў у суседнім доме і некаторы час выкладаў гісторыю ў школе. З пераездам у г. Віцебск (1980) стала вывучаць гісторыю і культуру месца. З пачаткам працы ў СШ № 43 г. Віцебска (1990) пачала ўдзельнічаць у пошукавым руху, стварыла пошукавы атрад «Пошук». Займалася скаўцкім рухам.

Значны ўплыў на фарміраванне зацікаўленасці аказала супольная праца з Л.Н. Бруевай. Брала ўдзел у Вахтах Памяці (1990–1995). З мэтай выяўлення імёнаў салдат, якія загінулі на тэрыторыі Віцебшчыны, працавала ў НАРБ, Архіве Міністэрства абароны РФ (г. Падольск). Выявіла імёны 44 салдат. Ініцыятар усталявання памятнага знака на месцы канцлагера для афіцэраў і палітработнікаў (1941–1944) у мікраараёне Лучоса.

Стварыла новую экспазіцыю ў музеі імя М.П. Шмырова СШ № 43 (1990), праз пэўны час музей атрымаў ганаровае званне народнага (2005). Брала ўдзел у стварэнні этнаграфічнага музея у Касцюковіцкай СШ Крычаўскага раёна Магілёўскай вобл. (2000), Музея гісторыі адукацыі Віцебшчыны. Заснавальнік абласнога навукова-даследчага таварыства «Патрыёты Айчыны» пры ВАААППДіП (2003).

Удзельнік Віцебскіх абласных навукова-практычных канферэнцый вучняў (2003–2007), некаторых рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцый. Аўтар метадычнай распрацоўкі «Сістэма патрыятычнага выхавання ў Віцебскай вобл.», «Даведніка па музейнай дзейнасці», шэрагу артыкулаў на тэмы патрыятычнага выхавання ў навуковым (часопісы «Внешкольное воспитание», «Проблемы воспитания»), рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку («Віцебскі рабочы», «Народнае слова»).

Тв.: Система патриотического воспитания в Витебской области. Из опыта работы отдела патриотической и экскурсионной работы УО «ГООВР». — Витебск: УО «ВОГИПКПРР», 2008. — 63 с.
Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Марчык Т.П. (12.08.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**МАРЭЛОЎСКІ** МАРЫЯН (1884–1969), навукоўца. Доктар філасофіі, гісторык мастацтва. Вучыўся ў Кракаве, Вене, Парыжы. Кіраваў працай Таварыства апекі над польскімі здабыткамі ў Маскве (1915–1918), аддзелам перадачы польскай спадчыны спецыяльнай дэлегацыі ў Маскве (1921–1926), даследаваў калекцыі ў Вавелі (1926–1929), прафесарам у Віленскім універсітэце (1934–1939), Люблінскім каталіцкім універсітэце (1939–1945), універсітэце г. Вроцлава (1952–1960). Супрацоўнічаў з Польскай акадэміяй навук, з’яўляўся членам-карэспандэнтам Бельгійскай акадэміі археалогіі. Аўтар вялікай колькасці прац, прысвечаных польскаму мастацтву. Напісаў некалькі прац: «Палац Пілсудскіх у Мосары» (Кракаў, 1927), «Нарыс мастацтва Віленшчыны і пуцяводнік па славутасцях паміж Неманам і Дзвіной» (Вільня, 1939), «Пуцяводнік па Віленскім ваяводстве».

Тв.: Палац Пілсудскіх у Мосары. — Кракаў, 1927; Zarysy syntetyczne sztuki wilesskej od gotyki do neoklasycyzmu. — Wilno, 1938–1939; Zarysy sztuki Wilekskej z pzewodnikiem po zabytkach miydzy Niemniem a Dvywina. — Wilno, 1939; (разам з J. Tochterman) Przewodnik turystyczny po woewydztwie Wileeskiem. Cz. 1–2.

**МАСЛА** АЛЕНА, аўтар артыкулаў у навуковым і перыядычным друку, прысвечаных гісторыі, культуры і прыродзе Міёршчыны. Жыве ў Мінску.

Тв.: (разам з С. Гук) Рака для ўсіх адна: нататкі з рэгіянальнай навукова-практычнай канферэнцыі «Дзвіна – Даўгава» // ВР. — 1988. — № 199. — С. 4; Уратуйце мяне, людзі…: [касцёл у Міёрах] // ВР. — 1988. — № 200. — С. 4; Труба ў хмызняку: [азёры Міёршчыны] // ВР. — 1988. — № 201. — С. 4; Тундра… у Беларусі // ВР. — 1990. — № 130. — С. 3; Аргонавты живут в Миорах // ТиО. — 1996. — Январь. — С. 5.



**МАСЯЙЧОНАК** РАМУАЛЬД ПІЛІПАВІЧ (8.05.1936, ст. Асінаўка Аршанскага раёна – 7.04.1991, Верхнядзвінск). Скончыў гіст. факультэт БДУ (1965). Працаваў важатым, піянерважатым у Асвейскай СШ (1956), выхавацелем, нам. дырэктара па вучэбна-выхавальнай рабоце ў Асвейскай школе-інтэрнаце (1956–1965), лектарам, інструктарам Верхнядзвінскага райкама КПБ (1973–1979), дырэктарам СШ № 2 г. Верхнядзвінска (1979–1991).

Зацікавіўся краязнаўствам, выкладаючы гісторыю ў школе. Абараніў курсавую работу «Верхнедвинск: история города» пад кіраўніцтвам А.П. Ігнаценка (1963) (захоўваецца ў фондах музея СШ № 2 г. Верхнядзвінска). Выступаў з артыкуламі па гісторыі краю на старонках раённай газеты «Дзвінская праўда». У 1980-я гг. з'яўляўся ініцыятарам аднаўлення экспазіцыі музея СШ № 2, якая пацярпела ад пажару ў 1970-х гг. Аўтар рукапісу «З далёкіх дзён ідзеш, Асвея», які быў выдадзены Верхнядзвінскай раённай бібліятэкай у 3 экземплярах. Аўтар шэрагу артыкулаў на краязнаўчую і сацыяльную тэматыку ў мясцовым перыядычным друку.

Выдатнік народнай асветы (1984).

Тв.: З далёкіх дзён ідзеш, Асвея. — Верхнядзвінск, 2003. — 31 с.; У барацьбе і трывозе: [1917] // ДзП. — 1987. — № 35. — С. 3; З гісторыі роднага краю // ДзП. — 1987. — № 120, 122, 124, 144; Глуш на скрыжаваннях: [сяр. XIX ст.] // ДзП. — 1988. — № 9. — С. 2; Абуджэнне: [кан. XIX – пач. XX ст.] // ДзП. — 1988. — № 10. — С. 2; Першыя парасткі // ДзП. — 1988. — № 11. — С. 2; Адкуль нашыя карані // ДзП. — 1988. — № 89. — С. 2, 3; У гады выпрабаванняў: [1812] // ДзП. — 1988. — № 91, 93; З далёкіх дзён ідзеш… // ДзП. — 2003. — № 70, 72, 73.

Літ.: Асабістая справа Масяйчонка Рамуальда Піліпавіча // Фонды музея СШ № 3 г. Верхнядзвінска; Краязнаўчы музей СШ № 2 // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна. — Мн.: Паліграфафармленне, 2000. — Кн. 2. — С. 322; Інтэрв'ю Л.І. Дзевяковіч (20.06.2007) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**МАТВЕЕЎ** БАРЫС СЦЯПАНАВІЧ (20.07.1941, г. Таўда Свярдлоўскай вобл.), краязнаўца. Кандыдат тэхн. навук (1998). Скончыў 8 класаў у СШ № 17 г. Віцебска, Віцебскі станкаінструментальны тэхнікум (1961), інжынерна-механічны факультэт БПІ (1974), аспірантуру. Абараніў дысертацыю на тэму «Міжгаліновы абмен інфармацыяй: яго формы і метады (на аснове работы віцебскіх прадпрыемстваў)». Працаваў ст. інжынерам па інфармацыі ў ВА «Маналіт» (1970–1977), інжынерам-механікам у трэсце «Віцебсксельбуд» (1977–1986), выкладчыкам спецдысцыплін у ПТВ № 59 (1986–1995).

Вывучае жыццёвыя лёсы Герояў Савецкага Саюза – ураджэнцаў Віцебшчыны, славутых землякоў. Падрыхтаваў (разам з К.П. Гайдуковым) кнігу «Слава и гордость земли Витебской», якая ўключае 850 персаналий.

Тв.: (разам з К.П. Гайдуковым) Слава и гордость земли Витебской. — Витебск: ВОТ, 2010.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Матвееў Б.С. (26.08.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**МАТВЕЕЎ** АЛЯКСАНДР ФЁДАРАВІЧ (4.04.1966, г. Віцебск), краязнаўца. Скончыў механічны факультэт ВДТІ (1990). Працаваў інжынерам-тэхнолагам на Віцебскім тэлезаводзе (1990–1999), пазаштатным супрацоўнікам у шматтыражнай газеце «Рабочее слово», рэдактарам, супрацоўнікам выдавецкага аддзела Віцебскага епархіяльнага ўпраўлення (1999–2009).

Займаецца даследаваннем гісторыі праваслаўя на Беларусі, і на Віцебшчыне ў прыватнасці. На фарміраванне зацікаўленасці ў вывучэнні гісторыі роднага краю пэўны ўплыў мелі настаўнік гісторыі СШ № 34 г. Віцебска Я.В. Лазараў, краязнаўцы Д.Р. Газін, А.М. Падліпскі.

Аўтар шматлікіх матэрыялаў у мясцовым перыядычным друку па пытаннях праваслаўнага краязнаўства. Складальнік некалькіх кніг, прысвечаных храмам Віцебскай епархіі: «Храмы и приходы Витебской епархии» (2007), «Храмы и приходы Витебской епархии» (2008), «Витебская епархия. Монастыри, храмы и приходы» (2009). Аўтар артыкулаў пра царкоўнае краязнаўства ў перыядычных выданнях «Витебские епархиальные ведомости», «Народнае слова», «Віцьбічы», «Рабочее слово», «Наше православие», «Планета открытий», «Друтский источник».




Аказаў дапамогу ў стварэнні царкоўна-археалагічнага кабінета Віцебскай епархіі (вул. Крылова, 7). Падтрымлівае кантакты з ВАКМ, фондам А.П. Сапунова.

Тв.: Витебская епархия. Монастыри, храмы и приходы: справочник / сост. А. Матвеев. — Мн.: Беларуская православная церковь, 2009. — 156 с.

Артыкулы ў часопісах: Встреча Крестного хода Волга – Днепр – Западная Двина // ВЕВ. — 2000. — № 1; Фотавыстава «Беларусь Православная» // Тамсама; Свято-Троицкий Марков монастырь // Тамсама; Храмы города Витебска // Тамсама; Будьте бдительны: подделка! // Тамсама; Из истории Витебского церковно-археологического музея // Тамсама; Витебская гимназия // Тамсама; Летописец Витебска // ВЕВ. — 2001. — № 1; Витебская православная епархия // Тамсама; Когда снимали колокола… // ВЕВ. — 2002. — № 1; Батальонная церковь // Тамсама; Чудо мироточения // ВЕВ. — 2002. — № 2; Трагедия храма Рождества Пресвятой Богородицы // Тамсама; Памяти Евгения Антонова // Тамсама; Служа таинственной Отчизне… // Святая Русь. — Мн., 2002. — № 5; Почтил Господь белорусский край // ВЕВ. — 2003. — № 1; Старейший священник епархии // Тамсама; Путь на Голгофу // Тамсама.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Любите человека при жизни // РбСл. — 1993. — № 30; А что выбираете Вы? // РбСл. — 1993. — № 31; Огонь большого сердца // РбСл. — 1994. — № 2; Не забыть, что мы — люди // РбСл. — 1994. — № 28; Что важнее?: [цэрквы Віцебска] // Віцьбічы. — 1995. — № 54. — С. 3; Желаю всем добра… // РбСл. — 1995. — № 45; Одна из немногих // РбСл. — 1997. — № 2; Чёрная церковь // Віцьбічы. — 2000. — № 11; Витебск // Наше Православие. — 2000. — № 1; Воскресенская церковь // ВР. — 2000. — № 55. — С. 4; Возрождение святынь // ВР. — 2000. — № 75. — С. 2; Кто поможет в восстановлении древней белорусской святыни: [в. Чарэя] // НС. — 2000. — № 102. — С. 5; На седьмых Свято-Евфросиниевских педагогических чтениях // Наше Православие. — 2001. — № 2; Славословие Христу // ВР. — 2002. — № 58; Приход есть, храм будет // Віцьбічы. — 2002. — 1 лют.; Дорога через хаос // Планета открытий. — 2002. — № 16; Матушка Варвара // Анастасия. — 2002. — № 8; По вере вашей да будет Вам…: [пратаіерэй Антоній Дрозд] // НС. — 2003. — № 3. — С. 4; Всем терпения и надежды // РбСл. — 2003. — № 11; Свобода — высшая ценность человека // РбСл. — 2003. — № 29; Он спешил делать добро // РбСл. — 2003. — № 33; Как это было: [выбух Успенскага сабора ў Віцебску] // НС. — 2004. — № 32. — С. 5; Живые родники земли // Наше Православие. — 2006. — № 2; Святой источник Параскевы Пятницы // Наше Православие. — 2007. — № 1; Кутеинская типография // Наше Православие. — 2007. — № 2; Храм Рождества Пресвятой Богородицы в Друцке // Друцкий источник. — 2008. — № 1; Празднование 1020-летия Крещения Руси на Беларуси // Друцкий источник. — 2008. — № 2; Стоять ли Ольге над Двиной? // Наше Православие. — 2008. — № 1; Пастырский визит в Беларусь // Друцкий источник. — 2008. — № 3; Взрыв над Двиной // Наше Православие. — 2009. — № 2; Герб Друцка // Друцкий источник. — 2009. — № 7; Патриарх Московский и всея Руси на Витебщине // Друцкий источник. — 2009. — № 13; Утраченное наследие // Витьбичи. — 2009. — № 99.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Матвееў А.Ф. (21.12.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**МАТЭЛЕНАК** ЛЕАНІД АЛЯКСАНДРАВІЧ (6.02.1946, в. Свярдлы Міёрскага раёна), краязнаўца, журналіст. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ (1975), ВПШ пры ЦК КПБ (1983). Працуе рэдактарам міёрскай раённай газеты «Ленінскі сцяг», цяпер «Міёрскія навіны» (з 1.06.1976).



Даследуе гісторыю і культуру Міёршчыны. Зацікавіўся гісторыяй роднага краю пад уплывам настаўнікаў гісторыі ў школе. Асаблівы ўплыў аказаў М.І. Латышаў.

Укладальнік кнігі «Памяць» Міёрскага раёна і аўтар артыкулаў у ёй. Аўтар тэксту для брашур «Миорский район: прошлое и настоящее, природа и люди», «Миорщина: мгновения прошлого и настоящего», шэрагу артыкулаў у перыядычным друку, прысвечаных розным бакам жыцця Міёрскага раёна.

Літ.: Гарэлік Л.М. Панізнік С.С. // Беларускія пісьменнікі: бібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А.В. Мальдзіса. — Мн.: БелЭн, 1994. — Т. 4. — С. 449–453; Шкатулаў І. Як жывеш, Заходняя Дзвіна? // ЛіМ. — 1988. — 8 ліп.; Дзядзінкіна С. Сяргей Папар: «Шукаю крыніцы, каб наталіць смагу» // НС. — 1996. — № 1. — С. 3; Сіцька Здзіслаў. Забельскі аазіс // Дыялог. — 1997. — № 70. — С. 12–13; Іваноў С. Хатка бабкі Параскі прымае гасцей // ДзП. — 1999. — № 34. — С. 2; Гук С. Галоўнае свята Прыдзвіння: [«Дзвіна — Двіна — Даўгава»] // ЛіМ. — 1999. — 16 ліп.; Музей ў Лявонпалі // СП (М). — 1999. — № 97. — С. 1; Характарыстыка на С.С. Панізьніка, вучонага сакратара Дзяржаўнага літаратурнага музея Я. Купалы // Асабісты архіў С.С. Панізьніка; фотакопія — асабісты архіў М.В. Півавара; Характарыстыка музея-сядзібы С.С. Панізьніка «Хатка бабкі Параскі» // Тамсама; электронная фотакопія / асабісты архіў М.В. Півавара; План работы літаратурна-этнаграфічнага музея «На шляху з грэкаў у варагі» (літаратурная сядзіба С. Панізьніка) на 1999 г. // Тамсама; Панізьнік С.С. Літаратурная сядзіба «На Шляху з варагаў у грэкі, грэкаў у варагі» // Тамсама; Кулажанка Л., Мальдзіс А., Сачанка С. Літаратурныя мясціны Беларусі: краязнаўчы даведнік: у 3-х кн. Кн.1: Брэсц., Віцеб. і Гомел. вобл. — Мн.: БелЭн, 2000. — С. 147; Пазняк С. Сяргей Панізнік: «Я пасрэднік паміж мінуўшчынай і сучасным чалавекам» // ЧЗ. — 2000. — № 102. 6 чэрв.; Крук В. Імя на літаратурнай карце Верхнядзвіншчыны // РДзП. — 2001. — 3–9 мая; Бельскі А. «І ўсе мае дні — Беларусі»: Літаратурны партрэт Сяргея Панізніка // РС. — 2002. — № 5. — С. 4–10; Бубала А. Музей сялянскага побыту // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна. — Мн.: Паліграфафармленне, 2000. — Кн. 2. — С. 324; Скобла М. Краса і сіла // Звязда. — 2002. — 2 лют.; Пакульневіч Я. «І хатка тая — мой Парнас» // ДзП. — 2002. — № 42. — С. 2; Матэленак Л. Свята паэта // МН. — 2002. — № 41. — С. 1; Матэленак Л. Куе паэт… «падкову» // МН. — 2007. — № 41. — С. 3; Матэленак Л. Новыя штрыхі да партрэта добра вядомага чалавека // МН. — 2007. — № 56. — С. 5; Пальскі Л. «Добры дзень, землякі!» // КГ. — 2007. — № 30 (191), жнівень. — С. 2; Ён абдымаў Сусвет: Т. Дмахоўскі варты міжнароднага прызнання // МН. — 2007. — № 56. — С. 5; У чароўным люстэрку Памяці // МН. — 2008. — № 15. — С. 4; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Панізьнік С.С. (29.10.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ПАНЦЯЛЕЙКА** АЛЯКСАНДР ТОВІЕВІЧ (6.10.1967, г. Браслаў), краязнаўца. Скончыў БДУ (1991). З 1991 г. супрацоўнік Браслаўскага музейнага аб'яднання. Асноўныя тэмы даследаванняў: тапаніміка, гісторыя Браслаўшчыны на мяжы XIX–XX стст., падзеі Вялікай Айчыннай вайны, канфесійная гісторыя краю. Даследаваннямі стаў займацца пад час навучання ва ўніверсітэце. Значную ролю ў станаўленні яго як краязнаўцы аказалі А.Ю. Гарэлік, С.І. Сідор, К.С. Шыдлоўскі. Браў удзел у пераэкспазіцыі асобных раздзелаў Браслаўскага краязнаўчага музея, у падрыхтоўцы рознатэматычных выстаў. Удзельнічаў у рэспубліканскіх і абласных навукова-практычных канферэнцыях, у тым ліку навукова-краязнаўчых Браслаўскіх чытаннях (1994–2002). Аўтар артыкулаў для кнігі «Памяць» Браслаўскага раёна, у зборніках «Браслаўскія чытанні», «Браслаўскія сшыткі». Друкуецца ў газеце «Браслаўская звязда» і выданні краязнаўцаў Браслаўшчыны «Павет».

Тв.: (разам з К. Шыдлоўскім) Наш край — Браслаўшчына: дапаможнік па раздзеле «Наш край» праграмы па гісторыі Беларусі для настаўнікаў сярэдніх школ: [саматуж. выд.]. — Браслаў, 1993. — 108 с.

Артыкулы ў кнізе «Памяць»: Паўстанне 1830–1831 гг. на Браслаўшчыне // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Браслаўскага раёна. — Мн., 1998. — С. 170–171; Паўстанне 1863–1864 гг. на Браслаўшчыне // Тамсама. — С. 180–181; (разам з К. Шыдлоўскім) Браслаўшчына ў XIX – пач. XX ст. // Тамсама. — С. 189–196; Зямец А.А. // Тамсама. — С. 248; Масцюлін А.І. // Тамсама. — С. 248–249; (разам з К. Шыдлоўскім) Браслаўшчына ў складзе польскай дзяржавы, 1920–1939 гг. // Тамсама. — С. 249–261; Вызваленне Браслаўшчыны // Тамсама. — С. 400–403; Вызваляючы наш раён // Тамсама. — С. 411–412; Кропка не пастаўлена: [лёс сына М. Цвятаевай — Г. Эфрона] // Тамсама. — С. 415–416; Доўгімі вёрстамі вайны: [браслаўчане на франтах вайны] // Тамсама. — С. 417–419; (разам з К. Шыдлоўскім) Праўда балючая і страшная: Палітычныя рэпрэсіі на Браслаўшчыне 30–50-х гадоў // Тамсама. — С. 565–570; (разам з К. Шыдлоўскім) Напісанае застаецца: Навуковыя і краязнаўчыя даследаванні // Тамсама. — С. 646–653.

Матэрыялы канферэнцый: Браслаўшчына ў канцы XIX – пачатку XX ст.: Гістарычна-статыстычная характарыстыка паводле друкаваных крыніц // Браслаўскія чытанні: Матэрыялы III навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 200-м угодкам паўстання 1794 года, 21–22 красавіка 1994 г. — Браслаў: Браслаўскі філіял Пастаўскай узбуйнёнай друкарні, 1994. — С. 52–55; Вуліцы Браслава // Браслаўскія сшыткі 1/1996: гістарычны зборнік, прысвечаны 930-годдзю Браслава (1065–1995): [саматуж. выд.]. — Браслаў, 1996. — С. 36–38; Прозвішчы браслаўчан // Тамсама. — С. 47–49; У гады Вялікай Айчыннай вайны // Тамсама. — С. 62–68; Первая попытка регуляции системы Браславских озер. 1902 г. // Браслаўскія чытанні: матэрыялы IV навукова-краязнаўчай канферэнцыі, 24–25 красавіка 1997 г. — Браслаў, 1997. — С. 171–174; Анзельм Лячыцкі // Браслаўскія сшыткі 2/1997. Гістарычны зборнік, прысвечаны стогадовым юбілеям будынкаў касцёла і царквы ў Браславе (1897–1997): [саматуж. выд.]. — Браслаў, 1997. — С. 94–99; Святары Васілеўскія // Тамсама. — С. 99; З гісторыі рэгуляцыі возера Дрысвяты // Браслаўскія сшыткі 3/1999: Гісторыя былога мястэчка Дрысвяты і наваколля: [саматуж. выд.]. — Браслаў, 1999. — С. 14–15;У часы Вялікай Айчыннай вайны // Тамсама. — С. 123; Брыгада АК «Дрысвяты» // Тамсама. — С. 125–126; Вызваленне // Тамсама. — С. 126–127; ГЭС «Дружба народаў» // Тамсама. — С. 129–130; «Браслаўская звязда» (1939–1949 гг.): Пачатак і гісторыя фармавання раённай газеты // Браслаўскія чытанні: матэрыялы V навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 939-годдзю першай згадкі Браслава ў пісьмовых крыніцах. — Браслаў; Наваполацк: Усяслаў Чарадзей, 2001. — С. 70–71.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Застаўся толькі ўспамін: [парк у Браславе] // БЗ. — 1992. — № 17. — С. 4; (разам з К. Шыдлоўскім) Вернем вуліцам горада іх гістарычныя назвы // БЗ. — 1992. — № 42. — С. 2–3; (разам з К. Шыдлоўскім) Вернем вуліцам горада іх гістарычныя назвы // БЗ. — 1992. — № 59. — С. 2; Перамаглі без зброі // БЗ. — 1993. — № 37. — С. 2, 3; Не стаялі ў баку ад вялікіх падзей: [1863 г. на Браслаўшчыне] // БЗ. — 1993. — № 47. — С. 2, 3; Што азначае ваша прозвішча // БЗ. — 1993. — № 63. — С. 2; (разам з К. Шыдлоўскім) Праўда балючая і страшная: [палітычныя рэпрэсіі на Браслаўшчыне] // БЗ. — 1993. — № 92, 96, 98, 99; Відзы-Лаўчынскія // БЗ. — 1994. — № 17–19; У баях за Друю // БЗ. — 1994. — № 21. — С. 2; Памятны ліпень 1944-га // БЗ. — 1994. — № 52, 53; На пераломе стагоддзяў: [Браслаўшчына ў канцы XIX – пачатку XX ст. у люстэрку статыстыкі] // БЗ. — 1995. — № 3. — С. 3, 4; Запрашэнне ў мінулае // БЗ. — 1995. — № 53. — С. 2; Злёт юных краязнаўцаў // БЗ. — 1995. — № 87. — С. 4; Прысвечана старажытнаму гораду // БЗ. — 1995. — № 91. — С. 2; Вуліцы горада // БЗ. — 1995. — № 99. — С. 2; Нацыянальныя паркі ЗША // БЗ. — 1996. — № 42. — С. 2; Нацыянальныя паркі Францыі // БЗ. — 1996. — № 46. — С. 2; Будзем паважліва ставіцца да прыроды // БЗ. — 1996. — № 74. — С. 2, 4; Азёры Браслаўшчыны: Неспіш // БЗ. — 1997. — № 26. — С. 4; Першыя газеты Браслаўшчыны // БЗ. — 2000. — № 75. — С. 2; Легенды нашага краю // БЗ. — 2002. — № 83. — С. 3, 4; З гісторыі Слабодкаўскага касцёла // БЗ. — 2004. — № 45. — С. 3.

Артыкулы ў бюлетэні «Павет»: Раённая газета «Браслаўская звязда». 1939 год. Перыяд станаўлення // Павет. — 2001. — № 1. — С. 4–5; Святары Замошскай царквы // Павет. — 2003. — № 9 (22), жнівень. — С. 4–5; Народныя вучылішчы на Браслаўшчыне // Павет. — 2003. — № 11 (24). — Лістапад. — С. 4–5; З гісторыі Слабодскага касцёла // Павет. — 2004. — № 2 (27) люты. — С. 4–6; Азёры Браслаўшчыны: колькі іх? // Павет. — 2006. — № 1 (47). — Люты. — С. 5–6; Браслаўшчына на старонках беларускай газеты «Сялянская ніва» за 1927 год // Павет. — 2006. — № 3 (48), сакавік. — С. 5.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Панцялейка А.Т. (22.09.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ПАПКОЎ** ВАЛЕР ЯКАЎЛЕВІЧ, настаўнік, краязнаўца. Працаваў у Падсвільскай СШ. У кан. 1970-х гг. выявіў гарадзішча каля в. Псуя Глыбоцкага раёна. Стварыў школьны музей Я. Драздовіча, у якім захоўваюцца арыгіналы карцін мастака. Актыўна ўдзельнічае ў працы раённага аддзялення БДТАПГіК. Бярэ ўдзел у краязнаўчых канферэнцыях як удзельнік і навуковы кіраўнік. Даследаваў знікнуўшыя вёскі, старажытныя назвы, помнікі Падсвільшчыны (1995).

Тв.: Агляд археалагічных даследаванняў на Глыбоччыне // ВГл. — 1991. — № 93–95. — С. 3.
Літ.: Бурэніч Т. Летапісцы роднага краю // ВГл. — 1995. — № 30. — С. 2.

**ПАЎЛАВА** АЛА ІВАНАЎНА (11.01.1959, г. Эйшышкес Літоўскай, педагог, краязнаўца. Скончыла Ноўкінскую ВШ Віцебскага раёна (1974), СШ № 43 г. Віцебска (1976), гіст. факультэт БДУ (1982). Працавала ў Ноўкінскай ВШ (з 1992 г. СШ) (1984–2010).

Даследуе гісторыю в. Ноўка Віцебскага раёна і яе ваколіц. Асабліва цікавіцца перыядам вызвалення вёскі ў 1944 г. ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, жыццёвым лёсам і дзейнасцю земляка дзіцячага пісьменніка Г.Л. Шакулава, былога вучня Ноўкінскай школы. Даследаваць гісторыю і культуру пачала з 1984 г. Пэўны ўплыў аказала настаўніца Ноўкінскай ВШ Лідзія Фёдараўна Кур’янава.

Брала ўдзел у стварэнні некалькіх выстаў прысвечаных вызваленню краю, якія размяшчаліся ў Ноўкінскай СШ. Мае ненадрукаваныя матэрыялы па гісторыі в. Ноўка, саўгаса «Рудакова», вядомых земляках, воінах-афганцах – ураджэнцах Ноўкі. Брала актыўны ўдзел у пошукавым руху на Віцебшчыне.

Тв.: (разам з Л.К.Нікіцінай) Вызваленне Віцебскага раёну // Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І.А. Абрамава [і інш.]; аўт.-уклад. М.В. Півавар. — Мінск: Паркус плюс, 2008. — С. 143–149; Аб чым расказалі старажылы: [тапаніміка] // ЖП. — 1994. — № 91. — С. 2.
Літ.: Анкета “Краязнаўцы Віцебшчыны”. Паўлава А.І. (13.11.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ПАЎЛАЎ** (В.П.?), гісторык. Кандыдат гіст. навук (1974). Аўтар дысертацыйнага даследавання «Борьба трудящихся Витебской области против немецко-фашистских захватчиков в Великой Отечественной войне».

Тв.: Борьба трудящихся Витебской области против немецко-фашистских захватчиков в Великой Отечественной войне (1974).
Літ.: Міхнюк У.М. Доктарскія і кандыдацкія дысертацыі па гістарычных навуках у Рэспубліцы Беларусь (1991–2003 гг.): бібліягр. паказ. — Мн.: НАРБ, 2006. — 68 с.



**ПАЎЛАЎ** МІХАЛ УЛАДЗІМІРАВІЧ (16.11.1957, в. Селішча Гарадоцкага раёна), краязнаўца. Скончыў Даўгапольскую СШ Гарадоцкага раёна (1972), ВДМІ (1985).

Гісторыяй цікавіўся з маленства. Сістэматычныя даследаванні роднага краю пачаў праводзіць пасля таго, як трапіў на экскурсію на раскопкі Верхняга замка ў Віцебску, якую праводзіў археолаг І. Цішкін. Пачаў чытаць літаратуру на гіст. тэматыку. Асаблівае ўздзеянне зрабіла кніга У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха». Пачаў збіраць старажытныя рэчы. Занепакоены стаўленнем да помнікаў гісторыі і культуры Віцебска, іх занядбаным станам і знішчэннем, разам з І. Цішкіным стаў ініцыятарам стварэння клуба добраахвотнай падтрымкі і рэстаўрацыі «Узгор’е» ў г. Віцебску (1986). Актыўна ўдзельнічаў у яго дзейнасці: на грамадскіх пачатках працаваў на расчыстцы будынкаў Трынітарскага манастыра, падрыхтоўцы да рэстаўрацыі касцёла Св. Барбары, у археалагічных раскопках у г. Віцебску. Адстойваючы грамадзянскую пазіцыю ў дачыненні да зносу гісторыка-культурных помнікаў і забудовы ў гіст. цэнтры Віцебска, неаднаразова звяртаўся ў абласную і рэспубліканскую пракуратуры, арганізацыі і ўстановы аховы помнікаў. Сабраў успаміны землякоў-удзельнікаў антыфашысцкага руху, якія змагаліся на тэрыторыі Заходняй Еўропы.

Па размеркаванні трапіў на працу ўрачом у в. Бачэйкава Бешанковіцкага раёна. З мэтай абароны Бачэйкаўскага палаца і парку і папулярызацыі ведаў пра звярнуўся да нашчадкаў князёў Цэханавецкіх у Лондане (праз А. Мальдзіса). Напісаў і выдаў брашуры, прысвечаныя вёскам Астроўна і Бачэйкава Бешанковіцкага раёна. Аўтар публікацый у бюлетэні «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі» і шэрагу артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў мясцовым перыядычным друку.




Разам з аднадумцамі стварыў відэафільм, прысвечаны віцебскім замкам (2002). Ініцыятар выдання шэрагу брашур, прысвечаных гісторыі і культуры Віцебска: «Віцебск. Страчаная прыгажосць горада», «Віцебскія замкі», «Пра што расказвае віцебскі гарадскі герб», «Пад мурамі саляных складоў», «Забойства Іасафата Кунцэвіча. Віцебск». Разам з мастаком І. Дуравым распрацаваў праект і выдаў каляровы рэтраспектыўны плакат «Віцебскі Верхні замак» (2003).




Тв.: Астровенскі касцёл. — Віцебск: ВАД, 1994. — 8 с.; Бачэйкаўскі палац і парк. — Віцебск; ВАД, 1989. — 8 с.; Забойства Іасафата Кунцэвіча. — Віцебск, 1996. — 34 с.; (разам з Л. Хмяльніцкай) Доктар Гібенталь, вынаходца гіпсавай імабілізацыі ў медыцыне, вядомы практык // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII–XIX стагоддзяў: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, 11–12 траўня 1992 г. — Гродна, 1992. — С. 63–66.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: «Узгор'е» // ВР. — 1986. — 12 сак. — С. 4; Пакуль сэрцы чыстыя…: [стан рэк у Гарадоцкім раёне, добраўпарадкаванне помнікаў вайны, сітуацыя на вёсцы] // ВР. — 1986. — № 138. — С. 4; Клуб аматараў старажытнасці // ВР. — 1987. — 17 студз. — С. 2; Гіне ад уласнай рукі: [экалогія наваколляў Віцебска] // ВР. — 1990. — № 49. — С. 4; Заснавана крывічамі: [версія пра паходжанне назвы г. Віцебска] // ПК (Г). — 1990. — № 87. — С. 2; Забойства Кунцэвіча: народнае паўстанне ці крывавая інтрыга? // ВК. — 1991. — № 44. — С. 3; За межамі айчыны: [жыхары Гарадоччыны — удзельнікі антыфашысцкай барацьбы ў Заходняй Еўропе] // ПК (Г). — 1991. — № 83. — С. 2; Францыск ці Георгій? // ВР. — 1991. — № 215. — С. 4; Забойства на Прачысценскай гары // Выбар. — 1991. — № 3. — С. 3; Астровенскі касцёл // Выбар. — 1992. — № 2. — С. 3; (разам з І. Цішкіным) Ратуша // ВК. — 1992. — № 24. — С. 4; Яшчэ раз пра «Віцьбічы» // Выбар. — 1993. — № 3. — С. 4–5; Яны ўзялі лёс ва ўласныя рукі // Выбар. — 1993. — № 8. — С. 2; Епархія прэтэндуе на гімназію // Выбар. — 1994. — № 38. — С. 5.

Літ.: Клемят Л. Міхась Паўлаў: «На жаль, мы не памыліліся…» // ВК. — 1997. — № 4. — С. 3.



**ПАЎЛОВІЧ** МІКАЛАЙ КАНСТАНЦІНАВІЧ (24.06.1956, г. Карэлічы Гродзенскай вобл.), краязнаўца, збіральнік, калекцыянер. Скончыў Рыжскі ўніверсітэт імя П. Стучкі (1986). Працаваў будаўніком, на чыгунцы ў г. Даўгаўпілсе (Латвія). Сябра беларускага таварыства «Уздым», Браслаўскага раённага таварыства імя О. Гедэмана. Жыве ў г. Даўгаўпілсе (Латвія).

Пачаў цікавіцца гісторыяй роднага краю з дзяцінства, калі жыў у в. Цырын на Навагрудчыне. Вялікую ролю адыграў бацька, а таксама дырэктар Цырынскай школы П.П. Сачыўка. Даследуе гісторыю беларусаў у Латгаліі, гісторыю і культуру Браслаўшчыны, Навагрудчыны.

Калекцыянер. Збірае матэрыялы на тэму «Беларусы Латгаліі»: паштоўкі, фотаздымкі, маркі, манеты, перыядычныя выданні, пісьмовыя крыніцы, атрыбутыку. Праводзіць пошук прыватных архіваў былых вучняў Беларускай гімназіі. Мае каля 150 кніг, карт, нотаў, паштовак, выдадзеных у міжваенны перыяд у Заходняй Беларусі, Латвіі, а таксама дарэвалюцыйных выданняў. Сярод іх вельмі рэдкія, напрыклад: «Гісторыя беларускай літаратуры» М. Гарэцкага (1926), «Птушка шчасця» Ф. Аляхновіча (1922), «Аб плодазьмене. Сялянская бібліятэка № 9» М. Кацаўрава (1920), «Парады цяжарным» І. Цвікевіча (Мн., 1923), «Сасонка» Я. Купалы, муз. М. Аладава (Мн., 1925), О.Ф. Сахарава «Птушка на волі» (Дзвінск, 1932), «Ёлка Дзеда Мароза», «Беларускія крывіцкія казкі № 1. Каваль Рымша і змей» (1929), «Historyja Biełarusi u kartach. Pavodle lekcyj čytanych ing. M. Abramčykam, na kursach biełarusavedy u Berline 1941–1942 hodzie vydannie Bieł. samapomačy, berlinskaha addziełu» (1942) і інш. Сярод іншых унікальных экспанатаў — ліст, зроблены з бяросты, які дзяўчына даслала з лагера свайму брату ў 1945 г.

Перадаў значную колькасць матэрыялаў у Музей Янкі Купалы ў Мінску, а таксама музеі Браслава, Віцебска, Даўгаўпілса, Краслава, Міёраў, Навагрудка, Пастаў, музей Яд-Вашэм (Іерусалім). Толькі ў Браслаўскі музей перадаў больш за 1,5 тысячы экспанатаў. На аснове матэрыялаў калекцыянера ў Браслаўскім раённым музейным аб'яднанні былі арганізаваны 3 выставы. На падставе дакументаў, сабраных даследчыкам ягоная цёшча была ўзнагароджана званнем «Праведнік свету» за ўратаванне яўрэяў у гады Другой сусветнай вайны.

Удзельнік Браслаўскіх чытанняў 1997, 2000, 2003 гг. Аўтар артыкулаў, надрукаваных у «Браслаўскіх сшытках», зборніках Браслаўскіх чытанняў, бюлетэні «Беларускі калекцыянер» (Орша, выд. Сярожкін). Аўтар некалькіх артыкулаў у бюлетэні «Павет». На аснове матэрыялаў, якія былі прадстаўлены калекцыянерам, падрыхтаваны і надрукаваны ў мясцовым перыядычным друку («Наша газета», Даўгаўпілс) цэлы шэраг артыкулаў.

Тв.: Да гісторыі знаходкі 10 грошай часоў паўстання 1831 г. // Браслаўскія чытанні: матэрыялы IV навукова-краязнаўчай канферэнцыі, 24–25 красавіка 1997 г. — Браслаў, 1997. — С. 44–45; Выхадцы з Браслаўшчыны ў Даўгаўпілсе: Беларусы на землях Латгаліі // Браслаўскія чытанні: матэрыялы V навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 939-годдзю першай згадкі Браслава ў пісьмовых крыніцах. — Браслаў; Наваполацк: Усяслаў Чарадзей, 2001. — С. 71–72; Роля купалаўскай драматургіі ў працэсах нацыянальнага самаўсведамлення латгальскіх беларусаў // Я. Купала і праблемы беларускага самапазнання: V Міжнародныя Купалаўскія чытанні — навуковая канферэнцыя, Мінск, 7–8 снежня 2002 г. — Мн.: Бел. кнігазбор. — С. 42–45; Браслаўшчына на паштоўках // Павет. — 2001. — № 1. — С. 2; Ксёндз Язэп Гайлевіч // Павет. — 2001. — № 4, снежань. — С. 5; Язэп Гайлевіч // Наша вера. — 2003. — № 3. — С. 20–21; Дакументы па гісторыі Браслаўшчыны // Павет. — 2003. — № 11, лістапад. — С. 6; Рэха катыньскай трагедыі // Павет. — 2003. — № 2 (15). —Люты. — С. 7; Цікавая знаходка // Тамсама. — С. 8; Дакументы па гісторыі Браслаўшчыны // Павет. — 2003. — № 11 (24). — Лістапад. — С. 6; Куток калекцыянера // Павет. — 2004. — № 3 (28). — Сакавік. — С. 8; Новыя археалагічныя помнікі Браслаўшчыны // Павет. — 2005. — № 8 (45), снежань. — С. 3.

Літ.: Корсак Т. На кангрэсе беларусістаў // БЗ. — 2001. — № 102. — С. 2; Знаходкі Міколы Паўловіча // Павет. — 2005. — № 6 (43), кастрычнік. — С. 4–5; Гедюне Е. Микола, что старит старину… // Наша газета (Даўгаўпілс). — 2007. — № 8. — С. 56; Наш сябар з Даўгаўпілса // БЗ. — 2008. — 1. — С. 3; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Паўловіч М. (30.01.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Інтэрв'ю М. Паўловіча (30.01.2009, г. Даўгаўпілс) // Тамсама.

**ПАХОЛКІНА** ЛЮДМІЛА ВАСІЛЬЕЎНА, журналіст. Працавала гал. рэдактарам газеты «Сцяг Перамогі» Лёзненскага райвыканкама. Аўтар артыкулаў, прысвечаных славутым землякам, воінам Савецкай Арміі, якія вызвалялі Лёзненшчыну.

Тв.: Подзвігу жыць у вяках: [Герой Савецкага Саюза Л.П. Ціхмянаў] // СП (Л). — 1981. — 22 студз.; Память не знает забвения; Так воевали братья Козловы // СП (Л). — 2001. — № 50. — С. 2; Отец и сын Рябовы — отважные пулеметчики // СП (Л). — 2003. — 7 кастр. — С. 3; Дзеля вызвалення Айчыны: [П.Ф. Чумакоў] // СП (Л). — 2005. — 7 мая. — С. 3; Незабываема, как первая любовь. 200 год: [Бабынавіцкай СШ] // СП (Л). — 2006. — № 38. — С. 1, 2; Живет в Добромыслях ровесник Октября: [І.Ц. Акунёў] // СП (Л). — 2007. — № 16. — С. 2.

**ПАЧОПКА** ЯНКА (Пачопка Іван Пятровіч; *Башкір*, *Праваслаўны, Я. Башкір, Янка Башкір, Я.Шкір-ба, Шкір-ба*) (26.10.1890, в. Летнікі Дзісненскага пав. Віленскай губ., цяпер Залескага с/с Глыбоцкага раёна – 29.05.1977, в. Малінаўка Глыбоцкага раёна), паэт, празаік, фалькларыст. Скончыў Варанецкую сельскагаспадарчую школу (цяпер Пастаўскі раён, 1913). Працаваў у дэпартаменце земляробства Віленскай губ., рэдактарам двухтыднёвіка «Праваслаўны беларус» (1925), які выдаваўся ў Варшаве, аграномам (1939–1958). У 1930-я гг. жыў на сваёй гаспадарцы. Друкаваўся ў газеце «НН». З ранняга юнацтва збіраў і запісваў народныя казкі, паданні, якія потым склалі кнігу «Дурнішча: народныя казкі і апавяданні на Дзісненшчыне» (1927). Вершы, народныя паданні, казкі, апрацаваныя Я. Пачопкам друкаваліся на старонках дзіцячых часопісаў «Заранка», «Пралескі», «Праваслаўны беларус», «Маланка», «Калоссе», «Хрысціянская думка», газеце «Сялянская ніва». Быў блізкім сябрам Я. Драздовіча, М. Машары.

Тв.: Дурнішча: Народныя казкі і апавяданні на Дзісненшчыне. — Вільня, 1927.

Літ.: Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 418–419; Кулажанка Л., Мальдзіс А., Сачанка С. Літаратурныя мясціны Беларусі: краязнаўчы даведнік: у 3-х кн. Кн. 1: Брэсц., Віцеб. і Гомел. вобл. — Мн.: БелЭн, 2000. — С. 156.

**ПАШЭВІЧ** ВЕРАНІКА, краязнаўца. У докшыцкай раённай газеце «Родныя вытокі» апублікавала матэрыялы краязнаўчага характару, у тым ліку прысвечаныя гісторыі каталіцкіх храмаў, землякоў, помнікам гісторыі і культуры краю.

Тв.: Даць і ганарыцца // РВ. — 1996. — № 11. — С. 3; Слабада. Царква Святой Праведнай Ганны // РВ. — 1999. — № 98. — С. 2; Валкалата. Касцёл Святога Яна — Іаана Хрысціцеля // Тамсама; Сітцы. Царква Вялікапакутніка Георгія Перамоганосцы // РВ. — 2000. — № 3. — С. 3; Няўрымслівы эсперантыст з Бягомля // РВ. — 2000. — № 9. — С. 2; Помнікі расказваюць // РВ. — 2000. — № 40. — С. 4; Не згубіць — захаваць // РВ. — 2001. — № 18. — С. 2; За медалямі — гісторыя // РВ. — 2001. — № 49. — С. 2; Ён ваяваў у Кранштаце // РВ. — 2002. — № 16. — С. 1, 2.

Літ.: Татаринов Ю. Города Беларуси: Витебщина. — Мн.: Энциклопедикс, 2006. — С. 37.

**ПЕТРАЧЭНКА** МІХАІЛ ВАСІЛЬЕВІЧ (15.11.1926, в. Лакшы Заборскага с/с Расонскага раёна Полацкай вобл., цяпер Віцебская вобл.), педагог, краязнаўца. Скончыў Полацкае педвучылішча (1947), гіст. факультэт ВДПІ (1953). Працаваў у Клясціцкай сямігодцы Полацкага раёна (1947–1949), дырэктарам Маторынскай сямігодкі Расонскага раёна (1949–1950), Бародзініцкай і Плюскай СШ Браслаўскага раёна (1950–1957), Бачэйкаўскай СШ Бешанковіцкага раёна (1957–1970), настаўнікам гісторыі ў Бачэйкаўскай СШ (1970–1987).



Цікавасць да мясцовай гісторыі абудзілася пасля 1945 г., калі вярнуўся з эвакуацыі на радзіму. Пад час сямігадовай працы ў Браслаўскім раёне краязнаўствам не займаўся. З 1957 г. жыве ў Бачэйкаве. Даследуе гісторыю мястэчка, гісторыю рода Цэханавецкіх, падзеі вайны 1812 г. на Віцебшчыне, падзеі Другой сусветнай вайны ў родным краі.

Удзельнічаў у стварэнні школьнага музея ў в. Бачэйкава. Перадаў некаторыя копіі архіўных матэрыялаў у сельскую бібліятэку. Працаваў у архівах і музеях Мінска, Лепеля. Меў стасункі з архівам УС РФ (г. Падольск). Матэрыялы па гісторыі раёна друкаваў у газетах «Советская Белоруссия», «Во славу Родины», «Віцебскі рабочы», «Зара». Матэрыялы, сабраныя краязнаўцам, былі выкарыстаны пры падрыхтоўцы перадач рэспубліканскага і абласнога тэлебачання. Мае ненадрукаваную працу «Гісторыя Бачэйкава», якая знаходзіцца ў асабістым архіве.

У час працы ў школе шмат вандраваў з дзецьмі па Полацкім, Расонскім, Бешанковіцкім раёнах. Дапамагаў навукоўцам кансультацыямі і матэрыяламі А. Федаруку, А. Мальдзісу, С. Законнікаву, Н. Гілевічу, Р. Барадуліну, літаратарам і мастакам РБ і РФ. Сустракаўся з Анжэем Цэханавецкім, былым уладаром Бачэйкава, у мястэчку і Нясвіжы (1988).

Тв.: Имение Бочейково и его владельцы // Зара. — 2007. — 19 ліст. — С. 6, 8.
Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Петрачэнка М.В. (27.09.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ПЕТУХОЎ** ЮРЫЙ СЯРГЕЕВІЧ (19.08.1984, г. Віцебск), архівіст. Скончыў гіст. факультэт ВДУ (2006). Працуе ў ДАВВ (з 2006). Даследуе асобныя пытанні гісторыі і культуры Віцебшчыны. Бярэ ўдзел у навуковых канферэнцыях. Аўтар некалькіх артыкулаў краязнаўчага характару.

Тв.: Сельская гаспадарка Віцебскай акругі напярэдадні першай пяцігодкі // Итоги НИР – 2004: VII (52) научная конференция студентов, магистрантов и аспирантов: сборник статей. — Витебск: ВГУ, 2003. — С. 27–29; Культурна-асветніцкая і адукацыйная палітыка савецкай улады ў камунах Віцебскай губ., 1918–1921 гг. // Инновации-2004: материалы XI Республиканской студенческой научно-практической конференции, г. Мозырь, 22 апреля 2004 г.: в 2-х ч. Ч. 2. — Мозырь: МГПУ, 2004. — С. 94; (разам з В.І. Акуневічам) Дакументы Віцебскай гарадской управы як гістарычная крыніца // Европа во Второй мировой войне: История, уроки, современность: материалы международной научно-теоретической конференции, 5–6 мая 2005 г. Витебск: ВГУ, 2005. — С. 108–111.
Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Петухоў Ю.С. (22.06.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ПЕЦЮКЕВІЧ** МАР'ЯН (*Марвіч, Цяцерскі*) (24.09.1904, в. Цяцеркі Браслаўскага раёна – 25.9. 1983, г. Торунь, ПНР), этнограф, краязнаўца, мемуарыст. Скончыў Віленскую беларускую гімназію (1926), аддзяленне этнаграфіі і этналогіі Віленскага універсітэта (1938). Працаваў у бібліятэцы Інстытута Усходняй Еўропы і бібліятэцы імя Урублеўскіх (1930–1939), дырэктарам Віленскага беларускага музея імя Івана Луцэвіча (1939–1941). Рэпрэсаваны органамі НКУС і высланы ў Варкуту, а потым на Урал (1949–1956). Пасля рэабілітацыі выехаў на сталае жыццё ў ПНР. Працаваў у Этнаграфічным музеі г. Торуні (1956–1970). Адзін з лепшых краязнаўцаў Заходняй Беларусі ў міжваенны час.



Родны край пачаў вывучаць пад час вучобы ва ўніверсітэце. Займаўся зборам этнаграфічных матэрыялаў, на аснове якіх напісаў дыпломную работу «Першабытныя рысы народнай культуры стараробаў у Браслаўскім павеце», выкананую пад кіраўніцтвам вядомага польскага этнографа Казіміра Машынскага, для якога збіраў матэрыялы па матэрыяльнай культуры беларусаў. Выступаў у друку, супрацоўнічаў з часопісамі «Lud», «Literatura ludowa», «Prace popularnonaukowe Towaristwa




naukowego», друкаваўся ў газетах «Ніва» (Беласток), «Беларускі календар» і інш. Займаючыся ў гуртку аматараў беларусазнаўства пры Віленскім універсітэце імя С. Баторыя, падрыхтаваў памятку збіральніку фальклорных матэрыялаў, праграму-апытальнік для вывучэння народных абрадаў пахавання-памінання «Дзяды» (у 10 раздзелах змяшчае 283 пытанні). Праграма не страціла сваёй актуальнасці і цяпер. Аўтар артыкула «Мікола Нікіфароўскі — беларускі этнограф».

Рыхтаваў асобную працу, прысвечаную сваёй роднай вёсцы Цяцеркі, матэрыяльнай і духоўнай культуры яе жыхароў. Аднак манаграфія не пабачыла свет. Рукапіс захоўваецца ў архіве Таруньскага этнаграфічнага музея (1976). У манаграфіі — гісторыя вёскі і жыхары, выпіскі з літаратуры, геаграфічнае палажэнне і тапанімія (у тым ліку слоўнік па мясцовай тапаграфіі Цяцерак), промыслы, земляробства і жывёлагадоўля, кавальства (слоўнікі па кірунках), сямейныя адносіны, рэлігійныя стасункі, народная медыцына, духоўная культура, народная літаратура (у тым ліку тэксты апавяданняў, прыслоўяў, песняў, праклёнаў). Зберагаецца і фотаархіў да працы.

Пасмяротна выдадзены яго ўспаміны «У пошуках зачараваных скарбаў» (1998), «Кара за службу народу» (2001) і частка навуковых артыкулаў «Сляды незабыўныя продкаў» (2007).

Тв.: Кнігі: У пошуках зачараваных скарбаў. — Вільня: Рунь, 1998. — 183 с.; Кара за службу народу. Абразкі з ссыльнага жыцця. — Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства, 2001. — 198 с.; Лісты, 1956–1982 / рэд. А. Глагоўская, В. Харужы. — Беласток, 2005; Сляды незабыўныя продкаў: этнаграфічныя нарысы. — Мн.: Кнігазбор, 2007. — 124 с.; Мой дзённік. Падарожжа ў Рым. — Вільня: Таварыства беларускай культуры ў Літве, 2007.

Літ.: Саламевіч Я. Пецюкевіч М. // Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя — Мн.: БелСЭ, 1989; Кожан К. З аўтабіяграфіі Мар'яна Пецюкевіча // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Браслаўскага раёна. — Мн., 1998. — С. 590–593; Кулажанка Л., Мальдзіс А., Сачанка С. Літаратурныя мясціны Беларусі: краязнаўчы даведнік: у 3-х кн. Кн.1: Брэсц., Віцеб. і Гомел. вобл. — Мн.: БелЭн, 2000. — С. 143; Саламевіч Я. Пецюкевіч М. // БЭ. Т. 12. — Мн.: БелЭн, 2001. — С. 341; Спецыяльны выпуск да 100-годдзя даследчыка // Павет. — 2004. — № 10, кастрычнік; Цяцеркі. Незавершаная манаграфія // Павет. — 2004. — № 10 (35), кастрычнік. — С. 4; Саламевіч Я. Этнаграфія — яго любоў // Сляды незабыўныя продкаў: этнаграфічныя нарысы. — Мн.: Кнігазбор, 2007. — С. 120–123.



**ПІВАВАР** МІКАЛАЙ ВАСІЛЬЕВІЧ (5.12.1971, п. Лужасна Віцебскага раёна), педагог, краязнаўца. Кандыдат гіст. навук (2007). Скончыў Мазалаўскую СШ Віцебскага раёна (1988), гіст. факультэт МДПІ (1993). Працуе ў Лужаснянскай школе-інтэрнацегімназіі для здольных і таленавітых дзяцей з Віцебскай вобл. (з 1993), на пасадзе дацэнта на кафедры гісторыі Беларусі ВДУ (з 2008).

Комплексна даследуе Віцебшчыну, аддаючы перавагу вывучэнню гісторыі і культуры краю, экалагічнага стану, помнікаў прыроды і ахоўваемых тэрыторый, жыцця і дзейнасці землякоў, распрацоўцы турыстычна-краязнаўчых маршрутаў у наваколлях Віцебска. Прыняў удзел у стварэнні гіст. часткі экспазіцыі выставачнага цэнтра «Духаўскі круглік». Аўтар перасоўных выстаў «Наш край» (1999, Лужаснянская гімназія), «Нечаканыя ваколіцы» (2009, «Задзвінне», ВРГКМ), «Гонар і слава Прыдзвінскага краю» (2010, Лужаснянская гімназія), прысвечаных папулярызацыі турыстычных рэсурсаў наваколляў Віцебска.

Аўтар кніг «Методыка выяўлення і рэгістрацыі помнікаў прыроды ў краязнаўчай працы» (1999), «Туристско-краеведческие походы и экскурсии в окрестностях Витебска» (2002), «Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г.» (2006), аўтар-укладальнік кнігі «Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы» (2008). Аўтар больш за 40 артыкулаў у міжнародным, рэспубліканскім, рэгіянальным навуковым друку, 50 артыкулаў у перыядычным друку на краязнаўчую тэматыку («Краязнаўчая газета», «Народнае слова», «Віцьбічы», «Віцебскі рабочы», «Жыццё Прыдзвіння», «Вечерний








Витебск»). Распрацаваў і выдаў больш за 10 буклетаў, прысвечаных наваколлям Віцебска. Распрацоўшчык і стваральнік сайта «Наш край: наваколлі Віцебска» (www.kraj.vitebsk.net, 1999, 2003), а таксама сайтаў прысвечаных Лужаснянскаму дэндрапарку і р. Лужаснянцы. Стварыў базу звестак па гісторыі і культуры наваколляў Віцебска, якая ўтрымлівае інфармацыю пра помнікі даўніны, прыроды, славутых землякоў, пісьмовыя гіст. крыніцы, пошукавы рух, персаналіі краязнаўцаў Віцебшчыны, значны графічны матэрыял. Фотаздымкі перыядычна друкуюцца ў «Краязнаўчай газеце».

Тв.: Кнігі: Методыка выяўлення і рэгістрацыі помнікаў прыроды ў краязнаўчай працы. — Віцебск, 1999. — 32 с.; Туристско-краеведческие походы и экскурсии в окрестностях Витебска. — Витебск, 2002. — 116 с.; Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г.: даведнік. — Віцебск: ВАД, 2006. — 176 с.; Маршрутами Придвинья. — Витебск: Обл. комитет по спорту и туризму, 2007. — 16 с.; Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І.А. Абрамава [і інш.]; аўт.-уклад. М.В. Півавар. — Мінск: Паркус плюс, 2008. — 328 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Краязнаўства // Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск: БелЭн, 2005. — Т. 1. — С. 719–721; Туристическо-краеведческая экскурсия по пойме Лужеснянки к усадьбе Сапунова в урочище Каховка // 90 гадоў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі: матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 24 лістапада 1999 г. — Мн.: БелНДІДАС, 2000; Краязнаўчыя цікавасці і турыстычныя рэсурсы месцаў, звязаных з дзейнасцю А.П. Сапунова // Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю: матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаных 150-годдзю з дня нараджэння А.П. Сапунова, Віцебск, 6–7 чэрвеня 2001 г. — Мн.: БелНДІДАС, 2002; Гісторыка-культурная і прыродная спадчына ў наваколлях Віцебска: Некаторыя звесткі пра аб'екты, якія могут быць зарэгістраваны як помнікі прыроды, гісторыі і культуры // Веснік ВДУ. — 2003. — № 1. — С. 3–11; Гістарычныя й краязнаўчыя вандроўкі як сродак выхавання // Мэтадычны дапаможнік беларускага настаўніка. — Мн.: Цэнтар Супольнасць, 2003. — 222 с. — С. 197–205; Месца краязнаўства ў гістарычнай навуцы і ідэалогіі Беларусі, Расіі, Украіны ў другой палове XX ст. // Славянскі свет: Мінулае і сучаснае: матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі, Мінск, 26 сакавіка 2004 г.: у 3 ч. / ВДУ; рэдкал.: А.П. Жытко [і інш.]. — Мінск, 2004. — Ч. 3. — С. 138–143; Пошукавы рух Беларусі ў 2-й палове XX ст. // Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны: матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 24 чэрвеня 2004 г. / ВДУ, ВАКМ; рэдкал.: В.У. Акуневіч [і інш.]. — Віцебск, 2004. — С. 118–122; Краязнаўчая дзейнасць клуба «Узгор'е» ў Віцебску ў канцы 1980 – пачатку 90-х гадоў // Веснік ВДУ. — 2004. — № 4. — С. 10–13; Гістарычнае краязнаўства ў Беларусі ў другой палове XX стагоддзя // Беларускі гістарычны часопіс. — 2005. — № 3. — С. 46–52; Краязнаўца з Віцебска, або Не забывайма пра сваіх рупліўцаў // Настаўніцкія інавацыі. № 2/3. Метадычны бюлетэнь для настаўнікаў. — Гдыня, 2005. — С. 34–38; Клуб «Дзвіна» — асяродак гістарычнага краязнаўства ў школе // Народная асвета. — 2005. — № 3. — С. 49–52; Е.Р. Раманаў і развіццё гістарычнага краязнаўства Віцебшчыны // «Открыть миру душу белоруса…»: міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 150-годдзю з дня нараджэння Е.Р. Раманава, Гомель, 25–26 кастрычніка 2005 г. / рэдкал.: А.Р. Яшчанка [і інш.]. — Гомель: ГДУ, 2005. — С. 177–180; Гісторыя краязнаўства: Да выдання зборніка персаналій краязнаўцаў і гісторыкаў Віцебшчыны // Романовские чтения – 2: сборник трудов Международной научной конференции, Могилев, 10–11 ноября 2005 г. / МгГУ; редкол. О.В. Дьяченко [и др.]. — Могилев, 2006. — С. 97–99; Краязнаўчыя даследаванні Віцебска дзяржаўнымі установамі ў 1960–1991 гг. // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры: зб. навук. арт. / ГрДУ; рэдкал.: І.П. Крэнь, І.В. Соркіна (адк. рэд.) [і інш.]. — Гродно: ГрГУ, 2007. — С. 394–398; Новыя помнікі прыроды ў Гарадоцкім раёне // Гарадоччына ўчора, сёння, заўтра: матэрыялы І Гарадоцкіх краязнаўчых чытанняў, 28 кастрычніка 2007 г. / ГРКМ; А.М. Дарафееў (адк. рэд.) [і інш.]. — Гарадок, 2008. — С. 142–144; (разам з В.В.



Шведам) Беларуские и латышские исследователи Подвинья XIX — первой трети XX в. // Latgale ka kultures pierobeza. — Daugawpils: Saule, 2008. — С. 39–48; Вывучэнне гісторыі і культуры Полаччыны XVI – пачатку XXI стст.: Даследчыкі і іх працы (даследчыкі Полаччыны XVI – пачатку XXI стст. і іх працы як краязнаўчыя помнікі) // Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі. Да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея / уклад. В.Д. Краско. — Полацк: НПГКМЗ, 2008. — С. 157–175; Краязнаўцы Лепельшчыны XVI – першай паловы XX ст. // III Лепельскія чытанні: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, 10 кастрычніка 2008, г. Лепель / рэд. кол.: А. Стельмах, У. Баранов. — Віцебск: Бюро оперативной полиграфии, 2008. — С. 104–121; Краязнаўцы Полаччыны другой паловы XX ст. // Беларускае Падзвінне: Вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў. Да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку: зборнік навуковых прац рэспубліканскага навукова-практычнага семінара, 20–21 лістапада 2008 года / пад аг. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. — Наваполацк: ПДУ, 2009. — С. 236–243; Стан помнікаў, узведзеных у гонар падзей Вялікай Айчыннай вайны ў Віцебскім раёне // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Память: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 18–19 чэрвеня 2009 г. / ВДУ; рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. — Віцебск: ВДУ, 2009. — С. 308–311.

Літ.: Краязнаўцы Віцебскага раёна // Память: Віцебскі раён: Гісторыка-дакументальная хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / уклад. У.І. Мезенцаў. — Мн.: Маст. літ., 2004. — С. 724; Дзядзінкіна С. Віртуальнае падарожжа па наваколлях Віцебска // НС. — 2002. — № 72. — С. 5; Шпакоўская Г. Космас — назва якому краязнаўства // НС. — 2002. — 14 снеж. — С. 3; Герасіменка М.П. Экспедыцыя «Наш край» у дзеянні // Детский туризм и краеведение Беларуси / авт.-сост. С.С. Митрахович. — Мн.: Рифтур, 2003. — С. 82; Слабин В.К. Интернетный сайт «Наш край» в экологическом и патриотическом образовании и воспитании // Краеведение в учебно-воспитательном процессе школ и вузов: сборник материалов республиканской научно-практической конференции, 16–17 октября 2003 г. — Брест: БрГУ, 2003. — С. 45–46; Варславан М. Гэта не прафесія, а стан душы // КГ. — 2006. — №2 (115), студзень. — С. 5; Карпас Е. «Исторические» трудности тестирования // ЗЮ. — 2006. — 12 мая. — С. 7; Шпакоўская Г. Краязнаўства — аснова патрыятызму // НС. — 2008. — 5 снеж. — С. 5.



**ПІЛАВЕЦ** ГАЛІНА ІВАНАЎНА (18.04.1963, в. Сяло Лёзненскага раёна Віцебскай вобл), педагог. Скончыла СШ № 1 г.п. Лёзна (1980), геаграфічны факультэт БДУ (1985). Працавала у СШ № 37 (1985–1986), СШ № 39 г. Віцебска (1990–1998), ст. выкладчыкам, дацэнтам у ВДУ (з 1998). Даследуе змены ландшафтаў, землекарыстанне на Віцебшчыне. Вывучае і папулярызуе жыццё і дзейнасць вядомага віцебскага метэаролага др. паловы XIX – пач. XX ст. А.С. Бялыніцкага-Бірулі. Аўтар манаграфіі «Хозяйственное освоение Витебской области в XVI–XX веках (историко-географический анализ)».

Тв.: Хозяйственное освоение Витебской области в XVI–XX веках: Историко-географический анализ. — Витебск: ВГУ, 2008. — 140 с.; А.С. Бялыницкий-Бируля — метеоролог Витебщины // Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю: матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаныя 150-годдзю з дня нараджэння А.П. Сапунова. — Мн., 2002. — С. 162–164.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Пілавец Г.І. (10.04.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ПІШЧУЛЁНАК** МІХАІЛ УЛАДЗІМІРАВІЧ (25.05.1953, в. Цімошкава Туркоўскага с/с Міёрскага раёна – 4.06. 2008), архівіст, педагог. Кандыдат гіст. навук (1990), Ганаровы архівіст Беларусі (2004). Скончыў гіст. факультэт МгДПІ (1974), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1990). У тым жа годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Праблемы дэмакратызацыі і галоснасці ў партыйных арганізацыях Беларусі». Працаваў настаўнікам гісторыі ў Павяцкай СШ Міёрскага раёна (1974–1977), у камсамольскіх і партыйных органах Віцебшчыны (1977–1987), кіраўніком аддзела па архівах і справаводстве Віцебскага аблвыканкама (1991–2008).

Асноўныя тэмы даследаванняў: архіўная справа на Віцебшчыне, праваслаўная царква ў XX ст., Вялікая Айчынная вайна на Віцебшчыне. Ініцыятар правядзення і актыўны ўдзельнік навуковых канферэнцый і архіўных чытанняў, «круглых сталоў», прысвечаных архіўным юбілеям, звязаных з гісторыяй краю, выдання матэрыялаў канферэнцый і зборнікаў дакументаў. Сярод інш. адзначым «90 гадоў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі» (1999), «Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю, прысвечаных 150-годдзю з дня нараджэння А.П. Сапунова» (2001). Выкладаў у ВДУ. Падтрымліваў адносіны з шэрагам дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый (ВАКМ, ВДУ, Музей М. Шагала, таварыства «Веды», БДТАПГіК).

Адзін з ініцыятараў утварэння першага рэгіянальнага аддзялення Археаграфічнай камісіі Белкамархіва — Віцебскага, а таксама аддзела навуковага выкарыстання і публікацыі дакументаў ДАВВ. Адзін з ініцыятараў і распрацоўшчыкаў гарадской і рэгіянальнай геральдыкі Віцебшчыны. Дзякуючы яго намаганням шэраг гарадоў і вёсак Віцебскай вобл. атрымалі гербы. Актыўны ўдзельнік (старшыня) тапанімічнай камісіі пры Віцебскім аблвыканкаме.




Рэдактар-укладальнік шэрагу выданняў, падрыхтаваных ДАВВ: «90 гадоў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі» (2000), «Витебщина архивная: история, фонды, персоналии (сер. XIX – XX вв.)» (2002), «Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю. Архіўныя чытанні, прысвечаныя 150-годдзю з дня нараджэння А.П. Сапунова» (2002), «Витебск. Классика и авангард. История Витебского художественного училища в документах Государственного архива Витебской области (1918–1923)» (2004), «Выстояли и подебили» (2005), «Праваслаўная царква на Віцебшчыне» (2006). Аўтар шэрагу артыкулаў у навуковым («Архівы і справаводства», «Беларуская мінуўшчына», «Беларуская думка», «Беларускі гістарычны часопіс», «Веснік ВДУ»), рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку («Віцебскі рабочы», «Віцьбічы», «Народнае слова»). Шэраг матэрыялаў перадаў у ДАВВ, дзе створаны асабісты фонд М.У. Пішчулёнка. Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».

Тв.: Артыкулы ў навуковым друку: (разам з Н. Старковай) Ціхі прытулак, або Чацвёртае адраджэнне: [царква] // БМ. — 1995. — № 6. — С. 26–29; Православная церковь на Витебщине в 1920-х – начале 1930-х годов (по материалам ГАВО) // Веснік ВДУ. — 1996. — № 1. — С. 12–16; Забойства Пэна. Афіцыйная версія // Зборнік выступленняў на навуковай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю Віцебскай мастацкай школы. — Наваполацк: Наваполацкая друкарня, 1997. — С. 63–66; Пра час, калі здымалі званы // БМ. — 1997. — № 6. — С. 16–19; А был ли портрет убийцы? К 60-летию со дня трагической смерти Ю. М. Пэна // Мишпоха — 1997. — № 3. — С. 111–114; Государственная архивная служба Витебщины: состояние и перспективы // 90 гадоў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, 24 лістапада 1999 г., г. Віцебск. — Мн.; Віцебск, 2000. — С. 10–16; Состояние и проблемы развития архивной отрасли на Витебшине на современном этапе // Архівы Беларусі на рубяжы XX–XXI стст.: Гісторыя, стан, перспектывы развіцця: Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, Мінск, 8–9 лютага 2000 г. — Мн., 2000. — С. 118–123; Архивисты Витебской области учатся зарабатывать деньги // АіС. — 2001. — № 3. — С. 78–83; Городские и районные архивы Витебской области: На этапе возрождения и укрепления // АіС. — 2001. — № 4. — С. 89–95; Городские и районные архивы Витебской области: На этапе возрождения и укрепления // Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю: матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаных 150-годдзю з дня нараджэння А. П. Сапунова 6–7 чэрвеня 2001 г., г. Віцебск. — Мн.; Віцебск, 2002. — С. 5–13; Архивное строительство на Витебщине в 1991–2001 гг. (Современные тенденции, проблемы, перспективы) // Витебщина архивная: история, фонды, персоналии, сер. XIX–XX вв. — Витебск, 2002. — С. 47–53; Віцебшчына архіўная. Да 150-годдзя ўтварэння першага дзяржаўнага архіва ў Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. — 2002. — № 4. — С. 30–36; Страшная арифметика потерь // Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 24 чэрвеня 2004 г. — Віцебск: ВДУ. — С. 44–48; Страшная арифметика потерь: Злодеяния фашистских оккупантов на Витебщине в фактах // Выстояли и победили: свидетельствуют архивы. — Витебск: ГУ ГАВО, 2005. — С. 5–9; Спящая смерть // Тамсама. — С. 24–25; Чем было вызвано письмо И. Сталина // Тамсама. — С. 36–37.

Артыкулы ў перыядычным друку: Крыніца вопыту і ведаў // ВР. — 1991. — 20 чэрв. — С. 2; Не — бяспамяцтву // ВР. — 1991. — 26 чэрв — С. 3; Вяртанне біржы // ВР. — 1991. — 4 ліп. — С. 3; Сто пудов серебра: [канфіскацыя царкоўнай маёмасці ў 1920-я гг.] // Віцьбічы. — 1991. — № 42. — С. 3; На работу в Германию // Віцьбічы. — 1991. — № 82. — С. 8; Крыніца вопыту і ведаў: [ДАВВ] // ВР. — 1991. — № 118. — С. 2; Жили-были, хлебушек растили: [с/х 1914–1918 гг.] // НС. — 1991. — № 53. 7 снеж.; (разам з В. Акуневічам) Тапанімічная рэвалюцыя на фоне Віцебска // НС. — 1992. — № 16. — С. 4; «Целесообразно стены разобрать…» // ВР. — 1992. — 7 сак. — С. 5; Целесообразно стены разобрать: [цэрквы Віцебска] // НС. — 1992. — № 28. — С. 5; 1938: Затмение: [грам.-паліт. жыццё Віцебшчыны] // НС. — 1993. — № 122, 125, 128; Новые документы о художнике: [Ю. Пэн] // НС. — 1993. — № 71. — С. 3; Мы должны сберечь архивное и документальное наследие // НС. — 1997. — № 76. — С. 3; Как сберегается архивное наследие // НС. — 1997. — № 130. — С. 3; Документальное наследие в надежных руках // НС. — 2002. — № 38. — С. 5; Ржавое рыло войны: [разміціраванне на Віцебшчыне] // НС. — 2004. — № 44. — С. 4; Об отце Вл. Караткевича: свидетельствуют документы // НС. — 2005. — № 7. — С. 5; Геральдика Витебщины // ТЭ. — 2008. — № 4. — С. 2.

Літ.: Закоржевский Г. «А золотые купола кому-то черный глаз слепили…»: [М. Пішчулёнак] // ВК. — 1998. — № 99. — С. 3; Шумейка М. Ф. Пішчулёнак М.У. // Архівісты Беларусі: біябібліяграфічны даведнік / склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. — Мн.: БелНДІДАС, 2006. — С. 178; Шпакоўская Г. Герб означает наследие: [геральдыка Віцебшчыны] // НС. — 2004. — № 18. — С. 5; Шпакоўская Г. По законам геральдики: [М. Пішчулёнак] // НС. — 2006. — № 18. — С. 6; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Пішчулёнак М.У. (1.06.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Шумейко М. Продолжатель богатых архивных и археографических традиций:

[М. Пішчулёнак] // AiC. — 2007. — № 5. — С. 122–124; Память. Михаил Владимирович Пищуленок // AiC. — 2008. — № 4. — С. 158–159.

**ПЛАВІНСКІ** МІКАЛАЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ (30.07.1981, г. Мінск). Скончыў гіст. факультэт БДУ (2003), аспірантуру пры Інстытуце гісторыі НАН Беларусі (2006). Працуе ст. навуковым супрацоўнікам ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі. Краязнаўчыя даследаванні распачаў з археалагічных разведак у Браслаўскім раёне з 2004 г. Удзельнічаў у экспедыцыях па Браслаўскім і Пастаўскім раёнах з 1994 г. Займаецца даледаваннем археалагічных помнікаў у Браслаўскім Паазер'і. Браў удзел у стварэнні некаторых выстаў у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі. Матэрыялы экспедыцый перададзены ў Музей гісторыі і культуры Беларусі, Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў.

Тв.: Кніга: Клінковая зброя X–XIII стст. на тэрыторыі Беларусі. — Мн.: Інстытут гісторыі НАН Беларусі. — 112 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Полацк да Рагвалода: Пытанні тапаграфіі і храналогіі культурнага слоя // ААД. Vol II. — Мн., 2007; Курганный могильник Погоща: результаты раскопок 2005–2006 годов // Lietuvos arheologia. T. 4. — Vilnius, 2008.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Плавінскі М.А. (17.06.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ПЛАВІНСКІ** МІКОЛА ХВЕДАРАВІЧ (*Ю. Тутэйшы*) (19.05.1927, в. Уланавічы Віцебскага раёна), краязнаўца. Зацікавіўся гісторыяй роднага краю яшчэ ў дзяцінстве. Жыў на 3-й МОПРаўскай (цяпер вул. М.Ф. Ватуціна). Вучыўся ў 7-й Сталінскай школе (цяпер СШ № 27, каля касцёла Св. Барбары). Навучанне было на беларускай мове. Часта наведваў в. Рашоткі (цяперашні Мазалаўскі с/с Віцебскага раёна), дзе жыў яго дзед. Пачаў збіраць бібліятэку кніг, прысвечаных роднаму краю, якая загінула пад час вайны.

У часы Другой сусветнай вайны быў удзельнікам СБМ. У 1947 г. быў асуджаны на 10 год пазбаўлення волі паводле артыкула 58 прым. Тэрмін пакарання адбываў на Кубані і Урале. Вярнуўшыся дадому, уладкаваўся ў мехкалону № 43 Беларускай чыгункі, дзе працаваў цесляром да выхаду на пенсію. Па службе шмат вандраваў (разам з мехкалонай) па Беларусі, Літве, Заходняй Расіі. У час летняга адпачынку аб'ездзіў амаль увесь СССР (як чыгуначнік меў права на бясплатны квіток). Быў у Хабараўску, Навасібірску, ва Узбекістане, на Каўказе, у Малдавіі і інш. рэгіёнах СССР. Аглядаў цэнтр горада, наведваўся ў кнігарні. Свае ўражанні занатаваў у некалькіх дзясятках блакнотаў, на аснове якіх рабіў альбомы.

Разам з вандроўкамі за межы Беларусі ў 1960–1990-я гады актыўна займаўся даследаваннямі Віцебшчыны. З'яўляўся карэспандэнтам Г. Каханоўскага, М.Ф. Мельнікава, Г. Кісялёва. Шэраг здабыткаў і адкрыццяў, зробленых краязнаўцам, маюць важнае значэнне не толькі для краязнаўства Віцебшчыны, але і гіст. навукі Беларусі. Напрыклад, у 1974 г. адшукаў мясцовасць, дзе знаходзілася былая в. Пуцявішча, такім чынам лакалізаваўшы месца дзеяння паэмы «Тарас на Парнасе» і месца жыхарства галоўнага героя — палясоўшчыка Тараса. Дзякуючы Г. Кісялёву ўвёў яе ў навуковы ўжытак. Знаходка стала важным аргументам у вырашэнні спрэчкі адносна аўтарства паэмы на карысць К. Вераніцына. Знайшоў месца пахавання І. Манькоўскага — беларускага асветніка XIX ст., аднаго з верагодных аўтараў першай паэмы на беларускай мове «Энеіда навыварат», які пражываў у маёнтку «Мілае» (сучасная в. Мазалава Віцебскага раёна).

Высветліў месца пахавання Дарты Пліекшане (Грышкоўскай), маці латышскага паэта Яна Райніса, і стаў ініцыятарам усталявання памятнага знака ў яе гонар. Пры дапамозе Віцебскага абласнога аддзялення БДТАПГіК і латышскіх пісьменнікаў на Старасямёнаўскіх могілках быў змешчаны валун з памятнай шыльдай. Выказваў прапанову ўсталяваць у Цірaспалі помнік невядомаму савецкаму герою-танкісту, які ў 1941 г. на рагу дарог, што вядуць на Полацк і Гарадок, здзейсніў таран нямецкага танка (ДАВВ. Ф. 487, воп. 1, спр. 105, арк. 45).

Першым на Беларусі ўзняў тэму «беларускага салаўя» — М. Забэйды-Суміцкага, з якім 17 год перапісваўся. У 1963 г. пабыў на яго канцэрце ў Віцебску. У «Ніве» (Беласток) надрукаваў артыкул пра гэтую падзею. Толькі ў 1988 г. гэты матэрыял быў надрукаваны ў «Віцебскім рабочым», але рэдактара ўсё адно з-за яго выклікалі ў Мінск «для тлумачэнняў». Тэма была падхоплена мінскімі журналістамі. Яны прыязджалі ў Віцебск, бралі інтэрв'ю, здымалі рэпартаж для тэлебачання, дакументы прапанавалі аддаць у архіў. Сам Плавінскі

напісаў некалькі артыкулаў на гэтую тэму, у тым ліку і ў «Маладосць». Перадаў у БДАМЛіМ матэрыялы перапіскі са славутым спеваком.

Даследаваў жыццё і дзейнасць беларускага савецкага пісьменніка 20–30-х гадоў XX ст. Зміцера Жыткевіча. Склаў яго біяграфію для біябібліяграфічнага слоўніка «Беларускія пісьменнікі».

Быў знаёмы, актыўна ліставаўся з грамадскімі і культурнымі дзеячамі Беларусі, сярод якіх Р. Барадулін, Я. Брыль, В. Быкаў, Зоська Верас, Н. Гілевіч, С. Грахоўскі, М. Забэйда-Суміцкі, У. Караткевіч, А. Каўка, А. Мальдзіс, З. Пазняк, Я. Скрыган, М. Улашчык, С. Шушкевіч і інш. У Віцебску яго наведваў Г. Каханоўскі.

Браў актыўны ўдзел у працы БДТАПГіК: пленумах, канферэнцыях, уваходзіў у склад праўлення Віцебскага абласнога аддзялення. Быў дэлегатам на трэцім, чацвёртым, пятым, шостым з'ездах таварыства, дзе абіраўся ў склад Рэспубліканскага савета. Браў удзел ва ўстаноўчым з'ездзе ТБМ (1989), I З'ездзе беларусаў свету, Устаноўчым з'ездзе Беларускага краязнаўчага таварыства (1989).

На працягу 30 гадоў М. Плавінскі выпісваў амаль усе рэспубліканскія выданні і склаў багаты прыватны архіў матэрыялаў пра Віцебшчыну і Беларусь. Матэрыялы ўтрымліваюцца ў дзясятках спецыяльных шуфлядаў, для захавання якіх пабудаваў асобнае памяшканне. Для спрашчэння карыстання фондамі стварыў картатэку.

Актыўна займаючыся краязнаўчым вывучэннем гісторыі Віцебска і яго наваколляў, публікаваў шэраг матэрыялаў. Друкаваная спадчына Плавінскага на краязнаўчую тэматыку ўключае ў сябе больш за сотню артыкулаў у рэспубліканскім («Звязда», «ЛіМ», «Маладосць», «Беларусь», «Родная прырода») і мясцовым друку («Віцебскі рабочы», «Народнае слова», «Віцьбічы»). На старонках друкаваных выданняў выступаў з артыкуламі, прысвечанымі роднаму краю, рэцэнзіямі на кнігі пра Беларусь, публіцыстычныя артыкулы ў абарону беларускай мовы, гісторыі, культуры. Аўтар брашуры пра Юр'еву горку — «Юр'ева горка з арліных вышынь» (1994). Асобна адзначым стыль аўтара. Ён вызначаецца лёгкасцю, прыемны для ўспрымання, нават навуковыя паведамленні аздоблены прыгожымі мастацкімі ўстаўкамі. Па словах беларускага гісторыка Кісялёва Г., беларускай мовай Плавінскі валодае як сапраўдны літаратар.

Неаднаразова ладзіў выставы, прысвечаныя юбілеям нацыянальных дзеячаў гісторыі і культуры. Свой верш Плавінскаму прысвяціў Рыгор Барадулін. У канцы 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст. некалькі разоў выступаў на Віцебскім тэлебачанні ў перадачах, прысвечаных нацыянальнаму Адраджэнню і культурнаму жыццю Віцебшчыны (напрыклад, 26 красавіка 1991 г. дэманстравалася перадача, прысвечаная Юр'евай горцы). На абласным тэлебачанні зняты і паказаны нарыс «Краязнаўца», прысвечаны М. Плавінскаму (25 лютага 1989 г.).

Тв.: Кнігі і артыкулы ў энцыклапедыях: Юр'ева горка з арліных вышынь. — Віцебск: ВАД, 1994. — 13 с.; Жыткевіч Зміцер // Беларускія пісьменнікі: бібліяграфічны слоўнік. Т. 2. — Мн: БелЭн, 1993. — С. 467–468.

Артыкулы ў навуковым друку: Салавей Бацькаўшчыны мілай // Беларусь. — 1990. — № 2; «Об'ективности ради…» // Политический собеседник. — 1990. — № 6; Славуты Спявак // Беларуская мова і літаратура ў школе. — 1990. — № 12; Каб вярнулася да народа яго гістарычная памяць: Праблемы сённяшняга краязнаўства // Браслаўскія чытанні: матэрыялы II навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 925-годдзю Браслава (1065–1990), 16–17 лютага 1991 г. / навук. рэд. М.А. Ткачоў. — Браслаў: Браслаўскі філіял Пастаўскай узбуйнёнай друкарні, 1991. — С. 58 — 60; Ці не пара змяніць шыльду? // Беларуская мова і літаратура ў школе. — 1991 — № 6; З кагорты першых // Дзвіна: Віцебшчына літаратурная. — Мн.: Маст. літ., 1992. — С. 280–283; Крамянёўка — гаючая вада // Родная прырода. — 1992. — № 3; Міхась Забэйда-Суміцкі ў маім жыцці // Маладосць. — 1993. — № 4.

Артыкулы ў перыядычным друку: Наспеўшае пытанне // ВР. — 1956. — 1 кастр.; Патрэбны спецыяльны зборнік //ЛіМ. — 1957. — 23 лют.; Еще раз об истории с географией // СБ. — 1973. — 1 сак.; Позірк у гісторыю // ЛіМ. — 1979. — 3 жніўня; Віцебскія вуліцы // ВР. — 1980. — 16 жніўня; Улица, на которой твой дом // СБ. — 1980. — 19 снеж.; Якім будзе праспект // ВР. — 1981. — 15 студз.; Пра клімат Віцебска: [рэцэнзія] // ВР. — 1982. — 16 лют.; У гонар Купалаўскага свята // ВР. — 1982. — 16 ліп.; У гонар юбілею // ЧЗ. — 1982. — 2 снеж.; Пяром і зброяй: [З. Жыткевіч] // ВР. — 1984. — 7 ліст.; Для маладых і старых // ВР. — 1986. — 4 ліст.; Закон і вакол закона // ЛіМ. — 1986. — 14 ліст.; Беларускі салавей // ВР. — 1988. — № 112. — С. 4; Аб Віцебску родным вядзецца гаворка // ВР. — 1989. — № 198; Узважыць «за» і «супраць» / ВР. — 1989. — 26 жніўня; Хто наступны? // ЛіМ. — 1989. — 10 ліст.; У абарону А. Белакоза // НГ. — 1990. — 13 студз.; «Мо не забудзе мяне матчын край…» // ЛіМ. — 1990. — 2 сак.; Вяртанне на Бацькаўшчыну // ВР. — 1990. — 22 чэрв.; Беларускі салавей у «Политическом собеседнике» // ЛіМ. — 1990. — 2 ліст.; Дзе гэта вуліца?: [вуліца А. Сапунова ў Віцебску] // ВР. — 1990. — 9 жніўня; Носьбіты славутага прозвішча // НГ. — 1990. — 3 кастр.; Цёзкі па прозвішчу ці нашчадкі? // ВР. — 1990. — 23 жніўня; Быў. Ёсць. Будзе // ВР. — 1990. — № 217. — С. 3; Што такое «бубашка» ? // ВК. — 1990. — 1 снеж.; Пра абыякавасць нашу… // ЛіМ. — 1991. — 4 студз.; Памяці Ларысы Геніюш // ЛіМ. — 1991. — 24 мая; Колькі ж нас-глухіх, сляпых… // ВР. — 1991. — 7 лют.; Светлай памяці Ларысы Геніюш // Беларускае тэлебачанне і радыё. — 1991. — 4 сак.; Наш сын прыёмны, родны сын: [прысвечаны 60-годдзю Г. Кісялёва] // ВР. — 1991. — № 53. — С. 3; Каб вярнулася да народа яго гістарычная памяць… // БЗ. — 1991. — 21 сак.; Пахвальнае слова памяці // ВР. — 1991. — 7 мая; Зміцер Жыткевіч // ВР. — 1991. — 15 чэрв.; Працяг Скарыніяны // ВР. — 1991. — 20 чэрв.; Маці родная — адзіная // ВР. — 1991. —

18 ліп.; Улюбёны ў родны край: [В. Каратынскага] // ВР. — 1991. — 15 чэрв.; Сцежкамі легендарнага Тараса / ВР. — 1991. — 25, 26, 27 верас.; «Нарыхтоўка дроў» на… могілках? // Віцьбічы. — 1991. — 30 ліст.; Дарце Пліекшан, маці Песняра // ВР. — 1991. — № 130. — С. 4; Дзёгцем па святынях // ЛіМ. — 1992. — 17 студз.; З чарнасоценным душком // НС. — 1992. — 21 сак.; Я тут, тутэйшы! // НС. — 1992. — 11 крас.; Не магу змаўчаць // НС. — 1992. — 1 мая; Беларуская нацыя — гістарычны блеф? // ЛіМ. — 1992. — 17 крас.; Болькі дзедаўшчыны // НС. — 1992. — 2 кастр.; Каласавіны // ВР. — 1992. — 31 кастр.; Прывід ці сапраўды праблема ? // Віцьбічы. — 1992. — 31 кастр.; Да веку — толькі чвэрць веку… // ВР. — 1992. — 10 ліст.; 39 беларускіх выданняў — аднаму адрасату // Звязда. — 1992. — 11 ліст.; Юр'ева Горка // НС. — 1992. — 7, 14, 21, 28 ліст.; Ваша імя можа застацца ў гісторыі // Выбар. — 1992. — № 12; Навошта выдумляць «веласіпед»…, або Новыя «чарнасоценныя» байкі пра адсутнасць у беларусаў нацыі і іншых аналагічных складаемых // Віцьбічы. — 1992. — № 148. — С. 2–3; Вуліцы Віцебска, як вам цяпер называцца? // Віцьбічы. — 1992. — № 140. — С. 2; Даваенны Віцебск у «Лабірынтах страху» // Віцьбічы. — 1993. — 16, 23 сак.; Гавары, ды не загаворвайся… // Рэспубліка. — 1993. — 19 лют.; Масток над хвалямі Дунайскімі // НС. — 1993. — 20 сак.; Каб потым не было сорамна… // Во славу Родины. — 1993. — 5 сак.; Яго цудоўныя песні слухаў старажытны Віцебск // НС. — 1993. — 3 чэрв.; «Літоўская гаспадыня» — беларускай гаспадыні // Віцьбічы. — 1993. — 2 верас.; Дзякуй, людзі добрыя, за спагаду і дапамогу // НС. — 1993. — 21 жніўня; Нячыстыя страсці ля тэатральнага пад'езда // Выбар. — 1994. — 17 лют.; Повязі братнія з часоў аддаленых // Віцьбічы. — 1994. — 7 чэрв.; Каму ж верыць? // Во славу Родины. — 1994. — 25 лют.; Пошукі імя // ВР. — 1994. — 9 ліп.; Віцебскія Лукішкі, або Чацвёрты замак у Віцебску // Віцьбічы. — 1994. — 1 снеж.; «Мядзвежую паслугу» — уласнымі рукамі // Выбар. — 1994. — 7 снеж.; З найменнем «Віцебскія» // Віцьбічы. — 1995. — 29 чэрв.

Літ.: Панізьнік С. Хай Вам працуецца і жывецца // ГлР. — 1982. — 28 кастр.; Каханоускі Г. У віцебскага калекцыянера і краязнаўца // Маладосць. — 1984. — № 10; Киселев Г. «Разыскивается классик…». — Мн.: Маст. літ., 1989. — С. 97–99, 398; Смирнова О. Ай да Пушкин… // Віцьбічы. — 1991. — 27 сак.; Валодзька Г. Краязнаўцы Паазер'я, яднайцеся // ВР. — 1991. — 4 крас.; Усцінаў А. Першы крок ца сцяжынцы да храма // ВГл. — 1991. — 20 верас.; Скрабатун У. Краязнаўчая канферэнцыя ў Глыбокім // Зважай. — 1992. — № 1; Малашэня Л. Царква без крыжа — народ без памяці // НС. — 1992. — 23 ліст.; Скрабатун У. Ян Райніс і Беларусь // Вентас Балсс. — 1992. — 6 ліст.; Буткевич С. Лед тронулся через тридцать лет // НГ. — 1993. — 17 сак.; Русецкі А. Глыбокай плыні, «Дзвіна» // ВР. — 1993. — 18 сак.; Вішнеўскі А. Віцебшчына літаратурная // ЛіМ. — 1993. — 14 мая; Пишут краеведы // НС. — 1994. — 16 чэрв.; Тючкалов Е. Родной город знаем и любим // Віцьбічы. — 1995. — 1 студз.; Тючкалов Е. Поздравления победителям // Віцьбічы. — 1995. — 12 студз.; Барадулін Р. На змярканні. Міколу Плавінскаму // Полымя. — 1995. — № 1; Кадушка В. Пясчынка да пясчынкі, цагліна да цагліны // НС. — 1996. — 20 лют.






**ПЛЫСАЎ** ВІКТАР ФЁДАРАВІЧ (20.09.1957, г. Віцебск – 22.02.2010), журналіст, краязнаўца. Скончыў СШ № 29 г. Віцебска (1975), факультэт правазнаўства БДУ (1984). Працаваў скарняком-раскройшчыкам на Віцебскім футравым камбінаце імя Еўсцігнеева (1975), пам. майстра на Віцебскім дывановым камбінаце (1977–1980), юрыстконсультам на Заходне-Дзвінскім МРС, будаўніча-мантажным трэсце № 28 (1984), карэспандэнтам газеты «Спартыўная панарама» (з 2000 г.), аглядальнікам у газеце «Віцьбічы» (з 2004). Служыў ва УС СССР (1975–1977).

Даследаваў гісторыю і культуру Віцебска, гісторыю спартыўнага жыцця горада. Зацікавіўся гісторыяй Віцебска з кан. 1970-х гг., калі вучыўся на курсах экскурсаводаў Віцебскага бюро турызма і экскурсій (1979). З'яўляўся членам таварыства «Веды». Значны ўплыў на фарміраванне цікавасці да гісторыі рэгіёна зрабіла знаёмства з А. Падліпскім.

Укладальнік шэрагу брашур, даведнікаў па гісторыі спорта ў г. Віцебск, сярод інш. «Летапіс футбола Віцебшчыны (1912–2001 гады)» (2002), «Футбольны клуб "Лакаматыў"» (за 2002–2007), «Футбол Віцебшчыны» (разам з А. Падліпскім) і інш. Удзельнічаў у стварэнні кнігі «Спартыўны летапіс Віцебска». Бярэ ўдзел у напісанні гісторыі футбола Віцебска, гісторыі спорта Віцебшчыны. Аўтар артыкулаў на краязнаўчыя тэмы ў мясцовых перыядычных выданнях Віцебшчыны: «Віцебскі рабочы», «Віцьбічы». Аўтар ідэй і прапаноў па шанаванні спартыўных дасягненняў горада: алеі спартыўнай славы Віцебшчыны, пытанняў для конкурсаў і віктарын на веданне гісторыі футбола Віцебска.

Тв.: (разам з А. Падліпскім) Футбол Витебщины. — Витебск: ВОУТ, 1984. — 32 с.; Участники Великого Октября на Витебщине С.А. Крылов и М.А. Евстигнеев. — Витебск: ВОУТ, 1987. — 4 с.; Герои Советского Союза Т. Мариненко и З. Туснолобова-Марченко. — Витебск: ВОУТ, 1987. — 4 с.; Строительно-монтажный трест № 28 «Витебскгражданжилстрой». — Мн.: Полымя, 1987. — 18 с.; Новополоцкий хоккей. — Витебск: Типография телезавода, 1989. — 18 с.; КИМ. Футбольный клуб: календарь-

справочник. — Витебск: ВОУТ, 1993. — 44 с.; Команды Витебщины в чемпионатах Беларуси. — Витебск: ВОТ, 2002. — 36 с.

Артыкулы ў перыядычным друку: Рекорды Витебщины // Віцьбічы. — 2006. — 17 жніўня; Витебск туристический // Віцьбічы. — 2007. — 21 жніўня; Летопись Придвинского края // Віцьбічы. — 2008. — 17 студз.; Летопись древнего Витебска // Віцьбічы. — 2008. — 9 лют., 1 сак., 5 крас., 12 крас.; Летопись Витебска. XX век // Віцьбічы. — 2008. — 19 крас., 3 мая., 17 мая., 31 мая., 14 чэрв., 26 ліп., 30 жніўня., 13 верас., 27 верас., 18 кастр., 1 ліст.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Плысаў В.Ф. (11.03.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ПЛЕШЫВАВА** ТАЦЦЯНА, педагог, краязнаўца. Працуе загадчыцай бібліятэкі пры Відзскім ПТВ Браслаўскага раёна. Пасля сыходу з вучылішча А. Самойленкі працягвала працу ў музеі, арганізавала збіральніцкую дзейнасць.

Літ.: Краязнаўчай праца ў Відзскім профтэхвучылішчы // Павет. — 2005. — № 8 (45), снежань. — С. 7.



**ПРАКАПОВІЧ** ІГАР МІХАЙЛАВІЧ (9.12.1960, г. Паставы), краязнаўца, педагог. Скончыў СШ № 2 і СПТУ № 2 у г. Паставы, геаграфічны факультэт БДУ (1984). Спецыялізаваўся на фізічнай геаграфіі (геамарфологія і лімналогія). Працаваў настаўнікам геаграфіі, біялогіі і хіміі Апідамскай школы, старшынёй Палескага сельсавета Пастаўскага раёна Віцебскай вобл.), настаўнікам геаграфіі і астраноміі СШ № 1 г. Паставы (з 1986). Скончыў аспірантуру пры Нацыянальным інстытуце адукацыі па спецыяльнасці «Агульная педагогіка» (завочна, 1999). Падрыхтаваў да абароны кандыдацкую дысертацыю па тэме «Тэарэтычна-дыдактычныя асновы пабудовы сістэмы школьнага краязнаўства». Член Геаграфічнага таварыства Беларусі (1985). Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (1994).

Сфера інтарэсаў як даследчыка і грамадскага дзеяча шырокая: геаграфія наваколляў (геамарфалогія, лімналогія, тапаніміка, ландшафтазнаўства), лакальная гісторыя Пастаўшчыны (даславянская гісторыя рэгіёна, старажытныя гандлёвыя шляхі, археалагічныя помнікі, нямецкія ўмацаванні і пахаванні на лініі фронта Першай сусветнай вайны, гіст. мясціны Пастаўшчыны. Сур'ёзна займаецца літаратурнай працай і журналістыкай, педагогікай, бардаўскай песняй. Пад час вучобы ў БДУ праходзіў практыку і працаваў у экспедыцыях галіновай навукова-даследчай лабараторыі азёразнаўства пры БДУ і лабараторыі вывучэння ландшафтаў Інстытута геахіміі і геафізікі НАН Беларусі.

Аўтар 12 кніг пра Пастаўскі край, сярод якіх «Фізічная геаграфія Пастаўскага раёна» (1994, 2007), «Адкуль паходзяць назвы: Назвы рэк і азёр Пастаўскага раёна» (2000), «Крыжы і камяні: нарысы па гісторыі Пастаўскага краю» (2003), «Ваколіцы Пастаў» (2004), «Насельніцтва Пастаўскага краю» (2004), «Сістэма школьнага краязнаўства» (2006) і інш. Укладальнік кнігі «Дзе Мядзелка песні пяе… Пастаўшчына літаратурная (проза, паэзія, публіцыстыка)» (2006), якая змяшчае вершы і біяграмы пастаўскіх паэтаў. Сааўтар кніг «Манькавічы» (з А. Вансовічам, І. Заяц), «Мястэчка каля пушчы: Груздава і ваколіцы» (Собаль І.), «Мястэчка над возерам. Задзеўе і ваколіцы», напісанай разам з І. Заяц. Разам з ёй












выдаў кнігу «О Беларусь, мая шыпшына» (2007), прысвечаную У. Дубоўку, якая змяшчае ўспаміны пра пісьменніка, лісты, творы аб родных мясцінах, выказванні і вершы сучаснікаў і інш. матэрыялы. Разам з краязнаўцам з в. Гута Пастаўскага раёна М. Арэхам выдаў кнігу «Гута-Голбія» (2007). Браў удзел у падрыхтоўцы геаграфічнага паказальніка для кнігі В. Кіпеля «Беларускі друк на Захадзе».

Аўтар больш за 50 артыкулаў па краязнаўстве ў навуковым і перыядычным рэспубліканскім і мясцовым друку («Беларускі гістарычны часопіс», «Родная прырода», «Маладосць», «Крыніца», «ЛіМ», «Вожык», «Маладосць», «Звязда», «Турызм і адпачынак», «Настаўніцкая газета», «Народнае слова», «Шыпшына», «Краязнаўца Паазер'я», «Сумежжа», «Крэсы», «Нарачанская зара» і інш.). Распрацаваў вучэбныя праграмы «Спадчына», «Турызм-краязнаўства» і «Аэракасмічныя метады даследавання ў геаграфіі» (факультатыў). Член рэдкалегіі часопіса «Геаграфія: праблемы выкладання». Выдаў некалькі паэтычных зборнікаў: «Рэха малітваў» (1993), «Намагнічаны космас» (1996), «Шляхі наканаванага бязмежжа» (1999). Арганізаваў і правёў літаратурныя семінары, прысвечаныя У. Дубоўку: «Даўжанскія вечары – 96» і «Даўжанскія вечары – 99». Уваходзіць у рэдкалегіі рэгіянальных недзяржаўных неперыядычных выданняў «Шыпшына», «Краязнаўца Паазер'я», «Выспа літаратурная».

Адкрыў месца старажытнага паселішча каля воз. Саранчаны, курганны могільнік каля в. Міхаліна (Пастаўшчына). Лаўрэат прэміі часопіса «Маладосць» (1993). Фіналіст рэспубліканскага і пераможца абласнога конкурсу «Настаўнік года – 95», «Чалавек 2009 г. Віцебшчыны».

Тв.: Кнігі: Фізічная геаграфія Пастаўскага раёна. — Віцебск: ІУН, 1994. — 50 с.; Адкуль паходзяць назвы: Назвы рэк і азёр Пастаўскага раёна. — Наваполацк: Усяслаў Чарадзей, 2000. — 45 с.; Крыжы і камяні: нарысы па гісторыі Пастаўскага краю. — Маладзечна: Перамога, 2003. — 56 с.; (разам з А. Вансовічам, І. Заяц) Манькавічы: гісторыка-геаграфічны нарыс. — Паставы: Сумежжа, 2004. — 60 с.; Насельніцтва Пастаўскага краю. — Паставы: Сумежжа, 2004. — 56 с.; Ваколіцы Паставаў: Помнікі прыроды, гісторыі і культуры з маршрутамі краязнаўчых вандровак. — Паставы: Сумежжа, 2004. — 60 с.; (разам з І. Собаль) Мястэчка каля пушчы: Груздава і ваколіцы. — Паставы: Сумежжа, 2005. — 60 с.; Паставы: [фотаальбом]. — Мн.: Беларусь, 2006.; Дзе Мядзелка песні пяе…: Пастаўшчына літаратурная: проза, паэзія, публіцыстыка / уклад. І. Пракаповіч. — Мн.: Маст. літ., 2006. — 270 с.; И край родной откроет тайны: Система школьного краеведения. — Мн.: Четыре четверти, 2006. — 124 с.; (разам з І. Заяц) Мястэчка над возерам: Задзеўе і ваколіцы. — Мн.: Ковчег, 2006. — 56 с.; (разам з І. Заяц) О Беларусь, мая шыпшына…: На радзіме У. Дубоўкі. — Мн.: Тонпік, 2007. — 128 с.; (разам з М. Арэхам) Гута-Голбія: гісторыка-геаграфічны нарыс Галбейскага краю. — Мн.: Кнігазбор, 2007. — 88 с.; Фізічная геаграфія Пастаўскага раёна. — Мн.: Кнігазбор, 2007. — 124 с.; Паставы: гістарычная хроніка горада. — Мн.: Кнігазбор, 2007. — 80 с.; Чароўны край — Пастаўшчына: (гісторыка-краязнаўчы курс «Паставызнаўства»). — Мн.: Кнігазбор, 2009. — 304 с.

Артыкулы ў кнізе «Памяць» і навуковым друку: З глыбіні вякоў: [даславянская гісторыя Пастаўшчыны] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Пастаўскага раёна. — Мн.: БелТА, 2001, — С. 29–35; Сацыяльна-эканамічнае развіццё Пастаўшчыны да сярэдзіны XIX ст. // Тамсама. — С. 89–99; Выкарыстанне дапаможніка па геаграфіі свайго раёна // Геаграфія: Праблемы выкладання. — 1995. — № 1; Забыты шлях: [гіпотэза аб існаванні ў старажытнасці воднага гандлёвага шляху з Полацку у Вільню і Наваградак праз сістэмы рэк Дзвіны, Нёмана, Віліі, Дзісны і сістэмы Нарачанскіх і Мядзельскіх азёр] // Падарожнік. — 1996. — № 9, 10; Сляды Першай сусветнай // БМ. — 1996. — № 2. — С. 73–74; Возера, якое праглынула само сябе // Падарожнік. — 1997. — № 3; Праграма турыстычна-краязнаўчага гуртка // Школа: Авторство и творчество: сборник программ. — Витебск: ИПК и ПРР и СО, 1997. — С. 58–71; Праграма «Спадчына» // Геаграфія: Праблемы выкладання. — 1997. — № 8. — С. 117–127; Сістэма школьнага краязнаўства // Геаграфія: праблемы выкладання. — 1998. — № 1. — С. 103–114; Геаграфія і краязнаўства // Матэрыялы VI з'езда Бел. геаграф. таварыства, верасень – кастрычнік 1999. — С. 329–330; Агульныя рысы краязнаўства як сістэмы // Геаграфія: Праблемы выкладання. — 2001. — № 3. — С. 44–46; Заняткі краязнаўчага гуртка па тэме «Тапаніміка Пастаўскага раёна» // Геаграфія: Праблемы выкладання. — 2001. — № 4. — С. 66–71; Крыжы і камяні // Нашы карані. — 2002. — №4 — С. 45–46; Экспедыцыя «Водны шлях» // Нашы карані. — 2002. — № 4; Мадэль сістэмы краязнаўства ў школе і характарыстыка яе элементаў // Веснік адукацыі. — 2003. — № 1–2. — С. 22–29; Разнастайнасць форм і метадаў краязнаўчай работы і іх выкарыстанне ў сістэме школьнага краязнаўства // Геаграфія: Праблемы выкладання. — 2003. — № 4 — С. 77–92; Насельніцтва Пастаўскага краю // Нашы карані. — 2003. — № 9 — С. 20–42; Манькавічы // Нашы карані. — 2004. — № 12. — С. 4–27; Планаванне сістэмы краязнаўчай работы ў школе // Пазашкольнае выхаванне. — 2004. — № 7. — С. 25–29; Каб любіць Беларусь нашу родную // Беларуская думка. — 2004. — № 10. — С. 126–129; Сістэмны падыход да краязнаўчай работы // Народная асвета. — 2004. — № 11. — С. 56–58; Сляды Першай сусветнай на Пастаўшчыне // Нашы карані. — 2005. — № 15. — С. 21–26; Азёры Пастаўскага раёна // Нашы карані. — 2005. — № 15. — С. 55; Моўныя працэсы на Пастаўшчыне // Роднае слова. — 2005. — № 10. — С. 6–7; Паставы: Погляд географа // Геаграфія: Праблемы выкладання. — 2007. — № 5 — С. 50–57.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Пастаўская воласць у сярэдзіне XIX стагоддзя // Сумежжа. — 1991. — № 1; І стаў Пасаднік Паставамі // ПК. — 1991. — 5 крас.; Чый горад Паставы // ПК. — 1991. —

31 мая; Царкоўна-прыходскія школы на Пастаўшчыне // ПК. — 1992. — 10 студз.; На пачатку стагоддзя // ПК. — 1992. — № 8. — С. 2; За цемраю вякоў мінулых: Даславянскі перыяд на Пастаўшчыне // ПК. — 1992. — № 22–26; Звязана з гісторыяй Пастаў // ПК. — 1992. — № 31. — С. 2; Пастаўшчына — азёрны край // ПК. — 1992. — № 79. — С. 2; Дзе нашыя карані // Сумежжа. — 1993. — № 15. — С. 3; 90 год назад у Лучаі // Сумежжа. — 1994. — № 3. — С. 4; Святыя мясціны Пастаўшчыны: Верлібры І. Пракаповіча // ПК. — 1994. — № 70. — С. 2; Любіць Радзіму — значыць ведаць яе // ПК. — 1995. — № 28. — С. 2; Што ў назве // ПК. — 1995. — № 41. — С. 2; Уладзіміру Дубоўку — 95 // ПК. — 1995. — № 60. — С. 2; Бацькава закляцце // НС. — 1995. — № 77. — С. 5; Забыты шлях // ПК. — 1995. — № 102. — С. 2; Эхо далёкой войны… // ТиО. — 1995. — Июнь. — С. 4; Нямецкія чыгункі на Пастаўшчыне // ПК. — 1996. — № 1. — С. 2; З роду фундатараў і мецэнатаў: [фундатарка і мецэнатка з м. Лучай Альжбета Пузына (Агінская)] // ПК. — 1996. — № 22. — С. 3; Адкуль паходзяць назвы // ПК. — 1996. — № 62, 64, 74. — С. 2; Шляхі краязнаўства // ПК. — 1997. — № 25. — С. 2; Куточак радзімы ў Мінску // ПК. — 1998. — № 41. — С. 3; Адкрыцці і знаходкі // ПК. — 1999. — № 56. — С. 3, 4; Гісторыя і сучаснасць: [агляд кнігі земляка, доктара гуманістыкі Варшаўскай АН Юрася Гарбінскага «Беларуская філасофская думка XX стагоддзя»] // ПК. — 1999. — 17 сак.; Азёры Пастаўскага раёна // Шыпшына. — 2000. — № 2, кастрычнік; Краязнаўства: адкрыцці і знаходкі // ПК. — 2001. — № 60. — С. 4; Вандроўка ў Камайшчыну // ПК. — 2001. — № 107. — С. 4; Падмурак будынка гісторыі // ПК. — 2002. — № 12. — С. 2; Помнік паўстанцу ў Каралінове: [будаўніцтва мастаком А. Цыркуновым помніка паўстанцу Ф. Даноўскаму] // Шыпшына. — 2002. — 7 лют. — С. 3; Экспедыцыя «Водны шлях» // НГ. — 2002. — 25 чэрв. — С. 3; Нязломны дух Фларыяна: [лёс паўстанца Фларыяна Даноўскага] // НС. — 2002. — 5 ліст. — С. 5; Зберажом сядзібу мастака: [сядзіба мастака А.І. Ромера ў в. Каралінова] // НС. — 2002. — № 135. — С. 5; Помнік змагару: [Фларыян Даноўскі] // Крэсы. — 2003. — № 1–2; «Блізкая гісторыя» // ПК. — 2003. — № 3. — С. 3; Насельніцтва Пастаўскага краю // ПК. — 2003. — № 13, 14, 17, 26, 29, 32, 45, 61, 65, 69, 70, 79, 93, 94, 101, 111, 113, 118, 119, 121, 122, 126, 127; Моўныя працэсы на Пастаўшчыне // Новы час. — 2004. — 30 студз. — С. 3; Новыя знаходкі юных краязнаўцаў // ПК. — 2004. — 27 кастр. — С. 3; Праваслаўны храм у Паставах // ПК. — 2004. — № 150–151. — С. 3; Новыя адкрыцці // ПК. — 2005. — 14 верас. — С. 3; Задзеўе — назва таямнічая // ПК. — 2005. — № 115. — С. 5; Дукі ў пекле вайны // ПК. — 2005. — № 129–130. — С. 5; Сарачаны адкрываюць таямніцы // ПК. — 2005. — № 147. — С. 5; Гісторыя вёскі Груздава // ПК. — 2006. — № 9,10, 15, 26; Рамуальд Зянькевіч // ПК. — 2006. — 14 чэрв. — С. 3; Пастаўшчына літаратурная // ПК. — 2006. — 2 верас. — С. 3; Хроніка г. Паставы // ЛіМ. — 2006. — 1 верас. — С. 6; Шляхі вядуць у Паставы // Тамсама; Палац Тызенгаўзаў // Тамсама; Літаратурны каляндар // Тамсама; Метрычныя кнігі Груздаўскай царквы // ПК. — 2007. — № 5. — С. 3; Падарожжа ў Рокішкі // ПК. — 2007. — № 54, 55, 57, 59, 61, 63; Шматгранная і таленавітая асоба // ПК. — 2007. — № 71. — С. 3; Рокішкі: Горад, поўны турыстычных спакус // Турызм і адпачынак. — 2007. — 25 ліп. — С. 3; «Пастаўшчына напаіла мяне беларускай пявучасцю…» // ПК. — 2007. — 3 кастр. — С. 3.

Літ.: Пракаповіч Ігар // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Пастаўскага раёна. — Мн.: БелТА, 2001. — С. 521–522; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Пракаповіч І.М. (28.12.2003) // Асабісты архіў М.В. Півавара Бубала А. Прыгожы край на таленты багаты // ПК. — 2003. — № 117. — С. 3; Гук С. Усё класічна: [рэц. на кнігу «Мястэчка каля пушчы»] // НС. — 2005. — № 148. — С. 5; Паставы: [электронны рэсурс] // Сайт г. Паставы. — 2004. — Рэжым доступу: http://postavy.euro.ru /prokopov.html; Шпакоўская Г. Калі Радзіма натхняе: [І. Пракаповіч] // НС. — 2008. — № 1. — С. 9.

**ПРАКОФ'ЕЎ** А., педагог. Працуе ў Дварнасельскай СШ Міёрскага раёна. Даследуе Дзісненшчыну. Распрацаваў «Геаграфічны нарыс Міёрскага раёна». Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку, прысвечаных гісторыі, культуры, прыродзе Міёршчыны.

Тв.: Вята — прыгажуння // СП (М). — 1990. — № 57–67; Смерч // СП (М). — 1990. — № 87. — С. 4; Традыцыі і сучаснасць: без канфлікту // СП (М). — 1991. — № 38. — С. 3; Таямніцы дзён // СП (М). — 1991. — № 83. — С. 4; Кастрычнік // СП (М). — 1991. — № 88. — С. 4; Лістапад // СП (М). — 1991. — № 99. — С. 4; Студзень // СП (М). — 1992. — № 2. — С. 4; Адкрой для сябе родны край // СП (М). — 1995. — № 45. — С. 3; Непаўторнае аблічча Міёршчыны // СП (М). — 1996. — № 77. — С. 3.

**ПРЖЭВАЛЬСКІ** ЮСІФ ФЛАРЫЯНАВІЧ (24.12.1914, в. Скуратава Віцебскага раёна – 9.08. 1999), краязнаўца. Скончыў Мінскі педтэхнікум (1931). Працаваў дырэктарам сямігодкі ў Віцебскім раёне. У гады вайны нач. штаба, камісар атрада імя Чапаева брыгады Кірылава, ваяваў на фронце. Працаваў загадчыкам Багушэўскага рана (1944–1945), дырэктарам школы працоўнай моладзі № 2 г.п. Багушэўска, дырэктарам дзіцячага дома № 9 г.п. Багушэўскага раёна (1945–1954), завучам, ст. выхавацелем Багушэўскага дзіцячага санаторыя (1954–1964), інструктарам, лектарам аддзела прапаганды і адукацыі Сенненскага райкама КПБ (1964–1968), сакратаром парткама саўгаса імя А.К. Гараўца Сенненскага раёна (1968–1979), выхавацелем, інструктарам па працы ў дзіцячым санаторыі (1979–1981), сакратаром прафкама саўгаса імя А.К. Гараўца (1981–1988). Жыў у п. Рыбнае Сенненскага раёна.

Даследчык роду Пржэвальскіх. Склаў радавод роду да 12 пакалення. З гэтай мэтай працаваў ў Цэнтральным гістарычным архіве СССР. Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку на краязнаўчую тэматыку.

Тв.: Старонкі баявой славы: [1941 г. на Сенненшчыне] // ЛІ. — 1990. — № 52. — С. 2, 3; Чалавек. Камуніст. Педагог: [І.П. Пятруша] // ВР. — 1990. — № 75. — С. 3; Род Пржэвальскіх паходзіць з Віцебшчыны // ВР. —

1991. — № 6. — С. 4; Пра дзяўчат з чацвёртага батальёна // ВР. — 1991. — № 89. — С. 2; Легенды і факты: [Сталін І. — сын М. Пржэвальскага] // ГС. — 1992. — № 1. — С. 2; Абавязкова і з годнасцю // ГС. — 1999. — № 33. — С. 2.

Літ.: Кутузаў М. Вялікі следапыт // ВР; Да гістарычных фактаў трэба ставіцца ўзважана: [да 160-годдзя М.П. Пржэвальскага] // ГС. — 1999. — № 32. — С. 2–3; Пржэвальскі І.Ф. Некралог // ГС. — 1999. — № 65. — С. 4.

**ПРУДОЎСКІ** РЫГОР, краязнаўца. Займаў пасаду адказнага сакратара Расонскага раённага аддзялення БТАПГіК. Аўтар артыкулаў, прысвечаных гісторыі і культуры Расоншчыны, гісторый з мясцовага жыцця, якія змяшчаліся ў рубрыцы «Вячоркі ў дзеда Міхася» ў раённай газеце «Камуністычны шлях» (цяпер «Голас Расоншчыны»).

Тв.: Ці будзе ў Клясціцах помнік? // КШ. — 1989. — № 25. — С. 2; За кожным помнікам — людзі // КШ. — 1989. — № 62. — С. 2; Ніхто не хацеў паміраць: [1943] // КШ. — 1989. — № 79. — С. 2; (разам з В. Малікавым) Помнікі археалогіі // КШ. — 1989. — № 83. — С. 2, 3, 4; Першы нумар часопіса: [«Спадчына»] // КШ. — 1989. — № 125. — С. 2; (разам з В. Афанасьевым) Аб назве Клясціцы: Баі пад Клясціцамі ў 1812 г.; Рагнедзін курган; Сакалінскі замак; Вопіс царкоўных і манастырскіх маёнткаў // КШ. — 1990. — № 90. — С. 2–3; Ян Баршчэўскі — першы беларускі пісьменнік // КШ. — 1990. — № 114. — С. 2–3; За светлы дзень — жыцця не шкадавалі // ГлРс. — 1991. — № 8. — С. 2–3; Так пачыналася вайна // ГлРс. — 1991. — № 50–54, 56–60; Вечная памяць, вечная слава: [Клясціцы] // ГлРс. — 1991. — № 62. — С. 2; Дапаможам у выданні кнігі «Памяць» // ГлРс. — 1991. — № 71. — С. 1; Ветэран і сёння ў страі: [Я.Ф. Чумакова] // ГлРс. — 2004. — № 39. — С. 2; Ну і дарожнікі // ГлРс. — 2004. — № 54. — С. 4; Жывы вянок яе зямнога шчасця: [Н.У. Кожар] // ГлРс. — 2004. — № 69. — С. 3; Праз гады і выпрабаванні: [сям'я Дукаў] // ГлРс. — 2004. — № 71. — С. 3; Сцэнкі з жыцця // ГлРс. — 2005. — № 7. — 2007 — № 31–32. — 2008. — № 32; І ад сляпнёў ёсць карысць // ГлРс. — 2005. — № 24. — С. 4; Вайна не шкадавала нікога // ГлРс. — 2005. — № 36. — С. 2; Плешчуцца жыватворныя хвалі Белага Юхаўскага: [возера] // ГлРс. — 2005. — № 74. — С. 2; Удзячнасць нашчадкаў // ГлРс. — 2005. — № 88. — С. 3; Мянушкі дзеда Міхася // ГлРс. — 2006. — № 5. — С. 3; Зберагаем і прымнажаем нашы багацці // ГлРс. — 2006. — № 9. — С. 2; Дэпутат, асветнік, арганізатар: [С.Я. Алейнікава] // ГлРс. — 2006. — № 13. — С. 3; У Кавалях — цудоўныя народныя майстры // ГлРс. — 2006. — № 16. — С. 3; На занятках па гісторыі ў Клясціцкай школе // ГлРс. — 2006. — № 31. — С. 2; Зялёны турызм у Расонскім раёне: [рэц. на буклет] // ГлРс. — 2006. — № 90. — С. 2; Аповеды дзеда Івана // ГлРс. — 2006. — № 92. — С. 3; Новыя Рубахі, Аверкава, Бандары: [тапаніміка] // ГлРс. — 2007. — № 13. — С. 2; Як будзе рэканструявацца Клясціцкая ГЭС? // ГлРс. — 2007. — № 57. — С. 2; Я помню цябе, мая родная вёска // ГлРс. — 2008. — № 4. — С. 5; Гарадскі пасёлак Расоны — 50 гадоў // ГлРс. — 2008. — № 22. — С. 2; Вернутыя імёны: [1942–1944] // ГлРс. — 2008. — № 62. — С. 4.



**ПРУСКІ** ІВАН МАКСІМАВІЧ (11.02.1923, в. Варанцэвічы Старасельскай вол. Магілёўскага пав., цяпер Волкавіцкі с/с Талачынскага раёна – 22.03.2002), педагог, краязнаўца. Скончыў Варанцэвіцкую школу (1938), Беларускае педагагічнае вучылішча (1941), Аршанскі дзяржаўны настаўніцкі інстытут імя Я. Купалы (1950), гіст. факультэт ВДПІ (1955). Служыў у Савецкай Арміі (5.1944–12.1945). Працаваў настаўнікам пачатковых класаў Жукаўскай ПШ (1945–1946), загадчыкам Рацаўскай ПШ Талачынскага раёна (1946–1947), загадчыкам Башараўскай ПШ Талачынскага раёна (1947–1949), настаўнікам гісторыі Рыдомльскай сямігодкі (1949–1961), дырэктарам Няклюдаўскай сямігодкі (1961–1962), настаўнікам гісторыі Рыдомльскай СШ (1962–1963), настаўнікам гісторыі Варанцэвіцкай СШ Талачынскага раёна (1963–1984).

Краязнаўствам займаўся ў час працы настаўнікам гісторыі, і асабліва актыўна ў Варанцэвіцкай СШ. Вёў вялікую збіральніцкую працу, перапіску з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. На аснове сабраных матэрыялаў стварыў школьны музей, у якім меліся аддзелы старажытнай гісторыі Талачыншчыны, гісторыі Друцкага княства, гісторыі мясцовасці часоў ВКЛ, нумізматычны аддзел. Асобныя раздзелы былі прысвечаны гісторыі школы, мясцовага калгаса «Камсамольская праўда». На аснове матэрыялаў, сабраных па гісторыі партыз. руху на тэрыторыі Талачынскага раёна напісаў і выдаў кнігу «Партызанская брыгада "Чекист"» (1993). З мэтай выдання кнігі атрымаў ліцэнзію на выдавецкую дзейнасць.




На жаль, пасля сыходу на пенсію Івана Максімавіча музей амаль не выкарыстоўваўся ў педагагічным працэсе, а матэрыялы часткова былі раскрадзены, часткова перададзены ў інш. калекцыі.

Доўгі час з'яўляўся пазаштатным карэспандэнтам раённай газеты «Сцяг Ільіча» («Наша Талачыншчына»). Аўтар некаторых артыкулаў ў кнізе «Памяць» Талачынскага раёна.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

Тв.: Партизанская бригада «Чекист». — Толочин: И.М. Прусский, 1993. — 136 с.; Выбіраю смерць: [М. Валянтовіч] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна. — Мн.: БелСЭ, 1988. — С. 153–155; У шпіталі — хірург з Оршы: [К. Краўчанка] // Тамсама. — С. 258–259; Старонкі баявой біяграфіі // СІ. — 1966. — 7 ліп.; З партыз. штаба — за кафедру // СІ. — 1968. — 30 мая; Партизанские тропы // Вечерний Минск. — 1968. — 18 снеж.; Лінія жыцця // ВР. — 1969. — 11 ліст.; Каб людзі працавалі спакойна // СІ. — 1967. — 30 жніўня; Як след бліскавіцы // НГ. — 1979. — 3 студз.; Сувязныя // СІ. — 1985. — № 13. — С. 3; Героі кніг — нашы землякі // СІ. — 1985. — № 131. — С. 2; Пераемнасць: [В.М. Валянтовіч] // СІ. — 1987. — № 123. — С. 2; Даражэй за ўсё // ВР. — 1988. — 26 кастр. — С. 4; «Не магу здрадзіць Айчыне»: [М.Ф. Валянтовіч] // ВР. — 1988. — № 13. — С. 4; Даражэй за ўсё: [Э. Часлаўская] // ВР. — 1988. — № 205. — С. 4.

Літ.: Башарымаў М. Адшумелая слава // СІ. — 1989. — № 71. — С. 2; Біяграфічная даведка пра І.М. Прускага / падрыхтавана Т.І. Кухашынавай (дачка І.М. Прускага, студзень 2009 г.) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ПЯТРОВА-ПІГУЛЕЎСКАЯ** А., удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар успамінаў пра партыз. жыццё 1941–1944 гг., якія друкаваліся на старонках Шумілінскай раённай газеты «Герой працы». Аўтар кнігі, артыкулаў у перыядычным друку, прысвечаных дзейнасці Лаўжанскай партызанскай групы ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Тв.: Спецыфіка партыз. жыцця // ГП. — 2001. — № 46, 48; «Вазьмі мяне ў партызаны» // ГП. — 2001. — № 71. — С. 3.

**ПЯТРОЎ** К.В., гісторык. Кандыдат гіст. навук (1954). Аўтар дысертацыйнага даследавання «Крестьянское движение в Витебской губернии во время революции 1905–1907 гг.».

Тв.: Крестьянское движение в Витебской губернии во время революции 1905–1907 гг.

Літ.: Міхнюк У.М. Доктарскія і кандыдацкія дысертацыі па гістарычных навуках у Рэспубліцы Беларусь, 1991–2003 гг.: бібліяграфічны паказальнік. — Мінск: НАРБ, 2006. — 68 с.

**ПЯЧОНАВА** ВОЛЬГА УСЕВАЛАДАЎНА (8.08.1957, г. Пугачоў Саратаўскай вобл. РСФСР), краязнаўца, бібліёграф. Скончыла філал. факультэт ВДПІ (1978). Працавала настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў СШ № 1 г.п. Лёзна, загадчыцай дзіцячай бібліятэцы г.п. Лёзна (з 1981).

Даследаваннямі Лёзненшчыны пачала займацца, калі пачала працаваць у бібліятэцы. Па родзе дзейнасці трэба было вывучаць артыкулы ў мясцовым перыядычным друку, адказваць на запыты чытачоў, шэраг якіх быў звязаны з гісторыяй і культурай краю. Даследуе тапаніміку і антрапаніміку, прыродныя аб’екты і стан экалогіі раёна. Асаблівую ўвагу выклікаюць работы па анамастыцы Лёзненшчыны, некаторыя матэрыялы друкаваліся ў раённай газеце «Сцяг працы», але вартыя выдання ў форме кніг. Сярод інш. — «От Абакумова до Ященко… Фамилии Лиозненского района», «Предками названо. Происхождение названий населенных пунктов, рек, озер Лиозненского района», «Улицы Лиозно. Прошлое и настоящее». Вывучае стан рэк і азёр Лёзненшчыны.

Вядзе заняткі краязнаўчага гуртка, праграму якога «Лёзназнаўства» распрацавала самастойна. Вядзе экалагічны клуб «Колокольчик» пры Лёзненскай дзіцячай бібліятэцы (з 1985). Арганізатар некалькіх выстаў у дзіцячым садку.

Тв.: Фамилии белорусского городка // Наука и жизнь. — 2005. — № 11. — С. 109; Почему так названа деревня // НС. — 2003. — 11 верас.; У каждого названия — своя история: [гідронімы Лёзненшчыны] // СП (Л). — 2005. — 10 верас. — С. 2; От Абакумова до Ященко…: [прозвішчы жыхароў Лёзненшчыны] // СП (Л). — 2005. — 5 ліст. — С. 3; Что ни кольцо — то словцо // Віцьбічы. — 2006. — 2 лют. — С. 4.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Пячонава В.У. (5.09.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ПЯЧОНКІН** ВАЛЕРЫЙ ГЕОРГІЕВІЧ (2.08.1955, в. Макараўка Аршанскага раёна), педагог. Скончыў Барздоўскую СШ (1972), Аршанскае педагагічнае вучылішча (1974), геаграфічны факультэт Смаленскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, (1982, завочна). Працаваў настаўнікам у Гомельскай вобл., Аршанскім педвучылішчы, настаўнікам геаграфіі, а потым дырэктарам Барздоўскай СШ Аршанскага раёна (з 1980).

Краязнаўчую дзейнасць пачаў з 1980 г. з вывучэння наваколляў і калекцыянавання рэчаў матэрыяльнай культуры. Больш сур’ёзна заняўся даследаваннямі Аршаншчыны з другой паловы 1980-х гадоў пад уплывам нацыянальнага адраджэння. Разам з групай

краязнаўцаў Віцебшчыны браў удзел у вандроўках, якія ладзіліся загадчыкам аддзела краязнаўства і беларусазнаўства ВАЦППДіП А.В. Куржалавым, працаваў у архівах, музеях, бібліятэках Віцебска, Мінска, Оршы, Вільнюса, Санкт-Пецярбурга.

Даследуе этнаграфію, тапаніміку Аршаншчыны, гісторыю былой Пугляеўскай вол. Горацкага пав. Магілёўскай губ. Стварыў музей «Гісторыя роднай вёскі» ў Барздоўскай СШ (1988). У экспазіцыі музея 8 раздзелаў. У фондах утрымліваюцца каля 1200 экспанатаў. Найбольш цікавыя з іх — драўляная саха, калекцыя самавараў, гліняны посуд, лыжкі, ступы, біклажкі, ручнікі, абрусы. Музей мае копіі дакументаў, звязаных з гісторыяй вёскі XVIII–XX стст., узятыя ў архівах Вільні і Санкт-Пецярбурга, касеты з запісамі фальклорных песень, паданняў і інш. матэрыялы.

Актыўна ўдзельнічае ў абласных і рэспубліканскіх семінарах і канферэнцыях, прысвечаных краязнаўству. Аўтар артыкулаў пра Оршу і Аршанскі раён у кнізе «Памяць», публікацый у часопісе «Геаграфія: праблемы выкладання», бюлетэні Віцебскага абласнога аб’яднання пазашкольнай работы, газетах «Віцебскі рабочы», у «Аршанскай газеце». У хатнім архіве зберагаецца рукапіс «З гісторыі населеных пунктаў Беларусі». Рэцэнзіі на дзейнасць змяшчаюцца ў мясцовых рэгіянальных выданнях. Частку матэрыялаў перадаў у Музей этнаграфіі «Млын» г. Оршы, Музей У. Караткевіча у г. Оршы.

Узнагароджаны нагрудным знакам «За актыўную працу» Педагагічнага таварыства РБ.

Тв.: Артыкулы ў навуковым друку і кнігах «Памяць»: Народныя рамёствы Пугляеўскай вобл. у канцы XIX – пачатку XX ст // Аршанскі краязнаўчы зборнік. — Орша, 1995. — С. 43–45; Калектывізацыя ў Барздоўцы // Памяць: Гісторыка-культурная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 207.

Артыкулы ў перыядычным друку: Народная асвета ў Аршанскім павеце // АГ. — 1995. — № 6. — С. 3; Перапіс стогадовай даўніны Сітнік // АГ. — 1999. — № 10. — С. 2; Генерал з Барздоўкі // АГ. — 2003. — № 24. — С. 2; Мы помнім іх паіменна // АГ. — 2003. — № 61. — С. 2; У музейных зборах і знаходках: [У. Караткевіч] // АГ. — 2003. — № 179. — С. 2; Нашаму калгасу — 75: [в. Барздоўка] // АГ. — 2004. — № 47. — С. 2; Чатыры даты з гісторыі школы: [СШ у в. Барздоўка Аршанскага раёна] // АГ. — 2004. — № 137. — С. 2; Барздоўка і яе гаспадары // АГ. — 2005. — № 14. — С. 2; Дзе пахаваны мае землякі // АГ. — 2005. — № 54. — С. 2.

Літ.: Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 20; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Пячонкін В.Г. (25.11.2003) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Сучасныя беларускія краязнаўцы // КГ. — 2006. — № 9 (122). — Сакавік. — С. 2.



**ПЯЧОНКІН** ЯКАЎ МІХАЙЛАВІЧ (19.03.1924, в. Шчаперня Полацкага пав. Віцебскай губ.), архівіст. Скончыў Селявішчынскую ВШ Ушацкага раёна Віцебскай вобл. (1941), вячэрнюю школу рабочай моладзі ў г. Полацку (1953), вячэрні ўніверсітэт марксізму-ленінізму пры Полацкім гаркаме КПБ (1955), гадавыя курсы павышэння кваліфікацыі пры МДГАІ (1966). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі з арміі працаваў у архівах Полаччыны: навуковым супрацоўнікам, начальнікам аддзела агульных фондаў Дзяржархіва Полацкай вобл. (1945–1947), ст. навуковым супрацоўнікам архіўнага аддзела Упраўлення МУС па Полацкай вобл. (1947–1949), начальнікам аддзела агульных фондаў Дзяржархіва Полацкай вобл. (1949–1954), загадчыкам Полацкага гарадскога архіва (1954–1964), дырэктарам філіяла ДАВВ у г. Полацку (1964–1986).

Правёў вялікую працу па зборы, аднаўленні, упарадкаванні і ўліку архіўных фондаў, якія знаходзіліся ў хаатычным стане пасля вайны. Ажыццяўляў выяўленне дакументаў для шэрагу зборнікаў, рыхтаваўся да выдання даведнік «Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. і яго філіял у Полацку (1917–1941 гг.)», папулярызаваліся архіўныя дакументы праз друк, радыё, выставы.

Узнагароджаны 12 медалямі: «За баявыя заслугі», «За адвагу» і інш., Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Літ*:* ДАВВ. Ф. 3717-п, воп. 24, спр. 121; Пячонкін Я.М. // Архівісты Беларусі: біябібліяграфічны даведнік / склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. — Мн.: БелНДІДАС, 2006. — С. 180.

**РАДОМСКАЯ** ЛІЛІЯ ДЗМІТРЫЕЎНА (9.07.1937 г. Ленінград), краязнаўца, настаўніца рускай мовы і літаратуры СШ № 23 г. Оршы. Скончыла Панізоўскую СШ Аршанскага раёна (1956), гісторыка-філал. факультэт Смаленскага педагагічнага інстытута (1960).

Займацца краязнаўствам пачала пад час вучобы ў інстытуце, калі брала ўдзел у фальклорных экспедыцыях. Працуючы ў школе, займалася літаратурным краязнаўствам. Брала непасрэдны ўдзел у стварэнні музея ў СШ № 3 г. Оршы (1986). Частка сабраных матэрыялаў была перададзена ў дзяржаўныя музеі Оршы, Віцебскі абласны музей народнай адукацыі.

Вывучае жыццё, творчую дзейнасць знакамітых землякоў. Выступіла ініцыятарам афармлення ў Музеі славы настаўнікаў выставы, прысвечанай У. Караткевічу (26.11.1986). Дзякуючы актыўнай працы музей атрымаў званне народнага (1991). Аўтар кнігі «Уладзімір Караткевіч і Орша» (1998), шэрагу артыкулаў у кнігах «Памяць» Оршы і Аршанскага раёна, рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку.

Узнагароджана граматамі МА БССР, медалём «За доблесный труд». Выдатнік асветы БССР, Выдатнік асветы СССР.

Тв.: Кнігі: Уладзімір Караткевіч і Орша. — Орша.: Абласная друкарня. 1998. — 48 с.
Артыкулы ў кнізе «Памяць»: (разам з В.П. Лютынскім, В.М. Сцяпанавым, Л.В. Яршовай, І.А. Яршовым) У складзе Расійскай імперыі // Памяць: Гісторыка-культурная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 109–122; Асвета // Тамсама. — С. 201–203.
Літ.: Філіповіч У. Памяць аб мінулым — клопат аб будучым: [музей СШ № 3 г. Оршы] // ЛП. — 1986. — № 14. — С. 3; Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 21; Сучасныя беларускія краязнаўцы // КГ. — 2006. — № 9 (122), сакавік. — С. 2; Симанович Д. Витебский вокзал, или Вечерние прогулки через годы: дневники. — Мн.: Асобны, 2006. — С. 332.



**РАЙЧОНАК** АДА ЭЛЬЕЎНА (10.04.1937, г. Віцебск), педагог, краязнаўца. Кіраўнік культурна-асветніцкага цэнтра імя Я. Драздовіча, дырэктар Музея мастацтва і этнаграфіі імя Я. Драздовіча ў в. Германавічы Шаркоўшчынскага раёна Віцебскай вобл. Скончыла філал. факультэт Пскоўскага падінстытута (1965). Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў Шаркоўшчынскім раёне.

Вывучае гісторыю Шаркоўшчынскага раёна Віцебскай вобл. і Дзісненскага краю. Краязнаўчую дзейнасць пачала ў 1961 г. у Слабадской СШ і працягвала яе, выкладаючы ў Германавіцкай СШ. Значны ўплыў на фарміраванне цікавасці да вывучэння роднага краю аказаў А.В. Куржалаў. Актыўны ўдзельнік грамадскага і краязнаўчага жыцця Віцебшчыны. Арганізатар сустрэч, канферэнцый, семінараў, пленэраў, мерапрыемстваў краязнаўчага і беларусазнаўчага характару.

Стварыла культурна-асветны цэнтр у в. Германавічы, а таксама Музей імя Язэпа Драздовіча (2004). У ім сабраны карціны сучасных беларускіх мастакоў, якія ўдзельнічалі ў пленэрах «Шляхамі Язэпа Драздовіча», што кожны год арганізуюцца КАЦ імя Я. Драздовіча. Мае збор з 115 карцін і кніг з аўтографамі аўтараў. Сабраны таксама матэрыялы, звязаныя з жыццём і творчасцю сына Ады Эльеўны — Міхася Райчонка, які быў вядомым краязнаўцам Віцебшчыны, даследчыкам дзейнасці Я. Драздовіча, але памёр 14.01.1999, на 26-м годзе жыцця. Прыняла ўдзел у стварэнні сядзібы-музея І.П. Сікоры ў в. Алашкі Малыя (20 км на захад ад Шаркоўшчыны), выкупіла яго хату з мэтай стварэння экспазіцыі. Захоўвае архіў выдатнага селекцыянера.







Брала ўдзел у Браслаўскіх і Дзісненскіх чытаннях. Арганізатар краязнаўчых чытанняў у КАЦ (2009), па матэрыялах якіх выдадзены зборнік артыкулаў. Падтрымлівае сувязі з Браслаўскім музейным аб'яднаннем, Браслаўскім краязнаўчым таварыствам імя О. Гедэмана, Віцебскім аддзяленнем фонда імя Л. Сапегі, ТБМ, з'яўляецца старшынёй Шаркоўшчынскага раённага аддзялення. Сааўтар кнігі «Германавічы». Аўтар артыкулаў у кнізе «Памяць» Шаркоўшчынскага раёна, навуковым і перыядычным друку («Кліч Радзімы»,

«Нашы карані»). Падрыхтавала (разам з У.К. Ляскоўскім) рукапіс кнігі «Адукацыя ў Дзісненскім павеце».

Тв.: Кніга: (разам з А. Адамковічам, У. Ляскоўскім) Германавічы. — Паставы: Сумежжа, 2006. — 95 с.
Артыкулы ў кнізе «Памяць»: Верны клятве Гіпакрата // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Шаркоўшчынскага раёна. — Мінск: БелТА, 2004. — С. 409; (разам з М. Райчонкам) Два мастакі — два лёсы // Браслаўскія чытанні: матэрыялы IV навукова-краязнаўчай канферэнцыі, 24–25 красавіка 1997 г. — Браслаў, 1997. — С. 111–116; Дзісеншчына — мая радзіма: матэрыялы краязнаўчай канферэнцыі ў Германавічах, 3 ліпеня 2009 г. — Глыбокае: Барміца, 2009. — 40 с.
Артыкулы ў перыядычным друку: Краязнаўцы Віцебшчыны ў Польшчы // КР. — 1992. — № 68. — С. 3; Вяртаюцца з небыцця // КР. — 1992. — № 82. — С. 2; Кулак. Крывасмок ён ці не? // КР. — 1992. — № 95–97; Музей і… узнагарода // КР. — 1992. — № 102. — С. 1; Нашы папярэднікі // КР. — 1993. — № 10. — С. 2; Сын беларускага народа // КР. — 1993. — № 80. — С. 2; Яны пахаваны ў Жуках // КР. — 1994. — № 59. — С. 2; Каб гучала родная мова // КР. — 1995. — № 35–36. — С. 4; Край свой ведаць — шчасліва жыць // НС. — 1995. — № 127. — С. 2; Ён родам з Дзісеншчыны // КР. — 1996. — № 7. — С. 1, 2; Жылі яўрэі на Шаркоўшчыне // НС. — 1996. — № 25. — С. 4; Далёкі 20-ты год // КР. — 1996. — № 26. — С. 2; Шаркоўшчынскія карані Аляксандра Грына // НС. — 1996. — № 91. — С. 6; Святло далёкай зоркі: [І. Буйніцкі] // НС. — 1996. — № 95. — С. 6; Галоўны ўрач // КР. — 1999. — № 6. — С. 2; Імя ў гісторыі // КР. — 1999. — № 22. — С. 2
Літ.: Ляскоўскі У. Пад шатамі машараўскіх дубоў // КР. — 1990. — № 63. — С. 3; Іларыёнаў Г. Памяццю ўрастаем у свой край // КР. — 1991. — № 4. — С. 3; Лабачэўская Л. Шляхамі вечнага вандроўніка // КР. — 1993. — № 43. — С. 1, 3; Скалабан В. Сучасныя беларускія краязнаўцы // КГ. — 2005, сакавік. — № 10 (123). — С. 2; Корсак Э. Калі ў небе клін жеравоў // КР. — 1994. — № 88. — С. 3; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Райчонак А.Э. (4.11.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**РАЙЧОНАК** МІХАСЬ (3.07.1973, в. Германавічы Шаркоўшчынскага раёна – 14.01.1999), краязнаўца, паэт. Скончыў Германавіцкую СШ Шаркоўшчынскага раёна Віцебскай вобл. (1990), філал. факультэт ВДУ (1995).

Краязнаўчымі даследаваннямі пачаў займацца пад уплывам маці — Ады Эльеўны. На конкурсе «Мой роды кут» (1989) паведамленне на тэму жыцця і дзейнасці Я. Драздовіча (адзінае на беларускай мове) вельмі спадабалася паэту А. Канапельку, які прапанаваў паступаць у ВДПІ, што Міхась і зрабіў, хаця збіраўся паступаць у БІМСХ. Пад час вучобы ў інстытуце (потым універсітэце) удзельнічаў у пошукавым руху, археалагічных раскопках (пад кіраўніцтвам Т.С. Бубенькі), дзейнасці краязнаўчага гуртка, студэнцкім і грамадскім жыцці. Пачынае друкавацца на старонках рэспубліканскага і мясцовага перыядычнага друку («ЛіМ», «Народнае слова», «Віцебскі рабочы»).

Асноўнымі тэмамі даследавання з'яўляліся жыццё і дзейнасць Я. Драздовіча, пошукавая дзейнасць. Курсавая і дыпломная працы былі прысвечаны славутаму земляку (дыпломная работа захоўваецца ў Полацкім краязнаўчым музеі). Асэнсоўваў спадчыну «вечнага вандроўніка». Збіраў успаміны пра яго, склаў бібліяграфічны спіс, прысвечаных яму прац. Працаваў у архівах Віцебска, Мінска, Вільнюса, Пецярбурга. Гэтыя матэрыялы разам з інш. яго працамі выдадзены ў зборніку «Нашчадкам». Адзін з арганізатараў Дзісненскіх чытанняў.

На аснове матэрыялаў, сабраных у вандроўках і экспедыцыях па родным краі, разам з маці стварылі школьны музей. Намаганнямі М. Райчонка ў Германавічах быў створаны Культурна-асветніцкі цэнтр імя Язэпа Драздовіча (1995), які з'яўляўся своеасаблівым цэнтрам для краязнаўцаў Дзісеншчыны. Паклаў традыцыю правядзення мастацкіх драздовіцкіх пленэраў. Аўтар кніг, выдадзеных пасмяротна: «Як сын твой родны», «Нашчадкам!». Апошняя складаецца з некалькіх частак: артыкулы М. Райчонка і іншую аўтараў пра Я. Драздовіча, спіс літаратуры па славутых земляках (С. Булак-Балаховіч, У. Дубоўка, Б. Кіт, М. Машара, П. Сергіевіч і інш.).

Тв.: Кніга: Нашчадкам. — Германавічы, 2003. — 101 с.
Артыкулы ў навуковым і перыядычным друку: Настаўнік Сікоры: [І.Ф. Атрахімовіч] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Шаркоўшчынскага раёна. — Мінск: БелТА, 2004. — С. 435–436; (разам з А. Райчонак) Два мастакі — два лёсы // Браслаўскія чытанні: матэрыялы IV навукова-краязнаўчай канферэнцыі, 24–25 красавіка 1997 г. — Браслаў, 1997. — С. 111–116; Ці грэшнікі мы? // ВР. — 1992. — № 147. — С. 3; Настаўнік Сікоры: [І.Ф. Атрахімовіч] // НС. — 1993. — № 132. — С. 3; Мастак і прарок: [Я. Драздовіч] // НС. — 1993. — № 145. — С. 4; Як сын твой родны; Нашчадкам!; Мастак і прарок // КР. — 1994. — № 5. — С. 3; Абразкі // НС. — 1999. — № 77. — С. 6.
Літ.: Кожан К. Іду, крычу, люблю, жыву: [М. Райчонак] // НС. — 1999. — № 77. — С. 6; Куржалаў А. Слова пра сябра // Нашчадкам. — Германавічы, 2003. — С. 5–6; Сідарэвіч А. Выдадзена ў Паставах // НН. — 2005. — № 29, 5 жніўня. — С. 8; Райчонак А. Біяграфія М. Райчонка (21.12.2007) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**РАМАНАЎ** РААЛЬД ЛЕАНІДАВІЧ (1933, в. Чарэя Чашніцкага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыў тэхнікум, інстытут, аспірантуру. Кандыдат тэхнічных навук. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Латвіі. Узначальваў эксперыментальную базу Дзяржбуда СССР, кіраваў кааператывам «Стройтехнология» пры Дзяржбудзе. У часы вайны быў у партыз. атрадзе, сынам палка. Захоўвае рукапісны дзённік дзеда — Фёдара Міхайлавіча Раманава, у якім апісваюцца падзеі першай паловы XX ст. в. Чарэі і наваколляў.



Даследуе гісторыю культуры, архітэктуры, будаўніцтва. Выказаў гіпотэзу пра тое, што Белая царква ў в. Чарэя была пабудавана па праекце Арыстоцеля Фіяраванці — славутага італьянскага архітэктара, які будаваў храмы маскоўскага Крамля. Выдаў кнігу «Памятники культуры Белой Руси», рыхтуе працяг. Аўтар артыкулаў у перыядычным друку на краязнаўчую тэматыку.

Тв.: Таямніцы Арыстоцеля Фіараванці // БМ. — 1996. — № 4. — С. 38–40; Таямніцы Арыстоцеля Фіяраванці: [царква ў в. Чарэя] // НС. — 1997. — № 12. — С. 5; Таямніцы Арыстоцеля Фіараванці: [Траецкая царква, в. Чарэя] // ЧП. — 1997. — № 14. — С. 3; Царь-град кривичей?: [в. Чарэя] // ЧП. — 1998. — № 5. — С. 4; Тайны Городецкого озера // НС. — 2002. — № 78. — С. 6.

Літ.: Шпакоўская Г. Черейский полюс Роальда Романова // НС. — 2002. — № 134. — С. 5.

**РАМАНОВІЧ** КАНСТАНЦІН ІВАНАВІЧ (1953, в. Рэпічы Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобл. – 24.02. 2005), краязнаўца, педагог. Скончыў факультэт гісторыі і камуністычнага выхавання ГрДПІ (1976). Пад час вучобы ў ГрДПІ практыку праходзіў у Эрмітажы, Рускім музеі, Рэспубліканскім піянерскім лагеры «Зубраня». Працаваў ст. піянерважатым ў Крашынскай СШ Баранавіцкага раёна (1970), настаўнікам гісторыі і нямецкай мовы, завучам Высокагарадзецкай СШ Талачынскага раёна, дырэктарам Валасоўскай СШ (1978–1991), дырэктарам Навінкаўскай СШ (1991–2005). Даследаваў гісторыю Талачынскага раёна. Стаў арганізатарам краязнаўчай збіральніцкай працы сярод дзяцей у падначаленых яму навучальных установах. З'яўляўся ініцыятарам і стваральнікам музея прыроды ў Валасоўскай СШ, зімняга сада Навінкаўскай СШ Талачынскага раёна. Арганізаваў турыстычны клуб «Ветразь». Ладзіў турыстычныя паходы па раёне. Валасоўская СШ была ўдзельніцай ВДНГ СССР (1990). Падрыхтаваў стэнды па гісторыі раёна, выдаў брашуру, прысвечаную школе. Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў мясцовым перыядычным друку.



Узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць», Ганаровай граматай МА БССР, знакам «Выдатнік народнай асветы БССР».

Тв.: Чашникская трагедия: [халакост] // НС. — 1995. — № 77. — С. 5; (разам з В. Біруковым) Прыгажосць зямлі і нябёсаў: [рэшткі палацаў на Талачыншчыне] // СІ. — 2000. — № 4–7; Ёсць такі атрад // НТ. — 2003. — № 41. — С. 2; (разам з В. Біруковым) Час збіраць камяні: [в. Будаўка] // НТ. — 2004. — № 48. — С. 2; Легендарны камень: [валун каля в. Старыя Галаварушкі] // НТ. — 2004. — № 67. — С. 2; Падарожжа па зямлі сваіх продкаў: [краязнаўчы маршрут па вёсках Талачыншчыны] // НТ. — 2004. — № 73. — С. 2.

Літ.: Адамаў М. Не для ўрока, а для жыцця // СІ. — 1985. — № 153. — С. 2; Нашы кандыдаты ў дэлегаты XXVIII з'езда КПСС // СІ. — 1990; Балукоў П. Падарожжа ў казку: [музей у Валасоўскай СШ Талачынскага раёна] // СІ. — 1990. — № 73. — С. 2–3; Шпакоўская Г. Апошні аргумент Дон-Кіхота: [К. Рамановіч] // НС. — 1996. — № 129. — С. 4; Лепшая сельская ў вобласці // НТ. — 2001. — № 71–72. — С. 3; Рамановіч К.І. Некралог // НТ. — 2005. — № 27. — С. 4; Мазур А. Он сказку делал былью … // ВК. — 2005. — № 25. — С. 3; Бірукоў В.М. З нагоды жалобы: [К. Рамановіч] // НТ. — 2005. — № 33. — С. 2; Бірукоў В.М. Час перад памяццю бяссільны: [К. Рамановіч] // НТ. — 2006. — № 16. — С. 3; Яроменка М. Урок без званка на перапынак // НТ. — 2006. — № 70. — С. 3.

**РАМАШКА** ФАМА (†), журналіст. Працаваў у Шаркоўшчынскай раённай газеце, у якой публікаваў артыкулы, прысвечаныя розным бакам культурнага і грамадскага жыцця роднага краю.

Тв.: Марыў паэт пра садок // КР. — 1987. — № 100, 101; Сваю шануйце мову // КР. — 1987. — № 124. — С. 3; Край мой родны, Шаркоўшчына! // КР. — 1988. — № 66. — С. 3; Вытокі — родная зямля: 125 год з дня нараджэння І. Буйніцкага // КР. — 1988. — № 100. — С. 4.




**РОГАЧ** ВЕРА ВАЛЯНЦІНАЎНА (1967), музейны работнік. Скончыла Віцебскі політэхнічны тэхнікум (1986), радыётэхнічны факультэт Наваполацкага палітэхнічнага інстытута (1992). Працуе ў ВАКМ (з 1992). Разам з А. Падліпскім склала даведнік, прысвечаны памятным шыльдам у Віцебску «Доски, берегущие память», а таксама кнігу «Письма одной любви» (Віцебск, 2010). Аўтар артыкулаў па гісторыі і культуры Віцебска ў навуковым і перыядычным друку.

Тв.: (разам з А. Падліпскім) Доски, берегущие память: справочник. — Витебск: ВОТ, 2006. — 95 с.; (разам з В. Шышанавым) Печать Белорусского Вольного экономического общества // Двенадцатая Всероссийская нумизматическая конференция, Москва, 19–24 апреля 2004 г.: тез. докл. и сообщ. — М., 2004. — С. 246–247; Памятные жетоны России к. XIX – н. XX в коллекции ВОКМ // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею: матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 30–31 кастрычніка 2008 г. / рэдкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. — Мн.: Медысонт, 2009. — С. 249–254.

Артыкулы ў перыядычным друку: Ключ как символ почета // ВВ. — 2001. — 19 студз.; Фирменный знак дореволюционного завода: [завод Лісоўскага ў Віцебску] // НС. — 2002. — № 79. — С. 6; Вот должность — вот знак // НС. — 2002. — № 102. — С. 6; И жетон на память // НС. — 2002. — 29 кастр.; За пятерки и десятки: [школьныя медалі] // НС. — 2003. — № 26. — С. 6; Значки для депутатов // НС. — 2003. — № 53. — С. 6; Дворянская печать // НС. — 2003. — № 91. — С. 6; На чьем ларце, на чьей руке // НС. — 2003. — 13 верас.; Чтобы сердца и душа были молоды // НС. — 2003. — 23 верас.; Значки сохраняют память: [МОПР] // НС. — 2003. — № 130. — С. 6; Значки нашей юности: [ВЛКСМ] // НС. — 2004. — № 33. — С. 6; Медали Тамары Лазакович // НС. — 2004. — № 134. — С. 6; Несколько слов от царя // НС. — 2004. — 1 чэрв.; Награды войны // НС. — 2004. — 21 верас.; История в жетонах // НС. — 2004. — 11 снеж.; Уникальный знак: [св. Владимировского братства] // НС. — 2005. — 1 лют.; Добровольные помощники пожарных // НС. — 2005. — № 68. — С. 6; Удивленный витебской коллекцией // НС. — 2005. — № 97. — С. 6; Печати рассказывают // НС. — 2005. — 17 верас.; Граната не в цель, а в даль: [Г.Ц. Курыленка] // НС. — 2005. — № 149. — С. 6; Был такой корпус: [Полацкі кадэцкі корпус] // НС. — 2006. — № 9. — С. 6; Уникальный жетон: [І.К. Мароз] // НС. — 2006. — № 24. — С. 6; Ключ от успеха // НС. — 2006. — № 45. — С. 6; Иногда помогает случай: [М.Н. Крачэтнікаў] // НС. — 2006. — № 74. — С. 6; Сувениры из древнего города // НС. — 2006. — № 107. — С. 6; Медаль в честь великого князя: [кн. Канстанцін Паўлавіч] // НС. — 2006. — № 129. — С. 6; «Соломинка» поперек дороги: [Пётр І і царэвіч Аляксей] // НС. — 2006. — № 147. — С. 6; О лотереях в кино // ВЛВ. — 2006. — 24 окт.; В Витебске такая выставка впервые // Тамсама; Доход от лотереи — на памятник истории // ВЛВ. — 2006. — 29 дек.; Как делили земли Витебщины: [медаль] // НС. — 2007. — № 18. — С. 6; Спасенная память: [М.В. Чысцякоў] // НС. — 2007. — № 31. — С. 6; «В небесах мы летали одних… » // ВЛВ. — 2007. — 29 апр.; Социалистический азарт // ВЛВ. — 2007. — 29 мая; А теперь еще и сказки // ВЛВ. — 2007. — Июнь; Витебляне любили лотереи всегда //Тамсама; Нам предлагают сокровища… // Тамсама; Плакат рекламировал лотереи // ВЛВ. — 2008. — Январь; Клад на гороховом поле // НС. — 2008. — 2 лют.; Не спортом единым: [Андрэева Н. — засл. трэнер БССР] // НС. — 2008. — 12 жніўня; Как в России делали прививки от оспы // НС. — 2007. — 23 жніўня; «Екатерининские сани из Курино улетучились» // ЖП. — 2009. — 16 мая. — С. 6; Загадка угольной печатки // Віцьбічы. — 2009. — 18 ліп.; Дар коллекционера: [І.Д. Галькевича] // Віцьбічы. — 2009. — 19 верас.; Значок для счетчика // Віцьбічы. — 2009. — 24 кастр.; Хранить вечно…: [П. Кондратенко — Герой Савецкага Саюза] // Віцьбічы. — 2009. — 21 ліст.; Награды для духовенства // НС. — 2009. — 26 ліст.; Знак для охранителя // Віцьбічы. — 2010. — 16 студз.; Побеждал и на военном и на любовном фронтах // НС. — 2010. — 20 лют.; Медали Тамары Лазакович // Віцьбічы. — 2010. — 20 сак.



**РУСЕЦКІ** АРКАДЗЬ УЛАДЗІМІРАВІЧ (1.11.1942, в. Гірэвічы Радашковіцкага раёна Маладзечанскай вобл., цяпер Валожынскі раён Мінскай вобл.), гісторык, краязнаўца. Кандыдат філасофскіх навук (1978), доктар гіст. навук (1990), прафесар (1996). Скончыў гіст. факультэт БДУ (1969), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС ў Маскве (1978). Працаваў рабочым саўгаса «Ракаўскі» (1959–1962), культработнікам санаторыя «Браслаўскі» (1962–1966), у газеце «Браслаўская звязда» (1966–1967), інструктарам, сакратаром, 2-м, 1-м сакратаром Віцебскага абкама ЛКСМБ (1967–1978), сакратаром, 2-м сакратаром Віцебскага гаркама КПБ (1978–1985), 1-м нам. загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі, загадчыка ідэалагічнага аддзела, сакратаром ЦК КПБ (1985–1991), на кафедры этыкі, эстэтыкі і атэізму БДУ (1991–1992), дырэктарам Віцебскага філіяла, нам. генеральнага дырэктара Міжнароднага інстытута мензджмэнту (1992–1993), нам. дырэктара Віцебскага ІУН (1993–1995), нам., 1-м нам. старшыні Віцебскага гарвыканкама (1995–1997). Працаваў у ВДПІ (1969–1970), рэктарам ВДУ (1997–2009). Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу РБ (2000–2004). Член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі адукацыі РБ (1998), акадэмік Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій

(1999), Міжнароднай акадэміі навук вышэйшай школы у г. Маскве (2002).




Краязнаўчую дзейнасць пачаў пад уплывам рэдактара газеты «Браслаўская звязда» М.Н. Башлакова (у 1964). Займаецца даследаваннем мастацкай культуры, гісторыяй Віцебска і Віцебшчыны. Прыняў удзел у стварэнні шэрагу музеяў, сярод якіх адзначым музеі 39-й і 41-й армій, музей М. Шагала, Музей гісторыі камсамола Віцебшчыны, Музей ВДУ і інш. Аўтар некалькіх кніг, прысвечаных культурнаму жыццю Віцебшчыны: «Художественная культура Витебска с древности до 1917 года», «Мастацкая культура Аршанскай зямлі ў XI–XIX стст.», «Ученые-уроженцы Витебщины — для инноваций Беларуси», «Художественная культура Витебщины: Поозерье, Подвинье, Верхнее Поднепровье», «Литературное творчество в системе художественной культуры Витебщины (1918–1945)». Аўтар вялікай колькасці артыкулаў у мясцовым і рэспубліканскім друку, прысвечаных гісторыі і культуры Віцебшчыны. Рэцэнзіі на дзейнасць змяшчаліся ў часопісах «Полымя», «Веснік ВДУ», «Беларуская думка», газетах «ЛіМ», «Культура» і шэрагу абласных і раённых газет.




Узнагароджаны ордэнам «Знак пашаны», медалём Францішка Скарыны, ордэнам Андрэя Першазванага, падзякай Прэзідэнта Беларусі, знакам «Выдатнік адукацыі».

Тв.: Кнігі: Художественная культура Витебска в позднем средневековье. — Витбск, 1995; Вывучаць і ведаць гісторыю Віцебска. — Віцебск: ВДУ, 2000. — 38 с.; (разам з Ю.А. Русецкім) Художественная культура Витебска с древности до 1917 года. — Мн.: БелЭн, 2001. — 288 с.; (разам з Ю.А. Русецкім) Мастацкая культура Аршанскай зямлі ў XI–XIX стст. — Мн.: БелЭн, 2002. — 232 с.; (разам з Ю.А. Русецкім) Художественная культура Витебщины (с древности до 1917 года): пособие для студентов специальности «Музейное дело и охрана исторического наследия (музееведение)». — Витебск: ВГУ, 2007. — 82 с.; (разам з Н.К. Талачко) Ученые-уроженцы Витебщины — для инноваций Беларуси. — Витебск: ВГУ, 2007. — 144 с.; Художественная культура Витебщины: Поозерье, Подвинье, Верхнее Поднепровье: В контексте восточно-славянских и западно-европейских культурных процессов. — Витебск: ВДУ, 2008. — 540 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Ян Чечет и Витебщина // Ученые записки ВГУ. — Т. 4. — Витебск, 2005; (разам з Ю.А. Русецкім) Творчасць паэтаў Віцебшчыны — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 18–19 чэрвеня 2009 г. / ВДУ; рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. — Віцебск: ВДУ, 2009. — С. 274–278.

Артыкулы ў перыядычным друку: Аркадий Владимирович Русецкий: библиографический указатель. — Витебск, 2002. — 32 с.

Літ.: Русецкі А.У. // Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава: Падзеі. Людзі. Лёсы / пад рэд. А.У. Русецкага, А.М. Дарафеева. — Віцебск: ВДУ, 1998. — С. 154; Савік М. Русецкі А.У. // ЭГБ. — Мн.: БелЭн, 2001. — Т. 6. Кн. 1. — С. 135; Звязаны лёсам // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебск: у 2-х кн. — Мн.: БелЭн, 2002. — Кн. 2. — С. 565–566; Аркадий Владимирович Русецкий: библиографический указатель. — Витебск, 2002. — 32 с.; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Русецкі А.У. (20.06.2005) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Корзенко Г.В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник. — Мн.: Бел. наука, 2007. — С. 326–327.




**РУСЕЦКІ** ЮРЫЙ АРКАДЗЕВІЧ (1969), гісторык. Скончыў СШ № 31 (1986), БДУ (1992). Кандыдат гіст. навук (2004). Працаваў на розных пасадах у г. Мінску, Віцебску. Працуе дырэктарам Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў ВДУ.

Вывучае гісторыю і культуру Віцебшчыны. Аўтар дысертацыйнага даследавання «Культурное развитие Витебска в конце XVIII – 30-х годах XIX столетия (1772–1839)» (кіраўнік В.А. Космач). Аўтар навукова-метадычнага дапаможніка «Культурное развитие Витебска в последней четверти XVIII – 30-х годах XIX столетия». Аўтар кніг (разам з А.У. Русецкім), прысвечаных матэрыяльнай і духоўнай культуры Віцебшчыны IX–XX стст.: «Художественная культура Витебска с древности до 1917 года», «Художественная культура Витебщины: Поозерье, Подвинье,

Верхнее Поднепровье», «Литературное творчество в системе художественной культуры Витебщины (1918–1945)». Удзельнік навуковых канферэнцый (з 2000).

Тв.: (разам з А.У. Русецкім) Художественная культура Витебска с древности до 1917 года. — Мн.: БелЭн, 2001. — 288 с; Культурное развитие Витебска в конце XVIII – 30-х годах XIX столетия, 1772–1839. — Витебск: ВГУ, 2002. — 55 с.; (разам з А.У. Русецкім) Мастацкая культура Аршанскай зямлі ў XI–XIX стст. Мн.: БелЭн., 2002. — 232 с.; (разам з А.У. Русецкім) Художественная культура Витебщины (с древности до 1917 года): пособие для студентов специальности «Музейное дело и охрана исторического наследия (музееведение)». — Витебск: ВГУ, 2007. — 82 с.; (разам з А.У. Русецкім) Художественная культура Витебщины: Поозерье, Подвинье, Верхнее Поднепровье: В контексте восточно-славянских и западно-европейских культурных процессов. — Витебск: ВДУ, 2008. — 540 с. ; (разам з А.У. Русецкім) Творчасць паэтаў Віцебшчыны — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 18–19 чэрвеня 2009 г. / ВДУ ; рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. — Віцебск: УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2009. — С. 274–278.

Літ.: Міхнюк, У.М. Доктарскія і кандыдацкія дысертацыі па гістарычных навуках у Рэспубліцы Беларусь, 1991–2003 гг.: бібліяграфічны паказальнік / У.М. Міхнюк. — Мінск: НАРБ, 2006. — 68 с.

**РЫБАКОВА** ВОЛЬГА УЛАДЗІМІРАЎНА, бібліятэкар. Працуе ў в. Курына Віцебскага раёна. Стварыла ў адным пакоі бібліятэкі зал этнаграфіі, дзе зберагаецца больш за 120 экспанатаў — прадметаў даўніны (посцілкі, вышыўкі, берасцяныя, саламяныя рэчы, патэфон і інш.), сабраных ў навакольных вёсках.

Літ.: Залесская С. Хранительница старины // ЖП. — 2004. — 7 снеж. — С. 3.



**РЫЎКІН** (Ривкин) МІХАІЛ СЦЯПАНАВІЧ (*М. Мишин*) (29.12.1931, г. Віцебск – 12.03.2010, г. Бібертал, ФРГ), педагог, краязнаўца. Кандыдат педагагічных навук (1971), дацэнт (1976). З'яўляўся адным з заснавальнікаў і нам. старшыні праўлення дабрачыннага таварыства «Хасдзей-Давід», адным з заснавальнікаў Таварыства папячэння яўрэйскіх могілак «Беталам» («Дом вечнасці»), адным з заснавальнікаў і членам праўлення віцебскай гарадской яўрэйскай абшчыны і старшынёй праўлення Віцебскага цэнтра дакументальных даследаванняў «Лухот». Скончыў ВДПІ (1953), аспірантуру НДІ зместу і метадаў навучання Акадэміі педадагічных навук СССР (1968). Працаваў настаўнікам гісторыі ў СШ в. Старае Сяло Віцебскага раёна (1953–1954), СШ № 3 г. Віцебска (1954–1971), выкладчыкам, ст. выкладчыкам, дацэнтам на кафедры педагогікі ў ВДПІ (ВДУ) (1971–2002).

Даследаваннямі Віцебшчыны стаў займацца з 1954 г., калі пачаў працаваць у СШ № 3 г. Віцебска. На станаўленне як краязнаўцы і даследчыка зрабілі істотны ўплыў доктар гіст. навук, ст. супрацоўнік Інстытута археалогіі АН СССР Л.В. Аляксееў і кандыдат педагагічных навук, метадыст, ст. навуковы супрацоўнік НДІ зместу і метадаў навучання АПН СССР П.С. Лейбенгруб. З'яўляўся навуковым карэспандэнтам аддзела гісторыі і грамадазнаўства НДІ педагогікі МА БССР.




На працягу паловы стагоддзя прадметам зацікаўлення вучонага стаў цэлы шэраг тэм: краязнаўства ў навучанні гісторыі, пазакласная краязнаўчая праца па гісторыі, методыка школьнага гістарычнага краязнаўства, школьны турызм і краязнаўства, эстэтычнае выхаванне і краязнаўства, археалогія Віцебшчыны, гісторыя і культура Віцебска, край у гады Вялікай Айчыннай вайны, славутыя землякі і інш. Асобна даследавалася тэма краязнаўства ў піянерскім лагеры.

Удзельнік саюзных (Масква, Ленінград, Палтава, Стаўрапаль), рэспубліканскіх, абласных, гарадскіх педагагічных чытанняў і навукова-практычных канферэнцый па пытаннях гіст. краязнаўства ў школе, на якіх выступаў з дакладамі пра абагульненне доследу выхавання навучэнцаў у працэсе гісторыі роднага краю. Распрацаваў методыку выкладання гісторыі БССР у школьным курсе гісторыі СССР, якая стала пазней тэмай дысертацыйнага даследавання: «Преподавание истории союзной республики в школьном курсе истории СССР (на материале VII–VIII классов школ Белорусской ССР)» (1971).

Браў удзел у грамадскім жыцці Віцебска. Удзельнічаў у стварэнні Статута БДТАПГіК, віцебскага гарадскога аддзялення. У 1970-я гады выбіраўся старшынёй гарадскога аддзялення БДТАПГіК, старшынёй навукова-метадычнага Савета Віцебскага абласнога аддзялення. У канцы 1980-х – пач. 1990-х гг. з'яўляўся членам камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Віцебскім гарвыканкаме. У артыкулах «Як гінуць помнікі» і «Што і чаму страчваем» пад агульнай назвай «Ля апошняй мяжы», апублікаваных у газеце «Віцебскі рабочы» ў чэрвені 1990 г., адным з першых узняў праблему знішчэння помнікаў гісторыі і культуры, якасці рэстаўрацыйных работ у Віцебску.

Спрычыніўся да арганізацыі святкавання 1000-годдзя Віцебска. Па даручэнні гаркама партыі меў камандзіроўку ў Маскву, у Інстытут археалогіі АН СССР. Сустракаўся з акадэмікам Б.А. Рыбаковым з нагоды ўдакладнення даты заснавання Віцебска. Атрымаў заключэнне пра тое, што датай заснавання мэтазгодна лічыць 947 год. У сааўтарстве з журналістам У. Хазанскім падрыхтаваў сцэнар святкавання 1000-годдзя Віцебска.

Удзельнічаў у даследаванні помнікаў археалогіі Віцебскага раёна пад кіраўніцтвам супрацоўніка Інстытута гісторыі АН БССР Г.В. Штыхава. Браў удзел у экспедыцыях і археалагічных раскопках пад кіраўніцтвам навуковага супрацоўніка Інстытута археалогіі АН СССР Л.В. Аляксева ў Аршанскім і Талачынскім раёнах (у тым ліку раскопкі старажытнага Друцка).

Аднавіў гісторыю бацькоўскага дома М. Шагала. Першым з даследчыкаў знайшоў архіўны дакумент (прашэнне бацькоў М. Шагала на будаўніцтва дома), які пераканаўча даказваў, што будынак на вул. Пакроўскай сапраўды належаў сям'і Шагалаў (публікацыя ў «Віцебскім рабочым» — «Бацькоўскі дом Шагала»). Гэтая падзея стала адной з прычын прыняцця рашэння гарвыканкамам аб стварэнні ў гэтым будынку Дома-музея М. Шагала. Разам з А. Падліпскім стварыў невялікую пачатковую экспазіцыю ў Доме-музеі М. Шагала.

Браў удзел у падрыхтоўцы выдання «Витебск: энциклопедический справочник». З'яўляўся членам гарадской камісіі па стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» г. Віцебска, аўтар некаторых артыкулаў у ёй. Займаўся даследаваннем халакосту на Віцебшчыне ў гады Другой сусветнай вайны. Па матэрыялах архіва Яд-Вашэм у Ерусаліме склаў спіс яўрэяў (930 прозвішчаў), забітых фашыстамі ў Віцебску у 1941–1944 гг. Удакладніў спіс разам з А. Шульманам па мясцовых крыніцах. Разам з А. Падліпскім правёў значную працу па добраўпарадкаванні Стараўланавіцкіх могілак. Арганізаваў Віцебскі яўрэйскі грамадскі ўніверсітэт гісторыі і культуры і кіраваў ім (красавік 1995 – чэрвень 2003). За час дзейнасці адбылося больш за 150 творчых сустрэч, экскурсій, турыстычных паездак, наведванняў музеяў, тэатраў. Пасля ад'езду М. Рыўкіна ў Германію дзейнасць установы перастала быць мэтанакіраванай і сістэмнай.

Стварыў у СШ № 3 г. Віцебска гісторыка-краязнаўчы музей.

Аўтар артыкулаў па вывучэнні гісторыі, выкарыстанні краязнаўства ў школе ў педагагічным друку. Друкаваўся ў часопісах «Преподавание истории в школе» (Москва), «Народная асвета» (Мінск), бюлетэні «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі». Шэраг артыкулаў апублікаваны ў зборніках педагагічных чытанняў (Мінск, Масква), у Шагалаўскім штогодніку (Віцебск), зборніку «Мишпоха» (Віцебск), у газетах «Віцебскі рабочы», «Народнае слова», «Віцьбічы», «Вечерний Витебск».

Дапамагаў у падборы матэрыялаў маскоўскай пісьменніцы Лідзіі Абуховай пры падрыхтоўцы ёй кнігі «Витьбичи». Разам з Л.В. Аляксеевым напісаў навуковы каментар да гэтага выдання. Аўтар ненадрукаванай кнігі (разам з Л. Міхайлавай) «Холокост на Витебщине». Значную частку свайго архіва і бібліятэкі (каля 200 кніг) перадаў у ДАВВ. Асабісты фонд № 2154 складаецца з 571 адзінак захоўвання (спраў) і ўтрымлівае матэрыялы па гісторыі Віцебска, славутых земляках, ліставанне з навукоўцамі і вядомымі асобамі, дакументы па халакосту, рукапісы артыкулаў, графічны матэрыял.

Узнагароджаны Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі, Віцебскага аблвыканкама, медалём «Ветэран працы» (1984). Выдатнік народнай асветы (1963). Апошнія гады жыцця правёў у Германіі.

Тв.: Кнігі: Из опыта внеклассной краеведческой работы по истории. — М.; Л.: Академия педагогических наук, 1961. — 40 с.; Эстэтычнае выхаванне вучняў у краязнаўчай рабоце па гісторыі. — Мн.: Вучпедвыд БССР, 1963. — 72 с.; Скарыстанне краязнаўчага матэрыялу на уроках гісторыі СССР. — Мн.: Народная асвета,1965. — 154 с.; Вывучэнне гісторыі БССР у 7–8 класах. — Мн.: Народная асвета, 1968. — 143 с.; Витебск: По страницам истории: методическое пособие. — Витебск: ВОБ, 1974. — 29 с.; Введение // Витебск в десяти веках: библиографический указатель литературы. — Витебск: Гос. б-ка БССР им. В.И. Ленина, ЦГБ им. М. Горького, 1975. — 160 с.; [тры главы па гістарычным краязнаўстве] // Методика обучения в средней школе. — Ч. 2. — М., 1978; Витебск. Площадь Победы. — Мн., 1978; (разам з А. Шульманам) Юдэль (Юрий) Пэн. Художник и педагог. — Витебск: типография витебского телезавода, 1994. — 72 с.; (разам з Д.Н. Генінай) Витебск в годы Великой Отечественной войны, 1941–1945 гг.: библиографический указатель. — Витебск:

ЦГБ им. М. Горького, 1995; (разам з А. Шульманам) Породнённые войной. — Витебск: ВОТ, 1997. — 61 с.; (разам з А.М. Падліпскім) Наш вечный дом: из истории еврейских кладбищ в Витебске. — Витебск: ВОТ, 2003. — 80 с.; Вечная память: справочник. Ч. 2. Евреи – жертвы нацизма, погибшие в оккупированном Витебске в 1941–1944 гг. / сост. М. Рывкин, А. Шульман. Витебск: ВОТ, 2003. — 64 с.; (разам з А. Шульманам) Хроника страшных дней. Трагедия Витебского гетто. — Витебск: ВОТ, 2004. — 151 с.

Артыкулы ў кнізе «Памяць»: (разам з А. Шульманам) Віцебскае гета // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 439–445; Мирные жители — жертвы фашистского террора // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 2. — Мн: БелЭн., 2003. — С. 406–416; Евреи, погибшие в Витебске в 1941–1944 гг. // Тамсама. — С. 417–429; Погибли в застенках тюрьмы СД // Тамсама. — С. 429–431.

Артыкулы ў зборніках, чапісах: Исторические названия — памятники культуры: тезисы докладов и сообщений Всесоюзной научно-практической конференции. — М., 1989; Тень Холокоста: материалы II Международного симпозиума «Уроки Холокоста и современная Россия» / Фонд «Холокост». — М., 1998; Судьба картинной галереи им. Ю.Пэна на фоне документов эпохи // ШМЕ. — 2005. — Витебск: ВОТ, 2006. — С. 20–38.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Выказванні У.І. Леніна аб Віцебшчыне // ВР. — 1970. — 27 студз. — С. 2–3; (разам з С.Д. Мохавым): [палеміка адносна рэканструкцыі віцебскай гарадской ратушы] // ВР. — 1972. — 30 чэрв.; У истоков древнего Витебска // ВР. — 1972. — 7 ліп.; Улиц каменная книга // ВР. — 1973. — 13 чэрв.; Ля апошняй мяжы. Як гінуць помнікі // ВР. — 1990. — № 124. — С. 2; Ля апошняй мяжы. Што і чаму страчваем // ВР. — 1990. — № 127. — С. 2; Пра бацькоўскі дом Шагала // ВР. — 1991. — № 9. — С. 3; (разам з А. Шульманам) Витебское гетто // Віцьбічы. — 1993. — № 138. — С. 7; (разам з А. Шульманам) Десятый круг ада: [Янавічы, 1941] // НС. — 1994. — № 55. — С. 4, 5; (разам з А. Шульманам) Сянно. 31 снежня // ВР. — 1994. — № 40, 41; Праведнікі свету. Сям’я Пашкевічаў, в. Паташня Міёрскага раёна // ВР. — 1994. — № 147. — С. 3; Праведнікі свету. Сям’я Канаховічаў хутар Рафалаўка Браслаўскага раёна // ВР. — 1994. — № 150. — С. 3; М.Ф. Лекановіч (Казачонак), в. Зябкі Глыбоцкага раёна // ВР. — 1994. — № 153. — С. 7; Н.Ф. Загнетава, в. Вышадкі Гарадоцкага раёна // ВР. — 1994. — № 168. — С. 7; (разам з А. Падліпскім) Еврейские кладбища Витебска // Возрождение. — 1996. — № 18, 19.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Рыўкін М.С. (25.11.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Памяти Михаила Ривкина // НС. — 2010. — 18 сак. — С. 15.

**РЫЦ** МАЙСЕЙ АБРАМАВІЧ, краязнаўца, педагог. Працаваў дырэктарам СШ № 2 г. Верхнядзвінска. Заснаваў у 1960 г. краязнаўчы музей у СШ № 2 (старэйшы музей у Верхнядзвінскім раёне). Узначальваў музей спецатрада «Баявы» ў СШ № 1. Аўтар артыкулаў у кнізе «Памяць» Верхнядзвінскага раёна, а таксама брашуры «Краеведение — живая школа воспитания», у якой прааналізаваў досвед краязнаўчай працы ў СШ № 2 г. Верхнядзвінска ў выхаванні школьнікаў.

Тв.: Краеведение — живая школа воспитания: Из опыта работы СШ 2 г. Верхнедвинска. — Мн.: Народная асвета, 1966. — 32 с.; За наш родны горад // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна. — Мн.: Паліграфафармленне, 2000. — Кн. 2. — С. 21; У баі за Дрысу // Тамсама. — С. 23.

Літ.: Краязнаўчы музей СШ № 2 // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна. — Мн.: Паліграфафармленне, 2000. — Кн. 2. — С. 322.



**РЫЦ** РУВІМ ЯКАЎЛЕВІЧ (19.06.1924, м. Дрыса (Верхнядзвінск)), краязнаўца, педагог. Скончыў Свярдлоўскае ваеннае вучылішча (1943), гіст. факультэт БДУ (1952). Працаваў рэдактарам раённай газеты «Патрыёт Радзімы» (1946–1954), дырэктарам СШ № 1 г. Верхнядзвінска (1954–1994).

Гісторыяй роднага краю зацікавіўся з 1953 г. Даследуе гісторыю раёна ў час Вялікай Айчыннай вайны, гісторыю прадпрыемстваў і калгасаў Верхнядзвіншчыны. Удзельнічае ў пошукавым руху. Стварыў і ўзначальваў на працягу трыццаці гадоў Музей баявой славы ў СШ № 1 (з 1964). Сабраў значную колькасць матэрыялу аб Сакалішчанскім, Прошкаўскім падполлі, подзвігу разведчыцы Лены Сураўнёвай, гісторыі школы. Шэраг матэрыялаў экспанаваліся на абласных і рэспубліканскіх выставах. Удзельнічаў у абласных і рэспубліканскіх канферэнцыях краязнаўчай накіраванасці. Арганізатар і ўдзельнік паходаў па месцах баявых дзеянняў партыз. атрадаў у раёне ў 1950–1980-я гг. Аўтар шэрагу публікацый на краязнаўчую тэматыку ў мясцовым перыядычным друку, кнізе «Памяць» Верхнядзвінскага раёна. Успаміны пакінуў у Музеі баявой славы г. Лёзна.

Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступені, медалямі СССР. Выдатнік народнай адукацыі БССР.

Тв.: Дрысенскія паводкі // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна. — Мн.: Паліграфафармленне, 1999. — Кн. 1. — С. 65–66; 91 год школе // Тамсама. — С 115–120; Як гэта было: З успамінаў // Тамсама. — С. 222.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Яны стваралі гісторыю // ДзП. — 1987. — № 13. — С. 4; Тут яго карані: [І.М. Кабзун] // ДзП. — 1988. — № 7. — С. 2; Вадзілі паязды машыністы // ДзП. — 1988. — № 27. — С. 2; Да новага жыцця: [калектывізацыя на Дрысеншчыне] // ДзП. — 1988. — № 28. — С. 2; Школьныя вытокі: [СШ г. Дрысы] // ДзП. — 1988. — № 80. — С. 2; Памяць сэрца: [Л. Сураўнёва] // ДзП. — 1988. — № 87. — С. 2; Дрысенскія паводкі // ДзП. — 1988. — № 123. — С. 2; І ўзарвалася ноч // ДзП. — 1989. — № 56. — С. 2; Смелая аперацыя // ДзП. — 1989. — № 64. — С. 2; За наш горад: [1944] // ДзП. — 1989. — № 77. — С. 2; Пісьмы расказваюць // ДзП. — 1989. — № 94. — С. 2; Аб чым расказваюць старыя газеты // ДзП. — 1990. — № 43. — С. 2; У адрас правадыра // ДзП. — 1990. — № 48. — С. 2; Вогненны лес: [акупацыйны рэжым фашыстаў] // ДзП. — 1990. — № 56. — С. 2; Углядваючыся ў гісторыю // ДзП. — 1990. — № 82. — С. 2; З мінулага Дрысеншчыны: [1812] // ДзП. — 1990. — № 155. — С. 1, 2; Народныя мсціўцы з 18-га // ДзП. — 1991. — № 15. — С. 2; Вернасць Айчыне: [В.М. Шэлепень] // ДзП. — 1991. — № 24. — С. 2, 4; Незабыўны час: [раён у 1944–1950-я гг.] // ДзП. — 1991. — № 102. — С. 2; І помнік ужо не безыменны: [17.09.1939] // ДзП. — 1998. — № 45. — С. 4; Вогненны лёс Асвейшчыны // ДзП. — 1991. — № 69. — С. 2; Гісторыя СШ № 1: узнікненне і развіццё // ДзП. — 1991. — № 71. — С. 3; Гісторыя СШ № 1: Школа ў дарэвалюцыйныя гады // ДзП. — 1991. — № 89. — С. 3; Вогненны лёс Асвейшчыны // ДзП. — 1998. — 18 жніўня. — С. 2; Смелая аперацыя: [1944] // ДзП. — 1999. — № 51. — С. 3; За наш родны горад: [А. Панцялееў] // ДзП. — 2000. — № 52. — С. 2; З гісторыі адукацыі на Дрысеншчыне // ДзП. — 2000. — № 61. — С. 3; Вярнуліся на Радзіму // ДзП. — 2000. — № 67. — С. 2; Яго сустракаў увесь горад: [І.М. Кабзун] // ДзП. — 2000. — № 70. — С. 2; …І пошук завяршыўся поспехам: [1939] // ДзП. — 2000. — № 74. — С. 2; Гераічны шлях атрада: [«Баявы»] // ДзП. — 2001. — № 63, 66–67; Прыклад служэння Айчыне: [партыз/ барацьба ў 1918 г.] // ДзП. — 2003. — № 101. — С. 2; Наш адважны зямляк: [Д. Крыўко] // ДзП. — 2003. — № 103. — С. 2; Подзвіг разведчыцы: [Л. Сураўнёва] // ДзП. — 2004. — № 4. — С. 2; Незабыўны подзвіг: [Траян Н. — ураджэнка г. Дрыса] // ДзП. — 2004. — № 9. — С. 2; Яго імем названа вуліца Верхнядзвінска: [І. Кабзун] // ДзП. — 2004. — № 12. — С. 3; Вадзіў цягнік пад бамбёжкамі: [П.А. Камісараў] // ДзП. — 2004. — № 23. — С. 2; Бой за Климовщину. Партизанская столица // ДзП. — 2004. — № 32. — С. 3; І ўзарвалася ноч // ДзП. — 2004. — № 37. — С. 2; Як гэта было… // ДзП. — 2004. — № 56. — С. 3; Ён вызваляў Верхнядзвінск: [П. Гіляроў] // ДзП. — 2004. — № 84. — С. 3; На берагах Вужыцы і Сар'янкі // ДзП. — 2004. — № 98. — С. 2; З верай ў перамогу: [1944] // ДзП. — 2004. — № 4. — С. 2; Отважный партизанский коммисар: [П. Кралько] // ДзП. — 2006. — № 8. — С. 2; Камдыў, чэкіст, пагранічнік: [П. Барэвіч] // ДзП. — 2006. — № 9. — С. 3; З далёкага мінулага // ДзП. — 2006. — № 40. — С. 2; Памятны бой: [красавік 1943] // ДзП. — 2006. — № 49. — С. 2; Население Дриссы в XIX веке // ДзП. — 2006. — № 58–59. — С. 2; Якой была адукацыя ў Дрысе // ДзП. — 2006. — № 60. — С. 2; Сялянскі рух у 1917 годзе // ДзП. — 2006. — № 65. — С. 2; Камісар Фёдар Быкаў // ДзП. — 2007. — № 11. — С. 2; Партызанскі тыл працаваў злажана // ДзП. — 2007. — № 38. — С. 3; Да апошняй хвіліны: [Л. Сураўнёва] // ДзП. — 2007. — № 51. — С. 2; Сталі роднымі: [1939] // ДзП. — 2007. — № 53. — С. 2; Заслугоўвае ўвекавечання: [Н. Траян] // ДзП. — 2007. — № 56. — С. 2; Першы герой нашага раёна: [І. Кабзун] // ДзП. — 2007. — № 73. — С. 2; Час нараджэння і развіцця: [СШ № 1] // ДзП. — 2007. — № 98. — С. 2; Школа ў першай чвэрці XX ст. Агляд актаў і інспектарскіх праверак // ДзП. — 2007. — № 99. — С. 2; Выпускнікі — абаронцы Радзімы // ДзП. — 2007. — № 101. — С. 2; Школа ў 50–90-я гады // ДзП. — 2007. — № 103. — С. 2.

Літ.: Краязнаўчы музей СШ № 1 // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна. — Мн.: Паліграфафармленне, 2000. — Кн. 2. — С. 322; Пакульневіч Я. Р.Я. Рыц: «Я быў пасляваенным рэдактарам "раёнкі"» // ДзП. — 2001. — № 96. — С. 2; Дзвінская С. Дарогамі мужнасці і славы // ДзП. — 2003. — № 99. — С. 2; Кисляк Н. Линия жизни продолжается. Верхнедвинской СШ № 2 — 60 // ДзП. — 2004. — № 80. — С. 3; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Рыц Р.Я. (29.05.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**РЭНКОЎСКІ** ГЖЭГАЖ (Grzegorz Rękowski), краязнаўца. Ураджэнец Браслаўшчыны. Цікавіцца гісторыяй, культурай, прыродай роднага краю пачаў з дзяцінства. Значна паўплывалі творы А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш», «Балады і рамансы», Э. Ажэшкі «Над Неманам», працы В. Ваньковіча, аповесці Ю. Вейсенгофа, У. Корсака, Ю. Эйсмонда, віленская сага Т. Карповіча «Песнь пушчы», «Трылогія» С. Сінкевіча. Пазней — успаміны, гіст. работы, эпісталярная спадчына, выданні ПТТК часоў савецкай Польшчы, прысвечаныя «крэсам».

Аўтар кніг «Ілюстраваны пуцяводнік па здабытках культуры на Беларусі» (1997), «Сярод азёраў і балот Віленшчыны» (2000). Апошняя складаецца з уводзінаў, 18 раздзелаў, спіса літаратуры, геаграфічнага і персанальнага паказальнікаў. Сярод раздзелаў — «Браслаў і Браслаўшчына — крэсы крэсаў», «Да сядзібы Д'ябла Поўначы», «У Опсе і Дрысвятах», «Відзы — крэсовы тыгель народаў», «Вялікія Браслаўскія азёры», «Друя — цень забытага бляску», «Іказнь, Перабродзе, Міёры», «На канцы света — Дзісна», «Таямніца балота Ельня», «Сага роду Лапацінскіх», «У Глыбокім і ваколіцах», «Тызенгаўзаўскія Паставы», «Стары і Новы Мядзель», «Крэсовае мора — Нарач», «У краіне Блакітных азёр», «Свір і возера Свір», «Сарачанскія азёры і віленская пушча», «Пілсудчына».

Выданні ўтрымліваюць вялікую колькасць інфармацыі па гісторыі, культуры, прыродзе Заходняй Віцебшчыны: Браслава, Глыбокага, Друі, Дзісны, Нарачы, Паставаў і іншых гарадоў і мясцовасцяў рэгіёна. У кнігах змяшчаюцца карты і планы месцаў і мясцовасцяў. Кнігі напісаны ў спалучэнні жанраў рэпартажа, пуцяводніка і распрацоўкі турыстычнага маршрута.

Тв.: Ilustrowany przewodnik po zabytkach kultury na Białorusi. — Warszawa: Kodruk, 1997; Wśród jezior i mszarów Wileńszczyzny. — Warszawa: Rewasz, 2000. — 368 s.

**САБІТНЮК** НІНА АНАТОЛЬЕЎНА (30.01.1956, в. Галубічы, Глыбоцкага раёна, Віцебскай вобл.), педагог. Скончыла мастацка-графічны факультэт ВДПІ (1978). Працавала на розных пасадах у навучальных установах Полаччыны. Выкладае гісторыю ў СШ г. Наваполацка.

Вывучае мясцовыя традыцыі вырабу і выкарыстання гульневых і абрадавых лялек з тэкстылю, народнай сімволікі і тэхналогій, даследуе астранамічныя і касмаганічныя ўяўленні нашых продкаў, праводзіць пошук і вывучэнне культавых мегалітычных помнікаў Полаччыны, аналізуе тайнапісны метад Ф. Скарыны. Зацікавілася вывучэннем гісторыі і культуры Полаччыны, працуючы ў Цэнтры пазашкольнай работы г. Наваполацка. Вядзе там гурток (з 2005). Значны ўплыў на фарміраванне зацікаўленасці ў вывучэнні мінуўчыны рэгіёна аказалі А.В. Куржалаў, Н.І. Ярмух, С.М. Глушкоў. Разам з апошнім бярэ ўдзел у экскурсіях і экспедыцыях па Полаччыне, у якіх вывучаюць помнікі даўніны, збірае фальклорныя і этнаграфічныя матэрыялы. Разам з інш. полацкімі краязнаўцамі праводзіла даследаванне культавага язычніцкага комплекса каля воз. Янова ў Полацкім раёне, выявіла некалькі мегалітычных аб’ектаў.

Разам з гуртком стварыла калекцыю «Дзед і Баба», якая складаецца з 40 народных лялек з тэкстылю (2005–2007). Калекцыя — спроба рэканструкцыі традыцыйных лялек Падзвіння. Захоўваецца ў музеі СШ № 5 «Хата ў жыцці беларуса» (падраздзелы «Выхаванне дзяцей і падлеткаў», «Печ», «Покуць»). Другая калекцыя склала аснову пастаяннай выставы «Бабулін куфэрак» ва УА «ДЦПР г. Наваполацка» (2009). Падрыхтаваныя выставы экспанаваліся ў розных установах Мінска, Віцебска, Полацка, Наваполацка.

Актыўна прапагандуе беларускія народныя тэатральна-абрадавыя традыцыі. З гэтай мэтай супрацоўнічае з разнастайнымі дзяржаўнымі і грамадскімі аб’яднаннямі, напрыклад, Наваполацкім гісторыка-культурным клубам этнаграфічных спеваў «Княжыч».

Бярэ ўдзел у міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных навуковых канферэнцыях, у тым ліку «Русская, белорусская и мировая литература: история, современность, взаимосвязи» (Наваполацк, 2004), «Эволюция человека по пражской библии Франциска Скорины (опыт реконструкции)» (Наваполацк, 2005), «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай» (Мінск, 2006), «Культавыя камяні з малымі ямкамі» (Вілейка, 2006), Рэспубліканскіх краязнаўчых педагагічных чытаннях.

Мае некалькі ненадрукаваных прац «Опыт систематизации пражской Библии Ф. Скорины в 3 частях», «Эволюция человека по пражской Библии Франциска Скорины (опыт реконструкции)», «Да пытання аб каляндарным стылі датавання Бібліі Ф. Скарыны, выдадзенай у Празе (1517–1519)».

Тв.: Кнігі (саматуж. выд.): Воднымі шляхамі да культавых камянёў старажытных палачан-крывічоў. — Новополоцк: ГЦВР, 2006. — 45 с.; Роля вучэбна-даследчай дзейнасці ў сацыялізацыі гуртко͡ўцаў: зборнік / склад. Н.А. Сабітнюк — Наваполацк: ДЦПР, 2008. — 144 с.; Изучение Полоцкого Стоунхенджа и других мегалитических памятников Витебщины как средство организации познавательного и оздоровительного досуга новополоцких школьников: Из опыта работы / сост. Н.А.Собитнюк. — Новополоцк: ГЦВР, 2010. — 108 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Пражская Библия как уникальный криптографический памятник // Проблемы истории литературы: сборник статей. — Вып. 18. — Москва; Новополоцк: Институт славяноведения РАН, ПГУ, 2004; Датаванне пражскай Бібліі Ф. Скарыны як сістэмна-лікавая крыптаграма: выяўленне, рашэнне, выкарыстанне // Матэрыялы Міжнароднай літаратуразнаўчай канферэнцыі. — БДУ, 2006 г.

Артыкулы ў перыядычным друку: Зашифрованное послание в XXI век // Вестник культуры. — 2004. — № 2–3; Криптограмма // Вестник культуры. — 2004. — № 4; Унікальныя знаходкі вучняў на знакамітым Полацкім Стоўнхенджы // КГ. — 2008. — № 2–4; Дорогами тысячелетий к священным камням звёздного культа древних полочан-кривичей // Тамсама. — С. 49.

Літ.: Мальдзіса А.І. Да пытання аб каляндарным стылі датавання Бібліі Ф. Скарыны, выдадзенай у Празе, 1517–1519 гг. // ГлР. — 2005. — 25 жніўня; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Сабітнюк Н.А. (12.04.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**САВІЧ** ЧЭСЛАЎ (Czesław Sawicz), краязнаўца. Аўтар кнігі «Перш, чым у нябыт зачыніцца брама», у якой распавядае пра жыццё на абшарах Віленшчыны, пераважна Браслаўшчыны, у перыяд Паўночнай вайны, перад падзеламі Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст., пра падзеі пахода Напалеона ў Маскву ў 1812 г., савецка-польскай вайны, падаецца значная інфармацыя пра роды Савічаў і Козел-Паклеўскіх. Працягам кнігі стала выданне «Магікане з-над Дзвіны» (Варшава, 2000). Утрымлівае багаты дакументальны матэрыял, які можа быць выкарыстаны гісторыкамі. У кнізе «Віленшчына. 1919–1939» (Варшава, 1995) на аснове інфармацыі са «Слоўніка геаграфічнага каралеўства Польскага» (1896), а таксама са статыстычных даведнікаў абрысавана карціна міжваеннай Віленшчыны, у склад якой уваходзілі землі цяперашняй заходняй Віцебшчыны.

Тв.: «Zanim czas pochłonie»: Północne rubieże Rzeczpospolitej Polskiej. — Warszawa, 1995. — 416 s.; Wileńszczyzna, 1919–1939. — Warszawa, 1995. — 640 s.; Mohikanie znad Dżwiny. — Warszawa, 2000. — 543 s.

Літ.: Katolog Brasławski: Literatura. — Warszawa: Oddział Warszawski Krajowego Stowarzyszenia Brasławian, 2006.

**САДОЎСКАЯ** СВЯТЛАНА ІВАНАЎНА (1955), краязнаўца, музейны работнік. Супрацоўнік ГРКМ. Укладальніца кнігі «Памяць» Гарадоцкага раёна і аўтар шэрагу артыкулаў у ёй (1990–2004). Некаторыя матэрыялы па гісторыі Гарадоччыны апублікавала на старонках мясцовага перыядычнага друку.

Тв.: У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай: Сацыяльна-палітычнае становішча // Памяць: Гарадоцкі раён: Гісторыка-дакументальная хроніка / укл. С.У. Садоўская. — Мн.: Беларусь, 2004. — С. 52–56; У складзе Расійскай імперыі // Тамсама. — С. 63–68; Гарадоцкі пав. у другой палове XIX – пач. XX ст. // Тамсама. — С. 137–140; Прамысловае развіццё ў 1920-я гг. // Тамсама. — С. 212–213; Стан сельскагаспадарчай вытворчасці ў 1920–1930-я гг. // Тамсама. — С. 216–217; Гандаль і сувязь // Тамсама. — С. 225–226; Культурнае развіццё // Тамсама. — С. 226–227; Першыя дні вайны // Тамсама. — С. 291–293; Акупацыя // Тамсама. — С. 296–299; Яны засталіся жыць // Тамсама. — С. 305–306; Крывавыя справы карнікаў // Тамсама. — С. 308–309; Выратаванае жыццё // Тамсама. — С. 369–370; Гарадоцкая аперацыя // Тамсама. — С. 369–373; Наладжванне мірнага жыцця // Тамсама. — С. 404–405; Краязнаўчы музей // Тамсама. — С. 732–733.

Артыкулы ў мясцовым друку: Баі пад Гарадком // ГВ. — 1993. — № 26. — С. 2; Чорнае крыло вайны // ГВ. — 1993. — № 27. — С. 4; Для книги «Память» // ГВ. — 1999. — № 45. — С. 4; Герой палярнага дрэйфу: [А.П. Сабалеўскі] // ГВ. — 2000. — № 10. — С. 2; Гістарычны парад // ГВ. — 2000. — № 50. — С. 2; Жыццё, адданае небу: [П.І. Пелюхаў] // ГВ. — 2000. — № 51. — С. 2; Як гэта пачыналася // ГВ. — 2001. — № 38. — С. 2, 3; Гарадоччына багатая на багатых людзей: [кніга «Памяць»] // ГВ. — 2001. — № 49. — С. 2; Летапіс роднага краю // ГВ. — 2002. — № 30. — С. 2; Старая фотография // ГВ. — 2003. — № 43. — С. 4; Напярэдадні вайны // ГВ. — 2003. — № 81. — С. 2, 4; Акупацыя // ГВ. — 2003. — № 88, 91, 93, 99; Гарадоцкая аперацыя // ГВ. — 2003. — № 101. — С. 2.

**САЛТУК** АЛЕГ УЛАДЗІМІРАВІЧ (25.08.1946, в. Рыжэнкі Шумілінскага раёна Віцебскай вобл.), журналіст. Скончыў Мішкавіцкую СШ Шумілінскага раёна (1963), факультэт журналістыкі МгДПІ (1967). Працаваў адказным сакратаром газеты «Патрыёт» Ушацкага раёна (1969–1974), сакратаром Віцебскага абласнога аддзялення СПБ, рэдактарам аддзела газеты «Віцебскі рабочы». Асвятляе пытанні гісторыі і культуры Віцебшчыны на старонках газеты «Віцебскі рабочы», вёў раздзел «Сябрына», у якім уздымаліся пытанні культурнага, нацыянальнага адраджэння беларускага народа, гіст. мінуўшчыны краіны. Вывучае літаратурнае жыццё Віцебшчыны.

Заслужаны член Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат літаратурнай прэміі імя У. Караткевіча, журналісцкай прэміі «Залаты піяр».

Тв.: У добры шлях: [А. Нафрановіч] // ВР. — 1998. — № 31. — С. 6; З кагорты народных: [П. Броўка] // ВР. — 2000. — № 72. — С. 6; Жывыя асяродкі памяці: [музеі Віцебшчыны] // ВР. — 2000. — № 117. — С. 3.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Салтук А.У. (6.10.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**САМОЙЛЕНКА** АЛЯКСАНДР, краязнаўца. Працаваў выкладчыкам у Відзскім ПТВ Браслаўскага раёна. У 1980-я гг. стварыў музей у ПТВ, які адлюстроўваў некаторыя старонкі гісторыі Відзаў і наваколля, гісторыю вучылішча, меў этнаграфічны куток. Пасля сыходу з вучылішча краязнаўчую працу пераняла Таццяна Плешывава.

Літ.: Краязнаўчай праца ў Відзскім профтэхвучылішчы // Павет. — 2005. — № 8 (45), снежань. — С. 7.

**САРОКА** (Матук) СВЯТЛАНА МІХАЙЛАЎНА (28.11.1961, в. Боркавічы Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобл.), мовазнаўца, гісторык журналістыкі, краязнаўца. Кандыдат філал. навук (2001). Скончыла СШ у г. Наваполацку, Політэхнічны інстытут па спецыяльнасці інжынер-механік (1983), факультэт журналістыкі БДУ (1990). Працавала канструктарам у ВА «Электрамодуль» (г. Маладзечна), карэспандэнтам, адказным сакратаром у газетах г. Маладзечна: шматтыражках «Приборостроитель», «Наш дзень», «Рэгіянальная газета» і «Новай газеты» г. Наваполацка (1986–1999), выкладчыкам дысцыплін «Культуралогія», «Тэорыя і гісторыя культуры», «Стылі і жанры літаратуры і журналістыкі», «Этыка», «Эстэтыка», дацэнтам кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ПДУ (з 1999).

Даследуе гісторыю беларускай журналістыкі, этнаграфічную культуру беларусаў у складзе Расійскай імперыі. Віцебшчына стала прадметам навуковай зацікаўленасці пад час напісання дысертацыі «“Віцебскія губернскія ведамасці” ў сістэме беларускай дарэвалюцыйнай прэсы» (навуковы кіраўнік прафесар А.Г. Слука). Аўтар кнігі «Витебские губернские ведомости» (официальная часть и неофициальная часть)» (2004), у якой аналізуе тэматыку пулікацый, склад аўтараў, ролю выдання ў грамадскім, навуковым жыцці губерні. Удзельнік навуковых канферэнцый (з 1999).

Тв.: Кнігі: «Витебские губернские ведомости»: официальная часть и неофициальная часть. — Москва; Новополоцк, 2004. — 220 с.

Артыкулы ў навуковым друку: К.А. Говорский и начало западноруссизма на страницах «Витебских губернских ведомостей» // Асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснай журналістыкі: матэрыялы навукова–практычнага семінара аспірантаў і суіскальнікаў. — Мн.: БДУ, 1999. — С. 66–69; «Распоясывайтесь русские люди! Жертвовали много — пожертвуем еще!» // Magazyn polski: Czasopismo naukowo-spoleczno-kulturalne. — № 3 (20). — Гродно: Союз поляков на Беларуси, 2000. — С. 64–66; Эпистолярная публицистика белорусского православного духовенства в 1863 году // Проблемы истории литературы: сборник статей. — М., 2000. — С. 85–92; Загадка графа Муравьева-Виленского // Проблемы истории литературы: сборник статей. Вып. 12. — М., 2000. — С. 110–123; Праблемы развіцця беларускай мовы ў XIX стагоддзі // Уладзімір Караткевіч і сучаснасць: зборнік артыкулаў. — Наваполацк: ПДУ, 2001. — С. 123–130; Ксенофонт Говорский в «Витебских губернских ведомостях» // Проблемы истории литературы: сборник статей. Вып. 13. — М., 2001. — С. 188–198; Парадоксы Витебской губернии // Проблемы истории литературы: сборник статей. — Вып. 14. — М., 2001. — С. 192–202; Проблемы литературы и журналистики на страницах официальных изданий Северо–Западного края Российской империи // Проблемы истории литературы: сборник статей. Вып. 16. — Москва; Новополоцк, 2002. — С. 192–198; Между Россией и Польшей была Беларусь: по страницам официальных белорусских изданий начала XX века // Проблемы истории литературы: сборник статей. Вып. 17. — Москва; Новополоцк, 2003. — С. 279–289.

Літ.: Сороко С.М. // Кафедра мировой литературы и культурологи, 1999–2004. — Новополоцк: Новополоцкая типография, 2004. — С. 23–25; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Сарока С.М. (4.12.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**САЎЛІЧ** УЛ., пісьменнік-драматург з Глыбокага, карэспандэнт, журналіст газеты «Віцебскі рабочы». Аўтар артыкулаў, у якіх асвятляюцца некаторыя пытанні гісторыі і культуры Віцебшчыны.

Тв.: Шубін-сын ціха жыве ў Лынтупах // ПК. — 1994. — № 30. — С. 2; Сікораўскі сад павінны заквітнець на Віцебшчыне // ВР. — 1995. — № 149. — С. 7; З даўніны ў сёння: [Глыбоцкі краязнаўчы музей] // ВР. — 1998. — № 78. — С. 7; Родам з Глыбокага: [П. Сухі] // ВР. — 1999. — № 102, 103, 105, 107; Ёсць у Крулеўшчызне вуліца // ВР. — 1999. — № 105. — С. 3; Цырк у Шаркоўшчыне // ВР. — 2000. — № 16. — С. 4.

**СВОЙНІКАЎ** СЦЯПАН ВАСІЛЬЕВІЧ, краязнаўца. Пражываў у в. Новая Тухінь Дубровенскага раёна. Працаваў на партыйнай і грамадскай рабоце, настаўнікам у школе. Збіраў матэрыялы па гісторыі вёскі, вывучаў лёс землякоў , друкаваў іх у мясцовым перыядычным друку.

Тв.: У баях за Бацькаўшчыну // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Дубровенскага раёна. — Кн. 1. — Мн.: Паліграфафармленне, 1997. — С. 339; Я вярнуўся дамоў з перамогай // Тамсама. — С. 341.

Літ.: Кулакоў Ф. Лекары нашых душ // ДнП. — 1992. — № 69. — С. 1, 2.



**СЕМЯНЬКОВА** (Макарава) ГАЛІНА КАНСТАНЦІНАЎНА (23.12.1968, в. Угрынкі Ушацкага раёна), педагог, мовазнаўца. Кандыдат філал. навук (2002), дацэнт (2005). Вучоны сакратар ВДУ. Скончыла СШ № 36 г. Віцебска (1986), філал. факультэт ВДПІ (1991), аспірантуру пры ВДУ (2001). Працуе на кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ (з 1991).

Даследуе асобныя пытанні анамастыкі Віцебшчыны: уласныя імёны, прозвішчы, мянушкі. Краязнаўствам зацікавілася ў час вучобы ў інстытуце. Пэўны ўплыў аказалі Г.М. Мезенка і А.В. Куржалаў. У канцы 1980-х гг. удзельнічала ў конкурсе педагогаў «Літаратурная Віцебшчына». З мэтай падрыхтоўкі запісала мноства фальклорных твораў на Ушаччыне, сабрала матэрыял пра пісьменніка-земляка Валянціна Лукшу, падрыхтавала і правяла для школьнікаў падарожжа на радзіму народнага пісьменніка Беларусі Петруся Броўкі ў в. Пуцілкавічы.

Выступіла ініцыятарам правядзення конкурса «Сучасная антрапанімія Віцебшчыны», які быў праведзены ВАААППДіП. Распрацавала канцэпцыю, метадычныя рэкамендацыі, склала бібліяграфічны спіс, правяла інструктыўны семінар. У выніку канкурсанты сабралі і ў той ці інш. ступені прааналізавалі звесткі пра імёны і прозвішчы больш за 5600 жыхароў вобласці, зафіксавалі і растлумачылі каля 500 мянушак. Матэрыялы ўвайшлі ў дысертацыю «Прозвішчы жыхароў Віцебшчыны», якая была абаронена ў 2002 г. Аўтар і сааўтар некалькіх метадычных дапаможнікаў, а таксама артыкулаў у навуковым друку, прысвечаных анамастыцы. Актыўны ўдзельнік міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных навуковых канферэнцый (з 1989). Падтрымлівае стасункі з ВАЦППДіП, БелІПК.




Тв.: Кнігі: Сучасны імяннік Віцебшчыны: метадычны дапаможнік па вывучэнні антрапаніміі. — Віцебск: ВДУ, 2001. — 32 с.; (разам з Г.М. Мезенка, В.М. Ляшкевіч) Віцебшчына ва ўласных імёнах: мінулае і сучаснасць. — Віцебск: ВДУ, 2006. — 238 с.; Беларуская антрапанімія: вучэбны дапаможнік / Г.М. Мезенка (навук. рэд.) [і інш.]. — Віцебск: ВДУ, 2009. — 254 с.; Прозвішчы жыхароў Віцебшчыны: структура, семантыка, геаграфія: аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук: 10.02.01 / Г.К. Семянькова; БДПУ. — Мінск, 2002. — 21 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Прозвішчныя тыпы Віцебшчыны: Паміж усходам і захадам // Веснік ВДУ. — 1999. — № 4 (14). — С. 48–53; Адтапанімныя прозвішчы ў антрапанімнай сістэме Віцебшчыны // V Республиканская научная конференция студентов, магистрантов и аспирантов Республики Беларусь: материалы конференции: в 5 ч. Ч. 3. — Гродно: ГрГУ, 2000. — С. 8–11; Адыменныя прозвішчы жыхароў Віцебшчыны: праблемы матывацыі // Наука и творчество молодёжи — XXI веку. Итоги НИР – 2000: тезисы докладов V (50) научной конференции студентов, магистрантов и аспирантов. — Витебск: ВГУ, 2000. — С. 34; Балтыйскія і яўрэйскія элементы ў прозвішчах жыхароў Віцебшчыны // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія: мат-лы V міжнар. навук. канф. / пад агульн. рэд. Л.М. Вардамацкага, А.М. Мезенкі. — Віцебск: ВДУ, 2000. — С. 109–110; Мікраядро «Прозвішчы жыхароў Віцебшчыны, утвораныя ад nomina impersonalia» // VI Республиканская научная конференция студентов и аспирантов Беларуси «НИРС-2001»: тезисы докладов: в 2-х ч. Ч. II // ВГУ; ред. кол.: Г.И. Михасев (гл. ред.) [и др.]. — Витебск: ВГУ, 2001. — С. 211–213; Аб'ём і змест аднаго з мікраядзер семантычнага поля «Прозвішчы жыхароў Віцебшчыны» // Весці БДПУ. — 2001. — № 2. — С. 56–63; Адыменныя прозвішчы ў антрапанімнай сістэме Віцебшчыны // Веснік ВДУ. — 2001. — № 1 (19). — С. 47–52; Матранімічныя прозвішчы на тэрыторыі Віцебшчыны: сістэмны і арэальны аспект // Веснік ВДУ. — 2001. — № 3 (21). — С. 69–71; Неафіцыйнае іменаванне жыхароў Віцебшчыны і светапогляд беларусаў // Веснік ВДУ. — 2002. — № 2 (24). — С. 89–94; Сучасныя прозвішчы жыхароў Віцебшчыны, утвораныя ад «колеравых» апелятываў // Актуальныя пытанні беларускай лінгвістыкі. Да 80-годдзя прафесара М. С. Яўневіча: зб. навук. арт. — Мн.: БДПУ, 2002. — С. 157–161; Лингвогеография современных фамилий жителей Витебщины // Теоретические и прикладные проблемы русской филологии: научно-методический сборник. Вып. XI. Ч. 1 / отв. ред. В. А. Глущенко. — Славянск: СГПУ, 2003. — С. 149–156; Польскія элементы ў прозвішчах жыхароў Віцебшчыны // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія: матэрыялы VI міжнароднай навуковай канферэнцыі: у 2-х ч. Ч. II / пад агульн. рэд. Л.М. Вардамацкага, Г.М. Мезенкі. — Віцебск: ВДУ, 2003. — С. 54–56; Прозвішчы жыхароў Віцебшчыны: Фанетычныя і словаўтваральныя асаблівасці беларускай, польскай і іншых моў // Иностранные языки в вузе и школе: теория и практика: материалы Республиканской научно-практической конференции, 22–23 апреля 2004 г. / под общей ред. Л.М. Вардомацкого. — Витебск: ВГУ, 2004. — С. 116–119; Лінгвастылістычныя каментарыі да апавядання Яна Баршчэўскага «Радзімы знак на вуснах» // Ян Баршчэўскі ў славянскім свеце. Да 210-годдзя з дня нараджэння: зборнік навуковых артыкулаў удзельнікаў IV Міжнародных чытанняў, 18-19 мая 2004 г. / пад рэд. В.І. Русілкі, В.Ю. Бароўкі. — Віцебск: ВДУ, 2004. — С. 105–107; Полевая арганізацыя прозвішчнай антрапаніміі Віцебшчыны // Актуальныя праблемы функцыянавання і развіцця лексікі славянскіх моў: матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 60-годдзю універсітэта, 7–8 кастрычніка 2004 г., г. Мазыр / адк. рэд. А.В. Солахаў. — Мазыр: МДПУ, 2004. — С. 158–160; Каляядзерная прастора семантычнага поля «Прозвішчы жыхароў Віцебшчыны» // Актуальные вопросы славянской ономастики. Славянская ономастика в ареальном, этимологическом и хронологическом аспектах: материалы III Международной научной конференции, 6–7 октября 2006 г. / отв. ред. Р.М. Козлова. — Гомель: ГГУ, 2006. — С. 223–230; Прозвішчы як адлюстраванне сацыяльнага стану і дыялектных асаблівасцей жыхароў Віцебшчыны / Г.К. Семянькова // Вучоныя запіскі. — 2007. — № 6. — Віцебск: ВДУ. — С. 121–133.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Семянькова Г.К. (16.06.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**СІДНЯКОВА** ВАЛЯНЦІНА, краязнаўца. Аўтар (разам І. Яршовым) кнігі «Зямля Караткевіча», прысвечанай жыццю і творчасці )вядомага пісьменніка-земляка У.С. Караткевіча. Другая кніга, выдадзеная таксама ў суаўтарстве з І. Яршовым — «Вёрсты пройдзеных дарог», прысвечана ўраджэнцам Аршаншчыны: пісьменнікам, друкарам, мастакам (31 нарыс).




Тв.: Кнігі: (разам з І. Яршовым) Зямля Караткевіча. — Орша, 1997. — 237 с.; (разам з І. Яршовым) Вёрсты пройдзеных дарог. — Магілёў: Магілёўская друкарня, 2003. — 240 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Уводнае слова // Аршанскі краязнаўчы зборнік. — Орша, 1995. — С. 3; Будынак, які ўвайшоў ва ўсе энцыклапедыі: [П. Лепяшынскі] // БМ. — 1997. — № 2. — С. 74–75.

Артыкулы ў перыядычным друку: Аб гербе Оршы // АГ. — 1994. — № 94. — С. 2; Багаты па прыгажосці і чароўны па тэмбру: [спявачка С.Ю. Друкер] // АГ. — 1998. — № 109. — С. 2; З першых Купалаўцаў // АГ. — 2000. — № 72. — С. 3.

Літ.: Махнач Т. Гісторыя Аршаншчыны ў асобах // ГлР. — 2004. — № 26–29. — 15 ліп. — С. 12.

**СІЗІНЦАВА** НАТАЛЛЯ РАМАНАЎНА, педагог. Нам. дырэктара па вучэбнай працы СШ № 1 г. Оршы. Працягнула працу Івановай С.Г. па стварэнні музея ў СШ № 1. Створаны музей мае 9 раздзелаў. Экспазіцыі прысвечаны навучальным установам з даўніны па цяперашні час, славутым выпускнікам і педагогам школы, аршанскім краязнаўцам.

Тв.: Борисова А. История города в школьном музее: [СШ № 1 г. Орша] // АГ. — 2005. — № 123. — С. 2.

**СІЛКІН** ГЕОРГІЙ СЯМЁНАВІЧ (†), педагог. Жыў на Гарадоччыне. Распрацоўваў гісторыю камуны «Чырвоны сцяг» у в. Даўгаполле Гарадоцкага раёна. Аўтар публікацый у раённай газеце (1970–1980-я гг.).

Тв.: Ніхто не забыты // ПК (Г). — 1985. — № 82. — С. 4.



**СІМАНЁНАК** ЛЮДМІЛА ІВАНАЎНА (19.02.1975, г.п. Обаль Шумілінскага раёна Віцебскай вобл.), педагог, метадыст. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (2004). Скончыла філал. факультэт ВДУ (1997). Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Лужаснянскай гімназіі для здольных і таленавітых дзяцей Віцебскай вобл. (1997–1999), метадыстам аддзела беларусазнаўства і краязнаўства Віцебскага абласнога аб'яднання па арганізацыі пазашкольнай працы з дзецьмі і падлеткамі (1999–2009), у тэатры «Лялька». Распачала краязнаўчую дзейнасць з прыходам у аддзел краязнаўства, дзе працавала над складаннем радаводаў вядомых асоб Віцебшчыны, літаратурным краязнаўствам, займалася арганізацыяй сустрэч са славутымі землякамі. Падтрымлівае адносіны з некаторымі дзяржаўнымі і грамадскімі ўстановамі г. Віцебска: ДАВВ, ВАБ, віцебскімі газетамі.

З'яўляючыся метадыстам аддзела беларусазнаўства і краязнаўства, вяла значную метадычную работу па развіцці школьнага краязнаўства ў Віцебску і Віцебскай вобл. Рэдактар зборніка «Гонар і слава Віцебшчыны». Укладальніца метадычных парад і рэкамендацый для ўдзельнікаў абласнога конкурсу на лепшы зборнік літаратурных твораў, прысвечаных роднаму краю.

Мае ненадрукаваную працу, якая ўключае збор літаратурных твораў пра Віцебшчыну, комплекс матэрыялаў пра славутых землякоў (анкеты, водгукі пра дзейнасць), якія пражываюць у Мінску

Тв.: Матэрыялы для удзельнікаў абласнога конкурсу на лепшы зборнік літаратурных твораў, прысвечаных роднаму краю / уклад. Л.І. Сіманёнак. — Віцебск, 2002. — 21 с.
Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Сіманёнак Л.І. (20.06.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**СІМАНОВІЧ** ДАВІД РЫГОРАВІЧ (26.06.1932, г. Нароўля Палескай вобл. (цяпер Гомельскай)), паэт, краязнаўца. Скончыў СШ № 1 г. Нароўля (1950), філал. факультэт БДУ (1955). Працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў СШ в. Крынкі Лёзненскага раёна Віцебскай вобл. (1955–1959), у газеце «Віцебскі рабочы» (1959–1960), рэдактарам, загадчыкам аддзела на Віцебскім абласным тэлебачанні (1961–1994). Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1960).

Працуючы на абласным тэлебачанні, даследаваў і папулярызаваў жыццё і дзейнасць асоб, звязаных з Віцебшчынай, якія пакінулі след у літаратуры і мастацтве. Сярод іх М. Гелавані, М. Лынькоў, С.Я. Маршак, У. Маякоўскі, А. Твардоўскі, Г. Успенскі і інш. Па матэрыялах даследаванняў падрыхтаваў цыкл перадач пад агульнай назвай «Витебщина литературная», прысвечаных гэтым асобам. Напрыклад, перадача «Чувство семьи единой. Сын Татарии — сын Беларуси» была прысвечана М. Джалілю. Аўтар сцэнараў тэлеперадач і тэлеспектакляў цыкла «Летопись дорог и встреч» пра асоб, лёс якіх быў звязаны з Віцебскам: «Подорожная Пушкина», «Осенний букет (Репин на Витебщине)», «За страницами БелСЭ», «Телевизионный клуб книголюбов», «Маладосць старажытнага горада» (пастаўлены ў 1964). Арганізаваў выпуск літаратурна-

мастацкага часопіса «Дзвіна» на Віцебскім абласным тэлебачанні (1961–1994). Штогод выходзіла 5–6 перадач, прысвечаных розным раёнам Віцебскай вобл., у якіх падавалася інфармацыя пра раён, яго гісторыю, адметнасці, культурныя традыцыі, старонка, прысвечаная кампазітарам, тэатру, канцэртнай самадзейнасці, літаратурная старонка і інш. Усяго выйшла больш за 100 перадач.




З мэтай падрыхтоўкі сюжэтаў працаваў у архіве, выяўляючы дакументальныя матэрыялы, што ілюструюць жыццё і дзейнасць асоб, звязаных з Віцебскам. Аднак у партархіў не быў дапушчаны, бо быў непартыйным. Збіраў вусныя ўспаміны і сведчанні, напрыклад, для падрыхтоўкі тэленарыса прысвечанага Янку Журбе, былі выкарыстаны ўспаміны сучаснікаў, здымкі ў Полацку, Чашніках.

Распрацаваў і чытаў у ВДПІ спецкурс, прысвечаны літаратурнаму жыццю на Віцебшчыне, які складаўся з лекцый: «Пушкин и наш край», «Литераторы-декабристы на Витебщине», «Наш край в жизни и творчестве русских писателей», «Витебский день Маяковского», «Витебщина в жизни и творчестве советских писателей», «Белорусские писатели — наши земляки», «Литературная жизнь Витебщины сегодня» і інш.

Аўтар краязнаўчых нарысаў «Подорожная Александра Пушкина» (1979, пачатковая назва «Летопись дорог и встреч»), у якіх адлюстраваны сувязі з Віцебскам А.С. Пушкіна, бацькі М.Ю. Лермантава, І.І. Лажачнікава, І.Я. Рэпіна, І. Батрака, У. Маякоўскага, Я. Купалы і Я. Коласа.

Аўтар артыкулаў па гісторыі і культуры Віцебшчыны ў энцыклапедычных выданнях і кнізе «Памяць» г. Віцебска. Разам з М. Дарафеенкам напісаў тэкст да фотаальбома «Віцебск». Аўтар артыкулаў, прысвечаных розным пытанням гісторыі і культуры Віцебшчыны ў рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку. Кніга «Витебский вокзал, или Вечерние прогулки через годы: дневники» ўтрымлівае цікавыя звесткі па гісторыі штодзённасці горада ў другой палове XX ст.

Удзельнічае ў грамадскім жыцці Віцебшчыны. Праяўляе актыўную грамадскую пазіцыю і прынцыповасць у адстойванні гістарычнага мінулага горада. Так, перадачу «Витебск на картинах художников» забаранялі, каб «не распальваць страсці веруючых» па прычыне таго, што ў ёй паказваліся храмы і цэрквы старога Віцебска. Адным з першых узняў шагалаўскую тэматыку ў перыядычным друку і культурным жыцці горада і краіны. Дзякуючы грамадзянскай пазіцыі і пасадзе (загадчык аддзела мастацкіх перадач Віцебскага абласнога тэлебачання) спрыяў аднаўленню памяці Марка Шагала ў горадзе. Ініцыятар правядзення Шагалаўскіх дзён у Віцебску. Разам з інш. прадстаўнікамі інтэлігенцыі Віцебска выступаў за перадачу будынка абкама КПБ пад мастацкі музей. Неадменны вядучы шэрагу мерапрыемстваў у культурным жыцці горада і вобласці. Старшыня Пушкінскага камітэта, Шагалаўскага камітэта г. Віцебска.

Адзін з ініцыятараў і арганізатараў стварэння Музея М. Шагала (1991), Літаратурнага музея (прапаноўваў яго стварэнне яшчэ да 1000-годдзя Віцебска ў 1974 г.) Літаратурнага музея ў ВДПІ (1980).

Аўтар 27 кніг паэзіі і прозы. Лаўрэат Шагалаўскай прэміі (1992) і абласной прэміі імя У. Караткевіча (2001), прэміі «Сузор'е муз» Віцебскага гарвыканкама.

Тв.: Подорожная Александра Пушкина. — Мн.: Маст. літ., 1979. — 160 с.; Сквозь даль времен. — Витебск: ВОТ, 1984. — 174 с.; Витебский вокзал, или Вечерние прогулки через годы: дневники. — Мн.: Асобны, 2006. — 424 с.; Віцебская абласная студыя тэлебачання // ЭЛіМБ. — Мн.: БелСЭ, 1985. — Т. 2. — С. 643–644; Віцебск. Літаратурнае жыццё // Тамсама. — С. 637–638; «С высоты Успенской горки…»: [М.Р. Фрадкін] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебска: у 2-х кн. — Мн.: БелЭн, 2002. — Кн. 2. — С. 540–542; У доме на Задунаўскай: Віцебскія дні С.Я. Маршака // Тамсама. — С. 560–561.

Артыкулы ў перыядычным друку: З павагай да мінулага: [помнікі гісторыі і культуры, прапановы] // ВР. — 1986. — № 241. — С. 3; Светлая крыніца памяці: [Бешанковіччына] // ВР. — 1987. — № 165. — С. 4; Школьны музей. Роздум аб выхаванні грамадзяніна // ВР. — 1988. — № 49. — С. 3; (разам з А. Падліпскім) Купалаўскія мясціны на Віцебшчыне // ЛІ. — 1988. — № 105. — С. 4; (разам з А. Падліпскім) На зямлі віцебскай // ЛіМ. — 1988. — 8 ліп.; Лёс паэта — лёс народа: [Т. Кляшторны] // ВР. — 1988. — № 164. — С. 4; Фрэскі на старой сцяне. Лёс мастакоў Хрыстафора і Пятра Даркевічаў // ВР. — 1988. — № 70. — С. 4; Фрэскі на старой сцяне // ЛіМ. — 1989. — 22 верас.; У Цяпіне, на радзіме вялікага асветніка // ВР. — 1990. — № 112. — С. 2; І добры след на зямлі… // ВР. — 1990. — № 25. — С. 4; Па гонару і сумленню: [грам.-паліт. жыццё, стан помнікаў гіст. і культуры] // ВР. — 1990. — № 144. — С. 4; Вяртанне: [М. Шагал] // НС. — 1991. — № 2. — С. 5; Галасы праз гады // ВР. — 1991. — № 72. — С. 5; «Парыж — ты мой другі Віцебск» // ВР. — 1991. — № 114. — С. 3; Сколько музыки в красках Шагала // Віцьбічы. — 1992. — № 70. — С. 2; А пушкінскай дароге нет канца… // НС. — 1999. — № 56. — С. 4; Встреча в Зазыбах // НС. — 1999. — № 140. — С. 5.

Літ.: Рублеўскі С. «Сябры мае людзі»: [Д. Сімановіч] // НС. — 1992. — № 71. — С. 5; Звязаны лёсам // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебск: у 2-х кн. — Мн.: БелЭн, 2002. — Кн. 2. — С. 568; Алимова Е. Поэт, влюбленный в человечество // Бюлетень Музея Марка Шагала. — Вып. 15. — Мн.: Рифтур, 2008. — С. 38–42; Канапелька А. Давід Сімановіч // НС. — 2000. — № 72. — С. 4; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Сімановіч Д.Р. (29.06.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**СІНКЕВІЧ** ТАЦЦЯНА ІВАНАЎНА (16.12.1966, г. Віцебск), педагог, мовазнаўца. Скончыла ВДПІ (1988). Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў СШ № 32 г. Віцебска (1988–1989), выкладчыкам кафедры агульнага мовазнаўства ВДПІ (з 1990).

Цікавіцца гісторыяй і культурай краю пачала з дзяцінства. Некаторы час працавала экскурсаводам. Вывучае назвы азёр Віцебшчыны. Пачала даследаванні лімнонімаў рэгіёна пад уплывам Г.М. Мезенкі, П.П. Шубы. Аўтар артыкулаў у навуковым друку.

Тв.: Особенности лимнонимов севера Беларуси // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства: матэрыялы ІІ Міжнароднай навуковай канферэнцыі: у 2-х т. — Віцебск: Выдавецтва ВДУ, 1994. — Т. 2. — С. 105–106; Лексико-семантические особенности лимнонимов Витебщины // Е. Карский и современное языкознание: мат-лы шестых научных чтений: в 2-х ч. — Гродно, 1996. — Ч. 2. — С. 101–106; Структурно-семантический аспект гидронимии северо-запада Беларуси // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства: зборнік матэрыялаў IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 24–26 красавіка 1997 г.: у 3-х ч. — Віцебск: ВДУ, 1997. — Ч. 3. — С. 436–439; Легенды и предания в названиях озер Витебщины // Русский язык и литература. — 1998. — № 4. — С. 112–116; Мифы, легенды, предания в основах названий озер Витебщины // Студия Славестычна: междунар. ономастич. конфер. / под ред. С. Абрамович, Л. Дацевич. — Белосток, 1999. — С. 282–287; Славянскія, балцкія, фінавугорскія фарманты ў назвах азёр Віцебшчыны // Веснік БДУ. Серыя 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. — 1999. — № 1. — С. 53–56; Проблемы этнических контактов и лимнология Витебщины // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія: матэрыялы V Міжнар. навук. канф., Віцебск, 25–27 мая 2000 г. — Віцебск, 2000. — С. 110–111; Лимнонимы северо-востока Беларуси (Витебская область) в балто-славянском контексте // Тезисы докладов III Международного конгресса диалектологов и геоленгвистов / под ред. С. Вархол. — Люблин, 2000. — С. 83; Варьирование названий озер Витебщины // Студия Славестычна / под. ред. С. Абрамович. — Белосток, 2000. — С. 279–282; Место и роль термина классификатора в структуре названий озер Витебщины // Русский язык в изменяющемся мире: мат-лы международной научной конференции: в 2-х ч. — Мн., 1999. — Ч. 1. — С. 126–129; Названия озер Витебщины как база для современных ономастических исследований // Мат-лы X Международного симпозиума славистов «Восточнославянские языки и литература с перспективы конца XX века». — Зелена Гура, 2001. — С. 156–159; Лимнонимы как источник изучения этноязыковой истории Витебщины // Белорусское Поозерье: Язык и духовная культура / под ред. А.М. Мезенко, А.В. Русецкого. — Мн., 2001. — С. 66–81; Ареальный анализ названий озер Витебщины // Актуальные вопросы славянской ономастики / ред. Р.М. Козлов. — Гомель, 2002. — С. 202–206; Географические термины в основах названий озер Витебщины // Материалы Международной научной конференции «“Восток – Запад” — диалог языков и культур в контексте глобализации». — Слупск, 2003; Сложные лимнонимы на территории Витебщины // Русский язык: система и функционирование. — Мн., 2004. — Ч. 2. — С. 16–19; Отражение социокультурных процессов в названиях озер Витебщины // Astra albaruthenica, Rossica, Polonica: VII міжнародная навуковая канферэнцыя беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія: зборнік навуковых артыкулаў. — Віцебск, 2006. — С. 357–359; Метонимические названия озер на территории Витебщины // Славянские языки: системно-описательный и социокультурный аспекты исследования: материалы III Республиканской научно-методической конференции. — Брест, 2006. — С. 125–129; Цветовые определения в названиях озер Витебщины // Тамсама. — С. 184–190; Метафорические названия в основах названий озер Витебщины // Язык. Текст. Человек. — Мозырь, 2006. — С. 106–108; Балто-славянские параллели в названиях озер Витебщины // Latgale kā Kultūras pierobeža Daugovpils: Daugovpils Universitātes Akadēmikais apgāds «Salute», 2008. — S. 369–375.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Сінкевіч Т.І. (15.12.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**СІТДЗІКАВА** ВОЛЬГА ЯЎГЕНАЎНА (1971), краязнаўца, педагог. Скончыла біялагічны факультэт ВДПІ (1993). Выкладае біялогію ў Ветрынскай СШ Полацкага раёна. Даследуе палацава-паркавыя комплексы, сядзібы, помнікі прыроды Полаччыны. Вывучае гісторыю праваслаўных храмаў у Полацкім раёне, тапаніміку і нумізматыку месца пражывання. Ініцыятар, арганізатар і ўдзельнік экспедыцый па Полаччыне. Удзельнік краязнаўчых рэспубліканскіх і рэгіянальных канферэнцый. Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Ореховно // РП. — 2003. — № 5. — С. 27; (разам з І. Сітдзікавай) Хто мы? Адкуль і куды ідзем? // НГ (НвП). — 2001. — № 92. — С. 3; Зберагчы, пакуль не позна: [сядзібы Полаччыны] // НГ (НвП). — 2002. — № 62. — С. 4.

Літ.: Шпакоўская Г. Кожны край — скарбонка гісторыі // НС. — 2007. — 13 ліст. — С. 5.



**СКАПА** УЛАДЗІМІР РЫГОРАВІЧ (*Ул. Бярозка, В. Собаль*) (5.12.1935, в. Сукрэмна Сенненскага раёна – 19.01.1999), журналіст. Скончыў СШ № 1 г. Сянно, аддзяленне журналістыкі філал. факультэта БДУ (1954–1959). Працаваў у Сенненскай раённай газеце, адказным сакратаром і рэдактарам газеты «Сцяг Ільіча» (Талачын) (1959–1965). З 1965 г. працаваў уласным карэспандэнтам, адказным сакратаром, нам. рэдактара газеты «Віцебскі рабочы», гал. рэдактарам (1983–1995). Амаль дзесяць гадоў узначальваў Віцебскую абласную журналісцкую арганізацыю. Браў удзел у стварэнні кніг «Памяць» Сенненскага і Талачынскага раёнаў, уваходзіў у камісію па іх стварэнні, аўтар шэрагу артыкулаў.

Займаўся даследаваннем жыцця і творчасці вядомых літаратараў – ураджэнцаў Віцебшчыны. Пад уласным імем і псеўданімамі Ул. Бярозка і В. Собаль апублікаваў сотні артыкулаў на гэтую тэму, а таксама па розных пытаннях гісторыі і культуры Прыдзвінскага краю. Рэдактар-складальнік кнігі «“Віцебскі рабочы” — 80 лет», аўтар артыкулаў, прысвечаных журналістам Віцебшчыны, якія асвятлялі пытанні гісторыі і культуры на старонках мясцовага перыядычнага друку.

Тв.: «Віцебскі рабочы» — 80 лет / рэд.-склад. У.Р. Скапа. — Віцебск: ВАУД, 1997. — 224 с.; Дзве камандзіроўкі // «Віцебскі рабочы» — 80 лет / рэд.-склад. У.Р. Скапа. — Віцебск, 1997. — 105–107; Старшыня калгаса: [Л. Навумава] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна. — Мн.: БелСЭ, 1988. — С. 608–609; Школа Смірнова // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна. — Мн.: БелСЭ, 1988. — С. 610–611; Вызначыўся паэтычным талентам…: [Т. Лада-Заблоцкі] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна / уклад. С.В. Шайко. — Мн.: Паліграфафармленне, 2003. — С. 66–67; Шляхам барацьбы і выпрабаванняў // Тамсама. — С. 73–81; Камунары з Баравікоў // Тамсама. — С. 95 — 97; Ішла вайна народная // Тамсама. — С. 131–136; Гады аднаўлення і стварэння // Тамсама. — С. 505–512; Слова ў вясёлкавымззянні: [А. Вялюгін] // Тамсама. — С. 546–547.

Артыкулы ў перыядычным друку: Чым горад славуты: [рэцэнзія на кнігу «Витебск и окрестности»] // ВР. — 1985. — № 181. — С. 4; Песні мужнасці і барацьбы: [М. Джаліль] // ВР. — 1986. — № 33. — С. 4; З глыбінь жыцця народнага: [К. Крапіва] // ВР. — 1986. — № 47. — С. 4; У інтарэсах цяперашніх і будучых пакаленняў: [рэцэнзія на «Энцыклапедыю прыроды Беларусі»] // ВР. — 1986. — № 151. — С. 4; Шанаваць жывых, помніць мёртвых: [І. Новікаў] // ВР. — 1988. — № 17. — С. 4; У пошуках гармоніі: [М. Стральцоў] // ВР. — 1988. — № 51. — С. 4; «Буйлянка» // ВР. — 1989. — № 8. — С. 4; У вытокаў жыцця народнага: [М. Гарэцкі] // ВР. — 1989. — № 92. — С. 3; «Хачу быць карысным свайму краю»: [У. Жылка] // ВР. — 1989. — № 176. — С. 4; «Пілую вершамі краты»: [В. Таўлай] // ВР. — 1989. — № 179. — С. 4; Гандлёвыя сувязі віцьбічаў // ВР. — 1989. — № 199. — С. 4; Дапытлівы разведчык, нястомны шукальнік: [М. Гарэцкі] // ВР. — 1989. — № 209. — С. 4; Летапісец роднага аднаўлення: [М. Лынькоў] // ВР. — 1989. — № 229. — С. 4; «Беларусі-партызанкі сын…»: [К. Заслонаў] // ВР. — 1990. — №4. — С. 4; Этнаграфія Беларусі: [рэцэнзія] // ВР. — 1990. — № 40. — С. 4; «З нас кожны рэвалюцыяй праняты…»: [У. Дубоўка] // ВР. — 1990. — № 133. — С. 4; Уся, да кроплі, любоў // ВР. — 1990. — № 167. — С. 4; У адкрыты свет, з адкрытым сэрцам: [Ю. Свірка] // ВР. — 1990. — № 134. — С. 4; Узнясенне над часам: [У. Караткевіч] // ВР. — 1990. — № 222. — С. 3; З дзівоснай марай па жыцці: [А.Я. Міронаў] // ВР. — 1990. — № 223. — С. 4; Усе мы з хат: [Я. Сіпакоў] // ВР. — 1991. — № 3. — С. 4; Стогн набалелай душы: [Я. Лучына] // ВР. — 1991. — № 39. — С. 4; З артэзіянскіх людскіх глыбінь: [А. Вярцінскі] // ВР. — 1991. — № 48. — С. 4; Дыяпазон творчых пошукаў: [М.М. Піятуховіч] // ВР. — 1991. — № 60. — С. 4; Маладнякоўскі Бялінскі: [А. Бабарэка] // ВР. — 1991. — № 68. — С. 4; Свет думак людскіх і трывог: [Н. Тулупава] // ВР. — 1991. — № 112. — С. 4; Нястомны сявец: [С. Палуян] // ВР. — 1991. — № 117. — С. 3; Годнасць байца і чалавека: [А. Звонак] // ВР. — 1991. — № 207. — С. 4; Ад пастушка да акадэміка: [П. Глебка] // ВР. — 1991. — № 212. — С. 4; На пераломе: [90 год М. Зарэцкаму] // ВР. — 1991. — № 218. — С. 4; Свой пракладваючы след: [А. Савіцкі] // ВР. — 1994. — № 4. — С. 2; Родны край. Па старонках «Беларускага календара» // ВР. — 1994. — № 9. — С. 4; З глыбінь народнага духу: [А. Ліс] // ВР. — 1994. — № 18. — С. 3; З чалавечай чуласцю і дабрынёй: [Е. Лось] // ВР. — 1994. — № 33. — С. 3; На ніве беларушчыны: [Б. Эпімах-Шыпіла] // ВР. — 1994. — № 129. — С. 5; Матывы маладосці і непакою: [Р. Жалязняк] // ВР. — 1994. — № 137. — С. 3; Адысея рэвылюцыянера-рамантыка: [М. Барадзін] // ВР. — 1994. — № 141. — С. 3; Віцебская частушка // ВР. — 1994. — № 153. — С. 5; Плён шматгадовых пошукаў: [рэц. на кнігу Я. Кічынай] // ВР. — 1994. — № 180. — С. 5; З юнацкай шчырасцю: [М. Сямашка] // ВР. — 1994. — № 188. — С. 6; Са знакам адметнасці: [Н. Пашкевіч] // ВР. — 1994. — № 189. — С. 3; Выпраменьваючы святло дабрыні: [Л. Калодзежны] // ВР. — 1995. — № 33. — С. 3; З навуковай грунтоўнасцю: [А.М. Булыка] // ВР. — 1995. — № 42. — С. 6; Споведзь перад сабою: [У. Папковіч] // ВР. — 1995. — № 46. — С. 5; Багацце душы і таленту: [Ю. Гаўрук] // ВР. — 1995. — № 67. — С. 8; Жывая крыніца: [М. Нікіфароўскі] // ВР. — 1995. — № 72. — С. 3; Каб песня, як крышталь, званіла…: [У. Дубоўка] // ВР. — 1995. — № 106. — С. 5; Крывёю сэрца: [А. Жаўрук] // ВР. — 1995. — № 125. — С. 6; Нержавеючая зброя: [У. Корбан] // ВР. — 1995. — № 129. — С. 6; Збіральнік народных скарбаў: [Е. Раманаў] // ВР. — 1995. — № 137. — С. 5; Жыў-быў добры казачнік: [Р. Шакулаў] // ВР. — 1995. — № 173. — С. 3; Шчодры ў жыцці, мудры ў літаратуры: [У. Караткевіч] // ВР. — 1995. — № 179. — С. 7; Асвецім сэрцам шлях сябрам: [А. Дубовіч] // ВР. — 1995. — № 186. — С. 6; Актуальны і сёння: [А. Гутковіч] // ВР. — 1995. — № 194. — С. 7; Сіла і мудрасць жыцця: [Я. Сіпакоў] // ВР. — 1996. — № 7. — С. 7; Издана в Витебске. Солдатам Победы // ВР. — 1996. — № 19. — С. 5; Радкі, народжаныя за кратамі // ВР. — 1996. — № 26. — С. 5; Вернасць клятве: [З. Партнова] // ВР. — 1996. — № 28. — С. 3; Абсягі навуковага пошуку: [М. Піятуховіч] // ВР. — 1996. —

№ 32. — С. 4; Урокі дабрыні: [І.В. Гутараў] // ВР. — 1996. — № 53. — С. 3; Прага праўдзівасці: [М. Барсток] // ВР. — 1996. — № 57. — С. 3; З кагорты пачынальнікаў: [Я. Чачот] // ВР. — 1996. — № 100. — С. 6; Партызанскі паэт: [А. Астрэйка] // ВР. — 1996. — № 109. — С. 3; «Песні чакаюць нас дома…»: [Г. Бураўкін] // ВР. — 1996. — № 129. — С. 3; Каб зямля маладзела: [С. Законнікаў] // ВР. — 1996. — № 139. — С. 5; Паплечнік Бялінскага: [Т. Лада-Заблоцкі] // ВР. — 1996. — № 155. — С. 6; З сэрца, адкрытага людзям: [А. Вярцінскі] // ВР. — 1996. — № 173. — С. 5; Пазыўныя часу: [М. Зарэцкі] // ВР. — 1996. — № 177. — С. 7; Дзвінцы // ВР. — 1996. — № 185. — С. 7; Тры прэм'еры: [Я. Шабан] // ВР. — 1996. — № 195. — С. 3; Дастойны памяці народнай: [землякі] // ВР. — 1996. — № 196. — С. 5; Паэты з Сушкоў: [П. і М. Сушко] // ВР. — 1997. — № 1. — С. 7; Вяртаючыся да каранёў: [М. Калачынскі] // ВР. — 1997. — № 4. — С. 6; Прага шчасця: [Вярба В. (Сакалова Г.)] // ВР. — 1997. — № 5. — С. 3; Хвалююча пра перажытое: [П. Лісіцын] // ВР. — 1997. — № 32. — С. 7; Даследуючы родны край: [А. Шлюбскі] // ВР. — 1997. — № 92. — С. 8; Вялікае пачуццё часу: [А. Стаховіч] // ВР. — 1997. — № 96. — С. 4; Дыханне бурнага часу: [В. Каваль] // ВР. — 1997. — № 119. — С. 7; Галоўны герой — сучаснік: [Я. Радкевіч] // ВР. — 1997. — № 146. — С. 7; Адрасаваны ў будучыню: [А. Ушакоў] // ВР. — 1997. — № 153. — С. 3; Першы редактор: [В. Грэбнік] // ВР. — 1997. — № 167. — С. 2, 8; З рамантычнай узнёсласцю: [В. Лукша] // ВР. — 1997. — № 171. — С. 3; Пясняр азёрнага краю: [М. Машара] // ВР. — 1997. — № 173. — С. 7; Вястун свабоды: [Гейне] // ВР. — 1997. — № 186. — С. 8; З даўніны да нашых дзён: [Віцебская вобл.] // ВР. — 1997. — № 190. — С. 2; Да болю родныя гукі: [Я. Васілёнак] // ВР. — 1997. — № 194. — С. 4; Вечны агонь жыцця: [кніга «Памяць» Чашніцкага раёна] // ВР. — 1998. — № 3. — С. 3; У звычайным — адметнае: [А. Шашкоў] // ВР. — 1998. — № 3. — С. 4 Вечны агонь жыцця. Выйшла з друку кніга «Памяць» Чашніцкага раёна // ЧП. — 1998. — № 4–5. — С. 5; Вернасць прызванню: [М. Дарафеенка] // ВР. — 1998. — № 11. — С. 3; Амплітуда сэрца: [А. Тулупава] // ВР. — 1998. — № 17. — С. 8; І мінулае, і сучаснае: [Л. Шчамялёў] // ВР. — 1998. — № 19. — С. 4; Люблю, спадзяюся, жыву: [Г. Пашкоў] // ВР. — 1998. — № 45. — С. 6; Грані таленту: [А. Глебаў] // ВР. — 1998. — № 46. — С. 3; Застаючыся самім сабой: [Ю. Свірка] // ВР. — 1998. — № 73. — С. 8; Прапанаваў Янка Купала: [тарашкевіца] // ВР. — 1998. — № 75. — С. 4; Героі былі побач // ВР. — 1998. — № 95. — С. 4; Купалле // ВР. — 1998. — № 102. — С. 3; Маўклівыя сведкі мінуўшчыны: [валуны] // ВР. — 1999. — № 11. — С. 4

Літ.: Скапа У. Ад селькора да рэдактара // «Віцебскі рабочы» — 80 лет / рэд.-склад. У.Р. Скапа. — Віцебск, 1997. — С. 146–152, Скапа. Некралог // ВР. — 1999. — № 7. — С. 2; Скапа У.Р. // НС. — 1999. — № 8. — С. 6; Скапа У.Р // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна / уклад. С.В. Шайко. — Мн.: Паліграфафармленне, 2003. — С. 45–46; Інтэрв'ю з Уладзімірам Раманоўскім (рэдактар газеты «Віцебскі рабочы») 2.10.2006 // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**СКАРАХОД** ВІКТАР ІВАНАВІЧ (4.01.1924, в. Слабада Докшыцкага раёна), краязнаўца, педагог. Скончыў 10 класаў Бярозкаўскай СШ, Маладзечанскі настаўніцкі інстытут (1952), МДПІ (1971). У гады Другой сусветнай вайны ваяваў у партыз. брыгадзе «Жалязняк». Працаваў настаўнікам у школах Докшыцкага раёна і г. Мінска. Арганізатар і кіраўнік краязнаўчага музея ў Бярэзінскай СШ Докшыцкага раёна.

Зацікавіўся краязнаўствам прыкладна з 1954 г. Даследаваў тэму партыз. барацьбы на Бягомльшчыне. У выніку была створана кніга «Старонкі памяці» (у рукапісе). Шмат матэрыялаў па партыз. тэматыцы друкавалася ў часопісах «Маладосць» («Такая мая вайна»), «Полымя» («Партызанскія былі»), «Беларуская мінуўшчына», докшыцкай раённай газеце «Родныя вытокі». Па матэрыялах была зроблена перадача на рэспубліканскім радыё. За выказванне ў публікацыях асабістых меркаванняў адносна ролі савецкага партыз. руху, партыі ў вайне (артыкулы «Ён з аддзялення агентурнай разведкі», «За што?») быў падвергнуты рэзкай крытыцы з боку былога партыз. кіраўніцтва (артыкул «За гістарычную праўду»).

Другая тэма, якая актыўна распрацоўвалася даследчыкам — гісторыя роднага краю. Даследаваны пытанні з жыцця насельніцтва Докшыччыны з часоў прыгону да нашых дзён. Выявіў імёны шэрагу паплечнікаў К. Каліноўскага – выхадцаў з Докшыччыны. Сабраныя матэрыялы па гісторыі населеных месцаў краю афармляў у выглядзе артукулаў, якія публікаваў на старонках рэспубліканскага і мясцовага друку. Асаблівую цікавасць уяўляе з любоўю напісаны нарыс па гісторыі вёскі Бярэзіна і яе наваколляў «Беразіно». Яго вылучае прыгожая мова, адметны стыль і дакладнае выкладанне фактаў. Напісаў гісторыю роднай вёскі «Астровенская Слабада».




Укладальнік кнігі «Памяць» Докшыцкага раёна, для якой напісаў шэраг артыкулаў. Збіраў фальклор роднага краю, які друкаваў у рубрыцы «Матчын скарб» у раённай газеце «Родныя вытокі». Частка іх змешчана ў зборніку «Спадчына». Выявіў шэраг археалагічных помнікаў на тэрыторыі раёна. Даследаваў стан народнай адукацыі ў родным краі ў XIX ст. і ў першыя савецкія дзесяцігоддзі, займаўся вывучэннем ліквідацыі кулацтва на Бягомельшчыне. Апісаў Асаўскую, Бягомльскую, Бярэзінскую, Докшыцкую і Тумілавіцкую цэрквы. У рукапісе зберагаецца даследаванне «Родны кут» пра гісторыю вёсак былой Вітуніцкай вол. Барысаўскага пав.

З 1976 г. жыве ў Мінску. З 1984 г. на пенсіі.

Тв.: Падзеі паўстання 1863–1864 гг. на Докшыччыне // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Докшыцкага раёна. — С. 88–91; Стан асветы на Докшыччыне ў 19 – пачатку 20 ст. // Тамсама. — С. 111–113; З гісторыі Докшыцкага гарадскога вышэйшага раманаўскага вучылішча // Тамсама. — С. 115–118; «Вялікі пералом» // Тамсама. — С. 144–148; Народная адукацыя ў Бягомльскім раёне ў гады 1-й пяцігодкі // Тамсама. — С. 168–173; Бягомльшчына напярэдадні вайны і ў першыя яе дні // Тамсама. — С. 264–266; (разам з С.М. Табачнікавым) «Прывітанне "Хайль Гітлер!" адмяніць…» // Тамсама. — С. 338–342; Узнагароджанне, якое не адбылося // Тамсама. — С. 588–589; З жыццём і векам крочыў я… Краязнаўцы Докшыччыны // Тамсама. — С. 652–654; (разам з Г. Дулебай, Г. Новікавай) З гісторыі населеных пунктаў Докшыцкага раёна // Тамсама. — С. 708–746; Такая мая вайна // Маладосць. — 1994. — № 4. — С. 231–240; (разам з С. Табачнікавым) Прывітанне «Хайль Гітлер!» адмяняецца // БМ. — 1995. — № 2. — С. 10–13; Зоркі Айчыны: ліст у рэдакцыю // Маладосць. — 1996. — № 1. — С. 251; Бой пад Новы год // Маладосць. — 1996. — № 11. — С. 200–207; Жыць хацелася ўсім // Маладосць. — 1998. — № 4. — С. 216–224.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Імёны на абеліске // ЛТ. — 1988. — № 124. — С. 3; Беразіно // ЛТ. — 1989. — № 1–8, 10, 12, 17; Паход у Докшыцы // ЛТ. — 1989. — № 76–78; Рэквіем Слабадзе (бярозкаўскай) // ЛТ. — 1990. — № 12. — С. 3; Падзеі ў Вялікім Полі // ЛТ. — 1990. — № 44–50; Блакада 1943 г. // ЛТ. — 1990. — № 51–60, 63; Дзмітрый Заркевіч — невязучы! // ЛТ. — 1990. — № 79. — С. 3, 4; На Ліцвічы. Самалёты // ЛТ. — 1990. — № 82, 83; Пераправа. Сустрэча з падрыўнікамі // ЛТ. — 1990. — № 95. — С. 3; З немцамі да суседзяў // ЛТ. — 1990. — № 98. — С. 3; Кулямёт маўчыць. Выпадак з бомбай // ЛТ. — 1990. — № 105. — С. 4; На Маскавіцы // ЛТ. — 1990. — № 107. — С. 4; Пад Пьяным Лесам // ЛТ. — 1990. — № 112. — С. 3; Адзначаем Новы год // ЛТ. — 1990. — № 114. — С. 3; Дыверсія на чыгунцы // ЛТ. — 1990. — № 127. — С. 3; Ён з аддзялення агентурнай разведкі // ЛТ. — 1990. — № 133, 134, 136; За што? // ЛТ. — 1990. — № 140. — С. 3, 4; Медыцынская сястра // ЛТ. — 1990. — № 147–148; Змагаліся сем'ямі // ЛТ. — 1991. — № 27. — С. 2; Матчын скарб // ЛТ. — 1991. — № 35, 47, 77, 92, 97. — 1992. — № 6,15, 24; Рэдакцыя ў блакаду // ЛТ. — 1991. — № 66–71; «Зганьбілі» дваранскае званне // ЛТ. — 1991. — № 92. — С. 2; З трэцім атрадам на Бярэзіну // ЛТ. — 1991. — № 93–95; Пачынальнікі-пабрацімы // ЛТ. — 1991. — № 99–102; Знакамітасці роду Федаровічаў // ЛТ. — 1991. — № 105. — С. 3; Рамантыка і трагедыя кахання // РВ. — 1991. — № 110. — С. 3, 4; Начштаба // РВ. — 1991. — № 111. — С. 2, 4; Бягомльская царква // РВ. — 1992. — № 2. — С. 3, 4; Падполле // РВ. — 1992. — № 3–8; Збеглыя. Фальварак Бярозкі // РВ. — 1992. — № 7. — С. 3, 4; З гісторыі Докшыц // РВ. — 1993. — № 65. — С. 4; Бой пад Гарэлым Лугам // РВ. — 1995. — № 12. — С. 2; Не руйнуйце родную гісторыю // РВ. — 1995. — № 45. — С. 2; (разам з С. Табачнікавым) «Прывітанне "Хайль Гітлер!" адмяніць» // РВ. — 1995. — № 47–50; Памяці Алеся Ставера // РВ. — 1995. — № 71. — С. 4; Богі і святы нашых продкаў // РВ. — 1995. — № 79–81; Цяжба // РВ. — 1996. — № 56. — С. 2; «Магнаты» // РВ. — 1997. — № 17. — С. 4; Ведай свой край, даражы яго мінулым // РВ. — 1997. — № 78. — С. 3; Бой пад Новы год // РВ. — 1998. — № 11. — С. 2; Докшыцкае гарадское вышэйшае пачатковае раманаўскае вучылішча // РВ. — 1999. — № 53. — С. 4.

Літ.: Бірукоў Л., Фрол А. За гістарычную праўду // ЛТ. — 1991. — № 15. — С. 2; Краязнаўцы Докшыччыны // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Докшыцкага раёна. — С. 652; Скараход В. // КГ. — 2006. — № 17 (130). — С. 2.



**СКРАБАТУН** УЛАДЗІМІР ІВАНАВІЧ (23.01.1955, в. Кавалёўшчына Глыбоцкага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца, журналіст. Скончыў Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум (1978), вучыўся ў Рыжскім політэхнічным інстытуце. Жыў у г. Вентспілс (Латвія). У 1993 г. вярнуўся на радзіму, жыве ў Глыбокім.

Вывучае гісторыю населеных месцаў Глыбоччыны, помнікі архітэктуры, біяграфіі знакамітых землякоў. Прымаў удзел у стварэнні кнігі «Памяць» Глыбоцкага раёна.

Выдавец газеты «Вольнае Глыбокае» (з 1994). У кожным нумары каля трэці матэрыялаў прысвечаны гісторыі і культуры Глыбоччыны. Лічыць, што з раздзелам Маладзечанскай вобл. Глыбокае стала цэнтрам былых віленскіх зямель, якія на цяперашні час уваходзяць у склад Віцебскай вобл.: Браслаў, Докшыцы, Міёры, Паставы, Шаркоўшчына. Член рэдакцыйнай рады ілюстраванага часопіса краязнаўцаў Паазер'я «Нашы карані». Выдаў кнігу «Глыбокае на старых паштоўках», у якой сабраў усе вядомыя відарысы горада Глыбокага, выяўленыя ў зборах Мінска, Рыгі, Варшавы.




Аўтар артыкулаў у кнізе «Памяць» Глыбоцкага раёна, у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку. Шэраг матэрыялаў змешчаны на інтэрнэт-сайце «Вольнае Глыбокае» www.vglybokaye.promedia.by. Сярод

іншых: «Корсак», «Забытая слава Мосара», «Другая сусветная ў Глыбокім», «Глыбокае. Касцел кармелітаў босых», «Замак ці ратуша?».

Тв.: Глыбокае на старых паштоўках. — Мінск; Глыбокае: БГАКЦ, 1998. — 111 с.; Глыбоцкія паштоўкі // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 143–145; Павел Іосіфавіч Каруза // Тамсама. — С. 412; Віктар Сянкевіч // Тамсама. — С. 414.

Артыкулы ў перыядычным друку: Глыбокае ў мінулым // ШП. — 1977. — № 148. — С. 3; Мой горад // ШП. — 1988. — № 113. — С. 2,4; Вандраванні па Глыбоччыне // ШП. — 1989. — № 126, 127. — С. 2, 4; Назвы вуліц — гісторыя горада // ШП. — 1990. — № 72, 75, 76, 80, 82. — С. 2; Захаваем багатую спадчыну Глыбокага // ВГл. — 1991. — № 119, — 1992. — № 8, 9, 11–14; Аб чым гавораць геаграфічныя назвы // ВГл. — 1993. — № 41. — С. 3; Гісторыя глыбоцкай паштоўкі // ВГл. — 1993. — № 98. — С. 3; Гісторык з Гірстуноў // ВГл. — 1993. — № 21. — С. 2; Адновім гістарычную справядлівасць і абмяркуем, якія назвы павінны насіць вуліцы горада // ВГл. — 1993. — № 32. — С. 3; Татары ў Глыбокім // ВГл. — 1994. — № 23, 24, 27. — С. 3; Неспадзяваная вандроўка // ВГл. — 1994. — № 89. — С. 3; Горад і вечнасць // ВГл. — 1994. — № 95. — С. 2–3; Прыстань на возеры Беразвецкім // ВГл. — 1996. — № 7. — С. 1, 2; Тундра ў ваколіцах Глыбокага // ВГл. — 1996. — № 13. — С. 4; Яго параўноўвалі з Хрыстом // ВГл. — 1996. — № 14, 19, 22; Пляц Касцюшкі // ВГл. — 1996. — № 28. — С. 2; Яго параўноўвалі з Хрыстом // СП (М). — 1996. — № 29; Жыццё — кароткае, Радзіма — вечная // ВГл. — 1996. — № 35. — С. 2; Да гісторыі перыядычнага друку на Глыбоччыне // ВГл. — 1996. — № 38. — С. 3; Глыбоцкі рынак. Гісторыя і сучаснасць // ВГл. — 1996. — № 43–47; «Залатое» дрэва // ВГл. — 1996. — № 58. — С. 3; Бонда і Барыла // ВГл. — 1996. — № 65. — С. 3; Латыгаль — сведка сівой мінуўшчыны // ВГл. — Тамсама — С. 4; Таямнічая «Туркаль» // ВГл. — 1996. — № 74. — С. 4; Што ў прозвішчы маім? // ВГл. — 1996. — № 89. — С. 3, 4; Цётка Тамара // ВГл. — 1996. — № 97. — С. 3; Стары дуб на вуліцы Радзівілаўскай // ВГл. — 1996. — № 102. — С. 3, 4; Вялец // ВГл. — 1996. — № 103. — С. 2, 4; Відзы: версія паходжання назвы // БЗ. — 1997. — № 60. — С. 2; Дзяды Стаўроўскія // ВГл. — 1997. — № 10. — С. 2; Краязнаўчы рух. Мэты і задачы // ВГл. — 1997. — № 15. — С. 1, 2; Беразвечча. Росквіт. Заняпад. Адраджэнне // ВГл. — 1997. — № 20, 24, 26, 28, 30, 32, 36, 40, 41, 43, 45, 47; Глыбоцкая прэса ў мінулым // ВГл. — 1997. — № 34. — С. 1; Купала // ВГл. — 1997. — № 48. — С. 4; Магіла фундатара // ВГл. — 1997. — № 49. — С. 2; Вуліца Глыбоцкая ў Варшаве // ВГл. — 1997. — № 65. — С. 4; Глыбачанін, які навучыў гуляць англічан у футбол // ВГл. — 1997. — № 70. — С. 2; Кафедэральны сабор у Глыбокім // ВГл. — 1997. — № 90, 100; — 1998. — № 1, 2; Праз год — тры вялікія юбілеі // ВГл. — 1998. — № 4. — С. 1; Баран — святая жывёла Глыбоччыны // Наша слова. — 1998. — 4 лют. — С. 4; Касцёл Святой Тройцы ў Глыбокім // ВГл. — 1998. — № 19. — С. 3; Палац у Мосары // ВГл. — 1998. — № 36, 39. — С. 3; Катэдральны сабор у Глыбокім // НН. — 1998. — 15 чэрв. — С. 12; Таямніцы сахновіцкага возера // ВГ. — 2000. — № 2. — С. 2, 4; Няма таго, што раньш было // ВГ. — 2000. — № 15–16. — С 5; Навінкі з кніжнай паліцы // ВГ. — 2000. — № 25. — С. 4; Кожны археолаг марыць знайсці сваю Трою, альбо Сенсацыя ў Лаўрынаўскім лесе // ВГ. — 2001. — № 17. — С. 3; Абрубская вуліца // ВГ. — 2001. — № 29. — С. 4; Мая Глыбоччына // Нашы карані. — 2003. — № 8; Глыбокае, якога мы не ўбачым // ВГ. — 2008. — № 48. — С. 8, 17; Канстанцінаў Двор // Тамсама. — С. 18–20; Завулак Рускі і завулак Літоўскі // ВГ. — 2008. — № 9, 10, 11; Два крыжы ў Язна // ВГ. — 2008. — № 20. — С. 4–5; Паміж Івессю і Псуяй // ВГ. — 2008. — № 22, 23; Па родных сцежках: [Вярхоўе, Норыца, Дразды на Пастаўшчыне] // ВГ. — 2008. — № 26. — С. 4–5.

Літ.: Зінкевіч А. Мясцовыя летапісцы // ВГл. — 1996. — № 39. — С. 2; КГ. — 2006. — № 18 (131), май. — С. 2.



**СЛАБІН** УЛАДЗІМІР КАНСТАНЦІНАВІЧ (7.10.1964, г. Гарадок Віцебскай вобл.), педагог, краязнаўца. Кандыдат педагагічных навук (2000). Скончыў СШ № 1 г. Гарадок (1981), біялагічны факультэт ВДПІ (1986), аспірантуру пры Інстытуце механікі металапалімерных сістэм АН БССР (1990). Працаваў настаўнікам хіміі ў Руднянскай СШ Гарадоцкага раёна (1986–1987), дацэнтам кафедры хіміі (1990–2003), педагогікі (2003–2005), а таксама загадчыкам сектара інфармацыйных тэхналогій лабараторыі творчага самаразвіцця асобы ў сістэме «Школа-ВНУ» ВДУ, дацэнтам кафедры кіравання і інфармацыйных тэхналогій Віцебскага філіяла Інстытута сучасных ведаў (2003–2005), настаўнікам хіміі гімназіі № 1 г. Віцебска (2005–2006), навуковым супрацоўнікам Цэнтра перадавых тэхналогій у навучанні і дацэнтам кафедры хіміі ўніверсітэта штата Арэгон, ЗША (з 2006).

Гісторыяй роднага краю цікавіўся з дзяцінства, але мэтанакіравана і сістэматычна пачаў займацца краязнаўствам пад уплывам падзей беларускага нацыянальнага Адраджэння канца 1980 – першай паловы 1990-х гг. Даследуе тапаніміку Гарадоччыны, падзеі Веліжскага паўстання 1918 г. на Гарадоччыне. У першай палове 1990-х гг. выступаў з шэрагам артыкулаў, прысвечаных праблемам беларускай мовы, гіст. сімволікі, этыкету, лёсам выдатных дзеячаў гісторыі і культуры, гарадоцкай тапанімікі. Палемізаваў з праціўнікамі нацыянальнага адраджэння Беларусі. Аналізуе архіўныя крыніцы, літаратурныя матэрыялы, звесткі сучаснікаў пра падзеі грамадзянскай вайны, сялянскія паўстанні на Віцебшчыне. Прыйшоў да высновы, што «бандыцкі» атрад, што дзейнічаў каля Курына, Ноўкі ў 1919 г. — рэшткі паўстанцаў, якіх разбілі пад Веліжам.

Браў удзел у шэрагу рэспубліканскіх і рэгіянальных краязнаўчых канферэнцый. Арганізатар міжнароднай канферэнцыі «Міжнародны экалагічны досвед і яго выкарыстанне на Беларусі» (Віцебск, 2002).

Распрацоўвае тэму віртуальнай Беларусі, у тым ліку і Гарадоччыны, у трохмерным інтэрнэт-асяроддзі Second Life (http://www.secondbelarus.com). У межах гэтага праекта, з'яўляецца аўтарам сайта, прысвечанага Віцебску (http://www.vitsyebsk.net), а таксама сайта, прысвечанага турбазе «Верасы». Падтрымлівае кантакты з кафедрай беларускай мовы ВДУ, Згуртаваннем беларусаў свету «Бацькаўшчына», рэдакцыяй сайта «Народныя навіны».

Тв.: Сацыяльна-палітычныя ўмовы перад Гарадоцкім паўстаннем і яго ход // Усталяванне савецкай улады і супраціў бальшавікам на Віцебшчыне: Гісторыка-краязнаўчыя чытанні, 29 лістапада 1998 г., Віцебск. — Гарадок, 1999. — С. 13–21; Да пытання аб Веліжскім паўстанні 1918 г. на Гарадоччыне // Віцебскі сшытак. — 2000. — № 4. — С. 195–201; Патэнцыял экалагічнага краязнаўства: Прыродазнаўчы музей, батанічны сад і… могілкі ў інтэрнеце // Краеведение в учебно-воспитательном процессе школ и вузов: сборник материалов республиканской научно-практической конференции, посвящённой 85-летию со дня рождения доцента Ф.В.Зеньковича, 16-17 октября 2003 г. — Брест, 2003. — С. 44–45; Интернетный сайт «Наш край» в экологическом и патриотическом образовании и воспитании // Тамсама. — С. 45–46; Волонтёрская работа по сохранению природы и памятников в Юджине (США) и Витебске (Беларусь) // Материалы II Международного конгресса «Молодёжь XXI века: актуальные проблемы социально-психологического здоровья», 3–6 ноября 2003 г. — Минск, 2003. С. 95–96; Отбор содержания исторической секции экологического сайта «Верасы» // Методология и методика информатизации образования: концепции, программы, технологии: материалы Всероссийской научно-практической конференции 26–28 января 2004 г. — Смоленск, 2004. — С. 218–225.

Артыкулы ў мясцовым друку: Азярышчанскі замак // ПК (Г). — 1988. — № 136. — С. 2; Шануйце зямлю бацькоў // ЧЗ. — 1989. — № 62. — С. 7; Вёскі — наша гісторыя // ПК (Г). — 1989. — № 80. — С. 4; За лёс роднай мовы // ПК (Г). — 1989. — № 97. — С. 2; Ведаць свае карані // ПК (Г). — 1989. — № 121, 125; Найменная кніга гісторыі // ЧП. — 1989. — 16 снеж. — С. 2; Незразумела, крыўдна і страшна // НСл. — 1990. — № 2. — С. 3; Слова пра Скарыну // ПК (Г). — 1990. — № 71. — С. 2; Карані, якія раптам ажылі // ПК (Г). — 1990. — № 81. — С. 2; Надышоў час адраджэння: [беларускі сцяг] // ПК (Г). — 1990. — № 140. — С. 2; Найменная кніга гісторыі: [тапаніміка] // ЧП. — 1990. — № 136. — С. 4; Гарадку — 340 гадоў // ПК (Г). — 1990. — № 154. — С. 3; Гісторыя ў назвах: [Гарадоччына] // ВР. — 1990. — № 186. — С. 4; Водгук стагоддзяў // ЧП. — 1991. — 12 студз. — С. 2; Што кажуць найменні // ГВ. — 1991. — 20 чэрв. — С. 3; Што за белым і чырвоным ? // ГВ. — 1991. — № 75. — С. 2; Бацькаўшчына // ПК (Г). — 1991. — № 83. — С. 2; Est modus in rebus — ёсць мера ў рэчах // НСл. — 1992. — № 14. — С. 2; Як звярнуцца да незнаёмага чалавека?: [нормы этыкету] // ПК (Г). — 1992. — № 5. — С. 2; Як прызнаваліся сімвалы // ГВ. — 1992. — № 11. — С. 1; Каб стала нацыя вучонай // Выбар. — 1993. — № 15. — С. 7; Мы павінны абараніць сябе // Выбар. — 1993. — № 17. — С. 2; Чытайма палітычных апанентаў // Выбар. — 1993. — № 19. — С. 2; Сімвал яднання // Выбар. — 1993. — № 28. — С. 2; Сімвал яднання: [са Сходу беларусаў свету] // ПК (Г). — 1993. — № 33. — С. 1; Белагвардзейскія банды ці народнае паўстанне? // Выбар. 1993. — № 37, 38, 39. — 1994. — № 2, 3; А было ж, было…: [Веліжскае паўстанне і Гарадоччына] // ПК (Г). — 1993. — № 48, 49, 51. — 1994. — № 2, 4, 7, 8; Сумненні наконт узросту горада // ГВ. — 1994. — № 35. — С. 2; 135-годдзе доктара Эсперанта // Выбар. — 1995. — № 1. — С. 8.

Літ.: Гук С. Сустрэнемся на сайце «Верасы» // НС. — 2003. — № 71. — С. 4; Слабін У.К. // Памяць: Гарадоцкі раён: Гісторыка-дакументальная хроніка / укл. С.У. Садоўская. — Мн.: Беларусь, 2004. — С. 715; Слабін У.К.: [электронны рэсурс]; Прыдзвінскі край: гісторыя і сучаснасць // сайт ВАБ. — Рэжым доступу: http://www.lib.vitebsk.net/PRIDVINIE-1/PERSONS/Slabin_UK.htm; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Слабін У.К. (19.04.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**СМАЛЯКОЎ** ГЕОРГІЙ, краязнаўца. Аўтар артыкулаў, прысвечаных гісторыі Копысі, на старонках «Аршанскай газеты».

Тв.: Копысь з глыбінь стагоддзяў // АГ. — 1992. — № 148, 150; Пётр I у Копысі // АГ. — 1993. — № 4. — С. 2; Копысь: Кафляных спраў майстры // АГ. — 1993. — № 5. — С. 2; Копысь: падзеі 1905–1907 г. // АГ. — 1993. — № 21. — С. 3; Копысь: Кастрычнік – лістапад 1917 // АГ. — 1993. — № 127. — С. 2; Копысь: Даваенныя пяцігодкі // АГ. — 1993. — № 132. — С. 3.

**СОБАЛЬ** ІНА (27.02.1989, г. Паставы), краязнаўца. Член краязнаўчага таварыства СШ № 1 г. Пастаў. Брала ўдзел у шэрагу краязнаўчых экспедыцый на тэрыторыі Пастаўскага раёна. Сабрала матэрыял і разам з І. Пракаповічам падрыхтавала кнігу «Мястэчка каля пушчы: Груздава і ваколіцы».

Тв.: (разам з І. Пракаповічам) Мястэчка каля пушчы: Груздава і ваколіцы. — Паставы: Сумежжа, 2005. — 60 с.

**СТАВІЦКІ** МІХАІЛ ТАДЭВУШАВІЧ, педагог. Працаваў настаўнікам ў Друйскай, Іказненскай СШ Браслаўскага раёна, Браслаўскім цэнтры дзіцячай творчасці. Стварыў музейную экспазіцыю ў Друйскай СШ, прысвечаную гісторыі месца. Сабраў звесткі пра георгіеўскіх кавалераў Браслаўшчыны, мастака М. Паўлоўскага. Адзін з арганізатараў даследавання надпісу Барысавага каменя ў Друі. Жыве ў Браславе.

Тв.: Сказание о Браславе // БЗ. — 1998. — 16 снеж. — С. 2; Месца бою 1812 года каля Друі і пахаванні // Павет. — 2008. — № 2 (61). — С. 6.

Літ.: Таямніца Друйскага пісаніка. На шляху да разгадкі // Павет. — 2008. — № 2 (61). — С. 2.



**СТАНКЕВІЧ** ГЕОРГІЙ (1962, Сенненшчына), краязнаўца. Скончыў Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію, факультэт нямецкай мовы БДЛУ (2003). Працаваў на пасадах агранома, старшыні калгаса ў Бешанковіцкім раёне, настаўнікам нямецкай мовы ў в. Старыя Ранчыцы Бешанковіцкага раёна.

Цікавіцца гісторыяй і культурай роднага краю пачаў з дзяцінства. У 1984 г. пераехаў жыць на Бешанковіччыну і пачаў вывучаць Прыдзвінне. Мае актыўную грамадскую пазіцыю. Значным фактарам, які паўплываў на свядомае даследаванне краю, удзел у грамадскім жыцці, стаў рэферэндум 1995 г. Разам з В.І. Гаркун выдаваў незалежную газету «Кардон» (Бешанковічы). Выдае інфармацыйна-культурную газету Бешанковіцкага раёна «Крывінка», у якой друкуюцца матэрыялы на вострыя сацыяльныя тэмы, а таксама краязнаўчага характару (выходзіць два разы на месяц). Выдадзена больш 60 нумароў. Паэт. Аўтар двух зборнікаў вершаў. Большасць вершаў пакладзена на музыку і выконваецца пад гітару.

Тв.: Мая зорка. — Віцебск: Партнёр-друк, 2009. — 100 с.

**СТУКАЛАВА** ВОЛЬГА ЛЕАНІДАЎНА, краязнаўца, музейны работнік. Працавала навуковым супрацоўнікам, загадчыцай музея «Нашы славутыя землякі», які потым стаў Музеем гісторыі і культуры Оршы, бібліятэкі імя А.С. Пушкіна. Аўтар некалькіх артыкулаў па гісторыі Оршы.

Тв.: Іван Батрак — рэдактар і паэт // Аршанскі краязнаўчы зборнік № 2. — Орша: Аршанская друкарня, 1997. — 65 с. — С. 62–64; Іх памятаюць // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 142–147; Ігнацы Іўлевіч // АГ. — 1994. — № 113. — С. 3; Іван Казлоўскі // АГ. — 1997. — № 13. — С. 2.

**СТРУНЧАНКА** АНДРЭЙ АНДРЭЕВІЧ (26.05.1988, в. Мазалава Віцебскага раёна), краязнаўца. Скончыў Мазалаўскую СШ (2006), факультэт народных святаў і абрадаў Віцебскага каледжа культуры і мастацтваў (2010). Працуе ў Мазалаўскім СДК.

Цікавасць да гісторыі роднага краю сфарміравалася пад уздзеяннем наведвання гуртка «Спадчына», якім кіравала настаўніца Мазалаўскай СШ І.М. Выхадцава. Кіраўнік гуртка «Родны край» пры Мазалаўскім СДК Віцебскага раёна. Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Быў у Мазалаве млын // ЖП. — 2008. — 19 лют. — С. 2; Ізбовіцкі гасцінец // ЖП. — 2008. — № 18. — С. 3; Гаючыя крыніцы // ЖП. — 2008. — 24 чэрв. — С. 2; День Дутчино // ЖП. — 2009. — 5 верас. — С. 5.

**СТЭЛЬМАХ** АДАМ КАНСТАНЦІНАВІЧ, былы сакратар Сенненескага падпольнага райкама КПБ(б). Даследаваў гісторыю станаўлення і развіцця партыз. руху на тэрыторыі Сенненскага і Багушэўскага раёнаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.



**СТЭЛЬМАХ** АЛІНА УЛАДЗІМІРАЎНА (4.09.1960, в. Стайск Лепельскага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыла гіст. факультэт МгДПІ (1984). Працавала настаўнікам гісторыі ў Нававалосавіцкай СШ Лепельскага раёна (1984–1987), супрацоўнікам, дырэктарам у Лепельскім раённым краязнаўчым музеі (з 1987).

Вывучэнне роднага краю пачала з пераходам на працу ў музей і пад уплывам беларускага нацыянальнага адраджэння ў канцы 1980-х гг. Займаецца комплексным даследаваннем Лепельшчыны, аддаючы перавагу вывучэнню партыз. руху ў краі, канфесійнага жыцця, гісторыі Лепельскага мінамётнага вучылішча, Бярэзінскай воднай сістэмы. Удзельнік этнаграфічных экспедыцый па Лепельскім раёне. Брала ўдзел у рээкспазіцыі асобных раздзелаў Лепельскага краязнаўчага музея, у падрыхтоўцы шэрагу выстаў. Удзельнічала ў рэспубліканскіх і абласных навукова-практычных канферэнцыях.

Адзін з ініцыятараў, арганізатараў і актыўных удзельнікаў Лепельскіх чытанняў (2004, 2008, 2010). Аўтар вялікай колькасці артыкулаў у кнізе «Памяць»Лепельскага раёна, зборніку

«Святы Казімір у Паазер'і. 400 гадоў каталіцызму ў Лепельскім краі», а таксама на старонках мясцовага перыядычнага друку. Выдала кнігу «Бярэзінская водная сістэма».




Тв.: Кнігі: Святы Казімір у Паазер'і. 400 гадоў каталіцызму ў Лепельскім краі / склад. А. Белы, І. Зямчонак, Л. Ульскі, В. Явід. — Лепель: Lepel, 2004. — 62 с.; Березинская водная система. — Витебск: ВОБ, 2009. — 24 с.

Артыкулы ў кнігах «Памяць» і навуковым друку: Іасафат Пятровіч Агрызка // Памяць: Лепельскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 91–93; Так пачыналася вайна // Тамсама. — С. 181–185; Сцяг 84-га артылерыйскага палка // Тамсама. — С. 188; Лепельскі контрудар // Тамсама. — С. 190–195; Выпускнікі вучылішча: [Лепельскае артылерыйска-мінамётнае вучылішча] // Тамсама. — С. 198; Лепельскае пяхотнае вучылішча // Тамсама. — С. 202–203; «Пасля разгрому фашыстаў сустрэнемся, усё раскажу…» // Тамсама. — С. 258–259; У небе лепельскім // Тамсама. — С. 365–366; Гэты дзень настаў // Тамсама. — С. 367–369; Народная асвета // Тамсама. — С. 573–574; Лепельскі філіял Аршанскага медвучылішча // Тамсама. — С. 577–578; Каб былі здаровы нашы дзеці // Тамсама. — С. 580; На спартыўнай арбіце // Тамсама. — С. 580–581; Мастакі Лепельшчыны // Тамсама. — С. 585–586; Лепельскі краязнаўчы музей // Тамсама. — С. 595–596; О совместных действиях партизанских отрядов и бригад в годы Великой Отечественной войны на территории Лепельского района // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 18–19 чэрвеня 2009 г. / ВДУ; рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. — Віцебск: ВДУ, 2009. — С. 150–157.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Гэты дзень мы набліжалі як маглі: [партыз. рух на Віцебшчыне] // ЛІ. — 1981. — 7 ліп.; У бой уступаюць курсанты // ЛК. — 1994. — № 41. — С. 2; Гісторыя аднаго фотаздымка і трох пісьмаў // ЛК. — 1994. — № 43. — С. 2; Калі б не вайна… // ЛК. — 1994. — № 47. — С. 2; Дзетдом у Весялове // ЛК. — 1996. — № 45. — С. 3; Дзіцячы дом у Лепелі // ЛК. — 1996. — № 56. — С. 4; Яны родам з Лепеля // ЛК. — 1996. — № 75. — С. 4; Па Бярэзінскай сістэме // ЧП. — 1996. — № 54. — С. 2; Святы Казімір у Паазер'і. Новыя Валосавічы раней і цяпер // ЛК. — 1999. — № 6. — С. 2; Цэрквы і касцёлы на Лепельшчыне // ЛК. — 1999. — № 22. — С. 2; Цэрквы і касцёлы на Лепельшчыне ў мінулым // ЛК. — 1999. — № 35. — С. 3; 22 чэрвеня ў чатыры гадзіны сонечнага раўнадзенства // ЛК. — 1999. — № 49. — С. 2; І ў Ірынполлі было падполле // ЛК. — 1999. — № 52. — С. 2; Курсанты мінамётнага вучылішча // ЛК. — 2000. — № 23. — С. 2; Чырвонаармеец І.М. // ЛК. — 2000. — № 51. — С. 2; Адшукаем невядомыя захаванні // Тамсама; Станаўленне краязнаўчага музея // ЛК. — 2000. — № 61. — С. 2; Асвета ў Лепельскім раёне // ЛК. — 2000. — № 66. — С. 2; Лепель і павет у канцы XIX стагоддзя // ЛК. — 2000. — № 69. — С. 4; Лепельшчына ў вайну 1812 года // ЛК. — 2001. — № 53. — С. 3; Канцлагер для ваеннапалонных у Камені // ЛК. — 2001. — № 62. — С. 3; Папаўняюцца музейныя фонды // ЛК. — 2001. — № 94. — С. 3; Бярэзінская водная сістэма // ЛК. — 2001. — № 101, 102. — 2002. — № 4, 11, 16; Помнік архітэктуры: [касцёл Св. Антонія в. Губіна] // ЛК. — 2002. — № 40, 61; Вёска Камень // ЛК. — 2003. — № 31, 33, 35; Як будавалася чыгунка Орша – Лепель // ЛК. — 2003. — № 53. — С. 3; Вёска Пышна // ЛК. — 2003. — № 55, 57; Весялоўскі дзіцячы дом // ЛК. — 2003. — № 86. — С. 2; Этапы станаўлення: [краязнаўства Лепельшчыны] // ЛК. — 2003. — № 89. — С. 3; Калекцыя жывапісу // ЛК. — 2003. — № 104. — С. 2; Апошні прагал воднай сістэмы // ЛК. — 2004. — № 96. — С. 4; Лепельскае гета // ЛК. — 2005. — № 31. — С. 2; Радавы вайны // ЛК. — 2005. — № 32. — С. 2; Плылі плыты… Поплывут ли туристы?: [Бярэзінская водная сістэма] // НС. — 2005. — № 38. — С. 5; Лепель промышленный // ЛК. — 2007. — № 14. — С. 7; Баявыя дзеянні ў 1918–1920-я гг. // ЛК. — 2007. — № 24. — С. 4; Городчевичская церковь // ЛК. — 2007. — № 94. — С. 7.

Літ.: Татаринов Ю. Города Беларуси. Витебщина. — Мн.: Энциклопедикс, 2006. — С. 97; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Стэльмах А.У. (18.06.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**СУДНІК** АЛЯКСАНДР ІВАНАВІЧ (21.08.1967, г. Полацк), краязнаўца, выдавец. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ (1995). Працаваў нам. рэдактара наваполацкай гарадской газеты «Новая газета», рэдактарам аддзела камерцыйнай літаратуры, менеджэрам па рэкламе ТАА МПКП «Дыяна», прыватным прадпрымальнікам (выдавецкая дзейнасць) (з 2000).




Краязнаўствам зацікавіўся ў першыя гады XXI ст. Займаецца выданнем навукова-папулярнай літаратуры краязнаўчага характару. Адзін з заснавальнікаў навукова-папулярнай серыі «Наследие Полоцкой земли» (2004), у якой пачалі выдавацца кнігі, прысвечаныя Полацку: «Иезуиты в Полоцке: 1580–1820 гг.», «Полоцкая земля», «Полоцкая княжна Мария Васильковна — автор «Слова о полку Игореве»: исследования тайнописи» і інш. Выданні — передрук выдадзеных у XIX–XX стст. кніг, артыкулаў, якія не страцілі сваёй навуковай і грамадскай вартасці, аднак па розных прычынах аказаліся маладаступныя для шырокага кола чытачоў. Аўтар (разам з Л. Данько) уступных артыкулаў, якія папярэднічаюць працам.

Адзін з арганізатараў краязнаўчых чытанняў «Наследие Полоцкой земли» (2007, 2008, 2009). Адзін з заснавальнікаў і гал. рэдактар «Полоцкого книжного издательства». Падтрымлівае цесныя сувязі з ПДУ, НПГКМЗ.

Тв.: Иезуиты в Полоцке: 1580–1820 гг.: в 2 ч. / сост., примеч. и вступ. ст. Л.Ф. Данько, А.И. Судник. — Полоцк: А.И. Судник, 2005. — Ч. 1. — 40 с; — Ч. 2. — 48 с.; Визитная карточка Полоцкого района. — Полоцк: А.И. Судник, 2005. — 24 с.; Путеводитель по городу Полоцку 1910 года: К торжеству перенесения мощей преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой, из г. Киева в г. Полоцк / сост., примеч. и вступ. ст. Л.Ф. Данько, А.И. Судник. — Полоцк: А.И. Судник, 2006. — 48 с.; Полоцкая земля / Л.В. Алексеев; вступ. ст. Л.Ф. Данько, А.И. Судник. — Полоцк: А.И. Судник, 2007. — 50 с.; Полоцкая княжна Мария Васильковна — автор «Слова о полку Игореве»: Исследования тайнописи / вступ. ст. Л.Ф. Данько, А.И. Судник. — Полоцк: А.И. Судник, 2008. — 53 с.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Суднік А.І. (16.06.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**СУЛЕЦКАЯ** НІНА АНДРЭЕЎНА (28.04.1950, Віцебск), музейны работнік, спецыяліст па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, краязнаўца. Скончыла вышэйшую камсамольскую школу (1976). Працавала ў Віцебскім абласным камітэце ЛКСМБ (1976–1979), дырэктарам ВАКМ (1979–1989), нам. старшыні Віцебскага абласнога савета БДТАПГіК (1989–1992), гал. спецыялістам па пытаннях аховы гісторыка-культурніцкай спадчыны і музеяў (1992–2010). З прыходам на пасаду дырэктара ВАКМ стала аднім з арганізатараў краязнаўчых даследаванняў у гэтай установе. Спрычынілася да стварэння экспазіцыі Музея П.М. Машэрава ў ВДУ, Музея прыватных калекцый, сядзібы І. Рэпіна ў Здраўнёве. З’яўлялася арганізатарам 1-й Віцебскай абласной краязнаўчай канферэнцыі, на якой было створана Віцебскае абласное краязнаўчае таварыства (1989). Прымала ўдзел у арганізацыі ўсіх канферэнцый БТАПГіК. Член прэзідыума Віцебскага абласнога аддзялення БДТАПГіК, член Віцебскай абласной рады ТБМ.

Даследуе гісторыю і культуру Віцебшчыны, займаецца ўвекавечаннем імёнаў гіст. асобаў, лёс якіх быў звязаны з Віцебшчынай, і вядомых землякоў.

Аўтар буклетаў «П. Машэраў», «Адраджэнне». Мае артыкулы па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны і практычных прапановах па яе захаванню ў рэспубліканскім («Звязда», «Культура», «ЛіМ») і мясцовым («Віцебскі рабочы», «Віцебскі кур’ер», «Старажыл») перыядычным друку.

Тв.: Віцебскі абласны краязнаўчы музей // ЭЛіМБ. — Мн.: БелСЭ, 1985. — Т. 2. — С. 650–651.

Літ.: Пастернак Т. Нина Сулецкая: «Исторический центр нуждается в реконструкции» // НС. — 1996. — № 48. — С. 3; Буткевич С. Нина Сулецкая: «Уважение к прошлому спасет мир» // ВР. — 2005. — № 28. — С. 5; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Сулецкая Н.А. (23.06.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.




**СУПРАНОВІЧ** АНДРЭЙ МІХАЙЛАВІЧ (11.11.1964, Полацк), мецэнат. Скончыў СШ № 7 г. Полацка (1982), Даўгаўпілскае вышэйшае ваенна-авіяцыйнае інжынернае вучылішча ім. Я. Фабрыцыуса (1987). Разам з А.І. Суднікам з’яўляецца заснавальнікам і кіраўніком навукова-папулярнай серыі «Наследие Полоцкой земли». Адзін з арганізатараў краязнаўчых чытанняў «Наследие Полоцкой земли» (2007, 2008, 2009). Адзін з заснавальнікаў і дырэктар «Полоцкого книжного издательства». Выдаткоўвае сродкі на выданне гэтай серыі, каштоўныя прызы для школьных краязнаўчых канферэнцый. На свае грошы паставіў у Полацку помнік герою руска-японскай вайны, гадаванцу Полацкага кадэцкага корпуса – генералу Р.І. Кандраценку.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Супрановіч А.М. (1.06.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**СУХАРУКАЎ** АЛЯКСЕЙ ВАСІЛЬЕВІЧ (14.09.1959, в. Шмані Гарадоцкага раёна Віцебскай вобл.), музейны работнік, краязнаўца. Скончыў гіст. факультэт БДУ (1986). Працаваў выкладчыкам гісторыі ў ПТВ № 162 г. Івацэвічы Брэсцкай вобл. (1986–1989), загадчыкам Музея-сядзібы І.Я. Рэпіна (з 1989). Краязнаўчымі даследаваннямі пачаў займацца пад час вучобы ва ўніверсітэце. Вывучае гісторыка-культурную спадчыну рэгіёна. Непасрэдна займаўся стварэннем Музея-сядзібы І.Я. Рэпіна «Здраўнёва». З 1994 г. з’яўляецца арганізатарам і ўдзельнікам канферэнцый, звязаных з гісторыяй і культурай краю. Аўтар артыкулаў у навуковым і мясцовым перыядычным друку.



Тв.: (разам з В.А. Шышанавым) Музей-сядзіба І.Я. Рэпіна «Здраўнёва» // ЭГБ: у 6 т. Т. 6. Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 2001. — С. 174; (разам з В.А. Шышанавым) Музей-сядзіба Ілы Рэпіна «Здраўнёва» // БЭ: у 18 т. Т. 14. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 19; (разам з В.А. Шышанавым) К истории создания Музея-усадьбы И.Е. Репина «Здравнёво» // Тезисы докладов и сообщений на конференции «Духовный мир России в творчестве И.Е.Репина». К 150-летию со дня рождения художника. — М.: ГТГ, 1994. — С. 65–67; (разам з В.А. Шышанавым) Музей-сядзіба І.Я. Рэпіна «Здраўнёва» як цэнтр развіцця беларуска-рускіх культурных сувязяў // Нацыянальныя меншасці Беларусі. — Кн. 3. — Брэст; Мінск, 1996. — С. 18–19; Гартаючы старонкі мінулага // ПК (Г). — 1986. — № 102. — С. 2–3.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Сухарукаў А.В. (7.07.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**СЦЕПАНЕНКА** МІКАЛАЙ ІВАНАВІЧ (8.06.1946, г. Віцебск), краязнаўца. Дацэнт (1992). Скончыў СШ № 15 (цяпер гімназія № 1) г. Віцебска (1964), ВДМІ (1970), клінічную ардынатуру па інфекцыйных хваробах пры ВДМІ (1970–1972). Працаваў сакратаром ЛКСМБ у ВДМІ (1970–1976), адначасова асістэнтам на кафедры інфекцыйных хваробаў, галоўным урачом віцебскай гарадской інфекцыйнай бальніцы (1976–1983), інструктарам у аддзеле прапаганды і агітацыі Віцебскага аблвыканкама (1983–1985), дзе курыраваў пытанні аховы здароўя, фізкультуры і спорту, начальнікам упраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама (1985–1990), першым нам. міністра аховы здароўя (1990–1994), прарэктарам па лячэбнай рабоце ВДМУ (1994–1997), нам. главы адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Віцебска (1997–2000), начальнікам аддзела па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Віцебскага аблвыканкама (2000–2008). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР і РБ 12 склікання (1990–1996)



Вывучае гісторыю медыцыны, рэлігіі на Віцебшчыне, а таксама жыццё і дзейнасць вядомых землякоў і асоб, якія звязалі свой лёс з Віцебшчынай. Даследаваць гэтыя пытанні пачаў у межах выканання службовых абавязкаў. Стаў адным з найлепшых знаўцаў. У 2005 г. на аснове практычных матэрыялаў і сабранай інфармацыі выдаў кнігу «Религии и неокультовые организации на Витебщине».




З часам на аддзел былі ўскладзены абавязкі па працы з суайчыннікамі за мяжой (раней былі ў кампетэнцыі МЗС РБ). Шляхам аналізу энцыклапедычнай літаратуры, кніг «Памяць», артыкулаў у перыядычным друку, ліставання сабраў значную колькасць інфармацыі пра віцяблян-эмігрантаў. На аснове гэтых матэрыялаў разам з М.П. Кузьмічом падрыхтаваў і выдаў кнігу «Нашы землякі ў далёкім і блізкім замежжы» (2007), у якой змешчана інфармацыя пра больш як 500 асоб, якія нарадзіліся на Віцебшчыне, але па розных абставінах з’ехалі за межы радзімы, дзе дасягнулі значных поспехаў у розных галінах навукі, культуры, на адміністрацыйных і дзяржаўных пасадах. Даведнік выклікаў шырокі рэзананс у рэспубліканскім друку, рыхтуецца 2-е выданне, дапоўненае і выпраўленае.

Разам з сынам Ю.М. Сцепаненкам сабраў значны матэрыял пра ўрачоў, якія працавалі на Віцебшчыне, і выдаў у форме біяграфічнага даведніка «Гордость здравоохранения Витебщины» (2009). Выступаў арганізатарам і актыўным удзельнікам навуковых канферэнцый

па гісторыі медыцыны, міжнацыянальных адносін. Некаторыя матэрыялы перадаў у ВАБ, ВДМУ, епархіяльную бібліятэку.

Адыграў значную ролю ў аднаўленні эканамічных і палітычных сувязяў Беларусі ў 1990–1994 гг., асабліва — забеспячэнні медыцынскімі прэпаратамі і абсталяваннем.

Аўтар больш 60 друкаваных работ. Узнагароджаны Ганаровай граматай ВС БССР (1974), знакам «Отличник здравоохранения БССР» (1986), ордэнам Рускай праваслаўнай царквы «Серафіма Сароўскага» (2002), ордэнам Беларускай праваслаўнай царквы «Еўфрасінні Полацкай»(2006), падзякай Прэзідэнта РБ (2006).

Тв.: Религии и неокультовые организации на Витебщине. — Витебск: ВОБ, 2005; (разам з М.П. Кузьмічом) Нашы землякі ў далёкім і блізкім замежжы: біяграфічны даведнік. — Віцебск: ВАБ, 2007. — 208 с.; (разам з Ю.М. Сцепаненкам) Гордость здравоохранения Витебщины: биографический справочник. — Витебск: ВОТ, 2009. — 212 с.

Літ.: Інтэрв'ю з М.І. Сцепаненкам (5.06.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**СЦЯПАНАВА** (Танана) АЛЕНА, журналіст. Вучылася ў БУК. Працуе на радыё «Свабода». Цікавасць да гісторыі і культуры роднага краю сфарміравалася пад уплывам падзей нацыянальнага адраджэння кан. 1980-х – пач. 1990-х. гг. Брала актыўны ўдзел у працы аршанскага клуба аматараў гісторыі і старажытнасцяў «Повязь». Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Леў Сямёнавіч Выгоцкі // АГ. — 1992. — № 7. — С. 2; Тапанімія Аршанчышы // АГ. — 1993. — № 94. — С. 3; Паэты Куцеінскай школы // АГ. — 1993. — № 103. — С. 3; «Орша самая лепшая»: [Орша і У. Караткевіч] // АГ. — 1997. — № 138. — С. 3.

**СЦЯПАНАЎ** ВІКТАР МІХАЙЛАВІЧ (13.02.1962, г. Орша), краязнаўца. Скончыў СШ № 14 г. Оршы (1979), МДПІЗМ (1985), гіст. факультэт БДУ (завочна). Працаваў выкладчыкам замежных моў у школах г. Оршы і раёна, навуковым супрацоўнікам у Музеі гісторыі і культуры Аршаншчыны, дырэктарам Музея драўлянай скульптуры С.С. Шаўрова, дырэктарам музея «Нашы славутыя землякі», перакладчыкам на аршанскай ЦЭЦ, журналістам у перыядычных выданнях г. Віцебска.

Даследуе жыццё і дзейнасць У. Караткевіча і сацыяльна-эканамічнае развіццё Оршы ў перыяд сярэднявечча. Браў актыўны ўдзел у грамадскім і навуковым жыцці горада. Удзельнічаў у археалагічных раскопках на тэрыторыі Куцеінскага манастыра, мерапрыемствах па кансервацыі Святадухаўскай царквы. Адзін з удзельнікаў аб'яднання краязнаўцаў Оршы «Повязь».

На пачатку 1990-х гадоў пачаў актыўна публікаваць у мясцовым друку артыкулы, прысвечаныя гісторыі краю, удзельнічаць у краязнаўчых канферэнцыях. У зборнік «Аршанская мінуўшчына» ўвайшлі артыкулы: «Пра сімволіку герба 1620 года», «Царква Св. Міколы», «Пачатак тэатра і музыкі ў Оршы», «Аршанскія дзяржаўцы і старасты», «Войты і самакіраванне», «Казацтва на Аршаншчыне», «Повязь часоў». Сааўтар некалькіх артыкулаў у кнігах «Памяць» Оршы і Аршанскага раёна. Укладальнік і адзін з аўтараў «Аршанскага краязнаўчага зборніка», у якім змешчаны артыкулы, што чыталіся на 1-й і 2-й Аршанскіх краязнаўчых канферэнцыях.

Тв.: Аршанскі краязнаўчы зборнік / уклад. В. Сцяпанаў. — Орша: Аршан. друкарня, 1995. — 48 с.; Узнікненне Аршанскага праваслаўнага брацтва // Тамсама. — С. 27–30; Пра сімволіку герба 1620 года // Аршанская мінуўшчына. — Орша, 1997. — С. 53–56; Царква Св. Міколы // Тамсама. — С. 78–79; Пачатак тэатра і музыкі ў Оршы // Тамсама. — С. 79–80; Аршанскія дзяржаўцы і старасты. Войты і самакіраванне // Тамсама. — С. 80–85; Казацтва на Аршаншчыне // Тамсама. — С. 95–97; Повязь часоў // Тамсама. — С. 105–107; (разам з В.Л. Насевічам, І.А. Яршовым) У складзе Рэчы Паспалітай // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 66–72; Аршанскія дзяржаўцы і старасты // Тамсама. — С. 79–80; Кальвінізм у Оршы // Тамсама. — С. 99–100; (разам з В.П. Лютынскім, Л.Д. Радомскай, Л.В. Яршовай, І.А. Яршовым) У складзе Расійскай імперыі // Тамсама. — С. 109–122; Культура // Тамсама. — С. 203–207; Паэты куцеінскай школы // Тамсама. — С. 88–90.

Артыкулы ў перыядычным друку: Гербы Оршы // ЛП. — 1989. — № 167. — С. 3; Другі аршанскі герб // АГ. — 1991. — № 22. — С. 3; Насельніцтва Оршы ў розныя часы // АГ. — 1991. — № 34. — С. 3; Нацыянальныя меншасці на Аршаншчыне // АГ. — 1992. — № 6. — С. 3; Пра сімволіку герба 1620 г. // АГ. — 1992. — № 56. — С. 3; Дарога з рабства свая ў кожнага народа // АГ. — 1992. — № 109. — С. 2; Царква Св. Міколы // АГ. — 1992. — № 115. — С. 3; Новае пра сімволіку герба // АГ. — 1992. — № 124. — С. 2; Пачатак тэатра і музыкі ў Оршы // АГ. — 1992. — № 154. — С. 4; Аршанскія дзяржаўцы і старасты // АГ. — 1993. — № 5. — С. 4; Кальвінізм у Оршы // АГ. — 1993. — № 31. — С. 31. — С. 4; Казацтва на Аршаншчыне // АГ. — 1993. — № 53. — С. 2; Эпізод невядомай вайны: [Паўночная вайна на Аршаншчыне] // АГ. — 1993. — № 65. — С. 3; Войты і самакіраванне // АГ. — 1993. — № 80. — С. 2; Зерне беларушчыны: [В.І. Саўліч і беларусізацыя] // АГ. — 1994. — № 138. — С. 3; Повязь часоў // АГ. — 1994. — № 141. — С. 3; Шматканфесійная Аршаншчына // АГ. — 1994. — № 145. — С. 3; «Ехалі казакі…»: [беларускія казакі] // Выбар. — 1995. — № 2. — С. 3.

Літ.: Дзмітрыева В. Нашы славутыя землякі // АГ. — 1996. — № 75. — С. 2; Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 25.

**СЫРАМАХА** ПАВЕЛ ЯКАЎЛЕВІЧ, былы камандзір партыз. брыгады імя Жукава. Аўтар артыкулаў па гісторыі партыз. руху на Браслаўшчыне. Разам з П.Р. Казлоўскім напісаў кнігу «Пусть знают и помнят потомки. Браславщина в 1941–1944 гг.».

Тв.: (разам з П. Казлоўскім) Пусть знают и помнят потомки: Браславщина в 1941–1944 гг. — Мн., 1994; (разам з П. Казлоўскім) В краю голубых озер // Из истории партизанского движения в Белоруссии, 1941–1944 гг.: сборник воспоминаний. — Мн., 1961. — С. 418–427; З успамінаў П. Я. Сырамахі // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Браслаўскага раёна. — Мн., 1998. — С. 335–336; Партызаны Браслаўшчыны // БЗ. — 1989. — № 23. — С. 3.

Літ.: Пошукі і знаходкі школьных краязнаўцаў // Павет. — 2005. — № 6 (43), кастрычнік. — С. 8.



**СЫРЦОВА** (Ходусева) ГАННА ВАСІЛЬЕЎНА (27.11.1931, саўгас «Пацёмкіна» Пачынкаўскага раёна Смаленскай вобл., РСФСР), гісторык, архівіст. Скончыла Бахоцкую СШ Смаленскай вобл. (1950), МДГАІ (1955). Працавала ў ДАВВ, на пасадах нам. начальніка архіва, ст. навуковага супрацоўніка, начальніка аддзела фондаў Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва, начальніка аддзела фондаў, уліку і навукова-даведачнага апарату (1955–1987). З 1978 г. — дырэктар.

Пакінула значны след у гісторыі архіўнай справы на Віцебшчыне. Правяла вялікую работу па забеспячэнні захаванасці дакументаў, удасканаленні навукова-даведачнага апарату архіва, склала інструкцыю па перападрыхтоўцы вопісаў і каталагізацыі дакументаў, правядзенні экспертызы каштоўнасці аб'ядналых архіўных фондаў раённага падпарадкавання. З'яўлялася ўкладальнікам і членам рэдакцыйнай калегіі даведніка «Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. і яго філіял у Полацку (1917–1941 гг.)». Удзельнічала ў рабоце па выяўленні дакументаў і іх археаграфічнай апрацоўцы для зборнікаў «Индустриализация Белорусской ССР» (1975), «Коллективизация сельского хозяйства Белорусской ССР» (Т. 1–4, 1973, 1976, 1980, 1985), «Развитие социалистического соревнования в БССР (1919–1941)» (1980), «Народное образование в БССР» (1979, 1980).

На аснове выяўленых дакументаў падрыхтавала артыкулы, 40 радыё- і тэлеперадач, у т. л. «Да 120-годдзя Віцебскага архіва старажытных актаў», «Першамай 1920-га», «Першыя дэманстрацыі на Віцебшчыне», «З гісторыі піянерскага руху на Віцебшчыне», «З гераічнага мінулага савецкай міліцыі», «Аб зверствах нямецкіх акупантаў» і інш.

Узнагароджана медалямі «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», «Ветэран працы», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Тв.: Першамай 1920-га // ВР. — 1959. — 1 мая; (разам з Г. Мярзловай) Первая конференция женщин колхозниц Витебщины // ВР. — 1960. — 8 сак.; У першыя гады калектывізацыі // ЛПр. — 1960. — 13 верас. — С. 1; З гісторыі калектыўных сельскіх гаспадарак на Талачыншчыне // Ленінец (Талачынскі раён). — 1961. — 1 мая. — С. 4; (разам з Г. Мярзловай) З гісторыі калектывізацыі Бешанковіцкага раёна // Зара. — 1961. — 14 чэрв. — С. 2; (разам з Е.І. Кавалёвай) Странички истории // ВР. — 1962. — 12 чэрв.; (разам з М.Л. Байновай) Яны был першымі: Першыя піянерскія арганізацыі // ВР. — 1962. — 25 ліп. — С. 3; (разам з Е. Кадаевай) Гэта было ў 1919 // ВР. — 1962. — 12 ліп. — С. 2.

Літ.: ДАВВ. Ф. 389, воп. 1-к, спр. 151 (Асабовая справа Г. В. Сырцовай); Шарендо В.В. Сырцова Г.В. // Витебщина архивная: история, фонды, персоналии, сер. XIX–XX вв. — Мн.: БелНДІДАС, 2002. — С. 186; Архівісты Беларусі: біябібліяграфічны даведнік / склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. — Мн.: БелНДІДАС, 2006. — С. 200.



**СЯДЫХ** ІГАР АНАТОЛЬЕВІЧ, архівіст. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ. Служыць у органах дзяржаўнай бяспекі РБ (з 1976). Працуе начальнікам архіўнага сектара Упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі (УКДБ) Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобл. На аснове дакументаў архіва УКДБ даследуе некаторыя пытанні гісторыі Віцебшчыны, у тым ліку гісторыю органаў дзяржбяспекі, рэлігійных арганізацый, праблемы палітычных рэпрэсій 1920–1970-х гг. Аўтар больш 20 публікацый у мясцовым перыядычным друку, якія раскрываюць асобныя старонкі гісторыі патрыятычнага падполля ў Віцебску, паслява-

еннай барацьбы органаў дзяржбяспекі з бандытызмам, пошуку ваенных злачынцаў і асоб, якія супрацоўнічалі з фашыстамі.

Тв.: Документы архива Управления Комитета государственной безопасности Республики Беларуси по Витебской области как источник изучения края // Витебщина архивная в начале XXI века: связь времен. — Витебск: ВОТ, 2006. — С. 69–70; Витебское подполье в документах немецкой контрразведки // НС. — 2005.
Літ.: Витебщина архивная в начале XX I века: связь времен. — Витебск: ВОТ, 2006. — С. 69.

**СЯКОЦКІ** ВАЛЯНЦІН БРАНІСЛАВАВІЧ, краязнаўца. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў на заводзе «Чырвоны барацьбіт» г. Оршы, кіраўніком прадпрыемства ацяпляльных катлоў (цяпер АТ «Орша»), старшынёй калгаса імя Фрунзе Дубровенскага раёна, начальнікам цэха на заводзе «Чырвоны барацьбіт». Арганізаваў Музей гісторыі завода.

Літ.: Козырава В. Стваральнік музея // АГ. — 2000. — № 95. — С. 2.



**СЯРГЕЕНКА** НАТАЛЛЯ АЛЕГАЎНА (15.03.1963, г. Полацк), краязнаўца. Скончыла СШ № 7 г. Полацка (1980), гіст. факультэт ГДУ (1988). Працавала на заводзе шкловалакна (1980–1983), настаўнікам гісторыі ў в. Камаровічы Гомельскага раёна (1988–1990), СШ № 1 (вячэрняй) г. Полацка (1991–1993), Краязнаўчым музеі г. Полацка (1999–2007), Доміку Пятра І (2008), у Цэнтры пазашкольнага выхавання (з 2008). Жыве ў г. Полацку.

Вывучаць гісторыю краю пачала пад час вучобы ва ўніверсітэце. Значны ўплыў аказалі выкладчыкі Валянцін Аляксандравіч Міхедзька, Алег Макушнікаў, Алесь Бяляцкі. Важную ролю ў станаўленні зацікаўленасці і фарміравання методыкі краязнаўчай працы аказала музейная практыка пад кіраўніцтвам З. Пазняка, якая праходзіла ў музейных установах Мінска і Гродна.

Вывучае канфесіянальнае жыццё Полаччыны ў 1920-я гг., даследуе лёсы краязнаўцаў 20-х гадоў XX ст., сучасную архітэктуру г. Полацка. Брала актыўны ўдзел у распрацоўцы экспазіцыі краязнаўчага музея г. Полацка «Полацк у міжваенны час 1917–1941 гг.», распрацавала канцэпцыю, тэматыка-экспазіцыйны план рээкспазіцыі залы «Полацк у XVI–XVIII стст.» (2005), метадычную тэму «Полацк у міжваенны час». Брала ўдзел у стварэнні музея «Школа будаўніцтва» ў ГПТУ № 66 г. Полацка (2007–2008).

Актыўна ўдзельнічае ў міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных навуковых канферэнцыях (Бранск, Віцебск, Полацк, Наваполацк), на якіх выступае з паведамленнямі на рэгіянальную тэматыку (з 2001). Брала ўдзел у І і ІІ гарадскіх краязнаўчых чытаннях «Наследие Полоцкой земли» (2007, 2008). Падтрымлівае стасункі з грамадскімі арганізацыямі (ТБМ), вядзе гурток «Юны экскурсавод» пры гарадскім аддзеле народнай адукацыі. Аўтар шэрагу артыкулаў у навуковым і перыядычным друку краіны і замежжа. Адзін з заснавальнікаў серыі «Наследие Полоцкой земли».

Тв.: Артыкулы ў зборніках матэрыялаў канферэнцый: Фарміраванне, дзейнасць і структура дзяржаўных органаў савецкай улады ў Полацку ў 20–30-я гг. XX ст. // Нацыянальны полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы ў 2000 г.), люты 2001 г. — Полацк, 2001. — С. 83–86; Грамадска-палітычныя арганізацыі Полацка ў 80–90-х гг. XX ст. // Нацыянальны полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы ў 2001 г.), 27–28 лютага 2002 г. — Полацк, 2002. — С. 65–67; Люстрацыя паезуіцкіх маёнткаў 1774 года // Нацыянальны полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы ў 2002 г.), 27–28 лютага 2003 г. — Полацк, 2003. — С. 50–59; Аперацыя «Баевік»: Мерапрыемствы па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей і ліквідацыі культу мошчаў на Полаччыне напачатку 20-х гадоў 20-га ст. // Нацыянальны полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы ў 2003 г.), люты 2004 г. — Полацк, 2004. — С. 58–63; Аперацыя «Баевік»: Мерапрыемствы па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей і ліквідацыі культу мошчаў на Полаччыне напачатку 20-х гадоў 20-га ст. // Проблемы славяноведения: сборник научных статей и материалов. Вып. 6. — Брянск: БГУ, 2004. — С. 187–191; Установы культуры ў Полацку на пачатку 20-х гадоў XX ст. // Нацыянальны полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы ў 2004 г.), люты 2005 г. — Полацк, 2005. — С. 79–93; Полоцкая люстрация поиезуитских владений // Иезуиты в Полоцке 1580–1820 гг. Ч. 2. — Полацк, 2005. — С. 16–18; «З кагорты выдатных полацкіх краязнаўцаў» // Полоцк глазами школьника: исследовательские работы учеников школ города // Наследие Ф.Скорины. — Полоцк, 2006. — С. 114–120; Дэйніс Пятро Язэпавіч — выдатны полацкі краязнаўца // Нацыянальны полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы ў 2005 г.), люты 2006 г. — Полацк, 2006. — С. 68–80;

Мошчы святога Андрэя Баболі ў Полацку // Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі. Да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея / уклад. В.Д. Краско. — Полацк: НПГКМЗ, 2008. — С. 189–197; Люстрацыя паезуіцкіх маёнткаў 1774 года — каштоўная малавядомая крыніца па гісторыі Полаччыны другой паловы XVIII ст. // История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур: Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности: материалы Международной научно-теоретической конференции, Витебск, 29–31 октября 2003 г. / ВГУ; редкол.: В.А. Космач [и др.]. — Витебск, 2003. — С. 108–109; Рукапіс «Люстрацыя полацкая паезуіцкіх маёнткаў, у архіў ясна асвечанага князя, ягамосці Радзівіла, маршалка генеральнай канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага. С. D.»: навуковае вывучэнне, прадстаўленне ў экспазіцыі // Музейные коллекции. Состояние и перспективы развития»: материалы научной конференции, 21–22 января 2006. IX выпуск. — Могилев, 2007. — С. 100–108; Сначала было слово, зовущее к любви и взаимопониманию // Вестник Белнефтехима. — 2008. — 5. — С. 70–71; История развития краеведения в межвоенное время в экспозиции Полоцкого краеведческого музея // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею: матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 30–31 кастрычніка 2008 г. / рэдкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. — Мінск: Медысонт, 2009. — С. 204–214.

Артыкулы ў перыядычным друку: Открылась выставка «Полоцк-Фридрихсхафен: 10 лет дружбы и сотрудничества // Трудовая смена. — 2000. — № 21. — С. 2; 10-годдзю сяброўскіх сувязяў прысвячаецца // ПВ. — 2000. — № 44. — С. 2; История одной находки // Трудовая смена. — 2001. — № 1; «Franciscus Luce de Ploczko»: [Францыск сын Лукі з Полацка] // ПВ. — 2003. — № 87. — С. 3; Яркие примеры отзывчивости полочан // ПВ. — 2003. — № 88. — С. 3; Старажытны рукапіс у фондах музея // ПВ. — 2004. — № 172–173. — С. 6; Улюбёны ў Полацкую даўніну: [І. Дэйніс, фота] // ПВ. — 2005. — № 3–4. — С. 7; У далёкіх дваццатых // ПВ. — 2005. — № 153–154. — С. 4; Суя, природная жемчужина // Трудовая смена. — 2005. — № 39. — С. 3; Пятро Дэйніс, або Як пачэсна і цяжка быць лідэрам мясцовых краязнаўцаў // КГ. — 2006. — № 38, кастрычнік. — С. 3, 6; Каменная летопись города // ПВ. — 2007. — № 85. — С. 7; Сабля шляхтича стала раритетным музейным экспонатом // НС. — 2008. — № 13. — С. 5; Сабля // Информ плюс. — 2008. — № 6. — С. 4; Полочанин в душе // Информ плюс. — 2008. — № 13. — С. 3; Полоцкий проект Владимира Короля // ПВ. — 2008. — № 26. — С. 4; Директор первой советской школы: [І.П. Дэйніс] // ИП. — 2008. — № 33. — С. 9; Мастера каменной летописи // ИП. — 2008. — 26 июня. — С. 5; С севера на юг по волнам Двины // ИП. — 2008. — № 27. — С. 4; Есть улицы старинные // ИП. — 2008. — № 30. — С. 5; «Из варяг в греки»: По пути предков река несла на волнах жизнь// НС. — 2008. — № 86. — С. 4.

Літ.: Трапезникова Л. День в музее // Беларускі час. — 2007. — № 25. — С. 22–29; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Сяргеенка Н.А. (31.07.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Спіс публікацый Н.А. Сяргеенка: [электронны рэсурс] // Тамсама.

**СЯРОЖКІН** АЛЕСЬ АЛЯКСАНДРАВІЧ (17.08.1957, г. Касцюковічы Магілёўскай вобл.), краязнаўца, калекцыянер. Скончыў 8 класаў у СШ № 2 г. Касцюковічы Магілёўскай вобл. (1972), ГПТВ № 4 у г. Санкт-Петербург (1974) па спецыяльнасці сталяр-чырвонадрэўшчык, філал. факультэт ВДПІ па спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура» (1991). Працаваў на Поўначы, вярнуўся ў Оршу ў 1981 г., працуе цесляром рэстаўрацыйнага ўчастка ў г. Оршы.



Даследуе гісторыю Оршы і ваколіцаў. Ініцыятар і стваральнік у Оршы клуба аматараў гісторыі і старажытнасцяў «Повязь» (лета 1986). Разам з членамі таварыства браў удзел у археалагічных раскопках у Оршы, рэстаўрацыі Куцеінскага манастыра, на кансервацыі Святадухаўскай царквы. Ладзіў талокі па добраўпарадкаванні помнікаў гісторыі і культуры ў в. Смаляны, Браздзетчына. Прычыніўся да арганізацыі шэрагу фотавыстаў пра старажытнасці Аршаншчыны. Мае хатні архіў з матэрыялаў, якія маюць дачыненне да гісторыі Оршы.

Заснавальнік, рэдактар і выдавец газеты «Беларускі калекцыянер», якая выдавалася ў Оршы у 1990-я гг., дзе змяшчаліся артыкулы краязнаўчага характару. Асаблівую ўвагу надае тэме антысавецкага руху на Аршаншчыне.

Тв.: Знаходкі рэстаўратараў // АГ. — 1997. — № 16. — С. 3; Помнікі архітэктуры: Праблемы захавання і рэстаўрацыі // АГ. — 2002. — № 46. — С. 2.

Літ.: Шынкевіч А.М. «Повязь» — пара станаўлення // ЛП. — 1987. — № 5. — С. 4; Карлюкевіч А. Беларускі калекцыянер: [Орша] // ВР. — 1993. — № 55. — С. 4; Паўловіч В. Не толькі калекцыянерам // АГ. — 2000. — № 26. — С. 2; Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 24; Каляндар знамянальных і памятных дат на 2006 г. — ВАБ, 2006. — С. 10.

Т**АБОЛА** САФІЯ, журналіст. Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку, у якіх асвятляе гісторыю і культуру Глыбоччыны.

Тв.: Легенда пра цыган // ВГ. — 2000. — № 15–16. — С. 4; Хто ўратуе возера? // Тамсама; Марыля // ВГ. — 2000. — № 17–18. — С. 7; Краязнаўцы збіраліся ў Германавічах // ВГ. — 2001. — № 2. — С. 3; Садам Сікоры — квітнець! // ВГ. — 2001. — № 7–8. — С. 4–7.

**ТАЛЯРОНАК** СЯРГЕЙ ВІКТАРАВІЧ (1964), гісторык. Супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР, кандыдат гіст. навук. Аўтар артыкулаў, прысвечаных гісторыі і культуры Докшыччыны.

Тв.: Кандрась з-пад Докшыц // ЛТ. — 1990. — № 24. — С. 3; Не скарыліся Напалеону // ЛТ. — 1990. — № 123. — С. 3; Гэта было ў Бірулях // ЛТ. — 1990. — № 129. — С. 3; Докшыцы ў вайне 1812 года // ЛТ. — 1992. — № 12. — С. 2, 4, (разам з С. Спірыдонавым) Уладары Докшыц у XVI ст. // РВ. — 1996. — № 52. — С. 2.

**ТАМАШЭВІЧ** НАТАЛЛЯ ЛЕАНІДАЎНА, педагог. Стварыла музей у СШ в. УзмёныМіёрскага раёна.

Тв.: На канферэнцыі // СП (М). — 1995. — № 32. — С. 2.
Літ.: Шык Л. Покліч сэрца // МН. — 2007. — № 9. — С. 2.

**ТАНЧЭЎСКАЯ** АЛА САМУІЛАЎНА (*А. Кавалёва*) (3.03.1941, в. Васькаўшчына Аршанскага раёна), журналіст. Скончыла СШ № 10 г. Оршы (1957), факультэт журналістыкі БДУ (1965). Працавала на радыё, на розных пасадах ў газеце «Ленінскі прызыў» (цяпер «Аршанская газета», 1965–2000), аршанскім рэдактарам «Незалежнай газеты» (2000–2004).

Гісторыяй роднага краю зацікавілася ў 1980-х гг. на хвалі нацыянальнага адраджэння. Брала актыўны ўдзел у працы клуба аматараў гісторыі і даўніны «Повязь», які ўтварыўся ў Оршы ў 1986 г. На старонках аршанскай раённай газеты асвятляла дзейнасць аб’яднання, пісала артыкулы, прысвечаныя помнікам даўніны, падзеям гісторыі на Аршаншчыне. Даследавала свой радавод і лёсы славутых землякоў. Аказала пэўны ўплыў на фарміраванне цікавасці да гісторыі краю некаторых вядомых у будучым аршанскіх краязнаўцаў: Ю. Копціка, А. Сцяпанавай (Танана) і інш. Узначальвала літаратурнае аб’яднанне «Дняпроўскія галасы».

Тв.: Шматгадовая праца: [рэцэнзія на кнігу «Аршанская даўніна»] // АГ. — 1992. — № 26. — С. 3; Арэхаўск і яго царква // АГ. — 1993. — № 23, 24, 26; Аршаншчына напярэдадні калектывізацыі // АГ. — 1994. — № 80. — С. 3; Гісторыя ў імя будучага: [5 гадоў Музею гісторыі і культуры Оршы] // АГ. — 1997. — № 145. — С. 2.
Літ.: Інтэрв’ю з А.С. Танчэўскай (20.09.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ТАРАСАЎ** СЯРГЕЙ ВАСІЛЬЕВІЧ (20.01.1961, г. Мінск), археолаг, гісторык. Кандыдат гіст. навук (1992). Скончыў гіст. факультэт МДПІ (1982). Працаваў у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі (з 1982), адначасова нам. гал. рэдактара літаратурна-драматычных перадач Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі (1995–1999). Дацэнт кафедры гуманітарных навук Інстытута парламентарызма і прадпрымальніцтва (з 2006). Член Саюза беларускіх пісьменнікаў, праўлення Беларускага камітэта ІАМОС, праўлення БДТАПГіК.

Даследуе гісторыю і археалагічныя помнікі Полацка і Полацкай зямлі. Праводзіў археалагічныя раскопкі Полацка (з 1986), абараніў кандыдацкую дысертацыю «Гісторыка-тапаграфічная структура Полацка IX–XVII стст.» (1992, навуковы кіраўнік Г.В. Штыхаў). Аўтар манаграфіі «Полацк IX–XVII стст.», напісанай на аснове гэтага даследавання, навукова-папулярнай кнігі «Чарадзей сёмага веку Траяна», прысвечанай князю Усяславу Брачыславічу.

Актыўна прапагандуе гістарычную спадчыну Беларусі, у тым ліку і Віцебшчыны, у СМІ. Аўтар сцэнарыяў дакументальных і мастацкіх фільмаў пра гісторыю Полаччыны. Выступаў вядоўцам перадач «Вецер вандраванняў», «Крок», «Скарбы беларускай гісторыі», «Беларускі дом» (1995), якія прысвечаны асобным пытанням гісторыі і культуры Беларусі, і Віцебшчыны ў прыватнасці.

Тв.: Полацк IX–XVII ст.: Гісторыя і тапаграфія. — Мн.: Бел. навука, 1998. — 183 с.; Отчет о раскопках в Полоцке в 1986 г. // АІГНАНБ, спр. 953; Отчет о раскопках в Полоцке и Полоцкой округе в 1987 г. // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі, спр. 1014; Отчет о раскопках в Полоцке в 1988 г. // Тамсама, спр. 1084; Отчет о раскопках в Полоцке в 1989 г. // Тамсама, спр. 1165; Справаздача аб археалагічных доследах у По-

лацку і полацкай акрузе ў 1990 г. // Тамсама, спр. 1205; Хрышчэнне Полацкай зямлі // Спадчына. — 1990. — № 3. — С. 44–46; Полацкае княства: Станаўленне і барацьба за дзяржаўную незалежнасць // Старонкі гісторыі Беларусі. — Мн., 1992; Полацкая зямля // БД. — 1992. — № 3; Полацкая зямля — выток беларускай дзяржаўнасці // Беларусь у Вялікім княстве Літоўскім. — Мн., 1992.

Літ.: Гаспадар «Беларускага дома // БМ. — 1999 — №. — С. 60; Тарасаў С.В. // ЭГБ. Т. 6. Кн. 2. — С. 440; Корзенко Г.В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник. — Мн.: Бел. наука, 2007. — С. 382.




**ТАРЫКАЎ** АЛЕГ АРКАДЗЕВІЧ (9.04.1938, в. Мікулічы на Глыбоччыне – 15.01.1996), краязнаўца. Скончыў СШ № 2 г. Глыбокае (1954), Глыбоцкае вучылішча механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі № 12 (1957). Працаваў у г. Кустанай (Казахстан), адкуль быў прызваны на службу ў СА. Пасля дэмабілізацыі скончыў энергафак Беларускага політэхнічнага інстытута (1965). Працаваў у г. Гомелі на заводзе «Гідрапрывад» (1965–1975), у НДІ у г. Мінске (1975–1982), на мэблевай фабрыцы ў г. Маладзечне (1982).

Займаўся вывучэннем роднага краю. Працаваў у архівах Віцебскай вобл., Вільнюса, Ленінграда, збіраў матэрыялы па гісторыі і культуры Глыбоччыны. Некаторыя артыкулы друкаваў у рэспубліканскім і мясцовым друку. Запісаў і літаратурна апрацаваў успаміны камандзіра атрада «Северные» П.Н. Максіменка, якая была выдадзена ў выдавецтве «Беларусь» у 1989 г.

На аснове сабраных матэрыялаў пра Глыбокае напісаў кнігу «Зарницы в глубинах озер». У сааўтарстве напісаў некалькі артыкулаў для кнігі «Памяць» Глыбоцкага раёна. Склаў і запісаў радавод сваёй сям'і (з XVIII стагоддзя). Аўтар вершаў і баек.

Тв.: Зарницы в глубинах озер. — Мн.: Полымя, 1993. — 151 с.; (разам з І.У. Бунто, А.П. Кур'яновіч) Старонка мінулага // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 31–39; (разам з П.К. Башко, А.П. Кур'яновіч, А.М. Сідарэвіч) Час барацьбы і выпрабаванняў // Тамсама. — С. 111–116; (разам з П.В. Галай, А.П. Кур'яновіч) У складзе польскай дзяржавы // Тамсама. — С. 131–139; (разам з І.І. Волкавым, А.В. Раманавым, Ф. Семуровым, П.А. Хомчанка, С.М. Шабалоўскім) Ішла вайна свяшчэнная // Тамсама. — С. 175–190.

Літ.: Даследчык, патрыёт краю // ВГл. — 1996. — № 8. — С. 2; Тарыкаў А.А.: [электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://hlybokaje.narod.ru/index.files/bio.htm. Дата доступу: 9.10. 2005.

**ТАТАРЫНАЎ** ЮРЫ АРКАДЗЕВІЧ. Аўтар некалькіх кніг, у якіх звяртаецца да гісторыі і культуры Віцебшчыны. У кнізе «Путешествие в Сарью» сярод іншага апісаў гісторыю і культуру мястэчак Заходняй Віцебшчыны (Лынтупы, Камаі, Паставы, Відзы, Опса. Творы ў асноўным маюць кампілятыўны характар, у іх выкарыстаны матэрыялы перыядычнага рэспубліканскага і мясцовага друку, інфармацыя, «любезно предоставленная» мясцовымі краязнаўцамі.

Тв.: По некоторым замечательным уголкам Белоруссии. — Мн., 1995; Путешествие в Сарью: Белорусская старина. — Мн.: Минсктиппрект, 1999. — 192 с.; Города Белоруссии: Витебщина в некоторых интересных исторических сведениях. — Мн.: Энциклопедикс, 2006. — 208 с.



**ТКАЧОЎ** МІХАСЬ (Міхаіл) АЛЯКСАНДРАВІЧ (10.03.1942, г. Мсціслаў – 31.10.1992), археолаг, гісторык-медыявіст, грамадскі дзеяч. Доктар гіст. навук (1987), прафесар (1989). Скончыў БДУ (1966). Працаваў настаўнікам у г. Жодзіне, Інстытуце гісторыі АН БССР (1968–1978), ГрДУ (1978–1989), выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя». Вывучаў ваенную гісторыю Беларусі, абарончае дойлідства, матэрыяльную культуру і архітэктуру гарадоў Беларусі X–XVIII стст. Неаднаразова праводзіў археалагічныя раскопкі ў г. Віцебску і на Віцебшчыне.

Тв.: Оборонительные сооружения городищ Северной Белоруссии дофеодальной поры // Тез. докл. к конф. по археологии Белоруссии. — Мн., 1969; Новае пра Сафійскі сабор: [Полацк] // ПГіКБ. — 1972. — № 2; Исследования в Гродненской и Витебской областях // АО 1972 г. М., 1973; Полезный путеводитель: [рэц. на кн.: Алексеев Л.В. По Западной Двине и Днепру в Белоруссии] // Сельская газета. — 1974. — 19 сак.; (разам з А.Л. Каралёвым) Работы Днепро-Двинского отряда // АО-1977. — М., 1978; Раскопки в Витебске // АО-1977. — М., 1978; (разам з Л. Калядзінскім) Касметыка ў старажытным Віцебску // Служба быту Беларусі. — 1982. — № 5; (разам

з Л. Калядзінскім) Итоги археологического изучения Витебска в 1976–1980 гг. // Древнерусское государство и славяне: материалы симпозиума, посвящ. 1500-летию Киева. — Мн., 1983; (разам з Л. Калядзінскім) Рыбалоўства ў старажытным Віцебску // РП. — 1983. — № 2; (разам з Л. Калядзінскім) Строительная техника и строительные материалы средневекового Витебска // Проблемы изучения древнего домостроительства в VIII–XIV вв. в северо-западной части СССР. — Рига, 1983; (разам з Л. Калядзінскім) Твор дробнай пластыкі XV–XVI стст. з Віцебска // Мастацтва Беларусі. — 1983. — № 6; (разам з Л. Калядзінскім, Т. Скрыпчанка) Віцебскія бранзалеты: [археал. знаходкі] // ПГіКБ. — 1984. — № 4; (разам з Т. Бубенькай, Л. Калядзінскім) Даследаванні працягваюцца: [па матэрыялах археал. раскопак у Віцебску] // ВР. — 1984. — 11 жніўня; (разам з Л. Калядзінскім) Лясны промысел у старажытным Віцебску // РП. — 1984. — № 4; (разам з Л. Калядзінскім) Постройки древнего Витебска XII–XVII вв. // Древнерусский город. — Киев, 1984; (разам з Л. Калядзінскім) Раскопкі на Верхнім замку: |Віцебск] // ПГіКБ. — 1984. — № 1; (разам з Л. Калядзінскім) Драўляныя вырабы і дрэваапрацоўка ў сярэдневяковым Віцебску // Помнікі культуры: Новыя адкрыцці. — Мн. 1985; (разам з Т.С. Бубенькай) Раскопки оборонительной башни в Витебске // АО-1984. — М., 1986; (разам з Л.У. Калядзінскім, Т.С. Бубенькай) Средневековый Витебск // Труды V международного конгресса славян. археологии. — М., 1987. — Т. 3. — Вып. 1б; (разам з Т.С. Бубенькай) Да пытання аб каменных умацаваннях Дольнага замка Віцебска // Гісторыка-археалагічны зборнік. — Мн., 1993. — Ч. 2. — С. 153–161.

Літ.: Знаходкі беларускіх археолагаў: [гутарка з начальнікам Віцеб. археал. экспедыцыі Ін-та гісторыі АН БССР М.А.Ткачовым] / запісаў С. Шаірка // ВР. — 1978. — 2 верас.; Ткачоў М.А. // ЭГБ. — Т. 6. Кн. 1. — С. 515; Чарняўскі М.М. Ткачоў М.А. // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя / БелЭн; рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. — Мн.: БелЭн, 1993. — С. 611.



**ТОРБІНА** (Вільчык) ІРЫНА ФЁДАРАЎНА (11.04.1956, в. Пышна Лепельскага раёна Віцебскай вобл), журналіст. Скончыла Лепельскую СШ № 2 (1973), філал. факультэт БДУ (1978). Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў Стражавіцкай БШ Чашніцкага раёна, СШ № 2, № 4 г. Чашнікі (1978–1999), рэдактарам аддзела грамадска-палітычнага жыцця Чашніцкай раённай газеты «Чырвоны прамень» (з 1999).

Цікавіцца гісторыяй роднага краю пачала, калі стала працаваць у школе. Значны ўплыў на фарміраванне зацікаўленасці да мінуўшчыны аказалі бацька Ф.А. Вільчык, а таксама класны кіраўнік, настаўніца гісторыі Лепельскай СШ № 2 Е.А. Рыўкіна.

Аўтар шэрагу артыкулаў, у якіх асвятляе пытанні гісторыі і культуры рэгіёна, гісторыю Чашніцкага раёна ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Асабліва цікавіцца лёсамі славутых землякоў, цікавых людзей, выхадцаў з Чашніччыны, напрыклад, бацькі нобелеўскага лаўрэата Жарэса Алфёрава Івана Карпавіча Алфёрава, былога генеральнага дырэктара «Аўтаваза» В. Вільчыка, акадэміка АН СССР Б. Даўгаплоска, вядомых майстроў, артыстаў і інш. Некаторыя матэрыялы перадала ў раённы гістарычны музей, бібліятэкі.

Тв.: Очарованная мелодией родного слова: [членкар НАН Беларусі Ю.Ф. Мацкевіч] // ЧП. — 2001. — № 56. — С. 2; Между Алфером и Алферовым только воля писаря: [сваякі Ж. Алфёрава на Чашніччыне] // ЧП. — 2001. — № 64. — С. 2; Чашніцкія Курапаты: [могілкі, растрэл пленных немцаў у 1944 г.] // ЧП. — 2001. — № 90. — С. 2; Родословная Мележей продолжается в Новолукомле // ЧП. — 2002. — № 5. — С. 2, 4; Черейский отшельник: [мастак-ілюстратар В.В. Прапаршчык] // ЧП. — 2002. — № 15. — С. 2; Что могут интеллектуалы-провинциалы: [І. Шайкоўскі] // ЧП. — 2002. — № 38. — С. 2; В Подрезах жил свой Страдивари: [В.М. Падрэз] // ЧП. — 2002. — № 100. — С. 3; Махно из Краснолукских лесов: [1918] // ЧП. — 2003. — № 33–34. — С. 4; О чем рассказало название улицы: [П.І. Анучын] // ЧП. — 2003. — № 38. — С. 3; О чем рассказали забытые могилы?: [1942] // ЧП. — 2003. — № 65. — С. 3, 4; О чем грустят ульские волны? // ЧП. — 2003. — № 80. — С. 2, 3; Из Иванска в Оренбург на тракторе: [П.М. Пясецкая] // ЧП. — 2004. — № 70–71. — С. 4; Икона от императрицы: [падарунак Марыі Аляксандраўны, жонкі Аляксандра II, Лукомлю] // ЧП. — 2004. — № 143–144. — С. 3, 8; Легендарная быль из 42-го: [забойства партызанамі бургамістра 1.05.1942] // ЧП. — 2005. — № 27. — С. 3; Черный ворон коснулся крылом: [рэпрэсіі] // ЧП. — 2005. — № 67–68. — С. 4; Быть ли музею под открытым небом: [турызм на Чашніччыне] // ЧП. — 2005. — № 75. — С. 2; Хранительница музейных реликвий: [Л.Г. Касцянка] // ЧП. — 2005. — № 121–122. — С. 2; Доктор из династии Романовых // ЧП. — 2007. — № 50–51. — С. 3; Под сенью ковельского леса // ЧП. — 2007. — № 77–78. — С. 2, 3; Как по Урицкого выйти к замку? // ЧП. — 2007. — № 108. — С. 5; Народный артист с Чашниччины: [А.Л. Ткачонак] // ЧП. — 2007. — № 146–147. — С. 5; Вожаком избрали в 41-м // ЧП. — 2008. — 16 жніўня. — С. 5; Флаг для Чашник и Новолукомля: [мастак В.В. Караблін] // ЧП. — 2008. — № 122. — С. 1; Там, где счастья в соснах заблудилось: [народны майстар Г. Асіпкова] // Алеся. — 2008. — № 12; Фотографии с особой энергетикой: [Каралёў Г., фотамастак] // Родная прырода. — 2009. — № 6.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Торбіна І.Ф. (13.03.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ТРАПЕЗНІКАВА** ЯЎГЕНІЯ АНАТОЛЬЕЎНА (снежань 1931), педагог, краязнаўца. Скончыла Кастрамскі педінстытут (1953). Працавала настаўнікам у школах РСФСР, сакратаром райкама камсамола, загадчыкам дзіцячага садка № 6, настаўніцай рускай мовы і літаратуры СШ № 2 г. Наваполацка (з 1968). У сярэдзіне 1960-х гг. пераехала на Беларусь. Стала арганізатарам школьнага Музея баявой славы. На яго аснове стварыла ў сваім класе атрад Чырвоных следапытаў «РВС» («Разведчики воинской славы»), які пазней быў ператвораны ў пошукавы клуб. Асноўнымі кірункамі дзейнасці аб'яднання сталі добраўпарадкаванне і дагляд воінскіх магілак, правядзене даследаванняў на месцах баёў, устанаўленне асобаў воінаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, дапамога і падтрыманне адносін з ветэранамі, удзел у Вахтах Памяці, выданне школьнай штомесячнай газеты «Следопыт».

Да найбольш важных вынікаў працы пошукавага клуба можна аднесці наступныя: усталявалі мемарыяльную дошку (1969) ў в. Рубанава Полацкага раёна на месцы партызанскай пераправы, узвялі помнік на брацкай магіле ў в. Грышына Расонскага раёна (1975) і вызначылі імёны 170 загінуўшых савецкіх салдат 28-й стралковай дывізіі. Членамі клуба вызначана 7 месцаў гібелі самалётаў. Устанавілі прозвішчы лётчыкаў, якія загінулі на самалёце ІЛ-2 (1983), узвялі на месці гібелі экіпажа ў г. Наваполацку памятны знак (1985). Усяго дзякуючы даследчай працы ўсталяваны чатыры помнікі, а ў Полацкім раёне — 4 мемарыяльныя дошкі і 3 помнікі.

Арганізатар і каардынатар грамадскай дзейнасці па пошуку загінуўшых салдат Вялікай Айчыннай вайны. На працягу шэрагу гадоў вядзецца вялізная перапіска з ветэранамі 6-й гвардзейскай і 4-й ударнай армій, партызанамі брыгады «Неуловимые», са сваякамі загінуўшых воінаў.

Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку, кнігі «Мы ищем на земле ровесников следы», у якой змешчаны нарысы па гісторыі і дзейнасці «РВС», сцэнары патрыятычных мерапрыемстваў.

Тв.: Кнігі: Мы ищем на земле ровесников следы… — Полоцк: А.И. Судник, 2008. — 171 с.

Артыкулы ў перыядычным друку: Памяць ці беспамяцтва // ПВ. — 1993. — № 8. — С. 2; Узнагародай будзе памяць // ПВ. — 1995. — № 32. — С. 2; Мы ищем на земле ровесников следы // Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны: матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі / ВДУ, ВАКМ; рэдкал.: В.У. Акуневіч [і інш.]. Віцебск, 2004. — С. 132–136; Застаецца добры след: [Вахта Памяці 1996] // ДнП. — 1996. — № 63. — С. 2.

Літ.: Бруева Л. Поисковому клубу — 25 лет: [РВС] // НС. — 1996. — № 16. — С. 5; Черноок С. Учитель — профессия не из легких?: [Я.А. Трапезнікава, «РВС»] // ИП. — 2001. — № 41. — С. 3.

**ТРАФІМАЎ** АНАТОЛЬ ІВАНАВІЧ, аматар даўніны. Займаецца геральдыкай, генеалогіяй, гербазнаўствам, сфрагістыкай. Даследуе гісторыю і культуру Полаччыны.

Тв.: Эмблематический комментарий к отдельным эпизодам биографии Франциска Скорины // Западная Двина. Литературно-публицистический журнал. — 2008. — № 1 (13). — С. 119–130.

**ТРАЦЦЯК** ІНА, краязнаўца, архівіст. Працуе ў Занальным дзяржархіве ў г. Полацку. Аўтар шэрагу артыкулаў па гісторыі і культуры Полаччыны, Верхнядзвіншчыны, Чашніччыны ў мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Народная асвета ў Полацкай акрузе, 1917–1941 гг. // СК. — 1989. — № 85. — С. 3; Сорак гадоў назад: [сельская гаспадарка Чашніччыны] // ЧП. — 1991. — № 52. — С. 2; Валынецкі раён, 20-я гады // ДзП. — 1995. — № 86. — С. 2; І ўсё гэта — толькі на Асвейшчыне // ДзП. — 1995. — № 80. — С. 2; Глыбокія карані: [мытня] // ДзП. — 1996. — № 97. — С. 2; Архітэктурныя помнікі Полацка // ПВ. — 1997. — № 54. — С. 2; Поў века таму назад // ПВ. — 1997. — № 76. — С. 3; Архівы Полаччыны // ПВ. — 1997. — № 100–102; З гісторыі Дрысеншчыны: [1900–1930] // ДзП. — 1998. — № 54. — С. 2; З гісторыі Бігосаўшчыны // ДзП. — 1999. — № 84. — С. 2; Дрыса ў сярэдзіне 20-х гадоў // ДзП. — 2000. — № 1. — С. 2; Дрысеншчына 50 год назад // ДзП. — 2000. — № 87, 88; Занальны дзяржаўны архіў у Полацку // ПВ. — 2000. — № 86. — С. 3; Полацкаму краязнаўчаму музею — 75 // ПВ. — 2001. — № 39. — С. 2; Полацкаму лясному тэхнікуму сёлета спаўняецца 80 год // ПВ. — 2001. — № 84. — С. 2; Дрысенскі аддзел адукацыі. Пачатак // ДзП. — 2002. — № 3, 4; Памятныя даты ў жыцці нашага горада // ПВ. — 2002. — № 27. — С. 2; Странички истории: [Занальны архіў у Полацку] // ПВ. — 2003. — № 109. — С. 3; Память остается // ПВ. — 2004. — № 55–56; Так гаспадарылі нашы продкі // ДзП. — 2004. — № 93. — С. 2; Документальная память времени: [Полацкі архіў] // ПВ. — 2005. — № 165–166. — С. 4; Як ствараліся нашы бібліятэкі // ДзП. — 2007. — № 59. — С. 2; Из истории родного края: [Ушаччына ў 1920-я гг.] // П. — 2007. — № 88. — С. 2.

**ТРУСАВА** (Лісава) АЛЕНА РЫГОРАЎНА (21.07.1960, г. Віцебск), архівіст, педагог. Скончыла СШ № 1 г. Віцебска (1977), МДГАІ (1980). Працавала на розных пасадах у ДАВВ (1977–1978 і 1980–1998). З 1986 г. — загадчыца аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў, з 1993 — нам. дырэктара ДАВВ. Кіравала камісіяй па стварэнні зборніка дакументаў «Мастацкае жыццё Віцебшчыны 1918–1924 гг.». Аўтар шэрагу артыкулаў для энцыклапедычных выданняў, кнігі «Памяць» г. Віцебска, у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку, перадач на віцебскай студыі тэлебачання і радыё.

Тв.: Артыкулы ў энцыклапедыях і даведніках: Давидовка, Еремино, Журжево, Мишково, Себяхи, Соколовка, Тирасполь, Улановичи // Витебск: энциклопедический словарь. — Мн.: БелСЭ, 1988; Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. // ЭГБ. Т. 3. — Мн.: БелЭн., 1996. — С. 224; Падліпскі Аркадзь Міхайлавіч // ЭГБ. Т. 5. — Мн.: БелЭн., 1999. — С. 373; Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т. 6. — Мн.: БелЭн, 1998. — С. 151.

Артыкулы ў кнігах і зборніках канферэнцый: Хранится в архиве // Материалы Первого Международного Шагаловского пленэра. — Витебск, 1994; Витебская художественная школа в архивных документах // Зборнік выступленняў на навуковай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю Віцебскай мастацкай школы. — Наваполацк: Наваполацкая друкарня, 1997. — С. 75–78; Гісторыя знішчэння Мікалаеўскага сабора ў Віцебску // Віцебскі сшытак. — 1995. — №1. — С. 20–25; Марк Шагал — в документах Государственного архива Витебской области // Шагаловский сборник: материалы 1–5 Шагаловских дней в Витебске (1991–1995). — Витебск, 1996. — С. 216–220; Реплика по поводу автобиографического мифотворчества М.М. Бахтина // Диалог. Карнавал. Хронотоп. — 1996. — № 3. — С. 161–166; Невычарпальная крыніца: [ДАВВ] // БМ. — 1997. — № 6. — С. 13–16; (разам з А.Г. Лісавым) На пути к созданию «Нового завета мира»: Тезисы двух непопулярных лекций Казимира Малевича // Диалог. Карнавал. Хронотоп. — 1998. — № 1. — С. 66–80; Деятельность общественных организаций по оказанию помощи детям г.Витебска, 20–30-е гг. XX в. // Беларусь и Европа: Взаимодействие культур: материалы международной научно-практической конференции. — Витебск, 2000. — С.244–245; (разам з Г.М. Каданавай) Канфесійная палітыка савецкай улады ў Віцебску // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка г. Віцебска. Кн.1. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 269–271; Традиционные и новые формы музыкальной жизни Витебска рубежа 1910–20-х гг. // Славянский мир и славянские культуры в Европе и мире: материалы международной научно-теоретической конференции. — Ч. 2. — Витебск, 2002. — С. 157–159; (разам з А.К. Галубовіч) К 200-летию образования Витебской губернии // Витебщина архивная: История, фонды, персоналии, сер. XIX–XX вв. — Мн.: БелНДІДАС, 2002. — 213 с. — С. 113–118; (разам з А.Г. Лісавым) Уполномоченный по музыкальным делам: незавершенный биографический очерк об А.О. Цшохере // Малевич. Классический авангард. Витебск: сб. ст. Вып. 6. — Витебск, 2003. — С. 85–118; (разам з А.Г. Лісавым) Два письма по поводу организации Витебской народной консерватории // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. — 2006. — № 9. — С. 121–126; Два письма по поводу организации Витебской народной консерватории. К 85-летию создания учебного заведения // Малевич. Классический авангард. Витебск. Вып. 9. — Мн.: Эконом-пресс, 2007. — С. 130–139.

Артыкулы ў перыядычным друку: Камітэты беднаты // ЛП. — 1988. — № 141. — С. 2; Рэўкомы ў Віцебскім павеце // ЛП. — 1989. — № 148. — С. 2; Рэўкомы ў Сенненскім павеце // ЛІ. — 1992. — № 149. — С. 2; Витебская биржа труда: 70 лет назад // ВК. — 1990. — № 30. — С. 5; Был ли корниловский мятеж в Витебске // ВК. — 1991. — 26 студз.; Как работали «друзья детей» // ВК. — 1991. — № 22. — С. 6; Витебский театр революционной сатиры // ВК. — 1991. — 8 чэрв.; З архіўных фондаў // ВР. — 1991. — 20 чэрв.; Гэта забыць нельга // ЛІ. — 1991. — 20 чэрв.; Гэта забыць нельга // ПК (Г). — 1991. — 23 чэрв.; (разам з М.В. Пішчулёнкам) Крыніца вопыту і ведаў // ВР. — 1991. — 20 чэрв.; Посетить Витебск — ненужное занятие: [пра гастролі Л. Уцёсава ў Віцебску] // ВК. — 1991. — 6 ліп.; Из истории БГТ-2 // ВК. — 1991. — 15 ліст.; Худрука уволили большевики // ВК. — 1991. — 22 ліст.; Аптеки и НЭП // ВК. — 1991. — 22 ліст.; Красные свадьбы // ВК. — 1991. — 6 снеж.; Праздников было… // ВК. — 1992. — 16 студз.; Мама рада, пап рад — сократили аппарат // ВК. — 1992. — 9 крас.; Хранится в архиве // Віцьбічы. — 1992. — 3–5 чэрв.; Ломбард: [1920-я гг., Віцебск] // ВК. — 1992. — № 40. — С. 5; (разам з Г. Каданавай) На алтарь большевистского идола: [царква] // ВК. — 1992. — № 12, 13.; Так гэта было // СП (Л). — 1994. — 26 снеж.; Сколько нас? // НС. — 1998. — 10 студз. — С. 2; Театральные реликвии // НС. — 1998. — 15 студз.



**ТРУТКО** РЫГОР ЯГОРАВІЧ (18.03.1912, г. Дуброўна – зіма 2001), краязнаўца, педагог. Скончыў 4 класы, рабфак сувязі, гіст. факультэт ВДПІ (1941). Працаваў пастухом, на лесанарыхтоўках у Карэліі (1929), пісьманосцам у Дуброўна, на ваенным радыёвузле ў Віцебску. У гады Другой сусветнай вайны быў у партыз. атрадзе «Кастрычнік» 2-й Заслонаўскай брыгады. Пасля вайны працаваў дырэктарам СШ № 5 г. Оршы (1944–1946), настаўнікам гісторыі ў школе Оршы № 8 (1944–1972).

Пасля вайны зацікавіўся нумізматыкай, пачаў збіраць манеты. Перадаў навукоўцам Інстытута гісторыі АН БССР манетны скарб, знойдзены ў Задняпроўі (1966). Адным з першых у Оршы пачаў ставіць перад уладамі і грамадскасцю пытанне пра захаванне гісторыка-культурнай спадчыны горада. Апублікаваў артыкул «Зберагчы помнікі старажытнасці» (1956), у якіх заклікаў да аховы культавых пабудоў Оршы: царквы Раства Багародзіцы, Пакроўскага і Куцеінскага Богаяўленскага манастыроў, касцёлаў. Падымаў пытанне пра стварэнне ў горадзе краязнаўчага музея.

Арганізаваў і ўзначаліў ініцыятыўную групу па яго стварэнні (1958), збор і захаванне экспанатаў. Аднак музей так і не быў адчынены, а большасць з сабраных рэчаў перададзены ў музеі Мінска. Пасля адкрыцця Музея гісторыі і культуры Оршы перадаў туды рэдкія кнігі, фотаздымкі, прадметы матэрыяльнай і нематэрыяльнай культуры, сярод інш. — зуб мамантa.

Найбольш плённым унёскам у краязнаўства Аршаншчыны асабіста сам лічыў далучэнне школьнікаў да краязнаўчай працы. Працуючы ў школе, пачаў праводзіць турыстычна-краязнаўчыя паходы па родным краі, а таксама па былых рэспубліках СССР. На аснове сабраных у час вандровак рэчаў быў створаны музей СШ № 8 г. Оршы, экспанаты якога пазней былі перададзены ў Музей гісторыі і культуры горада Оршы і некаторыя мінскія музеі. Шэраг вучняў Р.Я. Трутко на прыкладзе настаўніка зацікавіліся краязнаўствам і цяпер працягваюць даследаваць родны край. Сярод іх выкладчык аршанскага педкаледжа І. Яршоў і загадчык аддзела школьнага краязнаўства ЦДЮТЭ Р. Шарай. Выхаваў сямёра дзяцей.

Літ.: Каліноўскі П. Сумная гісторыя краязнаўчых музеяў: [БССР, Р. Трутко] // РП. — 1991. — № 11. — С. 28–29; Лютынскі В. Старэйшы краязнаўца // АГ. — 1996. — № 64. — С. 3; Лютынскі В. Вандруйце па родным краі // АГ. — 1999. — № 79. — С. 2; Лютынскі В. 88 год — таксама круглая дата: [Р. Трутко] // АГ. — 2000. — 11 крас.; Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 26; Герадот // ТЭ. — 2007. — № 17. — С. 6.

**ТУМАРКІН** ВЯЧАСЛАЎ ЛЬВОВІЧ (1930, м. Ляды Дубровенскага раёна), мемуарыст. У кнігах «Это было не во сне», «Голос убитых молчать не дает» апісвае падзеі 1941–1942 гг. на Дубровеншчыне, знішчэнне яўрэйскага насельніцтва ў м. Ляды і Прыдняпроўі. Матэрыялы кніг публікаваліся ў мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Кнігі: Это было не во сне. — [Б. м.], 2005.
Артыкулы ў перыядычным друку: «Голас забітых маўчаць не дае» // ДнП. — 2007. — № 82. — С. 6–7.
Літ.: Чапялова Л. Чалавек справы, або Россып шчодрасці і высакароднасці // ДнП. — 2007. — 17 кастр. — С. 2.



**ТУХТА** ВАЛЕРЫЙ УЛАДЗІМІРАВІЧ (*Валерый Чарэцкі*) (3.12.1976, г. Лепель), краязнаўца. Скончыў гіст. факультэт МгДУ (2003). Працаваў настаўнікам гісторыі і геаграфіі ў Велеўшчынскай БШ (1996–2007), Слабадской СШ Лепельскага раёна (з 2007).

Зацікавіўся гісторыяй роднага краю пад уплывам аповедаў пра мінулае дзеда Паўла Маляўкі. Больш сур'ёзна пачаў вывучаць мясцовасць з 1998 г., працуючы ў Велеўшчынскай школе. У 2000 г. стварыў гісторыка-краязнаўчы гурток «Нашчадкі». На фарміраванне цікавасці да роднага краю пэўны ўплыў аказаў лепельскі краязнаўца У.К Шушкевіч.

Даследуе помнікі археалогіі, культавыя дахрысціянскія мясціны, дзейнасць партызанскай брыгады «Чэкіст» у 1942–1943 гг. на тэрыторыі Лепельскага раёна. Займаецца зборам легенд і паданняў роднага краю, пошукам невядомых археалагічных помнікаў і няўлічаных ваенных пахаванняў. Правёў разведкі больш за 20 археалагічных помнікаў на тэрыторыі раёна, 14 уведзены ў навуковы зварот. Вядзе пошук няўлічаных воінскіх пахаванняў часоў Другой сусветнай вайны на тэрыторыі Слабодскага с/с (2003–2007). Устанавіў 7 такіх месцаў. На аснове сабраных звестак 52-м Асобным спецыялізаваным пошукавым батальёнам МА РБ былі эксгуміраваны парэшткі 21 чалавек, устаноўлена 1 імя, праведзены перапахаванні ў в. Велеўшчына (2003), г. Лепелі (2005, 2007).

Аказвае дапамогу супрацоўнікам Інстытута гісторыі НАН Беларусі ў выяўленні і даследаванні помнікаў археалогіі на тэрыторыі Лепельскага раёна (з 2002 г.). Ладзіць вандроўкі разам з аднадумцамі і членамі гуртка «Нашчадкі». Актыўна падтрымлівае сувязі з Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, ЛКМ, «Студэнцкім этнаграфічным таварыствам» (г. Мінск), ПДУ і інш. установамі, арганізацыямі, а таксама аматарамі роднага краю.

Браў удзел у стварэнні археалагічнай экспазіцыі Лепельскага краязнаўчага музея (2001–2008), выставы «Знакі воінскай адметнасці» (2004). Падрыхтаваў экспазіцыю, прысвечаную падзеям 1941–1944 гг. на тэрыторыі Лепельшчыны ў Слабадской СШ (2009). Удзельнічае ў абласных, рэспубліканскіх краязнаўчых канферэнцыях, у тым ліку ў Лепельскіх чытаннях (2004, 2006, 2008). Мае каля 80 артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў «Настаўніцкай газеце», раённай газеце «Лепельскі край». Некаторыя паданні, запісаныя ў час палявых даследаванняў, апублікаваны ў зборніках «Легенды і паданні Віцебшчыны», «Легенды і

паданні Лепельшчыны». Падрыхтаваў да друку кнігу «Дзе Байна сустракаецца з Эсай», якая павінна выйсці ў 2011 г.

Узнагароджаны юбілейным медалём «60 лет Победы в Великой Отечественной войне 1941–1945» (2005).

Тв.: Адкуль паходзіць Окана, Складаем тапанімічны слоўнік краю // Легенды і паданні Віцебшчыны: зборнік матэрыялаў абласнога конкурса «Легенды і паданні роднага краю»: [саматуж. выд.] / склад. Н. Зайцава. — Віцебск, 2002. — С. 25, 103–104;

Артыкулы ў перыядычным друку: Сцежкамі прашчураў // ЛК. — 2000. — № 54. — С. 4; Гісторыя аднаго захавання // ЛК. — 2000. — № 72. — С. 4; Ляснымі сцяжынкамі, палявымі дарогамі // ЛК. — 2000. — № 87. — С. 4; Сумнае вяселле: легенды і паданні роднага краю // ЛК. — 2000. — № 101. — С. 4; Пад шатамі стромкіх соснаў // ЛК. — 2000. — № 102. — С. 2; Адкуль паходзіць Окана // ЛК. — 2001. — № 5. — С. 2; Складаем тапанімічны слоўнік краю // ЛК. — 2001. — 30 студз. — С. 2; Дзед Аляксей і яго вёска // ЛК. — 2001. — № 21. — С. 2; Повязь пакаленняў // ЛК. — 2001. — 20 крас. — С. 2; Была. Ёсць. Будзе!: З гісторыі Чэрскай школы // ЛК. — 2001. — № 32. — С. 2; Дзе пяюць салаўі ў кустах лазы // ЛК. — 2001. — № 38. — С. 3; Час выбраў іх // ЛК. — 2001. — 6 ліп. — С. 2; Прайшоў вайну лясным воінам // ЛК. — 2001. — № 55. — С. 2; Пра танк і інш. знаходкі // ЛК. — 2001. — 28 жніўня. — С. 2; Суквецце талентаў // ЛК. — 2001. — 7 снеж. — С. 2; І Рабінавы камень за вёскай // ЛК. — 2002. — № 50. — С. 3; Знаходкі на валосавіцкай зямлі // ЛК. — 2002. — № 67. — С. 2; Археалагічны зрэз // ЛК. — 2002. — № 78–79. — С. 2; Аноўкаўскае ці Оч? // ЛК. — 2003. — № 9. — С. 3; Валатоўкі: рэальнасць і міфы // ЛК. — 2003. — № 15. — С. 2; Марская душа // ЛК. — 2003. — 8 крас. — С. 2; Паданне пра Гогалі // ЛК. — 2003. — № 31. — С. 3; Забытымі не будуць // ЛК. — 2003. — 8 мая. — С. 2; Устаноўлена імя // ЛК. — 2003. — 27 чэрв. — С. 2; Велеўшчынскія «Нашчадкі» // ЛК. — 2003. — № 57. — С. 3; Даследаванне курганоў // ЛК. — 2003. — № 84. — С. 4; Неперспектыўная вёска // ЛК. — 2003. — 21 кастр. — С. 2; Цярэшкінскае лясніцтва // ЛК. — 2003. — 18 ліст. — С. 2; Пажухлы трохкутнік // ЛК. — 2003. — № 99. — С. 2; Авеяны легендамі край: [знаходка гарадзішча каля в. Заслаўе] // ЛК. — 2004. — № 6. — С. 4; Таямніцы партыз. лесу // ЛК. — 2004. — № 15. — С. — С. 3; Частушкі бабулі Зосі // ЛК. — 2004. — № 19. — С. 2; Дваццатая вясна: [У.І. Садоўскі] // ЛК. — 2004. — № 23. — С. 2; Сем нашчадкаў // ЛК. — 2004. — 11 мая. — С. 2; Бабраня // ЛК. — 2004. — 25 мая. — С. 2; Зубры // ЛК. — 2004. — 29 чэрв. — С. 2; Касалапы госць // ЛК. — 2004. — 29 чэрв. — С. 2; «Я вярнуўся, бо ты чакала…» // ЛК. — 2004. — 2 ліп. — С. 2; Магіла маёра // ЛК. — 2004. — № 75. — С. 2; Няспраўджаныя надзеі // ЛК. — 2004. — 17 верас. — С. 2; Баявы шлях разведчыка // ЛК. — 2004. — № 80. — С. 2; Медсястра Тамара // ЛК. — 2004. — 5 ліст. — С. 2; Пра вёску Людчыцы і знікшую царкву // ЛК. — 2004. — № 100. — С. 3; У акупацыі… // ЛК. — 2005. — 18 студз. — С. 2; «Жаніцьба Цярэшкі» ў вёсцы Цярэшкі // ЛК. — 2005. — 21 студз. — С. 2; Рыжая зладзейка // ЛК. — 2005. — 22 лют. — С. 2; Паядынак з ваўкамі // ЛК. — 2005. — 1 сак. — С. 2; Надпіс на дрэве // ЛК. — 2005. — 1 крас. — С. 2; Засада ў Востраве // ЛК. — 2005. — 22 крас. — С. 2; Купалле // ЛК. — 2005. — 5 ліп. — С. 2; У небе і на зямлі // ЛК. — 2005. — 8 ліп. — С. 2; Разгадка Крукавай гары // ЛК. — 2005. — 25 ліст. — С. 2; Каменныя помнікі старажытнасці // ЛК. — 2005. — 20 снеж. — С. 2; Гаспадыня кніжнага царства // ЛК. — 2006. — 14 лют. — С. 2; Ордэн Маці // ЛК. — 2006. — 17 лют. — С. 2; Масленіца // ЛК. — 2006. — № 21. — С. 2; Абавязак і памяць // ЛК. — 2006. — 31 сак. — С. 2; У тыле ворага: [Р. Лінькоў] // ЛК. — 2006. — № 25. — С. 2; Пажар ля Велеўшчыны // ЛК. — 2006. — 23 мая. — С. 2; Шлях ветэрана // ЛК. — 2006. — 22 жніўня. — С. 2; Старажытнае гарадзішча // ЛК. — 2006. — № 73. — С. 3; Курганы ля Велеўшчыны // ЛК. — 2007. — 5 студз. — С. 2; Цярэшка ў Велеўшчыне // ЛК. — 2007. — 16 студз. — С. 2; Партызанскі рэйд: [экскурсія вакол в. Гадзіўля] // ЛК. — 2007. — № 12. — С. 3; Абыдзенны ручнік // ЛК. — 2007. — 4 мая. — С. 2; Невядомыя захаванні // ЛК. — 2007. — 15 чэрв. — С. 2; На берагах старажытнага возера: [воз. Бярэшча] // ЛК. — 2007. — № 62. — С. 7; Тры медалі «За адвагу» // ЛК. — 2007. — № 67. — С. 2; «Чэкісты» на Лепельшчыне // ЛК. — 2007. — № 85. — С. 2; Музей воінаў-інтэрнацыяналістаў // ЛК. — 2008. — 1 лют. — С. 2; Наведалі гарадзішча і Цар-дуб // ЛК. — 2008. — 18 сак. — С. 2; Ліквідатар // ЛК. — 2008. — 25 крас. — С. 2; Вогненныя вёрсты // ЛК. — 2008. — 8 мая. — С. 2; Першы бой // Тамсама.; Партызанская радыстка // ЛК. — 2008. — 12 чэрв. — С. 2.

Літ.: Шушкевіч У. Па слядах паветранага бою // ЛК. — 2000. — № 57. — С. 4; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Тухта В.У. (25.11.2003) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Матырка Васіль. Экскурсія да вытокаў // ЛК. — 2006. — № 90. — С. 3; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Тухта В.У. (18.10.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ТЫЧКО** АЛЬФРЭД ФРАНЦАВІЧ, краязнаўца, педагог. Працаваў настаўнікам у Мілашоўскай БШ Міёрскага раёна Віцебскай вобл. Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку. Жыве ў в. Мілашова.

Тв.: 125 гадоў таму // СП (М). — 1998. — № 33. — С. 2; Сустрэча праз гады // МН. — 2002. — № 17. — С. 4; Подзвіг Бабічава // МН. — 2004. — № 16. — С. 2.

Літ.: Ермалёнак В. Чым багатае Казакова? // КГ. — 2005. — № 17. — С. 1, 5.

**ТЫШКО** ІВАН (ЯНКА) ІВАНАВІЧ, краязнаўца. Аўтар артыкулаў прысвечаных гісторыі і культуры Віцебшчыны на старонках перыядычнага друку. Пражывае ў Віцебску.

Тв.: Усё пра нашу рэспубліку і Віцебшчыну: Па старонках чацвёртага тома Энцыклапедыі гісторыі Беларусі // ВР. — 1998. — № 9. — С. 7; Цуд стогадовай даўнасці: [кінематограф у Віцебску] // ВР. — 1998. — № 22. — С. 4; Аўтар «Знахара» родам з Глыбоччыны: [Т. Даленга-Мастовіч] // ВР. — 1998. — № 121. — С. 4; Святар-пісьменнік з Дзедзіна // МН. — 2004. — № 54. — С. 3; Святар беларускасці // МН. — 2004. — № 63. — С. Наша спадчына ў гістарычных гарадах і мястэчках // НС. — 2004. — № 71. — С. 5; Пра Сяргея Матэленка // МН. — 2006. — № 43. — С. 4.

**УЛЮЦЕНКА** ВІКТАР ВАСІЛЬЕВІЧ (*Антон Параскевін*) (22.11. 1949, г.п. Шуміліна), краязнаўца, калекцыянер, урач. Член Беларускага саюза журналістаў (2007). Скончыў Полацкае медвучылішча (1971), ВДМІ (1982), клінічную ардынатуру пры ВДМІ (1988). Працаваў загадчыкам урачэбнага ўчастка ў в. Дрысвяты Браслаўскага раёна (1971–1973), пам. санітарнага ўрача Шумілінскай райэпідэмстанцыі (1973–1976), гал. урачом Шумілінскай гарпасялковай бальніцы (1983–1986), загадчыкам тэрапеўтычнага аддзялення Шумілінскай цэнтральнай райбальніцы (з 1989).




Даследуе гісторыю і культуру Шуміліншчыны, помнікі гісторыі і культуры, царкоўнае краязнаўства. Збірае фальклорныя матэрыялы. Склаў карту камянёў, якія знаходзяцца на тэрыторыі раёна. Акрамя даследчыцкай дзейнасці актыўна займаецца грамадскімі і духоўнымі справамі. Сабраў багаты матэрыял пра род благаславёнай Цэліны Хлюдзінскай, заснавальніцы ордэна Уваскрэсення сясцёр Хрыстовых, якая нарадзілася ў в. Антопаль Аршанскага раёна, а з 12 гадоў выхоўвалася ў в. Лескавічы Шумілінскага раёна.




Разам з сябрамі-энтузіястамі Ю. Сіманенка, А. Шаршуном, Л. Ясіновічам, настаяцелем шумілінскага храма Ф. Пучынскім і вучнямі нядзельнай праваслаўнай школы займаюцца добраўпарадкаваннем крыніцы, навакольнай тэрыторыі ва ўрочышчы «Пяцінка» каля былой в. Казаногава Шумілінскага раёна. Крыніца здаўна лічылася святой, на пілігрымкі да яе прыходзілі вернікі з Суража, Талачына, Чашнікаў. У планах аднаўленне капліцы ў гонар Параскевы Пятніцы.

Збірае прыклады вуснай народнай творчасці, у асноўным у Казянскім с/с Шумілінскага раёна. Друкуе іх у мастацкай апрацоўцы ў мясцовым перыядычным друку пад сваім імем і псеўданімам Антон Параскевін. Матэрыялы, запісаныя ў наваколлях Шуміліна, якія раней выходзілі ў газетах «Віцебскі рабочы» і «Герой працы», передрукоўваліся ў кнізе «Светлазор» у раздзеле «Расказы». Разам з Ільіным В.А. выдалі кнігу «Пятенка. Православные храмы Шумилинщины» (2007).

Бярэ ўдзел у конкурсах «Мой родны кут», якія арганізуюцца Міністэрствам экалогіі і прыродных рэсурсаў на лепшую публікацыю на экалагічную тэматыку. Шэраг матэрыялаў перадаў у ВАКМ, Шумілінскі раённы краязнаўчы музей.



Тв.: <u>Кнігі</u>: (разам з В.А. Ільіным) Пятенка. Православные храмы Шумилинщины. — Витебск, 2007. — 46 с.; Параскевин А. Светлозор: сказы, стихи, рассказы, песни. — Витебск: ВОТ, 2008. — 236 с.

<u>Артыкулы ў перыядычным друку:</u> Пяценка // ГП. — 1989. — № 131. — С. 2; З верай у сэрцы: [царква ў в. Пабеда Шумілінскага раёна] // ГП. — 1990. — № 43. — С. 2; На замчышчы: [в. Лескавічы] // ГП. — 1990. — № 70. — С. 3; Сведка вандровак: [вакзал у Шуміліна] // ГП. — 1990. — № 80. — С. 3; На радзіме паэта: [А. Салтук] // ГП. — 1993. — № 38. — С. 3; «Баюся, што будзеце вы пустазеллем…»: [Пяценка] // ГП. — 1993. — № 83. — С. 2; Ці жыве Бог на Беларусі: [гісторыя Шуміліншчыны на фоне падзення ўзроўня духоўнасці] // ГП. — 1993. — № 103. — С. 2; Баюся, што будзеце вы пустазеллем // ВР. — 1994. — № 8. — С. 5; На замчышчы: [в. Лескавічы] // ВР. — 1994. — № 58. — С. 5; Праўда пана Сакалоўскага // ГП. — 1998. — № 52. — С. 2; Вось дык дзік // ГП. — 1998. — № 54. — С. 3; Фядосаў млын // ГП. — 1998. — № 71. — С. 2; Палка ў колах. З гісторый пра Ігната // ГП. — 1998. — № 82. — С. 3; І стала жыць пра яго памяць: [паданне пра яўрэя Срала з Жарабычаў] // ГП. — 1999. — № 13. — С. 3; Мацярынская малітва: [в. Жарабычы] // ГП. — 1999. — № 27. — С. 3; Апалінараў сон // ГП. — 1999. — № 32. — С. 3; Ільёнкавы ляды // ГП. — 1999. — № 39. — С. 3; Клімава хвароба // ГП. — 1999. — № 50. — С. 3; Як дзеўкі поле ад воўчых яблыкаў ачышчалі: [паданне, як на Шуміліншчыне пачыналі вырошчваць памідоры] // ГП. — 1999. — № 56. — С. 3; Жураўліная айчына // ГП. — 1999. — № 96. — С. 2; Дар'я — залатое верацяно // ГП. — 2000. — № 26. — С. 3; Зямля святой Пяценкі // ГП. — 2000. — № 45. — С. 2; Балотны цар: [Тошнік] // ГП. — 2003. — № 50. — С. 2, 4; Сказ пра замак на беразе возера // ГП. — 2004. — 25 мая. — С. 3; Краіна Белаяр // ГП. — 2005. — № 20. — С. 7, 8; З шэрымі валунамі на схілах // ГП. — 2005. — № 39. — С. 3; Сказ пра Усысу: [верш] // ГП. — 2005. — № 44. — С. 3; Лясны ручай // ГП. — 2005. — № 46. — С. 3, 4; Шчасце — гэта вялікая праца: [настаўніца М.Ф. Савіцкая] // ГП. — 2005. — № 52. — С. 3; Бабулін калодзеж // ГП. — 2005. — № 59. — С. 2, 7; Музыка жыцця: [в. Будобаль, У.Г. Кісялёў] // ГП. — 2005. — № 72. — С. 2; Падарожжа па рацэ Обаль // ГП. — 2005. — № 82. — С. 3, 4; Час шэрых валуноў // ГП. — 2006. — № 22. — С. 7; Ты, татка,

паліто надзень: [з успамінаў дзяцей пра вайну] // ГП. — 2006. — № 48. — С. 2; Падарожжа шчупака ў краіну белых вод // ГП. — 2006. — № 50. — С. 3; Скрыжаванні лёсаў і дарог // ГП. — 2006. — № 68–72; Сіроціна // ГП. — 2006. — № 87–89; Акамянелы досвітак: [знішчэнне Сіроцінскага гета] // ГП. — 2006. — № 90. — С. 2, 3; (разам з М. Мароз) Студня з-за смугі вякоў: [Пяценка] // ГП. — 2006. — № 92. — С. 5.

Літ.: Палісадзін В. Адраджэнне святой Пяценкі // ГП. — 2001. — № 65. — С. 3; Барысаў М. Тут анёлы лунаюць у небе // ГП. — 2003. — № 93. — С. 2; Шпакоўская Г. Пяценка — крыніца натхнення // НС. — 2007. — 15 снеж. — С. 5; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Улюценка В.В. (2.02.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**УРБАН** РЫГОР АНУФРЫЕВІЧ (1927, Лепельскі раён – 9.04.1995), краязнаўца. Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне. Служыў у войску (да 1951), працаваў аграномам, старшынёй с/с, Верхнядзвінскага гарвыканкама (1952–1989), райсавета ветэранаў (1989–1995). Актыўна выступаў на старонках мясцовага перыядычнага друку з артыкуламі сацыяльнай і краязнаўчай тэматыкі, аддаючы перавагу асвятленню лёсаў землякоў – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Тв.: Яго ведаюць усе: [М.С. Урбан] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна. — Мн.: Паліграфафармленне, 1999. — Кн. 1. — С. 319–320; Камандзір штрафной роты // ДзП. — 2000. — № 3. — С. 3; Праз войны // ДзП. — 1995. — № 9. — С. 2; Зброевых спраў майстар // ДзП. — 1995. — № 6. — С. 2.

Літ.: Некралог // ДзП. — 1995. — № 30. — С. 4.

**УХВАРОНАК** ІВАН ВАСІЛЬЕВІЧ (?, в. Высокі Гарадзец Талачынскага раёна Віцебскай вобл. – †), журналіст, краязнаўца. Ветэран Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў у рэдакцыі талачынскай раённай газеты, жыў у Маскве. Пісаў пра в. Высокі Гарадзец. Актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці. Аўтар шэрагу артыкулаў, у якіх узнімаў праблемы захавання гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны раёна. Падпалкоўнік у адстаўцы.

Тв.: «Выходила на берег Катюша» // СІ. — 1989. — № 56. — С. 3; Сустрэчы на старонках «Памяці» // СІ. — 1989. — № 57. — С. 2; Вёска майго дзяцінства: [в. Высокі Гарадзец] // СІ. — 1990. — № 7–9; Куды знік магільны помнік? // СІ. — 1990. — № 60. — С. 3; Плоў для ўсёй дывізіі // СІ. — 1991. — № 34. — С. 2; Суровая восень 43-га // СІ. — 1991. — № 46. — С. 2; Сыны наведалі Бацькаўшчыну: нататкі ўдзельніка кангрэса беларусістаў // СІ. — 1991. — № 56. — С. 2; Гнеўна шумяць яліны: [вызваленне в. Высокі Гарадзец] // СІ. — 1991. — № 57. — С. 2; «Самый длинный день в году» // СІ. — 1991. — № 58. — С. 2; Чарнобыль у Стуканах: [аб планах будаўніцтва магільніка пестыцыдаў на Талачыншчыне] // СІ. — 1992. — № 27. — С. 2; Дарогай бацькоў // СІ. — 1991. — № 33. — С. 2; Подзвіг у імя Радзімы: [А.Г. Мазанік] // СІ. — 1994. — № 27. — С. 2.

**ФАКЕЕЎ** УЛАДЗІМІР ІВАНАВІЧ (29.06.1951, Ташкентская вобл., Узбекская ССР), журналіст. Асвятляе на старонках мясцовага перыядычнага друку некаторыя пытанні мясцовай гісторыі, архітэктуры, музейнага будаўніцтва. Асобна адзначым працу «Новополоцкий именослов», у якой аналізуюцца пытанні анамастыкі горада.



Тв.: «Боратинки», «тынфы», «зайцы» // НС. — 1993. — № 131. — С. 3; Новополоцкий именослов // НС. — 1994. — № 7, 8, 12, 14, 15, 17; Живая вода музейного дела: [Музей гіст. і культ. Наваполацка] // НС. — 1997. — № 110. — С. 6; Сороковой день рождения: [Наваполацк] // НС. — 1997. — № 103. — С. 4; Архитектура Новополоцка: вчера, сегодня, завтра // НС. — 1997. — № 120. — С. 3; Новополоцкий именослов // НС. — 1999. — № 17–21; Город будет, но знать хочу каким!: [Наваполацк] // НС. — 2000. — № 87. — С. 3.

**ФАМІН** МІТРАФАН ІВАНАВІЧ (5.08.1913, в. Жабыкі Дубровенскага пав. – 23.05.1993), краязнаўца. Скончыў МгДПІ. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў інспектарам Ветрынскага рана, настаўнікам гісторыі, завучам, дырэктарам Вароніцкай СШ Полацкага раёна. Адзін з пачынальнікаў музейнай справы ў Полацкім раёне. Браў удзел у пошукавым руху. Працаваў у АМАРФ (Падольск). Выявіў дзясяткі імёнаў салдат, партызан і падпольшчыкаў, якія загінулі ў Полацкім раёне ў гады Другой сусветнай вайны.

Тв.: Усомльскі бой // СК. — 1989. — № 28. — С. 2; Ён вызваляў наш горад: [М.І. Саламацін] // СК. — 1989. — № 98. — С. 2; Геройская смерць: [гібель групы партызан у 1944 г.] // СК. — 1989. — № 125. — С. 2; І яго заслуга: [Г.Г. Шакіраў] // СК. — 1990. — № 72. — С. 2; Адважны камбрыг: [А.М. Ермакоў] // СК. — 1990. — № 75. — С. 2; Узнагароджаны за вызваленне Полацка: [В.І. Ціхаміраў] // СК. — 1990. — № 116. — С. 2.
Літ.: Фамін М.І. Некралог // ПВ. — 1993. — № 46. — С. 4.

**ФЕЙГІН** ВІКТАР ПАЎЛАВІЧ (9.06.1950, г. Віцебск), педагог. Скончыў гіст. факультэт МгДПІ (1980). Працаваў настаўнікам у школах Талачынскага раёна, настаўнікам гісторыі ў Лужаснянскай гімназіі (1997–2000), СШ № 40 г. Віцебска (з 1988).

Гісторыяй роднага краю стаў цікавіцца з маленства. Пэўны ўплыў на фарміраванне зацікаўленасцяў зрабілі М.І. Калкоў, Г.Р. Круганава, І.Д. Галькевіч. Браў удзел у стварэнні некаторых школьных музеяў у Талачынскім раёне. Спрыяў фарміраванню светапогляду і жыццёвых арыентыраў, краязнаўчых зацікаўленасцяў, любові да гісторыі роднага краю ў вялікай колькасці сваіх вучняў і знаёмых М. Макарава, Ю. Зорынай, П. Мядзведзевай і інш.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Фейгін В.П. (23.03.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ФЁДАРАЎ** ВАДЗІМ ІВАНАВІЧ (22.05.1938, г. Віцебск – 2005), настаўнік. Скончыў Смаленскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя К. Маркса (1965). Працаваў у розных школах і ўстановах народнай адукацыі г. Віцебска і Віцебскага раёна. Краязнаўчую дзейнасць распачаў у другой палове 90-х гг. XX ст. у СШ № 24. Найбольш цікавіўся гісторыяй пасёлка Тарны (цяпер у межах г. Віцебска): тапаніміка вуліц, гісторыя СШ № 24, гіст. падзеі, а таксама падзеямі вайны 1812 г. у Віцебскай губ., гаспадаркай Віцебшчыны XIX–XX стст., гісторыяй народнай адукацыі Віцебшчыны XIX – другой паловы XX ст. Удзельнічаў у стварэнні музея «Іх імёнамі названы вуліцы Тарнага», прысвечанага пяці воінам-віцяблянам, якія загінулі ў Афганістане. Актыўна працаваў з дакументамі ў ДАВВ. Падтрымліваў супрацоўніцтва з Музеем воінаў-інтэрнацыяналістаў г. Віцебска, гарадскім Саюзам воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Фёдараў В.І. (11.12.2003) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ФІЛІПЕНКА** УЛАДЗІМІР СЯРГЕЕВІЧ (6.12.1971, в. Маладзечна Мінскай вобл.), педагог. Скончыў гіст. факультэт БДУ (1995), аспірантуру ІЭМФ НАН Беларусі. Працуе ў ПДУ. Даследуе гісторыю і культуру Падзвіння.

Тв.: Уплыў знешняга асяроддзя на сістэму народнай медыцыны беларусаў Падзвіння // Веснік ПДУ. — 2005. — № 7; Гістарыяграфія вывучэння народнай медыцыны беларусаў Падзвіння // Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 1: у 2 ч. — Наваполацк, 2006; Анатамічна-фізіялагічныя ўяўленні, этыялогія і прафілактыка хвароб у сістэме традыцыйнай народнай медыцыны беларусаў Падзвіння // Веснік ПДУ. — 2007. — № 1.
Літ.: Корзенко Г.В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник. — Мн.: Бел. наука, 2007. — С. 403–404.

**ФІЛІПОВІЧ** УЛАДЗІМІР ПЯТРОВІЧ (1.08.1921, в. Яўлічы Слуцкага раёна Мінскай вобл. – 21.10.2004), краязнаўца. Вучыўся ў Казанскім авіяцыйным інстытуце (1938–1941), авіяцыйным вучылішчы г. Петрапаўлаўска, вучылішчы ст. Астафа Азербайджанскай ССР, ВАОШ г. Разань РФ (1949). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Ваенны лётчык. Служыў у Мічурынску, Канатопе. Пасля заканчэння авіяцыйнай школы ў Разані служыў у в/ч 2166 у г.п. Балбасава Аршанскага раёна (1949–1980). Працаваў начальнікам штаба грамадзянскай абароны на авіяцыйным заводзе ў г.п. Балбасава. Аўтар артыкулаў, прысвечаных г.п. Балбасава, лётчыкам, якія тут служылі, гісторыі авіяцыі, у газетах «Віцебскі рабочы», «Аршанская газета» .

Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі» і юбілейнымі медалямі УС СССР.

Тв.: Памяць аб мінулым — клопат аб будучым: [музей СШ № 3 г. Оршы] // ЛП. — 1986. — № 14. — С. 3; Гэта наша гістарычная памяць // АГ. — 2001. — № 77, 78, 80, 81, 83; Подзвігу Кацярыны Зяленка — 60 год // АГ. — 2001. — № 117. — С. 2; Самолет стал памятником: [Ту-16 у п. Балбасава] // АГ. — 2002. — № 6. — С. 3.

Літ.: Маркевіч М. Гэта наша гістарычная памяць // АГ. — 2001. — № 77. — С. 2; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Філіповіч У.П. (10.10.2009, запоўнена жонкай, Е.В. Філіповіч) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ФІХ** Б.М., гісторык. Кандыдат гіст. навук (1954). Аўтар дысертацыйнага даследавання «Роль комитетов бедноты в Витебской губернии в развертывании социалистической революции в деревне».

Тв.: Роль комитетов бедноты в Витебской губернии в развертывании социалистической революции в деревне.

Літ.: Міхнюк У.М. Доктарскія і кандыдацкія дысертацыі па гістарычных навуках у Рэспубліцы Беларусь, 1991–2003 гг.: бібліяграфічны паказальнік. — Мн.: НАРБ, 2006. — 68 с.

**ФУРС** АЛЯКСАНДРА (з Уміровічаў), аўтар успамінаў, у якіх апісваецца жыццё ў міжваенны перыяд на Пастаўшчыне, а таксама ў пасляваенны перыяд і жыццё ў ссылцы.

Тв.: Трагічны і светлы лёс. Успаміны пра Ларысу Геніюш // Сумежжа. — 1992. — № 2. — С. 2; Паміж молатам і кавадлам // Дзе Мядзелка песні пяе… Пастаўшчына літаратурная. — Мн., 2006. — С. 63–68.

Літ.: Юрий Фурс: «В первую очередь кузнецу нужны мозги» // НС. — 2007. — 6 ліст. — С. 5.

**ФУРСЕВІЧ** ІВАН ВАСІЛЬЕВІЧ (6.11.1927, в. Галавенчыцы Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобл. – 22.02.2001), краязнаўца. Служыў ва УС СССР (1945–1950), адначасова вучыўся на курсах пры Маскоўскім інстытуце замежных моў. У кастрычніку 1950 г. арыштаваны як сын «ворага народа» і высланы ў Магаданскую вобл. Рэабілітаваны ў 1991 г. Пасля вызвалення ў маі 1956 г. працаваў электрыкам на Экібастузскай ГРЭС. Скончыў Семіпалацінскі медінстытут (1964), працаваў гал. урачом санаторыя «Рахманаўскія ключы» Катон-Карагайскага раёна Паўночна-Казахстанскай вобл. Жыў у Докшыцкім раёне (з 1977), працаваў нам. гал. урача раёна, пасля выхаду на пенсію ўрачом-псіхіятрам. Валодаў англійскай, нямецкай, латышскай, польскай, украінскай мовамі.



Даследаваў пытанні рэлігійнага жыцця, тапанімікі Докшыччыны, удзел жыхароў краю ў рэвалюцыйным руху ў Заходняй Беларусі. Аўтар шэрагу артыкулаў у раённай газеце «Ленінская трыбуна» (з 1991 г. «Родныя вытокі»). Шмат з іх прысвечаны актуальным, малаасветленым пытанням беларускай гісторыі, а таксама гісторыі роднага краю.

Тв.: Надзея Хадасевіч-Лежэ // ЛТ. — 1991. — № 67. — С. 3; Старажытныя абрады на Бягомльшчыне // ЛТ. — 1991. — № 80. — С. 4; Рэлігія і мова // ЛТ. — 1991. — № 92. — С. 2, 4; Каляды // РВ. — 1991. — № 111. — С. 4; Царква ў нашым краі // РВ. — 1991. — № 7, 14; Гістарычныя адкрыцці Юрыя Пазнякова // Выбар. — 1992. — № 7. — С. 4–5; Докшыцкая батлейка // РВ. — 1992. — № 59. — С. 3; І.М. Пляшчынскі // РВ. — 1992. — № 67. — С. 4; Шчыры працаўнік роднага краю // РВ. — 1993. — № 7. — С. 3.

Літ.: Камінскі І.І. Краязнаўцы Докшыччыны // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Докшыцкага раёна. — С. 654–655.

**ХАВАНСКІ** ВАСІЛЬ (*Тонін В.*), журналіст. Працаваў рэдактарам газеты «Лепельскі край» на працягу 20 гадоў. Аўтар артыкулаў у кнізе «Памяць» Лепельскага раёна, артыкулаў на краязнаўчыя тэмы ў раённых газетах «Ленінскі сцяг», «Лепельскі край».



Тв.: Арганізатары камуны // Памяць: Лепельскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 126–127; Браты-артылерысты: [браты Маляўкі] // Тамсама. — С. 260; Як жанілі Цярэшку: [на Лепельшчыне] // ЛС. — 1990. — № 19. — С. 4; Яшчэ раз пра сям'ю Мароз // ЛК. — 1992. — № 4. — С. 2; Ян Чачот і Адам Міцкевіч // ЛК. — 1997. — № 18. — С. 2; Шагал і Рэпін // ЛК. — 1997. — № 63. — С. 2; І яшчэ раз крыху гісторыі // ЛК. — 2000. — № 93. — С. 4; Як Цярэшку жанілі // ЛК. — 2003. — № 1. — С. 2; Лепельскае падполле // ЛК. — 2005. — № 20, 21; Вогненныя вёрсты // ЛК. — 2005. — № 29. — С. 2; Партызанскія мастакі // ЛК. — 2005. — № 34, 35; Як немцы Несіна спалілі // ЛК. — 2005. — № 59. — С. 2; Галоўны летапісец гісторыі раёна // ЛК. — 2005. — № 85. — С. 2; Друкаванае слова на Лепельшчыне // ЛК. — 2006. — № 60. — С. 2; Ян Чачот на Лепельшчыне // ЛК. — 2006. — № 62. — С. 2; У Саснягоўскай пушчы // ЛК. — 2006. — № 87. — С. 4; Што ў прозвішчы тваім? // ЛК. — 2006. — № 94. — С. 2; Вясковае вяселле // ЛК. — 2006. — № 100. — С. 2.



**ХАЗАНСКІ** УЛАДЗІМІР ЯКАЎЛЕВІЧ (25.10.1923, г. Гарадок – 22.11.1989), журналіст. Скончыў Уральскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.М. Горкага. Працаваў у газетах «Савецкая Беларусь», «Віцебскі рабочы», уласным карэспандэнтам газеты «Чырвоная змена» ў г. Віцебску. Збіраў матэрыялы пра Прошкаўскае (Верхнядзвіншчына) і Обальскае падполлі. Аўтар нарысаў пра подзвігі невядомых да гэтага савецкіх патрыётаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Падзеі вайны на Віцебшчыне апісаў у кнігах «Ася», «Спытайце ў бяроз».

Лаўрэат прэміі ЛКСМБ.

Тв.: Цімур Гайдар: Віцебшчына на карце лёсу Аркадзія Гайдара // ВР. — 1988. — № 240. — С. 3; Святло нязгаснай зоркі: [Обальскае падполле] // ВР. — 1989. — № 60. — С. 3

Літ.: Хазанскі Ул. Я. Некралог // ВР. — 1989. — № 225. — С. 3.

**ХАЙНОЎСКІ** АЛЯКСАНДР ВІТАЛЬЕВІЧ, музейны работнік. Працуе ў Глыбоцкім гісторыка-этнаграфічным музеі. У 1998 г. стаў старшынёй грамадскага таварыства «Спадчына», створанага пры музеі для актывізацыі краязнаўчага вывучэння Глыбоччыны, між іншых мэтаў — арганізацыі чытанняў. Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку, прысвечаных гісторыі і культуры Глыбоччыны.

Тв.: «Спадчына» заяўляе аб сабе // ВГл. — 1998. — № 56. — С. 3; У наш час — хутар, у мінулым — засценак, фальварак Калеснікава // ВГл. — 1999. — № 3. — С. 3, 4; Глыбоччына: погляд у мінулае // ВГл. — 1999. — № 48. — С. 3; Прыдарожная капліčка // ВГл. — 2000. — № 28. — С. 2; Царква ў Чарневічах // ВГл. — 2000. — № 48. — С. 2; Гарадзішча ў Лаўрынаўскім лесе // ВГл. — 2000. — № 67. — С. 3; Вёска Забор'е салідны ўзрост мае // ВГл. — 2001. — № 89. — С. 2.



**ХАНЯК** АНАТОЛЬ СЯМЁНАВІЧ (17.09.1919, в. Замошша Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Сушанскі с/с Лепельскага раёна Віцебскай вобл.), педагог, краязнаўца. Скончыў Каменскую СШ Лепельскага раёна (1939), Горкаўскае зенітна-ракетнае вучылішча (1941), фізіка-матэматычны факультэт ВДПІ (1967). У часы Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у падпольнай барацьбе супраць фашыстаў, быў кулямётчыкам, палітруком узвода партыз. атрада (студзень 1942 – ліпень 1944), служыў ва УС СССР (верасень 1939 – кастрычнік 1941, снежань 1944 – верасень 1946) у якасці курсанта, камандзіра артылерыйскай батарэі. Працаваў настаўнікам, дырэктарам школы ў Лепельскім раёне, нам. дырэктара Лепельскай школы-інтэрната (1946–1961), загадчыкам парткабінета, нам. старшыні Лепельскага райвыканкама (1961–1966), старшынёй Лепельскага раённага камітэта народнага кантролю (1966–1979). Пасля выхаду на пенсію працаваў дырэктарам Лепельскага раённага краязнаўчага музея (1980–1983).

Зацікавіўся мінуўшчынай ў 1953 г., калі пачаў працаваць дырэктарам Лепельскай сямігодкі. Разам з вучнямі даследаваў гісторыю СШ № 3, школьнай адукацыі на Лепельшчыне, гісторыю будаўніцтва і дзейнасці Бярэзінскай воднай сістэмы (XVIII–XIX стст.). Вывучаў развіццё партыз. руху ў раёне ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, дзейнасць выдатных землякоў: Д. Даўгялы, І.Д. Гарбачэўскага, М.Ф. Кусцінскага, лепельскага селекцыянера Язэпа Мароза, якога называлі «беларускім Мічурыным», і інш.

Значны ўплыў на фарміраванне зацікаўленасці ў вывучэнні роднага краю аказаў А.А. Алейнікаў, доктар геалагічных навук, былы дырэктар школы, кіраўніком якой потым працаваў А. Ханяк (1953–1959). На працягу працы ў школе браў удзел у шэрагу паходаў па родным краі. На аснове сабраных матэрыялаў і праведзеных даследаванняў арганізаваў музей у СШ № 3 г. Лепеля. Стаў ініцыятарам і актыўным удзельнікам стварэння музея ў Лепельскай школе-інтэрнаце. Выступаў з дакладам «Краязнаўчая работа ў школе» пра вопыт работы на канферэнцыях ў Віцебску і Львове (1958). Распачатая калектывам настаўнікаў і вучняў Лепельскай сямігадовай школы ў 1950-я гг. краязнаўчая праца з'яўлялася станоўчым прыкладам для стварэння розных па змесце музеяў у многіх школах Лепельскага раёна. У час працы ў ЛКМ распрацоўваў тэматычны план музея і ажыццяўляў яго рэалізацыю (1980–1983).

Аказаў дапамогу пісьменніку У. Паўлаву ў падрыхтоўцы артыкула «Маладая партызанская гвардыя» пра 13-ты камсамольска-маладзёжны атрад Лепельскай партыз. брыгады імя І. Сталіна («Маладосць», 1974, № 4, с. 144–148), журналісту А. Шуману ў падрыхтоўцы артыкула «Недаром жил» матэрыяламі пра Я.К. Мароза («Беларуская ніва», 1993, 23 чэрв.).

Некаторыя артыкулы друкаваў у мясцовых перыядычных выданнях (з 1967) «Ленінскі сцяг» («Лепельскі край»). Мае ненадрукаваныя матэрыялы: «40 год Лепельскай сямігадовай школе» (1957), «Краязнаўчая работа ў Лепельскай сямігадовай школе (1958), якія зберагаюцца ў музеі СШ № 3 і асабістым архіве. Падрыхтаваў зборнік артыкулаў пад агульнай назвай «Аб тым, што бачыў, што перажыў, пра што думаў», які ўтрымлівае каля 50 артыкулаў на краязнаўчыя і грамадска-палітычныя тэмы. Захоўваецца ў фондах ЛКМ.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі Айчыннай вайны, медалямі «За баявыя заслугі», «За працоўную доблесць» і інш., Ганаровымі граматамі ВС БССР (1969, 1979).

Тв.: Жыццё, прысвечанае саду // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Лепельскага раёна. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 127–130; Да ўсеагульнай сярэдняй // Тамсама. — С. 142–143; Браты Армонікі: [удзельнікі партыз. руху на Лепельшчыне] // Тамсама. — С. 320–324; Рабілі зброю партызаны // Тамсама. — С. 288–289; Лепельскі дзіцячы дом // Тамсама. — С. 575.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Партызанскі мінамётчык: [А.А. Някрасаў] // ЛС. — 1982. — 28 жніўня. — С. 2; Ад цемры да святла // ЛС. — 1982. — 25 снеж. — С. 3, 4; Генерал з Заславак: [М.А. Ладзік] // ЛК. — 1992. — 25 жніўня. — С. 2; Язэп Мароз з Фатыні // ЛК. — 1992. — № 40. — С. 2; Хроніка баявых дзеянняў: [да 50-годдзя ўтварэння партыз. Полацка-Лепельскай зоны] // ЛК. — 1992. — № 102. — С. 1, 2; Аперацыя «Прарыў» // ЛК. — 1994. — № 30. — С. 2; Чалавек з легенды: [У.Е. Лабанок] // ЛК. — 1997. — № 53. — С. 1, 2; Ля вытокаў гісторыі школы // ЛК. — 1997. — № 6. — С. 2; Камсамолу — 80 гадоў // ЛК. — 1998. — № 86. — С. 1, 2; У глыбокім тыле // ЛК. — 2003. — № 10. — С. 3; Жудасная трагедыя // ЛК. — 2003. — № 21. — С. 2; Правал карнай экспедыцыі «Котбус» // ЛК. — 2003. — № 43. — С. 2; Баявая маладосць: [13-ты камсамольска-маладзёжны атрад Лепельскай партыз. брыгады імя І. Сталіна] // ЛК. — 2003. — № 52. — С. 2; Партызанскі «падарак» // ЛК. — 2003. — № 105. — С. 2; Ніколі не забудзем: [60-годдзе вызвалення Беларусі] // ЛК. — 2004. — № 105. — С. 2; Генерал-палкоўнік Смірноў: [былы камандуючы ракетнымі войскамі СССР і РФ] // ЛК. — 2007. — № 88. — С. 2.

Літ.: Шушкевіч У.К. Чалавек і яго захапленне // Памяць: Гісторыка-культурная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мн: БелЭн, 1999. — С. 602–603; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Ханяк А.С. (5.11.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Ліст А.С. Ханяка да М.В. Півавара з удакладненнямі і прапановамі (29.11.2008.) // Тамсама.



**ХАЦКЕВІЧ** ВАСІЛЬ ДЗМІТРЫЕВІЧ (28.06.1960, г. Лепель), турыст, краязнаўца. Скончыў аўтатрактарны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута (1987). Працаваў тэхнолагам на Полацкім аўтарамонтным заводзе (1987–1993), слесарам у аўтапарку № 14 г. Лепеля (1993–1998), вартаўніком у вайсковым шпіталі (1998–2006).

Зацікавіўся гісторыяй роднага краю пасля таго, як пераехаў у Лепель (1993) і пачаў удзельнічаць у арганізацыі і працы клуба турыстаў і краязнаўцаў. Разам з аднадумцамі робіць вандроўкі па гіст. месцах Беларусі, Лепельшчыны. Аказвае дапамогу супрацоўнікам Інстытута гісторыі НАН Беларусі ў выяўленні і даследаванні помнікаў археалогіі на тэрыторыі Лепельскага раёна. Разам з членамі клуба адкрыў стаянку першабытнага чалавека «Дубавец» каля в. Верабкі Лепельскага раёна.

Актыўна ўдзельнічае ў добраўпарадкаванні і працы па аднаўленні помнікаў гісторыі і культуры. Фотааматар. Фотавыстава «Мой родны кут» экспанавалася ў Лепельскай раённай бібліятэцы (2008). Удзельнік навукова-практычных канферэнцый «Лепельскія чытанні», якія ладзяцца Лепельскім краязнаўчым музеем.

Тв.: Першы паход лепяльчан па Бярэзіне // ЛК. — 2001. — № 41. — С. 2; За чатыры дні на Нарач і назад на веласіпедах // ЛК. — 2001; 60 кіламетраў уражанняў // ЛК. — 2001. — № 94. — С. 2; На байдарках па Ушаччыне // ЛК. — 2002. — № 59. — С. 2; Лыжная вандроўка // ЛК. — 2003. — № 20. — С. 2; Водная вандроўка // ЛК. — 2003. — № 51. — С. 3; На байдарках па Эсе // ЛК. — 2004. — № 65. — С. 3; Змееў камень выручыў // ЛК. — 2004. — № 78. — С. 3; Па азёрах на байдарцы // ЛК. — 2005. — № 50. — С. 2.

Літ.: Шпакоўская Г. Лепельскія вандроўнікі // НС. — 2004. — № 116. — С. 5; Шушкевіч У. Знайшлі рэдкі помнік: [знаходка паселішча бронзавага века каля в. Верабкі] // ЛК. — 2006. — № 100. — С. 3; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Хацкевіч В.Д. (27.11.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ХМЯЛЬНІЦКАЯ** ЛЮДМІЛА УЛАДЗІМІРАЎНА (*Аляксандра Салома, В. Солома*, *А.С.*) (17.10.1961, г. Віцебск), гісторык, музейны работнік, краязнаўца. Скончыла СШ № 34 г. Віцебска (1976), гіст. факультэт БДУ (1988). Працавала мантажніцай радыёапаратуры на Віцебскім тэлевізійным заводзе (1980–1981), майстрам вытворчага навучання ў ПТВ № 154 г. Віцебска (1981–1984), аператарам ЭВМ у Віцебскім ПКБ АСК, (1984–1988); малодшым навуковым супрацоўнікам у ВАКМ (1988–1989), мастацтвазнаўцам у НДІ «Белспецпраектрэстаўрацыя» (1989–1993), ст. навуковым супрацоўнікам у ВАКМ (1993–1998), дырэктарам Музея Марка Шагала (з 1998).

Краязнаўчую дзейнасць пачала пад час вучобы ў БДУ. Значны ўплыў на выбар тэмы даследавання зрабілі Г. Кісялёў і А. Мальдзіс. Займаецца даследаваннямі гісторыі і культуры Віцебска і Віцебшчыны XVIII – пачатку XX ст. Займалася стварэннем выстаў (пераважна мастацкіх), пад час працы ў ВАКМ брала ўдзел у фарміраванні калекцыі віцебскай кафлі. У межах выканання прафесійных абавязкаў займаецца развіццём музея М. Шагала.

Брала ўдзел у больш за 40 краязнаўчых і навуковых канферэнцыях, якія праходзілі ў Віцебску, Браславе, Полацку, в. Сар'і, Мінску, Гродне, Маскве, Варшаве, Кракаве. Сярод найбольш важных адзначым Першыя Сапуноўскія чытанні (Віцебск, 1991), Міжнародныя Шагалаўскія чытанні (Віцебск, 1994–2009), Міжнародную навуковую канферэнцыю «Рым-IV» (Гродна, 1993), Другі і Трэці Міжнародныя кангрэсы беларусістаў (Мінск, 1995, 2000), Міжнародную канферэнцыю «Агульная спадчына: мастацтва зямель былой Рэчы Паспалітай» (Варшава, 1999). Падтрымлівае кантакты з Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў і прыватныя кантакты са шматлікімі даследчыкамі з Расіі, Польшчы, Латвіі, Швейцарыі, Францыі, Германіі, Вялікабрытаніі, Ізраіля.

Аўтар некалькіх кніг па гісторыі і культуры Віцебчышыны, сярод якіх адзначым манаграфію, прысвечаную жыццю і дзейнасці А.П. Сапунова «Гісторык з Віцебска», нарыс «На Белай Русі ў Сар'і…», прысвечаны роду Лапацінскіх на Віцебшчыне, пуцяводнік па









Віцебску (2 выданні), «Шагал і Віцебск» (2 выданні). Аўтар некалькіх артыкулаў, якія прысвечаны роду Лапацінскіх, Віцебскаму губернскаму статыстычнаму камітэту, «Віцебскаму сшытку», у энцыклапедычных выданнях Беларусі, кнізе «Памяць» г. Віцебска. Аўтар значнай колькасці артыкулаў у навуковым і перыядычным друку. Падрыхтавала да друку працу «Дзе Віцьба з хвалямі Дзвіны… (гісторыя Віцебска IX – пачатку XX стагоддзяў)».

Брала актыўны ўдзел у арганізацыі працы Віцебскага абласнога краязнаўчага аб'яднання, выконвала абавязкі старшыні (1994–1999). Гал. рэдактар гіст. навукова-папулярнага часопіса «Віцебскі сшытак» (з 1994 г., выйшлі 4 нумары), гал. рэдактар «Бюллетеня Музея Марка Шагала» (з 2000 г., выйшлі 17 нумароў).

Тв.: Кнігі: Ратуша. — Віцебск, 1997. — 8 с.; Гісторык з Віцебска: жыццяпіс Аляксея Сапунова. — Мн.: Энцыклапедыкс, 2001. — 256 с.; На Белай Русі ў Сар'і…: нарыс з гісторыі маёнтка і роду Лапацінскіх. — СПб.; Мн.: ВИРД, 2001. — 102 с.; Витебск: путеводитель. — Мн., 2003. — 74 с.; Шагал і Віцебск = Шагал и Витебск = Chagall and Vitebsk / аўт. тэксту Л.У. Хмяльніцкая. — Мн.: Беларусь, 2006.

Артыкулы ў энцыклапедыях: Віцебскі губернскі статыстычны камітэт // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. — Мн., 1993. — С. 135; Лапацінскі (Łopaciński) Эўзэбіюш // ЭГБ. — Мн., 1997. — Т. 4. — С. 333; Лапацінскія // ЭГБ. — Мн., 1997. — Т. 4. — С. 334; «Віцебскі сшытак» // ЭГБ. — Т. 6. Кн. 2. — Мн., 2003. — С. 358; Развіццё асветы і народнай адукацыі ў Віцебску // Памяць. Віцебск. Кн. 1. — Мн., 2002. — С. 165–173; Віцебскія гімназіі // Памяць. Віцебск. Кн. 1. — Мн., 2002. — С. 173–181; Музей Марка Шагала // Памяць. Віцебск. Кн. 1. — Мн., 2002. — С. 646–647.

Артыкулы ў навуковым друку: Матэрыялы да біяграфіі А.П. Сапунова // Браслаўскія чытанні: матэрыялы 2-й навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 925-годдзю Браслава (1065–1990). — Браслаў, 1991. — С. 71–72; (разам з М. Паўлавым) Доктар Гібенталь, вынаходца гіпсавай імабілізацыі ў медыцыне, вядомы практык // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII–XIX стагоддзяў: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, 11–12 траўня 1992 г. —Гродна; Белавічы, 1992. — С.63–66; Віцебскі базыльянскі кляштар і Царква Св. Язафата // Навуковая канферэнцыя «Віцебшчына старадаўняя і сучасная»: тэзісы дакладаў. — Віцебск, 1993. — С. 24–26; (разам з Т.С. Бубенькай) Кафля з гербамі Агінскіх з Віцебска // Гісторыка-археалагічны зборнік. — 1994. — № 3. — С. 115–121; (разам з І. Цішкіным) Езуіцкі калегіум у Оршы // Гісторыка-археалагічны зборнік. — 1994. — № 3. — С. 228–236; З гісторыі віцебскага базыльянскага кляштара // Гісторыка-археалагічны зборнік. — 1994. — № 4. — С. 201–216; Лакальныя асаблівасці і ўплыў еўрапейскай традыцыі на фарміраванне архітэктурнага аблічча Віцебска // Беларусіка. Albaruthenica. — Мн., 1994. — Кн. 3. — С. 209–212; (разам з А. Міхайлюковым) Перспектывы развіцця музея Марка Шагала ў Віцебску // Беларусіка. Albaruthenica. — Мн., 1995. — Кн. 4. — С. 230–235; Віцебскае старажытнасховішча: епархіяльны музей ці уніяцкі збор? // Беларуска-рускае культурнае ўзаемадзеянне канца XIX – пачатку XX ст.: матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 150-годдзю з дня нараджэння І.Я.Рэпіна і 100-годдзю знаходжання мастака на Беларусі. — Віцебск, 1995. — С. 55–63; Род фундатараў і мецэнатаў // Віцебскі сшытак. — 1995. — № 1. — С. 42–51; (разам з Т.С. Бубенькай) Кафля з гербамі Агінскіх з Віцебска // Віцебскі сшытак. — 1995. — № 1. — С. 63–64; З гісторыі Віцебскага царкоўна-археалагічнага музея // Віцебскі сшытак. — 1995. — № 1. — С. 65– 71; Из истории Покровской улицы — родной улицы Марка Шагала // Шагаловский сборник. — Витебск, 1996. — С. 231–240; О трех витебских пейзажах Марка Шагала // Тамсама. — С. 241– 244; Лютэранскі некропаль у Віцебску // Беларуска-нямецкае грамадска-культурнае ўзаемадзеянне: Гісторыя, сучаснасць, перспектывы: матэрыялы Міжнароднага «круглага стала», 29–30 красавіка 1996 г. Беларусіка. Albaruthenica. — Мн., 1996. — Кн.7. — С.163–164; З гісторыі віцебскага базыльянскага кляштара // Віцебскі сшытак. — 1996. — № 2. — С.46–53; Культурна-мецэнацкая дзейнасць князёў Агінскіх на Віцебшчыне // Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу. Беларусіка. Albaruthenica. — Мн., 1997. — Кн. 6. — Ч. 2. — С. 34–44; Віцебскі царкоўна-археалагічны музей // З глыбі вякоў. Наш край. Гістарычна-культуралагічны зборнік. — Мн., 1997. — Вып. 2. — С. 4–15; Гарадскі краявід на віцебскіх работах Марка Шагала // Зборнік выступленняў на навуковай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю віцебскай мастацкай школы. — Віцебск, 1994. — С.34–37; За што судзілі паэта Тадэвуша Ладу-Заблоцкага // Віцебскі сшытак. — 1997. — № 3. — С. 24–32; Из истории витебских синагог // Мишпоха. — 1998. — № 4. — С. 25–27; Штрихи к портрету // Мишпоха. — 1998. — № 4. — С. 30–32; Адляніцкія-Пачобуты гэрбу «Здарбожац» на Віцебшчыне // Годнасьць. — 1997. — № 2 (4). — С. 31–39; Шагалаўскія дні ў Віцебску // КіД. — 1999. — № 9–10. — С. 22–23; А.П. Сапуноў і Віцебская вучоная архіўная камісія // 90 гадоў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі. — Мінск; Віцебск, 2000. — С. 40–44; Апошнія гады // Полоцкий летописец. — 1993. — № 1 (2). — С.82–86; Гісторык з Віцебска: жыццяпіс Аляксея Сапунова // Віцебскі сшытак. — 2000. — № 4. — С. 3– 63; Віцебскія карані роду Адляніцкіх-Пачобутаў // Віцебскі сшытак. — 2000. — № 4. — С. 132–136; Несколько фактов из истории одного здания // Бюллетень Музея Марка Шагала. — 2002. — № 2 (8). — С. 23–24; Новые сведения к биографии Беллы Розенфельд витебского периода // Бюллетень Музея Марка Шагала. — 2003. — № 2 (10). — С. 13–17; Сентябрьский конфликт 1919 года в Народном художественном училище //Тамсама. — 2003. — № 2 (10). — С. 17–20; Из истории витебской еврейской общины XVI–XVII вв. // Шагаловский сборник: материалы VI–IX Шагаловских чтений в Витебске (1996–1999). Вып. 2. — Витебск, 2004. — С. 88–92; Витебское окружение Марка Шагала: Виктор Меклер, Тея Брахман, Оскар Мещанинов, Осип Цадкин, Михаил Либаков, Рувим Мазель // Бюллетень Музея Марка Шагала. — 2005. — № 13. — С. 55–63; Віцебск і Шагал // Мастацтва. — 2006. — № 9. — С. 54–55; Марк Шагал и Витебская масонская ложа // Бюллетень Музея Марка Шагала. — Вып. 15. — Мн.: Рифтур, 2008. — С. 75–80; Die Ruckkenr von Marc Chagall nach Witebsk // Wostok. Belarus. In Zentrum Europas. — 2002. — Tom VII. — S. 24–26; Ludmiła Chmielnicka. Działalność kulturalno-mecenasowska Ogińskich na Witebszczyżnie // Przegłęd wschodni. — 2001. — Tom VII. — Zsz. 4 (28). — S. 1043–1060; Гістарычныя звесткі пра латгальскія землі ў працах віцебскага гісторыка А. П. Сапунова, 1852–1924 // Беларусь і Латвія: адміністрацыйнае,

сацыяльна-эканамічнае і культурнае ўзаемадзеянне ў Дзвінскім рэгіёне: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі «Разам на працягу стагоддзяў (беларуска-латышскія ўзаемадачыненні ў Дзвінскім рэгіёне)», Віцебск, 14–15 лістапада, 2006 год / пад рэд. Л. Хмяльніцкай. — Мн.: Тонпік, 2006. — С. 66-83; Сплетение судеб: Исаак Розенфельд, Софья Дымшиц-Толстая, Марк и Белла Шагалы // Бюллетень Музея Марка Шагала. Вып. 14. — Витебск, 2006. — С. 87–109; Марк Шагал. Возвращение на родину // Декоративное искусство (Москва). — 2006. — № 6. — С. 50–53; Летняя школа при Музее Шагала: искусство без границ // Бюллетень Музея Марка Шагала. Вып. 15. — Мн.: Рифтур, 2008. — С. 17–21; Марк Шагал и витебская масонская ложа // Бюллетень Музея Марка Шагала. Вып. 15. — Мн.: Рифтур, 2008. — С. 75–80; Марк Шагал в художественной культуре Беларуси 1920–1990-х годов // Шагаловский сборник. Вып. 3: материалы X–XIV Шагаловских чтений в Витебске (2000–2004). — Мн.: Рифтур, 2008. — С. 92–99; Архитектурный пейзаж на работах Марка Шагала витебского периода // Тамсама. — С. 100–103; Новые сведения к биографии Беллы Розенфельд витебского периода // Тамсама. — С. 104–109; Сентябрьский конфликт 1919 года в Витебском народном художественном училище // Тамсама. — С. 110–114; Марк Шагал: Годы учебы в Витебском городском училище // Тамсама. — С. 115–124; (разам з В. Шышанавым) К истории коллекций современного искусства в музеях Витебска, 1918–1941 гг. // Тамсама. — С. 125–161; Философ Семен Грузенберг и академическая среда Витебска 1919–1920 годов // Невельский сборник. Вып. 13. — СПб.: Акрополь, 2008. — С. 117–130; «Il etait le levain de sa generation». Lettres de Blaise Cendrars a Marc Chagall, moi – octobre 1913 // Dis-moi, Blaise. Leger, Chagall, Picasso et Blaise Cendrars, 27 juin – 12 octobre 2009. — Paris, 2009. — P. 77–81; Иллюстрации Марка Шагала к поэме Н. В. Гоголя «Мертвые души» = Illustrations by Marc Chagall for N. N. Gogol «Dead souls»: сопроводительный текст к набору репродукций. — Мн.: Минская печатная фабрика Гознака, 2009; Беларусь – Латвия: Новый мост культурного сотрудничества // Бюллетень Музея Марка Шагала. Вып. 16–17. — Витебск: ВОТ, 2009. — С. 12–13; К истории одной идеи Марка Шагала: От городского художественного музея к Музею современного искусства в Витебске // Тамсама. — С. 102–114; «Привал комедиантов»: Первый театральный опыт Марка Шагала // Тамсама. — С. 115–122.

<u>Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку:</u> Першы дзяржаўны архіў на Беларусі: Віцебскі архіў старажытных актаў // ВР. — 1989. — № 164. — С. 4; На Театральной, у Пиона // ВК. — 1990. — 14 ліп.; Хто зруйнаваў Замкавую гару? // ВР. — 1990. — № 146; Вечны помнік Віцебшчыне // ВР. — 1990. — 9 жніўня; Віцебскія вежы // ВР. — 1990. — № 197; З віцебскай геральдыкі // ВР. — 1990. — 6 снеж.; У Зафатая. На Спасской // ВК. — 1990. — № 26 (1, 8, 15, 22 снеж.; За сто лет до революции // ВК. — 1991. — 9 сак.; Университет в Витебске // ВК. — 1991. — № 11. — С. 6; Ён ведаў больш за нас // ВК. — 1991. — 23, 30 сак.; Энцыклапедыя паўночнай Беларусі // ВР. — 1991. — № 58–61; Апошнія гады // ВР. — 1991. — 27, 28, 29 сак.; Памяці прафесара // ВР. — 1991. — 30 сак.; Віцебская гімназія // ВР. — 1992. — 21, 22 студз.; Только дождь спас Витебск // ВК. — 1992. — 13 лют.; Картины весьма мрачны и мало утешительны // ВК. — 1992. — 20 лют.; Пять парикмахеров и 34 золотых дел мастера // ВК. — 1992. — 27 лют.; Віцебскія базыльяне // Выбар. — 1992. — № 5. — С. 4–5; «На Белай Русі, у Сар'і…» // ВР. — 1992. — 4 чэрв.; Старыя дамы Віцебска // ВК. — 1992. — 16, 30 крас., 14, 21, 28 мая, 11, 25 чэрв., 2 ліп.; (разам з І. Цішкіным) Адкрыццё Аршанскага езуіцкага калегіума // АГ. — 1992. — 7 ліп.; Витебская магдебургия // Славянский базар. — 1992. — 18 ліп.; Віцебскае старажытнасховішча // ГлР. — 1992. — 5 ліст.; Вы не из шляхты? // ВК. — 1993. — 3 снеж.; Князі Агінскія ў Віцебску // Выбар. — 1993. — № 12. — С. 3; Даследчык і краязнаўца // БЗ. — 1993. — 6, 9 кастр.; Смаляны: нарыс з гісторыі вёскі // ГлР. — 1993. — 11, 18 ліст, 2, 9, 16, 23 снеж.; Аршанскі езуіцкі калегіум // ГлР. — 1994. — 22, 29 верас.; Падземны горад // Наша Ніва. — 1995. — № 5; Царква на Прачысценскай гары // Витебские ведомости. — 1995. — 25 жніўня; У Маркавым манастыры // Витебские ведомости. — 1995. — 8 верас.; Вуліца, якую ведаюць у свеце // ГлР. — 1995. — 28 верас.; У Віцебску, у Задзвінні // ГлР. — 1996. — 1, 8 лют.; Царква ў Маркавым манастыры // Віцьбічы. — 1997. — 28 чэрв.; Гісторыка-краязнаўчыя перыёдыкі Віцебшчыны // ГлР. — 1997. — 13 сак.; «…К оздобе меской» // ГлР. — 1997. — 24 крас.; Шагал и КГБ // ВК. — 2002. — 9 жніўня; Mecenat książąt Ogińskich na Witebszczyzżnie // Głos znad Niemna. — 2000. — 6 stycz.; Калона ў гонар Канстытуцыі // ТиО. — 2008. — № 18. — С. 12; Набыткі веку Асветы // ТиО. — 2008. — № 19. — С. 12; Падарожжа з ВКЛ да Карла Вялікага // ТиО. — 2008. — № 20. — С. 7; Тры партрэты Яна Рустэма // ТиО. — 2008. — № 21. — С. 7; Архітэктурная перліна неаготыкі Беларусі // ТиО. — 2008. — № 22. — С. 12; Смалянскі замак // ТиО. — 2008. — № 24. — С. 12; Пра мястэчка Смаляны і «Помнік ІІІ Інтэрнацыяналу» // ТиО. — 2008. — № 27. — С. 16; Апошні прытулак Тамаша Зана // ПО. — 2008. — № 35. — С. 27; Бона Сфорца і Смаляны: гісторыя пра тое, чаго не было // ПО. — 2008. — № 39. — С. 23; «Город, фанатически любящий оперу» // ВВ. — 2009. — 12 ліст. — С. Х; Гастрольный тур Мейерхольда // ВВ. — 2009. — 17 снеж. — С. Х.

Літ.: Шпакоўская Г. «Віцебскі сшытак» доўжыць расповед // НС. — 2001. — 23 студз. — С. 5; Пукшанский А. Музей Шагала — в XXI век // ВК. — 2001. — № 17. — С. 1, 3; Дружкова Кс. Гаспадыня дома Шагала // ВР. — 2001. — 7 ліп. — С. 6; Шпакоўская Г. Людміла Хмяльніцкая: «Я адпачываю ў архіве» // НС. — 2002. — 4 мая. — С. 5; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Хмяльніцкая Л.У. (3.12.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ХМЯЛЮК** МАРЫЯ ГЕНРЫХАЎНА (5.08.1955, в. Белакозы Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобл.), архівіст, краязнаўца. Скончыла факультэт гісторыі і грамадазнаўства ГрДУ (1978). Працавала настаўнікам геаграфіі Макаравецкай ВШ Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобл. (1972–1973), настаўнікам нямецкай мовы, выхавацелем інтэрната Гладкаўскай ВШ Чавускага раёна Магілёўскай вобл. (1973–1977), інструктарам Чавускага райвыканкама Магілёўскай вобл. (1977–1982), інструктарам Талачынскага райвыканкама (1982–1987), карэктарам, карэспандэнтам раённай газеты «Время Ямала» Цюменскай вобл. РФ (1987–1992), інструктарам фізічнай культуры, спорту і турызму



Талачынскага райвыканкама (1993–1998), загадчыцай Талачынскага раённага архіва па асабовым складзе (з 1999).

Актыўна даследаваць гісторыю раёна пачала пасля таго, як азнаёмілася з дакументамі, перададзенымі раённаму архіву Занальным дзяржаўным архівам ў г. Орша (2001). Значны ўплыў аказала знаёмства з публікацыямі талачынскага краязнаўцы А.А. Шнэйдара. Вывучае гісторыю Талачынскага краю, аддаючы перавагу даследаванням перыяду 1941–1944 гг., гісторыі населеных пунктаў, прадпрыемстваў, арганізацый, калгасаў, саўгасаў раёна, канфесійнай гісторыі, тапаніміцы мясцовасці. Некаторыя матэрыялы выкарыстаў А.А. Шнэйдар пры напісанні кнігі «Мая Талачыншчына».

Удзельнічае ў канферэнцыях (з 2001). Ініцыятар шэрагу мясцовых грамадскіх ініцыятыў (канферэнцыі, адкрытыя сталы і інш.), прысвечаных гісторыі Талачыншчыны. Адзін з арганізатараў, разам з супрацоўнікамі Талачынскага краязнаўчага музея, работнікамі райвыканкаму, «круглых сталоў» на тэмы: «Путь к Победе» (2006), «Суровая правда войны» (2007), «Связующая нить поколений (20-годдзе раённай арганізацыі ветэранаў)» (2007), «Таямніцы Бацькаўшчыны» (2008). Актыўна публікуе артыкулы, заснаваныя на архіўных матэрыялах па гісторыі краю, у газеце «Наша Талачыншчына». Мае некаторыя ненадрукаваныя працы: «Гісторыя Талачынскага раёна ў гады нямецка-фашысцкай акупацыі 1941–1944 гг.», «Праваслаўная царква на Талачыншнчыне 1918–1992 гг.», «Гісторыя каталіцтва на Талачыншчыне», «Сангушкі», «Яўрэйскае гета», «З гісторыі калгасаў 1941–1944 гг.». Напрацаваныя матэрыялы па гісторыі раёна захоўваюцца ў чытальнай зале Талачынскага раённага архіва па асабовым складзе і ў прыватным архіве. Аўтар шэрагу артыкулаў па гісторыі і культуры Талачыншчыны на старонках навуковага і перыядычнага друку.

Тв.: Артыкулы ў навуковым друку: Из опыта работы Толочинского районного архива по личному составу // АіС. — 2002. — № 4. — С. 87–90; Документы по личному составу как источник изучения истории района: Толочинский опыт // АіС. — 2005. — № 2. — С. 86–89; Роль районного архива в изучении исторического прошлого Толочинского района // Витебщина архивная в начале XXI века: Связь времен. — Витебск, 2008.

Артыкулы ў перыядычным друку: «Это наша с тобой биография…»: [гісторыя Талачынскай тэкстыльнай фабрыкі 1927–1980] // НТ. — 2001. — 28 лют., 3 сак.; «Это наша с тобой биография…»: [гісторыя Талачынскага лясгаса 1944–1949] // НТ. — 2001. — Ліпень; Успомнім іх паіменна: [аднаўленне дзейнасці калгасаў на Талачыншчыне] // НТ. — 2003. — 10 крас. — С. 3; Спасенное детство: [гісторыя Пераваланянскага спецыялізаванага дзіцячага дома 1945–1956] // НТ. — 2003. — 5 мая. — С. 2; Зберагчы крупіцы гісторыі: [важнасць краязнаўчай работы] // НТ. — 2003. — 23 ліст. — С. 2; Люди и судьбы // НТ. — 2003. — № 49–50. — С. 4; Вторая жизнь героев // НТ. — 2003. — № 58–59. — С. 3; О чем говорят документы: [Вялікай Айчыннай вайна на Талачыншчыне] // НТ. — 2003. — № 104–105. — С. 4; Як гэта было: [святкаванне 1 мая 1945 г.] // НТ. — 2004. — 1 мая. — С. 2; У цяжкі пасляваенны час: [добраўпарадкаванне вуліц Талачына ў 1944 г.] // НТ. — 2004. — 5 мая. — С. 2; «Остановись, мгновенье…»: [аднаўленне гандлёвага абслугоўвання насельніцтва ў 1944–1952 гг.] // НТ. — 2004. — 12 чэрв. — С. 2; Да дня ўтварэння раёна // НТ. — 2004. — № 48. — С. 2; Адраджэнне духоўнасці: [да 200-годдзя Свята-Пакроўскай царквы] // НТ. — 2004. — № 69. — С. 2; Умелі працаваць і адпачываць: [да 40-годдзя саўгаса «Навінкі»] // НТ. — 2005. — 22 студз. — С. 2; Квітней, мая родная зямля: [да 45-годдзя саўгаса «Рыдамльскі»] // НТ. — 2005. — 5 сак. — С. 2; О чем говорят документы: [гісторыя вайны па нямецкіх дакументах] // НТ. — 2005. — 2, 6 крас.; Люди и судьбы // НТ. — 2005; Хроника военных лет на Толочинщине // НТ. — 2005. — 7 мая. — С. 24; Вторая жизнь героев: [наданне вуліцам імёнаў герояў вайны] // НТ. — 2005. — 14 мая. — С. 2; Халопкавічы (Коласава): [гісторыя в. Коласава] // НТ. — 2005. — 22 чэрв. — С. 2; Застылае неба: [знішчэнне Талачынскага гета] // НТ. — 2005. — 6 ліп. — С. 2; Палявая (Манастыры): [гісторыя в. Палявая] // НТ. — 2005. — 6 жніўня. — С. 2; Ельнік (Папоўка): [гісторыя в. Ельнік] // НТ. — 2005. — 20 жніўня. — С. 2; Талачын: [легенды і паданні] // НТ. — 2006. — 6 студз. — С. 2; Цена предательства // НТ. — 2006. — № 36–37. — С. 6; Новый порядок: мифы и реальность: [фашысцкі парадак на Талачыншчыне] // Тамсама. — С. 7–8; В том далёком памятном году: [1941] // НТ. — 2006. — № 49. — С. 3; (разам з М. Каралёвым) Правитель Монголии и Толочинская ветвь: [барон Унгерн фон Штернберг] // НТ. — 2006. — № 62. — С. 4; Памяць продкаў: [тапаніміка Талачыншчыны] // НТ. — 2006. — № 80. — С. 3; Вялікі Голад: [голад 1601–1604 гг.] // НТ. — 2006. — 27 снеж. — С. 3; Календарь знаменательных и памятных дат в истории района на 2007 г. // НТ. — 2007. — № 4. — С. 4; Справы даўно мінулых дзён: [1930-я] // НТ. — 2007. — № 19, 23 мая, 18 жніўня, 20, 27 кастр.; Так нараджаўся рынычны гандаль // НТ. — 2007. — 21 ліп. — С. 3; Лёс аднаго праекта // НТ. — 2007. — 8 жніўня. — С. 3; Святар паэт, грамадзянін: [У.К. Мазалеўскі] // НТ. — 2007. — № 60. — С. 2; (разам з М. Каралёвым) Отныне и во веки веком…: [да 155-годдзя каталіцкага храма і 15-годдзя парафіі ў Талачыне] // НТ. — 2007. — № 102. — С. 3; Беларускае мястэчка // НТ. — 2008. — № 4. — С. 4; Райплану — 75 лет // НТ. — 2008. — 16 крас. — С. 3; Календарь знаменательных и памятных дат в истории района на 2008 г. // НТ. — 2008. — № 8. — С. 3; Голошево // НТ. — 2008. — № 36. — С. 4; Друцк // НТ. — 2008. — № 48. — С. 3; Заложники времени: [сав. салдаты ў нямецкім палоне] // НТ. — 2008. — № 50. — С. 1, 2; Народная вайна: [1943] // НТ. — 2008. — № 53–54. — С. 3; След на земле: [да 50-годдзя Талачынскай ПМК-65] // НТ. — 2008. — 1 ліст. — С. 3; Первая немецкая оккупация: [1918] // НТ. — 2008. — № 84. — С. 4; Из истории колхозов: 1919–1941 гг. // НТ. — 2008. — № 91, 92.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Хмялюк М.Г. (2.12.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ХОМІЧ** ФРАНЦ ІГНАТАВІЧ (31.03.1949, в. Седлярова Дунілавіцкага раёна Полацкай вобл., цяпер Пастаўскі раён Віцебскай вобл.), педагог, краязнаўца. Скончыў Дунілавіцкую СШ (1966), Аршанскае педагагічнае вучылішча (1977), настаўнік працы і чарчэння) факультэт агульнатэхнічных дысцыплін МДПІ (1984). Працаваў матарыстам-матросам у Беламорска-Анежскім параходстве, на цеплаходзе «Балтийский-70» (1966–1970), настаўнікам у школах Пастаўскага раёна (1970–2004), з іх — 27 гадоў у Дунілавіцкай СШ. Жыве ў в. Дунілавічы Пастаўскага раёна.




Краязнаўчую дзейнасць распачаў пад уплывам прачытання краязнаўчых артыкулаў у розных выданнях, а таксама тэлеперадачы «Падарожжы дылетанта» ў 2005 г. Даследуе гісторыю яўрэйскіх мястэчак у Заходняй Беларусі, падзеі Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Пастаўскага раёна, канфесійную гісторыю ў рэгіёне. Браў удзел у стварэнні музея ў Дунілавіцкай СШ.

Стварыў у сябе на падвор'і куток народнага побыту Пастаўшчыны, сярод цікавых экспанатаў — драўляная лапата для выпечкі хлеба, трапло, драўлянае кола і інш. рэчы. Збірае матэрыялы па гісторыі краю, арганізуе вандроўкі і экспедыцыі па раёне, праводзіць экскурсіі. Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Храмы Дунілавіч // ВГ. — 2008. — № 11. — С. 4; Сям'я няпоўнай стала // ЛіМ. — 2008. — № 23.
Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Хоміч Ф.І. (13.08.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ХРОМАВА** Э.Ф., гісторык. Кандыдат гіст. навук (1954). Аўтар дысертацыйнага даследавання «Крестьянское движение в Витебской губернии в 1907–1909 гг.», абароненага ў БДУ (1954).

Тв.: Крестьянское движение в Витебской губернии в 1907–1909 гг.
Літ.: Міхнюк У.М. Доктарскія і кандыдацкія дысертацыі па гістарычных навуках у Рэспубліцы Беларусь, 1991–2003 гг.: бібліяграфічны паказальнік. — Мн.: НАРБ, 2006. — 68 с.

**ЦВЯТКОЎ** ГЕНАДЗЬ СЯМЁНАВІЧ (1927–1974), краязнаўца. Скончыў Багушэўскую СШ, геаграфічны факультэт БДУ. Працаваў настаўнікам у СШ № 2 г.п. Багушэўск, Багушэўскай школе працоўнай моладзі. Займаўся даследаваннямі гісторыі роднага краю. Дзякуючы яго дапамозе быў знойдзены самалёт У.М. Гарбунова, які загінуў 24.06.1944 г. пры вызваленні раёна.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Кузняцова А.В. (10.10. 2008) // захоўваецца ў асабістым архіве.



**ЦІМЧАНКА** ГАЛІНА АЛЯКСАНДРАЎНА (1926), педагог. Вывучае гісторыю месца пражывання. Даследуе гісторыю адукацыі ў раёне, падзеі Вялікай Айчыннай вайны ў краі. Высвятляла лёсы салдат, якія ваявалі пры вызваленні Лёзненшчыны, вяла перапіску з роднымі, збірала дакументы. Вяла вялікую арганізацыйную працу па ўзвядзенні помніка на т.зв. «Ціхмянаўскай вышыні» (1972). З'яўлялася кіраўніком музея баявой і працоўнай славы Бабынавіцкай СШ Лёзненскага раёна. Жыве ў в. Бабынавічы.

Тв.: Вечной молодости возраста нет. К 100-летию Бабыновичской СШ // СП (Л). — 1997. — 2 верас. — С. 2; Такой ценой досталась победа // СП (Л). — 2004. — 2 ліп. — С. 1, 2; Судьба артиллериста: [Р.М. Казацкі] // СП (Л). — 2006. — 6 мая. — С. 7.

**ЦІХАМІРАВА** ІРЫНА МІКАЛАЕЎНА, краязнаўца. Працягвае справу маці — Н.К. Ціхаміравай. Працуе ў СШ № 1 г.п. Лёзна. Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў перыядычным друку.

Тв.: Погляд у мінуўшчыну // СП (Л). — 1997. — 25 ліст. — С. 3; «Ні ў агні не гарыць, ні ў вадзе не тоне»: [155 год М.Я. Нікіфароўскаму] // СП (Л). — 2001. — 12 мая. — С. 3; Настаўнік, этнограф, краязнаўца: [160 год М.Я. Нікіфароўскаму] // СП (Л). — 2005. — 17 мая. — С. 2; Белорусский парижанин покорил Европу: [Б. Забораў] // СП (Л). — 2008. — 17 чэрв. — С. 3.

**ЦІХАМІРАВА** НІНА КАНСТАНЦІНАЎНА (19.11.1942, в. Туманава Арзамаскага раёна Ніжагародскай вобл., РСФСР), педагог, краязнавец. Скончыла Кіраўскі педінстытут (1967), СДПІ (1981), Акадэмію паслядыпломнай адукацыі (сусветная мастацкая культура, асновы праваслаўнай культуры Беларусі, праваслаўныя святыні беларускага народа), Духоўнае вучылішча Віцебскай епархіі (2000). Працавала настаўніцай матэматыкі і пачатковых класаў у пачатковай школе № 33 г. Варкуты (1961–1972), рускай мовы і літаратуры, этыкі, арганізатарам пазашкольнай працы ў СШ № 1 г.п. Лёзна (1972–2002), кіраўніком школьнага музея (1985–2006).



Займацца вывучэннем гісторыі і культуры роднага краю пачала з 1975 г., працуючы ў СШ № 1 г.п. Лёзна. Вялікі ўплыў на станаўленне як краязнаўцы аказалі А. Куржалаў, А. Падліпскі, С. Мітраховіч, Б. Зарх. Даследуе гісторыю Лёзна і наваколляў, баявы шлях воінскіх злучэнняў, якія вызвалялі Лёзненшчыну ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Збірае інфармацыю пра вядомых землякоў, святыні роднага краю.

Брала ўдзел у шэрагу рэспубліканскіх, абласных турыстычна-краязнаўчых канферэнцыях (з 1978), злётах Саветаў ветэранскіх арганізацый, якія вызвалялі Віцебшчыну (у Маскве, Ленінградзе, Мінску, Смаленску, Цвяры і інш. гарадах). Падтрымлівае стасункі з рэспубліканскім і віцебскім абласным цэнтрам пазашкольнай працы з дзецьмі і падлеткамі, ВАКМ, Лёзненскім ваенна-гістарычным музеем, музеем абароны Масквы і інш. Матэрыялы, сабраныя Н.К. Ціхаміравай, выкарыстаны ў кнігах Г.Д. Навумчанкі «Танковый прорыв» (Донецк, 1990), «Вспомним былые сражения» (Данецк, 2002), А.М. Падліпскага «Вторая родина Марка Шагала» (Віцебск, 2002). Аўтар артыкулаў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», у кнізе «Памяць» Лёзненскага раёна. Аўтар больш за 150 артыкулаў у рэспубліканскім (газета «Рэспубліка») і мясцовым («Народнае слова», «Віцьбічы», «Сцяг працы») перыядычным друку. Мае шэраг ненадрукаваных матэрыялаў (нарысы, аповесць, пуцявыя нататкі). Некаторыя матэрыялы перадала ў Лёзненскі ваенна-гістарычны музей, Музей абароны Масквы, Арзамаскі краязнаўчы музей, школьныя музеі Віцебска, Масквы, Аленіна, Люберцаў, Духаўчышыны.

Тв.: Лёзна // ЭГБ. Т. 4. — Мн., 1997. — С. 358–359.

Артыкулы ў перыядычным друку: Православие и народное образование на Лиозненщине // СП (Л.). — 1995. — 14 ліст.; «Время собирать камни…». О лиозненской Свято-Вознесенской церкви // СП (Л). — 1996. — 12 студз. — С. 3; Возвращение из небытия: [А.І. Пластаў] // СП (Л). — 1996. — 28 крас. — С. 2; Актриса Жанна Прохоренко и её корни на Лиозненщине: [актрыса, якая выканала гал. ролю ў фільме «Балада пра салдата» Г. Чухрая] // СП (Л). — 1996. — 12 снеж.; «А золотые купола кому-то черный глаз слепили» // СП (Л). — 1997. — 18 ліст. — С. 2; Погляд у мінулае: [вёскі Лёзненшчыны] // СП (Л). — 1997. — 25 ліст.; Не вернулся из боя: [Герой Савецкага Саюза Г.Ф. Пацёмкін] // СП (Л). — 1998. — 2 ліп.; Захаваць імёны для нашчадкаў // СП (Л). — 1998. — № 81. — С. 2; Лиозно в начале XX века // СП (Л). — 1998. — 24 ліст. — С. 3–4; Церковно-приходские школы на Лиозненщине // СП (Л). — 1999. — 29 снеж. — С. 3; «Ні ў агні ні гарыць, ні ў вадзе не тоне» // СП (Л). — 2000. — 4 крас.; Первое знамя на Витебщине // СП (Л). — 2000. — № 81. — С. 2; Танк на пьедестале // СП (Л). — 2001. — № 14. — С. 2; Адреса Марка Шагала // СП (Л). — 2001. — 27 сак. — С. 3; На алтарь Победы // СП (Л). — 2001. — 15 мая. — С. 3; Сутокское подполье // СП (Л). — 2002. — № 48. — С. 2; На Соборной площади // СП (Л). — 2002. — № 56. — С. 2; Они стояли насмерть: [вызваленне Лёзна] // СП (Л). — 2002. — 19 ліст. — С. 3; Хрысціянскі подзвіг княжацкага роду Агінскіх // СП (Л). — 2001. — 22 мая. — С. 3; На соборной площади // СП (Л). — 2002. — 20 ліп. — С. 2; Истоки Марка Шагала // СП (Л). — 2003. — 6 чэрв.; Зарождение славной традиции: [гісторыя музея СШ № 1] // СП (Л). — 2003. — № 81. — С. 3; Настаўнік, этнограф, краязнаўца: [М.Я. Нікіфароўскі] // СП (Л). — 2005. — № 40. — С. 2; «В тяжкий час земли родной»: [95-годдзе А. Твардоўскага] // СП (Л). — 2005. — № 50. — С. 3; Есть такая деревня…: [в. Зубкі, сям'я Лакісавых] // СП (Л). — 2005. — № 55. — С. 2; Так сложилась ее жизнь // СП (Л). — 2005. — № 57. — С. 2; За веру и Отечество: [Аляксандр Неўскі] // СП (Л). — 2005. — № 74. — С. 2; Шагнувшие в пламя войны: [лёсы землякоў] // СП (Л). — 2006. — № 48, 49, 5055, 57, 59, 60; Ученый Буглов и его родословная // СП (Л). — 2006. — 6 мая. — С. 2–3; Белорусский парижанин покорил Европу: [Б. Забораў, бацька якога паходзіў з Лёзна] // СП (Л). — 2008. — № 47. — С. 3.

Літ.: Падліпскі А.М. // НС. — 1995. — № 56; Манойла В. Краязнаўцы аб'ядналіся! // Спадчына (Л). — 2001. — № 2. — С. 1; Сучасныя беларускія краязнаўцы // КГ. — 2007. — № 3 (164), студзень. — С. 2; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Ціхамірава Н.К. (25.06.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ЦІШКІН** ІГАР АНАТОЛЬЕВІЧ (6.09.1961, Віцебск), археолаг, гісторык, грамадзкі дзеяч. Скончыў СШ № 21 г. Віцебска, гіст. факультэт МДПІ (1988). Працаваў токарам у віцебскім вытворчым аб'яднанні «Маналіт» (1980–1982), навуковым супрацоўнікам ВАКМ (1982–1988), археолагам на прадпрыемстве «Віцебскпраектрэстаўрацыя» (1988 –1995), АКПМ-2, прыватным прадпрымальнікам.

Адзін з ініцыятараў стварэння клуба «Узгор'е» (1986), дзейнасць якога была накіравана на абарону архітэктурнай і гістарычнай спадчыны Віцебска. Дзякуючы дзейнасці клуба былі выратаваны некаторыя помнікі гісторыі і культуры, гіст. месцы г. Віцебска (Трынітарскі кляштар, Дабравешчанская царква, гістарычная забудова Успенскай горкі), падрыхтаваны да рэстаўрацыі касцёл Св. Варвары, праведзена добраўпарадкаванне рэчышча Віцьбы, Сямёнаўскіх могілак. Клуб дапамагаў археолагам, якія праводзілі раскопкі ў Віцебску: Т.С. Бубеньцы, Л.У. Калядзінскаму, В.М. Ляўко.

Праводзіў археалагічныя даследаванні Уваскрасенскай царквы, Успенскага сабору, былых саляных складоў і шэрагу іншых помнікаў архітэктуры Віцебска, а таксама Куцеінскага манастыра, Езуіцкага калегіума і Базыльянскага кляштара ў Оршы.

Аўтар брашур, прысвечаных гісторыі і культуры Віцебска: «Віцебск. Страчаная прыгажосць горада», «Віцебскія замкі», «Пра што расказвае віцебскі гарадскі герб», «Пад мурамі саляных складоў», а таксама шматлікіх артыкулаў у навуковым і перыядычным друку. Разам з аднадумцамі стварыў відэафільм, прысвечаны віцебскім замкам (2002).







У час працы ў ВАКМ даследаваў тэму «Культура г. Віцебска X–XIII ст.» (НА ВАКМ, спр.722).

Тв.: Кнігі: Віцебск. Страчаная прыгажосць горада. — Віцебск: ВАД, 2002. — 48 с.; Віцебскія замкі. — Віцебск: ВАД, 2003. — 16 с.; Пад мурамі саляных складоў. Невядомы помнік беларускага рэнесансу. — Мн.: Знаменіе, 2005. — 12 с.

Артыкулы ў навуковым друку: Манетны клад XVII–XVIII ст. // ПГіКБ. — 1984; (разам з І. Чарняўскім) Віцебская ратуша // ПГіКБ. — 1987. — № 2. — С. 17–20; (разам з Л. Хмяльніцкай) Езуіцкі калегіум у Оршы // Гісторыка-археалагічны зборнік. — 1994. — № 3. — С. 228–236; (разам з І. Чарняўскім) Віцебская ратуша // Віцебскі сшытак. — 1996. — № 2. — С. 33–

35; Храм на рынку ў Віцебску // Тамсама. — С. 54–56; Невядомы помнік беларускага рэнесанса // Castrum, ubris et bellum, 2002. — С. 391–396.

Артыкулы ў перыядычным друку: Для сябе, для нашчадкаў: [прапановы па ахове помнікаў мінуўшчыны ў Віцебску] // ВР. — 1987. — № 23. — С. 3; Наперадзе рэстаўрацыя // ВР. — 1987. — № 175. — С. 4; Тварам да мінулага: [580-годдзе Грунвальдскай бітвы] // ВК. — 1990. — № 6. — С. 2; Уваскрасенская царква // Выбар. — 1992. — № 4. — С. 5; (разам з Л. Хмяльніцкай) Ратуша // ВК. — 1992. — № 24. — С. 4; (разам з Л. Хмяльніцкай) Адкрыццё Аршанскага езуіцкага калегіума // АГ. — 1992. — № 82. — С. 2; Гарачае лета 1957-га: [знішчэнне сабораў у Віцебску] // Выбар. — 1993. — № 3. — С. 6; Былое прыходзіць у сённяшні дзень: [бернардзінскі кляштар у Дуброўна] // ДнП. — 1997. — № 94. — С. 2; Дзе маліліся віцебскія майстры? // Спадчына. — 2002. — № 4.

Літ.: Людзьмі звацца: [І. Цішкін] // ВК. — 1990. — № 16. — С. 4; Хто ёсць хто: [І. Цішкін] // Выбар. — 1992. — № 11. — С. 5; Сахараў Сяргей. Ігар Цішкін: [электронны рэсурс]. Slounik. org: электронная энцыкляпедыя. — Рэжым доступу: http://slounik.org/153716.html.

**ЦІШУРОЎ** УЛАДЗІМІР (*У. Уладзіміраў, Ц. Уладзіміраў*), краязнаўца, журналіст. Пражывае ў Круглянскім раёне Магілёўскай вобл. Вывучае гісторыю і культуру месца пражывання, а таксама часткова тэрыторыю Талачынскага раёна Віцебскай вобл. Аўтар артыкулаў у перыядычным друку.

Тв.: Устрывожаны прах генерала: [пахаванне генерала П.І. Хамянтоўскага] // НТ. — 2001. — № ?; Лес пана Гардзялоўскага // НТ. — 2003. — № 36–37. — С. 2; Залужжа // НТ. — 2005. — № 119. — С. 3; Юзэфполле: [парк] // НТ. — 2005. — № 4–6. — С. 7; Курганы — сведкі тых падзей // НТ. — 2008. — № 1. — С. 3.

**ЦУПРЫЯНОВІЧ** МАРЫЯ ЯЎГЕНАЎНА (14.11.1958, в. Галошава Талачынскага раёна), бібліятэкар, краязнаўца. Скончыла ДБУК (1995). Працуе загадчыцай Коханаўскай бібліятэкай (з 1984). Праводзіць вялікую краязнаўчую працу ў дзіцячым гуртку «Крынічка» пры Коханаўскай пасялковай бібліятэцы. Вывучае гісторыю, прыроду Талачыншчыны. Стварыла краязнаўчы куток. Збірае творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, арганізуе выставы ў бібліятэцы. Аўтар некалькіх артыкулаў у мясцовым перыядычным друку.

Тв.: Заповедные уголки моей маленькой Родины: [в. Галошава] // НТ. — 2007. — № 76. — С. 4; Рацевский парк — заповедный уголок родной природы: по маршруту экскурсии членов клуба «Родничок» // НТ. — 2008. — № 82. — С. 4.

Лит.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Цупрыяновіч М.Я. (20.01.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ЦЯРЭНЦЕЎ** СЯРГЕЙ (26.03.1956–†), рабочы. Актыўны ўдзельнік грамадска-палітычнага жыцця Віцебска другой паловы 1980-х — 1990-х гг. Адстойваў ахаванне гіст. спадчыны Віцебска. Разам з інш. актыўнымі ўдзельнікамі клуба «Узгор'е» бараніў ад знішчэння Пакроўскую царкву. Напісаў дзясяткі лістоў і запытаў у адпаведныя інстанцыі, міністэрствы, пракуратуру аб тым, што будаўніцтва шматпавярховага будынку, якое планавалася на месцы царквы і Трынітарскага кляштара, сказіць гіст. забудову, зменіць гістарычныя дамінанты горада. Атрымаўшы планы ахоўных зон, даказваў неправамоцнасць такога будаўніцтва ў артыкуле «Небоскребная дикость», змешчанага ў газеце «Віцебскі рабочы».

10.11.1990 г. разам з аднадумцамі спрабаваў усталяваць у якасці часовага помніка ахвярам, трагічна загінуўшым у розныя часы гісторыі г. Віцебска, драўляны крыж на Успенскай горцы з надпісам «Пакутнікам Беларусі». Такія ж крыжы былі ўсталяваны каля в. Паляі Варонаўскага с/с Віцебскага раёна, на месцы растрэлаў 1933–1937 гг. у в. Нікалаёва Шумілінскага раёна, на месцы знішчэння зняволеных з Беразвецкай турмы атрадам аховы НКУС у ліпені 1941 г.

Аўтар артыкулаў на старонках перыядычнага друку, у якіх уздымаў актуальныя пытанні грамадскага жыцця горада.

Тв.: Тропа здоровья по костям: [нямецкія могілкі ў в. Сасноўка Віцебскага раёна] // ВК. — 1990. — № 23. — С. 4; Героям Грунвальдскай бітвы: [будаўніцтва помніка ў Віцебску] // НС. — 1991. — № 13. — С. 3; Памятная дошка ў гонар Грунвальда // ВК. — 1991. — № 36. — С. 3; Нет креста… Предполагалось, что это будет место поминовения всех безвинно убиенных // НС. — 1991. — № 59. — С. 2; И. Кунцевич: Легенды и вымысел // Віцьбічы. — 1991. — № 20. — С. 3.

Літ.: Паляі, Нікалаёва… Што далей: [С. Цярэнцеў] // ВК. — 1990. — № 10. — С. 1, 2; Бруцкі А. Арыштаваны крыж // НС. — 1991. — № 37. — 2; Малашэня Л. Каму крыж муляў вока // НС. — 1991. — № 55. — С. 3.

**ЦЯРЭШЧАНКА** ВІКТАР ДЗЯМ'ЯНАВІЧ (*В. Демьянов*) (10.03.1926, в. Альгова Віцебскага раёна Віцебскай вобл. (на той час Вёска Чырвонай Арміі)), краязнаўца. Скончыў Львоўскае ваеннае вучылішча (1951), факультэт журналістыкі БДУ (1958). Адслужыў ў войску 18 гадоў (звольнены ў запас у 1961 г.). Працаваў у тэхнічным вучылішчы мастаком вытворчага навучання, зваршчыкам. Узначальваў Віцебскі гарадскі камітэт БДТАПГіК. Пражывае ў в. Копці Віцебскага раёна.



Пасля выхаду на пенсію ў 1985 г. пачаў цікавіцца мясцовай гісторыяй. Вывучае гісторыю краю, аддаючы перавагу даследаванню падзей часоў Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі паўднёвага ўсходу Віцебскага раёна (Акцябрскі і Шапечынскі с/с), ваенныя дзеянні 33-й арміі пры вызваленні Віцебшчыны.

Ініцыятар стварэння памятнага мемарыялу ў гонар 60-годдзя Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг. у в. Копці, прысвечанага воінам 33-й і 39-й армій Заходняга (3-га Беларускага) фронту і ўзведзенага жыхарамі вёскі. Ініцыяваў і часткова фінансаваў узвядзенне некалькіх помнікаў: 10 гранітных абеліскаў (па колькасці вызваленых вёсак, з указаннем колькасці загінуўшых пры іх вызваленні салдат савецкай арміі), 6 помнікаў з прозвішчамі мясцовых жыхароў, загінуўшых у гады вайны, індывідуальных помнікаў афіцэрам, сярод якіх Я. Джугашвілі, стэлы ў гонар французскіх лётчыкаў палка «Нармандыя-Нёман», стэлы ў гонар прарыву фашысцкай абароны 23.06.1944 пры пачатку аперацыі «Баграціён» і некаторых інш.




Аўтар зборніка артыкулаў «На склоне лет…», у якім сабраў свае публікацыі, а таксама некаторыя матэрыялы, прысвечаныя лёсу Віцебшчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны, змясціў свой радавод (выдадзены ў 5 экзэмплярах). Разам з ветэранамі Г.С. Корбанам, У.С. Моціным, а таксама грамадскай актывісткай Л.Н. Бруевай падрыхтаваў зборнік дакументаў да 60-годдзя вызвалення в. Копці, дзе ў храналагічнай паслядоўнасці прыведзены ўспаміны, газетныя артыкулы 1941–1944 гг., якія маюць дачыненне да вызвалення населенага пункта.

Аўтар соцень артыкулаў у перыядычным друку. Большасць публікацый прысвечана падзеям Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Акцябрскага і Шапечынскага с/с Віцебскага раёна. Аднак аўтар выказвае свае меркаванні і адносна ключавых падзей Другой сусветнай вайны, грамадскага жыцця Беларусі, раёна, а таксама сусветнай мастацкай культуры, якія публікуе ў асобных артыкулах: «Поляков расстреляли немцы» (ЖП, 2002, 19 кастр.), «Торпедируют закон», «Признание Солженицына» (Ветеран, 2006, № 25), «"Рисование" беглого "классика"» (Таварищ, 1997, 12 верас.). Перадаў шэраг матэрыялаў у бібліятэку Капцянскай СШ Віцебскага раёна, у Капцянскую бібліятэку, у сельсавет.

Падпалкоўнік у адстаўцы, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны, медалямі «За ўзяцце Берліна», «За вызваленне Прагі», «За баявыя заслугі» і інш.

Тв.: «На склоне лет…»: сборник статей, заметок и воспоминаний о былом, 10 марта 2007 года. — Копти. — 176 с.; Віцебскае падполле: міфы і быль // ЧЗ. — 1990. — 1 верас.; Здесь начиналась операция «Багратион» // Віцьбічы. — 1997. — 26 чэрв.; На могильной плите — цветы // Віцьбічы. — 1997. — 7 жніўня; Вновь война будоражит память // Віцьбічы. — 1997. — 4 верас.; Мертвым не больно // Віцьбічы. — 1999. — 26 студз.; Земля у поселка Копти приняла 11 408 погибших солдат и офицеров. Кто вспомнит о них? // Віцьбічы. — 1999. — 8 крас.; В Коптях — гости из Казахстана // Віцьбічы. — 1999. — 7 мая; Забытая армия // Віцьбічы. — 2000. — 23 сак.; В небе Придвинского края // ЖП. — 2000. — 20 чэрв.; Тайна «Черных прудов» // Віцьбічы. — 2000. — 23 чэрв.; Кощунственно увековечить убийц на нашей земле // ЖП. — 2001. — 17 крас.; Погиб в Боравлянах // ЖП. — 2001. — 23 кастр.; В боях за Копти // Товарищ. — 2002. — 24 янв.; Штрафники: [удзел штрафбату ў захопе плацдарму на р. Лучоса каля в. Валасова Віцебскага раёна] // ЖП. — 2002. — 29 студз.; Саперы на… Лучесе // ЖП. — 2002. — 12 лют.; Срока давности не имеет: [Асвенцым] // ЖП. — 2002. — 2 крас.; Страшная правда войны // Народная воля. — 2002. — 7 мая; Суражская трагедия // ЖП. — 2002. — 1 чэрв.; Витебское направление в операции «Багратион» // ЖП. — 2002. — 25 чэрв.; Жизни не щадя: [баі 39-й арміі пад Копцямі] // ЖП. — 2002. — 15 кастр.; «Зеленая папка» Геринга // ЖП. — 2002. — 26 ліст.; Артиллерия не молчала: [каля в. Маклакі Віцебскага раёна] // ЖП. — 2002. — 10 снеж.; Сын Сталина в боях за Витебщину // ЖП. — 2003. — 14 студз.; Власовцы // ЖП. — 2003. — 18 лют.; Боевое крещение: [баі пад в. Копці] // ЖП. — 2003. — 4 сак.; Как казнили парашютистов в Витебске. Из дневника немецкого солдата //

ЖП. — 2003. — 4 сак.; Война для Якова Джугашвили закончилась под Лиозно // Віцьбічы. — 2003. — 8 мая; На войне как на войне: [прарыў нямецкай абароны каля в. Перавоз Віцебскага раёна] // ЖП. — 2003. — 23 ліп.; Гитлеровская группировка на подступах к Витебску // ЖП. — 2003. — 23 верас.; Расплата: [палонныя немцы] // ЖП. — 2003. — 7 ліст.; Клятва // ЖП. — 2003. — 13 снеж.; Огонь комсомольского сердца: [П.А. Галецкі] // ЖП. — 2003; Как Люба Зиновенко пленила коменданта // ЖП. — 2003; Один день генерала: [Чарняхоўскі І. пад Віцебскам] // ЖП. — 2003.; Свидетели // ЖП. — 2003; Никогда не забыть // ЖП. — 2003.; «Меланьин колхоз» // ЖП. — 2004. — 23 сак.; Яшка-артиллерист // ЖП. — 2004. — 30 сак.; Барышыно поле под Витебском // ЖП. — 2004.; Погибли под Ржевом витебчане… // ЖП. — 2004. — 6 ліп.; «Нормандия» в небе Придвинского края // ЖП. — 2004. — 24 жніўня; «Новый порядок» на пепелище // ЖП. — 2004. — 21 верас.; На подступах к Витебску // ЖП. — 2004. — 23 ліст.; Идея — создать музей узников «Пятого полка» // ЖП. — 2004. — 25 кастр.; Узники Освенцима — дети витебских партизан // ЖП. — 2005. — 25 студз.; Никогда не забыть: [Віцебскае гета] // ЖП. — 2005. — 15 сак.; На братских могилах не ставят крестов: [каля в. Лужына Віцебскага раёна] // Во славу Родины. — 2005. — 19 крас.; Ночью, у Коптей // ЖП. — 2005. — 7 мая; Вандализм на воинском захоронении // ЖП. — 2005. — 16 ліп.; Вознесенный в бессмертие // ЖП. — 2005. — 2 жніўня; Доля женская // ЖП. — 2005. — 18 кастр.; И тот святой клочек земли…: [КП 5-га гвардзейскага стралковага корпуса] // Во славу Родины. — 2005. — 27 кастр.; Сын Чапаева воевал на Витебщине // ЖП. — 2006. — 24 студз.; Внуки «Большой тройки» // Ветеран. — 2006. — № 13; «Дымановский плацдарм»: [зняты відэафільм] // Віцьбічы. — 2006. — 6 крас.; Шел вперед комиссар // ЖП. — 2006. — 6 мая; Это было под Витебском // ЖП. — 2006. — 20 чэрв.; Капитуляция // ЖП. — 2006. — 1 ліп.; Потери под Витебском // ЖП. — 2006. — 1 ліп.; Шли в бой «панцирники»: [аб выкарыстанні жалезных нагрудных пласцін савецкімі салдатамі пры наступленні каля в. Копці] // ЖП. — 2006. — 5 верас.; Забытая армия?: [33-я армія ў баях пад Віцебскам] // ЖП. — 2006. — 21 кастр.; Толочинский Матросов // Во славу Родины (Военная газета). — 2006. — 30 снеж.; Тайна захоронения // ЖП. — 2007. — № 3. — С. 2; «Авроровец» из Коптей // ЖП. — 2008. — № 2. — С. 2; «Великая Победа» — солдатские матери: [Белахвостава Пелагея — маці, якая адправіла на фронт 5 сыноў (усе загінулі)] // ЖП. — 2008. — № 5. — С. 3; Шла дивизия вперед: [3-я гв. арт. дывізія] // ЖП. — 2008. — 26 студз. — С. 3; Признания генерала: [36-я асобн. стралковая брыгада ў баях пад Віцебскам] // ЖП. — 2008. — № 17. — С. 4; «Тацинский» под Витебском // ЖП. — 2008. — № 19. — С. 5; Непокоренная высота 222,9 // ЖП. — 2008. — 30 жніўня. — С. 3; Непокоренная высота: [222,9] // ЖП. — 2008. — 20 снеж. — С. 5; Судьба человека: [В.С. Варанцоў] // ЖП. — 2009. — 10 студз. — С. 4; Правда о 33 Армии // ЖП. — 2009. — 3 сак. — С. 4; Как батька Минай на приеме у Сталина побывал // ЖП. — 2009. — 10 крас. — С. 2; Освобождая Витебск // ЖП. — 2009. — 23 чэрв. — С. 3; Что таит пруд в Ольгово? // ЖП. — 2009. — 24 кастр. — С. 3.

Літ.: Белов С. 213-я танковая бригада в боях за Витебск // Віцьбічы. — 2001. — 13 сак.; Ён адкрывае помнікі… французам і сыну Сталіна // Звязда. — 2004. — 8 верас.; Аникеев Л. От издателя // Беларусь–Россия. — 2005. — № 7–8 (31–32). — С. 47–48; Газин Д. Ольговские патриоты // ЖП. — 2005. — 15 кастр.; Русланова Н. Дипломат и внучка Сталина благодарны ветерану // ЖП. — 2006. — 1 крас.; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Цярэшчанка В.Д. (24.01.2004) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Русланова Н. Ветерану — 80 // ЖП. — 2006. — № 20. — С. 2.

**ЦЯЦЕРКА** ЛЮДМІЛА МІКАЛАЕЎНА (17.09.1952, г.п. Ушачы, Віцебскай вобл.), педагог, краязнаўца. Скончыла геаграфічны факультэт БДУ (1978). Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры Слабадской БШ Ушацкага раёна (1970–1974), настаўнік геаграфіі СШ № 1 г. Плешчаніцы Мінскай вобл. (1974–1978), Ушацкай СШ (1978–2005).

Комплексна даследуе геаграфію Ушаччыны: ад геаграфічнага становішча, флоры і фауны да ўплыву гаспадарчай дзейнасці чалавека на навакольнае асяроддзе. На працягу працы ў школе збірала матэрыял па геаграфіі Ушацкага раёна. Доўгі час з'яўлялася кіраўніком раённага метадычнага аб'яднання настаўнікаў геаграфіі, потым кіраўніком раённай творчай групы, якой была распрацавана і зацверджана праграма курса «Ушачазнаўства». На аснове матэрыялаў, сабраных настаўнікамі раёна, якія ўваходзілі ў склад групы, быў распрацаваны і выдадзены дапаможнік для курса «Ушаччына сінявокая». Падрыхтавана для друку яшчэ адно выданне на рускай мове.



Актыўна кантактуе з Ушацкім райвыканкамам, Ушацкім музеем народнай славы імя І.Е. Лабанка, раённай інспекцыяй прыродных рэсурсаў аховы навакольнага асяроддзя, раённым аддзелам статыстыкі, рэдакцыяй газеты «Патрыёт», таварыствам паляўнічых і рыбаловаў, раённай бібліятэкай імя Е. Лось, кіраўнікамі прадпрыемстваў гаспадарак раёна.

Тв.: Ушаччына сінявокая. — Мн.: БДУ, 2007. — 136 с.

Літ.: Філіпчык А. Ушаччына сінявокая // П. — 2007. — № 97. — С. 4; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Цяцерка Л.М. (11.01.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ЧАРНАРУЦКІ** АНАТОЛЬ УЛАДЗІМІРАВІЧ (4.07.1933), педагог, краязнаўца. Скончыў Аршанскі настаўніцкі інстытут, МДПІ. Працаваў настаўнікам у Чыгуначнай СШ у в. Круляўшчызна Докшыцкага раёна. Кіраваў гуртком, які ставіў за мэту вывучэнне роднага краю, выхаванне патрыятызму і грамадзянскіх якасцяў навучэнцаў. Арганізоўваў і праводзіў турыстычныя паходы па Докшыччыне і Беларусі. Вёў вялікую збіральніцкую і пошукавую працу. На аснове сабраных матэрыялаў стварыў музей у Чыгуначнай СШ в. Круляўшчызна (1965) у якім утрымлівалася больш 700 экспанатаў, а потым музей у новай СШ у Крулеўшчызне (цяпер не існуе, частка экспанатаў захоўваецца на прыватнай кватэры). Удзел у дзейнасці гуртка аказаў вялікі ўплыў на фарміраванне зацікаўленасці ў даследаваннях роднага краю ў значнага кола вучняў, у тым ліку і вядомага пазней краязнаўцы Бешанковіччыны А. Крачкоўскага.

Тв.: (разам з А. Крачкоўскім) Край Крулеўшчынскі // ЛТ. — 1990. — № 65–71; (разам з А. Крачкоўскім) Экіпаж крылатай машыны // ЛТ. — 1990. — № 100, 103, 106; (разам з В. Пашэвіч) Аэрадром стаў апошнім прытулкам // РВ. — 2005. — № 67. — С. 2.

**ЧАРНЯЎСКАЯ** СВЯТЛАНА СЯРГЕЕЎНА, кіраўнік рабочай групы па падрыхтоўцы кніг «Памяць» Полаччыны, укладальнік кніг «Памяць» г. Полацка і Полацкага раёна.

Тв.: Артыкулы ў кнізе «Памяць»: (разам з М.А. Манісам) Полаччына ў другой палове XIX – пач. XX ст. // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Полацкага раёна. — Мн.: Вышэйшая школа, 1999. — С. 59–63; Гаспадарчае будаўніцтва, калектывізацыя // Тамсама. — С. 59–63; (разам з М.А. Манісам) Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Полацка. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 358–362; Пасля вызвалення // Тамсама. — С. 484–485; Полацк у 1990-я гг. // Тамсама. — С. 700–701; Цеплаход «Полацк» // Тамсама. — С. 891.

Артыкулы ў перыядычным друку: «Памяць». Полацкі раён // ПВ. — 1995. — № 64. — С. 2; Полаччына вясковая: Адкуль яе карані? // ПВ. — 1999. — № 5, 91; Фелікс Тапчэўскі — хто ён? // ПВ. — 1999. — № 99. — С. 2; Камісар Глезін Фелікс // ПВ. — 2001. — № 69. — С. 3; Напісанае застаецца: [кніга «Памяць»] // ПВ. — 2002. — № 23, 24; Таланты Полаччыны // ПВ. — 2002. — № 38. — С. 3; Партызанскі рух на Полаччыне // ПВ. — 2002. — № 52. — С. 2; Один из «Неуловимых»: [А.Я. Целегуеў] // ПВ. — 2004. — № 39. — С. 3; Таварыш камбрыг: [Д.В. Цябут] // ПВ. — 2004. — № 150–151. — С. 2.

**ЧАРНЯЎСКАЯ** ТАМАРА ІГНАТАЎНА (2.10.1934, г. Масква), беларускі гісторык архітэктуры. Кандыдат архітэктуры (1967). Скончыла БПІ (1959). Працавала ў ІМЭФ (з 1961), адначасова выкладчыкам ў БПІ (1963–1971). Даследуе гіст. планіроўку і забудову шэрагу абласных цэнтраў краіны, у тым ліку і Віцебска. Аўтар кнігі «Архітэктура Віцебска», артыкулаў, прысвечаных Віцебску ў «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі», «Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобл.» (22 артыкулы).

Тв.: Архітектура Віцебска: З гісторыі планіроўкі і забудовы горада. — Мн.: Навука і тэхніка, 1980. — 112 с.; (разам з А.П. Белязо) Віцебск // ЗГіКБ. Віцебская воблаць. — Мн.: БелСЭ, 1985. — С. 41–47; (разам з В.М. Басковай) Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа // Тамсама. — С. 47–48; Гасцініца «Віцебск» // Тамсама. — С. 51–52; (разам з В.Б. Караткевіч) Губернатарскі палац // Тамсама. — С. 52–53; Жылы дом // Тамсама. — С. 55; Жылы дом з рэстаранам // Тамсама. — С. 55; (разам з А.А. Воінавым, А.М. Кулагіным) Забудова вуліцы Суворава // Тамсама. — С.57–58; Казанская царква // Тамсама. — С. 63–64; Касцёл Варвары // Тамсама. — С. 64; Манастыр базыліян // Тамсама. — С. 68.

Літ.: Чарняўская Т.І. // Архітэктура Беларусі: энцыклапедычны даведнік / рэдкал.: А.А. Воінаў [і інш.]. — Мн.: БелЭн, 1993. — С. 608.



**ЧКАЛАЎ** ВАЛЕРЫЙ БАРЫСАВІЧ (7.11.1945, г. Ульянаўск, РСФСР), краязнаўца. Скончыў СШ № 156 г. Горкага РСФСР (цяпер Ніжні Ноўгарад, РФ, 1962), хімічны факультэт БДУ (1967), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (Масква, 1979). Працаваў на Полацкім хімкамбінаце на пасадах інжынера-стажора, сакратара камітэта камсамола, зменным хімікам, загадчыкам сектарам цэнтральнай лабараторыі (1967–1969), 2-м, 1-м сакратаром гаркама камсамола г. Навапалацка (1969–1974), інструктарам, загадчыкам аддзела хіміі Віцебскага абкама КПБ (1974–1977, 1979–1981), нам. начальніка палітаддзела УУС Віцебскага аблвыканкама (1981–1992), у камандзіроўцы ў Афганістане (1986–1988) навуковым, ст. навуковым супрацоўнікам віцебскага музея воінаў-інтэрнацыяналістаў (1993–1998).

Гісторыяй і культурай Віцебшчыны зацікавіўся ў 1981 г., калі ўзначаліў працу па стварэнні Музея баявой і працоўнай славы Віцебскага абкама УМУС. Вывучае гісторыю дзейнасці віцебскай міліцыі, органаў кантролю Віцебскай вобл., віцебскую абласную энергасістэму, гісторыю развіцця банкаўскай справы Віцебшчыны, Напаволацкай гарадской арганізацыі ЛКСМБ, гісторыю афганскай вайны і ўдзел віцяблян у ёй.

Адзін з распрацоўшчыкаў канцэпцыі і тэматыка-экспазіцыйнага плана музея віцебскай міліцыі (1984), віцебскага музея воінаў-інтэрнацыяналістаў (1996), музея РУП «Віцебскэнэрга» (2003), музейнай экспазіцыі Галоўнага ўпраўлення па Віцебскай вобл., Нацыянальнага банка РБ (2007). Займаўся зборам экспанатаў для пералічаных музеяў.

Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку, якія змяшчаліся на старонках мясцовага перыядычнага друку: «Народнае слова», «Віцебскі рабочы», «Віцьбічы» (рубрыка «Перевал»). У газеце «На страже Октября» выходзілі матэрыялы па гісторыі віцебскай міліцыі. У штотыднёвіку «Витебский вестник» пісаў пра землякоў, якія загінулі ў Афганістане.

Тв.: Віцебскі гарадскі музей воінаў-інтэрнацыяналістаў // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 2. — Мн.: БелЭн, 2003. — С. 644–645.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Чкалаў В.Б. (13.04.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ЧУВАХОВА** ТАМАРА (*Тамара Альшэўская*), краязнаўца, журналіст. Аўтар артыкулаў па гісторыі і культуры Докшыччыны ў XX ст., якія змяшчаліся ў докшыцкай кнізе «Памяць», а таксама ў раённай газеце «Родныя вытокі».

Тв.: Артыкулы ў кнізе «Памяць»: Сувязны ў чорнай расе // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Докшыцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 2004. — С. 363–364;

Артыкулы ў перыядычным друку: Нашчадкі Скарыны // ЛТ. — 1990. — № 153. — С. 3; Не станьце манкуртамі // ЛТ. — 1991. — № 34. — С. 3; Пазаштатны горад Докшыцы // ЛТ. — 1991. — № 47. — С. 3; Наш «амерыканец» // ЛТ. — 1991. — № 70. — С. 2; Як ствараецца «Памяць» // ЛТ. — 1991. — № 110. — С. 3; Не губіце вечнае // РВ. — 1992. — № 27. — С. 4; Радовішча спадчыны // РВ. — 1992. — № 90. — С. 2; Колькі год раённай газеце // РВ. — 1993. — № 6. — С. 2; Агляд фальклору // РВ. — 1993. — № 32. — С. 3; Выкрэсленыя з гісторыі // РВ. — 1993. — № 68. — С. 3; Змагарныя дарогі Кастуся Акулы // РВ. — 1993. — № 71. — С. 2; Калядны шчыры вечар // РВ. — 1994. — № 2. — С. 4; …І «Цыганы» Пушкіна // РВ. — 1995. — № 14. — С. 3; Рамантык мінулых стагоддзяў // РВ. — 1995. — № 95. — С. 2; Гарадок невялікі пад назваю Докшыцы стаў паселішчам добрых і шчырых людзей // РВ. — 1995. — № 100–101; Раз’ядноўваючы мост // РВ. — 1996. — № 7, 8; Докшыцкія татары // РВ. — 1996. — № 8. — С. 2; Сувязны ў чорнай расе // РВ. — 1996. — № 46. — С. 2; Любоў на ўсё жыццё // РВ. — 1997. — № 17. — С. 2; Партызанская наборшчыца // РВ. — 1997; «Дапамажыце ўстанавіць імя» // РВ. — 1997. — № 78. — С. 3; Музей нашай гісторыі: Альбрэхт Адам ці Фабэр дю Фар // РВ. — 1999. — № 44. — С. 3; Докшыцы. Свята-Пакроўская царква // РВ. — 1999. — № 92. — С. 2; Порплішча. Спаса-Прэабражэнская царква // РВ. — 1999. — № 99. — С. 2; Порплішча. Касцёл Маці Божай Крулёвай кароны Польскай // Тамсама; Камайск. Царква Прарока Іллі // РВ. — 2000. — № 3. — С. 3; Пімен Панчанка і Бягомльшчына // РВ. — 2002. — № 71. — С. 2; Музыкі Калягі // РВ. — 2003. — № 12. — С. 2; Ці ўспомняць Сітцы пра Дамейку? // НС. — 2003. — № 23. — С. 6; (разам з М.Д. Чысцяковым) Да 100-годдзя Свята-Пакроўскай царквы. Крок у мінулае // РВ. — 2003. — № 75, 78; (разам з М.Д. Чысцяковым) Да 100-годдзя Свята-Пакроўскай царквы. Дзень сённяшні // РВ. — 2003. — № 82. — С. 2; (разам з М.Д. Чысцяковым) Пяснярка мінуўшчыны. — С. 2; Разам з паствай // РВ. — 2007. — № 74. — С. 6; Бягомлю — 425 год // РВ. — 2007. — № 76. — С. 2.



Літ.: Акцёры і ролі: Тамара Чувахова // РВ. — 1997. — № 97. — С. 4.

**ЧЫЖОВА** Н., навуковы супрацоўнік Расонскага музея баявой садружнасці. Вяла рубрыку «Зоркі Расоншчыны» ў раённай Расонскай газеце.

Тв.: Герой Савецкага Саюза — Сцяпан Іванавіч Жукаў // КШ. — 1988. — № 17. — С. 2; Памятаем герояў: [С.У. Савенка] // КШ. — 1988. — № 20. — С. 2; Змагаліся і за вызваленне Еўропы // ГлРс. — 1995. — № 6. — С. 2; У 18 юнацкіх гадоў: [І.А. Літвінаў] // ГлРс. — 1995. — № 10. — С. 2; У баях вучылі геаграфію Еўропы // ГлРс. — 1995. — № 11. — С. 2; Мужчынамі станавіліся рана: [Г.І. Ясючэнка] // ГлРс. — 1995. — № 30. —

С. 2; Рускі беларус: [В.А. Яфімаў] // ГлРс. — 1995. — № 39. — С. 2; Начальнік шпіталя: [А.П. Анісімава] // ГлРс. — 1998. — № 27. — С. 4.

**ЧЫСЦЯКОЎ** МІКАЛАЙ ДЗМІТРЫЕВІЧ (10.08.1929, засц. Чарнічка-1 Докшыцкай гміны Дзісненскага пав. Віленскага ваяв., цяпер в. Чарнічка-1 Тумілавіцкага с/с Докшыцкага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца. З 1937 г. вучыўся ў сямігадовай польскай школе ў Докшыцах. Вучыўся ў Пермскім настаўніцкім інстытуце (1956–1957). Працаваў на Урале. Вярнуўся на радзіму (1963). Працаваў электраманцёрам падстанцыі, дзяжурным электраманцёрам Докшыцкага РЭС (1964–1990).

Вывучае гісторыю Докшыц і населеных пунктаў раёна, легенды і паданні роднага краю, збірае матэрыялы пра выдатных землякоў, даследуе лёс докшыцкіх яўрэяў. Напрацаваныя матэрыялы публікуе ў мясцовым перыядычным друку. Браў удзел у падрыхтоўцы да выдання кнігі «Памяць» Докшыцкага раёна.



Цікавіцца мясцовай гісторыяй пачаў у канцы 1930-х гг., калі вучыўся ў школе ў Докшыцах. Прыняў актыўны ўдзел у стварэнні музея СШ № 1 г. Докшыц, Бягомльскага народнага музея (адзін з стваральнікаў). Супрацоўнічае з Бягомльскім музеем, рэдакцыяй газеты «Родныя вытокі». Дапамог яўрэям, што прыехалі з Ізраіля, аднавіць прозвішчы асоб, якія загінулі ў гады Другой сусветнай вайны (1989).

Мае шэраг публікацый па гісторыі Докшыц і докшыцкай царквы, ваенных падзеях у раённай газеце «Родныя вытокі». Узняў праблему пераіменавання вуліц Докшыц. Падтрымлівае сувязі з ураджэнцамі Докшыччыны, што жывуць у Польшчы, і з яўрэямі, якія нарадзіліся на Докшыччыне, але пражываюць у Ізраіле.

Тв.: Докшыцы, лета 1944-га… // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Докшыцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 2004. — С. 372–373; Дзень Перамогі ў Докшыцах // Тамсама. — С. 373.

Артыкулы ў перыядычным друку: Докшыцы // ЛТ. — 1991. — № 5. — С. 2; Так пачалася акупацыя // ЛТ. — 1991. — № 58. — С. 2; Вяртанне ў Докшыцы // РВ. — 1992. — № 31. — С. 2; І колькі школай пройдзена // РВ. — 1992. — № 17. — С. 2; Адновім гістарычную справядлівасць // РВ. — 1993. — № 100. — С. 2; Як гэта было ў нашым краі // РВ. — 1999. — № 74. — С. 2; Да 2000-годдзя Хрысціянства // РВ. — 2000. — № 5. — С. 3; (разам з Т. Чуваховай) Да 100-годдзя Свята-Пакроўскай царквы. Крок у мінулае // РВ. — 2003. — № 75, 78; (разам з Т. Чуваховай) Да 100-годдзя Свята-Пакроўскай царквы. Дзень сённяшні // РВ. — 2003. — № 82. — С. 2; Докшыцы гарачым летам 1943 // РВ. — 2003. — № 76. — С. 2

Літ.: Пашэвіч В. Ведаць і ганарыцца // РВ. — 1996. — № 11. — С. 3; Чувахова Т. Музей нашай гісторыі: Альбрэхт Адам ці Фабэр дю Фар // РВ. — 1999. — № 44. — С. 3; Дынастыя Чысцяковых // РВ. — 2001. — № 42. — С. 1; Пашэвіч В. Каб памяталі // РВ. — 2003; Камінскі І.І. Краязнаўцы Докшыччыны // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Докшыцкага раёна. — Мн.: БелЭн, 2004. — С. 655; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Чысцякоў М.Д. (чэрвень 2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ЧЭКАН** ЁЗЭФ (Józef Czekan), мемуарыст, краязнаўца. Ураджэнец Браслаўшчыны, удзельнік антыфашысцкага падпольнага супраціву ў гады Другой сусветнай вайны на Браслаўшчыне. Аўтар кніг «Жыццё акаўца» (1995), «Гісторыя Браслаўскага павету ў XX стагоддзі» (2001). У апошняй скарыстаны матэрыялы кніг З. Янушкевіча «Мае ўспаміны», М. Патоцкага «Успаміны жаўнера АК зямлі віленскай», К. Краўзэ «Апошні рапарт», выдання «У чарзе пакаленняў», выпушчанага гіст. секцыяй таварыства Арміі Краёвай у Кентжыне, а таксама ўспаміны В. Юркевіча, Ф. Крывеля.




Тв.:. Życie akowca. — Bydgoszcz, 1995. — 126 s.; Historia powiatu Brasławskiego XX stulecia. — Kęterzyn: GriF, 2001. — 215 s.

Літ.: Выдавецкія навіны // Павет. — 2005. — № 5 (9), травень. — С. 5.

**ШАБУНЁВА** ЛАРЫСА ЯЎГЕНАЎНА (29.01.1939, м. Лёзна Віцебскай акругі), педагог, краязнаўца. Скончыла гіст. факультэт МгДПІ. Працавала настаўнікам гісторыі, дырэктарам Слабадской СШ Лепельскага раёна. Зацікавілася гісторыяй роднага краю, калі студэнткай брала ўдзел у археалагічных раскопках на Дзявочай і Замкавай горах у г. Мсціславе пад кіраўніцтвам Л.В. Аляксеева. У фарміраванні цікаўнасці да мінуўшчыны значную ролю адыграла маці, З.В. Дзідзенка.

Збірае звесткі пра наваколле в. Слабада (Свяда), царкву Казьмы і Даміяна ў гэтай жа вёсцы, жыццёвы шлях святара Міхаіла Якаўлевіча Садоўскага. Брала ўдзел у стварэнні музея ў школе-інтэрнаце для глухіх дзяцей (г. Мсціслаў), этнаграфічнага музея ў школе в. Слабада. Мае прыватную калекцыю. Падтрымлівае стасункі з ЛКМ, Музеем гісторыі царквы пры Віцебскім духоўным вучылішчы. Аказала дапамогу клірыку Свята-Духаўскага сабора ў г. Мінску Фёдару Крываносу пры падрыхтоўцы кнігі «У Бога мертвых нет».

Тв.: Пакуты святара // ЛК. — 2003. — № 36. — С. 3.
Літ.: Гісторыя вёскі Слабада // ЛК. — 2000. — № 76, 87; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Шабунёва Л.Я. (27.11.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ШАВЭЛА** ЭМІЛІЯ ЛЯВОНАЎНА, педагог, краязнаўца. Працуе настаўніцай Дрысвяцкай СШ Браслаўскага раёна. Кіраўнік краязнаўчага гуртка «Крынічка». Займаецца зборам матэрыялаў па гісторыі і культуры роднага краю. Стварыла этнаграфічны музей у Дрысвяцкай СШ. Разам з вучнямі запісвае легенды, этнаграфічны, фальклорны матэрыял, аповеды мясцовых жыхароў. Склала «Летапіс вёскі Дрысвяты». Выявіла пахаванні часоў Першай сусветнай вайны. Лепшыя матэрыялы друкаваліся ў мясцовым перыядычным друку і зборніку «Браслаўскія сшыткі 3/1999».

Тв.: Паданні, звязаныя з мястэчкам Дрысвяты // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Т. 2. Віцебскае Падзвінне. — Мн., 2004. — С. 763–764; Фальклорныя матэрыялы, запісаныя вучнямі Дрысвяцкай школы пад кіраўніцтвам Э. Шавэла: Абрады «Талака», «Хрэсьбіны», «Вяселле», «Вечарушкі» // Браслаўскія сшыткі 3/1999. Гісторыя былога мястэчка Дрысвяты і наваколля: [саматуж. выд.]. — Браслаў, 1999. — С. 99–102; Літ. апрацоўка паданняў // Легенды і паданні Віцебшчыны: зборнік матэрыялаў абласнога конкурса «Легенды і паданні роднага краю» / склад. Н. Зайцава. — Віцебск, 2002. — С. 16, 51, 59–60, 67, 70, 77, 94; Каб стаць патрыётам // БЗ. — 1997. — 10 снеж. — С. 2; Дрысвяцкія легенды // БЗ. — 2001. — № 10. — С. 2.
Літ.: Музейныя экспазіцыі Дрысвяцкай школы // Павет. — 2005. — № 8 (45), снежань. — С. 8.

**ШАГАЛЕЕВА** ТАМАРА АРХІПАЎНА (1947, в. Верамеева Першамайскага с/с Гарадоцкага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыла філал. факультэт Вялікалуцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (1969). Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў Савецкай ВШ Невельскага раёна (1969–1970), завучам Вязаўскай СШ Навасакольніцкага раёна Пскоўскай вобл. (1970–1973), піянерважатай, настаўніцай рускай мовы Стадолішчанскай СШ Гарадоцкага раёна (1973–1982), настаўнікам, завучам, дырэктарам Обальскай ВШ Гарадоцкага раёна (1982–1991), малодшым навуковым супрацоўнікам Гарадоцкага краязнаўчага музея (1991–1996), настаўнікам СШ № 44 г. Віцебска (1996–2003).

Займацца краязнаўствам стала пад уплывам Мікалая Дзмітрыевіча Ткачова дырэктара Першамайскай СШ Гарадоцкага раёна, партызана Вялікай Айчыннай вайны, пад кіраўніцтвам якога штогод арганізоўваліся паходы ў Шчалбоўскі лес, збіраліся матэрыялы пра партыз. рух на тэрыторыі раёна, афармляліся альбомы. Пэўны ўплыў аказала і Зоя Ануфрыеўна Баянкова, былы завуч Стадолішчанскай СШ, Кацярына Ягораўна Уверская, былы дырэктар Гарадоцкага раённага краязнаўчага музея.

Вывучае гісторыю Гарадоцкага раёна, Першамайскага с/с Гарадоцкага раёна, этнаграфію Гарадоччыны. Удзельнічала ў стварэнні музея ў Стадолішчанскай СШ (1979) (экспазіцыі «Наша Радзіма ў час Вялікай Айчыннай вайны», «Яны вызвалялі наш край», «Родны кут»), у папаўненні калекцый ГРКМ, у стварэнні экспазіцый аддзелаў прыроды, этнаграфіі музея, рыхтавала тэматыка-экспазіцыйныя планы, запісывала ўспаміны жыхароў раёна пра падзеі мінуўшчыны (1991–2006).

На працягу 1991–1996 гг. брала ўдзел у экспедыцыях ГРКМ з мэтай вывучэння быту вяскоўцаў і гісторыі раёна. У 1973–1992 гг. кіравала саветам школьнага музея. Разам з гурткоўцамі ўдзельнічала ў археалагічных раскопках каля в. Смалькі (пад кіраўніцтвам археолагаў В.М. Ляўко і В.І. Шадыра).

Аўтар значнай колькасці артыкулаў у кнізе «Памяць» Гарадоцкага раёна, а таксама ў мясцовым перыядычным друку. Рукапіс кнігі «Гарадоччына», як і копіі артыкулаў, падрыхтаваных для кнігі «Памяць», перададзены ў ГРКМ. Рыхтуе летапіс Першамайскага с/с Гарадоцкага раёна.

Падтрымлівае добрыя стасункі з ГРКМ, Першамайскім с/с Гарадоцкага раёна, аддзелам сацыяльнага забеспячэння і аховы працы, Саветам ветэранаў Гарадоцкага раёна.

Узнагароджана граматай Міністэрства народнай адукацыі БССР (1980), выдатнік народнай асветы БССР (1987).

Тв.: Артыкулы ў кнізе «Памяць»: Прыродная характарыстыка Гарадоцкага раёна // Памяць: Гарадоцкі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў / склад. С.І. Садоўская. — Мн.: Беларусь, 2004. — С. 23–30; Павет у час вайны 1812 г. // Тамсама. — С. 71–77; Прыгонная Гарадоччына // Тамсама. — С. 84–92; Ахова здароўя ў XIX – пач. XX ст. // Тамсама. — С. 112–117; Народная адукацыя // Тамсама. — С. 119–125; Шляхі-дарогі // Тамсама. — С. 127–130; Гарадок і яго жыхары ў другой палове XIX – пач. XX ст. // Тамсама. — С. 130–133; «Спрадвеку тут яны жылі: [этнічны склад насельніцтва] // Тамсама. — С. 134–136; Прыгон адменены, а няволя засталася // Тамсама. — С. 140–146; З гісторыі шкляной вытворчасці // Тамсама. — С. 146–147; (разам з С.І. Садоўскай) Трагічнае супрацьстаянне // Тамсама. — С. 178–183; З гісторыі Гарадоцкага педагагічнага тэхнікума // Тамсама. — С. 199–201; Адрас міласэрнасці — Гарадок // Тамсама. — С. 203–205; Не згубіць каранёў сваіх // Тамсама. — С. 206–208; Шклозавод «Ноўка» // Тамсама. — С. 214–215, 689; Развіццё народнай адукацыі 1920–1930-я гг. // Тамсама. — С. 228–236; З гісторыі тэхнікума механізацыі сельскай гаспадаркі // Тамсама. — С. 236–239, 734–736; Стан аховы здароўя 1917–1941 гг. // Тамсама. — С. 244–246; Дом рамёстваў і фальклору // Тамсама. — С. 733–734; Захаваныя каштоўнасці. Архітэктура // Тамсама. — С. 736–739; (разам з Н.В. Бураковай) Страчаная спадчына // Тамсама. — С. 740–743; Традыцыі, абрады, вераванні // Тамсама. — С. 744–748; Гарадоцкі край у легендах і паданнях // Тамсама. — С. 748–752; Невычарпальная крыніца // Тамсама. — С. 754–758; Этнаграфічнае апісанне Гарадоччыны // Тамсама. — С. 759 — 776; Паляўніцтва, рыбалоўства // Тамсама. — С. 777–779; Садоўніцтва, пчалярства. Ганчарства // Тамсама. — С. 776–777; 779–780.

Артыкулы ў перыядычным друку: Вызваленаму Гарадку // ГВ. — 1992. — № 67. — С. 2; Гісторыю робяць людзі // ГВ. — 1993. — № 5. — С. 2; Нам засталася спадчына: [Гарадоччына на старонках «Віцебскага краёвага слоўніка»] // ГВ. — 1993. — № 11. — С. 4.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Шагалеева Т.А. (3.07.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ШАДЫРА** ВАДЗІМ ІОСІФАВІЧ (1.03.1947, г. Пячора Кожвінскага (цяпер Пячорскага) раёна Рэспублікі Комі, РФ), археолаг. Кандыдат гіст. навук (1981). Скончыў гістфак БДУ (1972), аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР (1979). Працаваў слесарам-зборшчыкам радыёапаратуры на заводзе ў г. Маладзечна (1965–1967), навуковым супрацоўнікам у Мінскім абласным краязнаўчым музеі (1968–1972), ст. навуковым супрацоўнікам Нацыянальнага музея гісторыі і культуры (1973–1974), на пасадах ст. навуковага супрацоўніка (1974–1992), загадчыка аддзела археалогіі жалезнага веку (з 1992), загадчыка сектара археалогіі эпохі бронзы і жалеза Інстытута гісторыі НАН Беларусі (з 2006).

Вывучае жалезны век басейна Заходняй Дзвіны і этнакультурныя працэсы 1-га тысячагоддзя н.э. Адкрыў і даследаваў шэраг помнікаў ранняга жалезнага веку на поўначы Беларусі (Віцебшчыне). Абараніў кандыдацкую дысертацыю «Племена днепро-двинской культуры Белорусского Подвинья (VIII–VII вв. до н.э. – IV в.н.э.)» (1981, навуковы кіраўнік Г.В. Штыхаў), доктарскую дысертацыю «Беларускае Падзвінне ў эпоху жалеза і ранняга сярэднявечча (VII ст. да н.э. – VIII ст. н.э.)» (2003, не зацверджана ВАК РБ). Аўтар артыкулаў, у якіх асвятляе розныя пытанні гісторыі Паўночнай Беларусі, у энцыклапедыях, матэрыялах навукова-практычных канферэнцый.

Тв.: Кнігі: Ранний железный век северной Белоруссии. — Мн., 1985; Беларускае Падзвінне, I тысячагоддзе н.э. — Мн., 2006;

Артыкулы ў навуковым друку: Древности балтов Белорусского Подвинья // Проблемы этногенеза и этнической истории балтов. — Вильнюс, 1985; Аб славянскім рассяленні на паўночным захадзе Беларусі // Весці НАН Беларусі. Серыя грам. навук. — 1992. — № 3, 4; Селішча Пруднікі на беларуска-латышскім парубежжы: матэрыяльная культура, датыроўка // Гісторыка-археалагічны зборнік. — Мн., 1993. — Ч. 2. — С. 170–182; Вялікае перасяленне народаў і крывічы // Гісторыка-археалагічны зборнік. — 1995. — № 7; Жывёлагадоўля і паляванне ў жыцці насельніцтва Беларускага Падзвіння ў 2-й пал. I тысячагоддзя н.э. // Гісторыка-археалагічны зборнік. — 1997. — № 12; Гарадзішча Вышадкі Гарадоцкага раёна // Гісторыка-археалагічны зборнік. — 2005. — № 20; Старажытная гісторыя Пруднікаў // НС. — 1995. — № 111. — С. 3.

Літ.: Шадыра В.В. // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. — Мн.: БелЭн, 1993. — С. 649–650; Скрыпчанка Т. Шадыра В. І. // ЭГБ. Т. 6. Кн. 2. — С. 190; Корзенко Г.В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: биобиблиографический справочник. — Мн.: Бел. наука, 2007. — С. 429–430.

**ШАЙКО** СЯРГЕЙ ВАСІЛЬЕВІЧ (29.04.1959, УССР), арганізатар. Скончыў гіст. факультэт БДУ. Працаваў настаўнікам гісторыі, дырэктарам СШ № 1 імя З.І. Азгура г. Сянно, нам. старшыні Сенненскага райвыканкама (1996). Укладальнік гісторыка-дакументальнай хронікі Сенненскага раёна, аўтар некалькіх артыкулаў у ёй. Удзельнічаў у стварэнні Сенненскага раённага краязнаўчага музея.

Тв.: Сенненшчына сёння // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна. — Мн., 2003. — С. 569–571; Нястомны краязнаўца // Тамсама. — С. 583–584.

**ШАЙКОЎ** ВАСІЛЬ ІВАНАВІЧ (2.01.1954, г.п. Сіроціна Шумілінскага раёна Віцебскай вобл.), гісторык, сацыёлаг. Кандыдат гіст. навук (1985), дацэнт (1992). Скончыў гіст. факультэт БДУ (1977), Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы і гуманітарнай адукацыі (1996). Працаваў у Брэсцкім інжынерна-будаўнічым інстытуце, Наваполацкім політэхнічным інстытуце, выкладчыкам, ст. выкладчыкам, загадчыкам кафедры ПДУ. Даследуе гісторыю Полацка 2-й паловы XVIII – пач. XX ст. Адзін з аўтараў зборнікаў навуковых прац «Полацк: карані нашага радаводу» (1996), «Беларускі горад у часе і прасторы: 500 гадоў Полацкай Магдэбургіі» (2001). Аўтар больш за 70 навуковых і метадычных публікацый, у шэрагу якіх разглядаюцца пытанні гісторыі і культуры Віцебшчыны. Аўтар артыкулаў, прысвечаных гораду, у гісторыка-дакументальнай хроніцы «Памяць».

Тв.: Лёс Полацкага часовага манетнага двара // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Полацка. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 255–256; (разам з А.М. Лукашэвічам) Полацкі кадэцкі корпус // Тамсама. — С. 288–292; Полацкі сонечны гадзіннік // Тамсама. — С. 292–293; (разам з В.У. Галубовіч) Гістарыяграфія гісторыі Полацка // Тамсама. — С. 892–901; Да пытання аб езуіцкай бібліятэцы ў Полацку // БГЧ. — 2003. — № 3. — С. 54–55; Дзе вучыцца на гісторыка // ПВ. — 2004. — № 63. — С. 4.

Літ.: Шайкоў В.І. // ЭГБ. Т. 6. Кн. 2. — С. 190; Шайкоў Васіль // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Полацка. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 826.

**ШАЛАЕВА** СВЯТЛАНА БАРЫСАЎНА (25.01.1958), архівіст. Скончыла СШ № 20 г. Віцебска (1975), культасветвучылішча (1978, Віцебск), факультэт пачатковых класаў ВДПІ (1987). Працавала вышывальшчыцай на Віцебскай фабрыцы мастацкіх вырабаў (1979–1981), на розных пасадах у ВАКМ (1981–2002), ДАВВ (з 2002). Даследаванне Віцебшчыны пачала ў час працы ў ВАКМ. Пэўны уплыў аказалі А.А. Букіна і Н.А. Сулецкая. Вывучала развіццё паштовай сувязі на Віцебшчыне, шкляной вытворчасці ў 1917–1940 гг., жыццёвыя лёсы славутых землякоў. Бярэ ўдзел у міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных чытаннях, на якіх выступае з паведамленнямі на краязнаўчую тэматыку (з 1981).

Тв.: В оккупированном Витебске // Выстояли и победили: Свидетельствуют архивы… — С. 10–12; Чалавек з легенды: [П.М. Машэраў] // ЛІ. — 1988. — № 19. — С. 2, 4.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Шалаева С.Б. (31.03.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ШАЛУХА** БАРЫС ФЁДАРАВІЧ (23.04.1924, в. Заложжа Крапівенскага с/с Аршанскага раёна – 20.11.2003, г.п. Арэхаўск), краязнаўца, педагог. Скончыў 9 класаў Крапівенскай школы (1941), Аршанскае педвучылішча (1947), гіст. факультэт СДПІ (1959). Працаваў сакратаром Крапівенскага с/с (ліпень 1945 – жнівень 1946), настаўнікам Берасценаўскай 7-гадовай школы Аршанскага раёна, Даўжанскай СШ (1952–1953), Браздечанскай СШ (1957), загадчыкам педкабінета, па сумяшчальніцтве старшынёй Арэхаўскага райкама прафсаюзаў работнікаў адукацыі, загадчыкам аддзела народнай адукацыі (1954–1957), настаўнікам гісторыі і геаграфіі Арэхаўскай СШ Аршанскага раёна (1957–1983).

Краязнаўствам стаў займацца пасля заканчэння педінстытута. Арганізаваў у Арэхаўскай СШ клуб юных следапытаў «Пошук» і шмат гадоў кіраваў ім. Асноўнымі кірункамі яго дзейнасці былі: вывучэнне гісторыі мясцовасці ў 1941–1944 гг., пошук імёнаў воінаў, якія загінулі пры вызваленні Арэхаўска, вывучэнне баявога шляху часцей і злучэнняў, якія праходзілі праз пасёлак у гады вайны.

У выніку праведзенай працы быў створаны школьны краязнаўчы музей, напісаны шэраг кніг. Сярод інш.: «Имени Юрия Смирнова» (1985), «В боях под Оршей» (1993), «Под музыку турбин» (1994). У апошняй сабраны гіст. звесткі пра развіццё в. Арэхі, п. Арэхаўск, будоўлі БелДРЭС. У 1995 г. была выдадзена кніга «Юноша из легенды». У рукапісным выглядзе падрыхтаваны матэрыял яшчэ дзвюх кніг: «Гордость наша — БелГРЭС» і «Выдающиеся выпускники Ореховской СШ». Аўтар шматлікіх публікацый у кнігах «Памяць» Дубровенскага і Аршанскага раёнаў, у перыядычным друку: газетах «Віцебскі рабочы», «Настаўніцкая газета», «Аршанская газета», «Дняпроўская праўда» і інш.




Член Союза журналістаў БССР. Узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, медалём «За взятие Кенингсберга», юбілейнымі медалямі. Выдатнік народнай адукацыі БССР.

Тв.: Кнігі: Имени Юрия Смирнова. — Мн.: Народная асвета, 1985; В боях под Оршей. — Молодечно: Молодеченская типография, 1993; Под музыку турбин. — Орша: Оршанская типография, 1994. — 109 с.; Юноша из легенды. — Орша: Оршанская типография, 1997.

Артыкулы ў кнігах «Памяць»: Каля вёскі Барадзіно // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Дубровенскага раёна. Кн. 1. — Мн.: Паліграфафармленне, 1997. — С. 264; Юны патрыёт // Тамсама. — С. 264–265; З успамінаў Барыса Фёдаравіча Шалухі, ураджэнца вёскі Крапіўна // Тамсама. — С. 271–272; Першым

уварваўся ў Дуброўна // Тамсама. — С. 333–334; У баях за Новае Сяло // Тамсама. — С. 335–336; (разам з Ф. Кулаковым) Яго смерць стала подзвігам // Тамсама. — С. 336–337; Аднім лёсам знітаваныя // Тамсама. — С. 337–338; Они закрыли амбразуру дзота // Память: Историко-документальная хроника Дубровенскага района. Кн. 2. — Мн.: Паліграфафармленне, 1996. — С. 114–115; Командир гвардейской роты: [В.С. Зелянюк] // Тамсама. — С. 121; Нараджэнне Чырвонай гвардыі // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 183; Сустрэчы жыхароў Аршаншчыны з М.І. Калініным // Тамсама. — С. 189; Зорка над балотам // Тамсама. — С. 209–211; (разам з Ф. Кулаковым) Балада пра чырвоны сцяг // Тамсама. — С. 352–353; Крылатыя дзяўчаты // Тамсама. — С. 364.

Артыкулы ў перыядычным друку: Пачыналася ў 1941-м // ЛП. — 1985. — № 20. — С. 2; Бясстрашныя сокалы // ЛП. — 1985. — № 40. — С. 2; У баях за Арэхаўск // ЛП. — 1985. — № 136. — 1986. — № 3, 10; Камандзір гвардзейскай роты: [В.С. Зелянюк] // ДнП. — 1985. — № 94. — С. 2; На шляху да Зоркі Героя. У баях за Новае Сяло // ДнП. — 1985. — № 131. — С. 2; Салдацкая слава: [А. Мусін] // ДнП. — 1985. — № 154. — С. 2; Да апошняга дыхання: [Л. Бурын] // ДнП. — 1986. — № 12. — С. 4; Жыццё пад музыку турбін // ВР. — 1986. — № 12. — С. 4; Геройскі шлях праз Новае Сяло // ВР. — 1986. — № 112. — С. 2; Пра баявы шлях 31-й арміі // ДнП. — 1986. — № 130. — С. 4; Падзяка правадыра: [Д. Івашчанка, падзяка ад Леніна У. за дастаўку хлеба ў Германію рускім ваеннапалонным у 1918 г.] // ДнП. — 1987. — № 5. — С. 2; Браты Лебедзевы. Артылерысты // ДнП. — 1987. — № 56. — С. 2; Духам нязломныя: [абарончыя баі 1941 г. на Дубровеншчыне] // ДнП. — 1987. — № 125. — С. 2; Калі паклікала Радзіма: [М. Сядоў] // ЛП. — 1987. — № 29. — С. 2; Подзвіг батарэі // ЛП. — 1987. — № 72. — С. 2; Узнагароджаны пасмяротна: [М.І. Гарэлаў] // ЛП. — 1987. — № 127. — С. 2; Пад музыку турбін // ЛП. — 1987. — № 140–142; (разам з В. Гедройц) Рэквіем: [в. Брылі] // ЛП. — 1987. — № 154. — С. 2; Агітпоезд «Кастрычніцкая рэвалюцыя» // ЛП. — 1987. — № 170. — С. 2; Эшалон з хлебам: [1918] // ЛП. — 1987. — № 173. — С. 2; Камбат Лаўрэнцьеў // ЛП. — 1987. — № 184. — С. 2; Ішлі гвардзейцы // ЛП. — 1988. — № 155. — С. 2; За рэчкай Крапівенкай // ЛП. — 1988. — № 197. — С. 2; Два ордэны камбата Пуставога // ДнП. — 1988. — № 113. — С. 2; Шлі на прарыў гвардзейцы // ДнП. — 1989. — № 69. — С. 2; Камандзір кулямётчыкаў: [Г. Пяцераў] // ЛП. — 1989. — № 10. — С. 2; Артылерыст Гушчын // ЛП. — 1989. — № 62. — С. 2; У небе Аршаншчыны // ЛП. — 1989. — № 77. — С. 3; Апошні бой героя: [С.П. Супрун] // ЛП. — 1989. — № 79. — С. 2; Пісьмы расказваюць: [А.П. Кабец] // ЛП. — 1989. — № 80. — С. 3; Мужнасць і ўзаемавыручка: [лётчыкі, 1944] // ЛП. — 1989. — № 81. — С. 2; Артылерыст Засценскі // ЛП. — 1989. — № 95. — С. 2; За адвагу даюць ордэны: [В.А. Мацюшын] // ЛП. — 1989. — № 202. — С. 2; Зямля бацькоў нашых: [в. Крапіўна] // ЛП. — 1990. — № 67. — С. 3; Беларускі прыродазнаўца: [А.А. Бялыніцкі-Біруля] // ЛП. — 1990. — № 77. — С. 3; Дні міру і вайны // ЛП. — 1990. — № 105. — С. 2; Майстэрства: [А.У. Образаў] // ЛП. — 1990. — № 168. — С. 2; Гордасць наша — БелДРЭС // ЛП. — 1990. — № 175. — С. 2–3; Дубы // ЛП. — 1990. — № 206. — С. 3; Перамога пачыналася ў 1941 г. // ЛП. — 1991. — № 7. — С. 2; Над ракой Адроў: [1941] // ЛП. — 1991. — № 82. — С. 2; Па тыле праціўніка // АГ. — 1991. — № 23. — С. 3; Дні і ночы вайны // АГ. — 1991. — № 35. — С. 2; Нараджэнне гвардыі: [1917–1918] // ДнП. — 1991. — № 56. — С. 3, 4; Праз фашысцкія канцлагеры // ДнП. — 1991. — № 58. — С. 2; Вялікае Арэхаўскае: [возера] // АГ. — 1992. — № 83. — С. 2; На кулямётнай кропцы — кветкі // АГ. — 1992. — № 103. — С. 2; Пры штурме Оршы // АГ. — 1992. — № 136. — С. 2; Сувязіст капітан Кавецкі // АГ. — 1993. — № 55. — С. 2; У строй — навечна: [Герой Савецкага Саюза Ю. Смірноў] // АГ. — 1995. — № 7. — С. 2; Гвардзейскі почырк: [А. Ляскоў] // АГ. — 1996. — № 21. — С. 3; Праз «Асінторф» на Арахі, Выдрыцу // АГ. — 1996. — № 46. — С. 2; Сапёр-разведчык Самуіл Кляпіцкі // АГ. — 1997. — № 96. — С. 2; Дарогамі ратнай славы: [вызваленне Аршаншчыны] // АГ. — 1998. — № 109. — С. 4; Наказ старого учителя // ВР. — 2000. — № 30. — С. 3; Над ракой Адроў // АГ. — 2001. — № 72. — С. 2; Перамога пачалася ў 41-м // АГ. — 2002. — № 55. — С. 2; Зорка над балотам // АГ. — 2004. — № 81. — С. 2.

Літ.: Велярок Г. Ідуць па зямлі следапыты // ЛП. — 1990. — № 201. — С. 2; Кулажанка Л., Мальдзіс А., Сачанка С. Літаратурныя мясціны Беларусі: краязнаўчы даведнік: у 3-х кн. Кн.1: Брэсц., Віцеб. і Гомел. вобл. — Мн.: БелЭн, 2000. — С. 135; Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 30; Кулакоў Ф. Дуброўна – Орша – БелДРЭС // ДнП. — 1994. — № 89. — С. 2; Біяграфія Б.Ф. Шалухі (падрыхтавала А. Куксо) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ШАПЧЫЦ** АНТОН ГАЎРЫЛАВІЧ (1.03.1910, в. Малыя Нягневічы Барысаўскага раёна Мінскай вобл. – кастрычнік 2002), краязнаўца, кінааматар. Скончыў Аршанскую сямігодку (1925), прафтэхшколу (1928), Віцебскі электрамеханічны тэхнікум (1931), Ленінградскі электратэхнічны інстытут інжынераў сігналізацыі і сувязі (1948). Працаваў у Аршанскай дыстанцыі сувязі (1956–1970), кінамеханікам Музея К. Заслонава (1975–1990). Кіраваў кінастудыяй пры аршанскім Доме культуры чыгуначнікаў.

Адзін з першых у Оршы зацікавіўся аматарскімі кіназдымкамі. Фіксаваў падзеі, якія адбываліся ў горадзе і ваколіцах. Стварыў больш за 40 фільмаў, прысвечаных мінуламу Оршы, памятным мясцінам горада, падарожжам аўтара. Працуючы ў Музеі К. Заслонава, стаў здымаць фільмы на ваенную тэму. Найбольш вядомы стужкі, прысвечаныя аршанскім падпольшчыкам: «Последняя записка» (пра І. Сухадольскую), «Елена Кардовская», «День Победы» (пра аршанскіх ветэранаў) і інш. Фільмы захоўваюцца ў фондах музея. Сабраў значны архіў фотаздымкаў і кінафільмаў пра помнікі гісторыі і культуры Оршы, падзеі мясцовай гісторыі ў пасляваенны час. Частка матэрыялаў была перададзена ў Музей У. Караткевіча. Перадаў некаторыя дакументы, газеты, часопісы 1920–1950-х гг., кнігі ў Музей К. Заслонава.

Прызёр абласных і рэспубліканскіх конкурсаў самадзейнага кінамастацтва.

Літ.: Сітнік Н. Занатоўваў гісторыю у стужках і дакументах: [А.Г. Шапчыц] // АГ. — 1998. — № 116. — С. 3; Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 28.

**ШАРАЙ** РЫГОР СЦЯПАНАВІЧ (17.02.1954, г. Орша), педагог. Скончыў 8 класаў СШ № 8 (1969), Аршанскае індустрыяльна-педагагічнае вучылішча па спецыяльнасці «Выкладчык працоўнага навучання і чарчэння» (1973), гіст. факультэт СДПІ (экстэрнам). Працаваў выкладчыкам гісторыі ў школах Аршанскага раёна, у ПТВ № 110 г. Орша, Цэнтры дзіцяча-юнацкага турызму і экскурсій.

Асноўная тэма даследаванняў — падзеі Вялікай Айчыннай вайны на Аршаншчыне і ўшанаванне памяці загінуўшых воінаў Савецкай Арміі. Зацікавіўся пошукавай справай яшчэ ў час вучобы ў педвучылішчы. У 1988 г. арганізаваў ваенна-парыятычны клуб «Русічы». Члены клуба займаюцца пошукам, пахаваннем загінуўшых воінаў і аднаўленнем іх імёнаў на тэрыторыі Аршанскага і Дубровенскага раёнаў, а таксама ў інш. раёнах Віцебскай вобл., Беларусі, выязджаюць на Вахты Памяці ў РФ. Па выніках працы ў ПТВ № 110 быў створаны Музей гісторыі вызвалення Оршы і дзейнасці пошукавага клуба «Русічы» (1992). Даследуе лёсы вядомых землякоў. Збірае матэрыял для кнігі «Земля умеет говорить», якая прысвечана лёсу тых, хто загінуў і прапаў без вестак пад час вайны, гісторыі вызвалення Аршаншчыны і дзейнасці клуба па аднаўленні памяці пра загінуўшых. Узнагароджаны Ганаровай граматай Віцебскага аблвыканкама, нагрудным знакам МА Расіі «За активный поиск».

Тв.: «Русічы» з салдатамі // ЛП. — 1991. — № 89. — С. 3; Фёдараў К. Ёсць у клуба «Русічы» музей // ДнП. — 1992. — № 56. — С. 2; По следам памяти // АГ. — 2003. — № 95–96. — С. 7; По праву памяти // АГ. — 2004. — № 90, 94, 97; Навечно в памяти народной // ТЭ. — 2007. — № 25. — С. 7.

Літ.: Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 29.



**ШАРКОЎСКАЯ** НАТАЛЛЯ ЮР'ЕЎНА, музейны работнік, краязнаўца. Працуе ў ВАКМ. Бярэ актыўны ўдзел у міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных канферэнцыях. Аўтар артыкулаў у навуковым і перыядычным друку па асобных пытаннях гісторыі і культуры Віцебшчыны. Выдатная знаўца матэрыяльнай культуры краю перыяду сярэднявечча, збораў віцебскіх калекцыянераў другой паловы XIX – пач. XX ст., якія захоўваюцца ў зборах ВАКМ.

Тв.: Археологическая коллекция ВУАК в фондах Витебского областного краеведческого музея // 90 гадоў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. — Мн.; Віцебск, 1999. — С. 58–61.

**ШАРУХА** ІГАР МІКАЛАЕВІЧ (8.06.1968, г. Полацк), краязнаўца, педагог, географ. Кандыдат педагагічных навук (2000), дацэнт (2002). Скончыў геаграфічны факультэт БДУ (1992). Працаваў настаўнікам геаграфіі і гісторыі ў СШ № 40, 27 г. Віцебска (1989–1992); з 1992 — у МгДУ на пасадах ст. выкладчыка кафедры педагогікі і методыкі пачатковага навучання (1993–1995), кафедры геаграфіі і аховы прыроды (1995–2000), нам. дэкана факультэта прыродазнаўства па навуковай працы (2000–2008), загадчыка кафедры геаграфіі і аховы прыроды (з 2008). Старшыня Полацкай філіі Геаграфічнага таварыства СССР (1988–1991), вучоны сакратар Магілёўскага аддзела Беларускага геаграфічнага таварыства (1993–2002), старшыня Магілёўскага абласнога аддзела геаграфічнага таварыства (з 2002).

Краязнаўчую дзейнасць распачаў у Віцебску (1989). Першыя артыкулы, прысвечаныя гісторыі вывучэння Віцебшчыны, надрукаваў у газеце «Віцебскі рабочы». Значную ролю ў фарміраванні зацікаўленасці да краязнаўства і станаўленні як даследчыка адыграў знакаміты географ, педагог, краязнаўца, аўтар «Пособия по краеведению» Пётр Аляксеевіч Лярскі.

Даследуе гісторыю геаграфічнага вывучэння Беларусі, тапаніміку, культурную геаграфію Беларусі, займаецца складаннем геаграфічна-статыстычных слоўнікаў. Бярэ актыўны ўдзел у міжнародных і рэгіянальных канферэнцыях (больш за 50). Штогод удзельнічае ў экспедыцыях у межах рэгіянальных і далёкіх практык са студэнтамі МгДУ (з 1997).

Аўтар больш за 500 артыкулаў у навуковым і перыядычным друку. Мае ненадрукаваныя працы па тапаніміцы Магілёўшчыны і Віцебшчыны, па культурнай геаграфіі. Асаблівую ўвагу выклікае «Геаграфічна-статыстычны слоўнік Полацкага раёна» (1990), які мае больш за 3 тысячы апісаных геаграфічных аб'ектаў па раёне. Аб'ём ненадрукаванага прыкладна каля 2,5 тысяч старонак.

Падтрымлівае кантакты з шэрагам устаноў і грамадскіх арганізацый, сярод якіх НАН Беларусі, ТБМ, Беларускае, Рускае, Украінскае геаграфічныя таварыствы, Міжнародны геаграфічны саюз, Індзейска-беларускае таварыства (Гомель), Краязнаўчае таварыства (Магілёў), Клуб аматараў гісторыі і падарожжаў «Чароўны ўспамін« (Магілёў), краязнаўчыя музеі.

Тв.: <u>Артыкулы ў навуковым друку:</u> В поисках Земли Санникова // Магілёўшчына. — Вып. 4. — 1993. — С. 77–83; Беларускія назовы ў Антарктыдзе // Спадчына. — 1994. — № 2. — С. 69–70; Геаграфічны цэнтар Еўропы — у Беларусі // Спадчына. — 1994. — № 6. — С. 109– 110; Уклад А.П. Сапунова ў вывучэнне Магілёўшчыны // Тэзісы Пятых абл. краязн. чытанняў. — Магілёў, 1994. — С. 78–81; Б. Эпімах-Шыпіла. Да 135-годдзя // РС. — 1994. — № 9. — С. 9–10, 19; Наш зямляк А.А. Бялыніцкі-Біруля — даследчык Сібіры // Навуковая спадчына геолагаў і географаў… — Мн., 1996. — С. 17–20; Чалавек энцыклапедычных ведаў // Аршанскі краязнаўчы зборнік. — Вып. 2. — Орша, 1997. — С.14–17; (разам з Б. Нешатаевым) Экспедиция на Оршанскую возвышенность // Універсітэцкі веснік. — 2002. — № 5–6. — С. 8; Кайгародаў Дз.Н.// Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Полацка. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 294; Востраў Полацк // Тамсама. — С. 890; Ферма Полацк // Тамсама. — С. 891; Особенности топонимики Витебско-Псковского порубежья: на примере Полоцкого региона // Восточная Европа: Вопросы исторической, общественной и политической географии: сборник научных статей. — Псков: ПГПИ, 2003. — С. 41–48; Культурное наследие Беларуси: [Беларусь — краіна замкаў і сядзіб] // Северо-Западная Россия и Беларусь: Вопросы экологической, исторической и общественной географии: материалы общ.-научной конфер., 27–28 ноября 2003 г., Псков — Псков: ПГПИ, 2003. — С. 7–9; Культурные ландшафты Полоцкой культурно-географической области как основа для развития экотуризма // Региональные проблемы экологии: Пути решения: тезисы докладов II Междунар. экологич. симпозиума в г. Полоцке: в 2-х т. — Полоцк: ПГУ, 2005. — Т. 2. — С. 192–193; Ландшафты Полоцкой культурно-географической зоны как основа для развития туризма // Вестник ПГУ. Сер. Е. Педагогические науки. — 2006. — № 5. — С. 144–147; Малавядомы лісты Е. Раманава // Е.Р. Раманаў. З гісторыка-археалагічнай спадчыны: выбраныя творы / пад рэд. І.А. Марзалюка. — Магілёў, 2006. — С. 232–236; (разам з В.Н. Пасько) Происхождение политонима «Белая Русь» // Рекреационно-туристический потенциал Северо-Запада России: материалы международной (российско-белорусской) общественно-научной конференции, Псков, 23–24 ноября 2006 г. — Псков: ПГПУ, 2006. — С. 33–35; Туристический потенциал порубежья: на примере Витебской и Полоцкой культурно-географических областей // Северо-Запад России: Эколого-хозяйственные проблемы и перспективы трансграничного сотрудничества. Материалы региональной общественно-научной конференции. — Псков: ПГПУ, 2007. — С. 25–27.

<u>Артыкулы ў перыядычным друку</u>: Бацька рускай феналогіі // СК (П). — 1989. — 22 верас. — С. 3; Краязнаўца і географ // СК (П). — 1989. — 22 жніўня. — С. 2; Піянер правінцыяльнай навукі // ВР. — 1989. — 14 кастр. — С. 3; …І ўклад нашых землякоў. Да 145-годдзя РГТ // СК (П). — 1990. — 22 ліп. — С. 3; Беларускі прыродазнаўца А. Бялыніцкі-Біруля // ЛП. — 1990. — 25 мая. — С. 2; Першая сярод жанчын-геолагаў // СК (П). — 1990. — 13 сак. — С. 2; Выдатны вучоны Наддзвіння: [У. Стукаліч] // СК (П). — 1990. — 28 сак. — С. 3; Вучоны і грамадзянін // ЛП. — 1990. — 24 ліп. — С. 2; Д. Кайгародаў // ВР. — 1990. — 20 кастр. — С. 3; Даследчык Сібіры // ВР. — 1991. — 9 лют. — С. 3; Вучоны і грамадзянін // ПВ. — 1991. — 12 верас. — С. 3; А.Б. Місуна — першая жанчына-геолаг // ВК. — 1992. — 6 лют. — С. 2; Востраў Полацк // ПВ. — 1993. — 5 ліст. — С. 2; Уладзіслаў — сын І. Эпімаха-Шыпілы // ПВ. — 1994. — 7 чэрв. — С. 2; Невядомы ліст вядомага прафесара // ПВ. — 1994. — 27 верас. — С. 3; Летапісец рэвалюцыйнага руху: [В.І. Сямеўскі] // ПВ. — 1994. — 13 верас. — С. 3; Імёны нашых суайчыннікаў на карце свету // ПВ. — 1995. — 10 студз. — С. 2–3; Паўстанец з Мосара — даследчык Сібіры // ПВ. — 1995. — 23 мая. — С. 4; Даследчык Сібіры — ураджэнец Наддзвіння: [І.Д. Чэрскі] // ПВ. — 1995. — 6 чэрв. — С. 2; Адкуль пайшла назва Палата // ПВ. — 1995. — 26 верас. — С. 2; Хуткая рака Тураўлянка // ПВ. — 1996. — 28 кастр. — С. 3; Паплечнік Ушынскага — беларускі прыродазнавец // АГ. — 1996. — 7 мая. — С. 2.

Літ.: Арлоў У. Таямніцы Полацкай гісторыі. — 2-е выд. — Мн.: Полымя, 2002. — С. 159; Інфармацыя // Магілёўская Даўніна. — 1995. — № 3. — С. 114; Кто есть кто в Республике Беларусь: в 2 т. Т. 2. — Мн., 2001. — С. 171; Кто есть кто в Республике Беларусь: Люди дела. — Мн.: Энциклопедика, 1999. — С. 349; Савосина И. Глобус Могилевской области не предвидится, но учебник по географии будет обязательно // Могилевская правда. — 1998. — 23 студз. — С. 11; Суднік Г. Фізічны і духоўны распад працягваецца: [інтэрв'ю] // Тыднёвік Магілёўскі. — 2000. — № 14. — С. 7; Могилевский государственный университет им. А.А.Кулешова. — Могилев, 2003. — С. 16, 31; Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова: Мінулае і сучаснасць. — Магілёў: МгДУ, 2003. — С. 232, 236; Скоробогатов А. Каменная тайна. О чем молчат каменные изваяния, обнаруженные в Белыничском районе // Могилевские ведомости. — 2007. — 8 снеж. — С. 8–9; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Шаруха І.М. (13.06.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ШАРЫПКІН** РЫГОР ЛЕАНІДАВІЧ (29.06.1967, в. Вусава Глыбоцкага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца, педагог. Скончыў філал. факультэт ВДПІ (1991). Працуе настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў Лучайскай БШ Глыбоцкага раёна. Краязнаўчую дзейнасць распачаў у 1992 г. пад час працы ў школе. Вялікі ўплыў на пачатак дзейнасці аказала знаёмства і сумесная дзейнасць з В.А. Ермалёнкам і У.І. Скрабатуном. Займаецца пошукам і зборам прадметаў матэрыяльнай і духоўнай культуры Залескага краю (мясцовасці пражывання), аднаўленнем забытых гіст. помнікаў. Стварыў два музеі ў сваёй школе: краязнаўчы музей «Мінулае Залесчыны» (1999) і Музей старой кнігі (2002). Прыняў удзел у археалагічных раскопках гарадзішча Зубкі (1995), гарадзішча Запруддзе (1998), шэрагу канферэнцый: «Глыбоччына — погляд у мінулае» (Глыбокае, чэрвень 1999), «Школьнае краязнаўства і вучнёўская даследчая дзейнасць» (Гродна, чэрвень 2000), трох канферэнцыях, якія ладзіў Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт, прысвечаных краязнаўчаму і аграрнаму турызму

(в. Камарова Мядзельскага раёна). Мае добрыя стасункі з Глыбоцкім раённым краязнаўчым музеем, Еўрапейскім гуманітарным універсітэтам.

Аўтар кніг «Гісторыя Залескага маёнтка» (2000), «Гісторыя Залескага краю» (2002), «Гісторыя Залескай школы» (2007). Мае шэраг артыкулаў, якія друкаваліся ў выданні «Краязнаўца Паазер'я», газетах «Веснік Глыбоччыны», «Вольнае Глыбокае», «Паўночна-Заходні край». Гэта цыкл «краязнаўча-даследчых артыкулаў» па нумізматыцы Залескага краю, артыкулы па гісторыі маёнтка ў в. Залессе-Астроўна, царквы ў вёсках Бутыкі, Мамаі, пра гарадзішчы ранняга жалезнага веку каля вёсак Запруддзе, Зубкі і інш. Шэраг артыкулаў прысвечаны значным асобам Беларусі і іх сувязям з краем. У форме рукапісаў захоўваюцца працы «Мой радавод», «Турыстычна-краязнаўчы маршрут Залесчыны». Рэцэнзіі на дзейнасць Р. Л. Шарыпкіна змяшчалі газеты «НН», «Настаўніцкая газета», «Народная воля», «Краязнаўчая газета», «Народнае слова» і інш. Некаторыя матэрыялы перададзены ў Глыбоцкі краязнаўчы музей. Вялікі аматар нумізматыкі. Адшукаў камень Я. Драздовіча.

Тв.: Кнігі: Гісторыя Залескага маёнтка. — Глыбокае, 2000; Гісторыя Залескага краю. — Глыбокае, 2002. — 38 с.; Гісторыя Залескай школы. — Глыбокае, 2007. — 72 с.

Артыкулы ў навуковым і перыядычным друку: Школьны краязнаўчы музей «Мінулае Залесчыны»: Дзейнасць, грамадскія сувязі і выхаваўчае ўздзеянне // Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі. Да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея / уклад. В.Д. Краско. — Полацк: НПГКМЗ, 2008. — С. 223–228; Таямніца аднаго верша // ВГл. — 1997. — № 96. — С. 2; Залесчына ў канцы XIX ст. // ВГл. — 1998. — № 5. — С. 2; Развіццё адукацыі на Залесчыне // ВГл. — 1998. — № 21. — С. 2; Нумізматычная знаходка ў Бушыках // ВГл. — 1998. — № 34. — С. 2; Цэмахова Дрэйза // ВГл. — 1998. — № 75. — С. 2; Вяртанне да Драздовіча // ВГл. — 1999. — № 6. — С. 2; Гісторыя Залескага маёнтка // ВГл. — 1999. — № 30. — С. 2, 4; Залескі маёнтак у гады вайны // ВГл. — 1999; Проста Марыя // ВГл. — 1999. — № 96. — С. 2; Гісторыя на старых фотаздымках // ВГ. — 2000. — № 13–14. — С. 6; Царква ў Мамаях // ВГл. — 2000. — № 14. — С. 2; Гістарычны хранограф Залешчыны // ВГ. — 2001. — № 6. — С. 2; Аркадзь Смоліч пра нашы мясціны // Паўночна-Заходні край. — 2003. — № 3, сакавік; Яшчэ раз пра камень Драздовіча // ВГ. — 2003. — № 3, ліпень.

Літ.: Інтэрв'ю Р.Л. Шарыпкіна (26.11.2003) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ШАРЭНДА** ВАЛЯНЦІНА ВАСІЛЬЕЎНА (11.01.1958, г. Віцебск), архівіст, краязнаўца. Скончыла СШ № 29 г. Віцебска, філал. факультэт ВДПІ (1979). Працавала ў СШ № 1 (1979–1980), на камсамольскай працы ў СШ № 1, Віцебскім станкаінструментальным тэхнікуме, Кастрычніцкім райкаме ЛКСМБ (1980–1986), метадыстам ў Кастрычніцкім РАА (1986–1988), намеснікам дырэктара СШ № 26 (1992–1997), навуковым супрацоўнікам, загадчыкам аддзела выкарыстання дакументаў ДАВВ (1997–2004). З 2006 г. працуе загадчыкам Віцебскага гарадскога архіва.

Краязнаўчую дзейнасць распачала з прыходам на працу ў ДАВВ. Займаецца даследаваннем станаўлення архіўнай справы на Віцебшчыне (1917–1940), гісторыяй і дзейнасцю ўстаноў, арганізацый, прадпрыемстваў г. Віцебска. Аказвала дапамогу ў стварэнні музея ВТТУ, ВРГКМ. Брала ўдзел у падрыхтоўцы шэрагу выстаў архіўных дакументаў па гісторыі камсамола, Нацыянальнага драматычнага акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа і інш.

Актыўна друкуе артыкулы ў навуковым, рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку на тэмы, звязаныя з гісторыяй і культурай Віцебшчыны. Падрыхтавала некалькі радыё- і тэлеперадач, прысвечаных гісторыі Віцебшчыны.

Працуючы на пасадзе загадчыка Віцебскага гарадскога архіва, плануе стварыць даследчую лабараторыю і базу звестак па гісторыі розных сфер дзейнасці і жыцця г. Віцебска, заняцца публікацыйнай і рэдакцыйнай дзейнасцю; наладзіць добрыя стасункі з краязнаўцамі Віцебска з мэтай прыняцця іх асабістых фондаў.

Тв.: Становление архивного дела на Витебщине // Витебщина архивная: История, фонды, персоналии, сер. XIX–XX вв. — Мн.: БелНДІДАС, 2002. — С. 20–28; Беларускі другі дзяржаўны тэатр // БГЧ. — 2002. — № 5. — С. 68–73.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Віцебск вызвалены, Віцебск адраджаецца // ВР. — 1997. — № 90. — С. 2; Большое видится на расстоянии, или 50 рублей на… больницу // Віцьбічы. — 1997. — 20 мая; Витебский «Нюрнберг» // ВР. — 1997. — № 178. — С. 7; К столетию витебского трамвая // Вечерний Витебск. — 1998. — 14, 28 лют., 14, 21 сак., 11 крас.; Документальная память народа // Віцьбічы. — 1998. — 14 ліп.; Если ты человек // Вечерний Витебск. — 1998. — 3 кастр.; Так это было 79 лет назад // Віцьбічы. — 1999. — 2 лют.; Ключ от всех кладовых истории // Віцьбічы. — 1999. — 11 крас.; За строкой документов // Віцьбічы. — 1999. — 21 верас.; Витебская губерния // Віцьбічы. — 1999. — 29 верас.; Витебская губерния // ВР. — 1999. — № 108. — С. 2; К дню освобождения Витебска // Віцьбічы. — 1999. — 23 чэрв.; Ко дню осво-

бождения Витебска // Віцьбічы. — 2000. — 23 чэрв.; Женщины в истории // Віцьбічы. — 2001. — 23 сак., 27 крас., 6 верас.; Кинематограф в 20-е годы // Віцьбічы. — 2002. — 17 снеж.; Радио не забава, а культурная потребность // Віцьбічы. — 2002. — 19 сак.; Как это было. К 85-летию Октябрьской революции // Вечерний Витебск. — 2002. — 14 ліст.; К 150-летию А.П. Сапунова // Віцьбічы. — 2001. — 5 чэрв.; 85 лет комсомолу // Віцьбічы. — 2003. — 28 кастр.; К 80-летию первого пионерского отряда на Витебщине // Віцьбічы. — 2003. — 10 чэрв.; (разам з У.П. Каханкам) 80 лет Витебской прокуратуре // Взгляд из прошлого в будущее. — С. 7–39.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Шарэнда В.В. (21.06.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ШКАДАЎ** МІКАЛАЙ АЛЯКСЕЕВІЧ (1931, в. Навумаўка Спас-Дзяменскага раёна Смаленскай вобл. – лета 1991), педагог, краязнаўца. Закончыў Баранавіцкі настаўніцкі інстытут (1953), гіст. факультэт МДУ, чатырохгадовыя курсы па вывучэнні нямецкай мовы. Працаваў настаўнікам гісторыі ў СПТВ № 35 г. Дуброўна, СШ у в. Расасна Дубровенскага раёна.

Даследаваў мінулае Дубровеншчыны, аддаючы перавагу вывучэнню гісторыі раёна ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Выступаў ініцыятарам стварэння ў Дуброўна краязнаўчага музея. Звяртаўся з запытамі ў ДАВВ, НАРБ. Стварыў Музей баявой славы 31-й арміі ў СПТВ № 35 г. Дуброўна (цяпер прафесійна-тэхнічны ліцэй). Аказаў вялікую дапамогу пры стварэнні школьнага музея ў в. Сваташына. Стала перапісваўся з ветэранамі, якія пражывалі ва ўсіх рэспубліках СССР.

Удзельнічаў у падрыхтоўцы кнігі «Памяць» Дубровенскага раёна. Аўтар артыкулаў у ёй, а таксама шэрагу матэрыялаў у газеце «Дняпроўская праўда». Сабраў багаты матэрыял і напісаў аб'ёмныя дакументальныя нарысы па гісторыі вёсак Баброва, Расасна, Сваташына Дубровенскага раёна. Матэрыялы друкаваліся ў раённай газеце. Вялікую частку сабраных матэрыялаў перадаў у рэдакцыю раённай газеты «Дняпроўская праўда», значная колькасць іх была выкарыстана пры падрыхтоўцы раённай кнігі «Памяць». Удзельнічаў у навуковых канферэнцыях у Маскве, Ленінградзе.

Літ.: Шпакоўская Г. Для ўсіх, хто любіць гісторыю // НС. — 1996. — 10 снеж. — С. 2; Харэўскі С. Помнікаў стала больш: [рэцэнзія на кнігу «Архітэктурная спадчына Браслаўшчыны»} // НН. — 1997. — 10 сак. — С. 9; Казюля Я. Напісанае застаецца // ГлР. — 1997. — 3 крас. — С. 5; Шыдлоўская Г. Пятыя «Браслаўскія чытанні» // Народнае слова. — 2000. — 23 мая. — С. 3; Шидловский К.С. // Кто есть кто в Республике Бела-

русь. — Мн., 2000. — 147 с.; Корсак Т. На кангрэсе беларусістаў // БЗ. — 2001. — № 102. — С. 2; Пашкевіч Т. Браслаўшчына: Прырода і людзі // БЗ. — 2004. — 4 лют.; Маліноўскі М. Адчыняю «куфэрак» нашай зямлі» // Культура. — 2006. — № 10. — С. 14; Шыдлоўская Я. Жалезны век у Браславе // НН. — 2006. — 31 сак. — С. 43; Сучасныя беларускія краязнаўцы // КГ. — 2006. — № 36, верасень. — С. 2; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Шыдлоўскі К.С. (22.09.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Дадатак да анкеты «Краязнаўцы Віцебшчыны» (15.01.2009) // Тамсама; Маліноўскі М. Адчыняю «куфэрак»… нашай зямлі // Маліноўскі М. З берагоў Друі да ракі Мышанка. — Баранавічы, 2008. — С. 164–167; Каментар да анкеты «Краязнаўцы Браслаўшчыны» // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ШЫК** УЛАДЗІМІР, журналіст, краязнаўца. Займаецца краязнаўчымі даследаваннямі Пастаўшчыны ў межах журналісцкіх заданняў і актыўнай грамадскай пазіцыі.

Тв.: Уваскросшы з руінаў: [Троіцкі касцёл у Дунілавічах Пастаўскага раёна] // Нар. Воля. — 1998. — 22 мая. — С. 3; Таинства видимый знак: [рэліквія з в. Ваўкалата Докшыцкага раёна] // ВК. — 1999. — № 8. — С. 3; Месца матэрыялізму павінен заняць ідэалізм: [І. Пракаповіч] // ВК. — 1999. — № 25. — С. 3; Долгая дорога к дому: [Паставы] // ВК. — 1999. — № 29. — С. 4; Хопіць быць чужымі ва ўласным доме: [Ф. Ляшонак] // ВК. — 1999. — № 60. — С. 4; Владимир Скрабатун: «Мы были вполне европейским государством» // ВК. — 1999. — № 68. — С. 3; Глубокский Нострадамус: [П.Д. Глаўніцкі] // ВК. — 1999. — № 93. — С. 3; Няма ў чым каяцца: [А. і А. Фурс — сябры СБП] // ВК. — 1999. — № 97. — С. 3; Настаўнік, у вугал // ВГ. — 2000. — № 1 (33), студзень. — С. 2; Шчырыя сэрцы маўчаць не маглі: Саюз беларускіх патрыётаў // ВГ. — 2000. — № 7 (39). — С. 3. — № 8. — С. 3; Цяжкі крыж акадэміка астранаўтыкі // ВГ. — 2000. — № 10. — С. 3; Яны былі першымі, альбо Яшчэ некалькі словаў пра патрыётаў Бацькаўшчыны з Пастаў // ВГ. — 2000. — № 11, 12. — С. 2–3; Паставы — горад старажытны // ВГ. — 2000. — № 11, 12. — С. 3; Тяжкий крест академика астронавтики: [Б. Кіт] // ВК. — 2000. — № 26. — С. 3; Наш уголок Европы: [Мосар] // ВК. — 2000. — № 30. — С. 3; Міхась за мяжу не збіраецца пакуль: [М. Гіль, Паставы] // ВК. — 2000. — № 38. — С. 3; Железных дел мастер: [Ю. Фурс] // ВК. — 2000. — № 71. — С. 3; Мы іграем не за грошы: [А. Собаль, Паставы] // ВК. — 2000. — № 81. — С. 3; Сэрцы не маглі маўчаць: [Саюз беларускіх патрыётаў, Глыбокае] // ВК. — 2000. — № 95. — С. 4; Пограничная зона // ВК. — 2001. — № 1. — С. 3; В окрестностях Парижа без перемен // ВК. — 2001. — № 68. — С. 3; Аркадзь Нафрановіч: «Шчаслівы той, хто кожнай сваёй клеткай знітаваны з роднай зямлёй» // ВК. — 2001. — № 72. — С. 3; Иосиф Бунто: «Вольно обошлись с историей даже в Хатыни» // ВК. — 2002. — № 5. — С. 3; Віталь Гарановіч: «Нікому не знішчыць родную мову» // ВК. — 2002. — № 15. — С. 3; След Мюнхгаузена в Глубоком: [пахаванне цёзкі па прозвішчу] // ВК. — 2002. — № 27. — С. 3; Збигнев Колос: «Забывая прошлое — не построишь будущее» // ВК. — 2003. — № 26. — С. 4; Возвращение из небытия: [Пастаўшчына, А. Ромер] // ВК. — 2003. — № 61. — С. 3; Іосіф Атрахімовіч: «Баюся цвілі ў душах новых са скуры бычай» // ВК. — 2003. — № 66. — С. 3; Сумерки над Гутой: [вёска ў Пастаўскім раёне] // ВК. — 2003. — № 69. — С. 4; Настоящий полковник: [М. Харчанка] // ВК. — 2003. — № 85. — С. 4; Хранить вечно: [Глыбоцкі занальны архіў] // ВК. — 2003. — № 92. — С. 3; Древний поселок с гербом: [Шаркоўшчына] // ВК. — 2004. — № 8. — С. 3; Жизнь, похожая на зону: [рэпрэсіі ў Зах. Віцебшчыне] // ВК. — 2004. — № 16. — С. 3; До города не дорос: [Варапаева] // ВК. — 2004. — № 24. — С. 3; Шудель Иосиф: «Любая диктатура аморальна и отвратительна» // ВК. — 2004. — № 36. — С. 3; Аистов пересчитали: [на Браслаўшчыне — 500 пар] // ВК. — 2004. — № 74. — С. 2; Верность призвания: [Л. Жук] // ВК. — 2004. — № 100. — С. 3; В эпоху великих потрясений: [Зах. Віцебшчына] // ВК. — 2005. — № 16. — С. 3; В условиях военного времени: [Глыбокае, 1944] // ВК. — 2005. — № 25. — С. 25. — С. 3; Эх, путь-дорожка фронтовая: [землякі-пастаўчане на франтах Другой сусветнай вайны] // ВК. — 2005. — № 34. — С. 2; Куток народнага побыту // ПК. — 2007. — № 4. — С. 3.

**ШЫЛЁНАК** ТАМАРА ПЯТРОЎНА, настаўніца беларускай мовы і літаратуры ў СШ № 2 г. Глыбокага, кіраўнік краязнаўчага гуртка (з 1989). Стварыла Літаратурны музей у СШ № 2 г. Глыбокага. У музеі змяшчаюцца матэрыялы пра глыбоцкіх краязнаўцаў. Разам з дзецьмі стварыла альбом, матэрыялы якога апублікаваны ў газеце «Веснік Глыбоччыны». Краязнаўствам займаецца і дачка.

Тв.: Народная тапаніміка // ШП. — 1990. — № 88. — С. 3; Фальклор Глыбоччыны // ВГл. — 1993. — № 81. — С. 2; Ёсць і ў нас, як у іншых, святыні // Тамсама; Увекавечыць скарб Глыбоччыны // ВГл. — 1995. — № 49. — С. 2.

Літ.: Звонка Т. Вандроўка з мінулага ў сучаснасць // ВГл. — 1996. — № 87. — С. 2.

**ШЫМАН** ЗІНАІДА І. (1928, в. Азярава Браслаўскага пав.), педагог. Скончыла філал. факультэт БДУ. Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. Піша вершы, невялікія гісторыі, у якіх дзеліцца ўспамінамі з ранейшага жыцця. Выдатнік народнай асветы БССР.

Тв: Легенды і паданні Пастаўшчыны // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Пастаўскага раёна. — Мн.: БелТА, 2001. — С. 611; Адам Гурыновіч // Звязда (П). — 1990. — № 33. — С. 3; Васіль Качалаў // Звязда (П). — 1987. — № 60. — С. 3.

Літ.: Дзе Мядзелка песні пяе… Пастаўшчына літаратурная. — Мн., 2006. — С. 261.

**ШЫМУК** БАРЫС ПІЛІПАВІЧ († 30.10.2008), настаўнік, краязнаўца. Член Беларускага геаграфічнага таварыства. Ініцыятар і арганізатар стварэння музея І.Д. Чэрскага ў Валынецкай СШ Верхнядзвінскага раёна. Праз перапіску і пошук у архівах, бібліятэках, навуковых установах сабраў багаты матэрыял пра жыццё і навуковыя адкрыцці земляка. У экспазіцыі прадстаўлены копіі дакументаў, фатаграфіі, карціны, мінералагічныя калекцыі, кнігі і інш. экспанаты. Грунтоўна распрацавана і прадстаўлена гісторыя вёскі Валынцы.

Тв.: Падзеі 1812 года на Дрысеншчыне // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна. — Мн.: Паліграфафармленне, 1999. — Кн. 1. — С. 62–65; (разам з А.Ф. Бубала) Жыццё на перадавой: [М.І. Хандогін] // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна. — Мн.: Паліграфафармленне, 2000. — Кн. 2. — С. 253–254; (разам з А.Ф. Бубала) Нашы «дзяды Талашы» // ДзП. — 1991. — № 87. — С. 3

Літ.: Валынецкі музей І.Д. Чэрскага // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна. — Мн.: Паліграфафармленне, 2000. — Кн. 2. — С. 322–323.



**ШЫМУКОВІЧ** СЯРГЕЙ ФАДЗЕЕВІЧ (28.05.1974, г. Дзісна Міёрскага раёна Віцебскай вобл.), гісторык, краязнаўца. Кандыдат гіст. навук (2000). Сын Ф.Л. Шымуковіча. Скончыў Дзісненскую СШ Міёрскага раёна, гіст. факультэт БДУ (1996), аспірантуру пры РІВШ БДУ (1999). Працаваў метадыстам у РІВШ БДУ (2000), дацэнтам у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (з 2003).

Даследуе гісторыю г. Дзісны, гарадоў Падзвіння, займаецца параўнальным аналізам шляхоў развіцця гарадоў Беларусі. Цікавіцца гісторыяй роднага краю пачаў пад час навучання ў Дзісненскай СШ. Значны ўплыў аказалі бацька, Ф.Л. Шымуковіч і настаўніца гісторыі Марыя Іванаўна Дзехцяронак. Пад час навучання ў БДУ уплыў аказала кандыдат гіст. навук, дацэнт Валянціна Анатольеўна Цяплова.

Аўтар курсавых і дыпломнай работ, прысвечаных гісторыі Дзісны, напісаных на аснове архіўных матэрыялаў («Гісторыя Дзісны і наваколляў»), частка якіх лягла ў аснову артыкулаў, напісаных для кнігі «Памяць» Міёрскага раёна. Аўтар артыкулаў у перыядычным друку на краязнаўчыя тэмы. Рыхтуе кнігу па гісторыі горада Дзісны.

Перадаў шэраг пісьмовых матэрыялаў і артэфактаў па гісторыі Дзісны ў краязнаўчы музей Дзісненскай школы-інтэрната.

Тв.: Артыкулы ў навуковым друку і кнізе «Памяць»: Развіццё прамысловасці ў Дзісне. Занятак насельніцтва // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Міёрскага раёна. — Мн.: Бел. навука, 1998. — С. 118–119; Гандаль у Дзісне // Тамсама. — С. 120–122; Будаўніцтва і народная гаспадарка // Тамсама. — С. 123–127; Насельніцтва Дзісны ў XIX ст. Змяненні сацыяльнага і этнічнага складу жыхароў // Тамсама. — С. 129–131; Деятельность частных благотворительных обществ г. Полоцка, конец XIX – нач. XX в. // Беларускі горад у часе і прасторы: 500 гадоў Полацкай магдэбургіі: зборнік навуковых прац. — Наваполацк; Мн., 2001. — С. 134–142.

Артыкулы ў перыядычным друку: Заняткі нашых продкаў // СП (М). — 2000. — № 4. — С. 4; Залаты час горада // СП (М). — 2000. — № 50. — С. 2; Трагедыя ў Дзісне ў чэрвені 1942 г. // СП (М). — 2000. — № 54. — С. 3; Гаспадарчае жыццё ў партызанскіх зонах // МН. — 2003. — 16 снеж. — С. 2.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Шымуковіч С.Ф. (6.04.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ШЫМУКОВІЧ** ФАДЗЕЙ ЛАЎРЭНЦЕВІЧ (27.02.1935, в. Баркоўчына Мікалаеўскай гміны Дзісненскага пав., цяпер Міёрскі раён Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыў Акунёўскую СШ (1955), фізіка-матэматычны факультэт ВДПІ (1969). Працаваў старшынёй Сцефанпальскага с/с (1960), нам. старшыні калгаса (1961–1964), настаўнікам, дырэктарам Акунёўскай СШ (1964–1973), дырэктарам Дзісненскай школы-інтэрната (1974–1979), завучам Дзісненскай БШ (1979–1984), ваенруком у Дзісненскай СШ (1984–1995).

Вывучаць край стаў з 1969 г., калі пачаў працаваць у Акунёўскай СШ. Разам з ваенруком А.У. Людскім высвятлялі лёсы жыхароў мікрарэгіёна школы ў гады Другой сусветнай вайны. Склалі спіс землякоў – удзельнікаў рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, Вялікай Айчыннай вайны. З часам тэматыка

пашырылася і стала комплекснай, аднак асаблівую ўвагу надае даследаванню жыццёвых шляхоў землякоў, гісторыі вёсак у раёне, г. Дзісны.

Сабраў значны маэрыял па гісторыі 4-й Беларускай партыз. брыгады (успаміны партызанаў, якія жывуць у Беларусі, Казахстане, Расіі, Украіне). Аднак ад стварэння кнігі па гісторыі брыгады прыйшлося адмовіцца з прычыны складанасці стварэння аб'ектыўнай карціны дзейнасці злучэння, таму што большасць удзельнікаў распавядалі пра падзеі суб'ектыўна, аддаючы перавагу асабістым перажываннім і эмоцыям. З пераездам у г. Дзісну на пасаду дырэктара школы-інтэрната зацікавіўся пытаннем вызвалення горада ад фашыстаў у 1944 г. Правёў апытанне мясцовых жыхароў, былых салдат, якія вызвалялі горад, і высветліў шэраг важных дэталяў.

Браў актыўны ўдзел у афармленні музея Героя Савецкага Саюза Кузьміна, камандзіра 1-й танкавай роты 159-й танкавай брыгады, якая вызваляла г. Дзісну ў 1944 г.

Аўтар шэрагу публікацый на старонках рэспубліканскага і мясцовага перыядычнага друку («Рэспубліка», «Звязда», «Сельская газета», «Народнае слова», «Міёрскія навіны»). Займае актыўную грамадскую пазіцыю. Вядзе паленіку адносна лёсу г. Дзісны, знікаючых вёсак, удакладнення матэрыялаў і дапаўнення кнігі «Памяць» Міёрскага раёна.

Узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР (1972), Пахвальнай граматай МА БССР (1975).

Тв.: Вятры ваенных навальніц // КР. — 1989. — № 74–76; І майская сталасць // КР. — 1990. — № 15, 16, 18–20; Багацце думак і натхненняў // КР. — 1990. — № 72. — С. 3; Партызанскімі сцежкамі // СП (М). — 1990. — № 40. — С. 3, 4; Не сорамна азірнуцца // СП (М). — 1990. — № 68; З далёкага мінулага // СП (М). — 1991. — № 14. — С. 4; У далёкім 41-м // СП (М). — 1991. — № 59. — С. 2; Камбрыг // СП (М). — 1991. — № 62. — С. 2; У грозным 41-м // СП (М). — 1991. — № 79. — С. 2; Хто ж вызваляў Дзісну? // СП (М). — 1991. — № 100. — С. 3; Учора, сёння // СП (М). — 1991. — № 106. — С. 2; Мужычок // СП (М). — 1992. — № 12. — С. 2; Аб Памяці для памяці // СП (М). — 1992. — № 24. — С. 3; Памяць // СП (М). — 1999. — № 42. — С. 2; Незаслужана забытая // СП (М). — 1999. — № 46. — С. 3; Звычайны чалавек // СП (М). — 1999. — № 53. — С. 3; Паміраючы горад // СП (М). — 2000. — № 10. — С. 3; Мы і рэлігія // СП (М). — 2001. — № 41. — С. 2, 4; Імёны на абеліску // СП (М). — 2001. — № 58. — С. 2; Зямля і людзі // СП (М). — 2001. — № 75. — С. 3; Лёс салдата // МН. — 2002. — № 16. — С. 2; 170 гадоў таму // МН. — 2002. — № 71. — С. 2; Беларусь у агні 1812 г. // МН. — 2002. — № 93. — С. 3; Жыццё для людзей // МН. — 2003. — № 3. — С. 2; Пра нашу памяць і беспамяцтва // МН. — 2003. — № 68. — С. 2; Жыву пад гэтым небам // МН. — 2003. — № 73. — С. 2; Шалаш не месца для шчасця // МН. — 2003. — № 86. — С. 3; Усё жыццё — экзамен на сталасць // МН. — 2004. — № 23. — С. 2; Перамога вырашалася на фронце, а кавалася ў тыле // МН. — 2004. — № 37. — С. 3; І салдат і хлебароб // МН. — 2004. — № 53. — С. 3; Танкіст з Дзісны // МН. — 2004. — № 78. — С. 3; Малая вёска — калыска // МН. — 2005. — № 4. — С. 3; Знішчальнік танкаў // МН. — 2005. — № 10. — С. 3; Мінамётчык з Дзвіны // МН. — 2005. — № 18. — С. 3; Толькі ўспаміны // МН. — 2005. — № 28. — С. 3; Мае аднавяскоўцы ў Вялікай Айчыннай вайне // МН. — 2005. — № 35. — С. 3; Лёсы, зламаныя вайной // МН. — 2005. — № 37–38. — С. 5; Радзіма ў чалавека адна // МН. — 2005. — № 65. — С. 5; Якое заўтра ў Дзісны // МН. — 2005. — № 69. — С. 2; Нарадзілася і памерла // МН. — 2005. — № 86. — С. 4; Патрыятызм і краязнаўства // МН. — 2005. — № 92. — С. 2; Яленскія з Акунёва // МН. — 2006. — № 37–38. — С. 3; Настаўніца першая мая // Тамсама. — С. 4; Маладосць, аддадзеная флоту // МН. — 2006. — № 59. — С. 2; Рэха вайны // МН. — 2006. — 20 чэрв. — С. 3; Праз віхуры грозныя // МН. — 2007. — № 41. — С. 2; Людзі вогненная прафесіі // МН. — 2007. — № 63. — С. 4; Ахова здароўя ў Дзісне // МН. — 2007. — № 99. — С. 3.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Шымуковіч Ф.Л. (30.06.2008) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Ліст Ф.Л. Шымуковіча да М.В. Півавара (30.06.2008) // Тамсама.



**ШЫНКЕВІЧ** АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ (8.04.1956, г. Орша), краязнаўца. Скончыў СШ № 5 г. Оршы (1973). Працуе на заводзе «Чырвоны Кастрычнік» (цяпер фірма «Лёс») наладчыкам радыёэлектроннай апаратуры.

У краязнаўства прыйшоў з зацікаўленасці фатаграфіяй. Пачаў здымаць помнікі гісторыі і культуры, а потым і збіраць матэрыялы пра гісторыю краю. Свядома займацца краязнаўчымі росшукамі пачаў з 1980 г. Падрыхтаваў рукапіс «Остатки древних поселений на Оршанщине» (1984, не выдадзены), матэрыялы якога выкарыстоўваліся пры падрыхтоўцы пазнейшых кніг аўтара. Значную ролю ў станаўленні цікавасці да вывучэння роднага краю аказалі А.М. і Э.А. Ляўковы.

Комплексна даследуе Аршаншчыну. Аддае перавагу вывучэнню помнікаў гісторыі, культуры і прыроды. На працягу 30 гадоў праводзіць пошук, вывучэнне, картаграфаванне, фотафіксаванне, складанне апісанняў аб'ектаў мінуўшчыны. Склаў карты помнікаў даўніны Оршы і ваколіц. У апошні час актыўна вывучае культавыя камяні і палеанталогію Аршаншчыны. Сабраў палеанталагічную калекцыю (каля 1000 адзінак), калекцыі замалёвак і здымкаў культавых камянёў, каменных крыжоў

і надмагілляў. Асабіста выявіў шэраг гарадзішчаў, паселішчаў, курганоў, каменных крыжоў (гарадзішча каля в. Лешча, курганы паблізу вёсак Ламачына і Горная Веравойша, селішчы ў ваколіцах вёсак Ляўкі, Рэпухава, Прыдняпроўе, Ларынаўка, культавыя камяні каля вёсак Гацькаўшчына, Стражава, капішчы паблізу в. Ларынаўка і Вусцянскага гарадзішча і інш.).

Браў актыўны ўдзел у стварэнні Аршанскага клуба гісторыі і старажытнасцяў «Повязь». Адзін з арганізатараў правядзення фотавыставы, прысвечанай помнікам гісторыі і культуры Оршы: [без назвы] (1987, фае кінатэатра «Перамога»), «Помнікі старажытнай архітэктуры Аршаншчыны» (1988, фае кінатэатра «Перамога»), «Ворша: погляд у мінулае» (1988, кафе «Молодежное», г. Орша), «Мастацтва старажытнай Аршаншчыны» (1989, фае кінатэатра «Перамога»), у чытальнай зале бібліятэкі ім. А. С. Пушкіна ў г. Оршы (1994), да гадавіны атрымання Оршай Магдэбурскага права (1996).




Аўтар кнігі «Аршанская даўніна» (1992), якая стала першым значным выданнем у другой палове XX ст., у якім абагульняліся звесткі пра помнікі гісторыі і культуры Аршаншчыны. Некаторыя артыкулы з выдання былі змешчаны ў кнігах «Памяць», прысвечаных Оршы і Аршанскаму раёну, а таксама ў зборніку «Аршанская мінуўшчына». З дапамогай Аршанскага аддзялення БДТАПГіК выдаў шэраг буклетаў серыі «Гісторыя аднаго помніка»: «Кутеинский монастырь в Орше», «Аршанскае замчышча», «Ільінская царква ў Оршы», а таксама брашур: «Аршаншчына старажытная», «Орша — взгляд в прошлое», «Кутеинская лавра: страницы истории», «Аршаншчына ў адлюстраваннях», «Падарожжа па Дняпры». Аўтар кніг (у электронным варыянце) «Фальклорная спадчына Аршаншчыны» (2003), «Очерки о земле оршанской» (2005), «Оршанщина: мир ископаемых» (2005). Распрацаваў карту «Помнікі даўніны на Аршаншчыне» (уключае 170 аб’ектаў).




Напісаў некалькі артыкулаў, прысвечаных Аршаншчыне, для «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі». Браў удзел у стварэнні кнігі «Памяць» Оршы і Аршанскага раёна. Удзельнічаў у падрыхтоўцы дапаможніка «Мой родны край — Аршаншчына» (2000), аўтар некалькіх артыкулаў у ёй. Аўтар карт і схем, малюнкаў (35 замалёвак каменных крыжоў), прысвечаных гісторыі і культуры Аршаншчыны. Апублікаваў дзясяткі артыкулаў на старонках мясцовых перыядычных выданняў. Шмат матэрыялаў на краязнаўчую тэматыку змясціў у інтэрнэце.




У электроннай форме падрыхтаваў працу «Оршанщина. Природа и старина», галоўнай часткай якой з’яўляецца «Віртуальнае падарожжа па Аршаншчыне», што складзена на аснове матэрыялаў кніг аўтара «Фальклорная спадчына Аршаншчыны» (2003), «Очерки о земле оршанской» (2005), «Оршанщина: мир ископаемых» (2005) з дадаткам новых матэрыялаў і апісаннямі знаходак апошніх гадоў. Уключае ў сябе некалькі соцень фотаздымкаў цікавых месцаў Аршаншчыны. Складаецца з 4 раздзелаў: «Карта объектов истории, старины и природы Оршанщины», «Культовые камни на территории Оршанщины», «Оршанщина на аэрофотоснимках», «Реестр объектов истории, старины и природы Оршанщины». DVD таксама ўключае ў сябе тэксты кніг аўтара (у фармаце PDF), аўтарскія публікацыі ў навуковым і перыядычным друку, рэцэнзіі на дзейнасць, архіўныя матэрыялы, карты Аршаншчыны XVI–XVIII стст., фотаздымкі помнікаў гісторыі, культуры, прыроды Аршаншчыны і інш.матэрыялы.




Аказаў дапамогу А.М. Кудзіну пры падрыхтоўцы ім кнігі «Храналогія гісторыі Оршы» (1992), а таксама В. П. Лютынскаму ў рабоце над кнігай «Орша в войне 1812 года» (1995), С.М. Асіноўскаму ў рабоце над кнігай «Орша: Залатыя стрэлы на блакітным полі» (1997), М. Раманюку — над кнігай «Беларускія

народныя крыжы» (2000), Э.М. Зайкоўскаму, Л.У. Дучыц — над кнігай «Жыватворныя крыніцы Беларусі» (2001), В. Жукоўскаму — над кнігамі «Оршеведение» (2002, 2009) «Город Барань» (2004), А.У. Русецкаму — над кнігай «Мастацкая культура Аршанскай зямлі ў канцы Х–ХІХ стагоддзях» (2002). Некаторыя матэрыялы пра надпісы і малюнкі на надмагільных камянях выкарыстаны ў выданні «Археалогія Беларусі» (Т. 4. Мн., 2001, с. 127, 130, 371).

Збірае фальклорную спадчыну рэгіёна. У зборніку «Легенды і паданні Аршаншчыны» (Орша, 2001, 2004) апублікаваны пачутыя і запісаныя ў 1960–1990-я гг. паданні «Камень Сямігаюн», «Лардавы камяні», «Ласка, «Камень-ліхадзей Камар», «Легенда аб узнікненні вёскі Татарск», «Легенда пра камень Караткевіча», «Юр'еў востраў», «Паданне пра Чаркасоўскае гарадзішча», «Паданні пра Іллінскую царкву». У выпраўленым і значна дапоўненым выглядзе паданні ўвайшлі ў склад кнігі «Фальклорная спадчына Аршаншчыны» (2003).

Актыўна супрацоўнічае з навучальнымі ўстановамі Оршы і Барані (1986–2008). Перадаў у Музей гісторыі і культуры Аршаншчыны вырабы з косці, гліны, жалеза, знойдзеныя каля в. Вусце Аршанскага раёна. У 1999 г. у Музеі гісторыі і культуры Оршы прайшла выстава прыватнай калекцыі акамянеласцяў.

За актыўную дзейнасць узнагароджаны Граматай прэзідыума Віцебскага абласнога савета БДТАПГіК, Ганаровай граматай Прэзідыума Рэспубліканскага савета БДТАПГіК (1987).

Тв.: Кнігі: Кутеинский монастырь в Орше. — Орша: Оршанская типография, 1988. — 4 с.; Аршанскае замчышча. — Орша: Оршанская типография, 1989. — 8 с.; Ільынская царква ў Оршы. — Орша, 1989. — 8 с.; Аршаншчына старажытная. — Орша: Аршанская друкарня, 1990. — 19 с.; Аршанская даўніна. — Мн.: Полымя, 1992. — 112 с.; Кутеинская лавра: Страницы истории. — Орша, 1992. — 20 с.; Орша: взгляд в прошлое. — Орша: Оршанская типография, 1992. — 26 с.; Аршаншчына ў адлюстраваннях. — Орша: Аршанская друкарня, 1994. — 37 с.; Падарожжа па Дняпры. — Орша: Аршанская друкарня, 1994. — 40 с.; Аршаншчына: Спадчына мінулага. — Орша: Аршанская друкарня, 1997; Оршанщина: Памятники природы и старины: топография и реестр объектов по состоянию на 2000 г. — Горки; Орша: Оршанская типография, 2001. — 40 с.; Оршанщина: Мир ископаемых: [саматуж. электроннае выд.]. — Барань, 2009. — 288 с.; Очерки о земле Оршанской. Природа, история, народные предания, старина: [саматуж. электроннае выд.]. — Барань, 2009. — 672 с.

Артыкулы ў энцыклапедыях: Аршанскі раён // БГЭ. — Мн., 1993. — Т. 1. — С. 192–194; Копысь // БГЭ. — Мн., 1997. — Т. 4. — С. 234–235; Орша // БГЭ. — Мн., 1999. — Т. 5. — С. 357–359.

Артыкулы ў навуковым друку і кнігах «Памяць»: Аршаншчына ў помніках даўніны і старажытнасці. Вывучэнне мінуўшчыны края // Аршанскі краязнаўчы зборнік. — Орша, 1995. — С. 4–6; Старадаўнія пісьмены; Старажытная крэпасць; Таямніцы гарадскіх пячор; Лёс «Белага Ковеля» // Аршанская мінуўшчына. — Орша, 1997. — С. 13–24; Куцеінскі манастыр // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Оршы і Аршанскага раёна. — Мн.: БелЭн, 1999. — Кн. 1. — С. 83–87; Помнікі даўніны на Аршаншчыне: [карта] // Тамсама. — С. 31; Раздзел 2. Далёкае мінулае нашага краю // Мой родны край — Аршаншчына: гісторыка-краязнаўчы зборнік для пачатковага азнаямлення / аўт.-склад. Т.М. Вароніна, А.М. Шышкевіч. — Віцебск: ВАД, 2000. — С. 43–51; Куцеінскі манастыр // Тамсама. — С. 75–77; Куцеінская друкарня // Тамсама. — С. 77–79.

Карты: Схематическая карта расположения древних памятников на территории Оршанского района, 1986 // Остатки древних поселений на Оршанщине: [рукопись 1986 г., не издавалась, карта не публиковалась]; Памятники старины на Оршанщине, 1989 // ЛП. — 1989 — № 155. — 1989. — № 156; Помнікі даўніны на Аршаншчыне, 1989 // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2-х кн. — Мн., 1999–2000; Помнікі даўніны на Аршаншчыне, 1990 // Аршаншчына старажытная. — Орша, 1991; Аршаншчына ў адлюстраваннях. — Орша, 1993; Помнікі даўніны на Аршаншчыне (1995) // Аршаншчына: Спадчына мінулага. — Орша, 1997; Памятники оршанской старины, 2000 // Оршанщина: памятники природы и старины: Топография и реестр объектов по состоянию на 2000 г. — Горки, 2001; Памятники природы и старины у северо-восточной окраины Орши (2000) // Оршанщина: памятники природы и старины: Топография и реестр объектов по состоянию на 2000 г. — Горки, 2001; Оршанщина: Природа и старина, 2005 // Очерки о земле Оршанской. — 2005.

Артыкулы ў перыядычным друку: Сівых часоў нямыя сведкі: [Смаляны] // ЛП. — 1986. — № 27. — С. 4; Загадка старажытнага Одрска // ЛП. — 1986. — № 55. — С. 4; Куцеінскі манастыр: людзі і падзеі: [«Помнікі Аршаншчыны»] // ЛП. — 1986. — № 81. — С. 4; Старадаўнія пісьмёны // ЛП. — 1986. — № 133. — С. 4; Старажытная крэпасць // ЛП. — 1986. — № 149. — С. 3; «Повязь» дзейнічае // ЛП. — 1986. — № 168. — С. 4; Таямніцы гарадскіх пячор // ЛП. — 1986. — № 172. — С. 4; Копысь старажытная // ЛП. — 1986. — № 183. — С. 4; Лёс «Белага Ковеля» // ЛП. — 1986. — № 199. — С. 4; «Повязь» — пара станаўлення // ЛП. — 1987. — № 5. — С. 4; Орша — 920 гадоў гісторыі // ЛП. — 1987. — № 15, 38, 61, 84; Калі адкрыецца музей // ЛП. — 1987. — 11 сак. — С. 1; Падарожжа па Дняпры // ЛП. — 1987. — № 120, 122; Незвычайныя камяні // ЛП. — № 132. — С. 4; Тамаш Зан — сябра Міцкевіча // ЛП. — 1987. — № 160. — С. 4; Стары будынак над Аршыцай // ЛП. — 1988. — № 8. — С. 3; Куцеінскі манастыр: старонкі гісторыі // ЛП. — 1988. — № 38, 42, 45; Гісторыя ў малюнках // ЛП. — 1988. — № 109; (разам з В. Сцяпанавым, А. Сярожкіным, Ю. Каплун) Захаваем для нашчадкаў // ЛП. — 1988. — 6 жніўня; Падання аб вёсках // ЛП. — 1989. — № 45, 100, 106; Адзін дзень у Аршанскім замку // ЛП. — 1989. — № 136. — С. 3; Унучка старажытнай царквы: [Ільінская царква ў г. Оршы] // ЛП. — 1989. — № 151. — С. 3; Даўніна: вядомая і занядбаная: [храмы Аршаншчыны] // ЛП. — 1989. — № 155, 156. — С. 3; Лардавы камяні: [ва ўрочышчы Красны Роў] // АГ. — 2001. — № 22. — С. 3; Татарск: [этымалогія] // АГ. — 2001. — № 81. — С. 5; Легенда аб узнікненні вёскі Татарск // Ступени. — 2005. — № 4, 6; Орша: Погляд у мінулае // ТЭ. — 2008. — № 26. — С. 5; «Фальклорная спадчына Аршаншчыны»:

[прадмова, Пра паромшчыцу Аўдоццю-Дзямідзіху, Успаміны пра продкаў] // Супермаркет. — 2008. — № 14; Камар-ліхадзей // Супермаркет. — 2008. — № 16; Татарск, і яшчэ пра татар… // Супермаркет. — 2008. — № 18; Дзяды апавядалі: [Барань] // Супермаркет. — 2008. — № 19; Паданне аб вадзяным млыне ў Барані // Супермаркет. — 2008. — № 20; Пра назву вёскі Бранцава // Тамсама; Легенда аб паходжанні вёскі Зайцава, Вёскі Забалацце і Веравойша // Тамсама; Легенда пра рэчку Ульянка, Пра вёску Зубрэвічы, Засеклі // Супермаркет. — 2009. — № 1; Паданне аб вёсцы Машкова // Супермаркет. — 2009. — № 2, Паданне пра маёнтак пана Хамянтоўскага // Тамсама; Як дзікі гусь даў назву вёсцы, Паданне пра вёску Амерыка // Тамсама; Чаму такая назва — Загарэльскія? // Супермаркет. — 2009. — № 3; Паданне пра лес Бараноўшчына // Тамсама; Юр'еў востраў // Тамсама; Паданне пра вёску Клюкаўка // Тамсама; Легенда пра вёску Крапіўна // Супермаркет. — 2009. — № 4; Паданне пра Крапівенку і вёску Барздоўка // Тамсама; Пракопава — Сёмачкава крыніца // Тамсама; Крапівенка — рэчка невялічка… // Тамсама; Гацькаўшчына: Таямніцы і сведкі мінулага // Супермаркет. — 2009. — № 6; Шатравіна // Супермаркет. — 2009. — № 7; Юрцава // Тамсама; Паданне пра вёску Турлаі // Тамсама; Паданне пра вёску Цюльпін // Тамсама; Смалянскія паданні: Курган, Куратнік, Хутар Белік, Хутар Вітахмо // Супермаркет. — 2009. — № 8; Лёс Вітахмоўскага млына // Тамсама; Паданне пра рэчку Слабада // Тамсама; Легенда пра вёску Пішчалава // Тамсама; Урочышча Ласка // Тамсама; Каменны крыж на беразе Адрова // Супермаркет. — 2009. — № 9; Камень Караткевіча // Тамсама; Рагвалодаў камень // Супермаркет. — 2009. — № 13; Ільінская царква // Тамсама; Легенда пра баярына Оршу // Супермаркет. — 2009. — № 14; Татарск // НС. — 2009. — № 14. — С. 5; Аршанская ікона Маці Боскай // Супермаркет. — 2009. — № 16; Грутаў роў і гаючая крыніца // Тамсама; Звілісты Дняпро // Тамсама; Чаму вёска завецца Зубава // Тамсама; Копысь: паходжанне назвы // Супермаркет. — 2009. — № 19; Мінулае ў назвах // Тамсама; Аршанскія падзямеллі // Супермаркет. — 2009. — № 20; Аршанскі млын на замчышчы // Тамсама; Аршанскі млын на замчышчы // Супермаркет. — 2009. — № 21; І яшчэ некалькі радкоў легенд і рэальных фактаў пра край аршанскі… // Тамсама.

Літ.: Танчэўская А. З фотаапаратам і кінакамерай // АГ. — 1986. — № 89. — С. 3; Тарасаў К. Каб энтузіязм не быў прыватным // ЛіМ. — 1987. — 3 ліп.; Алава Т. Канферэнцыя па краязнаўстве // АГ. — 1989. — № 203. — С. 4; Алава Т. Выдадзена ў Оршы // АГ. — 1990. — № 98; Аўтар кніг — рабочы // Звязда. — 1990. — № 236; Танчэўская А. Шматгадовая праца // АГ. — 1992. — 26, 27 лют.; Радкевіч І. Летапіс роднага горада // АГ. — 1992. — № 31; Лютынскі В. Літаратура аб Оршы: дасягненні і праблемы // АГ. — 1993. — № 107. — С. 2; Кавалёва А. Наш краязнаўца — для энцыклапедыі // АГ. — 1997. — № 146; Летапісец Аршанскай даўніны // БМ. — 1997. — № 5. — С. 67; Шынкевіч А. М. // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Оршы і Аршанскага раёна. — Мн.: БелЭн, 1999. — Кн. 2. — С. 442–443; Новая праца Шынкевіча // АГ. — 2001. — № 47; Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 30; Шынкевіч А.М. // ЭГБ. — Мн.: БелЭн, 2003. — Т. 6. Кн. 2. — С. 246; Сучасныя беларускія краязнаўцы // КГ. — 2006. — № 36, верасень. — С. 2.

**ШЫПІЛА** НІНА ПРАКОПАЎНА, настаўніца гісторыі, кіраўнік музея Каханавіцкай СШ Верхнядзвінскага раёна (1992). У музеі прадстаўлены матэрыялы па гісторыі баявой дзейнасці Асвейскай партызанскай брыгады імя М.В. Фрунзе, гісторыі школы, жыцця і дзейнасці земляка-этнографа, фалькларыста і грамадскага дзеяча XIX ст. Ігната Храпавіцкага. Разам з П. Квяцінскім прыклала значныя намаганні па вяртанні імя І. Храпавіцкага ў гісторыю Верхнядзвінскага раёна.

Літ.: Краязнаўчы музей СШ № 1 // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна. — Мн.: Паліграфафармленне, 2000. — Кн. 2. — С. 323–324; Пакульневіч Я. Шукаць шчасце свайму народу // ДзП. — 2007. — № 69. — С. 3.



**ШЫРМА** ВІКТОРЫЯ ГЕНАДЗЕЎНА (18.01.1982, г. Горкі Магілёўскай вобл.), архівіст, краязнаўца. Скончыла Казлоўшчынскую СШ Пастаўскага раёна (1999), гіст. факультэт ВДУ (2004). Працуе навуковым супрацоўнікам у ДАВВ (з 2004).

Даследуе гісторыю Віцебскай вобл. Значны ўплыў на фарміраванне краязнаўчай зацікаўленасці аказаў І. Зямчонак. Брала ўдзел у стварэнні некаторых выстаў і экспазіцый у ДАВВ, сярод інш.: «Да 100-годдзя Віцебскай вучонай архіўнай камісіі», «Усё жыццё — тэатр» (да юбілею акцёраў НАДТ імя Я. Коласа — А.К. Ільінскага, Н.П. Цішачкіна, Г.С. Дубава) і інш. Аўтар шэрагу артыкулаў па гісторыі і культуры Віцебшчыны ў навуковым і перыядычным друку.

Тв.: <u>Артыкулы ў навуковым друку:</u> Краткий обзор фондов оккупационного периода, находящихся на хранении в Учреждении Государственный архив Витебской области // Европа во Второй Мировой войне: История, уроки, современность: материалы международной научно-практической конференции, Витебск, 5–6 мая 2005 г. / редкол.: В.А.Космач (гл. ред.) [и др.]. — Витебск: ВГУ, 2005. — С. 106–108; Из истории развития школьного образования латышского населения на Витебщине в 1918–1930 гг. // Беларусь і Латвія: Адміністрацыйнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае ўзаемадзеянне ў Дзвінскім рэгіёне: матэрыялы Міжнар. навук. канф. «Разам на працягу стагоддзяў (беларуска-латышскія ўзаемадачыненні ў Дзвінскім рэгіёне)», Віцебск, 14–15 ліст. 2006 г. / пад. рэд. Л. Хмяльніцкай. — Мн.: Тонпік, 2006. — С. 112–117; К вопросу о развитии учреждений культуры в Витебской губернии, 1918–1924 // Куляшоўскія чытанні: матэрыялы

Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, 26–27 красавіка 2007 г. — Магілёў: МгДУ, 2007. — С. 231–233; К вопросу о развитии театрального искусства Витебской губернии, 1917–1924 // Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья: материалы Международной научно-теоретической конференции, Витебск, 19–20 апреля 2007 г.) / редкол.: В.А.Космач (гл. ред.) [и др.]. — Витебск: ВГУ, 2007. — Ч. 1. — С. 370–372; Деятельность учреждений и организаций культуры Городокского уезда в 1918–1923 гг. // Гарадоччына ўчора, сёння, заўтра: матэрыялы I Гарадоцкіх краязнаўчых чытанняў, 26 кастрычніка 2007 г. / рэдкал.: А.М. Дарафееў (адк. рэд.) [і інш.]. — Гарадок, 2008. — С. 93–101; Развитие латышского школьного образования на территории Витебщины в 20-е гг. XX века // Latgale ka kulturas pierobeza. Daugavpils: Saule, 2008. — S. 277–282.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: В обстановке великого праздника: [выбары ў ВС БССР] // Віцьбічы. 2004. — № 122. — С. 5; Из далекого далека: [В. Харужая ў Віцебску] // ВР. — 2005. — № 116. — С. 4; История одного дома: [гісторыя будынка па вул. Леніна, 22/16] // ВР. — 2006. — № 2. — С. 4.; Николаевский кафедральный собор // Віцьбічы. — 2006. — 21 верас.; Церковь во имя Воскресения Христова // Віцьбічы. // — № 134. — С. 4; Еще вчера была война: [кірмаш у Віцебску ў 1946 г.] // Віцьбічы. — № 49. — С. 4; Свято-Троицкая (Черная) церковь // Віцьбічы. — 2006. — № 49. — С. 3; Першы нядзельнік у пасляваенным Віцебску // Віцьбічы. — 2006. — № 144. — С. 7; Благовещенская церковь // Віцьбічы. 2006. — № 147. — С. 5; Личность неординарная, неповторимая: [крытык П. Медведзеў] // Віцьбічы. — 2007. — № 144. — С. 3; Депутат Придвинья: [С. Мельнікаў — старшыня аргкамітэта ЦВК БССР па Віцебскай вобл.] // Віцьбічы. — 2008. — № 1. — С. 3; Мы вместе — исторически // Віцьбічы. — 2008. — № 38. — С. 3.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Шырма В.Г. (3.09.2009) // Асабісты архіў М.В. Півавара.



**ШЫТАЛЬ** КАНСТАНЦІН МІХАЙЛАВІЧ (*Руслан Бугаевіч*) (22.04.1990, в. Круляўшчызна Докшыцкага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца. Вучыцца на гіст. факультэце БДУ (з 2008). Краязнаўчую дзейнасць пачаў у школе, збіраючы матэрыялы пра населеныя месцы Крулеўшчынскага с/с. Асноўнымі крыніцамі сталі публікацыі ў перыядычным друку і інтэрв'ю з мясцовымі жыхарамі. Першы артыкул быў надрукаваны ў докшыцкай раённай газеце «Родныя вытокі» ў 1999 г. Пазней матэрыялы друкаваліся ў газеце «Вольнае Глыбокае». Вялікую ролю ў станаўленні цікавасці да роднага краю адыгралі У. Скрабатун, М. Чысцякоў.

Асноўным кірункам краязнаўчай дзейнасці стала вывучэнне гісторыі Докшыччыны ў межах да 1962 г. (Докшыцкі, Крулеўшчынскі, Крыпульскі, Параф'янаўскі, Порплішчанскі, Сітцаўскі, Тумілавіцкі с/с). Аўтар артыкулаў, прысвечаных гісторыі і культуры Докшыцкага краю, у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку: газеты «НН», «Вольнае Глыбокае», «Родныя вытокі». З 2008 г. да зацікаўленасцяў дадаўся Глыбоцкі раён. Напісаў курсавую працу, якую змясціў на сайце http://www.westki.info/.

Аўтар сайта «Докшыцкі краязнаўчы сайт» http://dokshitsy.narod.ru, прысвечанага мінуўшчыне Докшыцкага краю. На сайце змешчаны нарыс па гісторыі мястэчка, заснаваны на аўтарскай творчай пераапрацоўцы матэрыялаў дарэвалюцыйных выданняў, польскіх кніг міжваеннага часу, успамінах мясцовых жыхароў, запісах краязнаўцаў (Д.І. Грабоўскага, М.Д. Чысцякова). На сайце змяшчаюцца карысныя ссылкі на інш. сайты, дзе можна знайсці інфармацыю пра Докшыччыну, у тым ліку і зямляцкія ў Польшчы. Значная колькасць артыкулаў, прысвечаных Докшыцам і наваколлям, змешчана на сайце «Радзіма майго духу» (http://radzima.org).

Падрыхтаваў электронную базу звестак па гісторыі Глыбокага, якая складаецца з адсканаваных кніг, публікацый, крыніц, старых фотаздымкаў. Даступна для карыстання краязнаўцаў і настаўнікаў рэгіёна. У планах напісанне кнігі па гісторыі Глыбокага.

Браў удзел у занальным злёце школьных краязнаўцаў у Глыбокім (красавік 2003), зладжанага Віцебскім абласным цэнтрам пазашкольнай працы. Падтрымлівае кантакты з Міні-рэсурсавым цэнтрам «Барміца» (г. Глыбокае), рэдакцыяй газеты «Вольнае Глыбокае», Глыбоцкім гісторыка-этнаграфічным музеем, Докшыцкай раённай бібліятэкай, сайтам www.radzima.org.

Актыўны арганізатар грамадскага жыцця ў рэгіёне. Выдаваў газету «Прамень» (жнівень 2007 – чэрвень 2009) з сацыяльнай і краязнаўчай тэматыкай, дзе друкуюцца артыкулы супраць алкагалізацыі насельніцтва, супраць абортаў, на рэлігійныя тэмы, па гісторыі краю.

Тв.: Мая Круляўшчызна // РВ. — 1999. — № 84. — С. 3; З гісторыі Крулеўшчызны // РВ. — 2003. — № 3. — С. 3; Крулеўшчына // ВГ. — 2003. — Ліпень; Заборцы і Параф'янава // ВГ. — 2003. — Лістапад; З гісторыі нашых чыгунак // РВ. — 2004. — Кастрычнік; Капліца Св. Прэабражэння Гасподняга ва ўрочышчы Дубоўскія каля Крулеўшчызны // РВ. — 2005. — № 90. — С. 3; Археолагі цікавяцца Докшыцкім раёнам // ВГ. — 2005. — Кастрычнік; Сітцы // ВГ. — 2005. — Снежань; Двор-Порплішча. Спадчына Радзівілаў? // РВ. — 2006. — № 44. — С. 3; Калі заснаваны Свіркі? // РВ. — 2006. — № 32. — С. 2; Мінулае Парафьянава //

РВ. — 2006. — № 44. — С. 2; Дзедзіна // РВ. — 2006. — № 54. — С. 4; на сайце radzima.org: Каралеўшчына; Капліца ў Крулеўшчыне; Касцёл Сэрца Езуса ў Крулеўшчыне; Парфенава; Касцёл у Парфенава; Сітцы; Вёска Пералої; Паўночнае Гляздзілава; Гляздзілава (Двор); Камяніца ў Двары-Порплішча; Янушэва; Забыты маёнтак; Клеманцова.

Літ.: Лук'яненка М. Косця Шыталь // РВ. — 2005. — № 13. — С. 3; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Шыталь К.М. (28.03.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Удакладненні да анкеты «Краязнаўцы Віцебшчыны» К.М. Шыталя (2.20.2010) // Тамсама.



**ШЫШАНАЎ** ВАЛЕРЫЙ АЛЯКСЕЕВІЧ (6.08.1966, г. Віцебск), музейны работнік, краязнаўца. Скончыў ТУ-154 радыётэхнікі (1984), гіст. факультэт ГрДУ (1994). Служыў у СА (1984–1986), працаваў слесарам на Віцебскім тэлезаводзе (1984–1989), , настаўнікам у СШ № 32 г. Віцебска (1992), ст. навуковым супрацоўнікам Музея-сядзібы І.Я. Рэпіна «Здраўнёва» ВАКМ (1992–2000), навуковым супрацоўнікам музея М. Шагала ў Віцебску (2000–2006), ст. навуковым супрацоўнікам ВАКМ (2006), нам. дырэктара па навуковай працы ВАКМ (з 2007).

Краязнаўчымі даследаваннямі пачаў займацца ў 1992 г., з прыходам на працу ў ВАКМ. Значны ўплыў на вызначэнне краязнаўчых памкненняў зрабіла Т.С. Бубенька. Кірункі даследаванняў: «Рэпін і Беларусь», «М.П. Чэрская на Віцебшчыне», «Яўрэі на Віцебшчыне», гісторыя Віцебска. Браў удзел у распрацоўцы шэрагу экспазіцый і выстаў ВАКМ, прысвечаных гісторыі і культуры Віцебшчыны.




З 1994 г. актыўна бярэ ўдзел у рэгіянальных і міжнародных канферэнцыях, на якіх прэзентуе матэрыялы, прысвечаныя краю. Сярод інш. прыгадаем: «Беларуска-рускае культурнае ўзаемадзеянне канца XIX – пач. XX» (Віцебск, ВАКМ, 1994), І Міжнародная канферэнцыя па праблемах музеефікацыі унікальных гістарычных тэрыторый (Мінск, 1995), «Двина-Дзвіна-Даўгава» (Віцебск, 1995), Шагалаўскія чытанні (Віцебск, Музей М. Шагала, з 1998), «Архивное наследие Витебщины как источник изучения истории края (к 150-летию А.П. Сапунова)» (Віцебск, 2001), Міжнародная нумізматычная канферэнцыя, прысвечаная 150-годдзю Нацыянальнага музея Літвы (Вільнюс, 2006), «Сапуноўскія чытанні» (Віцебск, 2007). «Віцебскія старажытнасці» (Віцебск, 2009), «Рэпінскія чытанні – 2009» (Музей-сядзіба І.Я. Рэпіна «Пенаты», РФ, 2009).




Аўтар кнігі «Витебский музей современного искусства: история создания и коллекция (1918–1941)» (2007), укладальнік бібліяграфічнага паказальніка «Репин и Здравнёво. 1995–2001» (2001). Апублікаваў мемуары першага цывільнага губернатара Віцебскай губ. «Любезный мне город Витебск…» (2005). Аўтар больш за 90 артыкулаў па пытаннях гісторыі і культуры Віцебшчыны ў энцыклапедыях, зборніках матэрыялаў канферэнцый, часопісах і больш за 50 артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку.

Нумізмат, мае шэраг публікацый, прысвечаных нумізматыцы.

Тв.: Кнігі: Репин и Здравнёво: библиографический указатель, 1995–2001 / сост. В.А. Шишанов. — Витебск: ВОКМ, 2001. — 20 с.; Любезный мне город Витебск… Мемуары и документы, конец XVIII – нач. XIX в. / вступ. ст., науч., коммент., сост., публ. В.А. Шишанова. — Мн.: Асобны дах, 2005. — 40 с; Витебский музей современного искусства: История создания и коллекция, 1918–1941. — Мн.: Медисонт, 2007. — 144 с.

Артыкулы ў энцыклапедыях і кнізе «Памяць»: (разам з А.В. Сухарукавым) Рэпіна Ілы музей-сядзіба «Здраўнёва» // БЭ: У 18 т. Т. 14. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 19; (разам з А.В. Сухарукавым) Рэпіна Ілы музей-сядзіба «Здраўнёва» // ЭГБ: у 6 т. Т. 6. Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 2001. — С. 174; (разам з А.В. Сухарукавым) Рэпіна Ілы музей-сядзіба «Здраўнёва» // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 2. — Мн.: БелЭн, 2003. — С. 648; Репина Ильи Музей-усадьба «Здравнево» // Республика Беларусь: энциклопедия: в 6 т. Т. 6 / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]. — Мн.: БелЭн, 2008. — С. 439–440.

Артыкулы ў навуковым друку: (разам з А.В. Сухарукавым) К истории создания Музея-усадьбы И.Е.Репина «Здравнёво» // Тезисы докладов и сообщений на конференции «Духовный мир России в творчестве И.Е. Репина» (к 150-летию со дня рождения художника). — М.: ГТГ, 1994. — С. 65–67; (разам з А.В. Сухарукавым) К истории создания музея-усадьбы И.Е. Репина «Здравнёво» // Белорусско-русское культурное

взаимодействие конца XIX – начала XX в.: материалы научной конференции, посвящённой 150-летию со дня рождения И.Е. Репина и 100-летию пребывания художника в Беларуси. — Витебск, 1995. — С. 111–117; Здравнёво. Исторический облик и музеефикация усадьбы // Матэрыялы II Міжнароднай канферэнцыі па праблемах музеефікацыі унікальных гістарычных тэрыторый. — Полацк, 1996. — С. 38–44; (разам з А.В. Сухарукавым) Музей-сядзіба І.Я.Рэпіна «Здраўнёва» як цэнтр развіцця беларуска-рускіх культурных сувязяў // Нацыянальныя меншасці Беларусі. Кн. 3. — Брэст; Мінск, 1996. — С. 18–19; «…Предназначен им для одного этюда» // Мишпоха. — 1997. — №3. — С. 34–35; Дабравесце ад батлейкі // Віцебскі сшытак. — 1997. — № 3. — С. 172–175; Завель Сорин: Страницы биографии // Мишпоха. — 1999. — № 5. — С. 52–53; Кто строил усадьбу Репина // Мишпоха. — 2000. — № 7. — С. 132; Невядомае Здраўнёва // Віцебскі сшытак. — 2000. — № 4. — С. 90–115; Да гісторыі злучэння Заходняй Дзвіны з Дняпром праз Лучосу і Аршыцу // Віцебскі сшытак. — 2000. — № 4. — С. 212–215; Репин в Белоруссии // Служба спасения 01. — 2000. — № 5. — С. 54–57; Дневные сны в Витебске // Бюллетень Музея Марка Шагала. — 2000. — № 1. — С. 2; Мавра Черская на Витебщине // Материалы конференции по итогам исследовательской работы сотрудников Витебского областного краеведческого музея в 2000 году. — Витебск: ВОКМ, 2001. — С. 11–16; Беларусь і беларусы вачыма Іллі Рэпіна // Гісторыя, культуралогія, мастацтвазнаўства: матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый», Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г. — Мн.: Бел. кнігазбор, 2001. — С. 311–316. — Беларусіка=Albaruthenica. Кн. 21; Яков Розенфельд: превратности судьбы // Бюллетень Музея Марка Шагала. — 2001. — № 1 (3). — С. 5–6; «Запутанное дело» // Бюллетень Музея Марка Шагала. — 2001. — № 4. — С. 8–9; Новые сведения о даче А.П. Сапунова «Алексеевка» // Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю: матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаных 150-годдзю з дня нараджэння А.П. Сапунова, 6–7 чэрвеня 2002 г., Віцебск / склад В.У. Скалабан [і інш.]. — Мн: БелНДІДАС, 2002. — С. 109–110; (разам з А.А. Букінай) К истории нумизматической коллекции А.Р. Бродовского // Десятая Всероссийская нумизматическая конференция, Псков 15–20 апреля 2002 г.: тез. докл. и сообщ. — М., 2002. — С. 303–304; Автопортрет И.Репина и усадьба Здравнёво // Филателия (Москва). — 2002. — № 9. — С. 44–45; Витебская художественная школа: Попытка определения: [рэц. на кнігу: Claire Le Foll. L'ecole artistique de Vitebsk (1897–1923): Eveil et rayonnement autour de Pen, Chagall et Malevitch. Paris: L'Harmattan, 2001] // Бюллетень Музея Марка Шагала. — 2002. — № 2 (8). — С. 15–16; Шагаловская библиотека в Витебске // Бюллетень Музея Марка Шагала. — 2002. — № 2 (8). — С. 2–3; «Рисовал с натуры…»: К истории акварелей А.И. Шевцова, написанных в усадьбе Здравнёво // Інсітнае мастацтва Беларусі: Гісторыя. Суадносіны з народнай культурай. Сучаснасць. Тэндэнцыі развіцця. — Віцебск, 2003. — С. 65–68; Художественная жизнь Витебска на страницах изданий «Известия Витгубисполкома совучдепов», «Школа и революция», «Юный марсиянин» // Шагаловский сборник. Вып. 2: материалы VI–IX Шагаловских чтений в Витебске, 1996–1999. — Витебск: Музей М. Шагала, 2004. — С. 121–124; (разам з В. Рогач) Печать Белорусского Вольного экономического общества // Двенадцатая Всероссийская нумизматическая конференция. Москва, 19–24 апреля 2004 г.: тез. докл. и сообщ. — М., 2004. — С. 246–247; Материалы о Ю.М. Пэне в РГАЛИ // Бюллетень Музея Марка Шагала. — 2004. — № 2 (12). — С. 5–11; К вопросу о «первом опыте обращения к творчеству Шагала в местной печати» // Тамсама. — С. 12–16; До последних дней папа жил этими воспоминаниями…: [М.М. Кунин. Феномен Михаила Куни]. — М.: Русская книга, 2003. 344 с. / вступление В.Шишанова] // Тамсама. — С. 16–20; Здравнёво: после октября 1917 // Репинские чтения: материалы чтений в Музее-усадьбе И.Е.Репина «Пенаты», 2003–2004. — СПб.: ИП Комплекс, 2004. — С. 80–89; К истории коллекции работ Репина в Витебском областном краеведческом музее // Тамсама. — С. 90–97; «Эти молодые люди были ярыми социалистами…». Участники революционного движения в окружении Марка Шагала и Беллы Розенфельд // Бюллетень Музея Марка Шагала. — 2005. — № 13. — С. 64–74; Мавра Черская на Витебщине // Чэрскі Іван Дзяменцьевіч. Да 160-годдзя з дня нараджэння: зб. артыкулаў. Вып.1 / рэдкал.: П.С. Лопух (гал. рэд) [і інш.]. — Мн.: БДУ, 2005. — С. 17–23; Музей и нумизматическая коллекция А.Р. Бродовского // Международная нумизматическая конференция, посвященная 150-летию Национального музея Литвы, Вильнюс, 26–28 апреля 2006 г.: тез. докл. — Вильнюс: Национальный музей Литвы, 2006. — С. 65–68; «Здраўнёва так папрыгажэла…» // Мастацтва. — 2006. — № 9. — С. 27; Об утраченном портрете Марка Шагала работы Юрия Пэна // Бюллетень Музея Марка Шагала. — 2006. — № 14. — С.110–111; «Curriculum vitae» Александра Ромма // Мишпоха. — 2007. — № 20. — С. 72–73; (разам з Л. Хмяльніцкай) К истории коллекций современного искусства в музеях Витебска, 1918–1930-е годы // Шагаловский сборник. Вып. 3: материалы X–XIV Шагаловских чтений в Витебске, 2000–2004. — Минск: Рифтур, 2008. — С. 125–161; Яков Розенфельд: Превратности судьбы // Тамсама. — С. 169–170; Марк Шагал: Этюды к биографии художника по архивным делам // Тамсама. — С. 171–175; «Желая поступить…»: Документы об учебе Беллы Розенфельд на Московских высших женских курсах // Тамсама. — С. 176–182; Ю. Пэн і яго час: [рэц. на кнігу «Ю. Пэн і яго час: матэрыялы навук. канф., Віцебск, 23–24 снеж. 1997 г.» (2008)] // Мишпоха. — 2008. — № 23. — С. 159; Материалы о Ю.М. Пэне в РГАЛИ // Малевич. Классический авангард. Витебск. Вып. 11 / ред. Т. Котович. — Мн.: Экономпресс, 2009. — С. 42–55; Витебский музей современного искусства: История создания и коллекции, 1918–1941 // Тамсама. — С. 80–181; Музей и нумизматическая коллекция А.Р. Бродовского // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею: матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 30–31 кастрычніка 2008 г. / рэдкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. — Мінск: Медысонт, 2009. — С. 184–199; Останні роки життя та історія поховання Ю.В.Рєпіна — батька великого художника // Науково-практична конференція, присвячена 150-річчю від дня народження І.Ю. Рєпіна: тези доповідей та повідомлень. — Харків, 1994. — С. 9–11.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Павел I и долгострой // Хобби (Москва). — 1991. — 3–16 верас. — С. 2; На марке — жемчужина Витебщины // Віцьбічы. — 1994. — 24 верас. — С. 1; Лёс «Здраўнёва» // Культура. — 1995. — № 28. — 2–8 жніўня. — С. 8; Для музея Репина // Віцьбічы. — 1996. — 6 студз.; «Истребить сожжением…» // Былое (Москва). — 1996. — № 11. — С. 7; Репин в филателии // НС. — 1998. — № 5. — С. 5; Из Петербурга библиотека Репина переехала в Верховье… // ЖП. — 1998. — № 1. — С. 3; Из Петербурга библиотека Репина переехала в Верховье… // НС. — 1998. — № 9. — С. 5; Печальные юбилеи «Здравнёво» // ВК. — 1998. — № 14. — С. 3; «Истребить публичным сожжением» // ВК. — 1998. — № 23. — С. 3; Меры к изобильному снабжению // ВК. — 1998. — № 26. — С. 3; «Малевичами» в магазине так и не расчитались // НС. — 1998. — № 32. — С. 5; Основание Витебска: ещё одна версия // ВК. — 1998. —

№ 33. — С. 1; Музей частных коллекций в Витебске // Миниатюра (Петербург). — 1998. — № 38. — С. 11; У год…: [легенды аб заснаванні Віцебска] // Культура. — 1998. — № 28–29. — С. 9; Я, Мавра Черская… // ВР. — 1998. — 29 жніўня. — С. 4; «Пишу образ в нашу деревенскую церковь — жертву приношу.» // Наше православие (Витебск). — 1998. — 25 верас. — С. 15; Мавра Черская — русская женщина // ЖП. — 1999. — № 8. — С. 4; Мавра Черская: десять лет спустя // ВР. — 1999. — № 82. — С. 4; Там пела птица Сирин… // ВР. — 1999. — № 43. — С. 3; Здравнёво: после Октября 1917-го // ВР. — 1999. — 3, 7 жніўня; Здраўнёва: пасля кастрычніка 1917 // Культура. — 1999. — № 28. — С. 12; За метеоритом — по Беларуси // ВР. — 2000. — № 101. — С. 5; У пошуках «беларускага дзіва» // Культура. — 2002. — №14. — С. 14; В память об Иване Черском // НС. — 2003. — № 12. — С. 6; О Репине из Латвии // НС. — 2005. — № 23. — С. 8; В последние дни… // НС. — 2005. — № 94. — С. 5; «Полны терпения и любви были его последние дни…» // Віцьбічы. — 2005. — № 114. — С. 5; 974, 947 или 914? // ВП. — 2005. — № 45. — С. 3; Витебск — «город проезжий»: Александр I // ВП. — 2005. — № 48. — С. 7; Археографы обсудили планы // НС. — 2005. — № 145. — С. 5; Здравневская картина на шведском аукционе // НС. — 2005. — № 147. — С. 8; В неразобранном виде… // ВП. — 2006. — № 2. — С. 3; Витебск — город хлебный // ВП. — 2006. — № 6. — С. 3; «Я сейчас приехал из деревни. Какая красота!» // Віцьбічы. — 2006. — № 17. — С. 8; Цвет ушедшего Витебска // ВП. — 2006. — № 9. — С. 13; «Сани. Рысак», или Граф Орлов едет на Барсе // ВП. — 2006. — № 13. — С. 3; «Плюшкин» из Петронишек: [фото автора «Корпус Станкоинструментального техникума, в котором в 1919–1923 гг. размещался губернский музей»] // ВП. — 2006. — № 22. — С. 3; Ученик как продолжение учителя // Віцьбічы. — 2006. — № 89. — С. 18; Никогда не забудем… // ВП. — 2006. — № 32. — С. 3; Люди в гороховом // ВП. — 2006. — № 34. — С. 3; Фамилия с открытки // ВП. — 2006. — № 51. — С. 3; Пороги Западной Двины // НГ. — 2008. — № 81. — С. IV; Последний император на Витебщине // ВП. — 2008. — № 27. — С. 3.

Літ.: Абрамова И. Фанат: [В. Шышанаў] // ВК. — 2002. — № 62. — С. 3; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Шышанаў В.А. (10.12.2003) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Дружкова К. Исследователь: [інтэрв'ю з В. Шышанавым] // ВП. — 2005. — № 38. — С. 3; Сучасныя беларускія краязнаўцы // КГ. — 2006. — № 36, верасень. — С. 2; Новик Д. Валерий Шишанов. Витебский музей современного искусства. История создания и коллекции (1918–1941): [рэц. на кнігу «Витебский музей современного искусства»] // Искусство (Москва). — 2008. — № 4. — С. 113; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Шышанаў В.А. (22.01.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ШЫШКЕВІЧ** АЛЯКСАНДР МІХАЙЛАВІЧ (28.03.1948, г. Ветка Гомельскай вобл.), педагог. Скончыў СШ № 3 г. Добруш (1967), гіст. факультэт БДУ (1972). Працаваў настаўнікам, арганізатарам, дырэктарам школы, лектарам Аршанскага гаркама КПБ, загадчыкам ГАА. Цяпер працуе нам. дырэктара па вучэбнай рабоце СШ № 20 г. Оршы.



Краязнаўствам пачаў займацца ў студэнцкія гады. Актыўна вандраваў па краіне. Прычыніўся да арганізацыі музея «Спадчына» у СШ № 20 г. Оршы. Разам з Т.М. Воронінай з'яўляецца сааўтарам дапаможніка (краязнаўчага зборніка для пачатковага азнаямлення) «Мой родны край — Аршаншчына», аўтар адной з глаў. Складальнік эксперыментальнай праграмы «Оршеведение» для вучняў школ горада. Займаецца распрацоўкай турыстычна-краязнаўчых маршрутаў па наваколлях Оршы, удзельнічае ў працы па ахове помнікаў гісторыі і культуры Аршаншчыны.

Тв.: Мой родны край — Аршаншчына: гісторыка-краязнаўчы зборнік для пачатковага азнаямлення / аўт.-склад. Т.М. Вароніна, А.М. Шышкевіч. — Віцебск: ВАД, 2000. — 160 с.; Горад у 20–30-я гады // Тамсама. — С. 93–97.

Літ.: Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 31; Башков И. Есть музей в 20-й школе: [А.М. Шышкевіч] // АГ. — 2003. — № 190. — С. 3.

**ШЭМЕЛЬ** АЛЯКСАНДР (24.03.1923, в. Думарышкі, Браслаўшчына), мемуарыст. Вучыўся ў Браслаўскай гімназіі (1938–1939). Браў удзел ва ўзброенай барацьбе Арміі краёвай на Браслаўшчыне, Віленшчыне. З 1946 г. жыве ў Варшаве. Скончыў юрыдычны факультэт Варшаўскага ўніверсітэта. Магістр юрыдычных навук (1964). Аўтар кнігі «Успаміны крэсавяка з часоў вайны», якая ўтрымлівае шмат інфармацыі па гісторыі Браслаўшчыны міжваеннага перыяду і часоў Другой сусветнай вайны.

Тв.: Wspomnienia kresowiaka z lat wojny. 23 Brasławska brygada partyzancka Armii Krajowej we wspomnieniach dowódców i żołnierzy. — Warszawa: Auditor, 2002; Wesele na Brasławszczyżnie // Brasławianie. Bieletyn Ilustrowany. — 1998. — Luty; Szkice pónocno-wschodniej Brasławszczyzny // Тамсама.

Літ.: Выдавецкія навіны // Павет. — 2003. — № 1 (14), студзень. — С. 8; Сергіевіч К. Выдадзены ў Польшчы // БЗ. — 2005. — № 45. — С. 3.

**ЭРЭНБУРГ** ЛЕЎ (г. Капыль), педагог, краязнаўца. Скончыў эканамічны факультэт Ленінградскага ўніверсітэта. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Па слабасці зроку не падпадаў пад прызыў, але пайшоў на вайну добраахвотнікам. Працаваў настаўнікам гісторыі, завучам Ляднянскай СШ Дубровенскага раёна (1953–1982), пасля выхаду на пенсію вёў краязнаўчы гурток.

Даследаваць гісторыю в. Ляды пачаў, калі прыехаў сюды працаваць. На той час у школах праводзілася кампанія «добрых спраў». Аднак адбывалася гэта часта фармальна. Сур'ёзна стаў даследаваць гісторыю вёскі і наваколляў часоў вайны: знішчэнне яўрэяў, вызваленне раёна. Пачаў пошукавую працу. З дапамогай мясцовага насельніцтва, школьнікаў стаў аднаўляць імёны людзей, якія загінулі пад час катаванняў, шукаць іх родзічаў. Адначасова праводзіў і збіральніцкую працу па больш ранніх перыядах гісторыі. На аснове сабраных матэрыялаў быў створаны школьны музей, які праз некаторы час быў зачынены па прычыне таго, што ў спісах ахвяр вайны апынуўся чалавек, які пабываў у палоне. У школе было створана таварыства «Чырвоных следапытаў». Аднак музей быў зачынены другі раз з фармулёўкай «экспазіцыя не мае вучэбна-выхаваўчага значэння». Захавалася толькі экспазіцыя, прысвечаная У.І. Леніну, 30-й гв. дывізіі, якая вызваляла в. Ляды ўвосень 1943 г. Сабраў вялікую колькасць дакументаў па гісторыі вёскі, вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а таксама шмат фотаздымкаў. Экспазіцыя, аднак, была таксама зачынена. Ладзіліся спробы арганізаваць музей у чацвёрты раз.



Тв.: З гісторыі Лядаў // ДнП. — 1993. — № 84, 86, 88, 90; З гісторыі Расасна // ДнП. — 1993. — № 72. — С. 2, 3.

Літ.: Кулакоў Ф. Бясконцы клопат падзвіжніка, або Ці будзе музей у Лядах?: [Л.С. Эрэнбург] // ДнП. — 1991. — № 89. — С. 2–3; Кулакоў Ф. Лекары нашых душ // ДнП. — 1992. — № 69. — С. 1, 2; Тумаркін В. «Голас забітых маўчаць не дае» // ДнП. — 2007. — № 82. — С. 6–7.

**Ю****ПАТАЎ** АНТОН НІКІФАРАВІЧ (5.08.1962, г. Віцебск), краязнаўца. Скончыў гіст. факультэт ГрДУ (1991). Служыў пажарным у самастойнай ваенізаванай пажарнай часці № 1 па ахове Кастрычніцкага раёна г. Віцебска (1983–1994), пажарным, начальнікам змены ў аварыйна-выратавальным атрадзе «Віцязь» (1995–2004), гал. спецыялістам аддзела прафесійнай падрыхтоўкі ў Віцебскім абласным упраўленні МНС (2004–2007), інспектарам аддзела навучання ў Віцебскім абласным упраўленні МНС (з 2007).



Вывучаць гісторыю краязнаўства Беларусі пачаў пад кіраўніцтвам прафесара Д.У. Карава ў час вучобы ў ГрДУ. Даследуе гісторыю станаўлення і развіцця пажарнай справы на Віцебшчыне, гісторыю катастроф і стыхійных бедстваў на тэрыторыі Віцебшчыны XIX–XX стст. Аўтар кнігі і шэрагу артыкулаў ў перыядычным друку на краязнаўчую тэматыку.

Тв.: Кніга і артыкулы ў навуковым друку: Страницы истории пажарной службы Витебщины: Люди. События. Факты / сост. В.И. Чекан, А.Н. Юпатов, Е.В. Юпатова. — Витебск: ВОБ, 2008. — 88 с.; (разам з Д.У. Каравым) Историческое краеведение на Витебщине в XIX — нач. XX века // Наш родовод: материалы Международной конференции по региональной истории Восточной Европы «Культура народов Великого княжества Литовского и Белоруссии XIII – нач. XX века», Гродно, 22–24 октября 1991 / отв. ред. Д.В. Карев. — Гродно, 1991. — Кн. 3. Ч. 1. — С. 44–48.

Артыкулы ў перыядычным друку: В огонь шагнуть отважно // СП (Л). — 2005. — № 59. — С. 3; Богатые славные традиции // Рабочее слово: [газета Витебского производственного объединения «Витязь»]. — 2006. — 20 янв.; Бешенковичи тогда сгорели за пару часов // Зара. — 2007. — № 77. — С. 3.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Юпатаў А.Н. (8.06.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ЮРКЕВІЧ** ГАЛІНА АНДРЭЕЎНА, музейны работнік. Загадчыца Музея У. Караткевіча ў Оршы. Вывучае жыццё і дзейнасць гэтага выдатнага пісьменніка — ураджэнца Оршы.

Тв.: Да дня беларускага пісьменства // ТЭ. — 2007. — № 36. — С. 6; «Пусть блещет песнь твоя алмазная…»: [І. Батрак] // ТЭ. — 2007. — № 39. — С. 7; Удзячнасць за памяць, удзячнасць за супрацоўніцтва // ТЭ. — 2007. — № 46. — С. 7; Уладзімір Караткевіч у перыядычных выданнях 2003–2004 гг. // АГ. — 2005. — № 9. — С. 3; Падарунак архівістаў: [знойдзены дакументы асабістай справы бацькі У. Караткевіча] // АГ. — 2005. — № 87, 99.

**ЮРЧАНКА** (Ветраў) ФЁДАР КІРЫЛАВІЧ, былы камандзір партыз. атрада (потым брыгады) «Кастрычнік». Аўтар артыкулаў у перыядычным друку, у якіх асвятляюцца падзеі вайны 1941–1945 гг. на тэрыторыі Віцебшчыны.

Тв.: Крукаўскі бой // СП (М). — 1986. — № 39; Незвычайны рэйд // СП (М). — 1987. — № 37; Юны партызан // СП (М). — 1987. — № 79; Яны былі камсамольцамі // СП (М). — 1988. — № 130; Паход у Вілейскую вобл. // СП (М). — 1988. — № 144–153; Кастрычніцкая калыханка // КР. — 1988. — № 101, 106–109; Бястрашныя // КР. — 1988. — № 126. — С. 2, 4; Яны заўсёды жывыя // КР. — 1988. — № 130. — С. 3; Ішла вайна народная // КР. — 1988. — № 147, 150; У Полацка–Лепельскай партызанскай зоне // СП (М). — 1990. — № 23; Варожая блакада // СП (М). — 1990. — № 40; За родны дом // СП (М). — 1990. — № 56; Подзвіг // СП (М). — 1990. — № 79. — С. 2; Тры браты // СП (М). — 1991. — № 46; Дарогамі жорсткіх выпрабаванняў // КР. — 1996. — № 53, 56–58.

**ЮШКЕВІЧ** МАРГАРЫТА ДЗМІТРЫЕЎНА (7.04.1932, в. Лапуны Гарадоцкага раёна Віцебскай вобл.), краязнаўца, педагог. Скончыла Яварскую СШ Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобл. (1952), геаграфічны факультэт МгДПІ (1957). Працавала піянерважатай ў Яшарскай СШ (1950–1952), арганізатарам ЦК ЛКСМБ у Яварскай СШ (1952–1954), настаўніцай геаграфіі, біялогіі і гісторыі ў Руда-Яварскай СШ (1954–1964), настаўніцай у Войтаўскай ВШ Віцебскага раёна (1964–1967), у СШ у в. Старое Сяло Віцебскага раёна на пасадах арганізатара, дырэктара, нам. дырэктара, настаўніка геаграфіі (з 1967).



Краязнаўчую дзейнасць пачала ў Старасельскай СШ (1967) з пошукавай працы і дзейнасці па выяўленні імёнаў салдат, якія загінулі пры вызваленні мясцовасці на працягу зімы 1943 – лета 1944 г. Працавала з роднымі загінуўшых, якія прыязджалі на месца гібелі сваякоў, дэлегацыямі з былых месцаў працы салдат. На аснове атрыманай інфармацыі пачала друкаваць артыкулы ў мясцовым перыядычным друку.







З другой паловы 1980-х тэматыка даследаванняў пашырылася. Грунтоўна даследавала жыццё і дзейнасць велікана Ф. Махнова, які нарадзіўся і жыў паблізу ад Старога Сяла, панскія маёнткі, экалагічны стан наваколляў, крыніцы, малыя рэчкі, праводзіла збор этнаграфічных матэрыялаў. На аснове сабраных матэрыялаў быў створаны школьны Музей баявой славы (1982). З сярэдзіны 1980-х гг. ён быў перапрафіляваны ў гісторыка-краязнаўчы, дзе больш шырока прадстаўлена гісторыя наваколляў. Добра распрацаваны тэмы, па якіх зроблены экспазіцыі: гісторыя Старага Сяла і блізкіх населеных пунктаў, вайна на тэрыторыі роднага краю, гісторыя Старасельскай школы, гісторыя арганізацый і ведамстваў на тэрыторыі мікрарэгіёна (бальніцы, аптэкі, пошты, чыгункі на старасельскім адрэзку, саўгаса імя В.П. Краева, школы рукадзелля і інш.). Музей мае каля 1,5 тысячы экспанатаў асноўнага фонду і 3 тысячы дапаможнага. У музеі зберагаецца багаты матэрыял пра самага вялікага чалавек на свеце — Фёдара Махнова, асабістыя рэчы, сярод якіх ложак асілка. У 1994 г. музей атрымаў званне народнага.

Удзельнічае ў краязнаўчых канферэнцыях, якія ладзяцца ўстановамі, падначаленымі Міністэрству адукацыі. Падтрымлівае кантакты з бібліятэкамі Мінска, Віцебска, ДАВВ, НГАБ і інш.

Аўтар некалькіх дзясяткаў артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку: газеты «Рэспубліка», «Віцьбічы», «Жыццё Прыдзвіння», «Народнае слова» і інш. Плануе публікацыю асобнымі выданнямі матэрыялаў на тэмы: «Гісторыя Старога Сяла», «Навакольнае асяроддзе Старасельшчыны», «Вялікая Айчынная вайна на тэрыторыі Старога Сяла і ў наваколлях», «Боевой путь 2-го гвардейского Ярцевского мотоциклетного полка». Выдала кнігі «Витебский великан» (2007), «Крымская и русско-турецкая война 1877–1878 гг. в воспоминаниях генерала от кавалерии И.А. Андриянова» (2009).



Тв.: Витебский великан. — Новополоцк: О.В. Молодечкин, 2007. — 24 с.; Генерал от ковалерии И.А. Андриянов: Очерки из жизни. — Витебск: ВОТ, 2009. — 90 с.; Возможности историко-краеведческого музея в воспитании гражданственности и военного патриотизма в период подготовки к 60-летию освобождения территории Беларуси от немецко-фашистских захватчиков // Туристско-краеведческий вестник. — Вып. 1 (3). — 2004. — Мн.: РЦТКУМ, 2004. — С. 50–53.

Артыкулы ў перыядычным друку: Пошук працягваецца // ЛПр. — 1986. — № 6. — С. 3; Працягваем пошук: [падзеі 1941 г. у в. Старое Сяло] // ЛПр. — 1986. — № 23. — С. 3; От первого народного училища. Старосельской школе — 130 лет // ЖП. — 1995. — № 61, 63, 70, 73; Генерал от кавалерии Андриянов жил в Старом Селе // ЖП. — 1998. — № 45. — С. 2; Партызаны Старога Сяла // ЖП. — 1999. — № 27. — С. 3; У глыб стагоддзяў: [гісторыя в. Старое Сяло] // ЖП. — 1999. — № 76. — С. 2; Из рода Поляковых: [Паляковай А.А. — 100 гадоў] // ЖП. — 2003. — № 38. — С. 2; По памятным местам: [вандроўка ў межах «Заронаўскага выступа» 1943 г.] // ЖП. — 2003. — № 46. — С. 3; Память жива: [генерал І.А. Андрыянаў] // ЖП. — 2003. — № 84. — С. 3; Не вернулся из боя: [лётчык А. Калінін загінуў каля в. Старое Сяло] // ЖП. — 2003. — № 95. — С. 2; Бессмертная батарея: [Ф.П. Ерзікаў] // ЖП. — 2004. — № 2. — С. 2; Пал смертью героя // ЖП. — 2004. — № 13. — С. 2; Легенда аб рэчцы Сары // ЖП. — 2004. — № 57. — С. 4; Поисковая экспедиция // ЖП. — 2006. — № 51. — С. 2; Погиб на субмарине: [зямляк — А. Іспянкоў] // ЖП. — 2008. — № 15. — С. 2; В картинах пейзажи из Старого Села: [Лускіна] // ЖП. — 2008. — № 20. — С. 2; Изучая край родной // ЖП. — 2008. — 17 чэрв. — С. 2; У могилы казахского солдата: [У. Алімжаеў] // ЖП. — 2008. — 16 верас. — С. 2; Бои 43-го // ЖП. — 2009. — 7 кастр. — С. 3.

Літ.: Жыжнеўская Н. Пошук працягваецца // ЛПр. — 1983. — 19 лют. — С. 3; Мезенцев В. Здесь оживает история // ЖП. — 2000. — 3 кастр. — С. 2; Краязнаўцы Віцебскага раёна // Памяць: Віцебскі раён: Гісторыка-дакументальная хроніка / уклад. У.І. Мезенцаў. — Мн.: Маст. літ., 2004. — С. 724; Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Юшкевіч М.Д. (12.08.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ЯКАВІЦКАЯ** СТЭФАНІДА СЦЯФАНАЎНА, краязнаўца. Са слоў бацькі запісала і надрукавала краязнаўчы нарыс, прысвечаны гісторыі роднай вёскі, — «Мае Міхнічы».

Тв.: Мае Міхнічы // ПК. — 2004. — № 146, 149, 152. — 2005. — № 1; Вось так калядавалі // ПК. — 2005. — № 166–167. — С. 7.



**ЯКАЎЛЕВА** ГАЛІНА МІКАЛАЕЎНА (8.11.1954, г. Віцебск), педагог. Кандыдат гіст. навук (1988). Скончыла СШ № 30 г. Віцебска, гіст. факультэт БДУ (1978). Працуе на кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай гісторыі ВДУ (1990). Даследуе гісторыю і культуру Віцебшчыны, аддаючы перавагу асобным пытанням грамадска-палітычнага і культурнага жыцця рэгіёна ў першай палове XX ст., вывучэнню нацыянальных меншасцяў у Прыдзвінні, гендарнай гісторыі. Аўтар шэрагу артыкулаў у навуковым друку, прысвечаных гісторыі і культуры Віцебшчыны.

Тв.: Из истории православной церкви Витебщины конца XIX в. // Веснік ВДУ. — 2000. — № 1; (разам з А.М. Дулавым) Из истории женского движения в первые годы советской власти на материале Витебской губернии // Иной взгляд. Международный альманах гендерных исследований. — Мн., 2000. — Май. — С. 29–30; (разам з А.М. Дулавым) Женщины Витебщины в период модернизации 1930-х годов // Женщины в истории: Возможность быть увиденными: сб. науч. ст. Вып. 1 / под ред. И.Р. Чикаловой. — Мн.: БГПУ, 2001. — С. 304–311; О некоторых аспектах развития образования и печати на Витебщине в конце XIX–XX вв. // Пісьменства і друк на Віцебшчыне: Гісторыя і сучаснасць: матэрыялы рэгіянальнай навуковай канферэнцыі, 15–16 кастрычніка 1996 г. — Віцебск: ВДУ, 1996. — С. 8–12; О некоторых аспектах социально-экономической и морально-политической обстановки на Полотчине в конце Великой Отечественной войны // Европа во второй мировой войне: История, уроки, современность. — Витебск: ВГУ, 2005. — С. 59–62; О социально-экономической, полититческой обстановке и морально-идеологическом климате в Полоцкой области в конце 1944–1945 гг.: По документам ГАВО // Быў подзвіг. І была Перамога: матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаных 60-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, Мінск, 12 мая 2005 г. / адк. рэд. Ю.У. Несцяровіч, У.В. Фядосаў. — Мн.: БелНДІДАС, 2006. — С. 41–45; Социальная защита детей сирот в первые послевоенные годы // Пути, тенденции и направления развития социальной сферы: материалы международной научно-практической конференции, Витебск, 23 мая 2008 г. — Витебск: ВГУ; Неизвестное об известном. О пребывании в Витебске поезда «Октябрьская революция» 11–12 июня 1919 года // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею: матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 30–31 кастрычніка 2008 г. / рэдкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. — Мн.: Медысонт, 2009. — С. 105–112; // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 18–19 чэрвеня 2009 г. / ВДУ; рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. — Віцебск: ВДУ, 2009. — С. 57–64; Латышский клуб как один из центров общественно-политической и культурной жизни г. Витебска в первые годы советской власти // Latgale ka kultures pierobeza. — Daugawpils: Saule, 2008. — S. 267–276.

**ЯКАЎЛЕЎ** АЛЯКСЕЙ СЯМЁНАВІЧ (1909, в. Востраў, цяпер Казянскі с/с Шумілінскага раёна – 1989), мемуарыст. Працаваў у лясніцтве, рабочым на Данбасе, бухгалтарам. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны жыў у Ленінградзе. Аўтар 6 рукапісных кніг (1980), якія перадаў у кабінет палітычнай асветы Шумілінскага РК КПБ (цяпер захоўваюцца ў Шумілінскім раённым краязнаўчым музеі). У мемуарах апісаў асабісты жыццёвы шлях, а таксама адлюстраваў гісторыю Каз’яншчыны з XVI ст. па другую палову XX ст. Допісы змяшчаюць багаты этнаграфічны матэрыял.

Літ.: Нарушэвіч У. Цудоўны камень // ГП. — 1992. — № 23. — С. 2; Незабыўныя дні: [А. Якаўлеў] // ГП. — 1992. — № 26. — С. 2.



**ЯКАЎЛЕЎ** АНАТОЛЬ ВАСІЛЬЕВІЧ (14.12.1949, г. Віцебск), краязнаўца. Скончыў школу працоўнай моладзі № 5 г. Віцебска (1968), Вышэйшае ваеннае вучылішча (1976). Служыў на розных пасадах у ВМФ СССР (1968–1990). Пасля службы вярнуўся ў Віцебск. Валодае польскай, літоўскай мовамі.

З сярэдзіны 1980-х гг., калі ў СССР і БССР пачалася палітыка дэмакратызацыі, галоснасці, пачаў браць удзел у грамадскім жыцці польскай меншасці на Віцебшчыне. Сур’ёзна займацца краязнаўчымі даследаваннямі пачаў з 1991 г. Зацікавіўся лёсамі нацыянальных меншасцяў на тэрыторыі БССР, у прыватнасці на Віцебшчыне. З выхадам у свет газеты Таварыства палякаў

Беларусі «Głos znad Niemna» звярнуў увагу на тое, што на яе старонках збольшага знаходзяць месца матэрыялы пра Заходнюю Беларусь. Стаў пісаць і публікаваць артыкулы пра лёсы палякаў і хрысціянскіх святыняў на Віцебшчыне. Матэрыялы збіраў, актыўна вандруючы па Віцебскай вобл., сустракаючыся з людзьмі, працуючы ў архівах (ДАВВ). Падрыхтаваныя артыкулы змяшчаюцца на старонках мясцовага, рэспубліканскага і замежнага друку; у газетах «Віцебскі рабочы», «Віцьбічы», «Призыв» (Себеж), «Głos znad Niemna» і інш. Мае ненадрукаваныя працы, прысвечаныя лёсам палякаў, літоўцаў, латышоў на Віцебшчыне ў ХХ ст. Рыхтуе да выдання кнігу, у якую ўвойдуць матэрыялы ранейшых газетных публікацый у значна пашыраным выглядзе.

Прыняў удзел у падрыхтоўцы некаторых выстаў у Польшчы. Шэраг сваіх публікацый перадаў у ДАВВ.

Тв.: Мае саседзі — цыганы // ВР. — 1996. — 6 ліст.; Варажба ў Вілію // ВР. — 1996. — 24 снеж.; Школа ў Лужасне: [Таварыства зямельных гаспадароў і будаўніцтва земляробчай школы] // ВР. — 1997. — № 80. — С. 5; Лихо не лежит тихо // Призыв (г. Себеж Псковской обл.). — 1997. — 19 сент.; 106 лет назад // Тамсама. — 2003. — 8 марта.

Głos znad Niemna: ściana płaczu // GzN. — 1993. — 18–24 студз.; Trudna droga odrodzenia // GzN. — 1994. — 24–30 студз.; W cichym miasteczku // GzN. — 1994. — 9–15 мая; Pamięnc, ból, nadzieja // GzN. — 1994. — 18–24 ліп.; Yestem synem ziemi Witebskej // GzN. — 1994. — 23–29 мая; W służbe Bogu i ludziom // GzN. — 1994. — 12–18 снеж.; Mikalai Wołosewicz poeta z Bieniakon // GzN. — 1994. — 26–31 снеж.; Pokój wam, dobry ludzie // GzN. — 1995. — 6–12 сак.; Polacy na Witebszczyżnie // GzN. — 1996. — 28.04–11 мая. — S. 17; Wacław Fedorowicz // GzN. — 1996. — 20–26 мая. — S. 5; Dzisna // GzN. — 1996. — 30.09–6 кастр.; Waclaw Hebelt — Magister filozofii // GzN. — 1996. — 19–25 верас.; Niewesołe wesełowo // GzN. — 1996. — 7–13 кастр.; Strażnik grobów polskich // GzN. — 1997. — 20–28 студз.; Z wiara nadzija // GzN. — 2000. — 18 лют.; Szlah ciernowy // GzN. — 2003. — 18 крас.; Losy Polaków na Witebszczyzżnie // GzN. — 2003. — 4 ліп.; Życie officie polane łzami // GzN. — 2003. — 2 мая; Brak wyboru // GzN. — 2003. — 26 верас.; Łosy Polakóv na Witebszczyżnie // GzN. — 2004. — 23 студз.; Moji nepokoje I bóle // GzN. — 2004. — 20 лют.; Dzulna kobieta, welka patriotka // GzN. — 2004. — 12, 19 сак., 26 крас.; Na samotnej wyspe // GzN. — 2004. — 9 сак.; Lidski organista // GzN. — 2004. — 4–11 сак.; Szlachetni i godni szacunku // GzN. — 2004. — 2 ліп.; W imie polskosci // GzN. — 2004. — 23 ліп.; Budowniczy domu Bożego // GzN. — 2004. — 15 кастр.; Kolyi losu // GzN. — 2005. — 7 кастр.; W obronie wiary // GzN. — 2005. — 28 кастр.; Wierze że // GzN. — 2006. — 17 сак.; Pobudzić sumienie // GzN. — 2006. — 31 сак.; Prykre wspomnienia // GzN. — 2006. — 14 крас.; Długa i trudna droga // GzN. — 2006. — 19 мая.

Літ.: Інтэрв'ю з А.М. Якаўлевым (18.07.2006) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ЯКІМОВІЧ** ЮРЫ АЛЯКСЕЕВІЧ (13.10.1946, г. Мінск – 1994), гісторык архітэктуры, педагог. Кандыдат архітэктуры (1979), дацэнт (1988). Скончыў БПІ (1969). Працаваў у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі (1969–1979), кіраўніком рэдакцыі культуры і мастацтва ў выдавецтве «Беларуская савецкая энцыклапедыя» (1980–1986), выкладчыкам у ВДПІ (1986–1994) (з 1988 г. дацэнтам кафедры выяўленчага мастацтва).

Даследаваў гісторыю архітэктуры, пераважна дакастрычніцкага перыяду, творчасць мастакоў XIX ст. (Н. Орды, Ю. Пешкі, Дз. Струкава і інш.). У віцебскі перыяд жыцця даследаваў гісторыю архітэктуры Віцебска і Віцебшчыны. Працаваў у архівах, праводзіў абмеры будынкаў, праекты рэканструкцыі. Зрабіў асобныя рэканструкцыі сядзібна-палацавых і паркавых пабудоў XVI–XVII стст. Віцебшчыны. Аўтар жывапісных і графічных серый «Замкі», «Драўлянае дойлідства», «Віцебшчына».

Адным з першых на кафедры пачаў весці заняткі на беларускай мове. Кіраваў дыпломнымі працамі студэнтаў ВДПІ, прапануючы для даследавання пытанні архітэктуры роднага горада, раёна, што давала вялікі плён пры падрыхтоўцы як будучых настаўнікаў, так і прапагандыстаў гісторыка-культурнай спадчыны краю.




У канцы 80-х – першай палове 90-х гадоў XX ст. прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Віцебска як член клуба дапамогі рэстаўрацыі «Узгор'е». Уваходзіў у актыў віцебскага абласнога аддзялення БДТАПГіК. Удзельнічаў у паездках у розныя куткі Беларусі, праводзіў пад час іх экскурсіі, распавядаючы пра асаблівасці архітэктурных стыляў у гарадах і мястэчках краіны. Дзякуючы яго намаганням узяты пад дзяржаўную ахову гіст. пабудовы ў в. Казлоўшчына і г.п. Варапаева ў Пастаўскім раёне, шэраг будынкаў у Віцебску. Першым сярод архітэктараў правёў даследаванні гіст. забудовы мікрараёна Задзвінне ў Віцебску, з'яўляўся старшынёй журы праектаў рэгенерацыі гэтага раёна горада. Распрацаваў канцэпцыю адраджэння мястэчак і малых гарадоў Віцебшчыны. Падрыхтаваў да друку

кнігу «Праваслаўныя храмы Віцебска-Аршанскай епархіі», «Сілуэты старога Віцебска» (не выдадзены).

Удзельнічаў у шэрагу навуковых канферэнцый. Адзначым удзел у Віцебскай абласной краязнаўчай канферэнцыі (студзень 1990), дзе чытаў паведамленні: «Касцёл у в. Астроўна Бешанковіцкага раёна», «Мястэчкі Віцебшчыны ў XVI–XVII стагоддзях», «Стрэшын у XVII – пачатку XVIII стагоддзяў», «Архітэктурная спадчына Віцебска» і інш. Разам з настаўнікамі «групы Куржалава» ездзіў у Польшчу ў краязнаўчую вандроўку.

Сярод інш. манаграфій адзначым: «Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся XVI–XIX стст.», «Зодчество Беларуси XVI – середины XVII ст.», «Помнікі мураванага грамадзянскага дойлідства Віцебска». Аўтар асобных глаў па гісторыі архітэктуры ў чатырохтомным выданні «Гісторыя беларускага мастацтва». Артыкулы, прысвечаныя пытанням гісторыі архітэктуры і архітэктурным помнікам Віцебшчыны, змяшчаліся ў выданнях «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», «Памятники Витебска», кнізе «Памяць» г. Віцебска. З'яўляецца аўтарам больш за 700 артыкулаў на тэмы архітэктурнай спадчыны Віцебшчыны ў навуковым і перыядычным друку «Віцебскі рабочы», «Народнае слова», «Чырвоны прамень» (Чашнікі), «Звязда» (Паставы), «Веснік Глыбоччыны» і інш.

Тв.: Кніга: Помнікі мураванага грамадзянскага дойлідства Віцебска XIX–XX ст. — Мн.: Полымя, 1990. — 47 с.

Артыкулы ў энцыклапедычных выданнях і навуковым друку: Віцебская школа дойлідства // ЭЛіМБ. — Мн.: БелСЭ, 1985. — Т. 2. — С. 650; Полацкая школа дойлідства // ЭЛіМБ. — Мн.: БелСЭ, 1987. — Т. 4. — С. 327; Полацкія замкі // Тамсама. — С. 338; Манастыр базыльян (Талачын) // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобл. — С. 411; Пакроўская царква (Дуброўна) // Тамсама. — С. 262; Архітэктурная спадчына Браслаўшчыны // Браслаўскія чытанні: матэрыялы ІІ навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 925-годдзю Браслава, 1065–1990, 16–17 лютага 1991 г. / навук. рэд. М.А. Ткачоў. — Браслаў: Браслаўскі філіял Пастаўскай узбуйнёнай друкарні, 1991. — С. 78–79; Архітэктурна-планіровачнае развіццё Віцебска ў 14–18 ст. // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 2002. — С. 91–100; Архітэктурна-планіровачнае развіццё Віцебска ў час яго знаходжання ў складзе Расійскай імперыі // Тамсама. — С. 186–198.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Дайшоў праз стагоддзі: [Віцебск па «Інвентару» XVII ст.] // ВР. — 1987. — № 245. — С. 4; Будынак былога мужчынскага духоўнага вучылішча // ВР. — 1988. — № 121. — С. 3; Чашнікі ў XVII ст. // НС. — 1991. — № 11. — С. 5; Лынтупы // ВР. — 1991. — 17 ліп. — С. 2; Чашнікі: [гісторыя горада] // ЧП. — 1991. — № 126. — С. 2, 3; Лынтупы і Старе Саколіна // ВР. — 1991. — № 136. — С. 4; Чашнікі // ВР. — 1991. — № 186. — С. 4; Архітэктурны ансамбль у Лынтупах // ВР. — 1992. — № 47, 48; Касцёл у Обалі // ВР. — 1992. — № 57. — С. 3; Паставы ў першай палове XVII ст. // ПК. — 1992. — № 91. — С. 2; Фарбы роднага краю: [В. Несцярэнка] // ВР. — 1992. — № 132. — С. 2; На Дубровенцы і Дняпры: [г.п. Дуброўна] // ВР. — 1992. — № 139. — С. 3; А жыццё ніколі не перапынялася…: [г.п. Дуброўна] // ВР. — 1992. — № 156. — С. 3; І няма шляхоў да адраджэння: [царква Св. Духа ў Віцебску] // ВР. — 1993. — № 35. — С. 5; У далёкім васямнадцатым стагоддзі: [Дубровеншчына] // ВР. — 1993. — № 117. — С. 5.

Літ.: Якімовіч Ю.А. // Архітэктура Беларусі: энцыклапедычны даведнік / рэдкал.: А.А. Воінаў [і інш.]. — Мн.: БелЭн, 1993. — С. 612; Сцяпанаў Ю. Даследчык і мастак: [Ю. Якімовіч] // ВР. — 1992. — № 52. — С. 4; Хитров А. Архитектура Юрия Якимовича // Віцьбічы. — 1992. — № 36. — С. 4; Хитько И. Я потерял друга: [Ю. Якімовіч] // НС. — 1995. — № 15. — С. 4; Лазаренко С. Он был для нас примером: [Ю. Якімовіч] // НС. — 1995. — № 15. — С. 4; Так слова яго не хапае: [Ю. Якімовіч] // НС. — 1995. — № 15. — С. 4; Татаринов Ю. Города Беларуси: Витебщина. — Мн.: Энциклопедикс, 2006. — С. 105.

**ЯКІМЦОВА** АЛЕНА ІВАНАЎНА (4.07.1961, г. Мінск), музейны работнік. Скончыла факультэт журналістыкі БДУ (1983). Працуе ў Музеі Лукомскай ДРЭС у г. Новалукомлі Віцебскай вобл. (з 1994).

Цікавіцца гісторыяй Чашніцкага раёна, старажытнага Лукомля. Пэўны ўплыў аказалі творы У. Караткевіча, У. Арлова, гіст. раманы, а таксама Г.В. Штыхаў. Адзін з арганізатараў Музея гісторыі ДРЭС і г. Новалукомля, Чашніцкага гіст. музея, шэрагу выстаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне, народнай творчасці работнікаў электрастанцыі і інш. Брала ўдзел у археалагічных раскопках на тэрыторыі Чашніцкага раёна (гарадзішчы каля вёсак Гара, Чарэя) пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Загадчыца Музея Лукомскай ДРЭС (1995).



Аўтар матэрыялаў, прысвечаных Лукомскай ДРЭС у кнігах «Беларуская энергасістэма», «Жывыя карані» (Віцебская абласная энергасістэма), «Замечательным энергетикам посвящается» (ветэраны працы). У раённай газеце «Чырвоны прамень» рэгулярна публікуе артыкулы краязнаўчай тэматыкі ў рубрыцы «Мой родны кут». Удзельнічала ў падрыхтоўцы серыі перадач па гісторыі населеных месцаў Чашніччыны на мясцовым тэлебачанні (1993).

Тв.: Бульвар Ф. Азміцеля // ЧП. — 1996. — № 6. — С. 2; Першы дырэктар: [Г.М. Хартановіч — дырэктар Лукомскай ДРЭС] // ЧП. — 1996. — № 30. — С. 2; Добрае дрэва: [СШ № 1 г. Новалукомля] // ЧП. — 1996. — № 17, 44, 48, 53; Які́м ён будзе, наш музей // ЧП. — 1996. — № 30. — С. 2; Чым багатая, зямля Чашніцкая? // ЧП. — 1998. — № 86. — С. 2; Лодочная станцыя: [у г. Новалукомль] // ЧП. — 1999. — № 6. — С. 2.

Літ.: Анкета «Краязнаўцы Віцебшчыны». Якімцова А.І. (1.04.2010) // Асабісты архіў М.В. Півавара.

**ЯКЯН** ІВАН (1941, в. Мягуны Пастаўскага раёна), краязнаўца. Працаваў загадчыкам Мягунскага сельскага клуба. Збірае фальклор сваёй мясцовасці, аддаючы перавагу народнаму гумару. Напісаў гісторыю роднай вёскі Мігуны (надрукавана ў газеце «Пастаўскі край»). Пазаштатны карэспандэнт пастаўскай раённай газеты. Піша прыпеўкі для ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці.

Тв.: Гісторыя вёскі Мягуны // ПК. — 2004. — № 85, 88, 91, 94, 100. — С. 2; Мокры камень з Цыганскага балота // ПК. — 2006. — № 103–104. — С. 3.





**ЯНУШ** ІЛЬЯ ЮЛЬЯНАВІЧ (2.08.1936, в. Гапіна Дзісненскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Шаркоўшчынскі раён Віцебскай вобл.), краязнаўца. Скончыў Глыбоцкае педвучылішча (1955), геаграфічны факультэт БДУ (1964). Працаваў настаўнікам у Новапагосцкай СШ Міёрскага раёна, інспектарам Міёрскага РАНА, нам. дырэктара Новапагосцкай СШ (1966–1982).

Займацца краязнаўствам пачаў у час вучобы ў Глыбоцкім педвучылішчы (1951–1955), дзе вопытны, руплівы настаўнік геаграфіі П.М. Свірко на занятках, у паходах, шчырых гутарках прывіваў вучням любоў да роднага краю, знаёміў з методыкай яго даследавання. Абавязковую вайсковую службу праходзіў на Камчатцы, дзе пазнаёміўся з прыродай, з мясцовымі помнікамі гісторыі і культуры, з краязнаўчым музеем гісторыі і культуры. Вяртаючыся са службы дадому, склаў дзённік, у якім занатаваў свае ўражанні аб надзвычай складаным восеньскім плаванні па Ціхім акіяне ад Петрапаўлаўска-Камчацкага да Уладзівастока (2500 км) і пра вельмі цікавы і пазнавальны праезд па чыгунцы з Далёкага Усходу да Мінска (каля 10 тысяч км).

Настаўніцкую працу пачаў у Новапагосцкай СШ Міёрскага раёна (1958). Геаграфічная адукацыя і пасада нам. па выхаваўчай працы садзейнічалі таму, што краязнаўчая работа набыла сістэматычны характар. У сярэдзіне 1960-х гг. разам з настаўнікамі гісторыі стварыў першы ў раёне школьны краязнаўчы музей у в. Новы Пагост. Узначальваў турыстычна-краязнаўчую работу ў школе, удзельнічаў у школьных экспедыцыях, экскурсіях. Асноўнай формай працы стаў удзел у рэспубліканскіх экспедыцыях і конкурсах. Даследаванне краю праводзілася па 6–8 кірунках. Большая частка экскурсій і паходаў праводзіліся вясной-летам. У час падарожжаў па родным краі разам з вучнямі сабраў для кабінета геаграфіі калекцыю мясцовых карысных выкапняў, гербарый раслін, зрабіў макеты розных тыпаў глеб, змайстраваў прыборы для назіранняў па геаграфіі і астраноміі, пабудаваў геаграфічную пляцоўку. Разам з вучнямі сістэматычна вёў феналагічныя назіранні і запаўняў календары.

Прыняў удзел і двойчы стаў пераможцам рэспубліканскіх краязнаўчых радыёвіктарын у 1965 і 1966 гг. У пачатку 1970-х гг. ад сваёй маці Тацяны Сямёнаўны і бабулі Алены Кліменцьеўны запісаў старадаўнія народныя песні, казкі, прыпеўкі і перадаў іх у ІМЭФ АН БССР. Запісаў успаміны Пятра Цімафеевіча Судака (1903 г. н.).

У 1982 г. разам з сям’ёй пераехаў у г. Лепель, дзе ўладкаваўся навуковым супрацоўнікам у ЛРКМ. У адпаведнасці з службовымі абавязкамі і схільнасцямі праводзіў пастаянную пошукавую працу ў горадзе і раёне. Збіраў матэрыялы па гісторыі і культуры Лепельшчыны ў архівах, музеях, бібліятэках краіны і замежжа. У 1990-х гг. стварыў пры музеі Клуб юных краязнаўцаў. Шмат гадоў вёў аднайменны гурток пры Лепельскай дзіцячай турбазе.

Актыўна ўдзельнічаў у грамадскай працы. У снежні 1989 г. на ўстаноўчай канферэнцыі быў абраны сябрам раённай рады ТБШ, БДТАПГіК.

Аўтар некалькіх артыкулаў для энцыклапедычных выданняў: «Беларускай энцыклапедыі», «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», шэрагу артыкулаў у мясцовым і рэспубліканскім друку («Звязда», «Культура», «Лепельскі край»). Падрыхтаваў першы раздзел гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» Лепельскага раёна і шэраг інш. матэрыялаў. Аўтар артыкула ў кнізе «Памяць» Шаркоўшчынскага раёна. Даследуе сядзібы Лепельшчыны. Зрабіў апісанне сядзіб знакамітых лепельчан: археолага М. Кусцінскага, садавода-селекцыянера В. Мароза. Напісаў нарыс па гісторыі лепельскага краязнаўства «Адкуль мы пайшлі». Выканаў фізіка-геаграфічнае апісанне раёна па тэме «Лепелязнаўства».

Ініцыятар узвядзення помніка гораду Лепелю, які быў усталяваны на сродкі Лепельскага райсавета (2007). Прапанаваў некалькі варыянтаў надпісу на помніку. Зрабіў гіст. абгрунтаванне месца ўстаноўкі помніка.

Тв.: Артыкулы ў энцыклапедычных выданнях, кнігах «Памяць» і навуковым друку: Лепель // ЭГБ. Т. 4. — Мн., 1997. — С. 350–351; Лепель // БЭ. Т. 9. — Мн., 1999. — С. 206; Пышна // ЭГБ. Т. 6. Кн. 1. — Мн., 2001. — С. 14; З глыбіні тысячагоддзяў // Памяць: Лепельскі раён: Гісторыка-дакументальная хроніка. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 21–24; Бярэзінская водная сістэма // Тамсама. — С. 46–48; Расправа // Тамсама. — С. 71; Школьная справа на Лепельшчыне // Тамсама. — С. 74; Як жылі землякі // Тамсама. — С. 81–82; Развіццё адукацыі і культуры // Тамсама. — С. 88–89; Яго адметнае слова: [Ф. Тапчэўскі] // Тамсама. — С. 89–90; Ян Чачот на Лепельшчыне // Тамсама. — С. 93–94; Таленавіты акцёр Саленік // Тамсама. — С. 95–96; Выходзілі часопіс і газета // Тамсама. — С. 99–100; Лепельскі археолаг, краязнавец М.Ф. Кусцінскі // Тамсама. — С. 101–102; Лепельскі настаўнік і краязнаўца: [І.Д. Гарбачэўскі] // Тамсама. — С. 102–104; Даўгяла Дзмітрый Іванавіч // Тамсама. — С. 104–105; У гады першай сусветнай // Тамсама. — С. 106; Лютаўская рэвалюцыя // Тамсама. — С. 107–108; Утварэнне ССРБ і інтэрвенцыя // Тамсама. — С. 110–111; Стальная магістраль // Тамсама. — С. 133–135; Брыгадзір трактарнай брыгады // Тамсама. — С. 135; Культурнае развіццё раёна // Тамсама. — С. 139–141; Выданні РОСТА // Тамсама. — С. 141; Лепельскі тэатр // Тамсама. — С. 143; Шляхам пакут і выпрабаванняў: [рэпрэсіі на Лепельшчыне] // Тамсама. — С. 151; Прыродная характарыстыка Лепельскага раёна // Тамсама. — С. 597–598; Шушкевіч У.К. // Тамсама. — С. 603; З гісторыі назваў // Тамсама. — С. 606–607; Нам засталася спадчына // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Шаркоўшчынскага раёна. — Мн.: БелТА, 2004. — С. 447–448; Лепельскі край // Геаграфія: Праблемы выкладання. — 1998. — № 2; Леў Сапега і Лепельшчына // Вялікі канцлер Вялікага княства. Да 450-годдзя з дня нараджэння Льва Сапегі: зб. матэрыялаў І Міжнародных Сапежанскіх чытанняў, 3–4 снежня, Брэст, ІІ і ІІІ Рэспубліканскіх Сапежанскіх чытанняў у Віцебску–Астроўна, 28–29 чэрвеня 2003 г., 28–29 кастрычніка 2006 г.; склад., рэд. Г.М. Праневіч. — Мн.: І.П. Логвінаў, 2007. — С.134–136.

Артыкулы ў рэспубліканскім перыядычным друку: Веру ў адраджэнне // НГ. — 1990. — 4 жніўня; Курапаты — месца майго болю: [на Лепельшчыне ствараецца музей Т. Кляшторнага] // Звязда. — 1990. — 7 кастр.; І нават на этапах не губляў пачуцця гумару: [А. Вярыга-Дарэўскі] // Культура. — 1992. — 18 лют.; Адновім у Лепелі гімназію // НГ. — 1995. — 13 снеж.; Лепельскі археолаг // ВР. — 1998. — 3 ліст. — С. 6; Касцёл у Губіне // Культура. — 1999. — 21–27 жніўня. — С. 13; Як будаваліся касцёлы // Культура. — 2000. — 29 верас.; Востраў гістарычных падзей: [Лепельскае возера] // ЧЗ. — 2000. — 24 жніўня; З песняй весяліліся і гаравалі: [лепельскі фальклор] // Культура. — 2003. — Кастрычнік; Вакол Лепельшчыны па перыметры… і далей: [краязнавец У. Шушкевіч] // КГ. — 2005. — № 16; Запатрабавана беларускім адраджэннем: [аб змене геаграфічных назваў на Лепельшчыне] // КГ. — 2005. — № 7; Нястомны даследчык Шаркоўшчынскага краю: [К.А. Кожан] // КГ. — 2006. — Студзень; На Георгіеўскіх могілках // КГ. — 2007. — № 7 (168), люты. — С. 2.

Артыкулы ў мясцовым перыядычным друку: Лепель у 1812 г. // ЛС. — 1984. — 25 жніўня; Хроніка Лепеля // ЛС. — 1986. — № 89. — С. 2; Бальшавіцкі заклік // ЛС. — 1987. — 14 лют.; Расправа: [бунт у Воласаўскай вобл.] // ЛС. — 1987. — № 23. — С. 4; Незабыўныя дні // ЛС. — 1987. — № 74. — С. 4; Свет над Улай // ЛС. — 1987. — № 80. — С. 4; Рэвалюцыйныя камітэты // ЛС. — 1987. — № 111. — С. 3; Адпор інтэрвентам: [польская інтэрвенцыя на Лепельшчыне] // ЛС. — 1987. — № 121. — С. 3; Аднаўленне гаспадаркі // ЛС. — 1987. — № 124. — С. 3; Вызваленне: [1919] // ЛС. — 1987. — № 126. — С. 3; Прафесар Б. Эпімах-Шыпіла // ЛС. — 1988. — № 7. — С. 2; Шлях бальшавіка: [В.І. Берасцень] // ЛС. — 1988. — № 15. — С. 2; Застаўся салдат у страі // ЛС. — 1988. — № 17. — С. 2; Стойкі бальшавік: [Г.І. Браўковіч] // ЛС. — 1988. — № 23. — С. 2; Лепельскі тэатр // ЛС. — 1988. — № 26. — С. 2; Узбуйненне Беларусі // ЛС. — 1988. — № 44. — С. 2; І лягла чыгунка // ЛС. — 1988. — № 54. — С. 2; М.І. Калінін на Віцебшчыне // ЛС. — 1988. — № 65. — С. 2; Адважны чырвонаармеец: [М.В. Грыгалюн] // ЛС. — 1988. — № 107. — С. 2; Б.І. Вярыга-Дарэўскі // ЛС. — 1988. — № 127. — С. 2; Сляды ад помнікаў: [да 550-годдзя Лепеля] // ЛС. — 1989. — № 15. — С. 3; Далучэнне да Расіі // ЛС. — 1989. — № 19. — С. 2; Горад будуецца: [1797–1805] // ЛС. — 1989. — № 21. — С. 2; Горад атрымаў герб: [1852] // ЛС. — 1989. — № 33. — С. 2; Лепельскі савет // ЛС. — 1989. — № 61. — С. 2; Першы старшыня лепельскага выканкама і рэўкома // ЛС. — 1989. — № 62. — С. 2; Стыпендыя імя М.В. Гогаля // ЛС. — 1989. — № 69. — С. 2; У пачатку стагоддзя // ЛС. — 1989. — № 72. — С. 2; Народныя промыслы // ЛС. — 1989. — № 118. — С. 2; Сябры краязнаўчага музею // ЛС. — 1989. — № 127. — С. 2; Саратнік Леніна // ЛС. — 1989. — № 134. — С. 2; Веру ў адраджэнне // ЛС. — 1990. — № 19. — С. 2; Аб гербе і сцягу РБ // ЛС. — 1991. — № 90. — С. 2; Там, дзе жыў Кусцінскі // ЛС. — 1991. — № 105. — С. 4; Крэпасць у Сушы // ЛС. — 1991. — № 109. — С. 4; Артыкул з «Нашай нівы» // ЛК. — 1992. — № 5. — С. 2; Каштоўнасць на стагоддзі: [помнікі гісторыі і культуры Лепельшчыны] // ЛК. — 1992. — № 11. — С. 3; Першая жанчына-геолаг: [Г. Місуна] // ЛК. — 1992. — № 53. — С. 2; Станаўленне аграрных адносін // ЛК. — 1992. — 12 мая; Надзвычай шкодны ў палітычных адносінах: [А. Вярыга-Дарэўскі] // ВР. — 1992. — № 22. — С. 4; Нам засталася спадчына // ВР. — 1992. — 21 мая; Ушануем нашу славу: [прапановы па прысваенні вуліцам Лепеля імёнаў знакамітых лепельчан] // НС. — 1992. — 3 крас.; Ян Чачот на Лепельшчыне // ВР. — 1993. — № 68. — С. 2; Селянін быў абавязаны // ЛК. — 1992. — № 70. — С. 3; Позірк у гістарычнае мінулае // ЛК. — 1992. — № 100. — С. 3; Як жылі землякі // ЛК. — 1992. — № 87. — С. 2; Лепельскі этнограф: [Р. Кладніцкі] // ВР. —

1993. — № 125; Шлях пакут: [аб рэпрэсаваных і рэабілітаваных лепельчанах] // НС. — 1993. — 4 снеж.; Лепельскі этнограф // ВР. — 1993. — 9 кастр.; Адкуль пайшоў горад Лепель // Во славу Родины. — 1993. — 14 кастр.; За Дняпром, за Дунаем // ЛК. — 1994. — № 37–38. — С. 3; Пра дружбу двух беларусаў: [Б. Эпімах-Шыпіла і Я. Купала] // ЛК. — 1994. — № 67. — С. 2; З кагорты пачынальнікаў: [Ф. Тапчэўскі] // ВР. — 1994. — № 83. — С. 3; Сустрэча з мінулым // ЛК. — 1994. — № 91. — С. 3; Увага: помнікі даўніны // ЛК. — 1996. — № 2. — С. 3; Што было ў нашых вёсках // ЛК. — 1996. — № 21. — С. 2; Называўся сельсавет Польскім // ЛК. — 1996. — № 27. — С. 2; Чыім імем назавем вуліцу? // ЛК. — 1996. — № 57. — С. 1; Выпрабаванне атамам // ЛК. — 1996. — № 95. — С. 2; Крэпасць Кап'ё // ЛК. — 1996. — 12 ліст. — С. 6; Крэпасць Кап'ё // НС. — 1996. — № 129. — С. 6; Пасля рэформы 1861 г. // ЛК. — 1996. — 22 чэрв. — С. 4; Пажар у Лепелі // ЛК. — 1997. — № 10. — С. 4; Чыім імем назавем вуліцу? // ЛК. — 1997. — № 14. — С. 2; Колькі нас было сто гадоў назад // ЛК. — 1997. — № 29. — С. 4; Ланкастэрскае вучылішча ў Лепелі // ЛК. — 1997. — № 41. — С. 3; Ганна Аляксандраўна Місуна // НС. — 1997. — № 97. — С. 4; Этнограф і фалькларыст: [Л. Юцэвіч] // НС. — 1997. — № 112. — С. 4; Адам Станислававіч Грабніцкі // НС. — 1998. — 19 сак. — С. 6; Лепельскі пав. 100 гадоў назад // ЛК. — 1998. — № 14. — С. 2; Іван Данілавіч Гарбачэўскі // ЛК. — 1998. — 26 мая. — С. 3; У Рыгу на платах // ЛК. — 1998. — № 40. — С. 4; Адкуль пайшло Пышна // ЛК. — 1998. — № 56. — С. 4; Падрабязна пра Лепельшчыну: гісторыка-геаграфічны нарыс // ЛК. — 1998. — № 78. — С. 2; Беларускі гісторык і архіварыус: [Д. Даўгяла] // ЛК. — 1998. — № 88. — С. 4; Этнаграфічныя звесткі аб лепельчанах // ЛК. — 1998. — 28 жніўня; Лепельскі археолаг: [М. Кусцінскі] // ВР. — 1998. — № 169. — С. 3; Беларускі гісторык, архіварыус // ЛК. — 1998. — 3 ліст. — С. 4; Лепельскі тэатр. Да 60-годдзя стварэння // ЛК. — 1998. — № 89. — С. 4; Іасафат Пятровіч Агрызка // ЛК. — 1999. — № 13. — С. 4; Святло яго сэрца: [А. Нафрановіч] // ЛК. — 1999. — № 33. — С. 3; Лёс прывёў на Беларусь: [цыганы на Лепельшчыне] // ЛК. — 1999. — № 47. — С. 4; Старому Лепелю… 786 гадоў? // ЛК. — 1999. — № 51. — С. 3; Як горад будавалі // ЛК. — 1999. — № 52. — С. 3; Леў Сапега і Лепельшчына // ЛК. — 1999. — № 55. — С. 3; Адкуль мы пайшлі: нарыс па гісторыі лепельскага краязнаўства з XVI ст. // ЛК. — 2000. — № 41–50; Дайшоў да нас з даўніны: [касцёл Св. Казіміра] // ЛК. — 2000. — № 35. — С. 4; Хірург Б.Р. Пржэвальскі // ЛК. — 2000. — № 43. — С. 4; Лепельскія касцёлы // ЛК. — 2000. — № 88. — С. 2; Установа гістарычнай памяці // ЛК. — 2001. — № 39. — С. 2; Лепель у 1812 г. // ЛК. — 2001. — № 72. — С. 4; Прайшлі праз выпрабаванні з прымяненнем атамнай бомбы // ЛК. — 2001. — № 76. — С. 2; Уніяцкая царква на Лепельшчыне // ЛК. — 2001. — № 90. — С. 3; Заслужаны дзеяч мастацтваў: [К.П. Стэцкі] // ЛК. — 2002. — № 24. — С. 2; Асветнік з Лепеля: [В. Цяпінскі] // ЛК. — 2002. — № 71. — С .1; Апякун і настаўнік Я. Купалы // ЛК. — 2002. — № 90. — С. 2; Нястомная даследчыца нетраў зямлі: [Г. Місуна] // ЛК. — 2002. — № 106. — С. 2; Роскві і заняпад сям'і Марозавых // ЛК. — 2002. — 23 крас. — С. 6; Хто і калі валодаў Лепелем // ЛК. — 2002. — № 109. — С. 3; Лепельскія фоталетапісцы // ЛК. — 2003. — № 11–12. — С. 3; Фоталетапіс лепельчан // НС. — 2003. — № 14. — С. 6; Як у Рудні жалеза выраблялі // ЛК. — 2003. — № 22. — С. 2; Раніца нашай дзяржаўнасці // ЛК. — 2003. — № 26. — С. 2; Лепельскі замак // ЛК. — 2003. — № 26. — С. 3; Месца Лепеля на Зямлі // ЛК. — 2003. — № 33. — С. 2; Крыніца пазнання і выхавання // ЛК. — 2003. — № 40. — С. 4; Захавальнікі спадчыны // ЛК. — 2003. — № 57. — С. 4; Фальклорная крыніца // ЛК. — 2003. — № 72. — С. 2; Аб чым гавораць назвы вадаёмаў // ЛК. — 2003. — № 101. — С. 4; З любоўю да Лепельшчыны // КГ. — 2004. — № 3, студзень. — С. 3; Энцыклапедычныя старонкі // ЛК. — 2004. — № 12. — С. 3; Нетры Лепельскай зямлі // ЛК. — 2004. — № 27. — С. 2; Уславім Лепель // ЛК. — 2004. — № 43. — С. 2; Крыніца пазнання: [прапанова стварэння Лепельскага краязнаўчага таварыства і курса «Лепелезнаўства»] // ЛК. — 2004. — № 51. — С. 3; Шчодры на таленты край // ЛК. — 2004. — № 74. — С. 2; Сядзіба Марозаў // Лк. — 2004. — № 96. — С. 2; Дэндрапарк: [у Лепелі] // ЛК. — 2004. — № 101. — С. 1; Магічная сіла // ЛК. — 2004; Нам засталася спадчына // ЛК. — 2005. — № 4. — С. 2; Штрыхі біяграфіі // ЛК. — 2005. — № 17, 19; Рыштаванні стварэння: [Бярэзінская водная сістэма] // ЛК. — 2005. — № 21, 22; Велічны поступ // ЛК. — 2005. — № 27. — С. 2; Новы стары горад: [Лепель] // НС. — 2005. — № 41. — С. 5; Генеалагічнае мінулае краю // ЛК. — 2005. — № 52. — С. 3; І Нізіны, і Пышнагоры // ЛК. — 2005. — № 53. — С. 2; Багацце нетраў // ЛК. — 2005. — № 56; Асаблівасці клімату // ЛК. — 2005. — № 58. — С. 3; Глебавае покрыва // ЛК. — 2005. — № 59. — С. 2; Паверхневыя воды // ЛК. — 2005. — № 68. — С. 2; Расліны і жывёлы // ЛК. — 2005. — № 70. — С. 3; Тэатральны дзеяч: [К.П. Стэцкі] // ЛК. — 2005. — № 76. — С. 2; Сведка мінулага: [гісторыя дома на вул. Першамайскай] // ЛК. — 2005. — № 79. — С. 1; Летапісец роднай старонкі // ЛК. — 2005. — № 80. — С. 2; Успаміны старажыла // ЛК. — 2005. — № 81. — С. 3; Адважныя падпольшчыкі // ЛК. — 2005. — № 84. — С. 5; Слова пра Лепельшчыну // ЛК. — 2005. — № 90. — С. 2; Рупліўцы нівы газетнай // ЛК. — 2005. — № 92. — С. 3; Ад Камчаткі да «Лепельскага краю» // ЛК. — 2005. — № 97; Ад саламянай страхі да аграгарадка // ЛК. — 2005. — № 101. — С. 1; Абразы на покуці // ЛК. — 2006. — № 1. — С. 3; Тэорыя пульсуючага свету // ЛК. — 2006. — № 8. — С. 2; Даследчык мінуўшчыны: [К. Кожан] // НС. — 2006. — № 12. — С. 5; Даследчыкі Лепельшчыны // ЛК. — 2006. — № 13. — С. 3; І сніцца салдатам Камчатка // ЛК. — 2006. — № 15. — С. 2; Камчацкі дзённік Лепельчаніна // ЛК. — 2006. — № 18. — С. 3; Турыстычныя маршруты Лепельшчыны // ЛК. — 2006. — № 27–29; Мілы куток на планеце // ЛК. — 2006. — № 32. — С. 2; Лепель турыстычны // ЛК. — 2006. — № 42. — С. 3; Лепельская прагімназія // ЛК. — 2006. — № 54. — С. 5; Вяртанне на «Савецкім Саюзе» // ЛК. — 2006. — № 69. — С. 3; Застаўся ў памяці людзей: [А. Вярыга-Дарэўскі] // ЛК. — 2006. — № 90. — С. 3; Кожны радок кранае сэрца: [А. Вярцінскі] // ЛК. — 2006. — № 93. — С. 2; Дзяржаўны дзеяч Сярэднявечча // ЛК. — 2007. — № 25. — С. 2; Сімвалічная кропка адліку: [аб стварэнні помніка Лепелю] // НС. — 2007. — 22 мая; Лот беркаўцу не роўня // ЛК. — 2007. — № 48. — С. 6; Сімвалічная кропка адліку: [памятны камень у гонар першай згадкі г. Лепеля] // НС. — 2007. — № 57. — С. 5; Доктар народнай медыцыны: [А. Гельфанд] // НС. — 2007. — № 68. — С. 3; Настаўнік. Партызан. Франтавік: [М.М. Белавусаў] // ЛК. — 2007. — № 89. — С. 2; Памятныя даты Лепельшчыны // ЛК. — 2007. — № 95. — С. 2; Памятныя гістарычныя даты // ЛК. — 2007. — № 101. — С. 2; Юбілей Віцебскай вобл. // ЛК. — 2008. — № 3. — С. 6; Дзе тая вуліца?: [аб стварэнні карты г. Лепеля] // ЛК. — 2008. — № 13. — С. 2; Першыя пасяленцы // ЛК. — 2008. — № 15. — С. 3; Першы ўспамін // ЛК. — 2008. — № 28. — С. 7; Жыццё ў каменным веку // ЛК. — 2008. — № 29. — С. 3; Эпохальные переходы и волоки // НС.

Літ.: Лепельскі настаўнік і краязнаўца // Памяць: Лепельскі раён: Гісторыка-дакументальная хроніка. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 103–104; Януш І. Ад Камчаткі да «Лепельскага краю» // ЛК. — 2005. — № 101. — С. 1; Кожан К. Родны край мала любіць. Яго трэба ведаць! // НС. — 2006. — 3 жніўня. — С. 5; Аўтабіяграфічная даведка краязнаўца Ілы Юліянавіча Януша (29.11.2007) // Асабісты архіў М.В. Півавара; Спіс надрукаваных краязнаўчых матэрыялаў І.Ю. Януша // Тамсама; Мальчэўская А. Цікавая справа — пазнаваць свой край // ЛіМ. — 2008. — № 43. — С. 16.

**ЯНУШКЕВІЧ** ЗЕЛІСЛАЎ (Zelisław Januszkiewicz) (1897–1974), войт Браслаўскага пав. Аўтар выдання «Мае ўспаміны (Браслаў, 1923–1932, Бельск-Падляскі, 1933–1939)», у якіх распавядае пра свой жыццёвы шлях. Да гісторыі Віцебшчыны мае дачыненне частка, у якой апісваецца час працы старастам браслаўскім (1923–1933). Ва ўспамінах утрымліваюцца 77 фотаздымкаў Браслаўшчыны 1920-х – пач. 1930-х гг. Кніга выдадзена намаганнямі сына Анжэя і М. Мілінкевіча, актывіста суполкі браслаўчан у Польшчы, а таксама Я. Кляновіча.

Аказаў вялікую падтрымку О. Хедэману ў выданні кніг, прысвечаных гісторыі краю, у 1930-я гг.

Тв.: Moe wspomnienia: Brasław, 1923–1932 r. Bielsk Podlaski, 1933–1939 r. — Warszawa, 1995. — 326 s.

Літ.: Januszkiewicz A. // Moe wspomnienia. — S. 1–11; Sylwetki brasławian zasłużonych dla małej i wielkiej ojczyzny. — Cz I. — Warszawa, 1998. — S. 69–79; Хросны бацька першай кнігі // Павет. — 2002. — № 4 (8), красавік. — С. 8.

**ЯРШОВА** ЛЮДМІЛА ВАСІЛЬЕЎНА, педагог, краязнаўца. Вывучае гісторыю і культуру Аршаншчыны. Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў навуковым і перыядычным друку. Жонка І.А. Яршова.

**ЯРШОЎ** ІГАР АНАТОЛЬЕВІЧ (16.10.1946, г. Орша), педагог, краязнаўца. Скончыў СШ № 8 г. Оршы (1964), гіст. факультэт БДУ (1974). Працаваў у аршанскай газеце «Ленінскі прызыў», гаркаме партыі, у прафсаюзе, выкладчыкам гісторыі ў Аршанскім педагагічным каледжы.



Цікавіцца гісторыяй роднага краю пачаў пад час навучання ў школе. Збірае матэрыялы па гісторыі і культуры Аршаншчыны, аддаючы перавагу высвятленню жыццёвых лёсаў землякоў і асоб, якія звязаны з Верхнім Падняпроўем. Аўтар кнігі «Вежы над Дняпром», у якую ўваходзяць 20 нарысаў на розныя тэмы з гісторыі Оршы і Аршаншчыны У сааўтарстве з В.М. Сідняковай выдаў кнігі «Зямля Караткевіча» і «Вёрсты пройдзеных дарог», якія складаюцца з артыкулаў пра прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, жыццёвы або творчы шлях якіх пачаўся на Аршаншчыне. Сааўтар некалькіх артыкулаў у кнігах «Памяць» Оршы і Аршанскага раёна. Публікуе матэрыялы ў мясцовым перыядычным друку: часопісах «Беларуская мінуўшчына», «Беларусь», «Родная прырода», «Роднае слова», «Пачатковая школа», «Адукацыя і выхаванне», газетах «Віцебскі рабочы», «Аршанская газета», «Настаўніцкая газета».

Тв.: Кнігі: Вежы над Дняпром. — Орша: Аршанская друкарня, 1996. — 256 с.; (разам з В.М. Сідняковай) Зямля Караткевіча. — Орша, 1997. — 237 с.; (разам з В.М. Сідняковай) Вёрсты пройдзеных дарог. — Магілёў: Магілёўская друкарня, 2003. — 240 с.

Артыкулы ў навуковым друку і кнігах «Памяць»: Воін і бунтар П І. Фаленберг // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Дубровенскага раёна. Кн. 1. — Мн., 1997. — С. 170–173; «Пісана на Оршы»: [Ф. Кміта] // БМ. — 1997. — № 1. — С. 24–27; Куцейна // БМ. — 1997. — № 2. — С. 54–58; Спяваў ён гімн у цэнзурнай клетцы // Аршанскі краязнаўчы зборнік № 2. — Орша: Аршанская друкарня, 1997. — С. 20; Аршанскія вапеннікі // Тамсама. — С. 47–51; Цікавыя сведкі гісторыі // Аршанская мінуўшчына. — Орша, 1997. — С. 39–44; Аршанскае Евангелле // Памяць: Гісторыка-культурная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. Кн. 1. — Мн: БелЭн, 1999. — С 48–49; Аршанскі стараста Філон Кміта // Тамсама. — С. 80–83; Засталася толькі назва: [Куцейна] // РП. — 1996. — № 3. — С. 13; Гімн майстрам // Тамсама. — С. 90–92; Труцэвіч Іаіль // Тамсама. — С. 100–102; Собаль Спірыдон Багданавіч // Тамсама. — С. 100–102; Некалькі момантаў з жыцця горада // Беларусь. — 2000. — № 20.

Артыкулы ў перыядычным друку: Пісана ў Оршы: [Ф. Кміта-Чарнабыльскі] //ВР. — 1985. — № 130. — С. 4; Воін і бунтар П.І. Фаленберг// ВР. — 1987. — 5–9 мая; З кагорты мужных: [П.І. Фаленберг] // ВР. — 1987. — № 86–88; З кагорты мужных: [П.І. Фаленберг — дзекабрыст з Дубровеншчыны] // ДнП. — 1987. — № 62, 63; Цікавыя сведкі гісторыі: [Орша на картах і планах] // ЛП. — 1990. — № 179. — С. 2–3; Гісторыю пераіграць нельга // АГ. — 1991. — № 30. — С. 2; Ішла вайна народная // ЛП. — 1991. — № 96. — С. 3; З агню ды ў полымя // ВР. — 1991. — № 239. — С. 4; З гісторыі Дубровенскага замка // ДнП. — 1992. — № 24. — С. 2; Апошнія зоркі: [«Кацюша»] // АГ. — 1992. — № 24. — С. 2; З надзеяй на вяртанне: [Аршанскае Евангелле] //

ВР. — 1994. — № 3. — С. 4; Спяваў ён гімн у цэнзурнай клетцы: [П.В. Шумахер] // ВР. — 1994. — № 66 — С. 3; Славутасць вырасла ў Оршы: [паэт 1-й пал. XIX ст. П.В. Шумахер] // АГ. — 1994. — № 85. — С. 3; Пётр Вялікі руку прыклаў // ВР. — 1995. — № 121 — С. 6; Адраджэнне: [Музей этнаграфіі] // АГ. — 1996. — № 13. — С. 3; «Беларуская мінуўшчына» пра нас: [рэцэнзія] // АГ. — 1997. — № 33. — С. 2; Былі ўрокі-падарожжы, урокі-паэзія, урокі-рыторыка: [У. Караткевіч] // АГ. — 1997. — № 51–52; Лёс Куцеінкі ў нашых руках // НС. — 1997. — № 121. — С. 4; Дазвольце не пагадзіцца: [адказ на рэцэнзію на кнігу «Вежы над Дняпром»] // АГ. — 1998. — № 6. — С. 2; Аршанцы-вапеннікі… на вапне родзяцца // АГ. — 1998. — № 11. — С. 2; Застаўся жыць у памяці нашчадкаў // АГ. — 1998. — 6 кастр. — С. 2; «Крыўдна за ўсю вучоную Еўропу»: [М. Урончанка — адзін з заснавальнікаў РГТ, ураджэнец Копысі] // АГ. — 1998. — № 100, 101; Куцеінка. Няўжо толькі гісторыя // АГ. — 1998. — № 100. — С. 3, Застаўся жыць у памяці нашчадкаў: [А. Філіповіч] // АГ. — 1998 — № 118. — С. 2; Баяліся нават мёртвага: [А. Філіповіч] // ВР. — 1998. — № 137. — С. 6; З руін і попелу: [рэцэнзія на кнігу С.М. Асіноўскага «Поле памяці»] // АГ. — 1999. — № 142. — С. 2; Радасць працы і змагання: [Ф. Вінаградава] // АГ. — 2000. — № 70. — С. 3; Рэйхстаг быў побач: [М.Ц. Федарэнка] // АГ. — 2000. — № 77. — С. 2; Вялікі боль душы: [В.М. Айзенштадт — ураджэнец Копысі] // АГ. — 2000. — № 89. — С. 2; Гады настаўніцтва ў Оршы: [У. Караткевіч] // НС. — 2000. — № 93. — С. 5; З ім звязана беларуская байка: [У. Корбан] // АГ. — 2000. — № 98. — С. 2; Уз'яднанне ці далучэнне: [рэцэнзія на кнігу Я. Анішчанкі «Беларусь у часы Кацярыны II»] // ДнП. — 2000. — № 3. — С. 3; Талент шчодры і шматгранны: [Янка Сіпакоў] // АГ. — 2001. — № 4. — С. 2; Богам дадзены талент: [мастак М. Купава] // АГ. — 2001. — № 12. — С. 2, 4; Рыцар гумару з берагоў Дзвіны: [Б.С. Ласкін] // АГ — 2001. — № 51. — С. 2; Зброя нашай перамогі: [«Кацюшы», в. Гадавічы] // АГ. — 2001. — № 81. — С. 2; Споведзь пра людзей зямлі роднай: [скульптар С.М. Вакар] // АГ. — 2001. — № 116. — С. 2; Жыццё, адданае мастацтву: [мастак М. Палянкоў] // АГ. — 2001. — № 145. — С. 2, 4; Душа не ведае спакою (этнамузыказнаўца З.Я. Мажэйка] // АГ. — 2002. — № 12. — С. 2; Гарадок далёкі сніцца: [дзіцячы пісьменнік М.Б. Яфімава] // АГ. — 2002. — № 30. — С. 2; Званок з далёкага дзяцінства: [пісьменнік Ю. Багушэвіч] // АГ — 2002. — №48. — С. 2; Цікавыя сведкі гісторыі: [карты і планы Оршы] // АГ. — 2003. — № 93–94. — С. 8.

Літ: Копцік Ю. Ігар Яршоў. «Вежы над Дняпром» // АГ. — 1997. — № 124. — С. 2; Иванова С.Г. Оршанские краеведы: биографический справочник. — Орша, 2002. — С. 11.

**ЯФРЭМЕНКА** ГАЛІНА, бібліятэкар. Працавала ў Зарубскай сельскай бібліятэцы Дубровенскага раёна. Аўтар артыкулаў на краязнаўчую тэматыку ў перыядычным друку.

Тв.: Рэдкі дар: [П.П. Новікава] // ДнП. — 2001. — № 20. — С. 2; І еднасць са сваім народам: [радавод] // ДнП. — 2001. — №56. — С. 3; Малінавы звон: [Л.С. Мартынаў] // ДнП. — 2001. — № 72. — С. 2; І стань шчасліваю дарогай // ДнП. — 2001. — № 80. — С. 2; Дружба засталася назаўсёды // ДнП. — 2001. — № 94. — С. 2; І ў сцюжу, і ў спёку ва ўсіх навідавоку // ДнП. — 2002. — № 7. — С. 3; Сівая легенда // ДнП. — 2002. — № 31. — С. 2.

# РАДЗІМАЗНАЎСТВА

Радзімазнаўства —
Мудрая навука.
Радзімазнаўца,
Як у забыцці,
Ідзе, каб сцежку
Ісціны знайсці…

*Р. Барадулін*

З мэтай лепшага разумення прадмета даследавання варта звярнуцца да пытанняў што такое краязнаўства, каго лічыць краязнаўцам, акрэсліць асаблівасці і асноўныя тэндэнцыі развіцця краязнаўства Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст.

## Што такое краязнаўства?

Тэрмін «краязнаўства» ўзнік не так даўно — яму каля сотні гадоў. Упершыню яго пачалі выкарыстоўваць у Польшчы напрыканцы XIX ст. Дагэтуль ва ўжытку быў распаўсюджаны тэрмін «радзімазнаўства», «отчизноведение». Аднак, карані гэтай з'явы цягнуцца ў глыбокую старажытнасць. Жаданне **край** свой **знаць** (краязнаўства) з'яўляецца, хутчэй за ўсё, тады, калі людзі перайшлі да сталага жыцця. Ад таго, наколькі добра ведаеш тую зямлю, дзе жывеш, залежала, наколькі багатым будзе жыццё. Класічнае разуменне краязнаўству было дадзена ў часы антычнасці александрыйскім навукоўцам Клаўдыем Пталамеем: «сутнасць *хараграфіі* (грэч. «horos» — мяжа, ці «choros» — мясцовасць = «краязнаўства») у апісанні вызначанай часткі зямлі, і не толькі таго, што можа ахапіць наш позірк і слых». Такое, так бы мовіць, «гаспадарчае» краязнаўства існавала да часоў Адраджэння, калі чалавек актыўна пачынае цікавіцца гісторыяй, культурай краіны. Хаця цікавасць да падзей гісторыі свайго краю фіксуецца ў летапісах і хроніках, у тым ліку і на беларускіх землях («Аповесць мінулых часоў», «Баркулабаўскі летапіс», «Хроніка Магілёва», «Віцебскі летапіс» і інш.).

Як навуковае зацікаўленне даследаваннямі краю і грамадскі рух краязнаўства фарміруецца ў Германіі ў пачатку XIX ст. з дзейнасці студэнцкіх таварыстваў. Цікавасць да вывучэння гісторыі ўвогуле і даследаванняў гісторыі роднага краю становіцца еўрапейскай тэндэнцыяй. Падзелы Рэчы Паспалітай, напалеонаўскія войны, рамантызм як згадка пра слаўнае мінулае абумовілі зварот мясцовай інтэлігенцыі да гісторыі і на беларускіх землях. Таварыствы «філаматаў» і «філарэтаў» у Віленскім універсітэце мелі дакладна вызначаныя краязнаўчыя мэты. З далучэннем беларускіх зямель да Расійскай Імперыі штуршком для вывучэння гісторыі з'явілася падарожжа Кацярыны II па беларускіх землях. З мэтай вывучэння эканамічных, адміністрацыйных рэсурсаў новых тэрыторый, а таксама магчымага тэатра ваенных дзеянняў даследаванні рэгіёна праводзіліся афіцэрамі расійскага Генеральнага Штаба, дзяржаўнымі і прыватнымі экспедыцыямі.

Аднак найбольш актыўна рост краязнаўчых даследаванняў у Расійскай імперыі пачынаецца з Вялікіх рэформ 1861–1874 гг., з развіццём капіталістычных адносін, павелічэннем колькасці інтэлігенцыі. З'яўляюцца першыя музеі, таварыствы па вывучэнні краю, выдаюцца манаграфіі, прысвечаныя прыродзе, эканоміцы, гісторыі, культуры, канфесійнаму жыццю рэгіёна.

У нашай краіне краязнаўства заўсёды займала значнае месца ў навуковым і грамадскім жыцці, а Віцебшчына з'яўлялася лідарам у рэгіянальных даследаваннях: тут дзейнічалі першы архіў на Беларусі (Цэнтральны архіў старажытных актавых кніг Віцебскай і Магілёўскай губерній, 1852–1903), Віцебская вучоная архіўная камісія (1909–1919), жылі найвыдатнейшыя даследчыкі А.П. Сапуноў, Е.Р. Раманаў, М.Я. Нікіфароўскі, Д.І. Даўгяла. З утварэннем БССР краязнаўства становіцца масавым, атрымлівае моцную дзяржаўную падтрымку. У гэты час яно адыграла надзвычай важную ролю ў нацыянальна-культурным будаўніцтве краю. Перыяд з 1919-га па 1929 г. атрымаў назву «залатога дзесяцігоддзя савецкага краязнаўства». На Віцебшчыне дзейнічала адна з першых і найлепшых арганізацый — Віцебскае акруговае краязнаўчае таварыства, якім кіраваў заснавальнік масавага краязнаўчага руху на Беларусі М.І. Каспяровіч. Аднак з канца 1920-х гадоў сітуацыя рэзка змянілася. Краязнаўцаў абвінавацілі ў нацыянал-дэмакратызме, большасць даследчыкаў былі рэпрэсіраваны.

Сітуацыя змянілася ў часы хрушчоўскай «адлігі», але да краязнаўства па звычцы ставіліся як да «справы піянераў і пенсіянераў». У навуцы тэрмін «краязнаўца» дасюль асацыіруецца з паняццямі «аматар», «дылетант», а для некаторых навукоўцаў мае нават ганебны характар.

Кардынальныя змены адбываюцца з пачаткам палітыкі перабудовы ў СССР. З другой паловы 80-х гг. ХХ ст. краязнаўцы і ўтвораныя імі грамадскія гісторыка-культурныя таварыствы — «Узгор'е» (Віцебск), «Вытокі» (Полацк), «Повязь» (Орша) — сталі ініцыятарамі важных спраў па папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны, нацыянальным адраджэнні краіны, звярнулі ўвагу на стан беларускай мовы, экалагічныя праблемы. Краязнаўцы Віцебшчыны першымі прыцягнулі ўвагу да забытых у краіне асоб: М. Шагала, Я. Драздовіча, Ю. Пэна, К. Вераніцына, дзясяткаў іншых, менш вядомых дзеячаў беларускай гісторыі і культуры. Дзякуючы дзейнасці краязнаўцаў, падтрыманых дзяржавай, адбыўся пералом у грамадскай думцы жыхароў вобласці адносна помнікаў гісторыі і культуры, зменены адносіны насельніцтва да захавання нацыянальнай спадчыны. Шэраг грамадскіх ініцыятыў, такіх як адкрыццё новых музеяў (літаратурнага, мастацкага, прыватных калекцый, воінаў-інтэрнацыяналістаў, стацыянарнай выставы «Патрыёты Віцебшчыны» і інш.), аднаўленне і рэстаўрацыя помнікаў даўніны, распрацоўка і выданне навукова-папулярных даследаванняў, пошук загінуўшых абаронцаў Айчыны, ушанаванне славутых землякоў, быў падтрыманы і здзейснены намаганнямі дзяржаўных органаў у пазнейшы час.

На сёння паняцце «краязнаўства» мае некалькі значэнняў.

Па-першае, гэта **міжгаліновая** дысцыпліна, якая вывучае жыццё і сучасны стан супольнасцяў і тэрыторый.

Па-другое, ***форма грамадскай дзейнасці***, навукова-папулярызатарская і асветніцкая па сваім змесце, накіраваная на ўсебаковае вывучэнне насельніцтвам гістарычных, палітычных, сацыяльна-эканамічных, геаграфічных, культурных, прыродных і шэрагу іншых фактараў пэўнай тэрыторыі (сяла, горада, раёна, вобласці і г. д.).

Па-трэцяе, ***метад пазнання*** (які абапіраецца, як правіла, на міждысцыплінарныя навуковыя сувязі).

Краязнаўства даследуе прыроду, эканоміку, дэмаграфію, гісторыю, мову, культуру пэўнай тэрыторыі. **Комплекснае** краязнаўства разглядае ўсе часткі ва ўзаемасувязі, галіновае — паасобна. Можна вылучыць такія асобныя яго кірункі, як гістарычнае, геаграфічнае, этнаграфічнае і фальклорнае, літаратурнае, тапанімічнае, мемарыяльнае (ахову помнікаў гісторыі і культуры), царкоўнае, бібліятэчнае, архіўнае, някропалезнаўства і інш.

Па форме дзейнасці ў сучасным краязнаўстве Беларусі вылучаюцца тры асноўныя кірункі: **дзяржаўнае**, **грамадскае** і **школьнае**.

Дзяржаўнае краязнаўства прадстаўлена дзейнасцю дзяржаўных устаноў і арганізацый, якая накіравана на вывучэнне пэўнага краю. Яно ўключае ў сябе працу спецыялізаваных навуковых устаноў (Інстытут гісторыі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Інстытут беларускай мовы і літаратуры, Інстытут геалогіі і геафізікі зямлі НАН Беларусі), вышэйшых навучальных устаноў, рэгіянальных дзяржаўных і ведамасных музеяў, архіваў, бібліятэк. Пэўную ролю ў краязнаўчых даследаваннях адыгрываюць тэрытарыяльныя органы і ўстановы абласной, раённай і гарадской адміністрацыі. У працэсе выканання сваіх прафесійных абавязкаў іх работнікі выяўляюць, збіраюць і апрацоўваюць разнастайныя матэрыялы, фактычныя і статыстычныя звесткі краязнаўчага характару. Адміністрацыйныя органы (аддзелы культуры, спорту і турызму) з'яўляюцца праваднікамі ў ажыццяўленні рэгіянальных даследаванняў. Асобую ролю ў распаўсюджванні і папулярызацыі краязнаўчых ведаў адыгрываюць сродкі масавай інфармацыі.

Грамадскі напрамак краязнаўства развіваецца на добраахвотных пачатках праз дзейнасць грамадскіх арганізацый (Таварыства аховы помнікаў, Беларускае краязнаўчае таварыства), краязнаўцаў-аматараў. Толькі краязнаўцы часта з'яўляюцца захавальнікамі мясцовай гісторыі, веды пра якую ў век глабалізацыі хутка знікаюць разам з рэгіянальнымі і нават нацыянальнымі адметнасцямі краю. Дагэтуль, дарэчы, няма ніводнай кнігі, прысвечанай гісторыі Віцебска, комплекснага экскурсійнага даведніка па горадзе. Затое ёсць сотні артыкулаў у мясцовым перыядычным друку аматараў-краязнаўцаў, рэгіянальных вучоных на розныя тэмы жыцця горада. Краязнаўцы-аматары часта маюць веды, ініцыятыву, але не валодаюць рэсурсамі для ажыццяўлення пэўных праектаў гісторыка-культурнай накіраванасці, поспех якіх часта залежыць ад супрацоўніцтва з дзяржаўнымі структурамі.

Школьнае краязнаўства з'яўляецца якасным прыкладам сінтэзу грамадскага і дзяржаўнага кірункаў і развіваецца праз сістэму турыстычна-краязнаўчай дзейнасці, арганізацыю краязнаўчых даследаванняў у школьных музеях і пошукавую працу. Напрыклад, вынікам Усебеларускай экспедыцыі навучэнскай моладзі «Наш край» стала стварэнне

сотняў краязнаўчых музеяў у школах краіны, правядзенне рэгіянальных і рэспубліканскіх конкурсаў, канферэнцый, распрацоўка турыстычна-краязнаўчых маршрутаў, выхаванне патрыятызму і грамадзянскіх якасцяў моладзі ў краіне.

Сёння краязнаўства развіваецца ў розных краінах. У Францыі яно мае назву mouvement regional, у Германіі — heimatkunde, у Англіі — regional survey, у Чэхіі — vlastived, у Славакіі — vlastivednost, у Балгарыі — краезнание, у ЗША — local geography, kocal history.

## Хто такі краязнаўца. Тыпалогія даследчыкаў (краязнаўцаў)

У пэўнай меры даследаваннямі краю (краязнаўствам) займаюцца тысячы людзей. Некаторыя вывучаюць край у межах выканання службовых абавязкаў (супрацоўнікі архіваў, музеяў, бібліятэк, выкладчыкі ВНУ, журналісты, дзяржаўныя служачыя), іншыя вядуць гурткі, некаторыя проста самастойна, для сябе, даследуюць свой край. Але далёка не ўсе з іх, на нашу думку, з'яўляюцца сапраўднымі краязнаўцамі. Што адрознівае першых ад другіх? Найбольш уласцівымі рысамі сапраўднага краязнаўцы, на нашу думку, з'яўляюцца:

- комплексны характар ведаў (вялікі дыяпазон тэм даследаванняў, шырокае кола ведаў пра край, іх энцыклапедычнасць, універсальнасць);
- рэгулярнасць і пастаяннасць даследаванняў;
- значныя вынікі працы (выданне кніг, артыкулаў у перыядычным друку, адкрыццё музеяў і падрыхтоўка выстаў, значная грамадская, педагагічная праца, спонсарская дзейнасць, удзел у добраўпарадкаванні помнікаў і памятных мясцін);
- любоў да краю. Края*<u>знаўца</u>* заўжды края*<u>люб</u>*.

Такім чынам, краязнаўцамі, на думку аўтара, можна лічыць шырокае кола асоб, якое ўключае ў сябе як падрыхтаваныя навуковыя кадры, што вывучаюць пэўную тэрыторыю на прафесійным узроўні, атрымліваюць за гэта грошы (гісторыка, які даследуе стан пэўнай тэрыторыі ў асобны перыяд, напрыклад, Полацк у часы сярэднявечча), так і аматараў, якія не маюць спецыяльнай адукацыі і займаюцца даследаваннямі з прычыны цікавасці ці любові да пэўнага краю. Сюды таксама можна аднесці асоб, якія не ставяць перад сабой мэты вывучэння пэўнага краю, але сваёй дзейнасцю спрыяюць такому вывучэнню, робяць шмат для папулярызацыі ведаў пра свой край і асвятлення асобных бакоў жыцця сярод насельніцтва рэгіёна.

Можна вызначыць наступныя катэгорыі асоб, якія праводзяць даследаванні рэгіёна:

- навукоўцы, якія даследуюць пэўную мясцовасць (Інстытут гісторыі НАН Беларусі);
- супрацоўнікі музеяў (дзяржаўных, грамадскіх, ведамасных);
- супрацоўнікі архіваў;
- супрацоўнікі бібліятэк;
- выкладчыкі ВНУ;
- журналісты і супрацоўнікі мясцовых сродкаў масавай інфармацыі;
- настаўнікі, стваральнікі школьных музеяў, супрацоўнікі цэнтраў дзіцячай творчасці;
- супрацоўнікі дзяржаўных органаў (кіраўнікі аддзелаў культуры, спорту і турызму цэнтраў рамёстваў і інш.), работнікі установы «Белпраектрэстаўрацыя»;
- краязнаўцы-аматары;
- іншыя (мецэнаты, тыя, хто непасрэдна не займаюцца, але спрыяюць вывучэнню краю, даследаванні якіх маюць часовы, эпізадычны характар).

У сферу дзейнасці першых васьмі катэгорый уваходзяць краязнаўчыя даследаванні, якія замаўляюцца (і фінансуюцца) дзяржавай. Аматары працуюць больш незалежна, аднак у большасці сваёй у межах, якія вызначае ім улада (тэматыка, методыка, ідэалогія).

## Перыядызацыя і характарыстыка краязнаўства Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст.

У гісторыі краязнаўства Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст. вылучаюцца два этапы: першы ахоплівае 1950–1985 гг., другі з 1985 да пачатку XXI ст. Першаму этапу ўласцівы масавы, але фармальны ўдзел у краязнаўчым руху насельніцтва краіны. Практычна адзінай грамадскай арганізацыяй, якая мела краязнаўчыя мэты дзейнасці, з'яўлялася Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (колькасць яго членаў у 1991 г. дасягала 2,1 млн). Актыўна працавалі на ніве краязнаўства Віцебскі абласны краязнаўчы музей і Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. На жаль, з прычыны адсутнасці у ВДПІ

гістарычнага факультэта ў ім амаль не вывучалася гісторыя краю. Тэматыка даследаванняў абмяжоўвалася ідэалагічна і прысвечана была галоўным чынам падзеям Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнаму будаўніцтву. Краязнаўчыя матэрыялы друкаваліся, але абмежавана, на старонках мясцовага перыядычнага друку.

Другі этап пачынаецца ў 1985 г. з разгортваннем у СССР палітыкі перабудовы. У гэты час у краязнаўчым руху адбываюцца кардынальныя змены. Перыяд характарызуецца імклівым ростам колькасці яго ўдзельнікаў, павелічэннем грамадскай актыўнасці, пашырэннем тэматыкі даследаванняў, цікавасцю да «белых плямаў» у гісторыі, скарачэннем ідэалагічных абмежаванняў. У другой палове 1980–1990-х гг. краязнаўства адыграла значную ролю ў нацыянальным адраджэнні Беларусі.

Найбольш актыўнымі прадстаўнікамі грамадства, якія не былі абыякавымі да лёсу помнікаў гісторыі і культуры, стану беларускай мовы, экалагічных праблем, у гарадах вобласці былі ўтвораны культурна-асветніцкія таварыствы «Узгор'е» (Віцебск), «Повязь», «Рша» (Орша), «Маладзік», «Вытокі» (Полацк). На пачатку 1990-х гг. утварылася і дзейнічала Віцебскае абласное аддзяленне Беларускага краязнаўчага таварыства. Пры Віцебскай абласной бібліятэцы ўтварыўся і дзейнічаў Краязнаўчы фонд імя А.П. Сапунова. Да пачатку 1990-х гг. плённа працавала абласное, гарадское і раённыя аддзяленні БДТАПГіК. У шэрагу раёнаў заходняй Віцебшчыны (Браслаў, Германавічы, Глыбокае, Паставы) утварыліся краязнаўчыя таварыствы, якія дзейнічалі на аснове энтузіязму мясцовых краязнаўцаў (М. Гіль, В. Бунто, А. і М. Райчонак, І. Пракаповіч, У. Скрабатун, К. Шыдлоўскі).

Адным з найбольш значных цэнтраў рэгіянальных даследаванняў у азначаны час стаў абласны архіў. Тут праводзяцца навуковыя канферэнцыі на рэгіянальную тэматыку (90 гадоў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, у гонар 150-годдзя А.П. Сапунова), выдаюцца зборнікі матэрыялаў канферэнцый[1] і тэматычныя зборнікі[2]. У Полацку традыцыйнымі становяцца канферэнцыі, прысвечаныя гісторыі і археалогіі Полацкай зямлі (1987, 1992, 1997, 2002, 2006, 2008). У Оршы пры дапамозе рэгіянальнага аддзялення Таварыства аховы помнікаў краязнаўцы выдаюць шэраг кніг. Высілкамі супрацоўнікаў Браслаўскага раённага аб'яднання, і ў першую чаргу К. Шыдлоўскага, праводзяцца Браслаўскія чытанні (1989–2007), выдаюцца «Браслаўскія сшыткі» (1996, 1997, 1999), бюлетэнь «Павет» (2001–2006).

З канца 1990-х па сярэдзіну першага дзесяцігоддзя XXI ст. краязнаўчы рух крыху змяніў свае арганізацыйныя формы. Змены ў палітычным кіраўніцтве краіны, сыход з жыцця харызматычных прадстаўнікоў нацыянальнай гісторыі і краязнаўчага руху (Г. Каханоўскага, М. Ткачова, М. Ермаловіча), маятнікавы ход (за ўсплёскам актыўнасці абавязкова ідзе спад цікавасці) прывялі да таго, што Беларускае краязнаўчае таварыства перастала існаваць, а спробы яго аднавіць не прывялі да станоўчага выніку (адноўленае таварыства не было зарэгістравана). На невялікія замежныя гранты і высілкамі краязнаўцаў у заходніх раёнах Віцебшчыны працягвалі існаваць гісторыка-культурныя ініцыятывы: Браслаўскае краязнаўчае таварыства імя О. Гедэмана (К. Шыдлоўскі), Пастаўскае краязнаўчае таварыства імя К. Тызенгаўза (І. Пракаповіч), Культурна-асветніцкі цэнтр імя Я. Драздовіча (А. Райчонак), выдавецкія праекты «Сумежжа», «Нашы карані» (М. Гіль) і некаторыя інш. Аднак шэраг аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын прывялі да згортвання амаль усіх ініцыятыў.

У апошнія гады актыўна развіваецца музейны сегмент краязнаўства Віцебшчыны. Лідарам можна прызнаць Нацыянальны полацкі дзяржаўны гісторыка-культурны музей-запаведнік, які ўключае ў сябе 11 музеяў. Штогод тут праводзяцца навуковыя канферэнцыі, выдаюцца іх матэрыялы, ладзяцца новыя выставы, узводзяцца новыя помнікі. Віцебскі абласны краязнаўчы музей у апошні час штогод праводзіць па некалькі навукова-практычных канферэнцый, а да свайго 90-годдзя выдаў зборнік матэрыялаў. Сталі традыцыйнымі Лепельскія чытанні, Гарадоцкія чытанні, якія праводзяцца раённымі краязнаўчымі музеямі. Працягваецца эдыцыйная дзейнасць абласнога архіва. Краязнаўчыя старонкі і матэрыялы сталі традыцыйнымі ў мясцовых перыядычных выданнях. Ва ўсіх раёнах і гарадах

---

[1] 90 гадоў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі: матэрыялы навуковай канферэнцыі, 24 лістапада 1999 г., Віцебск. — Мн.: БелНДІДАС, 2000. — 92 с.; Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю: матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаных 150-годдзю з дня нараджэння А.П. Сапунова, 6–7 чэрвеня 2001 г., Віцебск. — Мн.: БелНДІДАС, 2002 — 232 с.

[2] Витебщина архивная: История, фонды, персоналии, сер. XIX–XX вв. — Мн.: БелНИИДАД, 2002. — 213 с.; Витебск. Классика и авангард. История Витебского художественного училища в документах Государственного архива Витебской области, 1918–1923 / сост. М.В. Пищуленок. — Витебск: Витебская областная типография, 2004. — 336 с.; Выстояли и победили: Свидетельствуют архивы. — Витебск: ГАВО, 2005 — 91 с.; Православная церковь на Витебщине, 1918–1991: документы и материалы / редкол.: М.В. Пищуленок (гл. ред.), В.П. Коханко (отв. сост.) [и др.]. — Мн.: НАРБ, 2006. — 365 с.; Витебщина освобожденная, октябрь 1943 – декабрь 1945: док. и материалы / сост. Н.В. Воронова [и др.]. — Витебск: Витебская областная типография, 2009. — 584 с.

вобласці выйшлі гісторыка-дакументальныя хронікі «Памяць». Прыгадаем, што першая кніга «Памяць» у СССР была выдадзена Шумілінскім раёнам. Кнігі рознай тэматыкі, якасці падрыхтоўкі і навуковай вартасці выдаюцца як на сродкі дзяржавы, спонсараў, так і за ўласныя грошы краязнаўцаў-аматараў.

У школьным краязнаўстве Усебеларуская турыстычна-краязнаўчая экспедыцыя навучэнцаў «Наш край» перарасла ў рэспубліканскую акцыю навучэнскай моладзі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся». Са зменай назвы не змяніліся сэнс і асноўная мэта: удасканаленне дзейнасці ўстаноў адукацыі па грамадзянска-патрыятычным выхаванні навучэнцаў і студэнтаў праз актыўнае ўключэнне іх ва ўсебаковае вывучэнне гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны сваёй малой радзімы. З'явіўся новы напрамак у школьным краязнаўстве — стварэнне дапаможнікаў па гісторыі і культуры рэгіёнаў. Выйшлі ў свет курсы «Оршазнаўства»[1], «Сяннознаўства»[2], «Чашніказнаўства»[3] і інш. выданні[4]. На гістарычным факультэце ВДУ імя П.М. Машэрава выкладаюцца курсы «Гістарычнае краязнаўства», «Краязнаўства Беларусі», «Турыстычнае рэгіёназнаўства». Пасля доўгага забыцця аднаўляецца цікавасць да царкоўнага краязнаўства.

Хутка расце колькасць і якасць інтэрнэт-сайтаў краязнаўчага характару, якія прысвечаны гарадам, раёнам і нават вёскам Віцебшчыны. Шмат матэрыялаў выдаецца беларусамі, палякамі, якія нарадзіліся на Віцебшчыне, але па волі лёсу жывуць у Польшчы, Латвіі, Расіі. Асаблівую актыўнасць праяўляюць ураджэнцы Браслаўскага, Пастаўскага і Глыбоцкага раёнаў.

Аднак у апошнія два дзесяцігоддзі ў краязнаўстве ёсць і негатыўныя тэндэнцыі. Адсутнасць абавязковага рэцэнзавання рукапісаў, артыкулаў стала прычынай з'яўлення нізкаякасных, а часам і псеўданавуковых кніг і матэрыялаў. Вялікай заганай краязнаўства працягвае быць дылетанцтва.

На мяжы стагоддзяў у нашым жыцці шмат што хутка мяняецца. Адбываецца змена пакаленняў. Сыходзяць краязнаўцы, якія нарадзіліся ў мінулым стагоддзі. На змену ім прыходзіць моладзь, якая нарадзілася ўжо ў незалежнай Беларусі. Змяняецца і само краязнаўства — яго формы, метады, але не змяняецца яго сутнасць — любоў да свайго краю. Пакуль будзе край, будуць і людзі, якія яго любяць, шануюць і вывучаюць. Таму ў краязнаўства вялікая і доўгая будучыня.

---

[1] Мой родны край — Аршаншчына: гісторыка-краязнаўчы зборнік для пачатковага азнаямлення / аўт.-саст. Т.М. Вароніна, А.М. Шышкевіч. — Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 2000. — 160 с.; Жуковский В.В. Оршеведение: производственно-практическое издание. — 2-е изд. — Орша: Оршанская типография, 2009. — 208 с.

[2] Бандарэвіч В.В. Экскурсія да вытокаў горада Сянно: краязнаўчыя нарысы. — Мн.: Літаратура і мастацтва, 2008. — 168 с.

[3] Грыбко В.В. Гістарычна-краязнаўчы курс «Наша Чашнічына» (Чашніказнаўства). — Мн.: Медысонт, 2007. — 228 с.

[4] Цяцерка Л.М. Ушаччына сінявокая. — Мн.: БДУ, 2007. — 136 с.; Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І.А. Абрамава [і інш.]; аўт.-уклад. М.В. Півавар. — Мн.: Паркус плюс, 2008. — 328 с.




**Карта Віцебскай вобласці**

# ГЕАГРАФІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК


Аболецкая гара, ля в. Абольцы, Талачынскі раён 131
Абольцы, в., Талачынскі раён 36, 131, 311
Абрамава, Верхнядзвінскі раён 316
Абрыў, Лепельшчына 319
Абухава, в., Аршанскі раён 170
Абчуг, в., Крупскі раён, Мінская вобл. 312
Аверкава, в., Расонскі раён (не існуе) 242
Австрия 47
Адаменкі, в., Лёзненскі раён 31
Адамянішкі, в., Браслаўскі раён 173
Адворня, в., Ушацкі раён 34
Адроў, р., Аршанскі раён 211, 303
Адэса, г. 70
Ажуны, в., цяпер чыг. ст. Варапаева, Пастаўскі раён 151
Азёркі, в., Пліскі с/с., Глыбоцкі раён 31
Азярава, в., Браслаўскі раён 324
Азярцы, воз., Лепельскі раён 319
Азярышчанскі замак 265
Акмалінск, г. 27
Акопы (Казлоўскі хутар), Лепельскі раён 319
Акунёва, в., Міёрскі раён 325? 326
Акунёва, воз., Лепельскі раён 319
Акцябрскі, п., Віцебскі раён 135, 209
Акцябрскі, с/с, Віцебскі раён 135, 186, 295
Алашкі Малыя, в., Шаркоўшчынскі раён 245
Алексінічы, в., Сенненскі раён 183
Альбянка, в., Нясвіжскі раён, Мінская вобл. 207
Альгова, Ольгово, в., Віцебскі раён 295, 296
Альховік, в. Лёзненскі раён 31, 162
Альшаны, в., Столінскі раён, Брэсцкая вобл. 158
Амерыка, в., Аршанскі раён (з 1963 г. Краснапольцы) 25, 131, 161, 329
Амерыка, чатка свету 197
Амурск, г., Хабараўскі край 39, 41
Анінск, в., Пскоўская вобл. 33
Аношкаўскае (Оч), воз., Лепельскі раён 280, 318, 319
Аношкі, в., Лепельскі раён 197
Аношкі, Аношкаўскае, воз., Лепельскі раён 171, 318
Антунава, в., Ушацкі раён 33
Апідамы, в., Пастаўскі раён 239
Апшакаў, востраў, Лепельскае воз. 319
Аральскае, мора 318
Арахі, в., Аршанскі раён 303
Арол, г., РФ 188
Арлова, в., Віцебскі раён 38, 46
Артанія 161
Архирейские дачи, Віцебск 65
Аршанскі замак, аршанскае замчышча 48, 56, 214, 327, 328
Аршаншчына, Аршанскі раён 9, 11, 17, 24, 25, 27, 28, 29, 31, 47, 55, 56, 59, 62, 76, 88, 89, 90, 92, 96, 97, 104, 105, 106, 108, 115, 116, 123, 126, 128, 129, 134, 137, 139, 142, 144, 148, 153, 155, 160, 161, 169, 170, 172, 173, 175, 176, 186, 191, 192, 193, 194, 196, 204, 209, 210, 211, 213, 214, 221, 222, 242, 243, 244, 245, 249, 250, 251, 257, 258, 265, 266, 267, 270, 273, 274, 279, 281, 284, 289, 294, 297, 302, 303, 304, 305, 309, 326, 327, 328, 329, 333, 338, 343, 344, 349
Аршыца, р., Аршанскі раён 328, 332
Арэса, р. 25
Арэхаўна, в., Ушацкі раён 139, 313
Арэхаўск, г.п., Аршанскі раён 55, 170, 274, 302, 303
Асавец, в., Бешанковіцкі раён 168
Асвенцым, Освенцим, г., РП 64, 295, 296
Асвея, Освейское, воз. 41, 42, 98, 139
Асвея, м., Дрысенскі пав., цяпер г.п., Верхнядзвінскі раён 40, 112, 204, 226, 314,
Асвейшчына 225
Асінагарадок, в., Пастаўскі раён 123
Асінаўка, ст., Аршанскі раён 204
Асінторф, в., Аршанскі раён, раней в. Юр'еў Востраў, Дубровенскі раён 24, 96, 144, 170, 175, 176, 303, 313
Астафа, чыг. ст., Азербайджанская ССР, цяпер Азербайджан 284
Астравец, г., Гродзенская вобл. 101
Астравок, в., Капыльскі раён, Мінская вобл. 196
Астраўляны, в., Ушацкі раён 33
Астраўскія, в., Віцебскі раён 117
Астровенская Слабада, в., Докшыцкі раён 262
Астроўна, в., Бешанковіцкі раён 30, 41, 70, 71, 112, 164, 165, 167,195, 228, 322, 339, 341
Астроўна, воз., Лепельскі раён 319
Атлантыда 18
Атолава, воз., Ушацкі раён 34
Аўгустоўскія курганы, Лепельшчына 319
Аўраамская, ст., Гомельская акруга, Гомельшчына 116
Аўсянкі, в., Чашніцкі раён 140
Аўта, р., Міёрскі раён 136, 182
Афганістан 27, 167, 188, 283, 297, 298
Ахрэмаўцы, в., Браслаўскі раён 313
Ашмяны, г., Гродзенская вобл. 33

Бабіна, в., Лепельскі раён 317
Бабінавічы, Бабынавічы, в., Лёзненскі раён 37, 120, 292
Бабінічы, в., Віцебскі раён 56, 57, 209
Бабовішча, в., Ушацкі раён 139
Баброва, в., Дубровенскі раён 308
Бабруйск, г. 151
Бабынічы, Бабынавічы, в., Полацкі раён 138
Бабышкі, в., Міёрскі раён 224, 226
Багародзіцкае, в., Полацкі раён 33
Багушэўск, г.п., Сенненскі раён 52, 98, 131, 173, 182, 241, 292
Багушэўскі раён, цяпер тэрыторыя Сенненскага раёна 201, 241,266
Бадзяліна, в., Ушацкі раён 136
Баева, в., Дубровенскі раён 56, 104, 176
Байканур, г., Казахстан 114, 212
Байна, р., Лепельскі, Чашніцкі раёны 280
Балбасава, г.п., Аршанскі раён 161, 214, 284
Балбекі, в., Дзісненскі пав., Віленскае ваяв., цяпер Шаркоўшчынскі раён 156
Балбечча, в., Бешанковіцкі раён 182
Балгарыя 158, 172, 347
Балтыка 75, 165, 166, 168
Бандары, в., Расонскі раён (не існуе) 242
Бандэна, г., Італія 192
Баравенскае, воз., Лепельшчына 319
Баравенскія хутары, Лепельшчына 319
Барадзінічы, в., Браслаўшчына 18, 26
Барадзіно, в., Дубровенскі раён 302
Барадзіно, в., Расія 131
Баранава, в., Полацкі раён 129
Баранавічы, г. 113, 200, 307, 324
Баранавіцкі раён 151, 216, 247
Бараноўшчына, лес, Аршанскі раён 329
Барань, г., Аршанскі раён 25, 47, 48, 49, 115, 116, 131, 161, 211, 214, 328
Бараўляне, Боравляне, Боровляне, в., Віцебскі раён 80, 142, 295,
Барвін перавоз, Барвин перевоз, в., Віцебскі раён, цяпер в. Барвін 64, 65, 223
Барздоўка, в., Аршанскі раён 244, 329
Баркі, в., Шклоўскі раён 117
Барковщина, крыніца, Міёрскі раён 98
Баркоўчына, Міёрскі раён 325
Бародзінічы, в., Браслаўскі раён 231
Бароўка, в., воз., санат., Лепельскі раён 313
Баруны, в., Ашмянскі раён, Гродзенская вобл. 33
Барысаглебск, г., Варонежская вобл. 116
Барысаў, г. 309, 310
Барысаўка, в. Белгарадская вобл, РФ 180
Барысаўскага бальшак, Лепельшчына 319
Барысаўскі раён, Барыстаўскі павет 151, 172, 180, 183, 262, 303
Барысфен, гіст. назва р. Дняпро 214
Барышыно поле, каля Віцебска 296
Барэцк, в., Дубровенскі раён 197
Баталі, в., Гарадоцкі раён 46
Бачэйкава, Бочейково, м., цяпер в., Бешанковіцкі раён 8, 26, 53, 164, 165, 166, 167, 168, 189, 228, 229, 231
Башарава, в., Талачынскі раён 242
Безадэннае, воз., Лепельскі раён 319
Белаводскае, с., Маскоўскі раён, Кыргызстан 139
Белавуша, в., Столінскі раён, Брэсцкая вобл. 39
Белае, в., Ушацкі раён 215

Белае, воз., Глыбоцкі раён 60
Белакозы, в., Бераставіцкі раён, Гродзенская вобл. 289
Беласток, г., РП 78, 81, 115, 136, 152, 163, 210, 232, 236
Беласточчына 20, 81
Белаярск, г., Урал 107
Белік, х., Аршаншчына (не існуе) 329
Беліца, в., Сенненскі раён, цяпер в. Полымя 30, 131
Белы Ковель, замак, в. Смаляны, Аршанскі раён 213
Бельск-Падляскі, г., РП 343
Беразвецкае возера, Глыбоччына 264
Беразвечча, Беразвеч, Бярэзвеч, в., Глыбоцкі раён 46, 118, 119, 132, 163, 183, 196, 202, 264
Беразіно, г., Мінскай вобл. 42, 100
Бераснёва, в., Бешанковіцкі раён 26
Берлін, г. 117, 188, 295
Бешанковічы, Бешенковичи, г. 26, 143, 164, 166, 167, 168, 169, 179, 222, 335
Бешанковіцкі раён, Бешенковичский район, Бешанковіччына 26, 36, 70, 71, 98, 131, 139, 140, 164, 165, 166, 167, 168, 169, 171, 177, 182, 185, 189, 190, 192, 213, 217, 228, 231, 259, 266, 271, 297, 339
Бігосава, чыг. ст., Верхнядзвінскі раён 21, 41, 313
Бігосаўшчына 225, 277
Бікульніцкае капішча, каля воз. Янова, Полацкі раён 84
Бірукі, маёнтак у гміне Новы Пагост, цяпер Міёрскі раён 119
Блудзін, в., Доманавіцкі раён, Палеская вобл., цяпер в. Дзянісовічы, Калінкавіцкі раён Гомельскай вобл. 174
Бобрыца, воз., Лепельскі раён 319
Богіна, в., Браслаўскі раён 33
Бор, в., Лёзненскі раён 10
Бораўна, в., гарадзішча., Лепельскі раён 320
Боркавічы, в., Верхнядзвінскі раён 40, 129, 136, 255
Борунов сад, Віцебск 65
Браздзечна, в., Аршанскі раён 161
Бранск, г., РФ 272
Бранцава, в., Аршанскі раён 329
Браслаў, Браслав, г. 5, 14, 33, 44, 46, 55, 75, 77, 81, 94, 99, 106, 112, 124, 133, 136, 163, 185, 230, 237, 246, 263, 288, 314, 319, 320, 348,
Браслаўскі замак 322
Браслаўскі раён, Браслаўшчына, Браславщина 6, 14, 25, 26, 44, 45, 46, 49, 53, 54, 67, 77, 79, 81, 94, 95, 98, 99, 100, 106, 108, 109, 110, 111, 112, 119, 132, 140, 150, 155, 156, 157, 163, 173, 181, 186, 189, 195, 198, 199, 211, 218, 222, 227, 229, 230, 231, 232, 236, 239, 245, 246, 248, 252, 253, 255, 265, 271, 281, 299, 300, 308, 313, 314, 316, 320, 321, 322, 323, 324, 333, 339, 343, 348, 349
Браслаўскія азёры, Браславские озера 94, 153, 186, 253,
Брацкая ДРЭС 55
Бронная слабада, Масква 125
Бруяк, месца на р. Лужаснянка каля в. Сакольнікі 65
Брылі, в., Аршанскі раён 303
Брыгітполле, в., Віцебскі раён 118
Брэст, г. 41, 102, 112, 165, 195
БССР 13, 16, 19, 22, 29, 37, 41, 42, 45, 48, 50, 68, 75, 77, 82, 83, 84, 86, 87, 92, 93, 94, 95, 99, 101, 105, 106, 118, 119, 120, 131, 132, 137, 138, 139, 140, 146, 147, 148, 149, 153, 154, 157, 163, 169, 170, 175, 177, 180, 184, 186, 190, 195, 198, 201, 208, 210, 220, 221, 244, 245, 247, 248, 250, 251, 252, 254, 269, 270, 271, 274, 275, 267, 278, 279, 286, 301, 302, 314, 316, 324, 326, 330, 337, 340, 345
Бубнова, в., Лёзненскі раён 108
Будаўка, в., Талачынскі раён 247
Будзішча, в., Полацкі раён 33
Будзянка, в., Суражскі раён, цяпер Віцебскі (не існуе) 18
Будобаль, в., Шуміліншчына 281
Будслаў, в., Мядзельскі раён, Мінская вобл. 11, 133
Буевское, воз., Лёзненскі раён 108
Бузянка, р., Лепельскі раён 98, 318, 319
Бук, в., Талачынскі раён 36, 311
Букаціна, в., Віцебскі раён 65, 66
Булавішкі, в., Браслаўскі раён 323
Бура-Паломскі лагер, ГУЛАГ 151
Буракова (Буракова гара), гарадзішча, Гарадоцкі раён 94, 316
Буракова Балота, Лёзненшчына 128
Буторы, в., Талачынскі раён 36
Бушыкі, в., Глыбоцкі раён 306
Буянова, в., Міёрскі раён 62
Быдгошч, г., РП 118
Быкаўшчына, в., Полацкі раён 19
Быкі, в., Гарадоцкі раён 131
Бычкі, в., Ушацкі раён 131, 133, 151, 178
Бычыха, в., Гарадоцкі раён 131
Бягомль, Бягомель, Бегомль, г.п., Докшыцкі раён 86, 87, 263, 299
Бягомльшчына 262, 263, 284, 298
Бяленіца, р., Лепельскі раён 320
Бяльмонты, в., Браслаўскі раён 322, 323
Бярозкі, фальварак, Докшыччына (не існуе) 263
Бярэзіна, в., Докшыцкі раён 262, 263
Бярэзіна, р., Віцебская вобл. 25
Бярэзінская водная сістэма 167, 267, 341, 342
Бярэзінскі канал 318, 319
Бярэшча, воз., Лепельскі раён 280, 319

Вавель, карал. замак у Кракаве 203
Вайвады, в., Прыдруйская воласць, Дрысенскі пав., Віцебская губ. 52
Вайшкуны, в., Пастаўскі раён 197
Валасова, в., Віцебскі раён 183, 184, 295
Валасова, в., Талачынскі раён 247
Валатоўка, в., Лепельскі раён 318
Валатоўкі, в., Шумілінскі раён 17
Валга, г., Эстонія 43
Валкаўцы, в., Мсціслаўскі раён, Магілёўская вобл. 185
Валова азярцо, Валовая азярына, Валова азярына, Волово озеро, г., Полацк 35, 190
Валова гара, в., Лепельскі раён 131
Валынецкі раён 277
Валынцы, в., Верхнядзвінскі раён 40,155, 325
Варанецкае замчышча, Полацкі раён 35
Варанцэвічы, в., Талачынскі раён 141, 242, 311
Варапаева, г.п., Пастаўскі раён 46, 123, 124, 125, 151, 196, 324, 338
Варапаева, чыг. ст., Пастаўскі раён, раней в. Ажуны 151
Варганы, в., Докшыцкі раён 314
Варкуды, в., Ушацкі раён 200
Варкута, г. 57, 231, 292
Варняны, в., Гродзенская вобл. 33
Варонеж, г. 15, 19, 20
Вароніна, в., Сенненскі раён 30, 183
Варонічы, в., Полацкі раён 35, 146, 283
Вароны, Вороны, в., саўгас, Віцебскі раён 38, 146, 186, 209, 223, 294
Варосіна, в., Пінскі раён, Брэсцкая вобл. 182
Вархі, в., Гарадоцкі раён 71, 72
